Юры Весялкоўскі

Дух часу



Дух часу

Юры Весялкоўскі

Дух часу

Палемічна-крытычныя артыкулы

Беласток – Лёндан 2005

Рэдактар
Віталь Луба

Афармленьне, вокладка
Аляксандар Максімюк
(http://valcomp.biz/setpro/)

Copyright © 2005 by Юры Весялкоўскі

Кніга выдадзена за кошт Аўтара накладам 200 асобнікаў.

Зьмест

Відушчая памяць дасьледчыка 9
Ад аўтара 19

Эміграцыйнае жыцьцё

„Казюк" у Італіі 24
Першая беларуская арганізацыя ў Вялікабрытаніі
й яе духоўныя й палітычныя апекуны 25
Яшчэ адзін забыты юбілей 44
Беларуская суботняя школка ў Лёндане 47
Дадатак да „Кароткіх успамінаў" Паўла Навары 49
Да пытаньня заснаваньня часопіса „Аб'еднаньне" 57
Нараджэньне часопіса „Голас Часу" 59
З нагоды пятых угодкаў „Голасу Часу" 61
Паважаныя чытачы „Голасу Часу" 68
Аб Беларусі ў Лёнданскім унівэрсытэце 70
Міністар замежных спраў Рэспублікі Беларусь
наведаў беларусаў Англіі 71

Мінулае і сучаснасьць Беларусі

Сакавік у жыцьці беларускага народу 76
„Старажытная Беларусь" 80
Галасы аб Грунвальдзкай бітве 82
Францішак Скарына — беларускі першадрукар,
вучоны, асьветнік і культурны дзеяч, перакладчык
і пісьменьнік эпохі Адраджэньня 96
„Тут мой народ" 106
„Зварот да беларускага народу" 107

Беларусь пасьля падзелаў Рэчы Паспалітай 118
„З душой славяніна" 125
XIX стагодзьдзе на Беларусі й Кастусь Каліноўскі 126
Нарадавольцы, Ігнат Грынявіцкі й цень
К. Каліноўскага 136
Алаіза Пашкевічанка — Цётка (33-я ўгодкі
з дня яе сьмерці) 157
„А сэрца ўсё імкнецца да бацькаўскага краю..." 159
Слуцкая Абарона 160
Старая песьня неаджытай гамы 167
Другі Ўсебеларускі Кангрэс, 27 чэрвеня 1944 г. 174
Пяцьдзесят гадоў таму й сёньня 176
Менск, 27 чэрвеня 1944 года 180
Галоснасьць галосіць, а ўлада тармозіць 185
Яшчэ адно выданьне 191
„Таварыш" ці „спадар"? І „Жыве Беларусь!" 195
Хто выбіраў беларускі дзяржаўны гімн? 201
„Імёны на граніце" 204
Да візыту прэзыдэнта ЗША Б. Клінтана ў Беларусі ... 206
Сумная навіна 208
Беларусь выбрала прэзыдэнта 209

Заходнія і ўсходнія суседзі

Хто першы пачаў ламаць трактаты? 212
Беларуска-польская канфэрэнцыя гісторыкаў 217
Палякі на Беларусі й аб Беларусі 229
„Браця з-за Буга" 232
„Мысьлёнц о ойчызьне" 237
Заклік IV Кангрэсу 242
„Рочніца «Бужы» в Бялымстоку" 244
„Разумная палітыка" 249
Польска-ўкраінскае Монтэ-Касына 254
Фальшаваньне гісторыі 258
За плотам Катыньскага лесу 263
Пакт Молатава-Рыбэнтропа 279
Вынятак з артыкула „Галасы аб «Вялікай
Айчыннай вайне» й удзел у ёй савецкіх
і польскіх партызанаў" 282

Нас ня зналі й не хацелі прызнаць 295
Апошняя імпэрыя ў сьвеце 299
XXVIII зьезд КПСС у пэрспэктыве часу 302
Што сталася з агульнымі выбарамі ў Расеі
12 сьнежня 1993 году? 307
Рублёвая зона 312
Хто каго вучыў? 317
За цаной не пастаім... 333
У савецкіх рэспубліках фэрмэнт 342
Далёкая дарога да згоды 344
„Belarus" 347

Беларусь хрысьціянская

Хрысьціянства на Беларусі 350
Беларусь — сувязь у ланцугу ўсходняга й заходняга
хрысьціянства ў мінуўшчыну й цяпер 356
Славянская літургія ў паняцьці Рымскай царквы 362
Язафат Кунцэвіч і яго аднадумцы 374
„Беларуская крыніца" й сьвяты Фэліцыян 434
З улікам, ці з разьлікам? 436
Ці Кірыла й Мяфодзій дапамагаюць Маскве? 463
Герархі Праваслаўнай царквы ў СССР 467
„Хай будзе ўсё адно..." 471
Каляды на Беларусі 478
Якому Богу маліцца? 481
Замежны рапарт 490

Раньняе хрысьціянства

Хрысьціянства ад Галілеі да Беларусі
(гістарычны нарыс) 500
Ісус Назаранін 516
Ісус — Цар Юдэйскі 521
Асірацеўшыя апосталы 526
Як Саўл стаўся Паўлам 533
Евангельле — Добрая Навіна 541
Хрысьціянства й яго першыя рымскія цэзары 546
Новая эра ў гісторыі Рымскай імпэрыі 552

Ад Траяна да Марка Аўрэлія 560
Ад Камода да Філіпа Араба 567
Разьвіцьцё й пашырэньне хрысьціянства 572
Ад Дэцыя да Дыяклетыяна 580
Прасьлед хрысьціян за Дыяклетыяна й Галерыя 587
Сьмерць Галерыя й Максіміяна Дая 595
Канстанцін Вялікі — першы хрысьціянскі імпэратар 601
Першы экумэнічны сабор 609
Сьмерць Канстанціна Вялікага 614
Сыны Канстанціна й Юліян Апастат 618
Архіепіскап Мяфодзій і ягоная дзейнасьць 628

Грамадзка-арганізацыйнае жыцьцё

Крытыка й правакацыя 638
Войска й палітыка 639
Халодная вайна 642
Прычыны грамадзянскіх і міжнародных войнаў (для прыкладу — Югаславія) 646
Правы чалавека 699
Прысвоілі патэнт на сьвяткаваньне 703
Годалічэньні й розьніца паміж новым і старым стылямі 707
Праблемы Чарнобыля 710
Зналі ці ня зналі? 712
Чалавек сам сабе шкодзіць 714
Пра Алімпійскія гульні 716

У краінах сьвету

Атам — новая крыніца энэргіі й змаганьня 720
Кітай змагаецца 722
Рост насельніцтва Вялікабрытаніі 724
Суэцкі канал 727
Партыя працы на сваім шляху да ўлады 729
Нашыя пабрацімы на Балканах 733
Крытычныя галасы немцаў 744
Дыктатары XX стагодзьдзя 750

Відушчая памяць дасьледчыка

На далёкай, на чужыне
Жывём думкай аб Радзіме.
(„Голас Часу", Лёндан)

Гэту кнігу міжволі ўзважваеш на далоні, нібы ёмістую цагліну з гістарычнага падмурку Беларушчыны. Узважваеш з нялёгкім уздыхам: глыбока ў душу, трывожна й пранікліва, яна, гэта кніга, гэты „Дух часу" ўглядаецца вачыма замежжа, той заходняй дыяспары, ад імя якой узяўся мужна, на публіцыстычным дыханьні, прамаўляць адметны голас яшчэ аднаго, бясспрэчна, буйнага, цікавага, разнастайнага, беларуска-прыроджанага таленту — Юры Весялкоўскага.

У кнігу „Дух часу", сабраную з важкіх праблемных артыкулаў, аўтар уклаў усё сваё жыцьцё, роздум, боль, няспраўджаныя спадзяваньні, памылкі, калдобы шматлікіх дарог, што аддалялі й набліжалі яго да Бацькаўшчыны. Набліжэньне найбольш складвалася ўнутранае — праз роздумнае судакраненьне з павучальнымі ўрокамі мінуўшчыны (разьдзелы „Мінулае і сучаснасьць Беларусі", „Заходнія й усходнія суседзі").

Але напачатку, як споведзь — „Эміграцыйнае жыцьцё". У сваіх успамінах, нататках, экскурсах у асабіста перажытае, Юры Весялкоўскі, на жаль, няшмат увагі ўдзяляе ўласнай „персоне"... Вось бацьку, цяжка хворага, прыўздымае ўцешная навіна — яе пранёс з вуліцы ў нядзелю памятнага

Верасьня сынок-падлетак Юрась: праз Новы Сьвержань праскакалі жаўнеры-верхнікі з чырвонымі зоркамі. „Ну, слава Богу, зьмена ўлады". Але хто тады думаў, куды тая першая ўсьцешанасьць хісьнецца ў сям'і Весялкоўскіх, у жыцьці беларусаў-заходнікаў?.. Сьпісы высяленьня, разьвітальны адчай вывазу, катаржанскія дарогі ў Сібір, Катынь і г.д.

Юры Весялкоўскі не паглыбляецца ў свой жыцьцяпіс. Не імкнецца разабрацца, як стаўся надлом яго юначай душы, якая пачала ўжо спакушацца сумленнасьцю свайго Беларускага шляху. Ускочыць з агню ды ў полымя — на гэта штурхалі абставіны. Ды няпроста выскачыць з падзей, што ўцягвалі ў вогненны вір. Якім чынам, напрыклад, малады Весялкоўскі апынуўся ў Менску каля Беларускага гарадскога тэатру, дзе 27 чэрвеня 1944 года адбываўся Другі Ўсебеларускі Кангрэс, ды меў шчасьлівую нагоду стаяць перад „фронтам будынку", які быў упрыгожаны бел-чырвона-белымі сьцягамі й Пагоняй? Варту трымалі курсанты афіцэрскай школы. „Ганаровы пачот" — усё як належыць. „Я стаяў на сваім месцы" ажно да гадзіны пятай папалудні, усёй істотай успрымаў важнасьць гістарычнага моманту, бачыў на свае вочы, як прэзыдэнт БЦР Радаслаў Астроўскі самаходам пад'ехаў да тэатру, чуў, як там выбухалі бурныя воплескі на знак ухвалы прамаўленьняў. Юрась быў перапоўнены ўзрушэньнямі („Гэты важны гістарычны дзень у сталіцы Менску назаўсёды застаецца ў маёй памяці").

Цікава, што роўна праз дзесяць гадоў Юры Весялкоўскі меў магчымасьць перачытаць тыя выступленьні беларускіх кангрэсістаў у мюнхенскім выданьні („Другі Ўсебеларускі Кангрэс", Мюнхен 1954) і адчуць як бы асабістую прыналежнасьць да тагачасных падзей, і што самае галоўнае — паставіцца да ўсяго таго без іроніі. „Адступленьне ішло па ўсёй лініі ўсходняга фронту" (дакладней, ішло наступленьне — гэта як для каго), нямецкія танкі па вуліцах сунуліся „нах гаўзэн", а яны, больш тысячы дэлегатаў (1 039) з усіх куткоў Айчыны прабіваліся на свой Кангрэс па замінаваных дарогах, выбуховых чыгунках. „І гэтыя людзі не былі нямецкімі памагатымі й не было ўжо ніякай патрэбы памагаць немцам у гэты час, бо-ж відаць было, што немцы вайну прайгралі". Былі гэтыя людзі, — як тлумачыць Юры Весял-

коўскі , — „шчырымі беларускімі патрыётамі, іх ніхто не змушаў ісьці на Кангрэс і ніхто не вучыў іх, што яны маюць на ім гаварыць". Пра што гэта сьведчыць? А пра тое, што сьведамасьць беларусаў узнялася высока, нягледзячы на ўсе ўдушэньні, што чыніліся нямецкай акупацыяй. Людзі адчулі магчымасьць нацыянальнага самаадраджэньня, адраджэньня беларускай ідэі, беларускіх школ, прэсы...

А ці не было ўсё гэта ілюзіяй, непраглядна-тлумным падманам? Разам з падманным самапацяшэньнем — скліканьнем Кангрэсу, удзельнікаў апаноўвала эйфарыя нацыянальнага волевыяўленьня. Уздымны настрой перадаўся й маладому Весялкоўскаму, хоць нічога вясёлага анікому зь іх не сьвяціла наперадзе. Страта Айчыны! Нават з роднымі не ўсім выпала разьвітацца.

Далей біяграфічныя вехі аўтара кнігі „Дух часу" праглядваюцца пункцірна. „З Менску лёс закінуў нас у Францыю...". Затым у польскае войска, што фармавалася ў Італіі. На шчасьце, „немцы скапітулявалі ў Італіі" й перад Юрыем расхілілася прасьветліна вучобы ў польскай гімназіі пры войску. Вось там і намецілася вядучая ідэя далейшага жыцьця на чужыне: аб'яднаньне! Настойлівае адшуканьне беларусаў дзеля аб'яднаньня. Асабліва ўцалелых маладых беларускіх сіл, што групаваліся пры гімназіях. Рыхтаваўся грунт для беларускай арганізацыі — неадкладна, прысьпешна, з афіцыйнага дазволу галоўнага штабу польскай арміі. Стаўся не дужа абяцальным той першы агульны З'езд Беларусаў Вялікабрытаніі ў Лёндане (1948 г.). Былі гімназічныя звальненьні, былі ганеньні. Аднак пазітыўная роля З'езду заключалася ўжо ў самім стварэньні першай беларускай арганізацыі: Згуртаваньне Беларусаў у Вялікабрытаніі (ЗБВБ).

На вялікі жаль, сілы супроцьдзеяньня вялі да расколу гэтай яшчэ неакрэплай арганізацыі. Убачылася небясьпека з самымі сумнымі наступствамі. Тым, хто выйшаў з ЗБВБ, прыйшлося закладваць новую арганізацыю — Хрысьціянскае Аб'яднаньне Беларускіх Работнікаў (ХАБР). Ёсьць у гэтай назьве дамінуючае слова: АБ'ЕДНАНЬНЕ. Слова-ідэя — у імя пераадоленьня расколу. Дзякуючы высілкам сяброў новай арганізацыі ўзьнік, такім чынам, шырокавядомы ў заходніх колах часопіс „Аб'яднаньне"(1948), штомесячнік,

якому Юры Весялкоўскі аддаў восем гадоў шчырай арганізацыйна-творчай працы (1954-1962). У сьвет выйшла больш сотні нумароў.

Аднак і ў гэтую арганізацыю зь яе выданьнем раскол пускаў свае атрутныя карані. Часткова яму пажыву давала амбіцыйная няўступнасьць двух беларускіх прэзыдэнтаў, што апынуліся ў выгнаньні — Міколы Абрамчыка, які прыняў кіраўніцтва БНР па „тэстаменту" й Радаслава Астроўскага, што ачольваў БЦР. Вядома, зусім не час быў на чужыне ім хапацца за чубы. Але-ж нельга тут абысьці маўчаньнем другое. Прыкрую, нягодную гісторыю з захопам беларускага Дому Хрысьціянскага Аб'яднаньня, менавіта захопам, што ўчыніў Радаслаў Астроўскі разам са сваім сынам Віктарам. Можа, лепш было-б тут і не згадваць тую пакасную справу. Але ж яна дужа пазітыўна высьвечвае постаць Юрыя Весялкоўскага. Магчыма, тут праявілася адна з самых адметных рысаў яго натуры, яго публіцыстычнай уталентаванасьці — даверліва-пачуцьцёвая напоўненасьць аповеду, што выклікае наша разуменьне, прыхільнасьць адносін.

Справа ў тым, што Дом, у якім знаходзілася Хрысьціянскае Аб'яднаньне Беларускіх Работнікаў і сама рэдакцыя часопіса „Аб'яднаньне", неасьцярожна быў афармлены на імя Р. Астроўскага зь яго сынам: „У сувязі з прыездам прэзыдэнта БЦР у Англію, каб разгарнуць і ўладзіць працу арганізацыі, а таксама даць большую магчымасьць для працы прэзыдэнта БЦР, Галоўная Ўправа ХАБР пастанавіла правесьці рэвізію Дому ХАБР, і Дом ХАБР на поўных падставах быў перададзены пад кантроль прэзыдэнта БЦР як зьверхніка беларускага жыцьця ў Англіі й іншых краінах вольнага сьвету". Дык вось гэты „зьверхнік", які не прылажыўся „ні пэнсам" ні да набыцьця й працы Дому, зачыніць дзьверы перад супрацоўнікамі, наведвальнікамі. Такое проста ў галаву не ўкладвалася... І гэта ўчыніў той, каго па-маладому рамантычна настроены Юры Весялкоўскі шчыра вітаў пры ўваходзе ў Менскі гарадскі тэатр у 1944 годзе. „Я не мог зразумець, — піша ў сваёй кнізе аўтар, — каб прафэсар, старшыня БЦР, якога я бараніў на працягу гадоў будучы рэдактарам часопіса, мог пайсьці на такую пакасьць. Ніхто ў Лёндане лепш зь ім ня жыў, як я. Ён

прыходзіў да мяне, жыў недалёка, 30 мінут хады праз парк. І я заходзіў да яго часта забраць арганізацыйную карэспандэнцыю й мне цікава было пагутарыць зь ім, бо гэта быў адукаваны чалавек, стары беларускі дзеяч, палітык, які многа чаго й каго знаў і мог гутарыць на любую тэму".

Каштоўнасьць такіх мясьцін у гэтай кнізе Юры Весялкоўскага ў тым, што яны захоўваюць шчырую спавядальнасьць, пачуцьцёвую сапраўднасьць перажыванняў асобы, якая проста пакутуе за тую кампраметацыю агульнай справы, што ценем кладзецца на ўсю беларушчыну і, пэўна, ня толькі на чужыне. Як ня горка такое прыгадваць, ды трэба. Бо як-жа іначай, як праз боль усьведамленьня, выпраўляць натуру беларуса?

Захлынулася ў той нягоднасьці, на жаль, выданьне часопіса „Аб'еднаньне". І ўсё-ж разуменьне важнасьці беларускай справы на чужыне было невынішчальным — ажывіла й узмоцніла прагу да бесперапыннага дзеяньня. Юры Весялкоўскі з усім сваім выдавецкім вопытам і сумленнасьцю быў пакліканы да працягу — прыняў нялёгкі клопат рэдагаваньня двухмесячніка „Голас Часу". Часопіс разгортвае далей магчымасьці яго публіцыстычнага дару творчасьці. „Голас Часу" піша праўду, часам горкую, але праўду, — падкрэсьлівае гэты дужа істотны момант аўтар, шчыры працаўнік па прызваньню й усьвядомленаму абавязку. „Можа каму й гэты мой артыкул не падабаецца, у якім я выказваю крыўды. Але тут не ходзіць пра мяне, але пра жыцьцё беларускай арганізацыі й тыя беларускія часопісы, што заўчасна памерлі праз несьвядомую дзейнасьць некаторых людзей. Кожны з нас робіць памылкі, але на некаторыя зь іх не можа быць апраўданьня. Людзі павінны памятаць, што на сьвеце многа што мяняецца й усякія хітрыкі, ашуканствы, нажывы й праступствы толькі да часу". І з аўтарам можна пагадзіцца.

Дарэчы, амаль усе нумары гэтага часопіса я маю ў сваёй хатняй бібліятэцы. Ды й сяды-тады друкаваўся на яго старонках. Цяпер гэта ўжо гісторыя.

* * *

Апошнія самакрытычныя радкі — як дазвол на кардынальнае пытаньне: якая-ж яна, праўда, нават тая „горкая",

што не ўсім даспадобы — каму-ж яна належыць, ісьціна ў апошняй інстанцыі? Ці дадзена каму права безапеляцыйна яе прагалошваць?

Прыгадаем: з жалем гаворачы пра раскол толькі што ўтворанага Згуртаваньня Беларусаў аўтар без ніякага сумніву паказаў на першапрычыну: „Прычынай стаўся прыезд з Рыму ў Лёндан вуніята айца Чэслава Сіповіча, місіянера па наварочваньні праваслаўных на вунію". Бязладзьдзе ўзаемаадносін беларускіх прэзыдэнтаў на чужыне Міколы Абрамчыка й Радаслава Астроўскага — гэта ўжо як бы пасьля, у падвёрстку да першапрычыны...

Да супярэчлівых абставін і вымогаў часу не шкодзіла-б падыходзіць з большай разважнасьцю. Гэта незвычайна актуальныя сёньня вымогі еднасьці, унутранай узгодненасьці Дому людскога сужыцьця. Як не прыгадаць прарочае прадбачаньне Хрыста: „Усякае царства, якое разьдзялілася само ў сабе, апусьцее, і ўсякі горад ці дом, які разьдзяліўся сам у сабе, не ўтрымаецца" (Мацьв.,12:25). Тычыцца гэта й Беларускага Дому, што спакон зьнесіляецца ад унутранай калатнечы. Справядліва гэта й для Дому веры Хрыста. Хрысьціянскі Дом адзіны. Гэта безгалоўе палітыкаў расьцягвае яго па бярвеньню, разгароджвае на каморкі й катухі адасобленых вызнаньняў і канфесій — у імя сваіх захопніцкіх намераў, экспансій.

У гісторыі чалавецтва ўсё дэтэрмінавана й абумоўлена. У тым ліку й зьяўленьне ў эпоху Высокага Рэнесансу Велічнай постаці Францішка Скарыны — усёй сутнасьцю свайго дзеяньня ён ужо тады засьведчыў „вялікі культурны й нацыянальны ўздым самасьвядомасьці беларускага народу". Юры Весялкоўскі таксама робіць свой унёсак у Скарыніяну артыкулам „Францішак Скарына — беларускі першадрукар". Праўда й тут ён засьцерагае чытачоў ад дапушчэньня: „Але вуніятам Скарына не мог быць, бо ў той час вуніі як такой не было". Аднак сутнасьцю свайго беларускага першадрукарства, а таксама філасофскай падасновай славутых прадмоў і пасьляслоўяў да праваслаўных выданьняў кніг „Бібліі" Скарына пакінуў геніяльнае прадвесьце наконт (зусім магчыма!) нацыянальнай беларускай рэлігіі, пакінуў як „прадцеча" — усім сваім жыцьцёвым і творчым уласным прыкладам.

Дужа паказальная ў гэтым сэнсе адна мясьціна ў дасьледча-мастацкай кнізе Алега Лойкі „Францыск Скарына або Сонца маладзіковае" (шкада, Юры Весялкоўскі прамінуў такі дужа прыцягальны „прадмет" абгаварэньня й палемікі): „Друкаваная кніга Скарыны, — піша Алег Лойка, — у адначасьсі ўзвышалася над паствай і каталіцкай, і праваслаўнай, над паствай касцёла й царквы — над усім мнагаверствам Вялікага Княства Літоўскага, становячыся як-бы заяўкай на веру асобную — не лютэранскую, не папісцкую, а, можа стацца, літвінскую ці літвіна-рускую, беларускую".

Усталяваньне нашай нацыянальнай ідэі, паводле Юры Весялкоўскага, вылучае дзьве актуальныя задачы: змаганьне за родную мову, а таксама — за сваю Беларускую Праваслаўную Царкву й веру. Падобна, што апошняя ўважаецца за нацыянальную рэлігію. Але такое дапушчэньне павінна мець бясспрэчную перадумову — увядзеньне ў царкоўны ўжытак беларускай мовы, пакуль перад ёй насьцеж расчыняцца праваслаўна-царкоўныя дзьверы, то ёй выпадае найпершая роля ў адраджэньні беларускай ідэі. Зразумела, што й дзверы ўрадавага Дому — ва ўсіх сферах ужытку.

У кнізе прыгадваецца: ужо за Альгердам беларушчына стала мовай урадавай Літвы. Чаму было й не мовіць у гонар: „Ня обчым яким языком, але сваим уласным правы сьписаныя маем" (Леў Сапега, *Статут ВКЛ*, 1588 г.). А шыроказначнае выказваньне Адама Міцкевіча ў Парыжы пра беларускую мову („гэта самая чыстая гаворка, якая ўзьнікла й выдатна распрацавана"). Ці лёсавызначальнае запавяданьне Францішка Багушэвіча — яго немагчыма не паўтараць як малітву й заклінаньне: „Не пакідайце мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі". Яе даўно ўсьмяротнілі-б сваімі жорсткімі забаронамі, патапталі-б і выкінулі-б з ужытку Польшча й Расея, калі-б не захавальніца моўных скарбаў — нашы вёскі ды мястэчкі.

Усё-ж мы былі-б далей ад фатальнасьці, калі-б дараваныя Богам таленты трымаліся роднай глебы. У гэтым сэнсе нават Адам Міцкевіч не пазбыўся закіду з боку аўтара кнігі: аддаць такі, зямлёй нашай народжаны талент на паслужэньне Польшчы! Яшчэ большае незадавальненьне ў аўтара наклікаюць сваёй недастатковай беларускасьцю Тадэвуш Кась-

цюшка, Міхал Клеафас Агінскі й іншыя — яны-ж з беларускага „пня"! Зь іх нельга рабіць „сьвятых для нас", маўляў, яны не змагаліся за наша нацыянальнае вызваленьне, не выступалі за самастойнае разьвіцьцё беларускай культуры, мовы й г.д. Пад іх кіраўніцтвам беларусы не змагаліся за свае інтарэсы, а інтарэсы Польшчы, змагаліся пад „чужымі сьцягамі" — „за сваю згубу". Што на гэта скажаш? Усё складаней у тых сутыкненьнях і пабоішчах на „тэрэне" імперыялістычных захопніцтваў... Нават Адаму Станкевічу, ахвярнаму сьвятару-верніку, сейбіту беларускасьці перападае — як бы дзеля паніжэньня яго высокагоднай асобы. Што гэта — крайнасьці канцэпцыі?..

* * *

У кнізе Юры Весялкоўскага, асабліва ў разьдзеле „Заходнія й усходнія суседзі", атрымала пашырэньне актуальная думка: уладары з экспансіўнай ментальнасьцю часта капаюць дол-магілу для дзяржаўнасьці сваіх-жа краін. Экспансія мілітарная ідзе ў адной запрэжцы з рэлігійнай. Тры акрутныя падзелы Рэчы Паспалітай — вынік такой, на думку аўтара, сьляпой фанатычнай палітыкі польскай магнатэрыі. Рэпрэсіўныя акцыі разам з пагардліва-зьневажальным стаўленьнем да паняволеных суседзяў вялі да ўнутранага няладу й распаду, да самарасхістваньня дзяржаўных асноў. Дзіўна, захоп не дадаваў моцы мацарству, ня множыў сілы, а падкошваў іх бязладзьдзем. Магчыма, львіную долю энергіі, што паступала ў выніку экспансіі, паглынала патрэба „пераварваньня" заглынутага.

Карацей, узьнікла неабходнасьць навядзеньня парадку. Якім чынам? Шляхам акрутнага разрываньня саслабелай краіны больш моцнымі драпежнікамі. Такая думка прамоўлена ў кнізе ўсур'ёз: „За навядзеньне парадку ў Рэчы Паспалітай прыйшлося заплаціць суседзям тэрыторыяй, што давяло да першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе паміж Расеяй, Прусіяй і Аўстрыяй". Які няхітры разьлік: заплаціць тэрыторыяй! Усяго толькі.

Як жа ўзгодніць такія развагі з болем самога аўтара за драпежную ўседазволенасьць падзелу Беларусі паводле Рыжскага пагадненьня, дазволенасьць на агрэсію, захоп, на яе распалавіненасьць па жывому целу? Што — і тут „навядзеньне

парадку" на нашых родных землях? А затым ужо накідваньне на іх фашыстамі розных масьцей „новага парадку ў Эўропе" ці гвалтоўна-падманнага камуністычнага раю?

На гэта пытаньне дасканальна можа адказаць „Слуцкая Абарона" — артыкул, дзе сьвежасьць і дэталёвае разгортваньне фактаў, інфармацыйная насычанасьць міжволі прымушае нас перачытваць і ўглядацца ў падзеі таго гераічнага паўстанчага Слуцкага чыну.

З удзянасьцю ставімся й да няшчаднага, па-грамадзянску мужнага агаленьня ўсемагчымых ганебных спробаў фальшаваньня гісторыі, затойваньня й перакручваньня праўды („За плотам Катыньскага лесу", „Пакт Молатава-Рыбэнтропа"). Артыкулы гэтыя стаяць поруч, зьяднаныя, спаяныя, па сутнасьці, адной крывавай рэчаіснасьцю, з дэспатычным размахам распачатых мільённых трагедый. Хатынь — Катынь... „Мы, беларусы, — запавядае аўтар кнігі, — павінны памятаць аб сваіх ахвярах і іхніх забойцах, зь якога боку яны не ішлі-б, з усходу ці з захаду".

Шматзначнай, унутрана набліжанай сутнасьцю многія артыкулы кнігі сходзяцца як бы ў адным рэчышчы. У нашай уяве, напрыклад, яднаюцца, істотна пашыраючы інфармацыйнае поле, „Галасы аб Грунвальдзкай бітве" й „За цаной не пастаім..." — распрацоўкі на матэрыяле аддаленым у часе, але зьяднаныя духам (невыпадкова кніга мае назву „Дух часу") і невымернай цаной платы, дзьве па-сутнасьці найвялікшыя ў мінулым тысячагодзьдзі бітвы за выжываньне на зямлі, за непадлегласьць, самастойнасьць гаспадараньня на ёй. Сапраўды, які ахоп ахвярнага, змагарнага сьветаўсталяваньня нашай Беларусі ў гістарычным кантэксьце славянскага задзіночаньня! Ды не толькі дзівуюць, а шчымліва даймаюць нас, уражваюць уведзеныя ва ўжытак малавядомыя фактычныя пласты інфармацыйнасьці. Наколькі ўзрастае ў паэтапным бегу й працягу стагодзьдзяў цана перамогі ў імя незалежнага нацыянальнага быцьця й як абясцэньваюцца ў таталітарных сістэмазбудаваньнях кошты асобных чалавечых жыцьцяў! Выклад фактаў глыбока ўваходзіць у наш зьбянтэжаны роздум.

І што яшчэ незвычайна важна для сутнаснай каштоўнасьці й зьмястоўнасьці кнігі Юры Весялкоўскага — дык гэта яе

арганічнае богавыяўленьне хрысьціянскага сьвету. Напісаньне артыкулаў (яны важка ўвайшлі ў разьдзелы „Беларусь хрысьціянская", „Раньняе хрысьціянства") паклікана шчырай душой верніка, прытым верніка апантанага ў бясконцым заглыбленьні ў гісторыю хрысьціянства й праваслаўнае веравучэньне. Іх усталяваньне цягам доўгіх стагодзьдзяў было акроплена ня толькі боскай расой нябёс. А расой крывавай, пад ценем і балючым знакам Галгофскага ўкрыжаваньня („Хрысьціянства ад Галілея да Беларусі"). На цярністым шляху каларытна, праніклівa акрэсьлены пуцяводныя постаці Кірылы й Мяфодзія, Канстанціна Вялікага („Канстанцін Вялікі — першы хрысьціянскі імпэратар" і іншыя). Сваёй грунтоўнасьцю, навуковасьцю гэтыя працы ня толькі ўздымаюць наш адукацыйна-тэалягічны ўзровень, але разам і далучаюць нашы душы да шчырага спавяданьня высокіх ідэалаў, запавяданых Ісусам.

Сяргей Чыгрын

Ад аўтара

Кажучы шчыра, я ня меў намеру выдаць асобнай кніжкай некаторыя свае артыкулы, якія даводзілася мне пісаць будучы рэдактарам часопісаў „Аб'еднаньне", „Званіца" й „Голас Часу" ў Лёндане. А пасьля пісаў некаторыя артыкулы ў беларускія газэты.

Аднойчы, адна асоба прасіла мяне напісаць аб беларусах у Вялікабрытаніі, аб іхняй арганізацыйнай і палітычнай дзейнасьці, бо раней аб беларусах у Вялікабрытаніі нічога не было чуваць. Але тут было столькі непаразуменьняў і часам варожасьці, што іх цяжка было-б памінуць. Таму гэтай прапановай я ня быў зацікаўлены й яе памінуў, каб не парушаць тыя сумныя й кампраметуючыя дзеяньні некаторых беларусаў, якіх няма ўжо ў жывых.

Пад канец 2004 году я закончыў пісаць сваю апошнюю кніжку „Ад Гарбачова да Белавежы (1985-1991)". Пачаць пісаць нешта новае для мяне было ўжо цяжкавата, бо мінула 80 гадоў, паслабеў зрок, ды не было тае сілы, каб хадзіць па бібліятэках і зьбіраць матэрыял. Знайшоўшыся без работы, стала мне нудзіцца, пачаў доўжыцца час і тады я ўспомніў параду другой асобы, каб выдаць свае артыкулы асобнай кніжкай, якія прыходзілася пісаць у беларускай прэсе на працягу больш як паўстагодзьдзя. Быў гэта час, калі на пасьляваенным сьвеце, а таксама й у беларускім жыцьці адбываліся важныя й цікавыя падзеі, а асабліва ў арганізацыйнай дзейнасьці й аб іх многа гаварылася й пісалася.

Аўтар у маладосьці

Пісаў я даволі многа на гістарычныя тэмы, але гэты матэрыял увайшоў пазьней у асобныя кніжкі. Каб выдаць гэтую кніжку заставалася толькі адшукаць артыкулы ў прэсе, што не было для мяне вялікай праблемай.

Даволі многа пісаў я на рэлігійныя тэмы, якія стагодзьдзямі стваралі й ствараюць многа бяды й няшчасьця людзям на сьвеце, аб чым згадвае гісторыя й мы бачым на фактах сёньня. Вядома, што за шырмай рэлігіі праводзіцца палітыка й зь ёю многа злачынных злоўжываньняў, якіх тут не пералічыць. Некаторыя царкоўнікі кажуць, што рэлігія аб'ядноўвае людзей, ратуе іхнія душы. Але ў сапраўднасьці яна іх разьядноўвае на працягу доўгіх стагодзьдзяў і робіць іх непрымірымымі ворагамі й нават забойцамі.

Асабліва такія зьявы наглядаліся й наглядаюцца за нашага жыцьця ў апошняй вайне на Балканах, дзе сьмерцю мучанікаў загінулі сотні тысяч хрысьціянаў, мусульманаў, габрэяў, цыганоў і многа было зьнішчаных іхніх сьвятыняў. У Азіі ў 1947 годзе пачаўся канфлікт паміж індусамі, мусульманамі й сікхі, у часе якога загінула 500 000 мужчын, жанчын і дзяцей. Трупы ляжалі на вуліцах. Індыйскі палітычны й духовы лідэр Махандас Гандзі, каб спыніць злачынствы, пачаў галадоўку. Гандзі, які стараўся рашаць канфлікты мірным шляхам, аднойчы сказаў: „Я ня знаю нікога, хто зрабіў-бы для людзей больш чым Ісус. У хрысьціянстве, бясспрэчна, няма нічога няпраўнага". Аднак дадаў: „Праблема ў іх, што не жывуць згодна са сваім вучэньнем". А раней, у II стагодзьдзі айцец царквы Тартульян пісаў у сваёй „Апалёгіі" аб хрысьціянах, як яны любяць адзін аднаго й гатовы аддаць жыцьцё.

Так гэта было да IV стагодзьдзя, калі Хрысьціянская царква пайшла на супрацоўніцтва зь дзяржавай. Ад таго часу рэлігія не садзейнічае аб'яднаньню людзей, а часта стаіць побач злачыннай дзяржаўнай палітыкі.

У ісламе Магамэта многа чаго ўзятае зь веры юдэяў і хрысьціянаў. Аднак паміж мусульманамі, як і хрысьціянамі, няма згоды. Нават сярод рэлігійных канфэсіяў назіраюцца расколы, а дзейнасьць мусульманаў апошнімі гадамі трымае сьвет у страху.

Такія злачынствы нельга дапускаць, калі рэлігія вучыць маралі, пашаны, узаемнай любові сярод людзей, а яе кіраўнікі й вернікі займаюцца забойствамі ня толькі іншаверцаў, калі хрысьціянін ідзе вайной на хрысьціяніна, а мусульманін — на мусульманіна.

На сьвеце ніколі ня будзе парадку, калі кожная з рэлігіяў будзе сваю веру лічыць лепшай, сапраўднай, а другія веры называць схізмай і праз сваіх платных агентаў будзе старацца падпарадкаваць іх пад сваё кіраўніцтва, ды яшчэ злачыннай дарогай.

Нельга забараніць людзям пісаць і крытыкаваць дзейнасьць некаторых рэлігійных кіраўнікоў. Гэта ня будзе абразай іхняй веры, але будзе дыскусіяй, дэбатай над іхняй дзейнасьцю. Рэлігійнага фанатызму не павінна быць, зь ім трэба змагацца.

Некаторыя свае артыкулы ў часопісах я падпісваў псэўдонімамі не таму, каб хавацца за імі, а толькі таму, каб замнога не выстаўляць сваё прозьвішча ў часопісах, дзе прыходзілася многа пісаць на розныя тэмы. Гэтыя артыкулы, пісаныя пад псэўдонімамі, я замяшчаю тут. Зь іх можна давецацца й аб некаторай дзейнасьці беларусаў у Вялікабрытаніі, што зьяўляецца й часткай нашай эміграцыйнай гісторыі.

Шчырае беларускае дзякуй выказваю спадарству Лене і Колі Сенькам за шчодрую фінансавую дапамогу і духовую падтрымку. Таксама лічу сваім абавязкам выказаць шчырую ўдзячнасьць і пядзяку Віталю Лубу, які многа спрычыніўся да выдачы гэтай кніжкі.

Юры Весялкоўскі

Лёндан, лістапад 2005 г.

Эміграцыйнае жыцьцё

„Казюк" у Італіі

У газэце „Рунь" № 30 быў зьмешчаны цікавы артыкул Марыяна Пецюкевіча пра „Казюка" — сьвята народнага промыслу ў Вільні. Запазнаўшыся са зьместам артыкула, я ўспомніў, што гэтае сьвята ўшанавалі віленчукі ў Італіі ў мястэчку Мадэна 4 сакавіка 1946 году. Ехаць на „Казюка" ў Вільню-Мадэну заклікалі афішы ў радыюсе сотні кілямэтраў. „Казюка" ладзіла Віленская брыгада 5-ай Крэсовай дывізіі ген. Нікадэма Суліка. Арганізатары стараліся надаць Мадэне выгляд Вільні, і таму шмат дзе замест назвы „Мадэна" быў зьмешчаны назоў „Вільня". Тое самае было зроблена й зь некаторымі вуліцамі мястэчка, дзе віднеліся надпісы: Вострабрамская, Міцкевіча, Антокальская, Новая Пагулянка, Пляц Лукіскі (па-польску — Ю. В.). На адной вуліцы зрабілі мініятурную „Вострую Браму", перад якой адбылася багаслужба, што папераджала абрад „Казюка". Каб надаць „Казюку" традыцыйны выгляд, былі арганізаваны кірмаш драўляных гаспадарчых рэчаў, рознага печыва, абаранкаў, сувэніраў, а ў „Бары цёткі Альбіны" італьянскае віно замест Альбіны прадаваў дзядзька. Іграў польскі вайсковы аркестр, а яму наўзмен — італьянскі. Выступалі артысты, праводзіліся розныя гульні, латарэя й ўсё гэта нагадвала жаўнерам-віленчукам „Казюка" ў Вільні. Для мясцовых-жа жыхароў цікава было паглядзець на нешта незвычайнае, але цікавае й забаўнае.

Арганізатарам „Казюка" хадзіла ня толькі ўшанаваць вялікае віленскае сьвята, але й паказаць італьянцам польскія традыцыі, якія, зразумела, нічога супольнага з „Казюком"

ня мелі. Па местачковых вуліцах маршыравалі гуралі, кашубы, палешукі і ўсе яны былі ў сваіх народных строях, а некаторыя польскія жаўнеры мелі на сабе старадаўнюю польскую ўніформу... Хоць палякі надалі „Казюку" ў Мадэне польскі калярыт, аднак гэтае сьвята ня ёсьць традыцыяй выключна польскай, а найбольш беларуска-літоўскай і ўсіх іншых народнасьцяў Віленскага Краю, прадстаўнікі якіх ехалі ў гэты дзень у Вільню ды везьлі з сабою нешта прадаць-купіць, або проста весела прабавіць час.

(„Рунь" № 32, Вільня, 17 чэрвеня 2000 г.)

Першая беларуская арганізацыя ў Вялікабрытаніі й яе духоўныя й палітычныя апекуны

Першая беларуская арганізацыя — Згуртаваньне Беларусаў у Вялікабрытаніі (ЗББВ) паўстала ў Лёндане 18 студзеня 1947 году.

Ініцыятыва заснаваць гэтую арганізацыю нарадзілася ў Італіі пры 5-ай Крэсовай дывізіі й 3-ай Карпацкай дывізіі. Аб дзейнасьці беларусаў-гімназістаў 3-ай Дывізіі я не магу сказаць многа, але знаю, што яны трымаліся разам і там выкладчыкам быў беларус Нікан. Сярод беларусаў гімназістаў 5-ай дывізіі ў Італіі, якая знаходзілася ў горадзе Мадэна, выкладчыкам быў беларус Вінцук Грышкевіч, які пазьней выступаў як В. Жук-Грышкевіч. Па яго ініцыятыве склікаліся тайныя сходкі беларусаў-гімназістаў, на якіх разглядаліся беларускія пытаньні. Было вядома, што вайна скончылася, польская армія будзе разьвязана, а мы, беларусы, не зьбіраемся ехаць дамоў. Таму нашым абавязкам было шукаць беларусаў сярод палякаў, праводзіць зь імі ўсьведамляючыя гутаркі на беларускія тэмы й трымаць зь імі кантакт.

Амаль уся польская армія ў канцы 1946 году была перавезена зь Італіі ў Англію. Тут далей праводзіліся заняткі ў гімназіях і прафэсійных школах і тут, наколькі дазвалялі абставіны, шукаліся новыя беларусы, трымалася сувязь зь імі й вялася падрыхтоўка да скліканьня беларускага зьезду.

Такім парадкам, карыстаючыся праваслаўным сьвятам Вадохрышча, на 18 студзеня 1947 году скліканы быў Першы Арганізацыйны Зьезд Беларусаў у Лёндане, на Падынгтан. Варта згадаць, што на арганізацыйным Зьезьдзе былі выключна жаўнеры. І ў ходзе Зьезду ў залю ўвайшоў многа каму незнаёмы чалавек у цёмным касьцюме з лысай галавой, што многа хто з прысутных зьвярнуў на яго ўвагу. Неўзабаве выявілася, што быў гэта беларус, юрыст, Мікола Буляк з Любчы на Навагрудчыне.

Зьезд праходзіў, я сказаў-бы, не зусім спраўна, а гэта таму, што зьехалася даволі многа беларусаў, каля 130 жаўнераў, якія не былі між сабою добра знаёмыя. Няведама было хто й што сабою прадстаўляе. І тут ініцыятыву трымалі беларусы, якія прыйшлі ў польскую армію ў 1944 годзе, тыя, што не былі вывезены ў Сібір, а былі яны пад нямецкай акупацыяй і зналіся між сабою. Да гэтай групы належалі й гімназісты польскіх гімназіяў, быўшыя кадэты Менскай афіцэрскай школы БКА. Такім парадкам на старшыню Зьезду паклікалі былога лейтэнанта Афіцэрскай школы БКА ў Менску Канстанціна Нора. У ходзе Зьезду на старшыню Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі выбраны быў праф. Вінцук Жук-Грышкевіч.

Адрас арганізацыі знаходзіўся сьпярша пад 218 Сасэкс Гардэн, Падынгтан, у Лёндане, а неўзабаве пры ўкраінскай арганізацыі СУБ пад 49 Ліндэн Гардэн, Нотынгам Гіл Гэйт, таксама ў Лёндане. Знайшоўшы сабе прытулак, арганізацыя ЗБВБ пачала рататарным спосабам выдаваць часопіс „На шляху".

Праф. Жук-Грышкевіч быў выкладчыкам гісторыі ў польскай гімназіі 5-ай дывізіі і, як ужо згадвалася, быў ініцыятарам беларускай арганізацыі ЗБВБ. Быў ён бадай адзіным беларусам з тых шматлікіх вывезеных саветамі ў Сібір, які, апынуўшыся на Захадзе, заняўся арганізацыяй беларусаў. Не знайшоў ён нікога да помачы са свайго старэйшага акружэньня. Праўда, вёў ён перапіску зь беларусам, афіцэрам польскай арміі П. Сычам, якога лісты, пісаныя па-беларуску, зачытваў нам на тайных зборках, але П. Сыч ня быў на арганізацыйным зьезьдзе беларусаў у Лёндане. Многа беларусаў з польскай арміі, якія прайшлі савецкія лягеры, баяліся прызнацца да свае нацыянальнасьці й чуліся часам ня-

свойска, калі нехта гаварыў да іх па-беларуску. Таму першую беларускую арганізацыю ў Лёндане закладалі выключна беларусы з-пад нямецкай акупацыі, якія прыйшлі ў польскае войска пад канец 1944 году. І гэтыя людзі, а перадусім гімназісты, былі спружынай беларускай арганізацыі. У той час гімназія, дзе вучыў В. Грышкевіч, знаходзілася ў бараках каля невялікай вёскі Чысэлдон (сем міль ад Свіндона — гораду ў Вілтшаер).

Дырэкцыя гімназіі даведалася пра Беларускі Зьезд у Лёндане й у гэты самы дзень звольніла Грышкевіча з выкладчыка ў гімназіі, а ў канцы школьнага году разагнала й беларусаў-гімназістаў. Як для каго, але для праф. В. Грышкевіча ўтрата работы ў гімназіі аказалася вялікім псыхічным ударам. Ён пільнаваў, калі я буду ісьці з кантыны й паклікаў да сябе ў барак. Паказаў мне сваё звальнене й прасіў, каб я завёз ад яго ліст у Лёндан да польскага капітана авіяцыі Загурскага, які займаўся палітычнымі справамі. Я ня мог гэтага зрабіць, бо раніцай наступнага дня меў ехаць у свой батальён падпісваць паперы адносна ПКПР (Польскі Корпус Пшыспособеня й Розьмешчэня), зьвязаныя з надыходзячай дэмабілізацыяй з арміі. Тады я зьвярнуўся да Міхася Яськевіча й ён з задаваленьнем вечарам павёз пісьмо Грышкевіча ў Лёндан да капітана Загурскага й раніцай наступнага дня вярнуўся на заняткі ў гімназіі. Ніхто нічога аб гэтым ня знаў.

Той, хто тайна спатыкаўся з праф. В. Грышкевічам, мог заўважыць, што ён быў чалавек вельмі асьцярожны й нават баязьлівы, аднак рабіў сваю беларускую справу. Як відаць, праз дапамогу кап. Загурскага, Грышкевіч нічога ня страціў, а нават скарыстаў. Палякі ўладзілі яго пры сваім вайсковым штабе ў Лёндане. Ім патрэбны быў беларус, бо ў той час яны арганізавалі г.зв. „Мендзыможэ" („Міжмор'е") — арганізацыю дзяржаваў, якія знаходзяцца паміж Балтыйскім і Чорным морамі й папалі пад камуністычную дамінацыю.

Якую работу выконваў старшыня арганізацыі ЗБВБ пры Польскім штабе я ня знаю, бо ў той час ня быў у Лёндане, а яшчэ вучыўся ў гімназіі. Але, як падае яго заступнік Мікола Буляк у часопісе „Аб'еднаньне" (№ 1, 23. 03.1948), Польскі Штаб даваў для ЗБВБ некаторыя матэ-

Аўтар у маладосьці

рыяльныя сродкі ў форме грошай, паперы, канцылярыйных прыладаў. І варта згадаць, што гэтым Польскім Штабам дадзены быў дазвол беларусам, жаўнерам польскай арміі, належаць да свае ЗБВБ. Загад гэты быў зачытаны ў кожнай роце, але ён ня меў вялікага значэньня для сьвядомых беларусаў, бо яны без дазволу палякаў рабілі сваю беларускую справу, а па-другое дні польскай арміі былі палічаны. Аднак такая дзейнасьць беларусаў у польскай арміі палякамі не адабралася.

Актыўныя беларусы вербавалі сваіх знаёмых суродзічаў у беларускую арганізацыю й здавалася, што яна набірае сілы. Але неўзабаве прыехаў з Рыму ў Лёндан айцец Часлаў Сіповіч — вуніят, які раней быў рыма-каталіком. Ён увайшоў у супрацоўніцтва са старшынёю ЗБВБ В. Грышкевічам, які быў каталіком. Яны зьвязаны былі з прэзыдэнтам БНР Міколам Абрамчыкам, які жыў у Парыжы й нанёс візыт у Ватыкан. Яго палякі прывозілі з Парыжа ў Лёндан і ён са сваімі лёнданскімі саюзьнікамі з ЗБВБ вёў перагаворы з Польскім эміграцыйным урадам.

Аб чым яны гутарылі, гэта сакрэт. Толькі ў часе свайго дакладу для беларусаў Лёндану Абрамчык сказаў, што за павет ці два ваяваць з палякамі ня будзем. Інжынер Мікола Абрамчык абвясьціў сябе прэзыдэнтам Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэтую годнасьць ён атрымаў па „тэстамэнту" й пачаў тварыць Раду БНР.

Некаторыя члены Беларускай Цэнтральнай Рады (БЦР), баючыся, што іх заходнія саюзьнікі могуць прыцягнуць да адказнасьці за супрацоўніцтва зь немцамі, пачалі пераходзіць да Абрамчыка ў БНР, спадзяючыся знайсьці ў ёй абарону, бо Абрамчык быў ужо зьвязаны з Ватыканам і польскім эміграцыйным урадам у Лёндане. Аднак большасьць сяброў БЦР не пайшла да Абрамчыка. Людзі гэтыя спынілі сваю дзейнасьць на некаторы час, а замест БЦР стварылі рэпрэзэнтацыю — Беларускі Нацыянальны Камітэт у Рэгенсбургу (Заходняя Нямеччына), які меў свае рэпрэзэнтацыі амаль у кожным лягеры Нямеччыны, дзе знаходзіліся беларускія ўцекачы-эмігранты. Але аб гэтым беларусы Англіі мала што зналі й нічога ня зналі пра БЦР і яе прэзыдэнта Радаслава Астроўскага, які не выступаў публічна.

Неўзабаве айцец Ч. Сіповіч пачаў у Лёндане арганізаваць сваю вуніяцкую царкву. Адзін беларус расказваў: „Прыйшоў да нас у інтэрнат (на Онслёў сквэр, Саўт Кенсінктон, Лёндан) а. Сіповіч і кажа: „Хлопчыкі, памажыце мне залажыць беларускую царкву, бо інакш прыйдзецца мне ўзяць лапату й ісьці з вамі на будову". І некаторыя неабазнаныя беларусы пачалі яму памагаць. Я ў той час быў яшчэ ў войску й аднойчы прыехаў у Лёндан як у нядзелю а. Сіповіч служыў абедню. Я пайшоў на яго абедню й адразу адчуў ня тое, што ў Праваслаўнай царкве. Мне асабліва запамяталіся словы „Езус", замест Ісус і „амэн" замест — амінь.

Але сярод беларусаў былі й старэйшыя людзі, якія чулі пра вунію, зналі вуніятаў і яны выступілі супраць дзейнасьці а. Сіповіча. Сярод беларусаў Лёндану й неўзабаве на правінцыі стварылася замяшаньне.

5 лістапада 1947 году я здэмабілізаваўся з арміі й вечарам прыехаў у Лёндан на стала. Я ня быў добра запазнаны ў сутнасьці справы й таму прыслухоўваўся да адных і другіх групаў. Праф. В. Грышкевіча я знаў як свайго выкладчыка з гімназіі, зь якім разам закладаў ЗБВБ. Я часам заходзіў да яго на кватэру й мы гутарылі аб стварыўшайся сытуацыі ў арганізацыі. Аднойчы ён прасіў мяне, каб я памог а. Сіповічу наладзіць царкоўны хор, за што будзе мне пэўная заплата. Я на гэта не згадзіўся.

Таксама заходзіў я й у другі лягер — апазцыйны, дзе знаў толькі аднаго беларуса зь Нясьвіжскай настаўніцкай сэмінарыі. Тут былі, як кажуць, звычайныя адкрытыя людзі без ніякіх хітрасьцяў і камбінацыяў. Гэтую групу людзей ачольваў юрыст Мікола Буляк. Быў гэта сапраўды здольны, шчыры й працавіты чалавек, да таго вялікі праціўнік вуніятаў.

Пабыўшы сярод адных і другіх і запазнаўшыся зь іхнімі непаразуменьнямі, мае сымпатыі аказаліся па баку групы М. Буляка, які быў заступнікам старшыні ЗБВБ.

Ня ведаю як доўга трывала-б такая няпэўная сытуацыя ў арганізацыі ЗБВБ, каб не даведаліся мы з ангельскай каталіцкай газэты „Католік Гэральд" зь якою мэтай прыехаў у Лёндан а. Ч. Сіповіч і тут ужо не магло быць паразуменьня. У часопісе „Аб'еднаньне" (№ 1, 23.03.1948) чытаем: „Хто такі айцец Сіповіч і чаго ён прыехаў у Лёндан?" Ангель-

ская каталіцкая газэта „Католік Гэральд" ад 16 студзеня 1948 г., № 3227, зрабіла, як кажуць, мядзьвежую ўслугу а. Ч. Сіповічу, зьмяшчаючы яго інтэрв'ю пад загалоўкам: „Папа прыслаў рускага сьвятара сюды наварочваць праваслаўных"†.

Вось пераклад гэтага артыкула:

„Айцец Сіповіч ёсьць у Лёндане з пажаданьня папы, каб навярнуць нейкіх 1 000 рускіх, якія знаходзяцца ў гэтай краіне. Ён патрабуе ангельскіх каталікаў памагчы яму.

The Pope Has Sent A Russian Priest Here To Convert The Orthodox

By a Staff Reporter

Fr. Sipovich is in London at the desire of the Pope to convert some 1,000 Russians now in this country. He wants English Catholics to help him.

Справа з Ч. Сіповічам папала ў гэтае выданьне „Католік Гэральд" у часе касьцельных маленьняў, празь якія ўсе хрысьціяне могуць канчаткова вярнуцца да папы, як да сапраўднага духовага лідэра.

— Я маю толькі двух чалавек у сваім лёнданскім прыходзе — католікаў славянска-бізантыйскага абраду беларускага паходжаньня, — сказаў а. Сіповіч. — Але мая работа ёсьць у сапраўднасьці місіянерская. Я мушу падрыхтаваць грунт для наварачваньня вялікай колькасьці маіх землякоў, якія ёсьць

---

† The Pope Has Sent A Russian Priest Here To Convert The Orthodox

By a Staff Reporter

Fr. Sipovich is in London at the desire of the Pope to convert some 1,000 Russians now in this country. He wants English Catholics to help him.

The story of Fr. C. Sipovich comes most fittingly in this issue of „The Catholic Herald," preceding the Church Unity Octave, in which we are asked to pray that all Christians may turn finally to the Pope as their true spiritual Head.

„I have only two people in my London congregation — Catholics of the Slav Byzantine Rite, of the White Russian race," said Fr. Sipovich. „But my work is essentially missionary: I must prepare the ground for the conversion of the vast majority of my countrymen who are Orthodox, and who are in the Polish Resettlement Corps or among European Voluntary Workers. My own spiritual subjects in this country may number some 100 altogether."

PURE SYNODAL RITE

Romance attaches to Fr. Sipovich's arrival here; he is part of the efficient machinery set up by the late Pope Pius XI to tackle the Russian question, and which the present Pope is developing through the now famous Russicum college in Rome, where priests are trained in what is known as the „pure synodal rite," that is, the manner of worship and ritual as ordered by the Orthodox Synod of Russia.

Priests of his rite (they include some English Jesuits, amons them Frs. Milner and Ryder) strictly avoid anything, savouring of „Latinisation" in rite.

праваслаўныя й знаходзяцца ў Польскім Корпусе Разсяленьня й сярод Эўрапэйскіх Добраахвотных Рабочых. Пад маім духовым уплывам у гэтай краіне можа быць нейкіх 100 асоб.

Чыста сінадальны абрад

Прыбыцьцё а. Сіповіча сюды рамантычнае; ён ёсьць дзеючай машынай, пастаўленай апошнім папам Піем XI дзеля расейскага пытаньня, у якім сучасны папа разьвзвае праз знамяніты Русікум коледж у Рыме, дзе вучаць сьвятароў „чыста духоўнага абраду" ўстаноўленага Праваслаўным Сінодам Расеі. Сьвятары гэтага абраду (да якога належаць некаторыя ангельскія езуіты, сярод іх а.а. Мільнэр і Рыдэр), стараюцца абысьці ўсё тое, што магло-б увесьці „лацінізацыю" ў абрад. З другога боку ўкраінцы, аб якіх многа пісалася ад часу іхняга прыезду ў гэтую краіну, увялі некаторыя практыкі заходняга паходжаньня. „Работа ўкраінскіх сьвятароў тут ёсьць чыста пастырская сярод сваіх людзей", — сказаў а. Сіповіч.

Моцная апазыцыя

Цяжар працы, які стаіць перад гэтым маладым барадатым сьвятаром, каторы стараецца здабыць сымпатыі ан-

---

The Ukrainians, on the other hand, of whom much has already been written since their arrival in this country, have introduced into their rite certain practices of Western origin. „The work of the Ukrainian priests here is purely pastoral among their own people," Fr. Sipovich explained.

A STRONG OPPOSITION

The immensity of the task facing this young bearded priest, who tells me he is anxious to enlist the sympathy of English Catholics, lies in the knowledge that the opposition to his work comprises two able Orthodox Bishops, now in this country and also natives of White Russia, with four or five priests, the chief church of the dissidents being an Anglican building near Earls Court.

Fr. Sipovich celebrates the Catholic Liturgy on some Sundays at the Little Oratory, Brompton Road, at 9.30, and many Orthodox Christians attend.

„I want a chapel in London," he told me, „but my White Russian compatriots, whether Orthodox, Byzantine Catholic, or Latin, are poor. I want English Catholics to help me with their prayers."

He emphatically denied the charges being made by the White Russian Orthodox clergy here, who naturally resent his presence, that he has money „from the Vatican."

He is largely dependent on the charity of Catholics, and resides at the Lithuanian Church, the Oval, Hackney, in the poorest part of London.

Fr. Sipovich is Licentiate in Theology and holds the distinction of being a Doctor in Oriental Church Sciences, obtained after four years' study in the Pontifical Institute of that Faculty. He belongs to the Marian Congregation.

„Catholic Herald," 16.01.1948

гельскіх католікаў, ляжыць у сьвядомасьці, што апазыцыю да ягонай дзейнасьці прадстаўляюць двух здольных праваслаўных епіскапаў у гэтай краіне, якія таксама паходзяць зь Беларусі й маюць чатырох ці пяцёх сьвятароў. Галоўная царква гэтых інавернаў знаходзіцца ў ангельскай сьвятыні на Эрлс Корт.

— Я патрабую капліцу ў Лёндане, — сказаў ён мне, — але мае беларусы-суродзічы, хто яны не былі-б: праваслаўныя, вуніяты або католікі, ёсьць бедныя. Мне патрэбны ангельскія каталікі зь іхнімі малітвамі памагчы мне.

Ён з націскам аспрэчвае абвінавачаньні зробленыя тут праваслаўным духавенствам, якое ёсьць непрыхільнае да ягонай прысутнасьці й што грошы ён мае „з Ватыкану". У аснаўным ён залежыць ад дабрачыннасьці каталікоў Літоўскага касьцёла, які знаходзіцца на Овал, Гакнэй, найбяднейшай частцы Лёндану.

Айцец Сіповіч ёсьць адукаваны ў тэалёгіі, які пасьля чатырох гадоў студыяў у Рыме атрымаў дактарат і знае ўсходнецаркоўныя справы. Належыць ён да Кангрэгацыі Марыянаў".

Такое асьведчаньне а. Ч. Сіповіча ў каталіцкай газэце выклікала абурэньне сярод праваслаўных беларусаў Англіі. Айцец Сіповіч розна апраўдваўся ў прэсе, а яго прыяцелі асуджалі арганізацыю ХАБР і часопіс „Аб'еднаньне" за тое, што апошні асьмеліўся зьмясьціць на сваіх балонках пераклад гэтага інтэрв'ю на беларускую мову. Як прыклад: „У сакавіку г.г. выйшаў у Лёндане часапіс „Аб'еднаньне" як ворган Хрысьціянскага Аб'еднаньня Беларускіх Работнікаў у Вялікай Брытаніі. Не чапаючы палітычных арыентацыяў гэтага часопіса, прыходзіцца з сумам сьцьвердзіць, што самае слова „хрысьціянскі" вельмі не гарманізуе із зьместам некаторых артыкулаў часопіса. Якімі-ж этычнымі законамі й якою маральнасьцю кіраваліся рэдактары часопіса „Аб'еднаньне" зьмяшчаючы артыкул: „Хто такі а. Сіповіч і чаго ён прыехаў у Лёндан?" Ёсьць гэта пераклад з аднае лёнданскае газэты 16-I-48..." („Божым Шляхам" № 5 (8), травень 1948).

Усё-ж прысутнасьць а. Ч. Сіповіча ў Лёндане сярод праваслаўных беларусаў і ягоная дзейнасьць былі добра відавочнымі й зразумелымі.

Сярод беларусаў Вялікабрытаніі наступіў недавер да кіраўніцтва ЗБВБ, якое падтрымоўвае а. Сіповіча зь ягонай вуніяцкай царквой, а старшыня В. Грышкевіч адцягвае Агульны Зьезд сяброў ЗБВБ. Супраціў нарастаў, а зь ім непазьбежны канфлікт. Паўстала ініцыятыўная група, якая на сваім сходзе 15 сакавіка 1948 году пастанавіла заснаваць новую беларускую арганізацыю пад назовам Хрысьціянскае Аб'яднаньне Беларускіх Работнікаў у Вялікабрытаніі (ХАБР) і ў яе Часовую Ўправу на сходзе актыву й яго прыхільнікаў на старшыню прызначана Міколу Буляка, на заступніка старшыні — Барыса Суравага, на сакратара — Юрыя Весялкоўскага, на скарбніка — Паўла Бударкевіча, а на сяброў Управы: К. Нора, С. Серафіновіча, А. Малаху, А. Жданковіча, А. Вараву й І. Завадзкага. Часовая Ўправа пачала выдаваць свой часапіс „Аб'яднаньне", першы нумар якога выйшаў 23 сакавіка 1948 году. У ім і быў зьмешчаны пераклад з ангельскай мовы артыкула: „Хто такі айцец Сіповіч і чаго ён прыехаў у Лёндан?" У гэтым самым нумары „Аб'яднаньня" зьмешчаны быў абшырны „Заклік групы сяброў Галоўнай Управы й Лёнданскага Аддзелу ЗБВБ да сяброў ЗБВБ і ўсіх беларусаў Вялікай Брытаніі", у якім гаварылася:

„Вось сытуацыя, у якой апынулася беларускае грамадзтва на эміграцыі й пададзеныя праз нас яе прычыны. Прыйшла ўжо пара скончыць з гэтым і прыступіць да звычайнай працы, да якой заклікаюць нас нашыя найбольш ведамыя змагары за беларускую справу й дзесяткі тысячаў беларусаў, патрабуючых на шматлікіх сходах і зьездах утварэньня Беларускага Цэнтральнага Прадстаўніцтва на эміграцыі на аснове агульных дэмакратычных выбараў. (...)

Усе другія арганізацыі ці ўстановы, якія імкнуцца, каб рэпрэзэнтаваць усё беларускае грамадзтва на эміграцыі, уважаць за бяспраўнае.

У сувязі з гэтым заклікаем усіх беларусаў у Вялікай Брытаніі дакладна прадумаць усе гэтыя справы й заняць сваё становішча.

Заст. Старшыні ЗБВБ М. Буляк

Сябры Гал. Управы С. Серафіновіч, К. Нор.

За Лёнданскі Аддзел ЗВВБ Старшыня А. Малаха, сакратар А. Варава".

Крыху больш як месяц часу пасьля заснаваньня арганізацыі ХАБР атрыманы быў ліст ад праф. Р. Астроўскага за датай 22 красавіка 1948 году, у якім ён пісаў:

„Я зусім добра разьбіраюся ня толькі ў тых грамадзка-палітычных плынях, якія пакутуюць на Лёнданскім грунце, але добра знаю й людзей, якія тыя плыні стварылі. Нам, зразумела, нельга ісьці за імі ды хавацца за нерэальныя і сьмешныя канцэпцыі, бо-ж гэта не нашая асабістая справа, а грамадзкая, агульнанародная. (...) У чэснай працы, бязупынным змаганьні ды нязломным імкненьні да асягненьня ідэалу — наша сіла і... перамога! Жадаю Вам посьпехаў у Вашай грамадзкай працы й асабістага шчасьця кожнаму (-ай) з Вас".

Было гэта пісьмо даволі доўгае, якое падняло на духу сяброў арганізацыі. Яно азначала, што ХАБР ня ёсьць арганізацыяй ізаляванай, а ўваходзіць у шырэйшыя палітычныя зносіны зь беларускай эміграцыяй у Нямеччыне. Калі мінула небясьпека з боку аліянтаў, Беларуская Цэнтральная Рада склікала свой Пленум у Эльвангене, на якім выбрала выканаўчы орган БЦР і Прэзыдыюм Пленума. Адгэтуль і пачалася адкрытая барацьба двух беларускіх прэзыдэнтаў — Радаслава Астроўскага й Міколы Абрамчыка, якая паглыбіла раскол сярод беларусаў ня толькі Англіі, але ўсяе беларускае эміграцыі.

Хоць Згуртаваньне Беларусаў у Вялікабрытаніі было арганізацыяй апалітычнай, але немагчыма было абысьціся ў ёй без палітыкі й рэлігіі. І на гэтым фоне ўзьнікалі найбольшыя непаразуменьні, канфлікты.

Нарэшце, пасьля доўгага чаканьня, 2 траўня 1948 году адбыўся Другі Агульны Зьезд сяброў ЗБВБ, які меў адбыцца 18 студзеня 1948 году. На ім прысутнічалі й сябры часовай арганізацыі Хрысьціянскага Аб'яднаньня Беларускіх Работнікаў (ХАБР), якія былі сябрамі гэтай арганізацыі. Яны спадзяваліся, што ім удасца пазбыцца ў ЗБВБ падасланых Ватыканам людзей, якія зьвязаліся яшчэ з палякамі. Зьезд вёў В. Грышкевіч. Ён са сваімі прыхільнікамі быў рашуча настаўлены ўтрымаць арганізацыю ў сваіх руках і таму не хацеў прыняць Рэзалюцыі, прадстаўленай апазыцыяй. На Зьезьдзе не заносілася на кампраміс. Меркаваньне большасьці сяброў было выразна падзеленае, а менавіта каму мае

падпарадкавацца беларуская арганізацыя ў Вялікабрытаніі: прэзыдэнту М. Абрамчыку, які зьвязаўся з Ватыканам і палякамі, ці Р. Астроўскаму? Згоды не было відаць і таму, замест весьці калатню, большасьць сяброў арганізацыі ХАБР пакінула залю Зьезду.

Прычыны расколу ЗБВБ згадваюцца ў Рэзалюцыі сяброў ХАБР:

„Рэзалюцыя групы сяброў-удзельнікаў Другога Звычайнага Агульнага Зьезду ЗБВБ у Лёндане, скліканага на сёньня, г.зн. дня 2 траўня 1948 году. Мы, ніжэйпадпісаныя сябры-ўдзельнікі Другога Звычайнага Агульнага Зьезду Згуртаваньня Беларусаў у Вял. Брытаніі, дакладна азнаёміўшыся з усімі падрыхтоўнымі матэрыяламі, як камунікатамі, паведамленьнямі, рэгулямінамі, павесткамі дня, апрацаванымі часткай сяброў былое Гал. Управы ЗБВБ, сп.сп. В. Грышкевічам, В. Сянкевічам, М. Арцюхом і Ч. Кукелем — мусім сьцьвердзіць наступнае:

1. З віны ўпамянутых сяброў Гал. Управы ЗБВБ Агульны Зьезд ЗБВБ скліканы на тры з паловай месяцы пазьней чым належыцца згодна Статуту ЗБВБ, што зьяўляецца нарушэньнем пункту 8-га гэтага Статуту, дзе сказана, што „звычайны Зьезд склікаецца раз на год".

2. Зьезд скліканы гэтымі-ж сябрамі неправідлова, упамянуты § 8 Статуту гаворыць, што „найвышэйшаю ўладаю ЗБВБ ёсьць Агульны Зьезд сяброў", а не г.зв. „упаўнаважаных", якім быццам мае прыслугоўваць права галасаваньня за іншых канкрэтных сяброў на аснове іх пісьмовага даручэньня. Падобная сыстэма сяньня нідзе не спатыкаецца, недэмакратычная й нічога супольнага ня мае з пасярэднімі выбарамі пры помачы дэлегатаў.

3. Гэтая-ж група сяброў Гал. Управы няпраўна „завесіла" іншых трох сяброў гэтай-жа Управы, „выключыла" старшыню й сакратара Лёнданскага Аддзелу, толькі дзеля таго, каб не дапусьціць іх да голасу на Агульным Зьезьдзе.

4. Яны-ж няслушна выключылі іншых сяброў ЗБВБ, як напр. сп. Б. Суравага, кіраўніка Арганізацыйнай Сэкцыі й тэхнічнага сакратара за няўплату сяброўскіх складак у той час, калі гэтыя сябры ўплацілі ўсе сяброўскія складкі за 1947 год, г.зн. за час кадэнцыі Гал. Управы, злажылі гра-

шовыя ахвяры на Беларускі Дом, Прэсавы Фонд і іншае ў суме некалькіх фунтаў; гэтыя-ж сябры ўлажылі нямала працы ў разьвіцьцё нашай арганізацыі. Дастаткова ўзяць за прыклад сяброў Лёнданскага Аддзелу, якія зь вялікім накладам часу, асабістых выдаткаў на даезды й здароўе, цэлымі начамі адбівалі часопіс „На шляху" ці „Беларус на чужыне". Яны навогул сьлепа выконвалі ўсё, што ім загадвалі сп. В. Грышкевіч, або а. Ч. Сіповіч, нясучы на сабе ўвесь цяжар чорнай няўдзячнай працы. Цяпер гэтым-жа сябрам адабрана права голасу сярод зьехаўшыхся сваіх братоў, або зусім „выключана" іх зь беларускай сям'і.

5. Гэтая-ж група сяброў Гал.Управы апрацавала рэгулямін не як праект, а як закон, які мае забавязваць нават Агульны Зьезд — найвншэйшую ўладу ЗБВБ. У рэгуляміне гэтым уведзена між іншым абмежаваньнямі розныя праклямацыйныя тэрміны, каб зьвязаць ініцыятыву й волю ўдзелнікаў Зьезду, а сам Зьезд ператварыць у нямы й паслушны іх волі інструмент, патрэбны толькі да пацьверджаньня ўжо даўно зробленых імі пастаноў і для вонкавай прапаганды.

Як-жа, напрыклад, могуць сябры, расьцярушаныя па ўсёй Вялікай Брытаніі, згодна § 13 іх рэгуляміну сабрацца й дагаварыцца, каб за 10 дзён да тэрміну Зьезду ўнесьці такую ці іншую прапанову ў павестку дня Зьезду. Рабіць гэта ёсьць толькі магчымасьць цяпер, калі яны разам зьехаліся, спаткаліся й абмяняліся між сабою думкамі.

Бяручы пад увагу вышэйсказанае й склаўшуюся сытуацыю, зьехаўшыеся сябры ЗБВБ у Лёндане павінны былі самі ўзяць ініцыятыву ў свае рукі й правесьці неабходныя мерапрыемствы, каб надаць Агульнаму Зьезду характар правідловасьці й важнасьці.

Мерапрыемствамі гэтымі, якія мы прапануем, зьяўляюцца:

1. Пасьля адкрыцьця Зьезду павінна быць выбрана Мандатная Камісія ў складзе 3-6 чалавек у залежнасьці ад колькасьці ўдзельнікаў Зьезду. Мандатная Камісія выбіраецца звычайнай большасьцю галасоў, галасуючы ад вірытым (г.зн. кожны ўдзельнік-сябра Зьезду мае адзін голас і галасуе за сябе).

Права чыннага ўдзелу (права голасу) прыслугоўвае ўсім прысутным сябрам ЗБВБ, якія фігуравалі на сьпіску сяброў

ЗБВБ у часе кадэнцыі й б. Гал. Управы, г.зн. да дня 18 студзеня 1948 г. або ўступілі пазьней і залягаюць не больш як за 6 месяцаў з сяброўскімі складкамі да канца кадэнцыйнага году Гал. Упр. (г.зн. да 18 студзеня 1948 г.), хіба што выступілі з ЗБВБ на ўласную просьбу. Права голасу прыслутоўвае й тым сябрам, якія залягаюць больш за 6 месяцаў, але згодзяцца заплаціць усе залегласьці новавыбранай Зьездам Галоўнай Управе.

Мандатная Камісія, выбраўшы між сабой старшыню й сакратара, павінна неадкладна прыступіць да ўстанаўленьня правамоцнасьці (важнасьці) Агульнага Зьезду.

2. Зьезд лічыцца правамоцным (важным), калі сабярэцца патрэбны кворум, г.зн. найменш адна трэцяя ўсіх сяброў упраўленых да чыннага ўдзелу ў Зьезьдзе згодна пункту першага.

3. Пры адсутнасьці кворуму ўся ўлада ЗБВБ павінна перайсьці ў рукі Мандатнай Камісіі, якая павінна на працягу не больш як аднаго месяца склікаць Агульны Зьезд ЗБВБ ад вірытым, які адбудзецца незалежна ад колькасьці прыехаўшых сяброў.

4. Пры наяўнасьці кворуму Агульны Зьезд павінен неадкладна прыступіць да самаарганізацыі г.зн. прыняцьця Рэгуляміну. Рэгулямін прыймаецца звычайнай большасьцю галасоў усіх сяброў-удзельнікаў, маючых права чыннага ўдзелу ў Зьезьдзе (згодна пугкту 1 і 2) і галасуючых ад вірытым.

Толькі пры выпаўненьні гэтых варункаў, міма неправідловага скліканьня, Другі Звычайны Агульны Зьезд можа стацца правідловым і правамоцным (важным).

Дзеля гэтага кожнаму сябру-ўдзельніку Зьезду павінна быць ясная й зразумелая нашая прапанова, якую мы падаём у форме рэзалюцыі.

Калі-ж аднак знойдуцца сябры, якія захочуць, без папярэдняга прыняцьця Рэгуляміну, праводзіць Зьезд паводле Рэгуляміну не запрапанаванага, а накінутага сп.сп. В. Грышкевічам, В. Сянкевічам, Ч. Кукелем і М. Арцюхом — мы, сябры-ўдзельнікі Другога Агульнага Зьезду ЗБВБ, змушаны будзем прызнаць:

1. Зьезд за неправідловы й няважны;

2. сьвядома злую волю тых, якія пагаджаюцца з гэтым і будуць браць удзел у падобнай пародыі арганізацыйна-грамадзкага жыцьця;

3. пакінуць залю паседжаньняў Зьезду;

4. у кансэквэнцыі выступіць із ЗБВБ як арганізацыі недэмакратычнай і монапартыйнай.

Думаем, што ўсьлед за намі пойдуць усе іншыя сябры, якія паважна думаюць аб беларускай справе й хочуць служыць свайму народу як яго верныя сыны".

Далей падаецца ліста 48 прозьвішчаў беларусаў, якія выступілі з арганізацыі ЗБВБ і перайшлі ў ХАБР.

26 сьнежня 1948 году ў Лёндане адбыўся Першы Агульны Зьезд сяброў Хрысьціянскага Аб'яднаньня Беларускіх Работнікаў у Вялікабрытаніі. Быў гэта мнагалюдны зьезд. У яго Галоўную Ўправу ўвайшлі пераважна сябры з Часовай Управы ХАБР, якія былі вядомыя на Бацькаўшчыне й тут на эміграцыі праявілі сваю нацыянальную дзейнасьць. З правінцыі ў Галоўную Ўправу ўвайшоў адзін толькі А. Гатковіч.

Паміж дзьвюма арганізацыямі вялася й часам вострая палеміка, якая разгаралася асабліва ў часе раскладу ЗБВБ. ЗБВБ выдавала сьпярша часопіс „На шляху", а пасьля „Беларус на чужыне". ХАБР праз увесь час свае дзейнасьці выдавала часопіс „Аб'яднаньне", якіх выйшла больш за сто нумароў. Пры арганізацыі ХАБР заснаваны быў мужчынскі хор, арганізацыя аказвала матэрыяльную дапамогу суродзічам у лягерох Нямеччыны, ушаноўвала свае сьвяты— нацыянальныя, рэлігійныя й т.п. Заўчасны ўпадак арганізацыі ХАБР, які пачаўся ў 1962 годзе, спачывае на яе высокім аўтарытэце, але гэта ўжо другая справа.

З распадам арганізацыі ХАБР некаторыя яе сябры пачалі вяртацца назад у ЗБВБ і неўзабаве ачолілі яе Галоўную Ўправу. У гэтым ужо часе (1960 г.) а. Ч. Сіповіч атрымаў сан біскупа, а яшчэ раней прыдбаў адзін, а пасьля яшчэ тры дамы. Неўзабаве ў Лёндан прыехала больш беларускіх каталіцкіх ксяндзоў. У гэтых дамох пачало канцэнтравацца беларускае нацыянальнае жыцьцё арганізацыі ЗБВБ пад апекай ксяндзоў, якое сьпярша канцэнтравалася ў Беларускім Доме на 52 Пэн Роўд у Лёндане.

Замест таго, каб айцы-вуніяты, як духоўныя людзі, заняліся апекай старых, хворых і адзінокіх беларусаў, яны заняліся палітыкай. У сваіх дамох зрабілі цэнтр беларускага нацыянальнага жыцьця, а Беларускі Дом пакінулі для старых адзінокіх беларусаў-пэнсіянераў і лякатараў.

У адным з вуніяцкіх дамоў зрабілі Беларускую Бібліятэку, у другім — залю на сходкі, у трэцім — сталовую з кухняй, а ў чацьвёртым доме ў адным пакоі — капліцу, якую А. Мальдзіс у „Голасе Радзімы" апісаў як беларускую царкву, а чатыры дамы назваў „беларускай вёскай", хоць у гэтых дамох ніхто зь беларусаў не жыве за выняткам двух беларускіх вуніятаў — а. Надсона й а. Маскаліка ды лякатары англічане. У гэтых дамох затрымоўваюцца некаторыя прыезджыя ў Лёндан беларусы.

Так вуніяты, пры дапамозе сваіх памагатых, падабралі ў свае рукі арганізацыю ЗБВБ. Ладзяць яны так званыя „беларускія лекцыі", на якіх робяць даклады, пераважна каталікі-англічане й часам палякі. І што можна пачуць на тых лекцыях аб Беларусі, асабліва ад палякаў, якія лічаць Заходнюю Беларусь сваімі „крэсамі ўсходнімі"?

Пасьля такіх лекцыяў, якія часам уводзяць у блуд неабазнаных з гісторыяй людзей, усе ідуць на цёплы абед, дзе можна й выпіць кілішак віна. А хто й дзеля чаго купіў гэтыя дамы (беларускую вёску) і за чые грошы, і дзеля чаго даў іх да карыстаньня вуніятам, ніхто не цікавіцца. Таксама ніхто не цікавіцца хто пакрывае кошты за гэтыя абеды й піцьцё. Магчыма, некаторыя людзі й прыходзяць, каб нешта зьесьці й выпіць.

Чаму а. Надсон, які часта езьдзіць у Ватыкан, не скажа папу, каб гэтыя грошы, якія ён выдае на вуніяцкую акцыю сярод праваслаўных беларусаў, перадаць на адбудову сапраўднай Беларускай Каталіцкай Царквы на Беларусі? Чаму папа не назначыць біскупам беларуса, а назначыў біскупамі ярых палякаў (Кандрусевіч і Сьвёнтэк) ды выслаў з Польшчы на Беларусь чараду ксяндзоў-палякаў? Гэтыя слугі свайго польскага папы ўжо ўсьпелі ўзгадаваць і настроіць беларусаў-каталікаў так, што яны пачалі адкрыта гаварыць, што Заходняя Беларусь была „крэсамі Польшчы" й такой павінна быць, а беларусы хай выматваюцца за Смаленск.

Чаму а. Аляксандар Надсон, якога некаторыя беларусы й чужынцы лічаць вялікім беларускім патрыётам, не ідзе са сваёй вуніяй да беларусаў-каталікаў, якіх польскія ксяндзы парабілі палякамі й ня верне іх назад да свае вуніі й беларускасьці, а шнырыць сярод праваслаўных, уводзячы толькі непаразуменьні.

Было гэта даволі даўно, як не мыляюся, калі Рымская Кангрэгацыя Ўсходніх Цэркваў узнагародзіла айца А. Надсона тытулам мітрафорнага пратаярэя. Наданьне такога сану зьдзейсьніў біскуп Ч. Сіповіч у часе літургіі 6 жніўня 1978 году. Тады ў сваім казаньні біскуп Ч. Сіповіч сказаў: „У нас, не так як у вас (г.зн. праваслаўных), мы робім так, як нам кажуць". І гэта праўда. І айцец, а цяпер мітрафорны пратаярэй, рабіў і будзе рабіць так, як яму загадае Ватыкан, часам нават супраць свайго гонару й хрысьціянскай этыкі.

Шмат няпраўды гаворыцца, пішацца й распаўсюджваецца аб гэтай „беларускай вёсцы" й „беларускай царкве" на Фіншлей у Лёндане. Напрыклад, газэта „Таймс Гроў Ньюспэйпэр" за 5 кастрычніка 1989 году піша, што „а. Аляксандар Надсон, духовы лідэр тысячнай каталіцкай грамады ў Вялікабрытаніі". Ці-ж гэта праўда? Як доўга я жыву тут, яшчэ ня чуў, каб нехта зь беларусаў у Англіі сказаў, што ён вуніят і належыць да царквы а. Надсона. Яго падтрымоўваюць больш чужынцы, а сярод іх Вера Рыч, Гай Пікарда й Джэймс Дынглі, якія даволі часта езьдзяць на Беларусь і пашыраюць там вуніяцкую прапаганду. Гэтыя людзі добра знаюць, што сярод беларусаў Англіі вуніятаў няма, а яны аднак падтрымоўваюць вуніяцкую работу. Ці-ж такую дзейнасьць нашых прыяцеляў англічан можна назваць карыснай для беларускай нацыянальнай справы? Ёсьць праўдай, што некаторыя беларусы, па-знаёмству, або па-сяброўству зойдуць часам у капліцу а. Надсона, але іх можна палічыць на пальцах. Таму паўстае пытаньне: дзеля якой мэты нашы прыяцелі англічане памагаюць а. А. Надсону адрадзіць вунію на Беларусі? Пажадана было-б, каб яны самі адказалі на гэтае пытаньне.

І так, як некалі а. Ч. Сіповіч памог разьбіць еднасьць сярод беларусаў Вялікабрытаніі сваёю „беларускаю царквою", дык сёньня а. А. Надсон разьбівае еднасьць беларусаў на

Бацькаўшчыне праз сваю „нацыянальную царкву". Як першы, так і другі, былі й ёсьць платныя работнікі Ватыкану.

Успомнім некаторыя моманты зь біяграфіі біскупа Часлава Сіповіча ўзятыя з часопіса „Беларашын Стады" (№ 1, за 1981 год), пададзеныя а. А. Надсонам.

Часлаў Сіповіч нарадзіўся 8 сьнежня1914 г. у каталіцкай сям'і. У 1928 г. паступіў у школу да Айцоў Марыянаў у Друі. У 1934 годзе прыняў манаскі сан. Тут-жа ў Друі перайшоў на вуніяцтва, каб „загаіць старыя раны й запоўніць прорву паміж каталікамі й праваслаўнымі" — так піша а. Надсон. З гэтай мэтай паехаў ён у Рым вучыцца. У 1940 годзе быў высьвячаны на сьвятара, а ў 1942 годзе закончыў студыя. 19 сьнежня 1946 году зрабіў дактарат.

Будучы ў Італіі а. Сіповічу надарылася нагода спаткаць беларусаў у польскай арміі, а таксама некаторых уцекачоў, якім памагаў адшукаць сваякоў і знаёмых. „Вестка аб прысутнасьці маладога беларускага сьвятара ў Рыме, — піша а. А. Надсон, — хутка разышлася".

Але як гэтае знаёмства беларусаў з а. Сіповічам пачалося, аб гэтым а. Надсон ня кажа, а варта сказаць. Усё пачалося ў 1946 годзе, калі ў Парыжы пачала выходзіць беларуская газэта „Беларускія Навіны". Гэтую газэту выдаўцы прысылалі ў Рым, а з Рыму а. Сіповіч пашыраў яе сярод беларусаў-жаўнераў. Была гэта чыста вуніяцкая газэта, якую напэўна фінансаваў Ватыкан, бо ў 1946 годзе беларуская эміграцыя сядзела ў лягерох, а жаўнеры польскай арміі не былі багатымі, каб маглі фінансаваць газэту, ды яшчэ вуніяцкую, калі сярод беларусаў не было вуніятаў, а калі былі, то гэта лічаныя адзінкі.

Праз такое вось знаёмства зь беларусамі ў польскай арміі 9 красавіка 1947 году а. Сіповіч прыехаў за імі ў Англію й пачаў дзейнасьць, аб якой згадвалася раней.

Далей а. Надсон піша, што а. Ч. Сіповіч прыехаў у Англію, уступіў у Згуртаваньне Беларусаў Вялікабрытаніі й выконваў шэраг важных роляў у жыцьці арганізацыі.

Трэба прызнаць, што сьвятар (пазьней біскуп) Ч. Сіповіч быў хітры й разважны чалавек, умеў падысьці да людзей і ніколі не ўзвышаў сябе. Ня меў ён пыхі й таму знаходзіў прыязныя адносіны сярод некаторых праваслаў-

ных беларусаў, але быў ён тыповы езуіт, заданьнем якога было навярнуць праваслаўных беларусаў на вунію й гэта ён рабіў усімі магчымымі й даступнымі сродкамі. Аднак работа яго на эміграцыі не дала жаданых вынікаў. Памёр біскуп Ч. Сіповіч раптоўна 4 кастрычніка 1981 г. У газэце „Свабода" (№ 1, красавік 1990 год) а. Надсон піша: „Я меў шчасьце сустрэцца зь незвычайным чалавекам, айцом (пасьля біскупам) Часлявам Сіповічам, вялікім сьвятаром і палымяным беларускім патрыётам. Пад яго ўплывам у мяне нарадзілася жаданьне пасьвяціць жыцьцё на службу Богу сярод свайго народу".

Такое шчасьце сустрэцца з айцом Часлявам Сіповічам мела вельмі многа беларусаў і толькі двух згадзілася стаць пярэкрутамі, каб „пасьвяціць жыцьцё на службу Богу сярод свайго народу". Неўзабаве адзін з гэтых службістаў, сябра а. Надсона, зьняў сутану й адмовіўся ад каталіцкай веры, застаўся а. Надсон. А чаму? Відаць матэрыяльныя карысьці й выгады пераканалі яго застацца ў „праўдзівай веры". Некаторыя людзі кажуць — Бог адзін і адно Евангельле. І гэта праўда. То навошта тады мяняць веру, калі можна свабодна прапаведаваць Слова Божае на роднай мове й у той веры, у якой яго ахрысьцілі. І так большасьць хрысьціян робіць, а людзі, якіх вабяць выгады й матэрыяльнае забясьпечаньне, прадаюць сваю веру.

Зьмяніць веру, гэта яшчэ не вялікае злачынства. Многа хто гэта рабіў і робіць. І ўсё добра датуль, пакуль пярэхрыст ціха задавальняецца сваёй новай верай і не мяшаецца ў рэлігійныя справы таго веравызнаньня, якое ён здрадзіў.

Усё-ж, хоць позна, але некаторыя беларусы Англіі пераканаліся, якую „беларускую работу" праводзіў біскуп Часлаў Сіповіч і ягоны падручны а. А. Надсон пры дапамозе старшыні ЗБВБ Я. Міхалюка, былога сябры ХАБР. Апошнімі гадамі некаторыя беларусы пачалі сумнявацца ў дзейнасьці кіраўніцтва Галоўнай Управы ЗБВБ, ці яна сапраўды служыць беларускай нацыянальнай справе, ці выконвае паручэньні Ватыкану? І каб ня мець на сваім сумленьні адказнасьці перад гісторыяй, некаторыя яе сябры пачалі адмаўляцца ўваходзіць у Галоўную Ўправу. За апошнія тры гады адмовіліся быць сябрамі Галоўнай Управы ЗБВБ тры

асобы, якія некалі былі сябрамі ХАБР. На іх месца, на апошнім гадавым Зьезьдзе, які адбыўся 30 мая 1992 году, увайшлі тры новыя асобы, якія прыехалі ў Англію значна пазьней. Адна зь іх зь Беласточныны, а дзьве зь Беларусі. Такім парадкам у жылы кіраўніцтва ЗБВБ улілася новая кроў. Застаецца чакаць, ці гэтая новая кроў адродзіць арганізацыю, ці яе пераможа старая кроў?

Хоць арганізацыя ЗБВБ мае свой Беларускі Дом у Лёндане, але свае гадавыя зьезды й нацыянальныя сьвяткаваньні праводзіць у памешканьні вуніяцкай місіі. Значыць, ЗБВБ карыстаецца ласкай вуніятаў і за ласку трэба аддзячыць ласкай. Недалёкая будучыня пакажа, па якой дарозе пойдзе Згуртаваньне Беларусаў Вялікабрытаніі.

Так гэта ў скароце выглядала дзейнасьць першай беларускай арганізацыі ў Вялікабрытаніі. Былі, што праўда, і другія беларускія арганізацыі акрамя ЗБВБ і ХАБР. На ўвагу заслугоўваюць Беларускі ВызвольныРух і Беларускі Вызвольны Фронт. Гэта таксама частка бурлівай гісторыі беларусаў Англіі й яна патрабуе свайго дасьледчыка. Гэтыя дзьве палітыныя арганізацыі выступалі на міжнароднай арэне ў абароне паняволенай камунізмам Беларусі і нічога супольнага ня мелі з агентамі Ватыкану.

(„Голас Часу" № 20 (5) і 21 (6), Лёндан 1992 г.).

Яшчэ адзін забыты юбілей

У газэце „Беларус" (№ 451, люты 1998) К. Акула ў артыкуле „Юбілей Згуртаваньня Беларусаў Канады" цытуе часопіс „Зважай" (№ 3 (63), верасень 1991): „У 1946 г. у Вялікай Брытаніі паўстала першая арганізацыя самапомачы — Згуртаваньне Беларусаў Вялікай Брытаніі (на гэта раней быў атрыманы дазвол ад штаба польскіх збройных сілаў, што былі пад брытанскай камандай і дзе было нас, беларусаў, звыш 30 тысячаў — К. А.)".

Фактычна беларуская арганізацыя паўстала не ў 1946 годзе, а 18 студзеня 1947 году на сваім Першым зьезьдзе, які быў скліканы на праваслаўнае Вадохрышча, калі праваслаўныя беларусы мелі нагоду прыехаць у Лёндан на багаслужбу.

Хачу заўважыць, што аснова ЗБВБ была закладзеная не ў Вялікабрытаніі, а ў Італіі (у горадзе Мадэна) у польскай гімназіі, якая пачала сваю дзейнасьць у лістападзе 1945 году. Выкладчыкам гісторыі быў там беларус — праф. Вінцук Грышкевіч. Там-жа вучылася некалькі беларусаў, якія ў вайну займаліся на Бацькаўшчыне ў беларускіх настаўніцкіх сэмінарыях або іншых сярэдніх школах.

Запазнаўшыся з праф. Грышкевічам, яны час ад часу спатыкаліся зь ім за горадам або ў адной італьянскай хаце. Грышкевіч цікавіўся падзеямі на Беларусі пад нямецкай акупацыяй і беларускай дзейнасьцю. На гэтых спатканьнях мы абгаворвалі недалёкую будучыню, як сваю, так і тых беларусаў, якія былі ў польскай арміі ген. Андэрса.

Лёс Беларусі быў нам добра вядомы. Мы разумелі, што польская армія будзе распушчана, шмат хто зь беларусаў дамоў не паедзе, і таму, пакуль былі мы яшчэ разам, нам трэба было нешта рабіць.

Тады-ж было пастаноўлена: 1) шукаць жаўнераў-беларусаў; 2) вясьці зь імі ўсьведамляючыя гутаркі й 3) трымаць кантакт. Была гэта цікавая работа, і тут я заўважыў два гатункі беларусаў. Адны — што былі вывезеныя саветамі ў Сібір, і другія — што трапілі ў польскую армію з-пад нямецкай акупацыі. Першыя аказаліся часткова апалячаныя, беларуская справа цікавіла іх мала, а другія без ніякай прапаганды й намовы ахвотна выказвалі сваю гатоўнасьць уступіць у беларускую арганізацыю.

Тут варта згадаць, што ў польскай арміі была й другая гімназія — у 3-й Карпацкай дывізіі, там-жа была група беларусаў-гімназістаў, якія таксама прыйшлі ў польскае войска з-пад нямецкай акупацыі й былі нашымі сябрамі. Пасьля пераезду польскай арміі з Італіі ў Англію ў другой палове 1946 году была наладжана сувязь паміж беларусамі гэтых дзьвюх польскіх гімназіяў.

Час не чакаў, і таму, пры адпаведнай нагодзе, на Вадохрышча, быў скліканы ў Лёндане I Зьезд Беларусаў, на якім і была заложана першая беларуская арганізацыя ў Вялікабрытаніі — ЗБВБ. Як і трэба было спадзявацца, на старшыню арганізацыі абралі яе ініцыятара прафесара В. Грышкевіча.

Вярнуўшыся са зьезду ў Чыслдан (дзе знаходзілася гімназія) недалёка гораду Свіндан, Грышкевіч атрымаў пісьмо, у якім дырэкцыя гімназіі паведамляла, што ён звальняецца з працы й адсылаецца ў свой аддзел.

Нашая групка гімназістаў засталася вучыцца да канца навучальнага году, але пасьля й яе разагналі. Справа беларусаў польскай гімназіі ў 5-й дывізіі дайшла да ведама генэрала гэтай дывізіі Нікадэма Суліка, які прыехаў ў Чыслдан, але тут ужо беларусаў не было — іх адаслалі па сваіх аддзелах. Недалёка знаходзіўся толькі Павал Навара, да яго й паехаў Н. Сулік. Пасьля гутаркі Сулік паабяцаў Навару, што беларусы змогуць вучыцца далей і сказаў, каб П. Навара паведаміў сваім сябрам: няхай складаюць заяўкі ў ліцэй. Застаецца незразумелым, чаму гэтай справай не занялася дырэкцыя гімназіі.

Калі ў 1972 годзе арганізацыя ЗБВБ сьвяткавала свой 25-гадовы юбілей, з Канады прыехаў яе заснавальнік В. Жук-Грышкевіч. У сваёй прамове ён адзначыў як цяжка было яму дамовіцца зь беларусамі, якія, як і ён, былі вывезены ў Сібір — каб сарганізаваць беларускае згуртаваньне. Аднак калі ён спаткаў маладых хлопцаў з гімназіі, то пабачыў, што яны ведалі, чаго хочуць і тут не было праблемы.

Пасьля заканчэньня афіцыйнай часткі сьвяткаваньня да мяне зьвярнуўся П. Асіповіч, былы гімназіст: „Паглядзіш, Юрка, што мы яшчэ адсьвяткуем 50-я ўгодкі ЗБВБ, але ці ўсе дажывём". Дажыў ён да 50-х угодкаў, толькі не адсьвяткаваў... і хутка памёр.

Знаючы тагачасныя абставіны, я ня веру, што ў Вялікабрытаніі магла-б паўстаць беларуская арганізацыя з вывезеных у Сібір беларусаў. Гэтыя людзі баяліся ня толькі рабіць нешта беларускае, але нават гутарыць сам-насам па-беларуску. Быў адзін беларус, афіцэр польскае арміі П. Сыч, які пісаў лісты да Грышкевіча па-беларуску, але на зьезьдзе яго не было.

Такім чынам галоўнымі ініцыятарамі заснаваньня ЗБВБ былі маладыя беларусы — выпускнікі беларускіх сярэдніх школаў пад нямецкай акупацыяй, якія пасьля былі кадэтамі Афіцэрскай школы Беларускай Краёвай Абароны (БКА).

Так выглядае ў скароце справа заснаваньня ЗБВБ, якая павінна была адсьвяткаваць летась свой залаты юбілей.

(„Беларус" № 454, ЗША, травень 1998 г.)

Беларуская суботняя школка ў Лёндане

Сілай волі злажыўшыхся абставін Другое Сусьветнае вайны частка беларускіх эмігрантаў апынулася ў вялікім горадзе Лёндане й тут пасялілася. Такім чынам, апынуўшыся далёка ад роднага краю, роднай мовы й нашага роднага назову — Беларусь, нашым сьвятым абавязкам тут, на чужыне, ёсьць аддаць чэсьць і пашану роднаму краю, які нас узгадаваў і даў пачаткі жыцьця. І сапраўдны, шчыры беларус, у якога ў сэрцы жыве любоў і вера да свайго роднага, блізкага, той напэўна захоча пераказаць тыя духовыя вартасьці сваім дзецям. А для саміх дзяцей таксама будзе цікава даведацца аб тым, нечым новым, незнаёмым ім краю — Беларусі, зь якой паходзяць іхнія бацькі.

Дзеля таго, стараньнямі беларускіх арганізацыяў ХАБР і ЗББВ, у Лёндане сарганізавана была Беларуская суботняя школка.

Аднак, на вялікі жаль, ня ўсе бацькі належна дацэньваюць значэньне свайго паходжаньня. Часта яны саромеюцца прызнацца хто яны, а сваіх дзяцей пасылаюць у іншыя суботнія школкі. Ці такія бацькі задумваюцца над пытаньнем, якімі растуць іхнія дзеці? Ці гэтыя бацькі саромеюцца сваіх бацькоў, якія жылі на Беларусі ў недастатках, а тут яны распанелі й гэтым самым адчуваюць крыўду да Беларусі й усяго беларускага?

Ніхто ня ведае, як кола гісторыі можа павярнуцца й дзе могуць быць іхнія дзеці, так як мы ніколі ня думалі, што апынімся тут, у Лёндане. Але гледзячы збоку, як гэта ўсё выглядае прыкра й балюча, нейкім чынам сорамна й ганебна, калі бацькі пасылаюць сваіх дзяцей у чужыя й часта варожыя нам школкі, памінаючы сваю бацькоўскую мову, звычаі й народную культуру. Вось такім людзям Гальяш Леўчык прысьвяціў наступны верш:

Хто адрокся сваіх,
Хто стыдацца нас стаў

І прыліп да чужых,
Каб ён сьвету ня знаў.

Мову родную хто
Пазабыў, асьмяяў,
Загубіў за нішто,
Каб ён сьвету ня знаў...

Ня так даўно аўстралійскі міністар эміграцыі Доўнэр, прамаўляючы ў Сыднэі да эмігрантаў з трынаццаці краінаў з нагоды натуралізацыі, між іншым, сказаў: „Будзьце думныя са свае народнае культуры й дайце магчымасьць аўстралійцам зь яе скарыстаць. Вучыцеся англійскае мовы, але не забывайце выхоўваць сваіх дзяцей так, каб найменш зналі дзьве мовы, пры гэтым вучыцеся мовы сваіх продкаў".

Падобную заяву зрабіў пару гадоў таму канадыйскі міністар эміграцыі, які пасаромеў аднаго з эмігрантаў з Усходняй Эўропы за тое, што той хацеў зьмяніць сваё прозьвішча на больш англа-саксонскае. Міністар сказаў яму, што ня трэба саромецца свайго паходжаньня, бо той чалавек, які зацірае сьляды свайго паходжаньня, паводзіць сябе нягодна.

Дзякуючы стараньням сяброў Галоўных Управаў ХАБР і ЗБВБ, дня 17 сакавіка 1962 года распачала сваю працу Беларуская суботняя школка. Яе першым настаўнікам зьяўляецца гасп. А. Жданковіч. Школка знаходзіцца ў кварталe Гамэрсміт у Лёндане. Заняткі пачынаюцца кожную суботу ад 10 да 12 гадзіны. Аплата мінімальная, паколькі арганізацыі пакрываюць большасць коштаў. Бацькі, жадаючыя пасылаць сваіх дзяцей у Беларускую школку, павінны зьвяртацца да гасп. А. Жданковіча або да беларускіх арганізацыяў ХАБР альбо ЗБВБ.

Бацькі, памятайце аб сваім паходжаньні й перакажыце ўсё магчымае сваім дзецям.

Бацька беларускай пісьменнасьці Францішак Багушэвіч так сказаў: „Не пакідайце мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі".

(„Аб'еднаньне", № 2 (93), Лёндан, сакавік 1962 г.)

Дадатак да „Кароткіх успамінаў" Паўла Навары

Зьмяшчаючы „Кароткія ўспаміны" Паўла Навары ў „Голасе Часу", ва ўступе я зазначыў, што чым далей пісаў П. Навара свае „Кароткія ўспаміны", тым больш яны скарачаліся, або аўтар зусім памінуў важныя моманты дзейнасьці, у якой прымаў ён актыўны ўдзел. Гэта можна тлумачыць тым, што пачаў ён пісаць „Кароткія ўспаміны" знаходзячыся ў клініцы цяжка хворы, калі не было надзеі на паправу й калі стан ягонага здароўя з кожным днём пагаршаўся й 24 траўня 1983 году ня стала Паўла Навары.

Пасьля сьмерці Паўла Навары некаторыя сябры Галоўнай Управы ЗБВБ зьвярнуліся да мяне з просьбай, каб я напісаў пра Навару, зь якім мне прыходзілася быць разам у час вайны й пасьля яе. Я гэта зрабіў, напісаў успамін пад загалоўкам „Сьв. Памяці Павал Навара" й пераслаў у рэдакцыю газэты „Беларус", якая замясьціла яго ў № 311 і 312 (чэрвень-ліпень і жнівень-верасень 1983 году).

Цяпер, закончыўшы зьмяшчаць „Кароткія ўспаміны" Навары ў часопісе „Голас Часу", я хачу крыху іх дапоўніць, каб паказаць чытачу, што Павал Навара ня быў звычайны беларус. Быў гэта здольны, адукаваны, сьвядомы, стойкі й актыўны беларускі патрыёт.

Першы раз спаткаў я Паўла Навару ў Менску ў чэрвені 1944 году й запамятаў яго як шчуплага, маладога хлапца. Зь Менску лёс закінуў нас у Францыю. Там у лістападзе 1944 году нас разлучылі, але ў палове студзеня 1945 году мы зноў спаткаліся ў польскім войску ў Сан-Басіліё (паўднёвая Італія) у роце „цэзусоўцаў". Пасьля былі ў адным зьвязе на падафіцэрскай школе. Паўла разам з другімі беларусамі, што былі на школе, адаслалі на фронт, а мяне аднаго, сярод беларусаў, вярнулі назад у школу. Закончыўшы падафіцэрскую школу, я таксама ехаў на фронт, але ў цягніку даведаўся, што немцы скапітулявалі ў Італіі. Прыехаў я пад Імолю й тут прыдзялілі мяне да 17 батальёну 5 Крэсовай дывізіі й паслалі ў 1-ю роту. Павал Навара таксама быў у 17 батальёне, але ў 2-й роце. Аднак даўжэй-

Павал Навара па ўсіх прадметах стаяў добра, а па матэматычных — выдатна. Хімія, я сказаў-бы, была ягоным першым прадметам. Калі на запытаньне прафэсара Навара даў адказ, то ў сваю чаргу прафэсар сказаў: „То была одповедзь!" (Пасьля заканчэньня студыяў, гэты прафэсар прасіў П. Навару ехаць зь ім у Польшчу працаваць, бо там патрабуюць хімікаў, але Навара адмовіў).

Навара не ганарыўся сваімі здольнасьцямі, а нават памагаў слабейшым гімназістам у сваёй клясе. Адным зь іх быў сяржант Бутрым з 17 батальёна. Быў ён шмат старйэшы векам чалавек. Расказваючы аднойчы сваю біяграфію, Бутрым сказаў, што перад вайной ён супрацоўнічаў з польскай паліцыяй ды памагаў біць беларусаў на пастарунку. Пасьля такой інфармацыі Павал перастаў памагаць яму ў занятках.

Час ішоў, а зь ім 9 траўня 1947 г. прыйшло й заканчэньне школьнага году. Пэдагагічная Рада загадзя пастанавіла ня даць беларусам ходу да далейшай асьветы. Усіх нас, асабліва актыўнейшых, мелі разаслаць па сваіх аддзелах. Навара й я загадзя злажылі паданьні (заявы) на курсы ангельскай мовы, але я хутка атрымаў сваю заяву з прыпіскай, што мая просьба адкінута: „Подане застало аджуцонэ" — не падаючы ніякай прычыны. Я даведаўся хто адкінуў заяву й пайшоў да таго капітана ў канцылярыю з паданьнем. На маё запытаньне, хто адкінуў маё паданьне і па якой прычыне, капітан паглядзеў на маю заяву, пакруціў яе ў руцэ й сказаў, што ён ня знае. Паданьне ён мне аддаў і я пакінуў канцылярыю. 27 траўня мяне неспадзявана адаслалі ў свой батальён, які знаходзіўся каля Ашбуртон у грабстве Дэвон. Павал застаўся яшчэ ў лягеры, але неўзабаве й яго перавялі ў другі лягер, недалёка ад Чысльдан.

Будучы ў гімназіі я меў перапіску зь некаторымі беларусамі ў лягеры ДП у Нямеччыне. Лісты й беларускую прэсу, якую яны прысылалі мне, я не заўсёды атрымліваў так, як другія гімназісты. Мяне часам клікалі ў канцылярыю й там шэф Мазуркевіч уручаў мне пошту. А калі прыйшоў загад адаслаць мяне ў свой аддзел, дык шэф Мазуркевіч прыйшоў у канцылярыю лягеру й сказаў, што ўжо найбольшы час для мяне выехаць... Ён ня знаў, што ў канцылярыі працаваў адзін беларус, Бесараб, і ён гэта мне сказаў.

Я вярнуўся ў свой аддзел, а за пару дзён прыехаў і Навара. Застаў ён мяне ў кантыне за вячэрай. Я быў рады яго спаткаць і даведацца аб апошніх навінах у гімназіі. Павал, у прысутнасьці палякаў, расказваў мне па-беларуску аб сваім спатканьні з генэралам Н. Сулікам.

Справа беларусаў гімназіі 5 Крэсовай дывізіі дайшла, як бачым, да ген. Суліка. Скуль ён даведаўся, я ня знаю. Мог гэта зрабіць В. Грышкевіч, які ў той час жыў у Лёндане й меў знаёмых палякаў, а мог сказаць сын Суліка, Баляслаў, які разам з намі вучыўся ў адной клясе. Як там не было, але генэрал Сулік прыехаў у гімназію, каб пабачыць гэтых беларусаў, але іх тут ужо не было. Найбліжэй знаходзіўся П. Навара й Сулік паехаў да яго. І вось што расказваў мне Навара: „Выйшлі мы з афіцэрскага пакою прайсьціся й пагутарыць. Сулік абняў мяне за плячо, называў сынам, і распытваўся. Я расказаў яму так, як было ў сапраўднасьці й Сулік са мною пагадзіўся. А яму нагаварылі, што мы ў гімназіі займаліся кансьпірацыяй. Пры нагодзе Сулік сказаў, што ў свой час, будучы студэнтам у Пецярбургу, ён належаў да Беларускага Саюзу. На заканчэньне гутаркі Сулік сказаў, што я магу ісьці вучыцца далей, ды каб паведаміў сваіх сяброў (беларусаў), каб яны складалі заявы ў ліцэі".

Здаецца, гутарка генэрала Суліка з Наварам была прыязнай, але не зусім карысная для беларусаў-гімназістаў. Чаму П. Навара меў шукаць і паведамляць сваіх сяброў, каб яны падавалі заявы ў ліцэй, а чаму гэтай справай не занялася дырэкцыя гімназіі? Апошнім часам дырэктарам гімназіі быў капітан Шчарбіцкі, па паходжаньні й выглядзе — татарын з Беларусі. Знаў ён беларускую мову, але ня быў прыяцелем беларусаў. Па спатканьні з генэралам Сулікам Навара меў вострую гутарку са Шчарбіцкім, як казаў ён мне: „Я сьцяўся зь ім".

Тут можа нехта падумаць, што наша групка беларусаў непатрэбна сябе праяўляла. Тут не хадзіла пра нас асабіста, але пра другіх беларусаў, якія былі ў гімназіі й у гэтым польскім лягеры й шмат дзе сярод палякаў і многія зь іх не прызнаваліся ня толькі да беларусаў, але й праваслаўных. Людзі былі запалоханыя й трэба было нешта рабіць, каб іх ажывіць, напомніць ім сваё паходжаньне, бо польская армія стаяла ўжо на парозе ліквідацыі.

Павал Навара пайшоў вучыцца далей. Скончыў ліцэй, нейкі час працаваў у адным лёнданскім гатэлі ды адначасна рыхтаваўся паступіць на ўнівэрсытэт на факультэт матэматыкі, фізікі й хіміі. Экзамены здаў, на ўнівэрсытэт паступіў і ў 1952 годзе закончыў студыя. Працаваў хімікам у розных лабараторыях аж да свае хваробы.

Трэба яшчэ прыгадаць той прыкры час, калі ў Нямеччыне ў лягерох ДП пачаўся падзел беларускай эміграцыі. Гэтая эпідэмія перакінулася й у Англію. Мая дарога з Паўлам Наварам разышлася. Ён пайшоў за БНР, а я застаўся пры БЦР.

Павал даўжэйшы час быў сакратаром ЗБВБ (Згуртаваньня Беларусаў Вялікабрытаніі), а я — сакратаром ХАБР (Хрысьціянскага Аб'яднаньня Беларускіх Работнікаў). Дзьве беларускія арганізацыі ў Вялікабрытаніі рывалізавалі паміж сабою. Што праўда, спачатку ішлі паміж імі сваркі, але пераважна за прэзыдэнтаў. Паміж Паўлам і мною ніколі не было ніякай сваркі. Ён аднойчы наведаў мяне й ніколі не рабіў мне ніякіх закідаў і я ніколі ня меў яму за зло, што ён заняў пазыцыю пры БНР.

Звычайна, як надыходзіла нейкая гадавіна ці сьвята, якія ЗБВБ і ХАБР ладзілі супольна, то сьпярша двух сакратароў узгаднялі парадак. Магчыма таму, што я быў крыху старэйшы гадамі за Паўла, то звычайна ён пытаў мяне: „Ну, як мы зладзім гэтым разам?" І ніколі не было паміж намі непаразуменьняў, зайздрасьці каб высунуць сваю арганізацыю наперад. Усё рабілася як роўны з роўным.

Наколькі мне вядома, часам П. Навара меў прыкрасьці з боку сяброў ЗБВБ за свае сымпатыі да ХАБР, але ён ведаў, што робіць. Навара ня быў вузкапартыйным выканаўцам загадаў згары, паколькі быў гэта чалавек здаровага розуму й вялікага сэрца, які трактаваў кожнага беларуса як свайго брата, не зважаючы на яго палітычныя ці рэлігійныя перакананьні. Добра знаючы ангельскую мову, Павал няраз памагаў беларусам у бядзе, не пытаючыся ў іх да якой арганізацыі яны належаць, ці зусім не належаць. Сьціплы ён быў чалавек, але адораны добрым сэрцам і розумам. Часам быў востры ў дыскусіях.

Я наведваў Паўла ў клініцы, калі ён быў ужо цяжка хворы. Першы раз прынёс ён мне крэсла, мы селі й успаміналі

сваё невясёлае пройдзенае й мінулае. Аднойчы ён мне сказаў, што піша ўспаміны й пытаў мяне прозьвішчы некаторых беларусаў, якіх забыўся...

Калі наведаў я яго апошні раз, Павал ляжаў у ложку, чуўся аслаблены, стан здароўя значна пагоршыўся, гутарыў ён слаба й казаў мне: „Ты гавары, я буду слухаць". На развітаньне падаў мне руку, падзякаваў за наведваньне, ды на адыход памахаў сваёю худою рукою.

За гады свае няўтомнай працы Павал здабыў пашану нават сярод чужых, зь якімі супрацоўнічаў. ЗБВБ страціла ня толькі прыкладнага сябру, але й выдатнага працаўніка. Хваробу, а пасьля й сьмерць сьв. пам. Паўла Навары беларуская грамадзкасьць прыняла з балючым сэрцам. Доказам гэтага былі паховіны, на якія зьехалася каля сотні прыяцеляў — беларусаў і англічан. Пахавалі Паўла Навару 2 чэрвеня 1983 году ў Лёндане на могілках Фіншлей і засьпявалі „Сьпі пад курганом герояў". Абрад паховін зьдзейсьніў а. Я. Абабурка.

Пакінуў нябожчык у смутку жонку Эльлен, 17-гадовага сына Колю й 14-гадовую дачку Альжбету. (Пару гадоў пасьля сьмерці Паўла памерла й Эльлен).

Сьпі спакойна дарагі Сябра ў гасьціннай ангельскай зямлі. Хай Табе сьняцца сны аб роднай Беларусі, якую Ты шчыра любіў і хацеў яшчэ пабачыць.

(„Голас Часу" № 32 (5) і № 33 (6), Лёндан 1994 г.).

Да пытаньня заснаваньня часопіса „Аб'еднаньне"

У мінулым годзе ў Менску выйшаў І том „Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі". На 10-й старонцы спаткаў я цікавую інфармацыю пра лёнданскі часопіс „Аб'еднаньне", аўтарам якой зьяўляецца Л. І. Прончак:

„АБ'ЕДНАНЬНЕ", „Юніён", штоквартальны часопіс, які выдаваўся ў Лёндане ў 1948-66 (?) Хрысьціянскім Аб'еднаньнем Беларускіх Работнікаў у Вялікабрытаніі. Паводле вызначэньня рэдакцыі — „антыкамуністычнае перыядычнае англа-беларускае выданьне". Зьмяшчаў матэрыялы на белару-

скай і ангельскай мовах. Заснавальнік і рэдактар А. Варава (1918-66). Распаўсюджваўся сярод беларускай эміграцыі ў Вялікабрытаніі, ЗША, Аўстраліі, Канадзе. Зьмяшчаў дасьледваньні й архіўныя матэрыялы па гісторыі й культуры Беларусі, весткі з жыцьця эмігрантаў, вёў палеміку з афіцыйнымі савецкімі выданьнямі па пытаньнях нацыянальнай палітыкі, ідэалёгіі. Падтрымліваў ідэі й дэклярацыі Беларускай Цэнтральнай Рады (БЦР) і 2-га Ўсебеларускага Кангрэсу (1944). Сярод аўтараў В. і Р. Астроўскія, Варава, Ю. Жывіца, А. Салавей. Выйшла больш 100 нумароў".

У вышэйзгаданай інфармацыі сп. Л. І. Пранчака сказана недарэчнасьць. Ёсьць праўдай, што часопіс „Аб'еднаньне" быў органам Хрысьціянскага Аб'яднаньня Беларускіх Работнікаў у Вялікабрытаніі, але выходзіў ён сьпярша не як штоквартальнік, а як штомесячнік, хоць не заўсёды рэгулярна. Толькі ў другой палове 1962 году, калі рэдагаваньне ўзяў Віктар Астроўскі, ён зрабіў яго штоквартальнікам і на ім спыніўся далейшы выхад часопіса.

Таксама ня ёсьць праўдай, што заснавальнікам і рэдактарам часопіса „Аб'еднаньне" быў А. Варава. Заснавальнікам часопіса была Часовая Ўправа Хрысьціянскага Аб'еднаньня Беларускіх Работнікаў (ХАБР). У Пратаколе першага арганізацыйнага паседжаньня Часовай Галоўнай Управы ХАБР, якое адбылося 15 сакавіка 1948 году, у Рэдакцыйную Калегію ўвайшлі ўсе сябры Галоўнай Управы ў ліку 10 асоб. Аднак на паседжаньні Галоўнай Управы 17 ліпеня 1948 году было пастаноўлена:

„У сувязі з рэдукцыяй Рэдакцыі, адказным рэдактарам будзе кожны чарговы назначаны сябра. Назначаныя ў Рэдакцыю: гасп. гасп. Буляк М., Суравы Б., Рудзь С., Нор К., Сэрафіновіч С. Як бачым, А. Варавы няма сярод рэдактараў.

У час арганізацыі ХАБР большасьць яе сяброў Галоўнай Управы жылі ў памяшканьні на Онслоў Сквэр, Саўт Кэнсінктон, Лёндан, і там адбываліся паседжаньні Галоўнай Управы, там рэдагаваўся, набіваўся, адбіваўся й рассылаўся ва ўсе канцы сьвету (за выняткам СССР і камуністычных дзяржаў) часопіс „Аб'еднаньне". У гэтай рабоце, сярод актыўных беларусаў, прымаў удзел і А. Варава, які пераважна набіваў матрыцы, але рэдактарам ня быў, і закладчыкам таксама.

Калі закрыта было памяшканьне на Онслоў Сквэр і сябры Галоўнай Управы ХАБР, захаваўшы свае функцыі, разышліся па прыватных кватэрах, тады А. Вараву прыйшлося цяжэй справіцца з набіцьцём часопіса й ён пачаў адмаўляцца, хоць яму памагалі М. Лабанок і Я. Пракапук. Неўзабаве А. Варава ажаніўся й выехаў за Лёндан.

Выдачу часопіса перанялі П. Бударкевіч і А. Малаха, а ў 1954 годзе да іх далучыўся й я (аўтар гэтай заўвагі), і мы траіх выдавалі гэты часопіс да паловы 1962 году. Ад нас рэдагаваньне часопіса „Аб'еднаньне" пераняў Віктар Астроўскі й пісаў у ім многа недарэчнасьцяў.

Таксама В. Астроўскі ніколі раней не пісаў у „Аб'еднаньне", а толькі тады, як пачаў яго рэдагаваць. Ніколі нічога не пісаў у часопіс і А. Варава, а калі часам зьявілася ягонае прозьвішча пад нечым, дык была гэта работа Астроўскіх.

Як відаць, апошнія нумары „Аб'еднаньня", якія выдаў Віктар Астроўскі, папалі ў рукі сп. Л. І. Прончака й ён прыняў скажоную інфармацыю за праўду ды зьмясьціў яе ў энцыкляпэдыю.

Юры Весялкоўскі, першы сакратар ХАБР і шматгадовы супрацоўнік „Аб'еднаньня"

(„Голас Часу" № 31 (4), Лёндан 1994 г.)

Нараджэньне часопіса „Голас Часу"

На далёкай, на чужыне,
Жывём з думкай аб радзіме;
Пра яе шляхі эпасу, —
Хай нам скажа „Голас Часу".

Да паважаных чытачоў!

Ад даўжэйшага часу адзываліся галасы некаторых сяброў з Царкоўнага Камітэту сьв. Еўфрасініі Полацкай у Лёндане, а таксама некаторых прыхаджан, каб ажывіць нацыянальную дзейнасьць. Нават у мінулым годзе склікана была ініцыятыўная зборка, на якой парушаліся пытаньні аднаўленьня арганізацыі Хрысьціянскага Аб'яднаньня Беларускіх Работнікаў (ХАБР), выдачы яго органа „Аб'еднаньне", або царкоўна-грамадзкага часопіса „Званіца".

У свой час адзываліся подобныя галасы й ад прадстаўнікоў Царкоўнага Камітэту сьв. Мікалая ў Манчэстыры, каб выдаваць далей часопіс „Званіца".

Заўчасны параліч і сьмерць гэтых часопісаў былі работай некаторых людзей, якія кіраваліся больш прыватнымі амбіцыямі чым нацыянальна-грамадзкім дабром.

Каб нашая беларуская справа жыла ў гэтай краіне, дзеля таго апошнім часам было вырашана нешта выдаваць. Для нас, рассыпаных і некаторых адзінокіх і старых, прэса зьяўляецца лучнікам і інфарматарам. Па-другое, прэса захоўвае сьлед нашага беларускага быту ў гэтай краіне, нашай дзейнасьці, нашых дасягненьняў, нашай нацыянальнай сьвядомасьці.

Хоць сілы нашыя скромныя й арганізацыйная дзейнасьць мінімальная, але ёсьць магчымасьць выдаваць свой беларускі часопіс і гэтую магчымасьць мы нарэшце выкарысталі. Толькі ня ёсьць гэта „Аб'яднаньне" й ня ёсьць „Званіца", над магіламі якіх мінаюць дэкады, а ёсьць гэта, як бачыце, Паважаныя Чытачы, новы часопіс — „Голас Часу".

Як гаворыць яго падзагаловак, гэта царкоўна-грамадзкі часопіс. Таму будзем падаваць у ім пераважна матэрыял з гісторыі хрысьціянства, Праваслаўнай Царквы, Беларусі, успаміны з Другой Сусьветнай вайны й замяшчаць матэрыял з другіх выданьняў, якія згадваюць Беларусь. Гэтага вымагае ад нас дух часу. „Голас Часу" будзе стаяць за незалежнасьць Беларусі, за пастановы Першага Ўсебеларускага Кангрэсу, якія былі пацьверджаны Другім Усебеларускім Кангрэсам. „Голас Часу" будзе змагацца за родную мову, за сваю Беларускую Праваслаўную Царкву й веру.

На рэдактара часопіса „Голас Часу" прызначаны Ю. Весялкоўскі. У Рэдакцыйную Калегію ўвайшлі былыя сябры Галоўнай Управы ХАБР, супрацоўнўкі „Аб'яднаньня" й „Званіцы". Людзі гэтыя былі выбраны на сходзе парафіі царквы сьв. Еўфрасініі Полацкай у Лёндане, які адбыўся 2 ліпеня 1989 году ў царкоўнай залі на Гамэрсміт у Лёндане.

Рэдакцыйная Калегія будзе старацца, каб часопіс выходзіў як двухмесячнік, але матэрыяльныя кошты могуць перашкодзіць нармальнаму выхаду. Ёсьць гэта каштоўная справа, але час вымагае нешта рабіць.

(„Голас Часу" № 1, Лёндан, ліпень-жнівень 1989 г.)

З нагоды пятых угодкаў „Голасу Часу"

Гэты 30-ты нумар „Голасу Часу" заканчвае сваю пятую гадавіну нараджэньня. Ня ёсьць гэта яго доўгі жыцьцёвы шлях, але ёсьць гэта адзінае беларускае выданьне на эміграцыі ў Англіі й Заходняй Эўропе ў апошніх гадох. Як пачаў выходзіць „Голас Часу" — чытач даведаецца пазьней.

Цяпер скажу коратка, што ў Англіі беларусы пачалі выдаваць сваю прэсу неадкладна пасьля таго, як прыехалі яны ў гэту краіну. А большасьць іх прыехала ў Англію з польскай арміяй з Італіі ў канцы 1946 году. Будучы яшчэ ў арміі, ужо 18 студзеня 1947 году скліканы быў Першы Агульны Зьезд Беларусаў у Лёндане, на якім утворана была першая беларуская арганізацыя — Згуртаваньне Беларусаў у Вялікабрытаніі (ЗБВБ). Яе першы часопіс, які неўзабаве пачаў выходзіць, называўся „На шляху", але выходзіў ён нядоўга.

Неўзабаве ў арганізацыі ЗБВБ наступіў раскол. Прычынай стаўся прыезд з Рыму ў Лёндан вуніята айца Часлава Сіповіча, місіянера па наварачваньні праваслаўных на вунію, які адкрыў сваю капліцу й „запрашаў" у яе праваслаўных беларусаў. Але ня менш важнай прычынай было й тое, што некаторыя кіраўнікі Галоўнай Управы ЗБВБ падтрымлівалі дзейнасьць айца Сіповіча й выбралі сабе за прэзыдэнта інж. М. Абрамчыка, які ачоліў па тэстаманту БНР. Аднак большасьць сяброў арганізацыі засталася на баку БЦР, якую ачоліў на Беларусі праф. Радаслаў Астроўскі й разам зь ёю многа хто пакінуў Бацькаўшчыну летам 1944 году.

Беларусы, якія выступілі з ЗБВБ, заснавалі сваю арганізацыю — Хрысьціянскае Аб'яднаньне Беларускіх Работнікаў (ХАБР) у 1948 годзе й пачалі выдаваць часопіс „Аб'яднаньне". Першы нумар выйшаў 23 сакавіка 1948 года. У адказ ЗБВБ пачало выдаваць лацінкай „Беларуса на чужыне". Паміж гэтымі арганізацыямі вялася палітычная барацьба й часам супраць вуніяцкай дзейнасьці. Па пэўным часе „Беларус на чужыне" спыніў свой выхад, а часопіс „Аб'яднаньне" выходзіў далей і зьявілася яго больш за 100 нумароў.

Выходзілі таксама іншыя лякальныя беларускія выданьні, але пасьля некалькіх нумароў заціхлі.

У 1954 годзе ў Англію да сына прыехаў прэзыдэнт БЦР праф. Р. Астроўскі. Сын жыў за Лёнданам, ня меў свайго дому й ня мелі яны грошай купіць дом. Таму Галоўная Ўправа ХАБР запрапанавала прэзыдэнту перайсьці жыць у Дом ХАБР. Тут трэба сказаць, што арганізацыя ХАБР не была залегалізавана й Дом ХАБР павінен быў мець гаспадара. Гэтым намінальным гаспадаром быў А. Варава, які апошнім часам ня жыў у Лёндане ў гэтым доме. Такім парадкам Дом ХАБР быў перапісаны з А. Варавы на Р. Астроўскага з умовай, што адзін пакой застаецца для карыстаньня канцыляры й зборак сяброў ХАБР.

Справа дому ХАБР была прадстаўлена на 7-ым Агульным Зьезьдзе сяброў ХАБР, які адбыўся 9 чэрвеня 1955 году й на ім было сказана: „У сувязі з прыездам прэзыдэнта БЦР у Англію, каб разгарнуць і ўлепшыць працу арганізацыі, а таксама даць большую магчымасьць для працы прэзыдэнта БЦР, Галоўная Ўправа ХАБР пастанавіла правесьці рэвізію Дому ХАБР, і Дом ХАБР на поўных падставах быў перададзены пад кантроль прэзыдэнта БЦР як зьверхніка беларускага жыцьця ў Англіі й іншых краінах вольнага сьвету".

Недзе на пачатку 1962 году праф. Р. Астроўскі выехаў у ЗША да дачкі, а ў Доме застаўся жыць ягоны сын Віктар. Адчуўшы сябе паўнапраўным гаспадаром Дому ХАБР, стаў ён не пускаць у яго некаторых беларусаў-сяброў ХАБР, якія па старым звычаі заходзілі сюды. Я ў той час быў сакратаром ХАБР і пачаў атрымоўваць лісты з нараканьнямі на Віктара, які не дазваляў зайсьці ў Дом, а аднаго беларуса выпхнуў за дзьверы. Іншыя беларусы, нават з Галоўнай Управы, пачалі пытаць мяне што сталася з нашым Домам. Я пайшоў да Віктара Астроўскага пагутарыць наконт ягоных паводзінаў да некаторых сяброў арганізацыі. На мае запытаньні ён адказаў коратка, што Дом ёсьць яго, ён мае на гэта паперы й каму не падабаецца, хай судзіцца. Тады я напісаў ліст праф. Р. Астроўскаму ў ЗША, у якім прасіў яго залагодзіць непрыемнасьці, якія ўводзіць яго сын Віктар і адначасна прасіў прэзыдэнта, каб з Дому ХАБР нешта было дадзена на выдаваньне часопіса „Аб'еднаньне", якога я быў

у той час рэдактарам. Атрымаў я ад прэзыдэнта адказ, у якім ён выказаў зьдзіўленьне маёй пазіцыяй у справе Дому. Як бачым, Астроўскія адмовілі беларусам уступу ў беларускі Дом, хаця тыя ахвяроўвалі грошы на гэты Дом. Адмовілі таксама грашовую дапамогу на часопіс „Аб'еднаньне".

Для мяне справа стала яснай: з Астроўскімі мне не дамовіцца й я напісаў ліст да айца Мікалая Лапіцкага ў ЗША, які быў у добрых адносінах з Астроўскім, каб ён, як духоўная асоба, паўплываў на прэзыдэнта дзеля залагоджаньня гэтай кампраметуючай справы, каб яна ня выйшла навонкі. Прэзыдэнт палічыў мой ліст да а. Лапіцкага за абразу ягонай годнасьці й разам з сынам, замест ціха залагодзіць справу, павялі адкрытую вайну супраць мяне.

Паколькі я быў сакратаром арганізацыі й рэдактарам „Аб'еднаньня", а ўся карэспадэнцыя ішла на Дом ХАБР, то я неўзабаве здаў свае функцыі ў арганізацыі. Абавязкі рэдактара „Аб'еднаньня" пераняў Віктар Астроўскі й ён на старонках часопіса кляйміў мяне як мог, а таксама й іншых беларусаў, якія не пагадзіліся з паводзінамі Астроўскіх і ў гэты Дом больш не заходзілі. Неўзабаве часопіс спыніў свой выхад, а ХАБР само па сабе распалася, хоць пры Астроўскіх у арганізацыі засталіся старшыня Б. Суравы й сакратар А. Варава, якія ніколі ніякай зборкі не зрабілі.

Некаторыя сябры ХАБР пачалі вяртацца ў ЗБВБ і былі старшынямі гэтай арганізацыі. Такі быў сумны канец адной з найбольшых беларускіх арганізацыяў у Вялікабрытаніі й яе часопіса „Аб'еднаньне", які найдаўжэй выходзіў у Англіі.

Як для каго, а для мяне на працягу гадоў была гэта вельмі балючая й прыкрая справа. Я ня мог зразумець, каб прафесар, старшыня БЦР, якога я абараняў на працягу гадоў будучы рэдактарам часопіса, мог пайсьці на такую пакасьць. Ніхто ў Лёндане лепш зь ім ня жыў як я. Ён прыходзіў да мяне, жыў недалёка, 30 мінут хады праз парк. І я заходзіў да яго часта забраць арганізацыйную карэспадэнцыю й мне цікава было пагутарыць зь ім, бо быў гэта адукаваны чалавек, стары беларускі дзеяч, палітык, які многа чаго й каго знаў і мог гутарыць на любую тэму. Каб праф. Астроўскі быў у Лёндане, я думаю, гэтага непаразуменьня з Домам ХАБР не было-б. Усю гэтую кашу заварыў сын Віктар, які быў крыху

нарваны тып і гэта ён намовіў і ўцягнў бацьку ў непрыемную й кампраметуючую справу, якая прынесла ім паніжэньне. Але віна была тут і бацькі, які паслухаў сына.

Апраўдваліся яны тым, быццам гэты Дом ХАБР стаўся „дубком", месцам спатканьняў людзей, якія маюць кантакты з савецкай амбасадай у Лёндане. Было гэта беспадстаўнае тлумачэньне й каб гэта ўсё апісаць, заняло-б вельмі многа месца й часу, а па-другое, для мяне непрыемна паўтараць усё гэта перажытае другі раз.

Неўзабаве праф. Р. Астроўскі сыпнуў сваім супрацоўнікам воінскімі званьнямі: генэралаў, палкоўнікаў, маёраў, капітанаў і лейтэнантаў. Некаторыя беларусы ў Англіі атрымалі такія высокія чыны, што закруцілася ім у галаве. Сын Астроўскага, Віктар, атрымаў званьне генэрала, хоць у польскім войску быў радавым. Аднак гэтыя штучныя павышэньні не ўратавалі дзейнасці Астроўскага ў Англіі.

У 1974 годзе Царкоўны Камітэт сьв. Еўфрасініі Полацкай у Лёндане скамунікаваўся з Царкоўным Камітэтам сьв. Мікалая ў Манчэстэры й дамовіліся, каб супольна выдаваць царкоўна-грамадзкі часопіс і на рэдактара запрапанавалі мяне, хоць у той час жылі яшчэ Астроўскія. Я даў згоду. Выдача часопіса была абгаворана. Засталося даць назоў часопісу. К. Глінскі прапанаваў назоў „Зорка", я — „Званіца". Прыняты быў другі варыянт і ў месяцы сьнежні 1974 году зьявіўся першы нумар „Званіцы".

Але на самых пачатках яго выхаду, некаторыя людзі Астроўскага, які надаў ім афіцэрскія чыны, пачалі падсоўваць мне падхвалкі розных людзей, якія стаялі далёка ад беларускай справы, а таксама й Астроўскіх, каб я ўзносіў іх у часопісе „Званіца". Я адмовіўся гэтае рабіць. Царкоўны Камітэт у Манчэстэры поўнасьцю мяне падтрымаў. Тады Лёнданскі Царкоўны Камітэт стварыў новую рэдакцыйную калегію з адзінаццаці чалавек, але гэтыя людзі нічога не маглі мне памагчы ў выдачы. Я ім сказаў, што я ня ёсьць зацікаўлены ў колькасьці рэдакцыйнай калегіі, але ў яе якасьці й адмовіўся быць рэдактарам. Але на просьбу Манчэстэрскага Царкоўнага Камітэту выдаў я яшчэ адзін нумар „Званіцы" (за студзень 1976 г.), дзе падаў засьцярогі й прычыны свае адмовы.

Новай рэдакцыі спатрэбілася больш як тры гады, каб выдаць чарговы нумар „Званіцы". Выйшаў ён у сакавіку 1979 года, а наступны — у сьнежні таго-ж году й я больш „Званіцы" ня бачыў.

Усёй гэтай падрыўной работай кіраваў Канстанцін Глінскі, у той час ён атрымаў ад прэзыдэнта БЦР Р. Астроўскага назначэньне на прадстаўніка БЦР на Англію, чын „генэрала", хоць у польскім войску ня меў ён ніякай рангі. Аднойчы ў часе гэтых непаразуменьняў я спытаў „генэрала" К. Глінскага: «Дзе вы былі, спадар Глінскі, як зараз пасьля вайны беларусы Англіі арганізавалі сваё нацыянальнае жыцьцё? Вам арганізацыя ХАБР высылала часопіс „Аб'еднаньне", а вы ніколі не далі за яго ня толькі пэнса, але й не сказалі дзякуй. А цяпер вы вялікі начальнік і загадваеце што хто мае рабіць і пісаць». На гэта Глінскі адказаў: «Вы, спадар Весялкоўскі, мабыць, нэрвовы чалавек». Ня быў я нэрвовы, але нэрвовым быў Глінскі. Ён праз некаторы час слаў мне заказныя лісты, у якіх запалохваў мяне судом за абразу ягонай годнасьці, хоць я ніколі яго публічна ці пісьмова не абразіў. Але яму хадзіла, каб запалохаць мяне.

Хто-ж быў гэты „генэрал" К. Глінскі? Быў ён польскім павятовым судзьдзёй, сынам памешчыка на Беларусі, сябрам Віктара Астроўскага зь Вільні. У часе апошняй вайны ў польскай арміі ген. Андэрса й зь ёю прыехаў у Англію.

Асобы К. Глінскага й В. Астроўскага не былі вядомыя беларусам у Англіі праз даўжэйшы час. Віктар Астроўскі паказаўся ў Лёндане толькі тады, калі яго бацька прыехаў у Англію, а Глінскі яшчэ пазьней.

Апошнія гады свайго жыцьця Глінскі хварэў, ляжаў у шпіталі й знаў, што ён дагарае. Яго наведваў М. Гаховіч і яму Глінскі даручыў справу продажы ягонай хаты й усёй маёмасьці. Памёр К. Глінскі 11 чэрвеня 1987 г. Цела яго спалілі, а попел умясьцілі ў польскім каталіцкім касьцёле сьв. Андрэя Баболі ў Лёндане. Тыдзень пазьней памерла яго жонка, якая была полькай. Дзяцей яны ня мелі. Іхні дом М. Гаховіч прадаў і, згодна волі пакойнага (К. Глінскага), грошы за дом пераслаў у Польшчу сваякам. Я ня чуў і сам Гаховіч мне нічога не сказаў, каб Глінскі ахвяраваў нешта на праваслаўную царкву або на нешта беларускае.

Калі старшынёю Царкоўнага Камітэту ў Лёндане стаў Мікалай Гаховіч, ён, мабыць, з паручэньня беларускіх дзеячоў з-за акіяна, хацеў аднавіць арганізацыю ХАБР і часопіс „Аб'еднаньне". У гэтым ужо часе Астроўскіх не было ў жывых. Сын памёр у Лёндане раней за бацьку ў жніўні 1975 году. Памёр, як ужо згадвалася, і Глінскі.

На зборку Царкоўнага Камітэту, якая мела на мэце аднавіць ХАБР і яго часопіс „Аб'еднаньне", запрасілі прыйсьці й мяне. Я прыйшоў. Сходку вёў М. Гаховіч. І калі ён запрапанаваў мне абняць функцыю сакратара ХАБР і адначасна рэдактара „Аб'еднаньня", я рашуча адмовіўся. Справа тут ясная. Калі я абараняў жыцьцё арганізацыі й яе Дом, некаторыя з прысутных на сходцы стаялі тады збоку, а часам выступалі супраць мяне й былі гатовы пахаваць арганізацыю ХАБР. Цяпер яны хочуць аднавіць яе й часопіс ды зваліць усю работу на мяне. Я сказаў прысутным, што арганізацыі ХАБР аднаўляць ня буду, аднаўляйце вы, а я буду належаць да яе як звычайны сябра. На гэтым і замерла дыскусія пра адраджэньне ХАБР. Гутарка пайшла пра выдачу новага часопіса й каб я ўзяўся за гэтую работу.

Разумеючы важнасьць беларускай справы на чужыне й бачучы, што прысутныя хочуць, каб нешта выходзіла сваё — беларускае, я згадзіўся. Мне было даручана выбраць назоў новага часопіса, які я назваў „Голас Часу". У рэдакцыйную калегію было адаптавана яшчэ трох сяброў. Яны апрабавалі назоў новага часопіса. Неўзабаве, у ліпені-жніўні 1989 году выйшаў першы нумар „Голасу Часу" як двухмесячнік.

Ад гэтага 1989 году я ня маю перашкодаў у выдачы часопіса. Праўда, было адно непаразуменьне, калі старшыня Царкоўнага Камітэту хацеў абрэзаць „Голас Часу", каб зашчадзіць грошы, але ў рэдакцыйнай калегіі, да якой належаў і ён, ніхто зь ім не пагадзіўся.

Неспадзявана 3 траўня 1992 году раптоўна памёр М. Гаховіч. Была гэта вялікая страта для царкоўнай арганізацыі й для часопіса „Голас Часу", бо-ж ён даволі часта пісаў у гэты часопіс. Аднак часопіс выходзіць далей і закончыў свой пяцігадовы шлях. Спадзявацца на наступныя пяць гадоў — вельмі цяжка, бо гэты часопіс выдаюць людзі, якім мінула 70 гадоў. У гэтым веку чалавек патрабуе адпачынку, а не на-

пружанай работы. Усё-ж часопіс выходзіць, але аднаго дня яго ня стане й чытачы гэтым не павінны быць зьдзіўлены.

Пры нагодзе я хацеў-бы загадзя падзякаваць свайму супрацоўніку Уладзіміру Грэмяку, які займаецца адбіцьцём гэтага часопіса, складаньнем, апакоўкай і высылкай. За гэтых пяць гадоў я ніколі ня меў зь ім праблем. Ён выконваў сваю работу чыста, акуратна й своечасова, без ніякіх нараканьняў. Калі прыходзілася нешта рабіць дадатковае, ён не адмаўляўся, а па сваім звычаі гаварыў: „Добра ёсьць". Зь ім у мяне выдавецкая справа ідзе да гэтага часу спраўна. Раней мы выдавалі „Званіцу". Падганяць яго да работы не было патрэбы. З такімі людзьмі прыемна працаваць.

Адначасна трэба выказаць падзяку й Царкоўнаму Камітэту за яго фінансавую дапамогу, безь якой часопіс ніколі-б не пабачыў сьвету. А выдача часопіса каштуе даволі дорага. Напрыклад, за 1993 год кошт выдачы „Голасу Часу" склаў 1991 фунт і 84 пэнсы, ня лічачы кошту вокладак. Даходзяць яшчэ прыватныя выдаткі зьвязаныя з часопісам, якія не ўлічваюцца. Яго выдаўцы працуюць ганарова, а не за грошы, а часам выдаюць свае грошы.

Падзяка належыцца таксама многа каму на Бацькаўшчыне за іхнія артыкулы ў часопіс, за прысланыя газэты, часопісы, кніжкі й т.п.

Той, хто займаўся рэдактарскай работай, разумее, што гэта не такая простая справа, часта бывае непрыемнай, а тым больш у нашым эміграцыйным жыцьці, дзе не хапае адпаведных людзей да гэтай работы й не заўсёды хапае грошай на выдачу.

Як доўга будзе выходзіць гэты часопіс, — цяжка сказаць, многа залежыць ад здароўя выдаўцоў, а пакуль што ён выходзіць, то я зьвяртаюся да чытачоў часопіса на эміграцыі: памажыце яму фінансава прадоўжыць жыцьцё як адзінаму прадстаўніку беларускага слова ў Заходняй Эўропе. „Голас Часу" піша праўду, часам горкую, але праўду. Можа каму й гэты мой артыкул не падабаецца, у якім я выказваю крыўды. Але тут ня ходзіць пра мяне, але пра жыцьцё беларускай арганізацыі й тыя беларускія часопісы, якія заўчасна памерлі праз несьвядомую дзейнасьць некаторых людзей. Успамінаю я гэтыя рэчы, якія адбыліся нейкіх 30 гадоў таму й пазьней, каб нешта падобнае ніколі ня здарылася ў бе-

ларускім эміграцыйным жыцьці. Кожны з нас робіць памылкі, але на некаторыя зь іх ня можа быць апраўданьня. Людзі павінны памятаць, што на сьвеце многа што мяняецца й усякія хітрыкі, ашуканствы, нажывы й злачынствы толькі да часу. Так, што ў грамадзкай, як і ў царкоўнай дзейнасьці трэба паступаць сумленна, бо нічога няма тайнага, каб ня сталася яўным.

(„Голас Часу" № 30 (3), Лёндан 1994 г.).

Паважаныя чытачы „Голасу Часу"

Вы трымаеце ў руках апошні нумар нашага двухмесячніка „Голас Часу". Чаму апошні? Адказ вельмі просты. Нічога няма ў жыцьці вечнага. Часопіс выходзіў захадамі двух асоб і вось адзін зь іх, тэхнічны супрацоўнік, па сваёй страсьці, мае ўжо досыць гэтай работы, а новага нікога няма, хто мог-бы яго заступіць. Таму „Голас Часу", пражыўшы поўных шэсьць гадоў, міма свае добрае волі, спыняе далейшы выхад.

Усё, што я хацеў-бы сказаць, як рэдактар, гэта падзякаваць усім людзям, як у Англіі, так і ў другіх краінах Захаду, а асабліва на Беларусі й некаторым беларусам, што апынуліся за межамі Беларусі ў былым СССР, за іхняе супрацоўніцтва з часопісам.

Асабліва хачу выказаць падзяку сябру Нясьвіжскай Настаўніцкай Сэмінарыі Аляксандру Баханчыку за яго сталае супрацоўніцтва з часопісам на працягу апошніх трох гадоў, які прысылаў у рэдакцыю свае артыкулы, а таксама выразкі з розных газэт і гэтым узбагачаў зьмест часопіса. Таксама маё шчырае дзякуй консулу А. Якавіцкаму за ягонае супрацоўніцтва з часопісам. Ня менш я ўдзячны Беларускай Дзяржаўнай Бібліятэцы й Бібліятэцы Якуба Коласа ў Менску ды іншым беларусам за прэсу, безь якой часопіс выглядаў-бы намнога бяднейшы. Нельга памінуць і Царкоўны Камітэт царквы сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Лёндане за фінансавую дапамогу, безь якой часопіс ніяк ня могбы выйсьці ў сьвет. Каштаваў ён царкве блізка 2 000 фунтаў у год. Мая падзяка й тэхнічнаму супрацоўніку Уладзіміру Грэмяку, які адбіваў, складаў і рассылаў гэты часопіс

ды стараўся зрабіць сваю работу чыста, акуратна й на час. І тут хачу я перапрасіць Паважаных Чытачоў за мэханічныя памылкі, якія закрадаліся ў часопіс. Ня маючы карэктара, цяжка было іх заўважыць, калі старыя вочы слаба сьвецяць. А што да правапісу, дык ён пакідаўся пераважна за аўтарамі.

Мне, як рэдактару, трэба было памятаць аб матэрыяле ў часопіс, бо сталых карэспадэнтаў „Голас Часу" ня меў, хоць і не адчуваў ён недахопу з матэрыялам. Але трэба было мець нешта ў запасе, на ўсякі выпадак, таму нешта пісалася наперад і гэты матэрыял заставаўся не выкарыстаны. Некаторыя артыкулы аказаліся далёка ад свайго заканчэньня ў часопісе.

Прыкра, што ў Вялікабрытаніі ня будзе ніякага беларускага выданьня. Ёсьць тут арганізацыя — Згуртаваньне Беларусаў Вялікабрытаніі (ЗБВБ), ёсьць старшыня, ёсьць заступнікі, сакратар і сябры Галоўнай Управы. Апошнімі гадамі прыехала ў Англію пэўная колькасьць маладых беларусаў і беларусак зь Беларусі, людзі адукаваныя, якія могуць нешта напісаць. Арганізацыя ЗБВБ мае фінансавыя магчымасьці й лёгка можа запачаткаваць выдавецкую дзейнасьць. Няма толькі ў гэтых людзей ініцыятывы, ахвоты, няма каму заняцца гэтай справай. Беларусы, якія прыехалі ў Англію апошнімі гадамі, гэта ня тыя, што прыехалі па вайне ў 1946 годзе й адразу ўзяліся за арганізацыйную й выдавецкую дзейнасьць. Ужо больш за 40 гадоў як ЗБВБ не выдае ніякай беларускай прэсы. Выходзіў некаторы час „Журнал беларускіх студыяў" на ангельскай мове ды й той ужо не паказваецца гады.

Арганізацыя павінна мець свой ворган — прэсу, як пасьведку свайго жыцьця і дзейнасьці, а не абмежавацца да сьвяткаваньня 25 Сакавіка, Слуцкай Абароны ды прыняцьця гасьцей зь Беларусі.

На заканчэньне яшчэ раз маё шчырае беларускае дзякуй усім беларусам добрай волі, якія былі для мяне дапамогай у выдачы часопіса „Годас Часу".

Жыве Беларусь!

(„Голас Часу" № 36 (3), Лёндан 1995 г.)

Аб Беларусі ў Лёнданскім універсытэце

Некаторыя беларусы Лёндану, як і англічане, зацікаўленыя гісторыяй Беларусі й яе дзяржаўнай незалежнасьцю, мелі нагоду спаткаць і паслухаць даклады беларускіх навукоўцаў зь Беларусі. Даклады вяліся па-ангельску ў адной з заляў Усходне-Славянскіх студыяў Лёнданскага ўніверсытэту.

І так, 25 лютага г.г. д-р Васіль Еўдакімаў, юрыдычны кансультант па беларускіх справах адной з лёнданскіх камэрцыйных фірмаў, зрабіў даклад аб сучасным праўным разьвіцьці на Беларусі. 4 сакавіка студэнт Віталі Зайко гутарыў аб жыдох на Беларусі. 11 сакавіка Ігар Бабкоў, асьпірант універсытэту па гісторыі філязофіі, прадставіў сучасную тоеснасьць Беларусі ў яе склаўшыхся абставінах. 18 сакавіка доктар філязофіі Тацьцяна Буйко гаварыла аб адукацыі на Беларусі, а пасьля яе выступіла асьпірантка па палітычных навуках Тамара Курбыка, якая згадала сучасную складаную эканамічную й палітычную сытуацыю на Беларусі.

Лекцыі былі цікавыя ў тым сэнсе, што дакладчыкі вялі іх з пункту гледжаньня навуковых досьледаў і апошніх назіраньняў, а не партыйных шаблёнаў, як гэта было раней на мітынгах. Пасьля кожнага дакладу слухачы ставілі дакладчыкам пытаньні. Завязвалася дыскусія, што яшчэ больш паясьняла тое ці іншае пытаньне, якое да гэтага часу ў савецкай навуцы прадстаўлялася ў скажоным выглядзе. Аднак на некаторыя пытаньні дакладчыкі не маглі даць канкрэтнага адказу й яго немагчыма было даць. Хадзіла тут аб палітычную будучыню Беларусі. На гэтае пытаньне была выказаная такая думка: ці будзе Беларусь лібэральна-дэмакратычная, ці сацыялістычна-дэмакратычная, ці нават дыктатарская, пакажа недалёкая будучыня.

Варта заўважыць, што ўсе дакладчыкі — людзі маладыя, ветлівыя й свабодна знаёміліся зь беларусамі Лёндану. Прыемна было спаткаць суродзічаў і запазнацца з некаторымі зь іх.

(„Голас Часу" № 24 (3), Лёндан 1993 г.)

Міністар замежных спраў Рэспублікі Беларусь наведаў беларусаў Англіі

Вечарам 11 кастрычніка 1993 году беларуская грамадскасьць Англіі мела гонар спаткаць першы раз свайго першага міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь д-ра Пятра Краўчанку, які прыехаў у Лёндан па запрашэньню брытанскага ўраду. Спатканьне адбылося ў залі Беларускай бібліятэкі Ф. Скарыны ў Лёндане. Прыехалі паслухаць свайго міністра ня толькі беларусы Лёндану, але й сотні кілямэтраў ад сталіцы. Госьця прывітаў старшыня ЗБВБ сп. Я. Міхалюк. Выступаючы перад аўдыторыяй міністар П. Краўчанка прадставіў сьпярша склад дэлегацыі Міністэрства замежных спраў Беларусі:

— Міхась Хвастоў — кіраўнік Дэпартамэнта дзяржаўнага пратаколу,

— Уладзімір Сакалоўскі — намесьнік кіраўніка Дагаворна-прававога дэпартамэнту,

— Віктар Гэйсік — выканваючы абавязкі кіраўніка Дэпартамэнту двухбаковых сувязяў.

Таксама былі прадстаўлены жонка міністра замежных спраў Галіна Краўчанка, консул у Лёндане Алег Якавіцкі й яго жонка Натальля Якавіцкая.

У сваёй звышгадзіннай прамове міністар Краўчанка парушыў розныя тэмы, якія датычаць жыцьця беларусаў у краі й за мяжой. Даклад быў цікавы, аб'ектыўны, без ніякіх перахвалак. Пасьля дакладу было многа розных пытаньняў і на іх міністар даваў адказы. Абмежаваньняў у пытаньнях не было. Пасьля заканчэньня афіцыйнага выступленьня й пытаньняў ад арганізацыі ЗБВБ былі ўручаны прэзэнты для міністра П. Краўчанкі й ягонай жонкі.

Было наладжана прыняцьцё ў гонар госьця й яго супрацоўнікаў. У гэтым часе некаторыя беларусы вялі размовы з П. Краўчанкам і таксама ставілі розныя пытаньні, асабліва аб сучасным стане Беларусі, бо-ж прыезд д-ра П. Краўчанкі адбываўся тыдзень пасьля крывавых падзей у Маскве.

На гэты гістарычны вечар запрошаны былі музыканты зь Беларусі, якія знаходзіліся ў Лёндане. Пад музыку не

ўстаялі й пасівеўшыя ды лысыя пэнсіянеры, якія пачалі круціцца, хоць зь ня той хуткасьцю, як гады раней. Але былі й маладыя танцоры. Аднак атракцыяй танцаў аказалася трохгадовая Жанна, дачка спадарства Якавіцкіх. Танцуючы сама яна зьвярнула на сябе найбольшую ўвагу прысутных. Ці часам ня быць ёй прыма-балерынай?

Беручы агульна, спатканьне беларусаў зь міністрам замежных спраў Беларусі было прыемным, людзі разьехаліся дамоў задаволеныя, бо мелі яшчэ нагоду спаткацца са знаёмымі, якіх ня бачылі гадамі.

Міністар замежных спраў Рэспублікі Беларусь быў запрошаны ў Вялікабрытанію брытанскім урадам. Госьць выступіў па радыёстанцыі Бі-Бі-Сі, дзе сказаў аб Чарнобыльскай трагедыі. Аб прысутнасьці міністра Беларусі ў Лёндане паведамілі галоўныя ангельскія газэты. Напрыклад, „Гардыян" за 14 кастрычніка 1993 г. парушыла гісторыю крыжа сьв. Еўфрасініі Полацкай, зробленага ювелірам Богшам у 1162 годзе. Да вайны 1941 году крыж знаходзіўся ў музэі Магілёва. У вайну крыж прапаў. Ёсьць меркаваньні, што крыж знаходзіцца ў амэрыканскага калекцыянера. Як падае „Гардыян" — паводле слоў д-ра Пятра Краўчанкі — „існуе такая вера, што шчасьце й дабрабыт вернуцца на Беларусь тады, калі вернецца назад крыж". Справа крыжа Еўфрасініі Полацкай, упрыгожанага каштоўнымі камянямі, ня ёсьць забытай. Беларускі ўрад зьвярнуўся да Інтэрпола з просьбай аказаць садзейнічаньне ў пошуках нацыянальнай рэліквіі беларусаў.

Газэта „Юропін" за 14 кастрычніка дала кароткую біяграфію сьв. Еўфрасініі Полацкай, змясьціла каляровы здымак яе крыжа, апісала яго гісторыю, калі ён быў зроблены, як прапаў у вайну й якую дарагую вартасьць прадстаўляе для беларусаў.

Больш шырэй пра Беларусь згадала газэта „Фінаншал Таймс". Яна прадставіла Беларусь як незалежную дзяржаву зь няяснай будучыняй. На гэта маюць складацца яе сьціплыя натуральныя багацьці, адсутнасьць натуральных граніцаў, нястача сыравіны й рускіх рублёў, інфляцыя й уваход Беларусі ў рублёвую зону з Расеяй. Газэта згадвае Зянона Пазьняка як лідэра БНФ, які хоча ўзьняць нацыянальнае

пачуцьцё народу й адмежавацца ад Расеі. Газэта піша аб Чарнобыльскай трагедыі, адмове Беларусі ад ядзернай зброі, ды прамаскоўскія сымпатыі, як гэта зрабіў Вячаслаў Кебіч, падпісваючы ваенны саюз з Расеяй супраць волі Станіслава Шушкевіча. Праўдзіва падаюцца й другія факты, якія не прадбачваюць нічога добрага ў эканоміцы Беларусі. Газэта „Фінаншал Таймс" зьмясьціла карту Беларусі й яе суседзяў.

У газэце „Таймс Гаер" за 22 кастрычніка 1993 г. зьмешчаны здымак міністра замежных спраў РБ д-ра П. Краўчанкі й ягоны аповед аб Беларусі. Сьпярша міністар гаварыў аб дамашніх складанасьцях, аб дэструкцыі ядзернай зброі, якую атрымала Беларусь у спадчыну пасьля распаду Савецкага Саюзу, аб перабудове ваеннай індустрыі на мірныя мэты, на што Беларусь атрымала малую дапамогу звонку за выняткам ЗША.

— Паколькі Беларусь прыняла ўдзел у міжнароднай супольнасьці, — сказаў д-р Краўчанка, — заданьнем ёсьць пераканаць супольнасьць аб існаваньні Беларусі. Раней гаварылі аб Беларусі як частцы Расеі й Польшчы, а яе мову лічылі расейскім або польскім дыялектам.

У сваёй прамове ў Каралеўскім інстытуце міжнародных адносін палову свае прамовы міністар Краўчанка прысьвяціў Беларусі, якая мае больш за тысячагадовую гісторыю. Таксама ўспамянуты былі сталінскія чысткі, якія пачаліся ў 1928 годзе й зьнішчылі беларускую інтэлігенцыю. Беларуская гісторыя й культура былі паніжаны, а мова зьнікла з публічнага ўжытку.

Адрадзіць нацыянальнае жыцьцё беларускага народу, — сказаў міністар, — „штодзённае заданьне". Многа што робіцца. Беларуская мова вяртаецца ў публічнае жыцьцё, у школы. Вядуцца перагаворы з суседзямі аб вяртаньні гістарычнай літаратуры й музэяў і т.п.

У канцы прамовы д-р П. Краўчанка сказаў, што Беларусь ніколі не існавала як незалежная дзяржава ў сёньняшнім значэньні, але продкі беларусаў выконвалі галоўныя ролі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Мовай гэтай дзяржавы была мова беларуская, аб чым сьведчыць Статут 1588 году.

Так гэта ў скарачэньні выглядалі выступленьні міністра замежных спраў Беларусі ў Лёндане.

Прыезд міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь у Лёндан, як бачым, стаўся гістарычным. Сувэрэннасьць Беларусі прызналі шматлікія дзяржавы. Каб паставіць Беларусь на адпаведны ўзровень, каб яна мела пашану сярод дзяржаваў сьвету, аўтарытэтам павінен карыстацца ў першую чаргу ўрад і парлямант. На жаль, Беларусі гэтага не хапае, ёю кіруе старая камуністычная намэнклятура.

(„Голас Часу" № 28 (1), Лёндан 1994 г.)

Мінулае і сучаснасьць Беларусі

Сакавік у жыцьці беларускага народу

Сакавік — першы весьнік вясны, які сваімі цёплымі прамянямі разьбівае ледзяныя й сьнежныя аковы зямлі пасьля яе доўгага зімовага сну, абуджае прыроду да жыцьця й дае ёй пачаткі росту, разьвіцьця й красы. Недарма народная мудрасьць так трапна ахрысьціла гэтакім назовам месяц году сакавік у беларускім календары. Само слова „сакавік" абазначае нешта сакавітае, багатае, поўнае жыцьцёвых сокаў і таму месяц сакавік зьяўляецца сымбалем вясны-надзеі.

Калі заглянуць у гісторыю беларускага народу, то месяц сакавік зьяўляецца яму асаблівым, багатым на здарэньні нацыянальна-гістарычнага характару. На старонках гісторыі Беларусі сакавік запісаны як месяц вялікіх нацыянальных здарэньняў, парываў, узрываў, імкненьняў да збройнага, творчага й незалежнага жыцьця беларускага народу, як месяц актаў, чынаў і сумных падзеяў.

Для беларусаў месяц сакавік зьяўляецца ня толькі вясною, у значэньні пары году, але вясной нацыі. Сакавіковая вясна асьвятляе сваімі прамянямі падзеі нашых продкаў, дадаючы нам веры, надзеі, любові, сілы, гарту й ахвоты працаваць і змагацца за тыя акты-чыны, якія здарыліся якраз у сакавіку месяцы.

Цяпер глянем бліжэй на важнейшыя здарэньні, якія ў жыцьці беларусаў прынёс месяц сакавік на працягу нашае гісторыі.

3 сакавіка 1067 году на рацэ Нямізе адбыўся вялікі бой паміж палачанамі й кіеўлянамі. Полацкім князем у той час быў Усяслаў Чарадзей, які княжыў 57 гадоў (1044-1101) і быў адным з найслаўнейшых беларускіх князёў.

З таго часу прайшлі стагодзьдзі, калі сын зямлі нашай доктар Францішак Скарына з Полацку, здабываючы асьвету сьпярша ў Кракаўскім унівэрсытэце, а пасьля ў Падуі (Італія), доўга вандруючы па свеце, здабыў вялікую славу за Захадзе Эўропы й вярнуўся на сваю бацькаўшчыну, дзе 25 сакавіка 1525 году заснаваў у Вільні першую ў Вялікім Княстве Літоўскім друкарню.

Жывучы раней у чэшскай Празе, Скарына заняўся перакладам кніжак на беларускую мову, каб зрабіць іх даступнымі, як зазначыў сам перакладчык, „людзям простым, паспалітым". Такім чынам у 1517 годзе Скарына надрукаваў Біблію па-беларуску, якая была трэцяй у Эўропе — пасьля нямецкай і чэшскай.

11 сакавіка 1566 году быў зацьверджаны Статут Вялікага Княства Літоўскага (другое выданьне). Для беларусаў Статуты ВКЛ зь іх трыма рэдакцыямі (1529, 1566 і 1588) зьяўляюцца надзвычай важнымі культурнымі, літаратурнымі й дзяржаўнымі праўнымі дакумантамі нашай слаўнай мінуўшчыны.

Сярод слаўных старонак месяца сакавіка выступаюць і сумныя, трагічныя. Гісторыя Беларусі быццам той вулкан, што пэўны час адзываецца грохатам і агнявымі ўзрывамі, якія прыносяць людзям няшчасьці ў іхнім жыцьці. Такі трагічны лёс напаткаў маладога Кастуся Каліноўскага, сына ткача з-пад Сьвіслачы Ваўкавыскага павету. Будучы яшчэ студэнтам Пецярбургскага ўнівэрсытэту, Кастусь Каліноўскі захапіўся вызвольнымі, сацыяльнымі й рэвалюцыйнымі рэформамі.

Вярнуўшыся на радзіму, малады й энэргічны юрыст пачаў ажыўленую рэвалюцыйную дзейнасьць, якая выявілася ў паўстаньні супраць царызму за лепшую долю й быт для беларускага працоўнага люду.

За яго рэвалюцыйную дзейнасьць царскі ўрад сьмяротна пакараў „дыктатара Беларусі — Літвы", які загінуў на шыбеніцы 10 (22) сакавіка 1864 году на Лукішскім пляцы ў Вільні, маючы 26 год.

Перад сваёю сьмерцю, будучы ў астрозе, Каліноўскі пісаў лісты й вершы „Да люду беларускага", якія мелі быць павучэньнем на будучыню!

Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасьці, жыві ў свабодзе,
І часам спамяні пра Яську свайго,
Што згінуў за праўду для дабра твайго.

Ідучы на шыбеніцу губэрнатара Мураўёва, К. Каліноўскі да апошняй хвіліны свайго жыцьця захаваў і пакінуў нам чысьціню ідэі сапраўднага рэвалюцыянера-дэмакрата, які горача любіў свой народ і край і за іх аддаў сваё маладое жыцьцё.

Маючы на ўвазе сьмерць беларускіх паўстанцаў на чале з К. Каліноўскім і варожасьць царскага ўраду да беларусаў, Ігнат Грынявіцкі памсьціўся Аляксандру II, кінуўшы 1 сакавіка 1881 году пад яго бомбу. Бомба забіла цара, але сьмяротна раніла й самога Грынявіцкага, які ў той самы дзень уначы памёр ад ранаў, маючы 25 год.

Гады ішлі, змаганьне працягвалася, нацыянальная сьвядомасьць беларускага народу ўзрастала. Царскі ўрад змушаны быў пайсьці на некаторыя ўступкі нацыянальным меншасьцям.

У часе Вялікай Расейскай рэвалюцыі 1917 году беларуская інтэлігенцыя й студэнцтва прынялі актыўны ўдзел у нацыянальнай дзейнасьці, яўна выступаючы на мітынгах і зьездах, выносячы рэзалюцыі з дамаганьнямі незалежнасьці Беларусі.

15 сакавіка 1917 году ў Пецярбургу зьявілася дэкляцыя беларусаў, у якой гаварылася аб падзеле Расеі на фэдэральныя рэспублікі.

25 сакавіка 1917 году ў Менску адбыўся зьезд Беларускай сацыялістычнай грамады, які дамагаўся аўтаноміі Беларусі ў фэдэрацыі з Расейскай Рэспублікай.

25, 26 і 27 сакавіка 1917 году ў Менску адбыўся зьезд усіх беларускіх арганізацыяў, якія пастанавілі імкнуцца да перабудовы Расейскай Імпэрыі з тым разьлікам, каб Беларусь была незалежнай рэспублікай. У канцы зьезд выбраў Беларускі Нацыянальны Камітэт.

Гэты перыяд часу быў на Беларусі вельмі бурлівы. Памінаючы другія важныя падзеі й зьмены, якія праходзілі ў Расеі й на Беларусі ў выніку вайны, варта згадаць Другую Ўстаўную Грамату, выдадзеную 9 сакавіка 1918 году Радай Першага Ўсебеларускага Зьезду, якая складалася з 8-мі пунктаў і акрэсьлівала дзяржаўны лад Беларусі.

Маладая Беларуская Народная Рэспубліка ня мела свае арміі й не магла абараняць свае дзяржаўнай незалежнасьці. На Беларусі ішло змаганьне Чырвонай Арміі з Польскім Войскам Пілсудскага. Змаганьне закончылася падпісаньнем Рыжскага трактату 18 сакавіка 1921 году й падзелам Беларусі.

Рада БНР змушана была пакінуць Беларусь і эміграваць на Захад. 8 сакавіка 1928 году памёр яе старшыня — Пётра Крэчэўскі.

У міжваеннай Польшчы шырока разгарнула сваю дзейнасьць Беларуская сялянска-работніцкая грамада, якая налічвала больш за 100 000 сяброў. За яе адкрытую нацыянальна беларускую дзейнасьць 21 сакавіка 1927 году польскія ўлады зьліквідавалі БСРГ, а яе кіраўнікі пайшлі на суд і атрымалі да 12 гадоў зьняволеньня.

У часе Другой Сусьветнай вайны ў Вільні ў сваім памешканьні 5 сакавіка 1944 году, як некаторыя кажуць, быў замардаваны польскімі шавіністамі беларускі драматург Францішак Аляхновіч, які раней пабываў у кіпцюрох ГПУ.

Згадаем, што 14 сакавіка 1948 году ў Лёндане заснавана была беларуская арганізацыя — Хрысьціянскае Аб'яднаньне Беларускіх Работнікаў (ХАБР).

9 сакавіка 1952 году ў горадзе Манчэстэр (Англія) адбылася Канфэрэнцыя Беларускіх Жаўнераў з мэтай каардынацыі Беларускага Антыбальшавіцкага Фронту й арганізацыі Штаба Беларускага Вызвольнага Руху.

Як кожны адзін месяц прыносіць у годзе большыя ці меншыя здарэньні, таксама сакавік у жыцьці беларускага народу можа прынесьці нам шмат новых і пацяшаючых падзеяў, аб якіх варожыць будучыня.

(„Аб'яднаньне" № 2 (60), Лёндан 1956 г.).

„Старажытная Беларусь"

Пад такім загалоўкам вясной гэтага году паявілася кніжка вядомага й папулярнага беларускага гісторыка Міколы Ермаловіча. Наклад 20 тысяч асобнікаў і ўжо выданьне імгненна зьнікла з кніжных паліц. Яе змаглі атрымаць, можна сказаць, людзі, якім пашчасьлівілася. А такая кніжка павінна быць у кожнай беларускай хаце, калі мы хочам нешта знаць аб сваёй раньняй гісторыі, каб гаварыць аб беларускай дзяржаўнасьці й яе будучыні.

У параўнаньні да іншых савецкіх выданьняў па гісторыі Беларусі, кніжка М. Ермаловіча зьяўляецца кантрастам. Аўтар глядзіць далёка ў сівую старыну, у пару тварэньня самастойных княстваў і разглядае Полацкі й Наваградзкі перыяды. На 336 старонках друку маюцца такія загалоўкі:

1. З нашай перадгісторыі
2. Беларусь у сярэдзіне IX да канца X стагодзьдзя
3. Беларусь у XI стагодзьдзі
4. Беларусь у XII стагодзьдзі
5. Беларусь у першай палове XIII стагодзьдзя
6. Утварэньне й умацаваньне Вялікага Княства Літоўскага

У прадмове да „Старажытнай Беларусі" Міхась Ткачоў — доктар гістарычных навук — піша:

„У сваіх разважаньнях і вывадах М. Ермаловіч мае менш аргумэнтаў, чымся многія зь яго апанэнтаў, якія, як і ён, карыстаюцца данымі з тымі-ж нешматлікімі летапіснымі зьвесткамі.

Перакрыжаваны аналіз рускіх, беларуска-літоўскіх летапісаў, таціщчаўскіх зьвестак, нямецкіх і польскіх хронік дазволілі аўтару грунтоўна прасеяць гісторыю Полацкай і іншых земляў і адкінуць пустую мякіну, выказаць трапныя й слушныя меркаваньні, здагадкі, заўвагі".

Кніжка „Старажытная Беларусь" гэта бадай адна зь першых кніжак, якая дэталёва разглядае пачаткі беларускай гісторыі й уваходзіць у пару ўтварэньня й умацаваньня новай дзяржавы, якой было Вялікае Княства Літоўскае. Важна й тое, што аўтар памінуў шаблённую ідэалягічную догму, якая праз даўжэйшы час дамінавала па ўказаньнях партыйнага апарату. Гэта надало кніжцы сапраўдны навуковы

зьмест і аб'ектыўную ацэнку чытача, каб па-новаму асэнсаваць падзеі нашай далёкай мінуўшчыны.

Варта згадаць, што ў 1989 годзе выдавецтва „Навука і Тэхніка" выдала кніжку М. Ермаловіча „Па сьлядах аднаго міфа". На 94-х старонках маюцца такія загалоўкі:

1. На ўзраўні XVI ст.
2. Ці толькі раздробленасьць?
3. Дзе была летапісная Літва?
4. Літоўскія набегі й славянская каланізацыя
5. Для каго была большая пагроза?
6. Што-ж заваяваў Міндоўг?
7. Палітыка Войшалка й другое заваяваньне Літвы.

Аўтар і тут дэталёва разглядае гістарычны матэрыял, які асьвятляе пытнаньне ўтварэньня Вялікага Княства Літоўскага. У прадмове да гэтай кніжкі доктар гістарычных навук П. В. Аляксееў піша:

„Гэтая кніга прысьвечана эпосе стварэньня Вялікага Княства Літоўскага — часу мала асьветленаму паўнацэннымі крыніцамі і, як паказвае аўтар, яшчэ недастаткова вывучанаму. Нанова пераглядаючы гістарычныя зьвесткі, якія датычаць гэтай праблемы, М. Ермаловіч даволі абгрунтавана адмаўляе заваяваньне ў XIII ст. беларускіх земляў літоўцамі, што лічылася дагэтуль бясспрэчным фактам. Замест гэтага ён прапануе арыгінальную канцэпцыю й пацьверджаньне яе спасылкамі на крыніцы. (...) Галоўнае тое, што ў кнізе шмат новых, арыгінальных думак, якія, несумненна, заслугоўваюць таго, каб быць уведзенымі ў навуковы ўжытак. Яны будуць стымуляваць працу дасьледчыкаў, вымусяць перагледзець застарэлыя ў нашай гістараграфіі погляды".

У 1991 годзе гэтая кніжка была перавыдадзена, што сьведчыць аб яе папулярнасьці ў народзе. І тут трэба сказаць, што кніжка „Па сьлядах аднаго міфа" была напісана дваццаць гадоў таму, але кнігі гісторыка Ермаловіча ніхто не хацеў у той час друкаваць. Афіцыяльная цэнзура не магла прапусьціць тое, што пісаў Ермаловіч. Ён быў „вораг народу". У інтэрв'ю дадзеным Тацьцяне Антонавай („Голас Радзімы" № 14 за 4 красавіка 1991 г.) ён кажа: „Мая беларускасьць рэзала вочы ўладам на працягу доўгага часу. Я-ж заўсёды гаварыў па-беларуску. Думаў таксама па-беларуску. Раскажу вам такі вы-

падак. У 1966 годзе начальнік Маладзечанскага Камітэта дзяржаўнай бясьпекі Іваноў выступаў на нейкай нарадзе агітатараў і папераджаў слухачоў аб пільнасьці, аб ворагах. Сказаў таксама, што й у іх на Маладзечаншчыне ёсьць такое „живое ископаемое" — Мікола Ермаловіч. (...) Людзі, якія слухалі палымяныя выступленьні, расказвалі, што прамоўца нават цытаваў некалі сказанае мною ў 1948, 1950, 1960 гадах".

Інтэрв'ю з Міколам Ермаловічам Тацьцяна Антонава заканчвае так: „Глыбокія зморшчыны парэзалі твар майго субяседніка. За тоўстым шклом акуляраў — спакойныя вочы сумленна пражытага на зямлі чалавека, якога лёс захаваў для нас з вамі, для Беларусі. Перажытае, вядома, пакінула рубцы й шрамы на сэрцы, але не зрабілі яго ні злым, ні жорсткім, ні пакрыўджаным на ўвесь сьвет. Зь нейкай дзіцячай даверлівасьцю, бясхітраснасьцю расказвае М. Ермаловіч пра сябе. Зь цеплынёй і ўдзячнасьцю пра сяброў. Але так і не вымавіў ён услых словы пра сваю такую выпакутаваную й такую пяшчотную, пранізьлівую любоў да зямлі продкаў, да сваіх супляменьнікаў, ды любоў гэтая й адданасьць Беларусі — у кожным яго ўчынку, у кожным радку напісаных ім кніг".

Абставіны, у якіх прыходзілася працаваць гісторыку Міколу Ермаловічу мы ўжо ведаем. Але ня ўсе ведаюць, што аўтар беларускіх кніжак мае й другія праблемы ў сваёй працы, а гэта — слабы зрок, які ўскладняе яго працу. Шмат яму памагала жонка, чытала літаратуру й таму вучоны сваю выдатную працу „Старажытная Беларусь" прысьвяціў „памяці жонкі Лідзіі Цімафееўны Ермаловіч".

Як даведваемся, М. Ермаловіч працягвае пісаць гісторыю Беларусі. Застаецца толькі пажадаць ахвярнаму гісторыку добрага здароўя (у красавіку споўнілася яму 70 гадоў) і посьпехаў у дасягненьні намечанай мэты.

(„Голас Часу" № 13 (4), Лёндан 1991 г.)

Галасы аб Грунвальдзкай бітве

15 ліпеня гэтага году споўнілася 580 гадоў, калі аб'яднаныя сілы Вялікага Княства Літоўскага й Польшчы разьбілі наголаў нямецкіх рыцараў крыжакоў зь іхнімі памагатымі пад Грунвальдам і забясьпечылі сваім народам спакой на 500 гадоў.

На афіцыяльнай урачыстасьці, якая адбылася з гэтай нагоды на ратным полі, прысутнічалі дзяржаўныя дэлегацыі Польшчы й Літвы. Што да Беларусі, то ў чэрвені й ліпені Камісія па адукацыі, культуры й захаваньню гістарычнай спадчыны правяла шэраг паседжаньняў. Камісія рэкамэндавала Савету Міністраў БССР прыняць пастанову з нагоды 580-годзьдзя перамогі над крыжацкай навалай пад Грунвальдам, аб ушанаваньні гэтай гістарычнай даты, падзей і асоб зь ёю зьвязаных. Аднак Вярхоўны Савет БССР не паслаў сваю дэлегацыю на ўрачыстасьць. Толькі дзякуючы прыватным асобам і некаторым беларускім арганізацыям, якія памяталі гэтую гадавіну, прыбылі пад Грунвальд беларусы зь бел-чырвона-белым сьцягам, каб разам зь літоўцамі й палякамі аддаць пашану палеглым у баі продкам. За гэта належыцца ім вялікая ўдзячнасьць.

Аднак, як даведваемся зь „Нівы" ад 9 кастрычніка 1990 году, „на гучна сьвяткаваную на Грунвальдзкім полі 580-ю гадавіну славутай бітвы прэзыдэнт Рэчы Паспалітай запрасіў сяброў зь Вільні, Прагі й Масквы, а для гасьцей зь Менску й Кіева запрашэньняў не хапіла, мабыць, з-за крызіснага недахопу паперы ў Польшчы".

Часта здараецца, што перамогу ў баі многа хто прыпісвае сабе, свайму войску, а паражэньне звальвае на некага іншага. Нешта падобнае было й тут. Таму ў гэтым артыкуле мы паслухаем некаторых аўтараў, што яны гавораць аб Грунвальдзе ў той гарачы ліпеньскі дзень 1410 году.

У гісторыі й літаратуры аб бітве пад Грунвальдам (або Танэнбэргам) прынята пісаць, а часта й гаварыць як аб самай буйнай эўрапэйскай бітве сярэднявечча. У сапраўднасьці пачалася яна й вялася праз некалькі гадзін у трыкутніку й нават за трыкутнікам Танэнбэрг — Ладвігова — Грунвальд. Адлегласьць паміж гэтымі вёскамі была каля трох кілямэтраў.

На ўсход ад гэтага трыкутніка, каля возера Лубень, разлажыўся табар саюзьнікаў, а каля вёскі Грунвальд — тэўтонскі табар. Але таму, што бой пачаўся бліжэй Танэнбэргу й закончыўся ў табары праціўніка, таму й усю бітву некаторыя аўтары называюць Танэнбэргскай або Грунвальдзкай.

Найбольш інфармацыяў аб Грунвальдзкім баі знаходзім у Яна Длугаша, польскага гісторыка. Нарадзіўся ён пяць

гадоў пасьля гэтай гістарычнай бітвы, але яго бацька й дзядзька былі пад Грунвальдам і нешта расказалі маладому Длугашу.

Апісваючы бітву пад Грунвальдам Длугаш рабіў гэта ня толькі з апавяданьняў бацькі й дзядзькі, але, як духоўная асоба й навуковец, меў доступ да больш аўтарытэтных крыніцаў. Длугаш жыў у Кракаве на рагу вуліцы Кананічнай, у самым падножжы Вавэля, у недалёкім суседзтве з каралеўскай сядзібай і катэдрай. Гэта давала яму магчымасьць спатыкацца й гутарыць з рознымі людзьмі, якія былі пад Грунвальдам і лепш арыентаваліся за яго бацьку ды дзядзьку й зналі, хто сапраўды кіраваў ходам бітвы й як яна праходзіла.

Тут варта згадаць Зьбігнева Алясьніцкага, які ў часе бітвы знаходзіўся пры баку Ягайлы як ягоны сакратар. Пасьля, будучы кракаўскім біскупам, Алясьніцкі ўгаварыў Длугаша, як свайго шматгадовага супрацоўніка й прыяцеля, напісаць гісторыю Польшчы й даў яму нямала матэрыялу.

Дарэчы згадаць і аднесьці да ліку важнейшых гістарычных даных аб бітве пад Грунвальдам хронікі: Бэрнарда Вапоўскага, якая была напісана ў 1535 годзе па розных сабраных запісах як „Гісторыя" Длугаша, „Хроніка вайны", „Хроніка Лівоніі" Германа Варбэрга, „Хроніка Яна Посільге".

Прымаючы ўсе гэтыя й іншыя хронікі, трэба памятаць, што тагачасны ход выпадкаў пад Танэнбэргам-Грунвальдам ня можа быць пададзены ў сваёй пасьлядоўнасьці так, як гэта ўсё адбывалася ў сапраўднасьці. Не было тады ваенных карэспандэнтаў, якія ад пачатку да канца зафіксавалі-б найменшую дэталь падрыхтоўкі й сам ход бою. Таму некаторыя інфармацыі аб Танэнбэргскай бітве не заўсёды згодны між сабою.

Маецца, напрыклад, расказ аб двух мячах, якія вялікі магістар фон Юнгінген прыслаў у лягер саюзьнікаў, як выклік да бою. Згодна інфармацыі Длугаша, мячы прыняў адзін Ягайла, бо вялікі князь Вітаўт, быццам, заняты быў падрыхтоўкай войска да бою. Але ў пісьме Ягайлы з-пад Грунвальду да каралевы Ганны гаворыцца, што крыжацкія паслы зьвярталіся да караля й вялікага князя. Таксама Вапоўскі й „Хроніка вайны" падаюць, што Ягайла ўзяў адзін меч, а другі ўручыў Вітаўту. Гэтая апошняя інфармацыя ёсьць больш ве-

рагоднай. Аб ёй сьведчаць выказваньні польскіх паслоў на касьцельным саборы ў Канстанцу (1414-1418). Далей Вапоўскі ўспамінае, што апошняй ночы перад боем у лягеры крыжаносцаў прайшла вялікая бура, а ў палякаў стаяла цішыня й сьвяціў месяц. Аднак у лягеры саюзьнікаў прайшла бура й нарабіла шкоды, калі на прапанову Вітаўта было пастаноўлена пераехаць у ваколіцы возера Лубень на адпачынак.

Для гісторыі важна ўсё, што аб Грунвальдзе запісаў Ян Длугаш з расказаў навочных сьведкаў, удзельнікаў бітвы, а ў тым ліку бацькі й дзядзькі, а галоўна інфармаці ад Зьбігнева Алясьніцкага, які ўвесь час быў пры баку Ягайлы й наглядаў за ходам бітвы. Гэты якраз матэрыял увайшоў у гісторыю й паслужыў крыніцай для наступных дасьледчыкаў.

Усё-ж некаторыя польскія гісторыкі маюць засьцярогі да Длугаша й інтэрпрэтуюць некаторыя яго выказваньні па-свойму, каб Ягайлу, як польскаму каралю, надаць аўтарытэт. Засьцярогі могуць быць, але ці яны слушныя?

Цікава, што Ян Длугаш, як паляк і каталіцкі манах, насьцярожана выказваецца аб дзейнасьці свайго караля й ягонай рэлігійнасьці, якая не была пазбаўлена забабонаў. Длугаш кажа, што захаваньне Ягайлы пад Грунвальдам было часам небясьпечнае, трагічнае, аднак ён праз свае малітвы атрымаў ад Бога больш перамог як мячом на вайне. Хоць Длугаш піша аб Ягайлу скромна й часам паніжаюча, але за тое павышае палякаў. Такой думкі трымаюцца іншыя польскія гісторыкі, якія хочуць прыпісаць Ягайлу й польскай арміі ўсе заслугі як дыпляматычныя, так і мілітарныя пад Грунвальдам. Напрыклад, прыпісваецца Ягайлу камандаваньне арміяй, што ў сапраўднасьці не адпавядае праўдзе. Для наяўнасьці, „Пшэглёнд Гісторычны" (1910 г.) пісаў: „Галоўнакамандуючы, які мае кіраваць боем, павінен знаць дакладна распалажэньне й становішча сваіх войск і паасобных яго аддзелаў; Ягайла гэтага знаць ня мог, бо-ж у часе падрыхтоўкі войска маліўся".

Вапоўскі падае, што Ягайла марудзіў і ня мог рашыцца ўзяць на сябе камандаваньне, а толькі загадаў адслужыць імшу й „узьнёсшы рукі, глядзеў у неба й нерухома маліў Бога аб перамозе". Храніст асуджае караля, які „замкнуўся ў капліцы, калі вораг ужо наступаў".

У гісторыі не знаходзім, каб Ягайла калі-небудзь ці дзенебудзь камандаваў арміяй і папісаўся ў баі як здольны камандзір. Быў ён чалавек аспалай, упартай, самавольнай натуры. Ня ўмеў Ягайла ані пісаць, ані чытаць, а гутарыў пераважна па-беларуску й знаў літоўскую мову. Як падаюць некаторыя аўтары, Ягайла любіў ляжаць у ложку да поўдня, а пасьля праводзіў гадзіны за багатым сталом. Калі зрабіў у чым памылку, то цяжка было прывесьці яго да сэнсу, зразумець яе. Знаючы добра Ягайлу, аднойчы крыжакі напісалі яму зь іроніяй: „Як гэта вашая вяльможнасьць сама лёгка разумее ў сваёй уроджанай мудрасьці" .

Лянівы быў Ягайла да ўсякай працы, ці была гэта фізычная ці разумовая, але калі прыходзіла да паляваньня, то ён летам і зімою ганяўся па літоўскіх пушчах. Сярод польскай арыстакратыі вядомы быў як „прасьцяк". Лёгка падаў у злосьць і мог пасадзіць у турму абы-каго за нішто. Таму на канфэрэнцыях яго заўсёды нехта суправаджаў, каб захаваць мірны настрой і дыпляматычную тактыку.

Хоць Ягайла быў бедны розумам, але гарэў прагай славы. Як піша Павал Ясяніца, „Ягайлу не хапала культуры як палітычнай, так і асабістай і гэты факт адбіўся на лёсах польскай манархіі". А Павал Зарэмба піша, што Ягайла „быў бадай сьведкам чымся акцёрам падзеяў, у якіх прыпісвалі яму галоўную ролю". Так вось выказваюцца аб Ягайлу, як аб сваім каралю, польскія гісторыкі.

Пад Грунвальдам Ягайлы быццам і не было. Але гэты чалавек меў прыроджаную пасьпяховасьць, якую называюць — шчасьцем. А будучы даўжэйшы час у Кракаве, яго палякі крыху ачасалі.

Сапраўдным архітэктарам і ініцыятарам перамогі над крыжакамі пад Танэнбэргам аказаўся вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага Аляксандар Вітаўт, дваюрадны брат Ягайлы. Яго выдатныя здольнасьці й ваяўнічы тэмпэрамант засланялі Ягайлу. Вітаўт быў зусім іншы чалавек. Меў ён прыроджаныя здольнасьці. Вітаўт знаў некалькі моваў, што ўздымала яго аўтарытэт на міжнародных канфэрэнцыях і ня менш цікавіўся ваеннымі справамі. Бацька яго, Кейстут, часта пасылаў сына на чале атраду ў разьведку да крыжакоў, каб прывучыць хлапца да збройнай барацьбы. Так што

Вітаўт змалку правёў жыццё ў небясьпеках. Ён прымаў удзел у ваенных паходах на Маскву, Брандэнбург, Прусію, Мадзьяршчыну й на татараў, даходзячы да берагоў Чорнага мора. І ёсьць праўдай, што Вітаўт цярпеў паражэньні й нават вялікія, як пад Ворсклай. Але найбольш чалавек вучыцца на сваіх памылках. Таму, вось, Вітаўт прайшоў небывалую школу розных баёў, выпрабаваньняў і быў дастаткова запазнаны са штукай манголаў і ня менш з тактыкай і тэхнікай крыжакоў.

З польскага боку, праўдападобна, адзначылася мала каму вядомая постаць ціхага, але энэргічнага Зындрама з Машковіц, камандзіра Кракаўскай харугвы, заслугі якога польскія гісторыкі прыпісалі Ягайлу. Ёахім Лелевэль у сваім „Дзела", падае, што палякі мелі пад камандай Зындрама Машкоўскага, мечніка кракаўскага, 51 харугву. Аднак Зындрам ня быў узнагароджаны Ягайлам за свой удзел у бітве, як іншыя польскія камандзіры ніжэйшага рангу, ды па невядомых прычынах адабралі ад яго камандаваньне Кракаўскай харугвай.

Пакінуўшы Зындрама Машкоўскага ў цяні, палякі выцягнулі на сьвятло ўрадоўца кракаўскага двара Зьбігнева з Бжэзя. У кожным выпадку абодва яны, ці кожны паасобку, больш спрычыніліся ў баі за Ягайлу. Трэба памятаць, што перад боем і пасьля бою Ягайла карыстаўся Ваеннай Радай, на чале якой стаяў Вітаўт і меў рашаючы голас. Длугаш падае, што ў вядзеньні войнаў Ягайла быў нядбалы й цяжкі, усё ўскладаў на камандзіраў і заступнікаў.

Быццам пад Грунвальдам Ягайла ахвяроўваў камандаваньне арміяй чэху Сокалу, але апошні ветліва адмовіўся. У часе бою Сокал знаходзіўся пры каралю, а яго жаўнеры з Багеміі й Маравіі прымалі ўдзел у баі й адзначыліся, за выняткам аднае харугвы ўзначаленай Янам Сарноўскім, якая ня вытрымала націску ворага й пакінула поле бою. Але пад намовай ксяндза Яраша й папрокам кароннага падканцлера яна зноў далучылася да польскага войска.

Прафэсар Оксфардзкага ўнівэрсытэту Б. Р. Морфіл у сваёй кнізе на ангельскай мове „Расея" (1890 г.), успамінаючы разгром крыжакоў і Вітаўта, піша: „Супольна з польскай арміяй, ён (Вітаўт) выйграў важную бітву пад Танэнбэргам у 1410 годзе супраць тэўтонскіх рыцараў".

Таксама Бэрнард Парэс, прафэсар расейскай гісторыі, мовы й літаратуры, у сваёй кнізе на ангельскай мове „Гісторыя Расеі" падае: „Вітаўт, трэба прызнаць, у 1410 годзе зламаў хрыбет Тэўтонскаму ордэну, калі вёў супраць яго свой вялікі славянскі крыжовы паход і выйграў бой пад Танэнбэргам".

Ёсьць і польскія пісьменьнікі, гісторыкі й мастакі, якія прыпісваюць Вітаўту, а не Ягайлу, перамогу пад Грунвальдам. Напрыклад, вядомы польскі мастак Ян Матэйка, прадстаўляючы перамогу славянскіх народаў і літоўцаў над тэўтонскімі захопнікамі пад Грунвальдам, паказаў Вітаўта цэнтральнай фігурай у бітве.

Вядома, што раніцай перад боем Ягайла выслухаў дзьве імшы запар, а пасьля доўга маліўся, спавядаўся й прычашчаўся. Наступна пасаваў рыцараў, аж „забалела яму рука", — так пішуць некаторыя польскія аўтары. Выдаў пароль да бою „Кракаў" і „Вільня" й сказаў свайму войску навязаць саламяныя павязкі на рукавох, каб адрозьніць яго ад крыжацкага войска. Пасьля гэтага прыняў два голыя мячы ад крыжацкіх паслоў і даў знак польскаму войску да бою. Гэта ўсё, што мы ведаем аб Ягайлавай падрыхтоўцы да бою.

У часе бою Ягайла знаходзіўся пад аслонай, замаскаваны, каб ня толькі вораг, але й свае ня зналі, дзе ён знаходзіцца, — так падае Длугаш. Аднак адзін зь нямецкіх рыцараў, мабыць, заўважыў у тыле Ягайлу, скіраваў сваё кап'ё й ляцеў на кані проста на караля, але яго выбіў зь сядла Зьбігнеў Алясьніцкі, які быў прыбочным сакратаром. Ягайла пад'ехаў да дрыжачага на зямлі рыцара й стукнуў яму па лбе. Гэта ўсё, што мы знаем аб баявой дзейнасьці польскага караля Ягайлы.

Ёсьць успаміны, што, быццам, Ягайла рваўся да бою, але яго стрымалі свае. Ягайла мог рвацца, але не вырваўся, бо знаў, што яго ня пусьцяць. Вядома, што для Ягайлы прыгатаваны былі хуткія коні да ўцёкаў, калі-б бой аказаўся прайграны. І гэты факт гаворыць за тым, што Ягайла ня мог камандаваць арміяй пад Грунвальдам і весьці яе да перамогі, калі прыгатаваны быў да ўцёкаў. Ён мог быць толькі намінальным галоўнакамандуючым і толькі польскай арміі, бо на чале арміі ВКЛ стаяў Вітаўт.

ХРЫСЬЦІЯНСКАЕ АБ'ЕДНАНЬКЕ БЕЛАРУСКІХ РАБОТНІКАЎ
У В. БРЫТАНІІ

АБ'ЕДНАНЬНЕ

МЕСЯЧНІК

ГОЛАС ЧАСУ

ЦАРКОЎНА-ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС

З В А Н І Ц А

ЦАРКОЎНА—ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС
ПРАВАСЛАЎНЫХ БЕЛАРУСАЎ У ВЯЛІКАЙ ВРЫТАНІІ

Даведваемся, што пасьля бою Ягайла аглядаў пабоішча, на каленях цалаваў зямлю, дзякаваў Богу за перамогу, адпачываў пад дрэвам, бо чуўся моцна стомлены й ня мог гаварыць — ахрып, „выдаючы загады". Але якія загады й каму — не сказана, а вядома, што ў часе бою Ягайла прасіў праз свайго сакратара суседні атрад, каб прыйшоў асланіць яго, што было рашуча адмоўлена камандзірам.

Што быў Ягайла стомлены й адпачываў, гэта нармальная рэч, але што тады гаварыць аб ваярах, якія не хаваліся за кустамі, а гадзінамі махалі, рубалі мячамі й іншай зброяй. Вітаўт зьезьдзіў пару коней у баі. Ён увесь час бою знаходзіўся ня толькі сярод свайго войска, выдаючы яму загады, але й сярод польскіх рыцараў, якім указваў чаргу й напрамак удару, кіруючы такім чынам усім ходам бітвы. Длугаш падае, што Вітаўт у часе бою езьдзіў безупынна паміж польскіх палкоў і харугваў, дзе на месца змучаных і хістаючыхся падцягваў сьвежыя сілы й зь імі ішоў у атаку.

Пяро напрошваецца вынесьці такое заключэньне, што ў адказны час гісторыі, калі рашалася жыцьцё ня толькі арміяў, але й славянскіх народаў, Ягайла, калі ня плакаў, то маліўся, а калі не маліўся, то прасіўся, або стаяў далей ад вялікіх рашэньняў. Як падае той самы Длугаш, Ягайла, памятаючы незадаваленьне каралевы Ядвігі па поваду праліцьця хрысьціянскай крыві, якая не хацела вайны й бою, таксама ўнікаў збройнага канфлікту, адкладаў яго й рашыўся толькі з прычыны тэўтонскай правакацыі. Але й яму належыць адна заслуга пасьля бою, а гэта за гуманітарны падыход да палонных і забітых крыжацкіх лідэраў.

Асабліва ў апошніх стагодзьдзях пачаліся шырэйшыя досьледы аб прычынах, ходзе й камандаваньні боем пад Грунвальдам. Як зазначана папярэдне, багатае апісаньне Грунвальду пакінуў на лацінскай мове Ян Длугаш. Але яго рукапіс ляжаў ня выкарыстаны аж да XVIII стагодзьдзя.

Немцы у той час мелі многа адукаваных людзей, якія вялі хронікі, але, як відаць, не былі яны зацікаўлены апісваць сваё паражэньне. А па-другое, усё начальства Тэўтонскага ордэну загінула ў баі за выняткам вялікага шпітальніка Тэтынгена, які зь вялікай пыхі раптоўна заламаўся. Крыжацкая эліта ў Прусіі была так вынішчана, што пасьля

бою не засталося аўтарытэтнага лідэра, зь якім можна было-б весьці гутарку аб міры, а тым больш каб нехта мог дакумантальна апісаць сваю трагедыю пад Танэнбэргам.

Што праўда, немцамі былі зроблены хронікі аб Танэнбэргскай бітве, але яны часта скажалі факты й перабольшвалі лічбы. Яны лічылі славян на сотні тысяч, якія быццам сваёю масай залілі немцаў. Таксама саюзьнікі немцаў пісалі на Захадзе ў сваіх хроніках, што пад Танэнбэргам выступалі супраць Ордэну пагане-літоўцы, татары й схізматыкі-русіны і быццам іхняя лічэбная перавага перавышала крыжакоў, якія ваявалі ў „абароне хрысьціянства".

У XV стагодзьдзі на старонках гісторыі можна было спаткаць успаміны з-пад Грунвальду, але былі гэта толькі зацемкі й больш нічога. Некаторыя пісалі вершы, складалі песьні, што выглядала больш на легенду, як на гістарычную веду аб Танэнбэргу.

З боку ўсходніх славян, асабліва на Беларусі, ёсьць запісы ў летапісах Аўраамкі, Быхаўца, Навагародзкім, Супрасьльскім, Львоўскім, Васкрэсеньскім і другіх, дзе падаюцца сьціплыя інфармацыі аб ходзе бітвы.

Так, як Ян Длугаш павышае ролю польскага жаўнера ў баі пад Грунвальдам, а паніжае літоўскае войска, якое быццам без аглядкі ўцякала на Літву, пішучы: „Літоўцы, паказаўшы зад, бягуць да самае Літвы", так і аўтар „Хронікі Быхаўца" няслушна падае, што „войска ляцкае ничого им не помогли, только на то смотрели". Ёсьць праўдай, што войска польскае не сьпяшалася да бою, марудзіла ў той час, калі літоўскае войска ўжо білася з ворагам і пацярпела вялікія страты. Хроніка падае, што Вітаўт прыйшоў да Ягайлы й кажа; „Ты імшу слухаеш, а паны і князі, браты мае, пабітыя ляжаць, а твае людзі ім жаднае дапамогі ўчыніць ня хочуць". Ягайла адказаў: „Мілы браце, па-майму звычаю я не магу пакінуць імшы недаслуханай". Але прытым сказаў свайму камернаму гуфу пайсьці на помач літоўскаму войску. Некаторыя польскія аддзелы правялі час бязьдзейна, не ўступілі ў бой зусім. Як падае Ян Длугаш, са знатных ніхто не загінуў, толькі дваццаць рыцараў. І гэта ўжо сьведчыць як моцна была заангажавана польская армія ў баі пад Грунвальдам.

За апошнія два стагодзьдзі напісана даволі многа аб Танэнбэргу, пераважна на аснове запісаў Яна Длугаша, дзе кожны аўтар вёў свае разважаньні й уяўленьні аб падрыхтоўцы й ходзе гэтай гістарычнай бітвы. Сёньня аб Танэнбэргу й Грунвальдзе маем багатую літаратуру на розных мовах, прысьвечаную гістарычным, палітычным і мілітарным здарэньням таго часу.

Як раней, так і цяпер, у некаторых гісторыкаў дамінуе яўны нацыянальны шавінізм у дыскусіях на тэму хто быў сапраўдным гэніем Танэнбэргу й чыя армія найбольш спрычынілася да перамогі. І пройдзе яшчэ многа часу, пакуль прыціхнуць дыспуты — рэха сярэдневяковага Грунвальду, які ўскалыхнуў Эўропай. У кожным выпадку бітва была адной з найбольшых таго часу аж да XV стагодзьдзя ўключна. Тагачаснае рыцарства вяло войны, але не з такою вялікаю колькасьцю й не ў такіх варунках.

Трэба, аднак, прызнаць аб'ектыўна, што ўклад беларусаў у перамогу над крыжакамі быў немалы, а большы як падавала й падае некаторая польская ці іншая гістарыяграфія. Гэта ёсьць адна з гераічных старонак гісторыі беларускага жаўнера. Ян Вісьліцкі ў паэме „Пруская вайна", напісанай у 1516 годзе, у першую чаргу ўсхваліў вояў зямлі беларускай. Для палякаў і літоўцаў Грунвальд — гэта іхняя слава й гонар. І ня меншая слава й гонар павінен належаць і беларускаму жаўнеру. Хоць ваяваў ён пад прынятым назовам Літвы (Вялікага Княства Літоўскага), але ўклад яго ў перамогу быў большы за літоўцаў і другіх удзельнікаў. Аднак аб беларусах мала хто ўспамінае нават сёньня, ды яны самі, быццам, ад гэтага адмаўляюцца, калі не выслалі сваю афіцыйную дэлегацыю на сьвяткаваньне. Беларусаў, быццам, пад Танэнбэргам і Грунвальдам не было. Літовец К. Р. Юргеля ў сваёй кніжцы на ангельскай мове „Танэнбэрг, 15 ліпеня 1410", ня хоча прызнаць удзелу беларусаў у бітве пад Танэнбэргам. На яго думку, Полацкая, Гарадзенская, Смаленская й іншыя харугвы з Беларусі, гэта былі літоўскія гарнізоны, бо-ж на чале іх стаялі літоўскія генэралы й не было праваслаўных сьвятароў. Калі так, то трэба залічыць да літоўцаў і польскую армію, бо на чале яе, як некаторыя лічаць, стаяў літовец — Ягайла.

Сёньня кожнаму гісторыку вядома, хто быў пад Танэнбэргам і Грунвальдам і які быў яго ўклад у перамогу. Для прыкладу, Р. Портал у сваёй кніжцы на ангельскай мове „Славяне" піша ясна: „Беларускія й украінскія кантынгенты, што састаўлялі часьць Польска-Літоўскай арміі, перамаглі немцаў у памятным баі пад Танэнбэргам".

А расейскі гісторык Барбашоў з 40 харугваў Вітаўтавай арміі налічыў толькі 4 літоўскія харугвы, якія складаліся зь літоўскіх і жамойцкіх баяраў, а 36 харугвяў састаўлялі беларусы, якіх у той час называлі русінамі.

З польскіх 51 харугвы 7 харугваў было ўкраінска-падольскіх, якія належалі да кароннага войска — польскага. Былі гэта Львоўская, Холмская, Галіцкая, Перамышльская й тры падольскія харугвы. Амаль палова польскай коньніцы састаўлялі русіны з Чырвонай Русі. І калі ад 51 польскай харугвы адняць 4 украінскія, 3 падольскія, 2 чэшска-мараўскія й 1 мяшаную, то русіны пад Танэнбэргам выставілі больш харугваў за Польшчу й многа больш за сапраўдную Літву.

Варта памятаць, што літоўцаў і жамойцаў не магло быць многа пад Танэнбэргам. Згодна пастановы ў Берасьці ў сьнежні 1409 году літоўцы й жамойцы мелі застацца ў краі й весьці зачэпныя баявыя дзеяньні ўздоўж усяе граніцы з Ордэнам, каб гэтым аслабіць канцэнтрацыю варожай арміі. Такія баявыя дзеяньні былі праведзеныя з посьпехам.

Колькасьць татарскай коньніцы пад Танэнбэргам значна розьніцца ў гісторыкаў-дасьледчыкаў. Адны падаюць лік 300, другія да 30 тысяч коньніцы. Аднак большасьць дасьледчыкаў лічыць іх паміж 3-5 тысяч. Бяручы агульна, ВКЛ па колькасьці жаўнераў не ўступала Польшчы. А што да ўзбраеньня, то жаўнеры Вітаўта не выглядалі горш за іншых. Каб выглядалі яны горш, то напэўна Вітаўт не рабіўбы параду свайго войска перад мадзьярскімі пасламі, якія, акрамя пасрэднікаў з крыжакамі, былі адначасна іхнімі шпіёнамі. Пры канцы XIII і пачатку XIV стагодзьдзяў нямецкі храніст Пётр з Дусбурга пісаў, што войска „рутэнаў" — гэта значыць беларусаў, іхняя зброя й ваенная тактыка нічым ня розьніцца ад заходніх рыцараў,

Калі ходзіць яшчэ аб падрыхтоўку да бою, то крыжакі былі пэўныя, а магчыма замнога пэўныя свае перамогі над

славянамі й дзеля таго выпусьцілі ініцыятыву са сваіх рук. Па-першае, Юнгінген не павінен быў расьцярушваць свайго войска на ўмацаваньне пагранічных замкаў; па-другое, не выкарыстаў ён таго зручнага моманту, калі ня ўсе польска-літоўскія войскі прыйшлі пад Танэнбэрг і, па-трэцяе, крыжакі не павінны былі прасьледаваць уцякаючых татараў зь літоўцамі, а павярнуць сваю сілу на рэшту правага крыла праціўніка, якое аказалася адкрытым.

Пазьнейшыя дасьледаваньні спэцыялістаў паказалі, што крыжаносцы прайгралі яшчэ й таму, што не былі запазнаныя з тактыкай, якую татары перанялі ад манголаў. Мангольская армія й яе ваеннае майстэрства мелі за сабою баявую традыцыю доўгіх стагодзьдзяў. І сьмела можна сказаць, што на той час мангольская армія лічылася найлепшай мілітарнай установай. Баявое майстэрства манголаў было зусім простае — лёгкая конная язда. У крыжакоў было наадварот — цяжкая панцырная язда. Яе коньнік быў настолькі цяжкі й непаваротны, што сам ня мог ўзьлезці на каня. І калі ў баі зьляцеў ён з каня, то можна сабе ўявіць, што зь ім магло стацца... У такім даўжэйшым баі як пад Танэнбэргам, дзе прыходзілася некалькі разоў праляцець на кані туды-сюды, ды памахаць зброяй, то закуты ў панцыр коньнік адчуваў сябе перамучаным і няздольным да актыўнай і працяжнай барацьбы, якая патрабавала моцных мускулаў. Ды ня менш і коні адчувалі сябе перамучанымі.

Трэба прызнаць, што лёгкая коньніца ВКЛ не была здольнай да ўпартай барацьбы зь цяжкай коньніцай, якая ў той час існавала на Захадзе Эўропы й якой распараджаліся крыжакі. Але яна мела й свой дадатны бок. Пад моцным націскам панцыраў, яна, як лёгкая й паваротная, свабодна магла рассыпацца й лёгка сабрацца ў групу, рэарганізавацца й быць гатовай зваліцца на ворага з любога боку. Дзякуючы сваёй спраўнасьці, калі трэба было, яна магла лёгка ўцячы, а ў пагоні была хутчэйшай, здольнай дагнаць ворага й сесьці яму на карак. У залежнасьці ад зброі й абставін выходзіла й тактыка, якая заключалася ў тым, каб стварыць для сябе спрыяльныя варункі барацьбы.

З татара-мангольскай тактыкай Вітаўт быў добра запазнаны, ён няраз рабіў выправы на татараў і свой вопыт выкары-

стаў пад Танэнбэргам. Некаторыя дасьледчыкі мяркуюць, што татарская й літоўская коньніцы не ўцякалі на зламаньне карку, але такі быў звычай ашукаць ворага, нагрэць яго ў хуткай язьдзе, а пасьля прыступіць да рашучай расправы. Гэта сталася якраз пад Танэнбэргам. Амаль усе крыжацкія рыцары, якія ўзялі ўдзел у пагоні за часткай войска татараў і літоўцаў, не вярнуліся больш да сваіх. Яны былі фізычна перамучаны й сталіся лёгкай ахвярай для саюзьнікаў. І калі не загінулі яны пад мячамі, то папалі ў палон. Некалькі гадоў пасьля Танэнбэргу крыжакі пісалі, што была гэта тактыка. І калі была яна сапраўды, то ўдалася поўнасьцю.

Вітаўт добра знаў і тактыку рыцараў Ордэну. Ён быў у іх пару гадоў і разам з крыжакамі хадзіў супраць Ягайлы. Так, што Вітаўт меў за сабою каля 50 гадоў ваеннага вопыту, разумеў арганізацыю, тактыку й стратэгію сваіх ворагаў.

Усе тагачасныя арміі складаліся зь пяхоты, коньніцы, артылерыі й табару. Артылерыя ў той час была яшчэ прымітыўнай, але з вынаходзтвам пораху ўжывалася яна пры здабываньні замкаў. Пад Танэнбэргам артылерыя не адыграла вялікай ролі, а гэта магчыма таму, што ноччу, перад боем, прайшла вялікая бура з дажджом і замачыла порах. Таксама й пяхота, якой крыжаносцы мелі многа, аказалася бязьдзейнай. Не засыпала яна праціўніка хмарай стрэлаў са сваіх лукаў, што магло-б прачысьціць рады й гэтым аслабіць націск праціўніка. Толькі пасьля паражэньня коньніцы, крыжацкая пяхота ставіла супраціў у сваім лягеры Грунвальд, але яе баявы дух быў ужо зламаны.

Зь мілітарнага пункту гледжаньня бой пад Танэнбэргам выбіў меч з рук ваяўнічых нямецкіх рыцараў-манахаў, зьмяніў ход гісторыі Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, ды забясьпечыў славянскім народам спакой на цэлыя пяць стагодзьдзяў. Пасьля Танэнбэргу пацярпела й арганізацыя лацінскай Царквы, дзе крыжацкі ордэн прадстаўляў адзін з галоўных філяраў палітыкі, скіраванай ня толькі на паганскі, але й на „схізматыцкі" Ўсход. Аб гэтым сьведчыць голас чэшскага нацыянальнага героя Яна Гуса, які раскрыў зло каталіцкай герархіі, за што яго спалілі на кастры.

За цану страшэнных намаганьняў і вялікіх ахвяр славянаў была разгромлена магутная сіла Тэўтонскага ордэну. Сва-

ім ваенным майстэрствам, адвагай і гераізмам яны ўратавалі незалежнасць сваіх народаў.

І на канец трэба сказаць, што гістарычны бой пад Танэнбэргам-Грунвальдам выйграў ня польскі кароль Ягайла са сваёй польскай арміяй і выйграў яго не адзін Вітаўт са сваёю арміяй, але выйгралі яго супольна аб'яднаныя сілы Вялікага Княства Літоўскага, Польшчы й сваіх саюзнікаў пад кіраўніцтвам мужнанага вялікага князя Аляксандра Вітаўта.

(„Голас Часу" № 6 (9), Лёндан 1990 г.).

Францішак Скарына — беларускі першадрукар, вучоны, асьветнік і культурны дзеяч, перакладчык і пісьменьнік эпохі Адраджэньня

Эпоха Адраджэньня, або Рэнэсансу, была новай культурай, якая зьявілася ў Італіі ў XVI стагодзьдзі. Чалавек гэтай культуры стаўся скептыкам, ён пачаў сумнявацца ў дзеяньні звышнатуральных сіл, а даваў веру ў тое, што мог спраўдзіць сваёю кемлівасьцю, розумам. Ён пачаў дзейнічаць так, каб па ім на гэтым сьвеце засталася пасьмяротная слава з галіны навукі, літаратуры, мастацтва.

Рэнэсанс ахапіў усю Эўропу й не абмінуў Беларусь, дзе былі перадумовы для ўспрыманьня ідэй гуманізму. Гэтыя ўмысловыя рухі далі пачатак Рэфармацыі. Рэфармацыйны рух накіраваны быў у вялікай меры супраць Каталіцкай царквы, яе парадкаў і яе найвышэйшага духавенства на чале з папамі. У рэлігійным пытаньні рэфарматары хацелі вызваліцца ад сярэдневяковай схалястыкі й вярнуцца да старахрысьціянскіх абраднасьцяў.

Эпоха Рэнэсансу адыграла вялікую ролю ў разьвіцьці свабоднай філязафічнай думкі. Была яна адначасна дзейнікам разьвіцьця народнай культуры, мовы й друку, што гэтым самым разьвівала й умацоўвала нацыянальную сьвядомасьць. Рэфармацыя найбольш насьпела ў Нямеччыне. Зьбяднелая дробная шляхта, а пераважна дробнае сялянства былі гатовы ваяваць з пануючай сыстэмай, якой кіравалі багатыя феадалы й багацейшая Каталіцкая царква. Таксама гуманісты Галяндыі й іншых краін выказвалі настроі грамадзтва. Эразм

Ратэрдамскі (1469-1536) востра крытыкаваў Касьцёл і дзяржаўныя парадкі. Ульрых фон Гутэн (1488-1523) заклікаў немцаў выступіць супраць папскага ярма. Выступленьне Марціна Лютэра (1483-1546) у 1517 годзе выклікала ў народзе буру. У 1524 годзе пачалося сялянскае паўстаньне, якое ахапіла поўдзень і сярэднезаходнюю Нямеччыну. Паўстанцкі рух быў жорстка здушаны, больш за сотні вёсак пайшлі з дымам і больш за сто тысяч асоб пацярпела сьмерць.

Іншы характар насіла кальвінская Рэфармацыя, якую ў Жэневе запачаткаваў Ян Кальвін (1509-1564). Яго царкоўная навука апіралася на швейцарскай буржуазіі. Пад узьдзеяньнем Рэфармацыі Скандынаўскія краіны, Англія, Шатляндыя, Нідэрлянды й Нямеччына адступілі ад рымскага каталіцызму й гэта самае наглядалася на Беларусі. Рэфармацыйны рух у XVI стагодзьдзі ахапіў усю Эўропу.

Першымі гуманістамі сярод славян выступілі чэхі, узначаленыя Янам Гусам — рэктарам Пражскага ўнівэрсытэту. Карысны быў і на Беларусі ўплыў чэшскіх гусітаў, якія прапагандавалі патрыятызм і ўсё тое, што было зьвязана са сваёй краінай, яе культурай і мовай.

Адносіны Чэхіі зь Вялікім Княствам Літоўскім былі прыязныя. На Пражскім унівэрсытэце вучыліся выхадцы зь Беларусі й Літвы. У 1397 годзе пры ўнівэрсытэце была адкрыта асобная калегія для студэнтаў з ВКЛ. Ёсьць устаноўлены факт, што чэшска-беларускія культурныя сувязі існавалі раней. Еўфрасінія Полацкая ў часе свайго падарожжа ў Ерусалім сустракалася з чэшскімі дзеячамі культуры. Паплечнік Яна Гуса, Геронім Пражскі, аб'язджаў Беларусь і аптаваў за нацыянальную Царкву. Асоба Героніма Пражскага, як магістра Пражскага, Оксфардзкага й Венскага ўнівэрсытэтаў, садзейнічала пашырэньню гусіцкіх ідэй на Беларусі.

Трагічная сьмерць Гуса й Героніма, нанесеная айцамі Каталіцкай царквы на Канстанцкім саборы, выклікала ў Чэхіі рэвалюцыю. Як вынік гусіцкай ідэі, на пачатку XVI стагодзьдзя ўступае на арэну постаць слаўнага беларуса-гуманіста Францішка з Полацку. Сваю вышэйшую адукацыю пачаў ён у 1504 годзе ў Кракаўскім унівэрсытэце на факультэце свабодных мастацтваў, які закончыў з навуковай ступеньню бакалаўра філязофіі. Тагачасныя гуманістычныя

ідэі захапілі Скарыну й ён паехаў у Заходнюю Эўропу, дзе на працягу 6-ці гадоў пашыраў свае веды ў розных навуках. Ёсьць верагодным, што Скарына студыяваў мэдыцыну на ўнівэрсытэце ў Капэнгагене, дзе быў і сакратаром караля Ганса. У 1512 годзе бачым Скарыну ў Падуанскім унівэрсытэце, дзе ён здае на выдатна экзамены з мэдыцыны й яму першаму зь ліку ўсходніх славян прысвойваецца вучоная ступень доктара мэдыцыны.

На свой час Скарына быў высокаадукаваным чалавекам, які меў, як бачым, дзьве вышэйшыя навуковыя ступені: доктара свабодных мастацтваў і доктара лекарскіх навук.

Атрымаўшы асьвету на ўнівэрсытэтах Заходняй Эўропы й зьведаўшы многа краін, Скарына добра арыентаваўся ў тадышнім палітычным і рэлігійным жыцьці. Разумеючы патрэбу свайго народу, Скарына памінае палітычную барацьбу супраць зла й выбірае рэлігійна-прасьветную дарогу. Уся ягоная дзейнасьць носіць глыбокапатрыятычны характар.

Дзякуючы Яну Гусу й Героніму Пражскаму й іхнім ідэям каталіцкія ўплывы ў Чэхіі былі слабыя. Гэта дало магчымасьць славянам, якія былі пераважна ўсходняга абраду, здабыць там асьвету й захаваць пашану да свае роднае мовы замест лаціны. І невыпадкова ў 1517 годзе Скарына пасяліўся ў Празе й там пачаў выдавецкую дзейнасьць. З-пад станка Скарынінскай друкарні выходзяць кнігі: „Псалтыр" — 6 жніўня 1517 году; „Кніга Іава" — 10 верасьня 1517 году; „Кніга прытчаў" — 6 кастрычніка 1517 году; „Прамудрасьць Сіраха" — 5 сьнежня 1517 году; „Эклезіяст" — 2 студзеня 1518 году; „Песьня песьняў" — 9 студзеня 1518 году; „Прамудрасьць Саламона" — 19 студзеня 1518 году; „Кніга царстваў" (4 кнігі) — 10 жніўня 1518 году; „Кніга Ісуса Навіна" — 20 сьнежня 1518 году; „Іудзіф" — 9 лютага 1519 году; „Кніга судзей" — 5 сьнежня 1519 году. Такім чынам на працягу 1517-1519 гадоў Скарына выдаў 23 біблейскія кнігі пад агуллным назовам „Библия руская выложена доктором Франциском из славного града Полоцка, Богу ко чти и людем посполитым к доброму научению".

Акрамя перакладу Бібліі на тагачасную беларускую мову асаблівае значэньне мелі прадмовы Скарыны да кніжак Бібліі, якія адлюстроўвалі вялікі культурны й нацыянальны

ўздым самасьвядомасьці беларускага народу. Праз гэтыя прадмовы Скарына стараўся глыбей пранікнуць у душу чытача, прадставіць зьмест друкаванай кнігі, падкрэсьліць яе маральнае, рэлігійнае, адукацыйнае й грамадзкае значэньне. Нельга памінуць і таго факту, што Скарына ўвёў у беларускую літаратуру новы від мастацкай творчасьці — паэзію. Перакладаючы на беларускую мову кнігі Бібліі, свае прадмовы Скарына папярэджваў радкамі сылябічнага вершаскладаньня, якое да Скарыны не спатыкалася.

Нягледзячы на прыхільныя адносіны чэхаў, Скарына ўсётакі імкнуўся на сваю родную Беларусь. Ён рабіў захады аб адкрыцьці друкарні ў Вільні, у сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, у склад якога ўваходзілі беларускія землі. А так вяртаньне Скарыны з Прагі дамоў апісаў Кастусь Цьвірка ў вершы „Францыск, Скарынін сын":

Блукаў па сьвеце пілігрым,
Разьвеяў столькі лет і зім!
Цяпер ад тых чужых дамоў
Сьпяшыць Скарынін сын дамоў.
Па балатах, па чаратах
Ляціць кібітка нібы птах...
Ляціць кібітка. Праз бакі
Мільгаюць хаткі-катушкі,
Дзе вечны чад, дзе вечны бруд,
Дзе сьлепне ў цемры родны люд...
Ляціць кібітка ўдаль, ляціць,
Сьпяшае доктар Русь лячыць —
Ад нематы, ад глухаты,
Ад векавечнай цемнаты.

Паміж 1520 і 1525 гадамі Скарына перавозіць з Прагі ў Вільню друкарню, якая была першай на беларускай зямлі й першай ва ўсёй Усходняй Эўропе выдавецкай установай. Тут, у доме Якуба Бабіча, „наистаршего бурмистра славного великого места Виленского", Скарына надрукаваў і выдаў у 1522 годзе „Малую падарожную кніжыцу", якая была фактычна адной з найбольшых публікацыяў Скарыны, паколькі налічвала 856 старонак. Аб'ядноўвала яна „Псалтыр",

„Часасловец", „Шасьцідневец", 8 акатыстаў, 10 канонаў, „Саборнік", які ўключаў „Сьвятцы" й „Пасхалію" са зьвесткамі з астраноміі й грамадзянскага календара. У 1525 годзе Скарына выдаў „Апостала". Разам Скарыною выдадзеных было 25 кніг. Каб за такі кароткі час выдаць такую колькасьць кніг, у тагачасных тэхнічных абставінах, трэба было мець моцную волю й выдатныя здольнасьці.

Скарына ўзяўся, як бачым, за цяжкую й складаную працу, за якую можа ўзяцца чалавек з пачуцьцём любові й адданасьці свайму народу й яго культуры. Як зазначыў сам Скарына, ён узяўся за пераклад і друкаваньне кніг на роднай мове „к пожитку посполитого доброго, наиболей с тое причины иже мя милостивый Бог с того языка на свет пустил".

Разглядаючы Скарынінскія выданьні, моваведы ўзгодніліі, што мова, якой карыстаўся Скарына, у той час была беларускай літаратурнай мовай XVI стагодзьдзя. Гэта сьведчыць аб тым, што беларуская мова ў тую эпоху стаяла ўжо на высокім узроўні, а народ дасягнуў свайго разьвіцьця.

Гуманістычная этыка Скарыны прасякнута нацыянальна-патрыятычнымі ідэямі, дзе ён зьвяртае ўвагу на ролю чалавека, яго мудрасьць, паколькі „без мудрости и без добрых обычаев не ест моцно почтиве жити людем посполите на земле". Таму Скарына заклікаў народ да пазнаньня сьвятла навукі, да ўзбагачэньня людзкой мудрасьці.

Сваю любоў і прыналежнасьць да роднага краю Скарына выказаў у прадмове да кнігі „Іудзіф": „Пониже звери, ходящие в пустыне, знают ямы свои; птицы, летающие по воздуху, ведаюць гнезда свои; рибы, плывающие по морю и в реках, чують вири своя; пчелы и тым подобныя боронят ульев своих; також и люди, где зродилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имают".

Друкарская дзейнасьць Скарыны ў Вільні не трывала доўга. Прычына на гэта ня ёсьць зусім ясная, але можна меркаваць, што тагачасныя абставіны ў Вільні не зусім спрыялі Скарынінскай дзейнасьці. Фінансава Скарына быў залежны ад багатых людзей, якія падтрымоўвалі яго выданьні, а падругое, Каталіцкая царква прасьледавала ўсё, што не ішло па яе лініі. Напэўна ведаў Скарына, што ў Кракаве ў 1491 годзе быў асуджаны інквізыцыяй Швайпольт Фіёль за вы-

дачу праваслаўных кнігаў у сваёй друкарні, што магло спаткаць і Скарыну. Таму яшчэ, як на бяду, летам 1530 году, у часе вялікага пажару Вільні, згарэла друкарня Скарыны. Прыйшлося яму шукаць новай фінансавай падтрымкі й больш спрыяльнай атмасфэры для друкарскай дзейнасьці. Таму Скарына паехаў у Маскву й павёз з сабою свае кнігі на паказ. Але ў Маскве напаткаў вялікія непрыемнасьці. Па загаду вялікага князя маскоўскага Васіля Іванавіча кнігі выдатнага беларускага вучонага-гуманіста Скарыны былі сканфіскаваны й публічна спалены, паколькі быццам былі вынікам дзеяння „нячыстай сілы".

Меў Скарына й другія сямейныя непрыемнасьці ў часе сваёй пабыўкі ў Вільні. Судзіўся ён за дом жонкі зь яе сваякамі й выйграў справу. У ліпені 1529 году ў Познані памёр брат Скарыны, Іван. Быў ён гандляром скурамі й меў вялікія даўгі. За Іванавы даўгі Францішак Скарына папаў на дзесяць тыдняў у познаньскую турму, але яго выручыў сын Івана, Раман, які заявіў, што толькі ён ёсьць адказны за бацькавыя даўгі й гатоў іх сплаціць. Скарыну выпусьцілі на волю й ён вярнуўся ў Вільню. Магчыма, што прыкрыя судовыя справы й няўдача з наладжаньнем друкарскай справы ў Маскве заставілі Скарыну шукаць іншага шчасьця ў жыцьці.

Вяртаючыся да выданьняў Скарыны трэба сказаць, што былі яны папулярнымі ня толькі ў Вялікім Княстве Літоўскім, але й у Малдовіі, Румыніі, Польшчы, краінах Заходняй Эўропы ды неўзабаве ў суседняй Маскоўскай дзяржаве. А калі мы возьмем пад увагу тэхнічны бок выданьняў Скарыны, то агульна прызнана, што яны пераўзышлі многія заходнеэўрапэйскія выданьні. Скарына быў ня толькі перакладчыкам і друкаром кнігаў, але й мастаком. Кніжкі яго служылі ўзорам для заходнеэўрапйскіх друкароў, а таксама былі добрым павучэньнем для пачынаючых расейцаў, якія ўзяліся друкаваць кнігі 80 гадоў пазьней за беларусаў. „Біблія" Скарыны, якая паявілася друкам у 1517 годзе, была трэцяй пасьля нямецкай (1445) і чэшскай (1488).

Мала якія эўрапэйскія народы могуць пахваліцца такімі выдатнымі й таленавітымі дзеячамі культуры, якіх нарадзіла беларуская зямля. Да іх належаць: Рагнеда, Еўфрасінія Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аўраам

Смаленскі, ды першадрукар Ф. Скарына. Гэтыя людзі сталіся нацыянальным гонарам Царквы, гісторыі Беларусі й неўміручымі героямі беларускага народу.

Франішак Скарына быў адным з выдатных дзеячоў навукі, асьветы й культуры свайго часу, якога выдаў слаўны горад Полацк. Яго імя й аўтарытэт былі вядомы далёка за межамі ВКЛ. Скарыну запрашаў да сябе прускі герцаг Альбрэхт у 1530 годзе, назваўшы яго „мужам непараўнальнага розуму, найвучонейшым доктарам мастацтваў і мэдыцыны". Ацаніў здольнасьці Скарыны й польскі кароль Жыгімонт I. Напэўна ведаў аб Скарыне й чэшскі кароль Фэрдынанд, калі запрасіў яго на свой двор, даручаючы яму абавязкі каралеўскага батаніка й мэдыка. Гэтую пасаду Скарына прыняў і ў 1534 годзе быў закладзены Каралеўскі батанічны сад. І там у чэшскай Празе Скарына памёр каля 1550 году.

Хоць Скарына правёў значную частку свайго жыцьця за межамі роднай Беларусі, дзе двойчы знайшоў гасьціннасьць у чэшскай Празе, усё-ж застаўся ён верным сынам свае краіны — Беларусі й здабытыя веды за граніцай аддаў на карысьць свайго народу. Яго пераклад Бібліі адыграў вялікую ролю ў разьвіцьці беларускай мовы, культуры й самасьвядомасьці.

Скарына быў вялікім асьветнікам і гуманістам. Яго друкарская дзейнасьць лягла ў аснову беларускай літаратурнай мовы й паслужыла штуршком для другіх беларусаў, што любілі свой народ, мову, культуру й для іх працавалі. Кніга на роднай мове садзейнічала фарміраваньню нацыянальна-патрыятычнай сьвядомасьці насельніцтва Беларусі. Яна мела істотнае значэньне ня толькі на нацыянальную сьвядомасьць беларусаў, але й на ўсе ўсходнеславянскія народы.

Даволі многа знаем аб Скарыне, але далёка ня ўсё. Ня знаем нават году нараджэньня й сьмерці слаўнага сына гораду Полацка. Дасьледчыкі мяркуюць, што яго жыцьцё выпала на 1490-1550 гады. Але першая дата ёсьць малавераго дная. Цяжка паверыць, каб чатырнаццацігадовы юнак з праваслаўнага Полацку, дзе аб лаціне мала хто чуў, мог паступіць у 1504 годзе ў Кракаўскі ўнівэрсытэт.

Часам спатыкаем у друку зацемкі, што Скарына — каталік, але на гэта няма канкрэтных доказаў. Досьледы паказалі, што за жыцьця Скарыны не было ў Полацку ніводнай

каталіцкай сьвятыні. Толькі ў 1498 годзе манахі-бэрнардыны заснавалі там манастыр, а ў XV стагодзьдзі ў Полацку была лацінская кірха для нямецкай калёніі купцоў.

Вядома з гісторыі, што Ягайла ўвёў каталіцкую веру ў Вялікім Княстве Літоўскім, пачынаючы зь Вільні, нейкіх 120 гадоў да нараджэньня Скарыны. Вера гэтая пашыралася на Беларусі пад націскам Ягайлы й наступных польскіх каталіцкіх каралёў і каталіцкага кліру. Калі зайшла й як далёка пашырылася гэтая вера ў Полацку мы ня знаем. Польскі гісторык Януш Тазбір піша, што „ў той час (1581) у Полацкім ваяводстве было толькі сем каталіцкіх сем'яў" („Пётр Скарга", Варшава 1962, стар. 50).

Было гэта нейкіх 75 гадоў пасьля таго, як Скарына пачаў навуку ў Кракаўскім унівэрсытэце. Калі ва ўсім Полацкім ваяводстве было толькі сем каталіцкіх шляхоцкіх сем'яў, то колькі іх магло быць у Полацку за маладых гадоў Скарыны? Магчыма, што ніводнай каталіцкай сям'і.

Аднак, нягледзячы на каталіцкае імя Скарыны — Францішак, дзейнасьць яго сьведчыць аб тым, што па душы быў ён праваслаўным. Ягонай друкарняй у Вільні апекаваліся й выдачу кнігаў фінансавалі праваслаўныя — бургамістр Вільні Якуб Бабіч і райца Богдан Анкевіч. Кнігамі Скарыны карысталіся праваслаўныя брацтвы супраць наступу езуітаў. І хоць нідзе не сказана, каб Скарына прымаў удзел у спрэчках каталікаў з праваслаўнымі, якія ў той час разгараліся, аднак у свой час вуніяцкі архіепіскап Анастасій Сялява сказаў, што Скарыну „сам чорт навучыў ерасі".

Згадваючы „Малую падарожную кніжыцу" Ф. Скарыны, В. Дэруга піша: „Па падбору богаслужэбных тэкстаў яны зьяўляюцца Праваслаўнай Псалтырай к аналагічным выданьням нашых дзён. У тэксты ўключаны праваслаўны Сымбаль Веры (без каталіцкага філіоквэ), малітвы „За праваслаўных хрысьціян", нідзе няма характэрнага для каталіцкіх і вуніяцкіх малітоўных тэкстаў успамінаньня Галавы Рымскай Царквы" („Слово Божие для белорусского народа. К 470-летию издания Библии", „Журнал Московской Патриархии" № 4, Москва, 1989 г., стар. 71). Гэта ўжо сьведчыць, што Скарына ня мог быць католікам. У падуанскцм дакуманце, пісаным на лацінскай мове, гаворыцца, што

„Францішак, сын Лукаша Скарыны з Полацка, русін" (1512). У той час русінамі абазначаліся праваслаўныя, усходнія славяне. Але вуніятам Скарына ня мог быць, бо ў той час вуніі як такой не было. Гэты факт гаворыць дастаткова, што Скарына па сваёй веры быў праваслаўным.

Трэба памятаць, што ў тадышні час каталіцкай рэакцыі немагчыма было праваслаўнаму „схізматыку" папасьці ў каталіцкі ўнівэрсытэт. Таму, па словах Петрушэўскага, толькі пад маскай католіка Скарына мог дастацца ў Кракаўскі ўнівэрсытэт, прыняўшы каталіцкае імя Францішак.

Што да імя Скарыны, дык мы маем і другое ягонае імя — Юры, якое першы раз зьявілася ў грамаце кароля Жыгімонта ад 25 лістапада 1532 году, выдадзенай у Кракаве на лацінскай мове. У ёй успамінаецца імя Юры, а фактычна Георгі, побач Францішка. Але ў 1925 годзе польскі гісторык Генрык Лаўмянскі палічыў устаўленае імя „Георгі" за памылку перапісчыка, які быццам лацінскае слова „эгрэгіум" — выдатна, замяніў на грэцкае „Георгі".

Для нас, беларусаў, ня так важна імя Скарыны й за яго няварта спрачацца. Дастаткова ведаць ягонае прозьвішча й месца паходжаньня, а пра сапраўднае імя, якое ён атрымаў у часе хрышчэньня, то, мабыць, мы ніколі не даведаемся. Важна, што Скарына — сын беларускай зямлі, беларус, які любіў свой край, свой народ і для іх прысьвяціў свае здабытыя за граніцай веды.

У першых гадох утварэньня Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР) і разьвіцьця ў ёй беларускай культуры й навукі, над асобай і дзейнасьцю Скарыны вяліся аб'ектыўныя навуковыя досьледы. Пасьля ў БССР абвясьцілі Скарыну „клясавым ворагам", аўтараў яго біяграфіі арыштавалі, некаторых зьнішчылі фізычна або саслалі на выгнаньне. Скарыну пачалі рабіць манахам і прапанавалі выкінуць яго з гісторыі беларускай літаратуры. Пасьля знайшліся крытыкі, якія пачалі прадстаўляць Скарыну як рацыяналіста й праціўніка Царквы.

У сапраўднасьці Скарына ніколі ня быў манахам і ня быў ён праціўнікам Царквы, калі перакладаў Біблію й пісаў „иже мя милостивый Бог з того языка на свет пустил". У сваіх выданьнях Скарына няраз падкрэсьліваў, што кнігі свае

прызначае для асьветы „людзей паспалітых" і для адукацыі „малых дзетак".

1 студзеня 1944 году прыпадалі 25-я ўгодкі абвяшчэньня БССР. У гэтым часе савецкая армія мела посьпехі над нямецкай арміяй і рыхтавалася да вызваленьня Беларусі з-пад нямецкай акупацыі. Трэба было Маскве зайграць на нацыянальным пачуцьці беларусаў і таму пасьля ачарненьня Скарыны, зьявіўся ў Маскве напачатку 1944 году часапіс „Беларусь". У ім быў зьмешчаны артыкул сакратара ЦК КПБ Г. Гарбунова, які не кляймiў ужо Скарыну, а ўсхваляў яго, Васіля Цяпінскага, Багушэвіча, Купалу, Коласа, Каліноўскага, Галоту, Крывашапку, Вашчылу й т.п.

З гэтага часу савецкая літаратура пачала зноў цікавіцца Скарынам і называць яго не Францішкам і ня Юрыем, але Георгіем. І толькі апошнім часам беларускія савецкія літаратары адважыліся прызнаць імя Францішак, паколькі яно ёсьць больш папулярнае ў літаратуры й гэтм імем карыстаўся сам Скарына.

Што не пісалі-б аб Скарыне яго праціўнікі й у які-б бок яго не цягнулі, аднак Скарына застаецца гордасьцю беларусаў. Як вучоны асьветнік, друкар, дзеяч, доктар мастацтваў і мэдыцыны Скарына ўславіў свой народ далёка па-за межамі Беларусі. У яго асобе беларуская культура выйшла на міжнародную арэну й дасягнула свайго прызнаньня.

Сярод сарака партрэтаў самых выдатных выпусьнікоў Падуанскага ўнівэрсытэту заняў сваё ганаровае месца партрэт Скарыны. XVI-я Генэральная Канфэрэнцыя ЮНЭСКА залічыла Францішка Скарыну ў лік тых выдатных дзеячоў славянскай культуры, спадчына якіх павінна вывучацца й папулярызавацца на аснаўных эўрапэйскіх мовах. А калі прыехаць у Прагу й заглянуць у турыстычны даведнік, то там прачытаем, што „ў пачатку XVI стагодзьдзя беларус Францішак Скарына, доктар лекарскіх навук выдаў у Празе першую кнігу на беларускай мове".

Асобе Скарыны прысьвечана многа дасьледваньняў, артыкулаў і апошнім часам кніжак. Каля 1 500 навуковых прац напісана пра Скарыну на беларускай, расейскай, нямецкай, ангельскай, чэшскай, французскай, польскай і іншых мовах, якія ўпісалі Скарыну ў гісторыю сусьветнай

цывілізацыі. Слава аб гэтай шляхэтнай постаці ніколі не згасьне. Жыцьцём і дзейнасьцю беларускага першадрукара й гуманіста эпохі Адраджэньня зацікавіліся многія вучоныя сьвету. І так зьявілася аб вялікім беларускім асьветніку новая навука — Скарыніяна.

Рашэньнем ЮНЭСКА ў 1990 годзе ва ўсім сьвеце адзначаецца 500-гадовы юбілей славутага беларускага першадрукара, вучонага асьветніка, культурнага дзеяча, перакладчыка эпохі Адраджэньня Францішка Скарыны й гэтай падзеяй кожны беларус павінен ганарыцца.

(„Голас Часу" № 4 (7), Лёндан 1990 г.).

„Тут мой народ"

Пад такім загалоўкам у выдавецтве „Мастацкая літаратура" паказалася на сьвет у 1989 годзе кніжка пра прасьветніка — гуманіста Францішка Скарыну. Кніжка напісана на аснове вывучэньня тэкстаў Скарынінскіх выданьняў, а таксама малавядомых архіўных крыніцаў. У ёй гаворыцца пра ўплыў Скарынінскіх выданьняў на нацыянальна-культурнае адраджэньне беларускага народу наступных стагодзьдзяў. Кніжка зьмяшчае багаты гістарычны матэрыял ня толькі пра Скарыну, але згадвае яго эпоху й пазьнейшыя стагодзьдзі. Аўтарам кніжкі зьяўляецца Аляксей Каўка, кандыдат гістарычных навук.

Цікава тое, што аўтар пісаў гэтую кніжку ў той час, калі не было ніякай надзеі на яе выданьне, калі беларуская мова з кожным годам прасьледавалася, замірала й усякія нацыянальныя праявы караліся. Але аўтар кнігі „Тут мой народ" верыў не ў сьмерць, а ў жыцьцё беларускай мовы, у яе новае адраджэньне й таму пісаў, напісаў і выдаў сваю гістарычную працу.

Я тут аддам слова беларускаму навукоўцу Генадзю Каханоўскаму, чалавеку, які лепш знае аўтара й абставіны таго часу. Таму паслухаем што ён піша: „І вось новая кніга „Тут мой народ". Хіба можна было думаць пра яе выхад некалькі гадоў назад? Нізашто. Першы найлепшы рэдактар тут-жа адмёў-бы яе з парога. І ўсё-ж людзі верылі й спадзяваліся, што такі дзень надыдзе. Да гэтай шчасьлівай часіны рыхтаваліся задоўга. Напрыклад, той-жа Мікола Іванавіч Ермаловіч аддаў высакароднай справе работы над кнігай больш

чвэрць стагодзьдзя. Я не ведаю, колькі гадоў аддаў сваёй кнізе Аляксей Канстанцінавіч Каўка, ствараючы каштоўную панараму духоўнага станаўленьня й разьвіцьця нашай нацыянальнай самасьвядомасьці, ля вытокаў якой стаяў Францішак Скарына. Шматгадовая мазольная праца закончана, і араты ў белым каўнерыку прынёс на наш стол кнігу-роздум, кнігу-эпапэю пра радасьць і драму беларусаў — „Тут мой народ". Яе аўтар Аляксей Каўка нібы да нас зь неба зваліўся, ды якраз у той час, калі кажучы словамі Карася Каганца, „беларусы сталі прачыхацца", пайшлі ў наступ за сваё самазахаваньне. Вось і кніга вельмі дарэчы: як мы дагэтуль дажылі й не замерлі. Алгебра нашага жыцьця! Толькі самадур можа быць абыякавым да трагедыі свайго народа, а разумны разважае: „Дык-жа выжылі..." Гэта самая паўнайменная кніга пра тых, хто нёс свой крыж на скрыжалях часоў, хто да апошняй крывінкі аддаў сябе справе служэньня народу. (...) Кніга Аляксея Канстанцінавіча Каўкі настолькі ўнівэрсальная па сваёй задуме й выкананьню, што часам задумаешся: а ці не ўзяць нам яе ў якасьці курса беларусазнаўства, бо калі яшчэ зьявяцца кнігі такога ўзьлёту думкі й пачуцьця" („Беларусь" № 5, май 1990 г. стар. 8).

Беларуская грамадзкасьць павінна быць удзячна кандыдату гістарычных навук Аляксею Каўку за яго кнігу, якая зьявілася ў часе нацыянальнага прабуджэньня нашага народу й няменш у будучыні яна паслужыць дапаможнікам не аднаму дасьледчыку аб Ф. Скарыне. Беларусы патрабуюць больш такіх кніжак і яны спадзяюцца, што гэтая кніга аб Скарыне ня будзе апошняй кнігай гісторыка А. Каўкі, ды паслужыць прыкладам для другіх беларускіх гісторыкаў стварыць нешта падобнае на ўзор „Тут мой народ".

(„Голас Часу" № 5 (8), Лёндан 1990 г.)

„Зварот да беларускага народу"

Пад такім загалоўкам у газэце „Голас Радзімы" (№ 27 за 8 ліпеня 1993 г., стар. 4) Нацыянальны Арганізацыйны Камітэт па сьвяткаваньні ў Беларусі 200-х угодкаў вызвольнага паўстаньня зьвяртаецца да „Шаноўных суайчыньнікаў".

У сувязі з гэтым зваротам у мяне паўстала такое пытанне: Што гэтай гадавінай хочуць сказаць арганізатары сьвяткаваньняў беларускаму народу? Тое, што была ўтворана Найвышэйшая Рада Вялікага Княства Літоўскага й што нейкіх 18 тысяч паўстанцаў, пераважна апалячанай шляхты Беларусі, прыняло ўдзел у гэтым паўстаньні? Пасьля падаюцца прозьвішчы кіраўнікоў гэтага паўстаньня: Тадэвуш Касьцюшка, Тамаш Ваўжэцкі, Якуб Ясінскі, Міхал Клеафас Агінскі, Стэфан Грабоўскі — „сьвятыя для нас". Так напісана ў адозве.

Можна не любіць палякаў або расейцаў, але на гістарычныя падзеі мы павінны глядзець цьвяроза, так як яны адбываліся ў сапраўднасьці, а не ствараць міфы. Я асабіста ўважаю, што такія „сьвятыя для нас" як Т. Касьцюшка й ягоныя паплечнікі далёка стаялі ад беларусаў і беларускай справы. За што мы маем усхваляць іхнія імёны? За тое толькі, што яны паўсталі на Беларусі супраць Расеі за старую Рэч Паспалітую? А ці гэтыя лідэры паўстаньня ўнесьлі ў сваю праграму пытаньне будучыні Беларусі як незалежнай дзяржавы, або абяцалі нейкую аўтаномію, калі заклікалі беларусаў да паўстаньня й ішлі ў бой за Волю, Роўнасьць, Незалежнасьць?

Каб лепш зразумець паўстаньне Тадэвуша Касьцюшкі, неабходна вярнуцца да гісторыі адносін Польшчы да Вялікага Княства Літоўскага й запазнацца з абставінамі й парадкамі, якія там існавалі й да чаго яны вялі. Калі мы зь імі запазнаемся, тады лягчэй будзе зразумець стаўленьне беларусаў да гэтага паўстаньня й іхні ўдзел.

Ня трэба забываць, што пасьля Люблінскай вуніі 1569 году й Берасьцейскай 1596 году пачалася палітыка тварэньня аднаго народу Рэчы Паспалітай з адной верай. Палітычныя й рэлігійныя справы зводзіліся да таго, што ў 1697 годзе забаронена было карыстацца беларускай мовай у канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага, „як мало достэмпна геніушом польскім". Яе заступіла мова польская, а ў рэлігійнай справе рэй вялі польскія ксяндзы й езуіты. Прыгнятаючы й паніжаючы беларускую мову й праваслаўную веру, палякі ў палове XVII стагодзьдзя збудавалі больш за 300 касьцёлаў і манастыроў на Беларусі. Іхнюю абслугу надзя-

лялі беларускай зямлёй, а праваслаўным забаранялі ня толькі будаваць новыя цэрквы, але нават рамантаваць старыя. Праф. С. Ф. Платонаў піша, што цэнзура праваслаўных царкоўных кніжак даручалася каталікам; былі ўстаноўлены паборы з праваслаўных на карысьць каталіцкага духавенства; праваслаўныя былі падпарадкаваны каталіцкаму касьцельнаму суду. У месяцы жніўні 1720 году ў горадзе Замосьць адбыўся вуніяцкі сабор пад старшынствам папскага прадстаўніка. На саборы было пастаноўлена зьнішчыць „схізму", значыць, праваслаўную веру. Было гэта нарушэньнем Трактату аб вечным міры, заключаным паміж Расеяй і Польшчай у 1686 годзе. Паводле гэтага Трактату дысыдэнцкая шляхта ўраўноўвалася з каталіцкай ва ўсіх правох, але каталіцкая вера заставалася пануючай і кароль мог быць выбраны толькі з каталікоў. Выкананьне гэтых пастаноў было пацьверджана асобным Трактатам Рэчы Паспалітай з Расеяй, у адпаведнасьці зь якім Кацярына абяцала ў будучыні захаваць такі дзяржаўны парадак у Польшчы й Літве. Гэтым, быццам, імпэратрыца Кацярына брала Рэч Паспалітую пад пратэкцыю Расеі.

Ужо ў 1731 годзе амбасадар Вялікабрытаніі прадставіў польскаму ўраду мэмарыял, у якім напомніў прасьлед пратэстантаў у Польшчы, што можа выклікаць прасьлед католікаў у Англіі й у другіх пратэстанцкіх краінах. Але польскія ўрадавыя кругі, як піша гісторык В. Морфіл, ня бачылі як самі капалі магілу для свае дзяржавы. У 1732 годзе выдадзена была пастанова, у якой гаварылася, што людзям другіх веравызнаньняў — праваслаўным і пратэстантам адбіраецца права быць выбранымі ў паслы на сойм, трыбуналы й усякія камісіі. Сойм 1764 году ўхваліў пастанову караць сьмерцю тых, каторыя пяройдуць з каталіцтва ў другую веру. У 1766 годзе сойм па прапанове кракаўскага пасла Солтыка ўхваліў закон „абвяшчаць ворагам гаспадарства кожнага, хто асьмеліцца сказаць на сойме прамову на карысьць іншаверцаў".

Цяжка было ўстаяць безабаронным праваслаўным супраць гвалтоўнага каталіцкага й вуніяцкага фанатызму. Праваслаўныя брацтвы, як стойкія абаронцы праваслаўнай веры, пачалі зьнікаць. З чатырох праваслаўных епархіяў, прызнаных па Трактату паміж Расеяй і Польшчай у 1676 го-

дзе, у палове XVIII стагодзьдзя засталася толькі адна — Магілёўская або Беларуская, як яе называлі. Дзейны багаслоў і аратар, архіепіскап Юры Каніскі, якога каталікі ледзь не забілі ў Варшы ў 1759 годзе, а другі раз у 1761 годзе, езьдзіў на каранацыю імпэратрыцы Кацярыны II. У сваёй прачулай прамове прасіў ён Кацярыну заступіцца за праваслаўных у Рэчы Паспалітай.

Архіепіскап Каніскі езьдзіў таксама й у Варшаву ў 1765 годзе, меў аўдыенцыю ў кароля Станіслава Панятоўскага й прадставіў яму прыкрае становішча Праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай. Кароль аднёсься прыхільна да звароту архіепіскапа і калі сам пачаў хадайнічаць за праваслаўных, дык папа Клімент VIII пісаў прымасу Польшчы, што прызнаць правы іншаверцам у Польшчы, гэта тое самае што „пусьціць паршывых авечак у аўчарню Хрыста й паганіць Царкву яго".

У сваёй пропаведзі ў Віленскім Сьвята-Духаўскім манастыры ў 1767 годзе арх. Ю. Каніскі з балючым сэрцам сказаў: „У даны час каму вядома, у якім стане знаходзіцца наша пабожная вера ў гэтай дзяржаве? (...) Забраны ў праваслаўных сьвет навукі ў Вялікім Княстве Літоўскім, хоць і засталася апошняя Беларуская епархія, аднак і яна ў большасьці раскрадзена. (...) Школам і сэмінарыям быць не дазволена. Гоняць праваслаўны народ як авечак, ня маючых сваіх пастыраў, або ў касьцёлы, або ў вуніяцкія цэрквы — гоняць ня толькі з дамоў, але й з цэркваў нашых, прыказчык б'е народ бізуном, як гоняць быдла з хлява" („Культура" № 31, 10 жніўня 1993 г., стар. 6).

Станіслаў Панятоўскі (1764-1795) сеў на пасад кароля Польшчы ў выніку палітыкі Расеі й Прусіі. Быў ён фаварытам Кацярыны II, адукаваным, але слабога характару й схільным на кампрамісы чалавекам. У гэтым ужо часе Расея мела ўплыў на палітыку Рэчы Паспалітай і разам з Прусіяй дамагалася ад польскага ўраду зраўнаньня дысыдэнтаў (праваслаўных і пратэстантаў) у правох з каталікамі. Кароль згадзіўся, але польскі сойм адкінуў гэтую прапанову. Тады пратэстанты ў 1767 годзе ў Торуні, а праваслаўныя ў Слуцку стварылі свае канфэдэрацыі й зьвярнуліся да суседзяў за дапамогай у абароне іхніх рэлігійных правоў. На просьбу канфэдэратаў у Варшаву ўвайшлі рускія

войскі. Пад націскам Расеі, Прусіі й Аўстрыі польскі сойм у 1768 годзе прызнаў палітычныя й рэлігійныя правы дысыдэнтам, але каталіцызм застаўся дамінуючай рэлігіяй.

Праціўнікі дысыдэнтаў сарганізавалі ў Бары (на Падольлі) 29 лютага 1768 году канфэдэрацыю. Мэтай канфэдэратаў была цэласьць і незалежнасьць краіны, імкненьне да старой „залатой вольнасьці" шляхты, адмена рэформы й замацаваньне нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту дысыдэнтаў.

Барскія канфэдэраты выклікалі беспарадкі на Беларусі й Украіне. Да іх далучыўся каталіцкі клір, некаторыя магнаты, а сярод іх і гетман літоўскі Міхал Казімір Агінскі. Ствараліся банды, якія нападалі на дысыдэнтаў, нішчылі іхнія пасевы й забіралі ў гаспадароў жывёлу. Быў гэта новы польскі нацыяналізм-шавінізм. У выніку такіх беспарадкаў на Ўкраіне ўспыхнула паўстаньне ўзначаленае Іванам Гонтам і Максімам Жалезьняком. Украінцы пакідалі вуніяцкую веру і вялі барацьбу з польскай шляхтай, як некалі за Багдана Хмяльніцкага. Украінскіх паўстанцаў падтрымалі казакі і праваслаўнае духавенства. У барацьбу каталікаў з дысыдэнтамі ўмяшаліся польскія ўрадавыя войскі. У часе пацыфікацыі людзі гінулі тысячамі, а найбольш пацярпелі ўкраінцы.

Польскі ўрад ня мог навесьці парадак у краі, тады ў Рэч Паспалітую ўступілі рускія войскі, якія вялі баі з канфэдэратамі. Выціснуць канфэдэратаў з Рэчы Паспалітай памаглі прускія войскі. За навядзеньне парадку ў Рэчы Паспалітай прыйшлося заплаціць суседзям тэрыторыяй, што давяло да першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе паміж Расеяй, Прусіяй і Аўстрыяй.

Ужо пасьля першага падзелу Рэчы Паспалітай некаторыя палякі зразумелі свае памылкі, што ў іхняй дзяржаве дзеюцца неверагодныя рэчы. Трэба было абавязкова правесьці дэмакратычныя рэформы ў краі. А каб іх правесьці, трэба было абмежаваць самаволю шляхты й Каталіцкай царквы. Тады-ж дагледзелі палякі й шкодную работу езуітаў ды выгналі іх з Польшчы. Але каталіцкі шавінізм сярод палякаў як быў, так і застаўся, бо ў 1774 годзе зноў былі абмежаваны свабоды для дысыдэнтаў, якія атрымалі яны ў 1768 годзе. І тут варта згадаць, што адным з ня так

даўніх польскіх каралёў быў Станіслаў Ляшчынскі (1704-1711 і 1733-1736). Ён разумеў праблемы свае краіны й хацеў правесьці дэмакратычныя рэформы, але магнаты змусілі яго ўцякаць за граніцу.

Ад таго часу прайшло амаль паўстагодзьдзя, а абставіны ў Польшчы не паправіліся. Аднак знайшліся рэфарматары, якія пад уплывам Французскай рэвалюцыі напісалі польскую Канстытуцыю. Яна была прынята праз аклямацыю 3 траўня 1791 году. Гэтая Канстытуцыя, званая інакш „урадавым законам", мела на мэце захаваць цэласьць і сувэрэннасьць дзяржавы, гарантавала прывілеі шляхце, духавенству й мяшчанам ды адмяняла „лібэрум вэто", чым мела даць магчымасьць ураду нармальна працаваць. Але пару дзён пасьля прыняцьця Канстытуцыі магнацкая партыя злажыла пратэст супраць урадавага закону. У месяцы траўні ў мястэчку Таргавіца (Кіеўская губэрня) створана была т.зв. Таргавіцкая канфэдэрацыя, якая пасьпяшылася напісаць Акт і зьвярнулася за дапамогай да Кацярыны II, каб яна на аснове пастановы сойму з 1768 году абараніла стары лад Рэчы Паспалітай. Усё было прыгатавана загадзя ў Пецярбургу й доўга не прыйшлося чакаць, як рускія войскі ўвайшлі ў Польшчу й пачалі дыктаваць свае правы.

Па загаду Кацярыны II Канстытуцыю 3-га Траўня, на якую кароль ня так даўно прысягаў, адкінуў і сказаў, што ходзяць пагалоскі аб пасяганьні суседзяў на тэрыторыю Рэчы Паспалітай і што адзіным спосабам захаваньня Польшчы ёсьць Канстытуцыя, якая забясьпечыць ёй незалежнасьць. Аднак сталася што іншае. Скліканы ў Горадні 24 лістапада 1793 году польскі сойм моўчкі прыняў прапанову акупантаў аб другім падзеле Рэчы Паспалітай. Як першы, так і другі падзелы Рэчы Паспалітай адбыліся ціха, спакойна, бо не было каму, не было чым і не было за што ваяваць. Быў гэта вынік сьляпой палітыкі польскага нацыяналізму-шавінізму й каталіцкага фанатызму, якім кіравалі езуіты па ўказаньнях Ватыкану.

Да якога гэта крытычнага стану каціласа Рэч Паспалітая пісаў 7 ліпеня 1788 году брытанскі міністар у Варшаве: „Ад часу падзелу да гэтага часу Польшча ня мае ані свае гісторыі, ані свайго палітычнага існаваньня. Пазбаўленая гандлю, не маючы й аднаго на вонкі саюзьніка, ня маючы адпаведнай

унутранай сілы, даходаў, узалежненая ад чужога кіраўніцтва, сьціснута трыма магутнымі манархамі з усіх бакоў, яна ціха чакае прысуду, які прынясе ёй пустэчу. (...) Гэта ёсьць лёс краіны, якая пад здольным кіраўніцтвам магла-б лёгка раўняцца вядучым краінам Эўропы" („Год'с плейграўд а гісторы оф Полянд", вол. I, Ды Орджынс то 1795, стар. 929).

Па ініцыятыве польскіх патрыётаў, у траўні 1793 году пачалі рабіцца захады да паўстаньня за аднаўленьне граніцаў Польшчы. Начальнікам паўстаньня вызначылі Тадэвуша Касьцюшку, заслужанага змагара ў амэрыканскай грамадзянскай вайне, у якой ён удзельнічаў у 1776-1784 гадах. Лёзунгам паўстаньня сталіся словы „свабода, цэласьць, незалежнасьць". Паўстаньне ў Польшчы ўспыхнула ў красавіку 1794 году.

На Беларусі й Літве паўстанцы ноччу з 22 на 23 красавіка 1794 году захапілі Вільню й утварылі Вышэйшую Раду Вялікага Княства Літоўскага на чале з маладым палкоўнікам Якубам Ясінскім. Належаў ён да рэвалюцыйнай групы так званых „якабінцаў", якія ў часе Французскай рэвалюцыі 1789 году праклямавалі рэспубліку, зьнішчылі караля, шмат арыстакратыі й увялі тэрор. Якабінцы сваіх ворагаў у Вільні й у Варшаве ліквідавалі фізычна.

Ясінскі, як і шмат другіх паўстанцаў, зналі беларускую мову й пісалі на ёй вершаваныя заклікі да беларускага сялянства прыняць удзел у паўстаньні. Вось некалькі радкоў з закліку-песьні:

Ці ўжо мы ўсі сабакі?
Гаспадары — не бурлакі.
За што маем крыўды знаці?
За што церпіць наша маці?
Прадавайце аўцы, волы.
Жыта з сьвірна ды ўсе долы.
Нехай ксёндз нам пасьвенцае,
Нехай Бог нам памагае!
Бывай здарова, Грыпіна!
Параска! Мая дзяўчына!
Ад нас цяпер ад'езджаем
Да Касьцюшкі ўсі прыстанем.

Словы ў гэтым закліку-песьні нічога не абяцаюць беларускаму селяніну. Яго трактавалі як сабаку, пераносіў ён крыўды, цярпела маці, а прадаваць селянін ня меў чаго, бо часам еў хлеб зь мякінай. Далей ксёндз пасьвенцае, спадзяваньні на Бога й ад'езд да Касьцюшкі.

Тыповы шляхецкі заклік да народу, але не за яго свабоду, а свабоду шляхецкую, якую страціла часткова шляхта пад панаваньнем Расеі.

Ясінскі хацеў палепшыць гаспадарчы стан сялянства, але нічога ў нацыянальным пытаньні народам Вялікага Княства Літоўскага. Тое-ж рабіў і Т. Касьцюшка, які 7 траўня выдаў „Маніфэст", так званы „Паланецкі ўнівэрсал", які абяцаў сялянам права на зямлю й зьмяншаў паншчыну з 5-6 дзён да трох. Гэта, аднак, не задаволіла сялян, а ўзлавала магнатаў. Цяжка было Касьцюшку задаволіць абодва бакі, але трэба прызнаць, што меў ён гонар і пачуцьцё маральнай справядлівасьці й імкнуўся да праўды ў аграрным пытаньні.

„Паланецкі ўнівэрсал" Касьцюшкі не зрабіў вялікага ўражаньня на сялян, не вызваліў іх поўнасьцю з рабства магнатаў. І калі пачаліся ваенныя дзеяньні, то рускія генэралы таксама пусьцілі ў ход сваю прапаганду, што сялянам будуць перадаваць сэквэстраваныя маёнткі шляхты й магнатаў. Многа хто з удзельнікаў паўстаньня паверыў царскім генэралам і адступіў ад паўстаньня.

22 траўня 1794 году ў Вільні на польскай мове была выдадзена адозва да грамадзян, якая пачыналася наступным чынам: „Грамадзяне! (...) Усемагутны Бог вызваляючы Народ польскі з цяжкога ярма няволі, зрабіў Кракаўскую зямлю новай калыскай свабоды палякаў і паслаў на гэту сьвятую зямлю нашага земляка, грамадзяніна Літвы. (...) Яму ўдзячны за вяртаньне нашай славы палякаў!"

А дзе тая слава беларусаў, літоўцаў, украінцаў, грамадзянаў былога Вялікага Княства Літоўскага?

У сваім залажэньні паўстаньне 1794 году ня мела вялікага шансу на перамогу. Мы ўжо чыталі, як гэта палякі са сваім каталіцкім клірам адносіліся да дысыдэнтаў. Было важна й тое, што кіраўніцтва паўстаньня не было шчыра зацікаўленае ў зямельнай рэформе й не магло разьлічваць на падтрымку сялян. Пастулаты, занесеныя ў „Паланецкі

ўнівэрсал" не былі зрэалізаваны, бо Касьцюшка не перамог супраціву шляхты, а магнаты былі гатовы прадаць Польшчу кожнай хвіліны, каб захаваць толькі свае багацьці. Напрыклад, мадам Патоцка-Касакоўская задэкляравала аўстрыйскаму прыяцелю: „Калі ты пакінеш мне маё багацьце й рэлігію, то што я тады маю шкадаваць?!" Таксама галіцкія магнаты ў часе падзелу Рэчы Паспалітай прасілі аўстрыйскіх чыноўнікаў захаваць іх багацьці й веру, ды караць сьмерцю праступнікаў, а іхнюю маёмасьць канфіскаваць. Такі гэта быў патрыятызм некаторай польскай магнатэрыі.

Таксама Канстытуцыя 3-га Траўня 1791 году не была дэмакратычнай. Яна ўжо ў сваім першым пункце гаварыла, што нацыянальнай і пануючай верай у дзржаве ёсьць і будзе сьвятая рымска-каталіцкая вера з усімі яе правамі. Пераход ад веры пануючай да іншай ёсьць забаронены пад карамі адступства. Гэты пункт Канстытуцыі спадабаўся папу Пію VI і ён прыслаў блаславенства для Польшчы й караля й перанёс урачыстасьці сьв. Станіслава з 8 на 3 траўня. Але ўжо ў гэтым часе згушчаліся цёмныя хмары над Канстытуцыяй і Польшчай.

Варта згадаць, што ў Варшаве дзейнічаў Чатырохгадовы сойм (1778-1792), які прыняў шэраг законаў. У адным зь іх было сказана аб самаўрадзе для паасобных зямель. Усе гэтыя законы-рэформы былі перакрэсьлены Канстытуцыяй 3-га Траўня 1791 году пры ўдзеле караля. Канстытуцыя не ўратавала Рэчы Паспалітай і не задаволіла палякаў, а толькі абурыла народы ВКЛ, паколькі рабіла зь яго правінцыю Польшчы й акрамя каталіцкай дзяржаўнай рэлігіі мела быць адна дзяржаўная мова — польская.

Факт бясспрэчны, што сярод народаў Вялікага Княства Літоўскага жыла традыцыя дзяржаўнай самастойнасьці. Але пры такой Канстытуцыі й пры такіх парадках палякаў цяжка паверыць, каб беларусы прынялі ўдзел у гэтым „вызвольным" паўстаньні Касьцюшкі, якое абсалютна нічога не давала ня толькі беларусам, але ўсім народам ВКЛ, за выняткам палякаў і спалянізаваных беларусаў-каталікаў і вуніятаў.

Мы памятаем з нядаўняй гісторыі як гэта Юзаф Пілсудскі ваяваў „за нашу і вашу вольнасьць". Ягоныя абяцанкі ў Вільні ў красавіку, а ў верасьні 1919 году ў Менску пра-

дугледжвалі народам былога Вялікага Княства Літоўскага вялікую свабоду ў вырашэньні сваіх нацыянальных і рэлігійных спраў. Гэтага мы не спатыкаем у Касьцюшкі й Ясінскага, якія былі, як і Пілсудскі, сынамі беларускай зямлі. Таксама й Люцыян Жалігоўскі, сын гэтай зямлі, у кастрычніку 1920 году пайшоў вызваляць сталіцу былога ВКЛ, каб стварыць Сярэднюю Літву. І чым гэта ўсё закончылася? А закончылася тым, што Пілсудскі не стрымаў сваіх абяцанак, а Жалігоўскі, вызваліўшы Вільню з ваколіцамі ад літоўцаў, аддаў іх эндэкам, а сам выехаў у Варшаву.

Вызваліць народ і ўзяць яго пад сваю акупацыю, то якая гэта „воля, роўнасьць, незалежнасьць"? І каб тады, напрыклад, варожая куля трапіла ген. Жалігоўскага, як „вызваляў" ён Вільню ад літоўцаў, то нямала тадышніх беларусаў, падобна сёньняшняму Нацыянальнаму Арганізацыйнаму Камітэту, зрабілі-б і Жалігоўскага большым беларускім патрыётам за К. Каліноўскага й усіх згаданых „сьвятых для нас".

Адным з гэтых „сьвятых для нас" барацьбітоў паўстаньня Касьцюшкі, „які змагаўся за волю, роўнасьць і незалежнасьць", зьяўляецца Міхал Клеафас Агінскі. Варта аднак прачытаць, што піша аб ім С. Таляронак, супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі перыяду капіталізму Інстытута гісторыі АН Беларусі: „Аналізуючы запіскі графа Агінскага, прыходзіш да высноў, што ён не робіць розьніцы паміж паняцьцямі „Польшча" й „Рэч Паспалітая". І, такім чынам, як чалавек свайго клясу й часу, не робіць розьніцы паміж беларускім, літоўскім і ўкраінскім народамі, лічачы, што яны складаюць адзін народ польскі. У паперах графа Агінскага (знаходзяцца ў ЦДАСА, Ф. 12, воп. 1, спр. 156. Справа аб Польшчы й Літве) адсутнічаюць якія-небудзь дакуманты, якія-б сьведчылі аб тым, што Агінскі гэта змагар за нацыянальнае вызваленьне, які выступаў за самастойнае разьвіцьцё беларускага народу, яго культуры й мовы. Выношваючы адраджэньне Польшчы, Агінскі меў на ўвазе адраджэньне Рэчы Паспалітай як, па яго разуменьні, польскай дзяржавы" („Голас Часу, № 16 (1), Лёндан 1992 г.).

І такі быў не адзін Міхал Клеафас Агінскі, а ўсе кіраўнікі паўстаньня на чале з Тадэвушам Касьцюшкам. Дык якія-ж гэта „сьвятыя для нас"? Зусім іншая справа адзна-

чыць гадавіну беларускага збройнага чыну пад Грунвальдам, Воршай, Слуцкай Абароны, а не чужое „вызвольнае паўстаньне" Касьцюшкі.

Паўстаньне Касьцюшкі 1794 году, якое ставіла за мэту аднаўленьне незалежнай Рэчы Паспалітай у межах 1772 году, пацярпела паражэньне. Пасьля яго паражэньня наступіў трэці падзел Рэчы Паспалітай у 1795 годзе. Польшча зьнікла з карты Эўропы. Але, як раней вялося змаганьне ў імя незалежнасьці Польшчы ў яе граніцах 1772 году, так і пазьней вялося гэтае самае змаганьне за Польшчу. А беларусы, літоўцы, украінцы й іншыя выкарыстоўваліся ў гэтай барацьбе па-рознаму, але не за свае інтарэсы, а за інтарэсы Польшчы.

На працягу апошніх стагодзьдзяў беларусы многа дзе ваявалі пад чужымі сьцягамі й за чужую справу, ды на сваю згубу. Напрыклад, возьмем апошнюю вайну. Беларусы ваявалі ў польскай, савецкай і нямецкай арміях ды ў партызанах. Усюды яны ваявалі пад чужымі сьцягамі, гінулі за чужую справу й ніхто нічога не казаў. Але, калі ў апошняй вайне беларусы ўзялі зброю ў рукі пад сваім нацыянальным сьцягам, каб змагацца за свае нацыянальныя інтарэсы, то яшчэ й сёньня чуем лямант: „Здраднікі!" Чужое хвалім, а свайго ня хочам знаць.

Хочацца толькі ведаць што паўстаньне Т. Касьцюшкі мела прынесьці беларускаму народу? Чаму Нацыянальны Арганізацыйны Камітэт сьвяткуе яго на Беларусі як „вызвольнае паўстаньне"? Каго яно мела вызваліць, ад чаго вызваліць і што мела даць беларускаму народу? Касьцюшка абяцаў сялянам зямлю, але не перамог супраціву шляхты. Таксама Я. Ясінскі хацеў абмежаваць самаволю магнатаў і дэкляраваў роўнасьць грамадзян, але быў адсунуты з кіраўнічай пасады гэтым паўстаньнем за згодай Т. Касьцюшкі. І нідзе ня бачым, каб Касьцюшка, Ясінскі, ці які другі палітык-паўстанец успамянуў аб былой Беларуска-Літоўскай дзяржаве, каб вярнуць ёй старую незалежнасьць, а толькі гутарка ішла пра Польшчу.

Уладзімір Казбярук піша: „Напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай беларуская кніжная культура й асабліва мастацкая літаратура былі прыдушанымі, інтэлектуальная эліта

й тыя слаі, якія мы называем „пануючымі", цалкам дэнацыяналізаваліся, а Канстытуцыя 3 мая 1791 года — дэмакратычная ў сацыяльна-палітычным пляне — замацоўвала ўнітарны характар усёй дзяржавы. Калі-б падзеі й далей разгортваліся ў такім напрамку, то праз стагодзьдзе Францішку Багушэвічу ўжо не было-б чаго адраджаць" („Полымя" № 7, 1993 г., стар. 176).

Ясінскі загінуў у абароне Варшавы, а параненага Т. Касьцюшку рускія ўзялі ў палон. Цар Павал ахвяроўваў Касьцюшку высокі пост у сваёй арміі й хоць Касьцюшка адмовіў, аднак разам са сваімі шматлікімі палоннымі быў выпушчаны на волю й выехаў у ЗША. Праз васемнаццаць месяцаў вярнуўся ў Францыю. І калі Напаляон ішоў вайной на Маскву, разам зь ім ішло многа палякаў на чале зь Юзафам Панятоўскім, але Касьцюшка застаўся нейтральным у гэтай вайне. Ён пераехаў у Швейцарыю, дзе памёр 15 кастрычніка 1817 году, пражыўшы 71 год.

У паўстаньні Касьцюшкі я нічога ня бачу вызвольнага для беларускага народу, акрамя вяртаньня да граніцаў Рэчы Паспалітай 1772 году з той самай палітыкай апалячваньня й акаталічваньня беларусаў. Мы сёньня бачым, як палякі глядзяць на „Крэсы всходне", бо маюць там сваіх паплечнікаў.

(„Голас Часу" № 27 (6), Лёндан 1993 г.).

Беларусь пасьля падзелаў Рэчы Паспалітай

Пачынаючы ад палавіны XVIII стагодзьдзя Рэч Паспалітая хіліцца да эканамічнай руіны й свайго палітычна-дзяржаўнага заняпаду. Магнаты й шляхта, карыстаючыся вялікімі прывілеямі ў дзяржаве, не падпарадкоўваюцца пастановам дзяржаўных органаў. Яны ставяць на першы плян свае шляхоцкія правы й злоўжываюць правам „лібэрум вэто", уводзяць байкот і тармозяць рэформы ў краіне.

Унутраныя беспарадкі ў Рэчы Паспалітай выкарысталі яе мацнейшыя суседзі: Прусія, Аўстрыя й Расея, якія, змовіўшыся, пачалі дзяліць Рэч Паспалітую паміж сабою, далучаць яе тэрыторыю да свае. Такім парадкам адбыліся тры

падзелы Рэчы Паспалітай у 1772, 1773 і 1795 гадох. Пасьля першага падзелу Рэчы Паспалітай Кацярына II утварыла на забранай тэрыторыі „беларускае" генэрал-губэрнатарства. Пасьля другога падзелу ўтворана была Менская губэрня. Пасьля трэцяга й апошняга падзелу ўся Беларусь апынулася пад Расеяй, толькі Беласточчына адышла да Прусіі. Рэч Паспалітая перастала існаваць. На зьмену апалячанай і акаталічанай Беларусі прыйшоў другі акупант з Усходу, а зь ім палітычны, гаспадарчы й культурны заняпад і прыгнёт.

Дарма намагаюцца савецкія партыйныя гісторыкі даказаць, што быццам „узьяднаньне Беларусі з Расеяй у 1795 годзе мела вялікае прагрэсіўнае значэньне для далейшага разьвіцьця культуры й літаратуры беларускага народа. Зьдзейсьнены былі спрадвечныя імкненьні народа да ўзьяднаньня з родным яму па паходжаньню, мове, культуры й гістарычнаму лёсу вялікім рускім народам: значна хутчэй пачала разьвівацца эканоміка Беларусі, беларускі народ быў выратаваны ад гвалтоўнай палянізацыі" („Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры", Мінск 1956, стар. 58). У сапраўднасьці беларускі народ ня быў выратаваны ані эканамічна, ані культурна. Нават савецкія аўтары прызнаюць цяжкі матэрыяльны быт беларускай вёскі за цароў, сяляне якой цэлымі групамі выязджалі ў Сібір на цаліну, або ехалі за акіян, каб толькі далей ад бяды.

А што да культуры, мовы й палянізацыі, то ад самага пачатку падзелу Рэчы Паспалітай як Кацярына II, так і наступныя цары не прызнавалі беларусаў за самастойны народ, а іх мову лічылі расейскім дыялектам. Беларуская мова й яго культура мелі растварыцца ў вялікарасейскім моры. Расейская адміністрацыя дзяліла беларусаў не этнаграфічна, як павінна было быць, але дзяліла іх рэлігійна: хто праваслаўны — той рускі, хто каталік — той паляк; а беларусаў як такіх не было.

На былой зямлі Рэчы Паспалітай, якая апынулася ў граніцах Расеі, польскі элемэнт карыстаўся вялікай свабодай і правам. Гэта прызнавалі адкрыта польскія дзеячы й палітыкі. Яны праз свае „соймікі" кіравалі польскім школьніцтвам і адміністрацыяй на Беларусі й Літве. Каталіцкая царква карысталася свабодай, толькі забаронена было ёй падаваць да ве-

дама папскія энцыклікі без апрабаты генерал-губэрнатара. Ды нават езуіцкія калегіі былі адкрыты ў Магілёве, Мсьціслаўі, Чачэрску, Воршы, Віцебску й Дзьвінску пасьля таго, калі папа Клімент XIV у 1773 годзе разьвязаў ордэн езуітаў. Толькі Вуніяцкая царква, як і раней, не карысталася аўтарытэтам на Беларусі. Яе не любілі не толькі праваслаўныя, але й каталікі. Абрад яе быў усходні, а догмы — заходнія. Як праваслаўныя, так і каталікі хацелі пакончыць з гэтым штучным творам. Апынуўшыся сярод непрыхільнага да сябе асяродзьдзя, з часам вуніяты самі разьвязалі свой штучны твор. Адны яе вернікі вярнуліся назад у праваслаўе, а другія пайшлі ў рыма-каталіцызм, дзе іх польскія ксяндзы апалячылі.

У 1803 годзе ўтворана была Віленская школьная акруга на чале з польскім патрыётам, князем Адамам Чартарыскім, якая абымала ўсе беларускія губэрні. Мэтай яе было, як піша С. Таляронак, „жаданьне аднавіць палітычныя структуры Рэчы Паспалітай 1772 года, г.зн. уключыць у яе састаў, акрамя ўсяго іншага й Беларусь, ліквідаваць праваслаўе і вуніяцтва, насільна насадзіць каталіцызм" („Настаўніцкая газета" № 86, 27 кастрычніка 1990 г., стар. 3).

Стараньнем Адама Чартарыскага рэарганізаваны быў Віленскі ўнівэрсытэт, статут якога 18 мая 1803 году зацьвердзіў цар Аляксандар I. Гэтым-жа Адамам Чартарыскім у губэрнскіх гарадох адкрыты былі гімназіі, а ў паветах — павятовыя школы. Навучаньне ў школах на Беларусі вялося на двух мовах — польскай і расейскай, толькі не на беларускай, хоць князь А. Чартарыскі паходзіў са старога беларускага роду. Ён быў адначасна куратарам Віленскага ўнівэрсытэту й вёў нагляд за польскімі школамі. Яму на дапамогу прыйшлі такія самыя польскія патрыёты — Тадэвуш Чацкі й Гуга Калантай. Такім спосабам пад польскім уплывам апынуліся вельмі важныя дзялянкі выхаваньня моладзі ў польскім духу. Так пісаў адзін з польскіх дзеячоў да Калантая: „Пад расейскай уладай нам (палякам) адкрываюцца добрыя ўмовы. Разам з тым арганізацыя ў выбары здольных палякаў на месцы настаўнікаў зробіць тое, што толькі можна спадзявацца ў даным выпадку".

І сапраўды, такія спрыяльныя ўмовы палякі выкарыстоўвалі поўнасьцю. Вельмі добрую ролю выконваў Віленскі ўні-

вэрсытэт, які стаў цэнтрам палянізацыі сярэдняй і дробнай шляхты, бо магнаты былі ўжо спалянізаваны даўно. Па-другое, у мурох Віленскага ўнівэрсытэту гуртаваліся нелегальныя польскія рэвалюцыйныя арганізацыі апазыцыйныя да пануючай царскай сыстэмы.

Зь Віленскага ўнівэрсытэту пачалі выходзіць і піянеры беларускага нацыянальнага руху, пачала выходзіць ідэя аднаўленьня Вялікага Княства Літоўскага як незалежнай ад Расеі й Польшчы дзяржавы. Вядомы юрыст, прафэсар Ігнат Даніловіч парупіўся апрацаваць так званы „Западный свод законов" на аснове Літоўскага Статуту, які меў быць кодэксам для Беларусі.

Хоць Віленскі ўнівэрсытэт заснавалі палякі, а сярод іх апалячаныя беларусы, аднак беларуская справа ў ім з кожным годам набірала важнасьці й папулярнасьці. І каб пратрываў ён яшчэ дэкаду, ёсьць верагодным, што Беларусь мела-б шанц знайсьці ў ім свой голас, дзякуючы свабоднаму праяўленьню думак.

Па-за Віленскім унівэрсытэтам не было на Беларусі ніякай вышэйшай школы. Толькі ў 1840 годзе ў Горках была адкрыта Гора-Горацкая гаспадарчая школа, якая ў 1848 годзе была павышана да рангу інстытута. Быў гэта першы на Беларусі, а нават у Расеі сельска-гаспадарчы інстытут. Існаваў ён толькі да 1863 году й быў закрыты за ўдзел яго студэнтаў у паўстаньні Каліноўскага.

Як ужо згадвалася, у мурох Віленскага ўнівэрсытэту кавалася нацыянальная сьвядомасьць ня толькі палякаў, але й беларусаў, якіх было там нямала. Яны як ніколі раней зацікавіліся гісторыяй і культурай свае Белае Русі й падрыхтоўвалі на будучыню грунт для нацыянальнага адраджэньня. Сярод членаў студэнцкіх арганізацыяў філяматаў, філярэтаў, шубраўцаў былі выхадцы зь Беларусі — Адам Міцкевіч з Навагрудчыны, Тамаш Зан зь Меншчыны, Антон Адынец з Ашмяншчыны, Ян Чачот з Навагрудчыны й другія. Яны зьбіралі беларускі фальклёр і ў сваіх творах успаміналі Беларусь.

У гэтым часе беларускі народ быў ужо вядомы. Ён выступаў як маналітная грамада, якая гутарыла на адной мове. Зацікаўленьне беларускім краем было пашырана настолькі, што нават некаторыя польскія прафэсары Віленскага ўнівэрсытэту пама-

галі беларускаму археолягу Івану Грыгаровічу зьбіраць матэрыялы для ягонага выданьня „Белорусский архив древних актов". Работу Грыгаровіча працягваў Ігнат Даніловіч.

Амаль усе факультэты на Віленскім унівэрсытэце ўзначальвалі выдатныя прафэсары, людзі прагрэсыўныя, якія любілі свабоду й бацькаўшчыну. Таму Віленскі ўнівэрсытэт садзейнічаў руху адраджэньня зямель ВКЛ. Гэтае адраджэньне прывяло да польскага паўстаньня з мэтай устанавіць сваю незалежнасьць. Агульна гаварылася аб адраджэньні Вялікага Княства Літоўскага, выдаваліся ўлёткі нават на беларускай мове, а ў сапраўднасьці лістападаўскае паўстаньне (1830-1831) праходзіла пад лёзунгам аднаўленьня старой Рэчы Паспалітай з 1772 году. Хоць гэтае паўстаньне правалілася й на Беларусі, але беларусы ў ім шырокага ўдзелу не прымалі, за выняткам апалячанай шляхты. Былі выпадкі, што беларускія сяляне выдавалі паўстанцаў расейскім уладам.

Пасьля падаўленьня паўстаньня, палякі ўтрацілі прывілеі, якія даў ім Аляксандар І. Зачынены быў Віленскі ўнівэрсытэт, пакінута толькі Мэдыцынская акадэмія й Вэтэрынарнае аддзяленьне, страцілі законную сілу Статуты ВКЛ, а ўведзены ў 1832 годзе статут інкарпараваў Польскае Каралеўства ў склад Расеі, якое з таго моманту прыняло назоў Надвісьлянскі Край. Як працяг свае імпэрскай палітыкі, указам ад 18 чэрвеня 1840 году Мікалай І (1825-1855) забараніў ужываць тэрмін „Беларусь", а ўведзены быў новы тэрмін — „Северо-Западный край".

Цар Мікалай І новым міністрам асьветы назначыў Уварава. У паняцьці гэтага міністра прадметы геаграфіі й сучаснай гісторыі зьяўляліся небясьпечнымі для моладзі. Ён казаў: „Чым людзі менп знаюць, тым лягчэй імі кіраваць". Увараў быў першым, хто пачаў уводзіць расейскую мову на заграбленай тэрыторыі з мэтай асыміляваць нацыянальныя меншасьці.

Трыццаць гадоў царстваваньня Мікалая І адзначыліся мілітарызмам, прасьледам свабоды, заняпадам асьветы, культуры й цывілізацыі. Мікалай любіў гаварыць: „Мне не патрэбны разумныя, мне патрэбны паслушныя" й такімі людзьмі ён сябе акружаў. Гэта цёмная страніца ў гісторыі Расеі, а на Беларусі яна яшчэ цямнейшая.

Польскія дзеячы тае пары, як некаторыя й цяпер, уважалі й уважаюць, што Беларусь зьяўляецца састаўной часткай Польшчы й яна павінна ўвайсьці ў яе склад, калі Польшча атрымае сваю незалежнасьць.

У адказ на такі польскі падыход да Беларусі, з расейскага лягеру таксама пачынаюць адзывацца галасы яе ўраджэнцаў. Шпілеўскі, Кушын, Эгілеўскі й другія сабралі й апублікавалі даволі многа цікавага матэрыялу аб Беларусі. Але, як супрацьдзейнік польскім сьцьверджаньням, прызнаюць Беларусь за „русский край". Усё-ж гэтыя людзі праявілі вялікую цікавасьць да беларускай традыцыйнай культуры, мовы, гісторыі й яе пісьмовых помнікаў.

Такім парадкам узрастала зацікаўленьне тэматыкай Беларусі збоку навуковых, грамадзкіх і палітычных кругоў польскіх і расейскіх навукоўцаў. Людзей гэтых цікавіла раньняя гісторыя беларускага народу. Ужо ў часе Напалеонаўскай вайны 1812 году царскі афіцэр Канстанцін Калайдовіч зьведаў Беларусь. Ён зацікавіўся культурнай спадчынай беларускага народу й пасьля вайны зьбіраў і вывучаў старажытныя выданьні. Запазнаўшыся з багацьцем беларускай культуры, Калайдовіч зьвярнуў увагу вучоных сьвету на важнасьць і неабходнасьць дасьледаваньня беларускай мовы, якая ў той час, як ён асабіста пераканаўся, мела шырокае распаўсюджаньне.

Так, беларуская мова ў той час мела шырокае распаўсюджаньне. Адам Міцкевіч гаварыў у Парыжы, што беларускай мовай карыстаецца 10 мільёнаў людзей. Была гэта мова ў свой час дзяржаўная, але яе суседзі, палякі й расейцы, адабралі ад яе гэтае права, замяніўшы сваёй мовай. Беларуская мова засталася жыць толькі пад саламянай страхой гаротнага беларускага селяніна. Дзе-нідзе нехта пісаў вершы. Былі гэта скромныя пачаткі адраджэньня беларускай культуры, аднак нацыянальна масы народу спалі, не цікавіліся палітычным жыцьцём, бо-ж беларускія магнаты й інтэлігенцыя, калі не перайшлі у польскі, то трапілі ў расейскі лягер. Аб гэтым перыядзе малады расейскі рэвалюцыянер-дэмакрат Мікалай Дабралюбаў піша ў „Современнику" ў 1860 годзе, дзе дае такую характарыстыку беларусам: „Адносна беларускага селяніна, справа ўжо вырашана: забіты

канчаткова, так што нават пазбавіўся выкарыстаньня чалавечых здольнасьцяў. Ня ведаю, у якой ступені памылковае гэтае меркаваньне, таму што не вывучалі спэцыяльна беларускага краю, але паверыць яму, зразумела, ня можам. Цэлы народ так вось узялі й забілі, — як-бы не так!.. Ва ўсякім разе, пытаньне аб характарыстыцы беларусаў павінна хутка быць растлумачана працамі мясцовых пісьменьнікаў".

Тут трэба сказаць, што беларускі селянін ня быў у той час „забіты канчаткова", але быў ён прыбіты горам. Доўга не прыйшлося чакаць, як у 1863 годзе ён прыняў удзел у паўстаньні Кастуся Каліноўскага, які ўскладаў вялікую надзею якраз на беларускага селяніна-мужыка ў барацьбе з царызмам за свае правы.

Аднак, калі мы возьмем пад развагу ўсе тагачасныя палітычныя й сацыяльныя абставіны, то ўдзел у іх беларускага селяніна-мужыка пры баку Каліноўскага не закончыўся-б для яго надзеяй на лепшае. Больш верагодна, што ён як быў, так і застаўся-б польскім парабкам. Паўстаньні 1794, 1830-1831 і 1863 гадоў вяліся па ісьпірацыі польскай магнатэрыі. Хоць некаторыя іх кіраўнікі, як Якуб Ясінскі, Кастусь Каліноўскі й іншыя, мелі на мэце аднавіць Вялікае Княства Літоўскае, а фактычна Рэч Паспалітую, аднак палітыка палякаў да народаў былога ВКЛ заставалася нязьменнай. Толькі дзеля прапаганды, каб заіграць на нацыянальных пачуцьцях і пацягнуць масы народу да паўстаньня, асабліва 1863 году, выдадзена была палякамі адозва, у якой гаварылася, што „братнім народам Літвы й Русі, злучаным з Польшчай, гарантуецца памыснае разьвіцьцё іх нацыянальнасьцяў і іх моваў". Гэта ўсё, што абяцала Варшава народам Вялікага Княства Літоўскага.

Палякі дзейнічалі ў духу Канстытуцыі 3-га Мая 1791 году, якая ліквідавала Вялікае Княства Літоўскае й рабіла зь яго адну правінцыю Польшчы, дзе дзяржаўнай рэлігіяй мела быць рыма-каталіцкая, а мова — польская. Так піша польскі гісторык Владыслаў Вяльгорскі: „Толькі што закончыўся дня 22 кастрычніка 1791 г. працэс паступовага зьбліжэньня двух дзяржаваў, распачаты актам Крэўскім, падпісаным Ягайлам 14 жніўня 1385 г. Стварылася Рэч Паспалітая „Абодвух Народаў", маючых жыць у аднолькавай дзяр-

жаўнай сыстэме. Справа, аб якой мова, трывала 400 гадоў". („Польска а Літва", Лёндан 1947, стар. 170).

Так што Беларусь, Літва й Украіна ня мелі ніякай надзеі на адраджэньне сваёй культурнай спадчыны, якою яны карысталіся ў Вялікім Княстве Літоўскім да часу стварэньня Рэчы Паспалітай, або падпісаньня Любінскай вуніі ў 1569 годзе.

Толькі на пачатку 80-х гадоў XIX стагодзьдзя сярод рэвалюцыйных беларускіх студэнтаў можна было пачуць больш цьвярозы голас за аўтаномію Беларусі.

(„Голас Часу" № 10 (1), Лёндан 1991 г.).

„З душой славяніна"

Рэдакцыя „Голасу Часу" атрымала цікавую й карысную кніжку пад назовам „З душой славяніна", выдадзеную ў Менску ў 1991 годзе, аўтарамі якой зьяўляюцца А. С. Аксамітаў і Л. А. Малаш. Кніжка прысьвечана жыцьцю й навуковай дзейнасьці Адама Чарноцкага, які, каб схавацца ад пакараньня царскай уладай за выказаны патрыятызм, прыняў новае імя й прозьвішча — Зарыян Якаўлевіч Далэнга-Хадакоўскі. Пад гэтым прозьвішчам ён у навуковым сьвеце вядомы як адзін з першых дасьледчыкаў усходняй славяншчыны.

Хоць продкі яго бацькі паходзілі з Мазовіі, але родзічы маці былі зь Беларусі. Сам З. Далэнга-Хадакоўскі (Адам Чарноцкі) часта называў сябе случчаком, „па паходжаньні з тутэйшага краю". Але, як большасьць тагачаснай шляхты, узгадаваны быў у польскай культуры, аднак не праяўляў польскага нацыяналізму. Ягоныя абшырныя навуковыя досьледы паказваюць аб'ектыўны падыход да славянскага пытаньня, ягонай духовай культуры, дзе нямала ўвагі прысьвяціў ён і Беларусі.

„Уводзіны" да кніжкі, якія прадстаўляюць абставіны канца XVIII — пачатку XIX ст. у Эўропе паказваюць зацікаўленьне шматлікіх эўрапэйскіх вучоных пытаньнем паходжаньня славян. А што да Беларусі, дык чытаем: „Іншая сытуацыя ў гэты перыяд склалася на Беларусі, дзе нацыянальная самасьвядомасьць насельніцтва знаходзілася ў стане глыбокага крызісу, які вынікаў зь цяжкіх сацыяльна-палітычных умоў жыцьця беларускага народу ў складзе Рэчы Паспалі-

тай. Замаруджанасьць працэсу фарміраваньня беларускай нацыі, яе культуры, літаратурнай мовы й мастацкай літаратуры ў XVIII — пачатку XIX ст. тлумачыцца ў першую чаргу адсутнасьцю дзяржаўнай самастойнасьці й дэнацыяналізацыяй значнай часткі мясцовай інтэлігенцыі. Польскі ўплыў захапіў усе сфэры жыцьця беларусаў. Беларуская мова, якая выконвала ролю дзяржаўнай у Вялікім Княстве Літоўскім, была забаронена ў справаводзтве ўладамі Рэчы Паспалітай у канцы XVII ст. Прыходзіць у заняпад беларуская пісьменнасьць. Вялікія масы польскамоўнага насельніцтва з Мазовіі засялялі беларускія землі. Палянізацыі беларускага народу ў вялікай ступені садзейнічаў і Каталіцкі касьцёл, які яшчэ ў першай палове XVI ст. стварыў на Беларусі рыма-каталіцкія школы. Аб гэтым галоўным чынам рупіліся езуіты, якія пасьля аб'яднаньня Беларуска-Літоўскай дзяржавы з Польшчай паводле Любінскай уніі 1569 г. актыўна пранікалі на Беларусь і энэргічна насаджалі пальшчызну".

Сапраўды, кніжка цікавая, багатая дасьледчым матэрыялам і павінна зацікавіць кожнага беларуса, які крыху цікавіцца мінулым свае краіны.

(„Голас Часу" № 17 (2), Лёндан 1992 г.)

XIX стагодзьдзе на Беларусі й Кастусь Каліноўскі

Ідэі вольнасьці, роўнасьці й братэрства, якія былі напісаны на сьцягох Французскай рэвалюцыі 1789 году, дакаціліся да Расейскай імпэрыі. Былі гэта далёкія водгукі, якія прабудзілі інтэлігенцыю Расеі інакш глянуць на падзеі сьвету.

Неўзабаве прыйшла Напалеонаўская вайна зь яе лёзунгамі вызваленьня народаў. Пасьля паражэньня й Венскага кангрэсу (1814-1815) цар Аляксандар I (1801-1825) аказаўся адным з найбольш магутных эўрапэйскіх манархаў. Але гэта не гарантавала царскай Расеі бясьпекі. Яе жаўнеры, а асабліва афіцэры, пабачыўшы Заходнюю Эўропу, яе матэрыяльны ўзровень жыцьця й дэмакратычны лад, прывезьлі дамоў не адну добрую ідэю. У выніку гэтых ідэяў сярод маладых афіцэраў паўстала тайная арганізацыя, якая паставі-

ла сваёй мэтай замяніць самадзяржаўную Расею ў канстытуцыйную манархію.

У палове сьнежня (декабрь) выбухла заўчаснае, неадпаведна прыгатаванае паўстаньне й таму скончылася яно трагічна. Некаторыя арганізатары разьлічвалі, што ў сувязі са сьмерцю цара Аляксандра, якая наступіла 19 лістапада 1825 году, ім удасца захапіць уладу ў Расеі й правесьці рэформы. Аднак так ня сталася. Нейкіх тры сотні мяцежнікаў застрэлілі ў час мяцяжу, сотню, калі ня больш, саслалі ў Сібір, а пяць яго кіраўнікоў павесілі. Як іх вешалі, парвалася вяроўка й сказанец упаў на зямлю. Ён сказаў: „Нічога ў Расеі ня зроблена добра, нават шыбеніца".

Было гэта ня першае выступленьне супраць царату й хоць яно пацярпела паражэньне, затое мела сваё гістарычнае значэньне. Ідэі дзекабрыстаў знаменавалі новы этап у духоўным жыцьці тагачаснай Расеі й мелі жыватворныя ўплывы на разьвіцьцё прагэсыўнай думкі на Беларусі. За сьмерць дэкабрыстаў некаторыя расейскія рэвалюцыянеры прысягнулі памсьціцца на самадзяржаўі.

Добрае імя дзекабрыстаў засталося жыць у народзе. Шкада, што іхняя Канстытуцыя, якая пісалася ў Менску, не разглядала нацыянальнай праблемы Расеі, але гэтай справай заняліся другія рэвалюцыйныя арганізацыі й людзі, неўзабаве пасьля дзекабрыстаў.

Аляксандра I заступіў Мікалай I (1825-1855), асоба зусім адметная ад свайго брата й бацькі. Быў гэта чалавек цьвёрдай, упартай і працавітай натуры. Мікалай любіў ваеннае рамяство, салдацкую дысцыпліну й парадак. Аднавіў ён тайную паліцыю, увёў строгую цэнзуру прэсы й нават сам пераглядаў некаторыя рукапісы, якія маглі-б падважыць ягоны аўтарытэт. Быў гэта тыповы аўтакрат, які чым далей тым больш праяўляў дэспатызм.

У 1830-1831 гадох выбухла польскае паўстаньне, якое на Беларусі падтрымалі палякі. Яны пісалі адозвы па-беларуску й пускалі ў ход прапагандовы лёзунг „за нашу вольнасьць і вашу". Але беларусы на гэтае паўстаньне не адазваліся, а нават выдавалі расейскім уладам паўстанцаў. Паўстаньне ўпала, а ўсьлед за ім пачаўся прасьлед нацыянальнай і навуковай дзейнасьці народаў былога Вялікага Княства Літоўскага.

Віленскі ўнівэрсытэт, у мурох якога гуртаваліся розныя польскія рэвалюцыйныя арганізацыі, перанесены быў у Кіеў.

У 1836 годзе расейскую інтэлігенцыю парушыў філязафічны ліст Пятра Чаадаева. Твор гэты быў насычаны нянавісьцю да пануючай у Расеі сыстэмы, якая перахоўвала няслаўныя традыцыі азіятаў і татараў. За гэты ліст, па загаду Мікалая І, Чаадаева аб'явілі вар'ятам і замкнулі пад хатні арышт. Падобна піша доктар філязафічных навук, прафэсар М. Крукоўскі: „Тыранія стала амаль што традыцыйнай рысай гісторыі Расейскай імпэрыі, аб якой з такой горыччу пісаў вялікі Лермантаў. Гэта выразна праяўлялася як у клясавых, так і ў нацыянальных адносінах" („Голас Радзімы" № 2, 10 студзеня 1991 г., стар. 7).

У абароне свае нацыянальнае культуры выступіў Ігнат Кулакоўскі, які быў абураны дэнацыяналізуючай палітыкай царскай рэакцыі. Займаючы пасаду ў дырэкцыі вучылішчаў Гродзеншчыны, Кулакоўскі ў 1834 годзе зьвярнуўся ў Міністэрства асьветы Расеі, каб яно дало дазвол на неабходную адукацыю тутэйшых людзей. Як беларус, ён дамагаўся вывучэньня мовы народу, этнаграфіі, мастацтва, мясцовай старажытнасьці й гісторыі. Прапанаваў таксама выдаць „Гісторыю краю".

Шматлікія пісьмовыя захады І. Кулакоўскага засталіся без адказу. Тады, у 1855 годзе ён паехаў у Пецярбург, каб асабіста прадставіць там свае дамаганьні. На жаль, царская палітыка не была зацікаўлена асьветай народу, а тым больш нацыянальныя матывы не адпавядалі вялікадзяржаўнай палітыцы Расеі.

Сваёю дзейнасьцю Кулакоўскі хацеў паўплываць на насельніцтва краю, каб заставіць яго задумацца над сваім лёсам. Як навуковец, ён дасканала ведаў гісторыю свайго краю й у выніку яго дзейнасьці зьявіліся ананімныя артыкулы ў „Виленском вестнике" ў 1864 г. Кулакоўскі быў абраны ганаровым членам навуковага таварыства ў Данii.

На Беларусі адчуваўся ўсебаковы крызіс, які перш за ўсё праяўляўся ў адсутнасьці нацыянальнай школы, свае прэсы, абмежаваньні разьвіцьця беларускай культуры. На Беларусі й Літве па старой традыцыі з часоў Рэчы Паспалітай дзейнічалі польскія школы, „соймікі" й лякальная адміністрацыя.

Праз гэтыя ўстановы пашыраліся польскія ўплывы. Каб супрацьставіцца польскім уплывам, на Беларусь ехалі расейскія чыноўнікі й адміністратары, якім урад добра плаціў, каб толькі русыфікавалі мясцовае насельніцтва.

Аб агульным незадаваленьні царскімі парадкамі гаворыць той факт, што каля 150 тысяч асоб было высланых у халодную Сібір. Толькі на Беларусі за гэты час успыхнула 605 сялянскіх бунтаў. І не дарма празвалі цара Мікалая І „жандарам".

Г. А. Каханоўскі піша: „Вялікі ўплыў на выступленьні сялян Беларусі аказала паўстаньне іх клясавых пабрацімаў у Галіцыі ў 1846 г. Адпаведнае значэньне мела й рэвалюцыя 1848 г. у краінах Заходняй Эўропы. У самой-жа Беларусі дзейнічалі розныя рэвалюцыйна-дэмакратычныя арганізацыі. Так, па ініцыятыве беларускага паэта Ф. Савіча была створана нелегальнае „Дэмакратычнае таварыства", якое выхоўвала патрыятычныя пачуцьці ў мясцовай моладзі. Рэвалюцыйным дэмакратам адзначана дзейнасьць бясстрашнага сялянскага важака й публіцыста Ю. Бакшанскага, які адкрыта заяўляў: „Магутнасьць нацыі складае кляс людзей, імя якім мужык". Вялікі ўплыў на перадавую беларускую інтэлігенцыю аказвалі ідэі А. І. Герцэна, М. П. Агарова, В. Г. Бялінскага, М. Г. Чарнышэўскага, М. А. Дабралюбава й інш." („Археалогія й гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI-XIX ст.ст.", стар. 39).

Амаль усе гэтыя людзі гаварылі аб незалежнасьці Літвы, Беларусі й Украіны, а Бакунін пісаў: „Я вымагаю толькі аднаго, каб кожнаму малому й вялікаму племені дадзены былі магчымасьці й правы паступаць згодна ўласнай волі: жадае ён зьліцца з Расеяй ці Польшчай, хай зьліваецца. Хоча быць самастойным і жыць на варунках зусім асобнае дзяржавы — Бог зь ім, няхай аддзяляецца".

Наступнік Мікалая І, цар Аляксандар ІІ (1859-1881) аказаўся чалавекам шырэйшага палітычнага сьветапогляду й талеранцыі за свайго брата й бацьку. Заняў ён царскі пасад у той час, калі Расея знаходзілася ў прыгнечаным стане. Першым яго заданьнем было пакончыць з Крымскай вайной, якая была прайгранай. Пасьля заключэньня міру Аляксандар зьвярнуў увагу на балючую праблему Расеі, якой бы-

ло становішча сялян. Ён у 1861 годзе скасаваў паншчыну, якая на Захадзе Эўропы была адменена ў XV стагодзьдзі. Аляксандар надаў дэмакратычна-лібэральны ўстрой судаводзтву, увёў самаўрад — земствы й зрабіў прывілеі балтыйскім народам. Найбольш прывілеяў атрымалі палякі. У 1862 годзе лякальная адміністрацыя выконвалася па-польску, а ў Варшаве адкрыты быў унівэрсытэт. Толькі беларусы нічога культурнага не атрымалі й далей жылі надзеяй на сацыяльную, нацыянальную й палітычную палёгку.

Заможная расейская арыстакратыя супрацівілася шырокаму зраўнаньню нізоў грамадзтва, баючыся насьледзтваў Французскай рэвалюцыі й цар змушаны быў у палове стрымаць свае рэформы. Гэта выклікала абурэньне й расчараваньне ў прагрэсыўных слаях грамадзтва, а найбольш у рэвалюцыйна настроеных элемэнтах, якімі былі сяляне. У выніку такой палітыкі цара на Беларусі было зарэгістраваных 311 сялянскіх бунтаў. З гэтага ліку 108 былі здушаны пры дапамозе войска й паліцыі.

Цяжка сказаць, каб цар Аляксандар II быў вялікім рэфарматарам, але быў ён чалавекам чулым да дамаганьняў людзей і хацеў нешта зрабіць у гэтым напрамку. Але, як бачым, аказаўся бясьсільны, бо ўся адміністрацыя й армія знаходзіліся ў руках арыстакратыі, якая ўсімі спосабамі й мэтадамі паралізавала царскія рэформы.

Палякі, якія атрымалі найбольш прывілеяў у царскай рэформе, адказалі паўстаньнем у 1863 годзе. Яны дамагаліся незалежнасьці ня толькі этнаграфічнай, але й „гістарычнай" Польшчы — у межах былога Вялікага Княства Літоўскага, па граніцы 1772 году. Гэтым палякі паказалі сябе большымі нацыяналістамі й імпэрыялістамі за цара. У свой час цар сказаў: „Известно, что край этот — Белоруссия — никогда не был самостоятельным и никогда не считался за вновь приобретенный; он только был оторван от Польши, как исконная собственность России" (Аляксандар II, 1858 г.).

Такім парадкам, як і ў мінулыя стагодзьдзі, за Беларусь ішло змаганьне паміж палякамі й расейцамі, бо-ж кожны зь іх лічыў Беларусь сваёй уласнасьцю.

Лібэральна настаўленыя расейцы былі зьбянтэжаныя дамаганьнямі палякаў, якія пасягалі на Беларусь і Літву. І ня-

ма нічога дзіўнага, што на такія прэтэнзіі палякаў расейскі ўрад не пагадзіўся. Паўстаньне 1863 году, як і паўстаньне 1830-1831 гадоў было задушана жалезным кулаком. Гісторыя паўтарылася. Кіраўнікі паўстаньня завісьлі на шыбеніцы, а іхніх памагатых казакі пагналі бізуном у Сібір.

Гэтым разам паўстаньне 1863 году на Беларусі было сарганізавана лепш як у 1830-1831 гадах. Гэтую заслугу належыцца прыпісаць Кастусю Каліноўскаму, які праз сваю газэту „Мужыцкая праўда" стараўся разварушыць сялян.

Варта аднак пацікавіцца асобай Кастуся Каліноўскага больш. Аб Каліноўскім беларусы пішуць гадамі як аб нацыянальным героі, барацьбіту за нацыянальную й сацыяльна-эканамічную ды палітычную самастойнасьць Беларусі й Літвы.

Шкада, што мы ня маем газэты „Мужыцкая праўда" Каліноўскага, каб бліжэй запазнацца што ён там піша аб беларусах, Беларусі й што ў сапраўднасьці абяцаў беларускаму народу сваім паўстаньнем. Да гэтага часу падаваліся толькі выбраныя цытаты, сказы з „Мужыцкай праўды", якія часткова адлюстроўвалі два розныя бакі аднаго мэдалю. Другія цытаты з газэты, як „Ліст з-пад шыбеніцы" й адозвы, якія знаходзім у рознай беларускай прэсе, зусім інакш гавораць аб Каліноўскім і ягонай задуманай „свабодзе", якую ён рыхтаваў перад усім для праваслаўных мужыкоў-беларусаў.

У сваім „Лісьце з-пад шыбеніцы" К. Каліноўскі пісаў: „Для таго народзе як толькі калі пачуеш што браты твае з-пад Варшавы б'юцца за праўду й свабоду, тады й ты не аставайся ззаду. (...) Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу народзе, што ты тады зажывеш шчасьліва, калі над табою маскаля ня будзе". Тут, як бачым, Каліноўскі гаворыць аб паляках з-пад Варшавы, як аб беларускіх братох, зь якімі разам трэба ваяваць, каб зажыць шчасьліва, „калі над табою маскаля ня будзе".

Выглядае, быццам, пад Польшчай беларускі мужык жыў шчасьліва, а ўсё няшчасьце звалілася на яго толькі пад уладай Масквы. Ці-ж у сапраўднасьці так было? Гісторыя нам кажа інакш. Беларускі селянін-мужык у ніякім выпадку ня жыў лепш пад Варшавай як пад Масквой, а ў некаторых выпадках намнога горш. Пасол аўстрыйскага імпэратара да рускага цара, барон Жыгімонт Гэрбэрштэйн, які два разы праязджаў праз Беларусь (1517 г. і 1526 г.) пісаў: „На-

род бедны й прыгнечаны цяжкім рабствам". Падобна сьцьвярджае польскі публіцыст Старавольскі, што ў Рэчы Паспалітай „няма нічога іншага, акрамя дзікага рабства, якое аддало чалавека ў поўную ўладу яго пана". Нават такі заўзяты езуіт як Пётр Скарга змушаны быў прызнаць, што „паны ня толькі адбіраюць у гаротнага селяніна ўсё, што ім зроблена, але й забіваюць яго, калі пажадаюць". Такія гэта былі добрыя „браты з-пад Варшавы", якім Кастусь Каліноўскі стараўся дапамагчы коштам крыві беларускіх мужыкоў.

А калі мы глянем на Кастуся Каліноўскага з рэлігійнага боку, дык тут справа выглядае горш. У шостым нумары свае газэты „Мужыцкая праўда" ён бяссорамна піша: „Не адзін ужэ можэ забыўся, што бацько его быў ешчэ справедлівой уніяцкой веры й ніколі ўжэ не спомніць на тое, што перевернулі яго на сызму, на праваславье, што ён сегодня як той сабака жыве без веры й як сабака здохне чартам да пекла!!! (...) Пазнаеш тады свае ліхо — но ў пекле па неўчасе ўжэ будзе, не перапросіш тагды ўжэ справядлівага Бога й мэнкам тваім канца не будзе".

З такою-ж упэўненасьцю й пераканаьнем запалохваў Каліноўскі праваслаўных мужыкоў-беларусаў, каб хутчэй пераходзілі ў унію, бо інакш „здохне як сабака". І гэта было на парозе паўстаньня. А што было-б, каб Каліноўскі выйграў паўстаньне са сваімі „братамі з-пад Варшавы"? Ці ня быў-бы ён другім Язафатам Кунцэвічам? Калі ён ужо дыхаў такой ядавітай нянавісьцю да праваслаўных, параўноўваючы іх да сабак, то што лепшага можна было спадзявацца ад яго ў будучыні?

Далей Каліноўскі пісаў: „Паказываюць людзі, што сьвяты Ойцец аж з Рыму прыслаў ужэ да нас свае благаславеньне, гавораць што прышле ксяндзоў, што будуць прымаці на уніяцкую веру. Тады дзяцюкі хто адно верыць у Бога, Его Сына й Духа Сьвятога, нехай зараз пакідае сызму й пераходзіць на праўдзівую веру Дзедоў і Прадзедаў. Бо хто не перойдзе на унію, той сызматыком застанецься, той як сабака здохне, той на тамтом сьвеце пекельные мэнкі церпеці будзе!"

Відаць, Каліноўскі ня ведаў, ці не хацеў ведаць, што ў 1717 годзе зьявіўся тайны дакумант яго саюзьнікаў, палякаў, які меў скасаваць ня толькі „рускую" веру й народ-

насьць у Рэчы Паспалэтай, але й вунію, якая ў вачох палякаў была таксама рускай верай.

У XVIII стагодзьдзі было выдадзена некалькі соймавых пастаноў пад дыктоўку польскіх каталіцкіх біскупаў, якія забаранялі праваслаўным вернікам быць выбранымі на сойм і ў іншыя ўрадавыя ўстановы. А за адступленьне ад каталіцызму пагражала кара сьмерці. Нават паслам у сойме забаранялася выступаць у абароне іншаверцаў.

У публікацыях К. Каліноўскага не спатыкаецца, каб ён успамінаў беларусаў як народ па імені, а гаворыць аб іх як мужыкох, дзецюкох, падобна шляхціцу Рыпінскаму, удзельніку паўстаньня 1830-1831 гадоў, які ў сваім парыжскім зборніку меў надпіс: „Першаму з мужыкоў беларускіх, што наперад чытаць, а затым гаварыць і думаць па-польску навучыцца".

Гартаючы страніцы гісторыі Беларусі тае пары цяжка знайсьці ў Каліноўскага патрыятызм да Беларусі й беларусаў. Ён больш нагадвае прыладу польскай палітыкі на Беларусі як сапраўднага беларуса. Аб К. Каліноўскім ксёндз Адам Станкевіч, беларус, піша так: „Працу сваю палітычную пачаў (К. Каліноўскі) у роднай Гарадзеншчыне сярод беларускага народу. Дзеля гэтай мэты летам 1862 г. у Беластоку наладзіў патаемную друкарню, у якой (...) пад псэўданімам Ясько Гаспадар з-пад Вільні выдаваў беларускую часопісь „Мужыцкая праўда". Калі ў пачатку 1863 г. выбухла ў нашым краі польскае паўстаньне (падкрэсьлена мною — Ю. В.) Каліноўскі да яго далучыўся й стаў сьпярша палітычным камісарам Гарадзеншчыны, а пасьля, калі паўстаньне ўпала, абняў над ім дыктатарства ў Літве й Беларусі" („Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня", Вільня 1934, стар. 21).

Тут ксёндз А. Станкевіч прадставіў К. Каліноўскага зусім скромна, бо-ж ён выступае як польскі супрацоўнік, а ня нейкі беларускі патрыёт-незалежнік. І як падае Віктар Карловіч, К. Каліноўскі „знаючы добра гэты раён (Гарадзеншчыну — Ю. В.), быў выдэлегаваны з цэлай групай рэвалюцыйных дэмакратаў праз польскую арганізацыю ў Пецярбургу з заданьнем падняць на Літве й Беларусі арганізацыйную работу сярод сялян" („Константы Каліновскі", Варшава 1959, стар. 90).

І тут ня можа быць сумніву, што праз увесь час свае рэвалюцыйнае дзейнасьці Каліноўскі супрацоўнічаў з палякамі й у іхнім інтарэсе вёў прапаганду сярод беларускіх сялян. Хоць ён і пісаў па-беларуску аб свабодзе сялян, але такая свабода Каліноўскага была аднабаковая, польска-шляхоцка-каталіцкая, або вуніяцкая й нічога добрага не варажыла беларускаму народу.

Як згадвалася раней, Каліноўскі бачыў усе няшчасьці й бяду беларускага мужыка з боку Масквы ці Пецярбурга, якія яго русыфікуюць. Але Каліноўскі ня хоча бачыць як Варшава палянізуе й акаталічвае беларускага мужыка. Каліноўскі нічога ня кажа аб свабодзе й правох, якія меў праваслаўны беларус-мужык у Рэчы Паспалітай.

Ці можна ў даным выпадку назваць Кастуся Каліноўскага змагаром за вольнасьць Беларусі, калі ён у сваёй адозве „Да мужыкоў зямлі польскай", падпісанай „Яcько Гаспадар з-пад Вільні" па-беларуску, заклікае народ паўстаць разам з Польшчай і за Польшчу, бо „мы з прадвякоў палякі, на польскай зямлі жывём і польскі хлеб ямо".

Каб гэта пісаў нехта так сабе, але калі гэта пісаў лідэр паўстаньня, чалавек, які на ўнівэрсытэце студыяваў права, то такі падыход да нацыянальнай справы ня можна назваць шчырым. Можна толькі дзівіцца й сумнявацца таму, што мог думаць і як разважаць пісаніну Каліноўскага тагачасны гарапашны праваслаўны беларускі селянін-мужык.

Таму пажадана, каб дзейнасьцю Кастуся Каліноўскага пацікавіліся бліжэй беларускія гісторыкі. Ці быў ён сапраўдным беларускім нацыянальным патрыётам, героем, якім яго лічаць многія беларусы, ці замаскаваным агентам палякаў і рэлігійным фанатыкам? Адзіная ягоная заслуга можа быць у тым, што ён змагаўся супраць царскага самадзяржаўя.

Хто цікавіцца дзейнасьцю Кастуся Каліноўскага й ягонай пісанінай у „Мужыцкай праўдзе", раю прачытаць артыкул Уладзіміра Казберука „Маякі й міражы" ў газэце „Літаратура і мастацтва" (№ 49 ад 7 сьнежня 1990 г.).

А цяпер паслухаем, што аб паўстаньні 1863 году піша беларускі гісторык Усевалад Ігнатоўскі: „На Беларусі польскі элемэнт ня быў моцны, бо ён складаўся зь невялікага ліку паноў і залежных ад іх людзей. Разумеецца, паўстан-

цам трэба было залучыць да свае справы беларускага мужыка. У такім напрамку й ідзе прапаганда, рассылаюцца агітатары й адозвы. Каб зрабіць большы ўплыў на селяніна, адозвы друкуюцца на беларускай мове. Польская інтэлігенцыя, стаўшая на чале паўстаньня, добра разумела, што мужык толькі тады можа спачуваць справе, калі яна афарбуецца ў сацыяльную фарбу. Мужык не цікавіўся адбудаваньнем Польшчы ці Расеі, яму патрэбна была толькі воля й эканамічная забясьпека. Толькі такую Польшчу ён мог падтрымаць, каторая не занепадала-б паньскаю хваробаю й каторая здаволіла-б яго мужыцкія інтарэсы. У такім напрамку й напісаны адозвы да мужыкоў. Яны стаяць за „праўдзівую вольнасьць і веру бацькоў", апісваюць уціск над мужыкамі маскоўскай адміністрацыі. Усе войны, якія вяла Рэч Паспалітая з Масквою, тлумачацца ў адозвах як войны за тое, „што народу паляк хацеў даць свабоду". Толькі палякі ёсьць „сапраўдныя прыяцелі беларускага мужыка, толькі яны дадуць яму вольнае й шчасьлівае жыцьцё ў Польшчы, незалежнай ад Расеі. (...)

Пасьля спыненьня польскага паўстаньня пачаўся моцны русыфікацыйны рух пад кіраўніцтвам вядомага Мураўёва. Першаю мэтай ураду было зруйнаваць польскасьць, але руйнуючы польскасьць, урад больш руйнаваў беларускую культуру. Вядома, напрыклад, што друк польскіх кніжак забаронены ня быў, а друк кніжак на беларускай мове быў забаронены ўказам 1865 году. Прычына гэтага крыецца ў тым, што за Польшчу заступіліся замежныя дзяржавы, а Беларусь заступнікаў ня мела" („Кароткі нарыс гісторыі Беларусі", Вільня 1921, стар. 110-111).

Тут, як бачым, гісторык У. Ігнатоўскі памінуў К. Каліноўскага, бо бачыў яго чужую для беларусаў дзейнасьць. Толькі некаторыя беларускія каталікі, у пошуках народных герояў, увялі Каліноўскага ў лік беларускіх народных дзеячоў. І ўсё гэта толькі таму, што Каліноўскі карыстаўся беларускай мовай, як тою прыладаю. Каліноўскі быў пасьлядоўнікам Т. Касьцюшкі. Ён карыстаўся ў сваім паўстаньні сымбалямі Касьцюшкаўскага паўстаньня — фігура касінера (селяніна, узброенага касою) са сьцягам, на якім намаляваны гербы Вялікага Княства Літоўскага й Польшчы.

Нямала сялянскіх паўстаньняў на Беларусі скончылася паражэньнямі. Але ў народнай памяці захаваліся імёны іх кіраўнікоў: Галоты, Глінскага, Гаркушы, Крычэўскага ды іншых. У часе казацкіх войнаў XVI-XVII стагодзьдзяў беларускія мужыкі ішлі грамадою за сваімі лідэрамі супраць польскага засільля, толькі не за Каліноўскага паўстаньнем. Бо-ж яно як і паўстаньні 1794 і 1830-1831 гадоў нічога добрага беларускаму народу не варажылі, толькі што адбываліся на беларускай тэрыторыі й несьлі беларускаму народу старое паняволеньне й поўнае нацыянальнае вынарадаўленьне. Паўстаньне 1863 году не належыць да гісторыі беларускага народу й кранаецца яго толькі ўскосна, паколькі адбывалася на беларускай зямлі.

І ці ёсьць сэнс выцягваць з гісторыі мінулых стагодзьдзяў беларускіх рэнэгатаў, што здрадзілі свой народ, сваю веру й пайшлі на службу акупанта?

Аднак гэтыя рэвалюцыйныя падзеі на Беларусі нехаця прамовілі да беларусаў і разбудзілі іхняе нацыянальнае пачуцьцё, ужо ў апошняй чвэрці XIX стагодзьдзя крышталізуецца здаровая думка сапраўдных беларусаў-рэвалюцыянераў, якія ставяць беларускае пытаньне ясна. Былі гэта нарадавольцы й аб іх скажам наступным разам.

(„Голас Часу" № 11 (2), Лёндан 1991 г.).

Нарадавольцы, Ігнат Грынявіцкі й цень К. Каліноўскага

Рэвалюцыйны рух дзекабрыстаў, палякаў і дзейнасьць Кастуся Каліноўскага ў польскім паўстаньні 1863 году — гэта падзеі XIX стагодзьдзя, якія паўплывалі на прабуджэньне беларускага нацыянальнага пачуцьця. Пасьля здушэньня царскім урадам вызвольных выступленьняў сярод беларускай інтэлігенцыі пачалі зараджацца тайныя гурткі ў Менску, Магілёве, Горадні, Полацку ды іншых гарадох, якія пад маркай самаасьветы ўзнімалі беларускае пытаньне ў царскай Расеі.

На працягу стагодзьдзяў беларуская навука на Беларусі была забаронена, а беларусы змушаны былі працаваць сьпярша на карысьць польскай, а пасьля расейскай культуры.

Таксама іх заклікалі праліваць сваю кроў за свабоду Польшчы й пашырэньня межаў Расейскай імпэрыі. Не зважаючы на такія прыкрыя абставіны, беларуская стыхія жыла. Сьцьвярджалі гэта некаторыя расейцы й палякі, што хоць беларускі народ зьняволены, але ён не памёр, а прадаўжае свой гістарычны працэс. Аб гэтым голасна гаварылі рускія рэвалюцыянеры-дэмакраты — Бялінскі, Герцэн, Чарнышэўскі, Дабралюбаў і інш.

Тайныя гурткі беларусаў тварылі сетку рэвалюцыйных арганізацыяў, якія мелі кантакты з другімі рэвалюцыйнымі цэнтрамі Расеі, Украіны, Польшчы, ды разам дамагаліся сацыяльнай і зямельнай рэформы. Рэвалюцыянеры глядзелі на прыгонных і безьзямельных сялян як на мучанікаў і хацелі палепшыць іхні матэрыяльны быт. Каб прысьпяшыць ажыцьцяўленьне свае мэты, яны ішлі ў народ. Сваю арганізацыю назвалі Зямля й Воля.

Была гэта першая палітычная арганізацыя рэвалюцыянераў, якая пачала дзейнасьць сярод сялян у 1861 годзе. Яе актыўнымі сябрамі былі ўцалеўшыя на волі рэвалюцыянеры й рэвалюцыйная моладзь, сярод якой спатыкаліся дзеці заможных бацькоў. Бедны селянін у той час яшчэ ня сьніў пра навуку, ня быў сарганізаваны й палітыкай не займаўся. Таму за яго заступаліся рэвалюцыйныя рухі. І хоць дзялілі іх шматлікія розьніцы, але аб'ядноўвала адна думка свабоды.

Адным з больш дзейных гуркоў беларускіх нарадавольцаў успамінаецца гурток самаасьветы ў Магілёве, які паўстаў у палове 70-80-х гадоў. Яго сябрамі былі гімназісты мужчынскай і жаночай гімназіі, а таксама й навучэнцы духоўнай сэмінарыі. Яны ўтрымоўвалі кантакты з гарадамі Беларусі, Расеі й Украіны й ад іх атрымоўвалі нелегальную літаратуру. Сьпярша гурткі самаасьветы выступалі пад лёзунгам Зямля й Воля. Аб дзейнасьці нарадавольцаў знала паліця й магілёўскі гурток выкрыты быў у 1879 годзе.

Кіраўнікі арганізацыі Зямля й Воля мелі на мэце правесьці эканамічную рэвалюцыю пры дапамозе прапаганды, забастовак і рэвольтаў. Таму ў часе канікулаў, або па скончэньні студыяў, рэвалюцыйная моладзь ехала пераважна на вёску й там, сярод сялян і рабочых, праводзіла сваю прапагандысцка-ўсьведамляльную работу.

Нарадавольцы трымаліся сацыялістычнай ідэалёгіі й ускладалі свае надзеі на сялянскія масы. І нягледзячы што амаль адна траціна насельніцтва Расеі жыла ў недастатках, ня мела поўнай свабоды, зямлі, аднак ня ўсюды агітатараў спатыкалі ветліва. Народ не хацеў ангажавацца ў падпольле й часам выдаваў агітатараў, а не разумеючы атрыманай літаратуры, аддаваў яе свайму сьвятару, каб вытлумачыў ім. Гэта ўжо сьведчыць на колькі сяляне былі адсталыя ў палітыцы. Іх цікавіла толькі адна справа — кавалак свае собскай зямлі.

Сяляне зналі, што цар хоча даць ім волю, свабоду, але яны ня зналі добра, якая гэта будзе свабода, аднак верылі цару. І калі ў 1858 годзе цар Аляксандар II праязджаў праз вёскі, ён гутарыў зь мясцовымі прадстаўнікамі. А сяляне, убачыўшы цара, падалі на калені й прасілі Божага бласлявенства для яго.

Рэвалюцыянеры бачылі сваю паразу сярод сялян і, каб дабіцца ад цара рэформаў, акрамя нелегальнай літаратуры, прымянялі мэтады тэрору. Яны думалі, што ў выніку тэрарыстычнай кампаніі забойстваў шкодных людзей у адміністрацыі (пракуроры, губэрнатары, начальнікі паліцыі й т.п.) рэжым будзе змушаны скапітуляваць і такім парадкам увесьці новы лад. Тэрарысты ашукаліся й сярод суджаных у працэсе 193 у канцы 1877 і пачатку 1878 гадоў былі й беларусы, удзельнікі гэтага руху.

Цікава тое, што ў абароне іх выступаў беларус, ураджэнец Рэчыцы, вядомы ў той час пецярбургскі адвакат па палітычных справах Уладзімір Спасовіч, якога назвалі „каралём адвакатуры". Выступаў ён бясплатна, што сьведчыць аб яго сымпатыях да рэвалюцыянераў. Раней Спасовіч выкладаў крымінальнае права на Пецярбургскім унівэрсытэце й у часе студэнцкіх хваляваньняў 1861 году перахоўваў у сябе на кватэры бібліятэку зямляцкіх забароненых кнігаў.

З-за тэрарыстычнай дзейнасьці арганізацыі Зямля й Воля былі непаразуменьні сярод некаторых сяброў. На сходзе ў жніўні 1879 году наступіў раскол. Часьць сяброў прапагандавала сацыялізм і сваю групу назвала Чорны Перадзел. Астаўшыеся, якія стварылі Народную Волю, верылі, што шляхам дэзарганізацыі й тэрору правядуць зьмены ў царскай Расеі.

Пасьля расколу Чорны Перадзел, які меў сваю друкарню ў Менску, выдаў 3, 4, і 5 нумары гаээты „Чорны Перадзел", 3, 4, 5 і 6 нумары газэты „Зерно", праклямацыю Зямля й Воля, якая была прысьвечана забойству Аляксандра II, а таксама праклямацыю Северно-Русского Союза.

Кіраўнікі Чорнага Перадзелу былі памяркоўнымі, не хацелі займацца тэрорам, забойствамі, а сваю ўвагу канцэнтравалі на падзеле зямлі сярод сялян дарогай эвалюцыі. Аднак людзі гэтае арганізацыі не здабылі сабе прыхільнікаў і неўзабаве іхняя арганізацыя заціхла. Затое Народная Воля, маючы добрых арганізатараў, папаўняла свае рады сьвежымі сіламі, але адначасна яе лідэры плацілі за сваю тэрарыстычную дзейнасьць сьмяротнымі пакараньнямі.

Былі й іншыя групы рэвалюцыянераў, якія займаліся тэрорам. Напрыклад, студэнцкая група Маладая Расея ў сваіх праклямацыях заклікала да забойстваў. Такое права прыняў пазьней Ленін („Хто не з намі, той супраць нас") і тых, што інакш думалі, вынішчалі фізычна. Нарадавольцы ўважалі сябе за ідэолягаў сялянскай і рабочай дэмакратыі й у гэтым напрамку дзейнічалі.

Падзел арганізацыі Зямля й Воля на Чорны Перадзел і Народную Волю знайшоў сваё адбіцьцё й на Беларусі, толькі што тут гэты працэс праходзіў надта вольна. Малады век беларускіх рэвалюцыянераў і слабая дасьведчанасьць у рэвалюцыйнай рабоце не дазвалялі ім хутка зарыентавацца ў сутнасьці справы. Аднак большасьць іх далучылася да Народнай Волі й так было да 1881 году, да часу пагрому арганізацыі.

У такіх абставінах зрадзіўся й беларускі нацыянальна-вызвольны рух нарадавольцаў, дзе адным зь яго ідэовых падпольных гурткоў быў Гоман, арганізаваны Ігнатам Грынявіцкім недзе ў 1879 або 1880 годзе. Грынявіцкі супрацоўнічаў з рускім і польскім гуркамі нарадавольцаў і выступаў пад рознымі псэўданімамі (Міхаіл Іванавіч, Коцік і інш.). Нават ягонае сапраўднае прозьвішча не заўсёды падаецца аднолькава. Найчасьцей згадваецца Грынявіцкі, што ёсьць больш верагоднае, але часам — Грынявецкі ці нават Грыневіч.

Быў гэта час, калі ў першых дваццаці гадах царстваваньня Аляксандра II тры чацьвёртыя мільёна людзей розных палітычных і сацыяльных поглядаў было сасланых у Сібір

за свае перакананьні. І трэба памятаць, што каля адной трэці насельніцтва Расейскай імпэрыі састаўлялі прыгонныя, безьзямельныя, малазямельныя й батракі. Толькі некаторыя зь іх мелі частковую свабоду, таму змаганьне за свабоду й правы чалавека не сьціхалі. Як помста, царскія генэралы, губэрнатары, міністры й ім падобныя плацілі за гэта сваім жыцьцём. Таксама рабіліся замахі на жыцьцё цара, але ён меў шчасьце. У 1879 годзе яго мінулі, не папалі пяць выстралаў. Тры спробы ўзарваць царскі цягнік не ўдаліся. У 1880 годзе была падложана бомба пад царскую ядальню ў Зімнім палацы ў Пецярбургу. Цар спазьніўся, бомба ўзарвалася й замест цара было многа забітых і параненых жаўнераў, калі абрушылася сьцяна й завалілася столь.

Наступнага дня ў горадзе паявіліся плякаты, якія паведамлялі, што Выканаўчы Камітэт Народнай Волі шкадуе за сьмерць і параненых жаўнераў і цывіляў, але будзе надалей працягваць змаганьне з дынастыяй, пакуль ня будуць праведзены сацыяльныя рэформы.

Пра выпадак з бомбай вялікі князь Канстанцін так запісаў у сваім дзёньніку: „Мы перажываем тэрор, але з той розьніцай, што парыжане ў часе рэвалюцыі бачылі сваіх ворагаў твар у твар. Мы іх ня бачым і нават ня знаем".

Расейскі гурток Народнай Волі, зь якім супрацоўнічаў І. Грынявіцкі, пастанавіў зьнішшчыць цара Аляксандра II і дзень яго сьмерці вызначыў на 1 сакавіка 1881 году.

Сьпярша ўсё выглядала ціха, натуральна, толькі ў змоўшчыкаў нэрвы былі напружаныя, а сталіся яны яшчэ больш напружанымі, калі кіраўнік іхняй групы, Жалябаў, папаў у рукі паліцыі, калі пайшоў спатыкаць свайго знаёмага, які вяртаўся з-за граніцы. Пры Жалябаве знайшлі пяць копіяў газэты „Народная Воля". Паліцыянт, які арыштоўваў, пазнаў Жалябава з працэсу 193-х. Быў гэта вялікі духовы ўдар па сябрах-рэвалюцыянерах, які заставіў іх задумацца над плянам забойства цара.

Арыштаванага Жалябава заступіла Зофія Пяроўская, дачка былога губэрнатара Пецярбурга, а плян забойства цара застаўся на павестцы дня. Ролі замахоўцаў былі падзелены. Міхайлаў, Рысакоў, „Коцік"-Грынявіцкі й Емяльянаў атрымалі бомбы й мелі заняць розныя месцы, бо ня зналі да-

кладна кудою будзе праязджаць цар. Цар вяртаўся з агляду войска й як пад'ехаў пад Рысакова, той кінуў бомбу ў бок карэты. Раздаўся моцны выбух і ўзьняўся густы дым. Калі дым разьвеяўся, можна было бачыць на сьнягу забітыя коні, пару казакаў і хлапца ў лужыне крыві ды пашкоджаную царскую карэту. Цар застаўся жывы. Рысакова схапіла паліцыя, а цар выйшаў з карэты, каб прайсьціся й паглядзець на таго, хто кінуў бомбу. Народ расступаўся перад царом, даючы дарогу, і адначасна пытаў як ён чуецца, на што цар усхвалявана адказаў: „Дзякуй Богу, я не кранутый". На адказ цара пачуўся моцны голас Грынявіцкага: „За рана дзякаваць Богу" й тут-жа кінуў з-пад палы бомбу цару пад самыя ногі. Раздаўся другі моцны выбух. Бомба адарвала цару правую нагу, левую парвала, раны былі на твары й на галаве. Побач цара ляжаў сьмяротна ранены Грынявіцкі й больш за 20 асоб. Цяжка паранены імпэратар змог сказаць ціхім голасам: „Вазьміце мяне дамоў памерці". Яго завезьлі ў палац непрытомнага, дзе неўзабаве памёр. Цару было 63 гады.

Грынявіцкі апрытомнеў вечарам у шпіталі. Яго пільнавала паліцыя й як толькі прачнуўся, адразу пачаліся допыты. На пастаўленыя паліцыяй пытаньні Грынявіцкі адказаў сваім чыстым натуральным голасам: „Я нічога ня знаю" й неўзабаве памёр нікога ня выдаўшы й не сказаўшы нават свайго прозьвішча. Ігнату Грынявіцкаму было 24 гады.

Сьпярша паліцыя ня ведала з чые ініцыятывы быў забіты цар. Рысакоў не сказаў свайго сапраўднага прозьвішча й не сказаў свайго Грынявіцкі. Таму падазрэньне пала на арыстакратыю, якая была супраць рэформаў.

Доўга не прыйшлося чакаць, як Выканаўчы Камітэт Народнай Волі, забіўшы цара, выдаў свой маніфэст такога зьместу: „Сёньня, 1 сакавіка, кат народу Аляксандар II спаткаў сьмерць з нашых рук, сацыялістаў. І забойства яго тлумачыцца ранейшымі дамаганьнямі як: недастатковая апека над народам, вялікія налогі, пазбаўленьне людзей зямлі, свабоды, эксплёатацыя рабочых, абарона багатых, калі народ галадае й т.п. А тых, што стаяць за народ, цар вешае або высылае ў Сібір. За гэта ён быў забіты. (...) Цяпер новы цар, Аляксандар III, не павінен захоўвацца так як бацька. Ён павінен прызнаць патрэбы народу

й паступаць згодна праўды!" Такімі прычынамі тлумачылася забойства цара Аляксандра II.

Вяртаючыся да Ігната Грынявіцкага трэба сказаць, што ў беларускай літаратуры пра яго маюцца скупыя весткі. Але й зь іх можна ўявіць постаць маладога беларускага рэвалюцыянера.

Ігнат Грынявіцкі нарадзіўся (дзень і месяц невядомыя) у 1856 годзе ў маёнтку Басін на Бабруйшчыне (Т. Грыб падае, што І. Грынявіцкі нарадзіўся на Меншчыне), але, згодна двух паданьняў, маладыя гады правёў ён у Бельскай Падляшскай школе, а пасьля ў Беластоцкім Рэальным вучылішчы. У 1875 годзе Грынявіцкі паступіў на мэханічнае аддзяленьне Тэхнічнага інстытуту ў Пецярбургу, дзе пазнаёміўся з нарадавольцамі й стаў адным зь іх даверaных сяброў. Ён удзельнічаў у падробцы дакумантаў для падпольшчыкаў. У 1879 годзе Грынявіцкі ўступіў у Народную Волю, наведаў вёскі й мястэчкі Беларусі, шукаючы сярод мясцовай інтэлігенцыі прыхільнікаў свае справы. Восеньню тагож году Ігнат вярнуўся у Пецярбург. „Трэба адзначыць, — чытаем, — што ў Пецярбурзе Грынявіцкі актыўна ўдзельнічаў у польскіх, і рускіх гуртках. Палякі мелі тады свае ўласныя гурткі, асобныя ад рускіх. Грынявіцкі паказаў глыбокае разуменьне агульнарускіх рэвалюцыйных задач, адначасова працуючы ў рускім і польскім руху. Паходзячы са зьбяднелай беларускай шляхты, якая помніла сваё мінулае, Грынявіцкі па традыцыі называў сябе літвінам (літоўскай мовы ня ведаў, слабавата чытаў па-польску), але ўжо быў адным з гарачых заснавальнікаў беларускай мясцовай фракцыі нарадавольцаў" („Полымя" № 6, 1966 г., стар. 188).

У сваёй натуры Ігнат быў скромны, лагодны, працавіты, спачувальны на чужое гора. Яго ідэалам было служэньне народу ня толькі словам, але й чынам. І чын гэты, як вядома, праявіўся ў 1881 годзе.

Часам у беларускай прэсе спатыкалася выказваньне, што забойства Аляксандра II было Грынявіцкім зроблена як помста за падаўленьне паўстаньня 1863 году й сьмерць свайго земляка Кастуся Каліноўскага. Гэта мела быць прычына, што І. Грынявіцкі стаўся прадаўжальнікам справы К. Каліноўскага. Справа гэтая выглядае сёньня зусім інакш. Міф аб Кастусю Каліноўскім разьвейваецца. Падобна яму А. Міц-

кевіч, Т. Касьцюшка й многа ім падобных, што вызнавалі каталіцкую веру, былі гарачымі патрыётамі польскай справы. Мала хто зь іх, нягледзячы на беларускае паходжаньне, разумеў долю прыгнечанага й забітага горам беларускага народу, яго пяражываньні, цярпеньні.

Малады рэвалюцыянер Ігнат Грынявіцкі напэўна чуў і разумеў розьніцу паміж сваім і Каліноўскага змаганьнем, якое было ня так даўно, нейкіх 17 гадоў таму й мог нават бачыць і гутарыць зь яго ўдзельнікамі. К. Каліноўскі, як вядома, супрацоўнічаў з палякамі й ускладаў свае надзеі на Польшчу. Грынявіцкі глядзеў на гэту справу інакш, бачыў будучыню Беларусі не ў рамках Польшчы, а ў фэдэрацыі з Расеяй як вольных народаў. Такая-ж была ў тым часе мэта расейскіх нарадавольцаў, каб стварыць у Расеі фэдэрацыю вольных народаў і ў гэтым напрамку працаваў Грынявіцкі. Доказам гэтага зьяўляецца часопіс „Гоман", у якім выразна пішацца аб дзяржаўнай форме Беларусі, чаго не знаходзім у „Мужыцкай праўдзе" Каліноўскага, якая трымалася палякаў і ўводзіла ў зман маласьвядомых сялян.

Каліноўскі ня быў незалежным лідэрам паўстаньня на Літве й Беларусі, толькі адным з польскіх памагатых, аб чым пішуць палякі. Калі ў Польшчы паўстаньне ўпала, рэч зразумелая, што К. Каліноўскі, як адзін зь яго найбольш актыўных кіраўнікоў-сяброў, стаўся яго кіраўніком на Беларусі й Літве. Але й тут хілілася яно да ўпадку. У такой сытуацыі К. Каліноўскі стаўся лідэрам і выказваў свой патрыятызм да Беларусі. Але ці быў гэта шчыры голас?

Напярэдадні паўстаньня 1863 году ўтварыліся дзьве палітычныя групоўкі „белых" і „чырвоных". Групоўка „белых" на Беларусі й Літве аб'ядноўвала буйных памешчыкаў, якія выступалі за аднаўленьне Польшчы ў межах 1772 году. Былі гэта кансэрватары, якія не хацелі ісьці на дэмакратычныя пазіцыі й трымалі сувязь зь „белымі" ў Варшаве.

Групоўка „чырвоных" аб'ядноўвала малазямельную й безьзямельную шляхту ды інтэлігенцыю. Але й сярод „чырвоных" былі людзі, якіх зь „белымі" ў Варшаве яднала ідэя супольнай дзяржаўнасьці. Каліноўскі належаў да „чырвоных", вёў сярод іх галоўную ролю, бо-ж сам паходзіў з дробнай шляхты й таму бараніў яе інтарэсы.

Нельга забываць, што галоўныя кіраўнікі паўстаньня 1863 году й іхнія памагатыя вырасьлі пераважна на польскай культуры й не хацелі парываць з гістарычнай традыцыяй, якой была Рэч Паспалітая. Да такіх людзей належаў і Кастусь Каліноўскі. Яго Правінцыянальны Камітэт, як улада на Літве й Беларусі, у сваёй адозве ад 29 студзеня 1863 году гаварыў наступнае: „Паўстаньне на Літве рашае аб уваскрошаньні Польшчы й сьмерці ворагаў". Гэта сьведчыць, якое вялікае значэньне надавала Варшава землям былога Вялікага Княства Літоўскага.

Неўзабаве Правінцыянальны Камітэт зьмяніў свой назоў на Аддзел Загадваючы Правінцыямі Літвы й фактычна стаўся філіяй Цэнтральнага Паўстанчага Ўраду ў Варшаве, які кіраваў паўстанчым рухам на беларуска-літоўскіх землях. Гэтым Аддзелам, або філіяй Варшавы, была выдадзена ў Вільні 19 сакавіка 1863 году адозва, у якой пісалася:

„Народ польскі паўстаў, каб скінуць ганебнае ярмо. (...) Выканаўчы Аддзел для Правінцыі Літвы, дзейнічаючы з мандату Нацыянальнага Ўраду, кліча нашых братоў літоўцаў і беларусаў, якія твораць з Польшчай непадзельную цэласьць, да поўнага аб'яднаньня, да злучэньня ўсіх нацыянальных сілаў вакол штандару незалежнасьці. (...) Літва й Беларусь, верныя прысязе вуніі, паўстануць як адзін чалавек, за веру й свабоду, за вызваленьне народу, за абарону яго ўласнай незалежнасьці, парадку й цывілізацыі".

Гэтыя адозвы, як бачым, не давалі сялянам і народам Беларусі й Літвы таго, аб чым яны марылі. І такімі ашуканчымі адозвамі палякі стараліся выкарыстаць беларусаў і літоўцаў дзеля сваіх старых экспансыўных і палянізацыйных мэтаў.

Калі ходзіць пра палякаў пад расейскім заборам, то нават цар Аляксандар II асьцерагаў некаторых польскіх магнатаў, што яны замала даюць польскаму селяніну. Таксама цар і ягонае акружэньне згодны былі на каранацыю Канстанціна Мікалаевіча на караля Польшчы. І, як пішуць некаторыя гісторыкі, расейцы давалі палякам больш, чым гэтага хацелі некаторыя польскія арыстакраты. Чытаючы кніжку Паўла Ясяніцы „Польская анархія", я наткнуўся на такі сказ: „Дзевяноста гадоў таму сказана было ў Варшаве, што для палякаў можна часам нешта зрабіць — з палякамі ні-

колі". І таму магчыма, што Грынявіцкі, запазнаўшыся з гісторыяй польскіх паўстаньняў і дзейнасьцю Кастуся Каліноўскага, памінуў палякаў, а стараўся зьвязаць будучыню Беларусі ў фэдэрацыі з Расеяй.

Цяжка прыпісаць заслугу Каліноўскаму й у тым сэнсе, што ён першы пачаў выдаваць беларускую газэту. Каб гэтая газэта па сваім зьместу была чыста беларуская, заклікала да адраджэньня свае культуры, свайго нацыянальнага аблічча й свае незалежнай дзяржавы, тады можна было-б назваць К. Каліноўскага змагаром і патрыётам Беларусі. Але праз сваю газэту „Мужыцкая праўда" Каліноўскі бунтаваў беларускіх сялян толькі супраць цара, які быў быццам адзіным ворагам, прычынай усяго зла. Каліноўскі запалохваў праваслаўных беларусаў „сызмай, пеклам, менкамі і т.п.", калі яны не навернуцца да „сапраўднай" каталіцкай веры. А ў сваёй адозве „Да мужыкоў зямлі польскай" Каліноўскі заклікаў беларусаў паўстаць разам з Польшчай за Польшчу. Сапраўдны беларускі патрыёт так пісаць ня будзе.

Разглядаючы „Запавет" К. Каліноўскага й другія яго адозвы, у ніякім выпадку нельга назваць іх шчырымі ў інтарэсе беларусаў. Яны былі пасткай для беларускага народу. Каліноўскі заклікае народ ваяваць за народнае права, але польскае: за зямлю — польскую; за веру — вуніяцкую. Ён піша праваслаўным беларусам-мужыкам у сваёй „Мужыцкай праўдзе", каб пераходзілі ў вунію, бо хто не пяройдзе „той як сабака здохне".

Цяжка пагадзіцца з такой вызвольнай барацьбой беларускага народу пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Беларускія нацыянальныя матывы ў яго замоўчваюцца. Некаторыя аўтары, баронячы К. Каліноўскага, спасылаюцца на малаасьвядомасьць беларускага народу ў той час. Гэта праўда. Але Каліноўскі, які выдаваў сябе за сьвядомага беларуса, павінен быў нацыянальна ўсьведамляць беларусаў пра сваю газэту, а не пісаць у польскім духу й біцца за польскую справу. Чаму Ян Хадкевіч мог абараняць незалежнасьць ВКЛ перад Польшчай нейкіх 300 гадоў таму на Люблінскай вуніі 1569 году, калі стоячы на каленях казаў каралю Жыгімонту Аўгусту: „Нам і нашым унукам было-б балюча, калі-б з часам выявілася, што мы не разумелі свайго паняволеньня".

І напэўна знаў К. Каліноўскі, што да апошняга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе Княства Літоўскае фармальна захавала свой сойм, дзяржаўную ўладу, войска, скарб, грашовую сыстэму, суды, хоць польская мова дамінавала ў ВКЛ.

Каліноўскі піша ў сваёй „Мужыцкай праўдзе": „Паказываюць людзі, што сьвяты Ойцец аж з Рыму прыслаў ужэ да нас свае благаславеньне, — гавораць што прышле ксяндзоў, што будуць прымаць на вуніяцкую веру".

Выглядала, быццам нешта вялікае робіцца для беларускіх сялян у палепшаньні іхняга матэрыяльнага быту. А ў сапраўднасьці рымскія папы ніколі ня дбалі, не спачувалі й не стараліся палепшыць долю працоўнага народу. Яны былі галоўнымі ініцыятарамі войнаў, нянавісьці сярод народаў і жорсткага прасьледу сваіх праціўнікаў праз сваю Сьвятую Інквізыцыю, каб толькі падпарадкаваць гэтыя народы, а пасьля цягнуць зь іх дзесяціны.

Неўзабаве пасьля ўпадку Студзенскага паўстаньня, папа Пій IX 8 сьнежня 1864 году выдаў булу, паасобныя пункты якой былі абложаны пракляцьцем. Вось пару зь іх:

„Праклятый будзе той, хто скажа: кожны чалавек можа свабодна выбраць і вызнаваць рэлігію, каторую ўзнае за сапраўдную пры помачы свайго розуму".

„Праклятый будзе той, хто скажа: Касьцёл павінен быць аддзелены ад дзяржавы, а дзяржава ад Касьцёла".

„Праклятый будзе той, хто скажа: Найвышэйшы сьвятар у Рыме можа й павінен прымірыцца й пагадзіцца з прагрэсам, лібэралізмам і сучаснай цывілізацыяй".

Гэтая папская була прасякнута нянавісьцю да дэмакратычнага прагрэсу хрысьціянскай думкі й ня мае ў сабе ніякай маральнай адказнасьці. А сапраўдная хрысьціянская вера вучыць людзей з павагай ставіцца да іншага, яго годнасьці й памагчы слабейшаму. У такім, не зусім ветлівым асяродзьдзі, знаходзіўся й Кастусь Каліноўскі. Ён не згадвае беларусаў, Беларусь, а піша толькі аб мужыкох, дзецюкох і „сызме" й што сьвяты Ойцец прышле ксяндзоў, што будуць прымаць на вуніяцкую веру.

Польскі гісторык Марыян Кукель у кнізе „Дзее Польскі порозьбёровэй" (Лёндан 1963), даволі абшырна закранае арганізацыю Студзеньскага паўстаньня 1863 году, але аб К. Ка-

ліноўскім піша зусім мала, а менавіта: «З сяброў Літоўскага аддзелу найбольш дзейным быў Канстанты Каліноўскі, дзеяч „чырвонай" афарбоўкі — энтузіяст, імкнуўся падняць народ беларускі й аб'яднаць яго дзеля паўстаньня, рэдактар „Мужыцкай праўды"» й згадвае што загінуў ён на шыбеніцы.

У залежнасьці ад палітычных абставін і імпэралістычных пасяганьняў, камуністычная прэса розна ставілася да дзейнасьці Кастуся Каліноўскага. Асабліва ў першых гадох БССР Каліноўскаму прысьвячаліся творы паэзіі, літаратуры, мастацтва, скульптуры й т.п. Але пачынаючы з пачатку 1930-х гадоў Каліноўскі зьнікае зь беларускай нацыянальнай культуры. І толькі ў часе апошняй вайны зноў уводзяць яго на старонкі прэсы й надаюць яму розгалас. Меў Каліноўскі толькі адно супольнае з пазьнейшымі бальшавікамі: гэта ён і яны стараліся зьнішчыць царскую сыстэму. Каліноўскаму не ўдалося гэта зрабіць, зрабілі гэта бальшавікі ў часе рэвалюцыі 1917 году.

Як ужо згадвалася, польскае паўстаньне 1863 году, якога гарачым супрацоўнікам быў К. Каліноўскі, пацярпела паражэньне. Урэшце й Каліноўскі быў здраджыны польскім шляхцюком Парф'яновічам і пасьля арышту, допытаў і суда, 22 красавіка 1864 году павешаны ў Вільні на Лукішскім пляцы. Такі самы лёс спаткаў і раненага З. Серакоўскага, якога выдала полька. 128 удзельнікаў паўстаньня на Беларусі ваенны суд прыгаварыў на сьмяротнае пакараньне.

Усё-ж трэба прыгадаць, што паўстаньне 1863 году было падрыхтавана старанна і яго падпольныя кіраўнікі адпавядалі свайму заданьню. Не было арміі, а толькі партызанскія аддзелы, якія вялі аснаўную барацьбу з лясоў Беларусі й Літвы супраць расейскай рэгулярнай арміі. Таксама паўстанцы ня мелі шырокай падтрымкі сярод мясцовага насельніцтва. Шансы такой барацьбы былі зьнікомыя. І на гэта маем яшчэ адзін даволі важны факт, што палякі ніколі не былі прыязныя да сваіх славянскіх братоў на Ўсходзе. Гісторыя паказала палякаў на працягу стагодзьдзяў як заўзятых католікаў, нацыяналістаў, якія не хацелі жыць у згодзе з праваслаўнымі, а тым больш не хацелі каб нейкі „схізматык" камандаваў імі й дзеля таго падымалі свае неразважныя паўстаньні.

Польскія паўстаньні былі саламяным полымем. Акрамя бяды й няшчасьця яны нічога добрага польскаму народу не прынесьлі. Рэпрэсіі Мураўёва-Вешальніка ў адносінах да шляхецкага стану й заходніх губэрняў выклікалі ўпадак духа сярод „белых" — польскіх арыстакратаў. У 1865 годзе П. Попель асудзіў у Кракаве ўсякія паўстаньні, назваўшы іх нацыянальным самазабойствам, палітычнай дурнатой. І саўдзельнікам гэтай дурноты быў Кастусь Каліноўскі, які аддаў непатрэбна й сваю голаў за чужую справу.

Памыляючыся піша выдадзены ў 1990 годзе „Кароткі агляд гісторыі Беларусі", дзе на старонцы 64 чытаем: „Малодшыя беларусы, былыя ўдзельнікі паўстаньня Кастуся Каліноўскага, навязалі кантакты з расейскім лібэральным рухам з мэтаю ўзмацненьня свае рэвалюцыйнай дзейнасьці. Адным зь іх быў Ігнат Грынявіцкі, студэнт Петраградзкае палітэхнікі".

Які-ж гэта мог быць удзельнік паўстаньня К. Каліноўскага Ігнат Грынявіцкі, якому ў 1863 годзе было нейкіх 6 або 7 гадоў?

Варта ўспомніць, што пару гадзін да замаху на жыцьцё цара Аляксандра II Ігнат Грынявіцкі, прадчуваючы сваю сьмерць, напісаў пісьмо сваім сябрам. Вось некаторыя вытрымкі з гэтага пісьма:

„Аляксандар II павінен памерці. Дні яго зьлічаны. Мне, ці каму другому, прыйдзецца нанесьці страшны астатні ўдар, які гулка раздасца па ўсёй Расеі й рэхам адгукнецца ў самых далёкіх кутках яе, — гэта пакажа недалёкая будучыня.

Ён памрэ, а зь ім разам памром і мы, яго ворагі, яго экзэкутары. Гэта неабходна для справы свабоды, бо тым самым значна пахісьнецца тое, што хітрыя людзі завуць кіраваньнем — манархічным, неабмежаваным, а мы — дэспатызмам... Што будзе далей?

Ці шмат яшчэ ахвяр запатрабуе наша няшчасная, але дарагая бацькаўшчына, ад сваіх сыноў для свайго вызваленьня? Я баюся... мяне, асуджанага, які стаіць адною нагою ў магіле, палохае думка, што наперадзе шмат яшчэ дарагіх ахвяр забярэ барацьба, а яшчэ больш сьмяротная стачка з дэспатызмам, якая, я перакананы ў тым, ня вельмі далёкая й якая залье крывёю палі й нівы нашай Бацькаўшчы-

ны, бо, на жаль, гісторыя паказала, што раскошнае дрэва свабоды патрабуе, людзкіх ахвяр.

Мне ня прыйдзецца браць удзелу ў апошняй барацьбе. Лёс прысудзіў мяне на раньнюю пагібель, і я ня ўбачу перамогі, ня буду жыць ні аднаго дня, ні гадзіны ў сьветлы час, што меў быў зрабіць, і большага ад мяне ніхто на сьвеце вымагаць ня можа.

Справа рэвалюцыйнай партыі — запаліць сабраны ўжо гарачы матэрыял, кінуць іскру ў порах і затым прыняць усе меры да таго, каб новы рух скончыўся перамогаю, а не павольным выміраньнем лепшых людзей краіны" („Полымя" № 6, чэрвень 1966 г., стар. 188).

Паліцыя знала аб арганізацыі нарадавольцаў і пры допытах дасьведчаны сьледчы ўмела падышоў да 18-гадовага юнака Рысакова, які прызнаўся ня толькі да віны, але й выдаў сваіх сяброў.

Калі прыйшло да суда, Андрэй Жалябаў і Мікалай Кібальчыч выступалі як ідэёвыя прадстаўнікі рэвалюцыі. Жалябаў — сялянскі сын, але яго манеры й выгляд нагадвалі інтэлектуала. Вучыўся ён на ўнівэрсытэце ў Адэсе, а далучыўся да забойства цара праз намову Міхайлава, які быў заангажаваны не ў адным забойстве царскіх стаўленікаў. Жалябаў даў згоду, але пад варункам, што гэта будзе яго адзіны ўдзел у забойстве, а пасьля ён адыходзіць.

М. Кібальчыч — сын праваслаўнага сьвятара. Два гады студыяваў інжынерыю і гэта-ж ім былі падрыхтаваныя бомбы на цара. Кібальчыч быў здольным студэнтам, знаў нямецкую, французскую й ангельскую мовы, студыяваў таксама мэдыцыну і, каб не тэрарыстычная дзейнасьць, ён мог быць выдатным навукоўцам, прафэсарам.

Насьледуючы Жалябава й Кібальчыча, рэшта падсудных прамаўляла ў гэтым самым духу, нават Рысакоў, якога рэлігійнасьць ніяк не сумяшчалася зь яго рэвалюцыйнай дзейнасьцю. Усё-ж на яго скоса паглядаў Жалябаў.

Жалябаў заявіў на судзе, што ён ня верыць у царскі суд і свае чыны аддае на народны суд. Ніхто з падсудных, за выняткам Рысакова, ня здрадзіў суду ніякіх тайнаў, нікога не абвінаваціў, нікога ня выдаў, а з гонарам гаварылі аб сваёй рэвалюцыйнай рабоце.

Варта яшчэ зьвярнуць увагу на той факт, што падсудныя рэпрэзэнтавалі амаль усе слаі грамадзтва. Жалябаў з сялян; Рысакоў — бядняк, студэнт; Кібальчыч — сын сьвятара, навуковец; Міхайлаў — рабочы; Пяроўская — арыстакратка; Емяльянаў, на год старэйшы за Рысакова, выхоўваўся ў дзеда, які працаваў у рускай амбасадзе ў Канстантынопалі; Гэся Гэльфан — дачка прамыслоўца, жыда. Як бачым, нягледзячы на іхняе рознае сацыяльнае паходжаньне, усе яны змагаліся за адну ідэю.

Выканаўчы Камітэт Народнай Волі 10 сакавіка напісаў адкрыты ліст цару Аляксандру III, які быў зьмешчаны ў „Літаратуры Народнай Волі". Быў гэта вялікі ліст, у якім парушаліся праблемы штодзённага быту народаў Расеі. Былі там нараканьні й просьбы, каб вярнуць Расею на шлях нармальнага й мірнага разьвіцьця. Ліст гэты зьяўляецца важным дакумантам рэвалюцыйнага руху ў Расеі й яго чытаў новы цар, але не прыняў яго сур'ёзна.

Усіх шасьцёх суд прыгаварыў на кару сьмерці й нават няпоўналетняга Рысакова, які сазнаўся да віны й выдаў сваіх сяброў. Усе яны адмовіліся злажыць апэляцыю. Напэўна знали, што міласьці для іх ня будзе. Толькі адтэрмінавалі на адзін год кару сьмерці Гэсі Гэльфман, жыдоўцы, якая спадзявалася дзіцяці.

Дзень перад экзэкуцыяй, вечарам 2 красавіка, прыйшлі ў камеру сьвятары, каб паспавядаць і прычасьціць сказанцаў. Пяроўская й Жалябаў адмовілі ім. Міхайлаў спавядаўся, але адмовіў прычасьця. Кібальчыч — сын сьвятара правёў больш гадзіны часу дыскутуючы спакойна са сьвятаром аб рэлігіі, але адмовіў спавядацца й прычашчацца. Толькі Рысакоў, наймалодшы й найбольш рэлігійны, а цяпер зусім заламаўшыся духова, спавядаўся й прычашчаўся.

Леў Талстой, які таксама быў народнікам, спасылаючыся на хрысьціянскія пачуцьці, пісаў цару Аляксандру III і прасіў яго дараваць жыцьцё й даць магчымасьць праступнікам выехаць у Амэрыку. Гэтым цар паказаў-бы сябе царом хрысьціянскім, які паступае як Хрыстос, плацячы забойцам свайго бацькі дабром за зло. Можна зьнішчыць рэвалюцыянераў, — пісаў Талстой, — але не ідэі вольнасьці й свабоды.

Адказ наступіў ня так хутка, толькі праз два з паловай месяца па зьнішчэньні рэвалюцыянераў. Галоўны дарадчык цара, Пабеданосцаў, даў Талстому такі адказ: „Мой Хрыстос ня ёсьць твой Хрыстос".

3 красавіка пяцёра нарадавольцаў завісьлі на шыбеніцы, адважна гледзячы сьмерці ў вочы. Аднак не знайшлі яны глыбокага спачуваньня сярод тысячы прысутных гледачоў. І так сталася, што пасьля сьмерці Аляксандра II і яго забойцаў-рэвалюцыянераў, зламана была баявая сіла й дух Народнай Волі. Яшчэ праз пару гадоў прадаўжаліся забойствы, але без такіх лідэраў як Жалябаў, Кібальчыч, Пяроўская й Міхайлаў. Народная Воля хілілася да свайго ўпадку.

29 красавіка 1881 году новы імпэратар Аляксандар III выдаў маніфэст, у якім аб'явіў канец усялякім рэформам.

Што да беларускіх нарадавольцаў, то царскія сьмяротныя пакараньні не спынілі іхняй дзейнасьці. Мы многа ня знаем пра гэтых людзей, актыўных дзеячоў, бо яны не рэклямаваліся, але згадваюцца некаторыя прозьвішчы беларускіх студэнтаў Пецярбугскага ўнівэрсытэту: А. Марчанка, Х. Ратнер і вядомы нам Ігнат Грынявіцкі. Гэтымі актывістамі, а былі напэўна й другія, быў заснаваны беларускі нацыянальны гурток Гоман з мэтай заснаваць сваю палітычную арганізацыю. У 1881 годзе былі выдадзены лістоўкі — „Лісты зь Беларусі" й „Маніфэст" ад сацыяльна-рэвалюцыйнай беларускай партыі. Аднак не была гэта партыя, а група беларускіх студэнтаў-народавольцаў, якія, як і другія групы Народнай Волі, вялі змаганьне супраць царскага самадзяржаўя.

Беларускі народны рух мала чым розьніўся ад расейскага. Быў гэта рух інтэлігенцыі, толькі з той розьніцай, што ў Расеі дамінавалі ў ім пераважна студэнты ўнівэрсытэтаў, у той час як на Беларусі ядром народнікаў была моладзь сярэдніх школаў. Моладзь гэтая ня мела адпаведнага дасьведчаньня ў прапагандысцкай дзейнасьці, чым тлумачыцца яе павольнае разьвіцьцё. Каб прысьпяшыць разьвіцьцё свае дзейнасьці, у шматлікіх гарадох Беларусі ствараліся гурткі самаасьветы. Самаасьвета праводзілася праз літаратуру суседзяў — расейцаў і палякаў. Таму беларускія гурткі карысталіся літаратурай сваіх суседзяў і, будучы зь імі ў кантакце, разам супрацоўнічалі. Маецца інфармацыя, што

на пачатку 1881 году быў навязаны кантакт фракцыі Народнай Волі пад назовам Беларускай Арганізацыі. Агульнарасейская арганізацыя Зямля й Воля (1876-1879) мела вялікі ўплыў на дзейнасьць народніцкіх гурткоў на Беларусі.

Кожны сябра арганізацыі нарадавольцаў меў права заснаваць свой гурток і весьці сваю рэвалюцыйную дзейнасьць. Такім парадкам, захадамі беларускага гуртка народавольцаў, выдаваўся на расейскай мове нелегальны часопіс гэтага самага назову — „Гоман". Быў гэта часопіс нацыянальнага зьместу й выходзіў праўдападобна ў Пецярбургу, дзе быў цэнтар беларускай студэнцкай моладзі. Ад гэтага нумару „Гоману" знаем, што займаўся ён праблемамі нацыянальных адносін у Расеі. Пісаў пра нарастаньне рэвалюцыйнай барацьбы, пра бюракратызм дзяржаўнага апарату, пра паліцыйны прасьлед, пісаў пра ўсе тыя антыдэмакратычныя факты, якія праводзіла царская адміністрацыя на Беларусі.

Для цікавасьці чытача прывядзем выняткі з „Гоману" № 1, узятыя з кніжкі С. Х. Аляксандровіча „Пуцявіны роднага слова": „З усіх народнасьцяў, якія ўваходзяць у склад сучаснай Расеі, лёс беларусаў, як вядома, асаблівы тым, што на іх ужо з даўніх часоў прывыклі глядзець як на некаторы матэрыял для разнастайных экспэрымэнтаў, а не жывую народнасьць, якая здольная самастойна кіраваць сабою. Зыходзячы з гэтага пункту гледжаньня, блізкія суседзі беларусаў, карыстаючыся правам мацнейшага, рабілі над ім свае досьледы й бесцырымонна накладалі жорсткія рукі на жывы арганізм беларускай народнасьці, вырашыўшы, што яна павінна падпарадкавацца мацнейшым і асыміляваццa зь імі, растварыўшыся ў вялікарускім ці польскім моры".

Галоўная мэта, якую ставілі гоманаўцы перад беларускімі грамадзка-палітычнымі дзеячамі, даволі ясна выказана ў другім нумары „Гоману": „Цяперашні гістарычны момант зьяўляецца найбольш зручным для абуджэньня Беларусі, якая пры дружнай барацьбе нашай інтэлігенцыі перародзіцца у новае самастойнае жыцьцё й зойме месца сярод іншых фэдэрацыяў Расеі на пачатках свабоднага пагадненьня зь імі".

Надзвычай вялікую ўвагу й пашану надавалі беларускія нарадавольцы кожнай нацыі й кожнай асобе, якім загражалі варожыя сілы. На гэта знаходзім у другім нумары „Го-

ману" за 1884 год такое асьведчаньне: „Усякая нацыя й усякая асоба ня толькі мае права, але й абавязана абараняць сваю самастойнасьць ва ўсім, што не супярэчыць разьвіццю чалавецтва ўвогуле й кожнай нацыі ў прыватнасьці. Усякая таму нацыя, якой-бы яна сабой не была, заслугоўвае прызнаньня яе самастойнасьці й усякую спробу з боку іншых нацый задушыць гэтую слабую суседку трэба прызнаць шкоднай, ня толькі для гэтай слабой нацыі, але й для самой прыгнятальніцы" (Узята з кнігі „Беларуская нацыя й мова", Менск 1991, стар. 11).

С. Х. Александровіч у „Пуцявінах роднага слова" піша, што два нумары „Гоману" выразна гавораць, што гэта быў не абы-які часопіс, але ворган сарганізаванай групы беларускіх рэвалюцыянераў, якія зналі чаго хацелі й на сваіх старонках разглядалі праграмна-тэарэтычныя пытаньні будучай Беларусі. Гэтыя патрыёты безупынна пратэставалі супраць палянізацыі й русыфікацыі, заклікалі беларускую інтэлігенцыю глыбей пранікнуць у масы свайго народу, вывучыць яго мову, літаратуру, вусную народную творчасьць і змагацца за правы свабоднага разьвіцьця свае нацыянальнай культуры ў сям'і славянскіх народаў.

Былі гэта нацыянальна сьвядомыя патрыёты, якія адчувалі пад сабою грунт, сваё беларускае паходжаньне й гаварылі на старонках свайго часопіса „Гоман" аб дзяржаўнасьці Беларусі.

„Гоман" у беларускай грамадзка-палітычнай думцы XIX стагодзьдзя зрадзіла патрэба жыцьця, дух часу. Ён, непадобна „Мужыцкай праўдзе" Каліноўскага, рэпрэзэнтаваў сапраўдную барацьбу беларусаў на новым этапе іхняга разьвіцьця. Часопіс „Гоман" рабіў важны ўклад у разьвіцьцё грамадзкай думкі й фарміраваньне нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў.

Беларускія нарадавольцы, як бачым, ставілі сваёй галоўнай мэтай разьвіцьцё Беларусі як этнічнай адзінкі й яе нацыянальнае самавызначэньне пакідалі ў фэдэратыўнай сувязі з Расеяй.

Семідзесятыя годы XIX стагодзьдзя былі для беларускай рэвалюцыйнай моладзі перыядам фармаваньня свайго нацыянальнага аблічча. У гэтым напрамку працаваў Герцэн, які бараніў правы беларускага, літоўскага й украінскага наро-

даў. Ён пісаў: „Нікога ня трэба русыфікаваць ані палянізаваць (...) нікому ня трэба перашкаджаць гаварыць і думаць, вучыцца пісаць так, як хто хоча". Герцэн адкідаў „гістарычныя правы Польшчы" на беларускія, літоўскія й украінскія землі. Ён пісаў, што „справа ня ў тым, як прылучаны часьці дзяржавы, але ў тым, ці захавалі яны самабытнасьць ці не". Была гэта думка, ідэя, якая прызнавала права на самастойнае існаваньне тым народам, якія сілай абставін не маглі ажыцьцявіць свае нацыянальнай і дзяржаўнай самастойнасьці. Быў гэта заклік да змаганьня за свае правы.

Такую канцэпцыю падтрымаў Пётр Лаўроў, які стаяў за правы ўсіх народаў дзеля захаваньня іхняй уласнай самастойнасьці. А каб пазбыцца гранічных непаразуменьняў, прапанаваў фэдэрацыю рэспублік на аснове дэмакратычнага сацыялізму, дзе не павінна праяўляцца тэндэнцыя падпарадкаваньня адных народаў іншым народам. Ягонае выданьне „Вперёд" было папулярнае й прыязна прынятае на Беларусі. Яно адыграла ролю настаўніка як трэба служыць народу.

Выданьне „Вперёд" мела сваіх карэспандэнтаў і на Беларусі, толькі што прозьвішчаў іх ня ведаем, але ведаем што быў зьмешчаны артыкул пад загалоўкам „З краю Паўночназаходняга", у якім быў прадстаўлены быт прыгнечанага насельніцтва Беларусі. Лібэрман заўважае, што „большая часьць беларусаў або спалянізаваная, або зрусыфікаваная" й згубіўшы нацыянальнае пачуцьцё іх дзялілі паводле рэлігіі: праваслаўны — рускі, каталік — паляк. Ян Гласко (1855-1881), які паходзіў зь Віцебскай губэрні, у сваёй карэспадэнцыі пісаў, каб жыхары Беларусі ня ехалі ў Расею й не далучаліся да палякаў, пакідаючы свой край на волю лёсу, а засталіся на месцы, бо знаючы мясцовы быт, лягчэй можна весьці сваю справу. Я. Гласко быў карэспадэнтам і яго агульныя інфармацыі зь Беларусі зьмяшчала рэдакцыя „Вперёд".

Бяручы пад увагу агульныя абставіны часу, беларускія нарадавольцы не хацелі адразу заяўляць незалежнасьць Беларусі, бо на гэта не адпавядалі магчымасьці, а галоўным чынам малая нацыянальная сьвядомаць народу. Сьпярша трэба было нарадавольцам далікатна падысьці да сялян і адчыніць ім вочы на існуючы стан рэчаў, а асабліва на русыфікацыю й палянізацыю Беларусі.

Усё-ж дзейнасьць нарадавольцаў не знайшла шырокай падтрымкі ў масах народаў Расеі. Асабліва забойства цара Аляксандра II мела адмоўны ўплыў на народ. Як ведама, цар з нагоды свае каранацыі ў жніўні 1856 году аб'явіў амністыю для палітычных вязьняў у краі й уцекачоў за граніцу, уключна з уцалеўшымі дзекабрыстамі, польскімі паўстанцамі 1830 году, якія знаходзіліся ў Сібіры, правёў некаторыя рэформы ў краі й паслабіў цэнзуру. Прагрэсіўныя элемэнты Расеі былі задаволеныя пачатымі рэформамі. Прафэсары й студэнты спадзяваліся атрымаць акадэмічную свабоду; пісьменьнікі — свабоду слова; нацыянальныя меншасьці глядзелі на сваю свабоду, ды нават Царква хацела вызваліцца з-пад жалезнага кантролю дзяржавы.

Гэтыя рэформы былі на пачатку дастатковымі, каб пачаць новую эпоху. Але так сталася, што цар пад націскам сваіх супрацоўнікаў змушаны быў стрымаць рэформы супраць свае добрае волі. І, нягледзячы на гэта, жыла надзея, што ўсё-ж некаторыя дадатковыя рэформы будуць уведзены ў жыцьцё, але цара забілі.

Што-ж было прычынай забойства цара-рэфарматара? Трагедыя заключалася ў тым, што царскі ўрад запозна й запавольна пачаў задавальняць дамаганьні народу, а ў канцы спыніў рэформы. Ужо ад часу Кацярыны II, а пасьля Аляксандра I, інтэлігенцыя Расеі была запазнаная з дэмакратыяй Захаду. І гэтая прага да свабоды насьпела настолькі, што не магла даўжэй чакаць. Рэвалюцыйная інтэлігенцыя дзейнічала рашуча, быццам хацела нагнаць страчаны час, не здаючы дастаткова справы з насьледзтваў свае работы. Нямала нарадавольцаў завісла на шыбеніцы, шмат саслана на катаргу ў Сібір, або пасаджана ў турму. У часе вобыску вязьняў у Варшаўскай Цытадэлі знойдзена карэспадэнцыю пісаную па-беларуску, якая пачыналася „Здарова землячок!"

Некаторыя актыўныя сябры Народнай Волі не падзялялі тэрору на самых пачатках і пакінулі рады арганізацыі. Адным зь іх быў Пляханаў, пазьнейшы шматгадовы дзеяч сацыялістычнага руху, які правёў амаль усё сваё жыцьцё на эміграцыі, змагаючыся за перабудову Расеі на дэмакратычных асновах. Так, што Народная Воля не была арганізацыяй, якая выяўляла сапраўдную й агульную народную волю.

Ужо так прынята разглядаць гісторыю тае ці іншае дзяржавы паводле тых, што стаялі на чале яе. У Расеі да XX стагодзьдзя ўладу выконвалі цары. Што праўда, мелі яны вялікую ўладу, але гэта яшчэ ня значыць, што яны маглі рабіць усё, што ім падабалася. Гісторыя ўспамінае Аляксандра I і Аляксандра II як лібэральных цароў, але ў практычным жыцьці яны аказаліся бясьсільнымі правесьці мінімальныя дэмакратычныя рэформы, даць палёгку свайму народу, бо ў значнай меры залежалі ад сваіх памагатых, якія ўтрымоўвалі цароў дзеля выгадаў выбранай клясы. Такая сыстэма прадугледжвала, што ўнутраная палітыка Расеі ў ніякім выпадку ня зможа правесьці рэформы шляхам эвалюцыі, але можа быць дасягнута толькі пад націскам нізоў, у выніку чаго наступіць катастрофа, рэвалюцыя. У гэта верылі нарадавольцы й у гэтым напрамку працавалі.

Пасьля задушэньня царскім урадам руху нарадавольцаў яго некаторыя сябры, што засталіся некранутымі, былі заснавальнкамі новых палітычных гурткоў. Асабліва да народавольцаў была падобная партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў, так званых эсэраў, якія ў беларускім нацыянальным і незалежна-дзяржаўным змаганьні пачатку XX стагодзьдзя пакінулі трывалы сьлед.

Рэформы Аляксандра II яго наступнік Аляксандар III і Мікалай II адкінулі й вярнуліся назад да царскага дэспатызму. Асабліва Аляксандар III, пад уплывам свайго дарадчыка Пабеданосцава, адкінуў канстытуцыйныя прапановы свайго бацькі, абмежаваў тыя свабоды, што раней былі дадзены й праявіў моцную нацыяналістычную палітыку русыфікацыі заходніх акраін свае імпэрыі.

Пабеданосцаў займаў пасаду пракурора Сьвяшчэннага Сынода пры Мікалаю II і не скрываў антыпатыі да парлямэнтарызму й дактрыны сувэрэннасьці народаў. Як заўзяты праціўнік дэмакратыі, называў яе „найбольшым злом нашага часу". Яго дзейнасьць не аслабіла праціўнікаў манархіі, а толькі ўзмоцніла іхнюю варожасьць да існуючага парадку.

Усе расейскія цары ніколі не праявілі сапраўднай дэмакратыі й лібэралізму, а ўсьцяж замацоўвалі сваю дэспатычную ўладу. На ўсе вызвольныя рухі народаў, як у сябе дома, так і навонкі, яны глядзелі варожа. Калі, напрыклад, у Англіі выбухла паўстаньне Кромвэля (XVII ст.) супраць

караля, то Аляксей Міхайлавіч зьвярнуўся да эўрапэйскіх манархаў, каб распачаць сьвятую вайну супраць Кромвэля. А імпэратрыца Кацярына II (1762-1796) адмовіла прызнаць рэвалюцыйны ўрад Амэрыкі, які змагаўся за сваю дзяржаўную незалежнасьць. Пачынаючы ад Івана Каліты й канчаючы на Мікалаю II, палітыка расейскіх князёў, цароў і імпэратараў засталася нязьменнай, што ў канцы прывяло Расею да рэвалюцыі й утраты трону ў 1917 годзе.

У заключэньні можна сказаць, што ў падзеях другой паловы XIX стагодзьдзя беларусы праявілі сваю нацыянальную актыўнасьць. Хоць ня ўсе яны выбралі правільную дарогу, аднак памяць пра Кастуся Каліноўскага, Ігната Грынявіцкага й нарадавольцаў увайшла ў гісторыю Беларусі. Гэта ёсьць важны й цікавы перыяд гісторыі Беларусі, варты ўвагі беларускіх гісторыкаў.

(„Голас Часу" № 12 (3), 13 (4) і 14 (5), Лёндан 1991 г.)

Алаіза Пашкевічанка — Цётка (33-я ўгодкі з дня яе сьмерці)

5 лютага г.г. мінулі 33 гады з дня сьмерці выдатнае нашае пясьняркі — піянеркі беларускіх жанчын Алаізы Пашкевічанкі — Цёткі.

Нарадзілася яна 3 ліпеня 1876 г. у беднай сялянскай сям'і на Лідчыне. Сапраўднае яе прозьвішча Алаіза Пашкевіч. Сваё дзяцінства й юнацтва піянерка правяла ў вясковым асяродзьдзі, сярод беларускай прыроды, што мела вялікі ўплыў на пазьнейшую яе творчасьць. Без ніякай помачы з дому здолела вучыцца й скончыла Віленскую гімназію ў 1904 г., а пазьней вучыцца ў Пецярбургу на вышэйшых курсах. Да беларускага руху Цётка прыстала яшчэ будучы гімназісткай, дзе вядзе актыўную палітычна-нацыянальную працу, належачы да Беларускай рэвалюцыйнай грамады, адначасна пішучы вершы.

Зь першымі выстраламі рэвалюцыі 1905 г. Цётка сьмела выступае на арэну беларускага вызвольнага руху. У сваіх рэвалюцыйных вершах і прамовах кранае да глыбіні душы народных масаў, штурхае іх на новыя шляхі, на шляхі вызвольнай барацьбы.

Сваімі гарачымі прамовамі ў Вільні й яе ваколіцах Цётка здабывае вялікую папулярнасьць сярод працоўных, а яе імя стала ведамым ня толькі ў Віленскай акрузе, але было шырока вядомым ва ўсёй Беларусі. Яшчэ й цяпер хіба зной-дуцца старыя чыгуначнікі ў Вільні, якія захавалі аб ёй сьветлыя ўспаміны аб натхнёнай, самаадданай рэвалюцыянерцы.

За свае прамовы Цётка змушана была ўцякаць ад прасьледаваньня царскай паліцыі. Удалося ёй перабрацца ў Аўстрыю, дзе паступіла на Кракаўскі, а пасьля на Львоўскі ўнівэрсытэт. Тут яна не знайшла супакою. Туга й любоў да роднага краю й свайго народу, што яна выказвае ў сваіх вершах, падламліваюць яе сілы.

Калі Цётка выйшла замуж за ліцьвіна інж. Кейрыса й зьмяніўшы прозьвішча зноў вярнулася на Бацькаўшчыну, то зноў пачала кіпучую работу. Мы бачым яе як рэдактара часопісу для моладзі „Лучынка" й як супрацоўніцу газэты „Наша ніва", і як аўтарку першае чытанкі для дзяцей, і як арганізатарку першай беларускай школы ў Вільні, і як няўтомную грамадзкую дзяячку. Змучаная выгнаньнем, сілы яе падупадаюць, але працы яна не пакідае.

Пачынаецца вайна. Цётка працуе сярод раненых жаўнераў у шпіталі ў Новай Вілейцы, а калі выбухла эпідэмія тыфу, яна сьпяшыць на вёску, каб ратаваць сваіх людзей, якія бяз лекаў і помачы гінулі як мухі. У сваім родным кутку на Лідчыне яна заразілася гэтай страшнай хваробай — тыфам і памерла 5 лютага 1916 г. зусім яшчэ маладой жанчынай. Пахавана яна ў Старым Двары, у сваёй роднай вёсцы недалёка Ліды.

У Беларусі рэвалюцыя 1905 г. разам з сацыяльнымі лёзунгамі нясла на сваіх хвалях і магутны нацыянальны ўздым. Беларуская рэвалюцыйная грамада вяла шырокую падрыхтоўку да рэвалюцыйных выступленьняў сярод сялянаў і работнікаў. У гэтыя гарачыя дні Цётка з усім сваім юнацкім запалам аддаецца грамадзкай працы. У 1905 г. выходзіць маленькі зборнік вершаў Цёткі пад назовам „Хрэст на свабоду". Назоў зборніка выясьняе першы верш пад такім-жа загалоўкам, у якім апісваюцца падзеі 9 лютага 1905 г. у Пецярбургу. Расстрэлы рабочых, якія ішлі на чале са сьвятаром Гапонам прасіць ласкі цара й былі першым „Хрэстам на свабоду".

Пралілася першая кроў. З таго часу па ўсіх гарадох пачаліся дэманстрацыі. Народнае змаганьне яна ўяўляла як усхваляванае мора. Бой, у які ідуць народныя масы, „вякамі жджэцца", пясьнярка ў паэтычным захапленьні, упоеная змаганьнем, лічыць вялікім шчасьцем згінуць у гэтым баі („Мора"). Але хвалі рэвалюцыі хутка ападаюць. Наступае чорная рэакцыя, якая выглядае з настрояў пясьняркі. У вершы „Небывалыя часы" маюцца жудасьці гэтае рэакцыі, ад якіх „песьні нямеюць".

Будучы на чужыне, сум выклікае ня раз цяжкія хвіліны глыбокай духовай дэпрэсіі („З чужыны"). Але сум гэты ня выкліканы сьвядомасьцю ўтраты асабістага толькі шчасьця, яго крыніца — з псыхічнай структуры Цёткі. Зусім слушна піша аб гэтым Антон Навіна: „Ня страх сьмерці, ня боязьнь утраты ўцехаў жыцьця становяцца трагедыяй душы Цёткі, яе буйны тэмпэрамант кіруецца толькі ў чыста-грамадзкім кірунку, і сьмерць і хвароба мучаць пясьнярку таму, што яна чуе ўтрату сіл да працы". Верш „Мае думкі" найяскравей пацьвярджае вышэйсказанае. Пясьнярка хоча ператварыцца ў стыхійныя сілы, стацца агнём, ветрам, хваляй, быстрай рэчкай, каб усюды памагаць, каб даць людзям больш сьвятла чым дае сонца, бо яно ўсё-ж далёка ад зямлі („Мае думкі"). Змагарны дух Цёткі незламаны, ён моцны да канца яе жыцьця. Словамі нагадваючымі ўдары молата яна ўлівае веру ў душу беларуса.

Нешта блізкае з Багушэвічам у Цёткі, танальнасьць ейнае творчасьці. Зборнік яе вершаў „Скрыпка беларуская" — адказ на ягоны „Смык беларускі", аб чым выразна зазначае сама Цётка.

Так абарваліся струны ліры пясьняркі барацьбы. Але вера яе, што песьня ўстане „з стотысячнай сілай" („Грайка") збылася. І не жалейкі скруцілі яе нашчадкі ў нашай літаратуры, а выклікалі няўміручае беларускае мастацтва слова.

(„Аб'еднаньне" № 2 (11), Лёндан, 1949 г.).

„А сэрца ўсё імкнецца да бацькаўскага краю..."

Пад такім загалоўкам выйшла ў мінулым 1991 годзе ў Менску ў выдавецтве „Мастацкая літаратура", кніжка вядомага беларускага краязнаўцы Генадзя Каханоўскага. Па

сваім аб'ёме кніжка невялікая, усяго 75 страніц, але па сваім зьместу вельмі багатая й цікавая. Прысьвяціў яе аўтар Максіму Багдановічу з нагоды дзьвюх гадавінаў.

Шмат дзе ў мінулым годзе на Беларусі й за яе межамі беларусы ўшаноўвалі добрую памяць Максіма Багдановіча — пачынальніка беларускай клясычнай паэзіі — акадэміямі, мастацкімі выступамі, канцэртамі й т.п. Багдановічаўскі юбілей ушанаваны быў нават у будынку Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў 4 лістапада. Слова пра паэта сказаў Генадзь Бураўкін, сталы прадстаўнік Беларускай місіі пры ААН.

А паважаны Генадзь Каханоўскі, як жыхар Маладзечна, знаючы, што М. Багдановіч правёў у 1911 годзе нейкі час на Маладзечаншчыне, рашыў адшукаць ягонае месца пражываньня. Адгэтуль пачынаюцца ў кніжцы Г. Каханоўскага ня толькі пошукі месцазнаходжаньня Максіма ў летку 1911 году, дзе ён пісаў свае беларускія вершы, але ўспамінаюцца шматлікія прозьвішчы людзей, якія нешта зналі, чулі, або мелі нейкую сувязь з Максімам Багдановічам. Згадваюцца й тагачасныя абставіны, знаёмства зь Беларусьсю, яе культурнымі дзеячамі й культурнымі нацыянальнымі знаходкамі, якія зрабілі свой уплыў на творчасьць маладога паэта.

Як зазначана ў кніжцы, „аўтар на аснове архіўных знаходак — а гэта ўспаміны сучасьнікаў, лісты нашаніўцаў і бацькі паэта, паэта да знаёмых Максіма — узнаўляе бадай самы плённы, так званы ракуцёўшчынскі, перыяд творчасьці паэта. Выданьне падрыхтавана да 80-годзьдзя сустрэчы Максіма Багдановіча зь Беларусьсю й 100-годзьдзя з дня нараджэньня".

Цікавая кніжка па сваіх знаходках і гэтым зьяўляецца яна яшчэ адным укладам у скарбніцу беларускай культуры, за што беларуская грамадзкасьць павінна быць удзячная аўтару.

(„Голас Часу" № 17 (2), Лёндан 1992 г.).

Слуцкая Абарона

Гісторыя станаўленьня беларускай дзяржаўнасьці мае не адно збройнае выступленьне. Але адным з найбольшых і найлепш сарганізаваных была Слуцкая Абарона ў ліставападзе 1920 году.

Горад Слуцк мае старую й багатую гісторыю. Першы ўспамін аб ім датуецца 1116 годам, калі менскі князь Глеб напаў на дрыгавічоў. На Слуцкае княства нападалі й кіеўскія князі, пакуль яно не ўвайшло ў склад Вялікага Княства Літоўскага ў XIII стагодзьдзі. Няраз нападалі на Слуцк манголы-татары, пакідаючы па сабе руіны, але за кожным разам Слуцк адбудоўваўся.

На пачатку XV і XVI стагодзьдзяў у Слуцку праводзілася будоўля замкаў і горад стаўся магутным абаронным пунктам. Але ў жыцьці Слуцка важна згадаць два знакамітыя здарэньні, якія спрычыніліся да папулярнасьці гэтага горада. Гэта Слуцкая гімназія, якая была заложана ў 1630 годзе й манафактура персідскіх паясоў, якая існавала ў 1670-1705 гадох (сёньня „слуцкія паясы" знайсьці можна ў некаторых музеях сьвету).

Тут трэба яшчэ дадаць, што дзякуючы ўраджайнай глебе, сяляне Случчыны жылі заможна й таму пасылалі сваіх дзяцей у гімназію. Асабліва са Слуцкай гімназіі выйшла многа сьвядомых беларусаў, якія ў нацыянальна-культурным і палітычным жыцьці Беларусі адыгралі важную ролю.

У часе расейскай рэвалюцыі 1905 году ў Слуцку былі забастоўкі сярод старэйшых клясаў гімназіі. А ў рэвалюцыю 1917 году Случчына была першай, дзе ўлада апынулася ў руках сьведамага беларускага нацыянальнага актыву. Калі ў Менску аб'явілі незалежнасьць Беларусі Актам 25 сакавіка 1918 году, то ў Слуцку дзейнічаў ужо Беларускі Нацыянальны Камітэт і выходзіла газэта „Родны край".

Як бачым, Слуцк рана заняў вядучую ролю ў асьвеце й таму Случчына сталася нацыянальна найбольш сьвядомай правінцыяй Беларусі, якая дала найбольш беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў — рупліўцаў на ніве адраджэньня дзяржавы.

У выніку рэвалюцыі 1917 году ў Расеі, якая перакінулася часткова ў Нямеччыну, восеньню 1918 году пачалося адступленьне нямецкай арміі на ўсходнім фронце. 15 сьнежня ў Слуцк прыйшлі бальшавікі й выдалі Загад № 1, у якім было сказана: „Уся грамадзкая ўлада ў горадзе й павеце пераходзіць да рэўкома. Камітэт загадвае насельніцтву гораду й павету захоўваць паўнейшы спакой і парадак і папераджае, што ўсякія бясчынствы, грабяжы й контррэва-

люцыйныя выступленьні, адкуль-бы яны не выходзілі, будуць зьнішчаны па ўсёй строгасьці законаў рэвалюцыйнага часу аж да расстрэлу".

Такі загад-прыказ не спалохаў случчакоў, а сарганізаваны бальшавікамі вясной 1919 году ў Слуцку „Сводный Слуцкий Батальон", беларускі нацыянальны актыў моўна й збройна апанаваў яго й спыніў бальшавіцкую дзейнасьць.

8 чэрвеня 1919 году на Случчыну прыйшлі польскія войскі Пілсудскага. Палякі, падобна бальшавікам, не прызналі беларускай нацыянальнай ідэі й аднасіліся да яе варожа, не даючы беларусам магчымасьці ўзмоцніцца. Такі стан трываў год часу.

Бальшавіцкі наступ на Варшаву ў ліпені 1920 году меў вялікі посьпех і гэта надта падбадзёрыла бальшавіцкіх актывістаў, якія зь першых дзён свае акупацыі Случчыны павялі наступ супраць нацыянальна сьвядомых беларусаў, якія не ішлі на супрацоўніцтва зь імі. Тады-ж камуністы ліквідавалі беларускія ўстановы, а іх актыўных дзеячоў, як П. Жаўрыд і іншыя, арыштоўвалі й вывозілі.

Раптоўнае й неспадзяванае паражэньне Чырвонай Арміі пад Варшавай у палове жніўня 1920 году й яе панічнае адступленьне змусіла бальшавікоў пакінуць Случчыну. У гэты пераломны момант з савецкай турмы ўцёк П. Жаўрыд і вярнуўся ў Слуцк, дзе аднавіў дзейнасьць Беларускага Нацыянальнага Камітэту. Камітэт разгарнуў працу й у першую чаргу ўзяўся за арганізацыю беларускай міліцыі, у якую ўступіла 500 чалавек — ядро будучай арміі.

Адступіўшых са Случчыны бальшавікоў заступіла войска Пілсудскага. Як раней так і цяпер беларуская нацыянальна-арганізацыйная дзейнасьць не падабалася палякам і яны праз свае інтрыгі адсунулі зь Беларускага Нацыянальнага Камітэту Паўла Жаўрыда, а на яго месца пасадзілі палянафіля д-ра Паўлюкевіча й далі яму на дапамогу дугога палянафіля Алексюка. Гордыя сваёй перамогай гэтым разам палякі аказаліся на Беларусі больш нахабнымі, чым бальшавікі. Яны ўжо не гаварылі аб прынцыпе самавызначэньня, або фэдэрацыі Літвы, Беларусі й Украіны, але дыктавалі свае ўмовы бальшавікам.

У хуткім часе ваенныя падзеі на фронце склаліся так, што 12 кастрычніка 1920 году палякі й бальшавікі падпіса-

лі дагавор аб перамір'і, намецілі дэмаркацыйную лінію Кіевічы — Лань і неспадзявана прызналі незалежнасьць Украіны й Беларусі. „Трывалыя, ганаровыя, на ўзаемным давераы перагаворы", што было зазначана на самым пачатку польска-бальшавіцкай дамоўленасьці, распачаліся 18 кастрычніка ў Рызе. Пастаноўлена было адступіць бальшавіцкай і польскай арміям ня менш як 15 кілямэтраў ад дэмаркацыйнай лініі. Такім парадкам утварылася зона шырынёй 30 кілямэтраў, у якой апынуўся горад Слуцк.

Апынуўшыся ў нэйтральнай зоне, асабліва інтэлігенцыя, моладзь і вайскоўцы, якіх на Случчыне налічвалася больш за 300 афіцэраў розных рангаў і зброі, пачалі выказваць рашучасьць супраць акупантаў. Нават слуцкі „хлоп" і „мужык", якіх акупацыйная бяда хоць мучыла, але й вучыла, пачалі разумець, што ніхто ім паратунку не прынясе, зь няволі ня вызваліць, свабоды ня дасьць, а яе трэба дабівацца самым, сваімі собскімі сіламі й самі ўзяліся за работу.

Захадамі Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Слуцк на 14 лістапада 1920 году скліканы быў Зьезд Случчыны, каб народ сам рашыў свой лёс. На зьезд прыбыло 107 дэлегатаў ад Слуцка й 15 паветаў, а сярод іх прадстаўнікі ад Беларускай Нацыянальнай Рады, ад Найвышэйшай Рады й нават афіцэры ад генэрала Булак-Балаховіча.

Гэтым разам палякі не перашкаджалі беларусам у іхняй дзейнасьці таму, што ў выніку іхняга дагавору з бальшавікамі ад 12 кастрычніка Случчына мела адысьці да саветаў, а фактычна была зонай нейтральнай. Па-другое, усякія бунты на савецкай тэрыторыі давалі палякам лепшы шанс выйгрышу на мірных перагаворах у Рызе.

Зьезд Случчыны, які адбыўся ў вялікім доме памешчыка Э. Вайніловіча, неадкладна адсунуў ад кіраўніцтва Нацыянальным Камітэтам Паўлюкевіча й усю ўладу перадаў у рукі беларускіх незалежнікаў — эсэраў. На старшыню Зьезду выбралі Васіля Русака, а на заступніка— судзьдзю Уладзіміра Пракулевіча. У кіраўніцтва Рады Случчыны выбралі 17 чалавек на чале з У. Пракулевічам. Зьед праходзіў у патрыятычным духу, аб чым сьведчыць наступная рэзалюцыя: „Першы Беларускі Зьезд Случчыны, скліканы ў ліку 107 асобаў, вітае Найвышэйшую Раду Беларускай Народнай Рэс-

публікі й заяўляе, што ўсе свае сілы аддасьць на адбудову Бацькаўшчыны, катэгарычна пратэстуе супраць заняцьця нашай Бацькаўшчыны чужацкімі й самазванымі савецкімі ўладамі. Хай жыве Вольная, Незалежная Народная Беларуская Рэспубліка ў яе этнаграфічных межах".

Пасьля заканчэньня Зьезду Рада Случчыны стала часовым урадам Случчыны і адразу прыступіла да арганізацыі збройных сілаў. Праз тыдзень часу, 21 лістапада, Рада Случчыны выдала Дэклярацыю, у якой гаварылася аб незалежнасьці Беларусі й „у выніку патрэбы сілаю ружжа, нягледзячы на лічэбную перавагу ворага, думаючы, што наша справа — справа праўдзівая, а праўда заўсёды закрасуе".

Словы напісаныя на паперы случчакі прадэманстравалі чынам. На заклік Рады Случчыны адгукнуліся амаль усе маладыя й старыя, а нават жанчыны аказалі дапамогу. За пару дзён створаны быў 1-шы Беларускі Слуцкі полк пад камандай П. Чайкі, які ў свой час працаваў у Генеральным Штабе расейскай арміі. Адначасна створана 2-гі Беларускі Грозаўскі полк пад камандай Семенюка (у лютым 1920 г. Семянюк камандаваў 1-ым Беларускім партызанскім атрадам).

З гэтых трох палкоў стварылася 1-я Беларуская брыгада на чале з капітанам Анціповічам. Да случчакоў пачалі далучацца некаторыя групы партызан, якія раней ваявалі з акупантамі.

Работай Слуцкай Абароны кіраваў Галоўны Штаб. Брыгада была падзелена на палкі, батальёны, роты, мела конны атрад, табар і сваю зброевую майстэрню. Пры штабе брыгады створаны быў асобны атрад з двух ротаў, ваенны суд, палявы шпіталь, дзейнічала разьведка й контрразьведка. У параўнаньні да другіх беларускіх збройных выступленьняў Слуцкая Абарона адзначалася дасканалай арганізацыяй, што сьведчыць аб яе вопытным кіраўніцтве, якое прадбачвала збройнае змаганьне на даўжэйшы час.

Першыя баі случчакоў з рэгулярнымі сіламі Чырвонай Арміі пачаліся 26-27 лістапада й неўзабаве ўтварыўся фронт на нейкіх 100 кілямэтраў. Ня буду апісваць баі случчакоў з Чырвонай Арміяй, але скажу, што з-за недахопу зброі й амуніцыі й пры пераважаючых сілах рэгулярнай арміі праціўніка случчакі змушаны былі 31 сьнежня 1920 году пе-

райсьці за раку Лань, дзе ў ваколіцы вёскі Сіняўка іх разброілі палякі. Але некаторыя случчакі не здалі ружжа й прадаўжалі барацьбу з чэкістамі аж да 1929 году.

Калі наблізіўся канец збройнага чыну случчакоў, зь ім і будучыня Беларусі выглядала трагічна. Беларуская газэта „Змаганьне" ад 10 сьнежня 1920 году пісала: „Цяпер надышоў час, калі Беларуская Рэспубліка ня можа больш існаваць без сваёй беларускай арміі, якая толькі адна можа зразумець правільныя справы перадавога беларускага народу й несьці ўнутраную й зьнешнюю ахову Беларускай Рэспубліцы".

Случчакі змагаліся й паміралі на полі бою за вольнасьць і незалежнасьць Беларусі й нават у крытычны час не пайшлі на ніякія кампрамісы. Сваім чынам случчакі адкрылі новую страніцу збройнага змаганьня ў гісторыі беларускага народу за вольнасьць і незалежнасьць. Яны паказалі сваю стойкасьць, салідарнасьць, маральную сілу, ахвярнасьць і арганічную ненавісьць на акупанта-наездніка.

Адзін з удзельнікаў Слуцкай Абароны А. Кабычкін так успамінае тыя дні: „Мне даводзілася быць сьведкам збройнай барацьбы розных партызанскіх аддзелаў на Украіне, але нідзе я ня бачыў гэтакага запалу як у Слуцкіх Паўстанцаў. Гэта была, бадай, адзіная ў сьвеце вайсковая фармацыя, якая нічога ня брала ў насельніцтва й не рабіла ніякіх рэквізыцыяў. Зрэшты ў гэтым не было й патрэбы, бо ўсё патрэбнае для войска, як фураж, прадукты, а нават вопратку сяляне самі добраахвотна прывозілі ў Семежава. (...) Трэба было бачыць, як, амаль штодня, цягнуліся абозы ў Семежава (часта зь белчырвона-белым сьцягам на першым возе) з усім патрэбным для паўстанцаў, каб належна зразумець, зь якой любоўю й ахвярнасьцю адносілася насельніцтва да свайго вызвольнага войска" („Вызвольныя шляхі", Кліўленд 1965, стар. 45).

Уся Беларусь выказала шчырыя сымпатыі й пакладала вялікія надзеі на збройны чын случчакоў. У довад свайго патрыятызму жанчыны запісваліся ў Чырвоны Крыж, шылі вопратку й прыслалі сьцяг з прыгожа вышытай Пагоняй і надпісам: „Тым, што паўсталі й пайшлі памірaць, каб жыла Беларусь".

Будучыня членаў Слуцкай Рады й афіцэраў Слуцкай Абароны склалася трагічна. Тыя, што засталіся на Случчыне,

былі арыштаваны бальшавікамі й сасланы ў лягеры. Некаторых случчакоў палякі выдалі бальшавікам неафіцыйна. Заняўшы Заходнюю Беларусь у 1939 годзе НКУС арыштоўваў удзельнікаў „Слуцкага мяцяжу". Тут успомнім некаторыя прозьвішчы членаў Слуцкай Рады й камандзіраў, якія загінулі трагічна:

— Павал Жаўрыд — камісар Найвышэйшай Рады Народнай Рэспублікі ў Слуцкім павеце ў 1920 годзе. Расстраляны ў Менскім ГПУ ў 1925 г.

— Уладзімір Пракулевіч — загінуў у ГУЛАГу.

— Юры Лістапад — сябра Рады Случчыны. Двойчы арыштаваны й суджаны. Загінуў у ГУЛАГу.

— Юліян Сасноўскі — сябра Рады Случчыны, скончыў жыцьцё ў Польшчы ад польскай двойкі.

— капітан Анціповіч — сябра Рады Случчыны. Выдадзены польскімі ўладамі бальшавікам, расстраляны.

— палкоўнік Гаўрыловіч — загінуў у ГУЛАГу.

— капітан Самусевіч — выдадзены польскімі ўладамі бальшавікам, расстраляны.

— паручнік Бранявіцкі — забіты агентамі НКУС у Заходняй Беларусі.

— штабс-капітан Сокал-Кутылоўскі — пасьля заканчэньня Другой Сусьветнай вайны выдадзены з Заходняй Нямеччыны камуністам і пасаджаны ў ГУЛАГ. У часе амністыі быў выпушчаны на волю.

— Васіль Русак — старшыня Першага Зьезду Случчыны, пасьля паражэньня Слуцкай Абароны эмігравaў у Чэхаславакію. Пасьля заканчэньня Другой Сусьветнай вайны перададзены чэшскімі камуністамі ў СССР, дзе яго спаткала сьмерць.

Як бачым, камуністы разьлічваліся амаль з усімі ўдзельнікамі Слуцкай Абароны, каго толькі маглі злавіць у свае рукі.

Пасьля развалу СССР, калі Беларусь прыняла форму незалежнай дзяржавы, сярод дэмакратычных і навуковых колаў Рэспублікі адзначаліся, першы раз за 72 гады, угодкі Слуцкай Абароны. Прайшло гэта сьвяткаваньне пад крытыкай камуністаў і перашкодамі, а дзе й з забаронай. Аднак пачатак быў зроблены. У мінулым годзе ўгодкі Слуцкай Абароны ўшаноўваліся больш урачыста, але таксама не абышлося без шыканаў з боку камуністаў і некаторай адміністрацыі.

Будзем бачыць як у гэтым годзе пры першым прэзыдэнце Беларусі будзе аддадзена пашана тым беларусам, якія змагаліся й паміралі, каб жыла Вольная і Незалежная Беларусь!

(„Голас Часу" № 33 (6), Лёндан 1994 г.).

Старая песьня неаджытай гамы

У мінулым годзе ў „Бібліятэцы газэты «Голас Гадзімы»" выйшла кніжачка доктара юрыдычных навук прафэсара Вадзіма Круталевіча „Станаўленьне дзяржаўнасьці. Да 70-годзьдзя абвяшчэньня БССР" (Менск 1989).

На тэму беларускай савецкай дзяржаўнасьці пісаў вышэйзгаданы аўтар даволі часта. Але гэтым разам, у часе ажыўленай галоснасьці й перабудовы, калі нават у савецкіх школах студэнты не здавалі экзаменаў па гісторыі, то ў В. Круталевіча гісторыя станаўленьня беларускай дзяржаўнасьці мала чым зьмянілася ад яго папярэдніх публікацыяў.

Ня будзем разглядаць тут зьмест усяе гэтае кніжачкі, бо на гэта спатрэбіцца многа часу й месца, аднак зьвернем увагу на яе заканчэньне, на перадапошнюю й апошнюю старонкі, што там аўтар піша. А піша ён, між іншым, аб нацыянальна-тэрытарыяльным разьмежаваньні БССР і РСФСР, якое быццам не ўдалося зрабіць у 1919 годзе. Але факты сьведчаць, што ў часе тварэньня БССР было сказана, што тэрыторыя рэспублікі павінна складацца зь пяці губэрняў: Гродзенскай, Менскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай. І гэтыя пяць этнічна беларускія губэрні мелі ўвайсьці ў склад тагачаснай БССР згодна гістарычнаму мінуламу.

Толькі праз махінацыі партыйнага кіраўніцтва ў Маскве, якое не дало магчымасьці ажыцьцявіцца БССР, за яе плячыма ў лютым 1919 году створана была Літ-Бел. (Літоўска-Беларуская Рэспубліка) і як на сьмех увялі ў яе ўрад аднаго беларуса — А. Чарвякова. Такім парадкам і правам забраныя былі ад БССР Магілёўская, Віцебская й Смаленская губэрні й далучаны да Расеі.

Такога роду дзеяньне не было ўчыненае беларусамі, а была гэта работа РКП(б), якая звузіла тэрыторыю Беларусі да няпоўных шасьці паветаў былой Менскай губэрні з насельніцтвам 1,5 мільёна душ. Цэнтральнае Бюро КП(б)Б, якое

кантралявала Масква, забараняла членам рэспубліканскай партыйнай арганізацыі ставіць і абмяркоўваць пытаньні межаў Беларусі.

Толькі на пачатку НЭПу беларусы пачалі дамагацца вяртаньня свае тэрыторыі і справа беларускай граніцы на ўсходзе выклікала барацьбу Менска з партыйнымі арганізацыямі Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губэрняў, якія былі абстаўленыя людзьмі даверанымі ЦК РКП(б). І толькі дзеля таго, што ў 1922 годзе ўтворана была фэдэрацыя — СССР, таму, каб пабольшыць куртатую Беларусь, далучылі да яе некаторыя ўсходнія правінцыі.

У 1924-1926 гадох, як піша В. Круталевіч, Магілёўская й Віцебская губэрні былі вернуты БССР. Вярнулі іх 3 сакавіка 1924 году, а 6 сьнежня 1926 году далучылі да Беларусі Гомель і Рэчыцу.

Аднак Смаленшчына з горадам Смаленскам, якія ў 1919 годзе ўваходзілі ў склад Беларускай ССР, а Смаленск быў яе першай сталіцай, па сёньняшні дзень засталіся пры Расеі. І такі факт В. Круталевіч называе „актам вялікага гістарычнага значэньня, сьведчаньнем дзейнасьці абвешчанага Кастрычніцкай рэвалюцыяй права нацый на свабоднае самавызначэньне". Тут ніякага „свабоднага самавызначэньня" не было. Ніхто нікога не пытаў. Усё рабілася на вярхох, за плячыма народу, а толькі гаварылася, што з волі народу.

Вадзім Круталевіч ведае добра, што Смаленшчына — старадаўняя беларуская зямля й захоп яе сілай Масквою не павінен замоўчвацца. Права на сваю тэрыторыю, як і „права нацый на свабоднае самавызначэньне", аб чым пісаў Ленін у лістападзе 1917 году ў сваёй „Дэклярацыі правоў народаў Расеі", павінны быць гарантаваны. Нават „Беларуская савецкая энцыкляпэдыя" ня бачыць розьніцы паміж полацкімі й смаленскімі крывічамі.

Далей аўтар піша, што „ў 1939 годзе была выпраўлена гістарычная несправядлівасьць. Заходняя Беларусь увайшла ў склад БССР". А хто-ж учыніў гэтую несправядлівасьць, калі не Масква з Варшавай у 1920-1921 гадох у Рызе й назвалі гэта „слушна й справядліва, ня выказаўшы ніякай агрэсыўнасьці".

Наступна аўтар піша, што заключаны ў 1945 годзе дагавор паміж СССР і ПНР вызначыў савецка-польскую грані-

цу. І тут „з выпраўленай гістарычнай несправядлівасьці" ў 1939 годзе, у 1945 годзе Сталін аддаў Польшчы Беласточчыну. Гэтым была зроблена яшчэ адна новая несправядлівасьць, за якую гадамі церпяць беларусы Беласточчыны й Бельшчыны ад зьнявагаў палякаў. Сталін аддаў Польшчы гэтыя беларускія землі, каб прымірыць грамадзкую думку палякаў, якія не былі прыхільныя да камунізму.

Сёньня ў Польшчы няма камуністычнай улады, а Беласточчына й Бельшчына засталіся пры Польшчы. Камуністы на Крамлі рэзалі жывое цела народаў, гандлюючы іхняй тэрыторыяй і за гэта маюць сёньня ня толькі непаразуменьні, але й праліцьцё крыві, бо ўсё гэта рабілася ня з волі народаў, а за плячыма народаў дзеля сваіх імпэрскіх мэтаў.

Згадвае В. Круталевіч у сваёй кніжцы й аб амністыі для беларускіх нацыянальных антысавецкіх арганізацыяў, членаў Вялікай Беларускай Рады, Найвышэйшай Рады, Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларускай Вайсковай Камісіі й інш. А згадвае ён гэтую прапагандысцкую амністыю так: „Савецкая ўлада не закрыла дарогу да ўдзелу ў сацыялістычным узнаўленьні тым, хто прызнаўшы свае памылкі, зразумеўшы бэспэрспэктыўнасьць далейшай барацьбы, гатоў быў справай даказаць ляяльныя адносіны да новага ладу. Выяўленьнем гэтай гуманнай палітыкі зьяўлялася аб'яўленьне прэзыдэнтамі ЦВК СССР і ЦВК БССР 11 ліпеня 1923 года „Амністыі з нагоды трэцяй гадавіны вызваленьня горада Мінска ад белапалякаў".

Некаторыя беларусы з вышэйшых устаноў паверылі ў бальшавіцкую амністыю, „гуманную палітыку", як гэта называе Вадзім Круталевіч, і вярнуліся на Беларусь, каб „справай даказаць ляяльныя адносіны да новага ладу". Але, як неўзабаве выявілася, людзі гэтыя былі правакацыйна сьцягнуты на Беларусь і зьнішчаны Масквой як „ворагі народу", „нацдэмы", „шпіёны" й т.п. Аб такіх рэчах, на жаль, В. Круталевіч маўчыць.

Таксама, пасьля апошняй вайны, была аб'яўлена амністыя й некаторыя беларусы, што апынуліся на Захадзе, паверылі ў яе й паехалі на „Радзіму". Але замест папасьці на сапраўдную радзіму, папалі ў Казахстан, пад кітайскую граніцу й Бог ведае куды.

У кніжцы В. Круталевіча такія рэчы не ўспамінаюцца й не згадваюцца такія факты, калі ў 1918-1920 гадох Ленін аддаваў Беларусь палякам аж па Бярэзіну. Нават у часе пераможнага паходу Чырвонай Арміі на Варшаву ў 1920 годзе ў тэлеграме Леніна да польскага камуніста Уншліхта гаварылася: „Мы вельмі ўрачыста дэкляруем і гарантуем польскім рабочым і сялянам, што граніца будзе праведзена далей на ўсход ад тае, якую даюць Керзан і Антанта".

Падпісваючы 12 ліпеня 1920 году дагавор зь незалежнай Літвой, Ленін аддаваў ёй Вільню, Аўгустова, Ашмяны, Паставы, Браслаў і Ліду. Аб гэтых падарунках Леніна й ягоных памагатых, якія гандлявалі тэрыторыяй Беларусі, Вадзім Круталевіч таксама маўчыць.

У студзені 1919 году на адным з паседжаньняў Цэнтральнага Бюро КП(б)Б А. Ф. Мясьнікоў прызнаўся: „Мы сперва заявили категорический против республики". Аб гэтым пазьней пісаў В. Г. Кнорын: „І-шы зьезд КП(б)Б у сьнежні 1918 году, абвяшчаючы БССР, перад усім апіраўся на (...) пэрспэктыве перасоўваньня савецкай улады на Захад. (...) Задзіночаньне працоўных масаў Беларусі для далейшага змаганьня за сьветавую пралетарскую рэвалюцыю супраць капіталістаў і памешчыкаў — вось гэта лёзунг і першае заданьне БССР 1 студзеня 1919 г."

Такія вядучыя бальшавіцкія рэвалюцыянеры на Беларусі як Мясьнікоў, Кнорын, Калмановіч і іншыя востра выступалі супраць станаўленьня беларускай савецкай дзяржаўнасьці.

Беларусы няраз пратэставалі супраць палітычных і тэрытарыяльных зьменаў, якія рабілі бальшавікі на Беларусі, выкарыстоўваючы беларускі нацыяналізм дзеля сваіх экспансыўных намераў. Была нават выслана дэлегацыя ў Маскву да Леніна, але ён адмовіў просьбе беларусаў. Беларускі Камісарыят часта падаваў пад рэпрэсіі за тое, што займаецца тэрытарыяльнымі пытаньнямі.

Найбольш непрыемнасьцяў меў Зьмітрок Жылуновіч са сваёю групай за ўпорыстую дзейнасьць. Гэтыя людзі няраз абвінавачваліся як агенты польскага імпэрыялізму, як верхаводы беларускіх нацыяналістаў, ворагі народу, якія пралезьлі ў партыю й т.п. А былі яны ў сапраўднасьці камуністы, але няменш і шчырыя патрыёты, якія абара-

нялі свае нацыянальныя й дзяржаўныя інтарэсы, за што заплацілі сваёй галавой.

Трэба сказаць праўду, што ад пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі камуністычная партыя на чале зь Ленінам не дапушчала беларусаў да кіраўніцтва на Беларусі. Галоўную ролю ўрадаваньня ў ёй выконвалі заўзятыя ворагі беларускасьці: Мясьнікоў — армянін, Кнорын і Ляндэр — патомкі інфляндзкіх немцаў, ды маса расейцаў і палякаў — камуністаў. Гэта былі даверaныя людзі ў Маскве.

І пачынаючы ад прыходу бальшавікоў да ўлады, гэтымі людзьмі, і пасьля іх, вялася прапаганда, што быццам на Беларусі ніколі нічога не было акрамя ўціску, галоты, сьлёз і ўсякага няшчасьця, толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла Беларусь, беларусаў і стварыла ім „незалежную дзяржаву БССР".

Заканчвае сваю кніжку В. Круталевіч так: „Жыцьцё ідзе наперад. Вопыт гісторыі дапамагае больш бачыць сучасныя праблемы й пэрспэктывы далейшага разьвіцьця, ацаніць дасягнутае ў ходзе нацыянальных адносін, недахопы існуючых прававых форм. Публічнасьць, плюралізм думак, супастаўленьне розных пунктаў гледжаньня садзейнічаюць усебаковаму аналізу рэчаіснасьці, пошукам шляхоў пераадоленьня супярэчнасьцей, умацаваньня савецкай фэдэрацыі".

Так, жыцьцё ідзе наперад, галоснасьць ідзе наперад, перабудова, хоць павольна, але ідзе наперад, прызнаючыся да зробленых памылак у мінулым. Толькі каля такіх рэчаў праходзіць глуха Вадзім Круталевіч, быццам яны яго не датычаць. Ён надалей бачыць збаўленьне Беларусі й умацаваньне савецкай фэдэрацыі ў Кастрычніцкай рэвалюцыі, у той рэвалюцыі, якой сьвяткаваньне ў мінулым годзе збайкатавалі некаторыя савецкія рэспублікі, не гаворачы аб іншых дзяржавах савецкага блёку, што ўжо парвалі зь ідэалёгіяй Кастрычніцкай рэвалюцыі. І гэта раней ці пазьней наступіць у Савецкім Саюзе.

Ці шаноўны Круталевіч ня бачыць, што гэтая Кастрычніцкая рэвалюцыя зрабіла з Беларусі расейскую калёнію? „ЛіМ" ад 26 студзеня 1990 году піша: „Чаму ў Беларусі амаль не засталося беларускіх школ? Чаму мы, народжаныя ў Бе-

ларусі, мы, што вучыліся ў тутэйшых школах і ВНУ, ня ведаем сапраўднай гісторыі свайго народа? Колькі такіх пакаленьняў ужо выраслі? Хто вінаваты ва ўсім гэтым?

Круталевіч не надае вялікага значэньня Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі, дзейнасьць якой паслужыла прычынай стварэньня БССР як процівагі БНР. Не было-б БНР, не было-б і БССР. На гэтую тэму пісаў беларус-бальшавік Усевалад Ігнатоўскі: „Сярод разгляду пытаньня выявілася, што беларускае нацыянальнае адраджэньне значна шагнула ўперад за часы рэвалюцыі й нямецкай акупацыі. Трэба ў данай працы партыі не забываць, лічыць патрэбным выявіць нацыянальнае беларускае пытаньне, утварыць грунт для Беларускай Савецкай Рэспублікі".

Таксама В. Круталевіч памінае Лютаўскую рэвалюцыю 1917 году, якая надала новы ход гісторыі Расеі. Тады-ж, якраз, распачалася ажыўленая дзейнасьць нацыянальных меншасьцяў былой царскай імпэрыі. Тады-ж Беларуская сацыялістычная грамада склікала ў сакавіку 1917 году сваю канфэрэнцыю ў Менску, якая выбрала Менскі камітэт. БСГ мела свае прадстаўніцтвы ў Петраградзе, Маскве, Кіеве, Сараташе, Казані, Адэсе, Калузе, Хельсінкі й другіх гарадох Расеі й Беларусі. Дзе былі арганізацыі БСГ, там адбываліся мітынгі, маніфэстацыі беларусаў, якія дамагаліся нацыянальных правоў. А газэта „Грамада" парушала на сваіх старонках аграрныя й нацыянальна-дзяржаўныя пытаньні. Было гэта яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі беларусы ўпэўненым крокам ішлі да самавызначэньня.

Бальшавікі пад лёзунгамі свае прапаганды — „Улада — Саветам!", „Зямля — сялянам", „Мір — народам!" — перахапілі ўладу ў кастрычніку 1917 году й назвалі гэта Кастрычніцкай рэвалюцыяй. Узяўшы ўладу ў свае рукі, бальшавікі ўвялі дыктатуру пралетарыяту, якая спыніла імкненьні беларусаў і другіх народаў былой царскай імпэрыі да свайго самавызначэньня. Аб гэтым найлепш сьведчыць разгон бальшавікамі Першага Ўсебеларускага Кангрэсу ў Менску ў сьнежні 1917 году, які выказаўся за сваю дзяржаўную незалежнасьць. Зьезд быў разагнаны сілай штыкоў бальшавіцкай арміі, а В. Круталевіч піша: „Зьезд быў распушчаны Саўнаркомам Заходняй вобласьці за спробу

ўзурпацыі дзяржаўнай улады. (Зрэшты, магчыма былі й іншыя, больш гібкія меры барацьбы з гэтым выступленьнем)".

18 студзеня 1918 году бальшавікі разагналі дэмакратычна выбраную канстытуанту (парлямант) у Петраградзе за тое, што дэлегаты 5 студзеня таго-ж году адмовілі прызнаць Кастрчніцкі пераварот (рэвалюцыю), савецкую ўладу й яе парадкі. Уведзеная ўлада бальшавікоў не была дэмакратычнай, а была гэта суровая дыктатура, якая жорстка распраўлялася са сваімі праціўнікамі. Першы кіраўнік ЧэКа Фэлікс Дзяржынскі сказаў: „Мы стаім за арганізаваны тэрор. (...) Нашым заданьнем ёсьць змагацца супраць ворагаў Савецкага ўраду й новага парадку. (...) Ворагам мы не акажам міласьці".

Так склалася гісторыя, што ў часе як Першай, так і Другой Сусьветнай вайны, немцы далі беларусам магчымасьць праводзіць сваю нацыянальную дзейнасьць: арганізаваць школьніцтва, выдавецтвы, адміністрацыю, весьці культурную, царкоўную й іншую працу. Хоць быў гэта ваенны час, акупацыя, але ў некаторых выпадках беларусы атрымалі больш магчымасьцяў для свае нацыянальнай актыўнасьці, як яны мелі пры саветах ці паляках. Беларусы выкарыстоўвалі ўсе магчымасьці, каб ажывіць сваю нацыянальную дзейнасьць. Гэта моцна не падабалася савецкай уладзе й яна абвінавачвала беларускіх патрыётаў у здрадзе радзіме й закідала ім розныя недарэчнасьці. Такім парадкам беларускія дзеячы, як у Першую, так і Другую вайну аказаліся „здраднікамі" й „ворагамі народу" й за гэта нямала іх пацярпела, або былі зьнішчаны фізычна.

Яшчэ робяцца пошукі ваенных злачынцаў. Апошнімі гадамі савецкія спэцслужбы адшукалі нямала „праступнікаў", якія, паводле іх слоў, схаваліся ў заходніх краінах і дамагаліся ад мясцовых улад вярнуць іх дзеля пакараньня. Сапраўдны праступнік павінен адказаць за сваё злачынства. Але ці савецкія ўлады адшукалі й пакаралі праступнікаў за Курапаты, Катынь, Парк Чалюскінцаў, Магілёўскія кар'еры й многа другіх магілаў, памардаваных на Беларусі й у другіх мясцох Савецкага Саюзу? Іх быццам яшчэ шукаюць, але да гэтага часу нікога не знайшлі, ня знойдуць і не пакараюць гэтых сапраўдных злачынцаў, што замар-

давалі 40 мільёнаў нявінных людзей. Сёньня папулярна называюць іх ахвярамі сталінскага тэрору, але не адзін Сталін тут вінаваты.

Што праўда, прафэсар В. Круталевіч падае некаторыя падзеі, факты й людзей — дзейнічаючыя асобы, але імі ён асьвятляе толькі адзін бок мэдалю. Многа важных пытаньняў станаўленьня беларускай дзяржаўнасьці, як былі, так і засталіся не выяўленымі сьведама. Таму кніжка доктара юрыдычных навук прафэсара Вадзіма Круталевіча „Станаўленьне дзяржаўнасьці" не выклікае ў чытача асаблівага зацікаўленьня. У ёй не хапае шчырасьці. Сваім характарам, настаўленьнем, кніжачка нагадвае старую песьню неаджытай гамы.

(„Голас Часу" № 2 (5), Лёндан 1990 г.).

Другі Ўсебеларускі Кангрэс, 27 чэрвеня 1944 г.

Набліжаецца 49-я гадавіна Другога Ўсебеларускага Кангрэсу — падзеі, якая моцна дэнэрвуе камуністаў. І каб толькі была гэта адна. Іх дэнэрвуе й Першы Ўсебеларускі Кангрэс 1917 году, які яны разагналі штыхамі, іх дэнэрвуе Акт 25 Сакавіка 1918 году, іх дэнэрвуе Слуцкая Абарона, якую яны здушылі сілай зброі. Праз сваіх нашпігаваных „змагароў за народнае шчасьце", падасланымі чэкістамі была зьліквідавана адна з самых масавых беларускіх арганізацыяў — Беларуская сялянска-работніцкая грамада ў Польшчы ў 1927-1928 гадох. Дык ці-ж можа іх супакоіць Другі Ўсебеларускі Кангрэс, які не ўдалося ім разагнаць?

Для камуністаў Кангрэс гэты не зьяўляецца выяўленьнем волі беларускага народу, якога дэлегаты рэпрэзэнтавалі амаль усю Беларусь, бо паходзілі зь Менскай, Лідзкай, Ганцавіцкай, Навагрудзкай, Слонімскай, Вялейскай, Баранавіцкай, Глыбоцкай, Слуцкай, Берасьцейскай, Бранскай, Гомельскай, Пінскай, Кобрынскай, Гарадзенскай, Магілёўскай, Бабруйскай, Смаленскай, Віцебскай, Барысаўскай, Аршанскай акругаў ды зь Вільні й Віленшчыны.

Усе беларускія народныя выступленьні ў імя свабоды й дзяржаўнай незалежнасьці, з пункту гледжаньня баль-

шавікоў, гэта антынародныя выступленьні нацыяналістаў. Сёньня іхняй мэтай на Беларусі зьяўляецца вярнуць чырвоны сьцяг, савецкі гімн, аднавіць СССР, увесьці адну мову — расейскую, стварыць адзін савецкі народ і ўсім гэтым мае кіраваць, як і раней, камуністычная партыя ў Маскве. Спрачацца зь людзьмі крывавага рэжыму камуністаў — страта часу. Лепш згадаем, што пішуць аб Другім Усебеларускім Кангрэсе, гэтай гістарычнай падзеі, іншыя людзі.

„Улетку 1944 году скліканы ў Менску Другі Ўсебеларускі Кангрэс. 1039 дэлегатаў рэпрэзэнтавалі ўсю Беларусь, як пад нямецкай, так і пад савецкай акупацыяй. Паміма пагрозаў і перасьцярогаў з боку немцаў, Кангрэс пацьвердзіў жаданьне беларускага народу здабыць поўную незалежнасьць, жаданьне выказанае ўжо Першым Усебеларускім Кангрэсам у 1917 годзе.

Дэлегаты аднагалосна заявілі, што беларускі народ не прызнае накінутае яму БССР. Апрача таго, зьвяртаючыся да народаў сьвету, Кангрэс заявіў, што Савецкі Саюз ня мае права вырашаць будучыню Беларусі, ды што ўсе ўмовы, заключаныя Савецкім Саюзам у дачыненьні да Беларусі, ня маюць праўнае важнасьці" („Кароткі агляд гісторыі Беларусі", Кліўленд — Нью-Ёрк — Талін 1990, стар. 87-88).

Падамо яшчэ адно выказваньне, а іх ёсьць многа больш, аб Другім Усебеларускім Кангрэсе, але гэтым разам будуць гэта словы адначасна й былога ўдзельніка Першага Ўсебеларускага Кангрэсу:

„І не дзеля страху перад немцамі, а дзеля любові й адданасьці Беларусі сабраліся ўдзельнікі II-га Кангрэсу ў Менску. І прыйшлі яны нават адтуль, дзе не была нямецкая нага, дзе фактычна ўлада была ў партызанскіх руках; а ішлі яны праз шляхі, адрэзаныя партызанамі. Іх клікала Беларусь і Беларуская Справа. Шмат хто з удзельнікаў гэтага Кангрэсу загінуў у вайну; але дзе-б яны не ляглі — на прасторах далёкай чужыны, або пяскох радзімай зямлі, — іхнія магілы будуць помнікамі гэтых вялікіх дзён нацыянальнага ўздыму. (...)

Паходні, запаленыя 25 Сакавіка, былі данесены верна пакаленьнямі да II-га Ўсебеларускага Кангрэсу й яшчэ раз высака падняты перад усім народам. Яны гараць і разгараюц-

ца. Нашым заданьнем ёсць годна несьці іх у будучыню, якая, я ў гэта моцна й нязломна веру, прывядзе да скліканьня III-га Ўсебеларускага Кангрэсу ўжо ў Вольнай і Незалежнай Беларусі" (Мікола Шыла, „А што далей?", Лёндан 1948).

Ворагі беларускай дзяржаўнасьці бачаць віну Другога Ўсебеларускага Кангрэсу ў тым, што ён адбыўся пад нямецкай акупацыяй. Тут ня важна пад чыёй акупацыяй ён адбыўся, але важна, якія ён вынес пастановы. І гэтым павінны пацікавіцца беларускія культурныя, навуковыя й палітычныя арганізацыі.

Другі Ўсебеларускі Кангрэс быў завяршэньнем пастаноў Першага Ўсебеларускага Кангрэсу й тае нацыянальна-вызвольнай работы, якая вялася пад нямецкай акупацыяй. Дзякуючы гэтай рабоце, беларуская эміграцыя захавала сваю нацыянальную тоеснасьць і не расплылася ў моры чужынцаў, ды праводзіла далей сваю нацыянальна-вызвольную барацьбу за незалежнасьць свае Маці-Беларусі, як праводзілі яе раней беларусы пад расейскай і польскай акупацыямі. Аб гэтым павінны памятаць беларусы на Бацькаўшчыне, каб наступныя 50-я ўгодкі Другога Ўсебеларускага Кангрэсу ўшанаваць годна й гэтым ушанаваць памяць усіх тых, што змагаліся й паміралі, каб жыла незалежная Беларусь!

(„Голас Часу" № 24 (3), Лёндан 1993 г.).

Пяцьдзесят гадоў таму й сёньня

Ніжэй зьмяшчаем рэфэрат, які быў зачытаны на акадэміі 26 чэрвеня г.г. у царкоўнай залі ў Лёндане з нагоды 50-годзьдзя Другога Ўсебеларускага Кангэсу й беларускай дыяспары.

У канцы чэрвеня 1994 году споўніцца 50 гадоў ад тых гістарычных падзеяў, якія ўвайшлі ў гісторыю Беларусі. Падзеі вайны 1941-1944 гадоў на Беларусі аказаліся пераломнымі ў жыцьці нашага народу. Трохгадовая нямецкая акупацыя, хоць была яна жорсткая, але ў першым годзе акупацыі дала беларусам магчымасць закладаць сваё школьніцтва, адміністрацыю, культурныя ўстановы, аднавіць зьнішчанае камуністамі царкоўнае жыцьцё. Але не прайшло многа часу як паявіліся савецкія партызаны й польская Армія Краёва ў Заходняй Беларусі. Партызаны ня толькі грабілі

мясцовае насельніцтва вёсак, але мардавалі беларускіх праваслаўных сьвятароў і ўсіх тых беларусаў, якія прымалі ўдзел у адраджэньні й адбудове свае нацыянальнай годнасьці. Была гэта варожая праява савецкіх і польскіх партызанаў, каб забіць беларускі адраджэнскі рух у яго корані.

У выніку актыўнай дзейнасьці савецкіх партызан і польскай Арміі Краёвай, немцы не маглі справіцца самі й дзеля таго паклікана была больш людзей у беларускую паліцыю. Калі-ж у канцы 1943 году створана была Беларуская Цэнтральная Рада (БЦР), яна абвясьціла мабілізацыю ў Беларускую Краёвую Абарону (БКА) і адкрыла ў Менску Афіцэрскую Школу дзеля падрыхтоўкі будучых камандзіраў. Заданьнем БКА было бараніць сваё насельніцтва ад нападаў і грабяжоў партызанскіх бандаў. Арганізацыя БКА аказалася спозьненай, прыйшоў час адступленьня на Захад.

27 чэрвеня 1944 году ў Менску скліканы быў Другі Ўсебеларускі Кангрэс, у якім прыняло ўдзел 1 039 дэлегатаў зь Беларусі й 16 прадстаўнікоў ад беларускіх арганізацыяў па-за межамі Беларусі. Людзі гэтыя сабраліся ў крытычны час, каб заявіць на ўвесь сьвет, што Беларусь хоча жыць сваім вольным і незалежным дзяржаўным жыцьцём. Прэзыдэнт Другога Ўсебеларускага Кангрэсу Я. Кіпель у сваёй уступнай прамове сказаў:

„Гісторыя на нас усіх усклала ганаровыя й вельмі цяжкія задачы. Мы сабраліся ў надзвычайна адказны гістарычны мамэнт: на ўсім сьвеце ідзе вайна, вырашаецца лёс народаў на доўгія гады. Беларусь цяпер ня можа застацца бязьдзейнай. Мы мусім узяцца за будаўніцтва свае будучыні.

Ад нашага імя дазваляюць гаварыць сабе крамлёўскія заправілы, яны там вызначаюць апекуноў, якія ўжо рыхтуюць шыбеніцы нашаму народу. На нашы землі пратэндуюць польскія паны.

І вось таму ў гэты час мы павінны голасна сказаць усяму сьвету: Хто мы й чаго хочам! (Бурныя воплескі).

Першы раз беларускі народ меў магчымасьць вольна сабрацца тут у Менску, у гэтым будынку, дваццаць шэсьць гадоў таму назад.

Гэта быў Першы Ўсебеларускм Кангрэс. Ён выбраў Раду Кангрэсу, якая ў 1918 годзе, 25 сакавіка, вынесла свае агні-

стыя пастановы аб лёсе Беларусі й беларускага народу. Не спадабаліся пастановы Першага Ўсебеларускага Кангрэсу й ягонай Рады бальшавікам, яны разагналі гэты Кангрэс і на працягу дваццаці шасьцёх гадоў аблівалі яго пастановы ня толькі памыямі й гразёю, а нават крывёю лепшых сыноў нашага народу. Аднак сваімі бруднымі й подлымі ўчынкамі бальшавікі ня здолелі зацьміць пастановы Першага Ўсебеларускага Кангрэсу — яны зіхацяць аж па сёньняшні дзень і вабяць да сябе ўсё лепшае, што ёсьць у беларускім народзе".

Хоць бальшавікі разагналі Першы Ўсебеларускі Кангрэс, які праходзіў у сьнежні 1917 году, але ён усьпеў вынесьці рэзалюцыю аб незалежнасьці Беларусі. А выбраная Рада Беларускай Народнай Рэспублікі абвясьціла Незалежнасьць Беларусі Актам 25 сакавіка 1918 году. Таму Другі Ўсебеларускі Кангрэс вынес пакую пастанову: „Вызначыць правільнай і зноў пацьвердзіць гістарычную пастанову Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, якая маючы паўнамоцтвы Першага Ўсебеларускага Кангрэсу 1917 г., на сваім сходзе 25 сакавіка 1918 г. урачыстай 3-ай Устаўной Граматай вырашыла аб канчатковым разрыве Беларусі з бальшавіцкаю Масквою й расейскай дзяржавай ва ўсіх яе формах".

Зараз пасьля адбыўшагася Другога Ўсебеларускага Кангрэсу многа беларускіх дзеячоў, вайскоўцаў і некаторыя сем'і пакінулі Бацькаўшчыну й выехалі на Захад, каб пазьбегчы прасьледу камуністаў і далей прадаўжаць барацьбу. А тыя беларусы, што засталіся дома, многа хто зь іх прайшоў праз савецкія турмы, лягеры й многа хто не вярнуўся дамоў.

Хоць ваенныя абставіны ў той час былі вельмі цяжкія, аднак дзейнасьць БЦР не адступіла ад абранага гістарычнага шляху барацьбы за свабоду й сувэрэннасьць свае дзяржавы й аб гэтым сьведчаць пастановы Другога Ўсебеларускага Кангрэсу, якія былі скіраваны на барацьбу супраць камунізму й за вызваленьне Беларусі з-пад маскоўскай пагрозы. Таму сёньня шчырыя беларусы павінны аб'ядноўваць свае рады супраць тых сілаў, якія хочуць зноў падпарадкаваць Беларусь пад маскоўскую апеку, якая станецца новым ярмом для нашага народу.

Савецкая прапаганда на працягу гадоў кляйміла й яшчэ кляйміць беларускую эміграцыю, называючы яе „здрад-

нікамі" й „калябарантамі". У час апошняй вайны ня толькі беларусы, але ўсе савецкія рэспублікі, якія, незалежна ад свае волі, апынуліся пад нямецкай акупацыяй, былі калябарантамі, калі не нямецкімі, то бальшавіцкімі. А розьніца паміж Гітлерам і Сталінам не была вялікая, абодва яны былі тыранамі й абодва масава вынішчалі людзей. Але тых беларусаў, што працавалі, няважна пад чыёй акупацыяй, але працавалі ў імя свабоды й незалежнасьці Беларусі, ня можна называць ані здраднікамі, ані калябарантамі. Трэба памятаць, што варункі працы ў час вайны й акупацыі былі абмежававаныя, аднак яны ўзгадавалі рады беларускіх патрыётаў, якія да гэтага часу прадаўжаюць вызвольнае змаганьне. Будучы на эміграцыі 50 гадоў, яны, як прыклад, захавалі сваю родную мову, чаго не сумелі зрабіць бальшавіцкія служакі ў сваёй так званай „незалежнай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы" і гэта відаць сёньня.

Ушаноўваючы 50-я ўгодкі Другога Ўсебеларускага Кангрэсу й масавага беларускага эксодусу на Захад у канцы чэрвеня 1944 году, мы павінны памятаць, што сёньня сярод нас сядзяць беларусы й беларускі, якія пакінулі свой родны дом раней за тых беларусаў, што выехалі ў 1944 годзе. Іх вывезьлі ў мірны час з дому ў 1940 годзе ворганы савецкай бясьпекі й яны зазналі нямала гора й бяды за тых беларусаў, што пакінулі родны дом у 1944 годзе. Розьніца паміж першымі й другімі ёсьць такая, што першым пастукалі ў вокны ці дзьверы ноччу й сказалі: „Собирайся с вещами", а другія не чакалі, калі прыедуць па іх „таварышы" й самі пакінулі родны дом, каб ня зносіць зьдзекаў камуністычнай „свабоды й дэмакратыі" й далей прадаўжаюць барацьбу за вызваленьне свайго народу.

Сёньня Беларусь лічыцца незалежнай дзяржавай, але ёю далей кіруе камуністычная наменклятура, якая ня можа пазбыцца свае старое практыкі. Трэба чакаць, здаецца, яшчэ доўга, калі прыйдзе новае маладое пакаленьне й заступіць гэтых былых камуністаў і палітрукоў, якія выдаюць сябе за дэмакратаў і хочуць яшчэ раз павярнуць кола гісторыі назад.

Усё-ж будзем верыць, што Беларусь будзе Вольнай і Незалежнай Дзяржавай. Аб гэтым сьведчаць у шмат якіх дзяр-

жавах сьвету Беларускія Кансуляты й Амбасады, што мы маем у Лёндане й гэта трэба вітаць.

Мы павінны быць задаволены, што нашая праца на эміграцыі, на працягу 50-ці гадоў не пайшла на марна. Сёньня ўжо ня так лёгка й проста сьцерці з карты Эўропы Беларусь зь яе дзесяцімільённым народам. Беларусь жыла, жыве і будзе жыць як вольная й Незалежная Дзяржава сярод Вольных Народаў сьвету, бо ёсьць гэта права дадзенае Богам.

(„Голас Часу" № 32 (5), Лёндан 1994 г.).

Менск, 27 чэрвеня 1944 года

Беластоцкая „Ніва" (№ 12 за 22 сакавіка 1992 г.) падала такую абвестку:

„Вялікая просьба адгукнуцца тых, хто служыў у БСА (Беларуская самаахова), БКА (Беларуская краёвая абарона), быў членам СБМ (Саюз беларускай моладзі), ці служыў у польскай АК (Армія Краёва), або працаваў у польскіх адміністрацыях на тэрыторыі Беларусі. Зьвяртацца можна па адрасу:

224019, Беларусь, г. Брэст, вул. Валгаградская, 6 — 1,
Адамчык Андрэй".

Таксама „Літаратура і мастацтва" (№ 13 за 27 сакавіка 1992 г.) у артыкуле „Дзень Волі" піша: „Дзень 25 сакавіка нарэшце сьвяткаваўся ў рэспубліцы адкрыта. Але афіцыйным сьвятам гэтая дата пакуль яшча ня прызнана. Магчыма, таму й не знайшлося іншага, больш прасторнага памешканьня для вечарыны".

Апошняя інфармацыя падказала мне ўспомніць яшчэ адну важную гістарычную падзею, якая адбылася 27 чэрвеня 1944 году ў сталіцы Беларусі Менску, але аб ёй мала хто сёньня гаворыць на Беларусі, а я скажу.

Быў прыгожы ціхі летні ранак, калі Афіцэрская школа Беларускай краёвай абароны (БКА) маршыравала да будынку Беларускага гарадзкога тэатру. У гэты дзень, 27 чэрвеня 1944 году, меў у будынку тэатру адбыцца Другі Ўсебеларускі Кангрэс.

Кадэты Афіцэрскай школы трымалі вакол будынку тэатру варту, а Афіцэрскі зьвяз, як ганаровы пачот, стаяў недалёка ўваходу да будынку тэатру, а каля яго — гарадзкі ар-

кестр. Будучы крыху вышэйшага росту, я меў шчасьце стаяць перад фронтам будынку, недалёка ўваходу ў тэатр, які быў упрыгожаны бел-чырвона-белымі сьцягамі й Пагоняй. Я добра бачыў што дзеялася перад будынкам тэатру.

Недзе, каля 8-ае гадзіны раніцы самаходам прыехаў прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады праф. Радаслаў Астроўскі. Капітан Ганаровага зьвязу (прозьвішча не памятаю) здаў прэзыдэнту рапарт і пасьля гэтай цырымоніі людзі пачалі ўваходзіць у будынак тэатру. Сярод гэтай масы народу я бачыў пару знаёмых мне асоб.

Я стаяў на сваім месцы й глядзеў на вулічыны рух гораду. Каля поўдня паказалася сонца. Прыгожа выглядаў дзень. Неспадзявана чутны былі выстралы зэнітак. Недзе высока лятаў савецкі самалёт, але бомбаў не скідаў. Па вуліцы сунуліся нямецкія танкі, немцы сьмяяліся й гаварылі: „Нах гаўзэн" (Дадому). Адступленьне ішло па ўсёй лініі ўсходняга фронту. Стоячы так, я чуў, як час ад часу раздаваліся магутныя воклічы й апладысмэнты, якія даходзілі з залі Кангрэсу. Дзесьці каля гадзіны 5-ай папаўдні курсанты Афіцэрскай школы вярталіся зь песьняй у свае казармы. Гэты важны гістарычны дзень у сталіцы Менску назаўсёды застаецца ў маёй памяці.

Аб Другім Усебеларускім Кангрэсе гаварылася й пісалася многа, а найбольш дрэннага. Яго галоўная „віна" заключалася быццам у тым, што Кангрэс адбыўся пад нямецкай акупацыяй. Але, калі так разважаць сутнасьць справы, дык трэба не забываць, што незалежнасьць Беларусі, прагалошаная Актам 25 Сакавіка 1918 году, таксама адбылася пад нямецкай акупацыяй. Мала гэтага, якраз месяц пасьля прагалошаньня незалежнасьці Беларусі Актам 25 Сакавіка, яе ўрад на чале з Раманам Скірмунтам выслаў сваё подданства імпэратару Вільгельму, дзе было сказана: „Толькі пад абаронай Германскай Імпэрыі бачыць край добрую долю ў будучыні". І на гэта мала хто зьвяртае ўвагу й не паддае ніякай крытыцы. Аднак Другі Ўсебеларускі Кангрэс многа каму не падабаецца й таму варта запытаць саміх сябе: чым быў лепшы Вільгельм ад Гітлера? Ці-ж не абодва яны ішлі на Беларусь з аднолькавымі мэтамі?

Тут няма нічога дзіўнага, што камуністы строга расправіліся з удзельнікамі Другога Ўсебеларускага Кангрэсу, якія

засталіся дома й нямала вылілі памыяў на яго ўдзельнікаў і на сам Кангрэс і гэта яшчэ цяпер робяць некаторыя аўтары на старонках менскай прэсы. А чаму? Мы пабачым далей.

Ня трэба забываць, што 1039 дэлегатаў, якія прыбылі ў Менск на Кангрэс, нягледзячы на замінаваныя дарогі й помсту партызан, былі шчырымі беларускімі патрыётамі. Іх ніхто не змушаў ісьці на Кангрэс і ніхто не вучыў іх што яны маюць на ім гаварыць. І гэтыя людзі не былі нямецкімі памагатымі й не было ўжо ніякай патрэбы памагаць немцам у гэты час, бо-ж відаць было, што немцы вайну прайгралі й як на ўсходнім, так і на заходнім франтох адступалі ў свае межы. Так, што выслугоўвацца перад акупантам не было сэнсу й некаторыя з гэтых дэлегатаў не паехалі ўжо дамоў, а проста падаліся на эміграцыю. Але яны пакінулі важны дакумант, „Рэзалюцыю Другога Кангрэсу", у якой было сказана:

„Другі Ўсебеларускі Кангрэс, сабраўшыся ў Менску праз чвэрць стагодзьдзя пасьля Першага Ўсебеларускага Кангрэсу й выслухаўшы даклады аб падзеях на Беларусі ў часе паміж абодвума кангрэсамі, аднагалосна пастанавіў:

1. Вызнаць правільнай і зноў пацьвердзіць гістарычную пастанову Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, якая маючы паўнамоцтвы Першага Ўсебеларускага Кангрэсу 1917 г., на сваім сходзе 25 сакавіка 1918 г. урачыстай 3-й устаўной Граматай вырашыла аб канчальным разрыве Беларусі з бальшавіцкай Масквою й расейскай дзяржавай ва ўсіх яе формах.

2. Пацьвердзіць, што Беларускі Народ ніколі не прызнаваў, не прызнае цяпер і ніколі не прызнае ў будучыні за форму сваёй беларускай дзяржаўнасьці, накінутыя яму маскоўскімі захопнікамі формы БССР.

3. Паведаміць усе ўрады й народы сьвету, што голас Масквы ў СССР у беларускіх справах ня мае ніякай праўнай сілы, а ўсе створаныя Масквою нібыта беларускія ўрады — ня маюць ніякіх праўных кампэтэнцыяў, бо не вызначаюцца Беларускім Народам.

Таму ўсе ўмовы, ці аднабаковыя пастановы ўрадаў: СССР, былой Польшчы і сучаснага гэтак званага эміграцыйнага ўраду Польшчы, якія датычаць тэрыторыі Беларусі й Беларускага Народу й якія былі зроблены раней, або будуць зроб-

лены ў будучыні, — Другі Ўсебеларускі Кангрэс абвяшчае ня маючымі ніякай праўнай сілы, як ня будуць мець сілы й усякія іншыя магчымыя спробы падзелу Беларусі з боку іншых дзяржаў і народаў" („Другі Ўсебеларускі Кангрэс", Мюнхэн 1954, стар. 67).

Дэлегат Случчанін у сваім выступленьні на Кангрэсе сказаў: „Мы не жадаем нічыёй „апекі", а тым больш „апекі" з боку бальшавіцкай Масквы й панскае Польшчы, якія залілі нашу зямлю сьлязьмі й крывёю. Нашым прыяцелем і саюзьнікам можа быць толькі той, хто дапаможа нам парваць ланцугі векавой няволі й пайсьці шчыльнымі радамі на прастор вольнага й незалежнага жыцьця ў вольнай і незалежнай Беларусі. Усе іншыя намеры ў адносінах да нашае Бацькаўшчыны мы вызнаём варожымі й патрабуючымі адпору" („Другі Ўсебеларускі Кангрэс", стар. 66-67).

Шмат шчырых і патрыятычных прамоваў было сказана ўдзельнікамі Кангрэсу, якія зводзіліся да агульнага назоўніка — Вольная й Незалежная Беларусь. Нечага падобнага мы не знаходзім у працы Першага Ўсебеларускага Кангрэсу й нават у Акце 25 Сакавіка 1918 году.

У сваёй заключной прамове Прэзыдэнт Другога Усебеларускага Кангрэсу сп. Я. Кіпель сказаў:

„Паважаныя Дэлегаты Кангрэсу!

Сёньняшні дзень — гэта вялікі дзень у гісторыі беларускага нацыянальна- вызвольнага руху. Сёньня тут, на Кангрэсе, былі прыняты аднагалосна ўсе найважнейшыя пастановы, патрэбныя для пасьпяховае барацьбы за нацыянальныя ідэалы нашага Народу. Наш Другі Кангрэс ня толькі не адступіўся ад прынцыпаў Першага Кангрэсу, а, наадварот, ён гэтыя прынцыпы яшчэ больш умацаваў і зрабіў іх найбольш дзейнымі. (Моцныя вплескі).

Але ня толькі ў гэтым паважнасьць сёньняшняга дня. Сёньняшні Кангрэс яшчэ важны й тым, што ён нацыянальна беларускі. Гэта значыць, што нацыянальная сьведамасьць нашага народу ўзьнялася вельмі высока. Сёньняшнім сваім актам наш народ давёў усяму сьвету, што ён ня хоча ні маскоўскай, ні польскай апекі. Усе пастановы аб выхадзе з гэтак званага Савецкага Саюзу й аб анулюваньні маскоўска-польскіх дагавораў аб Беларусі, прынята аднагалосна.

(Воплескі). А гэта вельмі важна! Сярод тысячы двухсот чалавек не знайшлося ні аднаго, які-б хацеў звароту бальшавікоў, які-б хацеў паняволеньня польскіх паноў на Беларусі. Бясспрэчна, гэта — воля ўсяго беларускага народу. Наш народ ня хоча ні маскоўскага панаваньня на Беларусі, ні польскага. Сёньняшні дзень давёў усяму сьвету, што ад імя Беларусі ня маюць права гаварыць ні Масква, ні польскія эмігранты ў Лёндане. (Воплескі).

Гаспадары Дэлегаты, калі прыедзеце ў Вашыя гарады, у Вашыя вёскі, дык перадайце ўсё гэта ўсяму беларускаму насельніцтву, няхай яно ня верыць бальшавіцкім чуткам. Што-б не здарылася на сьвеце, але ў нашай барацьбе з бальшавізмам мы пераможам і будзем вольнымі! (Воплескі).

На гэтым дазвольце закончыць Кангрэс.

Жыве Беларусь! (Усе голасна адказваюць: „Жыве Беларусь!" („Другі Ўсебеларускі Кангрэс", Мюнхэн, 1954 г,. стар. 69).

Апынуўшыся на эміграцыі, сярод беларускай інтэлігенцыі пачаліся прыкрыя рэчы. Некаторыя актыўныя ўдзельнікі Другога Ўсебеларускага Кангрэсу, з прычын палітычнай кан'юнктуры, пачалі пакідаць БЦР і аднаўляць БНР з тэстамэнтовым прэзыдэнтам Міколам Абрамчыкам. Людзі гэтыя разьлічвалі няменш і на свае матэрыяльныя карыcьці. Аднак, як бачым з пратаколаў, Другі Ўсебеларускі Кангрэс ня быў супраць БНР, а нават адабрыў і папоўніў некаторыя яго пастановы.

На Кангрэсе былі згаданыя прозьвішчы тварцоў Першага Ўсебеларускага Кангрэсу ў 1917 годзе, якіх не было ўжо ў жывых. Іхнюю памяць прысутныя ўшанавалі, устаўшы, хвілінай цішыні. Многа каго зь іх бальшавікі замучылі ў турмах, лягерох сьмерці, або забілі. Былі на Другім Кангрэсе й уцалелыя ўдзельнікі Першага Кангрэсу й іх запрасілі ў Прэзыдыюм Кангрэсу.

Нельга нэгаваць той факт, што хоць ішла страшная вайна й Беларусь была акупавана немцамі, але гэты вораг даў беларусам магчымасьць адрадзіць сваю нацыянальную сьвядомасьць, сваю нацыянальную ідэю, сваю нацыянальную годнасьць. Беларускія школы, беларуская адміністрацыя, беларуская прэса, Беларуская Праваслаўная царква, паліцыя, арганізацыя сваёй нацыянальнай арміі й т.п. І ўсё гэта вя-

лося на беларускай мове. Праўда, ня ўсё ішло спраўна. Час быў ваенны. Але за тры гады нямецкай акупацыі беларусы зрабілі больш нацыянальнага як сёньняшні Вярхоўны Савет у сваёй незалежнай дзяржаве — Рэспубліцы Беларусь. Зараз па вушы ён у расейшчыне, ніяк ня можа яе пазбыцца, а аб сваёй арміі мала хто клапоціцца.

Пастановы Другога Ўсебеларускага Кангрэсу й нацыянальны ўздым былі зьнішчаны камуністычным насільлем сталінскіх сатрапаў і многія на Бацькаўшчыне, да гэтага часу, жывуць ашаломленыя варожай прапагандай у нацыянальнай несьвядомасьці.

І каму падабаецца ці не падабаецца, Другі Ўсебеларускі Кангрэс усё-ж такі быў важнай падзеяй гістарычнага значэньня. Ягоныя дамаганьні й пастановы сьведчаць самі за сябе. Яны былі скіраваны ў аднам напрамку — незалежная ад нікога Беларусь. І будзе вельмі прыкра, калі беларусы на Бацькаўшчыне не ўшануюць 50-я ўгодкі Другога Ўсебеларускага Кангрэсу й яго барацьбітоў, што змагаліся й паміралі за Вольнасьць і Незалежнасьць свае Маці-Беларусі. У вольнай Беларусі Другі Ўсебеларускі Кангрэс павінен займаць сваё пачэснае месца як навочны прыклад бескампраміснага змаганьня беларускіх патрыётаў за сваю дзяржаўную незалежнасьць.

(„Голас Часу" № 19 (4), Лёндан, 1992 г.)

Галоснасьць галосіць, а ўлада тармозіць

Беларускі народ, так як і кожны іншы, мае сваю багатую гісторыю. Гісторыя яго своеасаблівая. Яна розьніцца ад другіх народаў тым, што беларускі народ на працягу доўгіх і цяжкіх стагодзьдзяў вядзе барацьбу за сваё сацыяльнае вызваленьне, за сваю дзяржаўную незалежнасьць.

Першая Сусьветная вайна не прынесла Беларусі дзяржаўнай незалежнасьці. Пасьля нямецкай акупацыі, у 1919-1920 гадох на тэрыторыі Беларусі ішла вайна паміж палякамі й бальшавікамі, якія Беларускай Народнай Рэспубліцы не далі магчымасьці стаць на ногі, толькі падзялілі Беларусь Рыжскім трактатам.

Як жылі беларусы пад Польшчай, гэтым разам мы памінём, а скажам, што пад уладай саветаў бальшавікі пусьцілі ў ход сваю прапаганду, што беларускі народ атрымаў свабоду на разьвіцьцё свайго культурнага й нацыянальнага жыцьця ў сваёй „незалежнай і сувэрэннай дзяржаве БССР".

Што праўда, на пачатку 20-х гадоў пры савецкай уладзе на Беларусі праводзілася шырокая культурная, навуковая й нацыянальная работа, як гэта папулярна казалі — будуецца Беларускі Дом. Па словах Аляксандра Крывіцкага беларуская нацыянальная справа выглядала так:

„У Савецкай Беларусі мова нашага народу ў яе літаратурным выглядзе была абвешчана дзяржаўнай мовай разам з рускай і іншымі пашыранымі тады ў рэспубліцы мовамі („Дэкляцыя аб абвяшчэньні незалежнасьці ССРБ" ад 1 ліпеня 1920 года). Ужываньне яе стала ня толькі практычнай неабходнасьцю, але нават абавязкам у грамадзкіх вусных і пісьмовых зносінах (працэс так званай „беларусізацыі"). Беларуская літаратурная мова загучала ў дзяржаўных і культурных установах рэспублікі, у школах, на вуліцах і плошчах нашых гарадоў і ў сялянскіх клубах з вуснаў беларускіх партыйных, грамадзкіх і культурных дзеячоў, вучоных, дзяржаўных і гаспадарчых работнікаў. Створаны былі беларускія выдавецтвы, пачалі друкавацца масавымі тыражамі газэты, часопісы, кнігі й брашуры на роднай мове. На працягу 1924-1928 гадоў выйшла ў сьвет 875 розных па назве кніг, а ў 1931 годзе — 1 300 кніжак" („У рытме з разьвіцьцём мовы", Менск 1976, с. 23).

У рэзалюцыі XII зьезду РКП(б) у прыватнасьці падкрэсьлівалася неабходнасьць таго, каб: „д) органы нацыянальных рэспублік і абласьцей будаваліся пераважна зь людзей мясцовых, якія ведаюць мову, быт, норавы й звычаі адпаведных народаў; е) былі выдадзены спэцыяльныя законы, што забясьпечваюць ужываньне роднай мовы ва ўсіх дзяржаўных органах і ва ўсіх установах..."

Каб зрабіць беларускую мову заканадаўчай, яна была замацавана ў 22 артыкуле Канстытуцыі БССР 1927 году, які гаварыў: „Дзякуючы значнай перавазе ў Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспубліцы насельніцтва беларускай нацыянальнасьці, беларуская мова выбіраецца як мова пе-

раважная для зносін паміж дзяржаўнымі, прафэсіянальнымі й грамадзкімі ўстановамі й арганізацыямі".

На пачатку 30-х гадоў наступае круты паварот. Пад маскай нацдэмаўшчыны, якая быццам хацела адарваць БССР, ды розных закідаў шпіянажу, сабатажу й т.п. пачынаецца наступ на беларускія ўстановы. Масава ліквідуюцца беларускія навуковыя кадры, інтэлігенцыя, ды нават сялянства залічаецца да „ворагаў народу" й такім правам і парадкам Савецкая Беларусь вяртаецца да старой сыстэматычнай русыфікацыі.

Заслужаны пісьменьнік Васіль Быкаў піша: „Беларуская мова, якая нядаўна квітнела ў гарадох, пачала вянуць навідавоку, жалезным памялом яе вымяталі з устаноў, ВНУ, Акадэміі навук, арганізацый і органаў улады. Права карыстацца ёю заставалася за некалькімі газэтамі, двума тэатрамі ды Саюзам пісьменьнікаў, які перад вайной скараціўся да двух дзесяткаў членаў. Астатнія былі зьнішчаны або знаходзіліся ў лягерох на ўсходзе краіны..."

Артыкул Канстытуцыі БССР наконт прызнаньня дзяржаўнасьці беларускай мове быў заменены такім чынам, што беларуская мова зь яго была выключана. І гэты сумны выпадак адбыўся на сэсіі Вярхоўнага Савету Беларусі пры маўклівым удзеле дэпутатаў-пісьменьнікаў пад старшынством народнага пісьменьніка рэспублікі" („Літаратура і мастацтва", 25 сакавіка1988 г.).

У 1934 годзе выйшаў „Правапіс беларускай мовы" й, як падае А. Крывіцкі, „ён быў прызначаны й накіраваны на замацаваньне й стабілізацыю ня толькі правапіснага, але й у пэўнай меры фанэтыка-граматычнага адзінства ў межах беларускай літаратурнай мовы з улікам цеснай сувязі яе ў сваім разьвіцьці з рускай літаратурнай мовай й мовамі іншых народаў Савецкага Саюзу (падкрэсьлена мною — Ю. В.).

Як ішлі гады, некалькі разоў мяняўся беларускі правапіс так, каб беларускую мову падвесьці да рускай. А Канстытуцыя БССР пры кожнай нагодзе пазбаўляла ўсё беларускае. І, як піша Леанід Лыч, доктар гістарычных навук, „у Канстытуцыі БССР 1978 году пра беларускую мову згадваецца толькі два разы. Сказана, што ўжываецца ў судаводзтве й што на ёй напісаны словы „Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!" на чырвонай стужцы гэрба. Ніякіх сацыяльных гарантый па ахо-

ве беларускай мовы Канстытуцыя БССР не дала яе носьбітам. Відаць, складальнікі аснаўнога закону рэспублікі добра „прадбачылі" хуткі непазьбежны скон беларускай мовы й таму палічылі за лепшае ўхіліцца ад прамой пастаноўкі праблемы" („Літаратура і мастацтва", 28 красавіка 1989 г.).

І так заглухла беларусізацыя. Мову карэннай нацыі ня толькі вывелі са штодзённага ўжытку ў рэспубліцы, але зьнікла яна й са слоўніка. Яе разглядалі як небясьпечную праяву „нацыяналізму" і прасьледавалі тых, хто адважыўся выступіць у абароне свае нацыянальнае культуры. Такім „дэмакратычным" парадкам беларускае нацыянальнае, культурнае й навуковае жыцьцё ў „незалежнай і сувэрэннай дзяржаве БССР" падразалася ў самым корані й паступова засыхала.

Як піша доктар гістарычных навук М. Біч, „гэта спрыяла шырокаму распаўсюджаньню ўяўленьняў пра беларускую мову й культуру як нешта адсталае, спэцыфічна „вясковае", ад чаго кожнаму трэба як найхутчэй пазбаўляцца, каб стаць „перадавым" чалавекам. Фальшывы стэрэатып, комплекс непаўнацэннасьці стаў масавай зьявай, і многія, вельмі многія беларусы пачалі выракацца сваёй мовы, нацыянальнай культуры, звычаяў і традыцый, адрывацца ад тысячагадовага кораня народа, ад дзесяткаў пакаленьняў сваіх невядомых продкаў — стваральнікаў беларускай мовы й культуры. Гэта ў цэлым нельга ацаніць інакш як адрачэньне дзяцей ад бацькоў" („Настаўніцкая газета", 25 сакавіка 1989 года).

Дастаткова прачытаць кніжку Алега Бембеля „Роднае слова й маральна-эстэтычны прагрэс" (Лёндан 1985), каб пераканацца, у якім катастрафічным стане апынулася беларуская мова зь яе школай пры савецкай уладзе. У гэтай кнізе адзін мастак-беларус пытае й адначасна дае адказ: „Што такое мова?... Гэта сувязь з асяродзьдзем... Нараджаецца чалавек — і толькі праз мову ён зьвязваецца са сьветам. А на чужой мове парушаецца гэтая пасьлядоўнасьць, гарманічнае разьвіцьцё... Тое самае атрымліваецца цяпер з маім дзіцём: кожны дзень з садзіка прыходзіць маленькі вораг нацыянальнай культуры".

Адзін бацька пісаў у газэту: „Чаму я, каб аддаць сваю дачку вучыцца ў беларускі кляс, павінен пісаць заяву, агітаваць іншых бацькоў пісаць такія-ж заявы? Гэта было-б

зразумела, калі-б я жыў, скажам, у Расеі. А гэта-ж робіцца ў Беларусі. Такое становішча — абраза для любога нацыянальна сьвядомага чалавека".

Апошніх пару гадоў у СССР наступілі зьмены. Зьявіліся галоснасьць і перабудова. У савецкай прэсе можна знайсьці многа крытычных артыкулаў адносна мінулага сацыяльнага, культурнага, палітычнага й гаспадарчага стану савецкіх рэспублік. Многа піша беларуская прэса ў краі аб занядбаным стане беларускай мовы й беларускага школьніцтва ў БССР. Пачуўшы подых свабоды, верныя сыны свае краіны: паэты, пісьменьнікі, настаўнікі беларускай мовы, мастакі розных прафэсіяў, навуковыя працаўнікі й усе тыя, каму дарагая Беларусь, паднялі свой голас у абароне роднай мовы, каб вярнуць ёй дзяржаўныя правы, якімі яна карысталася на пачатку 20-х гадоў савецкай улады. Для прыкладу прывядзём выказваньні доктара гістарычных навук Леаніда Лыча ў тым жа нумары „Літаратуры і мастацтва":

„Насьпеў час выкласьці й давесьці з дапамогай усіх сродкаў масавай інфармацыі да ведама народа навукова абгрунтаваную праграму адраджэньня й канстытуцыйнай гарантаванасьці далейшага бясьпечнага функцыяніраваньня беларускай мовы ў якасьці дзяржаўнай на сваёй спрадвечнай тэрыторыі. Адказным партыйным і савецкім работнікам, адпаведным прафэсійным групам вучоных і творчай інтэлігенцыі рэспублікі ёсьць цяпер што вывучаць і пераймаць з вопыту моўнага будаўніцтва ў рэспубліках Прыбалтыкі, Закаўказьзя, Малдаўскай ССР, дзе ўжо распрацаваны функцыі рускай мовы як сродку міжнацыянальных зносін і моў найбольш шматлікіх іншанацыянальных зносін і моў найбольш шматлікіх іншанацыянальных груп. Агульным для саюзных рэспублік зазначаных рэгіёнаў зьяўляецца наданьне сваім нацыянальным мовам статусу дзяржаўных. Гэты прынцып ня можа не ўзяць на ўзбраеньне й Беларуская ССР як сувэрэннае дзяржаўнае фарміраваньне...

Каля 50 гадоў таму назад мо хто й верыў, што можна нейкім чынам захаваць, не даць памерці беларускай мове, пазбаўленай статусу дзяржаўнай, дык набыты за гэты час горкі вопыт поўнасьцю разьвейвае такія ілюзіі. Я не магу назваць аніводнай мовы, над якой не вісеў-бы дамоклаў меч

пасьля таго, як яна перастала быць афіцыйнай, дзяржаўнай. Захаваць беларускую мову магчыма толькі наданьнем ёй такіх функцый. Альтэрнатыва дзяржаўнасьці не існуе ў гістарычнай практыцы чалавека, ня могуць быць выключэньнем з гэтай заканамернасьці й беларусы. І таму той, хто выступае супраць увядзеньня іх моў у ранг дзяржаўнай, жадае таго ці не, па сутнасьці садзейнічае яе заняпаду, уступае ў супярэчнасьць зь інтарэсамі духоўнага разьвіцьця беларускай нацыі, не адчувае сваёй адказнасьці перад будучымі пакаленьнямі".

За апошніх пару гадоў многа было сказана й напісана на тэму беларускай мовы й беларускага нацыянальнага жыцьця ў БССР і ня так многа што зроблена ў іхнім ажыцьцяўленьні ад часу перабудовы. Зьявілася вялікая апазыцыя — бюракраты, якія тармозяць дэмакратычныя пачынаньні беларусаў „звацца людзьмі", як пісаў Янка Купала. Не адзін беларускі мітынг, не адна беларуская маніфэстацыя былі апошнім часам спаралізаваны мясцовымі ўладамі пры дапамозе войска й міліцыі, якія прымянялі дубінкі, газ і другія меры, каб не дапусьціць беларусаў ушанаваць памяць нават памерлых. Міліцыя, замест глядзець парадку, прымяняла фізычныя меры пабояў пікетчыкаў і то дарогай подступу. У такіх вось абставінах добрыя намеры часта пакідаюць па сабе сьлед старых сумных успамінаў.

Як першы раз у палове студзеня г.г., так і гэтым разам беларуская вядучая інтэлігенцыя й палітычныя дзеячы хацелі правесьці свой кангрэс у сваёй сталіцы — Менску. Аб іх захадах згадвае ангельская газэта „Гардыян" ад 26 чэрвеня 1989 году. Супраць кангрэсу выступілі партыйныя ворганы гораду на чале зь Яфрэмам Сакаловым, якія адмовілі даць беларусам дазвол на правядзеньне кангрэсу. Яны нават зьвярнуліся да другіх рэспублік, каб не дазволілі беларусам правесьці свой кангрэс. Аднак літоўцы, як першы раз у палове студзеня, так і гэтым разам далі беларусам залю на правядзеньне свайго беларускага кангрэсу ў Вільні, на які зьехалася больш за 360 дэлегатаў. Кангрэс, які праходзіў пад Пагоняй і бел-чырвона-белым сьцягам, мае на мэце „ўстанавіць народную ўладу й адрадзіць беларускую нацыю".

У гэтай дзейнасьці, як бачым, беларусаў падтрымоўваюць літоўцы. А падтрымоўваюць таму, што лідэры Камуністычнай партыі Літвы сталі ў абароне сваіх нацыянальных правоў, на што не здабыліся лідэры Камуністычнай партыі Беларусі.

Нават газэта „Правда" выступіла з крытыкай партыйнага кіраўніцтва Беларусі, якое не дазволіла Беларускаму народнаму фронту правесьці свой кангрэс у Менску, у сваёй сталіцы, а змусіла яго на выгнаньне.

Як гэта прыкра й сорамна, што ў гэтым антыбеларускім руху прымаюць удзел некаторыя беларусы, каб перашкодзіць перабудове. Яны маюць адвагу выступаць вусна й пісьмова супраць заслужаных дзеячоў культуры. Чытаючы ў прэсе пра такіх дэмагогаў, робіцца дзіўна, сорамна й страшна, што яны хочуць пасунуць гадзіньнік узад, схаваць страшнае мінулае ад народу. Наяўнасьць такіх людзей у грамадзтве спрычыняе вялікую шкоду нацыянальнай сьвядомасьці й культуры беларусаў.

Будзем спадзявацца, што беларускі народ, а перад усім яго вядучая інтэлігенцыя, выкарыстаюць спрыяльныя абставіны й прыложаць усе стараньні, каб вярнуць беларускаму народу яго родную мову.

Цяжкое й складанае заданьне выпала на долю беларусаў у гэты гістарычны час. Іх чакае высакародная праца, якая павінна стацца нашым сьвятым абавязкам. А ў першую чаргу гэта ёсьць сьвяты абавязак дзяржаўных ворганаў, калі яны выступаюць ад імя беларускай нацыянальнасьці.

(„Голас Часу" № 1, Лёндан 1989 г.)

Яшчэ адно выданьне

У выдавецтве „Мастацкая літаратура" зьявілася ў 1991 годзе даволі цікавя кніжка „З гісторыяй на «вы»". Гэта збор важнейшых апублікаваных артыкулаў 80-х гадоў, якія былі напісаны ў часе г.зв. галоснасьці. Тады якраз пачалі адзывацца галасы некаторых беларусаў на старонках прэсы, мэтай якіх было паказаць сутнасьць трагічнай гісторыі Беларусі, якая да гэтага часу знаходзілася пад кантролем вялікадзяржаўнай палітыкі цароў, а пасьля камуністаў.

Некаторыя аўтары гэтых выбраных навуковых артыкулаў падпісваюцца дактарамі або кандыдатамі гістарычных навук. Як бачым, ёсьць гэта спэцыялісты свае справы, якія парушаюць, выкрываюць і запаўняюць, як сказана ў кнізе, „белыя плямы" мінулага, узаемадачыненьні літаратараў і прафэсійных гісторыкаў, нацыянальную сімволіку й іншыя праблемы вяртаньня беларусам іх гістарычнай памяці.

Чытаючы гэтую кнігу кідаецца ў вочы яе аднабаковая арыентацыя, падборка такіх артыкулаў, якія паказваюць, што быццам усе няшчасьці й крыўды, якія прывялі наш народ да заняпаду, зьяўляюцца віной царызму й камунізму. У гэтым мае заключацца ўвесь трагізм сёньняшняй нашай адсталасьці.

Аднак пакуль да Масквы ці Петраграду, то ўжо намнога раней прыйшла няменшая, але намнога большая бяда й няшчасьце для нашага народу з Кракава й Варшавы. Але аб стане беларускай культуры ў той час ніводзін аўтар нічога ня піша, а нават у некаторых зь іх адчуваюцца сымпатыі да польскіх парадкаў на Беларусі. Быццам беларуская мова мела нейкі шанс прадаўжаць сваё існаваньне, а паўстаньні Касьцюшкі й Каліноўскага мелі, быццам, прынесьці свабоду беларусам.

Пакуль да расейскай акупацыі Беларусі царызмам, то беларуская мова ў яе, культура былі ўжо настолькі прыбітыя палякамі, што не відаць было для іх паратунку. Так, што царызму мала што засталося, каб канчаткова пахаваць пытаньне беларусаў і Беларусі.

Асабліва многа крытычных заўваг накіроўваюць аўтары ў сваіх артыкулах на перыяд русыфікацыі Беларусі апошніх дэкадаў савецкай улады. І гэта праўда. Аднак, хоць камуністы імкнуліся да зьліцьця ўсіх нацыяў і моваў Савецкага Саюзу ў адну расейскую мову й адну расейскую культуру, каб стварыць такім парадкам адзін савецкі народ, усёж беларуская мова захавалася ў прэсе да апошняга часу. Але ніводзін гісторык не палічыў патрэбным, каб напісаць, якім спосабам палякі сумелі за 20 гадоў свае дзяржаўнай незалежнасьці зьліквідаваць усе беларускія школы, якія былі заснаваны беларусамі ў Заходняй Беларусі пад нямецкай акупацыяй у часе Першай Сусьветнай вайны, зачыніць усе

беларускія выдавецтвы й спыніць беларускае культурнае жыцьцё? Калі-ж у апошніх гадах незалежнай Польшчы выйшла нейкае беларускае выданьне ў Вільні, то быў гэта „голас плачучага ў пустыні".

Як другі факт, кніжка „З гісторыяй на «вы»", мела-б большую вартасьць, каб у ёй адзін артыкул не абражаў годнасьць беларусаў у часе апошняй акупацыі Беларусі немцамі. На 348 старонцы чытаем: „Нават такія фармацыі, як Беларуская краёвая абарона, створаная ў студзені 1944 года, узьнікалі шляхам прымусовай мабілізацыі пад пагрозаю расстрэлу. Бралі ў БКА сілай — акружалі вёску й хапалі ўсіх годных. Людзі разьбягаліся па лясох, хаваліся ад фашыстаў дзе толькі можна. Засталіся ў БКА прафэсійныя злодзеі, забойцы й жменька здраднікаў".

Ці-ж ня ёсьць гэта стары камуністычны фабрыкат прапаганды? І гэтых „прафэсійных злодзеяў, забойцаў і жменька здраднікаў" сабралася аж 47 батальёнаў БКА, для якіх заснавана была Афіцэрская школа ў Менску. Жаўнеры БКА насілі свае беларускія нацыянальныя эмблемы й праходзілі беларускую каманду. У БКА не было „злодзеяў, забойцаў і здраднікаў", а былі былыя афіцэры-беларусы з царскай, савецкай і польскай арміяў, ды тры роты маладых кадэтаў зь сярэдняй асьветай. БКА было зародкам беларускага нацыянальнага войска й у сваёй песьні яны сьпявалі:

Ідуць жаўнеры-беларусы праз вёскі, сёлы, гарады,
Перамагаць усе прымусы, што нас гнятлі вякі-гады.
Сьцяг бел-чырвона-белы вольны ў сэрцы кожнага із іх,
Жаўнер Краёвай Абароны на варце стаў правоў сваіх.

Лёгка абражаць БКА, але як выглядае сёньня справа беларускага войска ў сваёй незалежнай дзяржаве ў параўнаньні да іншых былых рэспублік? Ці-ж ня сорам нам, беларусам, што апынуліся ў хвасьце? Нават ангельская газэта „Ді Дэйлі Тэлеграф" ад 23 сьнежня 1991 г. пісала: „Дзесяцімільённы беларускі народ зьяўляецца найбольш баязьлівым за другія славянскія рэспублікі". І няраз другія ангельскія газэты й тэлевізія падкрэсьлівалі, што Беларусь зьяўляецца найбольш камуністычнай рэспублікай.

На гэту тэму можна многа сказаць і прывесьці шматлікія факты дактарам гістарычных навук за іхнія працы па гісторыі Беларусі й тыя абразы, якія яны, падобна другім навукоўцам і літаратарам, прыпісвалі некаторым беларускім эмігрантам за іхняе супрацоўніцтва з акупантам. Але ці час нам сёньня гэтым займацца?

Тут трэба адно памятаць, што якая гэта не была-б акупацыя й дзе-б яна не была, аднак у краі павінен быць парадак і гэты парадак найлепш могуць утрымаць мясцовыя людзі. І ў дадзеным выпадку абставіны вымагалі супрацоўніцтва з акупантам. Гэта было ня толькі на Беларусі, але на ўсіх кантынэнтах сьвету спакон вякоў.

Эміграцыя беларусаў пачалася стагодзьдзі таму, але дзеб беларусы не паехалі, там яны расплыліся сярод расейцаў або палякаў, ды іншых народаў і па іх загінуў сьлед. Але эміграцыя беларусаў перыяду Другой Сусьветнай вайны на Захад не рассыпалася сярод чужынцаў, а захавала сваю нацыянальную годнасьць і нацыянальны гонар, і гэта дзякуючы толькі таму, што яна атрымала нацыянальнае пачуцьцё, нацыянальную сьвядомасьць у часе нямецкай акупацыі Беларусі. Тады якраз створана было беларускае школьніцтва, адміністрацыя й іншыя ворганы ўнутранага парадку. Гэтага нашы людзі не маглі атрымаць пад Польшчай і апошнім часам у БССР.

Што праўда, немцы не прыйшлі вызваліць Беларусь ад камунізму й даць ёй дзяржаўную незалежнасьць. Яны прыйшлі як заваёўнікі са сваёй мэтай і ў такіх абставінах прыходзілася беларускай інтэлігенцыі працаваць і выкрыстоўваць усё магчымае для свае справы, каб падняць нацыянальную сьвядомасьць у народзе. Ня ўсе беларусы ішлі ў сталінскія партызаны, але сярод беларусаў існаваў арганізаваны рух супраціву, як супраць камунізму, так і супраць немцаў.

Ня так лёгка давалі немцы беларусам магчымасьць на праводжаньне свае нацыянальнай работы. Няраз прыходзілася іх прасіць, каб уратаваць народ ад вонкавых небясьпек з боку правакацыі савецкіх партызанаў, ад якіх найбольш цярпела беларускае сялянства. Палякі самі лезьлі да немцаў у супрацоўніцтва, каб пад іхняй апекай вынішчаць беларускую інтэлігенцыю, якой яны зьнішчылі нямала.

І яшчэ на 349 старонцы чытаем: „За тыдзень да вызваленьня сталіцы Беларусі 27 чэрвеня 1944 году была разыграна камэдыя па скліканьні „Ўсебеларускага Кангрэсу".

Была гэта не камэдыя, а трагедыя. На Кангрэс зьявілася дабравольна 1 039 дэлегатаў, якія сказалі сваё слова й некаторыя зь іх не паехалі ўжо дамоў, а паехалі з Кангрэсу на эміграцыю. А сказалі дэлегаты на Кангрэсе 27 чэрвеня 1944 году тое, што было сказана блізка 48 гадоў пазьней — 8 сьнежня 1991 году ў Белавежы. А менавіта, у 2-ім пункце пастановы Ўсебеларускага Кангрэсу было сказана: „Пацьвердзіць, што Беларускі Народ не прызнаваў, не прызнае й ніколі не прызнае ў будучыні за форму сваёй беларускай дзяржаўнасьці, накіненую яму маскоўскімі захопнікамі форму БССР".

Так гэта выглядала супрацоўніцтва беларусаў з акупантамі ў часе Другой Сусьветнай вайны. Як сказаў у свой час Антон Луцкевіч, „пайду з тымі, хто ў сучасны момант можа дапамагчы".

(„Голас Часу" № 17 (2), Лёндан, 1992 г.).

„Таварыш" ці „спадар"? І „Жыве Беларусь!"

Член-карэспандэнт АН Беларусі Аркадзь Жураўскі ў артыкуле „Таварыш" ці „спадар"? („Беларуская думка" № 5 ад 1994 г.) разглядае паходжаньне слова „спадар". І нельга сказаць, каб прыведзеныя ім гістарычныя даныя былі малаверагоднымі. І ўсё было-б вельмі добра, каб аўтар затрымаўся на сваіх навуковых тэзісах і прайшоў міма каля тых людзей, якія, незалежна ад свае волі, апынуліся пад нямецкай акупацыяй.

Зусім слушна заўважае паважаны А. Жураўскі, што слова „спадар" зьявілася на Беларусі ў час нямецкай акупацыі. Але ня можна сказаць, каб гэтае слова ўпала зь неба, або яго высмактаў з пальца Янка Станкевіч. Як аўтар сам заўважае, слова „спадар" спатыкалася ў беларускай мове стагодзьдзі таму й не заўсёды мела яно адно значэньне. Але ёсьць і такі сказ: „З усіх прыведзеных аўтарам прыкладаў толькі „спадар" з Баркулабаўскага летапісу сапраўды мае значэньне ветлівага зва-

роту". І гэты адзіны прыклад, як заўважае аўтар, „зусім недастатковы, каб сьцьвярджаць, што ў старабеларускай мове слова „спадар", „спадарыня" й „спадарства" былі асноўнымі ветлівымі зваротамі. І тут нельга спрачацца. Аднак член-карэспадэнт АН не прызнае слова „спадар" за ветлівы зварот да людзей, таму будзем зьвяртацца да яго „таварыш".

Няраз у гісторыі Беларусі прыводзіліся агульнавядомыя прыклады ўжываньня звароту „гаспадар". Напрыклад, гаспадар Вялікага Княства Літоўскага; гаспадаром называлі чалавека, які меў кавалак зямлі; гаспадаром называлі чалавека, які меў свой дом і быў гаспадаром дому. Але, у даным выпадку, як ветліва зьвяртацца да чалавека, які нічога ня мае? Таксама „гаспадар"? Ці лепш было-б зваць яго „батрак", „пралетар" альбо „таварыш", хоць у беларускай мове, як заўважыў таварыш А. Жураўскі, маецца ветлівы зварот „грамадзянін", але гэтым словам мала хто карыстаецца.

У беларускай мове ўжываўся зварот „пан". У старадаўніх беларускіх дакумантах спатыкаецца зварот „паны — Рады". Але слова „пан", „паны" нагадваюць беларусам абшарнікаў, прыгнятальнікаў, ад якіх прыходзілася цярпець. Дык ці варта такім словам карыстацца беларусам? А да таго гэта палянізм, хоць зваротам „пан" карыстаюцца нашы суседзі ўкраінцы.

Не заўсёды мы, беларусы, і ня толькі мы, карыстаемся словамі, якія маюць, так сказаць, свой айчынны корань, але й словамі чужога паходжаньня. Няма на сьвеце чыстай мовы й таму слова „спадар" ня ёсьць нам чужым, яно спатыкалася ў беларускім пісьменстве й няма ніякай патрэбы, каб яго выкінуць таму, што некаму яно не падабаецца. А што слова „спадар" мела іншае значэньне, дык у кожнай мове ёсьць словы, якія абазначаюць многа чаго іншага. Само слова „спадар" прыемна гучыць і мае сваё акрэсьленае значэньне, як ветлівы зварот да кожнага чалавека, незалежна ад яго палітычных перакананьняў і эканамічнага стану.

Словам „спадар" беларусы пачалі карыстацца ў вайну таму, што слова „таварыш" уведзенае было бальшавікамі й ім карыстацца было не на часе. Таксама й слова „пан", як ужо згадвалася, зьяўлялася палянізмам і да яго не зусім прыязна ставіліся беларусы. Таму прыняты былі звароты „спа-

дар", „спадарыня" й „спадарства", якія паступова прымаліся й пашыраліся на Беларусі ў час нямецкай акупацыі, а пазней карысталіся імі беларусы на эміграцыі.

Аднак і на эміграцыі былі выняткі, якія не зусім прыхільна ставіліся да слова „спадар". Зьяўляліся артыкулы ў прэсе, дзе разглядалася паходжаньне й значэньне слова „спадар" і „гаспадар". Янка Станкевіч, які ўвёў слова „спадар", апынуўся пад абстрэлам. Шмат беларускіх дзеячоў, яшчэ да вайны, мелі клопат зь беларускай мовай Янкі Станкевіча будучы ў Вільні, а таксама на эміграцыі. Была гэта мова залішне спэцыфічная, каб ёю карыстацца ў літаратуры. Але гэты ўпарты чалавек ніяк не хацеў пагадзіцца з жывой беларускай мовай, з прынятым правапісам Б. Тарашкевіча. Памінем тут савецкі правапіс, які дапасоўвае беларускую мову да рускай. Некаторыя артыкулы Я. Станкевіча ў эміграцыйнай прэсе рэдакцыя, каб адмежавацца, падкрэсьлівала, што захоўвае мову аўтара — Янкі Станкевіча, якога часта называлі „навучоны спадар". І мова такіх артыкулаў выклікала часам сьмех у чытача, бо спатыкаліся „хормы" слоў, як напрыклад, „працавень" замест працаўнік і т.п. Усё, што засталося з моўнай філязофіі Янкі Станкевіча гэта „спадар", які з часам быў прыняты.

Далей у артыкуле „Таварыш ці спадар?" чытаем: „У калябаранцкім друку, на жаль, не ўдалося натрапіць на якінебудзь дакумант тыпу табеля аб рангах, зь якога можна было-б даведацца, хто з тагачасных мясцовых прыслужнікаў меў гонар называцца спадаром. З наяўнага матэрыялу відаць, што спадарамі лічыліся службоўцы высокага рангу, ад валасных бургамістраў, работнікаў раённых і гарадзкіх устаноў і прадпрыемстваў і канчаючы дзеячамі Беларускай Рады Даверу й Беларускай Цэнтральнай Рады".

Ня ёсьць праўдай, што тэрмін „спадар" адносіўся да людзей высокага рангу. Як мне добра вядома, прэзыдэнт БЦР Радаслаў Астроўскі быў супраць тэрміну „спадар" і заўсёды зьвяртаўся да людзей моўна й лістоўна „гаспадар", хоць у часе акупацыі да яго зьвярталіся „спадар прэзыдэнт" і так зьвярталіся некаторыя асобы на эміграцыі.

Але найбольш варожа за слова „спадар" таварыш Аркадзь Жураўскі адносіцца да беларусаў-эмігрантаў. Супраць гэ-

тых людзей камуністы вялі варожую прапаганду ад самай вайны, толькі апошнімі гадамі яна, быццам, прыціхла. Але за тое пачалася барацьба супраць беларускай дзяржаўнай сымболікі: Пагоні, бел-чырвона-белага сьцягу, беларускай мовы, а цяпер, як бачым, прыйшла чарга й на „спадара" й на „Жыве Беларусь!"

Варта памятаць, што на працягу стагодзьдзяў многа краін сьвету ўвялі ў сваю мову розныя навінкі, а нават мянялі назовы сваіх краін. Гэта найбольш відавочна на краінах Цэнтральнай Афрыкі ў пасьляваенны час. І ніхто іх за гэта не дакарае.

Аднак, акрамя сваіх навуковых доказаў адносна „спадара", таварыш Жураўскі надае большае значэньне палітыцы, ды кусае тых беларусаў, якія знаходзіліся пад нямецкай акупацыяй і рабілі нешта беларускае. Таму свой артыкул аб „таварышу" й „спадару" ён пачынае так:

„Старэйшае пакаленьне беларусаў ведае, што перад нападам на Савецкі Саюз гітлераўцы сабралі з усёй Эўропы беларускіх эмігрантаў, у большасьці былых дзеячаў і прыхільнікаў колішняй Беларускай Народнай Рэспублікі, і ў абозе сваіх полчышчаў прывезьлі іх у Беларусь. Тут ім былі даручаны некаторыя дапаможныя пасады ў разнастайных акупацыйных установах. Шэрагі іхнія папаўняліся мясцовымі прыхільнікамі „новага парадку ў Эўропе" ў якасьці валасных бургомістраў, работнікаў раённых і гарадзкіх управаў, паліцэйскіх і інш. Але гэтыя прыслужнікі акупантаў на першым часе адчулі нязручнасьць, бо ня ведалі як цяпер менаваць сябе й сваіх фашысцкіх гаспадароў".

Фактычна, немцам ня трэба было зьбіраць з усёй Эўропы беларускіх эмігрантаў, яны самі сабраліся ў сваіх беларускіх арганізацыях. Гэтыя людзі мелі шчасьце быць на Захадзе, бо інакш даўно іх зьнішчыў-бы НКУС як нацдэмаў. Гэтую практыку бальшавікоў добра знае таварыш А. Жураўскі, аднак, як відаць, ня знае, што ня так лёгка немцы дазволілі гэтым беларусам вярнуцца на Бацькаўшчыну, яны іх трымалі да пэўнага часу. А што пасьля некаторыя зь іх, вярнуўшыся на Радзіму, памагалі мясцовым прыхільнікам устанавіць парадак у краі, то што тут дрэннага? У краі не магла быць анархія, трэба было ўтрымаць

парадак, наладзіць ахову здароўя, адміністрацыю, школьніцтва, паліцыю й т.п. Гэта дазволена міжнародным правам пад акупацыяй. Але камуністы міжнароднага права не прызнавалі й не прызнаюць.

А што тут было неабходным рабіць, гэта тое, што сьпярша ўладу на Беларусі захапілі шмат дзе палякі, тварылі пры баку немцаў паліцыю й абвінялі беларусаў у камунізме, стралялі іх як гусей. Многа каму з савецкіх людзей не падабаецца, чаму ўрадавыя пасады на Беларусі займалі беларусы, а ня людзі прысланыя Масквою, як гэта было перад вайной і па вайне. Але ў час вайны й Масква прысылала сваіх людзей на Беларусь. Былі гэта аддзелы чэкістаў спэцыяльнага прызначэньня, якія стралялі непажаданых ім беларусаў, грабілі беларускія вёскі, рабілі правакацыі й дзеяньні прысланых Масквой людзей часта канчаліся пажарамі цэлых вёсак і забойствамі мірных беларускіх сялян.

Маецца й такі досьціп: „У часе славутага Другога Ўсебеларускага Кангрэсу, які праходзіў 27 чэрвеня 1944 году, грукат гармат Чырвонай Арміі, што наступала, прымусіў спадароў хуценька закрыць кангрэс і пасьпешна спакаваць свае чамаданы, каб разам з гітлераўцамі падацца на Захад".

Так, Кангрэс праходзіў пад грукат гармат Чырвонай Арміі, але яго дэлегаты мелі час вынесьці свае пастановы, мелі час спакаваць свае чамаданы й мелі час падацца на Захад. А як гэта было з Чырвонай Арміяй і рэштай камуністаў на Беларусі 22 чэрвеня 1941 году? Мелі яны час спакаваць свае чамаданы й падацца на ўсход?

Яшчэ раней у газэтцы „Мы и время" (№ № 24 і 25 за сакавік 1994 г.), таварыш А. Жураўскі ўчапіўся за кліч „Жыве Беларусь" і навязвае яго да фашызму, а найбольш прыпісвае Саюзу беларускай моладзі, якая часта карысталася гэтым клічам. Чытач павінен знаць, што ў СБМ нікога сілай не змушалі ўступаць. Нацыянальна сьвядомая моладзь сама ўступала ў рады СБМ, каб рабіць нешта беларускае й была гэтым задаволена. Бо-ж у СБМ не вучылі клясавай варожасьці, а пашаны й любові да свайго народу й краіны. І нават тыя эсбээмаўцы, якія засталіся дома, ня выехалі ў эміграцыю, былі савецкай ўладай прыгавораны да 25 гадоў лягероў. Некаторыя зь іх, што перажылі змроч-

ны час ГУПАГаў, яшчэ й сёньня ганарацца тым, што былі сябрамі й сяброўкамі СБМ, а не камсамолу.

Таварыш А. Жураўскі ніяк ня хоча пагадзіцца з тым, што ветлівы зварот „спадар" і кліч „Жыве Беларусь" апошнім часам пашыраюцца на Беларусі. Ён піша:

„У наш час у беларускім друку многа пішацца ад неабходнасьці вяртаньня беларусам іх гістарычнай памяці. Вяртаньне калябаранцкага кліча „Жыве Беларусь!" таксама можна разглядаць як вяртаньне такой памяці, толькі з агаворкай, што гэта памяць дагары нагамі.

Колішні калябаранцкі кліч „Жыве Беларусь!" у наш час першым аднавіла, здаецца, згуртаваньне „Бацькаўшчына" на сходзе, які праходзіў 10 верасьня 1990 г. у Доме літаратара. Аб гэтым з гордасьцю паведамлялася тады ў друку: „Ці на якім высокім вучоным зборы большасьць выступленьняў будзе заканчвацца заклікам „Жыве Беларусь!", на які зала адказала б дружным „Жыве!" („Літаратура і мастацтва" ад 12 кастрычніка 1990 г.). Але „высокія вучоныя зборы" не прымусілі сябе доўга чакаць. Ужо ў маі наступнага года кліч „Жыве Беларусь!" чутны быў на Міжнародным кангрэсе беларусістаў у тым-жа Доме літаратараў. У прыватнасьці, гэтым клічам закончыў тады сваё прывітальнае выступленьне намесьнік старшыні Прэзыдыюму Вярхоўнага Савета БССР С. Шушкевіч, у адказ у зале ўзьнялося некалькі рук з воклічам „Жыве!".

І яшчэ чытаем: „Ужо ў канцы 1941 г. кліч „Жыве Беларусь" быў уведзены як абавязковы ў школьны ўжытак". Я ў той час хадзіў у школу й добра памятаю, што ў школе не было ніякага абавязку ўжываць „Жыве Беларусь!" вучням. Гэтым клічам карысталіся зазвычай сябры СБМ і некаторыя афіцыйныя лісты мелі ў канцы допіс „Жыве Беларусь!"

Трэба адно памятаць, што газэтка „Мы и время" — гэта камуністычная газэтка, якая нямала выліла ўсякага бруду на ўсё беларускае, нацыянальна-культурнае з мэтай стрымаць адраджэньне народу. Гэта газэтка, як бачым, лье далей свой бруд і дастаткова спаткаць там прозьвішча карэспандэнта, а ўжо вядома каму ён служыць.

Ёсьць гэта непрыемная палеміка, вынік таго, што беларускі народ, ня маючы сваёй сапраўднай дзяржаўнасьці, якая

яго аб'ядноўвала-б, дзеліцца на розныя фракцыі, часта варожыя, якія шукаюць для свае справы саюзьнікаў, а фактычна ворагаў, замест будаваць сваю сапраўдную Вольную й Незалежную Рэспубліку Беларусь. На гэта гатовы „спадар", але ці гатовы „таварыш"?

(„Голас Часу" № 34 (1), Лёндан 1995 г.).

Хто выбіраў беларускі дзяржаўны гімн?

Дзяржаўны пераварот, які адбыўся ў жніўні 1991 году ў Маскве, зьмяніў усю сыстэму СССР, а сьнежанскае таго-ж году спатканьне Ельцына, Краўчука й Шушкевіча ў Белавежы канчаткова парушылі „нерушымы Саюз". Былі гэта гістарычныя падзеі, якія замянілі штучны твор „незалежных рэспублік СССР" у сапраўдныя незалежныя дзяржавы.

Але ня ўсё гэта адбылося й адбываецца спраўна. Мы ведаем, якіх людзей узгадавала камуністычная партыя за 70 гадоў і прызначала на адказныя дзяржаўныя пасады. Амаль усе гэтыя людзі, якія ў часе путчу займалі адказныя пасады ў адміністрацыі, сядзяць і сёньня на сваіх мяккіх крэслах і, так ці інакш, стараюцца захаваць стары парадак. Некаторыя зь іх сталіся з дыктатараў дэмакратамі, але большасьць іх захавала тую самую камуністычную ідэалёгію, якая, як толькі можа, тармозіць дэмакратычны працэс у Беларусі, якая імкнецца да сапраўднай незалежнасьці. І гэта адбываецца ва ўсіх галінах дзяржаўнага жыцьця беларускага народу.

Нацыянальна-дзяржаўнае жыцьцё Беларусі адраджаецца вельмі павольна. Чужыя людзі, насланыя Масквой на Беларусь, ды нямала сваіх рэнэгатаў мараць не аб дабры беларускага народу й яго дзяржаўнасьці, але аб сваіх прыватных інтарэсах. Гэта старыя апаратчыкі, сакратары партыйных установаў і другіх камуністычных арганізацыяў, якія, будучы бюракратамі, прывыклі толькі загадваць.

Хоць паволі, але нешта нацыянальнае на Беларусі робіцца й патрабуе станоўчых зьменаў у жыцьці незалежнай дзяржавы перад вонкавым сьветам. Такім чынам паўстала

патрэба, акрамя свайго сьцягу й эмблемы, выбраць беларускі нацыянальны гімн.

Беларусь за апошняе стагодзьдзе мела некалькі сваіх гімнаў і яе патрыёты сьпявалі іх пад уладай чарговых акупантаў. Першым гімнам быў верш Я. Купалы „А хто там ідзе", напісаны ў 1910 годзе, а музыку да яго склаў кампазітар Л. Рагоўскі. Хоць гэты верш быў папуляьны й яго пераклалі на некаторыя замежныя мовы, але зьмест яго не адпавядаў характару нацыянальнага гімну.

Другі верш, таксама Я. Купалы, „Не загаснуць зоркі ў небе", напісаны ў 1911 годзе быў пакладзены на музыку ў 1917 годзе праф. М. Янчуком і сьпяваўся ў часе Першай Сусьветнай вайны ва Ўсходняй Беларусі, па другім баку фронту. Але быў гэта рэвалюцыйны час і яму канкуравала так званая „Беларуская Марсэльеза". Яе сьпявалі на Першым Усебеларускім Кангрэсе ў Менску ў 1917 годзе, а пасьля „Беларускую Марсэльезу" сьпявалі ў БССР на ўрачыстасьцях аж да 1930 году. А ў Заходняй Беларусі пад Польшчай папулярнай была песьня „Не загаснуць зоркі ў небе".

Цяпер, калі Беларусь сталася незалежнай дзяржавай, паўстала неабходнасьць выбраць адзін з гэтых гімнаў, або стварыць новы, які будзе адпавядаць інтарэсам незалежнай дзяржавы.

Было гэта нялёгкае заданьне для выбаршчыкаў, а тым больш для ўкладальнікаў-паэтаў новага гімну, каб у некалькіх стафах верша адлюстраваць мінулае й сучаснае складанай гісторыі беларускага народу.

Пакуль гэты артыкул зьявіцца ў часопісе, ужо можа быць выбраны новы беларускі гімн. Але нічога не перашкаджае сказаць мне сваё меркаваньне пра пададзеныя на разгляд гімны „Пагоня", „Магутны Божа" й „Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Усе яны маюць прыгожы зьмест і мэлёдыю.

„Пагоня" — патрыятычная песьня, я яе люблю, але як на гімн дзяржаўны, не для мяне. Пісалася яна ў часе Першай Сусьветнай вайны ў абставінах пабыту М. Багдановіча ў Вільні. „Магутны Божа" сьпяваюць беларусы на эміграцыі як рэлігійны гімн у царкве й мае ён рэлігійны зьмест і царкоўную мэлёдыю, таму будзе лепш пакінуць гэтую песьню для царквы. Больш падыходзіць беларускі гімн „Мы вый-

дзем шчыльнымі радамі", які напісаны быў у 1919 годзе Макарам Краўцовым, а музыку да яго напісаў Уладзімер Тэраўскі. Гэты ваяцкі марш стаўся гімнам Слуцкага збройнага чыну на незалежнасьць Беларусі й зьмест яго найбольш адпавядае сучаснасьці, ды й мэлёдыя яго жывая.

Аднак нашыя былыя слугі акупанты — камуністы-імпэрыялісты ў сваёй газэце „Мы и время" (№ 16 (37), август 1992) пішуць: „Рэспубліканскі й Менскі гарадзкі Саветы ДСПС прынялі рашэньне зьвярнуцца ў ВС РБ з прапановай захаваць дасюлешні гімн РБ у сувязі з тым, што прадстаўленыя конкурснай камісіяй варыянты новага гімна значна нізкія па свайму зьместу й мастацкай якасьці".

Наступны нумар гэтай-жа камуністычнай газэты „Мы и время" — № 17 (38) — у артыкуле „О проекте государственного гимна Республики Беларусь" піша: „У апублікаваных тэкстах гімнаў згадваецца бел-чырвона-белы сьцяг. Вядома, што ён радзіўся ў эпоху вялікіх сацыяльных процістаяньняў — грамадзянскай вайны — не на баку прагрэсіўных сіл, а на баку буржуазных нацыяналістаў. Вядома таксама, што пад гэтым сьцягам разам з гітлераўскімі войскамі на тэрыторыі Беларусі выступалі й прадажнікі беларускага народу. Пад гэтым сьцягам беларускія нацыяналісты праводзілі свае карныя экспэдыцыі супраць партызан і мірных жыхароў. Гэты сьцяг разьвіваўся над управамі й над канцэнтрацыйнымі лягерамі. Пад гэтым сьцягам ішло зьнішчэньне й анямечаньне беларускага народа. (...) Адзін з гімнаў пачынаецца з кліча „Жыве Беларусь", каторы атрымаў пуцёўку ў жыцьцё ў часе фашыстоўскіх папутчыкаў — буржуазных нацыяналістаў. Кубэ забараніў ім выкарыстоўваць, як людзям неарыйскага паходжаньня, „Хайль Гітлер!" і яны перайшлі на „Жыве Беларусь!" Гэты кліч атрымаў пашырэньне й сёньня. Ці ня ёсьць гэта ідэалягічная акупацыя, але ўжо без фашыстоўскіх войск?"

Такія дурніцы пісалі ўжо няраз слугі камунізму, якія ніколі ня мелі гонару й годнасьці чалавека глянуць праўдзе ў вочы, а цэлы час карысталіся й цяпер карыстаюцца хлусьнёй.

Пра гімн „Мы выйдзем шчыльнымі радамі" аўтары камуністычнай газэткі „Мы и время" пішуць, што ён носіць баявы кліч „На бой!", „Дамо адпор!" А што мы чытаем у іхнім

гімне БССР, які яны хочуць захаваць: „У бітвах за волю, у бітвах за долю". І тут згадваецца „бітва" — бой. Далей чытаем: „Горда ўзьняўся ў сьветлыя высі, сьцяг камунізма — радасьці сьцяг". Гімн БССР мае яшчэ й такі прыпеў:

Нас аб'яднала Леніна імя,
Партыя к шчасьцю вядзе нас ў паход.
Партыі слава! Слава Радзіме!
Слава табе, наш савецкі народ!

Якая гэта была „воля", „доля" й да якога „шчасьця" й „славы" вяла й давяла „наш савецкі народ", то гэта добра відаць кожнаму сумленнаму чалавеку. І сёньня захаваць такі гімн БССР могуць толькі камуністы-праступнікі. Свой артыкул у газэце „Мы и время" яны заканчваюць: „Мы поддерживаем гимн при некотором уточнении".

Так гэта людзі ўчарашняга дня хочуць захаваць учарашні парадак і савецкі гімн, але новы беларускі гімн выбяруць людзі сёньняшняга дня й ён будзе адпавядаць сапраўднай незалежнай Рэспублікі Беларусь.

(„Голас Часу № 22 (1), Лёндан 1993 г.).

„Імёны на граніце"

У газэце „Чырвоная зьмена" (№ 33 за 10-16 жніўня 1992 году) Алесь Палынскі зьмясьціў цікавае апісаньне адкрыцьця ў Гародні помніка па загінуўшых у Афганістане гарадзенцах, якіх імёны высечаны на граніце.

Сумная й трагічная ўрачыстасьць. Ня будзем паўтараць увесь яе прабег, але згадаем некаторыя разважаньні тых, што былі й што не былі ў Афганістане. Вось што сказала на гэтай урачыстасьці І. С. Галаўнёва, старшыня камітэта бацькоў воінаў, загінуўшых у Афганістане:

„Сёньня на Гарадзенскай зямлі адраджаецца справядлівасьць. Людзі прыйшлі пакланіцца нашым дзецям. (...) Я — маці. Ува мне — галасы ўсіх маці зямлі беларускай. (...) Людзі! Забудзьце аб палітыках! Памятайце пра дзяцей нашых і яны-ж і сапраўды былі яшчэ дзецьмі! Як стагнала зямля, прымаючы цынкавы труны! Досыць ліць бруд на га-

ловы тых, хто вярнуўся з гэтай вайны. Яны ні ў чым не вінаватыя! Беражыце іх, беражыце мір, не дай Бог вам перажыць тое, што перажылі мы".

Разумна сказала жанчына. Другі выступіў В. І. Сарокін, старшыня Гарадзенскага абласнога аддзяленьня Саюза вэтэранаў Афганістана:

„Кучка палітыкаў для рашэньня сваіх вузка палітычных задач разьвязала вайну замест крапатлівай палітычнай работы. За гэтую авантуру прыйшлося плаціць сваёй дарагой цаной. Больш як тры тысячы жыхароў Гарадзеншчыны прымалі ўдзел у гэтай неаб'яўленай вайне. 76 чалавек загінула, 109 вярнулася з Афганістана інвалідамі, 15 сем'яў засталося без карміцеляў. 116 воінаў узнагароджана ордэнамі. (...) Сьлед вайны на ўсё жыцьцё застанецца ў сэрцах. Ні сэрца, ні розум не могуць знайсьці адказу на пытаньне: „За што? Чаму?" На жаль, сродкі масавай інфармацыі, пісьменьнікі, кампазітары сарамліва абыходзяць гэтую тэму. (...) Жывыя заўсёды абавязаны тым, хто па-геройску загінуў".

Па-геройску, ці не па-геройску загінуў, гэта яшчэ ня ўсё, больш важна за што загінуў?

Удзельнік афганскай вайны, пісьменьнік М. І. Чаргінец, сказаў:

„Афганістан каштаваў беларускаму народу васемсот жыцьцяў яе сыноў. Амаль шэсьцьсот чалавек сталі інвалідамі й цяпер патрабуюць клопату грамадзтва, бо не ў стане забясьпечыць сабе жыцьцё. На вялікі жаль, ёсьць пакуль на Беларусі й тыя, хто жадае ачарніць іх подзьвігі, іх бездакорную службу. Некаторыя не шкадуюць чарніла, каб даказаць, што яны ня бачаць розьніцы паміж немцамі на Беларусі й нашымі хлопцамі ў Афганістане. Гэтыя людзі — сьлепакі, яны проста выконваюць сацыяльны заказ, хто хоча ўшчэнт ачарніць усё сьвятое, што ёсьць у беларусаў. (...) Даруйце нам за тое, што мы засталіся жывымі".

Нашыя людзі не „сьлепакі", яны добра разумеюць, бачаць і разьбіраюцца ў дзейнасьці немцаў на Беларусі й нашых хлапцоў у Афганістане. Як адных, так і другіх на чужую тэрыторыю паслалі з ружжом дзяржаўныя галавары й гэта яны распачалі вайну. Нехта пляце буйду аб так званых „воінах-інтэрнацыяналістах", якія выконвалі свой абавязак. Якія

гэта інтэрнацыяналісты? Скуль яны ўзяліся? Гэта-ж былі прызваныя ў Чырвоную Армію хлапцы. Іх паслалі ў Афганістан крамлёўскія імпэрыялісты дзеля пашырэньня свае чырвонае імпэрыі са сваім чырвоным тэрорам і якія пасадзілі ў Кабуле свайго чырвонага стаўленіка. Брэжнеў думаў, што прымітыўны афганскі народ будзе хутка падпарадкаваны доблеснай Чырвонай Арміяй і яе вядучай тэхнікай. Аднак так ня сталася. Чырвоная Армія ня выканала свайго заданьня й вярнулася дамоў з чырвоным закрываўленым носам.

У афганскай вайне савецкі жаўнер быў нявіннай ахвярай захопніцкай палітыкі свайго ўраду. Жаўнер тут не вінаваты, ён выконваў загад сваіх начальнікаў. Я спачуваю ўсім жаўнерам, якія прымалі ўдзел у афганскай вайне й разумею іхнія крыўды, нараканьні й усе тыя псыхічныя, фізычныя й кліматычныя варункі, у якіх прыходзілася ім ваяваць, не гаворачы аб інвалідах і забітых. Але яны сёньня гавораць: „Мы не станем, як амэрыканскія вэтэраны В'етнама, кідаць свае ўзнагароды. Яны крывёю зароблены! Нашай крывёй". Ніхто ім ня кажа, каб яны кідалі свае ўзнагароды, але такі „афганец" думае, што ён сапраўды ваяваў за слушную справу й сваёю крывёю зарабіў заслугу. Але таго, што нехта завёз яго ў чужую краіну — Афганістан — мардаваць нявінных мясцовых людзей, ён не разумее. Усё, што ён знае: ён „герой", слушна зарабіў узнагароду, яна яму належыць і ён ёю ганарыцца.

І тут няма нічога дзіўнага, што разважныя людзі параўноўваюць такіх „герояў" да акупантаў — немцаў на Беларусі ў часе апошняй вайны.

(„Голас Часу" № 21 (6), Лёндан 1992 г.)

Да візыту прэзыдэнта ЗША Б. Клінтана ў Беларусі

15 студзеня 1994 года ў Рэспубліцы Беларусь з афіцыйным візытам знаходзіўся прэзыдэнт Злучаных Штатаў Амэрыкі Біл Клінтан з жонкай і дачкой. Праграма візыту прадугледжвала афіцыйную сустрэчу прэзыдэнта ў аэрапорце, перамовы з дэлегацыямі Вярхоўнага Савету Беларусі на ча-

ле са Станіславам Шушкевічам і Савета Міністраў на чале з Вячаславам Кебічам, сустрэчу з прадстаўнікамі апазыцыі, выступленьне перад вучонымі ў Акадэміі навук, цырымонію ўскладаньня кветак на плошчы Перамогі й на месцы пахаваньня рэпрэсаваных Сталіным людзей у Курапатах.

Жонка прэзыдэнта Хіляры Клінтан наведала Дзіцячую клініку № 4, а таксама Тэатр опэры й балета, а іх дачка Чэлсі азнаёмілася з арганізацыяй заняткаў у балетным класе Менскага харэаграфічнага вучылішча.

Падчас перагавораў, адбыўшыхся паміж Б. Клінтанам і кіраўніцтвам Беларусі, былі абмеркаваны пытаньні далейшага ўмацаваньня двухбаковых зносін. Прэзыдэнт ЗША пазытыўна ацаніў зьнешнепалітычны курс Рэспублікі Беларусь, накіраваны на зьдзяйсьненьне праграмы ядзернага раззбраеньня й пацьвердзіў, што й надалей Злучаныя Штаты Амэрыкі будуць падтрымліваць намаганьні Беларусі.

Дзеля пашырэньня гандлёвых сувязяў Білам Клінтанам і Станіславам Шушкевічам быў падпісаны дагавор аб узаемнай абароне інвэстыцый, які будзе стымулам для разьвіцьця прыватнага бізнэсу на Беларусі.

Акрамя таго ў рамках візыту прэзыдэнта ЗША ў Міністэрстве замежных спраў былі падпісаны таксама дагавор аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, а таксама дагавор паміж Нацыянальным банкам Беларусі й Банкам па экспарту-імпарту ЗША аб супрацоўніцтве мытных службаў дзьвюх краін.

Падчас візыту было вырашана пытаньне арганізацыі ў Менску Амэрыканскага бізнэс-цэнтру, які будзе дапамагаць амэрыканскім кампаніям у вывучэньні магчымасьцяў інвэстыцыяў і гандлю на Беларусі, а таксама будзе дапамагаць беларускім фірмам. Прэзыдэнт ЗША заявіў аб перадачы Беларусі мэдыцынскага абсталяваньня на 10 мільёнаў даляраў.

На выступленьні ў Акадэміі навук Беларусі прэзыдэнт Б. Клінтан заявіў: „Спадзяюся, што вы будзеце памятаць, што Амэрыка з Вамі, што мы верым у вашу мужнасьць, у вашу будучыню. Мяркую, што наша партнёрства будзе працягвацца ды прынясе мір і прагрэс, якога я жадаю вашай краіне й усяму сьвету".

(„Голас Часу" № 29 (2), Лёндан 1994 г.)

Сумная навіна

Якраз, як заканчвалася набіцьцё гэтага нумару „Голасу Часу", вечарам 26 студзеня „Сіфакс" падаў, што парлямант Беларусі адхіліў свайго лідэра, Станіслава Шушкевіча, ад займанага ім становішча.

Прычынай адстаўкі мелі быць ягоныя лібэральныя адносіны да рыначнай рэформы й нэгатыўная палітыка да Расеі. А наступнага дня газэта „Гардыян" за 27 студзеня 1994 г. падала, што Станіслаў Шушкевіч страціў сваю пасаду за карупцыю, бяручы дзяржаўныя грошы на прыватныя патрэбы. Ужо ня першы раз камуністы выказваюць свой недавер да палітыкі С. Шушкевіча, а галоўным чынам за Белавежскае пагадненьне, якое прывяло да распаду СССР. У гэтым апошнім галасаваньні цікавая адна рэч: чаму некаторыя лібэралы, якія падтрымоўвалі Шушкевіча раней, гэтым разам стрымаліся ад галасаваньня?

Прэм'ер-міністар Вячаслаў Кебіч, як падае „Сіфакс", утрымаўся на сваёй пасадзе. Тут няма нічога дзіўнага, бо камуністычныя сымпатыі В. Кебіча й ягонае „верноподданство" Расеі добра вядомыя беларусам у краі й за мяжой.

Станіслаў Шушкевіч быў беларускім лідэрам, які змагаўся за замацаваньне дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі й гэта не падабалася камуністам, якія ўжо раней пачалі адсоўваць на бок усіх сьвядомых беларусаў з арміі, напрыклад, палкоўніка Мікалая Статкевіча, з Міністрэства ўнутраных спраў Уладзіміра Ягорава й зь дзяржаўнай бясьпекі Эдуарда Шыркоўскага. Апошніх двух за тое, што яны выдалі Літве двух камуністаў. Гэтым разам прыйшла чарга й на С. Шушкевіча. Становішча яго ў парляманце было цяжкое, бо там сядзелі амаль усе камуністы, якія былі выбраны ў 1990 годзе па ўказаньнях камуністычнай Масквы.

Такія гэта навіны апошнім часам на нашай Беларусі, якія нічога добрага не варожаць на прышласьць. Застаецца надзея на агульныя выбары ў новы парлямант і тут пытаньне, калі яны адбудуцца, як адбудуцца й каго выбярэ народ? А гледзячы з далёкай Англіі на Беларусь баліць сэрца, як гэта чужыя людзі ва ўрадзе Беларусі зьневажаюць усё бела-

рускае, а яго народ вядуць у чужую няволю. Адзіная надзея на агульныя выбары, якія пакажуць, ці беларусы хочуць быць гаспадарамі ў сваім краі, ці парабкамі акупанта, як былі яны раней?

(„Голас Часу" № 29 (2), Лёндан 1994 г.)

Беларусь выбрала прэзыдэнта

Гарбачоўская адліга разваліла Савецкі Саюз. У гэтым нама нічога дзіўнага, бо ўжо пасьля Другой Сусьветнай вайны не засталося на сьвеце ніводнай імпэрыі акрамя СССР.

Англічане, маючы дасьведчаньне ў кіраўніцтве сваімі заморскімі калёніямі й дамініёнамі, дабравольна далі ім права на самастойнае, незалежнае жыцьцё й загадзя падрыхтавалі мясцовых людзей да пераняцьця ўлады. Такі працэс прайшоў мірна й урачыста.

Зусім інакш склалася сытуацыя ў краінах былога СССР. Тут зайшлі палітычныя зьмены, але ў некаторых рэспубліках не адбылося без праліцьця крыві. Таксама не адбыліся яшчэ й да гэтага часу эканамічныя рэформы й таму шмат краін былога Савецкага Саюзу апынулася над эканамічнай прорваю. Такі лёс спаткаў і Беларусь, якая акрамя эканамічнай катастрофы перажывае й нацыянальную.

Вялікім няшчасьцем для Беларусі было прэм'ерства Вячаслава Кебіча. Ягоны ўрад за чатыры гады ані эканамічна, ані нацыянальна нічога канкрэтнага не зрабіў для Беларусі як незалежнай дзяржавы, а толькі хацеў зьвязаць яе з Расеяй як была яна раней.

Хоць Беларусь была прагалошана незалежнай дзяржавай і апошнім часам была распрацавана свая Канстытуцыя, але ў практычным жыцьці яна не прымянялася. Усё рабілася й робіцца так, каб захаваць стары парадак і пакінуць тых самых людзей эпохі БССР на сваіх пасадах, якія на працягу чатырох гадоў свайго ўрадаваньня не зрабілі ніякага прагрэсу.

Згодна новай Канстытуцыі, Беларусь, як рэспубліка, павінна мець прэзыдэнта. Старая наменклятура хацела зрабіць ім В. Кебіча. Але ў першым туры прэзыдэнцкіх выбараў лідэрам аказаўся Аляксандар Лукашэнка, аднак не атрымаў ён патрэбнай большасьці галасоў, каб заняць пасад

прэзыдэнта. Усё-ж у другім туры выбараў Лукашэнка атрымаў 81% галасоў выбаршчыкаў. Некаторыя галасавалі ня так за Лукашэнку, як супраць Кебіча. Трэба толькі дзівіцца, што за Кебіча галасавала паважная колькасьць выбаршчыкаў у першым туры.

Цяпер згадаем коратка пра прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнку. З паходжаньня ён беларус. Нарадзіўся У 1954 годзе ў п. Копысь Аршанскага раёну Віцебскай вобласьці. Мае дзьве вышэйшыя адукацыі. Закончыў Магілёўскі пэдагагічны інстытут і Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Па спэцыяльнасьці — настаўнік гісторыі й грамадазнаўства, эканаміст — арганізатар сельскагаспадарчай вытворчасьці. Як большасьць былых савецкіх людзей, А. Лукашэнка, будучы камуністам, працаваў сакратаром камітэту камсамолу, быў партыйным кіраўніком у войску, у калгасах і саўгасах. Апошні час Лукашэнка працаваў старшынёй парляманцкай камісіі па барацьбе з карупцыяй і тут ён здабыў сабе папулярнасьць. Быў ён адным з ворагаў Белавежскіх пагадненьняў, насіў бээсэсэраўскі дэпутацкі значок, падтрымліваў пракамуністычныя арганізацыі й ніколі не размаўляў па-беларуску. Такі гэта партрэт Аляксандра Лукашэнкі да часу выбару яго на прэзыдэнта Беларусі. Заходняя прэса параўноўвае А. Лукашэнку да Ўладзіміра Жырыноўскага — ініцыятара вярнуць былы Савецкі Саюз.

Як там не было, але, заняўшы прэзыдэнцкі пост, Лукашэнка даў прысягу паступаць згодна Канстытуцыі Беларусі, г.зн. абараняць яе дзяржаўную незалежнасьць. І што цікава, сваё першае выступленьне ў парляманце, як прэзыдэнт, А. Лукашэнка зачытаў па-беларуску.

Так, як і абяцаў у сваёй перадвыбарчай кампаніі, Лукашэнка ачысьціў урад ад людзей, якія паступалі незаконна. Гэтым прыдбаў сабе новых ворагаў, якія напэўна ня будуць сядзець спакойна. Але, пакуль суд ды справа, трэба даць час першаму прэзыдэнту Беларусі пачаць работу, а пасьля даць яму сваю ацэнку.

(„Голас Часу" № 32 (5), Лёндан 1994 г.)

Заходнія і ўсходнія суседзі

Хто першы пачаў ламаць трактаты?

У сувязі з 50-й гадавінай гітлераўскага нападу на Польшчу, 2 верасьня 1989 году ў Лёндане адбылося ўрачыстае паседжаньне Нацыянальнай Рады Рэчы Паспалітай. На паседжаньні аднагалосна была прынята рэзалюцыя, якая асуджае існуючую ў Польшчы савецкую дамінацыю й дамагаецца ліквідацыі пакту Рыбэнтропа-Молатава. І як зазначае рэзалюцыя, праз гэты пакт саветы зламалі Рыжскі трактат з 1921 году.

Далей Нацыянальная Рада „выказвае гатоўнасьць урэгуляваць адносіны зь незалежнымі суседзямі: Літвой, Латвіяй, Беларусьсю й Украінай". Гэта значыць, што заходнія землі Беларусі й Украіны маюць адысьці да Польшчы, так як яны былі да 1939 году.

У часе другой Рэчы Паспалітай яе граніца зь Нямеччынай не прлягала ўздоўж Одры й Нысы-Лужыцкай, а толькі праходзіла далей на ўсход. Старая граніца Польшчы зь Нямеччынай у некаторых мясцох вызначана была плебісцытам, у адпаведнасьці з пастановай Канфэрэнці ў Парыжы ў 1919 годзе. І сёньня палякі не прызнаюць яе, хаця перасунулася яна на захад і дала палякам больш тэрыторыі.

Усходнюю граніцу Польшчы Мірная Канфэрэнцыя ў Парыжы не вызначыла. У той час, як ішлі дыскусіі ў Парыжы й падпісваўся Вэрсальскі трактат, палякі вялі вайну з бальшавікамі на беларускай зямлі. У гэтых ваенных дзеяньнях Антанта мілітарна й эканамічна памагала Польшчы, каб стрымаць пашырэньне камунізму на Захад. А што да ўсходняй граніцы Польшчы, то ў 87 артыкуле Тарктату была ўстаўлена агаворка: „Граніцы Польшчы, якія ёсьць

неакрэсьленыя ў гэтым трактаце, будуць устаноўлены праз галоўныя Саюзныя Дзяржавы". Аднак так не сталася.

Усходняя граніца Польшчы рашалася ў той час не за канфэрэнцыйным сталом, а на полі збройнага змаганьня. Таму заходнія дзяржавы не хацелі бяз ведама Саветаў заўчасна выносіць сваю пастанову, і абмежаваліся толькі да этнічнай граніцы.

8 сьнежня 1919 году Антанта вызначыла Польшчы часовую граніцу, якую сталі называць „лініяй Керзана". Была гэта не этнаграфічная, але палітычная лінія. Яшчэ да нашага часу, на захад ад гэтай граніцы насельніцтва Беласточчыны не згубіла свайго беларускага характару. Сталін аддаў Польшчы Беласточчыну й Бельшчыну, каб прыцягнуць Польшчу ў свой камуністычны блёк. Бальшавікі гандлявалі чужой тэрыторыяй як ім падабалася й за гэта маюць сёньня й могуць мець заўтра яшчэ большы клопат за свае махінацыі.

Ваенныя падзеі палякаў з бальшавікамі ў 1919-1920 гадох закончыліся пагадненьнем у Рызе. Абодва бакі мелі досыць вайны, але міру найбольш хацелі бальшавікі й за гэты мір былі гатовы аддаць палякам амаль усю Беларусь. Але польскія нацыяналісты не хацелі ўсяе Беларусі. Яны ўзялі яе столькі, колькі маглі пераварыць.

Рыжскі трактат быў ганебным злачынствам, якое ўчынілі палякі з бальшавікамі над беларускім народам. Яны не дапусьцілі на Канфэрэнцыю ў Рыгу беларускую дэлегацыю БНР, якую ачольваў В. Ластоўскі, не дапусьцілі таксама ані Жылуновіча, ані Чарвякова з БССР, якую бальшавікі самі стварылі; а палякі не дапусьцілі свайго сымпатыка А. Луцкевіча зь яго Найвышэйшай Радай БНР. За іхнімі плячыма палякі з бальшавікамі падзяліліся Беларусьсю.

І як гэта гучыць фальшыва, калі старшыня польскай дэлегацыі ў Рызе Ян Домбскі ў заключным слове сказаў: „Мы стараліся разьвязаць усе спрэчныя справы слушна й справядліва: кожная старана зрабіла для другой уступствы ня толькі, каб дайсьці да паразуменьня, але таксама каб аблегчыць прышлыя адносіны".

А ў адказ Домбскаму савецкі прадстаўнік у Рызе, Іофэ, выказаў сваю недарэчнасьць, калі сказаў: „Абодва бакі ня выказалі ніякай агрэсыўнасьці. Мы падпісалі мір, які поў-

насьцю заспакойвае жыцьцёвыя, справядлівыя й неабходныя інтарэсы польскага народу".

Пры ўкладаньні трактату паўстала даволі важнае пытаньне: з кім Польшча гранічыць? Таму абодва бакі афіцыйна прызналі незалежнасьць Беларусі й Украіны й упісалі гэта ў пратакол.

Як бачым, змоўшчыкі прызналі незалежнасьць Беларусі, але не дапусьцілі беларускіх прадстаўнікоў на мірную Канфэрэнцыю, а за плячыма „незалежнай Беларусі" Домбскі й Іофэ падзяліліся ёю паводле сваіх узаемных інтарэсаў, назваўшы гэта „слушна й справядліва ня выказаўшы ніякай агрэсыўнасьці".

Другой недарэчнасьцю было, што „незалежная Беларусь", якую ніхто зь беларусаў не рэпрэзэнтаваў у Рызе, паводле 2-га артыкула трактату „зракалася ўсякіх тэрытарыяльных правоў на захад ад граніцы".

На падзел Беларусі ў Рызе, Якуб Колас у вершы „Беларускаму Люду" пісаў у 1921 годзе:

Хіба забудзем мы тыя межы,
Што правадзілі бяз нас?
Раны глыбокі, ох, яшчэ сьвежы!
Помсты агонь не пагас.
Нас падзялзлі! — Хто? Чужаніцы!
Цёмных дарог махляры,
К чорту іх межы, к д'яблу граніцы.
Нашы тут гоні, бары!
Будзем мы самі гаспадарамі,
Будзем свой скарб ратаваць.
Годзе той крыўды! У ногу з братамі
Пойдзем свой край вызваляць!

Рыжскі трактат быў асуджаны ўсім беларускім народам, яго правымі й левымі арганізацыямі. Нават Трэці Кангрэс Саветаў Менскага ўезду 12 сьнежня вынес рэзалюцыю, у якой дамагаўся незалежнасьці Беларускай Савецкай Рэспублікі ў яе этнаграфічных межах і што дэлегацыя БССР павінна быць паслана на мірныя перагаворы, дзе рашаецца лёс Беларусі паміж Расеяй, Украінай і Польшчай.

Падпісваючы Рыжскі трактат у сакавіку 1921 году, Польшча ў 7-ым артыкуле забавязалалася забесьпячаць свабоднае разьвіцьцё беларускай культуры, мовы, ды адначасна давалася права арганізацыі беларускіх школаў у межах Польшчы.

Яшчэ раз згадаем, што Польшча, падпісваючы Вэрсальскі Мірны дагавор 28 чэрвеня 1919 году, забавязалася ахоўваць жыцьцё й вольнасьць усіх бяз розьніцы паходжаньня, нацыянальнасьці, мовы, веравызнаньня, ды на дзяржаўны кошт запэўніць навучаньне дзяцей нацыянальных меншасьцяў роднай мовы. Артыкул 1-шы Вэрсальскага дагавору, ратыфікаванага польскім Соймам 1 жніўня 1919 году, катэгарычна забавязваў Польшчу, каб „яе пастановы былі прызнаны Польшчай, як правы прынцыповыя, каб ніводная ўстанова, ніводнае распараджэньне, ніводная ўрадавая дзейнасьць не ішла супраць гэтых пастаноў і што ўсё тое, што ідзе супраць іх, будзе лічыцца ня маючым сілы".

Польская Канстытуцыя ад 21 сакавіка 1921 году у 109-м артыкуле пастанаўляе: „Кожны грамадзянін мае права захаваньня сваёй нацыянальнасьці, разьвіцьця сваёй мовы й нацыянальных асаблівасьцяў". Артыкул 110-ы Канстытуцыі пастанаўляе, што нацыянальныя меншасьці могуць арганізаваць школы на ўласны кошт, у якіх могуць карыстацца сваёй мовай.

Ці Польшча выканала гэтыя агульналюдзкія забавязаньні перад сваімі грамадзянамі іншых нацыянальнасьцяў і рэлігіяў, падпісваючы Вэрсальскі й Рыжскі трактаты? Ніколі. Дык хто ж тады пачаў першы ламаць трактаты як не палякі. Як піша полька Барбара Топорска ў „Вядомосьцях" ад 26 траўня 1962 году, „Польшча зламала ўсе міжнародныя трактаты, якія забавязвалі яе да шанаваньня аснаўных свабодаў грамадзян другіх вераў і нацыянальнасьцяў.

Брытанскі прэм'ер-міністар Льлёйд Джордж, якому прыходзілася няраз спатыкацца й гутарыць з палякамі на Мірнай Канфэрэнцыі ў Парыжы, у сваіх успамінах так згадвае палякаў:

„Ніхто не зрабіў нам больш клопату як палякі. Будучы ў свой час наймагутнейшай вайсковай сілай у цэнтральнай Эўропе, калі Прусія была галадаючым княствам, у той час як да нязьлічаных правінцыяў сярод абшырнай тэрыторыі,

заселенай іншымі расамі, Польшча ня можа мець нашчадніцкіх гістарычных дамаганьняў, да забраных ёю зямель. П'яная ад сьвежага віна свабоды, дадзенай ёй аліянтамі, яна імкнецца яшчэ раз быць усемагутняй паняй цэнтральнай Эўропы. Самавызначэньне народаў не адпавядае яе амбіцыі. Яна палакомілася на Галіцыю, Украіну й частку Беларусі. Галасаваньне насельніцтва рашуча адкінула-б яе дамінацыю. Таму права ўсіх народаў да выбару сваёй дзяржаўнасьці было зараз-жа адкінута яе лідэрамі.

Яны цьвердзілі, што гэтыя розныя народы належалі да палякаў правам збройнага захопу іх продкаў. Як той нармандзкі барон, які, калі запыталі яго паказаць дакумант на зямлю, выцягнуў шаблю з ножан".

Вясной 1922 году ў Генуі (Італія) адбылася міжнародная канфэрэнцыя. З траўня беларуская дэлегацыя нанесла візыт старшыні Генуэзскай Канфэрэнцыі прэм'еру Італіі Л. Факта й уручыла яму мэмарандум ад ураду БНР да ўдзельнікаў канфэрэнцыі. У ім зьмяшчалася просьба „паставіць у праграму канфэрэнцыі пытаньне аб пераглядзе Рыжскага міру і, як вынік адмены яго, прызнаць Беларускую Народную Рэспубліку".

Адначасна распаўсюджваўся зварот замежнай групы ЦК партыі беларускіх эсэраў з заклікам „удзяліць увагу беларускаму народу". У звароце гаварылася: „Мы просім Высокую Канфэрэнцыю не прызнаваць Рыжскага міру й ануляваць праведзены ў Рызе падзел Беларусі, кіруючыся этнаграфічнымі данымі. Просім прадставіць беларускаму народу свабоду ўстанаўленьня дзяржаўнага ладу й права свабоднай канфэдэрацыі" („Полымя", кастрычнік 1983 г., стар. 171).

Буржуазны Захад мала цікавіўся прыгнечанымі народамі, і, ня толькі да беларускага, але й да пытаньняў іншых малых народаў прыслухоўваліся краем вуха.

17 верасьня 1939 году Рыжскі трактат быў перакрэсьлены, але ня супраць волі народу, а дзеля дабра Беларусі й Украіны.

Пішучы гэты артыкул, я добра памятаю нядзелю 17 верасьня 1939 году. Раніцай чутны былі глухія выбухі з боку польска-савецкай граніцы. Пасьля па баку Заходняй Беларусі, высока над Стоўбцамі, паявіліся самалёты, але гораду не бамбілі. Сонца раніцай сьвяціла й я бачыў у самалётах чыр-

воныя хвасты. Калі я стаяў на вуліцы, каля мяне праляцеў на кані жаўнер. Я прыйшоў у хату й кажу хвораму бацьку, які ляжаў у ложку, што я бачыў жаўнера на кані, які праляцеў па нашай вуліцы, але гэта ня быў польскі жаўнер. Хворы бацька падняўся з ложка, сеў, перахрысьціўся й сказаў: „Дзякуй Богу, зьмена ўлады". І гэтак думалі амаль усе беларусы ў Заходняй Беларусі пад Польшчай. А што рабіла пазьней НКВД, гэта другая справа. Аднак аб'яднаньне Заходняй Беларусі з Усходняй было народам спаткана прыхільна.

Заняцьце Чырвонай Арміяй Заходняй Беларусі 17 верасьня 1939 году ратавала яе ад палянізацыі й акаталічаньня. Па ўсёй Заходняй Беларусі адкрыліся беларускія школы, а зь імі адкрылася дарога да вышэйшай асьветы, асабліва для беднай сялянскай моладзі, якая ня мела магчымасьці вучыцца пры Польшчы.

Той дваццацігадовы міжваенны перыяд польскае ўлады на землях Беларусі ўвайшоў у гісторыю як перыяд нацыянальнага прыгнёту й заняпаду нацыянальнай культуры. Войт у гміне, камэндант паліцыі на пастарунку, а ксёндз з амбоны кіравалі Заходняй Беларусьсю.

На працягу доўгіх стагодзьдзяў супольнага польска-беларускага жыцьця палякі кіраваліся сьляпым нацыяналізмам, шавінізмам, імпэрыялізмам. Гэтыя перастарэлыя навыкі перахоўваюцца некаторымі палякамі да нашага часу.

На заканчэньне гэтага артыкула варта сказаць, што паколькі пакт Рыбэнтропа-Молатава ёсьць варожы для палякаў, то няменш варожым для беларусаў зьяўляецца Рыжскі трактат, заключаны Домбскім і Іофэ.

(„Голас Часу" № 3, Лёндан 1989 г.)

Беларуска-польская канфэрэнцыя гісторыкаў

Некаторая беларуская прэса за месяц красавік гэтага году падала інфармацыю аб нядаўна адбыўшайся ў Менску першай навуковай канфэрэнцыі беларускіх і польскіх гісторыкаў прысьвечана беларуска-польскім сувязям у перыяд Вялікага Княства Літоўскага й Рэчы Паспалітай.

У канфэрэнцыі прымалі ўдзел Таварыства беларуска-польскай дружбы, Дом савецкай навукі й культуры ў Варшаве, Інсытут гісторыі АН БССР, Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт, Міністэрства народнай асьветы БССР, а таксама вучоныя з Варшавы, Познані, Торуні, Беластока. Гэта першая такога роду канфэрэнцыя й ёсьць надзея, што будуць і наступныя.

Так склалася палітычная кан'юнктура, што гісторыя Беларусі аказалася ня толькі занядбанай, але скажонай і то нашымі суседзямі з захаду й усходу. І цяпер, у часе галоснасьці, беларускія гісторыкі маюць нагоду выступіць і сказаць сваё слова праўды пра гісторыю Беларусі, ды запоўніць шматлікія „белыя й чорныя" плямы.

У сваім залажэньні канфэрэнцыя ёсьць карысная й на часе, бо-ж сапраўдным гісторыкам ходзіць, каб узгодніць гістарычныя факты супольнага шматвяковага сужыцьця беларускага й польскага народаў у адной дзяржаве так, як яны жылі ў сапраўднасьці. Аб'ектыўныя вынікі канфэрэнцыі могуць аказаць вялікую дапамогу ўкладальнікам падручнікаў для школаў і вышэйшых навучальных установаў па вывучэньні гісторыі гэтага перыяду, каб будучае маладое пакаленьне БССР і Польшчы магло засвойваць сапраўдныя веды, а не нацыяналістычную прапаганду.

Трэба спадзявацца, што нешта талковае будзе зроблена ў напрамку ўзгадненьня аснаўных гістарычных фактаў, бо да гэтага часу выказваліся спрэчныя паняцьці паміж польскімі й беларускімі гісторыкамі адносна Вялікага Княства Літоўскага.

Яшчэ й сёньня большасьць польскіх гісторыкаў прызнае, што вунія Літвы з Польшчай была карысная ня толькі для Польшчы, але няменш і для народаў ВКЛ. Як прыклад, палякі спасылаюцца на сваю вышэйшую культуру, якую яны, быццам, прынесьлі народам ВКЛ.

Такія асьведчаньні польскіх гісторыкаў аспрэчвалі й аспрэчваюць беларускія й расейскія гісторыкі, ды нават некаторыя замежныя й польскія гісторыкі не пагаджаюцца з паводзінамі палякаў на тэрыторыі ВКЛ. Факт той, што Рэч Паспалітая, якая пасьля вуніі зь Літвой сталася наймагутнейшай дзяржавай у Эўропе, у XVII стагодзьдзі аказалася арэнай грамадзянскай вайны, а ў канцы XVIII стагодзьдзя сталася ахвярай суседзяў.

Сталася гэта таму, што Польшча не рэспэктавала нацыянальныя й рэлігійныя пачуцьці народаў ВКЛ, а як нацыяналістычна-шавіністычная дзяржава накідала ім сілай усё сваё з мэтай спалянізаваць сьпярша магнатаў і шляхту праз Каталіцкі касьцёл, а пасьля прыступіць да палянізацыі народу праз увядзеньне царкоўнай вуніі. Гэта выклікала ў народзе агульнае незадаваленьне, хваляваньне, бунты, што прывяло да грамадзянскай вайны й утраты дзяржаўнай незалежнасьці Рэчы Паспалітай. Ня ўсе, аднак, польскія гісторыкі хочуць прызнаваць памылкі Польшчы.

Тэма гісторыі старая, але падыход да яе новы. Аб ходзе першай канфэрэнцыі выказаў свае погляды старшыня Беларуска-Польскага таварыства прафэсар Леанід Лойка ў газэце „Советская Белоруссия" ад 16 красавіка г.г. у артыкуле „Наши корни истории".

Адно з важных пытаньняў, якое парушае праф. Л. Лойка, гэта паходжаньне беларускай дзяржаўнасьці: ці Вялікае Княства Літоўскае было літоўскім ці беларускім. У даным пытаньні, — кажа праф. Лойка, — становішча польскіх гісторыкаў аказалася неаднолькавае. У шмат чым паўтараюць яны канцэпцыю часоў беларускага гісторыка Л. Абэцэдарскага зь яго манаграфіяй 70-х гадоў.

Але не адзін Абэцэдарскі пісаў гісторыю Беларусі ў духу яе русыфікацыі й фальсыфікацыі. Русыфікаваў Беларусь многа хто да Абэдэрарскага, а найбольш царскія гісторыкі й нават савецкая Акадэмія навук БССР.

Як польскія, так і расейскія белыя й чырвоныя імпэрыялістычныя гісторыкі прыпісвалі сваё культурнае дабрадзейства ў разьвіцьці Беларусі, якое было ў сапраўднасьці не што іншае, як палянізацыя й русыфікацыя беларусаў. Дзесяткі пакаленьняў беларусаў выраставалі ва ўмовах палітыкі палянізацыі, русыфікацыі і дыскрымінацыі беларускай культуры. Не даючы права на беларускую мову, школу, нашы суседзі закладалі свае польскія або расейскія школы. І гэта называлі яны пашырэньнем культуры сярод беларусаў.

Летапісы й дакуманты гавораць, што яшчэ да прыходу на Беларусь дабрадзеяў з захаду й усходу, ужо за Альгерда (памёр у 1377 г.) на беларускай мове вялася дзяржаўная канцылярыя ВКЛ. За караля Казіміра Ягайлавіча (1440-

1492) у 1457 годзе выдадзены быў „Земскі прывілей Казіміра", які напамінае ангельскую „Магну Хартыю". За Казіміра выдадзены быў „Судзебнік" — зборнік пісаных законаў для дзяржаўных судзьдзяў.

У 1517 годзе пачынаюць выходзіць з друку ў перакладзе на беларускую мову кніжкі Бібліі пад агульнай назвай „Библия руская выложена доктором Франциском Скориною из славного града Полоцка, Богу ко чти и людем к доброму научению".

Перакладзеная Скарыною на родную мову Біблія апярэдзіла палякаў і расейцаў. Была яна трэцяй пасьля нямецкай (1445) і чэшскай (1488) і ёю карысталася ўся ўсходняя славянская Эўропа.

У XVI стагодзьдзі выйшлі на беларускай мове тры Статуты дзяржаўных законаў у 1529, 1566 і 1588 гадох. Польскі гісторык Ежы Ахманскі піша: „III Статут Літоўскі, які абавязваў аж да 1840 году, зьяўляецца выдатным помнікам літоўскага права й перавышае ня толькі Судзебнікі маскоўскія 1497, 1550, 1649 гадоў, але дамінуе над шматлікімі заходнееўрапэйскімі кодэксамі, не гаворачы ўжо аб Польшчы, якая не змагла здабыцца на падобны збор правоў" („Гісторыя Літвы", Вроцлав 1982, стар. 133).

У 1585 годзе выдадзены быў „Трыбунал", які зьяўляецца ня толькі юрыдычным дакумантам, але таксама каштоўным помнікам баларускай мовы.

Факты гавораць самі за сябе, што беларускія феадалы тае пары былі людзьмі адукаванымі, уважалі сябе за беларусаў, а не палякаў ці пазьней за расейцаў, і, як гаспадары дзяржавы, пісалі свае законы на роднай беларускай мове. Канцлер Леў Сапега ў прадмове да Статуту пісаў: „Не обчим яким языком, але своим власным правы списаные маем и каждого часу чого нам потреба ку спору всякое крывды ведати можем".

Кастусь Тарасаў піша: „Трэці Статут Вялікага Княства Літоўскага набыў шырокую эўрапэйскую вядомасьць. Ён перакладаўся на польскую, нямецкую, лацінскую, французскую мовы; выкарыстоўваўся на Маскоўскай Русі пры падрыхтоўцы Саборнага ўложэнія 1649 года, у судах Эстоніі й Латвіі. Статуту было наканавана доўгае жыцьцё. Ён дзейнічаў усё

XVII і XVIII стагодзьдзі, толькі ў 1840 годзе царскі загад скасаваў яго" („Памяць пра легенды", Мінск 1990, стар.110).

Прафэсар Оксфардзкага ўнівэрсытэту В. Морфіл у сваёй кніжцы на ангельскай мове піша: „Беларусы былі найбольш цывілізаванай нацыяй на Ўсходзе Эўропы. На беларускай мове дайшлі да нас сапраўдныя дакумэнты, якія выдавалі польскія каралі сваім подданым у XV-XVI стагодзьдзях" („Полянд", Лёндан 1893, стар. 14).

Але пасьля польска-літоўскіх вуніяў, канец XVII і амаль усё XVIII стагодзьдзе, гэта найбольш убогі, крытычны й трагічны перыяд беларускай культуры на працягу ўсяе яе гісторыі. У 1697 годзе сойм Рэчы Паспалітай выдаў закон аб забароне ўжываньня беларускай мовы ў афіцыйнай дакумэнтацыі. Пісаць дазвалялася толькі па-польску або па-латыні. У XVIII стагодзьдзі ў беларускай літаратуры не знаходзім ніводнага паважнейшага пісьменьніка.

Сьцьверджаньні некаторых польскіх гісторыкаў, што знаходжаньне Беларусі ў складзе Рэчы Паспалэтай спрычынілася да яе разьвіцьця ў духу заходняй культуры, якую прынесьлі палякі на „крэсы всходне", не адпавядае праўдзе. Палякі прынесьлі на ўсходнія землі не культуру, а няшчасьце. Яны былі фактычна ініцыятарамі ліквідацыі слаўнай усходняй грэка-візантыйскай культуры, якая стаяла вышэй за заходнюю рымскую. Ліквідавалі яе палякі праз свой сьляпы нацыяналізм і ваяўнічую Каталіцкую царкву пад інсьпірацыяй „непамыльных" рымскіх папаў.

Пакуль да заходняй культуры, то палякі сьпярша запазналіся й карысталіся ўсходняй культурай, якая ішла ў Польшчу з Маравіі. Аб гэтам гаворыць зварот мараўскага князя Сьвятаполка да лідэра польскага племя палян, каб прыняў хрысьціянства, якое ў другой палове IX стагодзьдзя пашыралі там браты Канстанцін-Кірыла й яго брат Мяфодзій ва ўсходнім праваслаўным абрадзе. І гэты абрад быў прыняты ў Польшчы.

Усе вуніі, якія зьвязалі Беларусь з Польшчай, хаця некаторыя польскія гісторыкі пішуць, што былі яны дабравольныя, у сапраўднасьці былі навязаны. Не народ тварыў іх, а кіраўнікі алігархічнай клясы. Яны пад прэтэкстам прагрэсу заходняй культуры, на практыцы аказаліся тормазам у разьвіцьці агульных культур народаў ВКЛ, што спрычы-

нілася да ўпадку Рэчы Паспалітай. Вуніі прынесьлі больш шкоды народам ВКЛ, чым карысьці.

Сьпярша вунія была карыснай у сэнсе абаронным супраць крыжакоў і заключана была праз сужэнства Ягайлы зь Ядвігай. Але калі прыйшлося ВКЛ ваяваць у абароне сваіх зямель супраць наступу Маскоўскай дзяржавы, то палякі не сьпяшаліся з дапамогай. Толькі тады пачалі памагаць, калі ўбачылі небясьпеку для сябе. І ў гэты крытычны час вайны Вялікага Княства Літоўскага з Масквой, за помач ВКЛ павінна было заключаць новыя вуніі з Польшчай, якія аддавалі ВКЛ пад апеку Каралеўства Польскага, якое дзейнічала ў інтарэсах палякаў. А ў іх інтарэсах была каталізацыя, палянізацыя й захоп зямель ВКЛ, што яшчэ больш насьцярожыла Маскву супраць Вялікага Княства Літоўскага.

Вялікае Княства Літоўскае ў сваім залажэньні было дзяржавай, у якой шанавалася этнічнае паходжаньне народаў і іхняе рэлігійнае перакананьне. Ужо на самых пачатках тварэньня ВКЛ Міндоўгам і Гедымінам быў пакладзены моцны падмурак, які не нарушаў „старыны" — г.зн. захоўваліся старыя парадкі, якія былі заведзены раней. Гэта садзейнічала кансалідацыі ўнутраных сіл дзяржавы.

Аднак палякі не ацанілі належным чынам гэтага важнага народнага права, а нарушыўшы „старыну" пачалі ўводзіць свае парадкі ў ВКЛ і праз сваю каталізацыю й палянізацыю магнатаў, шляхты й сялян спрычыніліся да маральнага й эканамічнага заняпаду сьпярша ВКЛ, а неўзабаве гэты самы лёс напаткаў і Польшчу.

Сілай абставін часу Беларусь сталася забытым краем. Аб ёй пісалі й успаміналі як аб Польшчы, а пасьля як і Расеі. Асобнага аб'ектыўнага дасьледаваньня не было. Яе лепшыя творчыя сілы выкарыстоўвалі палякі, а пасьля падзелаў Рэчы Паспалітай —расейцы. Яны не прызнавалі існаваньня беларускай нацыі як народу, яе мовы, а бачылі на гэтай зямлі толькі „заходнерускі народ", або „польска-літоўскую шляхту", а яе мову называлі дыялектам. Такая тэрміналёгія вяла да скажэньня ўсяго гістарычнага працэсу беларускага народу й замоўчваньня яго багатай гісторыі й культуры.

Першы падзел Рэчы Паспалітай яе суседзямі ў 1772 годзе прамовіў да розуму некаторых польскіх дзеячоў, але не

зусім. Старыя пасяганьні на чужое засталіся жыць. Канстытуцыя 3-га Мая 1791 году, аб свабодзе якой так многа гаварылі, расьпісвалі ды ў далейшым расхвальваюць палякі, у сапраўднасьці не палепшыла, а толькі пагоршыла абставіны народаў ВКЛ у адносінах да Польшчы. Канстытуцыя, горш чым Люблінская вунія (1569), накінула сваю гегемонію народам Вялікага Княства Літоўскага. Не зьвяртаючы ўвагі на Статут ВКЛ ад 1588 году, які гаварыў аб захаваньні ў спакою падданых нашых абыватэляў панства з боку рознага разуменьня й ужываньня хрысьціянскага набажэнства. Ужо ў сваім першым пункце Канстытуцыі пастаноўлена, што нацыянальнай рэлігіяй у дзяржаве ёсьць і будзе сьвятая рымска-каталіцкая вера й пераход зь дзяржаўнай веры ў другую забараняецца. На ўсе тэрыторыі Рэчы Паспалітай мела расьцягвацца аднолькавая адміністрацыя й судаводзтва, зразумела, на польскай мове. І ў такім канстытуцыйным строі Вялікае Княства Літоўскае раўнялася польскім правінцыям Велькапольскі й Малапольскі.

Усходнія народы Рэчы Паспалітай, якія мелі адменную мову, звычаі, рэлігію й дэмакратычныя прынцыпы, змушаны былі паддацца Польшчы. Аб гэтым піша вядомы польскі пісьменьнік Крашэўскі ў сваёй манаграфіі „Вільно": „І так Польшча паглынала ня толькі Літву, але ад гэтага часу (...) накідала ёй усё сваё права, адміністрацыю, звычаі, мову, не пакідаючы прыроджанага (карэннага), не дастасоўваючыся да гэтага краю".

А ў канцы Крашэўскі абвінавачвае Польшчу ва ўтраце незалежнасьці Літвы. Вуніі адчынілі шырока дзьверы для польскай эміграцыі і калянізацыі ВКЛ. Як прызнаюць самі палякі, эміграцыя была „выборова", яе складалі ксяндзы, манахі розных ордэнаў, навукоўцы, палітыкі, пісьменьнікі й г.п. Заданьнем гэтых людзей было насяляць гарады, апаноўваць вёскі, прылучаць сабе ўсё, што прадстаўляла матэрыяльную вартасьць, як зямля, галоўным чынам праз Каталіцкі касьцёл і ўладу, прысьпяшаць палянізацыю краю.

Падобныя рэчы дзеяліся на Беларусі й пад Расеяй пасьля падзелаў Рэчы Паспалітай. Таму неабходна, каб беларускія гісторыкі правялі сваю канфэрэнцыю з расейскімі гісторыкамі й напомнілі ім захоп Смаленшчыны, Пскоў-

шчыны й узгоднілі шэраг гістарычных фактаў з гісторыі Беларусі, якія да гэтага часу падаюцца фальшыва й так сама вучаць у сваіх школах моладзь. Да таго прэса, радыё, тэлевізія падаюць далёкія ад праўды інфармацыі па гісторыі Беларусі. Шматлікія дасягненьні беларусаў расейцы прыпісваюць сабе, як гэта рабілі раней палякі, або замоўчваюць. Многа хто знае, што ўсё гэта робіцца сьвядома з мэтай прынізіць слаўнае мінулае Беларусі ў галіне культуры, цывілізацыі, збройнай сілы, а паказаць, што толькі дзякуючы ўзьяднаньню Беларусі з Расеяй, дзякуючы Кастрычніцкй рэвалюцыі, савецкай уладзе й мудрай партыі, Беларусь атрымала „дзяржаўную незалежнасьць" і права на разьвіцьцё свае культуры й т.п.

Расейскія дзяржаўныя гісторыкі, як „старшыя браты" беларусаў, саромеюцца прызнаць, што расейцы вучыліся шмат чаго ў беларусаў, а не беларусы ў расейцаў. Усяго гэтага немагчыма ўспамянуць і пералічыць, але можна прыпомніць ужо раз згаданага Л. Абэцэдарскага, які, зьвязваючы Беларусь з Расеяй, прызнаў уклад беларусаў у разьвіцьцё культуры й цывілізацыі Маскоўскай дзяржавы. Ён пісаў: „Выхадцы зь Беларусі склалі пераважную большасьць прыдворных майстроў маскоўскага цара. Беларускія майстры прывезьлі ў Расею тэхніку аб'ёмнай разьбы па дрэву, тэхніку вырабу рэльефных паліхромных кафляў. Яны падрыхтавалі паяўленьне ў Расеі скульптуры. Віцебскі аружнік Лука Журын удасканаліў вытворчасьць рускай агнястрэльнай зброі. Праслаўлены зодчы XVI в. Янка Бухвостаў быў выхадцом зь Беларусі. Шырока вядомая дзейнасьць у Расеі паэта, драматурга, педагога Сімяона Полацкага. Выхадцы зь Беларусі былі акцёрамі, дэкаратарамі, касьцюмерамі, рэквізітарамі першага ў Расеі прыдворнага тэатра. У Расеі працавалі беларусы — перакладчыкі, друкары, настаўнікі, сьпевакі, іканапісцы. Сусьветную славу набылі такія помнікі архітактуры й мастацтва, як Каломенскі дварэц цара Аляксея, Васкрасенскі храм Нова-Іерусалімскага манастыра на Істры, Круціцкі церамок у Маскве, разны іканастас Смаленскага сабора былога Нова-Дзявічага манастыра — помнікі, якія зьяўляюцца выдатнейшым вынікам творчай садружнасьці беларускіх і рускіх майстроў" („У сьвятле не-

абвержаных фактаў", Мінск 1969, стар. 91-92). З гэтага бачым, што „малодшы брат" перарос „старэйшага брата" на галаву. Аднак „старэйшы брат", прысвоіўшы сабе мудрасьць „малодшага брата", пастанавіў зьнішчыць яго. Як пісаў у 1924 годзе А. Чарвякоў, „усё тое, што так ці іцакш гаварыла аб былой гісторыі беларусаў, што так ці інакш магло напамінаць, што Беларусь гэта ня ёсьць Расея, — усё гэта нішчылася, прасьледавалася агнём ды жалезам".

Нямала было зьнішчана й вывезена зь Беларусі яе гістарычных і культурных рэчаў. Некаторыя зь іх сёньня можна знайсьці ў розных канцох сьвету, а найбольш у Расеі, Польшчы й Літве. Што праўда, робяцца захады вярнуць Беларусі яе спадчыну, але ня так лёгка й проста вярнуць гэтыя рэчы. Ды ўлада ў краіне была яшчэ ня так даўно ў руках тых-жа камуністаў, што нішчылі беларускую народную культуру, ды яшчэ й сёньня няведама як будуць ставіцца да яе. І таму некаторыя беларусы на эміграцыі неахвотна давалі свае эмігрыйныя выданьні ў беларускія дзяржаўныя ўстановы ў краі, баючыся, каб яны зноў не пайшлі з дымам, або цьвілі ў падвалах цэнзараў.

Вяртаючыся да дзейнасьці палякаў у Вялікім Княстве Літоўскім, то ім даваліся вялікія зямельныя надзелы, якія зрабілі іх магнатамі. З часам да такіх магнатаў належалі абшырныя полаці беларускіх зямель: у Віленскай і Гарадзенскай губэрнях — 60%, у Менскай губэрні — 53,9% і ў Магілёўскай губэрні — 41,9% прыватнай зямельнай уласнасьці. Сюды трэба ўлічыць і беларускіх магнатаў, якія з прыняцьцём каталіцкай веры сталіся палякамі. Таму, рэч зразумелая, што беларускае сялянства, якое хварэла на зямлю, не магло быць задаволенае такімі парадкамі, што раней ці пазьней вяло да тайнага й яўнага бунту.

Як паказвае гісторыя, нашы суседзі-акупанты грунтаваліся не на аб'ектыўных жыцьцёвых рэаліях, а на сьвядомым скажэньні праўды. Гэта-ж яны руйнавалі беларускія народныя звычаі, мову, права, веру й не давалі доступу да свае навукі. Расейцы высунулі нават плян падзяліцца Беларусьсю з палякамі й такім парадкам зь імі пагадзіцца, бо ж шляхта й магнаты былі спалянізаваны, а сялянская маса запрыгоненая й ёю можна было кіраваць свабодна.

Нямала было й сваіх янычараў, якія, перайшоўшы ў лягер ворага на службу, памагалі нішчыць беларускую культуру. Рабілася так, каб забіць нацыянальную сьвядомасьць, каб народ ніколі не даведаўся аб сваіх слаўных продках, сваёй культуры, гісторыі й сіле мяча беларускага воя, які мужна змагаўся ў абароне свае незалежнай дзяржавы, якой было ВКЛ і не ў адным баі з крыжакамі, швэдамі, татарамі, масквічамі, прынёс вялікую славу. Былі гэта памятныя гістарычныя баі пад Грунвальдам, Хоцімам, Воршай і інш. І пазьней ваявалі беларусы, але пад чужымі сьцягамі, прыносячы славу чужынцам.

І толькі цяпер сярод некаторых гісторыкаў гэтых народаў пачынае фарміравацца сьвядомасьць перагляду дзяржаўнай палітыкі й узаемных дачыненьняў. І цяпер настаў час вывучыць мінулае Беларусі так, як гэта ёсьць прынята ў цывілізаваных краінах.

Шкада, што на канфэрэнцыі ў Менску польскія гісторыкі не прад'яўлялі прэтэнзій да беларускіх земляў, хоць у часе апошняй прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ў Польшчы Лех Валэнса сказаў, што ён памятае аб „крэсах".

Як падае газэта „Свабода (№ 9, травень 1991 г.) ва ўлётцы польскай Трвалэй Рады Едносьці Краю было напісана: „Суайчыньнікі! Палякі! Расея павінна вярнуць Польшчы захопленыя ёю, пачынаючы ад 1772 г., адвечныя польскія гарады й землі. (...) Што тычыцца ўстанаўленьня ўсходняй мяжы Польшчы, мы вельмі цешымся, што беларусы ўважаюць, што наша зь імі мяжа яшчэ канчаткова ня вызначана. Па сутнасьці й мы так уважаем і жадаем вярнуць часова занятыя польскія землі з гарадамі Каралявец, Вільня, Горадня, Берасьце, Наваградак, Баранавічы, Слонім, Смаленск, Львоў ды іншыя".

Або, як падае „Наша Ніва" (№ 1, травень 1991): „«Падарожжа на крэсы» — пад гэдакай рубрыкай варшаўская тэлевізія апошнім часам падае дакумантальныя стужкі з колішніх крэсаў. Нядаўна апавядалася пра Мерачоўшчыну й Ружаны. Зьмест: польскі сантымэнт, адраджэньне пальшчызны, каталіцтва — польскай веры".

І як згадвае праф. Л. Лойка, на канфэрэнцыі была сказана такая фраза: „Гэтыя быўшыя польскія землі, безумоўна, павінны застацца ў Беларусі".

Ніякія „быўшыя польскія землі" не засталіся ў Беларусі, толькі яшчэ Сталін аддаў Польшчы карэнную беларускую Беласточчыну й Бельшчыну. Якая вялікая была раней Польшча, можна знайсьці на карце XIV стагодзьдзя. Тады граніца Каралеўства Польскага зь Вялікім Княствам Літоўскім праходзіла даволі далёка на захад ад Беластока, далей на захад ад Суража, Браньска, Драгічына й Белай.

Так, што быўшыя польскія землі знаходзяцца далей на захад ад Беластока й ракі Буг. А калі мы глянем на карту ад 1385 года, то Польшча была яшчэ меншай. Але да падзелу Рэчы Распалітай у канцы XVIII стагодзьдзя граніца Польшчы пасунулася на ўсход на беларускую й украінскую тэрыторыі. На Беларусі гэтая граніца адпавядае амаль сучаснай граніцы Беларусі з Польшчай за выняткам згаданай ужо Беласточчыны й Бельшчыны.

Якая-б не была дамоўленасьць паміж беларускімі й польскімі гісторыкамі на канфэрэнцыях, аднак цяжка паверыць, каб палякі адмовіліся ад сваіх імпэрыялістычных пасяганьняў на Ўсходзе, а асабліва на Беларусі. Аб гэтым сьведчаць шматлікія факты апошняй дзейнасьці польскіх агітатараў на Беларусі, якія школяцца ў Польшчы й засылаюцца на Беларусь, дзе галоўны рэй вядуць польскія ксяндзы праз свой Каталіцкі касьцёл.

Многа гавораць палякі ў краі аб вялікай колькасьці палякаў на Беларусі, але не аб беларусах нават на Беласточчыне. Інфармацыйна-культурнае выданьне праваслаўных беларусаў усходняе Беласточчыны „Часопіс" падае, што людзі, якіх можна лічыць адукаванымі, апісваючы Беластоцкае ваяводзтва аб беларусах не ўспамянулі, а залічылі іх да мазураў. Але не забыліся ўспамянуць „энклявы людносьці літэвскей і татарскей". Такіх фактаў прамоўчваньня беларусаў даволі многа.

Ня ёсьць гэта нешта новае. Польская шавіністычная экспансія на Беларусь мае сваю старую й багатую гістарычную місію, але не ганаровую. Сёньня яна яшчэ раз ажывілася таму, што на гэта адпавядаюць палякам спрыяльныя абставіны. Ды нават беларускія культурнікі садзейнічаюць гэтай польскай акцыі. Як падае беларуская прэса ў краі, творчая і навуковая беларуская інтэлігенцыя ў Менску хо-

даецца стварыць Таварыства прыхільнікаў польскай культуры на Беларусі.

Апошнім часам з боку дзяржаўных культурных устаноў Беларусі й Польшчы намячаецца ўзаемная дапамога сваім суродзічам за польска-беларускай мяжой. Маецца на мэце стварыць сумесную камісію, якая будзе дасьледаваць супольную спадчыну абодвух народаў і абменьвацца культурнымі здабыткамі.

Усё гэта выглядае прыгожа на словах і на паперы, але ў практычным жыцьці гараць праваслаўныя цэрквы, капліцы, дамы сьвятароў на Беласточчыне, ломяцца замкі ў цэрквах, разбураюцца помнікі й крыжы над магіламі памерлых праваслаўных. І да гэтай нікчэмнай работы спрычыняюцца польскія навукоўцы праз сваю фальшывую навуку, каб толькі пасеяць зерні варожасьці супраць праваслаўных беларусаў на Беласточчыне, ды зрабіць іх палякамі й ворагамі свайго беларускага народу. А на Заходняй Беларусі вядзецца прапаганда за прыналежнасьць яе да Полыпчы. Палякі гавораць беларусам адкрыта: „Вымятайцеся за Стоўбцы!", а нават за Смаленск. І як можна з гэтым пагадзіцца?

Я не зьяўляюсы ворагам ані польскай, ані расейскай, ані іншай культуры, але думаю, што лепш будзе, калі беларусы, аматары польскай культуры, створаць на Беларусі Таварыства абароны беларускай культуры ад варожых наступаў сваіх суседзяў і адвядуць болш часу на аднаўленьне сваёй пакрыўджанай культуры й скажонай гісторыі.

На жаль, у „Заяве старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР тав. Кебіча В. Ф. аб граніцах Беларусі" было сказана наступнае: „Хачу таксама падкрэсьліць, што мы ня пойдзем ні на якія крокі па пераглядзе цяпер існуючых граніц. І ў нас няма ніякіх тэрытарыяльных прэтэнзіяў да нашых суседзяў" („Звязда" № 4174, 5 верасьня 1991 г.).

Гэта прыкрае асьведчаньне старшыні Савета Міністраў сувэрэннай дзяржавы, які так хутка й лёгка пагадзіўся з варожай сілай над правам. Для паважанага старшыні Вячаслава Кебіча добра вядома, што граніцы Беларусі па Першай і Другой Сусьветных войнах вызначаліся без удзелу беларусаў. За іх плячыма рабіўся гандаль іхняй тэрыторыяй. Таму граніцы Беларусі павінны быць перагледжаны

й вырашаны згодна гістарычных фактаў, а не казаць загадзя, што „ў нас няма ніякіх тэрытарыяльных прэтэнзіяў да нашых суседзяў".

(„Голас Часу" № 14 (5), 15 (6), Лёндан 1991 г.)

Палякі на Беларусі й аб Беларусі

Кшыштоф Машкоўскі у газэце „Тыдзень польскі" ад 30 траўня 1992 году ў сваім невялікім артыкуле „Адраджэньне Беларусі" выказвае свае ўражаньні ад пачутага ад сваіх прыяцеляў, якія пабывалі на Беларусі. Тут коратка ўспамінаецца гутарка з дацэнтам унівэрсытэту ў Менску Паўлам Церашковічам і пераклад ягонай працы праф. А. Мальдзісам на польскую мову.

У выніку такіх інфармацыяў аўтар артыкула прыходзіць да заключэньня й дараджае, што ў сувязі з палітычнымі й гаспадарчымі зьменамі, якія адбыліся на Беларусі, трэба „неабходна вярнуцца да прынцыпаў талеранцыйнай рэлігійнай маралі й законнасьці. Тое, што раней рэпрэзэнтавала г.зв. вышэйшая сфэра памешчыкаў і арыстакратыі, зь якімі лічыліся капіталісты. (...) Ці не было-б талковым шукаць разьвязкі ў павароце на Беларусь былых земляўласьнікаў: Сапегаў, Радзівілаў, Тышкевічаў і інш. (Даведаліся, што робяцца захады склікаць у Нясьвіжы сямейны зьезд Радзівілаў). Паварот гэтых людзей даў-бы Беларусі многа карысьці: знайшоўся-б гаспадар зямлі". А газэта „Свабода" (№ 5 за травень 1992 г.) падае, што „Радзівілы, магчыма, зьбяруцца ў Нясьвіжы". Гэтую навіну прывёз з Польшчы доктар Адам Мальдзіс, які сустракаўся з Радзівіламі ў Варшаве, куды яны зьехаліся на пахаваньне Фэрдынанда Радзівіла.

„Аказваецца, нясьвіжскія Радзівілы вельмі сур'ёзна думаюць пра тое, як дапамагчы Нясьвіжу й зьбіраюцца ўтварыць з гэтаю мэтай свой Фонд, — распавядае А. Мальдзіс. — Вялікіх грошай цяпер у іх, натуральна, няма, але ёсьць імя, ёсьць сувязі, і калі сапраўды ўтворыцца Фонд Радзівілаў, гэта будзе карысна. Можа тады ўдасца як сьлед заняцца растаўрацыяй нясьвіжскага фарнага касьцёла, а магчыма, і аднаўленьнем замка ў першапачатковым выглядзе. Дарэчы, нядаўна ў Англіі мне давялося сустракацца з Лізаве-

тай Радзівіл (Тамашэўскай), у якой я пабачыў вельмі каштоўныя фатаздымкі замкавых інтэр'ераў: дзе-якія карціны віселі, якая зброя, колькі было слуцкіх паясоў. (...)

Па словах Адама Мальдзіса, год таму Радзівілаў запрашалі на Беларусь. Беларускі фонд культуры разаслаў па розных краінах зварот да іх з прапановай правесьці ў Нясьвіжы зьезд Радзівілаў усяго сьвету. Аднак тады Радзівілы насьцярожана паставіліся да гэтай ідэі, афіцыйна адгукнуўся толькі адзін зь іх. Цяпер сытуацыя зьмянілася й нясьвіжскія Радзівілы выказваюць жаданьне сабрацца ў сваім радавым замку. Такую сустрэчу, на думку спадара Мальдзіса, можна наладзіць ужо сёлета ўвосень, калі ў Нясьвіжы будзе праходзіць фэстываль старадаўняй беларускай музыкі".

Таксама, у той самай польскай газэце „Тыдзень польскі" ад 30 траўня быў зьмешчаны артыкул пані Анны Пругар пад загалоўкам „Імпрэсіі зь Менску беларускага". Гэты артыкул ня ёсьць прыязны для Беларусі. Аўтарка згадвае Менск як былую сталіцу БССР, а цяпер як цэнтр СНД, які стаў вядомы ў сьвеце па афіцыйных камунікатах. Але аб самым Менску аўтарка піша, што гэты горад брыдкі, без характару. „Што было прыгожае, даўно зьнішчана". Крытыкуе апошнюю архітэктуру горада, вяртаецца да апошніх стагодзьдзяў, калі Менск „у вялікай меры фармавалі палякі". Не памінула яна згадаць і каталіцкі „чырвоны касьцёл", будова якога ёсьць „зьвязана з польскім памешчыкам Зямлі Слуцкай Эдвардам Вайніловічам". Далей ідзе змаганьне католікаў за гэты касьцёл.

Не зусім задаволена пані Анна й са свайго наведаньня бібліятэк, дзе мала чаго знайшла польскага. Праўда, знайшла яна ў чытальні Акадэміі тоўстыя кніжкі пісаныя на працягу двух стагодзьдзяў на польскай мове пра Радзівілаў у Нясьвіжы. Але як зазначае пані Анна Пругар, „ніхто аднак не заглянуў у гэтыя кніжкі, а працаўнікі бібліятэкі неахвотна ўспамінаюць іх паходжаньне". І далей піша: „На канец гэтага падарожжа па Менску па сьлядох нашых землякоў і продкаў папала я ў Беларускую народную галерэю". І тут пабачыла Сапегаў, Радзівілаў і ім падобных, аднак не была задаволена, бо не знайшла слова „Польска", а толькі ўспаміналася Рэч Паспалітая й то неахвотна.

Такія гэта ўяўленьні й намеры шматлікіх палякаў, якія так прагна лезуць на Беларусь і якіх падтрымліваюць беларускія „дзеячы культуры". Для прыкладу прывядзём яшчэ выказваньні польскай пісьменьніцы Марыі Чапскай, якая паходзіць зь сям'і абшарніка на Меншчыне і якая зусім інакш разумее праблему Беларусі й беларусаў. У сваёй кніжцы на польскай мове яна піша:

„Яшчэ перад бальшавіцкім пераваротам (1917 г.— Ю. В.) скліканы быў палякамі ў Менску, у вялікай залі Сельскагаспадарчага таварыства, сход беларускіх грамадзян, якія мелі дарогай агульнага галасаваньня выказацца аб будучыні краіны.

Старшынствавалі на сходзе двух найбольш заслужаных яго грамадзян Раман Скірмунт і Эдвард Вайніловіч. Усе мы любілі наш родны край і ніколі-б яго не пакінулі-б, уроджаныя й выхаваныя на Беларусі, але не здавалі сабе справы зь яе своеасаблівасьці й ужо скрышталізаванай нацыянальнай сьвядомасьці.

Праз стагодзьдзі польскага кіраўніцтва на Літве й Беларусі эліта народу, зь вялікай для гэтага народу шкодай, палянізавалася й адыходзіла ад сваіх асноў.

Нашы суседзі, аснаўная большасьць шляхты й менскай інтэлігенцыі, вырасла зь беларускага пня, але ўзбагачаныя й узьнесеныя да годнасьці, як Вайніловічы, Ваньковічы, Багдановічы, Федаровічы, Трэпкі, Ёдкі й іншыя паступова далучаліся да наплывовага польскага элемэнту, прымаючы мову, звычаі й веру калянізатараў, ды сваімі характэрнымі якасьцямі ўзбагачалі й замацоўвалі польскі элемэнт, замест тварыць эліту свайго народу; гэты самы працэс адбыўся на Літве этнаграфічнай, гэта самае здарылася з дынастычнымі родамі Чартарыскіх, Сангушкаў, Сапегаў, гэта самае з Радзівіламі, спольшчанымі як уся літоўска-беларуская шляхта.

І калі на менскім сходзе жадалі адказаць на пытаньне, ці Беларусь мае вызначць сваё існаваньне як незалежная рэспубліка, ці мае быць злучана, як перад падзеламі, з Польшчай, аграмадная большасьць галасавала за злучэньне з Польшчай. Ня ведаю, ці нацыянальна сьвядомыя беларусы прысутнічалі на гэтым сходзе й якое занялі-б яны становішча калі-б былі. Нам, галасуючым за злучэньнем Беларусі

з Польшчай здавалася, што гэты край безабаронны перад расейскім захопніцтвам і павінен мець апору ў Польшчы. Супраць злучэньню з Польшчай выказаліся два кіраўнікі сходу: Раман Скірмунт і Эдвард Вайніловіч, што мелі ім у той час за зло, не разумеючы заданьня" („Час одменёны", Парыж 1978, стар. 42-43).

Вось яскравыя прыклады беларускай спольшчанай магнацкай эліты — „гаспадароў зямлі", да чаго яны імкнуліся, да якога стану прывялі народ і край. І хто сёньня запрашае гэтых людзей на Беларусь? Беларускі фонд культуры! Што бачыць у гэтых людзях Адам Мальдзіс? Рэстаўрацыю касьцёлаў, палацаў і што больш! Аднак, на маю думку, у вяртаньні Радзівілаў і іншых магнатаў на Беларусь, як гэта прапануе пан Кшыштоф Машкоўскі, Беларусь ня знойдзе спраўдных „гаспадароў зямлі", а толькі старых эксплёататараў, рэнэгатаў, палянізатараў, прыгнятальнікаў і ворагаў беларускай дзяржаўнай незалежнасьці. Ці-ж ня так?

(„Голас Часу" № 20 (5), Лёндан 1992 г.)

„Браця з-за Буга"

Пад такім загалоўкам Зэнон В. Унгар зьмясьціў арыткул у „Дзёньніку польскім" за 7 жніўня 1992 г. Аўтар падае, што па ініцыятыве Камітэту памяці Адама Міцкевіча пры Саюзе палякаў Беларусі 23-25 чэрвеня 1992 году адбылася міжнародная навукова-краязнаўчая канфэрэнцыя „Спатканьне над Сьвіцязьзю". На радзіме Адама Міцкевіча, у Наваградку, заселі навукоўцы Польшчы, Літвы й Беларусі. Праз тры дні ішлі дыскусіі на беларускай і польскай мовах. Гаварылі аб нацыянальным адраджэньні народаў І-ай Рэчы Паспалітай. Факт гэты падкрэсьліў старшыня Саюзу палякаў Беларусі Тадэвуш Гавін, сказаўшы: „Чуюся шчасьлівым, што пасьля столькіх гадоў татальнай няволі можам адрадзіць сваю мову й культуру; павінны зрабіць усё, каб утрымаць добрыя адносіны агульных мэтаў братніх народаў гэтай зямлі".

Застаецца толькі спытаць прамоўцу: калі гэтыя добрыя адносіны й агульныя мэты былі сярод братніх народаў на гэтай зямлі пры панаваньні Польшчы?

У другім нумары „Дзёньніка польскага" за 5 кастрычніка 1992 году, таксама пад загалоўкам „Браця з-за Буга" чытаем, што ў Лёндане створана польская арганізацыя „Браця з-за Буга". Як падае газэта, арганізацыю прывітаў, пару месяцаў таму, старшыня Галоўнай управы Саюзу палякаў Беларусі Тадэвуш Гавін, сказаўшы: „Галоўная ўправа Саюзу палякаў Беларусі з сядзібай у Горадні падтрымоўвае ініцыятыву нашых суайчыньнўкаў у Англіі аб стварэньні арганізацыі Браця з-за Буга ў Вялікабрытаніі".

Арганізацыя паўстала. І як падае „Дзеньнік польскі" за 15 кастрычніка 1992 г., у горадзе Нотынгам (Англія) адбылася сьціплая акадэмія ў парафіяльнай залі. Прысутнічалі на ёй пераважна „крэсовяцы". На акадэміі гаварылася аб 53 гадавіне здрадніцкага нападу саветаў на ўсходнія землі Польшчы 17 верасьня 1939 г., які скурчыў Польшчу на Ўсходзе. Гаварылася аб „крэсовым" народзе, які быў „пшэдмужэм хшэсьціяньства", аб утрачанай сваёй зямлі й сваіх знаёмых прыяцеляў, дзе расьлі й дзе спачываюць косьці бацькоў. Закончыў сваю прамову дакладчык тым, што яшчэ ня час адпраўляць жалобную імшу ані па „крэсах", ані па ідэі, якую „крэсы" рэпрэзэнтуюць. Жывуць яны ў гісторыі, жывуць ва ўспамінах. І можа можна будзе пераказаць іх наступным пакаленьням. На помач палякам на „крэсах" сабрана 87 фунтаў.

Другі польскі прадстаўнік, Рышард Кацынэль, старшыня Камітэту Адама Міцкевіча, у сваім выступленьні на вышэйзгаданай навукова-краязнаўчай канфэрэнцыі ў Наваградку гаварыў аб Кароне, Літве, Рэчы Паспалітай, Польшчы й Беларусі, аб іхняй 600-гадовай супольнай гісторыі й культуры.

І тут паўстае шмат пытаньняў аб 600-гадовай супольнай гісторыі, культуры й яе выніках. Далей дакладчык кажа: „Калі нам амаль праз 200 гадоў стараліся накінуць чужыя парадкі з усходу, чужую нам культуру зь яе асаблівасьцямі, нашыя народы неаднойчы разам ставалі да барацьбы на сьмерць і жыцьцё за вольнасьць нашай Рэчы Паспалітай і нашай культуры".

А хто-ж раней, больш чым 200 таму, накідаў Беларусі з захаду чужыя ёй парадкі, чужую культуру зь яе асаблівасьцямі? Ці-ж не палякі? І не заўсёды беларусы станавіліся да барацьбы разам з палякамі „на сьмерць і жыцьцё

за вольнасьць нашай Рэчы Паспалітай", а часам выступалі супраць яе. Беларусы, як у І-ай так і ў ІІ-ой Рэчы Паспалітай ня знялі што значыць свабода, яна для іх была абмежавана.

Гаворыць пан Кацынэль: „Уласьціва гэта аб'яднаньне двух народаў — польскага й беларускага пад уплывам заходняй эўрапэйскай культуры, як скрыжаваньне двух расьлін, выдалі са свайго асяродзьдзя багаты ўраджай; шмат знатных постацяў, заслужаных ня толькі для нашых народаў, але для ўсяго сьвету. Хопіць згадаць імёны Касьцюшкі, Міцкевіча, Каліноўскага, Крашэўскага, Манюшкі, Купалы, Пілсудскага й шмат другіх".

Хоць яны, іхнія бацькі, дзяды, прадзеды й ім падобныя былі беларусамі, добра ведалі беларускую мову, але, атрымаўшы асьвету ў езуіцкіх школах ды прыняўшы каталіцкую веру, а пасьля прайшоўшы Віленскі ўнівэрсытэт, людзі гэтыя пісалі на польскай мове. Да гэтага спрычыніўся яшчэ царызм, які забараняў беларускі друк і школы. Такім парадкам многа беларусаў аказалася польскімі пісьменьнікамі, паэтамі, навукоўцамі й т.п., якія з прыняцьцём польскае культуры ўсе апынуліся ў польскім шляхецкім лягеры. У некаторых зь іх крышталізаваўся польскі нацыяналізм, які ня дбаў пра просты народ і яго мову, культуру, а нават варожа ставіўся да ўсяго беларускага, а Беларусь лічыў за Польшчу й для яе прысьвячаў свае веды й часта сваё жыцьцё.

Такія людзі як Касьцюшка, Каліноўскі, Пілсудскі й многа іншых, якія вырасьлі зь беларускага пня, ніколі не былі шчырымі прыяцелямі беларускага народу. Касьцюшка змагаўся выключна за польскую справу, Каліноўскі быў польскім стаўленікам і каталіцкім фанатыкам, а Пілсудскі найбольшым махляром, прыгнятальнікам і палянізатарам беларусаў. Гэта былі людзі, ад якіх беларускі народ нічога добрага не атрымаў.

Аб Міцкевічу дакладчык Кацынэль сказаў: „Найбольшай постацьцю ў галіне літаратуры ёсьць сын народу Рэчы Паспалітай Адам Міцкевіч. Ёсьць ён перш за ўсё сынам польскага народу; быў вялікім патрыётам палякам і паднёс да найвышэйшай ступені польскую паэзію. Ёсьць ён таксама

сынам беларускага народу; нарадзіўся на нашай зямлі (падкрэсьлена мною — Ю. В.) і маючы польскія й беларускія карані апяваў родныя мясьціны".

Тут трэба заўважыць, што Адам Міцкевіч ня мае польскіх каранёў, а толькі беларускія. Ён паходзіў зь беларусаў і ў сваёй паэзіі не гаворыць аб Польшчы, а толькі аб Літве, фактычна аб Беларусі, і апісвае яе прыроду, звычаі, гістарычныя падзеі на Беларусі й яе парадкі. Міцкевіч пісаў вершы, паэмы й балады на польскай мове, але яна была пераплецена беларускімі словамі. Яго найвыдатнейшыя творы, драма „Дзяды" (1823), паэма „Пан Тадэвуш" (1834) і „Гражына" (1823) — базаваліся на беларускім фальклоры, абрадах, гісторыі Навагрудчыны й яе прыродзе, што натхняла маладога рамантыка да пісаньня.

Польскі публіцыст і знаўца гісторыі Беларусі Леан Васілеўскі заўважае: „Польскія рамантыкі (Чачот, Зан, Адынец і, перш за ўсё, Адам Міцкевіч) поўнай жменяй чэрпалі са скарбніцы беларускай народнай паэзіі, якую яны добра ведалі, бо выхаваліся ў беларускім асяродзьдзі. Сярод польскай моладзі ў Віленскім унівэрсытэце беларускія песьні карысталіся вялікай папулярнасьцю. Захавалася памяць, напрыклад, аб тым, што ўлюбёнай песьняй Адама Міцкевіча была беларуская „Ой ляцела цяцера да чэраз лес" („Бялорусь і Літва", Кракув 1912, стар. 268-269 — узята з кніжкі „Нарысы беларускай літаратуры XIX стаголдзя", Мінск 1957, стар. 15).

Не хацеў зразумець Адам Міцкевіч цярпеньняў свайго прыгнечанага народу, каб прамовіць да яго на роднай мове, і аддаў свой талент польскай культуры. Аднак пахвальна гаварыў ён і аб беларускай мове ў сваім дакладзе ў Парыжы.

„Дзеньнік польскі" нічога не піша аб выступленьнях беларусаў на канфэрэнцыі ў Навагрудку, толькі згадаў няпоўны сказ Алега Лойкі: „Гэта палітыкі сварацца, а мы, інтэлігенцыя, павінны аб'ядноўваць народы праз культуру".

Ужо камуністы аб'ядналі народы СССР праз сваю культуру, а да іх цары аб'ядноўвалі народы свае імпэрыі праз сваю культуру, а да цароў палякі аб'ядноўвалі народы Рэчы Паспалітай таксама праз сваю культуру. Вынік гэтых культурных аб'яднаньняў сёньня відавочны на Беларусі.

З дакладаў палякаў на канфэрэнцыі ў Наваградку можна вынесьці такое ўражаньне, што яны маюць нейкае права да Беларусі. Яны спасылаюцца на І-ю Рэч Паспалітую, а сёньня на дэмакратыю, і ўспрымаюць беларускае адраджэньне як нацыянальны шавінізм. Але, калі-ж гэта палякі былі ў сваёй гісторыі дэмакратамі, а не шавіністамі? Аб чым сьведчыць выкарыстоўваньне Адама Міцкевіча, як сына польскага й беларускага народаў, каб пад яго маркай праводзіць сваю старую палітыку на Беларусі?

Мэта палякаў на Беларусі зусім зразумелая. Сёньня Беларусь зьяўляецца незалежнай, але нацыянальна вельмі слабой дзяржавай. І як да кожнага слабога арганізму чапляюцца розныя хваробы, так яны чапляюцца й да сёньняшняй Беларусі. Каб пазбыцца гэтых хваробаў, трэба лячыць арганізм — свой урад. Калі Беларусь ня будзе мець свайго сапраўднага ўраду, тады кожны небеларускі рух, кожная небеларуская арганізацыя зь яе прэсай на нашай зямлі будзе пагражаць небясьпекай для нашай дзяржаўнасьці. Мы гэта бачым ня толькі з боку палякаў, але й расейцаў, і ўкраінцаў, ды нават літоўцы на эміграцыі праводзілі сваю дзяржаўную граніцу каля Наваградка.

Вяртаючыся да Адама Міцкевіча трэба адзначыць, што, апынуўшыся на эміграці, увайшоў ён у рэвалюцыйны рух як ідэоляг дэмакратычнага крыла эміграцыі з Польшчы, Беларусі і Літвы. У руху народаў былога ВКЛ на эміграцыі Міцкевіч моцна адчуў утрату свае Бацькаўшчыны. Маецца цікавы ўспамін Герцэна, які, спаткаўшы першы раз Міцкевіча ў Парыжы, даволі дакладна запісаў свае назіраньні, якія зьмясьціў у „Полярной звезде". Гэтае спатканьне ўспамінае таксама прафэсар Оксфардзкага ўнівэрсытэту В. Р. Морфіл у сваёй кніжцы „Сторы оф нэйшэн — Полянд" (1893). Тут Міцкевіч прадстаўлены як чалавек заклапочаны, невясёлы, сівы, з больш літоўскім чым польскім выглядам твару. Слова літоўскі трэба разумець — беларускі, бо А. Міцкевіч ня быў літоўцам і ня знаў літоўскай мовы.

Больш пра Адама Міцкевіча можна даведацца з артыкула П. Манькоўскага „Палякі атруцілі Адама Міцкевіча", змешчаным у „Голасе Часу" (№ 22 (1), Лёндан 1993 г., стар. 12).

(„Голас Часу" № 22 (1), Лёндан 1993 г.)

„Мысьлёнц о ойчызьне"

Цяжка весьці палеміку зь людзьмі, якія да гэтага часу, жывучы на Захадзе, або ў якой іншай дэмакратычнай краіне сьвету, ня ведаюць аснаўных дэмакратычных прынцыпаў і права меншых народаў на сваё вольнае й незалежнае жыцьцё на сваёй зямлі. Манія пасяганьня на чужое гэта адвечная рыса палякаў. Праз захопніцкую палітыку й неталеранцыю да былых народаў Вялікага Княства Літоўскага Польшча прывяла іх да заняпаду й утраты нават свае дзяржаўнай незалежнасьці. І нават утрата свае дзяржаўнай незалежнасьці не прамовіла да розуму некаторым польскім палітыкам і звычайным палякам, каб зьмяніць свае адносіны да суседзяў на ўсходзе. І гэта мы бачым сёньня.

Калі прэзыдэнт ЗША В. Вільсан 8 студзеня 1918 г. згадаў у сваёй Дэклярацыі аб устанаўленьні незалежнай Польшчы з доступам да мора, то палякі пачалі дамагацца граніцаў на ўсходзе з 1772 году. Таму на Мірнай канфэрэнцыі ў Парыжы брытанскі прэм'ер-міністар Льлёйд Джордж сказаў польскаму прадстаўніку І. Падарэўскаму: „Мы здабылі свабоду нацыям, якія ня мелі найменшай надзеі на яе. (...) І вось мы маем найбольшы клопат у сьвеце, каб стрымаць іх ад захопу зямель другіх народаў і навязаньня гэтым народам такой самай тыраніі, якую яны самі цярпелі на працягу стагодзьдзяў. Вы ведаеце, я належу да малой нацыі (валіец) і дзеля таго маю вялікую сымпатыю да ўсіх прыгнечаных народаў, аднак мяне напаўняе жах, калі я бачу нацыі, якія — ледзь толькі пабачылі сьвятло свабоды — пачынаюць уціскаць другіх".

І гэта самае было з польскім эміграцыйным урадам у Лёндане ў час апошняй вайны. Толькі гэтым разам ён не дамагаўся граніцы Першай Рэчы Паспалітай, але ніяк не хацеў уступіць Рыжскую мяжу, якая была да верасьня 1939 году.

Гэтай мяжы не прызналі Польшчы яе саюзьнікі — заходнія дзяржавы, а затрымаліся на так званай „лініі Керзана". Аднак палякі яшчэ да гэтага часу ня трацяць надзеі на далучэньне Заходняй Беларусі да Польшчы й робяць усё магчымае ў гэтым напрамку. Гэта можна бачыць з артыкула

пана Змгмунта Я. Домбэка „Мысьёнц о ойчызьне" („Думаючы пра бацькаўшчыну"), які што думае, тое піша:

„Думаю аб тым кавалку зямлі, які араў і апрацоўваў мой бацька, дзед і прадзед. Родная зямля належыць цяпер чужым, якія на ёй гаспадараць. (...) Край іх продкаў, край дзяцінства: Старая Вілейка, Ашмяны, Нарач і Маладэчна, Наваградак і Баранавічы, Валынь і далей на поўдзень (...) ня ёсьць ужо Польшча. Жывуць там іншыя людзі, хоць гавораць на знаёмай, але аднак чужой, або заборчай мове. (...)

Так склалася нашая народная гісторыя, а асабліва ў часе Ягелёнаў, што зямлі на захадзе Польшчы нам убыло, а на ўсходзе прыбыло. Аж нарэшце па 100 гадах зноў апынуліся амаль на той самай тэрыторыі, якую ўзяў у сваё ўладаньне кароль Баляслаў Храбры над Одрай, Віслай і Бугам. Пасьля розных няшчасьцяў, праз якія прайшла наша Бацькаўшчына ў апошнія 250 гадоў, трэба прызнаць, што прыйшлося ёй разьвіцца пад духовым кіраўніцтвам Каталіцкага касьцёла" („Тыдзень польскі", 24 сьнежня 1994 г.).

Так вось насьвятліў гісторыю палякаў пан Зыгмунт Я. Домбэк. Толькі не сказаў ён як гэта прыбылі Польшчы землі на ўсходзе й ад калі гэта яго продкі пачалі гаспадарыць на Беларусі. На якой гэта зямлі, паводле слоў пана Домбэка, жывуць там людзі, якія гавораць на іншай мове? А хто раней жыў на гэтай зямлі да Ягелёнаў, у часе Ягелёнаў і па Ягелёнах і на якой мове яны гутарылі? Відаць, пан Домбэк ня ведае на якой мове гутарыў гэты народ спакон вякоў і на якой мове пісаў свае законы. Для прыкладу згадаем Статуты Вялікага Княства Літоўскага. Аб гэтым варта было-б пацікавіцца пану Домбэку.

Праўду піша пан Домбэк, што народ польскі разьвіўся пад духовым кіраўніцтвам Каталіцкага касьцёла. Толькі гэтае разьвіцьцё нічога ня мае супольнага з рэлігіяй. Была тут не рэлігія, а толькі палітыка з рознымі праступствамі, якія паходзілі ад ксяндзоў і біскупаў Польскага Каталіцкага касьцёла й пашыраліся на суседнія ўсходнія краіны з блаславенства рымскіх папаў. Гэта было ня толькі стагодзьдзямі таму, але й сёньня бачым, што нясуць на Беларусь польскія ксяндзы з блаславенства рымскага папы.

Маецца такі прыклад: Ганна Сухоцка ад імя польскага ўраду падпісала з Ватыканам канкардат, у якім сказана, што Ватыкан будзе назначаць біскупаў у Польшчы й гэтыя біскупы павінны быць польскімі грамадзянамі. Чаму тады такое права ня ўвёў Ватыкан у іншыя дзяржавы, дзе пражываюць каталікі? А гэта таму, каб не назначаць там мясцовых біскупаў, а засылаць туды польскіх. Найлепшы прыклад —Беларусь, куды наехала чарада польскіх ксяндзоў, а кардынал Казімеж Сьвёнтэк пры кожнай нагодзе падкрэсьлівае сваю польскасьць. Гэта ўжо не рэлігія, ня вера, а злачынная палітыка Польскага Касьцёла й Ватыкану.

Прывядзём выказваньні Язэпа Палубяткі: „Што датычыцца каталіцтва, то тут назіраецца звычайная гульня ў палітыку. Калі й можна пачуць тут беларускае слова, то яно, пэўна, кажацца для таго, каб было больш зразумелым так званым „беларускім палякам". Спрэс польскія сьвятары й казаць пра нейкі клопат пра беларускасьць проста дзіва. У гэтым яны ні ў якім разе не зацікаўлены. Аб гэтым сьведчыць і зьяўленьне польскіх штандараў на касьцёлах, і шматлікія замежныя місіі, і мнагалюдныя вандроўкі нашых вернікаў у Польшчу за кошт іх касьцёла (сустрэчы з папам рымскім у Беластоку, фэстываль каталіцкай моладзі ў Чэнстахове й іншыя дробныя мерапрыемствы" („Літаратура і мастацтва" № 48 ад 2 сьнежня 1994 г.).

Маецца й такі прыклад зь „Дзеньніка польскага" (29 сьнежня1994 г.), дзе артыкул „Бук сен родзі на Бялорусі" („Бог нараджаецца на Беларусі") апублікаваў ксёндз Уладыслаў Блін, родам зь Віцебшчыны, якога сям'я па вайне выехала ў Кашалінскае ваяводзтва (Польшча). Пяць гадоў таму У. Блін вярнуўся ў Магілёў, але ўжо як польскі ксёндз, каб прапаведаваць Евангельле, ды просіць з-за граніцы фінансавай дапамогі для сваёй работы. А сваю місію сам ксёндз Блін апісвае так: „Найбольшы цуд, які бачыў я ў нас, стаўся дзякуючы людзям вялікага сэрца. Гэта Вы запрашаеце нашыя дзеці да сваіх сем'яў (у Польшчу). Перапрашаю за клопат з тымі дзецьмі. Але яны вяртаюцца ўжо да сваіх сем'яў іншымі. Прыходзяць на сьвяткаваньні ў касьцельную залю. У катэдру прыводзяць свае сяброўкі, сяброў. Раз гляджу: малая дзяўчынка вядзе бацьку

ў касьцёл, вучыць яго стаць на калені, складае яму рукі, бо ён першы раз у касьцёле".

Калі гэты ксёндз вярнуўся на Беларусь прапаведаваць Евангельле й знае беларускую мову, то чаму не прапаведуе яго на беларускай мове сярод сваіх прыхаджан?

Тут вядзецца яўная акцыя палянізацыі старых „крэсаў усходніх", а цэнтр гэтай акцыі знаходзіцца ў Люблінскім Каталіцкім універсытэце. І тут варта паслухаць, што ў „Настаўніцкай газэце" піша Пятрусь Капчык, філёляг, выкладчык рускай і польскай моў сярэдняй школы № 1 г. Ізяслава Хмяльніцкай вобласьці на Ўкраіне:

„Тры апошнія гады мне даводзіцца мець справу з паездкамі ў Польшчу, якія зьвязаны з вучобай на курсах польскай мовы ў Любліне — горадзе, дзе месьціцца сядзіба фундатара дапамогі польскім школам на Ўсходзе імя Ганевіча. Менавіта гэтая арганізацыя разам з Настаўніцкім інстытутам паляністыкі й арганізоўваюць курсы настаўнікам польскай мовы з гэтак званага „ўсходу": Беларусі, Украіны, Літвы, Латвіі, Малдовы, Расіі, Казахстану й Узбэкістану. Што адразу кідаецца ў вочы на гэтых курсах, дык гэта тое, што амаль палова ўсіх курсантаў прыязджае зь Беларусі — краіны, дзе 10 мільёнаў насельніцтва. Другі „цікавы" факт: паміж сабою гэтыя выкладчыкі „чамусьці" не размаўляюць па-беларуску ці па польску, а... паруску! Як быццам бы яны прыехалі з Расіі. Асабліва ігнаруюць беларускую мову курсанты з заходніх абласьцей Беларусі — Брэсцкай і Гарадзенскай. Ёсьць ненавісьнікі беларускай мовы й зь Віцебска. (...)

Вяртаючыся з курсаў, яны з галавой кідаюцца праводзіць палітыку „палянізацыі" падрастаючага пакаленьня. (...)

Але тое, што даводзіцца чуць ад выкладчыкаў-палякаў на такіх вось курсах асабліва мяне прымушае задумацца: а куды-ж скіраваны зараз інтарэсы польскай дзяржавы?! Адказ з усяго адзін — на той самы „ўсход", або як палякі гавораць — „на крэсы всходне". (...)

Польскі шавінізм адраджаецца шпаркімі крокамі, і праваднікамі ідэй польскага імпэрскага шавінізму якраз становімся міжволі й мы, настаўнікі польскай мовы, якім убіваюць у галовы падчас курсаў гэтыя самыя ідэі".

Такіх прыкладаў маецца больш, але з браку месца немагчыма ўсё змясьціць. Толькі паслухаем яшчэ Міколу Кузьняцова, доктара гістарычных навук, які піша як гэта польскія ўрадавыя дзейнікі і Каталіцкі касьцёл праводзяць сваю работу на Беларусі апошнім часам: пакуль Беларусь разважала, як ёй быць без Расеі, Польшча дзейнічала. У пасьляперабудовачнай рэспубліцы сарганізаваўся Саюз палякаў, аб'яднаўшы звыш 360 тысяч прыхільнікаў, з кастрычніка 1993 года існуе партыя Польскае дэмакратычнае аб'яднаньне, якія ўладкоўваюцца, пачынаюць дзейнічаць. Так, Баранавіцкі Саюз палякаў спачатку зьняў пакойчык ва ўтульным асабняку, дзе разьмяшчалася мясцовая бібліятэка. З цягам часу завалодаў усім будынкам, выцясьніўшы бібліятэку. Зроблена ўсё без шуму й тлуму, у вядомых традыцыях езуіцкага ордэна. Усё сьмялей дзейнічаюць польскія прадпрымальнікі, у Мінску пачаў працаваць прыватны камерцыйны ўніверсытэт. Польшча бярэ на сябе цяжар падрыхтоўкі ў сваіх вышэйшых навучальных установах нашых кадраў, ствараюцца культурна-асьветныя й рэлігійныя цэнтры. Ксяндзы ўзяліся за вывучэньне беларускай мовы й дзе-нідзе на ёй правяць імшу, хоць сваіх вернікаў атаясамліваюць з палякамі. Польскія палітыкі ўмацоўваюць сувязі з паўночна-заходнім блёкам НАТО, баючыся ў той жа час, каб хаця не прынялі туды Расею, прагна жадаюць, але беспасьпяхова, вырвацца зь яе ўплываў. Адказныя чыноўнікі ўрада хацелі-б, каб дыстанцыравалася ад вялікага ўсходняга суседа й Беларусь. Але парады й крытычныя заўвагі носяць суб'ектыўны характар і не ўлічваюць геапалітычнага й эканамічнага фактару, якім кіруецца ў сваёй дыпляматыі Беларусь, і зьяўляюцца ўмяшаньнем у чужыя справы.

У адпаведнасьці з праводзімай у рэспубліцы нацыянальнай палітыкай, беларускія палякі займелі магчымаць адкрываць, будаваць свае школы, дзіцячыя дашкольныя ўстановы. Ужо сёньня на Гродзеншчыне звыш 11 тысяч школьнікаў вывучаюць польскую мову. У самым жа Гродне яна выкладаецца ў 10 клясах як і іншыя прадметы, яшчэ ў дзесяці клясах выкладаньне наогул польскамоўнае. Увогуле тут вучыцца каля 180 школьнікаў. Тут плянуецца таксама пабудаваць школу на 640 вучняў, дзіцячы садок на 70 дашка-

лят, інтэрнат для юных талентаў. І, вядома, сугучнасьць — недалёка касьцёл. Усе выдаткі бярэ на сябе Польшча. А далейшае — гэта ўжо задачка з двумя невядомымі. Спачатку культурная нацыянальная незалежнасьць, ці адміністрацыйная аўтаномія, а там і далучэньне па „патрабаваньню" большасьці польскага насельніцтва аўтаномнай адзінкі да Польшчы" („Чырвоная зьмена" № 129 ад 1 сьнежня 1994 г.).

Такія гэта рэчы адбываюцца сёньня на Беларусі. Вядзецца, як бачым, аднаўленьне старой палянізацыі Беларусі, у якой прымаюць удзел сьвецкія й духоўныя дзейнікі. Ня менш у гэтай рабоце зацікаўлены й польскі ўрад, які не шкадуе матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў. А што на гэта скажа ўрад Беларусі?

(„Голас Часу" № 35 (2), Лёндан 1995 г.)

Заклік IV Кангрэсу

У днях 28-29 сакавіка 1992 году IV Кангрэс Канфэдэрацыі незалежнай Польшчы прыняў адозву да грамадзян, парлямэнтаў, урадаў і палітычных груповак краін Міжмор'я — краін, якія знаходзяцца на захад ад Расеі, а на ўсход ад заходнеэўрапэйскай супольнасьці, інакш кажучы, аб тых краінах, якія знаходзяцца паміж Балтыйскім і Чорным морамі.

У адозве згадваецца распад камуністычнай сыстэмы, якая прывяла гэтыя народы да эканамічнага заняпаду. Але, адначасна ў адозве напамінаецца, што маскоўская гегемонія можа яшчэ адрадзіцца. Дзеля таго IV Кангрэс Канфэдэрацыі незалежнай Польшчы прапануе народам, што знаходзяцца пад Масквою, стварыць сваю супольнасьць, якая зможа супрацьставіцца спакусам Расеі падняць свой гаспадарчы дабрабыт і тады можна будзе аб'яднацца з Заходняй Эўропай. Заканчваецца адозва такімі вось словамі: „Надышоў ужо час, каб застанавіцца над гэтай праблемай (...) патрэбы салідарнасьці дзяржаў і народаў Міжмор'я — прыступім да супольных дзеяньняў. Разам будзе нам лягчэй".

Нічога дрэннага ў гэтай адозве няма. Але гісторыя нам напамінае, што ў часе Першай Сусьветнай вайны, у канцы 1915 году, у Вільні створана была Канфэдэрацыя Вялікага Княства Літоўскага. Канфэдэрацыя распалася й непрыем-

нае было тое, што палякі тайна затрымалі сабе грошы, ахвяраваныя на мэты Канфэдэрацыі.

Пілсудскі, займаючы Вільню ў красавіку 1919 году, выдаў адозву да грамадаян Вялікага Княства Літоўскага, у якой абяцаў гэтым народам вырашыць палітычныя й рэлігійныя справы так, як самі гэтага захочуць, без гвалту й націску палякаў.

Заняўшы Менск у верасьні 1919 году, Пілсудскі ў будынку Шляхецкага клюбу сказаў, што яго войска прыйшло, каб выгнаць бальшавікоў, даць вольнасьць і магчымасьць тутэйшым людзям уладзіць свае справы. Якімі вольнасьцямі, магчымасьцямі й правамі карысталіся беларусы пад Польшчай Пілсудскага кожны знае й аб гэтым паўтараць ня будзем.

Неўзабаве, пасьля заканчэньня апошняй вайны, захадамі лёнданскіх палякаў выдаваліся брашуркі з заклікам да стварэньня супольнасьці дзяржаваў, якія знаходзяцца паміж Балтыйскім і Чорным морамі. У гэтай супольнасьці, якая называлася „Міжмор'ем", палякі мелі адыгрываць галоўную ролю. Ідэя стварэньня „Міжмор'я" замерла сама па сабе, бо народы з Міжмор'я не давяралі палякам на эміграцыі.

Цяпер мы маем новую адозву, выдадзеную палякамі ў краі, якая заклікае да супрацоўніцтва. Нічога дрэннага, як ужо згадвалася, і ў гэтай адозве няма, як нічога дрэннага не было ў адозвах Пілсудскага й лёнданскіх палякаў. Бяда толькі ў тым, што палякі адно пішуць і гавораць, а што іншае робяць.

Трэба аднак памятаць, што пакуль народамі Міжмор'я пачалі кіраваць расейцы, то раней да іх кіравалі палякі. Як адны, так і другія былі для народаў Міжмор'я аднолькава праступныя. І таму, ці часам праз гэтую міжморскую супольнасьць палякі не плянуюць аднавіць сваю старую гегемонію над гэтымі народамі?

Ужо цяпер, без супольнасьці, палякі наслалі на Беларусь сваіх агентаў-ксяндзоў, якія апалячваюць беларусаў-каталікоў праз свой Касьцёл. Лёнданскі „Дзеньнік польскі" падказвае палякам у краі засылаць на Белрусь сваю прэсу, кніжкі, фільмы й т.п., што ў будучыні аплаціцца.

Даведваемся з прэсы, што ў Вілейцы ня так даўно пастаўлены помнік легіянерам Пілсудскага. З якой рацыі й за што? Не інакш як за ліквідацыю ўсяго беларускага і заме-

най яго на польскае на Беларусі. Таксама ў Воранаўскім раёне (Навагрудчына) узведзены помнік жаўнерам Арміі Краёвай. І тут варта спытаць: за што? Адказ ёсьць толькі адзін: за ліквідацыю беларускай інтэлігенцыі ў часе апошняй вайны. У дырэктыве кіраўніцтва цэнтра „грэнадзёраў" ад 14 траўня 1943 году было пастаноўлена, што мэтай палякаў ёсьць вызваленьне Заходняй Беларусі ад бальшавікоў, але кожны паляк павінен памятаць, што беларусы — гэта ворагі польскага народу. Палякі павінны ўсякімі спосабамі кампраметаваць беларусаў перад немцамі, дабіваючыся арыштаў беларусаў з тым, каб страты ў беларусаў былі як найбольшымі. А якія жудасныя злачынствы ўчыняла Армія Краёва над беларусамі? Аб гэтым найлепш напісаў польскі лібэральны пісьменьнік Юзаф Мацкевіч.

І трэба толькі дзівіцца наколькі маласьвядомы й талерантцыйны зьяўляецца беларускі народ, што дазваляе ў сваёй незалежнай дзяржаве ставіць помнікі сваім катам-забойцам і гэтым рабіць насьмешку над сабою.

Мала гэтага, прэм'ер Рэспублікі Беларусь В. Кебіч абдымаецца й цалуецца з польскімі міністрамі ды голасна заяўляе, што Беларусь ня мае ніякіх тэрытарыяльных прэтэнзій да сваіх суседзяў. Што за добры й дэмакратычны прэм'ер-міністар Рэспублікі Беларусь для сваіх ворагаў-суседзяў, толькі не для Беларусі й беларусаў. Ці Кебіч ня знае, што граніца паміж Польшчай і Беларусьсю была праведзена ў Рызе ў 1920 годзе ў адпаведнасьці з дамоўленасьцю Варшавы й Масквы бяз веды й згоды беларусаў. Таксама была яна праведзена й у 1949 годзе. Так, што ідэя Міжмор'я ня ёсьць дрэннай ідэяй, але гэтая ідэя будзе выглядаць, на маю думку, намнога лепш, калі ў ёй ня будзе расейцаў і палякаў — былых двух прыгнятальнікаў народаў Міжмор'я.

(„Голас Часу" № 19 (4), Лёндан 1992)

„Рочніца «Бужы» в Бялымстоку"

Пад такім загалоўкам у польскай лёнданскай газэце „Тыдзень польскі" (5 верасьня 2004 году) быў зьмешчаны артыкул Крыстыны Асіповіч, прысьвечаны 60-й гадавіне выступленьня Арміі Краёвай (АК) летам 1944 году супраць немцаў

на ўсходнім фронце. Назоў гэтай акцыі „Бужа", альбо „Бура", і мела яна на мэце весьці барацьбу ня толькі па тылох немцаў, але й супраць Чырвонай Арміі за аднаўленьне Польшчы ў межах 1939 году.

На пачатку вайны акрамя Арміі Краёвай у Варшаве ў жніўні 1941 году створаная была падпольная дывэрсыйная арганізацыя „Вахляж" („Веер"), якая на „крэсах всходніх" былой Польшчы мела праводзіць сабатаж ад Балтыйскага да Чорнага мораў ды адначасова палітыку вяртаньня гэтых земляў да Польшчы. Сваю дзейнасьць „Вяхляж" пачаў у верасьні 1941 году.

Як бачым, гэта была вялікая прастора, на якой пражывала ня так шмат палякаў, але былі яны пераважна адукаванымі людзьмі, патрыётамі. Аднак арганізацыя „Вахляж" не праявіла свае актыўнасьці. Яна, як і АК, не магла сягаць далей як за межы былой Польшчы 1939 году.

На сваёй тэрыторыі „Вахляж" і АК не праводзілі дывэрсыяў супраць немцаў, бо за гэта найбольш адказвала перад немцамі цывільнае насельніцтва. Таму „Вахляж" выбраў Беларусь, як найбольш прыдатную прастору для свае дзейнасьці, за якую пакараньне прыходзілася несьці беларусам.

Аднак людзі „Вахляжа" не былі добра падрыхтаваныя для такой дзейнасьці. Яны паходзілі з карэннай Польшчы, школіліся на дывэрсантаў у Англіі, адкуль самалёты скідалі іх на парашутах у Польшчы, а адтуль кіраўніцтва „Вахляжа" пасылала іх на ўсход. Людзі гэтыя ня ведалі моваў народаў на „крэсах" і гэтым выдавалі сябе. Ды што праўда, кіраўнікі „Вахляжа" не былі сумленныя, яны выстаўлялі фальшывыя рапарты аб сваёй дзейнасьці, якой не было, і за гэта атрымлівалі грошы, таму „Вахляж" быў распушчаны ў лютым 1943 году, а ягоныя людзі, якіх называлі „ціха-цёмнымі", і якія былі вышкаленымі дывэрсантамі, былі разасланыя па аддзелах АК.

Армія Краёва мела свае аддзелы ў Беларусі, і яе заданьнем было ліквідаваць беларускую дзейнасьць і яе інтэлігенцыю, каб пасьля вайны лягчэй было палякам устанавіць сваю ўладу ў Беларусі.

Як узгадвалася, заданьнем „Бужы" было весьці вайну на тылох нямецкай арміі, якая адступала летам 1944 году. Але

ня ўсе акаўцы выступалі супраць немцаў, шмат хто зь іх супрацоўнічаў зь немцамі да канца вайны. Некаторыя камандзіры АК былі ў змове зь немцамі, бралі ад іх зброю, амуніцыю й ваявалі супраць савецкіх партызанаў, што выглядала на канфрантацыю з Чырвонай Арміяй. Заданьнем АК, як „факт дакананы", было ўстанавіць сваю ўладу пасьля адступленьня немцаў з „крэсаў усходніх".

Ініцыятарамі такога пляну былі генэрал Сікорскі ў Лёндане й кіраўнік АК Равэцкі („Грот") у Варшаве. Сікорскі пісаў Равэцкаму:

„Мы павінны апярэдзіць расейцаў і стварыць факты дакананыя праз паўстаньне у краі й пераняць вайсковую й адміністратыўную ўладу. Савецкае войска павінна трактавацца як саюзнае, а пасьля кожнага акту неляяльнасьці зь іхняга боку дамагацца англясаксонскай інтэрвэнцыі".

Дарогаю „фактаў дакананых" акцыя „Бужа" мела польскі ўрад у Лёндане ўчыніць гаспадаром „крэсаў усходніх", а пасьля й Польшчы. Аднак такі плян аказаўся нерэальным і немагчымым для выкананьня. Усё-ж, каб падмацаваць дзейнасьць АК на „крэсах", як другі „факт дакананы", 1 жніўня 1944 году выбухла паўстаньне ў Варшаве.

У гэты час Чырвоная Армія сьведама затрымалася перад Віслаю й дапамогі паўстанцам не аказала, бо паўстаньне было выклікана польскім эміграцыйным урадам у Лёндане, які варожа ставіўся да камуністаў. Такім чынам Варшаўскае паўстаньне было разгромленае немцамі, якія зруйнавалі Варшаву, а палякі пацярпелі вялікія страты ў людзях. Пасьля Чырвоная Армія заняла Варшаву й пасадзіла там камуністычны ўрад.

Але гэтым ня быў пакладзены канец змаганьню АК у Заходняй Беларусі. Акаўцы мсьціліся ня толькі на мясцовай савецкай адміністрацыі, але й на звычайных беларусах. Была гэта доўгая барацьба, якая цягнулася да 1953 году. Тады рэшта акаўцаў перайшла зь Беларусі на Беласточчыну пад Польшчаю й там праводзіла сваю злачынную дзейнасьць сярод мірных беларусаў, мардуючы іх без дай прычыны толькі таму, што яны — беларусы й праваслаўныя.

Нельга сказаць, каб беларусы ды іншыя нацыянальныя меншасьці ў міжваеннай Польшчы карысталіся нацыянальнай сва-

бодаю. Польшча, падпісваючы Вэрсальскую дамову ў 1919 годзе, забавязалася даць свабоду нацыянальным меншасьцям у сваёй дзяржаве. Таксама на канфэрэнцыі ў Рызе ў 1920 годзе, калі была праведзеная мяжа, якая дзяліла Беларусь і Ўкраіну, палякі забавязаліся даць нацыянальную свабоду гэтым народам, але яе ніколі не далі. Савецкі ўрад нагадваў пра гэтыя забавязваньні, але польскі ўрад не зьвяртаў увагі. Таму нацыянальныя меншасьці Польшчы ад 1920 да 1930 году выслалі ў Лігу Нацыяў 155 нараканьняў на польскі ўрад. Але й гэтыя скаргі не зрабілі ніякага ўплыву на польскі ўрад, хоць паказалі Польшчу ў вачох сьвету як дыктатарскую дзяржаву.

Таму нічога дзіўнага, што падчас вайны Польшчы зь Нямеччынай у 1939 годзе пад прэтэкстам абароны сваіх братоў — беларусаў і ўкраінцаў — Чырвоная Армія 17 і 18 верасьня заняла Заходнюю Беларусь і Заходнюю Ўкраіну. Былі гэта трагічныя наступствы палітыкі польскага ўраду, які прыгнятаў нацыянальныя меншасьці, каб зрабіць іх палякамі дзеля сваёй старой ідэі вялікай „моцарствовэй Польскі". Пілсудскі аднойчы сказаў, што Польшча будзе вялікая альбо зусім яе ня будзе.

Прывядзём тут урывак са „Справаздачы кур'ера Міністэрства ўнутраных справаў аб сытуацыі ў акупаванай Польшчы ў жніўні 1944 году":

„З болем трэба сьцьвярджаць, што тых некалькі сотняў людзей, якім былі дадзеныя важнейшыя становішчы ў вызвольнай працы, нічога не навучыліся за пяць цяжкіх і трагічных гадоў, што не зрабілі ў іх душах ніякага пералому, як можна было спадзявацца ў верасьні 1939 году й чаго можна было ад іх дамагацца. Не змаглі нават пад акупацыяй вылезьці з балота сваіх памылак і заганаў. Узьняцца крыху вышэй і звысоку больш ясна глянуць на сьвет, на Польшчу, на сваю працу. Усё, на жаль, засталося ў гэтых паноў па-старому, нічога не зьмянілася да лепшага" („Мендзы Лёндынэм і Варшаво", Варшава 1986, стар. 356).

Як падае „Дзеньнік польскі" ад 19 траўня 1990 году, у час прыватнага побыту ў Лёндане міністар замежных справаў ва ўрадзе Тадэвуша Мазавецкага, праф. Кшыштоф Скубішэўскі, сказаў на прэс-канфэрэнцыі, што Польшча ня мае ніякіх прэтэнзіяў да сваіх даўнейшых усходніх земляў.

Аднак польскі ўрад на выгнаньні напамінае, што землі гэтыя былі захопленыя збройным нападам на Польшчу 17 верасьня 1939 году ў змове з гітлераўскай Нямеччынай. У Ялце ў 1945 годзе захоп гэты быў пацьверджаны заходнімі аліянтамі бяз згоды польскага ўраду ў Лёндане.

Як бачым, некаторыя палякі ніяк ня хочуць зразумець, што на гэтых землях, якія яны называюць сваімі, жылі спрадвеку народы, якія мелі сваю культуру, мову, пісьменнасьць, традыцыі, ды ў мінулым вялі войны з палякамі. І сёньня пасягаць на гэтыя землі могуць толькі хворыя на імпэрыялістычную манію захопнікі.

Крыстына Асіповіч піша, што з нагоды 60-й гадавіны „Бужы" Беласток, пад патранатам былога эмігрыйнага прэзыдэнта РП Рышарда Качароўскага, адзначыў гэтую дату. Раніцою ў гарадзкой базыліцы адбылася імша пры ўдзеле шматлікіх сьцяганосцаў. Пасьля ля помніка жаўнерам АК Беластоцкай, Віленскай і Наваградзкай акругаў былі ўскладзены вянкі й сказаны прамовы. Наступна адбылася навуковая сэсія пад назовам „Акцыя «Бужа»", у якой прымалі ўдзел варшаўскія, віленскія й беластоцкія гісторыкі. Была адкрытая выстава пад назовам „Ржавыя драты нас аддзяляюць ад Бацькаўшчыны". Адкрываючы выставу, былы прэзыдэнт Качароўскі сказаў: „Гісторыю пісалі вы — хто насіў мундзір альбо павязку АК. (...) Перад дзецьмі й унукамі доўга хавалі тое, за што змагаліся бацькі й дзяды. Ёсьць шмат чаго да адрабленьня".

Далей у гутарцы з карэспандэнтамі былы прэзыдэнт сказаў: „Для нас, палякаў, плян „Бужа", а таксама Варшаўскае паўстаньне — гэта прыклад патрыятызму, ахвярнасьці й адданасьці вялікай справе, якою ёсьць польская дзяржава, вольная й незалежная."

Аб акцыі „Бужа" ня раз пісала польская прэса. Ставілася пытаньне: ці была яна патрэбная? З пункту гледжаньня лёгікі — не. Быў гэта неабдуманы самазабойчы акт фанатыкаў, які закончыўся фіяскам. Аднак „Бужа" ўвайшла ў гісторыю Польшчы. Каштавала яна палякам сотні тысяч ахвяраў і разбурэньне Варшавы. Але, як лічаць некаторыя палякі, кроў, пралітая ў перамозе ці паражэньні, заўсёды мае сваю вартасьць.

(„Беларус" № 502, ЗША, лістапад 2004 г.)

„Разумная палітыка"

Прыпадкова давялося мне дастаць кніжку Енджэя Гертыха „Пул веку польскей політыкі. Увагі о політыцэ Дмовскего й політыцэ польскей лят 1919-1939 і 1939-1947". Кніжка выдадзена ў Заходняй Нямеччыне ў 1947 годзе.

У агульным нарысе аўтар данае кніжкі разглядае наступныя перыяды: 1. Першае Сусьветнае вайны, удзел у ёй Польшчы з палітыкай Рамана Дмоўскага як галоўнага кіраўніка польскай ідэалёгіі. 2. Паваенны перыяд у незалежнай Польшчы зь яе ўнутранай і замежнай палітыкай. 3. Пачатак Другой Сусьветнай вайны, упадак Польшчы, барацьба яе народу, расчараваньні й заданьні эміграцыйнага ўраду на выпадак Трэцяй Сусьветнай вайны паводле думкі аўтара.

Прачытаўшы гэтую кніжку мы пераканаемся, што дануюпрацу пісаў польскі нацыяналіст-шавініст і заўзяты каталік. Ня маю на ўвазе паніжаць польскага высілку, як у часе Першае, так і Другое Сусьветных войнаў, а наадварот, нават прызнаць іхнюю мужнасьць на працягу цэлае іхняе гісторыі. Прыкра толькі чытаць фальшывыя насьвятленьні й перакручваньне некаторых гістарычных фактаў, ды пасяганьні на чужое, аб чым расьпісваюцца польскія палітыкі.

1. Паводле думкі й доказаў аўтара вышэйзгаданай кніжкі, ключ Першай Сусьветнай вайны ляжаў у кішэні Р. Дмоўскага, гэта значыць, у палякаў, якія мелі надаваць адпаведны ход дзеяньням у той ваенны час. Што праўда, на пачатку вайны Дмоўскі дзейнічаў у Петраградзе, пасьля пераехаў на Захад і дзейнічаў у Лёндане, Парыжы й езьдзіў у ЗША.

Як знаем з гісторыі, Польшча на пачатку Першай Сусьветнай вайны ў 1914 годзе як такая была змазана з карты Эўропы й ніякай палітычнай або мілітарнай сілы не прадстаўляла. Толькі за тое, што легіёны Пілсудскага ваявалі пры баку немцаў, апошнія стварылі Кангрэсавае Каралеўства й надалі яму юрыдычную аўтаномію.

Далей аўтар даказвае, што дзякуючы мудрай палітыцы Дмоўскага, бой пад Марнай быў выйграны французамі й зазначае, што магчыма некаторым генэралам можа не спадабацца, але ёсьць фактам, што гэта была заслуга Р. Дмоўскага.

Як падае гісторыя, Францыя ад даўжэйшага часу была зьвязана саюзам з Расеяй. Саюз гэты прадбачваў, што калі Нямеччына нападзе на Францыю, Расея мае пайсьці вайной на Прусію. Так і сталася. Нямеччына напала на Францыю, Расея стрымала сваё забавязаньне й рушыла на Прусію. Каб стрымаць расейцаў, немцам прыйшлося ўзяць два корпусы войска з-над Марны. У часе крытычнага бою над Марнай немцам не хапіла гэтых двух корпусаў і яны прайгралі гэты вялікі рашаючы бой, які ўратаваў Парыж і заважыў на ходзе далейшай вайны. Трэба зазначыць, што пры баку французаў быў ангельскі корпус.

Цяпер паўстае пытаньне: пры чым тут Дмоўскі? „Адзін пень гарэў, а другі плечы грэў".

2. Паўстаньне Польшчы, як незалежнай дзяржавы, было рэзультатам таго, што Нямеччына пасьля некалькіх гадоў вайны ня вытрымала напору Антанты на Заходнім фронце й змушана была эканамічна вярнуцца ў свае межы ды падпісаць падыктаваны ёй Мірны трактат у Вэрсалі.

Падобная сытуацыя стварылася й на Ўсходнім фронце. Пацярпеўшы няўдачы на Заходнім фронце, немцы бяз бою пакідалі Ўсходні фронт і ехалі дамоў. Гэты перыяд нямецкіх няўдачаў на франтох паспрыяў пабольшаньню шэрагаў польскіх легіёнаў і 11 лістапада 1918 году Польшча была прагалошана незалежнай дзяржавай, дзе галоўную ўладу абняў Юзаф Пілсудскі.

Многа горш выглядала справа ў Расеі, змучанай доўгай і няўдачнай вайной зь немцамі, якая прывяла яе да рэвалюцыі. Галоўным чыньнікам, які палажыў падваліны пад незалежную Польшчу, была Амэрыка. Яе прэзыдэнт В. Вільсан у сваёй праграме ў пункце 13-ым згадаў Польшчу як незалежную дзяржаву з доступам да мора. У часе польска-бальшавіцкай вайны 1919-1920 гадоў палякі атрымоўвалі дапамогу як з боку Амэрыкі, так і Францыі й дзякуючы гэтай дапамозе сталі на свае ногі. Каб не дапамога ЗША й Францыі, то бальшавікі ў 1920 годзе прайшлі-б усю Польшчу без ніякага „цуду над Віслай".

Аднак Енджэй Гертых у сваёй кніжцы гэтыя факты не ўспамінае сьвядома й прадстаўляе ход усяе справы выключна як вынік дзеянняў абапертых на свае собскія сілы.

Граніцы, якія забясьпечыла сабе Польшча на захадзе Вэрсальскім трактатам, а на ўсходзе Рыжскім трактатам, былі часткова вынікам канцэпцыі Рамана Дмоўскага. Хоць Дмоўскі ня быў сябрам польскага ўраду й з Пілсудскім ня вёў сяброўства, але яго палітыка перамагла ўрад і ўвайшла ў жыцьцё народу. Дэвізам Дмоўскага ў палітыцы Польшчы была інкарпарацыя. Праціўнікам яе быў Пілсудскі, які прапанаваў канцэпцыю фэдэрацыі. Магчыма й дайшло-б да фэдэрацыі, каб палякі не баяліся Ўкраіны. Палякі зналі, што Ўкраіна вялікая й багатая краіна, большая за Польшчу й украінцаў больш у два разы за палякаў і гэта варажыла палякам неспакой. Калі-б Польшча прыняла канцэпцыю фэдэрацыі, яна змушана была-б аддаць беларусам і ўкраінцам іхнія землі, што палякам не магло зьмясьціцца ў галаве.

Як згадвалася ўжо вышэй, канцэпцыя Дмоўскага перамагла, хоць ня поўнасьцю, і ўвайшла ў жыцьцё. Беларусы, якія жылі пад польскім панаваньнем, добра ведаюць як палякі закрывалі беларускія школы, абсаджвалі ўрады палякамі з Цэнтральнай Польшчы, насылалі асаднікаў, давалі ім лепшыя землі, насылалі ксяндзоў, разьбівалі беларускія арганізацыі пад прэтэкстам камуністычнай дзейнасьці, нішчылі Праваслаўную царкву, акаталічвалі беларусаў і т.п. Гэта й была палітыка пана Рамана Дмоўскага, якую палякі на „крэсах всходніх" старанна выконвалі.

Аўтар дае яшчэ зацемку ад сябе, што беларускія й украінскія школы, якія закладаліся пасьля вайны, часта былі супраць волі мясцовага насельніцтва. Ці ж гэта ня ёсьць хлусьня!

Дмоўскі на рыжскай мяжы не хацеў затрымацца, ён сягаў на Ковеншчыну, Віцебск, Бабруйск і Кіеў, на межы Вялікага Княства Літоўскага. Дмоўскі добра знаў, што гэтыя землі ня польскія, але ён тлумачыў іх тым, што яны маюць „польскі характар", згадваючы пашырэньне каталіцызму на Літве й Берасьцейскую вунію.

Наступна аўтар востра атакуе пасьляваенны ўрад 1926 году, які праз 13 гадоў свайго кіраўніцтва не парупіўся забясьпечыць Польшчу з боку Нямеччыны. За прыклад прыводзіць гістарычны факт XIII стагодзьдзя, калі палякі, бачучы пагрозу з боку нямецкіх крыжакоў, пастараліся зьяд-

наць для сябе Вялікае Княства Літоўскае. Гэта было зроблена 24 гады перад небясьпекай, якую спаткалі пасьля пад Грунвальдам 15 ліпеня 1410 году.

Прыведзены аўтарам прыклад Грунвальду не зусім адпавядае зьместу гэтай кніжкі, якая наскрозь прасякнута ідэалёгіяй Дмоўскага. Бой пад Грунвальдам выйгралі беларусы, русіны з дапамогай палякаў і літоўцаў, былі й наёмнікі. Усе яны разам супольнымі сіламі разьбілі Крыжацкі ордэн. Гэтая супольная акцыя насіла фэдэратыўны характар, варожы інкарпарацыі Дмоўскага. Лепш было-б аўтару гэты прыклад памінуць, а падшукаць другі, больш падобны да „інкарпарацыі".

Калі ходзіць аб саміх палякаў, то яны няздольныя ўстаяць ані перад Усходам, ані перад Захадам. Польская шавіністычная палітыка „мацарствовасьці" не знайшла ў гісторыі апраўданьня, а ў суседзяў — спачуваньня.

1 верасьня 1939 году магутная гітлероўская армія на працягу амаль трох тыдняў зьмяла з поля бою польскую армію й гэтым палажыла канец польскай дзяржаўнасьці зь яе палянізацыяй і акаталічваньнем. 17 верасьня таго ж году Чырвоная Армія заняла Заходнюю Беларусь і Заходнюю Ўкраіну й гэтым канчаткова пахавалі Польшчу.

Сапраўды прыкра, калі 32-мільённая дзяржава лягла ў грузах на працягу няцэлых трох тыдняў, а яе ўрад і галоўнае камандаваньне ў першых днях вайны ўцяклі ў Румынію, дзе іх інтэрнавалі за дратамі.

Многа можна пісаць на гэту тэму, але гэта пакінем палякам. Прывядзём толькі пару прыкладаў дзеля параўнаньня. У 1914 годзе дыспрапорцыя сілаў паміж Сэрбіяй і Аўстра-Вэнгрыяй была яшчэ большай у параўнаньні да нямецкіх і польскіх у 1939 годзе, аднак сэрбы пераможна выйшлі з вайны. Маленькая краіна Фінляндыя, а як-жа яна прыгатавалася да вайны супраць Савецкага Саюзу, якія мела фартыфікацыі пад Выбаргам, якая лінія Манэргейма! Камуністам дорага каштавала заняць яе. Аднак зламаць канчаткова Фінляндыю не змаглі й пайшлі на перагаворы. Гэтыя прыклады аўтар часткова падае сам у доказ польскай бяздзейнасьці.

Палякі прайгралі вайну вельмі хутка й яе патрыёты пабрылі за межы, каб пры баку саюзьнікаў праводзіць далей барацьбу за дзяржаўную незалежнасьць Польшчы.

Гітлераўская Нямеччына была разьбіта. У 1945 годзе вайна скончылася, Польшча адрадзілася, але не тая што была, аб якой марылі палякі на эміграцыі. Пачаўся лямант на ўсіх і на ўсё, што ёй усадзілі нож у сьпіну, што Польшча бяз Вільні й Львова ня можа існаваць. Аднак ЗША, Вялікабрытанія й Савецкі Саюз не прызналі польскага эміграцыйнага ўраду. Палякі пачалі крычаць, што заходнія саюзьнікі іх здрадзілі. Пачалі шукаць вінаватых і знайшлі Мікалайчыка, які, будучы прэм'ер-міністрам польскага ўраду ў Лёндане, зачаста езьдзіў у Маскву й запрадаўся камуністам. Мікалайчык і цяпер не вылазіць з-пад бізуна, якім яго хлешчуць, што зьдзейсьніў „збродню" супраць польскага народу, аддаючы Вільню й Львоў камуністам.

Што мог зрабіць у сапраўднасьці Мікалайчык адносна гэтых двух гарадоў? Галоўныя вялікія дзяржавы не зьвярнулі ніякай увагі на пратэсты лёнданскага польскага эміграцыйнага ўраду, якога яны не прызналі, паколькі гэтыя гарады зь ягонымі землямі ў мінулым не былі польскімі. Сёньня на гэтых землях няма так многа палякаў і такой дыскусіі ні цяпер, ні пазьней у будучыні быць ня можа! Аднак палякі паказалі сябе такой нацыяй, якая пасягае на чужое й гэта іх кампраметуе на працягу ўсяе іхняе гісторыі.

Цікавыя тэзы выводзіць аўтар гэтае кніжкі на выпадак Трэцяй Сусьветнай вайны. Паводле яго думкі, на выпадак вайны, адзіная толькі Польшча здольная даць ідэалёгію Эўропе ды падняць яе народы з упадку ды выкрасаць у іх іскру запалу, надзею й волю. Аўтар прыпісвае, што праўда, гэтую рысу характару й немцам, але яны не пацягнуць за сабою народы, пакуль не навернуцца на хрысьціянства ад Лютэра й Кальвіна. Далей ён даказвае, што й Англія няздольня павесьці народы Эўропы, таму што яна ня ёсьць каталіцкая. Англія — кажа ён — яшчэ дыша кромвэлеўскім духам рэлігійных войнаў XVII стагодзьдзя. Польшча была ў каталіцкім лягеры, Англія — у пратэстанцкім. Пратэстанцкі дыктатар Олівэр Кромвэль — ангелец, фінансава памагаў швэдам у іхным паходзе на Польшчу й у свой час павіншаваў Густава з тым, што ён сваім паходам на Польшчу „вырваў адзін рог папу".

Тое, што Польшча ёсьць каталіцкая й да таго місіянерска-каталіцкая — нам вядома. Але што Польшча баіцца

ангельскага кіраўніцтва ў Эўропе — гэта факт, бо Англія стаіць на грунце сёньняшняй граніцы Польшчы на ўсходзе й гэтым самым Польшча ня бачыць ніякіх пэрспэктываў на Вільню й Львоў. Тады паўстануць новыя дзяржавы як Беларусь і Ўкраіна, апошняя напэўна будзе граць першую скрыпку як большая за Польшчу.

Польская палітыка была, ёсьць і будзе імкнуцца да таго, каб разьбіць еднасьць народаў на былых „крэсах". Аўтар шмат расьпісваецца на гэтую тэму, шмат дае прыкладаў, параўнаньняў і скіроўвае галоўным чынам польскую палітыку на Дунай у пошуках саюзьнікаў.

Аб беларусах аўтар выказваецца, што яны складаюць частку польскай „сполэчносьці народовэй", так як Валія й Шатлядныя зьяўляюцца часткай Вялікабрытаніі. Зь якіх крыніцаў аўтар гэта выводзіць — невядома. Магчыма са свае буйнае фантазіі. Ёсьць праўдай, што Валія й Шатляндыя твораць частку Вялікабрытаніі, але не складаюць частку Англіі. Беларусы з палякамі ніколі не тварылі Польшчу, гэта можа прыняць аўтар да ведама. Калі возьмем той гістарычны час, калі беларусы й палякі мелі супольнага караля, то й тады Беларусь не называлася Польшчай, а толькі лічылася самастойнай дзяржавай, мела свой урад, сваё войска, свае грошы, законы й т.п.

Як-бы аўтар не стараўся панізіць значэньне Беларусі й беларусаў дзеля свае захопніцкае палітыкі, гэта яму не ўдасца. Беларусь жыла, жыве й будзе жыць. Сёньня беларускі прадстаўнік, хоць ён камуніст, сядзіць у Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў разам з усімі народамі сьвету й увесь сьвет знае, што такі народ існуе.

Беларускі народ ня хоча камунізму, гэта ён паказаў у часе апошняй вайны. Беларусы хочуць жыць сваім незалежным дзяржаўным жыцьцём.

(„Аб'еднаньне" № 1 (54), Лёндан 1955 г.)

Польска-ўкраінскае Монтэ-Касына

Кожны год, у месяцы траўні, палякі сьвяткуюць гадавіну перамогі над немцамі ў здабыцьці Монтэ-Касына ў 1944 годзе. У „Дзёньніку польскім" ад 11 траўня 1991 году, у артыкуле „Польска-ўкраінскае Монтэ-Касына" Зьдзіслаў Яга-

дзінскі адбівае атакі ўкраінскіх эмігрантаў, якія хочуць прыпісаць заслугу ўкраінцам у здабыцьці гэтай нямецкай цьвярдыні ў Італіі.

Можна было-б памінуць гэты польска-ўкраінскі канфлікт, каб там не было беларусаў, якія таксама злажылі свае галовы ў подступах да манастыра Монтэ-Касына.

Вельмі добра, што ўкраінцы памятаюць пра сваіх загінуўшых суродзічаў у апошняй вайне й аддаюць ім пашану. Але не зусім добра й прыемна чытаць, калі ўкраінскі нацыянальны шавінізм перарастае нават польскі.

Той, хто быў у Другім Польскім корпусе, добра ведае, што ў ім акрамя палякаў было многа беларусаў, украінцаў, жыдоў, татараў, літоўцаў і нават немцаў. Пераважна ўсе былыя грамадзяне II Рэчы Паспалітай. Апынуліся яны ў польскай арміі таму, што многа іх папала ў палон да Чырвонай Арміі ў 1939 годзе, іншыя былі вывезены з Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны ў Сібір у часе заняцьця гэтых краін Чырвонай Арміяй згодна пакту Рыбэнтропа-Молатава ў 1939 г.

Гэтых людзей, хоць ня ўсіх, ураставала вайна (некаторыя гаварылі: Гітлер вызваліў нас, напаўшы на Савецкі Саюз). Тады-ж, на пачатку сьнежня 1941 году ген. Сікорскі, будучы ў Маскве, успамянуў Сталіну акрамя палякаў польскіх грамадзян, г.зн. беларусаў, украінцаў і іншых, што знаходзяцца ў Савецкім Саюзе, каб ім была дадзена магчымасьць уступіць у польскую армію, якая арганізавалася за мяжой. Сталін на гэта згадзіўся й хто толькі мог з польскіх грамадзян падаваўся за паляка, каб уцячы ад галоднай і халоднай сьмерці.

Такім парадкам паважная колькасьць беларусаў і ўкраінцаў з г.зв. „крэсаў усходніх" апынулася ў польскай арміі і таму ўтворана была 5-я Крэсовая дывізія. Была яшчэ 3-я Карпацкая дывізія ў саставе 2-га Польскага корпусу ў Італіі, але ў ёй беларусаў і ўкраінцаў было мала.

Тут украінскія эміграцыйныя дзеячы перабольшваюць сваімі цьверджаньнямі, што 5-я дывізія была „дывізіяй украінскай". Украінцы ў ёй не састаўлялі большасьці. Большасьць арміі састаўлялі палякі. Толькі пасьля заканчэньня вайны ў 5-ю дывізію прыйшло больш украінцаў зь нямецкай арміі, але й тады яны не састаўлялі большасьці.

Лёс жаўнераў 5-е Крэсовае дывізіі склаўся трагічна. Пасьля савецкіх лягероў, мала хто з гэтых людзей хацеў ісьці ахвотна ваяваць за Польшчу, ды яшчэ тую, пад якой яны гаравалі апошнім часам, але іншага выхаду не было. Людзям хацелася толькі вырвацца ад непасільнай працы ў савецкіх лягерах.

Будучы у Крэсовай дывізіі ў Італіі, я гутарыў зь некаторымі беларусамі-вэтэранамі з-пад Монтэ-Касына й адзін зь іх так мне апавядаў: „Мой добры сябра, беларус, будучы сьмяротна ранены асколкам у грудзі, паміраючы прамовіў: «Я за іх гіну, ляхаў»". У далейшай гутарцы мой субяседнік таксама крытычна гаварыў аб паляках і сказаў, што калі надарыцца магчымасьць, ён паедзе дамоў.

Пасьля вайны, будучы ў Англіі, вясной 1948 году мяне паслалі памагаць дэмабілізаваць 5-ю дывізію. Далі мне весьці картатэку. Праз мае рукі праходзілі ўсе паперы дэмабілізаваных жаўнераў. Я чытаў іх прозьвішчы, дату й месца нараджэньня, веравызнаньне й куды яны едуць на работу. Так, што я добра арыентаваўся ў складзе 5-е дывізіі й тут магу сказаць шчыра, што ўкраінцаў не было больш у параўнаньні да палякаў і беларусаў.

Аднойчы прыйшлі паперы, што нейкіх 6 ці 7 жаўнераў пасьля дэмабілізацыі вярталіся дамоў, на Беларусь. Я ня мог застацца абыякавым да сваіх людзей, якія стаялі групай на пляцы. Я падышоў да іх і загаварыў па-беларуску, каб даць ім знаць, што я свой. Яны зьдзівіліся крыху, пачуўшы беларускую мову, бо ў польскім войску мала хто гутарыў па-беларуску, але яны гутарылі са мною па-беларуску. Мая галоўная цікавасьць да гэтых людзей была ў тым, ці не баяцца яны часам ехаць дамоў, будучы ўжо адзін раз у „Савецкім раі". Адказы іх былі розныя, а найбольш чуліся нараканьні на палякаў. Настрой быў такі: што будзе, то будзе, а мы едзем дамоў. Адзін зь іх, парашутыст, меў крыўду да палякаў, што ўсю вайну прайшоу зь імі й нічога не даслужыўся. Старэйшы гадамі дзядзька з-пад Міра, гледзячы на мяне, сказаў: „Што табе, ты малады, знойдзеш сабе дзяўчыну, ажэнішся й будзеш жыць, а я маю дома жонку й дзяцей". Я стаяў, слухаў іхнія нараканьні, перажываньні, прычыны, спачуваў ім ды на разьвітаньне пажадаў ім усяго найлепшага.

Трэба прызнаць, што ў польскай арміі наглядалася дыскрымінацыя й на гэта маюцца прыклады, але гэта другая справа. Тут можна згадаць яшчэ аднаго беларуса, удзельніка бою за Монтэ-Касына, сьв. памяці К. Шыбіцкага, якога беларусы пахавалі ў Манчэстэры (Англія) 4 студзеня. Аб ім так піша газэта „Беларус" (№ 378 за люты 1991 году): „Прайшоўшы праз Іран, Ірак ды іншыя краіны, апынуўся ў Італіі, дзе браў удзел у баёх на Монтэ-Касына. З кампаніі, да якой належаў і якая налічвала 140 чалавек, уцалела толькі 18. Крыўдаваў, што ўсе дасталі заслугі, а яму не далі. Прычына ня ведамая — можа таму не далі, што быў сьведамым беларусам".

У лістападзе 1948 году я здэмабілізаваўся й прыехаў у Лёндан на працу. Першым месцам спатканьня беларусаў была царква на Эрль-энд-Корт у Лёндане. Прыходзілі ў царкву пераважна былыя польскія жаўнеры й некаторыя іхнія сем'і, якія праз Сібір, Сярэдні Ўсход і Афрыку пасьля вайны прыехалі ў Англію. Пры царкве завязвалася шырэйшае знаёмства сярод беларусаў. Адным зь беларусаў, якога я спаткаў, быў Мікалай Мароз, былы польскі жаўнер, які ў подступах на гару Монтэ-Касына быў цяжка паранены. Прыехаў ён у Лёндан і прывёз у сабе асколкі. Тут у 1949 годзе рабілі яму апэрацыю й памёр у маладым веку.

Калі ўкраінцы так моцна прыпісваюць сваю большасьць і ўклад у здабыцьці Монтэ-Касына, то што тады маюць сказаць беларусы? Па словах паляка З. Ягадзінскага, „працэнтова ўдзел украінцаў у II Корпусе быў зьнікомы — многа больш знаходзілася ў ім беларусаў". Шкада, што да гэтага часу ніхто зь беларусаў, удзельнікаў баёў на Монтэ-Касына, нічога не напісалі.

Аб Монтэ-Касына палякі маюць багатую літаратуру. Беларусы яе ня маюць, хоць многа іх там было й нямала засталося там назаўсёды. Што праўда, ёсьць толькі невялічкая кніжачка на 62 старонкі — „Сьмерць і салаўі", напісаная беларусам-афіцэрам П. Сычом, удзельнікам бою на Монтэ-Касына. У прадмове да гэтае кніжачкі чытаем: „Кніжка апісвае бітву пад Монтэ-Касына — адну з найвялікшых бітваў Другой Сусьветнай Вайны — і ўдзел некаторых зь іх, расказвае што яны перажывалі ў чужым войску, ідучы на пагібель за чужую справу. Праўда, яны змагаліся з гітле-

раўскай тыраніяй, але-ж тады ўжо было ведама, што Беларусь была здадзена на ласку й няласку другога тырана — бальшавіцкай Масквы".

(„Голас Часу" № 13 (4), Лёндан, 1991 г.)

Фальшаваньне гісторыі

Жыцьцё паасобных людзей і народаў гэта сталае змаганьне за свой быт і існаваньне. Як даўно існуе сьвет між людзьмі адбываліся непаразуменьні, войны ды перасяленьні цэлых народаў, якія па тых ці іншых прычынах вандравалі сотні й тысячы кілямэтраў у новыя так званыя „абяцаныя землі".

Падобныя зьявішчы, крыху ў іншым выглядзе, мы назіраем у недалёкім мінулым і за нашага жыцьця. Аб такіх падзеях на нашай зямлі-шары навукоўцы розных краінаў выдаюць цэлыя томы працаў, якія ў будучыні, для наступных пакаленьняў, маюць служыць гістарычнай дакумантацыяй.

Таму гісторыя ня ёсьць байкай, яна павінна апірацца на пэўных даных — дакумантах, досьледах, раскопках і т.п. Так што зьмяняць гісторыю нельга, яе можна толькі фальшаваць.

У гэтым артыкуле я хачу зьвярнуць увагу на такое фальшывае асьвятленьне гістарычных фактаў польскімі гісторыкамі за мяжой.

У 1952 годзе, па ініцыятыве Зьвёнзку зем пулноцно-всходніх РП, прафэсары й выпускнікі Віленскага ўнівэрсытэту імя С. Баторага ў Школе палітычных навук у Лёндане прачыталі 27 лекцыяў аб Вялікім Княстве Літоўскім, якія пасьля выдалі асобнай кніжкай пад назовам „Дзее Зем Велькего Ксенства Літэвскего". Кніжка гэта налічвае 398 старонак друку й напісана вельмі тэндэнцыйна.

Палякі прыйшлі на нашыя землі ў XIV стагодзьдзі й выступаюць як вышэйшы, дамінуючы дзейнік, які нёс заходнюю культуру, рэлігію, асьвету й польскую мову. Мясцовае насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага, паводле польскіх лектараў, быццам дабравольна прымала ўсе гэтыя дабрадзействы палякаў, рэзультатам якіх у XVII стагодзьдзі ва ўсім Вялікім Княстве Літоўскім польская мова была ўрадавай, а каталіцкія касьцёлы амаль выключнымі сьвятынямі. Аў-

тахтоны-ж гэтых зямель, беларусы й літоўцы, называюцца палякамі „тутэйшымі" грамадзянамі Рэчы Паспалітай.

Каб правесьці больш дакладны аналіз данае кніжкі й запярэчыць няслушным вывадам палякаў, апіраючыся на досьледы й матэрыялы другіх гісторыкаў і навукоўцаў, трэба было-б адвесьці больш часу й месца на што не дазваляюць рамкі гэтага часопіса. Таму я коратка затрымаюся над важнейшымі гістарычнымі фактамі, якім польскія прафэсары й абітурыенты „Вшэхніцы Баторовэй" хочуць надаць чыста польскі характар, а прыналежнасьць гэтых зямель прыпісваюць Польшчы.

Да прыходу палякаў на беларуска-літоўскія землі, у сувязі з сужэнствам Ягайлы зь Ядвігай, Беларусь была ўжо хрысьціянская й тварыла зь Літвой адну дзяржаву пад назовам Вялікага Княства Літоўскага. Праваслаўнае веравызнаньне беларусы прынялі ў 988 годзе ад грэкаў зь Візантыі й праз чатыры стагодзьдзі (да прыходу палякаў) узгадавалі ў рэлігійным духу наступныя пакаленьні, даючы ім на той час вялікую культуру й асьвету.

У той час (XIV-XV ст.ст.), калі Польшча не магла вызваліцца з лаціны, бо ня мела свайго пісьма, беларуская мова ў Вялікім Княстве Літоўскім была мовай урадавай, на якой гутарыў і пісаў ня толькі вялікакняскі двор, але й сам польскі кароль. У гэтых гадох былі выдадзены тры несьмяротныя Статуты дзяржаўных законаў (1529, 1566, 1588 гады), якія былі напісаны на беларускай мове ды якімі, між іншым, нямала карысталіся палякі, а яшчэ больш расейцы. Беларуская мова ў той час была папулярнай, яе пераймалі літоўцы й несьлі ў глыб Літвы. Прыкладам можа паслужыць факт, што польска-літоўскі пасол у Рыме Эразм Цёлэк у 1501 годзе казаў папу Аляксандру VI, што на Літве пражывае палавіна беларусаў і што радавыя літоўцы часьцей ужываюць беларускую мову як „прыемнейшую й лягчэйшую".

Палякі, запазнаўшыся зь беларускай мовай, пачалі дамагацца, каб мець такі Статут на польскай мове, як больш для іх зразумелай за лаціну, а таму што польскага пісьменства ў той час не было, то пераклады рабіліся з лацінскай мовы на беларускую. Такім парадкам былі перакладзены з лаціны на беларускую мову:

1. Варцкі Статут, перакладзены ў 1420 г.
2. Статут вялікага князя Ягайлы ад 1423 г.
3. Вісьліцкі Статут XV ст., не пазьней за 1423 г.

У гэтых перакладах спатыкаецца многа палянізмаў, магчыма таму, каб зрабіць мову больш зразумелай для палякаў. Але зь цягам часу сытуацыя зьмянілася. Палякі, ахрысьціўшы паганскую Літву ў каталіцызм (1387), пачалі сягаць на беларускія землі. Маючы супольнага караля, які прыняў каталіцкую веру й жыў у Кракаве, Польшча на чале зь Ягайлам дапамагала каталіцкаму кліру праводзіць сярод праваслаўных беларусаў сваю „місійную" акцыю, якая адначасна была й палянізацыйным сродкам. За такую дзейнасьць Ягайла надзяляў каталіцкія касьцёлы вялікімі полацямі зямлі зь вёскамі.

Асабліва пасьля Люблінскай вуніі ў 1569 годзе, калі палякі атрымалі большыя правы дзеяньня ў Вялікім Княстве Літоўскім, наступіў раптоўны наплыў палякаў на беларускія землі. Як самі прызнаюць палякі, эміграцыя была „выборова", складалі яе ксяндзы, манахі, навукоўцы, палітыкі, пісьменьнікі, тэхнікі, купцы, рамесьнікі, эканамісты й майстры розных галін. Прыехала й заможная шляхта, якая атрымала маёнткі.

Нельга памінуць, што ў гэтым часе прыехаў на Беларусь ордэн езуітаў, які гвалтам і прымусам выганяў з цэркваў праваслаўнае духавенства зь вернікамі, а на іх месца саджалі вуніятаў.

Якую зьнявагу перажывала тады Праваслаўная царква, можа паслужыць доказам прамова валынскага пасла Лаўрына Дравінскага сказаная ім на польскім сойме ў 1620 годзе: „Ужо ў вялікіх гарадох цэрквы запячатаны, — гаварыў ён, — маёмасьці разграблены, у манастырох няма манахаў — там скаціну зачыняюць. Дзеці паміраюць без хрышчэньня, пакойнікаў вывозяць з гарадоў без пахаваньня як падаль. Мужчыны з жонкамі жывуць без бласлаўленьня, народ памірае без хрышчэньня. Так робіцца ў Магілёве, Воршы, Менску. У Вільні цела праваслаўнага пакойніка трэба вывозіць у тыя толькі вароты, празь якія вывозяць з гораду нечыстоты". А такіх і падобных прыкладаў таго часу маецца вельмі многа.

Такое становішча змусіла пэўную частку слабейшай беларускай інтэлігенцыі перайсьці ў вунію або проста ў каталіцызм, адкуль вяла ў той час зусім кароткая дарога да поўнай дэнацыяналізаці й апалячаньня.

Аднак польска-каталіцкі наступ на Беларусь на працягу стагодзьдзяў напатыкаў вялікі супраціў мясцовага беларускага насельніцтва. Вялікі князь Гедымін у свой час у адным са сваіх лістоў пісаў папу: „Няхай палякі вызнаюць веру паводле свайго абраду, беларусы паводле свайго, мы паводле свайго, а ўсе маем аднаго Бога".

Але палянізацыя на нашых землях адбывалася сыстэматычна й плянава. Розныя пратэсты на соймах не знаходзілі ў палякаў послуху. Так, напрыклад, 22 лютага 1581 году на сойме ў Варшаве Мікалай Радзівіл (Рыжы) скардзіўся ў сваёй прамове: „Ня знойдзецца ніводзін у Польшчы на „-іч", якому далі-б староства або якую-небудзь годнасьць; у Літве знаходзяцца на „-скі", якія ўрады маюць". З гэтага ясна відаць, што палякі, не зважаючы на пратэсты беларускага баярства, надалей праводзілі сваю палітыку, якая на Беларусі стала пад знакам зьнішчэньня ўсяго беларускага, а ў першую чаргу — праваслаўнае рэлігіі й беларускай мовы, уводзячы на іх месца каталіцкую рэлігію й польскую мову. Прыкладам гэтаму могуць паслужыць розныя пастановы польскага сойму супраць беларусаў.

У 1667 годзе польскі сойм пастанавіў вызваліць ад ваенных абавязкаў каталіцкае й вуніяцкае духавенства, а праваслаўнае ніжэйшае духавенства павінна было плаціць падаткі так, як плацілі мяшчане.

У 1668 годзе польскі сойм пастанавіў пераход з каталіцтва або вуніі ў іншую веру караць выгнаньнем з краю.

У 1676 годзе быў выдадзены закон, у якім праваслаўным забаранялася пад карай сьмерці выязджаць за мяжу, або прыязджаць з-за мяжы.

У 1697 годзе польскі сойм прыняў пастанову, якая забараняла ўжываць беларускую мову ва ўрадах, судох і ўсялякіх урадавых установах, як у справаводзтве, так і ў карыстаньні.

У 1718 годзе на сойме ў Горадні быў нават прыняты праект закону аб канчатковай ліквідацыі праваслаўя на Беларусі.

Няма нічога дзіўнага, што беларусы, апынуўшыся пад такім жорсткім прасьледам з боку палякаў, пачалі арыентавацца на ўсход, шукаючы помачы, ратунку. Такім чынам польскі зьдзек і прывёў да таго, што Масква забрала Беларусь, а пасьля супольна з Прусіяй і Аўстрыяй падпарадкавалі сабе й Польшчу. Каб не такая злачынная палітыка палякаў на Беларусі, можа сёньня Масква не камандавала-б намі.

Аб беларускіх нацыянальных дзеячох і пісьменьніках аж да Першай Сусьветнай вайны, польскія „навукоўцы" пішуць, што яны былі пераважна ня толькі палякі, але нават польскія патрыёты. Так як даўней, па старому звычаю, усіх каталікоў яны лічаць палякамі й праўдападобна так жа ўсіх тых, што маюць прозьвішчы на суфікс „-скі".

Аб Кастусю Каліноўскім пішуць, што ён зьяўляецца палякам і польскім патрыётам, забываючы аб тым, што ён у сваёй „Мужыцкай праўдзе" пісаў па-беларуску! „Ад маскаля й паноў няма чаго спадзявацца, бо яны ня вольнасьці, а глуму й зьдзерства нашага хочуць... („Мужыцкая праўда" № 1).

У часе арганізацыі паўстанцкіх аддзелаў, некаторыя з беларускіх кіраўнікоў дамагаліся, каб віленскія паўстанцы мелі цесную лучнасьць з Варшавай. На гэта К. Каліноўскі заявіў, што „такой бесталковай галаве як Варшава, ня можна давяраць долю Беларусі" й што „сякера паўстанца не павінна спыніцца нават над калыскай шляхоцкага дзіцяці".

Кастусь Каліноўскі паходзіў з небагатай шляхецкай сям'і, але ён быў беларусам, які будзіў свой народ да вольнасьці, заклікаў яго да асьветы, выдаваў нелегальную беларускую газэту й за сваю беларускую дзейнасьць 22 сакавіка 1864 году загінуў у Вільні на шыбеніцы па загадзе губэрнатара Мураўёва як беларускі нацыянальны герой-патрыёт.

Другі „паляк" гэта Францішак Багушэвіч, які выдаў два зборнікі беларускіх вершаў „Дудка беларуская" ў 1891 годзе й „Смык беларускі" ў 1894 годзе. На асаблівую ўвагу заслугоўвае прадмова Багушэвіча да зборніка „Дудка беларуская", якую можна назваць маніфэстам беларускага нацыянальнага ўсьведамленьня.

Ці мог сапраўдны паляк пісаць так, як гэта пісаў Ф. Багушэвіч: „Не пакідайце мовы нашай беларускай, каб не ўмёр-

лі". Да ліку палякаў залічалі таксама Вінцука Дуніна-Марцінкевіча, Алёйзу Пашкевіч (Цётку) і другіх.

Мы ня можам разглядаць вышэйзгаданыя асобы паводле польскага рэцэпту: хто каталік — той паляк, а павінны заглянуць у працу гэтых людзей, што яны рабілі й што пісалі.

Нашыя ворагі — як з захаду, так і з усходу — стагодзьдзямі намі гандлявалі, аднак, калі найзьлейшыя іхнія кары не змаглі забіць волі беларускага народу да свабоды, то тым больш ня зьменіць яе фальшаваньне польскімі прафэсарамі гісторыі.

(„Аб'еднаньне" № 4 (57), Лёндан 1955 г.)

За плотам Катыньскага лесу

Назоў невялікай вёскі Катынь, што знаходзіцца з боку дарогі Менск — Смаленск, можна знайсьці ў замежнай энцыкляпэдыі як месца масакры польскіх афіцэраў у 1940 годзе.

Амаль 50 гадоў праступнік сядзеў ціха, не прызнаваўся да віны, хоць цывілізаваны сьвет даўно знаў яго, а апошнімі гадамі савецкая прэса нехаця прызнала віну свайго ўраду. І толькі 13 сакавіка 1990 году Маскоўскае радыё падало да ведама, што знойдзеныя апошнім часам дакуманты паказваюць, што злачынства ў Катыні было зроблена кіраўніцтвам НКУС (папулярна вядомым як НКВД). У сувязі з гэтым савецкі бок выказаў глыбокае спачуваньне з прычыны трагедыі й прызнаў Катынь за адно з найбольшых сталінскіх злачынстваў.

Яшчэ раней, пад узьдзеяньнем галоснасьці, тыднёвая газэта на ангельскай мове „Москаў Ньюс" (№ 32 ад 6 жніўня 1989 г.) прызнала, што тайная паліцыя Сталіна замардавала польскіх афіцэраў у Катыньскім лесе.

Усё-ж, нягледзячы на галоснасьць, некаторыя мясцовыя жыхары, што жывуць каля Катыньскага лесу (16 кілямэтраў на захад ад Смаленска), баяліся аб гэтым гаварыць голасна й са страхам глядзелі ў бок забароненай зоны. Але ў часе Другой Сусьветнай вайны, як і па вайне, знайшліся людзі, якія сьмела гаварылі аб Катыньскім лесе, ды нават самі адкрылі магілы памардаваных. Адным зь іх быў Міхась Крывазерцаў, жыхар Гнездава, што недалёка Катыньскага лесу. Ён

ня меў і ня мог мець пашаны да савецкай улады, бо-ж ягоны бацька стаў ахвярай калектывізацыі. Крывазерцаў заявіў наступнае: „Я асабіста бачыў і знаю, ёсьць тое: у 1943 г. Іван Андрэеў і Фёдар Куфцікаў сказалі немцам, што яны знаюць дзе нашае войска страляла палякаў". Немцы ўзялі некалькі людзей, далі ім лапаты й яны пачалі капаць зямлю. І, як расказвае далей Крывазерцаў, адкапалі 18 нашых трупаў, евангелістаў, а пасьля 300 трупаў палякаў.

Значыць, што пасьля забойства палякаў, забівалі яшчэ сваіх, бо-ж ляжалі яны на версе палякаў. Так, што ў Катыньскім лесе пахаваны былі не адны палякі.

З расказаў навочных сьведкаў відаць, што Катыньскі лес, як месца сьмерці, запачаткавалі ня толькі польскія афіцэры й на іх не закончыліся забойствы. Яшчэ задоўга да палякаў знайшлі сваю сьмерць у Катыні нямала беларусаў і другіх нацыянальнасьцяў былога Савецкага Саюзу. Ды нават сярод замардаваных палякаў спатыкаюцца імёны Канстанцін, Мікалай, Барыс і т.п., што нагадваюць праваслаўных. Спатыкаюцца й жыдоўскія імёны. Аднойчы ў гутарцы адзін беларус, Алесь Ражанец, сказаў, што яго дзядзька, Пётр Ражанец, будучы польскім афіцэрам, загінуў у Катыні й ягонае прозьвішча фігуруе на сьпіску загінуўшых.

З расказаў некаторых жыхароў навакольля Катыні даведваемся, што гісторыя Катыньскага лесу, як месца экзэкуцыі, сягае 1918 году. У гэтым-жа годзе, 22 жніўня, Ленін сказаў: „Часова дараджаю назначыць сваіх начальнікаў і расстрэльваць загаворшчыкаў і зьменлівых, нікога не пытаючы й не дапускаючы да валакіты". 5 верасьня 1918 году, паводле прапановы Сьвярдлова, быў прыняты дэкрэт аб чырвоным тэроры, у якім гаварылася: „Неабходна забясьпечыць Савецкую Рэспубліку ад клясавых ворагаў шляхам ізаляваньня іх у канцэтрацыйных лягерох". Гэтыя лягеры мелі існаваць на час рэвалюцыі. Але ў лютым 1919 году на паседжаньні УЦВК Дзяржынскі заявіў: „Я прапаную пакінуць гэты канцэнтрацыйны лягер для выкарыстаньня працы арыштаваных, для паноў, якія жывуць без заняткаў, для тых, хто ня можа працаваць без вядомага прымусу. У часе НЭПу Ленін сказаў: „Вялікая памылка думаць, што НЭП палажыў канец тэрору, мы яшчэ вернемся да тэрору, і тэ-

рору эканамічнага". А паводле Кагановіча, у 1920-1930 гадох судзілі людзей скрыта г.зв. „тройкай". І пасьля такіх судоў некаторыя людзі, памінаючы канцэнтрацыйныя лягеры, прыгаворваліся на кару сьмерці. Работу гэту пачала ЧК Дзяржынскага, якога звалі „Жалезным Фэліксам".

У 1930 годзе дзесяткі тысяч зьняволеных перабудоўвалі дарогу Менск — Масква. Непаслушных і хворых вязьняў везьлі ў Катыньскі лес, дзе мела быць „адпачынковае ведамства". Але з гэтага „ ведамства " ніхто не вярнуўся на работу.

Дарога Менск — Масква, як тады, так і ў першых днях савецка-нямецкай вайны 1941 году прыняла назоў „Дарогі сьмерці". Па ёй энкавэдысты гналі вязьняў перад наступам немцаў і ўсіх слабых, зьняможаных, што не маглі далей ісьці, стралялі на дарозе.

У 1931 годзе пэўны раён Катыньскага лесу быў абведзены калючым дротам і ўступ за дрот эабараняўся. У 1935 годзе Катыньскім лесам загадвала ГПУ, якое праводзіла сталінскія чысткі. Ад 1940 году ўвесь гэты раён кантраляваў НКУС, а Казіную Гару, месца экзэкуцыі, ахоўвалі вартавыя з сабакамі аж да прыходу немцаў у 1941 годзе.

У дапамогу НКУС створаны быў новы орган бясьпекі — НКДБ (Народны Камісарыят Дзяржаўнай Бясьпекі). У 1940 годзе на чале НКУС стаяў Бэрыя, а на чале НКДБ — нарком Мяркулаў.

Народны камісар унутраных спраў Беларусі, Наседкін, быў застрэлены разам зь людзьмі Яжова ў выніку чысткі апарату й быццам за масавую арганізацыю рэпрэсіяў. У сваім асьведчаньні Наседкін сказаў, што 4 500 людзей са Смаленшчыны было прыгавораных на сьмерць.

Так, як расказвалі навочныя сьведкі, загружаныя людзьмі самаходы пачалі прыязджаць у Катыньскі лес у 1935 годзе й прыязджалі яны аж да паловы 1941 году. Адзін зь мясцовых жыхароў сказаў: „Нам было сказана, што тут знаходзіцца санаторыя для працаўнікоў тайнай паліцыі. Але цяжка было паверыць, бо мы бачылі толькі цяжкія грузавыя машыны, якія прыязджалі й ад'язджалі, часам некалькі разоў на дзень.

Месца катыньскай масакры афіцыйна немцы адкрылі пры канцы 1943 году й паведамілі свае ўлады. У паведамленьні было сказана, што трупы — польскія афіцэры, якія мелі

зьвязаныя рукі вяроўкай мясцовай вытворчасьці, але кулі, якімі стралялі ў патыліцу, былі нямецкай прадукцыі. Неўзабаве немцы ўстанавілі, што адна іхняя фірма высылала перад вайною амуніцыю ў Польшчу, Балтыйскія дзяржавы і СССР. А пры заняцьці Заходняй Беларусі й Украіны Чырвонай Арміяй у 1939 годзе амуніцыі гэтай дасталося саветам больш. 13 красавіка 1943 году Бэрлінскае радыё падало сэнсацыйную вестку аб адкрыцьці магіл памардаваных польскіх афіцэраў недалёка малой вёскі Катынь, на лясной гары званай Казінай Гарой. Там знойдзены быў засыпаны роў даўжынёю 28 мэтраў і шырынёю 16 мэтраў, у якім адкапалі тры тысячы трупаў зложаных у 12 пластоў. Месца гэтае засаджанае было маладым лесам. Немцы абвінілі ў злачынстве Савецкі Саюз, які быў саюзьнікам заходніх дзяржаваў у вайне зь Нямеччынай. Аб гэтым адкрыцьці пісала нямецкая прэса, а таксама пісалі й другія газэты, якія выходзілі на акупаванай немцамі тэрыторыі, у тым ліку й беларуская прэса.

Знаючы гебэльсоўскую прапаганду, мала хто хацеў верыць нямецкаму адкрыцьцю ў Катыньскім лесе, нават палякі ў Лёндане. Агульная прапаганда асуджала немцаў, бо-ж людзі былі забітыя нямецкімі кулямі.

На паведамленьне Бэрлінскага радыё Маскоўскае радыё й газэта „Правда" 15 красавіка 1943 г. адказалі контрударам, заяўляючы, што злачынства ў Катыні было зроблена немцамі ў 1941 годзе. Гэта значыць у той час, калі немцы акупавалі Смаленск. Паслухаем, што аб гэтым піша былы партызан, доктар гістарычных навук, прафэсар А. Хацкевіч: „Упершыню я прачытаў гэтую інфармацыю ў „Беларускай газэце", якая выдавалася ў Менску беларускімі буржуазнымі нацыяналістамі ў часе акупацыі. Ні я, ні мае баявыя сябры, партызаны, зразумела, не паверылі фашысцкай брахні. Праз некалькі дзён радыст нашай брыгады прыняў па радыё паведамленьне з Масквы, у якім гаварылася: „На працягу апошніх двух, трох дзён гебэльсоўскія паклёпнікі пашыралі подлыя выдумкі аб тым, што савецкія ўлады вясной 1940 г. у ваколіцы Смаленска папоўнілі масавы расстрэл польскіх афіцэраў. Уяўляючы гэты жудасны факт, нямецка-фашысцкія нягоднікі не захісталіся перад самымі бессаромнымі й агіднымі выдумкамі, стараючыся схаваць зла-

чынствы, якія, як цяпер стала вядома, папоўнілі яны самі. Нямецка-фашысцкія інфармацыі ў гэтай справе не пакідаюць ніякага сумненьня ў гэтым трагічным лёсе быўшых польскіх ваеннапалонных, якія былі захоплены на будаўляных работах у 1941 г. у ваколіцы Смаленска й якія разам з савецкімі грамадзянамі, пражываўшымі ў навакольлі Смаленска, папалі ў рукі нямецкіх палачоў летам 1941 году пасьля адыходу савецкіх войск з раёна Смаленска" („Вечерний Минск", 26 мая 1990 г.).

Калі першыя інфармацыі аб адкрыцьці катыньскіх магіл дайшлі да польскага грамадзтва ў краі, Людовік Фішэр, губэрнатар Варшаўскай акругі, 6 красавіка прыняў біскупа Антонія Шлягоўскага й двух праваслаўных епіскапаў, а таксама лютэранскіх і евангельскіх сьвятароў, каб яны паднялі барацьбу супраць камунізму й у гэтым духу выдалі свае пастырскія пасланьні. Нямецкая прэса шырока выкарыстоўвала Катынь дзеля сваіх прапагандысцкіх мэтаў, каб выклікаць сярод заходніх саюзьнікаў недавер да Савецкага Саюзу. У шматлікіх камунікатах і рапартах падаваліся апісаньні трупаў. Але Захад глядзеў на гэта зь недаверам.

Каб даказаць, хто ёсьць сапраўдным віноўнікам Катыньскай масакры, немцы стварылі Міжнародную камісію, у якую ўвайшлі ўнівэрсытэцкія дактары-спэцыялісты з 12 краін Эўропы, а ў якасьці сьведкаў выступілі прывезеныя зь лягероў палонныя ангельскія, амэрыканскія й польскія афіцэры. Спэцыялістам была дадзена поўная свабода, неабходная дапамога й магчымасьць свабодна весьці сьледзтва, якое пачалося 28 красавіка 1943 году.

У рабоце па высвятленьні Катыньскай масакры прысутнічалі таксама польскія прадстаўнікі з Варшавы, Кракава й другіх мясцовасьцяў, а Польскі чырвоны крыж праводзіў сваё незалежнае сьледзтва. Вынікі сьледзтваў паказалі, што мардэрства было зроблена вясной 1940 году, крыху больш як год часу да пачатку нямецка-савецкай вайны. Гэта пацьвердзілі знойдзеныя пры забітых пісьмы з дому, савецкія газэты, запісы, польскія й савецкія грошы й другія рэчы савецкай прадукцыі. Таксама знойдзены ў часе вайны тайны рапарт менскага НКУС ад 10 чэрвеня 1940 году паказвае, што й ён прымаў удзел у ліквідацыі польскіх афіцэраў.

Калі немцы, адступаючы, пакідалі Катыньскі лес і яго захапіла Чырвоная Армія ў восені 1943 году, то адразу зьявілася туды Спэцыяльная камісія па ўстанаўленьні й расьсьедаваньні абставін расстрэлу нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Катыньскім лесе ваенна-палонных польскіх афіцэраў. І ў гэтым-жа 1943 годзе была пастаўлена дошка з надпісам: „Здесь в Катынском лесу осенью 1941 года расстреляны гитлеровским извергом 11 000 военнопленных польских солдат и офицеров. Воин Красной Армии отомсти!"

Напісаны савецкімі органамі змест дошкі ўжо сьведчыць, што немцы былі абвінавачаны ў Катыньскай масакры яшчэ да таго, пакуль Спэцыяльная камісія пачала весьці свае досьледы.

Аб тым, як саветы маскавалі сваё злачынства ў Катыні, сьведчыць расказ супрацоўніка камісіі Палітбюро ЦК КПСС, зьмешчаны ў газэце „Аргументы и факты" (№ 33, 18-24 августа 1990 г., с. 5):

„Калі ў 1960 г. я працаваў у саставе камісіі ЦК КПСС па расьсьледаваньні судовых працэсаў 30-х гадоў, мне прыйшлося студыяваць партыйныя архівы, гутарыць з многімі людзьмі. Асабліва П. Богаяўленскі, галоўны памочнік ачольваючага місію Палітбюро Н. Швэрніка, расказваў мне наступнае.

Усе польскія палонныя афіцэры, якія апынуліся ў Катыні яшчэ да вайны зь немцамі, былі расстраляны па ўказаньні Сталіна. Калі немцы захапілі Катынь, гэтае злачынства было выяўлена, а савецкі ўрад прыпісаў яго немцам.

Пасьля таго як Смаленская вобласьць была вызвалена ад немцаў, быў уложаны плян, які ставіў сваёй мэтай даказаць, што злачынства ў Катыні — справа рук гітлераўцаў.

Тады-ж была створана камісія пад старшынствам Швэрніка, у той час старшыні Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету РСФСР, у якую ўвялі мітрапаліта, вучоных, пісьменьнікаў для пасьведчаньня злачынства ў Катыні. Аднак, пакуль камісія выехала ў Катынь, туды была паслана група супрацоўнікаў Лубянкі. Яны выкапалі трупы, палажылі ў скрынкі й прывезьлі ў Маскву ў Інстытут судовай мэдыцыны. Там зь іх былі вынятыя кулі савецкага вырабу й заменены нямецкімі, а ў кішэні ўложаны нямецкія газэты й грошы. Пасьля трупы адвезьлі назад, закапалі й паставілі на іх тычкі.

Камісія на чале са Швэрнікам і Богаяўленскім у тым часе прыбыла ў Катынь, зноў былі раскопаны трупы й устаноўлена, што расстрэл праведзены быў немцамі, таму што кулі — нямецкія, газэты й грошы — таксама".

Спэцыяльная камісія на чале з акадэмікам Бурдзенкам праводзіла сваё сьледзтва, пераважна на допытах сьведкаў, ад 26 верасьня 1943 года да 24 студзеня 1944 года, а дактары разглядалі магілы толькі адзін тыдзень, ад 16 да 23 студзеня 1944 году.

Асьведчаньне савецкай камісіі было загадзя вядомае: у Катыні закапаны ваеннапалонныя палякі, расстраляныя нямецкімі акупантамі. Агульны лік трупаў акрэсьліваўся на 11 тысяч, а фактычна пахаваных іх было каля чатырох тысяч. Далей прыводзіліся фальшывыя інфармацыі, быццам польскія палонныя працавалі на захад ад Смаленска ў верасьні 1941 году й восеньню таго-ж году немцы іх расстралялі, а віну ўсклалі на саветаў, каб увесьці замяшаньне паміж расейцамі й палякамі. Знаходзіліся фальшывыя сьведкі, якія абвінавачвалі немцаў у зьнішчэньні славянскага народу й т.п.

Дарэчы згадаць, што ў савецкай камісіі не было нікога з замежных прадстаўнікоў і нават польскіх камуністаў. Толькі 30 студзеня 1944 году палкоўніку Бэрлінгу дазволена было наведаць Катынь і ён у сваёй прамове сказаў: „Кроў палякаў памардаваных немцамі кліча аб помсьце. Нам належыцца памсьціць за іх і мы памсьцім!"

Ці памятаў у той час палкоўнік Бэрлінг, што казаў яму і яго сябрам у Маскве на Лубянцы Бэрыя зь Мяркулавым 30 кастрычніка 1940 году: „Мы сделали ошибку, большую ошибку сделали"? Але аб гэтым будзе далей.

Усё-ж камуністы Масквы маскавалі сваю злачынную работу. І як піша той-жа прафэсар А. Хацкевіч, версія аб расстрэле польскіх афіцэраў немцамі была паўторана ў выглядзе лістовак і пашырана па ўсіх большых населеных пунктах Івянецка-Налібоцкай зоны, дзе быў атрад польскіх легіёнаў. Камуністам залежала, каб у партызан і насельніцтве зоны замацаваць веру ў тое, што злачынства пад Смаленскам учынілі гітлераўцы, а віну злажылі на саветаў таму, каб увесьці раскол у антыгітлераўскую кааліцыю.

Калі Чырвоная Армія пасоўвалася на Захад, то органы бясьпекі шукалі ўдзельнікаў міжнароднай камісіі, якая працавала ў Катыньскім лесе пры немцах. Аднаго зь іх, балгарына д-ра Маркава арьштавалі й судзілі. Ён прызнаў „сваю віну" перад балгарскім народам і публічна адмовіўся ад сваіх папярэдніх асьведчаньняў, быццам яны былі зроблены пад прымусам ды абвінавацiў немцаў у Катыньскай масакры.

Заходнія дзяржавы ведалі, што іх саюзьнік Савецкі Саюз нясе адказнасьць за Катынь, але яны не хацелі рабіць з гэтага новага скандалю, што магло-б прывесьці да разьбіцьця антыгітлераўскай кааліцыі, на што разьлічвалі немцы. У той час нямецкая армія была даволі моцная й саюзьнікам хадзіла выйграць вайну, дзеля таго яны маўчалі аб Катыні. Тысячы загінуўшых польскіх афіцэраў не зьяўляліся для заходніх аліянтаў вялікай праблемай, паколькі на вайне ў сусветным маштабе загінулі ўжо мільёны людзей.

Быў тут і другі повад пасыўнасьці, маўчаньня Захаду пра Катынь, якое наводзіла на іх страх і небясьпеку. Праз даўжэйшы час Сталін прасіў аліянтаў, каб яны адчынілі другі фронт на Захадзе, які заставіць немцаў забраць часьць свае арміі з Усходу й перакінуць на Захад, што аслабіць націск немцаў на ўсходнім фронце. З гэтым аліянты адцягвалі й цяпер баяліся, каб Сталін не пагадзіўся з Гітлерам і не заключыў новы пакт, як гэта здарылася ў 1939 годзе. Таму Амэрыка й Англія аказаліся пакорнымі перад Савецкім Саюзам, што адбілася на канфэрэнцыях заходніх лідэраў са Сталіным. І хоць яны выйгралі вайну, але Захад за канфэрэцыйным сталом прайграў Цэнтральную Эўропу.

Цікава яшчэ й тое, што пасьля вайны, як судзілі ў Нюрнбэргу нямецкіх ваенных злачынцаў, 1-3 ліпеня 1946 г. разглядалася справа Катыні. Расейскі пракурор-генэрал Рудзенка, а не палякі, абвінялі гітлераўцаў у масакры польскіх афіцэраў у Катыньскім лесе, але яму не ўдалося даказаць віну немцаў.

І тут, у Нюрнбэргу, заходнія судзьдзі прамаўчалі Катынь. Гэтым разам хадзіла ім захаваць на сьвеце мір пасьля выйгранай вайны. Мір гэты меў быць забясьпечаны праз утварэньне Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў, у якую меў увайсьці й Савецкі Саюз. Такое заданьне мела для заходніх аліянтаў большае значэньне чым Катынь і яны яго ціха абыходзілі.

Гісторыя з польскімі афіцэрамі, якіх замардавалі ў Катыньскім лесе трагічная, але ціквая ў палітычным сэнсе. 17 верасьня 1939 году Польшча перастала існаваць, яна была падзелена паміж Нямеччынай і СССР. Гітлер і Сталін сталіся саюзьнікамі, мелі падпісаны пакт аб неагрэсіі. Але пры канцы 1940 году адносіны паміж імі пачалі халадзець, што азначала няўхільную вайну. Тады органы бясьпекі СССР пачалі шукаць сярод польскіх палонных афіцэраў, сымпатыкаў камунізму. Пры іхняй дапамозе намячалася стварыць польскае войска пад сваёй камандай.

Знойдзена было некалькі вышэйшых штабовых афіцэраў на чале з палкоўнікам Бэрлінгам, якіх прывезьлі ў Маскву на перагаворы. У перагаворах, якія адбыліся 30 кастрычніка 1940 году ў будынку турмы на Лубянцы, прымаў удзел нарком НКУС Бэрыя й нарком Мяркулаў. І калі гутарка зайшла аб прыцягненьні польскіх генэралаў, якія знаходзіліся ў савецкім палоне, дык тут Бэрыя не зусім ясна сказаў: „Мы сделали ошибку, большую ошибку сделали". Але ў той час ніхто нічога ня знаў...

На пачатку нямецка-савецкай вайны, якая пачалася 22 чэрвеня 1941 году, устаноўлены былі дыпляматычныя зносіны Вялікабрытаніі з Савецкім Саюзам. Праз англічан палякі сустрэліся з расейцамі ў Лёндане й 30 ліпеня 1941 году падпісалі дыпляматычнае пагадненьне, а 12 жніўня была падпісана мілітарная канвэнцыя. Такім парадкам былі ўстаноўлены дыпляматычныя зносіны з Масквой і зроблены захады па арганізацыі Польскай Арміі ў Расеі з палонных польскіх жаўнераў 1939 году й цывільных грамадзян, якія былі вывезеныя зь Беларусі й Украіны ў Сібір і другія раёны СССР.

Армію арганізаваў выпушчаны з турмы на Лубянцы генэрал У. Андэрс. Ён ужо чуў аб сваіх афіцэрах у лягерох СССР і спадзяваўся на іх дапамогу. 16 жніўня 1941 году ген. Андэрс запрасіў на афіцыйнае паседжаньне прадстаўнікоў савецкіх ваенных уладаў — ген. Панфілава ў прысутнасьці ген. НКУС Жукава. Андэрс спытаў савецкіх генэралаў аб планаванай колькасьці Польскай Арміі. Адказ быў наступны: тысяча афіцэраў і 20 тысяч салдат. Гэта абурыла ген. Андэрса, які ведаў прыблізную колькасьць афі-

цэраў у савецкім палоне, ня лічачы звычайных жаўнераў і вывезеных з Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны нейкіх 250 тысяч людзей.

Калі для польскіх грамадзянаў у СССР была аб'яўлена амністыя й пачала арганізавацца Польская Армія, то палякі не далічыліся сваіх афіцэраў. Польскія прадстаўнікі ў Маскве й Лёндане зьвярнуліся нават да Сталіна з запытаньнем аб зьнікненьні 10 тысяч сваіх афіцэраў. Атрымалі яны на гэта малаверыгодныя, дзіўныя й часам сьмешныя адказы, але аб Катыні ніхто нічога ня знаў.

На пачатку сьнежня 1941 году з Лёндану ў Маскву прыехаў ген. Сікорскі. Ён прыхільна адносіўся да саюзу з Расеяй і ў гутарцы са Сталіным парушыў справу загінуўшых у Савецкім Саюзе афіцэраў. Але й ён не атрымаў задавальняючага адказу. Пры нагодзе Сікорскі ўспамянуў беларусаў, украінцаў і жыдоў — былых грамадзян Польшчы, якія былі вывезены ў СССР, каб ім была дадзена магчымасьць уступіць у польскую армію ў Расеі, на што Сталін, хоць неахвотна, даў згоду. Тады-ж Сталін парушыў справу граніцы з Польшчай і аб ёй так піша ген. Сікорскі: „У сьнежні 1941 г., калі Сталін зажадаў ад мяне невялікіх гранічных карэктаў і прапанаваў бліжэйшы саюз, я не згадзіўся на такую дыскусію на тэму граніц. Быць можа, што польскі ўрад пры падтрымцы Брытаніі й Злучаных Штатаў Амэрыкі схіляць савецкі ўрад да прызнаньня нашых правоў на ўсходзе" („Польске сілы збройнэ", Лёндын 1950, стр. 195).

Пакуль вядомай стала справа Катыні, 10 красавіка 1943 году польскую дэлегацыю з Варшавы, а 11 красавіка — з Кракава немцы самалётамі прывезьлі ў Смаленск, а адтуль у Катынь. Ужо 13 красавіка 1943 году палякі інфармавалі свой урад у Лёндане што бачылі ў Катыні. Інфармацыяў аб Катыні надыходзіла больш з кожным днём і яны пацьвярджалі сьведчаньні немцаў і ўсе падрабязнасьці перадаваліся ў Лёндан. Так, што польскі ўрад у Лёндане добра знаў хто памардаваў ягоных афіцэраў у Катыні.

Калі вясной 1943 году аб Катыні загаварылі ў эфіры й на страніцах прэсы, то 15 красавіка ген. Андэрс выслаў тэлеграму міністру народнай абароны Польскага Ўраду ў Лёндане, у якой выказваў пачуцьці сваіх падначаленых

і прасіў міністра выясьніць справу польскіх афіцэраў прапаўшых у СССР.

16 красавіка міністар абароны выдаў камунікат адносна польскіх ваеннапалонных што прапалі ў Расеі. Аднак немцы націскалі на палякаў у краі, каб яны публічна ў прэсе й па радыё заявілі, што бачылі ў Катыні й хто гэтаму вінаваты. Але польскія лідэры ў краі зналі намеры немцаў і не хацелі гэтага рабіць, а справу Катыні пакінулі для свайго ўраду ў Лёндане. А польская эміграцыйная прэса дамагалася такога сьледзтва.

У сувязі з тым, што нямецкія й савецкія асьведчаньні супярэчныя, таму прадстаўнік Польскага чырвонага крыжа ў Жэневе, Станіслаў Радзівіл, 17 красавіка 1943 году зьвярнуўся ў Міжнародны чырвоны крыж з афіцыйнай просьбай дасьледаваць у Катыньскім лесе злачынства забойства.

Так атрымалася, што дзень перад гэтым немцы зьвярнуліся ў Міжнародны чырвоны крыж у Жэневе, каб ён заняўся правядзеньнем сьледзтва ў справе забойства польскіх афіцэраў у Катыньскім лесе.

Гэтага хапіла саветам, каб праз сваё радыё й прэсу павесьці атаку на польскі ўрад Сікорскага ў Лёндане, абвінавачваючы яго ў „калябарацыі з Гітлерам", што было яўнай няпраўдай і недарэчнасьцю. У гэтым ужо часе Чырвоная Армія акрыяла й брала верх над Вэрмахтам. Крыху раней, 2 лютага 1943 году, атрымала яна вялікую перамогу пад Сталінградам. А тым часам у Маскве было вырашана пакончыць з польскім эміграцыйным урадам у Лёндане. Сталін лістоўна зьвярнуўся да Чэрчыля й Рузвэльта, дзе абвіняў польскі ўрад у варожай кампаніі супраць Савецкага Саюзу, якая распачалася адначасна ў нямецкай і польскай прэсе. Такая акалічнасьць, у паняцьці Сталіна, не пакідае сумніву, што паміж ворагам аліянтаў — Гітлерам, а ўрадам Сікорскага існуе кантакт у вядзеньні гэтай варожай кампаніі.

Катыньская справа выклікала непаразуменьні сярод аліянтаў. Прычына была ў тым, што польскі лёнданскі ўрад пачаў дзейнічаць самавольна, без паразуменьня з аліянтамі. І толькі тады, калі апынуўся ён у бядзе, пачаў шукаць парады й помачы ў сваіх саюзьнікаў. Аб гэтым 2 траўня

напомніў Сікорскаму амэрыканскі амбасадар пры польскім уладзе Антоны Дрэксэль Бід.

Аліянты хацелі ўтрымаць добрыя адносіны з СССР і таму польскай прэсе было забаронена праяўляць варожасьць да Савецкага Саюзу. А ў гутарцы з генэралам Сікорскім Чэрчыль сказаў: „Калі яны памерлі, нічога ты ня зробіш, каб іх вярнуць". Падобна выказаўся й Рузвэльт.

Пад націскам англічан польскі эміграцыйны ўрад змушаны быў спыніць сваю прапаганду супраць Савецкага Саюзу, а Чэрчыль у пісьме Сталіну прадставіў складаную сытуацыю польскага ўраду ў Лёндане, ды абараняў яго паводзіны. Адначасна прасіў Сталіна захаваць мірныя адносіны з польскім урадам і даць магчымасьць польскім сем'ям эвакуавацца ў Іран.

Сталін, быццам, пачуўся абражаным, парваў дыпляматычныя зносіны з польскім эміграцыйным урадам у Лёндане, аб чым Молатаў 26 красавіка 1943 году паведаміў польскага амбасадара ў Маскве.

У сакавіку таго-ж 1943 году ў Маскве ўтвораны быў Саюз польскіх патрыётаў. 28 красавіка ў Маскве з прамовай да палякаў выступіла вядомая польская камуністка Ванда Васілеўская. Яна гаварыла аб сарваньні зносін з польскім эміграцыйным урадам у Лёндане, які акампраметаваўся канчаткова, бяручы ўдзел у арганізаванай гітлераўцамі антысавецкай прапагандзе ў справе Катыньскага лесу, дзе польскія афіцэры быццам былі застрэлены савецкімі ворганамі.

9 траўня польскія камуністычныя выданьні „Вольна Польска" й „Новэ віднокрэнгі", што выдаваліся ў Савецкім Саюзе, зьмясьцілі камунікат ад 8 траўня 1943 году: „Савецкі ўрад пастанавіў задаволіць просьбу Саюзу польскіх патрыётаў у СССР і ўтварыць на тэрыторыі СССР польскую дывізію імя Тадэвуша Касьцюшкі, каб супольна з Чырвонай Арміяй весьці барацьбу супраць нямецкага захопніка".

Такім вось парадкам і правам Катынь сталася, як бачым, справай немаральнай справядлівасьці, а палітычнай камбінацыяй. Адзіным палякам, які сказаў праўду аб Катыні, быў Юзаф Мацкевіч. Ён на запросіны нямецкіх уладаў прыехаў зь Вільні ў Катынь 20 траўня. Вярнуўшыся ў Вільню, у мясцовай газэце „Гонец подземны" падаў, што злачынства ў Катыньскім лесе было зроблена саветамі.

Пасьля вайны, як у Нюрнбэргу меўся пачацца працэс над нямецкімі ваеннымі злачынцамі, Іван Крывазерцаў, будучы на Захадзе, хацеў быць сьведкам. Як падае Юзаф Мацкевіч, Крывазерцаў пайшоў у Брэмене ў амэрыканскую Галоўную кватэру й пачаў гаварыць аб рускіх і Катыні. Амерыканцы глядзелі на яго іранічна й сьмяяліся. Пасьля адзін зь іх сказаў сур'ёзна: „Я думаю, мы павінны паслаць яго да рускіх. (...) Яны знаюць як лепш выкарыстаць такую ведамасьць і што зрабіць". Крывазерцаў у страху ўцёк, ня маючы нагоды сказаць праўду.

Страх, каб не папасьціся рускім, прымусіла Крывазерцава шукаць іншага выхаду. Палякі памаглі яму ўцячы ў Італію. Там зьмяніў прозьвішча на Міхась Лабада, народжаны ў Вілейцы, і пад прыбраным прозьвішчам прыехаў у Англію як дыпіс — перамешчаная асоба.

У красавіку 1946 году Іван Крывазерцаў зрабіў перад польскімі вайсковымі ўладамі заяву, што ў студзені 1943 году ён прачытаў у газэце „Новый путь", якая выходзіла ў Смаленску, кароткі артыкулік. У ім нехта пісаў, што ген. Сікорскі ня можа знайсьці сваіх афіцэраў, якія папалі ў расейскі палон. Пры гэтым гаварылася, што лёс гэтых палякаў выклікае трывогу польскага ўраду ў Лёндане. Прачытаўшы гэта, Крывазерцаў вярнуўся думкамі да Казіных Гор, якія ўсьцяж яго непакоілі. Пайшоў ён да тлумача Васа й у гутарцы кажа яму: „Сікорскі шукае сваіх афіцэраў у Сібіры, а яны ляжаць тут, застрэленыя ў Казіных Горах".

У кастрычніку 1947 году Крывазерцаў знаходзіўся ў лягеры Істон-ін-Гордано (Соммэрсэт) і тут раптоўна зьнік. І толькі дзякуючы рашучым захадам паляка Юзафа Мацкевіча, які ў 1943 быў у Катыні сьведкам у часе эксгумацыі трупаў, пры дапамозе члена Брытанскага парляманту ў лютым 1952 году высьветлілася, што цела Крывазерцава знайшлі 30 кастрычніка 1947 году ў шалашы ў садзе ў вёсцы Флакс Бортан каля Брыстолю. Праведзеная аўтопсія паказала, што памерлы пакончыў жыцьцё самагубствам — павесіўся. Застаецца толькі пытаньне: павесіўся Крывазерцаў сам, ці яго павесілі?

Той, хто нешта ведаў аб Катыньскім лесе й аб ім голасна гаварыў, або той, хто нічога ня знаў, а хацеў даведацца праў-

ду, падобна Івану Крывазерцаву, спатыкаў сьмерць, быццам са свае волі або ў выніку нешчасьлівага выпадку.

У 1951 годзе Кангрэс ЗША стварыў спэцыяльны камітэт, якога заданьнем было сабраць і вывучыць матэрыял адносна Катыньскай масакры. 2 ліпеня 1952 году камітэт аднагалосна заявіў, што савецкі НКУС правёў масакру афіцэраў польскае арміі ў Катыньскім лесе не пазьней як вясной 1940 году.

А раней, як Чырвоная Армія заняла Катынь восеньню 1943 году й расейцы праводзілі там дэманстрацыйнае сьледзтва, на ім прысутнічалі заходнія карэспандэнты й дачка амэрыканскага амбасадара ў Маскве 25-гадовая Катлін Гарыман. Не інакш, як па палітычных прычынах, яна й некаторыя працаўнікі амэрыканскай амбасады асудзілі немцаў за забойства польскіх афіцэраў. А брытанскі ўрад амаль праз увесь час не асудзіў сапраўднага злачынцу. І толькі тады, калі савецкі ўрад у сакавіку 1990 году прызнаў сваю віну, брытанскі ўрад зьмяніў сваю пазыцыю.

Раней, у часе вайны, аліянты не маглі адкрыта абвінаваціць свайго саюзьніка ў масакры польскіх афіцэраў, бо гэта азначала-б, што яны заключылі ваенны саюз з бандай забойцаў.

Часта некаторыя прыкрыя рэчы забываюцца сваімі й чужымі. Таксама й Катынь і многа другіх ведамых і малаведамых пахавальных магіл у былым СССР — ахвяр сталінскай мясарубкі — засталіся забытымі. Але таму, што сярод шматнацыянальнай масы ахвяр у Катыні апынуліся польскія афіцэры, палякі слушна раздулі Катынь як з гуманітарнага, так і палітычнага боку.

У часе галоснасьці ТАСС выступіла зь інфармацыяй, у якой аб Катыні сказала як аб нечым даўно ўсім вядомым. Больш вядомай сталася Катынь ад 1943 году. Яе немагчыма было схаваць, але ўлады стараліся замаскаваць. На такую маскіроўку выбралі яна на Беларусі вёску Хатынь, якая ляжыць нейкіх 40 кілямэтраў на паўночны ўсход ад Менска ў напрамку Віцебска. У часе вайны, быццам немцы зьнішчылі гэтую вёску разам зь людзьмі як сотні другіх вёсак. Як падае Беларуская савецкая энцыкляпэдыя, у Хатыні немцамі ў 1943 годзе было жыўцом спалена 149 жыхароў. Але, як падае газэта „Голас Радзімы", вёску Хатынь спалілі ня немцы, а ўкраінцы. Савецкія ўлады зналі аб гэтым, але сьвя-

дома хавалі праўду, а віну ўсклалі на немцаў. Ім хадзіла пра падабенства назоў Хатынь і Катынь. Па-ангельску Хатынь пішацца й вымаўляецца з малою розьніцаю як Катынь. І таму многа людзей як з Захаду, так і з СССР, якія наведалі Хатынь, думалі што былі ў Катыні.

Камуністычная ўлада зрабіла Хатынь вялікім прапагандысцкім цэнтрам і акружыла яе добрымі дарогамі й іншым неабходным абсталяваньнем. Затое магілы памардаваных ахвяр у Катыньскім лесе даўжэйшы час былі акружаны шчыльным плотам і па ім вяла адна лясная сьцежка й тою забаранялася хадзіць.

У выніку розгаласу эміграцыі, савецкія ўлады паставілі на магілах польскіх афіцэраў помнік. Пасьля ціха й скрыта замянілі яго цёмнай плітой і далі больш скромны надпіс: „АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ — АФІЦЭРАМ ПОЛЬСКІМ РАССТРАЛЯНЫМ ПРАЗ ГІТЛЕРАЎЦАЎ У 1941 ГОДЗЕ". Гэты надпіс мала розьніўся ад першага надпісу, які быў зроблены на помніку. Абодва яны не адпавядалі праўдзе, а па-другое згадвалі толькі польскіх афіцэраў, а прамоўчвалі другія ахвяры.

Як падае „Дзеньнік польскі" (9 студзеня 1990 г.), былы дарадчык прэзыдэнта ЗША, Зьбігнеў Бжэзінскі, наведаў Маскву, меў спатканьне з прадстаўніком савецкага ўраду. Пры нагодзе ён запытаў дазволу наведаць магілы замардаваных польскіх афіцэраў у Катыні. Просьба яго была задаволена без ніякіх перашкод і нават была аказана ўрадавая дапамога.

Калі Бжэзінскі апынуўся ў Катыні й прачытаў на пліце, што польскія афіцэры былі замардаваны немцамі ў 1941 годзе, зарэагаваў на гэта, зьвярнуўшыся да мясцовага сакратара партыі з просьбай, каб гэты надпіс зьнесьці. Было паабяцана зрабіць гэта ў наступным годзе. І гэта было зроблена пару дзён перад афіцыйным прызнаньнем віны Масквою.

Неспадзявана „Московские новости" за 25 сакавіка 1990 года падалі цікавыя інфармацыі аб трагедыі польскіх афіцэраў у Катыні. Было прызнана, што масакру польскіх афіцэраў у Катыні правялі работнікі НКУС. Дзякуючы досьледам супрацоўніцы Інстытуту гісторыі АН СССР Натальлі Лебедзевай, былі знойдзены дакуманты, якія выкрываюць галоўных злачынцаў. На першым месцы фігуруе Л. П. Бэрыя — камісар дзяржаўнай бясьпекі, шэсьць генэралаў, ня

лічачы ніжэйшых чыноў аж да лейтэнантаў, камісары, ды згадваюцца Сталін, Молатаў і інш.

Нарэшце злачынцы прызналіся да віны. І як падае ангельская газэта „Обсэрвэр" за 6 кастрычніка 1991 г., адзін начальнік НКУС з Калініна (цяпер Цьвер, на поўнач ад Масквы) Уладзімір Такароў, якому ў 1991 годзе было 89 гадоў і які быў сьляпы, прызнаў мардэрства польскіх афіцэраў, якое было зроблена па загаду Сталіна. Ён сказаў, што ў красавіку 1940 году месяц часу спатрэбілася, каб застрэліць 6 295 палякаў, за ноч забівалі 250. У Катыні застрэлілі 3 897 палякаў і каля Харкава — 4 403.

Другі начальнік НКУС Пётр Сапруненка, якому ў 1991 годзе было 83 гады й які загадваў усімі польскімі палоннымі й інтэрнаванымі, адмаўляў свой удзел у масакры й не памятаў галоўных момантаў. Аднак памятае, што атрымаў загад з Палітбюро, падпісаны Сталіным, выканаць экзэкуцыю.

Тое, што забыўся сказаць Сапруненка, памятаў Такароў. А памятаў ён, што П. Сапруненка на нарадзе начальнікаў НКУС у Маскве, якія наглядалі за польскімі палоннымі, сказаў ім ясна, што ўсе палякі будуць пастраляны.

Як падала заходняя прэса за 15 кастрычніка 1992 году, сьмяротны прысуд былым польскім афіцэрам быў вынесены на паседжаньні Палітбюро 9 сакавіка 1940 году.

У палове кастрычніка 1992 году шэф місіі архіваў пры ўрадзе Расеі Рудольф Піхоя ўручыў польскаму прэзыдэнту Леху Валэнсу ксэракопіі тайных дакумантаў, якія за подпісамі І. Сталіна, Л. Кагановіча, Л. Бэрыі, М. Калініна, В. Молатава, А. Мікаяна й К. Варашылава пацьвярджаюць, што праступства ў Катыні было зроблена па загаду Палітбюро ВКП(б). Уручаючы польскаму прэзыдэнту тайныя дакуманты аб Катыні, Р. Піхоя сказаў, што „ўсе генэральныя сакратары КПСС, пачынаючы ад І. Сталіна, а канчаючы на М. Гарбачове, зналі аб існаваньні гэтых дакумантаў.

Справа Катыні ня ёсьць выключна справай памардаваных палякаў. Нямала спачывае там асоб другіх нацыянальнасьцяў, а сярод іх і беларусаў. Таму абавязкам беларускага ўраду ёсьць пацікавіцца сьпісам польскіх афіцэраў і адшукаць сярод іх памардаваных беларусаў. У дакуманце перададзеным прэзыдэнту Польшчы сказана, што ў тур-

мах заходніх раёнаў Украіны й Беларусі знаходзілася агулам 18 632 арыштаваных (10 685 зь іх гэта палякі). Астатнія 8 тысяч гэта былі беларусы, украінцы й жыды, лёс якіх таксама невядомы.

Пры нагодзе не зашкодзіць згадаць беларусаў Заходняй Беларусі, што жылі пад Польшчай да 1939 году. Яны таксама нямала зазналі бяды ад палякаў у часе як Першай, так і Другой Сусьветных войнаў. У часе польска-бальшавіцкай вайны 1919-1920 гг., як піша польскі карэспандэнт М. Недзялкоўскі, „калі-б гэты стан рэчы стаўся вядомы тут у краі й за граніцай, то Польшча магла-б стаць перад скандалам у значэньні агульнаэўрапэйскім. (...) У даны час больш за 20 тысяч людзей цывільных з усходніх зямель знаходзіцца ў турмах, альбо інтэрнаваны".

Усім вядомы ў міжваенны час канцэнтрацыйны лягер у Картуз-Бярозе, які некаторыя называюць польскай „санаторыяй", у якой „лячылі хворых".

Непрабачальным зьяўляюцца паводзіны польскай Арміі Краёвай на Беларусі ў часе апошняй вайны, якая фізычна вынішчала беларускую інтэлігенцыю. Больш страшныя рэчы дзеяліся зараз пасьля вайны на Беласточчыне, калі АК масава мардавала беларусаў толькі за тое, што яны — беларусы й праваслаўныя. Прыкра, што замест асудзіць гэтых праступнікаў, сёньня палякі й іхні Каталіцкі касьцёл ушаноўваюць памяць гэтых забойцаў-праступнікаў як вялікіх польскіх герояў. Калі-ж палякі некага асуджаюць за злачынствы, то павінны прызнаць і свае праступсты. Польская пагаворка гаворыць: „Не чынь тэго другему, цо тобе не мілэ". Мы, беларусы, павінны памятаць аб сваіх ахвярах і іхніх забойцах, зь якога боку яны не ішлі-б, з усходу ці захаду. Гэтага вымагае справядлівасьць.

(„Голас Часу" № 22 (1), 23 (2), Лёндан 1993 г.)

Пакт Молатава-Рыбэнтропа

Апоўначы з 21 на 22 жніўня 1939 году нямецкая й савецкая інфармацыйныя агенцтвы паведамілі, што Іаахім Рыбэнтроп прыязджае ў Маскву, каб заключыць мірны пакт аб неагрэсіі з Савецкім Саюзам.

Рыбэнтроп прыехаў у Маскву і, як было сказана, заключыў пакт аб „взаимной помощи и ненападении друг на друга". Да гэтага пакту зроблены быў сакрэтны пратакол, які дзяліў Эўропу на „сфэры інтарэсаў".

У выніку сакрэтнага пратаколу ў верасьні 1939 году Польшча была падзелена, а летам 1940 году Літва, Латвія й Эстонія былі заняты Чырвонай Арміяй. Схаваўшы тайны пратакол, быццам яго не было, Масква гаварыла, што Балтыйскія дзяржавы „дабравольна" далучыліся да Савецкага Саюзу.

Як падае газэта „Індэпэндэнт" (17.07.1989 г.), у часе савецкай і заходненямецкай тэлевізійнай дыскусіі савецкі прадстаўнік Цэнтральнага Камітэту КПСС Валянцін Талін прызнаў існаваньне сакрэтнага пратаколу з 1939 году, зробленага паміж СССР і Нямеччынай, які дзяліў Эўропу на „сфэры інтарэсаў".

Усходнія землі тадышняй Польшчы, называныя палякамі іхнымі „ўсходнімі крэсамі", якія ў 1939 годзе заняла Чырвоная Армія, ніколі не былі польскімі. Спакон вякоў гэтыя землі былі беларускія й ўкраінскія. Нават саюзьнікі Польшчы, Антанта ў часе Першай, а пасьля Другой Сусьветнай вайны асьцерагалі польскіх палітыкаў, каб не пасягалі на беларускія й украінскія землі, бо яны ніколі не былі польскімі. Толькі ў выніку цяжкой ваеннай і гаспадарчай сытуацыі бальшавікоў у 1920 годзе, каб спыніць польска-бальшавіцкую вайну, на мірнай канфэрэнцыі ў Рызе бальшавікі аддалі палавіну Беларусі й частку Украіны Польшчы. І толькі ў верасьні 1939 году гэтыя землі былі забраны й неўзабаве далучаны да БССР і УССР.

У часе галоснасьці, калі пачаўся шум вакол савецка-нямецкага пакту з 1939 году, М. Гарбачоў згадзіўся ўстанавіць гістарычную камісію дзеля вывучэньня справы. Леў Безыменскі, савецкі гісторык, апошняй восені быў пасланы ў Бон, каб заглянуць у нямецкія архівы. Усё, што ён знайшоў, гэта мікрафільм, копія пратаколу, якую Масква ўважае за падробку.

Гэта самая газэта „Індэпэндэнт" (14 жніўня г.г.) падае, што папулярная ў Савецкім Саюзе газэта „Аргументы и факты" зьмясьціла сакрэтны пратакол аб неагрэсіі. Дакумант гэты быў атрыманы зь Міністэрства замежных спраў Заход-

няй Нямеччыны й на ім былі подпісы міністраў замежных спраў Нямеччыны Іаахіма фон Рыбэнтропа й Савецкага Саюзу Вячаслава Молатава.

Цяпер гісторыкі зь Міністэрства замежных спраў у Маскве гавораць, што Балтыйскія дзяржавы былі змушаны ўвайсьці ў Савецкі Саюз. Для іх было зусім лягічна запрасіць Чырвоную Армію на сваю тэрыторыю пасьля заняцьця Польшчы нацыстамі.

Падобную думку выказвала ўсходненямецкая газэта „Юнгэ Вэльт", якая якраз на 50-ую гадавіну нямецка-савецкага пакту прызнала яго важным для Масквы, бо меў ён служыць абаронай перад гітлераўскай Нямеччынай. Да гэтага часу Ўсходні Бэрлін ігнараваў, або адмаўляў існаваньне тайнага пратаколу падпісанага 23 жніўня 1939 году. Але польскае Палітбюро на парозе 50-й гадавіны пакту прызнала гэты дакумант за варожы, бо ліквідаваў ён незалежнасьць Польшчы.

Аляксандар Якаўлеў, які ачольвае парлямэнтарную камісію па расьсьледаваньні інвазіі на Польшчу Гітлерам 1 верасьня 1939 году, прызнае, што Балтыйскія дзяржавы былі аддадзены ў „сфэру інтарэсаў" Савецкага Саюзу. Аб гэтым ведаў толькі Сталін і міністар замежных спраў Молатаў, што было зроблена нелегальна.

Але тут Якаўлеў пярэчыць сабе, кажучы, што анэксія Эстоніі, Латвіі й Літвы ў 1940 годзе не была вынікам пакту Молатава-Рыбэнтропа, а вынікам „другіх абставін". Гэтымі „абставінамі" былі, паводле слоў А. Якаўлева, гістарычныя сувязі Расеі з Балтыкай і забесьпячэньне гэтых народаў перад Трэцім Рэйхам.

Тут варта згадаць выказваньні кандыдата фізіка-матэматычных навук А. Патупы, які ў „Літаратуры і мастацтве" ад 28 ліпеня 1989 г. у артыкуле „Урокі на сёньня й назаўтра" піша:

„Балюча ўсьведамляць, што мы, па праву лічачы сябе пераможцамі германскага нацызму, самі стварылі ў 30-х гадох ніколькі ня лепшую сыстэму, што дружалюбны аліянс з Гітлерам у 1939 годзе быў зусім не выпадковасьцю й ужо зусім не спрытным палітычным манэўрам, а пачварнай у сваёй здрадніцкай сутнасьці, за якую мы заплацілі дзесяткамі мільёнаў жыцьцяў, паўвекавой адкрытай канфрантацыяй з заходнімі дэмакратыямі, сваёй цяперашняй адсталасьцю. Вя-

лікае шчасьце, што вынікі сталінскага зьнешнепалітычнага экстрэмізму не давялі сьвет да гібелі ў ядзерным пажары".

Асьведчаньне ўрадавых дзейнікаў у Маскве, а таксама іхняя цэнтральная прэса сьведчаць затым, што балтыйскія народы маюць застацца надалей у „сфэры інтарэсаў" Масквы. Апошнім часам Цэнтральны Камітэт выдаў асьведчаньне, якое было зачытана ў тэлевізіі 26 жніўня й у ім было павядомлена, што падзеі ў Балтыйскіх краінах закранаюць „важныя інтарэсы" савецкага народу. Далей было сказана, што Цэнтральны Камітэт у Маскве ня можа талераваць такія паводзіны Балтыйскіх рэспублік і яе камуністычным лідэрам было сказана, каб ачысьцілі свае рэспублікі ад нацыяналістычных элемэнтаў, якія выклікаюць напружаньне й хочуць выйсьці з Савецкага Саюзу.

Так гэтую справу прадстаўляе савецкая тэлевізія, прэса й яе дзяржаўныя прадстаўнікі. Але зусім інакш бачаць яе балтыйскія народы са сваімі кіруючымі органамі.

Савецкі Саюз праходзіць вялікі ўнутраны крызіс, яму пагражае небясьпека. І каб утрымаць усе савецкія рэспублікі разам, трэба даць ім поўную нацыянальную й эканамічную свабоду. Савецкі Саюз патрабуе неадкладнай генэральнай перабудовы й перагляду сваіх рэспубліканскіх граніцаў, якія ўстанаўляліся ня воляй народаў, а сілай мацнейшага над слабейшым.

(„Голас Часу" № 2, Лёндан 1989 г.)

Вынятак з артыкула „Галасы аб «Вялікай Айчыннай вайне» й удзел у ёй савецкіх і польскіх партызанаў"

Ня хочацца верыць, каб такі чалавек як Міхась Ткачоў мог пісаць такія недарэчнасьці: „Каго сярод фашысцкіх халуёў было болей — няхай падлічваюць спэцыялісты, але бясспрэчна тое, што пераважная колькасьць жыхароў Беларусі, якая апынулася ў акупацыі, пайшла не ў паліцыю, а ў партызаны. Нават такія фарміраваньні, як Беларуская краёвая абарона, створаная ў студзені 1944 году, узьнікла шляхам прымусовай мабілізацыі пад пагрозай расстрэлу. Бра-

лі ў БКА сілай — акружалі вёску й хапалі ўсіх годных. Людзі разьбягаліся па лясох, хаваліся ад фашыстаў дзе толькі можна. Засталіся ў БКА прафэсійныя злодзеі, забойцы й жменька здраднікаў. Правалілася задума акупантаў і зь Беларускай самааховай, якая існавала з ліпеня 1942 да красавіка 1943 году, калі яе распусьцілі з прычыны таго, што яна не спраўдзіла надзеі гаспадароў" („З гісторыяй на «Вы»", Мінск 1991, стар. 348).

Тэндэнцыйна піша сп. М. Ткачоў, што ў партызаны пайшло больш беларусаў чым у паліцыю. Як беларусы ішлі ў партызаны, мы ўжо з большага згадвалі, а як ішлі ў паліцыю дык тут варта прывесьці прыклад з кніжкі Ю. Туронка аб мабілізацыі беларусаў у паліцыйны батальён супраць партызан: „Летам 1943 г. для барацьбы з партызанамі, апрача нямецкіх батальёнаў, накіраваны былі іншыя, сярод іх літоўскія, латышскія, украінскія, расейскія й нават адзін польскі. Але й гэтых сіл усё-ж такі не хапіла. Таму восеньню 1943 г. зроблена была нясьмелая спроба пашырэньня беларускіх паліцэйскіх батальёнаў, нягледзячы на пэўны недавер і недахоп кадраў. У верасьні-кастрычніку была аб'яўлена лякальная мабілізацыя ў Баранавіцкай і Слонімскай акругах. Вынікі яе былі нечаканыя: на заклік вайсковых аддзелаў адгукнулася столькі прызыўнікоў, што гэтай колькасьці хапіла зь верхам, каб сфарміраваць два заплянаваныя батальёны, — частку людзей давялося нават пераправіць у Слуцк, дзе павінен быў арганізавацца яшчэ адзін батальён. Неўзабаве быў сфарміраваны даволі вялікі добраахвотны (кавалерыйскі — Ю. В.) батальён у Навагрудку, якога ядром сталі вучні мясцовай настаўніцкай сэмінарыі" („Беларусь пад нямецкай акупацыяй", Менск 1993, стар. 167).

А што да мабілізацыі беларусаў у БКА ў 1944 годзе, дык у той час я быў на Беларусі й ад нікога ня чуў, каб некага расстралялі, або злавілі ў БКА. А чуў, што беларусы адгукнуліся масава на мабілізацыю й зьявілася іх больш як трэба было. Не хапіла для іх ружжа, абмундзіраваньня й таму некаторых адаслалі дамоў.

За мабілізацыяй беларусаў у БКА наглядала польскае падпольле й камандзір Арміі Краёвай так інфармаваў свой польскі эміграцыйны ўрад: „Беларусы поўнасьцю аб'яднаныя для

немцаў праз апошнія ўступствы й большасьць ахвотна ідзе ў войска" (Мэльдунэк сытуацыйны „Лявіны" № 5 ад 19.IV.1944 г., „Армія Краёва в докумэнтах", т. III, Лёндан 1976, стар. 417).

Яшчэ ў восені 1941 году прадстаўнік польскай Арміі Краёвай у Менску даносіў свайму ўраду ў Лёндане, што беларусы змушаны манэўраваць так, каб ніякім чынам не зьвярнуць на сябе ўвагу немцаў, прынамсі, да часу стварэньня беларускай арміі, якая мае налічваць 150 000 асоб. Сёньня галоўнай іх работай ёсьць уцягваць сваіх людзей у аддзелы, каб стварыць суполкі партыі аж да поўнага апанаваньня войска й паліцыі. Беларусы імкнуцца да таго, каб мірным шляхам атрымаць ад немцаў як найболей, а рэшту забраць па іхнім разгроме. Аб гэтым, у той ваенны час, ніхто адкрыта не гаварыў.

У „Мабілізацыйным загадзе" прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады было сказана наступнае:

„Для поўнай ліквідацыі бальшавіцкіх бандаў, якія рабуюць і нішчаць наш край, забіваюць нявіннае жыхарства й адбіраюць яго маймо, — на аснове 2-га артыкулу статуту Беларускай Цэнтральнай Рады загадваю:

1. Арганізаваць Беларускую Краёвую Абарону для абароны нашай бацькаўшчыны Беларусі.

2. На дзень 7 сакавіка 1944 г. паклікаць у Краёвую Абарону ўсіх афіцэраў і падафіцэраў былых арміяў: царскай расейскай, польскай і савецкай, як і іншых, у акругах: Менскай, Слуцкай, Баранавіцкай, Слонімскай, Вялейскай, Глыбоцкай і Наваградзкай. Гэтаму пакліканьню падлягаюць усе афіцэры ў веку 55 гадоў".

Адначасна на службу ў БКА прызываліся ўсе мужчыны 1908-1924 гадоў нараджэньня. Аб гэтым, як БЦР чакала вынікаў мабілізацыі, згадвае Ул. Шнэк:

„Цяпер настаў час трывогі й перажываньняў, падзей і сумненьняў. У Цэнтральнай Радзе чакалі затаіўшы подых, стаяла пытаньне: Як адгукнецца Беларускі Народ на гэты прызыў? Падтрымае ці не?

І вось, ужо па паўдні 10 сакавіка, у Галоўнае Кіраўніцтва БКА сталі паступаць першыя весткі з мабілізацыйных пунктаў. Неспадзяваная, годная падзіву нацыянальная сьвядо-

масьць Беларускай Моладзі зьдзівіла ўсіх. Перавысіла ўсе самыя лепшыя спадзяваньні: Прызыўныя пункты перапоўнены! Значыць: Жыве Беларусь! Значыць, хоча Беларусь змагацца за сваю волю й лепшую долю! А новыя весткі яшчэ лепшыя: людзі прыязджаюць нават з тых раёнаў, якія былі поўнасьцю апанаваны савецкай партызанкай. Патаемнымі сьцежкамі, абыходзячы партызанскія заслоны, людзі ішлі на прызыўныя пункты, каб служыць у родным Беларускім Войску — каб людзьмі звацца" („Гісторыя Б.К.А.", 1991 г.).

Магчыма, што ў часе мабілізацыі ў БКА ў некаторых вёсках партызанскага засягу беларусы маглі пайсьці ў партызаны замест у БКА, бо яны зналі, што калі пойдуць у БКА, то ноччу прыйдуць партызаны й расстраляюць усю сям'ю. І так яно было ў сапраўднасьці. А вось што ў рэдакцыю „Голасу Часу" піша сп. М. Зуй, які быў афіцэрам БКА:

„У БКА быў пакліканы парабак Жаваронак, які жыў у маёнтку Падоршчына (Шаркоўскі раён Глыбоцкай акругі). Перад вайной служыў ён у польскай арміі й вярнуўся дамоў капралам. Уступіўшы ў БКА, партызаны прыслалі яму ліст з дамаганьнем вярнуцца дамоў. Ён прыйшоў да мяне з гэтым лістом і пытае: „Што мне рабіць?" Я адказаў, што цяпер вайна й кожнаму з нас пагражае небясьпека. А калі хочаш змагацца за свае ідэі, таму прыходзіцца ставіць сваё жыцьцё пад небясьпеку. Ён падумаў і сказаў: „Не паслухаю бандытаў і застануся ў батальёне".

Праз тры дні, уначы прыйшлі партызаны й нажамі зарэзалі жонку й дзьве дачкі 18 і 19 год, а хату спалілі. На другі дзень, пасьля жудаснага мардэрства, я ўзяў Жаваронка й 50 жаўнераў БКА й паехалі на месца дакананага злачынства. Знайшлі мы там абгарэлыя тры трупы. Жаваронак спакойна перанёс трагедыю свае сям'і й верна служыў у батальёне БКА".

Падобны лёс напаткаў шмат беларускіх сем'яў, калі нехта зь іхняй радні служыў у Самаахове або паліцыі. Напрыклад, у вёсцы Лыкавічы, Карэліцкі раён, партызанамі былі замардаваны: Рап'ёвец Аляксандар, Гімпель Аляксандар, Самец Уладзімір і 16-гадовы хлапец Бурак Васіль. У суседняй вёсцы Некрашэвічы партызаны замардавалі сям'ю Палуяна — бацьку, матку, сястру зь дзецьмі й брата.

Таксама хлусьню піша Міхась Ткачоў, што немцы разьвязалі Беларускую самаахову, бо яна „не спраўдзіла надзеі акупантаў". Справа Беларускай самааховы не залежыла выключна ад волі беларусаў. На яе арганізацыю хапала ахвотных людзей і беларускія дзеячы хацелі, каб праз самаахову стварыць сваё беларускае войска й быў ужо апрацаваны свой вайсковы статут, тактыка й іншае. Стварэньне свае беларускай арміі давала-б беларусам козыр у рукі, чаго баяліся некаторыя немцы. Аднак, генэральны камісар Кубэ стаяў за стварэньне Беларускай самапомачы. Выступаючы 7 ліпеня 1942 году ў Баранавічах ён сказаў: „Настаў час, што беларускі народ на беларускіх землях павінен сам тварыць сваё жыцьцё. На гэтай зямлі беларускай ня мае што рабіць ані маскаль, ані паляк".

Але ў паняцьці некаторых нямецкіх нацыстаў ня толькі маскаль і паляк, але і беларус не павінен быў кіраваць на Беларусі. Таму галоўнай прычынай няўдачы Беларускай самааховы былі нэгатыўныя адносіны нямецкай нацысцкай эліты да вырашэньня беларускага нацыянальнага пытаньня й права. Лягчэй было падпарадкаваць сабе беларусаў, не даючы ім у рукі зброі. Некалькі старых стрэльбаў не маглі абараніць свайго нацыянальнага гонару й вёскі ад намнога лепш узброеных партызанаў. І таму, каб не правакаваць партызан, разьвязалі Самаахову. На гэта маецца дакумант — просьба прэзыдэнта БЦР да генэральнага камісара Беларусі за датай 25 мая 1944 году:

„Будучы ў Слуцку, я даведаўся, што тамашні Гебітскамісар арганізуе так званыя „ўзброеныя вёскі", пры чым узбраеньне гэтых вёсак палягае на 5-10 паламаных вінтоўках. Такая „збройная сіла", зразумела, ня можа супрацьставіцца добра ўзброеным партызанскім аддзелам і ў выніку гінуць ня толькі добраахвотнікі, якія прымаюць такую зброю ад Гебітскамісара, але й іх сем'і.

У сувязі з гэтым, я ветліва прашу Вас, г. Генэрал, спыніць такую шкодную дзейнасьць Слуцкага Гебітскамісара, а я дам адпаведны загад Акруговаму Афіцэру БКА Слуцкай акругі пасылаць лепш у небясьпечныя вёскі, у паразуменьні з Гэбітскамісарам, адпаведна ўзброеныя адзелы батальёнаў БКА".

На просьбу прэзыдэнта БЦР дня 6 чэрвеня1944 году паступіў такі вось адказ ад Генэральнага камісара Беларусі Ф. Готбэрга: „Я зусім згаджаюся з Вамі ў справе так званых „узброеных вёсак" і ўжо даў адпаведны загад Слуцкаму Гебітскамісару, каб ён у гэтай справе паразумеўся з Вашым акруговым афіцэрам у Слуцку" (абодва лісты зьмешчаны ў кніжцы „За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі", Лёндан 1960, стар. 113).

Кожны разумее па сваёй натуры, што ня толькі на Беларусі, але ў кожнай краіне змабілізаваны чалавек ня ідзе ахвотна на вайну, бо ён пакідае свой дом, радню, жонку й дзяцей, або бацькоў. Ідзе ён на вайну з абавязку, бо ведае, што калі ня пойдзе, будзе прыцягнены да адказнасьці. Таксама беларусы ў час вайны не ішлі ахвотна й у савецкую армію, і ў партызаны, за выняткам партыйцаў, камсамольцаў і тых, што ўцяклі ў лес ад народнага гневу. Пакліканыя на пачатку вайны ў Чырвоную Армію з нашае мясцовасьці людзі, пры добрай нагодзе вярнуліся дамоў. Падобных прыкладаў маецца многа.

Для прыкладу скажу, што ня ўсе беларусы ішлі ахвотна ў паліцыю. Адзін былы паліцэйскі, Уладзімір Шавэйка, добры, спакойны хлапец, які некалькі гадоў таму памёр у Англіі, расказваў мне, як яго прымусам узялі ў паліцыю. Аднак ён ня ўцёк да партызанаў, хаця мог уцячы. Відаць, хлапец разумеў, што будучы ў паліцыі ён не прынясе сваім людзям тае крыўды, якую прыносілі партызаны.

Гэта ж партызаны расстрэльвалі тых, хто адмовіўся ісьці ў лес і аб такім выпадку расказваюць прафэсар Я. Шыраеў і Э. Мацкевіч. Вядома, што немцы дрэнна адносіліся да савецкіх палонных, але й партызаны ня лепш ставіліся да ўзятых у палон немцаў. Яны іх расстрэльвалі на месцы, толькі больш вартасных адсылалі самалётамі на Вялікую Зямлю. Чэхаў, славакаў, мадзьяраў і іншых, што служылі ў нямецкай арміі, адпушчалі пад варункам, што яны раскажуць сваім сябрам праўду аб партызанах.

Многа горш было зь беларусамі, якія насілі зброю. Тым, што перайшлі да партызанаў дабравольна з ружжом, тыя даравалі праступства й давалі ім магчымасьць „адкупіць сваю віну перад радзімай". А тых, пераважна з паліцыі, якія

папалі ў палон да партызанаў, чакала непазьбежная пакутная сьмерць. Былі выпадкі, што іх палілі на кастрох, або рабілі іншыя зьдзекі. Падобна да партызан паступалі й немцы. Тых партызан, якія здаліся дабравольна, пакідалі ў жывых, часам уступалі яны ў паліцыю, а лёс іншых рашаў афіцэр: расстрэльваў на месцы, а пасылаў на шыбеніцу, мала калі ў канцэнтрацыйны лягер.

Прывяду два невялікія прыклады вярбоўкі людзей у партызаны на Беларусі, якія пачуў я ў Лёндане ад двух беларусаў, што мелі спатканьне з партызанамі. Адзін зь іх расказваў, што яго добры сябра, Косьцік, пайшоў у партызаны й хацеў яго завэрбаваць. Аднойчы Косьцік прыйшоў зь лесу з партызанам і даў свайму сябру адразанку, каб застрэліў солтыса. Сябра ўзяў адразанку, але сумленьне не дазволіла яму забіць чалавека, які фактычна ні ў чым ня быў вінаваты, нікому нічога дрэннага не зрабіў. І адгэтуль пачаўся прасьлед ня толькі сябры Косьціка, які начамі не начаваў у хаце, але ўсю сям'ю калацілі партызаны. І аднойчы, камісар, пасьля сваіх разважаньняў, сказаў: „В последствии дела уничтожим врагов". Ні ў чым невінаватай сям'і прыйшлося пакінуць сваю хату, гаспадарку й перайсьці жыць пад ахову акупацыйнай улады, каб ня пэцкаць рукі ў крыві свайго суседа-беларуса.

Другі мой сябра расказваў, што аднойчы прыйшлі да іх у хату п'яныя партызаны. П'яныя былі да такой ступені, што адыходзячы адзін зь іх забыўся ўзяць свой аўтамат. Сям'я схавала аўтамат і нікому нічога не сказала. Па пэўным часе зноў зьявіліся гэтыя самыя партызаны. Аўтамат аддаў ім сын сям'і. Тады яны да яго: „Ты наш чалавек!" і пачалі даваць хлапцу заданьні да выкананьня. Ня хочучы зьвязваць сябе з бруднай работай людзей зь лесу, прыйшлося яму пакінуць дом і перайсьці жыць у другое месца, каб захаваць годнасьць чалавека.

Маецца й такі прыклад у якіх абставінах людзі ішлі ў партызаны, а дакладней, як іх бралі ў партызаны й што зь імі рабілі, калі яны вярталіся назад дамоў. Быў такі выпадак пад Баранавічамі й аб ім успамінае д-р Малецкі:

„Пасьля калядніх канікулаў 17-гадовы юнак Р. не вярнуўся ў школу. Нас паведамілі, што яго сілком забралі ў пар-

тызаны. За пару тыдняў ён аднак жа вярнуўся. Усе ўсьцешыліся, бо быў ён прыкладным вучнем ды бойкім на сцэне танцорам. На Вялікдзень ён паехаў дахаты. Там бандыты яго зноў злавілі ды на сваім панадворку, перад бацькамі, расстралялі. Усе дзеці плакалі, калі мы ў яго гонар зладзілі жалобную акадэмію. Пухам хай будзе родная зямля для гэтай нявіннай ахвяры азьвярэлых катаў" („Пад знакам Пагоні", Таронта 1976, стар. 114).

І яшчэ адзін характэрны прыклад таго, як гэта ахвотна ішлі беларусы ў савецкія партызаны. Аб гэтым расказвае Іна Рытар (Аляксандра Саковіч), якая была настаўніцай нямецкай мовы ў Настаўніцкай сэмінарыі ў Наваградку:

„Узначальваў яе (сэмінарыю) доктар Аляксандар Орса. Ён падабраў добры настаўніцкі калектыў. Усе прадметы выкладаліся па-беларуску. Праграмы мы складалі самі. Немцы не ўнікалі ў нашы справы. Сэмінарыя часта была для моладзі паратункам ад партызан і ад немцаў. Часта партызаны прысылалі сэмінарыстам запіскі, каб яны ішлі ў лес да іх... Не прыйдзеш, — спалім бацькоў. Некаторыя ішлі, а некаторыя — не" („Літаратура і мастацтва" № 21, 1993 г.).

Адносіны беларусаў да партызан як і да немцаў былі бадай аднолькавыя. Аб гэтым піша Віктар Іванавіч Ермаловіч, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН Беларусі, кандыдат гістарычных навук:

„У рапарце В. Р. Болцікава, старшага оперупаўнаважанага Капаткевіцкага раённага аддзела НКУС на імя намесьніка наркома ўнутраных спраў БССР палкоўніка Місюрава ёсьць такое паведамленьне: „Настрой насельніцтва да фашыстаў такі, што нам усё роўна якая ўлада, хоць германцы, хоць саветы, усё роўна нам трэба падпарадкавацца тым ці іншым" („Чырвоная зьмена" № 42, 21 красавіка 1994 г.).

Цікава аб мэтадах партызанскай „гераічнай" барацьбы падае прафэсар, доктар тэхнічных навук, Я. Шыраеў:

„Партызанская вайна вялася так, што галоўным лічылася забіць немца любой цаной: цаной сялянскай сям'і або цаной усёй вёскі. Такі характар дзеяньняў быў уласьцівы больш партызанам, якімі кіравалі з Цэнтра па лініі НКУС.

Яскравым прыкладам гэтаму зьяўляецца забойства партызанамі намесьніка Беларусі фон Кубэ, які найбольш ля-

яльна ставіўся да беларусаў, за сьмерць якога былі расстраляны тысячы мірных грамадзян горада Мінска. Якая эфэктыўнасьць гэтай акцыі ў справе набліжэньня перамогі? Відаць, эфэкт быў адваротны. На месца Кубэ прыйшлі ваенныя, якія адразу-ж распачалі шырокамаштабныя аперацыі. У выніку гэтая акцыя прывяла да пагоршаньня становішча ў партызанскім руху.

Забойства Кубэ, як і забойствы асобных афіцэраў ці салдат у населеных пунктах былі малаэфэктыўныя, дробныя па ваеннай значнасьці й бессэнсоўныя, калі ўлічыць, якой цаной, якімі ахвярамі гэта абарачвалася для мірнага насельніцтва Беларусі. (...)

Тым ня менш, трагічныя падзеі, зьвязаныя зь дзеяньнямі партызан, даходзілі й да нашай вёскі. Непадалёк ад нас на хутары жыла заможная сям'я Кажухоўскіх. Гаспадар — просты вясковы хлапец, які ажаніўся з дачкой памешчыка, вызначаўся ўменьнем весьці гаспадарку. Партызаны расстралялі ўсю гэтую сям'ю. Бачных прычын не было. У адказ на гэтую акцыю партызан немцы расстралялі дзьве сямі' сялян у вёсцы Цюрлі й Сакі, у якіх спыніліся на начлег партызаны.

У апошні час пачалі зьяўляцца публікацыі пра бясчынства партызан над мірным насельніцтвам. Нарэшце настаў час сказаць праўду пра гэта. Мэтады партызан часта нічым не адрозьніваліся ад мэтадаў нямецкіх карных атрадаў. Вядомы беларускі пісьменьнік Янка Брыль напісаў аб спаленьні партызанамі, на чале з засланым з Цэнтра камандзірам, беларускай вёскі разам зь людзьмі, жыхары якой нечым не дагадзілі партызанам („Літаратура і мастацтва" № 3, 1991 г.). Гэтая-ж газэта апісвае, як партызаны рассправіліся зь ні ў чым невінаватымі людзьмі, калі ў іх не аказалася золата, якое партызаны зьбіралі па заданьню Цэнтра. У пісьме ў тую-ж газэту Рыгора Лявонцева (г. Чэлябінск) апісваецца выпадак расстрэлу ў Клічаўскім раёне партызанамі ні ў чым невінаватага настаўніка школы Васіля Астроўскага. У шэрагу матэрыялаў прыводзяцца прозьвішчы партызанскіх камандзіраў, якія тварылі гэтыя зьверствы" („Літаратура і мастацтва" № 14, 3.04.1992 г. стар. 10-11).

На крытыку прафэсара Я. Шыраева адазваліся мясцовыя партызаны, змясьціўшы ў „Маладзечанскай газэце" (9 сьнежня

1992 г.) артыкул пад загалоўкам „Не каламуцьце, паны, чысты струмень народнага супраціўленьня". Яны прызнаюць віну партызан і пішуць: „Усякае магло здарыцца. Але самі партызаны сурова каралі, калі даведаліся пра факты рабаўніцтва, і таму ёсьць прыклады". Аднак гэтых прыкладаў не падалі, затое падалі прыклады злачынстваў немцаў, якія, быццам, заставілі іх ісьці ў партызаны, каб памсьціць за свой народ.

Так, немцы рабілі злачынствы, але-ж яны былі акупанты, чужынцы. А якія праступствы рабілі партызаны над сваім безабаронным народам, то аб гэтым яны маўчаць. Ціж ім ня ведама, што яшчэ да вайны камуністы раскулачвалі сялян, заганялі іх у калгасы, гналі на прымусовыя работы, вывозілі ў Сібір, саджалі ў турмы й т.п. То чаму тады гэтыя „мсьціўцы" не пайшлі ў лес, каб памсьціцца на ворагу свайго народу? Партызаны Беларусі ваявалі не за свой народ, не за яго свабоду й справядлівасьць, а за старую бальшавіцкую няволю, дыктатуру, прасьлед, зьнявагу й русыфікацыю беларусаў. Трэба аднак сказаць, што сярод партызан былі людзі, якія мелі сумленьне, але колькі іх было? Аднак за іх плячыма не павінны хавацца праступнікі, якіх савецкая ўлада зрабіла героямі „Вялікай Айчыннай вайны" („Голас Часу" № 31 (4), 1994 г.).

Аб Вялікай Айчыннай вайне й удзеле ў ёй савецкіх і польскіх партызанаў „Голас Часу" пачаў пісаць у 1993 годзе (№ 24/3) і спыніў публікацыю з прычыны нявыхаду часопіса ў палове 1995 году. За гэтыя два гады многа чаго было напісана пра гады апошняй вайны. Тут падам толькі частку заканчэньня гэтага артыкула:

„Была вайна, беларуская кроў цякла па адным і па другім баку барыкады. Нельга спадзявацца, каб былыя партызаны сказалі, што яны змагаліся за нішто. Яны маюць свае аргумэнты, але й другі бок мае таксама свае аргумэнты. Калі-ж савецкія партызаны ваявалі за слушную камуністычную справу, дык чаму гэтая слушная справа правалілася сама сабой у 1991 годзе й яе завадзілы асуджаны сваім народам і культурным сьветам? Тут рацыю маюць тыя, якія змагаліся супраць сталінскай тыраніі й адначасова за сваё нацыянальнае адраджэньне, чаго не разумелі й ня хочуць зразумець былыя партызаны як А. Каўко, А. Ільяшук і многа іншых.

А. Ільяшук з Пружанаў у „Голасе Радзімы" (№ 6 за 6 лютага 1992 г.) выказвае гнеў да аднаго беларуса на эміграцыі, што тычыцца й да іншых беларусаў, што ў часе вайны былі паліцэйскімі, уласаўцамі й ваявалі „супраць народа". Паводле яго думкі, яны маглі пайсьці ў партызаны, або сядзець у вёсцы й не паказвацца людзям, — „а такая магчымасьць у яго была".

Тут А. Ільяшук моцна памыляецца. Такой магчымасьці на Беларусі ў час апошняй вайны не было, каб нехта мог спакойна сядзець у сваёй хаце каля мамы. А ісьці ў партызаны дабравольна, каб грабіць аднавяскоўцаў і выконваць сталінскія паручэньні ды ваяваць за стары камуністычны парадак, які быў чужы й варожы беларускаму народу, шчыраму беларусу было немэтазгодна, бо такое вяло да праступства. Кожны ведае, што маладым здаровым людзям немагчыма было сядзець спакойна ў хаце, вайна іх патрабавала. І калі яны самі не пайшлі ў партызаны, паліцыю, або не знайшлі сабе бясьпечнай работы на месцы, дык такіх маладых людзей сілай забіралі ў партызанскія атрады, або мясцовая адміністрацыя паклікала ў паліцыю, у розныя батальёны, у Самаахову й БКА, альбо высылалі на работу ў Нямеччыну. Мог застацца дома толькі той, хто глядзеў за гаспадаркай і то ня кожны.

Зусім лягічна прадстаўляе даную сытуацыю на Беларусі Уладзімір Кузьменка, старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі Беларусі савецкага перыяду Інстытута гісторыі АН РБ, кандыдат гістарычных навук:

„Абвастрылася на гэтай падставе супрацьстаяньне ў грамадзтве. Прычым мноства людзей не было поўнасьцю вольнымі ў сваім выбары — у плынь падзей яны ўцягваліся таталітарнымі сістэмамі — гітлерызмам і сталінізмам, якія сутыкнуліся ў сьмяротным супрацьборстве. Аб'ектыўнасьць і дакладнасьць патрабуюць менавіта такіх ацэнак. Як бачым, пры гэтым не застаецца месца для трафарэтнай высновы аб „усенароднасьці" барацьбы супраць акупацыі" („Настаўніцкая газэта" № 53, 1.07.1992 г., стар. 3).

На сказанае Ўладзімірам Кузьменкам можна прывесьці й такі прыклад. У 1957 годзе ў Лёндане выдадзена была кніжка на ангельскай мове „Но плейс ту лей май гэд" („Няма месца палажыць сваю галаву"). Аўтар кніжкі, Антоны

Рычардсон, апісаў гісторыю маладога беларускага паліцэйскага Сашы Нёмана. Кніжка напоўнена драматычнымі ваеннымі перажываньнямі.

Уступ да кніжкі напісаў дасьледчык партызанскай вайны д-р Ота Гэйльбурн. Ён піша, што ў часе апошняй вайны рускія аддзелы ваявалі на баку немцаў супраць свае краіны. Няшмат іх было прызначана да гэтай барацьбы, бо прывілею насіць зброю супраць рускіх прызначалася толькі немцам. Але некаторыя нямецкія афіцэры былі такой думкі, што пабіць рускіх можна толькі з дапамогай рускіх аддзелаў, заангажаваных супраць партызан. Адным зь ліку заангажаваных супраць партызан быў Саша Нёман. Ён ня быў сапраўдным рускім, — піша Гэйльбурн, — але беларусам, які на пачатку вайны жыў ва ўсходняй Полыпчы. У верасьні 1939 году Сталін акупаваў гэтую тэрыторыю. У 1941 годзе немцы заатакавалі Расею й праз наступныя тры гады кантралявалі гэтую тэрыторыю.

На працягу пару гадоў, — піша Гэйльбурн, — нешчасьлівая краіна зьмяніла трох гаспадароў. Ня ўсе жыхары, якія стаялі на нямецкім ці расейскім баку, зрабілі гэта па ідэалягічных ці ідэалістычных прычынах. Адны пайшлі з апартуністычных матываў, другія — праз сілу склаўшыхся абставін. Сям'я Нёмана прадстаўляе трагічны прыклад: старэйшы брат Сашы паддаўся націску камуністаў і пайшоў у партызаны, а Саша добраахвотна пайшоў у Вэрмахт супраць партызан, каб пазьбегчы помсты немцаў. Тут, як бачым, няма ляяльнасьці, няма блізкага, роднага зразуменьня.

Як далей піша Ота Гэйльбурн, некаторыя партызаны апублікавалі свае ўспаміны, але мала што было сказана аб дасьведчаньнях антыпартызанскай барацьбы. І гэтая кніжка запаўняе гэты недахоп.

Прозьвішча беларускага юнака — Нёман — псэўданім. Сапраўднае прозьвішча яго — Аляксандар Петраш. У Лёндане беларусы называлі яго Сашкам. Уступіў ён у паліцыйны батальён ня маючы 17 гадоў і прайшоу, як кажуць, пекла. Яго паліцыйны аддзел папаў у палон каля Стоўбцаў і рускія не аказалі яму ніякай міласьці. Стралялі й білі іх на сьмерць чым папала. Сашку й некаторым яго сябрам удалося ўцячы ў лес і дабрацца пад Беласток да сваёй часьці.

Апынўшыся на заходнім фронце, Сашка папаў у палон да амэрыканцаў і пайшоў у польскае войска. Па вайне жыў у Лёндане, але яму не сядзелася спакойна. Сашку заслалі ў Польшчу з заданьнем, дзе папаў у рукі польскай камуністычнай бясьпекі. Аднак удалося яму вырвацца з рук паліцыі й вярнуцца ў Лёндан. Аб гэтым аўтар кніжкі Антоны Рычардсон нічога не ўспамінае, а заканчвае кніжку на сакавіку 1955 году, калі Сашка паехаў у Парыж, каб паступіць у Чужаземную легію. Аднак, Сашка не прайшоў лекарскай камісіі й апынуўся на вуліцы без граша. Прадаў тады свой ручны гадзіньнік і неяк дабраўся ў Лёндан. Таму Антоны Рычардсон даў праўдзівы назоў кніжцы: „Няма месца палажыць сваю галаву".

Я памятаю, як аднойчы ў Лёндане, яшчэ да ад'езду Сашкі ў Парыж, ён гаварыў мне так: „Сашкі жыцьцё гэта аўтамат у руцэ, ленты патронаў завешаныя накрыж, у кішэні кансэрвы й Сашка пайшоў..."

З Лёндану С. Петраш пераехаў жыць у горад Брайтон і тут ажаніўся. Памёр ён у 1988 годзе ад лейкеміі. (Варта дадаць, што ў Брайтон адведаць Сашку прыехаў ягоны брат, былы партызан. Вярнуўшыся дамоў, на Беларусь, Сашкі брат быў забіты на дарозе самаходам. Выпадак?)

Цяжка сказаць, каб Сашка кіраваўся глыбокімі нацыянальнымі й маральнымі вартасьцямі, хоць быў ён сьвядомым беларусам і належаў да Хрысьціянскага Аб'яднаньня Беларускіх Работнікаў у Вялікатрытаніі (ХАБР). Меў ён здольнасьці да рысаваньня й часам нешта зьмяшчаў у часопісе „Аб'яднаньне" — воргане ХАБРу. Але, як большасьць маладых людзей, Сашка шукаў прыгодаў, хаця былі яны небясьпечныя.

Акрамя Сашкі Петраша было многа ахвотнікаў ваяваць супраць злачыннай камуністычнай сыстэмы. Многа хто ішоў з помсты за старыя й за новыя крыўды з боку партызан. Так, што нягледзячы на тое, што ўсходні фронт пасоўваўся на захад і было вядома што немцы вайну прайгралі й зноў прыйдуць на Беларусь камуністы, нельга сказаць, каб барацьба супраць камунізму на Беларусі паслабела. Г. Я. Гуленка й В. Акшэўскі пішуць: „Да красавіка 1943 г. 70-75 тысячам беларускіх партызан супрацьстаяла ўжо 28-30 тысяч паліцэйскіх беларускіх ахоўных атрадаў. Значная коль-

касьць паліцаяў знаходзілася таксама ў гарадох. Вясной 1944 г. колькасьць староньнікаў гітлераўцаў папоўнілі батальёны Беларускай краёвай абароны" („История Белоруссии", Минск 1993, стар. 153).

У гэтым годзе 9 траўня споўніцца 50 гадоў ад заканчэньня Другой Сусьветнай вайны, якую пачаў Гітлер праз свой пакт са Сталіным у жніўні 1939 году. Саюзныя краіны адзначаць гэтую гадавіну ўрачыста, як дзень вялікай перамогі. Будзе многа выступленьняў пра гітлераўскія праступствы, але ці хто згадае праступствы савецкіх партызан і польскай Арміі Краёвай на Беларусі.

Акрамя радасьці, многа каму пацякуць горкія сьлёзы з вачэй. Вайна была страшная, многа было праступстваў з боку чужых і сваіх. Беларусь сьцякала крывёю. Згадваюцца ў гэтай вайне й беларускія „нацыяналісты" — „здраднікі", якіх з кожным годам вайны ня меншала, а прыбывала. Толькі дакладна не сказана каму яны здрадзілі? Беларусь не была незалежнай дзяржавай, ёю падзяліліся ў Рызе ў сакавіку 1921 году бальшавікі з палякамі. Як адзін, так і другі акупант нішчылі ўсялякія праявы беларускага нацыянальнага й культурнага жыцьця. Таму змаганьне, якое вялі беларускія „здраднікі" ў часе апошняй вайны, яшчэ не закончанае. Гэтую барацьбу працягвае сёньня маладое й сьвядомае пакаленьне беларусаў на Бацькаўшчыне супраць тых самых нашых прыгнятальнікаў як з усходу, так і з захаду, якія зноў хочуць падабраць Беларусь пад сваю апеку.

(„Голас Часу" № 36 (3), Лёндан 1995 г.)

Нас ня зналі й не хацелі прызнаць

Ужо ад часу Люблінскае вуніі 1569 году беларуская дзяржава — Вялікае Княства Літоўскае — апынулася пад пагрозаю палянізацыі й анэксыі. Беларускае пісьменьніцтва і школьніцтва заступіла польская мова, а ў 1697 годзе польскі сойм забараніў друкаваць кнігі на беларускай мове, ужываць яе ў дакумантах і грамадзкіх месцах. Прычына была такая: „Поневаж ензык рускі недостэмпны ест гэнюшові польскему, пшэто пісаж повінен не по руску, а по польску пісаць".

З апошнім падзелам Рэчы Паспалітай у 1795 годзе ўся Беларусь апынулася пад Расеяй. Кацярына II, як і наступныя імпэратары, не прызнавала беларусаў за асобны народ, лічыла іх „рускімі", а іхнюю мову называла „русским наречием". У той-жа час палякі беларускую мову называлі „польскім дыялектам".

Так было да рэвалюцыі 1905 году, калі беларусы атрымалі дазвол на выдаваньне прэсы на беларускай мове, але не дазвол мець свае беларускія школы.

Пасьля заканчэньня Першай Сусьветнай вайны й устанаўленьня ў Расеі камуністычнай улады, у БССР ажывілася беларуская нацыянальная й культурная дзейнасьць. Але ад 1930-х гадоў пачынаецца перасьлед усяго беларускага, а яго навуковыя кадры часткова зьнішчаюцца фізычна, часткова высылаюцца на катаргу. У Беларусі праводзіцца сыстэматычная русыфікацыя, якая прадаўжалася да пачатку нямецка-савецкай вайны 1941 года. А па вайне пачаўся яшчэ большы перасьлед беларускай нацыянальнай дзейнасьці.

Калі Беларусь сталася незалежнаю дзяржаваю ў 1991 годзе, тады ўзьнікла надзея на аднаўленьне беларускае культуры й мовы як дзяржаўнай. Але, калі прэзыдэнтам стаў А. Лукашэнка, Беларусь вярнулася да старой русыфікатарскай палітыкі.

Варта згадаць, што амаль пасьля 150 гадоў была адноўлена польская дзяржава, якая ў 1919-1920-х гадох вяла вайну з камуністычнай Расеяй. У выніку гэтай вайны Беларусь была падзелена Рыжскім трактатам. У першых гадох існаваньня Польшчы на тэрыторыі Заходняй Беларусі існавалі беларускія школы й гімназіі, былі выбраныя свае паслы ў польскі сойм. Але гэта доўга не трывала. За пару гадоў палякі пачалі рабіць перашкоды зь беларускімі школамі й з часам іх пазакрывалі, не дапусьцілі беларускіх паслоў у сойм. Пачалася актыўная палянізацыя і наварочваньне праваслаўных у каталіцызм.

Другая Сусьветная вайна, якая вялася быццам у імя свабоды, незалежнасьці й справядлівасьці народаў сьвету, аказалася маною. Таксама створаная па вайне Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў, якой мэтай было сачыць за парадкам у сьвеце, шмат не змагла зрабіць. Сьвет быў падзелены, з ад-

наго боку камуністычная экспансыўная дыктатура, а з другога — заходняя дэмакратыя, якія паміж сабою змагаліся. Так было да 1991 году.

З-за прыніжанага становішча беларусаў на працягу апошніх стагодзьдзяў, калі яны былі пазбаўлены сваіх школаў, свайго культурнага жыцьця, іхняя псыхалёгія не захавала глыбокага пачуцьця да свайго паходжаньня, да свае гісторыі, калі на іхняй мове выдаваліся дзяржаўныя акты й размаўлялі польскія каралі.

Нашы суседзі насьміхаліся над беларусамі, а мову называлі хамскай, мужыцкай, простай, а Беларусь лічылі за сваю зямлю. У часы Рэчы Паспалітай на мапе Эўропы на месцы Беларусі пісалася Польшча, а пазьней — Расея. Як бачым, Беларусі не было. А калі не было такога краю, то не было і такога народу.

Так Польшча і Расея гандлявалі Беларусьсю, пісалі свае гісторыі, дзе беларусам не было месца. Гэтымі гісторыямі карысталіся замежныя ўнівэрсытэты, дзе часам былі іхныя прафэсары і сьвет амаль ня ведаў пра Беларусь.

Прывяду некаторыя прыклады са свайго жыцьця. Калі ў час апошняе вайны трапіў я ў польскае войска ў Італіі, пры выпаўненьні фармуляра пісарчук пытае пра маю нацыянальнасьць. Я кажу — беларус, а ён мне кажа, што ў Польшчы такіх не было перад вайною. А я яму кажу, што перад вайною іх было блізка тры мільёны. А ён мне кажа, што аб іх ня чуў. Аднак другі пісарчук запісаў мяне беларусам.

Калі я апынуўся ў адным з польскіх аддзелаў, то яго шэф паклікаў мяне ў канцылярыю, каб спраўдзіць эвідэнцыю. І тут на дзіва я ўбачыў, што нехта зрабіў мяне ня толькі палякам, але і каталіком. Я і тут сказаў, хто я ёсьць, і шэф спакойна закрэсьліў чырвоным алоўкам „паляка" і „каталіка", а зьверху напісаў: „бялорусін, правослаўны".

Падобнае здарэньне меў я, калі прыехаў у Англію і быў здэмабілізаваны. Будучы на пастарунку паліцыі, як і кожны чужынец, паліцыянт, чалавек старэйшых гадоў, спытаў пра маю нацыянальнасьць. Я адказаў: беларус. Паглядзеў ён на мяне і кажа: „Яшчэ цябе на сьвеце не было, як я вучыўся гісторыі і аб Беларусі й беларусах ня чуў". Тады я спытаў яго, ці чуў ён, што адным зь сябраў-засна-

вальнікаў ААН была Беларусь. Тут ён крыху задумаўся, але мне нічога не сказаў. Аднак у дакуманце напісаў ангельскае „W" з кропкаю і „Russian". Так што зрабіў ён мяне белым рускім, але не беларусам.

Быў гэта вынік таго шматвяковага ігнараваньня беларусаў. Але таксама нельга сказаць, што аб беларусах зусім нічога не было ведама. У канцы XIX стагодзьдзя прафэсар Оксфардзкага ўнівэрсытэту В. Р. Морфіл у сваёй гісторыі „Полянд" пісаў, што беларусы былі найбольш цывілізаваным народам, і на іхняй мове пісаліся дакуманты й дзяржаўныя Статуты. Гэтыя Статуты былі прыкладам для палякаў і расейцаў. Асабліва апошнія карысталіся імі й шмат бралі ў свае „Уложения", а беларускую мову і беларусаў зьневажалі.

Асабліва ў час апошняй вайны шмат хто на Захадзе мог чуць пра Беларусь, бо на яе тэрыторыі праходзіла нямецка-савецкая вайна, і аб ёй шмат пісала прэса. А па вайне заходнія аўтары апісвалі гэтуго вайну, згадвалі Беларусь і беларусаў. Апошнімі гадамі было для мяне цікава і даволі дзіўна як шмат ведаюць пра Беларусь заходнія аўтары, чаго я не спадзяваўся, бо раней у англамоўных выданьнях пра Беларусь згадвалася вельмі мала. А было гэта таму, што тады яшчэ існавала каляніяльная сыстэма, і пісаць аб прыгнёце беларусаў не выпадала. Многія краіны мелі калёніі й не давалі свабоды іх жыхарам.

Аб беларусах Ангельшчыны ўлады ведалі. Па вайне былі заложаны дзьве арганізацыі й Англа-беларускае таварыства. Беларусы Англіі прымалі ўдзел у міжнародных канфэрэнцыях, маніфэстацыях супраць камуністычнага рэжыму. І калі была „халодная вайна", то заходнія дзяржавы шукалі дапамогі ў беларусаў.

Беларусы на Бацькаўшчыне не павінны пакладаць вялікія надзеі на беларускую эміграцыю, бо ніякая эміграцыя не зрабіла вырашаючага ўплыву на зьмену ўраду і палітыкі ў сваіх краях. Расейская эміграцыя пасьля Першай Сусьветнай вайны плыла на Захад на караблёх, плылі генэралы, афіцэры й маса інтэлігенцыі. Польская эміграцыя мела ў час апошняе вайны свой урад у Лёндане, мела сваё войска, але не змагла пасадзіць свой урад у Варшаве.

Як бачым, усё вырашае народ у краі. Эміграцыя можа сымпатызаваць, падтрымліваць апазыцыю супраць дыктатуры матэрыяльна, як і некаторыя дзяржавы. Таму беларусам у краі трэба больш пакладаць надзеі на свае собскія сілы й весьці змаганьне за сваю дзяржаўную незалежнасьць да пераможнага канца.

(„Беларус" № 484, ЗША, травень 2003 г.)

Апошняя імпэрыя ў сьвеце

Гістарычныя падзеі, якія сёньня маюць месца ў Савецкім Саюзе й яго сатэлітах, зьвяртаюць на сябе ўвагу цэлага сьвету. Некаторыя палітыкі й простыя людзі дзівяцца, што такая татальная й магутная імпэрыя як СССР магла стаць на шлях дэмакратызацыі свае ўнутранай і замежнай палітыкі. Але тут няма нічога дзіўнага.

Гартаючы старонкі гісторыі, мы знойдзем першыя біблейныя імпэрыі — Вавілёнскую й Асырыйскую, пасьля імпэрыю Аляксандра Македонскага, Рымскую імпэрыю, якая з часам ператварылася ў Сьвяшчэнную імпэрыю, якою кіравалі нямецкія імпэратары з блаславенства рымскіх папаў. З часам гэтыя імпэрыі распаліся самі па сабе.

На парозе Першай Сусьветнай вайны згадваюцца Нямецкая, Турэцкая, Аўстра-Мадзьярская, Брытанская й Расейская імпэрыі. У выніку прайгранай вайны Цэнтральных дзяржаваў з Антантай, першыя тры імпэрыі распаліся. Засталіся толькі Брытанская й Расейская, якая прыняла назоў СССР.

Пасьля Другой Сусьветнай вайны Брытанская імпэрыя перастала існаваць дабравольна. Яе ўрад перадаў сваю каляніяльную ўладу загадзя падрыхтаванай мясцовай адміністрацыі й захаваў зь ёю лучнасьць праз так званы „Коммонвэлдз", ды да гэтага часу жыве са сваімі былымі калёніямі ў згодзе.

Але як царская, так і савецкая імпэрыі ніколі не далі ніякай сапраўднай свабоды паняволеным народам, за выняткам часовага НЭПу, а нават пасьля Другой Сусьветнай вайны Савецкі Саюз паняволіў яшчэ больш народаў Эўропы. Да гэтага часу ў СССР налічваецца каля 100 розных народнасьцяў, а было іх больш, толькі што за гады савец-

кай улады некаторыя зь іх былі зрусыфікаваны й па іх нічога не засталося.

Як вышэйзгаданыя імпэрыі распаліся самі па сабе, або ў выніку вайны ці пад напорам нацыянальных рухаў знутры, так прыйшла чарга й на савецкую імпэрыю.

Ад Эльбы да Уладзівастока й ад Балтыйскага мора да Чорнага, Азоўскага і Касьпійскага мораў наглядаецца вызваленчая вясна прыгнечаных народаў Савецкай імпэрыі, якою кіруе Масква. Ды нават у цэнтры імпэрыі — Маскве, на апошніх выбарах у савецкі парлямант 90 працэнтаў жыхароў аддалі свае галасы за дэмакрата Барыса Ельцына, які не падзяляе дасюлешнюю палітыку свайго ўраду.

Апошнім часам тысячы маніфэстантаў розных савецкіх рэспублік выходзяць на вуліцы сваіх сталіцаў з нацыянальнымі сьцягамі, плякатамі, склікаюць мітынгі, зьезды, на якіх дамагаюцца сваіх нацыянальных правоў. Некаторыя з гэтых народаў, як грузіны й балты, дамагаюцца поўнай дзяржаўнай незалежнасьці.

З гэтым не пагаджаюцца рускія нацыяналісты-шавіністы. Яны гавораць, што да гэтага часу быў спакой і парадак у краю, а ўвесь гэты балаган нарабіў Гарбачоў сваёю галоснасьцю й перабудовай, якога расхвальвае Захад.

У паняцьці такіх людзей акупаваць сілай чужую краіну, дэнацыяналізаваць яе народ праз русыфікацыю, турмы, забойствы, вывазы ў Сібір карэнных жыхароў, а на месца іх прывоз рускіх і русыфікаваных рэнэгатаў у гэтыя краіны і навязваньне ім сваёй мовы, культуры, права й т.п. мае называцца трыманнем парадку і спакою?!

Праз стагодзьдзі цары мяшалі народы й гэтае самае рабіла й робіць савецкая ўлада. Яна стараецца з усіх савецкіх рэспублік і народаў зрабіць адзін „савецкі народ", які мае карыстацца адной рускай мовай і культурай. Аднак гэты беспачуцьцёвы экспэрымэнт ня ўдаўся, а толькі прынёс многа шкоды й замяшаньня сярод народаў Савецкага Саюзу.

Парадак і спакой могуць быць дасягнуты толькі тады, калі кожная савецкая рэспубліка атрымае права на свабоднае карыстаньне сваёй роднай мовай, школай, культурай, урадам. А калі гэта не падабаецца рускім, хай едуць у сваю рэспубліку й там задавальняюцца сваімі правамі.

Пра галоснасьць многа гаворыцца й пішацца, але перабудова пасоўваецца вельмі павольна ў нацыянальным і гаспадарчым жыцьці Савецкага Саюзу. Таму нічога дзіўнага, што ў савецкім парляманце ўтварылася даволі моцная апазыцыя на чале з Барысам Ельцыным, гісторыкам Ю. Афанасьевым, А. Сахаравым і інш. Ёсьць гэта неафіцыйная апазыцыя, але яна дамагаецца радыкальных зьменаў у арганізацыйнай структуры Савецкага Саюзу. Прафэсар А. Сахараў сказаў, што існуючая імпэрыя павінна быць заменена канфэдэрацыяй у сёньняшніх граніцах, якія могуць быць зьмененыя пазьней.

Да голасу Ельцына й яго групы дэмакратаў прыслухоўваюцца масы народу ў краіне й за мяжой. Яны знаюць, што ў Савецкім Саюзе дзейнічаюць старыя кансэрватыўныя сілы. На пленуме, які быў прысьвечаны нацыянальным пытаньням, прэзыдэнт М. Гарбачоў 19 верасьня гэтага году сказаў, што савецкая камуністычная партыя патрабуе рэформы. Прэзыдэнт ёсьць настаўлены прадаўжаць сваю перабудову, але ён напатыкае моцную апазыцыю сярод сваіх супрацоўнікаў і таму перабудова ня можа рушыцца зь месца. Яна апынулася ў тупіку й каб вывесьці яе з гэтага тупіка, патрэбныя людзі, якія думаюць дэмакратычнымі прынцыпамі, гэта значыць — рэфарматары, а не кансэрватары.

Каб задаволіць левых і правых у сваім акружэньні, прэзыдэнт Гарбачоў асьведчыў, што Савецкі Саюз павінен застацца Саюзам і ніякага аддзяленьня, або выхаду з Саюзу ССР быць ня можа. Нацыянальнасьцям ахвяроўваецца большую культурную й палітычную аўтаномію з цэнтрам у Маскве, які мае трымаць нагляд.

Так, што выхад з Савецкага Саюзу, на што дазваляе Савецкая Канстытуцыя, або ўтварэньне Канфэдэрацыі ня могуць быць задаволены.

Ажыцьцяўленьне беларускай нацыянальнай справы таксама не стаіць на месцы, і робяцца поступы наперад. Толькі гэтыя поступы ня ёсьць такія гвалтоўныя і станоўчыя як у другіх савецкіх рэспубліках, якія карысталіся сваёй дзяржаўнай незалежнасьцю пасьля Першай Сусьветнай вайны.

Як падае Тэлеграфная агенцтва Савецкага Саюзу (ТАСС), Беларусь мае атрымаць эканамічную аўтаномію й падобна

Балтыйскім рэспублікам будзе весьці сваю фінансавую гаспадарку. Такі экспэрымэнт будзе мець дзьве фазы. Першыя фаза мае пачацца 1 кастрычніка гэтага году, а другая — на пачатку наступнага году.

Ёсьць гэта, безумоўна, важны экспэрымэнт у жыцьці Беларускай Рэспублікі, які мае быць прыкладам для другіх рэспублік. Але ёсьць гэта эканамічная аўтаномія, а не культурна-палітычная. Усё-ж беларуская нацыянальная справа набірае сілы й паступова крочыць наперад, хоць напатыкае не адну перашкоду на сваім шляху.

(„Голас Часу" № 3, Лёндан 1989 г.)

XXVIII зьезд КПСС у пэрспэктыве часу

Пакуль яшчэ да зьезду, які адбыўся ў Маскве 2 ліпеня 1990 г. і цягнуўся два тыдні, дык ужо раней пачаліся ажыўленыя дыскусіі ва ўсіх партыйных і беспартыйных арганізацыях Савецкага Саюзу. Дыскусіі праходзілі ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага, палітычнага й духоўнага крызісу савецкага грамадзтва. Пяць гадоў перабудовы й галоснасьці зрабілі наяўны поступ у духоўна-маральным жыцьці народаў СССР, але ў эканамічнай галіне наглядаюцца шматлікія недахопы. Гэты адмоўны паказьнік выкарыстоўвалі кансэрватыўныя сілы камуністычнай партыі, у руках каторых знаходзіцца сёньня ўлада, і гэтыя людзі абаранялі й абараняюць сваю старую абанкручаную палітыку й камандную сыстэму. Яны адкідаюць рэформы, ня думаюць аб дабрабыце краіны, ці нават свае камуністычнае партыі, а дбаюць пра свой прыватны інтарэс, пра сваё наседжанае крэсла, каб жыць у раскошы.

Камуністычная партыя Савецкага Саюзу, якую праз увесь час яе існаваньня так голасна расхвальвалі на старонках прэсы яе казённыя пісакі, сёньня хіліцца да свайго непазьбежнага ўпадку. Пачынаючы ад Новага году да месяца чэрвеня, гэта значыць за пяць месяцаў, здало свае партыйныя білеты каля 130 000 камуністаў і гэты працэс прадаўжаецца. Але, не зважаючы на гэта, заўзятыя марксісты хочуць за ўсякую цану стрымаць перабудову, якая наносіць ім паражэньне, каб самім утрымацца пры ўладзе. Вядучую ролю

адыгрывае тут кансэрватыўная сіла старых партыйцаў і апаратчыкаў у саюзе з вайсковай бюракратычнай элітай. Людзі гэтыя не прывыклі прыслухоўвацца да голасу народу, а толькі загадваць яму. Іхнія вострыя выступленьні й крытыка палітыкі генэральнага сакратара ЦК КПСС М. Гарбачова ў першым тыдні зьезду стваралі паважную пагрозу перабудове й нагадвалі паварот да дыктатуры.

Дэлегатам едучым у Маскву на гэты XXVIII зьезд была ўзложана вялікая адказнасьць, бо яны па сутнасьці мелі вырашыць лёс партыі. Ці стане яна на шлях дэмакратызацыі, ці застанецца, як і раней, на пазіцыях зачарсцьвелага камунізму? Дэлегаты зналі, што гэты зьезд будзе адным з найбольш вырашальных у гісторыі іхняй партыі.

Просты рабочы чалавек глядзеў на зьезд і не спадзяваўся нейкіх цудаў, а думаў ён практычным дасьведчаньнем мінулых дэкадаў. Ён ня хоча больш жыць пад сонцам камуністычнай партыі й слухаць яе прапаганду пра „мірнае, шчасьлівае й заможнае жыцьцё", аб „самай перадавой у сьвеце краіне", яе „рэкордах" і „клопатах партыі пра народ". Асабліва аб гэтым „клопаце" найбольш апошнімі гадамі паказала Чарнобыльская аварыя, якая выклікала ня толькі вялікае абурэньне й недавер у народзе, але й ненавісьць да камуністычнай партыі й яе лідэраў.

Хопіць прыпомніць Мікіту Хрушчова, які абяцаў, што за 5-10 гадоў Савецкі Саюз дагоніць і перагоніць Амэрыку й другія капіталістычныя краіны ў прадукцыі харчаваньня. А што мы бачым у сапраўднасьці? Сёньня марксісты гавораць аб палепшаньні быту, але не савецкага народу, а свае камуністычнае партыі.

Вялікую трывогу для партыі спраўляюць апошім часам саюзныя рэспублікі. Адна за другой дамагаюцца, калі ня большай аўтаноміі, дык поўнай дзяржаўнай незалежнасьці. Сувэрэнітэтныя самастановішчы складовых рэспублікаў пагражаюць разьбіцьцём існуючага дыктатарскага маналіту маскоўскага таталітарызму. Неспадзяваныя ў перастройцы нацыянальныя праблемы бясспрэчна тармозяць распачатую перабудову, а найбольш тармозяць яны перабудову самой закасьцянелай камуністычнай партыі. Ёй і так прыйдзецца пайсьці на ўступствы й зрачыся манаполіі на дзяржаўную

ўладу. Газэта „Голас Радзімы" (№ 26 за 28 чэрвеня 1990 году) падае наступнае:

„На паседжаньні Савета Федэрацыі СССР, якое праходзіла ў Крамлі 12 чэрвеня гэтага года пад старшынствам прэзыдэнта СССР М. С. Гарбачова, абмяркоўвалася пытаньне аб нацыянальна-дзяржаўным ладзе СССР. (...)

Для распрацоўкі праекта новага Саюзнага дагавору прызнана неабходным стварыць рабочую групу з паўнамоцных прадстаўнікоў па Саюзнаму дагавору 20 чэрвеня бягучага года.

Таму лічу, што ўжо на першай сесіі Вярхоўнага Савету БССР пасьля дэталёвай прапрацоўкі можна было-б вызначыць асноўныя прынцыпы сапраўднага палітычнага й эканамічнага сувэрэнітэту рэспублікі. Гэта азначала-б аднаўленьне фактычнай незалежнасьці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў вырашэньні пытаньняў палітычнага, эканамічнага й сацыяльна-культурнага жыцьця. Адначасова неабходна замацаваць адпаведныя гарантыі забясьпечаньня сувэрэнітэту БССР".

Як раней у Палітбюро былі пераважна расейцы, або рэнэгаты іншых нацыянальнасьцяў, дык цяпер будуць у ім прадстаўнікі ад 15-ці рэспублік. Такі склад Палітбюро можа мець большы сэнс і гэта, трэба спадзявацца, узмоцніць пазіцыю прэзыдэнта Гарбачова ў правядзеньні распачатай перабудовы ды дасьць большы голас рэспублікам у вырашэньні сваіх нацыянальных праблем.

Камуністычная партыя Савецкага Саюзу за 70 гадоў свайго існаваньня была паслухмянай прыладай у руках маскоўскіх дыктатараў.

Бяручы пад увагу цяперашняе жахлівае становішча савецкай эканомікі, узровень жыцьця ды нястачу нават свайго собскага зерня, якое трэба купляць за акіянам, то адказнасьць за гэта ляжыць акурат на гэтай-жа паслухмянай камуністычнай партыі.

Калі нават параўняць жыхароў афрыканскіх калёніяў, большасьць якіх хадзіла ў часе апошняй вайны амаль голымі, а пасьля вайны, атрымаўшы незалежнасьць, ня толькі добра апрануліся, а стварылі свае незалежныя дзяржавы, адкрылі свае школы, універсытэты, адміністрацыйныя ўстановы й т.п. І калі мы параўнаем іх у некаторых суад-

носінах да народаў Савецкага Саюзу, дык афрыканскія народы зрабілі большы культурны й эканамічны прагрэс пасьля Другой Сусьветнай вайны, як гэта зрабілі камуністы пасьля Першай Сусьветнай вайны й свае Кастрычніцкае рэвалюцыі 1917 году. Газэта „Індэпэндэнт" (за 6.07. 1990 г.) падае, што 40 мільёнаў савецкіх грамадзян жыве ў недастатках. І каго тут вінаваціць як не камуністычную партыю зь яе бюракратамі й дыктатарамі.

Кожная манаполія, ці яна будзе капіталістычная, ці камуністычная, заўсёды ёсьць дыктатурай. Гэта ёсьць хамут, які цісьне, душыць і не дае магчымасьці свабодна дыхаць, думаць і праяўляць ініцыятыву. Свабодны чалавек ня можа стаяць прыкаваны на месцы, яму трэба рухацца наперад, думаць сваім розумам і рабіць прагрэс.

Савецкая рэчаіснасьць паказала, што камунізм ня здаў экзамену ў практычным жыцьці. Тэорыя разьмінулася з практыкай і ўсе камуністычныя краіны Варшаўскага пакту разьлічыліся з гэтай сыстэмай за выняткам Савецкага Саюзу. Яго першыя рэвалюцыянеры і пазьнейшыя лідэры ня выканалі сваіх забавязаньняў перад народамі былой царскай імпэрыі, якія абяцалі ў часе вайны й рэвалюцыі. І таму не прадбачваецца, каб народы СССР зноў паверылі камуністам. Партыя не пайшла з часам, адстала й хоча далей кіраваць абанкручанай марксістоўскай ідэалёгіяй.

Прэзыдэнт Гарбачоў пачаў праводзіць і далей праводзіць палітычную й эканамічную перабудову. Але вёў ён адначасна палітычную гульню паміж левымі й правымі групоўкамі камуністычнае партыі. Аднак, гэтым разам, яму прыйшлося заняць ясную пазіцыю й ён, як і трэба было спадзявацца, падтрымаў цэнтр і левых, заатакаваўшы кансэрватараў, якія думаюць учарашнім днём і хочуць да яго вярнуцца. І нягледзячы, што на зьезьдзе была большасьць заўзятых марксістаў, аднак у крытычных выбарах Гарбачоў і яго заступнік атрымалі перамогу, якую ня менш суправаджалі некаторыя расчараваньні. У канцы зьезду знатныя дэмакратычныя асабістасьці, хоць ня так многа, але пакінулі камуністычную партыю.

Бяручы агульна, трэба прызнаць заслугу прэзыдэнту Гарбачову, што ён павёў зьезд так, што ягоная палітыка, хоць

моцна крытыкавалася марксістамі, але ў канцы не была стрымана й ёсць надзея, што па гэтым зьезьдзе яна прысьпешыць сваю работу. Камуністычная партыя Савецкага Саюзу страціла сваю ранейшую манаполію. Прымаючы дэмакратычную плятформу, ёй прыйдзецца лічыцца з голасам іншых палітычных партыяў, якія ў недалёкай будучыні афармяцца. І таму камуністычная партыя, калі такая яшчэ існуе, павінна зрачыся свайго камандната прынцыпу й навучыцца супрацоўніцтва зь іншымі партыямі ў нацыянальна-дэмакратычнай і парляманцкай сыстэме.

Перабудова адкрыла дарогу да фармаваньня новых палітычных партыяў і нацыянальных плыняў ці рухаў. На Беларусі нацыянальны рух праявіўся Беларускім народным фронтам, які аб'ядноўвае незалежніцкія асьпірацыі шматлікіх арганізацыяў і нацыянальна сьведамых дзеячоў і шырэйшых кругоў грамадзкасьці. Паўстаюць і палітычныя партыі. Так у Менску аформілася Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі (НДПБ). Аснаўная мэта НДПБ — адраджэньне нацыянальнай сьвядомасьці й чалавечай годнасьці беларускага народу, аднаўленьне поўнай палітычнай і эканамічнай незалежнасьці рэспублікі. У Горадні ўзнікла Дэмакратычная партыя Беларусі. Мяркуюць, што Дэмакратычная партыя будзе супрацоўнічаць зь Беларускім народным фронтам. У Берасьці створаны арганізацыйны камітэт Рэспубліканскай партыі Беларусі. Гэта мае быць партыя парляманцкага тыпу, якая разьлічвае на падтрымку ўсіх слаёў насельніцтва Беларусі. У аснове яе паложаны дэмакратычныя прынцыпы й сувэрэнітэт Беларусі.

Усе гэтыя партыі стаяць, як бачым, на плятформе дэмакратыі й нацыянальнай незалежнасьці Беларусі. Будзе гэта яшчэ адзін удар па ня так даўно магутнай і праслаўленай камуністычнай партыі СССР, якая на працягу 70-ці гадоў свае „дыктатуры пралетарыяту" пакінула па сабе крывавы сьлед, мора сьлёз і ганебны ўспамін.

На дарозе распачатай перабудовы шмат яшчэ стаіць перашкод і канфліктаў. Аднак здаровы розум дэмакратычных сілаў паступова перамагае манаполію аднапартыйнасьці, якая, хочаш ці ня хочаш, любіш ці ня любіш, здае пазіцыі, а на яе месца нараджаецца ў муках дэмакратычная парля-

манцкая сістэма. „Або савецкае грамадзтва пойдзе наперад па шляху пачатых глыбокіх пераўтварэньняў (...), або верх возьмуць контрперабудовачныя сілы, і тады краіну, народ чакаюць (...) змрочныя часы", — сказаў на XXVIII зьезьдзе прэзыдэнт Гарбачоў.

Ці-ж сапраўды савецкае грамадзтва, а тым больш Вярхоўны Савет БССР „пайшоў наперад па шляху пачатых глыбокіх пераўтварэньняў", што 27 ліпеня аднагалосна абвясьціў Беларусь сувэрэннай? З нацыянальнага пункту гледжаньня гэта значны прагрэс да дзяржаўнай незалежнасьці, але як паказала практыка зь Літвой, выхад з Саюзу ня ёсьць такі лёгкі й просты.Таму будзем чакаць якія практычныя меры прыме Вярхоўны Савет дзеля ажыцьцяўленьня свайго рашэньня адносна сувэрэннасьці ці незалежнасьці Беларусі.

(„Голас Часу" № 5 (8), Лёндан 1990 г.)

Што сталася з агульнымі выбарамі ў Расеі 12 сьнежня 1993 году?

З агульнымі выбарамі ў Дзяржаўную Думу Расеі 12 сьнежня 1993 году сталася тое, чаго ніхто не спадзяваўся ў Расеі й па-за ёю. Сталася нешта неверагоднае, што паказала сьвету як далёка стаіць рускі народ ад сапраўднай дэмакратыі.

Аб Уладзіміры Вольфавічу Жырыноўскім, лідэры Лібэральна-дэмакратычнай партыі Расеі, якая нічога супольнага зь лібэралізмам і дэмакратыяй ня мае, чуваць было апошнімі гадамі. Але паважны чалавек не надаваў дэмагогіі Жырыноўскага вялікага значэньня. Усё-ж былі людзі, якія заўважылі ў ім нешта ненармальнае. Як прыклад, падае Андрэй Васільеў: „Мне давялося чуць пана Жырыноўскага падчас перадвыбарчых гастроляў у Чэлябінску (тады ён спрабарнічаў за прэзыдэнцкае крэсла зь Ельцыным). Ля прахадной тутэйшага трактарнага завода ён абяцаў рабочым за тыдзень выбіць усе даўгі з заморскіх краін. Пасылаю эскадру ракетаносцаў да берагоў Афрыкі, патрабую вярнуць мільярды даляраў і лічу да трох. Не паслухаюць — ракетны залп" („Чырвоная зьмена" № 126, 14 сьнежня 1993 г.).

Але ад часу прайшоўшых у Расейскай Фэдэрацыі выбараў 12 сьнежня 1993 году прозьвішча Жырыноўскага не сыходзіць з вуснаў палітыкаў, карэспандэнтаў і старонак прэсы. Маюцца такія інфармацыі, што Лібэральна-дэмакратычная партыя Жырыноўскага была заснавана ў 1990 годзе па ўказаньню М. Гарбачова, тагачаснага камуністычнага лідэра. Заложана яна была зь ведама КДБ, каб канталяваць дэмакратычныя сілы, якія будуць у ёй гуртавацца. Значыць, ЛДПР Жырыноўскага зьяўляецца работай камуністаў. І гэта відаць зь перадвыбарчай кампаніі ў Думу, а таксама сьведчыць аб гэтым яе ўдзел у супольных з камуністамі маніфэстацыях за аднаўленьне СССР зь ягоным старым парадкам.

Ня будзем заглядаць у прыватнае жыцьцё Уладзіміра Вольфавіча Жырыноўскага, які любіць гаварыць толькі аб сваёй матцы, але не аб бацьку з жыдоўскім імем Вольф. Згадаем толькі ягоную папулярнасьць сярод рускага народу ў выбарчай кампаніі ў Думу. Скуль яна ўзялася? Калі аднойчы замежны карэспандэнт запытаў Жырыноўскага аб ягоным посьпеху ў выбарах, адказ наступіў зусім просты: „Я гавару праўду". Ад праўды, якую гаварыў Жырыноўскі ў сваёй перадвыбарчай і пасьлявыбарчай прапагандзе, чалавека ахоплівае жах. Разважны чалавек, ды яшчэ пасьля ня так даўніх сталінскім і гітлераўскім экспэрымэнтах, саромеўся-б аб гэтым гаварыць, але Жырыноўскі выбраў старога імпэрыялістычнага каня й на ім праехаўся на выбарах з гонарам.

Пацікавімся больш філязофіяй, якую прапагандаваў Жырыноўскі ў час сваіх паездак па Расеі. А гэта: вярнуць да Расеі ўсе рэспублікі, якія адарваліся ад яе й утварылі свае незалежныя дзяржавы. Абяцаў далучыць да Расеі Польшчу й Фінляндыю, што некалі належалі да царскай Расеі й такую работу, на думку Жырыноўскага, трэба пачаць зь Беларусі. А каб лягчэй вярнуць іх пад уладу Расеі, Жырыноўскі гатоў прыняць усе эканамічныя меры, нават холадам і голадам змусіць іх на каленях паддацца Расеі. І на гэтым Жырыноўскі не затрымоўваецца, а кажа (паводле газэты „Гардыян" ад 14 сьнежня 1993 г.), што Японія, Кітай і Захад павінны зразумець, што яны ня могуць мучыць Расею доўгі час, бо калі Расея паўстане, то нічога ад Японіі й Эўропы не застанецца. Ды яшчэ прадбачвае, што рускі жаўнер

будзе стаяць на беразе Міжземнага й Чырвонага мораў ды ў Індыйскім акіяне памые свае боты.

Вось куды сягае Жырыноўскі са сваёй партыяй і партыйцамі. І зусім зразумела чаму ён дамагаецца спыніць перабудову ваенных фабрык на патрэбы мірнага ўжытку. Маецца шмат чаго недарэчнага, дзіўнага, сьмешнага й трагічнага ў выказваньнях гэтага дзіўнага чалавека, які мае намер стаць прэзыдэнтам Расеі.

Таксама Жырыноўскі запалохваў Японію й Нямеччыну бомбай Хірасімы, калі яны будуць мяшацца ў справы Расеі. Ці-ж разважны палітык будзе гаварыць такія недарэчнасьці, як гэта гаварыў Жырыноўскі? Але тут важны адзін навочны факт: як гэта моцна прасякнуты імпэрыялістычнай маніяй рускі народ. Яму хопіць, каб нейкі безадказны агітатар зайграў на яго нацыянальным патрыятызме, як ён гатовы на ўсё. Аб рускім брутальным нацыяналізме нават Ленін гаварыў на ложы сьмерці.

6 сьнежня 1993 году, тыдзень да выбараў у Думу, у рэдакцыю „Голасу Часу" наш супрацоўнік зь Беларусі так напісаў аб Жырыноўскім: „Зараз партыя Жырыноўскага змагаецца за месца ў будучай Думе. Для агітацыі партыям даюць час на радыё й тэлебачаньні. Руская служба Радыё „Свабода" таксама стала даваць эфір розным партыям для правядзеньня сваіх праграм. І вось Жырыноўскі кажа з кім Расея павінна зрабіць неперадзельную граніцу, з кім граніцы рабіць увогуле ня трэба. А што да Беларусі, дык ён сказаў, што Беларусь наелася свабоды, пераканалася, што без Расеі яна будзе галодная й халодная. Зараз Беларусь просіцца ў эканамічную садружнасьць з Расеяй і трэба ўсё зрабіць, каб такую эканамічную садружнасьць стварыць. А далей, на думку Жырыноўскага, Беларусь будзе першаю краінай, якая адкажацца ад сваёй незалежнасьці й папросіцца ў склад рускае дзяржавы. На думку Жырыноўскага, ня пройдзе й год, як Беларусь будзе губэрняй Расіі й для гэтага, на яго думку, трэба зрабіць самыя заманчывыя ўмовы. Бо калі беларусам будзе добра ў адзінай Расіі, яе прыкладу можа сьледаваць Украіна й Казахстан, а тады зь іншымі былымі рэспублікамі й гаварыць няма чаго, бо там стаяць рускія войскі".

Калі 19-22 жніўня 1991 году ў Маскве адбыўся няўдачны камуністычны путч, пасьля „Голас Часу" (№ 15 (6) за лістапад — сьнежань 1991 г.) пісаў: „Хоць прэзыдэнт Расеі Б. Ельцын заявіў, што Расея ня будзе ані старшэйшым, ані малодшым братам, а роўнай зь іншымі рэспублікамі, аднак стары «белы» расейскі імпэрыялізм можа быць ня меншай пагрозай за «чырвоны»".

Цяжка паверыць, каб усе гэтыя людзі, якія галасавалі за Жырыноўскага, былі фашыстамі ці імпэрыялістамі. Але ў гэтых выбарах паважную ролю адыграў эканамічны крызіс у Расеі, або рэформы, якія пачалі праводзіць нагла, без адпаведнай падрыхтоўкі. У выніку такой палітыкі паўстала беспрацоўе, пустыя паліцы ў крамах і астранамічныя цэны на тавары. На вуліцах сядзяць жабракі, пашырыліся забойствы, распуста й т.п. Такі стан рэчаў наглядаецца й у другіх дзяржавах былога Савецкага Саюзу ўключна зь Беларусьсю, дзе шмат чаго не хапае ў штодзённым жыцьці народу. І таму нічога дзіўнага, што ў выніку такой рэформы, народ выказаў у выбарах сваё незадаваленьне.

Па-другое, незадаваленьне ў радох расейскай арміі й афіцэраў. Раней яны былі героямі Савецкага Саюзу й яшчэ цяпер ганарацца сваімі мэдалямі з часу вайны й тут няма нічога дзіўнага. Больш дзіўна, як гэта ганарацца вэтэраны афганскай вайны, якіх камуністы завезьлі ў Афганістан мардаваць нявінны, бедны й прымітыўны народ. І ці часам па сьлядох афганцаў Жырыноўскі ня думае дайсьці да берагоў Індыйскага акіяна?!

Такой дарогай на працягу стагодзьдзяў Расея пашырала межы свае імпэрыі. У гэтым і заключаецца сутнасьць палітыкі Жырыноўскага, які імкнецца ўстанавіць імпэрыю Расеі й гаворыць аб вайне. Вайну гэту ён пачне сьпярша са сваімі блізкімі суседзямі, каб зноў вярнуць іх у старую залежнасьць ад Расеі. Такі працэс будзе адбывацца праз кроў, турмы, Сібір і т.п., як гэта рабілася за цароў і бальшавіцкай дыктатуры пралетарыяту.

Расею чакае цяжкая й складаная праблема. Фашыст Уладзімір Жырыноўскі здабыў у выбарах блізка 25% галасоў, а камуніст Г. Зюганаў — 20%. Гэта абазначае вялікую пагрозу для маладой расейскай дэмакратыі. А для Захаду гэта

яшчэ адна падобная навучка. Захад ратаваў Расею ў Першай Сусьветнай вайне й у Другой Сусьветнай вайне, але ўдзячнасьці не атрымаў. Амэрыку, якая аказала найбольшую дапамогу СССР у часе вайны, па вайне й апошнім часам, Жырыноўскі абражае й палохае ракетамі. Цяпер Захад павінен больш памагаць былым савецкім рэспублікам, якія будуюць свае незалежныя дзяржавы, бо Расея ніколі не была краінай дэмакратыі, а толкі дэспатызму й паняволеньня.

Па дарозе дэспатызму й паняволеньня народаў мае ісьці Жырыноўскі. Здабыўшы папулярнасьць у Расеі, ён хоча здабыць яе й за мяжой. Ён пісаў аб праве Нямеччыны на Ўсходнюю Прусію й заходнюю тэрыторыю Польшчы, што моцна занепакоіла палякаў.

У канцы сьнежня 1993 году Жырыноўскі наведаў Балгарыю й там пачаў павучаць балгараў, хто мае імі кіраваць і што рабіць. Хочучы, магчыма, здабыць сымпатыю балгараў, прапанаваў далучыць Македонію да Балгарыі, чым падліў алівы ў агонь югаслаўскай вайны. Але Міністэрства замежных спраў Балгарыі заявіла, што такая палітыка Жырыноўскага — непрымальная. А Антыкамуністычны саюз дэмакратычных сілаў Балгарыі сказаў: „Жырыноўскага заклік зьмяніць палітыку на Балканах зьяўляецца таннай прапагандай, або сьвядомым захадам узмоцніць напружаньне". Адна балгарская газэта параўнала Жырыноўскага да Гітлера. У часе свае прысутнасьці ў Балгарыі Жырыноўскі паклаў вянок ля помніка рускім жаўнерам, але народ Сафіі ня выказаў ветлівасьці й удзячнасьці гэтаму чалавеку, больш таго — абразіў яго.

Прэзыдэнт Балгарыі Жэлеў сказаў, што ўжо запозна вярнуць Балгарыю ў Савецкі Саюз. А за абразу годнасьці прэзыдэнта, які быў выбраны дэмакратычным парадкам, Жырыноўскаму загадалі пакінуць Балгарыю за 24 гадзіны.

Румыны загадзя выказалі сваю адмову бачыць Жырыноўскага. Меў ён ехаць у Нямеччыну на 18 дзён, але для такога госьця немцы ня выдалі візы. Галоўны прамоўца ад імя нямецкага ўраду, Дзітэр Вогель, заявіў, што Бон ня можа талераваць экстрэмістычныя погляды Жырыноўскага на эўрапэйскія граніцы.

Жырыноўскі вярнуўся ў Маскву абражаны, бо мала хто з замежных палітыкаў хацеў зь ім паважна гаварыць. Жы-

рыноўскі ўсьпеў ужо абразіць палову эўрапэйскіх краін і не відаць, каб якая дзяржава сьпяшалася даць яму візу на ўезд. Аднак Жырыноўскі стаіць на сваім.

Прэм'ер-міністар Вялікабрытаніі Джон Мэйджэр 14 сьнежня 1993 году сказаў, што яшчэ зарана даваць ацэнку посьпехам Жырыноўскага, але даў знаць рускім нацыяналістам не запалохваць сваіх цяпер незалежных суседзяў. Ён сказаў: „Аб'яднанае Каралеўства й міжнародная садружнасьць прызналі незалежнасьць краін, якія раней былі часткай Савецкага Саюзу (...) і спадзяюцца, што іхні сувэрэнітэт будзе рэспэктаваны".

І можа быць вельмі прыкра й небясьпечна, калі апазыцыйныя партыі Расеі, якія выступаюць супраць Лібэральна-дэмакратычнай партыі Жырыноўскага, пачнуць абяцаць рускаму народу тое-ж самае, што абяцаў Жырыноўскі, каб перацягнуць гэтых людзей на свой бок. Тады будзе сапраўдная трагедыя ня толькі для гэтых народаў і для Расеі, але для ўсяго сьвету.

На жаль, прэзыдэнт Б. Ельцын у сваёй навагодняй прамове выказаў поўную падтрымку для ўсіх рускіх, якія жывуць за межамі Расеі. А міністар замежных спраў Расеі Козыраў сказаў, што войскі Расеі павінны застацца стаяць у былых савецкіх рэспубліках. Ці-ж гэта мае быць намер Расеі зноў умешвацца ва ўнутраныя справы незалежных сувэрэнных дзяржаваў, у якія яна раней засылала сваіх людзей кіраваць гэтымі краінамі? Тут вычуваецца нешта падобнае, або супольнае з выказваньнямі Жырыноўскага... Недалёкая будучыня пакажа аблічча рускай дэмакратыі.

(„Голас Часу" № 29 (2), Лёндан 1994 г.)

Рублёвая зона

Дзень 12 красавіка 1994 году павінен лічыцца „чорным днём" беларускай дзяржаўнасьці. Гэтую дату беларусы павінны памятаць як дату, калі зроблены быў першы афіцыйны крок да аб'яднаньня грашовай сыстэмы Расеі й Беларусі. Было гэта зроблена насуперак Канстытуцыі Беларусі, у якой сказана, што Беларусь будзе праводзіць сваю самастойную зьнешнюю палітыку й што ў яе будзе свой Нацы-

янальны банк. А тут урад, насуперак Канстытуцыі, падпарадкоўвае Нацыянальны банк Беларусі Расеі. Але што для камуністаў значыць Канстытуцыя... Мы памятаем Сталінскую Канстытуцыю, якая быццам давала шырокія правы свабоды сваім „незалежным рэспублікам", якія маглі нават выйсьці з СССР, калі гэтага жадалі. А што было ў сапраўднасьці, кожны знае. Так, што ў Канстытуцыю камуністы ня вераць, а могуць уставіць у яе нейкі пункт, які дазволіць ім маніпуляваць так, як яны захочуць.

Аб імкненьні беларускага ўраду ўвайсьці ў рублёвы саюз з Расеяй гаворыць Уладзімір Тарасаў, доктар эканамічных навук: „Чаму так імкнецца ў рублёвы саюз наша рэспубліка? Адказ просты: парлямант і ўрад, схаваўшыся за расійскі рубель, спрабуюць ухіліцца ад адказнасьці за крызісны стан эканомікі. За тры гады ў рэспублікі не адбылося сур'ёзных структурных зьмен, так і не распачата па-сапраўднаму прыватызацыя, не створана інфраструктура рынку, а ўвядзеньне нацыянальнай валюты спазьнілася па меншай меры на тры гады" („Беларусь" № 4, 1994 г., стар. 2).

Такой думкі аб Беларусі зьяўляюцца й парлямантарыі Захаду. Калі сьпікер беларускага парляманту Мячаслаў Грыб наведаў Стасбург, дык яму там сказалі, што на Беларусі не адбываецца ніякіх зьмен і рэспубліка па-ранейшаму застаецца таталітарнай дзяржавай.

Што было падпісана 12 красавіка Кебічам у Маскве, гэта яшчэ не закон, але досыць таго, што сучасны ўрад Беларусі, пасьля чатырох месяцаў перагавораў з маскоўскімі кіраўнікамі, наважыўся аддаць незалежнасьць Рэспублікі Беларусь пад кантроль Расеі. Хоць старшыня Нацыянальнага банку Беларусі С. Багданкевіч таксама падпісаў дакумант, але не падпісаў яго пяты пункт, у якім гаворыцца аб падпарадкаваньні Нацбанку Беларусі Цэнтральнаму банку Расеі.

Ня маючы свайго Нацыянальнага банку, Беларусь напэўна страціць эканамічны ўплыў на сваю гаспадарку, але й страціць частку дзяржаўнай незалежнасьці. Гэтага якраз хоча Расея. Яна будзе рабіць усё, каб не палепшыць эканамічны стан Беларусі, а ўплясьці яе ў сваю эканоміку, каб яна не магла зь яе вызваліцца. Паводле „Нью Ёрк Таймс", заходнія дэмакраты не выключаюць, што наступствам ма-

нэтарнай вуніі можа быць палітычная вунія дзьвюх рэспублік, што абазначае канец беларускай дзяржаўнасьці. Гэта разумеюць некаторыя народныя дэпутаты Беларусі й выступаюць супраць такой дзейнасьці ўрада й парляманту, якія працуюць на шкоду сваім народным інтарэсам. Таму, як падае „Народная газэта" (№ 70 ад 15 красавіка 1994 г.) у артыкуле „Дэмакраты абараняюць Канстытуцыю", „народныя дэпутаты Рэспублікі Беларусь В. Алампіеў, А. Трусаў, В. Какоўка, В. Малашка, М. Крыжаноўскі зьвярнуліся ў Прэзыдыюм Вярхоўнага Савету са зваротам. У ім, у прыватнасьці, адзначаецца, што „заява старшыні Савета Міністраў Беларусі сп. Кебіча В. Ф. Расійскаму тэлебачаньню сьведчыць аб тым, што ў парушэньні арт. 8, арт. 83 п. 11 і арт. 145 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якая ўступіла ў сілу 30 сакавіка 1994 г., ім у Маскве падпісаны Дагавор аб аб'яднаньні грашовых сістэм Рэспублікі Беларусь і Расеі".

Патрабаваньне групы народных дэпутатаў — даручыць Генэральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь сп. Шаладонаву В. І. неадкладна правесьці рассьледаваньне й пры неабходнасьці ўзбудзіць крымінальныя справы ў адносінах да ўдзельнікаў падрыхтоўкі падпісаньня гэтага дагавору.

У сваім звароце дэпутаты папрасілі Прэзыдыюм Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь зрабіць палітычную ацэнку падзеям, якія адбыліся, а таксама ўключыць у парадак дня нечарговай сесіі Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь пытаньне „Аб адстаўцы старшыні Савета Міністраў і членаў ураду ды іншых асоб за антыканстытуцыйную дзейнасьць".

Як стала вядома, на пазаўчарашнім паседжаньні Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету па дадзенаму звароту ніякага рашэньня не было прынята. Ён накіраваны на разгляд у адпаведныя камісіі.

На такія асьведчаньні розных апазыцыянераў прэм'ер-міністар Вячаслаў Кебіч 19 красавіка гутарыў з групай журналістаў і адказаў на шэраг пытаньняў. Ён глядзіць на „рублёвую зону" ня так, як глядзіць апазацыя й другія замежныя крытыкі. Вось што чытаем: „У прыватнасьці, прэм'ер-міністар з высокай ступеньню іроніі аднёсься да выказваньня Станіслава Шушкевіча й Зянона Пазьняка аб „злачынстве", быццам бы ўчыненым урадам у сувязі з падпісаным дагаворам

аб аб'яднаньні грашовых сістэм Беларусі й Расеі. Вячаслаў Кебіч падкрэсьліў, што лічыць яго чарговай правакацыяй нацыянал-рэфарматараў і рэагуе на яго спакойна й нават са шкадаваньнем. Ён адзначыў, што сёньня любому чалавеку абсалютна ясна: без саюза з Расеяй немагчыма выйсьці з крызісу, немагчыма палепшыць жыцьцё людзей. Калі ўсё грамадзтва спрабуе крытычна пераасэнсаваць трагедыю мінулага й зразумець сэнс рэальнага сувэрэнітэту, то тыя, хто называе сябе нацыянал-патрыётамі, жывуць у сярэдневяковых ілюзіях. Вячаслаў Кебіч назваў дагавор з Расеяй адзіным спосабам захаваньня сувэрэнітэту Беларусі" („Звязда" № 77 ад 21.04. 1994 г.).

Але расейскія газэты пішуць зусім што іншае, што гаворыць Вячаслаў Кебіч. Напрыклад, „Известия" замясьціла вялікі загаловак „Белоруссия обменяла часть своего суверенитета на российские рубли" й піша: „Беларускі бок праяўляе гатоўнасьць адмовіцца ад часьці эканамічнага сувэрэнітэту ўзамен за больш пэўную валюту — рубель і на больш пэўныя эканамічныя сувязі". Таксама газэта „Труд" піша: „Усім павінна быць зразумела: немагчыма функцыяніраваць адзінай рублёвай зоне без уваходу Беларусі ў састаў Расеі на правох рэспублікі". І такую пазіцыю выказваюць другія расейскія газэты.

Як мае выглядаць гэтае грашовае аб'яднаньне й да чаго яно вядзе, піша Максім Гілеўскі:

„Называюцца, па сутнасьці, дзьве пазіцыі, дзе мы атрымаем выгаду: 1) танная нафта (кошт яе зьнізіцца на 40 даляраў за тону), 2) адсутнасьць межаў і мытняў, што дазволіць нашым трактарам працаваць на расійскіх палях.

Але: 1) навошта ня нашым прадпрыемствам (актывы — пасівы, бюджэт — крэдыты, заводы — саўгасы расійскія) танная нафта? 2) чаго нам хвалявацца за продаж ня нашых трактароў?

Няўжо адзін спосаб выжыць — пусьціць сабе кулю ў скронь?! Дазволь, чытач, прывесьці лічбы з „Общей газеты", якую выдаюць у Маскве. Гэта меркаваньні экспертаў абодвух бакоў пра фінансавыя страты й набыткі Расіі пры аб'яднаньні грашовых сістэм:

— расійскія пастаўшчыкі энэрганосьбітаў і бюджэт Расіі згубяць у 1994 годзе прыбыткі на суму 1,4 млрд. даляраў (у выпадку прымяненьня зь Беларусьсю ўнутраных расійскіх цэнаў);

— аднак, дзякуючы зьніжэньню цэн на знэрганосьбіты, Расія можа атрымаць выйгрыш праз пастаўку таннай прадукцыі зь Беларусі ў 400 млрд. рублёў;

— агульныя выдаткі, якія нясе Беларусь за ўтрыманьне на сваёй тэрыторыі расійскіх войскаў стратэгічнага прызначэньня — каля 1,9 млрд. даляраў на год;

— стварэньне Расіяй уласнай групіроўкі супрацьпаветранай абароны на заходнім накірунку замест аб'ектаў, якія знаходзяцца на Беларусі, запатрабавала б болей 10 трлн. рублёў;

— стварэньне граніцы зь Беларусьсю на працягу 1 239 км каштавала-б Расеі ня менш 600 млрд. рублёў плюс 400 млрд. на стварэньне пунктаў мытнага кантролю;

— будаўніцтва на тэрыторыі Расіі аб'ектаў, аналягічных вузлу сістэмы папярэджаньня аб ракетным нападзе ў Баранавічах і цэнтру сувязі ВМФ у Вілейцы, запатрабуе ня менш 4 трлн. рублёў.

Падвядзём рысу: Расея страчвае 1,4 млрд даляраў, але эканоміць ня менш 10 млрд. даляраў. Беларусь, адмаўляючыся ад платы за транзіт і за ўтрыманьне расійскіх вайсковых аб'ектаў (па ацэнках незалежных экспэртаў) адначасна адмаўляецца не менш ад 3 млрд. даляраў штогод.

Дык каму трэба аб'яданьне грашовых сістэм? Чаму Беларусь павінна змагацца за нейкія энэрганосьбіты для прадпрыемстваў, якія ўжо ня будуць належаць самой Беларусі? Чаму мы павінны аддаваць адзінае, што ў нас ёсьць — дзяржаву — не атрымліваючы нічога ўзамен? (Ды й што можна параўнаць па каштоўнасьці з уласнай дзяржавай?"). („Культура" № 17 ад 27.04.1994 г.).

Таксама піша Валеры Карбалевіч: „Судзячы па ўсяму, у рэспубліцы выбіраецца самая няўдзячная мадэль разьвіцьця, не рашаючая ніводнай зь існуючых праблем. Кіруючая намэнклятура, як шляхта апошніх дзесяцігодзьдзяў існаваньня Рэчы Паспалітай, дзеля асабістых карысьцяў гатова ў чарговы раз ахвяраваць інтарэсамі народа" („Европейское время" № 3 (18), март 1994 г.).

Вядома, што сёньня эканоміка Расеі мала лепш выглядае за беларускую й калі жабрак выцягвае руку да жабрака, то што ён можа атрымаць?!

(„Голас Часу" № 31 (4), Лёндан, 1994 г.)

Хто каго вучыў?

У вялікай сям'і славянскіх народаў беларускі народ розьніцца ад іншых народаў сваёю моваю. Мова — самы першы набытак любой этнічнай супольнасьці людзей. Славянскія мовы належаць да шматлікай сям'і індаэўрапэйскіх моваў. А, наогул, дасьледчыкі налічваюць на зямлі каля дзьвюх тысячаў моваў, але іх напэўна было больш. Некаторыя зь індаэўрапэйскіх моваў загінулі беспаваротна й зь імі загінула этнічнае паходжаньне народу. Да сёньняшняга часу захаваліся славянскія мовы, якія ў свой час мелі тварыць адну агульную мову. З часам, калі на эўрапэйскім кантынэньце пачалі пашырацца славяне, іхныя сувязі пачалі слабець, што адбілася на адзінстве славянскай мовы ды прывяло да пэўнай зьмены.

Калі землі Кіеўскай Русі й іншых сумежных зь ёю княстваў апынуліся ў XIII ст. у залежнасьці ад татара-манголаў, яны страцілі магчымасьць разьвіцьця сваіх моваў і страцілі шмат сваіх стараславянскіх асаблівасьцяў, засвойваючы татара-мангольскія, угра-фінскія ды іншыя словы. Беларусьжа ў той час і пазьней не была пад татара-мангольскай, угра-фінскан ці іншай залежнасьцю і таму ня мела чужога ўплыву на разьвіцьцё свае мовы. У выніку гэтага працэсу, сярод усходніх славянаў надышоў ня толькі моўны, але й нацыянальны падзел на беларусаў, украінцаў і расейцаў.

Ёсьць многа навуковых сьведчаньняў, якія гавораць, што беларуская мова зьяўляецца адной з найбольш чыстых славянскіх моваў, найбольш блізкай да праславянскай крыніцы. Заўважыў гэты вядомы польскі этнограф Міхал Федароўскі, які прысьвяціў 30 гадоў свайго жыцьця досьледам беларускага фальклёру ў мінулым стагодзьдзі. Беларускі фальклёр гэта мова беларускага народу, частка яго нацыянальнага аблічча, дзе ён пераказваў свой гераізм, сваю радасьць і смутак, сваю надзею й роспач. Фальклёр зьяўляецца гістарычным паказьнікам эпохі. З палітычных прычынаў было прынята пісаць у царскай ды савецкай літаратуры й гісторыі, што продкі беларусаў, украінцаў і рускіх жылі адным жыцьцём, карысталіся адной мовай і што тварылі быццам адзіную Рускую дзяржаву. Для прыкладу пры-

вядзём зацемку: „У гэтай дзяржаве (Кіеўская Русь), якая ў канцы X і ў XI ст.ст. дасягнула вышэйшага росквіту й магутнасьці, этнічныя продкі рускага, украінскага і беларускага народаў жылі адным агульным грамадзка-палітычным жыцьцём, мелі аднолькавую мову, літаратуру і культуру" („Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры", Мінск 1956 г., стар. 5).

Калі гаварыць пра дакладнасьць, дык гэтыя „этнічныя продкі рускіх, украінцаў і беларусаў не жылі „агульным грамадзка-палітычным жыцьцём". Іхныя князі вялі частыя й заўзятыя войны за сваю дзяржаўную незалежнасьць, помсьцілі адзін аднаму, князь мардаваў князя, каб толькі захаваць сваё княства незалежным ад Кіева. Так у 1169 г. Андрэй Багалюбскі, князь Растова-Суздальскі, штурмам узяў Кіеў, абрабаваў яго, спаліў, разагнаў многа насельніцтва, а рэшту зрабіў нявольнікамі. Быў гэта пачатак распаду Кіеўскай Русі, і ніхто ня мог яго стрымаць. Гэта ёсьць яскравы прыклад вышэйпамянёнага „агульнага грамадзка-палітычнага жыцьця" Кіеўскай Русі ды ейных „рускіх" удзельных князёў, пра што так хораша пішацца ў „Нарысах па гісторыі беларускай літаратуры" савецкага часу. Ад гэтага памятнага 1169 г. Кіеў ніколі ўжо не акрыяў, а наезд татара-манголаў у першай палавіне XIII ст. канчаткова ўсьмяроціў Кіеўскую Русь, а з Кіева зрабіў глухі пасёлак.

Кляркcон у сваёй кнізе на ангельскай мове „Гісторыя Расеі ад XI стагодзьдзя" на стар. 33 піша, што ў кіеўскі пэрыяд не было Рускай дзяржавы. І яе не магло быць. А што да яе пісьменнасьці, дык яна вялася на стараславянскай мове, а не на той, якой карысталіся плямёны Кіеўскай Русі. Тагачасныя аўтары былі пераважна манахамі ў манастырох і яны, калі што пісалі сьвецкага, дык карысталіся царкоўнаславянскім пісьмом.

Маскоўскае княства пачало тварыцца даволі позна, недзе ў X ст., і не на славянскай тэрыторыі, а на тэрыторыі ўграфінскіх плямёнаў. Першы ўспамін пра Маскву спатыкаем пад 1147 г. і ейнае паходжаньне ня ёсьць славянскае, а чудзкае (угра-фінскае), што ў перакладзе азначае „мяккая вада". І, як падае праф. Мікалай Фр. Хіроўскі, „паводле большасьці ўсходнеэўрапэйскіх, нерасейскіх гісторыкаў, Кіеў-

ская эра ў сапраўднасьці не належыць да гісторыі Расеі" („Эн Інтродакшын ту гісторы", ЗША 1967, стар. 19).

А што да „агульнай мовы", дык Кіеўская Русь яе ня мела. Было толькі агульнаславянскае моўнае падабенства. З прыняцьцём хрысьціянства Уладзімірам Вялікім у X ст. у Кіеў прыйшла царкоўнаславянская літаратура, якая пашыралася на Русі, але была яна на балгарскім дыялекце. Крыху раней (IX ст.) славянскі алфавіт улажылі сьвятыя Кірыла і Мяфодзій, якія паходзілі з гораду Салёнікі (Грэцыя). Яны перакладалі грэцкія царкоўныя кнігі на славянскую мову, карыстаючыся дыялектам, які яны добра зналі, бо гадаваліся сярод славянаў — беларускіх дрыгавічоў, якіх там называлі „другавітамі". Мова гэтых рэлігійных кнігаў мела незразумелыя словы для жыхароў Кіеўскай Русі, і яны тлумачыліся перакладчыкамі „на боцех", інакш кажучы, на палях.

У той старажытны час мы маем на Беларусі такіх рэлігійна-культурных асьветнікаў як Еўфрасінія Полацкая. Памерла яна ў 1173 г. і па яе сьмерці было напісана на царкоўна-славянскай мове „Жыцьцё Еўфрасініі Полацкай" як асьветніцы, якая бачыла сваё пакліканьне ў тым, каб служыць умацаваньню хрысьціянства ў Полацкай зямлі і ўзьняць культурна-асьветніцкі й маральны ўзровень сваіх суайчыньнікаў. Еўфрасінія вышэй „за все имение" ставіла кнігі, „ими же утешает (...) душа и сердце веселится". Яна стварала свае арыгінальныя творы й рабіла пераклады з грэцкай мовы. Выдатнымі й адукаванымі беларускімі асьветнікамі сярэдневечча былі Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч і Аўраам Смаленскі. Яны былі першымі красамоўцамі хрысьціянскага слова й пяра ня толькі ў Беларусі, але й сярод усходніх славянаў. У гэтым часе на тэрыторыі Беларусі паўсталі полацкае, лаўрышаўскае, мсьціслаўскае і друцкае „Евангельлі". „Аршанскае Евангельле" XIV ст. зьмяшчае ў сабе лексычныя й фанэтычныя асаблівасьці беларускай мовы. Усходнія славянскія княствы — Полацкае, Тураўскае, Ноўгарадзкае, Кіеўскае ды іншыя — мелі свае гаворкі, якія розьніліся ня толькі ад царкоўнаславянскае мовы, але мелі сваю спэцыфіку, якая вызначыла з часам беларускую, украінскую й расейскую мовы. Дарэчы зацытаваць выказваньні беларускага вучонага Фёдара Янкоўскага:

„Засяленьне славянамі велізарных абшараў натуральна прывяло да паслабленьня сувязяў паміж славянскімі групамі, а нарэшце й да распаду агульнаславянскага моўнага адзінства. Не пазьней, як у VI ст. надышоў канец агульнаславянскай эпохі, пачалося выдзяленьне славянскіх моўных групаў, асобных славянскіх моваў" („Роднае слова", Мінск 1972, стар.12). Падобнае гаворыць і прафэсар Мікалай Фр. Хіроўскі, заяўляючы, што нацыянальныя адрозьненьні беларусаў утварыліся ўжо ў VII-XIII ст.ст. У XI ст. у кнігах-перакладах, пісаных беларусамі царкоўнаславянскай мовай, выразна прабіваюцца беларускамоўныя рысы. У той час Кіеўская Русь ня мела арыгінальных твораў. Ейныя жыхары былі яшчэ малапісьменныя, трэба было ім многа вучыцца, каб пачаць пісаць свае арыгінальныя аповесьці або іншыя мастацкія творы. Пісаліся толькі летапісы, паломніцкая літаратура ды сьвецкія пераклады.

Недзе ў сярэдзіне XIII ст., у сувязі з пашырэньнем пісьменнасьці, склаўся першы пэрыяд гісторыі ўласнай беларускай літаратуры. Акадэмік Яўхім Карскі лічыць, што важнейшыя асаблівасьці беларускай мовы ў той ці іншай меры існавалі ўжо ў XIII ст. і з гэтага XIII ст. склаліся характэрныя рысы беларускай мовы, якія адрозьнівалі яе ад моваў іншых славянскіх народнасьцяў. І на працягу наступных стагодзьдзяў спэцыфічныя рысы беларускай мовы замацаваліся й выразна выявіліся ў афіцыйных дакумантах ды іншых помніках літаратуры й пісьменнасьці. Была гэта старабеларуская мова. Акадэмік Карскі прысьвяціў амаль усё сваё навуковае жыцьцё вывучэньню беларускай мовы й культуры.

Яго грунтоўная праца „Беларусы" даказала, што беларуская мова — арыгінальная, самастойная славянская мова, са сваёй гісторыяй, а беларускі народ — самастойны славянскі народ.

Усё-ж трэба аб'ектыўна прызнаць, што беларуская мова мае шмат супольнага зь некаторымі славянскімі мовамі, асабліва з суседнімі. Але яна розьніцца ад іх сваім характарам выгавару й гукавым складам. Яна мае свае фанэтычныя рысы, як „аканьне" ды „яканьне", чаго не спатыкаем у іншых славянскіх мовах. А „дзеканьне" й „цеканьне", хоць і спатыкаецца ў мове палякаў, але мае іншы характар. Таксама

на фармаваньне беларускай мовы мела ўплыў і літоўская. А, наогул, М. Т. Флорынскі ў сваёй кніжцы на ангельскай мове „Расея" піша, што на разьвіцьцё расейскай літаратурнай мовы мелі ўплыў замежныя мовы: старажытнацаркоўнаславянская, грэцкая, іранская, старанармандзкая, гоцкая, турка-татарская ды ўгра-фінская. На ўкраінскую літаратурную мову мелі ўплыў польская, нямецкая, турка-татарская, турэцкая, лацінская й літоўская мовы. На беларускую літаратурную мову аказалі ўплыў польская, нямецкая, габрэйская, літоўская і ўкраінская мовы.

У залежнасьці ад таго, да якой этнічна-гістарычнай супольнасьці людзей адносіцца кожная мова, іх падзяляюць на тры групы: племянная мова, мова народнасьцяў і нацыянальная мова. Нацыянальнай мовай называецца найбольш высокая ступень этнічна-моўнага разьвіцьця грамадзтва, дзе адна з больш вядучых моваў замацоўваецца ў сфэры грамадзкіх зносінаў. Пэрыяд узьнікненьня й разьвіцьця беларускай нацыянальнай мовы адносіцца да пары Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ).

Калі Беларусь і частка Ўкраіны ўвайшлі ў склад ВКЛ, беларуская мова заняла ў ім урадавую пазыцыю. Мела яна свае характэрныя рысы, адрозьнівалася ад агульнаўсходнеславянскай мовы сваімі фанэтычнымі ды лексычнымі асаблівасьцямі.

Што да цяперашніх „літоўцаў" (усходніх балтаў, землі якіх былі далучаныя да ВКЛ), дык яны не маглі накінуць беларусам сваёй мовы таму, што былі яны малаколькасныя, малаадукаваныя й ня мелі яшчэ свайго пісьма. Беларуская культура стаяла намнога вышэй за культуру малацывілізаваных балцкіх плямёнаў.

Такім чынам, беларуская мова ў вялікім Княстве Літоўскім сталася афіцыйнай мовай канцылярыі ды справаводзтва. Пачынаючы ад вялікага князя Альгерда (1343-1377) на беларускай мове пісаліся дзяржаўныя акты, адміністрацыйныя ўказы, ваенныя загады, судовыя пратаколы й прысуды, што спрыяла ейнаму далейшаму разьвіцьцю. На беларускай мове прамаўлялі дзяржаўныя мужы, князі, а сэнатары на соймах вялі дыскусіі й спрэчкі між сабою на беларускай мове. Беларуская мова ў ВКЛ была родная для ўсіх,

пачынаючы ад гарапашнага селяніна й канчаючы вялікім князем, або каралём. І гэта таксама садзейнічала разьвіццю беларускай мовы, як дзелавой, што аказвала значны ўплыў на мову іншых жанраў.

Польскі палітык і гісторык Лявон Васілеўскі ў сваёй кніжцы „Літва й Беларусь" піша: „Ужо за Альгерда беларушчына становіцца мовай урадавай Літвы, і вышэйшыя сфэры літоўскага грамадзтва асымілёўваюцца стыхійна зь беларускай мовай. У той час зьявіўся назоў „Белая Русь", які ўжываўся ў жыцьці, у дакумантах ды пісьмах нямецкіх, польскіх і інш. Беларушчына сталася супольнай моваю князёў, паноў і літоўскага баярства. Адначасна становіцца яна мовай урадавых дакумантаў". Быў гэта час, калі ў Беларусі поруч урадавага пісьма разьвівалася й сьвецкая літаратура ў форме летапісу, што сьведчыць аб росьце гістарычнай самастойнасьці беларускага народу. Была таксама перакладная літаратура, характэрная для сваёй эпохі тым, што ейныя аўтары, пераважна, не падавалі сваіх прозьвішчаў, яны заставаліся ананімнымі ў беларускай літаратуры. Гэтыя творы садзейнічалі пашырэньню гістарычнага й культурнага далягляду, а таксама паказалі беларускаму народу ягонае месца сярод іншых народаў. На пашырэньне й разьвіццё беларускай мовы мелі ўплыў ідэі адраджэньня й гуманізму. Значную ролю ў пашырэньні беларускай пісьменнасьці адыгралі розныя рэфарматарскія рэлігійныя плыні, якія вялі між сабой палеміку. Рэфарматары зьвярталіся да народу на ягонай роднай мове й на гэтай мове вяліся спрэчкі й адначасна прапагандаваўся патрыятызм і любоў да свае краіны, культуры й мовы.

Дзеля папулярнасьці й пашырэньня роднага слова ў 1517 г. Ф. Скарына выдаў у Празе кнігі Бібліі, а пасьля пачаў выдаваць іх у Вільні. Біблія Скарыны была першай друкаванай кніжкай сярод усходніх славянаў і трэцяй пасьля нямецкай і чэшскай. Скарына заклікаў народ да пазнаньня сьвятла навукі, да ўзбагачэньня людзкой мудрасьці. Але, як на бяду, летам 1530 г., у часе вялікага пажару Вільні, згарэла друкарня Скарыны. Давялося яму шукаць фінансавай падтрымкі й больш спрыяльнай атмасфэры для свае друкарскае дзейнасьці. Скарына паехаў у Маскву і павёз свае кніжкі на паказ, каб заахвоціць маскавітаў да друкарскай справы. Але

ў Маскве напаткаў ён непрыемнасьці: загадам вялікага князя маскоўскага Васіля Іванавіча кнігі выдатнага беларускага вучонага былі сканфіскаваны й публічна спалены.

Гісторыя паўтарылася, калі ў сярэдзіне XVI ст. у Маскву прыехалі іншыя беларускія друкары Пётр Мсьціславец і Іван Фёдараў. Ім удалося выдаць толькі дзьве царкоўнаславянскія кнігі, і на гэтым іхная работа спынілася. Маскоўцы зь іхным царом Іванам Грозным палічылі друкаваныя кнігі за прошукі „нячыстай сілы", паламалі друкарню ды пачалі пагражаць друкарам. Давялося Пятру й Івану вярнуцца ў ВКЛ.

Прадаўжальнікам Скарыны быў Васіль Цяпінскі. Ягонае „Евангельле" было напісанае на славянскай і беларускай мовах. Цяпінскі заклікаў свой „слаўны народ" беларускі да дзейнасьці супраць палянізацыі й адстойваў правы адукацыі на роднай мове.

У 1596 г. у Вільні брацкая друкарня надрукавала ілюстраваную „Азбуку" Лаўрэньція Зізанія (першы беларускі буквар), „Лексіс" (першы беларускі слоўнік) і „Граматыку". Кніжкі гэтыя зрабілі вялікі ўплыў на разьвіцьцё ня толькі беларускай нацыянальнай культуры, але садзейнічалі пашырэньню навукі на Ўкраіне, у Расеі й сучаснай Літве.

Вайна паміж ВКЛ і Масковіяй 1654-1667 гг. паўплывала на тое, што беларуская мова сталася штуршком для разьвіцьця мовы расейскай. Пра гэта згадвае гісторык Бацюшкаў: „Апрача зямельных заўладаньняў, Расея ў гэтай вайне атрымала для свайго адраджэньня духовыя ды разумовыя сілы, прыгарнуўшы да сябе лепшых заходнерускіх (чытай — беларускіх) дзеячоў ды літаратурнымі перайманьнямі ў беларусаў і палякаў. У 1664 г. у Маскву з Полацка прыбыў ераманах полацкага Богаяўленскага манастыра Сымон Сітняновіч. Тут ён запачаткаваў школьную асьвету й пакінуў па сабе многа навуковых і літаратурных працаў". Дзейнасьць Сымона Сітняновіча, якога папулярна называлі Сімяон Полацкі, выйшла далёка за межы Беларусі. Ён многа спрычыніўся да разьвіцьця навукі й культуры ў Маскоўскай дзяржаве. Полацкі выхоўваў царскіх дзяцей, сярод іх будучага імпэратара Пятра Вялікага, напісаў для іх „Буквар". Ён прынёс у Маскву кірылічнае пісьмо, якое ў адпаведнасьці з даручэньнем Пятра Вялікага было рэфармаванае (таксама бе-

ларусам Капіевічам) у так званую „грамадзянку". Прафэсар І. Ярэмін пісаў, што Сімяон Полацкі „залажыў асновы рускай літаратуры, той галіны мастацкай творчасьці, якая да яго не была распрацаваная — паэзіі й драматургіі".

Іншы расейскі вучоны П. Бяссонаў сцьвярджае, што надта пашыраныя ў Беларусі тэатральныя прадстаўленьні — батлейкі, адыгралі не апошнюю ролю ў станаўленьні расейскага тэатру: „Карыснымі былі для нас (расейцаў) гэтыя прадстаўленьні, якія дзякуючы прыбышом з Полацку ды іншым, паявіліся ў двары цара Аляксея, Сафіі й Пятра: граныя там беларускія з паходжаньня вядомыя містэрыі запачаткавалі наш (расейскі) тэатр".

Дык хто-ж тады каго вучыў? Хто каму даводзіўся „старэйшым братам"? Аб тагачаснай беларускай мове піша ўжо згаданы расейскі гісторык Бяссонаў: „Мову сваю дала Беларусь большай частцы іншых (...) народнасьцяў, з мовай — пісьменнасьць, тым і іншым — цэлы сьвет поглядаў, а з гэтым правадніком-пасрэднікам — усе астатнія самабытна цывілізацыйныя пачаткі".

Ведама, што Ўладыслаў Ягайла, будучы польскім каралём у Кракаве, гаварыў на беларускай мове і гэтай мовай там карыстаўся. Ён нават прывёз у Кракаў беларускіх мастакоў, якія ўпрыгожвалі каралеўскі палац, храмы, малявалі абразы. І наступныя каралі з дынастыі Ягайлавічаў таксама гаварылі па-беларуску. На беларускай мове ў XIV-XVI ст.ст. былі выдадзеныя: „Літоўская мэтрыка", „Літоўскія статуты" ў трох рэдакцыях, „Судзебнік Казіміра Ягелончыка", „Літоўскія летапісы", а таксама творы перакладной сьвецкай і царкоўнай літаратуры. На асабліваю ўвагу заслугоўваюць тры рэдакцыі „Літоўскага статуту" 1529, 1566 і 1588 гг. Іхным апошнім аўтарам быў канцлер ВКЛ Леў Сапега, які ў прадмове напісаў: „Если катораму народу устыд правоў сваих няумеци (...) каторыя ня обчым яким языком, але сваим уласным правы списаныя маем".

Беларуская літаратурная мова XIV-XVI ст.ст. (тады яе называлі „рускай", а часам і „літоўскай") ня так многа адрозьніваецца ад сучаснай беларускай мовы. За прыклад можа паслужыць урывак са Статуту Літоўскага 1529 г.: „А пісар земскі мает по-руску літэрамі і словы рускімі всі лісты, выпісы і поз-

вы пісаті, а не іншым езыком і словы". Артыкул гэты быў правамоцны ў ВКЛ да канца XVII ст. Гэтае сьведчыць пра тое, што беларускія фэадалы ўважалі сябе беларусамі, даражылі сваёй беларускай мовай і сваей дзяржавай — Вялікім Княствам Літоўскім. Статут ВКЛ апошняй рэдакцыі ў 1811 г. быў перакладзены на расейскую мову ў якасьці зводу мясцовых законаў. Польскі гісторык Ежы Ахманьскі піша: „III Статут Літоўскі, які дзейнічаў ажно да 1840 г., зьяўляецца выдатным помнікам літоўскага (чытай: беларускага) права, пераважае ня толькі маскоўскія Судзебнікі 1497, 1550, 1649 гг., але дамінуе над шматлікімі заходнеэўрапэйскімі кодэксамі, ня кажучы ўжо пра Польшчу, якая да падобных зводаў законаў так і не дайшла" („Гісторыя Літвы", Вроцлаў 1982, стар. 133).

Прафэсар В. Морфіл у сваёй кніжцы на ангельскай мове падае: „Беларусы былі найбольш цывілізаванай нацыяй на Ўсходзе Эўропы. На беларускай мове дайшлі да нас сапраўдныя дакуманты, якія выдавалі польскія каралі сваім падданым у XV-XVI ст.ст." („Полянд", Лёндан 1893, стар. 14).

Польская мова ў той час была яшчэ бедная, каб можна было на ёй нешта пісаць. Палякі карысталіся лацінай. Да XVI ст. уся дзяржаўная дакумантацыя пісалася ў Польшчы на незразумелай для народу лацінскай мове. Гэта пацьвярджае верш, напісаны Янам Казімірам Пашкевічам на свабоднай ад тэксту старонцы Літоўскага Статуту 1529 г.:

Польска квитнет лациною,
Литва квитнет русчизною;
Без той в Полсце не пребудеш,
Без сей в Литве блазнем будеш,
Той лацина езык дает,
Та без Руси не вытрвает.
Ведзь же юж Русь, иж тва хвала
По всем свете юж дойзрала;
Весели ж се ты, Русине,
Тва слава нигды не згине!

І гэтак у 1420 г. у Кракаве на тагачасную беларускую мову быў перакладзены Варцкі статут, а ў 1423 годзе — Вісьліцкі. Польскі вучоны праф. Грабец даводзіць, што

ў творах польскага пісьменьніка М. Рэя ёсьць беларускія і ўкраінскія элемэнты. А польская дасьледчыца Г. Сафарэвіч напісала спэцыяльную навуковую працу пра ўплыў беларускай мовы на польскую.

Гэтаксама беларуская культура зрабіла вялікі ўплыў на разьвіцьцё культуры сучаснага літоўскага народу, бо іхныя продкі, усходнія балты, лічы, да XVI ст. былі непісьменныя. Вось што пісаў на гэтую тэму польскі навуковец У. Вяльгорскі: „Мова беларуская была ў той час мовай асьвечаных кругоў Літвы. Пра гэта трэба памятаць. Пацягнула яна за сабою просты літоўскі народ з тае прычыны, што дала яму доступ да адукаванага слова" („Польска і Літва", Лёндан 1947, стар. 94-95). Тое самае сцьвярджае літоўскі акадэмік Костас Карсакас: „Беларускі народ зрабіў вялікі ўклад у культурнае разьвіцьцё літоўскага народу. Літоўцы заўсёды з удзячнасьцю ўспамінаюць той факт, што беларусы далі літоўцам пачатак пісьменнасьці". Зьяўленьне літоўскай пісьменнасьці было зьвязанае з пашырэньнем рэфармацыі — барацьбы супраць Каталіцкай царквы. Першая кніжка на літоўскай мове была выдадзена ў 1547 г. у Кёнігсбэргу (Прусія). Былі гэта „Катэхізму простыя словы" лютэранскага сьвятара Марцінаса Мажвідаса.

У канцы XV — пачатку XVI ст.ст. беларуская літаратура настолькі разьвілася, што сталася пасрэднікам паміж эўрапэйскімі літаратурамі. Яе пераклады рыцарскіх раманаў, аповесьцяў, хронікаў і навуковых твораў тае пары служылі для перакладаў у Маскоўскім Княстве. Захавалася пэўная колькасьць тагачасных друкаваных помнікаў, граматаў, юрыдычных дакумантаў, рукапісных кнігаў на старабеларускай мове. Была гэта ўжо беларуская літаратурная мова, зразумелая для ўсіх жыхароў ВКЛ. Пасол Рэчы Паспалітай у Рыме Эразм Цёлэк у 1501 г. гаварыў папу Аляксандру VI пра беларускую мову: „Літоўцы маюць уласную мову. Але дзеля таго, што русіны насяляюць сярэдзіну дзяржавы, дык усе звычайна карыстаюцца іхнай мовай, бо яна больш далікатная й больш лёгкая".

Як бачым з гістарычных фактаў, беларуская мова ў той далёкі час была мовай дзяржаўнай, мовай культуры, была той крыніцай, зь якой чэрпалі веды нашы суседзі. Беларус-

кая мова была пашырына намнога далей за межы сучаснай Беларусі. „Беларускі сялянскі каляндар на 1938 год" (Вільня, стар. 40) падае: „Беларуская мова пашыраная далёка на ўсход. Карта ўсходнеславянскіх дыялектаў (гутарак), уложаная Маскоўскай Дыялекталягічнай камісіяй адзначае, што беларускія з асновы дыялекты (гутаркі, гаворкі) пашыраныя амаль ва ўсёй Смаленшчыне і ў большай частцы Калужскай губэрні. Беларускія ўплывы на расейскія гаворкі адзначаныя на гэтай мапе амаль ва ўсёй Пскоўскай губэрні, у паўднёва-заходняй частцы Цьверскай губ. і нават у паўднёвай прыгранічнай паласе Ленінградзкай губ.".

Далейшыя гістарычныя падзеі склаліся так, што над беларускай мовай ейныя суседзі, палякі ды расейцы, зрабілі зьдзек. Яе забаранілі ўжываць і нават палічылі яе „дыялектамі" сваіх моваў. У 1697 г. у Рэчы Паспалітай беларуская мова была заменена польскай і ў дзяржаўным, і ў грамадзкім справаводзтве, і адгэтуль пачаўся заняпад нашае мовы. У канцы XVIII ст. Беларусь была занята Расеяй, ейны імпэрскі ўрад не прызнаваў беларускі народ за асобную нацыю, а беларускую мову лічыў „русским наречием".

Так што няпраўду пісалі савецкія гісторыкі й літаратуразнаўцы, калі сцьвярджалі, што праз аб'яднаньне зь „вялікім рускім народам" беларусы і ўкраінцы атрымалі пэрспэктыву захаваньня й разьвіцьця нацыі, ейнай мовы, літаратуры, культуры й нібыта ўратаваліся ад палянізацыі й рэлігійнага прыгнёту. Калі, можа, і ўратаваліся ад палянізацыі, дык накінулі на сябе яшчэ большы прыгнёт — русыфікацыю.

За цароў не было ў Беларусі беларускіх школаў, над беларускім друкаваным словам вісеў дамоклаў меч забароны. Калі што за цароў й выдавалася па-беларуску, дык за мяжою або падпольна. Якая-ж магла тут быць „пэрспэктыва захаваньня й разьвіцьця" беларускае мовы й літаратуры? Беларуская мова перахоўвалася на вёсцы сярод сялянства, на ёй пісалі беларускія патрыёты. Людзі трымаліся сваіх старых традыцыяў, абрадаў, сьвятаў, забабонаў.

Невядомы аўтар пісаў у часопісе „Пантэон" у 1859 г.: „Нас цікавяць паданьні й вераваньні старажытных грэкаў, рымлянаў, мы пішам пра іхныя законы, міфалёгію, мову, нават пра шпацыры й абеды; чаму-ж не пісаць пра родную Бела-

русь, якая так славіцца сваімі самабытнымі звычаямі, міфалёгіяй, мовай і, нарэшце, ігрышчамі й сьвятамі?"

І неўзабаве беларускай спадчынай пачалі цікавіцца ня толькі беларускія, але й расейскія дасьледчыкі. Яны пачалі зьбіраць беларускія песьні, запісвалі абрады, звычаі й выдавалі іх асобнымі кніжкамі або зьмяшчалі ў рускамоўных выданьнях. Так, яшчэ ў часе вайны 1812 г. царскі афіцэр Канстанцін Калайдовіч, будучы ў Беларусі, зацікавіўся спадчынаю беларускага народу й пасьля вайны пачаў зьбіраць ды вывучаць беларускія старажытныя выданьні. Сумленьне падказала яму зьвярнуць увагу сьвету на важнасьць і неабходнасьць вывучэньня беларускай мовы, якая ў той час, ён асабіста пераканаўся ў гэтым, мела шырокае распаўсюджаньне.

Зварот Канстанціна Калайдовіча не прайшоў глуха: шмат тагачасных адукаваных людзей таксама пачалі ставіць пытаньне: што гэта за такі край Беларусь і якая мова ў беларусаў, якія яго насяляюць? Кожны па-свойму адказваў на гэтае пытаньне. Вось што на гэты конт піша сучасны беларускі мовазнаўца Фёдар Янкоўскі:

„Пасьля далучэньня Беларусі да Расеі рускія лінгвісты XIX ст. (А. Вастокаў, Ф. Буслаеў, І. Сразьнеўскі і інш.), азнаёміўшыся з жывой беларускай мовай праз фальклёрныя тэксты, зь вялікім захапленнем пісалі пра вартасць і каштоўнасць характэрных рыс беларускай фанэтыкі, граматыкі, словаўтварэння, лексікі для вывучэння славянскіх моў, у тым ліку рускай.

Беларуская мова зь яе асаблівасьцямі зьявілася неацэннай крыніцай для славістычнай навукі. Ф. Буслаеў, А. Вастокаў, І. Сразьнеўекі, А. Сабалеўскі, А. Патэбня, Ф. Фартунатаў і іншыя вядомыя вучоныя часта зьвярталіся да фактаў беларускай мовы пры гістарычна-параўнальным вывучаньні славянскіх і індаэўрапэйскіх моваў".

Акадэмік Сабалеўскі хаця й цікавіўся беларускай мовай, але, разам з Пагодзіным, не прызнаваў існаваньня беларускай і ўкраінскай моваў і культуры. Сабалеўскі не хацеў прызнаць беларускай мове права называцца нават „наречием" расейскай мовы, а ўважаў яе толькі „поднаречием" вялікарускага „наречия". Падобнай думкі трымаўся й акадэмік Сразьнеўскі. Польскі дасьледчык С. Ліндэ ў сваю чаргу

лічыў жывую беларускую мову польскім дыялектам („так бардзо до польшчызны збліжоны дыялект").

Палеміка паміж уплывовымі коламі польскай і расейскай вялікадзяржаўнай арыентацыі адносна беларускага „племя", ягонай прыналежнасьці, тым ня менш выклікала цікавасьць да культуры, мовы, гісторыі й пісьмовых помнікаў беларусаў. Але й самыя беларусы ў дадзеным пытаньні не сядзелі спакойна. Асаблівае зацікаўленьне беларускім народам выклікала паўстаньне 1863 г. і ад таго часу пачалося ўсё больш інтэнсіўнае ягонае вывучэньне.

Адам Міцкевіч, з паходжаньня беларус з Наваградчыны, хоць і аддаў свой талент польскай літаратуры, аднак у часе свайго выступленьня ў Парыжы сказаў: „На беларускай мове, якую называюць „русінскай" альбо „літоўска-русінскай" (...) размаўляюць каля дзесяці мільёнаў чалавек; гэта самая чыстая гаворка, якая ўзьнікла даўно й выдатна распрацаваная". А польскі публіцыст Леон Васілеўскі заўважае: „Польскія рамантыкі (Чачот, Зан, Адынец і, найперш, Адам Міцкевіч) поўнай жменяй чэрпалі са скарбніцы беларускай народнай паэзіі. Сярод польскай моладзі ў Віленскім універсытэце беларускія песьні карысталіся вялікай папулярнасьцю. Захавалася памяць, напрыклад, аб тым, што ўлюбёнай песьняй Адама Міцкевіча была беларуская „Ой, ляцела цяцера ды цераз лес" („Бялорусь і Літва", Кракаў 1912).

У Вільні часоў Міцкевіча сярод членаў студэнцкіх арганізацыяў „філяматаў" і „філярэтаў" было шмат выхадцаў зь Беларусі: згаданы ўжо А. Міцкевіч і Я. Чачот з Наваградчыны, Т. Зан зь Меншчыны, А. Адынец з Ашмяншчыны, І. Дамейка зь Віцебшчыны ды інш. Яны зьбіралі беларускі фальклёр, у сваіх творах услаўлялі Беларусь. Філяматы на сваіх патаемных зборках часта размаўлялі паміж сабою па-беларуску. На дзень народзінаў А. Міцкевіча Т. Зан павіншаваў яго па-беларуску.

Беларускай мовай карысталіся і йншыя студэнты, аднак хаця яны й мелі сымпатыі да беларускай (фактычна: іхнай роднай) культуры й марылі пра аднаўленьне Вялікага Княства Літоўскага, працавалі яны на карысьць польскай або расейскай культур. Шмат хто зь іх упісаў свае прозьвішчы ў гісторыю ды культуру нашых суседзяў, іншыя-ж былі абы-

дзены моўчкі. Як піша дасьледчык С. Васілёнак, „яўным непаразуменьнем зьяўляецца замоўчваньне творчасьці такіх пісьменьнікаў як Ян Аношка, Януар Філіповіч, Пётр Мялешка, Тадэвуш Лада-Заблоцкі ды шмат іншых паэтаў, празаікаў, публіцыстаў канца XVIII пачатку XIX ст.ст. толькі таму, што яны друкавалі свае творы пра жыцьцё, побыт беларускага народу на польскай мове. Абсурднасьць гэтага відавочнага факту робіцца яшчэ больш відавочнай, калі даведваемся, што іхныя ймёны абыдзены ў працах па гісторыі польскай літаратуры. Польскія літаратуразнаўцы лічылі гэтых пісьменьнікаў беларусамі, паколькі яны былі выхадцамі зь Беларусі, жылі й працавалі там і ўсёй тэматыкаю свае творчасьці былі зьвязаныя з жыцьцём, побытам і барацьбой беларускага народу. Але гэтыя пісьменьнікі да гэтага часу засталіся ня ўведзенымі і ў гістарычны нарыс беларусай літаратуры!" („Фольклор и литература Белоруссии", 1961, стар. 154-155)

Падобна да А. Калайдовіча і А. Міцкевіча пра беларускую мову пісаў акадэмік Расейскай Акдэміі Д. І. Языкаў (1773-1845): „Настоящий язык белорусский есть весьма любопытный, который наши учёные должны тщательно изучать потому, что он много объясняет в русских летописях и филологии нашего языка: его можно назвать отцом великороссийскому наречию. Это, вероятно, тот самый язык, которым говорили в Пскове, Новгороде при варягах. Устранённый благовременно от влияния монголизма и доселе не испытавший воздействия великороссийского наречия, он сохранил во многих отношениях свой старинный вид и характер и менее претерпел от формы польского языка, нежели думают" („Свабода" № 10, травень 1991 г.)

Аднак царскі ўрад не зьвяртаў увагі ні на беларускую мову, ні на беларускі народ. Адмысловым указам Мікалая І ад 18 ліпеня 1840 г. беларускія землі прынялі назоў „Северо-Западный край". Мікалай І назначыў новым міністрам асьветы Уварава. У разуменьні гэтага міністра прадметы геаграфіі й сучаснай гісторыі зьяўляліся небясьпечнымі для моладзі. Расейская імпэрыя на працягу свае гісторыі змагалася супраць фармаваньня нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў і ўкраінцаў, навязваючы ім сваю мову, як сродак абрусеньня.

У часе паўстаньня К. Каліноўскага „Мужыцкая праўда" пісала: „У нас, дзецюкі, адно вучаць у школах, каб ты знаў чытаць па-маскоўску, а то для таго, каб цябе зусім перарабілі на маскаля". Пасьля заняпаду паўстаньня беларуская прэса была забаронена віленскім губэрнатарам М. Мураўёвым. Былі фізычна зьнішчаны некаторыя ўдзельнікі паўстаньня, царская адміністрацыя ўзялася за абрусеньне беларусаў праз свае школы й царкву. За прыклад можа паслужыць сьведчаньне ўплывовага царскага чыноўніка, куратара Віленскай школьнай акругі Н. Карнілава, які ў 1864 г. так ахарактарызаваў ролю й задачу расейскай школы:

„Здешние училища, независимо от педагогического, имеют и важное политическое значение, как орудия противодействия местным, враждебным государству элементам, так и для образования народа во незыблемых началах веры и преданности престолу и отечеству". Такая „школа" ставіла сабе за мэту выхоўваць беларускіх дзяцей больш у палітычным духу, чым у асьветніцкім, каб як мага хутчэй зрусыфікаваць іх.

Нягледзячы на рэпрэсіі царскае ўлады, беларуская літаратура, хоць і стыхійна, жыла й разьвівалася. Найбольш вядомымі ў той час былі ананімныя творы „Вось цяпер які люд настаў", „Размова пана з хлопам", „Гутарка Данілы са Сьцяпанам" ды інш. У гэтых „гутарках" выказваліся нараканьні на цяжкі лёс, на несправядлівасьць уладаў, на прыгнёт, выказвалася надзея на палепшаньне свае долі. Пісаліся палітычныя сатыры, вершы, паэмы, якія распаўсюджваліся ў рукапісах, не падаючы прозьвішчаў.

Пра неспрыяльныя ўмовы для беларускай нацыянальна-культурнай работы тае пары згадвае ў сваёй капітальнай працы „Беларусы" (том 3, кн. 3, стар. 3) Яўхім Карскі: „Здавалася, мясцовай мове паложаны канец: галоўны сродак выяўленьня народнага духу быў адабраны. (...) Але (...) у тыя часы мала зьвярталі ўвагі на просты народ, які касьнеў у змроку невуцтва й жывіў сваё духовае жыцьцё толькі вуснай паэзіяй. А між тым, ён і быў корань, і аснова беларускай народнасьці; ён і аказаўся галоўным хавальнікам жывой гаворкі: у ім свабодна і незабруджана цякла крыніца жывой вады, якая ня высахла й да гэтага часу".

Удзельнік паўстаньня 1863 г., „бацька беларускай паэзіі" Франьцішак Багушэвіч пісаў у прадмове да „Дудкі беларускай": „Братцы мілыя, дзеці зямлі-маткі маёй! Вам, ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, ды і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя „мужыцкай" завуць, а завецца яна беларускай. (...) Я шмат гдзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў: і пераканаўся, што мова вашая ёсьць такая-ж людзкая і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая. (...) Яно добра, а нават і трэба знаць суседзкую мову, але найперш трэба знаць сваю. (...) Не пакідайце-ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі!"

Памагаў К. Каліноўскаму ў паўстаньні й В. Дунін-Марцінкевіч. Праседзеў ён амаль год у турме паводле абвінавачваньня ў пісаньні на беларускай мове рэвалюцыйных праклямацыяў. Блізкасьць пісьменьніка да народу й спачуваньне да яго, веданьне пануючых абставінаў прынесьлі пісьменьніку вялікую пашану сярод навакольнага сялянства. Творчасьць Дуніна-Марцінкевіча зацікавіла карэспандэнта „Газэты варшаўскай" і ён 23 чэрвеня 1855 г. пісаў аб беларускай мове наступнае: „Пекная гэтая галіна славянскай мовы — гэты крывіцкі дыялект — і старая. Бо гэта мова нашага Літоўскага Статуту й заканадаўства на працягу двух стагодзьдзяў — XVI і XVII. І пашыраная. Бо сьмела можна сказаць, што на ёй размаўлялі тры чвэрці Літвы, народ, шляхта й паны. Сёньня мова, пазбаўленая пісьмовага значэньня, засталася толькі роднай памяткай сялянскіх хатаў".

Аднак на творы Дуніна-Марцінкевіча, якія ён пісаў па-беларуску, адзываліся крытычныя галасы палякаў і расейцаў, якія ўважалі Беларусь за сваю правінцыю, і папракалі пісьменьніка за ягоную мову. Марцінкевіч адказаў ім: „Жывучы сярод люду, які размаўляе па-беларуску, прасякнуты ягоным ладам думак, марачы аб долі гэтага братняга народу, анямеўшага ў маленстве ад невуцтва й цемнаты, выраШыў я для заахвочваньня яго да асьветы ў духу ягоных звычаяў, паданьняў і разумовых здольнасьцяў пісаць на ягонай уласнай гаворцы" (В. І. Дунін-Марцінкевіч, „Збор твораў", Мінск 1958, стар. 416).

(„Рунь" № 51-54, 56, Вільня, 11 чэрвеня 2003 г. — 31 траўня 2004 г.)

За цаной не пастаім...

1. Пачатак вайны й дапамога аліянтаў

Камунізм Сталіна й нацызм Гітлера — гэта дзьве найбольш дыктатарскія сыстэмы дзяржаўнага кіраўніцтва. Два дыктатары, якія былі непрымірымымі ворагамі, да пэўнага часу й пад прыкрыцьцём, нібыта іх аб'ядноўвае сацыялізм, супрацоўнічалі між сабою. Калі-ж Гітлер у чэрвені 1941 г., апярэдзіўшы Сталіна, нечакана напаў на Савецкі Саюз, дык камуністы, пабачыўшы свае велізарныя людзкія, матэрыяльныя ды тэрытарыяльныя страты, пачалі ўздымаць патрыятызм і баявы дух народаў СССР і заклікаць іх на барацьбу супраць агрэсара. Аднак, якім быў тадышні патрыятызм і баявы дух г.зв. „савецкага народу", можа сказаць толькі той, хто жыў у той час і бачыў пачатак вайны, бачыў уцякаючых савецкіх байцоў і вязьняў, што з клункамі вярталіся дамоў, чуў, што яны гаварылі.

Напэўна Сталін адчуваў сябе вінаватым за катастрафічны для савецкага камуністычнага рэжыму пачатак вайны й гатовы быў панесьці адказнасьць за свой залішні давер да Гітлера й недаацэнку тых перасьцярогаў аб часе нападу гітлераўскіх войскаў, якія ён прайгнараваў. Таму першымі днямі вайны Сталін сядзеў на сваёй дачы ў Кунцаве пад Масквой і чакаў, што яго прыйдуць арыштаваць. Аднак Палітбюро яго не арыштавала й паклікала да работы. Тады Сталін апрытомнеў і 3 ліпеня (пасьля 11 дзён ад пачатку вайны!) зьвярнуўся па радыё да народу са зваротам „Браты й сёстры!", заклікаючы яго ўсё нішчыць, нічога не пакідаць ворагу ды йсьці ў партызаны.

Але ці ўсе людзі маглі йсьці ў лес? Хто меў глядзець за старымі, малымі, хворымі, за гаспадаркай, каб пракарміць сябе, сям'ю й тых самых партызанаў Сталіна? Пра гэтае ў сваім звароце Сталін не казаў. Ён, як і ягоны папярэднік Ленін у часе рэвалюцыі ды грамадзянскай вайны, загадаў паліць і нішчыць усё, што нельга было ўзяць з сабой. Ды што значыў гэты заклік Сталіна для безабароннага мірнага насельніцтва, пакінутага на волю лёсу ганебна адступаючай Чырвонай Арміяй, якая ў першыя два месяцы ад пачатку

баявых дзеяньняў апынулася ажно пад Масквой? Падабалася каму ці не, але ў крытычнай сытуацыі дзеля захаваньня сваіх штодзённых інтарэсаў народ на акупаваных тэрыторыях мусіў супрацоўнічаць з акупантам. Як піша Алесь Петрашкевіч, „у апошнюю ўсенародную вайну Расея, а ніхто іншы, кінула нас пад ногі гітлераўскім зграям, у выніку чаго мой народ заплаціў за сваё выжываньне кожным трэцім жыцьцём. Трэцім, а не чацьвёртым, як да гэтага часу сцьвярджае афіцыйная прапаганда, паказваючы наш савецкі патрыятызм" („Народная воля" № 160, верасень 1998 г.).

Працягваючы палітыку Леніна, Сталін у часе калектывізацыі пазбавіў мільёны людзей роднай хаты, уласнасьці, сям'і, жыцьця. Ён нішчыў нацыянальную сьведамасьць народаў СССР, ягоную інтэлігенцыю, зьнішчыў Царкву, выдатных камандзіраў. А калі грымнула бяда, пачаў успамінаць царскіх палкаводцаў і сьвятых: Аляксандра Неўскага, Дзьмітрыя Данскога, Суворава ды іншых расейскіх патрыётаў. Аднак галоўныя памылкі „мудрай палітыкі таварыша Сталіна" былі відавочныя: Чырвоная Армія без аглядкі бегла на ўсход або практычна бяз бою здавалася ў палон. У другой палове 1941 г. НКУС паведамляў, што ў радох савецкіх жаўнераў пашыранае п'янства, паніка, сьвядомыя самараненьні. Вінаватых або расстрэльвалі перад палком, або адсылалі ў штрафныя батальёны. Гэта яшчэ больш дэзарганізоўвала армію. Як падаюць немцы, толькі за апошнія 6 месацаў 1942 г. перайшло да іх 60 тыс. савецкіх жаўнераў.

Быў гэта сапраўды крытычны час для Сталіна. Паводле Джона й Карола Гарадсаў, „пытаньне стаяла працягваць вайну супраць немцаў ці не. (...) Жукаў казаў, што ён 7 кастрычніка быў сьведкам сытуацыі на Крамлі, калі Сталін загадаў Бэрыі знайсьці г.зв. „Берасьцейскі мір", які быў заключаны зь немцамі ў 1918 г. Сталін хацеў міру за ўсякую цану. Як кажа Жукаў, ён быў гатовы аддаць Балтыйскія краіны, Беларусь і частку Ўкраіны" („Ворльд вор энд Совет піпл", стар. 19).

Перад нападам Гітлера Сталін дапамагаў яму гаспадарча й палітычна ў вайне супраць Вялікабрытаніі й Францыі. Молатаў заяўляў, што абсурдна ваяваць супраць гітлерызму ў імя дэмакратыі. Сталін, падзяліўшы з Гітлерам Эўропу на сфэры ўплыву, напаў на Польшчу, на Фінляндыю,

захапіў частку Бэсарабіі й Балтыйскія краіны. І вось 3 ліпеня 1941 г. Сталін загаварыў раптам як „дэмакрат":

„У гэтай вызваленчай вайне мы будзем мець верных саюзнікаў у асобе народаў Эўропы й Амэрыкі". А ўжо 12 ліпеня ён пісаў Чэрчылю й прасіў яго адкрыць фронт у паўночнай Францыі. Калі Гары Гопкінс, асабісты пасланьнік Рузвэльта, напрыканцы ліпеня таго-ж 1941 г. абгаворваў са Сталіным сытуацыю, што склалася на фронце, дык апошні перадаў яму даўжэзны сьпіс, у якім сярод іншых рэчаў была просьба прыслаць 20 тыс. зэнітных гарматаў. 3 верасьня Сталін зноў прасіў Чэрчыля адкрыць другі фронт ды прысылаць штомесячна 30 тыс. тонаў алюмінію, 400 самалётаў і 500 танкаў. Пры гэтым Сталін зазначаў, што бяз гэтай дапамогі Савецкі Саюз можа быць пабіты або аслаблены да таго, што ня будзе здольны дапамагчы саюзьнікам. 13 кастрычніка Сталін прапанаваў Вялікабрытаніі высадзіць у Архангельску або на поўдні Расеі (праз Іран) 25-30 дывізіяў дзеля супольных апэрацыяў на савецкай зямлі.

Ні брытанцы, ні амэрыканцы не маглі ў той час адкрыць новага фронту. Аднак яны пачалі аказваць СССР ваенную ды гаспадарчую дапамогу. Адна толькі дапамога ЗША ў 1942 г. складала 100 млн. даляраў штомесячна, а ў наступным годзе ўзрасла да 250 млн. даляраў штомесячна й заставалася такой да канца 1944 г. Як падаюць Майкл Бэльлер і Аляксандар Некрыч, за час вайны аліянты паставілі ў Савецкі Саюз 18 700 самалётаў, 10 800 танкаў, 9 600 гарматаў, 401 000 транспартных машынаў, 2 590 000 тонаў паліва, 172 000 тон дроту й кабеля, 1 800 паравозаў, 11 300 вагонаў („Утопія ін Вор", Лёндан 1986, стар. 411-412). Для жаўнераў Чырвонай Арміі Англія паставіла 3 млн. параў ботаў, больш за 1 млн. мэтраў тканіны на абмуньдзіраваньне, мэдыкамэнты, розныя мэдыцынскія прылады ды шмат што іншае.

Амэрыка, Брытанія, Канада, Аўстралія слалі ў СССР зброю, тэхніку, прадукты харчаваньня й важныя рэчы, якіх там не было, а калі й было, дык вельмі мала. Праз гэтую дапамогу Брытанія страціла 104 гандлёвыя й 22 ваенныя караблі й сотні маракоў, якія загінулі ад нямецкіх падводных лодак і самалётаў, што мелі свае базы ў Нарвэгіі. І па вайне вялікую дапамогу зруйнаваным вайною краінам, у тым

ліку й СССР, аказаў „плян Маршаля". (Гаворка йдзе пра заходнюю дапамогу краінам, якія былі пад нямецкай акупацыяй і праз тэрыторыю якіх два разы праходзіў фронт).

У часе Тэгеранскай канфэрэнцыі (1943 г.) Сталін прызнаў сваё цяжкое становішча й тое, што без амэрыканскае дапамогі цяжка было-б выйграць вайну. Нават у 1945 г. Сталін пісаў прэзыдэнту Трумэну, што амэрыканская дапамога „Лэнд Ліс" адыграла важную ролю й у пэўнай ступені спрычынілася да памыснага заканчэньня вайны. Найлепшым сьведчаньнем важнасьці амэрыканскай дапамогі для станоўчых вынікаў вайны могуць паслужыць і словы маршала Г. Жукава: „Амэрыканцы забясьпечылі нас шматлікімі матэрыяламі, безь якіх мы не маглі-б стварыць нашых рэзэрваў, не былі-б здольныя працягваць вайну. (...) Мы ня мелі выбуховых рэчываў. Не было нічога, каб запоўніць патроны вінтовак. Сапраўды, амэрыканцы ўратавалі нас выбуховымі рэчывамі. А колькі гэта сталі яны прыслалі нам! Ці маглі-б мы прадукаваць танкі, каб не было гэтае амэрыканскае сталі?" („Ды Джорнал оф Славік Міністры Стадыс", т. 9, № 1, сакавік 1966).

Аднак у хуткім часе пасьля таго, як „гарачая" вайна скончылася перамогай аліянтаў ды распачалася вайна „халодная", у Савецкім Саюзе пачалі гаварыць і пісаць нешта зусім іншае. Так у „Гісторыі БССР" (т. II, 1958, стар. 361) чытаем: „Правячыя колы ЗША й Англіі дапамагалі Германіі ўзьняць яе ваенна-эканамічны патэнцыял, даўшы для гэтага велізарныя пазыкі. Усё гэта рабілася з мэтай накіраваць фашысцкую агрэсію супраць Савецкага Саюзу. Імпэрыялісты хацелі з дапамогай гітлераўскай Германіі зьнішчыць савецкую сацыялістычную дзяржаву". А яшчэ раней, у 1953 г. (як падае Мацью П. Галагер) палкоўнік М. Талчэнаў так патрактаваў дапамогу аліянтаў Савецкаму Саюзу: „Вялікая колькасьць транспартных караблёў, якія плылі ў СССР, была затопленая. Гэта сталася таму, што ангельскае марское камандаваньне сьвядома паведамляла немцам (!) час адплыву канвояў і маршрут, па якім яны будуць плысьці. (...) Кіруючыя колы ЗША й Англіі выкарыстоўвалі дэструкцыю транспарту, каб „даказаць", што дастаўка караблямі тавараў у СССР зьвязаная зь вялікай небясьпе-

кай і на гэтай падставе абрэзаць свае й так мізэрныя пастаўкі" („Ды Совет Гісторы оф Ворльд Вор II", стар. 50-31).

Што да апошняй сэнтэнцыі, дык усё тут „шыта белымі ніткамі", а што да першай, дык, як мы ўжо бачылі, ня „правячыя колы ЗША й Англіі дапамагалі Германіі ўзьняць яе ваенна-эканамічны патэнцыял", а таварыш Сталін заключыў з Гітлерам саюз і аж да самага нападу Нямеччыны на Савецкі Саюз дапамагаў ёй матэрыяльна й палітычна супраць Англіі ды Францыі. А ці-ж не заходнія краіны асьцерагалі Сталіна пра немінучы напад немцаў? Пра гэтае „Гісторыя БССР" маўчыць.

У сапраўднасьці аліянтам трэба было ўзброіць, абуць, накарміць Чырвоную Армію, пакуль яна сама змагла разгарнуць і разьвіць свой собскі ваенны промысел. Як паказала само жыцьцё, у Другой сусьветнай вайне галоўнымі фактарамі перамогі быў не людзкі патэнцыял, а ейная індустрыя й тэхналёгія.

Аднак пра калясальную дапамогу Савецкаму Саюзу з боку аліянтаў камуністы многа не гаварылі, не пісалі й амаль не гавораць цяпер. А ў Беларусі, пэўна, і дагэтуль у школах пераважна распавядаюць пра „партызанскую Беларусь" ды „рэйкавую вайну".

2. Страты

Каб асягнуць сваю мэту ўнівэрсальнай перамогі камунізму, Сталін дазволіў нішчыць сотні, тысячы й нават мільёны людзей, якія ня так хацелі, або ня так думалі, як думаў таварыш Сталін. Лэдзі Нансы Астор, якая была першай жанчынай у брытанскім парляманце, будучы ў Маскве ў сьнежні 1931 г., мела гонар спаткаць Сталіна. У часе іхнай размовы яна не пабаялася запытацца ў яго: „Як доўга ты будзеш забіваць людзей?" Перакладчык тут затрымаўся, але Сталіп загадаў перакласьці сказанае лэдзі Астор. І адказаў: „Працэс будзе доўжыцца датуль, пакуль ня будзе ўстаноўленае камуністычнае грамадзтва".

Згодна прапанове Леніна, у часе грамадзянскай вайны рэвалюцыі камуністы пачалі закладаць канцэнтрацыйныя лягеры для „неблаганадзейных", якіх за Сталіна налічвалася тысячы, а вязьняў — мільёны. Таксама й Гітлер, калі прыйшоў да ўлады ў 1933 г., у тым самым годзе залажыў

два канцэнтрацыйныя лягеры, у Араненбургу й Дахаў. А на пачатку Другой Сусьветнай вайны ў 1939 г. нацысты мелі ўжо 6 такіх лягероў, дзе сядзела 21 тыс. палітвязьняў.

Другая Сусьветная вайна была вайною агрэсараў, вайною, якая мела зьнішчыць існуючыя сыстэмы дзяржаўнага ладу й нават некаторыя народы, якія па тых ці іншых прычынах не адпавядалі ім.

Варта згадаць, што ў апошняй вайне Савецкі Саюз пацярпеў найбольшыя страты ў людзях. Першую ацэнку стратаў СССР у Вялікай Айчыннай вайне даў Сталін у размове з карэспандэнтам „Праўды" ў 1946 г. Тады ён сказаў, што СССР страціў каля 7 млн. чалавек. Аднак такі лік ёсьць далёкі ад праўды. Камуністы хавалі свае калясальныя страты нерад народам.

Агулам прынята лічыць, што людзкія страты СССР у апошняй вайне складаюць 10 млн. вайскоўцаў і такую самую колькасьць цывільных, разам — 20 млн. чалавек. Але Л. Брэжнеў аднойчы абмовіўся: „Больш за 20 млн. душ". Узьнікае пытаньне, наколькі больш?

Савецкі палкоўнік К. Клімаў, які перайшоў на Захад, пісаў у кніжцы „Советские маршалы имеют слово", што савецкая армія ў вайне супраць немцаў страціла 8,5 млн. забітымі, 2,5 млн. памерла ад ранаў, 2,6 млн. памерла ў лягерох для ваеннапалонных. Аднак такой лічбы няма ў савецкіх архівах. Ды некаторыя заходнія дасьледчыкі прынялі даныя Клімава за блізкія да праўды.

Прычынай вялікіх людзкіх стратаў у савецкай арміі ёсьць той факт, што шмат людзей пасылалі на фронт без ніякае баявой падрыхтоўкі. Такіх людзей у першым-жа баі ахопліваў страх, паніка, за якімі йшлі ўцёкі й немінучая сьмерць. Камандзір зьвязу В. Дзятлаў распавядае пра гэткі эпізод на Беларускім фронце ў 1943 г.:

„Ланцуг людзей у цывільнай вопратцы праходзіў уздоўж акопаў.

— Славяне, хто вы й скуль паходзіце?

— Мы з Арлоўшчыны, падмацаваньне.

— Што за падмацаваньне ў цывільнай вопратцы й безь вінтовак?

— Нам загадалі дастаць вінтоўкі ў баі".

На дэмаграфічнай статыстыцы СССР як за ваенны, так і за пасьляваенны пэрыяд стаяў грыф „Сакрэтна". І толькі ў часе гарбачоўскай адлігі ўдалося зазірнуць у сакрэтныя даныя. Пасьля карпатлівых падлікаў атрымалася лічба 26,6 млн. людзкіх ахвяраў у часе Вялікай Айчыннай вайны.

За няпоўныя 6 гадоў вайны, якую немцы вялі ў Эўропе, Афрыцы й на моры, яны страцілі 3,5 млн. вайскоўцаў і 780 тыс. цывільных, большасьць якіх загінула ў часе паветраных налётаў саюзьнікаў на нямецкія гарады й прамысловыя аб'екты. Аднак Б. Сокалаў падае, што страты немцаў большыя й складаюць агулам 5,95 млн., што ў 7,3 разы менш за савецкія страты (Сокалаў лічыць, што Савецкі Саюз страціў падчас апошняй вайны 43,5 млн. чалавек). Як бачна, нямецкія страты ў людзях у параўнаньні з савецкімі ёсьць не такія вялікія, асабліва, калі ўзяць пад увагу, што СССР пачаў вайну на амаль два гады пазьней за немцаў і ваяваў толькі на адным фронце. Сталін хлусіў, калі 7 лістапада 1941 г. гаварыў на Чырвонай плошчы, што за 4 месяцы вайны Нямеччына страціла 4,5 млн. жаўнераў.

Праз увесь час вайны Вялікабрытанія са сваёй садружнасьцю, распачаўшы вайну ў верасьні 1939 г. і ваюючы ў Эўропе, Афрыцы, Азіі й на акіянах, страціла 542 200 жаўнераў і 92 673 цывільных, зь якіх 61 000 загінула ў выніку паветраных налётаў немцаў.

Францыя страціла 250 тыс. вайскоўцаў і 350 тыс. цывільных, Польшча — 120 тыс. жаўнераў і 5,3 млн. цывільных, Югаславія — 300 тыс. жаўнераў і 1,33 млн. цывільных. За няцэлыя 4 гады вайны ЗША страцілі 295 тыс. жаўнераў і ніводнага цывільнага. Тут трэба адзначыць, што амэрыканцы ваявалі зь японцамі на астравох Ціхага акіяну, а таксама зь немцамі ў Афрыцы й Эўропе. Японія страціла 1,5 млн. жаўнераў, Італія — 410 тыс. жаўнераў.

Такім чынам, за ўсю Другую Сусьветную вайну саюзьнікі Савецкага Саюзу страцілі забітымі 1 397 200 жаўнераў. У гэты лік не ўваходзяць людзкія страты тых дзяржаваў, што былі саюзьнікамі аліянтаў, але былі акупаваныя немцамі. Што праўда, нельга сказаць, каб гэты лік быў зусім дакладны, бо ў вайну шмат людзей прападае бяз весьці або знаходзіцца за мяжой.

Пра людзкія страты Савецкага Саюзу мы даведваемся больш па вайне. Тут трэба ўлічваць ня толькі байцоў, забітых ворагам на фронце, але й забітых сваімі. Пра гэта згадвае акадэмік, дарадца прэзыдэнта Акадэміі навук Беларусі А. Махнач:

„«Штрафбаты» замянілі «дысбаты» мірнага часу. Тут не лічыліся з жыццём жаўнераў. Гэтыя батальёны накіроўваліся на самыя небясьпечныя ўчасткі, на штурмы, пад прыцэльны агонь праціўніка. Нават калі ў гэтым не было неабходнасьці. Проста зьнішчалі людзей, якія ў чымсьці, нясхай і ў нязначным, правінаваціліся. Загладзіць віну можна было адно сьмерцю або раненьнем.

На фроньце дзейнічалі г. зв. «заградатрады» — спэцслужбы НКУС. Падчас адступленьня нашых войскаў яны білі па сваіх. Наперадзе — вораг, ззаду, выходзіць, другі. Выйсьце — сьмерць. Ці патрэбная была гэткая крайняя мера? Думаю, не. Гэта кашчунства" („Мы и время", № 5, 1994 г.).

А былі яшчэ загады: № 270, які забараняў жаўнеру Чырвонай Арміі здавацца ў палон, і № 227, які забараняў адступаць, нават часова — загад „Ни шагу назад!". Апошні загад Сталіна даваў немцам магчымасьць акружаць і браць у палон сотні тысячаў чырвонаармейцаў.

Прыклад, як цанілася жыццьцё савецкіх жаўнераў у часе вайны, падаюць Васіль Кушнер і Якаў Паўлаў:

„Генэрал М. Антоненка, намесьнік камандуючага 1-ым Беларускім фронтам забясьпечаньня тылу, у 1985 г. на навуковай канфэрэнцыі з гонарам заявіў, што падчас Бэрлінскай апэрацыі ягонаму ведамству ўдалося «зьберагчы» вялікую колькасьць артылерыйскіх снарадаў. І гэта пры 100-тысячных людзкіх стратах у гэтай апэрацыі! Каму й для каго патрэбная гэткая «эканомія»?" („Беларускі гістарычны часопіс", № 2, 1994 г.).

Як падае ангельская газэта „Гардыян" за 22.01.1993 г., паводле даных Інстытуту расейскай ваеннай гісторыі пад Сталінградам было расстраляна найменш 13 500 байцоў за дэзэрцірства й здраду. Калі так, дык колькі тады байцоў загінула падчас абароны Сталінграду? А Сталін казаў Чэрчылю ў Тэгеране, што ў Чырвонай Арміі кожны жаўнер хоча быць героем, а не забітым.

У кожнай вайне былі героі, трусьліўцы, дэзэрціры, здраднікі й г.д. І хлусіць „Гісторыя БССР" (т. II, Мінск, 1958 г.), пішучы:

„Маральны стан савецкай арміі ў гады вайны вызначаўся выключна высокім узроўнем. Савецкія воіны ведалі, што вядуць справядлівую вызваленчую вайну за свабоду й незалежнасьць сваёй Айчыны. Усьведамленьне высакароднай мэты вайны нараджала масавы гераізм, гатоўнасьць ісьці на ахвяры дзеля перамогі над ворагам. (...)

Зьнешняя палітыка СССР згуртавала вакол Савецкага Саюзу ўсе прагрэсіўныя сілы, сарвала спробу сусьветнай рэакцыі стварыць супраць савецкай краіны адзіны фронт імпэрыялістычных дзяржаваў".

Хто-ж, як ня гэты „фронт імпэрыялістычных дзяржаваў" уратаваў Савецкі Саюз ад немінучай катастрофы, аказаў у першых месяцах савецка-нямецкай вайны Савецкаму Саюзу на просьбу Сталіна мілітарную й гаспадарчую дапамогу? Дый што гэта быў за „гераізм", калі ззаду стаялі спецслужбы, якія стралялі ў сваіх?

Цяжка паверыць некаторым савецкім аўтарам, што захопнікі зьнішчылі ў Беларусі больш за 2 млн. грамадзянаў. У час адступленьня на Ўсход у чэрвені 1941 г. воргаы НКУС расстрэльвалі вязьняў у турмах і забівалі на дарозе тых; хто ня меў сілы йсьці далей. А савецкія партызаны тым часам палілі беларускія вёскі й забівалі сялянаў і беларускую інтэлігенцыю, якая працавала ў сваёй адміністрацыі й школьніцтве.

Ня трэба думаць і пісаць, што немцы, прыйшоўшы ў Беларусь, без дай прычыны нішчылі цывільнае насельніцтва. Калі й былі ахвяры сярод простых людзей, дык найбольш праз сьвядомую правакацыю сталінскіх партызанаў, каб пасьля мець нагоду гаварыць і пісаць пра зьверствы фашыстаў. Ня лепшымі за фашыстаў былі й байцы Чырвонай Арміі, калі яна ўвайшла на нямецкую тэрыторыю.

3. На заканчэньне

Вайна прынесла Савецкаму Саюзу вялікія людзкія страты. Пра гэтыя страты сьведчыць той ускосны факт, што на 22 чэрвеня 1941 г. у СССР налічвалася 209,3 млн. жыхароў, а на 1 студзеня 1946 г. — 167 млн. Гэтыя калясальныя стра-

ты, больш за 42 млн., камуністы хавалі, дакладнага ліку стратаў не падавалі, пра дапамогу саюзнікаў маўчалі, а толькі гаварылі: „Мы победили!", „Мы за ценой не постоим!"

А колькі-ж гэта мільёнаў людзей панесьлі пакутніцкую сьмерць, жывучы ў „братнім саюзе народаў СССР"? Як падае Ёнатан Гловэр, „за 70 гадоў пасьля 1917 г. савецкі рэжым фізычна зьнішчыў 61 911 000 людзей" („Гуманіты", Лёндан 1999).

Самае важнае ў сьвеце — гэта жыцьцё чалавека. Але паводзіны некаторых людзей паказвавюць, што яны не падзяляюць поглядаў на жыцьцё другіх людзей і сьвядома спрычыняюцца да іхняй заўчаснай сьмерці,

Як у Першай, так і ў Другой Сусьветнай вайне маса людзей камандзірамі арміяў была паслана на яўную сьмерць зусім непатрэбна. Часта перамога ці паражэньне ў баі нічога не рашала са стратэгічнага пункту гледжаньня, а людзі гінулі дзесяткамі й сотнямі тысяч толькі дзеля кар'еры й славы ваенных камандзіраў.

Гэнацыд XX стагодзьдзя плянамерна зьнішчаў нацыянальныя, расавыя, палітычныя, этнічныя й рэлігійныя групы. Людзей мучылі ў турмах, лягерох, мардавалі, стралялі й труцілі ў газавых камерах. У Руандзе ў 1994 годзе было забітых 800 000 чалавек пад уплывам прапаганды й нянавісьці мясцовага насельніцтва. У сярэднім за дзень забівалі там 8 000 чалавек. Многа людзей загінула ў вайне ў Афганістане й многа людзей гіне ў Іраку. У гэтых войнах дамінуюць ня так палітычныя й эканамічныя праблемы, як рэлігійная супрэмацыя, дзе людзі сьвядома й фанатычна ідуць на сьмерць у імя Алаха. І як доўга гэта будзе трываць, цяжка сказаць.

(„Рунь" № 40-41, Вільня, 23 траўня — 13 жніўня 2001 г.)

У савецкіх рэспубліках фэрмэнт

У сувязі з галоснасьцю й перабудовай у пятнаццаці савецкіх рэспубліках пачаўся небывалы рух. Рух гэты стаўся вынікам шматгадовай палітыкі Камуністычнай партыі Савецкага Саюзу й яе Цэнтральнага Камітэту, які рашаў усе нацыянальныя й дзяржаўныя справы бяз веды й згоды народаў свае імпэрыі. Часам граніцы паміж народамі рэспуб-

лік і другімі суседнімі дзяржавамі праводзіліся не па этнічным прынцыпе, але палітычна рэзалася жывое цела народу й аддавалася яго часам ворагу. За такі прыклад можа паслужыць Беларусь, якую крамлёўскія лідэры абрэзалі з усіх бакоў.

Як ведама, Балтыйскія краіны атрымалі сваю дзяржаўную незалежнасьць зараз пасьля Першай Сусьветнай вайны, якіх прызнаў нават Ленін. Але ў 1940 годзе яны былі захоплены Чырвонай Арміяй без дай прычыны. Цяпер у гэтых рэспубліках пачаўся рух за сваю дзяржаўную незалежнасьць.

Горш выглядаюць справы народаў Цэнтральнай Азіі й Каўказу. Там пачалася людзкая трагедыя. Больш за сто людзей загінула толькі ў чэрвені гэтага году ў этнічных замешках у Казахстане, Узбэкістане й Таджыкістане. У Грузіі найменш 19 асоб былі забіты савецкімі жаўнерамі. Ніхто ня ведае колькі забітых было ў Азербайджане ў канфлікце азербайджанцаў з армянамі. І такі стан рэчаў прадаўжаецца.

На гарызонце Савецкага Саюзу зарысоўваецца паважная небясьпека. Этнічныя беспарадкі, сказаў прэзыдэнт Гарбачоў 1 ліпеня гэтага году, могуць адмоўна адбіцца на ходзе перабудовы й будучыні дзяржавы. Павінны быць прыняты меры супраць людзей, якія выклікаюць нацыянальны антаганізм і дамагаюцца зьмены граніцаў.

У чэрвені гэтага году Андрэй Сахараў, у сваёй прамове ў Лёндане, згадаў вялікую небясьпеку, якая пагражае Савецкаму Саюзу з боку нацыянальных меншасьцяў. Сахараў гаварыў аб Савецкім Саюзе як аб „апошняй каляніяльнай імпэрыі ў сьвеце".

Рэч зразумелая, што такія падзеі ў краіне савецкі ўрад ня можа талераваць і, як падае газэта „Сандэй Таймс" (2 ліпеня 1989 году), прэзыдэнт Гарбачоў прапанаваў чатыры варункі:

1. Кожнаму грамадзяніну павінны быць загарантаваны правы згодна Савецкай Канстытуцыі.

2. Этнічным групам павінна быць дазволена разьвіцьцё свае мовы й культуры.

3. Неабходна ўвесьці радыкальныя рэформы ў палітычную й эканамічную сыстэму рэспублік.

4. Члены камуністычнай партыі й інтэлігенцыя павінны прылажыць стараньні, каб ахаладзіць узбуджаныя настроі.

Але намеры некаторых рэспублік выступіць з Саюзу, — сказаў прэзыдэнт, — гэта справа выключана. А 72 артыкул савецкай канстытуцыі дазваляе рэспубліцы выйсьці з саюзу.

(„Голас Часу" № 1, Лёндан 1989 г.)

Далёкая дарога да згоды

Заходнія дзяржавы ўступілі ў Другую Сусьветную вайну супраць Гітлера ў імя цывілізацыі, дэмакратыі й свабоды, але галоўным пераможцам у гэтай вайне аказаўся Сталін, які быў, бадай, горшым дыктатарам і злачынцам за Гітлера.

Ведаючы злачынствы Сталіна ў краі, ягоны саюз з Гітлерам і аказаную яму матэрыяльную і прапагандысцкую падтрымку ў вайне супраць Вялікабрытаніі й Францыі, заходнія дзяржавы аднак, калі Гітлер напаў на СССР, аказалі яму ўсебаковую мілітарную і гаспадарчую дапамогу, без якой Савецкі Саюз чакала-б непазьбежная катастрофа.

Вайна аліянтаў зь немцамі была выйграная на полі бою, але прайграная за канфэрэнцыйнымі сталамі. Сталін перахітрыў Рузвэльта і Чэрчыля. Гэта заўважылі ў канцы вайны некаторыя палітыкі й генэралы на Захадзе. Пачуліся такія галасы, каб узброіць Вэрмахт і накіраваць яго супраць Чырвонай Арміі, і замест атамных бомбаў на Хірасіму і Нагасакі, скінуць іх на Расею.

Але заходнія мужы, выдатна ведаючы пра злачынствы Сталіна, аддалі яму Балтыйскія дзяржавы, Польшчу, Мадзьяршыну, Чэхаславаччыну, Румынію, Балгарыю і Ўсходнюю Нямеччыну амаль на паўвекавую няволю.

Нядаўна дзяржавы-пераможцы сьвяткавалі 60-ю гадавіну свае перамогі над фашызмам. Каб пазьбегнуць такіх войнаў у будучым была створаная Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў (ААН), у якую ўвайшла ў той час 51 краіна сьвету, а сярод іх і Беларусь, як заснавальніца гэтай арганізацыі.

Ці за гэтыя 60 гадоў была дасягнутая шляхотная ідэя міру, якую ААН сабе паставіла? Факты кажуць, што не. Нацыі не шукаюць сапраўдных сяброўскіх адносінаў, а больш цікавяцца самавызначэньнем. У канцы XX стагодзьдзя наступіў распад Савецкага Саюзу, быў развалены

Бэрлінскі мур, спыніла сваю дзейнасьць Югаслаўская Фэдэрацыя, пачалося збройнае змаганьне Расеі з Чачнёю, вайна ў Іраку і на Блізкім Усходзе.

На міжнародных спатканьнях гэтыя пытаньні парушаліся. Так, напрыклад, у 2000 годзе ў Нью Ёрку пад кіраўніцтвам ААН адбыўся саміт тысячагодзьдзя за мір ва ўсім сьвеце. На ім прысутнічала больш за тысячу рэлігійных дзеячоў. Аднак нават яны, бачачы сваіх праціўнікаў, паказалі няздольнасьць прыйсьці да згоды.

У лістападзе 2003 году на саміце Азіяцка-Ціхаакіянскага эканамічнага супрацоўніцтва (АЦЭС), які праходзіў у Тайляньдзе, і на якім прысутнічалі прадстаўнікі з 21 краіны, дзяржавы-ўдзельніцы ўзялі на сябе абавязак змагацца з тэрарыстычнымі групамі, каб такім чынам павысіць узровень міжнароднай бясьпекі. Але і тут гучалі галасы незадавальненьня супраць жыдоў.

Некаторыя палітыкі кажуць, што галоўнаю прычынаю непаразуменьняў на сьвеце зьяўляецца сёньня нацыянальнае пытаньне, дзе прыгнечаныя народы дамагаюцца свайго сувэрэнітэту. Сёньня дамінуючыя краіны ня хочуць ісьці на ўступкі гэтым прыгнечаным народам дзеля сваіх карысьлівых інтарэсаў.

Напрыклад, у Эўрапейскім Зьвязе (ЭЗ) у газэце „International Herald Tribune" было сказана: „Суперніцтва і недавер зьяўляюцца асноўнымі асаблівасьцямі эўрапейскай палітыкі. Большасьць краінаў-сябраў ЭЗ да гэтага часу лічыць немагчымым, каб адная з краінаў мела большы ўплыў і кіраўніцтва". Гэта наглядаецца сёньня ў Беларусі, над якою трымае палітычны й эканамічны кантроль Расея. У дадзены час Беларусь пазбаўленая сваёй сапраўднай дзяржаўнай і нацыянальнай незалежнасьці. Яна зьяўляецца чорнаю плямаю на мапе Эўропы".

Як раней, так і цяпер, Расея зьяўляецца галоўнаю прычынаю шматлікіх непаразуменьняў у былых савецкіх рэспубліках. Старая манія Масквы падбіваць суседнія народы і русыфікаваць іх яшчэ жыве. Нават у часы галоснасьці й перабудовы Гарбачова расейскія жыхары Эстоніі дамагаліся 14 сакавіка 1989 году забараніць у Эстоніі эстонскую мову, ачысьціць эстонскую камуністычную партыю ад на-

цыяналістаў і далучыць паўночна-ўсходнюю частку краіны са сталіцаю Талінам да Расейскай Фэдэрацыі.

Ня лепш выглядалі нацыянальныя й палітычныя справы ў іншых рэспубліках СССР пад кантролем Масквы, дзе да гэтага часу сядзяць, дзякуючы дыктатурам і фальшывым выбарам паслушныя лідэры „незалежных сувэрэнных дзяржаваў". Прэзыдэнт ЗША Джордж Буш падпісаў „Акт аб дэмакратыі ў Беларусі", які забараняе амэрыканскім урадавым установам выдаваць пазыкі, крэдыты ды іншую фінансавую падтрымку ўраду РБ. Выключэньне робіцца толькі для гуманітарнай дапамогі беларускім дэмакратычным партыям, няўрадавым арганізацыям. У законе ёсьць запіс, які абавязвае прэзыдэнта і Кангрэс ЗША шукаць саюзнікаў для палітыкі санкцыяў у дачыненьні да Беларусі.

Таксама некаторыя замежныя палітыкі на Захадзе Эўропы кажуць, што беларуская апазыцыя ў краі ёсьць слабая, каб магла сама змагацца з дыктатурай, ёй патрэбная падтрымка звонку.

Дзяржаўны сакратар ЗША Кандаліза Райс у гутарцы з журналістамі назвала Беларусь „апошняй дыктатурай у Цэнтральнай Эўропе і краінаю, якую немагчыма нікуды інтэграваць". Але за Беларусь заступіўся кіраўнік расейскага зьнешнепалітычнага ведамства Сяргей Лаўроў, сказаўшы, што „дэмакратычныя прынцыпы нельга разьвіваць звонку". Лаўроў, які спатыкаўся ў Вільні ў красавіку сёлета са сваімі калегамі з краінаў НАТО сказаў, што „мы, натуральна, нідзе ня станем падтрымоўваць тое, што называецца зьменаю ўлады". За гэта Лаўроў атрымаў падзяку А. Лукашэнкі.

Камісія па правох чалавека ААН прыняла вострую рэзалюцыю адносна Беларусі, а адзін з аўтараў гэтага дакумэнту, спэцдакладчык Адрыян Севярын заявіў, што „ў Беларусі парушаюцца практычна ўсе правы чалавека".

А кэгебіст У. Пуцін віншаваў Лукашэнку са „свабоднымі й дэмакратычнымі выбарамі" дэпутатаў у парлямэнт Беларусі. Гэтак зрабіў ён ва Ўкраіне, вітаючы В. Янукевіча з абраньнем прэзыдэнтам краіны. Але ў рэшце праўда перамагла, і ўкраінскі народ на сапраўды свабодных і дэмакратычных выбарах прэзыдэнтам Украіны абраў В. Юшчанку. Такую волю народу Лукашэнка назваў бандытызмам.

Пасьля Ўкраіны наглядаліся беспарадкі ў Кіргызстане і Ўзбэкістане з прычыны дыктатарскай і карупцыйнай улады сымпатыкаў Масквы. І трэба спадзявацца, што такія працэсы будуць прадаўжацца ў іншых краінах былога СССР да той пары, пакуль ня будзе ўсталяваная сапраўдная дэмакратыя без уплываў захопніцкай Масквы.

Так што на дарозе да сапраўднай дэмакратыі, свабоды й згоды ў Беларусі стаіць, як і стаяла стагодзьдзямі, злачынная Масква.

(„Беларус" № 510, ЗША, ліпень 2005 г.)

„Belarus"

У гутарцы карэспандэнта „Голасу Радзімы" (14 ліпеня1994 г.) Веранікі Чаркасавай з часовым павераным Злучаных Штатаў Амэрыкі ў Рэспубліцы Беларусь Джорджам Альбэртам Кролем, апошняму было пастаўлена такое прытаньне: „Ці памятаюць яшчэ ў Амэрыцы пра Чарнобыль? І ўвогуле, што там ведаюць пра Беларусь?"

На гэтыя пытаньні наступіў такі адказ: „Я думаю, што вы закранулі важнае пытаньне. Мне вельмі шкада, але амэрыканцы мала ведаюць аб чарнобыльскай трагедыі, аб тым, як пацярпела ваша рэспубліка. Таксама мне шкада, што ў Амэрыцы вельмі мала ведаюць пра Беларусь, яе людзей, гісторыю, культуру. Многія нават не ўяўляюць, дзе яна знаходзіцца. Не так даўно я пабываў дома, у маім штаце Нью-Джэрсі. Мае родныя й сябры пыталіся ў мяне: „Джордж, дзе ты працуеш? У Беларусі? А дзе гэта? Што гэта за краіна?" Вельмі рэдка ўспамінаецца яна ў друку. Пішуць больш пра Расею, Прыбалтыку, Украіну. На жаль, у Беларусі няма пастаянных прадстаўнікоў амэрыканскай прэсы, як у іншых рэспубліках".

Падобная сытуацыя наглядаецца й у Вялікабрытаніі й у шмат іншых краінах Заходняй Эўропы. Таму, відаць, нехта парупіўся ў ЗША выдаць невялікую кніжку на ангельскай мове пад назовам „Беларусь".

Будучы ў ангельскай бібліятэцы й шукаючы на паліцах адну гістарычную кніжку, я неспадзявана наткнуўся на „Беларусь" і быў ёю зьдзіўлены. Мне папала быць яе

першым чытачом. Узяў я гэтую „Беларусь" дамоў і з цікавасьцю прачытаў.

Спярша хачу сказаць, што тэхнічнае выкананьне — выдатнае. Фармат кніжкі крыху большы за звычайны, вокладкі цьвёрдыя, папера добрая, здымкі каляровыя. Так, што вонкавы выгляд кніжкі прыгожы.

Кніжка зьмяшчае павярхоўныя інфармацыі аб Беларусі, піша пра яе геаграфічнае месцазнаходжаньне, клімат, славянскае паходжаньне насельніцтва, веравызнаньне, гаспадарчае становішча, натуральныя багацьці, гісторыю, гарады, кантакты з Расеяй і т.п.

На 56 старонках са здымкамі многа ня можна напісаць аб Беларусі, але таго, што напісана, дастаткова, каб запазнаць чытача зь Беларусьсю, паказаць што гэтая краіна існуе больш за 1 000 гадоў, мае сваю гісторыю, культуру, мову, хоць яе гісторыя складалася на працягу стагодзьдзяў крытычна. Усё-ж нашым суседзям, палякам не ўдалося апалячыць беларусаў, а расейцам — зрусыфікаваць.

Напаткаў я адну недакладнасьць на 27 старонцы, дзе напісана: „У 13-ым стагодзьдзі, татарскі важака Бату Хан заваяваў Русь — княства, у якое ўваходзіла сучасная Беларусь".

Гэтая зацемка не адпавядае праўдзе. Беларусь не была заваявана татарамі, хоць празь яе тэрыторыю праходзілі татары. Нідзе не сказана ў гісторыі, каб Беларусь плаціла дань татарам, як гэта рабіла Расея. Не адзін раз зазналі татарскія полчышчы цяжкія паражэньні на Беларусі за свае наезды. Таксама на 46 старонцы зьмешчана карта Беларусі й там дзе павінен быць пазначаны Гомель, напісана Гродна, а там дзе павінна быць Гродна, памечана Гомель.

Бяручы агульна, кніжка „Беларусь" вельмі вартасны даведнік для тых чужынцаў, якія нічога ня чулі, або мала чулі пра Беларусь. Таму ініцыятарам, складальнікам і выдаўцам „Беларусі" належыць шчырая падзяка.

(„Голас Часу" № 31 (4), Лёндан, 1994 г.)

Беларусь хрысьціянская

Хрысьціянства на Беларусі

Польскі гісторык XVI стагодзьдзя Мацей Стрыйкоўскі гаворыць у хроніках: „Уладзімір Сьвятаславіч прыняў хрышчэньне ад мітрапаліта пасланага з Усходу патрыярхам, і з гэтага часу ўсе рускія народы, якія знаходзіліся ў Белай, Чорнай, усходняй, паўночнай і паўднёвай Русі, цьвёрда й непахісна сталі ў хрысьціянскай веры па абраду й законам грэцкім, пад вярхоўнай уладай Канстантынопальскага патрыярха".

Хрысьціянская вера на Белай і Чорнай Русі, як і на ўсёй Русі, мае свае раньнія пачаткі. Аб праніканьні хрысьціянства на Беларусь можа сьведчыць той факт, што праз яе тэрыторыю праходзіць вадападзел басэйнаў Балтыйскага й Чорнага мораў. Адны рэкі плывуць у Балтыйскае мора, а другія — у Чорнае. На гэтым вадападзеле рэк трэба было затрымоўвацца гандлярам і падарожнікам, каб перагрузіць свае тавары. Гэта давала магчымасьць мясцоваму насельніцтву спатыкаць розных людзей, гутарыць з імі й запазнацца зь іхнімі навыкамі. Такой гандлёвай дарогай пранікала на Беларусь хрысьціянства.

На гэтым водным шляху, як яго называлі „з варагаў у грэкі", недалёка Смаленску, у Гнёздаўскіх курганах знойдзена глінянае начыньне з кірылаўскімі літэрамі „гороуша" (гарчыца). Знойдзены там і манэты з пачатку X стагодзьдзя. Гэта сьведчыць аб тым, што кірылаўскі надпіс зьяўляецца доказам праніканьня на Беларусь Кірыла-Мяфодзіеўскага славянскага пісьменства, а зь ім і хрысьціянства. Другі прыклад — нацельны крыжык, як першы сьлед хрысьціянства, зной-

дзены ў мінулым стагодзьдзі каля Драгічына над Бугам. Крыжыкі такія сустракаліся ў IV-VI стагодзьдзях у Корсуні ў грэцкай калёніі на Крыме. А аб раньнім хрысьціянстве на Полаччыне гаворыць раскопка пажарышча з X — пачатку XI стагодзьдзя, на месцы якой узвышаецца Сафійскі сабор.

Хрысьціянства на Беларусі афіцыйна запачаткавала Рагнеда, дачка полацкага князя Рагвалода й сын яе князь Ізяслаў. Рагнеда была жонкай кіеўскага князя Уладзіміра Вялікага, які пасьля нарады са сваімі баярамі адпусьціў яе з сынам Ізяславам на родную Полаччыну. Пасяліліся яны сьпярша ў Ізаслаўлі (Заслаўі) — каля Менску.

Калі Ўладзімір прыняў хрысьціянства ў 987 годзе й жаніўся зь сястрой візантыйскага імпэратара, ён паслаў сваіх паслоў да Рагнеды ў Ізаслаўль, дзе яна жыла, каб сказалі ёй ад яго імя: „Аз убо ныне крещен есьми и приях веру и закон християнский; подобает мне едину имети жену, юже поял в християнстве. Избери себе от вельмож, егоже хощеши да сачитаю тя ему".

На гэта Рагнеда адказала коратка: „Быв княгинею могу ли быть рабом у слуги твоего!" Рагнеда не згадзілася выбраць сабе за мужа аднаго з Уладзіміравых вяльмож, а прыняла хрысьціянскую веру, якую прапанавалі ёй пасля Ўладзіміра й пачала працаваць дзеля яе пашырэньня. (Паводле другіх гісторыкаў Рагнеда й Ізяслаў былі хрышчаны да прыезду на Полаччыну).

Палітыка Ўладзіміра ў адносінах да Полацкай зямлі й другіх славянскіх земляў засталася тая самая. Калі раней не ўладося яму аб'яднаць славянскія княствы дарогай паганства, то цяпер Уладзімір хацеў злучыць Полацкую зямлю з Кіеўскай праз хрысьціянскую веру, каб падпарадкаваць яе кіеўскаму мітрапаліту. Але трэба сказаць праўду, што Ўладзімір не выдаваў для Полаччыны сваіх прыказаў, каб людзі прымалі хрысьціянства абавязкова й тых, што не хацелі яго прыняць, не называў „бунтаўшчыкамі княжай улады", як гэта было ў Кіеве.

Малады князь Ізяслаў рупіўся ня толькі аб адбудове зьнішчанай бацькам Уладзімірам незалежнай Полаччыны, але аддаваў многа часу асьвеце й пашырэньню хрысьціянскай веры. Сьведчаньнем пісьменнасьці на Полаччыне зьяўляецца

пячаць Ізяслава зь ягоным кірылічным надпісам. Летапісец так успамінае Ізяслава: „Быў гэта князь ціхі й лагодны, і пакорны, і літасьцівы, і вельмі любіў і шанаваў сьвятарскі сан і манашы, і пільна гарнуўся да Сьвятога Пісаньня".

На жаль, летапісец нічога не гаворыць як Ізяслаў пашыраў хрысьціянскую веру. Аднак, калі чытаў ён Евангельле й цікавіўся духоўным санам, то нешта рабіў у гэтым духу. Многа памагала яму маці Рагнеда. Яна прыняла манаства зь імем Анастасія, пабудавала ў Заслаўі манастыр і была ў ім першай ігуменьняй. Гэты манастыр стаўся першым цэнтрам хрысьціянства на Беларусі. Мясцовая традыця лічыць, што зь імем Рагнеды зьвязана заснаваньне парафіяльнай Праабражэнскай царквы. Трэба прызнаць, што Рагнеда запачаткавала доўгі працэс хрысьціянізацыі свайго краю й была першай манашкай на ўсходнеславянскіх землях.

Вядома, што ў Полацку была хрысьціянская царква, а ў 992 годзе ўстаноўлена была там епіскопія. Яе першым вядомым епіскапам быў Міна, які ўспамінаецца пад 1105 годам. Перад ім былі епіскапы, толькі не захаваліся іхнія імёны. Епіскап Міна памёр у 1116 годзе. Пасьля яго епіскапамі былі: Ільля (1120-1129), Козьма (1143-1156), Дзяніс (1167-1182), Мікалай, Каліст, Уладзімір і інш.

Другая епіскопія на Беларусі была заснавана ў Тураве. Яна ўспамінаецца пад 1005 годам і ёй належалі Пінск, Навагрудак, Гародня, Берасьце, Ваўкавыск, Зьдзітаў, Слуцк і другія гарады дрыгавічоў. Яе першым епіскапам быў Фама. Таксама ўспамінаюцца епіскапы Сымон, Ігнат, Якім, Юрый. Асаблівае месца ў Тураўскай епархіі займае епіскап Кірыла Тураўскі, які памёр каля 1183 году. У 1440 годзе кафэдра тураўскіх епіскапаў была перанесена ў горад Пінск.

Трэцяя епархія на Беларусі была заснавана ў Смаленску ў 1137 годзе князем Расьціславам Мсьціславічам (1127-1159), а яе першым епіскапам быў Мануіл (1137-1169). Варта згадаць, што паводле запісаў Друцкага Евангельля, у Друцку пабудаваны быў у 1001 годзе сабор, які зьяўляўся адным з самых старажытных ня толькі на Беларусі, але на ўсёй Кіеўскай Русі.

Пашырэньне хрысьціянства на Беларусі ва ўсходнім абрадзе ніколі не было прымусовым, як гэта рабілася шмат

дзе, а асабліва на Захадзе Эўропы. Як падае гісторыя, франконскі кароль Карл Вялікі (памёр у 814 г.) наварачваў у хрысьціянства саксонцаў, мардуючы іх тысячамі. Пасьля нямецкія графы, бароны, каралі й імпэратары таксама наварачвалі славян паміж Лабай і Одрай у сваю лацінскую веру агнём і мячом. Такой дарогай Ордэн мечаносцаў і Тэўтонскі ордэн у Прыбалтыцы наварочвалі латышоў, эстонцаў, прусаў і літоўцаў у сваю веру.

Праваслаўная царква на Беларусі такімі мэтадамі не карысталася. Усе важнейшыя справы вырашаліся ў той час на вечах, і, як відаць, справа хрысьціянскай веры веча пакінула кожнаму свайму грамадзяніну рашыць асабіста. Кожны чалавек, кожная сям'я, рашалі рэлігійнае пытаньне добравольна, так як падказвала ім сваё сумленьне. Але паколькі князі прымалі хрысьціянскую веру ахвотна, таму ахвотна насьледавалі іх падданыя.

У такім выпадку хрышчэньне Беларусі ня мае свае акрэсьленай даты, але прыняцьце хрысьціянства як дзяржаўнай рэлігіі, можна лічыць, адбылося за князя Ізяслава й яго маткі Рагнеды. А паколькі, як падае гісторыя, Ізяслаў быў сынам Уладзіміра й некаторыя беларускія землі знаходзіліся пад яго наглядам, таму дата хрышчэньня Русі можа быць такая, што й на Беларусі, хоць яна ня ёсьць зусім дакладная. Факт ёсьць той, што хрысьціянства на Русі, а таксама й на Беларусі, якую ў той час называлі Полацкай, Тураўскай і Смаленскай зямлёй, ажывілася пасьля дзейнасьці сьвятых Кірылы й Мяфодзія. Уложанае імі славянскае пісьмо й перакладзеныя на славянскую мову літургічныя кнігі, мелі вялікі ўплыў на славянскі сьвет. Далейшая дзейнасьць вучняў Кірылы й Мяфодзія ў Балгарыі мела дамінуючы ўплыў на пашырэньне й замацаваньне хрысьціянскай веры сярод усходніх славян.

Акрамя Рагнеды й Ізяслава — як першых вядомых на Полаччыне прадстаўнікоў хрысьціянскай веры — нельга памінуць і другіх перадавых хрысьціян. Людзі гэтыя сваёю ахвярнасьцю й добрымі прыкладамі спрычыніліся ня толькі да пашырэньня хрысьціянскай веры, але праз гэтую веру замацоўвалі дасягненьні візантыйскай цывілізацыі й культуры ў сваім краі.

Успамянём тут князя Барыса, які вядомы быў на Беларусі з пашырэньня хрысьціянства. Барыс быў пабожны, ветлівы да людзей і паступаў згодна Сьвятога Вучэньня. Ён годна выконваў свае княжыя правы ў адносінах да палачан, даў ім „волности и вечо мети и в звон звонити". Будаваў Барыс на Беларусі сьвятыні і манастыры — выдатныя помнікі старажытнай архітэктуры. Вярнуўшыся з паходу на яцьвягаў (1102), заснаваў горад Барысаў. З памятак, якія захаваліся па гэтым князю, гэта некалькі каменяў, на якіх былі высечаны крыж з надпісам: „Господи помози рабу своему Борису".

Адной з найбольш выдатных прасьветніц тае пары зьяўляецца князёўна Еўфрасінія (1100-1173), дачка полацкага князя Юрыя Ўсяславіча, унука слаўнага Ўсяслава Чарадзея. Еўфрасінія была адукаванай жанчынай свайго часу, мудрасьць якой зналі за межамі Беларусі. Ужо ў маленьстве праявіла яна зацікаўленьне да кнігі й навукі. Будучы дванацацігадовай дзяўчынкай Еўфрасінія тайна пастрыглася ў манашкі й з дазволу полацкага епіскапа Ільлі жыла пры царкве сьв. Сафіі. Гэтая „блажэнная отроковіца" вырашыла прысьвяціць сябе Богу й таму адмовіла шматлікім жаніхам.

У манастыр паступіла таксама малодшая сястра Еўфрасініі, Гарыслава — жонка полацкага князя Рамана Ўсяславіча. Пасяліўшыся са сваёй блізкай раднёй у манастыры, у цішы саборных сьцен Еўфрасінія малілася й цяжка працавала на славу царкоўнай і грамадзкай прасьветы. Яна „нача книги писати своими руками", перакладала з грэцкай мовы, стварала свае арыгінальныя творы, адчыняла школы, заснавала пры сваім манастыры цэнтр па перапісцы кніг і праўдападобна пісала летапісы. Еўфрасінія вышэй „за все имение" ставіла кнігі, „ими же утешает (...) душа и сердце веселится". Кнігі яе прадаваліся, а атрыманыя грошы Еўфрасінія раздавала бедным.

Са згоды епіскапа Ільлі Еўфрасінія атрымала мястэчка Сяльцо й там у 1125 годзе заснавала Спаскі жаночы манастыр „асьвячоных Богу дзеў". Пабудавала Еўфрасінія ў 1150 годзе мужчынскі манастыр у імя Багародзіцы. Будучы ігуменьню манастыра, Еўфрасінія пабудавала на ўласныя сродкі дзьве каменныя царквы, Спаса й Багародзіцы. Для царквы

Спаса ахвяравала дарагі настольны крыж, які зроблены быў з золата, срэбра, эмаліі й інкруставаны жэмчугам. На крыжы, зробленым полацкім майстрам ювелірам Лазарам Богшам, выгравіраваны быў надпіс: „Вь лето 6669 покладает Офросиния чьтьный кресть вь монастири своем вь цркви святого Спаса". У перакладзе на сёньняшнюю мову гэта значыць: „У 1161 годзе ўсклала Еўфрасінія сьвяты крыж у манастыры сваім у царкве сьвятога Спаса". А для другой царквы Еўфрасінія выпісала з Усходу славутую ікону Божай Мацеры, адну з трох найкаштоўнейшых іконаў, якія рабіў візантыйскі мастак Лука Хрысаверг.

Пад старасьць Еўфрасінія разам з братам Давідам і двюраднай сястрой Яўпраксіяй адправіліся ў Ерусалім, каб пакланіцца Гробу Хрыста. Па дарозе наведала яна Канстантынопаль, дзе была прынята імпэратарам Мануілам і патрыярхам. Зьведаўшы шматлікія канстантынопальскія сьвятыні й пакланіўшыся мошчам сьвятых, Еўфрасінія адправілася ў далейшую дарогу. Прыбыўшы ў Ерусалім, яна ўзлажыла каля Гробу Хрыста залатую кадзільніцу, як дар свае зямлі. Была яна адной зь першых паломніц зь беларускіх земляў.

У Ерусаліме Еўфрасінія неспадзявана захварэла й 24 траўня 1173 году памерла. Згодна яе жаданьню была там пахавана ў манастыры прападобнага Феадосія. Але пазьней, у часе Крыжовых войнаў, мошчы яе былі перавезены ў Кіеў і толькі ў 1910 годзе спачылі ў родным Полацку ў Спаскім манастыры.

„Жыціе Еўфрасініі Полацкай" — твор напісаны цікава й адпавядае сапраўднасьці. Мова яго тыповая на той час — стараславянская, але знаходзіцца часткова пад уплывам мясцовай старабеларускай гаворкі.

З гэтых скромных інфармацыяў можна бачыць, які культурны ўплыў дала Еўфрасінія для свайго народу й на якім цывілізацыйным узроўні стаяла Полаччына. Тут было ня толькі рэлігійнае пакліканьне, але й патрыятычнае пачуцьцё падказвала Еўфрасініі зрабіць вялікую й карысную справу для свае Полацкай зямлі, слава якой жыве й жыць будзе. Памяць свь. Еўфрасўніі сьвяткуецца 23 траўня (5 чэрвеня па новаму стылю).

У 1992 годзе Праваслаўная царква на Беларусі ўрачыста сьвяткуе 1000-годзьдзе заснаваньня першай праваслаўнай епіскопіі ў старажытным Полацку. Будзем спадзявацца, што міленіюм Полацкай епіскопіі не абмяжуецца толькі да царкоўнага сьвяткаваньня, а станецца пачаткам навучаньня ролі Царквы ў пашырэньні асьветы й культуры на Полаччыне й у суседніх землях.

Згодна летапіснага запісу, таксама ў гэтым годзе Полацк адзначае 1130 гадавіну свайго існаваньня як адзін з самых найстарэйшых гарадоў Беларусі.

(„Голас Часу" № 18 (3), Лёндан 1992 г.)

Беларусь — сувязь у ланцугу ўсходняга й заходняга хрысьціянства ў мінуўшчыну й цяпер

(Частка I)

У днях 28-31 кастрычніка ў Ватыкане адбыўся сымпозіюм на тэму „Хрысьціянства й культура ў Эўропе: Памяць, Сьвядомасьць, Плян на будучыню". Сярод удзельнікаў гэтага спатканьня быў таксама й праф. Анатоль Грыцкевіч зь Менску. Вось яго выступленьне на гэтым сымпозіюме (з яго дазволу). („Хрысьціянскія навіны", Беларускі інфарматар № 6 (34), кастрычнік-сьнежань 1991 год. Радыё Ватыкан).

Добра было-б замясьціць тут усё сказанае праф. Анатолем Грыцкевічам на сымпозіюме ў Ватыкане, каб чытач меў магчымасьць запазнацца як доктар гістарычных навук асьвятляе разьвіцьцё хрысьціянства на Беларусі ад часу яго прыняцьця нашымі продкамі. На жаль, з прычыны нястачы месца ў часопісе немагчыма гэта зрабіць. Але некаторыя выказваньні прафэсара патрабуюць дапаўненьняў.

Я поўнасьцю пагаджаюся з паважаным А. Грыцкевічам, што гісторыя хрысьціянства на Беларусі пачынаецца з часоў хрышчэньня Русі ў X стагодзьдзі, хоць ёсьць весткі, што нашы продкі зналі раней аб хрысьціянстве і што створаны былі катэдры Праваслаўнай царквы ў цэнтрах княстваў: у Полацку, Тураве й Смаленску. Пагаджаюся таксама, што хрысьціянская культура мела ўплыў на штодзённае жыцьцё грамадзтва, на палітыку князёў і з гэтым пэрыя-

дам зьвязаны імёны сьвятой Еўфрасініі Полацкай і епіскапа Кірылы Тураўскага.

А што да асобы Міндоўга, які быў дзейным князем, прабеглым палітыкам і закладчыкам Вялікага Княства Літоўскага, дык аб ім сказана так: „У Наваградку вялікі князь літоўскі Міндоўг хрысьціўся па каталіцкаму абраду разам са сваёй дружынаю ў 1252 годзе, а праз год атрымаў ад рымскага папы каралеўскую карону й тытул караля Літвы й Русі. Праўда, праз некалькі гадоў ён навярнуўся на паганства. Аднак рымска-каталіцкі касьцёл у Наваградку, тагачаснай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага (Беларуска-Літоўскай дзяржавы) застаўся".

Калі чалавек у сваім жыцьці нешта робіць, або мяняе веру, дык ня робіць гэта дзеля забавы, толькі па нейкіх прычынах ці асабістым перакананьні, або дзеля нейкай мэты й аб гэтым якраз прафэсар А. Грыцкевіч нічога ня кажа. Ня кажа ён гэтага сьведама, бо інакш увесь яго даклад ня меў бы ніякай вартасьці, сэнсу. Таму тут трэба сказаць, паясьніць, што Міндоўг хрысьціўся па каталіцкаму абраду па прычыне цяжкіх палітычных абставін. Супраць яго завязалася варожая кааліцыя ягоных сваякоў з Галіцка-Валынскаю Русьсю, якая была ў саюзе з татарамі з аднаго боку, а з другога боку пагражаў Лівонскі ордэн. Як падае летапіс, „многое воевание бысть". Міндоўг апынуўся ў крытычнай сытуацыі. На гэту тэму гісторык Мікола Ермаловіч піша так: „Міндоўг убачыў, што вакол яго заціскаецца кола й вырашыў таксама дзейнічаць подкупам у адносінах з Рыгай. (...) Але адных раскошных дараў было мала. Рыжскім біспупам Андрэем была пастаўлена ўмова: прыняць хрышчэньне ад папы, і толькі тады Міндоўг адолее ворагаў, г.зн. яму будзе аказана патрэбная дапамога. Рымская курыя ўжо даўно ўважліва сачыла за падзеямі ва ўсходняй Эўропе й выкарыстоўвала кожны зручны момант для пашырэньня там уплываў Каталіцкай царквы" („Па сьлядах аднаго міфа", Мінск 1991, стар. 64).

Такім спосабам Міндоўг прыняў каталіцкую веру. Аб гэтым вельмі добра ведае прафэсар Анатоль Грыцкевіч, але, мабыць, сьведама памінуў гэты важны факт, бо-ж яшчэ аб хрышчэньні Міндоўга запісала Валынская летапісь так: „Крещение его льстиво бысть (...) и неволею принели быша".

Калі мінула ваенная небясьпека, Міндоўг пакінуў лацінскі хрэст. І як падае Густынскі летапіс пад 1246 годам, Міндоўг „приять веру христианскую от востокь со своими многими бояри". Паказаны 1246 год сьведчыць, што Міндоўг раней быў праваслаўным і калі пакінуў, накінуты яму каталіцызм, дык ня значыць, што перайшоў у паганства, а вярнуўся да свае праваслаўнай веры. А касьцёл, які меў застацца ў Наваградку, дык цікава: хто яго будаваў? Хто ў яго хадзіў? Хто ў ім служыў? І як ён называўся? Як падае гісторыя, першы касьцёл у Наваградку быў заснаваны ў 1395 годзе вялікім князем Вітаўтам, г.зн. амаль 190 гадоў пазьней.

З хронікі бачым, што Міндоўг прыняў каталіцкі хрэст не са свае добрае волі й ня з мэтай пашырыць каталіцызм у сваёй праваслаўнай дзяржаве, а толькі прыняў гэтую веру „неволею". Каталіцызм у дзяржаве Міндоўга ня меў ніякай шансы пашырацца, бо насельніцтва Беларусі было праваслаўнай веры ад стагодзьдзяў. Але такі пералётны мамэнт бяды Міндоўга быў дастатковы для прафэсара А. Грыцкевіча, каб сказаць, што „працэс распаўсюджаньня хрысьціянскай культуры ішоў двума шляхамі: ажыцьцяўляўся як Рымска-Каталіцкаю, так і Праваслаўнаю цэрквамі".

Далей праф. А. Грыцкевіч піша такую навінку: „У XV — пачатку XVI ст. вялікія князі літоўскія, католікі, выдалі шэраг грамат, замацоўваючых за Праваслаўнаю царквою ў Вялікім Княстве Літоўскім пэўныя правы й прывілеі".

Тут прафэсар ані адным словам не згадаў, якім чынам ці парадкам зьявіліся на Беларусі гэтыя князі-каталікі й са свае ласкі пачалі даваць праваслаўным „пэўныя правы й прывілеі", калі ўвесь беларускі народ ад прыняцьця хрысьціянства ў X стагодзьдзі быў праваслаўнай веры.

А сталася гэтая трагедыя праз вялікага князя Ягайлу, які ў Крэве ў 1385 годзе згадзіўся на вунію ВКЛ з Польшчай, згадзіўся прыняць каталіцкі хрэст і ахрысьціць жмудзінаў у каталіцкую веру, за што атрымаў маладзенькую жонку Ядвігу й польскую карону.

Як толькі Ягайла сеў на польскі трон у Кракаве, адразу пачаў уводзіць каталіцкую веру ў Вялікім Княстве Літоўскім праз польскіх біскупаў, ксяндзоў і свае каралеўскія пастановы. Гэтымі пастановамі Ягайла ўводзіў дыскрымі-

нацыю праваслаўных, зводзіў іх да ролі пазбаўленых правоў грамадзян. Ён прызнаваў каталікам на ўласнасьць маёнткі, судовую справядлівасьць, сямейныя свабоды й спадчыну, звальняў баяраў ад дзяржаўных работ за выняткам ваенных, а той, хто адступіць ад лацінскага абраду, траціць гэтыя правы. Ягайла загадаў уступаць у сужэнствы толькі ў каталіцкай веры. Ад яго імя быў сфармуляваны загад схіліць і прыцягнуць да веры каталіцкай і паслухмянасьці сьвятому Рымскаму касьцёлу ўсіх, незалежна ад таго, да якой веры належалі гэтыя людзі раней. Адначасна дазвалялася прымаць строгія меры пакараньня супраць упартых.

Калі ў 1411 годзе Ягайла прыехаў у Пярэмышль, дык у яго прысутнасьці забрана была тамашняя праваслаўная катэдра ды заменена на лацінскую, а грабніцы й астанкі праваслаўных магнатаў былі выкінуты (Длугаш, „Гісторыя Польшчы", т. IV, стар. 149).

Аб „пэўных правох і прывілеях", якімі хоча пацешыць нас праф. Грыцкевіч, сьведчыць такі вось дакумант, які быў выстаўлены ў 1413 годзе на зьезьдзе ў Гарадле. „З вышэй пералічаных свабодаў, прывілеяў і ласкаў могуць карыстацца й цешыцца імі толькі паны й шляхта Літоўскай зямлі (...), якія зьяўляюцца вернікамі хрысьціянскай рэлігіі Рымскага касьцёла, а не схізматыкамі або няверныя".

А каб прысьпяшыць акаталічаньне русінаў, папа Марцін V так павучаў Ягайлу: „Даем табе свабоду й уладу нападаць збройна ад імя Нашага Касьцёла на іхныя гарады, мястэчкі, вёскі й воласьці, забіраць іх у палон і, згодна зьместу кананічных законаў, прасьледаваць герэтыкаў аж да зьнішчэньня".

Такім вось „хрысьціянскім" парадкам рабіліся па волі рымскага папы й польскага караля католікі на Беларусі, якія неўзабаве выдавалі „правы й прывілеі" для праваслаўных.

Наступныя польскія каралі ішлі часам на ўступствы Праваслаўнай царкве, але зазвычай тады, калі дзяржаве пагражала ваенная небясьпека. Рабілася гэта з мэтай, каб мець за сабою людзей, аднак неўзабаве зноў вяртаўся прыгнёт праваслаўных. А што да вялікіх князёў, якіх мае на ўвазу прафэсар, дык Вітаўт і Сьвідрыгайла аказвалі пашану праваслаўным, але яны былі ў большай ці меншай меры залежнымі ад

польскага караля. Што да Вітаўта, то ён не зьвяртаў многа ўвагі на рэлігію. Быў гэта чалавек мала рэлігійны, пры кожнай палітычнай зьмене мяняў і веру. А Сьвідрыгайла, хоць і апёрся на праваслаўных, але яго манія стаць каралём Польшчы й атрымаць карону ад папы ня ведама да чго давяла-б.

Далей прафэсар Грыцкевіч піша: „Вялікае значэньне для набліжэньня культуры Ўсходу да культуры Захаду Эўропы ў XV ст. мела Флярэнційская вунія 1439 году, якая часова аднавіла ня толькі ў Візантыі, Беларусі, Сэрбіі й Вялікім Княстве Літоўскім адзінства Хрысьціянскай царквы пад кіраўніцтвам папы рымскага".

Тут моцна памыляецца паважаны прафэсар Грыцкевіч. Флярэнційская вунія ані чуць не аднавіла адзінства Хрысьціянскай царквы пад кіраўніцтвам папы й Рыму. Флярэнційская вунія не была прагалошана ў Канстантынопалі. Паважанаму Грыцкевічу вядома добра, што грэкі паехалі сьпярша ў Фэрару (пасьля сабор пераехаў у Флярэнцыю) ня так рабіць царкоўную вунію, як прасіць мілітарнай дапамогі Захаду, бо туркі падыходзілі пад сьцены Канстантынопаля й толькі за мілітарную дапамогу Канстантынопаль пагаджаўся на царкоўную вунію. Але мілітарная дапамога Захаду, якую абяцаў папа рымскі ў Флярэнцыі, ніколі не была аказана. Чаму-ж тады маюць заставацца ў моцы яе пастановы? Калі адзін бок не стрымаў забавязаньня, значыць, дамоўленасьць была парушана й была яна парушана Рымам і Канстантынопалем.

Ды нават каб Захад і даў мілітарную падтрымку Канстантынопалю, вунія не ажыцьцявілася-б. Супраць яе быў увесь праваслаўны народ Усходу. Нават удзельнікі Флярэнційскага сабору, якія вярнуліся дамоў, пабачыўшы варожае стаўленьне сваіх вернікаў да вуніі, пачалі адмаўляцца ад яе. Адзін зь іх, Георгі Схалярыас, які падпісаў вунію ў Флярэнцыі, вярнуўшыся ў Канстантынопаль, павесіў на дзьвярах храма сь. Сафіі абвестку, у якой заявіў, што ён гатоў хутчэй памерці, як пакінуць праваслаўную веру.

У 1445 годзе ў Канстантынопалі патрыярхам выбралі Мамаса, які, спадзяючыся яшчэ на мілітарную дапамогу Захаду, хацеў увесьці вунію, але напаткаў такі супраціў, што пакінуў Канстантынопаль і выехаў у Рым.

А які посьпех мела Флярэнційская вунія на Беларусі, дык можна прывесьці такі факт. Папа рымскі прыслаў на Беларусь вуніята, кардынала Рыгора, і наказаў каралю Казіміру памагчы кардыналу навярнуць „схізматыкаў", гэта значыць праваслаўных, у вунію, а супраць упартых прымяніць строгія меры. Кароль так рабіў, але па некаторым часе пераканаўся, што няма ніякіх шансаў, каб вунію можна было на Беларусі ўвесьці пагрозай ці ласкай і спыніў прасьлед. Гэта самае бачыў і папскі кардынал Рыгор, які прызнаў сваю памылку, пакаяўся ў ёй і перайшоў у праваслаўе. А ў паняцьці прафесара А. Грыцкевіча гэта „фарміравала ментальнасьць кліру Праваслаўнай царквы на Беларусі й Украіне, і стварала вуніяцкі настрой на будаваньне адзінай Хрысьціянскай царквы".

Далей прафэсар піша: „Такім чынам, у пэрыяд расколу заходняй Хрысьціянскай царквы ў XVI ст., у пэрыяд узьнікненьня пратэстанцкіх Цэркваў, на Ўсходзе Эўропы, куды таксама пранікалі пратэстанцкія рухі, былі створаны магчымасьці для аб'яднаньня Царквы".

І тут прафэсар памыляецца. Рэфармацыйны рух не ствараў ніякіх магчымасьцяў для аб'яднаньня Цэркваў. Мы нідзе не знаходзім у гісторыі тае пары, каб праваслаўныя аб'ядналіся з каталікамі супраць рэфармацыі. Праўдай ёсьць тое, што праваслаўныя аб'ядноўваліся з рэфарматарамі-пратэстантамі супраць гвалтоўнага наступу каталікаў і вуніятаў. Пад 1599 годам маецца пастанова Віленскага зьезду прадстаўнікоў Праваслаўнай і Евангельскай цэркваў аб прасьледаваньнях і злоўжываньнях робленых вуніятамі й каталікамі. Ды, як прызнае сам праф. Грыцкевіч у сваім артыкуле „Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс пра Беларусь", у 1767 г. дзьве шляхецкія канфэдэрацыі (узброеныя часовыя палітычныя саюзы шляхты) у Торуні — польскіх лютэран і кальвіністаў і ў Слуцку — кальвіністаў, лютэран і праваслаўных Вялікага Княства Літоўскага патрабавалі ўраўнаньня сваіх правоў з каталіцкай шляхтай" („З гісторыяй на «вы»", Мінск 1991, стар. 11).

І такіх патрабаваньняў на зраўнаньне правоў іншаверцаў з католікамі маецца намнога больш.

А што да Берасьцейскай царкоўнай вуніі 1596 году, як зазначае сам праф. Грыцкевіч, у навуковай гістарычнай лі-

таратуры было шмат спрэчак, каб даказаць яе нэгатыўнасьць, ці наадварот пазітыўнае значэньне. У сярэдзіне й другой палавіне XX ст. у СССР да гэтага давялося яшчэ ўлічаць і палітычнае, ідэалягічнае, камуністычна-прапагандысцкае асьвятленьне (з пункту гледжаньня Кампартыі Савецкага Саюзу, пачынаючы са Сталіна).

На тэму Берасьцейскай вуніі маецца дастаткова багаты матэрыял без савецкіх аўтараў. Ён знаходзіцца ў польскай і замежнай гістарычнай літаратуры. А ня менш важна запазнацца з перапіскай Рымскай курыі са сваімі нунцыямі ў Польшчы ў часе дзейнасьці вуніятаў на Беларусі й Украіне. Але гэты матэрыял многа не паможа тым людзям і дактарам гістарычных і філялягічных навук, якія пераступілі парог Ватыкана й пачалі весьці яго прапаганду.

(„Голас Часу" № 17 (2), Лёндан, 1992 г.)

Славянская літургія ў паняцьці Рымскай царквы

Наведзіны папам рымскім Чэхаславаччыны 21-22 красавіка гэтага году не сьцягнулі так многа народу, як гэтага спадзяваліся некаторыя. Ці не хаваецца тут, часам, старая крыўда чэхаў. Як падае газэта „Індэпэндэнт" ад 23 красавіка г.г., папа зрабіў першыя крокі, каб адсланіць найбольш ганебныя „белыя плямы, якія фактычна зьяўляюцца чорнымі плямамі ў дзейнасьці Каталіцкай царквы ў адносінах да чэшскага народу й яго вядучага рэфарматара Яна Гуса.

У сваім выступленьні папа выказаўся пахвальна й аб першых апосталах славян — Канстанціну (Кірылу) і Мяфодзію, якія пашыралі хрысьціянства сярод славян, залажылі Царкву й увялі ў яе славянскую літургію, пісьмо й візантыйскую традыцыю. За гэта Ўсходняя царква прызнала іх за сьвятых, а Каталіцкая царква — за „герэтыкаў". І толькі ў 1881 годзе папа Леў XIII прысвоіў ім званьне сьвятых. Як бачым, прыйшлося чакаць больш за 1000 гадоў, калі Другі Ватыканскі сабор прызнаў нацыянальную літургію. Столькі гадоў спатрэбілася непамыльным папам, каб зразумець значэньне сыходу Сьвятога Духа на апосталаў.

31 сьнежня 1980 году папа Ян Павал II, у сваім апостальскім лісьце, учыніў сьвятых Кірылу й Мяфодзія патронамі Эўропы, побач сьвятога Бэнэдыкта, за іхнюю работу ў пашырэньні хрысьціянства сярод славян.

А запазнаўшыся з адносінамі Рымскай царквы й яе папаў да славянскай літургіі, узяўшы пад увагу тыя зьнявагі над архіепіскам Мяфодзіем, ягонымі вучнямі, сьвятарамі й далейшыя паняверкі славянскай літургіі, можна сказаць, што ліст папы Яна Паўла II ёсьць парадаксальны.

Каб падбадзёрыць чэхаў, Ян Павал II сказаў: „Папа паляк не забыўся, што хрысьціянства прыйшло ў Польшчу з Чэхіі". І тут варта пацікавіцца, якой дарогай і ў якім абрадзе яно зьявілася ў Чэхіі й над верхняй Віслай, краінай, якая належала ў свой час да Вялікамараўскай дзяржавы.

Каб шырэй прадставіць дзейнасьць Кірылы й Мяфодзія й прычыны грамадзка-касьцельнага непаразуменьня, якое прывяло да рэвалюцыі ў Чэхіі, пасьля заўчаснай сьмерці Яна Гуса й Гераніма Пражскага, спатрэбіцца адвесьці многа месца. Дзеля таго абмяжуемся да важнейшых момантаў гісторыі гэтага пэрыяду.

Нехта можа сказаць: навошта ўспамінаць той далёкі час і мяшацца ў чужыя чэшска-каталіцкія справы. Яно то так, але паколькі ў гэтым канфлікце ўспамінаецца Беларусь і беларускія жаўнеры пралівалі сваю кроў у Чэхіі ў імя свабоды й справядлівасьці, таму ня будзе грэх заглянуць у гэты адрэзак гісторыі.

Каб лепш зразумець сэнс справы, трэба вярнуцца да славянскай Мараўскай дзяржавы, якая ахоплівала Маравію, Славакію, Чэхію, Лужычы, Сілезію, Кракаўшчыну, Панонію (Славэнія ў Югаславіі й паўднёвая частка Мадзьяршчыны). Першае хрысьціянства несьлі ў гэтую дзяржаву немцы на пачатку IX стагодзьдзя разам са сваім падбоем краіны. Народ хутка пазнаў, што кантакты зь нямецкім духавенствам могуць паставіць іх у палітычную залежнасьць ад Нямеччыны.

Калі да ўлады ў Маравіі прыйшоў Расьціслаў (846-870), ён вызваліў краіну з залежнасьці Людовіка Немца, ды зрабіў яшчэ руйнуючы паход на яго ўсходнія граніцы.

Мараўскія кіраўнікі зналі пра Візантыю й яе грэцкае хрысьціянства. Таму ў 662 годзе вялікамараўскі князь Расьць-

ціслаў прыслаў сваё пасольства да візантыйскага імпэратара Міхаіла III, якое прывезла яму ліст наступнага зьместу:

„Мы, славяне, зьяўляемся звычайнымі людзьмі, якім ніхто не сказаў, якая дактрына ёсьць праўдзівая. Мы просім цябе, міласьцівы ўладар, прышлі нам чалавека, які будзе вучыць нас праўдзіва, бо ад цябе выходзіць права, якое кіруе сьветам".

Мараўскім лідэрам хадзіла, як бачым, каб мець чалавека, які знае іхнюю славянскую мову й на гэтай мове будзе навучаць і пісаць, бо ў краі ніхто не разумее грэцкай, лацінскай і нямецкай моў.

Просьба Расьціслава была задаволена й вясной 863 году зь Візантыі ў Маравію прыбылі браты Канстанцін і Мяфодзій з групай сьвятароў, манахаў, рамесьнікаў і правадніками. Канстанцін і Мяфодзій паходзілі з гораду Салуні (Салёнікі), што ў Грэцыі. Вакол гэтага гораду й у горадзе жыло многа славян і, як падаюць некаторыя гісторыкі, быццам маці Канстанціна й Мяфодзія была славянкай. Таму нічога дзіўнага, што салуньскія браты, жывучы сярод славян, добра зналі славянскую мову й напэўна іхнія супрацоўнікі, што прыйшлі зь імі, былі славянамі.

Тут на асаблівую ўвагу заслугоўвае Канстанцін, які вучыўся на ўнівэрсытэце ў Канстантынопалі й праявіў вялікія здольнасьці да навукі, за што празвалі яго „прафэсарам". Дзякуючы яго стараньням быў уложаны славянскі алфавіт, так званая глаголіца. І нічога дзіўнага, што імпэратар Міхаіл і патрыярх Фоцій паслалі гэтых двух салунцаў у Вялікаморавію, як сваіх найлепшых людзей, якія везьлі з сабою перакладзеныя на славянскую мову некаторыя царкоўныя тэксты. Пры гэтым імпэратар Міхаіл III даў ім завезьці ліст да князя Расьціслава у якім ён пісаў: „Прымі вялікі падарак, больш вартасны за золата, срэбра, каштоўныя камяні, або часовыя багацьці. (...) Праз гэта (маючы на ўвазе славянскае пісьмо), ты таксама можаш быць успамянуты сярод вялікіх народаў на сваёй роднай мове".

Місіянерская дзейнасьць усходняга абраду, якую прапаведавалі ў Маравіі Канстанцін і Мяфодзій, карысталася вялікім посьпехам, бо вялася яна, як і багаслужба, на славянскай мове, на мове зразумелай народу. Гэта моцна непакоіла каталіцкае духавенства, якое вяло сваю літургію на не-

зразумелай для народу латыні й ня ведала мясцовай славянскай мовы, бо было нямецкага паходжаньня.

Гэта бачылі й разумелі славянскія місіянеры й былі вельмі асьцярожныя. Яны не ўступалі ў палемічныя справы й спрэчкі са сваімі праціўнікамі й абмежавалі сваю навуку ды дзейнасьць выключна да царкоўнай, каб пазьбегчы непаразуменьняў. Яны паміналі нават Канстантынопаль, які быў акурат у кепскіх зносінах з Рымам.

Закончыўшы першы этап сваёй місійнай дзейнасьці, салуньскія браты вярталіся ў Канстантынопаль, як у дарозе былі запрошаны папам Мікалаем I наведаць Рым. Пакуль яны прыехалі ў Рым, памёр папа й на яго месца выбралі Адрыяна II. У часе дыскусіяў, якія адбываліся ў Рыме наконт славянскай літургіі, Канстанцін пераканаў у яе слушнасьці новага папу, які блаславіў славянскія кнігі.

Быў 869 год, калі неспадзявана захварэў і памёр у Рыме Канстанцін (Кірыла). Мяфодзій сядзеў у Рыме са сваімі сьвятарамі й ня знаў што рабіць. Аб гэтым даведаўся, мабыць, вялікі прыхільнік славянскай літургіі Коцаль, князь Панноніі й запрасіў Мяфодзія — „нашага настаўніка" — прыехаць у Панонію. Мяфодзій вярнуўся да Коцаля, каб працягваць місіянерскую работу на славянскай мове. І тут пачаліся новыя непаразуменьні з каталіцкім духавенствам. Немцы подступам запрасілі Мяфодзія на свой сабор у Рэгенсбургу (871) і зьняволілі яго ў Швабіі. Тры гады сядзеў архіепіскап у зьняволеньні й зносіў зьнявагі.

Вярнуўшыся зь нямецкай турмы, архіепіскап Мяфодзій працягваў свае пастырскія абавязкі. Зь яго рук у 874 годзе прынялі хрысьціянства чэшскі князь Барывой з жонкай Людмілай і чэшскія рыцары, якія наведалі двор князя Сьвятаполка. Жонка Барывоя была вялікай прыхільніцай славянскага абраду. Яе сьвятаром быў Павал, вучань Мяфодзія, які хрысьціў Вацлава, што сёньня зьяўляецца сьвятым чэхаў.

Архіепіскап Мяфодзій бачыў, што вакол славянскай літургіі арганізуецца змова, у якой прымае ўдзел рымскі папа, таму ён паехаў у Канстантынопаль (881 або 882 год). Яго спаткаў імпэратар Васілій I і патрыярх Фоцій. Імпэратар выказаў вялікі гонар і задавальненьне мараўскаму архіепіскапу за яго місійную славянскую работу ў Маравіі,

паколькі сам быў, як некаторыя гісторыкі кажуць, славянскага паходжаньня.

На жаль, мала ведаем аб гутарках, якія вяліся тады ў Канстантынопалі, за выняткам, што сьвятар Мяфодзія, дыякан і некалькі славянскіх літургічных кніжак засталіся ў Канстантынопалі. Гэта нагадвае, што архіепіскап Мяфодзій, патрыярх Фоцій і імпэратар Васілій поўнасьцю здавалі сабе справу, што Рым ня ёсьць шчыра зацікаўлены ў славянскай літургіі. Папы баяліся канфлікту з франкамі й таму ішлі ім на ўступствы. У такой сытуацыі адзінай апорай для славянскай літургіі Кірылы-Мяфодзія ў Маравіі і на Балканах меў быць Канстантынопаль.

Мяфодзій вярнуўся ў Маравію сьпешна й узяўся за пераклады літургічных і другіх славянскіх кнігаў на славянскую мову, бо, відаць, прадчуваў недалёкую сваю сьмерць.

Сапраўдная трагедыя для славянскай літургіі пачалася адразу пасьля сьмерці архіепіскапа Мяфодзія ў 885 годзе. У той час у Маравіі княжыў Сьвятаполк, прыхільнік лацінскага абраду. Ён даў вольную руку каталіцкаму епіскапу, былому ворагу Мяфодзія, Віхінгу, дзейнічаць на Маравах. А рымскі папа Сьцяпан V (885-891), зараз пасьля паховін архіепіскапа Мяфодзія, выдаў распараджэньне такога зьместу: „Найсьвяцейшыя Божыя службы, якія на славянскай мове ўпарта адпраўляе Мяфодзій — хоць былі яны праз папярэдняга папу Яна VIII дазволеныя — далей пад уладай апостальскай ня могуць быць дапушчаныя й зьяўляюцца забароненыя. (...) Адно, што дазваляецца, гэта пасьля прачытаньня найсьвяцейшага Евангельля на лацінскай мове, паясьніць яе (на славянскай) тым, якія не разумеюць латыні. (...) Наступнік (Горазд), якога ўстанавіў Мяфодзій насуперак правілаў сьв. Айцоў, ня будзе выконваць улады біскупа пакуль не зьявіцца перад намі й не атрымае дазволу".

Епіскап Горазд, як і рэшта яго славянскага духавенства, не зьявіліся перад папам. За гэта адны былі арыштаваны й пасаджаны ў турму, другія ўцяклі за межы Маравіі, а іншых прадавалі ў Вэнэцыі як няволвнікаў. Пра іх выпадкова даведаўся ў Вэнэцыі візантыйскі амбасадар, выкупіў іх і адаслаў у Візантыю. Такім правам і парадкам разбурала-

ся, але не зьліквідавалася, славянская Царква ў Маравіі, Чэхіі й другіх краінах былой Вялікамараўскай дзяржавы.

Няма на гэта дакладных інфармацыяў як пашыралася царкоўнаславянская літургія ў Польшчы. Вядома аб вялікамараўскіх кантактах з польскім племем вісьлян. Больш вядома, што Кракаў глядзеў на чэшскую Прагу й запазычваў ад яе ўсё. Сёньня большасьць польскіх вучоных прызнае, што пры жыцьці сьвятога Мяфодзія пашыраўся ў Польшчы славянскі абрад і быў ён прыняты ў 900 годзе. Але ў 966 годзе Мешка I (Мечыслаў) замяніў яго на лацінскі, аднак славянскі абрад меў перавагу над лацінскім да 1000 году. Існуюць гістарычныя спасылкі пра двух епіскапаў усходняга абраду — Прахора й Прокулфа — і што абрад гэты пашыраўся на поўнач і ўсход.

Аб існаваньні ў Польшчы славянскай літургіі ўспамінае найстарэйшая польская хроніка Гала Ананіма (каля 1113 г.). Гісторыя падае, што польскі кароль Казімір Аднавіцель (1034-1058) ішоў вайной супраць „фальшывых хрысьціян" і нішчыў цэрквы ў Польшчы. Ліквідацыя славянскай Царквы ў Польшчы наступіла за караля Баляслава III (1085-1135). Апошнім славянскім епіскапам быў Часлаў. Аб ім Ян Длугаш піша, што быў ён адхілены ад катэдры ў 1103 годзе за тое, што лічыў непатрэбным прасіць Рым аб сваім зацьверджаньні.

У 925 годзе на касьцельным саборы ў Спліце каталіцкае духавенства абвясьціла славянскі абрад „нямілым Богу". І не зважаючы на гэта, хоць пад забаронай і прасьледам, аднак славянская Царква ў Чэхіі жыла й яе хацелі аднавіць за згодай чэшскага князя Уладыслава. На гэта папа Грыгорый VII пісаў у 1080 годзе да Уладыслава: „Панекуль годнасьць Твая выступіла з просьбай, каб мы дазволілі адпраўляць у нас багаслужбы на славянскай мове, памятай, што гэтай Тваёй просьбе ніяк ня можам спрыяць. (...) Праз аўтарытэт сьв. Пятра забараняем Табе супрацьставіцца ў гонар Усемагутнага Бога".

Калі чэшскім каралём стаў Карл IV (1346-1378), па яго распараджэньні заложаны быў у Празе славянскі манастыр, у які запрашаліся манахі з Харватыі. Яны служылі па-рымскаму абраду, але на славянскай мове. Харваты карысталіся славянскімі кнігамі пісанымі глаголіцай і па іх вучылі-

ся чэхі. Але, калі ў 1355 годзе Карла IV выбралі імпэратарам Рымскай Сьвяшчэннай імпэрыі, латынь пачала выціскаць славянскую мову й манахаў з царквы Чэхіі. За Карла IV зьявіўся ў Прагу назначаны папам каталіцкі біскуп.

У гэтым ужо часе (каля XIV ст.) на захадзе Эўропы адзываліся крытычныя галасы адносна парадкаў у Рымскай царкве. Сімонія, гандаль індульгенцыямі, матэрыяльныя карысьці Царквы й яе духавенства, Сьвятая інквізыцыя — гэта балючыя зьявішчы, якія пярэчаць хрысьціянскай навуцы.

У 1324 годзе зьявілася праца палітычнага пісьменьніка Марсілія Падуанскага пад загалоўкам „Абаронца Міру". Датычыла яна й асноў Царквы, яе грунтоўнай перабудовы. Паводле аўтара, Царква ёсьць грамадзтва верных і яе ўлада належыць верным. Органам гэтага грамадзтва ёсьць сабор, які стаіць вышэй папы. І, паводле Марсілія, Царква павінна зрачыся зямнога багацьця, бо яно вядзе да вайны Царквы зь дзяржавай.

Але ня так лёгка рымскія папы хацелі здаць духоўную ўладу над сьвецкай. І таму якраз нарастаў канфлікт, а зь ім — пачатак новага руху, які хутка пашыраўся па ўсёй Эўропе й наймацней праявіўся ў Чэхіі. Яго падхапіў малады, але здольны Ян Гус.

Ян Гус (1371-1415) у 20-гадовым узросце меў ужо навуковую ступень Пражскага унівэрсытэту й гэта садзейнічала яго папулярнасьці. Навуковец Ян Гус улажыў правапіс чэшскай мовы й нанава пераклаў Біблію. Ён, як духоўны й здольны прапаведнік, сьцягваў многа народу ў сваю царкву. Людзі памяталі, што іхняя Царква мела сувязі з Грэцкай царквой, а толькі праз сілу й інтрыгі яна была падпарадкавана Рыму. Памяталі багемцы й аб сваёй роднай мове ў літургіі, якую заступіла незразумелая латынь, памяталі яны й аб свабодах, якімі карысталіся раней да караля Багеміі Карла IV, які крыху пазьней стаў імпэратарам Сьвяшчэннай Рымскай імпэрыі (1355-1378).

У рэлігійнай і нацыянальнай дзейнасьці вялікую ролю выконваў Ян Гус. Ён гаварыў народу, што Ісус Хрыстос ёсьць Галава Царквы, а не рымскі папа й што людзі павінны паводзіць сябе ў адпаведнасьці з навукай Хрыста. За Гусам пайшло многа духавенства, рыцары, народ просты й нават ка-

роль Вацлаў IV ціха сымпатызаваў гусітам. Гус асабліва востра выступаў супраць індульгенцыяў — адкупленьня грахоў за грошы, што выклікала абурэньне лацінскіх біскупаў. За гэта папа Ян XXIII у 1412 годзе экскамунікаваў Гуса.

Непаразуменьні ў Каталіцкай царкве вяліся ад часу яе заснаваньня, больш яўна выступалі на працягу XIV стагодзьдзя, калі папа Клімент V (1305-1314) перанёс у 1309 годзе свой трон у Авіньён, на поўдні Францыі. У выніку пад французскай уладай на папскі трон выбіраліся толькі французскія біскупы. Гэты перыяд часу, які цягнуўся 70 гадоў, прынята называць „Авіньёнскай няволяй" і ў гэтай Царкве наглядаўся маральны ўпадак. Вядомы італьянскі паэт Пэтрарка (1304-1374) пісаў аб папскім Авіньёне, дзе ён жыў, што гэта гняздо прадажніцтва, „у якім хаваецца ўсякае зло, якое толькі існуе на сьвеце". Фактычна авіньёнскія папы не былі горшымі ані лепшымі за рымскіх, але такі дуалізм быў аслабленьнем улады й аўтарытэту Каталіцкай царквы.

„Авіньёнская няволя" закончылася ў 1377 годзе, калі папа Грыгорый XI вярнуўся ў Рым. Пасьля яго сьмерці кардыналы, якія знаходзіліся ў Рыме, выбралі на папу італьянца Урбана VI. Гэта не спадабалася французскім кардыналам, якія выбралі сабе ў Авіньёне на папу Клімента VII і адгэтуль пачаўся новы касьцельны раскол, які цягнуўся сорак гадоў. Абодва „намесьнікі сьвятога Пятра" пракліналі адзін аднаго.

Дзеля навядзеньня парадку ў Каталіцкай царкве ў Пізе скліканы быў сабор, які ўняважніў двух папаў, а выбраў трэцяга — Аляксандра V, які пачаў працаваць над злучэньнем разьбітай Каталіцкай царквы. Але не даехаў ён да Рыму. Былі другія кандыдаты на папскі трон і таму Аляксандра атруцілі. На месца Аляксандра, у гэтай самай Пізе ў 1409 годзе, выбралі на папу былога марскога пірата, чалавека нізкай маралі Бальтазара Коса, які прыняў імя Яна XXIII. Першыя два папы не прызналі пастановы сабору ў Пізе, не здалі сваіх пасад і за папскі трон пачалася барацьба ня двух, а трох папаў, якія лічылі сябе „непамыльнымі" й прэтэндавалі на званьне „наступніка сьвятога Пятра" ды далей пракліналі адзін адгаго. Барацьба вялася сярод іх не за рэлігійныя догмы, а за папскую ўладу. Гэтая прага да ўлады праявілася ў рымскіх папаў вельмі рана. І, гледзячы на нехрысь-

ціянскія паводзіны каталіцкіх герархаў, Гус сказаў: „Сабакі грызуцца за костку, адбярыце костку — перастануць".

Зроблена была яшчэ адна спроба навесьці парадак у Каталіцкай царкве на саборы ў Канстанцу (1414-1418), на які прыехаў і Ян Гус, каб бараніць сваю навуку. Магчыма, Гус не паехаў-бы на гэты сабор, але атрымаў ён гарантыю ад Жыгімонта Люксэмбургскага, апекуна Рымскай царквы, што яму ня будзе зроблена ніякая крыўда. Сабор дамагаўся, каб Гус публічна адмовіўся ад свае навукі, як яны называлі яе — герэзіі. Перад саборам айцоў Гус не адмовіўся, не пакаяўся за свае перакананьні й дзейнасьць і таму быў прыгавораны на сьмерць.

Паплечнік Гуса, Геронім Пражскі, быў таксама чэшскім рэфарматарам. Скончыў ён Пражскі ўнівэрсытэт у 1398 годзе й выкладаў на ўнівэрсытэтах Парыжа, Гайдэльбэргу, Кёльну. Калі ходзіць аб асьвету, то быў ён ня менш адукаваны за Гуса й абодва яны мелі аднолькавыя погляды на Царкву.

У 1413 годзе Геронім наведаў Беларусь. Ён разам зь Вітаўтам прыехалі ў Віцебск. Спаткала іх чатырохтысячная грамада беларусаў, дзьве працэсіі — праваслаўная й каталіцкая. Геронім памінуў каталікоў, а на каленях аддаў пашану праваслаўным іконам. Пасьля Геронім наведаў Вільню, Пскоў, дзе знаёміўся з жыцьцём беларусаў. У сваіх выступленьнях Геронім прапагандаваў патрыятызм і ўсё тое, што было зьвязана са сваёй краінай, яе культурай і мовай.

Вярнуўшыся дамоў, перад ад'ездам Гуса на каталіцкі сабор у Канстанц, Геронім паабяцаў яму, што калі зойдзе патрэба, ён прыедзе ў Канстанц, каб памагчы яму. Слова сваё Геронім стрымаў, прыехаў у Канстанц 4 красавіка 1415 году. Тут ён ад сваіх прыяцеляў даведаўся, што сытуацыя сталася крытычнай, няма ніякай надзеі на ратунак Гусу і яму самому таксама пагражае небясьпека. Геронім вяртаўся дамоў, але ў дарозе 23 траўня 1415 году быў арыштаваны. Яго вялі ў турму праз горад на ланцугу. Пасьля допытаў, абразаў і націску прызнацца да сваіх памылак Гераніма таксама асудзілі на сьмерць і на судзе прыпомнілі ягоныя адносіны да каталіцкай працэсіі ў Віцебску.

Як першы, так і другі суд айцоў Каталіцкай царквы над чэшскімі патрыётамі былі фальшывыя, а іх ход даво-

лі цікавы. Скажам коратка, што прыхільнікі Яна Гуса й Гераніма Пражскага зьвярталіся да папы, каб ён вызваліў багемскіх рэфарматараў, на што папа адказаў, што гэта іх праціўнікі зьняволілі й ён нічога ня можа памагчы. А Жыгімонт Люксэмбургскі, які даў Гусу сваю жалезную гарантыю, што яму нічога не станецца на саборы, дэманстрацыйна пратэставаў, а пасьля прасіў, каб Гуса адкрыта судзілі. Калі Гус быў асуджаны на сьмерць, Жыгімонт не пратэставаў, ён думаў, што са сьмерцю Гуса памрэ яго справа ў Багеміі.

Такі быў закон Каталіцкай царквы, дзе галоўную дзейнасьць па запалохваньні вяла Сьвятая інквізыцыя, якая мыла свае рукі ў нявіннай людзкой крыві.

6 ліпеня 1415 году многа людзей сабралася на катэдральнай плошчы ў Канстанцу, каб пацікавіцца перадсьмяротнай цырымоніяй над Янам Гусам, якая мела абразьлівы зьмест. Імпэратар Сьвяшчэннай Рымскай імпэрыі, як галоўны віноўнік гэтай трагедыі, сядзеў са сваімі супрацоўнікамі. Адбылася ўрачыстая імша, пасьля якой зачыталі фальшывае абвінавачаньне супраць Гуса, на якое не было дазволена адказаць засуджанаму. Гледзячы на гэта ўсё, Ян Гус маліўся, каб Бог дараваў ім грахі. Гуса спалілі за сьценамі Канстанцу, а попел яго кінулі ў раку Рэйн.

Трэба памятаць, што каталіцкая герархія прыгаварыла Яна Гуса на сьмерць нават за тое, чаго ён ніколі не казаў і не вучыў. Хадзіла проста, каб зьнішчыць чалавека, які ня так думаў і ня так рабіў як ім хацелася.

Гэты самы сабор заходніх айцоў пазбавіў пасад трох папаў, якія дэкадамі змагаліся між сабою за ўладу, а толькі аднаго зь іх, папу Яна XXIII, прызнаў „вінаватым у сімоніі й растраце касьцельнага дабра" й прадставіў яго як „скандальнага для ўсяго хрысьціянства". Але за гэта папа Ян XXIII ня быў прыгавораны на сьмерць, хоць яго біскупы й кардыналы абвінялі на судзе ў некалькіх забойствах, у тым ліку й папы Аляксандра V. Чуючы за сабою віну, папа Ян XXIII уцёк з сабору, але яго злавілі за горадам і зьняволілі. Але папа Ян XXIII не панёс вялікага пакараньня.

Гераніма Пражскага напаткаў той самы лёс, што й Яна Гуса. Ён быў пасланы на касьцёр 30 траўня 1416 году. Іду-

чы на тое самае месца, дзе спалілі Яна Гуса, Геронім сьпяваў рэлігійныя песьні й маліўся.

Захады Гераніма, каб абараніць Гуса, скончыліся для яго трагічна. Абодва яны загінулі за тое, што мелі адвагу публічна выступіць у абароне чысьціні Царквы. Рабілі яны гэта з большай адвагай як трэба было ў той час.

Пасьля трагічнай сьмерці Гуса й Гераніма з рук каталіцкага сабору ў Канстанцу збунтавалася ўся Чэхія. Кароль Вацлаў, будучы старэйшым братам Жыгімонта Люксэмбургскага, ня мог перанесьці гэтай трагедыі й памёр на сэрца 16 жніўня 1419 году. Карона мела перайсьці ягонаму малодшаму брату Жыгімонту, але гэты чалавек быў зьненавіджаны ў чэхаў. Гэта-ж ён подступам паслаў Яна Гуса на касьцёр праз сваю жалезную гарантыю бясьпекі. Каб захапіць чэшскі трон, Жыгімонт арганізаваў войска й вёў крыжовы паход супраць чэхаў, а папа Марцін V быў духовым інсьпіратарам крыжовых паходаў супраць чэшскага народу. Рым выслаў амбасадараў у Прагу з мэтай заключыць мір, але чэшскі народ адкінуў караля-здрадніка, які меў кіраваць імі з блаславенства папы. Вайна працягвалася.

Пасьля розных ходаньняў, чэшская дэлегацыя зьвярнулася да Вітаўта — гаспадара Вялікага Княства Літоўскага з прапановай прыняць чэшскую карону. Калі аб гэтым даведаўся папа Марцін V, ён пачаў палохаць Вітаўта крыжовым паходам. Вітаўт не спужаўся папы й яго крыжовага паходу, а памятаючы Гераніма Пражскага, які гасьціў на Беларусі, у знак прыязьні выслаў у Чэхію свайго плямяньніка, князя Жыгімонта, сына Карыбута, як свайго намесьніка. Жыгімонт Карыбут, удзельнік Грунвальдзкай бітвы 1410 году, зь пяцьцю тысячамі беларускага праваслаўнага войска ішоў боем у Чэхію. Ваяваў ён з каталіцкім каралеўскім войскам Жыгімонта Люксэмбургскага й у палове траўня 1422 году ўвайпоў у Прагу вітаны народам.

Жыгімонт Люксэмбургскі ня быў паважаным чэхамі чалавекам, ня меў ён тактыкі й розуму быць разважным палітыкам ці здольным гаспадаром дзяржавы й галоўнакамандуючым арміяй. Ягоныя палітычныя й ваенныя пачынаньні звычайна канчаліся паражэньнямі, але яго падтрымоўваў папа рымскі.

Гусіты ў вайне з каталікамі Жыгімонта Люксэмбургскага мелі посьпех і тут трэба аддаць заслугу другому ўдзельніку Грунвальдзкай бітвы, патрыёту Яну Жыжку. Супольна пралітая кроў беларусаў і чэхаў пад Грунвальдам і на чэшскай зямлі замацоўвала сяброўства абодвух народаў. Жаўнеры Жыжкі, якім памагалі ў баі нават жанчыны, сталі за першабытную Апостальскую царкву й таму востра выступалі супраць касьцельнай герархіі зь яе багацьцямі, прывілеямі, дактрынамі, і дамагаліся ўвядзеньня ў краі дэмакратычнай сыстэмы. Людзі гэтыя пастанавілі ў 1450 годзе выслаць дэлегацыю ў Канстантынопаль дзеля аднаўленьня старых зносін з Усходняй Праваслаўнай царквой. Даную справу, ад імя пражскай гусіцкай кансісторыі, прадставіў у Канстантынопалі Канстанцін Ангелік. У Канстантынопалі праект быў адобраны, але не ажыцьцявіўся ў сувязі з заняцьцем Канстантынопаля туркамі ў 1453 годзе.

Хоць гусіты ў часе вайны не дабіліся свае незалежнасьці, але іхнія дэмакратычныя й гуманныя ідэі не маглі ў Эўропе прайсьці глуха. Яны далі штуршок Рэфармацыі, якая ажывіла ўсю Заходнюю Эўропу й дакацілася да Беларусі. Лютэр у сваёй публічнай дыспуце з Каталіцкай царквой асьведчыў у Лейпцыгу ў 1519 годзе, што навука Яна Гуса мае слушныя пачаткі, праўдзіва хрысьціянскія, што сабор, як і папы, могуць памыляцца. Рэфармацыя была дзейнікам сіл разумовых, якія хацелі зьмяніць існуючы стары парадак.

Дзейнасьць Яна Гуса, як рэлігійнага й нацыянальнага змагара за свабоду, застаецца жыць у памяці чэшскага народу й дзень яго сьмерці — 6 ліпеня — чэхі сьвяткуюць як рэлігійнае й нацыянальнае сьвята.

Таксама доўга жыве памяць аб Яну Гусу ў Ватыкане, які ў ліпені 1925 году злажыў пратэст ураду Чэхаславакіі супраць нацыянальнага сьвята чэхаў у гонар Гуса. Гэтым Ватыкан апраўдваў забойства Яна Гуса й Гераніма Пражскага.

Дзесяткі тысяч нявінных хрысьціян загінулі з рук Сьвятой інквізыцыі, якая была заснавана з волі й блаславенства рымскіх папаў у XII стагодзьдзі. Немагчыма апраўдаць усе гэтыя нікчэмныя злачынствы над простым нявінным народам, якія ўчыняліся Каталіцкай царквой. Папы былі яе га-

лавой, яны мелі ўладу й маглі кожнай хвіліны стрымаць праліцьцё крыві й непатрэбныя мукі-цярпеньні, але ніводзін зь іх гэтага не зрабіў, а яшчэ заахвочвалі інквізітараў да работы. І так было яно да XIX стагодзьдзя й прымалася гэта за нешта зусім нармальнае. Папа Урбан II (1088-1099) пісаў: „Не лічу за мардэрцаў тых, якія праз руплівасьць, або дабро нашай Каталіцкай царквы, забіваюць праклятага".

Два дні да візыту папы Яна Паўла II у Прагу Ватыкан і Чэхаславакія аднавілі дыпляматычныя зносіны. А прысутнасьць у Чэхіі рымскага папы мае быццам выбеліць чорныя плямы, а фактычна змыць засохлую кроў са страніцаў гісторыі, якую пралівалі чэхі праз „непамыльных" рымскіх папаў. Такая дзейнасць рымскіх папаў супярэчыць навуцы Хрысьціянскай царквы супраць Дзесяці Запаведзям, дзе сказана: „Не забівай".

На заканчэньне можна прыпомніць, што Праваслаўныя цэрквы, якія карыстаюцца славянскай мовай, з асаблівым пачуцьцём удзячнасці адносяцца да сваіх сьвятых прапаведнікаў і тварцоў славянскага пісьма й літургіі Кірылы й Мяфодзія. Памяць застаецца жыць, бо дзе-б не былі салуньскія браты, яны ніколі не насілі пры сабе ружжа й не было чутно, каб хто зь іх павысіў голас супраць каго. Былі гэта сапраўдныя хрысьціянскія місіянеры. Яны сваёю рэлігійнаю дзейнасьцю палажылі трывалыя асновы й для культурнага разьвіцьця славянскіх народаў. Але сёньня, больш як за тысячу гадоў, мова салуньскіх братоў, якую завуць царкоўнаславянскай, сталася малазразумелай для бальшыні вернікаў. Таму апошнім часам робяцца захады, каб царкоўнаславянскую літургію перакласьці на сучасную зразумелую для народаў сваю мову.

(„Голас Часу" № 4 (7), № 5 (8), Лёндан, 1990 г.)

Язафат Кунцэвіч і яго аднадумцы

Страшны цень вуніяцкага біскупа Язафата Кунцэвіча зноў пачынае выклікаць горкія ўспаміны сярод праваслаўных беларусаў. Аб гэтым „сьвятым" многа пісалася ў прэсе й нямала гаварылася ў народзе. Шмат хто ведае біскупа-вуніята як асобу, аб дзейнасьці й паводзінах якой канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега пісаў: „Хай Бог баро-

ніць, каб нашая краіна была абясчэшчана гэтакімі гнуснымі паступкамі!" Але за такія „гнусныя паступкі" Каталіцкая царква ўвяла Кунцэвіча ў ранг сваіх „сьвятых". Пасьля Другой Сусьветнай вайны Ватыкан правёў „чыстку" сваіх сьвятых, але Язафата Кунцэвіча пакінуў. Мабыць, яму там і месца, бо-ж, як ведама з гісторыі, рымскія папы пашыралі й устанаўлівалі сваю каталіцкую веру агнём, мячом і праліцьцём нявіннай людзкой крыві праз так званыя Сьвятыя інквізыцыі або Крыжовыя паходы. І ў такой справе вуніяцкі біскуп ня быў апошнім.

Цяжка аднак пагадзіцца з тым, каб такога царкоўнага дзеяча можна было ставіць побач Еўфрасініі Полацкай і Кірылы Тураўскага, якія служылі Богу й народу добрымі павучальнымі прыкладамі хрысьціянскай маралі, ды засталіся праваслаўнымі, а не пярэхрыстамі. І таму ставіць побач іх Язафата Кунцэвіча ёсьць зьнявагай для Праваслаўнай царквы й добрага імя хрысьціянства.

Можна было-б памінуць гэтага, як нашыя продкі называлі, „душахвата", але нельга прайсьці моўчкі тую лухту аб Кунцэвічу, якую хочуць пашырыць вуніяты й іхнія памагатыя, а сярод іх айцец Ян Матусевіч.

Вось-жа ў газэце „Літаратура і мастацтва" (ад 17 жніўня 1990 году, стар. 8) мы знаходзім адказы айца Яна Матусевіча на пастаўленыя яму пытаньні карэспадэнта У. Пучынскага. У адказах духоўнай асобы чытаем прошлае ягоных дзядоў, бацькоў і самога а. Яна Матусевіча, дзе ён гаворыць: „У 1968 годзе я езьдзіў паступаць у тэатральны інстытут, але не прайшоў творчы конкурс. Хутка перайшоў у каталіцкую веру (у дзяцінстве я быў хрышчаны ў царкве, мае бацькі былі праваслаўныя), бо ўсе дзяды й прадзеды былі каталікамі — як лацінскага, так і ўсходняга абраду (г.зн. — вуніятамі) — з пакаленьня вельмі далёкага".

І тут варта прыпомніць а. Яну Матусевічу, што „з пакаленьня вельмі далёкага" ўсе беларусы былі праваслаўнымі, а не католікамі, бо-ж была гэта іхняя першабытная вера, якую прынялі яны з Канстантынопаля, а не з Рыму, і да якой належалі продкі, ня толькі Яна Матусевіча, але й сам Ян Матусевіч. Аб гэтым, што Беларусь спакон веку была праваслаўнай, сьведчаць Барысавыя камяні. Пазьней, калі

мяняліся палітычныя абставіны ў сувязі з Крэўскай вуніяй і Польшча скіравала сваю палітыку на Ўсход, пачалі паяўляцца каталікі на Беларусі. Сытуацыя праваслаўных вернікаў пачала пагаршацца ў выніку каталіцкай рэакцыі. І, каб палепшыць сваё матэрыяльнае становішча, некаторыя праваслаўныя пачалі пераходзіць у каталіцызм, што зрабілі й Матусевічы. Гэты нястойкі рэлігійны дух перайшоў і на сучаснага Яна Матусевіча.

З апошніх інфармацыяў даведваемся, што „ў міжчасе ў жыцьці а. Яна Матусевіча адбыліся зьмены. Зараз ён працуе грэка-каталіцкім сьвятаром у Менску" („Ніва" № 44, 4 лістапада 1990 г., стар. 7).

На Беларусі мае быць 215 каталіцкіх касьцёлаў і толькі ў трох зь іх набажэнствы вядуцца на беларускай мове. Рэшта касьцёлаў знаходзіцца пад апекай польскіх ксяндзоўпалянізатараў. І замест таго, каб застацца каталіцкім сьвятаром і абняць апеку над беларусамі-каталікамі, айцец Ян Матусевіч пайшоў у вунію, каб сярод праваслаўных беларусаў вэрбаваць новыя ахвяры для будучай польскай справы, бо-ж ён вучыўся на ксяндза ў Польшчы. І якое тут можа быць тлумачэньне?

У падтрымку а. Я. Матусевічу гаворыць доктар філялягічных навук, сябра Рэспубліканскай рады ТБМ, каталік, Адам Мальдзіс: „Раней вунія ў нас была толькі знакам „мінус". Але калі ўзяць усе факты ў сукупнасьць, то мы бачым, што справа значна складаней, што побач зь яўнымі мінусамі — таму што ўсё-ж такі вунія ў пэўным сэнсе была навязана народу — у вуніі было вельмі й вельмі многа плюсаў. Адзін зь іх — гэта спроба стварыць рэлігію, якая-б прынесла мір гэтаму народу й якая была-б нацыянальнай рэлігіяй" („Наша слова" № 4, чэрвень 1990 г., стар. 12).

У сваім выказваньні паважаны Адам Мальдзіс сам сабе пярэчыць. Калі ён кажа, што „вунія ў пэўным сэнсе была навязана народу", гэта значыць — накінута яму супраць волі, і да таго чужымі людзьмі, то які тут можа быць мір і гутарка пра нацыянальную рэлігію? На Беларусі быў мір рэлігійны датуль, пакуль Польшча не пачала заводзіць свае парадкі й сілай насаджаць каталіцкую веру, а пасьля й вунію сярод праваслаўных беларусаў і ўкраінцаў. І гэтага міру ня будзе

так доўга, як доўга Ватыкан з польскім Каталіцкім касьцёлам будуць прадаўжаць сваю палітыку на Беларусі.

Ёсьць яшчэ адно выказваньне паважанага А. Мальдзіса зь ягонага апошняга наведаньня Вялікабрытаніі. Вярнуўшыся дамоў, у інтэрв'ю дадзеным Дзіяне Чаркасавай, на яе запытаньне: „Раскажыце, што такое „беларуская вёска", дзе вы жылі?", расказ наступіў такі: „Вёска — гэта вельмі гучнае. Там усяго чатыры двухпавярховыя мураваныя дамы. Адзін — бібліятэка й музей, у іншых жывуць людзі. Насупраць дамоў — беларуская царква. Глядзіцца ўсё вельмі прыгожа, хаця й сьціпла, таму што грошай на куплю дамоў не было. Апошнім часам у бібліятэку й музей паступаюць ахвяраваньні ад беларусаў з Заходняй Германіі, ЗША, Аўстраліі. Такім паступленьням садзейнічае тое, што айцец Аляксандар зьяўляецца апостальскім візытатарам для ўсіх беларусаў у эміграцыі" („Голас Радзімы" № 42, 19 кастрычніка 1989 г. стар. 4).

Тыповы прапагандысцкі жэст, які не адпавядае праўдзе. Айцец Аляксандар не зьяўляецца апостальскім візытатарам для „ўсіх беларусаў у эміграцыі", бо пераважаючая частка эміграцыі — гэта праваслаўныя беларусы, якія маюць сваіх царкоўных герархаў, а айцец Аляксандар зьяўляецца апостальскім візытатарам толькі для католікаў, а гэта й для вуніятаў, колькасьцьцю якіх ён ня можа пахваліцца.

Кожны адзін, хто быў у гэтай „беларускай вёсцы", насупраць дамоў ня бачыў ніякай беларускай царквы, а звычайны дом, унутры якога, у адным большым пакоі зроблена капліца, а ў другіх пакоях жывуць людзі, або яны пустуюць.

Далей сп. Мальдзіс кажа: „Глядзіцца ўсё вельмі прыгожа, хаця й сьціпла, таму што грошай на куплю дамоў асабліва не было". І тут адразу паўстае ў чалавека пытаньне: як гэта магло стацца, што не было грошай на куплю дамоў, а купілася „беларуская вёска"? Тут цуд ня стаўся, грошы зь неба ня ўпалі й беларусы на гэтыя дамы грошай не давалі, а нехта-ж даў. А хто? Перад хатай, у якой знаходзіцца „беларуская царква", умешчана дошка, на якой па-ангельску напісана: „Беларуская каталіцкая місія". І апошняя наіўнасьць: быццам таму, што айцец Аляксандар Надсон зьяўляецца апостальскім візытатарам для ўсіх беларусаў у эміграцыі, паступаюць ахвяры.

Такая пісаніна многа каму з праваслаўных беларусаў не падабаецца й яны зьвярталіся ў гэтай справе ў рэдакцыю „Голасу Часу". Але што тут можна зрабіць, калі гэтым тытулам, ці прэтэнзіяй да ўсіх беларусаў у эміграцыі, падпісваецца часам сам айцец Аляксандар Надсон, нягледзячы на тое, што сваіх беларусаў-католікаў у Вялікабрытаніі можа палічыць на пальцах аднае рукі, ды няшмат іх больш і на іншых кантынэнтах.

Аднак апошнім часам знаходзяцца людзі, напрыклад, прафэсар Юры Хадыка, намесьнік старшыні БНФ „Ажраджэньне", які ў інтэрв'ю часопісу „Тыгоднік беластоцкі" гаворыць такія дзівосы: „Неабходна адраджэньне Вуніяцкай царквы. Гэта-ж аўтэнтычнае веравызнаньне беларусаў, якое выводзіцца непасрэдна ад прыняцьця хрысьціянства й якое можа нас усьцерагчы ад атэізму. (...) І таму Фронт, не зважаючы на супярэчнасьці, імкнецца адрадзіць вуніяцкую рэлігію — стрыжань беларускай культуры" („Ніва" № 36, 9 верасьня 1990 г., стар. 1).

Як хто, а паважаны прафэсар павінен ведаць, што вуніяцтва ня ёсьць аўтэнтычным веравызнаньнем беларусаў і яно не выводзіцца непасрэдна ад прыняцьця хрысьціянства. Розьніцы паміж Усходнім і Заходнім хрысьціянствам наглядаліся ад самых раньніх пачаткаў арганізацыі Хрысьціянскай царквы. Яшчэ далёка да вуніяў гэтыя розьніцы захаваліся да нашага часу. У 1988 годзе сьвяткаваўся міленіюм хрышчэньня Русі, якое прынялі продкі беларусаў і ўкраінцаў з Канстантынопаля, а не з Рыму, ды нават Рымская царква карысталася грэцкаю мовай у сваёй літургіі й кнігах, якія прыйшлі з Грэцыі.

Ёсьць праўдай, што рымскія папы хацелі накінуць Русі сваю ўладу, але яна была адкінута. Напрыклад, у 961 годзе ў Кіеў прыбыла місія на чале зь біскупам Адальбэртам з манастыра ў Лятарынгіі. Сам біскуп вярнуўся дамоў нічога не асягнуўшы, але шчасьліва. Аднак сярод яго духоўных былі ахвяры. Так іх прынялі на Русі. У гэтым ужо часе хрысьціянства было добра вядомае на славянскай Русі.

У Густынскім летапісе гаворыцца: „Вь лето 886 прииде Михаил митрополит въ Русь послан отъ Василия Македонина: царя греческого, и Фотия патриарха". А ў часе княжань-

ня ў Кіеве Яраполка, брата Ўладзіміра, гаворыць летапісец: „Того же лета придоша к Ярополку из Рима послы". І нават пасьля прыняцьця хрысьціянства, папа два разы прысылаў сваё пасольства да князя Ўладзіміра, якое ў 991 годзе суправаджалі паслы каралёў Польшчы й Чэхіі, а ў 1000 годзе суправаджалі паслы каралёў Чэхіі й Мадзьяршчыны. Былі гэта прадстаўнікі заходніх каталіцкіх дзяржаваў найбольш высунутых на Ўсход і праз іх Рым хацеў пашырыць сваю веру далей на Ўсход.

Уладзімір напэўна ведаў праступныя паводзіны рымскіх папаў тае пары й напэўна памятаў свае паводзіны будучы паганінам. Але цяпер, як сапраўдны хрысьціянін, Уладзімір застаўся верны саюзу з грэкамі. Канстантынопаль быў больш талерантны за Рым у царкоўных пытаньнях, а падругое, славіўся сваёй высокай культурай і цывілізацыяй.

Мы ўжо няраз у прэсе чыталі буйды вуніяцкіх аднадумцаў пра так званую „беларускасьць", якую вуніяты, быццам, перахоўвалі праз сваю Царкву. Тут варта напомніць паважанаму Ю. Хадыку, што сабор вуніяцкіх біскупаў у Замосьці (1720 г.) увёў польскую мову ў казаньні й царкоўную адміністрацыю, а ў Магілёве, Мсьціслаўі й Воршы пастаўлены былі лацінскія біскупы. І гэта, паводле паважанага прафэсара Ю. Хадыкі, мае быць „стрыжань беларускай культуры".

Калі такую недарэчнасьць гаворыць намесьнік старшыні БНФ „Адраджэньне", дык што думаюць аб гэтым праваслаўныя сябры БНФ? Ці яны ня бачаць каму служыць Юры Хадыка й якое замяшаньне ўводзіць ён у БНФ?! Тут павінны сказаць сваё слова праваслаўныя беларусы з Беларускага народнага фронту.

Знаходзім яшчэ адно малаверагоднае цьверджаньне доктара гістарычных навук, прафэсара А. Грыцкевіча, які ў сваім артыкуле „Стэрэатыпы й гістарычная рэчаіснасьць" піша: „Паводле Статуту Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. польская шляхта й магнаты ня мелі права перасяляцца й купляць, набываць у спадчыну або атрымліваць іншым спосабам землі, маёнткі, мястэчкі ў Вялікім Княстве Літоўскім, ня мелі яны права й атрымліваць дзяржаўныя пасады тут. Словам, не было ніякага нацыянальнага прыгнёту да XVIII ст. Іншая справа, што ў XVII-XVIII ст.

ст. значная частка шляхты стала карыстацца польскай мовай, аднак беларуская мова ў 1696 г. не была забаронена, а толькі дзяржаўныя акты й афіцыйныя паперы складаліся адгэтуль на польскай мове. Але гэта яшчэ не прыгнёт, а тагачасная палітыка нацыянальнага нігілізму, што праводзілася беларускай шляхтай. Што такое нацыянальны нігілізм мы добра ведаем па сучаснаму становішчу. Тое-ж можна сказаць і пра выдуманы ў XIX ст. і падтрыманы афіцыйнымі гісторыкамі ў 70-80-х гадах XX ст. тэзіс аб рэлігійным прыгнёце беларусаў. Які гэта прыгнёт, калі ў канцы XVIII ст. у Беларусі праваслаўных засталося толькі 6,5 працэнта ўсяго насельніцтва. 75 працэнтаў беларусаў былі уніятамі. То які гэта нацыянальна-рэлігійны прыгнёт?" („Настаўніцкая газэта" № 82, 13 кастрычніка 1990 г., стар. 3).

На такія разважаньні праф. А. Грыцкевіча можна даць абшырны адказ. Але я ня буду тут многа палемізаваць, а толькі паважанаму А. Грыцкевічу прывяду прыклад Сталінскай Канстытуцыі, якая давала народам СССР вялікія нацыянальныя й рэлігійныя правы. А што было ў сапраўднасьці? Таксама й Статуты ВКЛ пісалі адно, а рабілася што другое. Забарона вядзеньня дакумантацыі на беларускай мове, гэта ў сп. А. Грыцкевіча „не прыгнёт".

Ужо Люблінская вунія 1569 году перакрэсьліла тое, што было напісана ў Статутах ВКЛ, і што дазволіла палякам набываць зямельнае дабро ў ВКЛ за ваенныя заслугі. Ды нават у часе Люблінскай вуніі частка зямель ВКЛ была прыдзелена да Кароны Польскай.

Калі-ж паводле праф. А. Грыцкевіча не магло быць на Беларусі палякаў і не было прыгнёту, то якім цудам шляхта й магнаты прымалі каталіцкую веру й палянізаваліся, а дзяржаўныя акты пісаліся па-польску, а часам па-латыні, а не на іншай мове? Ці-ж беларусам у той час настолькі абрыдла свая дзяржаўная мова, што яны пачалі пераходзіць на польскую? Ці-ж непадобным спосабам у 1930-х гадах за Сталіна й яго наступнікаў беларусы пачалі пакідаць родную сваю мову й пераходзіць на расейскую? Гэта сама адносіцца й да „75 працэнтаў вуніятаў" і толькі 6,5 працэнтаў праваслаўных, якіх налічыў паважаны гісторык А. Грыцкевіч. І такую „гісторыю" паўтарае Уладзімір Арлоў: „Па-

водле падлікаў А. Грыцкевіча, да вуніятаў у канцы XVIII стагодзьдзя належала тры чвэрці насельнітва Беларусі" („Літаратура і мастацтва" ад 16 лістапада 1990 г., стар. 14).

Нават польскія эміграцыйныя гісторыкі зь імпэрыялістычнымі схільнасцямі прызнаюць: „Вунія не ахапіла ўсяе артадаксальнай праваслаўнай Русі ў граніцах ВКЛ" („Дзее зем Велькего Ксенства Літэвскего", Лёндан 1953, стар. 72).

Зусім талкова на справу вуніі глядзіць польскі прафэсар В. Чаплінскі: „Польшча ганарылася да гэтага часу сваёй талерантнасцю, а фактына ўвайшла на дарогу неталеранцыі ў адносінах да праваслаўя, змусіла вернікаў гэтай Царквы пайсьці ў падпольле, выклікаючы ў шырокіх колах рускага народу пачуцьцё глыбокай крыўды. Не шмат памагло, што афіцыяльна Вуніяцкая царква была гарой, што захавала яна славянскую літургію, што дазваляла сужэнства сьвятарам. Народ усходніх зямель ня мог яму (каралю) дараваць гэтага, што прызнаў першагерархам Царквы папу, што ў паасобных пунктах адступіў ад догмаў, якія праз стагодзьдзі баранілі праваслаўе" („Зарыс дзеюў Польскі до року 1864", стар. 240).

Падобна аб вуніі выказваецца другі польскі гісторык Марцэлі Косман. Ён піша, што дзяржаўныя ўлады перасталі ўважаць усходнюю рэлігію, якую называлі дызуніцкай, аднак яна мела падтрымку ў масах. Калі адсоўвалі сьвятароў верных Канстантынопалю, а на іх месца стаўлялі вуніятаў, дык людзі абкідалі іх камянямі. Вуніяцкія манастыры пусьцелі. Нават на захадзе Беларусі, у Берасьці, народ пераходзіў у сваю праваслаўную царкву, а не хацеў ісьці ў вуніяцкую (1639). Падобна было й у Пінску. І ў канцы М. Косман піша: „Такая сытуацыя не стварала найлепшых пэрспэктываў, год 1596 падмануў надзеі на аб'яднаньне русінаў з католікамі" („Гісторыя Бялорусі", Вроцлав 1979, стар. 141).

Так выглядала ў сапраўднасьці справа вуніі на Беларусі й Украіне. А сёньня гэты чужы й варожы беларускаму народу вуніяцкі твор некаторыя беларускія дзеячы размалёўваюць ружовымі фарбамі, каб увесьці ў зман неабазнаных з гісторыяй вуніі беларусаў.

Карэспадэнт У. Пучынскі паставіў такое пытаньне а. Яну Матусевічу: „Пасьля «Дзядоў» у беларускай каталіцкай сьвятыні адбылося сьвяткаваньне ўгодкаў забойства вуніяцкага

сьвятога — біскупа Кунцэвіча. Чаму вы, каталіцкі сьвятар, таксама далучыліся да гэтага?" Адказ наступіў такі: „Я скажу, што гэта ня толькі вуніяцкі біскуп. Ён — і католік. Што значыць вуніяты? Гэта католікі ўсходняга абраду". „Але-ж гісторыкі кажуць, — працягваў карэспандэнт, — што Кунцэвіч быў пакараны заслужана, сінтэзу дзьвюх культур, дзьвюх вер ён дамагаўся нечалавечымі мэтадамі, вёў непрыстойны лад жыцьця". На гэта а. Ян Матусевіч адказаў: „Я з гэтым ня згодзен. Лічу, што гэта домыслы ворагаў вуніі, ворагаў сьв. Язафата Кунцэвіча, ворагаў Каталіцкай царквы. Гісторыя ня кажа аб гэтым канкрэтна. А домыслы могуць быць розныя".

Такімі адказамі а. Я. Матусевіч паказаў сябе як далёка ён стаіць ад гістарычнай праўды й у сапраўднасьці закрывае вочы ды ня хоча бачыць яе й чуць. Гістарычную праўду называе „домысламі", бо праўда кампраметуе „сьвятога" праступніка. Аб гэтым вуніяцкім „сьвятым" крытычна гаварылі ня толькі праваслаўныя, але й каталікі. Найлепшы гістарычны й канкрэтны факт — гэта пісьмо канцлера Вялікага Княства Літоўскага Льва Сапегі да самога „сьвятога" Язафата. Сапега быў высокаадукаваным, вопытным палітыкам, парлямантарыем, юрыстам, дыпляматам і аўтарам слаўнага Статута Літоўскага, з голасам якога лічыўся кароль. Ягонае пісьмо да Кунцэвіча было замешчана ў „Голасе Часу" № 4 за 1990 год і яшчэ раз яго замесьцім, каб пры нагодзе мог яго пабачыць, прачытаць і пераканацца а. Ян Матусевіч, што кажа канкрэтна гісторыя аб гэтым „душагубе". Леў Сапега быў у той час каталіком, падтрымоўваў і прапагандаваў вунію, але не праступную дзейнасьць аднаверца Язафата.

У 1619 годзе Кунцэвіч выхлапатаў у караля грамату на падпарадкаваньне сабе ўсіх праваслаўных цэркваў у Полацкай епархіі. Маючы дакумант караля, Кунцэвіч у гэтым-жа годзе паехаў у Магілёў, каб там накінуць жыхарам сваю вунію. Але, як яны даведаліся, што едзе Кунцэвіч, замкнулі гарадзкія вароты, заселі на вале й навялі на вуніята гарматы. Гараджане пагражалі Кунцэвічу сьмерцю, калі ён не адыдзе ад гораду. Кунцэвіч вярнуўся ў Полацк, але й тут ня меў посьпеху. Прагналі Кунцэвіча й жыхары Воршы, куды ён прыехаў з гэтай самай мэтай.

Праваслаўныя зналі, што ім пагражае небясьпека й таму палачане дамовіліся з жыхарамі Віцебска, Магілёва, Вільні, Воршы й стварылі тайны саюз — самаабарону супраць наступу вуніятаў на чале з Кунцэвічам. Сувязь гэтую падтрымоўвалі праваслаўныя брацтвы.

Пасьля сваёй няўдачы ў Магілёве й Оршы Кунцэвіч зноў паехаў у Варшаву да караля Жыгімонта III з жалабай. Кароль падпісаў спэцыяльны ўнівэрсал, якім караў сьмерцю праціўнікаў вуніі. А ў часе каранацыі Жыгімонт III абяцаў захаваць спакой у дзяржаве, аднак стаў праціўнікам „дысыдэнтаў" — праваслаўных.

Ці-ж ня ёсьць гэта зьнявага, злачынства й садызм у адносінах да праваслаўных? „Дня 22 чэрвеня 1620 г. у Траецкі манастыр пад Полацкам сабраліся многія праваслаўныя вернікі з акалічных прыходаў і манастыроў, з хрэснымі ходамі, для ўзьняцьця пратэсту супраць гвалту вуніята Кунцэвіча. Ваявода, паляк і каталік, загадаў сваім гайдукам і казакам разграміць гэту маніфэстацыю праваслаўных. Хрэсныя ходы, ідучыя дарогамі ў манастыр, былі крывавым тэрорам і забойствамі разагнаныя. Уначы манастыр быў акружаны збройнымі людзьмі полацкага ваяводы, вада была адрэзана, а нарэшце манастыр быў спалены з мноствам сабранага там народу. На суседнім узгорку Кунцэвіч з гайдукамі ваяводы служыў малебень удзячнасьці, пры полымі пажару манастыра й пры крыках кананьня праваслаўннх, гінуўшых у агні" („З гісторыі Праваслаўнай царквы беларускага народу", Нью-Йорк 1956, стар. 28).

Будучы думны са свае ўдачы — унівэрсалу, дадзенага каралём, Кунцэвіч забараніў хаваць памерлых без выкананьня вуніяцкага абраду. Калі адзін з праваслаўных мяшчан пахаваў памерлага сына па сваім праваслаўным абрадзе, Кунцэвіч загадаў адкапаць труп і пахаваць па вуніяцкім абрадзе. Такімі пачынаньнямі Кунцэвіч выклікаў да сябе ўсеагульную нянавісьць і людзі пачалі зваць яго „душагубам". Рэакцыяй на такія й падобныя паводзіны біскупа Кунцэвіча быў ліст канцлера Л. Сапегі наступнага зьместу:

„Цераз надужываньне вашэцявага аўтарытэту, і вашэцявы паступкі, якія барджэй бяруць пачатак зь нікчэмнасьці, асабістай нянавісьці, чымся зь міласэрнасці да вашэцявых

бліжніх, — што знаходзіцца ў яскравай супярэчнасьці з правамі нашае краіны, — вы раздзьмухалі гэтыя небясьпечныя іскры, якія могуць выклікаць усёзьнішчальны агонь. Паслухмянасьць перад правамі нашае краіны ёсьць болей патрэбная, чымся вунія з Рымам. Нямудрае распаўсюджваньне вуніі шкодзіць вялічнасьці сувэрэна. Трапным ёсьць імкненьне, каб быў адзін пастыр і адзін статак; трэба імкнуцца з развагаю й не тасаваць „когі інтрэ", якое супярэчыць нашым правам. Агульнае аб'яднаньне можа зрэалізавацца толькі праз любоў, але не на дарозе гвалту; таму няма чаго дзівіцца, што наш аўтарытэт напатыкае на супраціў. Вашаць піша мне, што вашэцявае жыцьцё ёсьць у небясьпецы; а я думаю, што гэта вашаць сам вінаваты. Вашаць кажа, што змушаны ў цярпеньнях ісьці сьледам першых епіскапаў. Крочаньне сьледам вялікіх пастыраў запраўды ёсьць годным пашаны, і вашаць павінны ісьці іхняю пабожнасьцю, навукаю й далікатнасьцю. Чытайце іхнія жыцьцяпісы, і вашаць у іх ня знойдзе, каб яны каго-небудзь прыводзілі ў суд Антыёхіі або Канстантынопаля; тады як усе нашыя судовыя ўстановы завалены знаходзяцца вашэцявымі прасьледаваньнямі. Вашаць кажа, што ёсьць змушаны бараніцца перад агітатарамі. Хрыстос, будучы прасьледаваным, не бараніўся ад іх, але маліўся за тых, што прасьледавалі Яго: гэтак павінен і вашаць паступаць, замест распаўсюджаньня абразьлівых пасланьняў або выгражаць пагрозамі; гэтакіх прыкладаў апосталы не пакінулі нам. Вашэцявы сьвяты абавязак заключаецца ў тым, што вы дазваляеце грабіць схізматыкаў, і адсякаць галовы: Евангельле вучыць зусім іншаму. Гэтая вунія стварыла вялікую бяду. Вы ўводзіце гвалт над сумленьнем, і вы замыкаеце цэрквы, затым хрысьціяне гінуць, як пагане, без багаслужбы й тайніцаў веры. Вашаць злоўжывае аўтарытэтам манарха, нават ня просячы дазволу на яго ўжываньне. Калі-ж вашэцявы дзеяньні выклікаюць разрухі, вашаць зараз-жа піша нам, што патрэбным ёсьць пакараць праціўнікаў вуніі. Хай Бог бароніць, каб наша краіна была абясчэшчана гэтакімі гнуснымі паступкамі! Каго вашасьць навярнуў сваёю жорсткасьцю? Вашаць адапхнуў аднойчы ляяльных казакаў; вы зьіначылі авечак у казлоў; вашаць сьцягнуў небясьпеку над краінаю

й магчыма зьнішчэньне для католікаў. Вунія не прынесла радасьці, адно толькі нязгоду, сваркі й бязладзьдзе. Было-б шмат лепей, калі-б яна ніколі ня мела месца сярод нас. Цяперака, я паведамляю вашэця, што загадам караля, цэрквы маюць быць адчыненымі й перададзенымі праваслаўным, каб яны маглі выконваць свае багаслужбы. Мы не забараняем жыдам, ані магамэтанам мець свае дамы для багаслужбы, а вы запіраеце хрысьціянскія сьвятыні. Я атрымліваю пагрозы з усіх старон нашага краю, што ўсе сувязі з намі будуць парванымі. Вунія ўжо пазбавіла нас Старадуба, Сівершчыны й іншых местаў і крэпасьцяў. Высьцерагайцеся, каб гэтая вунія не спрычынілася да вашэцявага й нашага зьнішчэньня.

12 красавіка 1622 г.

Леў Сапега".

Канцлер Леў Сапега, як бачым, напомніў вуніяцкаму біскупу Кунцэвічу ягоныя нетактоўнасьці й незаконнасьць такіх паводзін, якія прыносяць шкоду ня толькі Праваслаўнай царкве, але й Каталіцкай ды дзяржаве. Нават вуніяцкі мітрапаліт Руцкі быў занепакоены паводзінамі свайго біскупа. На жаль, ліст канцлера Льва Сапегі не прамовіў да розуму полацкага біскупа-фанатыка.

Шукаючы права на нікчэмныя паводзіны Кунцэвіча, польскаму сойму ў 1623 годзе было пададзена прашэньне ад імя Беларусі наступнага зьместу: „У Беларусі, у Воршы й Магілёве уладыка полацкі (вуніят) Язафат Кунцэвіч запячатаў цэрквы й пяць гадоў трымае іх так. У Полацку й Віцебску мы ня можам мець багаслужбаў у царкве, ні дома. (...) Але, што горш за ўсё складае варварства й зьверства неймаверныя, у тым-жа беларускім Полацку, той-жа адступнік уладыка (Кунцэвіч), каб дасадзіць тамашнім мяшчанам, загадаў выкапаць нядаўна пахаваныя каля царквы хрысьціянскія целы памерлых і кінуць на зьядзеньне сабакам, як нейкую падаль" („Полоцка-Витебская старина", т. 1, Витебск 1911, стар. 23).

Чужы да гэтай рэлігійнай справы ангельскі гісторык Норман Дэвіс, які займаецца гісторыяй Польшчы, піша; „Архіепіскап Кунцэвіч ня быў чалавекам мірным, ён быў замешаны ва ўсякі прыгнёт, (...) адмаўляў праваслаўным сяля-

нам хаваць сваіх памерлых на самаахвярнай зямлі". А нам прафэсар А. Мальдзіс стараецца ўнушыць, што адным з плюсаў уніі была спроба стварыць рэлігію, якая-б прынесла мір гэтаму народу й якая была-б нацыянальнай". Ці-ж ня ёсьць гэта навука езуіта Ляёлі, які вучыў: „Калі нават нашым вачам нешта выглядае белае, але касьцёл уважае за чорнае, дык трэба прызнаць за чорнае".

Падобна пісаў і праф. А. Грыцкевіч, што на Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага, у канцы XVIII стагодзьдзя было толькі 6,5 працэнта праваслаўных, а 75 працэнтаў вуніятаў. І тут я прывяду яшчэ адзін сказ з працы польскага гісторыка М. Космана, які падае, што ў шматнацыянальным складзе ВКЛ „побач каталікоў моцныя былі праваслаўныя русіны (вуніяты знаходзіліся ў значнай меншасьці)" („Протэстанці і контррэформацыя", Вроцлаў 1978, стар. 69).

Кунцэвіч вядомы быў на Беларусі са сваёй суровасьці да праваслаўных. Калі ён прыехаў у Віцебск, каб пакончыць з праваслаўем, то ў першую чаргу загадаў узяць, пабіць і кінуць у турму праваслаўнага сьвятара Ільлю за тое, што ён патаемна адпраўляе праваслаўныя багаслужбы. Гледзячы на такое захаваньне „духоўнай" асобы, у горадзе выбухла паўстаньне-рэвалюцыя. Збунтаваныя віцябляне, у разгары злосьці, забілі вуніята Кунцэвіча, прывязалі яму камень да шыі й кінулі ў Дзьвіну. Сталася гэта ў нядзелю 12 лістапада 1623 году, што прадбачваў сам Кунцэвіч і перад чым асьцерагаў яго канцлер Леў Сапега.

З гэтае прычыны 10 лютага 1624 году папа Урбан VIII пісаў да польскага караля Жыгімонта III Вазы: „Хай будзе праклятый той, хто стрымае меч ад крыві (...) і ты, дзяржаўны кароль, не павінен устрымацца ад мяча й агня, хай ерась адчуе, што за суровымі злачынствамі ідуць пакараньні".

Так, віцябляне ўчынілі злачынства, забілі чалавека, які быў сьлепа адданы Рымскай царкве, папу й за гэта папа настойваў, каб адпомсьціць мячом, крывёй і агнём. Папа пісаў, што „за суровымі злачынствамі ідуць пакараньні". Але якія суровыя злачынствы рабіў вуніяцкі біскуп Язафат Кунцэвіч у адносінах да праваслаўных і якое ён павінен быў панесьці пакараньне, аб гэтым рымскі папа прамаўчаў. Зна-

чыць, Кунцэвіч рабіў добра. Неўзабаве папа дамагаўся ад свайго каталіцкага духавенства, каб яно пазбавіла дысыдэнтаў і праваслаўных усякіх правоў і ўвяло адну каталіцкую веру ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Усё-ж сьмерць Язафата Кунцэвіча схіліла вуніяцкага мітрапаліта В. Руцкага да пошукаў паразуменьня з дысыдэнтамі. Перагаворы пачаліся ў 1623 годзе й няраз абмяркоўваліся на сойме. Прапанавалася стварыць у Польшчы асобную патрыярхію, незалежную ад Канстантынопаля. Але на гэта не згадзіліся кіеўскі праваслаўны мітрапаліт Барэцкі й праваслаўныя брацтвы. Вуніятам і палякам хадзіла, каб адарваць праваслаўных Рэчы Паспалітай ад Канстантынопаля й зрабіць іх сэктантамі пад сваёй уладай. У гэтым духу працаваў і вуніяцкі мітрапаліт Руцкі: „Каб наблізіць вуніяцтва да каталіцызму, ён (мітрапаліт Руцкі) загадаў пераабсталяваць манастыры па ўзору васіліянскіх — у цэрквах заводзіліся арганы, выкідаліся іканастасы. Скардзіцца на бясчынствы й нахабства вуніятаў не было куды, бо суды Рэчы Паспалітай заўсёды трымалі іх бок. Праваслаўная царква знаходзілася ў цяжкім становішчы: парадзела духавенства; на тэрыторыі ўсёй дзяржавы некаторы час быў толькі адзін праваслаўны епіскап — Яўстафій Тысароўскі ў Львове. Да яго й зьвярталіся за пасьвячэньнем праваслаўныя сьвяшчэньнікі" („Учарашні й сёньняшні дзень Уніяцкай царквы", Мінск 1985, стар. 20-21).

За плячыма вуніятаў стаялі палякі, якія, падтрымліваючы іхнюю разбуральную работу Праваслаўнай царквы, вялі адначасна й сваю палянізацыйную акцыю. Як піша В. Пануцэвіч у сваім вуніяцкім выданьні, „усе школы, як і мясцовая адміністрацыя й судаводзтва, карысталіся польскай мовай як выкладовай і ўрадавай. Гэтаксама польская мова сталася пануючай у Каталіцкай царкве абодвух абрадаў" („Берасьцейская вунія", Чыкага 1972, стар. 125).

А нам некаторыя беларускія прафэсары дураць голаў аб нейкай беларускасьці, якую быццам перахоўвала Вуніяцкая царква на Беларусі й што не было ніякага прымусу над беларускай мовай.

Прасьлед і сьмяротныя пакараньні вінаватых і невінаватых у забойстве Кунцэвіча не спалохалі праваслаўных вер-

нікаў. Іхнія брацтвы й цэхі надалей вялі сваю ажыўленую дзейнасьць, якая моцна непакоіла вуніятаў. Аб гэтым сьведчыць рапарт вуніятаў да рымскага папы ў 1624 годзе:

„Такія брацтвы (праваслаўныя) надзвычай пашыраліся па ўсіх меншых гарадох, і цяпер, пачынаючы з Кіева, утварылі як-бы нейкую новую дзяржаву. Калі назначаюцца агульныя дзяржаўныя соймы, яны тайна склікаюць свае сходкі й, сабраўшы грошы, адсылаюць пісьмы й выбраных за жалабаю й бранью супраць нас па ўсіх мясцовых соймiках, якія зьбіраюцца шэсьць тыдняў перад соймам. (...) Такі спосаб супрацьдзеяньня вуніі прыносіць нам вялікія шкоды. Праўда, у брацтвах дзейнічаюць людзі больш ніжэйшых слаёў, але яны маюць магчымасьць зьбіраць вялікія грошы й усе іх слухаюць; па сваім баку яны маюць многа дваран. Пры гэтым брацтвы існуюць у гарадох, дзе знаходзяцца нашы катэдральныя цэрквы. Тут жывуць адны гараджане, якія займаюцца гандлем і розным рамяством; пры іхнім супрацоўніцтве яны наносяць нам не абы-якую шкоду. Пасылаючы многа маладых купцоў па ўсім Вялікім Княстве Літоўскім, яны перацягваюць ад нас клір і робяць гэта ня толькі ў Вільні, але, зь вялікай хуткасьцю, па ўсіх гарадах і мястэчках" (П. Батюшков, „Белоруссия и Литва", стар. 218-219).

Такі рапарт ня мог застацца без увагі папы рымскага, які сачыў за справай і даваў указаньні польскаму каралю, а той праз сваіх памагатых рабіў націск на праваслаўных.

А вось што піша каталік Вацлаў Ластоўскі: „Тым часам «дысыдэнты» (праваслаўныя), ціснутыя за веру ў Беларусі, пачынаюць уцякаць на Украіну да тамтэйшых вольных казацкіх дружын, нясучы туды кліч змаганьня за веру" („Кароткая гісторыя Беларусі", Вільня 1910, стар. 64). Падобна піша польскі гісторык К. Піварскі: „Мэтады, якія прымянялі каталікі й вуніяты ў адносінах да веры (праваслаўнай) пры падтрымцы дзяржаўных уладаў, стваралі ў верных праваслаўю шырокіх масах украінскага й беларускага народаў глыбокае пачуцьцё крыўды, што было повадам іхняга недаверу да польскай дзяржаўнасьці й змушала іх шукаць апекі па-за граніцамі дзяржавы. Належыцца зазначыць, што прасьлед дызуніі вязаўся з клясавай барацьбой. Польскія феадалы разам з каталіцкім клірам пераадольвалі дызунію

як адзін зь дзейнікаў узмацняючых супраціў украінскага й беларускага народаў" („Гісторыя Польскі од половы XV в. до 1795 р., Варшава 1962, стар. 184).

Такім чынам, стварыўшы Вуніяцкую царкву дзеля свае палітычнай мэты, польскі каталіцызм пасоўваўся на Ўсход, карыстаючы помаччу шляхецкай Рэчы Паспалітай. Калі толькі ў XVIII стагодзьдзі Польшча пачула сваё панаваньне на землях Беларусі й Украіны, то пакарысталася падтрымкай Каталіцкай царквы, бо за войскам і адміністрацыяй ішлі польскія ксяндзы са сваімі місіянерамі й школамі.

Незадаваленьне народных масаў Беларусі й Украіны, а бадай найбольш казацкі рух спрычыніліся да таго, што справа праваслаўнай веры няраз ставілася на польскім сойме. Адным зь яе гарачых абаронцаў быў Афанасій Філіповіч, ігумен манастыра ў Берасьці, які ў царкве й на вуліцы выкрываў дзейнасьць вуніятаў.

Філіповіч быў высокаадукаваным чалавекам, выдатна валодаў польскай, лацінскай, грэцкай, царкоўнаславянскай і сваёй роднай мовай. Быў ён беларускім пісьменьнікам і публіцыстам. У змаганьні за Праваслаўную царкву голас Філіповіча чуваць было на соймах у Варшаве ў 1641 і 1643 гадах. Пасьля свайго апошняга выступленьня на сойме перад каралём Уладыславам IV Афанасій быў арыштаваны. Ён кідаў каралю яўныя пагрозы: „Если унею проклятую выкорните, а усходнюю правдивую церковь успокоите, то щасливые лета пожывете. А если не успокоите веры правдивое Грецкое и не знесете унеи проклятой, то дознаете запевне гневу Божего. (...) Обирай же, што хоч, пока час маеш". Вострае выступленьне А. Філіповіча на сойме й наогул варожыя адносіны да існуючага парадку ў Рэчы Паспалітай сталі прычынай яго арыштаваньня. І аж да сьмерці мітрапаліта П. Магілы (1 студзеня 1648 г.) трымалі яго, калі не ў турме, то пад арыштам у манастыры.

Карыстаўся Афанасій свабодай коратка. 1 чэрвеня 1648 году яго арыштавалі трэці раз і то ў часе літургіі. Абвінавацілі яго за зносіны з казакамі Багдана Хмяльніцкага, за праклёны вуніі, за здраду дзяржаўных інтарэсаў. Хоць ягоная віноўнасьць не была даказана, аднак Афанасій быў прызнаны віноўным.

Сьпярша яго мучылі, дамагаліся пакаяньня ў сваіх праступствах, патрабавалі змяніць свае адносіны да вуніі, на што Філіповіч адказаў: „Што юж рекл, том рекл, и з тым умираю" й тут, па загаду палякаў, 15 верасьня 1648 году яго застрэлілі ў лесе каля вёскі Германовічы, недалёка Берасьця.

Афанасій Філіповіч ня быў з тых рахманых праваслаўных духоўных, што часта ішлі на ўступствы сваім працiўнікам, каб толькі захаваць сваё цёплае месца. Ён адкрыта й голасна дамагаўся рэлігійнай і нацыянальнай справядлівасьці, якую ў той час цяжка было знайсьці, а хутчэй можна было знайсьці за гэта кару сьмерці. І яна яго спаткала як стойкага абаронцу свае праваслаўнай веры.

Вяртаючыся да забойства Язафата Кунцэвіча ў Віцебску прыгадаем, што за гэта было прыгаворана на кару сьмерці 120 віцяблян. Зь іх пакарана 20 чалавек, астатнім удалося ўцячы й схавацца ад сьмерці. Затое многа гараджан трапіла ў турму й нямала падвярглося цялесным пакараньням — адлупцавалі бізуном, канфіскавалі маёмасьць, каго выгналі з гораду. Горад пазбавілі магдэбургскага права, разбурылі ратушу й зьнялі званы, якія заклікалі народ на паўстаньне, а жыхароў аб'явілі вуніятамі. Пакараньне праваслаўных, як бачым, было строгае.

Такімі вось мэтадамі пашыралася каталіцкая экспансія, змушаючы людзей падпарадкавацца рымскаму папу.

Пахавалі вуніята Кунцэвіча ўрачыста ў саборнай царкве. Памяць яго „сьвятасьці" акружылі легендамі аб розных цудах, якія быццам адбываліся пры яго магіле. У сучаснай газэце чытаем: „Пакутніцкі крыж Язафату Кунцэвічу. 12 лістапада ў Віцебску была спроба паставіць асьвечаны крыж беларускаму вуніяцкаму біскупу Язафату Кунцэвічу на месцы ягонага забойства ў гэты дзень 1623 году" („Свабода" № 12, лістапад 1990 г.). На згаданую „ўрачыстасьць" прыехаў са Львова ў Віцебск вуніяцкі сьвятар Сэбасьціян, каб ушанаваць памяць свайго земляка, але гэтая прапагандысцкая афёра не ўдалася. Было-б намнога лепш, каб вуніяты замест аддаваць пашану кату праваслаўных беларусаў, пачалі маліцца за тыя нявінныя ахвяры, памардаваныя каталіцкай Сьвятой інквізыцыяй, якая замест сапраўднай на-

вукі Хрыста паліла й рубала ўсіх тых, хто не хацеў пакланіцца рымскаму папу.

Праваслаўныя беларусы павінны зразумець дзейнасьць Язафата Кунцэвіча на Беларусі й не дазволіць каталіцкай агентуры рабіць насьмешку над імі. Я. Кунцэвіч з паходжаньня й веры быў чужым чалавекам на Беларусі.

Такая была палітыка езуітаў, што й па сьмерці Кунцэвіча працягваўся прасьлед праваслаўных, каб загнаць іх у вунію. Папа Урбан VIII у сваёй грамаце мітрапаліту Вельямін Руцкаму (1613-1637) прызнаў ягоную заслугу ў прыцягненьні да вуніі каля двух мільёнаў праваслаўных. Нават езуіты наракалі на жорсткасьць Руцкага, якую ён прымяняў да людзей, змушаючы іх перайсьці ў вунію. Мітрапаліт Руцкі жыў у Наваградку й таму яго дзейнасьць скіравана была ў першую чаргу супраць праваслаўных беларусаў.

Але не заўсёды вуніятам і каталікам ўдавалася накінуць вунію праваслаўным. Напрыклад, уладальнік Глуска Канстанцін Палубенскі ў 1626 годзе пісаў, што ў горадзе часта былі „бунты и разрухи". Ён хацеў просьбай і грозьбай прывесьці іх да вуніі, але ў канцы Палубенскі прызнаўся: „А не могучы их да таго притягнуть, пазваляю им церковь одну и от того часу обецую им жадное перешкоды в том не чынить".

Многа горшымі за Палубенскага былі езуіты, ксяндзы й урад, за якімі стаяў кароль. Усе яны прасьледавалі праваслаўных, аднак народ змагаўся. На гэта прывядзём яшчэ адзін прыклад: „Вунія пашыралася прымусова. Невуніятаў пазбаўлялі маёмасьці, прасьледавалі. Забойцу, які пераходзіў у новую веру, не каралі. У пастанове віленскага зьезду прадстаўнікоў Праваслаўнай і Евангельскай цэркваў, які адбыўся ў 1599 г., гаворыцца, што вуніяты нападаюць на міран, асабліва з гарадзкога саслоўя. Тых, хто застаецца пры старой веры, выключалі з цэхаў, забаранялі займацца рамяством, гандлем і нават жыць у гарадох" („Учарашні й сёньняшні дзень Уніяцкай царквы", Мінск 1985, стар. 21).

Трэба памятаць, што дзейнасьць вуніятаў у Вялікім Княстве Літоўскім была падрыхтавана езуітамі й інсьпіравана польскімі ўладамі на чале з каралём па загаду рымскага папы. Інакш кажучы, была гэта чужая вера чужой агентуры на Беларусі, мэтай якой было акаталічыць і апалячыць

праваслаўных беларусаў. У выніку такой работы мы маем сёньня на Беларусі польскі Каталіцкі касьцёл, які лічыць усіх беларусаў-каталікоў палякамі, а Заходнюю Беларусь — польскай зямлёй. Многа раней, у другой палове XVI стагодзьдзя, Васіль Цяпінскі абвіняў у здрадзе тых, хто адрокся ад сваёй нацыянальнай культуры й перайшоў у каталіцкую веру. Аб тым, што гэтая вера несла праваслаўным беларусам у Рэчы Паспалітай, сказаў на Варшаўскім сойме ў 1620 годзе пасол Лаўрын Дравінскі ў прысутнасьці караля: „Ужо ў большых гарадох цэрквы запячатаны, царкоўная маёмасьць разграблена, у манастырох няма манахаў, — там жывёлу замыкаюць, дзеці паміраюць без хрышчэньня; трупы памерлых вывозяць без царкоўнага абраду з гораду як падліну; мужы з жонкамі жывуць без шлюбнага бласлаўенства; народ памірае без споведзі, без прычасьця. (...) У Вільні, калі хочуць пахаваць цела праваслаўнага, то павінны вывозіць яго праз тыя вароты, праз якія вывозяць гарадзкую нечыстоту. Праваслаўных манахаў ловяць на дарозе, б'юць і ў турмы саджаюць. (...) Ужо 20 гадоў на кожным сойміку, на кожным сойме горкімі сьлязьмі молім, але вымаліць ня можам, каб нас пакінулі пры правох і вольнасьцях нашых" („Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни", Буэнос-Айрэс 1966, стар. 178-179).

Аб такіх фактах маўчаць вуніяты й іх ня хочуць знаць работнікі Ватыкану. Яны вядуць прапаганду аб Беларусі як аб краіне, якая, быццам, была вуніяцкай ад прыняцьця хрысьціянства, а вуніяцтва карысталася беларускай мовай і яе перахоўвала. Яны сьведама маўчаць, ня хочуць сказаць беларускаму народу праўду, што вуніяцкія герархі на саборы ў Замосьці ў 1720 годзе ўвялі польскую мову ў сваю царкву й канцылярыю. Пастанавілі поўнасьцю ўвесьці каталіцкія догмы, зьнішчыць сьляды „схізмы", наблізіць царкоўную абраднасьць да каталіцкай, вучыць людзей аб непагрэшнасьці папы й т.п.

А пакуль да вуніі з Рымам, то Беларусь наскрозь была праваслаўнай і аж да падзелу Рэчы Паспалітай Праваслаўная царква карысталася сваёй роднай мовай. Гэта дзякуючы ёй, праваслаўным брацтвам і вернікам беларускасьць за-

хавалася да нашага адраджэньня, а там дзе захаваліся вуніяты й каталікі, — сёньня гаспадараць палякі.

Неспадзявана на арэну выступіў яшчэ адзін апостал вуніі — Сакрат Яновіч. Ён у польскай газэце „Жыце Варшавы" пісаў аб вуніі як „вельцэ заслужонэй для народовосьці бялоруской (броніла вувчас ензыка народу, его культуры, одрэмбносьці краю)". І далей піша, што беларускія патрыёты ў Менску бачаць у вуніяцтве сапраўдны дзейнік уваскрошаньня беларускага народу.

Вось гэта яшчэ адно сьведчаньне хлусьні. Чаму гэтыя патрыёты й Сакрат Яновіч, які зьяўляецца пісьменьнікам, не напішуць канкрэтна, што добрага зрабіла вунія для Беларусі й яе народу? Хай пакажуць канкрэтныя факты. Нават польскія гісторыкі, каталікі, адмоўна пішуць аб вуніі й прызнаюць, што яна прынесла для дзяржавы шкоду. Мы на гэтую тэму часта пішам і цяпер паслухаем, які адказ Сакрату Яновічу на старонках беластоцкай „Нівы" дае Міхась Грыгарук у артыкуле „Новы палітрук":

„Нядаўна трапіла мне ў рукі „Жыце Варшавы" № 257 ад 5 лістапада 1990 г. Гляджу й вачам ня веру: Сакрат Яновіч зьмясьціў там артыкул „Новэ паньство: Бялорусь". Вельмі добра, — думаю, — у Беластоку не друкуюць яго, то ва ўсёй Польшчы пазнаёмяцца". Аднак, прачытаўшы яго, стала мне соромна, што наш народ такога „вадзіцеля" дажыўся.

У артыкуле Яновіч выяўляе таямніцы нядаўняй сустрэчы „беларусаў" у Белавежы. Былі там прадстаўнікі зь Менску, Лёндану, Нью-Ёрку, але ўсе чужыя, хоць Яновіч і прызнае, што ў Беларусі дамінуе праваслаўнае веравызнаньне. Асабовы склад тае сустрэчы й яе тэмы выглядаюць больш на „Іудзін вечар", бо абдумвалі там, як зьнішчыць на Беларусі праваслаўе.

Жахам праймае факт, што ўдзельнікі „сустрэчы", а зь імі й аўтар артыкула, гэтак лёгка адцураліся ад мора беларускае крыві й сьлёзаў, што высмакталі „місіянеры" вуніі нашаму народу. Аўтару й яго хаўрусьнікам абыякава тое, што гэтыя псэўдахрысьціяне ў цэрквах па ўсёй Беларусі тапталі Сьвятое Цела Хрыстова — Прычасьце, бо Яно, бачыце, праваслаўнае. Чым яны розьніліся ад сучасных атэістаў? Вунія была палітыкай, а не верай" („Ніва", 9 сьнежня1990 г.).

Тут трэба зрабіць засьцярогу, што на гэтай сустрэчы ў Белавежы былі ня ўсе чужыя прадстаўнікі да праваслаўя. Некаторыя з гэтых прадстаўнікоў выступалі й голасна бараніліі сваю праваслаўную веру супраць наступаў вуніі. (Глядзі „Голас Часу" № 10 (1), студзень-люты 1991 г., стар. 18-19).

Фальшывая навука работнікаў Ватыкану прывяла да таго, што сёньня паміж праваслаўнымі беларусамі й каталікамі-рэнэгатамі няма згоды й быць ня можа, бо-ж апошнія лічаць сябе палякамі, а Беларусь — Польшчай.

Паслухаем для прыкладу, што піша Анатоль Сідарэвіч аб вёсцы Вярэйкі (Заходняя Беларусь): „Тут я зноў хачу паўтарыць: пад выглядам царкоўнае, рэлігійнае працы вядзецца палітычная праца. Сабраўшыся ў царкве-касьцёле, люд сьпяваў ня толькі псальмы й літаніі. Відавочцы сьцьвярджаюць, што разоў пяць быў адсьпяваны гімн „Ешчэ Польска не згінэла". Палякі й спольшчаныя католікі проста ў вочы кажуць праваслаўным: — Тут была й будзе Польшча. Наша мяжа за Стоўпцамі. І гэтак кажуць: — Вымятайцеся за Смаленск!" („Літаратура і мастацтва", 7 верасьня 1990 г., стар. 16).

Трэба вось, каб у такое асяродзьдзе ішлі вуніяты са сваёю беларускасьцю й усьведамлялі гэтых сваіх авечак — рэнэгатаў-аднаверцаў — дзе ёсьць іхняе месца, а не рабілі замяшаньне сярод праваслаўных беларусаў.

На гэтую тэму выказваецца таксама папулярны й заслужаны беларускі пісьменьнік і паэт Ніл Гілевіч: „Многія таварышы гаварылі аб тым, што зараз мы назіраем нешта накшталт новага этапу палянізацыі нашага народу. Сотні тысяч беларусаў-католікаў у нас лічаць сябе палякамі. Відочна, што нам неабходна тут павесьці вялікую растлумачальную работу, нам патрэбны тысячы й тысячы публікацыяў на гэтую тэму ў друку" („Наша слова" № 4, чэрвень 1990 г., стар. 13).

Сказана ясна, зразумела, правільна й на часе й мы вядзём гэтую растлумачальную работу.

Праз сваю багатую й ўсебаковую прапаганду Ватыкан адурманіў, апошнім часам, некаторых беларусаў на Бацькаўшчыне. Людзі гэтыя, узгадаваныя ў духу атэізму, не разьбіраюцца ў рэлігійных справах, ня ведаюць гісторыі Царквы ды мэтаў Ватыкану й таму лёгка паддаюцца вуніяцкай прапагандзе, якая заіграваe на нацыянальных пачуцьцях.

Каталіцкая царква й яе дзейнасьць аснаваны пераважна на неабмежаванай уладзе рымскага папы. Царква гэтая праходзіла розныя этапы ў сваім жыцьці, каб надаць папу аўтарытэт. У часе Рэфармацыі Каталіцкая царква стала перад паважнай пагрозай, але яе выратаваў і пашырыў уплывы Ігнат Ляёля (1491-1556) — заснавальнік Ордэну езуітаў.

Ляёля быў прафэсійным гішпанскім жаўнерам, які ў часе абароны Памплёны ад французаў быў ранены ў абедзьве нагі. Раней любіў ён чытаць рыцарскія раманы, а ў часе лячэньня чытаў жыцьцё Ісуса Хрыста й сьвятых.

Будучы чалавекам багатай фантазіі ды начытаўшыся рэлігійных кнігаў, Ляёля выраншыў насьледаваць хрысьціянскіх сьвятых. Павесіў ён свой меч у капліцы бэнэдыктынскага манастыра й надзеў духоўнае аблачэньне. З адабрэння папы Паўла III у 1540 годзе Ляёла залажыў Ордэн езуітаў, які быў пабудаваны на ўзор вайсковай арганізцыі. Ляёля вучыў: „Калі нават нашым вачам нешта выглядае белае, але Касьцёл прызнае за чорнае, то трэба прызнаць за чорнае".

У гэтым часе аўтарытэт Рымскай царквы й папы ўпадалі на карысьць пратэстантаў. Рэфармацыя пашыралася. Нават вялікі магістр тэўтонскіх рыцараў, Альбэрт Гогенцолерн у 1525 годзе перайшоў у пратэстантызм. А гэтыя-ж рыцары на працягу доўгіх стагодзьдзяў стаялі ў абароне каталіцкай веры й пашыралі яе на вастрыні мяча з блаславенства рымскіх папаў. Такой зьменай вялікага магістра папа ня мог быць задаволены, ён быў моцна абураны, пратэставаў, але без рэзультату.

Трэба было прыняць нейкія меры, каб запабегчы раскладу Каталіцкай царквы. Папа зьвярнуўся за парадай да сваіх кардыналаў і яны дарадзілі яму аднавіць інквізыцыю. Ляёля падтрымаў такую думку й 21 ліпеня 1542 году зьявілася папская була аб інквізыцыі, якая давала інквізытарам неабмежаваную ўладу. Зь людзьмі, якія адмаўляліся ад каталіцкай веры, духоўныя суды рабілі што хацелі, нават палілі іх жывымі на кастры. Нішчыліся рэлігійныя кніжкі, калі яны не адпавядалі навуцы Каталіцкай царквы й забаранялася іх друкаваць. Прыватным асобам загадвалася выяўляць касьцельным уладам людзей, якія не падпарадкоўваліся загадам і патрабаваньням Каталіцкай царквы. Людзі

ўцякалі, хаваліся ад прасьледу, а інквізытары іх шукалі. Было гэта падобнае на дзейнасьць пазьнейшых органаў бяспекі ў СССР, у часе вышукваньня „ворагаў народу", толькі не ў такім шырокім маштабе.

Як бачым, галоўнымі завадатарамі рэлігійнага фанатызму былі езуіты — папскія жандары. Яны гатовы былі прыняць у свой ордэн злачынцу, калі гэта было карысна для Каталіцкай царквы.

У 1563 годзе закончыў абрады Трыдэнцкі сабор (у паўночнай Італіі), які сабраў духавенства амаль з усяго сьвету. Яго пастановы нічога не зьмянілі ў жыцьці Царквы, толькі ўзмоцнілі дысцыпліну духавенства й арганізацыйную дзейнасьць. Важным было, што сабор апрацаваў плян, які скіраваны быў супраць рэлігійнай рэфармацыі. Гэты плян актыўна ажыцьцяўлялі езуіты Ляёлі. Былі гэта вышкаленыя й дысцыплінаваныя місіянеры, якія стараліся пранікнуць у асяродзьдзе мясцовай адміністрацыі, каб мець уплыў на кіруючыя колы дзяржаўнай адміністрацыі. Яны былі гатовы ісьці ўсюды, нават на розныя злачынствы, каб толькі дасягнуць сваю мэту.

Як супрацьдзейнік рэлігійнай рэфармацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім, на запросіны каталіцкага біскупа Валерыяна Пратасевіча-Сушкоўскага (1556-1580), прыехалі ў Вільню езуіты. Яны ў 1570 годзе ў Вільні, у адпаведнасьці з планам на даўжэйшую мэту, адкрылі калегію, якую ў 1579 годзе перайменавалі ў акадэмію і якую некаторыя назвалі Віленскім унівэрсытэтам.

Неўзабаве быў адкрыты шэраг езуіцкіх школаў у розных беларускіх гарадох і мястэчках. Каталіцкі біскуп Пратасевіч выдаў адозву да бацькоў, каб пасылылі сваіх дзяцей у езуіцкія школы вучыцца. Адозва мела посьпех. Магнаты й шляхта розных веравызнаньняў пасылалі сваіх сыноў у Вільню й другія езуіцкія школы. Выгада была для бацькоў у тым сэнсе, што навучаньне ў школах адбывалася бясплатна.

І тут езуіты праз свой унівэрсытэт і школы ўзгадоўвалі маладое беларускае пакаленьне ў духу чужых традыцыяў, наварачвалі школьнікаў у каталіцызм і з пагардай ставіліся да ўсяго мясцовага. Езуіцкі унівэрсытэт у Вільні быў свайго роду духоўнай сэмінарыяй з двума факультэтамі —

тэалёгіі й філязофіі. Адзін факультэт вучыў законаў Рымскай царквы, а другі — вучыў як уводзіць іх у жыцьцё ў польскім духу.

Даволі цікавы быў спосаб выхаваньня моладзі ў езуіцкіх школах. Прымяняліся цялесныя пакараньні, але толькі за вялікія злачынствы. Езуіты стараліся ўплываць на сваіх вучняў праз амбіцыю. Яны дзялілі клясы на дзьве часьці, якія спаборнічалі паміж сабою. Вучні, што вучыліся добра, атрымоўвалі ўзнагароды. Адсталых вучняў, або нядобрых, саджалі на так званыя „асьліныя лаўкі", або надзявалі такім вучням на галаву шапкі з асьлінымі вушамі й так вадзілі па школе. Таксама пашырана была сістэма даносаў.

Мовай навучаньня на ўнівэрсытэце была латынь, а дапаможнай служыла мова польская. Беларуская мова, якая была ў той час урадавай Вялікага Княства Літоўскага, на Віленскім унівэрсытэце ігнаравалася й таму гэтая вучэльня сталася прапагандыстам ня толькі „польскай веры", але й польскай мовы, што вяло да палянізацыі Беларусі.

У 1586 годзе ў езуіцкіх школах вучылася больш за 700 вучняў-дзяцей беларускіх магнатаў і шляхты. Гэтыя адукацыйна-прапагандысцкія каталіцкія ўстановы рабілі вялікі ўплыў на культурнае, палітычнае й рэлігійнае жыцьцё моладзі, а з часам і краіны.

Пасьля такога аднабаковага й бясплатнага навучаньня ў езуіцкіх школах зь іх выходзілі агрэсыўныя каталіцкія місіянеры-фанатыкі, якія ня толькі што адракаліся ад веры сваіх бацькоў, але вялі супраць яе вайну. Яны зьневажалі сваю родную мову й народ, зь якога выйшлі. Іхнія патомкі, дзякуючы польска-езуіцкім школам, згадзіліся ў 1697 годзе, каб у Вялікім Княстве Літоўскім пісар земскі не „па-руску", гэта значыць, не па-беларуску, а „па-польску" пісаў. Быў гэта вынік езуіцкіх школаў. Калі раней, на працягу апошніх 400 гадоў, дзяржаўныя законы ВКЛ укладаліся й пісаліся на беларускай мове, цяпер пісаліся яны на мове польскай і праводзіўся жорсткі прасьлед Праваслаўнай царквы.

Для прыкладу ўспомнім Мікалая Радзівіла Чорнага, стойкага абаронцу незалежнасьці ВКЛ. Ён аддаў чатырох сваіх сыноў пад нагляд езуіцкай адукацыі. Вынік аказаўся такі,

што ўсе сыны Радзівіла Чорнага прынялі каталіцкую веру. Адзін зь іх, Юры, стаў нават каталіцкім біскупам, другі — Мікалай, празваны Сіроткай, ахвяраваў 5 000 чырвонцаў на адшуканьне кнігаў Бібліі, якія выдаў яго бацька, каб іх спаліць. Падобная рэч сталася й у сям'і вядомага абаронцы й заступніка праваслаўнай веры князя Канстанціна Астрожскага. Яго сыны прынялі каталіцкую веру, а ўнучка, ярая каталічка, крыўдзіла тых, каму памагаў і за каго заступаўся яе дзед. Падобных прыкладаў было многа.

За час свае асьветніцкай дзейнасьці езуіцкія школы сталіся трагедыяй для беларускага народу, яго культуры, мовы й дзяржаўнасьці. У езуіцкай прапагандзе дапамагала іхняя прэса, якая вяла палеміку супраць іншых вераў. Каталіцкая рэакцыя прымала розныя формы. Асаблівую варожасьць да беларускага слова праявілі тры віленскія біскупы: Валеры Пратасевіч, Юры Радзівіл і Акакій Грахоўскі. Яны скуплівалі беларускія кнігі з мэтай зьнішчыць іх і з часам закрылі ў Вільні друкарню, дзе выдаваліся гэтыя кнігі.

Кастусь Тарасаў піша: „На землях Вялікага Княства не было нават кніжных кастроў, яны запалалі з пачаткам Контррэфармацыі, каталіцкай экспансіі. Наступ яе на Беларусі й Літве датуецца 1564 годам, калі ў Вільні зьявілася першая партыя езуітаў. Па дзіўнай выпадковасьці, а можа й наўмысна, іх аказалася трынаццаць чалавек — чортаў тузін. „Чортава сем'я", — называў езуітаў Будны. І сапраўды, яны выявілі незвычайную энэргію. Праз дваццаць гадоў у Вялікім Княстве іх ужо налічвалаася 300 чалавек, сярод якіх 250 — мясцовага паходжаньня. На сумленьні езуітаў, бясспрэчна, шмат благіх учынкаў" („Памяць пра легенды", Мінск 1990, стар. 121).

На Беларусі найбольш важную ролю ў пашырэньні каталіцкай веры й польскасьці выканаў Пётр Скарга — першы рэктар Віленскай акадэміі. Па паходжаньні П. Скарга — паляк з-пад Варшавы. Быў гэта тыповы езуіт, прадстаўнік польскай нацыі й каталіцкай экспансіі, чалавек злосны, нэрвовы, які ў сваіх духоўных выступленьнях жадаў ня толькі душы, але й галавы „гэрэтыкаў". Ён, едучы ў Рым да езуітаў вучыцца, вёз з сабою шаблю. Афіцыйна Скарга выступаў супраць насільля, а ў сапраўднасьці заклікаў віленска-

га біскупа Юрыя Радзівіла на злачынствы. Ён пісаў да біскупа Радзівіла: „Будзь завостраным слупом на гэрэтыкаў, на гэтых бязвартасных людзей, каторых забівалі ў другіх краінах, і каб тут іх цяпер. Нягодныя здраднікі, так вось зь імі рабіць, да найменшага выбіць".

Пры кожнай нагодзе Скарга выхваляў заслугі й значэньне езуітаў. Ён аднойчы пісаў аб адным шляхціцу — прыяцелю езуітаў, які будучы пры сьмерці пачуў голас зь неба. Пасьля гэтага, неяк дзіўным спосабам шляхціц выздаравеў і пазьбег сьмерці без споведзі, хоць недалёка быў праваслаўны „поп". Такая гэта была навука езуітаў, дзейнасьць якіх, быццам, адабраў голас з неба.

Усе гэтыя няшчасьці прыходзілі на людзей, калі не з блаславенства, то з пракляцьця папаў рымскіх, асабліва ў часе Рэфармацыі. Маецца такі характэрны прыклад: „24 жніўня, у ноч сьв. Варфаламея, натоўпы сфанатызаваных каталікаў, пад'юджаныя біскупамі й ксяндзамі, дрыжачыя за свае ўпадаючыя ўплывы, у зьверскі спосаб вымардавалі ў Парыжы чатыры тысячы гугенотаў, сяброў групы пратэстантаў. Дваццаць тысяч загінула на правінцыі. Тагачасны папа Рыгор XIII, даведаўшыся аб гэтым здарэньні, адслужыў спэцыяльную ўрачыстую імшу з працэсіяй і „Тэ Дэум" ды сказаў выбіць памятны мэдаль „Кладэс Гугенорум" (Паражэньне гугенотаў). Пры гэтай нагодзе зь яго вуснаў палі такія гістарычныя словы: „Тыя, каторыя служаць іншаму богу як наш і вызнаюць іншую рэлігію, павінны быць вынішчаны агнём і мячом, а іхнія гарады — зьнішчаны й спалены" („Сьлядамі клёнтвы", Варшава 1966, стар. 98).

У гэтай самай кніжцы на старонцы 76 чытаем другі характэрны прыклад датычны сьвятасьці папы рымскага: „У XVI стагодзьдзі папа Сыкст V (1585-1590) апярэдзіў сваіх папярэднікаў надзвычайнай лютасьцю. Ён быў аўтарам пагаворкі: „Хачу, каб за майго ўрадаваньня турмы былі пустыя, а шыбеніцы поўныя". І за яго пантыфікату дзейнічаў ананімны Пасквіна, аўтар дасьціных і вострых антыпапскіх памфлетаў. Сыкст V абяцаў тысячу дукатаў і адпушчэньне грахоў таму, хто выдасьць гэтага сьмельчака. Пасквіна зьявіўся асабіста, атрымаў тысячу дукатаў, але страціў язык і правую руку".

Езуіты былі галоўнымі экзэкутарамі пастаноў рымскіх папаў, галоўнымі ініцыятарамі вайны Рэчы Паспалітай з Масквою, каб там пасадзіць на трон самазванца Дзімітра й праз яго пашырыць сваю каталіцкую веру на Ўсходзе. Карыстаючыся каталіцкім фанатызмам караля Жыгімонта III, выхаванца езуітаў, папа ў Каляднюю ноч 1609 году блаславіў меч і капялюш для Жыгімонта як „рыцара Касьцёла", які меў здабыць і навярнуць на каталіцызм Маскву, Пэрсію й Швэцыю.

Аднак гісторыя пайшла другой дарогай і ў гэтым віна толькі палякаў і іхняга фанатычнага Касьцёла. Праваслаўныя беларусы й украінцы не маглі далей пераносіць польскага гвалту. Ня могучы знайсьці права ў сваёй дзяржаве — Рэчы Паспалітай, яны пачалі шукаць яго за мяжой. У 1651 г. у Маскву прыбыў ігумен Дзісьненскага манастыра Афінаген Крыжаноўскі, які абвясьціў сябе паслом ад насельніцтва Полаччыны. Ён заявіў у пасольскім прыказе, што яго „послали ко государю ис Полоцка все белорусцы (...) и велели ему бити челом государю, чтобы он их, белорусцев, принял в сваю государеву оборону". Падобная дэлегацыя была ў Маскве са Слуцка. А Ўкраіна поўнасьцю падалася пад „государеву оборону".

З Вялікага Княства Літоўскага часта ішлі жалабы й просьбы ў Маскву, а пасьля ў Пецярбург аказаць дапамогу праваслаўным. Такую жалабу атрымаў Пётр I на пачатку 1718 году. У сакавіку выслаў ён польскаму каралю грамату, у якой напомніў, што абмежаваньне свабоды праваслаўным у польскай дзяржаве нарушае дагавор аб вечным міры паміж Польшчай і Расеяй.

Пасьля сьмерці Пятра I падобныя скаргі ад праваслаўных вернікаў з Беларусі ішлі да імпэратрыцы Ганны Іванаўны. Ад некалькіх гадоў праваслаўныя Беларусі з архіепіскапам Юрыем Каніскім прасілі імпэратрыцу Кацярыну II, каб аказала пратэкцыю.

У 1765 годзе архіепіскап Каніскі паехаў у Варшаву й дабіўся аўдыенцыі ў караля Станіслава Панятоўскага. У сваёй прамове ён прадставіў сумны стан Праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай і падаў каралю мэмарандум „Правы й свабоды жыхароў грэцкай веры ў Польшчы й Літве" напісаны

па-польску. Гэты мэмарандум быў пераложаны на эўрапэйскія мовы як узор абароны верацярпімасьці. Аднак усе гэтыя захады-пратэсты й зьвязаныя зь імі сьледзтвы, каб спыніць прасьлед праваслаўных у Рэчы Паспалітай, не знайшлі і не маглі знайсьці належнага зразуменьня ў палякаў.

У 1751 годзе папа рымскі выдаў спэцыяльную булу для католікаў Польшчы і Літвы, у якой абвясьціў, што даруе ім грахі на сто гадоў наперад за іхнюю вернасьць да яго. Атрымаўшы такую „гарантыю", яшчэ большы фанатызм у адносінах да праваслаўных ахапіў гэтых адурманеных вернікаў Каталіцкай царквы.

Ад імя Расеі ў польскі сойм была пададзена прапанова зраўняць дысыдэнтаў Рэчы Паспалітай у правох з католікамі, але была яна адкінута. Тады дысыдэнты арганізавалі ў 1767 годзе свае канфэдэрацыі: праваслаўныя ў Слуцку, а пратэстанты ў Торуні, мэтай якіх была просьба зраўняць іх у правох з католікамі. Слушныя іх дамаганьні апрабавалі ўрады Расеі, Прусіі й Аўстрыі, але ня польскі ўрад. Тады ў Варшаву ўступілі рускія войскі. Пад страхам сілы польскі сойм у 1768 годзе прызнаў права на рэлігійную свабоду для інаверцаў. Ад гэтага часу Расея стала, быццам, пратэктарам правоў пакрыўджаных у Рэчы Паспалітай.

Абарона праваслаўных праз Расею не спадабалася польскім шляхоцка-клерыкальным лідэрам і яны залажылі сваю канфэдэрацыю ў горадзе Бары (на Падольлі), якая прыняла назоў Барскай канфэдэрацыі (1768). Яе сябры, магнаты-каталікі, ад некаторага часу выступалі супраць караля, дысыдэнтаў і ўсякіх рэформаў і пачалі збройную барацьбу супраць праваслаўных на Беларусі й Украіне. Яны нішчылі пасевы праваслаўных сялян, забіралі іхнію жывёлу й рабілі другія шкоды.

Барскія канфэдэраты выклікалі лякальную вайну, якую ня мог спыніць урад Польшчы. Тады ў межы Рэчы Паспалітай уступілі рускія, прускія й аўстрыйскія войскі. Бунт польскага нацыяналістычна-рэлігійнага шавінізму быў спынены. За навядзеньне парадку ў анархістычнай дзяржаве саюзьнікі-суседзі пастанавілі ўзяць сабе па кавалку тэрыторыі Рэчы Паспалітай у якасьці кампэнсаты. Быў гэта пачатак падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе.

Першы падзел Рэчы Паспалітай прамовіў да розуму палякаў і яны праз свой, так званы Вялікі сойм, пачалі ўводзіць рэформы ў краі. Але некаторая польская магнатэрыя аказалася прадажнай. Яна 27 красавіка 1793 году падпісала ў Петраградзе ў прысутнасьці Кацярыны II акт, які асуджаў рэформы польскага сойму. Сваю праграму польскія магнаты аб'явілі ў Таргавіцы на Ўкраіне, да якой далучыўся кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. З волі гэтых людзей наступіў другі падзел Рэчы Паспалітай у 1793 годзе, а ў 1795 годзе наступіў апошні — трэці падзел.

Польшча ня мела ратунку, не было каму яе бараніць, не было за што бараніць і не было чым бараніць. На гэтым і скончыла сваё існаваньне Рэч Паспалітая, дзякуючы езуітам, вуніятам і сваёй шавіністычнай палітыцы. А яшчэ ня так даўно Рэч Паспалітая была магутнай дзяржавай.

У газэце „Літаратура і мастацтва" ад 12 красавіка 1991 году было зьмешчана інтэрв'ю ўзятае Алесем Ігнатовічам у айца Яна Матусевіча. Айцу Матусевічу было пастаўлена шэраг пытаньняў. Пытаньні й некаторыя адказы а. Яна Матусевіча на іх падаюцца ніжэй:

„Айцец Ян, навошта ў рэспубліцы спатрэбілася, шчыра кажучы, рэаніміраваць уніяцтва? Яно-ж не існуе на Беларусі паўтара стагодзьдзя! І навошта вам, каталіцкаму сьвятару з добрым аўтарытэтам, спатрэбілася прайсьці праз сьцяну непаразуменьня нашае паставы, холад афіцыйнага Рымска-Каталіцкага касьцёлу, насьцярожаныя адносіны сьвецкіх улад да адраджэньня вуніі? Навошта спатрэбілася гэтая дарога да новага храма, што злучыў у сабе адначасова рысы Праваслаўнай і Каталіцкай царквы?"

І тут, як і раней, а. Ян Матусевіч паказаў сваю неграматнасьць у царкоўнай і гістарычнай справе. На пастаўленыя пытаньні ён дае такія адказы:

„Разумееце, мы, беларусы, ад самага свайго нараджэньня як народ зьяўляемся „уніятамі", жылі на мяжы ўсходніх і заходніх этнічных і культурных традыцый. І невыпадкова фарміраваньне беларускага народа як этнічнай адзінкі ў XVI стагодзьдзі якраз і завяршылася стварэньнем уніяцкай нацыянальнай царквы".

Ані слова пра езуітаў, пра польскіх каталіцкіх ксяндзоў зь іхнімі ордэнамі й праклямацыямі папаў рымскіх, пра польскіх каталіцкіх каралёў, якія супраць права накідалі Праваслаўнай царкве вунію сілай. У паняцьці айца Яна Матусевіча гэтага быццам ніколі не было. І гэта ёсьць тыповая езуіцкая практыка Каталіцкай царквы замоўчваньня нявыгадных фактаў.

Цікава ад калі а. Ян Матусевіч зрабіўся такі вялікі беларускі патрыёт, які, як ён кажа, „перайшоў у вуніяцтва, каб быць поплеч з народам, садзейнічаць яго нацыянальна-духоваму адраджэньню"?

Што за іронія. Дзе тыя вуніяты — „народ" на Беларусі, зь якім хоча „быць поплеч" а. Матусевіч? У гэтай самай газэце „ЛіМ" на старонцы 2-й чытаем: „У абсталяванай у адным з прыватных дамоў па вуліцы Якуба Коласа капліцы ў ноч з 6 на 7 красавіка адбылося ўрачыстае набажэнства, якое правёў дэкан а. Пётра Кузьмічаў. (...) На сьвяце прысутнічалі беларускія й украінскія грэка-католікі з Полацка, Вільні й Кіева".

Гэты факт ужо гаворыць аб папулярнасьці вуніі на Беларусі й колькасьці яе вернікаў, калі ўсе яны на Вялікдзень разам з гасьцямі з Полацка, Вільні й Кіева зьмясьціліся ў прыватным доме. Але гэтая разбуральная агентура, як бачым, арганізуецца з дапамогай суседзяў і блаславенства папы рымскага.

А айцец Ян Матусевіч, як адзін зь вядучых ідэолягаў адраджэньня вуніі на Беларусі, убачыў розьніцу паміж Праваслаўнай і Каталіцкай цэрквамі й прызнаў за немагчымае зрабіць іх беларускімі. Ён кажа: „Але нават калі касьцёл і царква пачнуць маліцца па-беларуску, яны ўсяроўна не стануць сапраўды беларускімі. Бо ў іх-жа свае рытуальныя сьпевы, свой абрад, свая вопратка ў сьвятароў. Усё гэта прыйшло з Візантыі або Рыму".

Калі-ж так, то якою моваю мае маліцца Праваслаўная й Каталіцкая царква на Беларусі, якія сьпевы, аблачэньне й абрад маюць прыняць гэтыя вуніяцкія сьвятары, каб быць беларускімі? І ўсё-ж паводле разуменьня а. Яна Матусевіча, толькі Вуніяцкая царква на Беларусі можа гэта ўсё запоўніць. Такія рэчы можа гаварыць толькі цудак, а ніколі паважны сьвятар.

Аб паляках і расейцах ён кажа наступнае: „Абодва гэтыя бакі змагаліся за свой уплыў на Беларусі й таму імкнуліся насадзіць сваю рэлігію — касьцёл або праваслаўную царкву".

Выглядае, быццам Беларусь была паганская й таму Польшча й Расея змагаліся, каб яе ахрысьціць, а перадусім накінуць сваю рэлігію. Тут мае частковую рацыю а. Матусевіч у першым выпадку, бо-ж Каталіцкі касьцёл лічыў праваслаўных „схізматыкамі" й праз сваіх місіянераў стараўся насадзіць на Беларусі вунію. А што да Рускай Праваслаўнай царквы, то на Беларусі была праваслаўная вера раней як у Расеі, так, што Расея не магла насаджваць свае рэлігіі на Беларусі.

Яшчэ далёка да вуніі Беларусь мела сваю незалежную ад Расеі царкоўную арганізацыю на чале зь мітрапалітамі, якія падпарадкоўваліся Канстантынопалю. І нават калі Расея завалодала Беларусьсю ў канцы XVIII стагодзьдзя, то яна аднавіла Праваслаўную царкву, якая часткова сілай была падпарадкавана вуніі праз польскія сьвецкія й касьцельныя ўлады пад дырэктывамі Ватыкану.

Ёсьць праўдай, што расейцы русыфікавалі Беларускую Праваслаўную царкву, і ня толькі царкву, але ўсю Беларусь русыфікавалі, аднак не ліквідавалі Праваслаўную царкву, як гэта рабіў Ватыкан праз польскі ўрад, езуітаў і вуніятаў.

Але гэта ня значыць, каб мы, беларусы, дзеля расейцаў і палякаў мянялі сваю веру на сэкту вуніі, ішлі ў каталіцызм, а пасьля рабіліся палякамі, як гэта паказала гісторыя. І такога прынцыпу павінен трымацца айцец Ян Матусевіч, а не займацца замаскаванай прапагандай нейкай нацверы.

Ці-ж такая мае быць дарога да хрысьціянскага адзінства, як гэта прапагандуе Ватыкан праз сваіх агентаў? Аб гэтым піша адзін чытач „Голасу Часу": „Надта актуальная зацемка „Тэалягічны праваслаўна-каталіцкі царкоўны дыялёг". Па-мойму трэба больш падкрэсьліваць, што папская рада — „хрысьціянскае адзінства" стараецца іншыя хрысьціянскія веравызнаньні падпарадкаваць папу рымскаму, што ня мае нічога супольнага з „адзінствам". Па сваёй структуры папства ёсьць „касьцельна-дыктатарскай" арганізацыяй, дзе ніжэйшае духавенства — а зь ім разам і вернікі, гаворачы па-польску, „не маё ніц до гаданя". Калі Праваслаўная царква, ці Каптыйская або Сірыйская ёсьць саборнымі (на са-

борах маюць голас і клір, і вернікі), то Каталіцкая мае „камандны статут". Вазьміце пад увагу, што кардыналы прысягаюць вернасьць кожнамю новаму папу, а не Каталіцкаму касьцёлу — значыць, тут сам Касьцёл „на заднім пляне", а вернасьць „уладару" зьяўляецца асноваю ўсяе касьцельнае арганізацыі. Каталіцкім тэолягам — прывыклым да дыктатарскай сыстэмы — цяжка зразумець, што можа быць „у рознасьці еднасьць". Таму праз розныя ўхваткі, як „вуніі" (асабліва на Блізкім Усходзе) — „будзьце й далей у сваіх рызах, але падпарадкоўвайцеся нам, Ватыкану" — наладжваюць „хрысьціянскае адзінства", каб потым „латынізаваць". Асабліва мы, беларусы, наглядаем, што робіцца ў заходнеўкраінскіх вуніятаў. Ужо там абавязвае цэлібат — бязжэннасьць ніжэйшага духавенства, епіскапаў вызначае папа рымскі, па свайму ўважэньню, бо меркаваньне вуніяцкага духавенства яго надта мала цікавіць. Папа ў даным выпадку кіруецца палітычнымі меркаваньнямі — не дражніць Маскву.

У актуальных палітычных справах адносна Беларусі „польскі папа" не прызнае цяперашняе граніцы між БССР і Польшчаю. У сувязі з намінацыяй епіскапа Кандрусевіча на архіепіскапа Масквы, прэсавы прадстаўнік Ватыкану пасьпяшыўся заявіць, што гэта ня мае значэньня прызнаньня „цяперашніх граніц" між Польшчай і СССР. Епіскап Кандрусевіч — гэта „новы траянскі конь" у межах Беларусі...

У нас вунія, як вы правільна пішаце, была інструмантам апалячаньня й лацінізацыі абрадаў. Цікава, што яшчэ знаходзяцца „мудрагелі", якія стараюцца надаць вуніі „нацыянальны характар" — інструманту нашага паняволеньня".

Сёньняшнюю „незалежную" беларускую царкву, якую мае замер арганізаваць а. Я. Матусевіч і К° на Беларусі, супярэчыць ягоным асьведчаньням. Паводле ягоных словаў, у Праваслаўнай царкве й Каталіцкім касьцёле парадак заведзены Візантыяй і Рымам. Быццам гэты парадак ён, айцец Ян Матусевіч, мае зьліквідаваць, і ўвесьці свой, вуніяцкі. Але ў канцы кажа: „Толькі папа рымскі зьяўляецца нашым дарадчыкам і духоўным настаўнікам".

Такія бесталковіцы гаворыць а. Ян Матусевіч пабачыўшы ў Рыме папу Яна Паўла II, які блаславіў дзейнасьць вуніятаў і даў ім свае ўказаньні.

Наслаў ужо папа сваіх біскупаў і ксяндзоў на Беларусь нямала, а цяпер вучыць і блаславіць пярэкрутаў, каб навялі яшчэ адзін балаган на шматпакутнай Беларусі.

Аб апошнім побыце папы ў Беластоку пісалася наступнае: Дзве новыя каталіцкія епархіі — Беластоцкую й Драгічынскую — устанавіў папа Ян Павал II. Беластоцкая епархія — гэта частка Віленскай архіепархіі, якая знаходзіцца ў сучасных граніцах Рэчы Паспалітай Польскай. Таксама Драгічынская епархія зьяўляецца часткай Пінскай епархіі ў сёньняшніх межах Польшчы" („Ніва", 16 чэрвеня 1991 г.).

Гэтым разам паляк-папа сам пацьвердзіў, што ён не прызнае паваенных граніцаў паміж Польшчай і Беларусьсю ды Літвой, але так як раней прытрымоўваецца граніцы 1939 году.

Цяжкі й складаны шлях прайшоў беларускі праваслаўны народ на працягу свае шматвяковае гісторыі. Зазнаў ён многа крыўды з боку Каталіцкага касьцёла зь яго падручнымі вуніятамі. Як раней, так і цяпер, Каталіцкая царква стаіць матэрыяльна добра, бо-ж праз увесь час свае гісторыі яна была зацікаўлена ня менш матэрыяльнымі карысьцямі й сьвецкай уладай. Сёньня яна можа пазволіць на любога роду прапаганду й дзейнасьць, але яна перайшла свой зэніт. Ужо пасьля Другой Сусьветнай вайны пачаліся непалады ў касьцельнай арганізацыі, што прывяло да Другога Ватыканскага сабору. Сабор ня ўзмоцніў Касьцёла, аб чым гаворыць недахоп каталіцкага духавенства. „Дзеньнік польскі" ад 2 кастрычніка 1990 году падае, што на ўсім сьвеце налічвалася 401 930 каталіцкіх ксяндзоў. Але пяць гадоў раней было іх 406 376; амаль тысяча ксяндзоў убывае кожны год і гэты спад працягваецца.

Але гэта ня значыць, што Каталіцкая царква ў заняпадзе. Яе цэнтр — Ватыкан — яшчэ моцны, багаты й пільна сочыць за ходам сусьветнай палітыкі, ды шукае й чакае нагоды, каб праявіць сваю работу ў спрыяльны момант, як гэта мы бачым сёньня на Беларусі й Украіне, у час так званай галоснасьці й перабудовы і тут мае ён посьпех.

Пад інспірацыяй Ватыкану польская Каталіцкая царква зь яе вуніяй выкарыстоўвае пасыўнасьць Праваслаўнай царквы на Беларусі й Украіне. Яна падобна Праваслаўнай царкве на эміграцыі глядзіць на гэта ўсё быццам у страху, баіцца

сказаць сваё слова. А палякі-каталікі на Беларусі не баяцца, не марнуюць часу. У некаторых іхніх дзеячоў, як напрыклад на Гарадзеншчыне, польскі нацыяналізм перарос у шавінізм і, як піша адзін зь іх у „Глосе з-над Немна", палякі змагаюцца й будуць змагацца нават з Касьцёлам, калі ён схіліцца да ўвядзеньня беларускай мовы ў каталіцкую імшу.

Ня лепш выглядае беларуская справа й з нацыянальнадзяржаўнага пункту гледжаньня. Палякі ў краі праводзяць розныя курсы для „палякаў" зь Беларусі, на якіх разам з каталіцкімі ксяндзямі ўнушаюць ім прыналежнасьць Заходняй Беларусі да Польшчы. У гэтай рабоце прымаюць удзел былыя забойцы з АК, якія ў часе апошняй вайны стралялі беларусаў на вуліцы ў белы дзень і гэта толькі таму, што яны былі беларусамі й працавалі на сваёй беларускай нацыянальнай ніве, на карысьць свайго народу. Гэтыя бандыты з радоў АК, зараз пасьля заканчэньня вайны, перайшлі на Беласточчыну й там мардавалі беларускія праваслаўныя сем'і, якія не хацелі перасяляцца ў БССР, не хацелі пакідаць сваіх гаспадарак, а засталіся на сваёй роднай зямлі, на якой жылі іхнія бацькі, дзяды, прадзеды й г.д. Цяпер гэтыя садысты й ім падобныя нішчаць, паляць праваслаўныя цэрквы й рыхтуюць новую разьню на „крэсах", каб угадзіць свайму папу, а ярае каталіцкае духавенства дзейнічае ў духу палянізацыі й штучнага „царкоўнага адзінства" пры дапамозе вуніятаў.

Вельмі рэдка можна знайсьці ў „Дзёньніку польскім" аб'ектыўны погляд на Каталіцкі касьцёл і польскую нацыяналістычную дзейнасьць на Беларусі. Але 27 красавіка 1991 году Ежы Букоўскі ў артыкуле „Чы грозі нам клерыкалізм?" выказвае свае засьцярогі да дзейнасьці Каталіцкай царквы. Паводле яго слоў „Другі Ватыканскі сабор удыхнуў у акасцянелыя ад стагодзьдзяў структуры новае жыцьцё, але ў аснаўных справах няма мовы аб ніякім лібэралізьме". Далей аўтар піша „што іншае ўдзел Касьцёла ў жыцьці дзяржавы, а што іншае клерыкалізм, хоць гэта дзьве справы блізка вяжуцца паміж сабою. Калі ксёндз падкрэсьлівае, што важнейшае ёсьць жыцьцё духовае, чым грамадзкая кар'ера й „ня можна служыць двум панам", гэта красамоўны заклік да заняцьця азначанай пазыцыі, што мае абазна-

чаць прымат рэлігіі над палітыкай. І калі нехта з гэтым не пагаджаецца, дык сам сябе выключае з каталіцкай грамады. Значыць, што шматвяковае існаваньне Каталіцкай царквы і яе папаў маюць дамінаваць над палітыкай і гэта не страціла свае сілы й цяпер.

Польская прымаўка кажа: „поляк мондры по часе", але ў даным выпадку будзе якраз у часе, бо-ж палякі пачалі прыходзіць да сэнсу. Ангельская газэта „Дэйлі Тэлеграф" ад 3 чэрвеня 1991 году падае, што за апошнія 18 месяцаў дзьве трэція насельніцтва Польшчы выказалася, што каталіцкая герархія замнога мяшаецца ў палітыку.

На гэта папа Ян Павал II, будучы апошні раз у Польшчы, сказаў, што абмежаваньне рэлігіі можа прывесьці палякаў да „бязбожнай нацыі". Беспадстаўная гаворка. Калі камуністычная бязбожная дыктатура не зрабіла іх бязбожнымі, тым больш ня зробіць іх бязбожнымі сучасная дэмакратыя.

Як стагодзьдзі раней, так і цяпер ажывілася польская рэлігійная й палітычная экспанія на Беларусі. Беластоцкая „Ніва" (№ 13 ад 31 сакавіка 1991 году) падае: „25 студзеня 1991 г. дацэнт Анжэй Рахуба прачытаў у Варшаўскім універсытэце даклад на тэму „Беларускія землі пасьля Люблінскай вуніі". Даклад быў літаральна адчытаны й меў характар сухой лекцыі, зь якой можна было даведацца галоўным чынам пра польскія ўплывы, палянізацыю, каталізацыю м.інш. сілавую (у часе вуніі на 2,5 мільёна насельніцтва было 1,5 мільёна беларусаў, а на пераломе XVII і XVIII стагодзьдзяў — на 5 мільёнаў стала іх толькі 40%). У эканамічных адносінах дакладчык зьвярнуў увагу на наданьне каралём 3/4 зямлі магнатам і шляхце, ды апрача эканамічнага прыгнёту падкрэсьліў вялікія вынішчэньні насельніцтва войнамі. Палянізацыю ацаніў станоўча, што ў яго перакананьні спрыяла разьвіцьцю культуры. Вялая дыскусія мела палемічны характар, напрыклад, была спроба шукаць аналёгіі між паняцьцямі Беларусь, Чорная й Чырвоная Русь й г.д."

Так гэта сёньня бачыцца Беларусь праз акуляры некаторых польскіх навукоўцаў. Палянізацыя, каталізацыя, наданьне каралём зямлі магнатам і вынішчэньне мясцовага насельніцтва войнамі зводзіцца да агульнага назоўніка — разьвіцьця польскай культуры.

І не апошнюю ролю ў гэтай польскай „культуры" адыграў польскі Каталіцкі касьцёл са сваімі папамі рымскімі ў адносінах да праваслаўных беларусаў і ўкраінцаў. М. М. Схэйман піша: „Вунію ўводзілі сілай. Праваслаўных заганялі на казаньні каталіцкіх ксяндзоў; хто не хацеў уступаць у вунію, таго хвасталі розгамі, у адным архівальным дакуманце чытаем, што ксёндз Макшыцкі, прыехаўшы ў Чаркасы, сабраў людзей і рэкамэндаваў усім уступіць у вунію. Людзі адмовіліся. Тады ваявода з аховай і жаўнерамі пачалі біць людзей, так што вусны ім разрывалі, ногі й рукі выкручвалі й тры асобы забілі на сьмерць" (М. Кояловіч, „История воссоединения западнорусских униятов старих времен", Санкт-Петербург 1837, стар. 52).

„Гэты-ж ксёндз Макшыцкі прыехаў у вёску Уелехін (1766) і паведаміў, што ўсе жыхары невуніяты будуць зьнішчаны, а экзэкуцыю выканае 500 жаўнераў прыбыўшых у вёску. Толькі пад такой пагрозай вёска прыступіла да вуніі. 29 ліпеня 1766 г. у мястэчку Мгнева спалілі аднаго старэчу за адмову перайсьці з праваслаўя на веру вуніяцкую. Старэчу абвязалі рукі пакульлямі, аблілі смалой і кат іх запаліў" („Круткі зарыс гісторыі папества", Ксёнжка і Ведза, 1954, стар. 109-110).

Падобных прыкладаў польскай культуры й рэлігійнасьці, як палякі заганялі праваслаўных у вунію, маецца многа й цяжка ды сорамна пісаць, што такія рэчы маглі рабіць хрысьціне над хрысьціянамі. І ня менш прыкра чытаць і глядзець як вуніяты й іхнія памагатыя, пераадзеўшыся сёньня за дабрадзеяў беларусаў, прыхільнікаў іхняй нацыянальнай справы, гэтыя ваўкі ў авечай шкуры зноў хочуць увесьці на Беларусі гэтую чужую й прасякнутую крывёй нашага народу вунію пры помачы польскай і ватыканскай агентуры. Яе некаторыя платныя работнікі, якія прадалі праваслаўную веру дзеля свае прыватнай выгады, прададуць і беларускую нацыянальнасьць, як гэта зрабілі раней такія-ж здраднікі вуніяты, аб чым сьведчыць гісторыя.

Тут акрамя рэлігійнай справы хаваецца й палітычная. Ужо ад часу Першай Сусьветнай вайны палякі ведалі, што Літва, хоць малая, але крыклівая, мае высокую нацыянальную сьвядомасьць. Таксама 50-мільённы народ Украіны —

традыцыйна варожа настаўлены да Польшчы, таму гэтыя дзьве краіны былога ВКЛ палякі памінаюць, а канцэтруюцца на Беларусі як на слабой ахвяры. На Беларусі яны бачаць свае „крэсы" й апошнія гады вядуць на яе свой культурны, палітычны й касьцельны наступ у духу польскага нацыяналізму й каталіцкага фанатызму.

Юрась Закрэўскі піша: „Вялікая місія Польшчы — гэта дапамагчы сваім братам за ўсходняй мяжой стаць нарэшце палякамі, а з часам (ёсьць надзея, што Савецкі Саюз разваліцца) і ўзьяднацца з маці-Польшчаю. Польскія палітыкі разьлічваюць, што гэта будзе зроблена без асаблівых турбот, бо супрацьстаяць гэтаму на Беларусі няма каму. Па-рознаму вызначаюцца будучыя межы, некаторымі да Смаленска" („Літаратура і мастацьтва" № 8 ад 22 лютага 1991 г.).

Сёньня Польшча займае першае месца сярод каталіцкіх краін сьвету па выпуску ксяндзоў. І гэтыя ксяндзы часта ўважаюць сябе за большых польскіх патрыётаў як каталікоў, ад якіх далёка не адышоў і папа Ян Павал II.

Штомесячнік „Часопіс" (№ 5 за май 1991 году) падае: „Папа Ян Павал II даў новы імпульс для дзейнасьці закону езуітаў. (...) На ўсход Эўропы прадбачваецца выслаць 1 200 езуіцкіх місіянераў, з каторых паважная колькасьць будзе скіравана на Беларусь. На Ўкраіну прадбачваецца іх менш, таму што яна „забясьпечана" праз аднаўленьне тысячы вуніяцкіх прыходаў у Галіцыі. Місіянеры маюць быць настаўнікамі ў духоўных сэмінарыях у Горадні (таксама ў будучыні ў Берасьці). Будуць маглі спаўняць функцыі выкладчыкаў на будучых польскіх унівэрсытэтах у Горадні й Берасьці й на існуючым літоўскім, у Вільні". Зусім талкова й прадбачліва піша Анатоль Сідарэвіч, член Цэнтральнай Рады БСДГ. Яго выказваньні зьяўляюцца перасьцярогай на будучыню й у гэтым ён бачыць віну сучаснага ўраду, які аб нічым ня дбае: „Гэты Вярхоўны Савет і гэты ўрад не ўсьведамляюць сваёй адказнасьці перад Бацькаўшчынай, перад гісторыяй. Кожны ўрад мае перад сваім народам абавязак гарантаваць яго палітычную, эканамічную, сацыяльную й культурную бясьпеку. Мне, прыкладам, было-б цікава ведаць: хто асабіста ва ўрадзе Рэспублікі дазволіў прыехаць на Беларусь цэлай кагорце польскіх каталіцкіх місіянераў?

Хто кантралюе іх дзейнасьць? Колькі ў казаньнях гэтых беспрынцыповых (у Польшчы) ксяндзоў палітыкі й колькі рэлігіі? Чаму ўрад Беларусі дазваляе весьці палітычную прапаганду й агітацыю замежным грамадзянам" („Літаратура і мастацтва", 15 лістапада 1991 г., стар. 4).

А што робяць у гэтай справе беларусы-каталікі, а перш за ўсё беларускі „патрыёт" — ксёндз Ян Матусевіч? Як згадвалася раней у „Голасе Часу", ён у гэты крытычны час для нашага нацыянальнага й рэлігійнага адраджэньня, замест трымацца сваіх каталікоў-беларусаў, перайшоў у вунію. Ці зрабіў ён гэта на сваё ўласнае жаданьне? Каталіцкая царква забараняе сваім вернікам пераходзіць у другую веру, але мы ведаем, што часам папы застаўлялі сваіх ксяндзоў пераходзіць у вунію. Як-бы там не было, усё-ж фактам застаецца, што а. Ян Матусевіч пакінуў беларусаў-каталікоў польскім ксяндзам на апалячаньне, а сам перайшоў у вунію, каб вэрбаваць новых вуніятаў і гэтым рабіць замяшаньне сярод праваслаўных. Мы ўжо бачым, якую навуку прапануе гэтым разам а. Матусевіч, які быў ужо праваслаўным, быў каталіком, сёньня ён вуніят а заўтра? Добры зь яго акрабат.

Як нас інфармавалі, ці то слушна, ці няслушна, быццам у часе свайго апошняга побыту ў Лёндане ў 1990 годзе а. Ян Матусевіч не памінуў і польскі касьцёл сьв. Анджэя Баболі. Пасьля езьдзіў у Ватыкан да папы па інструкцні, якія атрымаў з блаславенствам.

Хто-ж быў гэты сьвяты Анджэй Баболя, што пайшоў да яго маліцца а. Я. Матусевіч? А быў гэта польскі арыстакрат народжаны ў 1591 годзе ў Малапольшчы. Стаўшы езуітам у Вільні ў 1609 годзе, служыў у касьцёле сьв. Казіміра. Як прапагандыста каталіцкай веры ад 1623 году яго можна было спаткаць ня толькі ў Вільні, але ў Нясьвіжы, Бабруйску, Полацку, Пінску й другіх гарадах і вёсках Беларусі. Быў гэта чалавек, як прызнаюць самі палякі, халернага характару, нецярплівы, настойлівы й у пэўнай ступені нахабны. Студыяваў ёй у Віленскай акадэміі філязофію, пэдагогіку, тэалёгію. А калі прыйшло да экзаменаў у 1622 годзе, то на чатыры прадметы здаў толькі адзін. На гэтым бадай скончылася ягоная далейшая навука. Анджэй Баболя пайшоў па Беларусі наварачваць праваслаўных на каталі-

цызм. Сваімі паводзінамі ён выклікаў нянавісьць сярод праваслаўных. За ім ішлі дзеці грамадою й крычалі на яго.

Вуніяты, як вядома, не былі адзінокімі ў барацьбе з праваслаўнымі. Зь імі поруч стаялі іхнія апекуны й закладчыкі вуніі — езуіты, якія надзвычай хутка распаўсюджваліся ня толькі на Беларусі, але па ўсёй Эўропе й другіх кантынэнтах. Яны надавалі вялікае значэньне будаўніцтву касьцёлаў, манастыроў, навучальных установаў з мэтай апанаваць зьверху й зьнізу мясцовае насельніцтва. Ім дапамагалі й другія каталіцкія ордэны — бэрнардынаў, кармэлітаў, дамініканаў, аўгусьцінаў і іншыя. І ў гэтым калектыве дзейнічаў А. Баболя.

У 1657 годзе Баболя другі раз вярнуўся ў Пінск і 16 траўня яго й другіх каталіцкіх агітатараў злавілі казакі. У часе допытаў Баболя, як чалавек упарты, вёў сябе ўпарта й быў забіты казакамі. Фактычна яго забілі казакі за зьдзекі над праваслаўнымі ў Янове. Такім цудам папа Пій IX зрабіў у 1853 годзе езуіта Баболю другім сьвятым польскай Каталіцкай царквы на прасьледаванай Ватыканам Беларусі.

Як відаць, неўзабаве палякі зробяць трэцяга свайго сьвятога на Беларусі. „Дзеньнік польскі" ад 27 лютага 1991 году падае, што ў Берасьці патронам Згуртаваньня палякаў абраны Рамуальд Траўгут. А ў Польшчы гавораць, што ён павінен заняць месца на алтары, як сьвяты Каталіцкай царквы. Траўгут нарадзіўся 30 кілямэтраў ад Берасьця, ён не насьледаваў ані Кунцэвіча, ані Баболі, а быў кіраўніком Студзенскага паўстаньня 1863 году на Палесьсі й за гэта царскія ўлады яго павесілі, як і кожнага іншага кіраўніка гэтага паўстаньня. Чаму-ж тады не зрабіць Серакоўскага, Каліноўскага й другіх кіраўнікоў гэтага паўстаньня сьвятымі, якія былі католікамі й змагаліся ня горш за Траўгута й памерлі на шыбеніцы, каб жыла Польшча на Беларусі? І вядучую ролю ў гэтай палітычна-рэлігійнай гульні адыгрывае Ватыкан.

Нацыянальная й рэлігійная трагедыя на Беларусі пачалася з часу заключэньня польска-літоўскай вуніі ў Крэве ў 1385 годзе. Вунія гэта дала палякам права дзейнічаць у Вялікім Княстве Літоўскім. Ад часу гэтай вуніі палякі праз свой Каталіцкі касьцёл і ўслугі кароля Ягайлы імкнуліся падпарадкаваць пад сваё кіраўніцтва ВКЛ, што ім часткова

ўдалося. Некалькі разоў палякі-каталікі рабілі спробы аддаць Праваслаўную царкву пад уладу рымскага папы, але тут такая работа заўсёды канчалася нічым.

Справа падпарадкаваньня Праваслаўнай царквы Рыму сталася больш надзейнай пад канец XVI стагодзьдзя, калі папства пачало браць верх над рэфармацыяй. Тады якраз езуіты разгарнулі сваю актыўнасьць у ВКЛ з мэтай перацягнуць на свой бок праваслаўных уладыкаў. У гэтай рабоце галоўную ролю адыгрываў езуіт Пётр Скарга. Гэта ён перацягнуў праваслаўных епіскапаў Беларусі й Украіны ў унію за абяцанкі, якія ніколі не былі здзейсьнены.

Аднак шаноўны Іван Саверчанка памыляецца ў сваім атыкуле „Канцлер Леў Сапега", калі ва ўзьнікненьні вуніі на Беларусі абвінавачвае рэфармацыю, якая быццам змусіла праваслаўных епіскапаў Вялікага Княства Літоўскага пайсьці на пагадненьне з Рымам. Вось што ён піша: „Як сьведчаць тагачасныя гістарычныя крыніцы, яны (беларускія й украінскія епіскапы — Ю. В.) такім шляхам імкнуліся захаваць свае правы й ранейшы ўплыў на духоўнае жыцьцё насельніцтва Вялікага Княства перад наступам моцнага рэфармацыйнага руху, які ўсё больш адцясьняў Праваслаўную царкву. У сваёй барацьбе з рэфармацыяй яны не маглі абаперціся на грэчаскіх патрыярхаў, бо яны самі з падзеньнем Канстантынопаля трапілі ў залежнасьць ад турэцкіх султанаў. Зьвяртацца за дапамогай у Маскву, як прапанаваў Канстанцін Астрожскі, ніхто зь іх не рызыкаваў. Больш чакаць не было адкуль. Праваслаўная царква Вялікага Княства апынулася ледзь не на мяжы зьнікненьня. Каб узмоцніць сваю ўладу, праваслаўныя герархі й прынялі рашэньне адмовіцца ад падпарадкаваньня Канстантынопалю, прыняўшы першынство папы рымскага" („Голас Радзімы" № 12, 21 сакавіка 1991 г.).

Вось-жа, як падаюць тагачасныя гістарычныя крыніцы, рэфармацыя была работай творчых і дэмакратычных сілаў, якія выступалі супраць парадкаў Каталіцкай царквы зь яе біскупамі й папамі на чале, якія трымалі сваю ўладу дзякуючы Сьвятой інквізыцыі й праклёнам. Ёсьць праўдай, што Рэфармацыя рабіла сваю работу, прагрэс, і на Беларусі сярод праваслаўных арыстакратаў, якія пачалі перахо-

дзіць у пратэстантызм, але гэта рабілі яны са свае добрай волі, а не пад прымусам, як гэта рабілі езуіты й польскі Каталіцкі касьцёл.

Ня ёсьць праўдай, як піша Іван Саверчанка, што праваслаўныя беларусы і ўкраінцы быццам у сваёй барацьбе „не маглі абаперціся на грэчаскіх патрыярхаў, бо яны самі з падзеньнем Канстантынопаля трапілі ў залежнасьць ад турэцкіх султанаў". Якраз праваслаўныя беларусы й украінцы абаперліся на грэчаскіх патрыярхах. Іхнія прадстаўнікі: два патрыяршыя экзархі — Нікіфар ад Канстантынопальскага патрыярха й Кірыла Лукарыс ад Александрыйскага патрыярха, а таксама Лука, архіепіскап Макар з манастыра на гары Афон і іншыя духоўныя, сьвецкія й дзяржаўныя асабістасьці з князем К. Астрожскім і ягоным сынам Аляксандрам прысутнічалі на Праваслаўным саборы ў Берасьці ў кастрычніку 1596 г. Патрыяршы экзарх Нікіфар меў пісьмовае паўнамоцтва ад Канстантынопальскага патрыярха старшынстваваць на Саборы. І пазьней, у 1620 годзе, ерусалімскі патрыярх, будучы ў Кіеве, рукапалажыў шэсьць новых епіскапаў і мітрапаліта Іава Барэцкага й гэтым аднавіў Праваслаўную царкву ў ВКЛ.

Польскія ўлады са сваім Каталіцкім касьцёлам і вуніятамі дзейнічалі гвалтам. Аб гэтым сьведчыць праваслаўна-пратэстанцкі сабор, які адбыўся ў Вільні ў 1599 годзе. „Разбурана вялікую колькасьць нашых цэркваў і дамоў малітвы, а гэтыя гвалты суправаджалі рабункі, праліцьцё крыві, мардэрствы й усякая лютасьць як над жывымі, так і над памерлымі. (...) У шматлікіх мясцох забаронена прысутнічаць на багаслужбах і адпраўляць паховіны, а таксама другія хрысьціянскія абрады; забаронена будаваць цэрквы й дамы малітваў" (Януш Тазбір, „Пётр Скарга", Варшава 1962, стар. 110-111).

Факт застаецца той, што дзеячы Рэфармацыі — пратэстанты, разам з праваслаўнымі выступалі на сваіх зьездах супраць антыхрысьціянскіх дзеяньняў Каталіцкай царквы. Нават кальвінскі князь Слуцка, Януш Радзівіл VI, быў у саюзе з праваслаўнымі супраць каталіцкай акцыі. Мы не знаходзім у гісторыі ніякіх канфліктаў паміж пратэстантамі й праваслаўнымі акрамя супольных выступленьняў супраць дзікіх і антыхрысьціянскіх праяваў поль-

скай каталіцкай герархіі і яе памагатых вуніятаў супраць гэтых абедзьвюх цэркваў.

А што да грэчаскіх патрыярхаў, што „трапілі ў залежнасьць ад турэцкіх султанаў", то на гэтым ня быў канец Праваслаўнай царкве. Ад таго часу да Берасьцейскай вуніі прайшло паўтара стагодзьдзя і Праваслаўная царква не апынулася „на мяжы зьнікненьня", як гэта піша сп. Іван Саверчанка, яна існуе й сёньня.

Аб адносінах Каталіцкага касьцёла да Праваслаўнай царквы ў параўнаньні да магамэтанаў, то Хрыстафор Філялет, даючы адказ П. Скаргу на ягоную кніжку „Аб еднасьці царквы Божай...", у 1597 годзе пісаў аб насільлі каталікоў над праваслаўнымі, якога нават „християне в неволе турецкой живучи, ласки Божей не терпят". А незадоўга да заняцьця Канстантынопаля туркамі, на дамаганьні вуніята Ізыдора прагаласіць у Канстантынопалі Флярэнційскую вунію, адзін з духоўных саноўнікаў сказаў: „Лепш турэцкі турбан, як кардыналава шапка". І меў ён рацыю, бо ў 1204 годзе, калі лаціньнікі боем захапілі Канстантынопаль, яны моцна зьняважылі праваслаўную веру й яе сьвятое месца.

Знайшоўся яшчэ адзін абаронца вуніі, Міхась Паўлаў, які ў газэце „Выбар" (№ 3 ад 6 лістапада 1991 г.) у артыкуле „Забойства на Прачысьценскай гары" пралівае кракадзілавыя сьлёзы па кату Язафату Кунцэвічу й вуніі. Ён піша: „Пазбавілі жыцьця ўладыку, пастаўленага па закону Сьвятой царквы, зацьверджанага прывілеем караля". Ці-ж ня ведае М. Паўлаў, што кароль і Кунцэвіч і ім падобныя, якія несьлі беларускаму народу чужую веру, а забаранялі карыстацца сваёй першабытнай Праваслаўнай верай і яе традыцыямі, былі на Беларусі чужымі людзьмі?

Далей М. Паўлаў хоча некаму ўмовіць, што быццам Леў Сапега ня мог напісаць крытычнага пісьма Кунцэвічу. Паводле ягоных слоў: „ці мог так пісаць адзін з тварцоў вуніі на сваё дзіцятка?" Так можа сказаць чалавек не абазнаны з гісторыяй, які замыкае вочы на факты або займаецца сьвядомай прапагандай. Аднак Л. Сапега пісаў і павучаў фанатыка вуніі Кунцэвіча, раіў як мае трымаць сябе сярод людзей. І ў гэтым месцы прывядзём некаторыя выняткі зь пісьма вялікага канцлера ВКЛ Л. Сапегі да Язафата Кун-

цэвіча: „Вы Вашымі неразважнымі гвалтамі падбурылі й прымусілі народ рускі да супраціўлення й зламаньня ўчыненай яго каралеўскай Міласьці прысягі. Цяжка вам пярэчыць гэтаму, бо вас пераконваюць пададзеныя ад іх найвышэйшым ураднікам польскім і літоўскім жалабы. Ці-ж вам не вядомы нараканьні люду, што яны прагнуць лепш быць у подданстве турэцкім, чымся цярпець гэтакі ўціск веры й набажэнства свайго? (...) Вы злоўжываньнем свае ўлады, кіруючыся хутчэй гультайствам і прыватнай нянавісьцю, чым любоўю да бліжняга, супраць сьвятой волі й нават забароне Рэчы Паспалітае, былі прычынай і паджогай тых небясьпечных іскраў, каторыя ўсім нам пагражаюць пажарамі ці то вельмі згубнымі, ці то ўсё травячы. (...) Што датычыць небясьпекі, пагражаючай Вашаму жыцьцю, дык можна сказаць: „Кажды сам прычынай сваёй бяды" („Спадчына" № 1, 1991, стар. 73).

Так гэта ў сапраўднасьці выглядала вунія, якую ўводзіў на Беларусі Я. Кунцэвіч. Аб гэтай вуніі й удзеле ў ёй Льва Сапегі варта паслухаць што піша М. Шкялёнак: „У дадатку Вялікі Канцлер (Л. Сапега) зрабіў сам тут памылку, дапамагаючы вуніі ў часе яе тварэньня, хоць кіраваўся самымі шляхэтнымі, як з агульналюдзкога пункту гледжаньня, так і інтарэсаў беларускага народу, думкамі. Памылку гэту Сапега пазьней сам зразумеў, вельмі яе шкадаваў, аднак апраўдаць яе, нягледзячы на сваё жаданьне, ня мог. Усё-ж справа ўдзелу Сапегі ў рэлігійным жыцьці Вялікага Княства мае для беларускае гісторыі велізарнае значэньне, бо яна выясьняе ролю магутнае постаці Сапегі ў ратаваньні сваёй айчыны ад тае агоніі, у якой яна апынулася ў выніку безупынна трываўшае вайны між дзвюма часткамі аднаго й таго-ж народу" („Спадчына" № 1, 1991, стар. 6).

Далей М. Паўлаў піша: „Я ж заўважыў ці можна пісаць пра Кунцэвіча й Вуніяцкую царкву, не прачытаўшы дакумантаў тае пары?" А чытаў іх Міхась Паўлаў? Пэўна не, бо калі-б чытаў, то такіх недарэчнасьцяў не пісаў-бы. Варта было-б прачытаць М. Паўлаву, як рымская курыя слала свае сакрэтныя павучэньні сваім нунцыям у Польшчы як маюць наварачваць праваслаўных беларусаў і ўкраінцаў у вунію. У інструкцыі Ватыкану для папскага нунцыя ў Польшчы

Лелію Руіні ў 1612 годзе загадвалася: „Захоўваць усялякую асьцярожнасьць і найбольшую тайну, каб (...) спакойна дацягнуць намечаную мэту". А ў Сьвятым Евангельлі сказана, што нічога няма тайнага, каб ня сталася яўным. Каталіцкая царква заўсёды карысталася й карыстаецца тайнымі й яўнымі павучэньнямі, якія часам далёкія ад сапраўднай навукі Хрыста. Агонь, меч, прасьлед, людзкая кроў і „найбольшыя тайны" служылі й служаць мэтам пашырэньня каталіцкага хрысьціянства. Сродкі апраўдваюць мэты.

Сёньня вуніяты моляцца: „Мы, дзеці Беларускага Народу, як маглі служылі Тваім загадам, але са слабасьці чалавека часта падалі й зьневажалі Цябе сваімі грахамі. Цяпер молім Цябе шчыра: даруй нам". Слухалі вуніяты тады й слухаюць цяпер ня Божых загадаў, а грэшных папаў рымскіх, якіх маніяй было й ёсьць кіраваць усім хрысьціянскім сьветам, дзеля свае выгады.

Цяпер Каталіцкая царква прыняла, быццам, гуманную форму, але, як і раней, дзе толькі даецца ёй, хоча прышчапіць праваслаўным сваю веру, нават няшчасным беларускім дзецям адарваным на кароткі час ад бацькоў: „Выязджаючы ў Польшчу на лячэньне дзеці з тэрыторыяў пацярпеўшых ад чарнобыльскай аварыі, вяртаюцца ўжо напалавіну католікамі. На занятках ксёндз ім гаворыць: да праваслаўных бацюшкаў не хадзіце, а ёсьць у вашым горадзе такі-то (даецца адрас мясцовага ксяндза), да яго ідзіце" („Журнал Московской Патриархии" № 10, 1991, стар. 22).

А аб той вуніяцкай веры, „зацьверджанай прывілеем караля", папскі нунцый у Польшчы Касма дэ Тарэс так пісаў у 1622 годзе ў сваім данясеньні: „Немагчыма апісаць наколькі рускі народ ненавідзіць рымскіх католікаў. Гэтая нянавісьць даходзіць да такой ступені, што пры спатканьні рыма-каталіцкага ксяндза яны плююць на зямлю ад жаху й агіды". І гэта, паводле М. Паўлава, таксама можа быць няпраўда.

Лепш пазнаць праўду, і часам горкую праўду, як паўтараць недарэчную й фальшывую прапаганду, а яшчэ лепш, калі чалавек нечага ня знае добра, то лепш маўчаць. Але знаходзяцца „знатакі" з навуковымі званьнямі, якія абвяргаюць злачынствы вуніята Язафата Кунцэвіча й гэтым фальшуюць гістарычную праўду.

Як нас інфармуюць, сярод сёньняшніх вуніятаў на Беларусі ёсьць добрыя беларусы, былыя бязбожнікі, якія нядаўна паверылі ня ў Бога, а ў прапаганду агентуры Ватыкану на Беларусі, заснаванай польскімі езуітамі. Але аб гэтым усе маўчаць.

Прывядзём яшчэ адзін прыклад з гэтай беларускай дзяржаўнай рэлігіі вуніі, якая давяла наш народ да паляніза-цыі. А. Касьцень піша: „Мяркую па сваёй Пастаўшчыне, якая ня можа быць выключэньнем. Неяк узяў я ў рукі аловак і пачаў запісваць: ксёндз у Лынтупах — паляк, у Паставах — паляк, у Дунілавічах — паляк... Бацюшка ў Манькавічах і Груздаве — украінец, у Паставах — рускі... Немалаважная гэта прычына таго, што стаўленьне да беларускасьці ў царкве варожа нейтральнае, у касьцёле часьцей за ўсё — зусім варожае. Па сваёй волі ці не па сваёй вядуць такую палітыку сьвятары — меркаваць не бяруся. Ведаю адно: пры касьцёле й пры царкве ў Паставах даўно ўжо дзейнічаюць школкі для дзяцей, дзе ўнукаў і ўнучак маіх дзядзькоў, якіх у агульнаадукацыйных школах яшэ толькі зьбіраюцца вучыць на роднай мове, вучаць па-расейску й папольску. І школкі гэтыя ў іх жыцьці ўжо „вьшэйшыя".

Неяк нядаўна завітаў зноў у рэдакцыю адзін з тых элеганцкіх дзядзькоў. Прынёс аб'яву аб раскладзе работы курсаў па вывучэньні польскай мовы для дарослых. Адпаведныя беларускія каторы ўжо год зьбіраюцца адчыніць, гэтыя-ж — пасьпяхова дзейнічаюць. Дзядзька выконвае абавязкі старасты. Ён і не хавае, што галоўны ініцыятар і ці не фундатар курсаў — касьцёл.

На гэты раз гутарка атрымалася ў нас больш шчырая. І прозьвішча чалавека, і гаворка сьведчылі аб яго беларускасьці. Родным вясковым, так і не пераадоленым умовамі местачковага жыцьця веяла ад кожнага слова. Але называе ён сябе палякам, як і дзяцей, унукаў сваіх. Пераканаць у адваротным шчырага, простага чалавека немагчыма. Яно-ж ад першай споведзі, ад глыбінных дзіцячых уражаньняў у касьцёле.

Нястомны зьбіральнік гісторыі роднага краю І. Быхавец адшукаў нядаўна цікавы дакумант: справаздачу аб дзейнасьці народнага вучылішча ў Лынтупах за 1909/1910 навучальны год. Цікавыя тут зьвесткі аб дзейнасьці школы, і, між

іншым, аб нацыянальнасьці вучняў. Беларусаў — 91, рускіх — 4, яўрэяў — 5, палякаў — 3... А прайшло ўсяго восем дзесяцігодзьдзяў. Два пакаленьні маіх землякоў вырасьлі на роднай зямлі, але — каля касьцёла, які і сёньня адыгрывае ў нас тую-ж ролю" („Літаратура і мастацтва", 3 студзеня 1992 г., стар. 4).

Што да караля Жыгімонта III Вазы й яго „прывілеі", аб якой з пашанай згадвае М. Паўлаў, то канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега пісаў да князя Радзівіла 17 лютага 1588 году так: „Кароль казаў, што больш палякам павінен, чымся Літве, бо яму палякі больш зычлівасьці паказалі, як Літва. І ня толькі гэта кажа, але й робіць. Ужо там больш палякі ў нас (у Вялікім Княстве) дастаюць, чымся сама Літва; ліцвіну зараз адмовяць, а паляку зараз дадуць. Дзеля гэтага азнаямляю Вашай Міласьці, што, як толькі штось адчыніцца, дык усё палякам хоча (у Вялікім Княстве) аддаць" („Спадчына" № 1, 1991, стар. 62).

Язафат Кунцэвіч ня быў ніякім „патрыётам" свае Бацькаўшчыны, а сьляпым фанатыкам. Сваёю дзейнасьцю ён уводзіў Сьвятую інквізыцыю, якая ўчыняла зьдзекі над хрысьціямі, калі не хацелі яны пакланіцца рымскаму папу. І ўсе гэтыя праступнікі, як Дамінік, Кунцэвіч, Баболя й ім падобныя, на сумленьні якіх не адна замучаная людзкая ахвяра, апынуліся ў ліку сьвятых Каталіцкай царквы, а такія людзі, як Міхась Паўлаў і яму падобныя, б'юць ім свае паклоны.

Адным зь ідэйных аднадумцаў Язафата Кунцэвіча быў беларускі ксёндз Адам Станкевіч. Што праўда, розьніца паміж імі вялікая. Першы быў брутальны, праступны й здольны на ўсякую пакасьць. Другі — больш інтэлігентны, карыстаўся зазвычай добрым словам і пяром. Аднак мэта як аднаго, так і другога была адна.

Чытаючы ў „Спадчыне"(№ 1/92) „Родную мову ў сьвятынях" аўтарства ксяндза Адама Станкевіча, якога некаторая беларуская прэса размалёўвае як беларускага патрыёта, дзеяча, даходзім да высновы, што гэты вобраз не зусім адпавядае рэчаіснасьці. Аўтар нагадвае больш работніка каталіцкай палітыкі, як сапраўднага, памяркоўнага сьвятара. Будучы сам рыма-каталіцкім сьвятаром, Станкевіч піша больш аб вуніі як аб сваім Каталіцкім касьцёле на Беларусі, хоць дзьве

гэтыя канфэсіі служылі й служаць адной і той самай мэце й падпарадкоўваюцца таму самаму рымскаму папу.

Некаторыя выказьваньні ксяндза А. Станкевіча ў ягонай кніжцы „Родная мова ў сьвятынях" не адпавядае гістарычнай і царкоўнай праўдзе, а толькі ўводзіць у зман неабазнанага з царкоўнымі справамі чалавека. Напрыклад, ксёндз А. Станкевіч піша: „Ад пачатку прыняцьця хрысьціянства аж да канца XIV веку ўсе беларусы былі ўсходняга абраду й да в. XI-XIV належалі да Каталіцкага касьцёла. Калі-ж у XI в. грэкі адарваліся ад гэтага Касьцёлу, праз Расею пацягнулі за сабою так-жа й Беларусь".

Напісана адна вялікая недарэчнасьць, глупства. Калі „ад самага прыняцьця хрысьціянства аж да канца XIV веку ўсе беларусы былі ўсходняга абраду", — як гэта піша ксёндз А. Станкевіч, то як яны маглі належаць да Каталіцкага касьцёла? (Маецца тут на ўвазе Рым). У тым часе Каталіцкі касьцёл ня меў ніякага ўплыву й ўлады над Праваслаўнай царквой на Беларусі, якая была ў цесных зносінах з Канстантынопалем, зь якога прыняла хрысьціянства ў 988 годзе.

Другая недарэчнасьць, гэта быццам грэкі адарваліся ад Каталіцкага касьцёла і праз Расею пацягнулі за сабою таксама й Беларусь. Факт ясны як Божы дзень, што ня грэкі адарваліся, а лаціньнікі адарваліся, інакш кажучы, увялі раскол у Царкве праз папскую булу й пыху.

Шкада, што заўчасна памёр ксёндз А. Станкевіч, каб даведацца як высланьнік Ватыкану, кардынал Аўгустын Бэа, будучы у Канстантынопалі (Істамбуле) у красавіку 1965 году маліўся ў былой базыліцы сьв. Сафіі (туркі зрабілі ў ёй у 1934 г. музей) і прасіў прабачэньня для кардынала Гумбэрта, які 16 ліпеня 1054 году кінуў на алтар гэтай сьвятыні папскую булу і, пракляўшы патрыярха, дэманстратыўна выйшаў з катэдры са сваімі прыбочнымі. Такія нахабныя паводзіны кардынала Гумбэрта ў Канстантынопалі разьядналі хрысьціянства, але ксёндз А. Станкевіч уважаў, што гэта „грэкі адарваліся ад гэтага касьцёла", г.зн. рымскага.

Далей ксёндз Станкевіч піша больш талкова, але не зусім дакладна: „Пачатак у нашым краі беларусаў-каталікоў лацінскага абраду вядзецца ад 1386 г., калі Ягайла, стаўшыся каралём Польшчы й вялікім князем літоўскім, загадаў

хрысьціць разам зь літвінамі й беларусаў, дагэтуль няхрышчаных. Каб падабацца ўладзе і мець больш правоў, нямала так-жа праваслаўных беларусаў прыняло каталіцтва ў форме лацінскай. Лік, вядома, беларусаў-лаціньнікаў яшчэ тады ня быў вялікі".

Шкада, што ксёндз А. Станкевіч не падае мэтадаў, якімі кароль Ягайла разам з польскімі ксяндзамі заганялі літоўцаў і беларусаў, ужо хрышчаных у праваслаўнай веры, у каталіцкі касьцёл, і абмежаваўся такой прыгожай фразай: „Каб падабацца ўладзе й мець больш правоў". Гэта ўжо сьведчыць як каталікі-палякі глядзелі на інаверцаў, і якімі правамі яны карысталіся пад уладай католікаў, калі прымалі каталіцкую веру, „каб падабацца ўладзе й мець больш правоў".

Другую недарэчнасьць, якую хоча паказаць нам ксёндз Станкевіч, гэта быццам у XIV стагодзьдзі сярод беларусаў былі пагане, або няхрышчаныя, якіх ахрысьцілі на каталікаў. Цікава было-б ведаць, якім спосабам іх ахрысьцілі?

Агульна вядома, што Беларусь прыняла хрысьціянства ў X стагодзьдзі й за чатыры стагодзьдзі свае дзейнасьці Праваслаўная царква ахапіла ўсіх беларусаў за выняткам літоўцаў, якіх ніхто не прымушаў прымаць хрысьціянскую веру, многа хто зь іх дабравольна прымаў праваслаўе, як гэта зрабіў сьпярша Ягайла. Як верны слуга Ватыкану ксёндз А. Станкевіч піша: „Апостальская сталіца, адарваных ад еднасьці касьцельнай нашых продкаў, не пераставала клікаць да павароту. Заклік гэты ўрэшце знайшоў свой адгалосак, бо ў 1596 г. у Берасьці, зь невялікімі выняткамі, беларусы прыступілі да Каталіцкага касьцёла. У той час, калі была дасягнута рэлігійная вунія ў Берасьці, беларуская мова была ўжо мовай самастойнай, мовай культуры, навукі, мовай дыпляматыі, сойму, суду, адміністрацыі".

І тут ксёндз Адам Станкевія нічога ня піша якім парадкам і правам беларусы й украінцы прыступілі да гэтай вуніі ў 1596 годзе, быццам ён нічога тут ня знае, а трэба было нешта напісаць. Відаць, не дазваляла сумленьне, не было моцных аргумэнтаў, калі абмежаваўся толькі да кароткай зацемкі: „Беларусы прыступілі зноў да Каталіцкага касьцёла", быццам некалі да яго належалі.

Ня будзем у гэтым месцы разглядаць Берасьцейскую вунію, бо гэта абшырная тэма. Маюцца напісаныя кніжкі і шматлікія артыкулы, якія паказваюць хто закладаў вунію й дзеля чаго й каму яна была патрэбна.

Далей у сваёй кнізе Адам Станкевіч узвышае вунію, надае ёй аўтарытэт карыстаньня беларускай мовай, пісьмом і т.п. Аднак неўзабаве з гэтых прыгожых вуніяцкіх кветак пачынае зьбіраць горкія ягадкі. Ён піша тут цьвяроза: „Але пасьля расьцьвету беларускай культуры рэлігійнай, дзякуючы шырокаму ўжываньню ў жыцьці рэлігійным беларускай народнай мовы асабліва ў XVI ст., пад канец XVII ст. наступіў заняпад. Пасьля вуніі нашага краю з Польшчай у 1569 г. уплыў польскай культуры паволі да таго здужэў у нас, што мова польская ўсё больш і больш выціскала як з публічнага жыцьця агулам, так і з Касьцёла лацінскага ці вуніяцкага беларускую мову. Дайшло ўрэшце да таго, што пастанова нашых законаў з 1588 г. аб тым, што ўрадавай мовай у краі зьяўляецца мова беларуская, была скасавана й у 1697 г. выданы новы закон, што такой мовай ужо мае быць мова польская".

Як пісаў вышэй ксёндз А. Станкевіч, да Берасьцейскай вуніі 1596 г. і нават у часе гэтай вуніі, „мова беларуская была ўжо мовай культуры, навукі, мовай дыпляматыі, сойму, суду, адміністрацыі". Дык што сталася, што ў 1697 годзе яе заступіла мова польская? Дзе-ж была й што рабіла „беларуская нацыянальная царква" — вунія са сваёй беларускай мовай? І аб гэтым нічога не гаворыць ксёндз А. Станкевіч. Ці-ж у яго не хапае адвагі шчыра прызнаць палянізацыю, якую прынесьлі на Беларусь палякі са сваім Каталіцкім касьцёлам і Ордэнам езуітаў? Якія пастановы выносілі польскія каталіцкія біскупы на соймах супраць інаверцаў? І якую ганебную ролю ў гэтай бруднай рабоце выконвала Вуніяцкая царква з наказаў папскіх нунцыяў? Зразумела, што такія рэчы непрыемна пісаць духоўнай асобе й яна іх памінала.

А. Станкевіч добра знаў, што марай Каталіцкай царквы даўно было ўвайсьці на тэрыторыю праваслаўных русінаў і яна прымяняла ў гэтай рабоце розную тактыку. Як толькі Польшча ўзмоцніла сваё панаваньне на землях Вялікага Княства Літоўскага ў XVII стагодзьдзі, то за яе войскам і ад-

міністрацыяй ішлі польскія каталіцкія ксяндзы са сваімі ордэнамі й школамі. Кандыдат гістарычных навук П. Лойка піша: „У Рэчы Паспалітай паступова — да сярэдзіны XVII ст. — фарміруецца новая ня толькі сацыяльная, але можна сказаць, і этнічная супольнасьць — „польскі народ шляхецкі", — якая аб'ядноўваецца не толькі адзінымі правамі й прывілеямі, палітычнай ідэалёгіяй, але й адзінай рэлігіяй (каталіцызмам), і адзінай мовай (польскай). Апалячваньне шляхты на беларускіх землях прывяло недзе ў сярэдзіне XVII ст. да сітуацыі, калі беларускае грамадзтва рэзка падзялілася па сацыяльна-рэлігійнай прыналежнасьці на „ляхаў-папежнікаў" і „люд просты беларускі". Безумоўна, гэтая акалічнасьць была вынікам заняпаду нацыянальнай дзяржаўнасьці й нацыянальнай культуры" („Настаўніцкая газэта" № 40, 20 мая 1992 г., стар. 3).

Аднак ксёндз Адам Станкевіч бароніць беларускую мову ў Вуніяцкай царкве, але ў крывым люстэрку й прыводзіць нам такі характэрны факт: „Полацкія вуніяцкія біскупы ў канцы XVIII і пач. XIX ст. рассылалі загады парафіяльным ксяндзам, каб па-беларуску гаварылі казаньні й беларускай мовай карысталіся пры катэхізацыі. Да нашага часу захавалася „Одэзва Ясьне Вельможнэго Якуба Мартусевіча Луцкего Д'ецэзьяльнэго Біскупа й адміністратора Полоцкей Архід'ецэзіі до ужэнднікув онэй в 1824 р. месёнца пазьдзерніка..." . З гэтага дакуманту відаць ясна якой мовай карысталася Каталіцкая (вуніяцкая) царква ў сваёй канцылярыі на Беларусі й на якой мове зьвярталася яна да сваіх падначаленых — на польскай, а не беларускай. Як не стараўся-б А. Станкевіч абараняць беларускую мову ў Вуніяцкай царкве, яму гэта не ўдаецца й у канцы прызнае: Увесь век XVIII — гэта час павольнага канчаньня беларускага народу, яго мовы й культуры. Каталіцкі касьцёл на беларускіх землях, ня толькі лацінскі, але й вуніяцкі, за гэты век пасьпеў бадай цалкам спольшчыцца. Замест роднай мовы запанавала ў ім польская. (...) Вунія дазволіла запрэгчыся ў польскую сьвецкую палітыку на шкоду каталіцтву й на шкоду беларускага народу. Словам, на пач. XIX в. сьмяротным ужо потам было пакрыта чало Беларусі, а такжа й Вуніі".

Сказана ясна, шчыра і зразумела. Аднак сёньня агенты Ватыкану хлусяць неабазнаным людзам аб „беларускай нацыянальнай рэлігіі" — вуніі зь беларускай мовай у царкве. Ёсьць праўдай, што беларуская мова была ў царкве, але праваслаўнай і захоўвалася там аж да падзелу Рэчы Паспалітай. А ў Вуніяцкай царкве польская мова запанавала хутка, яе вернікі пачалі пераходзіць у каталіцызм і з часам палянізаваліся.

Такая польская палітыка прывяла сьпярша да Люблінскай вуніі, аб якой так піша акадэмік Ю. Астроўскі: „У 1569 г. Люблінскай вуніяй утвараецца фэдэратыўная польска-беларуска-ўкраінская дзяржава Рэч Паспалітая, узмацняецца рэлігійная палянізацыя насельніцтва (...) Вялікага Княства. З праваслаўных беларускіх магнатаў, у пагоні за каралеўскімі прывілеямі, каталікамі сталі Радзівілы, Сапегі, Хадкевічы, Пацы, Тышкевічы й іншыя. Сярод апошніх аказаліся й прабацькі Агінскіх, Манюшкі, Міцкевічы, Ажэшкі, Сыракомлі, Касьцюшкі, Дамэйкі й многія з тых, хто сваёй творчасьцю й палітычнай актыўнасьцю пайшлі ў польскую культуру. (...) Дваране (шляхта) Вялікага Княства, якія прынялі каталіцтва, сілком робяць каталікамі ўсіх сваіх сялян, ксяндзы часьцей за ўсё засылаюцца на землі княства з Польшчы й вядуць актыўную рэлігійна-нацыянальную палітыку асыміляцыі беларусаў" („Літаратура і мастацтва" № 20, 15 мая 1992 г., стар. 14).

Пасьля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай у 1796 годзе ўся Беларусь апынулася пад Расеяй. Царскі ўрад, знаючы мэтады, якімі ўводзілася каталіцтва й вунія на праваслаўнай Беларусі й якія зьдзекі й паніжэньні перажывалі праваслаўныя ў Рэчы Паспалітай, быў схільны вярнуць беларусам іхнюю паніжаную першабытную праваслаўную веру. Цяжкасьцяў вялікіх тут не было. Як некалі ў 1596 годзе праваслаўныя епіскапы пайшлі ў вунію пад націскам, так у 1839 годзе дабравольна вярнуліся назад у праваслаўе. Аб гэтым гістарычным павароце вуніятаў на лона свае Царквы ксёндз А. Станкевіч піша так: „Даканалі гэтага трагічнага дзела Віленскі вуніяцкі біскуп Язэп Сямашка, з паходжаньня ўкраінец, Антон Зубка, вуніяцкі біскуп Брэсцкі й Базыль Лужынскі, вуніяцкі біскуп Аршанскі, — абодва з паходжаньня беларусы. Зь лёгкім сэрцам здрадзілі яны веру й народ".

Так, як бачым, ксёндз А. Станкевіч паказаў сябе рашучым прыхільнікам вуніі, змагаром за падпарадкаваньне Праваслаўнай царквы рымскаму папу. У яго няма рэспэкту да іншых веравызнаньняў, як толькі да рымскай веры. Калі ў 1595 годзе праваслаўныя епіскапы здрадзілі сваю веру й народ і перайшлі ў вунію, — у паняцьці ксяндза А. Станкевіча, — гэта не была здрада. Але, калі ў 1839 годзе вуніяцкія епіскапы вярнуліся назад да свае спрадвечнай праваслаўнай веры, то тут ужо на думку ксяндза А. Станкевіча была здрада й ён піша: „Зь лёгкім сэрцам здрадзілі яны веру й народ. (...) Раз здрадзілі свой народ, не зразумелі й ня вычулі яго гістарычных дарог і не спрацівіліся хвалям быту яго заліваючым, дык лёгка такжа здрадзілі й польшчыну, да якой нібы былі прывыкшы. Здрадзілі яны лёгка й веру, бо вунія ўжо не была вуніяй, яна была спольшчанай часьцінай лацінскага касьцёла й то, як меркавала тагачаснае польскае грамадзтва, горшага гатунку".

Вось да чаго дакацілася вунія на Беларусі. І сёньня беларусы павінны дзякаваць Богу й маліцца, што на Беларусі ня стала вуніі, бо інакш усе мы, як нацыя, перасталі-б існаваць, а былі-б палякамі. Былы вуніяцкі архіепіскап Язэп Сямашка ў 1863 годзе пісаў: „Некалькі стагодзьдзяў рускі народ гэтай краіны (г.зн. беларускі на Беларусі) знаходзіўся пад ігам Польшчы. У гэты час пазбавілі яго ня толькі старажытнага праваслаўя дарогай вуніі, але палакоміліся на яго родную мову (...) і, зь цягам часу, ня толькі асобныя прадстаўнікі, пераважна граматныя, але цэлыя прыходы й акругі па розных мясцовасьцях, забыўшыся свае родныя штодзённыя малітвы, пачалі карыстацца малітвамі на польскай мове".

Ня толькі беларускія магнаты й шляхта апалячыліся праз польскі Каталіцкі касьцёл і вунію, але й дробная беларуская шляхта, сяляне. Раней яны ня ўмелі гаварыць па-польску, але будучы пад уплывам польскіх ксяндзоў, апалячаных вуніятаў-сьвятароў і католікаў магнатаў з часам усе яны апалячыліся. Польскія каталіцкія ксяндзы на Беларусі былі фактычна польскімі агентамі, якія выконвалі ролю ідэалягічных дывэрсантаў. Гэта яны ліквідавалі нацыянальную сьвядомасьць беларускага народу й падабралі ў свае рукі Вуніяцкую царкву.

Часам цяжка зразумець ксяндза Адама Станкевіча. Магчыма ў залежнасьці ад абставін часу ў яго пачалі мяняцца й погляды да рэлігійных канфэсіяў. Ён пачынае больш талкова разумець пачуцьці людзей іншых канфэсіяў. Напрыклад, у 1938 годзе з нагоды 950 угодкаў хрышчэньня Беларусі ён сказаў такія словы, над якімі варта задумацца сёньня: „Мы ў нашых узаемных адносінах павінны больш зьвяртаць увагу на тое, што нас аб'ядноўвае ў хрысьціянстве, чым на тое, што нас дзеліць. (...) У жыцьці нашым хрысьціянскім павінны мы ўсе выжываць чужы й хрысьціянству, і народу элемэнт палітычны, стараючыся карыстацца сваёй беларускай мовай. (...) Гэта расчыніць дарогу хрысьціянству ў душу беларускага народа, гэта скіруе беларускі народ на яго прыродныя пункты апоры, каб ён захаваў раўнавагу й марна ня згінуў. Шуканьне й тварэньне беларускай нацыянальнай й рэлігійнай сінтэзы — гэта жаданьне ўзложанае на нас самой гісторыяй, самым Богам" („950-годзьдзе хрышчэньня Беларусі", Вільня 1938, стар. 11-12).

Так гэта выглядала нефартунная гісторыя вуніі са сваёю „роднаю моваю ў сьвятынях", якую сёньня Ватыкан намагаецца аднавіць на Беларусі той самай старой дарогай праз польскіх ксяндзоў, якіх наслаў ужо нямала на Беларусь. Гэтыя польскія ксяндзы-партыёты праводзяць на Беларусі большую палянізацыйную работу як рэлігійную. А вуніяты-пярэхрысты вядуць сваю разбуральную работу пад маркай наццарквы сярод праваслаўных. І ўсё гэта робяць платныя работнікі з блаславенства рымскага папы Яна Паўла II.

У газэце „Пагоня" (№ 17 (31) ад 18-24 чэрвеня 1993 г.), што выходзіць у Горадні, быў зьмешчаны артыкул „Трэці лішні, альбо, ці можа вунія стварыць рэлігійную канфрантацыю?" Аўтарам артыкула зьяўляецца слухач Каталіцкага коледжу сьв. Фамы Аквінскага ў Горадні А. Сафу. Відаць, што паважаны слухач коледжу так наслухаўся навукі сваіх выкладчыкаў „праўдзівай веры", што хуценька ўзяўся за пяро, каб нешта напісаць на тэму праваслаўнай і каталіцкай Царквы на Беларусі, дзе ўсяленскасьць грэка-каталіцызму можа адыграць рашаючую ролю ў аб'яднаньні дзьвюх сястрынскіх канфэсіяў", піша А. Сафу. Толькі не напісаў пад чыім кіраўніцтвам мае наступіць аб'яднаньне? Але ў да-

лейшым тэксьце гэта будзе відаць. Аднак тут варта напомніць паважанаму А. Сафу некаторыя царкоўныя й гістарычныя факты, якія, мабыць, для яго не зусім вядомыя.

Царкоўныя праблемы Ўсходняй і Заходняй цэркваў злажыліся розна, нават геаграфічная адлегласьць дзяліла Рым ад Канстантынопаля. Таму, каб у іх лепш разабрацца, мала быць слухачом коледжу, трэба прастудыяваць не адну царкоўную і гістарычную кніжку, каб належна разабрацца дзе што й чаму так сталася? Усё-ж у сваім артыкуле сп. А. Сафу мае адну крупінку рацыі, калі піша, што „сама-ж гісторыя расколу Царквы дакладна паказала нам, што ў аснове расколу ляжыць ня спрэчка аб дагматыцы паміж Заходняй й Усходняй царквой, а складаная палітычная барацьба за ўладу як дзяржаўную, так і рэлігійную". З гэтым я згодны часткова, што сьпярша не было дагматычных спрэчак паміж Усходняй і Заходняй цэрквамі. Аднак А. Сафу памыляецца, калі ён ставіць побач Каталіцкай царквы барацьбу Праваслаўнай царквы за дзяржаўную ўладу. Такая барацьба адносіцца выключна да Заходняй царквы, якой папы кіравалі, кіруюць і адначасна змагаюцца за сваю касьцельную дзяржаву. А ў Візантыйскай імпэрыі, як раней, так і пазьней, патрыярхі не ваявалі за дзяржаўную ўладу, за яе ваявалі пераважна генэралы, каб быць імпэратарамі. А ў царкоўным жыцьці рашаў не патрыярх, а сабор епіскапаў, а ў каталікоў рашае папа, які стаіць вышэй сабору і яму ўсе падпарадкоўваюцца.

У канцы XVIII стагодзьдзя, у выніку Французскай рэвалюцыі 1789 году, у Рыме пачынае ўпадаць папская сьвецкая ўлада й ужо за папы Пія IX (1846-1876) папская ўлада зусім упала. Яна была адабраная ад папы дэмакратычным шляхам праз агульнае галасаваньне народу Італіі. Аднак з воляй народу папа Пій IX ніяк не хацеў пагадзіцца й у роспачы за зямное царства пракляў усіх тых і нават караля Італіі, што спрычыніліся да ўпадку ягонай сьвецкай улады. Так гэта закончылася папская дзяржаўная ўлада над народам Італіі — не блаславенствам, а праклёнам.

Таксама ня ёсьць праўдай, што „Канстантынопаль, стаўшыся сталіцай Візантыйскай імпэрыі, жадаў ня толькі параўняць сябе з Рымам, атрымаць поўную незалежнасьць,

але й рэлігійна ўзьнесьці сябе". Паважаны А. Сафу павінен ведаць са старажытнай гісторыі, што Канстантынопаль стаяў як навукова, так і рэлігійна куды вышэй за Рым. Не з Захаду на Ўсход, а з Усходу на Захад ішла навука, культура й хрысьціянская вера яшчэ да пабудовы Канстантынопаля. А ў той час, калі ў Канстантынопалі не было ніводнай паганскай сьвятыні, у Рыме налічваліся іх сотні. Нават на Ватыканскай гары за сьцяной базылікі да IV стагодзьдзя пагане практыкавалі свае абрады са сьвятым быком. Рымскія арыстакраты, якія сядзелі ва ўрадах, былі заўзятыя пагане, а народ Рыму дыхаў сваім гістарычна-клясычным паганствам. Дык у чым Канстантынопаль меў параўноўваць сябе, каб атрымаць незалежнасьць, або ўзьнясьці сябе вышэй Рыму? У ягонай усебаковай адсталасьці? У папскай маніі на кіраўніцтва сьветам? Тут паслухаем, што аб папах піша ангельскі гісторык Г. А. Фішэр: „Раньнія папы былі ў большасьці людзі цёмныя. Не былі філёзафамі й тэолягамі. Не далі яны ніякага ўкладу ў разьвіцьцё царкоўнай дактрыны. (...) Калі часам папа й паказаў сваю здольнасьць, то была яна ў сфэры адміністрацыйнай, а не рэлігійнай" („А Гісторы оф Юрэп" („Гісторыя Эўропы"), Лёндан 1969, стар. 171).

Старая веліч Рыму ўпала й зь ёю ўпалі палітычныя й рэлігійныя ўплывы. Сталіца Рымскай імпэрыі была перанесена з Рыму на Ўсход імпэратарам Дыяклетыянам (284-305) у Нікамэдыю. Калі ўладаром Візантыі стаў Канстанцін Вялікі, то ён з малога гарадка Візантыі над Босфарам разбудаваў вялікі й прыгожы горад, які назвалі ягоным імем — Канстантынопаль. Урачыстае адкрыцьцё новай сталіцы Рымскай імпэрыі адбылося ў красавіку 330 году. І не зашкодзіць спадару А. Сафу ведаць, што да другой паловы III стагодзьдзя грэцкая мова была мовай Рымскай царквы й часам грэкі былі папамі ў Рыме. Таксама аж да 741 году папскія выбары пацьвярджаліся Канстантынопалем, або імпэрыяльным экзархам у Равэне.

Аб вуніі 1596 году А. Сафу піша як аб даабраахвотным саюзе й тут-жа ставіць пытаньне: „Што дрэннага ў тым, што беларусы станавіліся каталікамі? На гэта ёсьць воля Хрыста. Ён хацеў бачыць Царкву адзінай, ставячы на чале яе Пятра".

На гэтыя выказваньні аўтара дам адказ ніжэй, а цяпер паясьню, што „здрадніцкае паўстаньне казакаў, як гэта піша Сафу, не было ніякім здрадніцкім. Казакі, якім памагалі й беларусы, не здрадзілі ні сваёй праваслаўнай веры, ні сваёй Бацькаўшчыне Ўкраіне й Беларусі, якіх прасьледавалі палякі са сваім каталіцызмам і вуніяй. А што часам туркі памагалі казакам, то яны памагалі й палякам супраць казакаў.

Піша Сафу, што вунія праіснавала да 1839 году, што царскі ўрад дзейнічаў пры дапамозе хлусьні й катаргі. А як дзейнічалі папы рымскія ў сваёй касьцельнай дзяржаве? Ці-ж не пры дапамозе свае Сьвяшчэннай інквізыцыі, кастроў, на якіх палілі жывых людзей, калі яны не хацелі пакланіцца папам рымскім. Ці-ж ня так было?

Таксама піша А. Сафу, што ў вунію ў 1596 годзе пайшлі ўсе праваслаўныя епіскапы, за выняткам Капысьценскага й Балабана. Як ахвотна пайшлі ў вунію праваслаўныя епіскапы ў 1596 годзе, так ахвотна вярнуліся назад у праваслаўе ў 1839 годзе вуніяцкія епіскапы й расказалі як іх рабілі ня толькі каталікамі, але й палякамі.

Яшчэ хоча сказаць А. Сафу, што Хрыстос паставіў на чале Царквы Пятра, які быццам стаўся епіскапам Рымскай царквы. Дзе гэта сказана? Ісус Хрыстос трактаваў сваіх вучняў аднолькава й нікому зь іх не надаў галоўнай ролі, як гэта ўнушае Рымская царква.

Таксама прысутнасьць апостала Пятра ў Рыме стаіць пад вялікім знакам запытаньня. Аб гэтым сьведчыць той факт, што калі апостал Павал прыехаў у Рым, яго многа хто з хрысьціян і нават прававерныя жыды спаткалі й вялі гутаркі, але нідзе не ўспамінаецца „епіскап Рымскай царквы Пётр". Значыць, яго ў Рыме не было (глядзі: „Дзеяньні Сьвятых Апосталаў", разьдзел 28).

На тэму Рымскай царквы й апостала Пятра так піша прасьвіцер Г. Ф. Касьцяльніцкі: „Рымская царква на працягу стагодзьдзяў пераняла псыхалёгію і традыцыі старажытнага паганскага Рыму. Рым лічым „орбіс тэррарум" (увесь сьвет) за сваё ўладаньне. Бяз гэтай славы й традыцыі старога дзяржаўнага Рыму папскі Рым і Рымска-Каталіцкая царква ніколі не маглі-б аб'яднацца. У сапраўднасьці не ў апостала Пятра, а ў паганскім Рыме трэба шукаць ас-

ноў для каталіцкіх догматаў, для Рымскай царквы і яе епіскапа" („Три статьи о папстве", Нью-Йорк 1968, стар. 13).

А што папы рымскія сталіся заступнікамі Пятра і што ім належыцца ня толькі Заходняя, але й Усходняя царква й зямля, то гэта мы ведаем з фальсыфікатаў папскай канцылярыі, якія былі раскрыты стагодзьдзі таму самымі католікамі.

Бяда ў тым, што Каталіцкая царква ня вучыць поўнай свае гісторыі. Яна баіцца, каб не выклікаць у чалавека цікавасьці да пазнаньня праўды й таму забараняе трымаць і карыстацца некаторымі кніжкамі як рэлігійнага, так і гістарычнага зьместу.

Цяпер вернемся да даволі важнага пытаньня, якое паставіў А. Сафу: „Што дрэннага ў тым, што беларусы станавіліся каталікамі?" У гэтым нічога дрэннага не было-б датуль, пакуль яны праз Каталіцкі касьцёл і вунію пачалі прымаць польскую культуру, пераходзіць у польскі лягер і з часам сталіся ярымі палякамі й ворагамі ўсяго беларускага. Вось дзе ляжыць корань зла нашай беларускай магнатэрыі, шляхты й цёмнага сялянства, якія са сваімі сьвятарамі пацягнуліся ў вунію. І пацягнуліся яны ў вунію й каталіцызм не са свае добрае волі, але пад прымусам і пагрозамі. Варта тут паважанаму А. Сафу запазнацца з гістарычным нарысам „Адкуль узяліся на Беларусі палякі?" Палякі на Беларусі ніколі не былі карэннымі жыхарамі. Паводле законаў нашай старадаўняй дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага — усім іншаземцам (у тым ліку й палякам) забаранялася займаць у нас дзяржаўныя й царкоўныя пасады, купляць зямлю. Таму ў старажытныя часы прыкметнай міграцыі палякаў на Беларусь не было.

У другой палове XVII стагодзьдзя ў выніку розных сацыяльна-палітычных прычынаў на Беларусі пакрысе пачаўся працэс палянізацыі (г.зн. апалячваньня) шляхты й найвышэйшых слаёў грамадзтва. Пазьней, у XIX стагодзьдзі, хваля палянізацыі часткова закранула й сялянства, пераважна праз Каталіцкі касьцёл. Ксяндзы, часта наўмысна атаясамліваючы нацыянальнасьць і веравызнаньне, прапаведавалі згаданую форму: хто трымаецца „польскай" (каталіцкай) веры — той паляк.

У выніку такіх працэсаў, паводле перапісу 1897 года, палякамі запісалася 12 працэнтаў насельніцтва Беларусі. Гэтаксама, згодна з данымі Кракаўскага статыстычнага камітэта, у 1912 годзе сярод жыхароў Гарадзенскай губэрні было 10,07 працэнта палякаў, а ў Віленскай яшчэ меней — 8,17 працэнта.

У Заходняй Беларусі ў часе яе знаходжаньня у складзе Польскай дзяржавы ў 1920-1930-х гадох праводзілася дзяржаўная палітыка апалячваньня, якая суправаджалася перасьледамі ўсяго беларускага. Польскія ўлады маніпулявалі статыстычнымі данымі, штучна завышалі лік польскага насельніцтва. Не абмяжоўваючыся гэтым, яны праводзілі палітыку прамой калянізацыі, перасяліўшы блізу 300 тысяч чалавек гэтак званых асаднікаў у Заходнюю Беларусь з этнічнай Польшчы.

На тэрыторыі Ўсходняй Беларусі (БССР) палякі складалі тады не больш за 3 працэнты насельніцтва, або 97,5 тысячы чалавек (даныя 1926 года).

Пасьля далучэньня Заходняй Беларусі, у 1940 годзе ў выніку сталінскіх рэпрэсіяў блізу 600 тысяч чалавек каталіцкіх веравызнаньняў (у іх ліку практычна ўсе асаднікі) былі вывезены ў Сібір.

Пасьля Другой Сусьветнай вайны, у 1940-1950 гадах лік польскага насельніцтва ў Беларусі яшчэ больш зьменшыўся. У выніку польска-савецкіх міждзяржаўных пагадненьняў каля 500 тысяч каталікоў (пераважна сялян, што ўцяклі ад калгасаў) выехала на сталае жыхарства ў Польскую Народную Рэспубліку.

Як не парадаксальна, але й пасьля гэтага ў БССР, паводле перапісу 1989 года, жыло 418 тысяч палякаў, зь якіх 13,3 працэнта лічылі роднай мовай польскую. Дык адкуль жа яны ўзяліся? Мы ж ведаем, што на працягу ўсёй нашай гісторыі значнага перасяленьня палякаў на нашыя землі не было (за вылучэньнем з'явы асадніцтва, якое, аднак, не пакінула па сабе этнадэмаграфічнага сьледу).

Значнць, яны „прадукуюцца" тут, на Беларусі. І „прадукуе" іх без сумненьня польскі Каталіцкі касьцёл. Менавіта ён сёньня, як дзьвесьце гадоў назад, робіць палякаў зь беларусаў-каталікоў, прышчэпліваючы ім польскую нацыянальную сьвядомасьць" („Звязда" № 103, 2 чэрвеня 1993 г., стар. 3).

Калі гэтага яшчэ мала слухачу каталіцкага коледжа сьв. Фамы Аквінскага ў Горадні спадару А. Сафу, то прывядзём яшчэ прыклад Ірыны Коваль: „Падчас нядаўняй пілігрымкі мне разам зь іншымі вернікамі давялося наведаць Будслаў з абразам Цудадзейнай Маці Божай Будслаўскай. Але сьвяточны настрой у нас быў сапсаваны, і вось чаму: сустрэў нас каля касьцёла ягоны пробашч, распавёў гісторыю мястэчка й касьцёла ды між іншым сьцьвердзіў, што ўсе, маўляў, тут палякі, а тэрыторыя гэта, на вялікі жаль, знаходзіцца пад Беларусьсю, акупаваная. Так вось, не больш і не менш, кажа пробашч, што ў будучым мяркуе зрабіць тут цэнтр каталіцызму. Будуць над касьцёлам польскі ды ватыканскі сьцягі лунаць, а недзе воддаль — беларускі, бо хочаш не хочаш, але мусім уладам (акупацыйным, зразумела) падпарадкавацца. (...) Колькі можна рваць на шматкі нашу радзіму? Як каталік — так і паляк, а як праваслаўны — дык ужо й рускі. Дзе яшчэ такое ўбачыш? Толькі ў нас на Беларусі, бо самі мы забыліся на сваю мову, выракліся сваіх каранёў. Вось намі й патураюць. Будзе ў Будславе цэнтр духоўнасьці, цэнтр культуры, ды толькі які? Сьпяваюць старэнькія бабулькі ў тамтэйшым касьцёле пад арган па-польску, а выйшаўшы з касьцёла, мовяць па-беларуску. І так ці не паўсюдна" („Літаратура і мастацтва" № 29, 17 ліпеня 1992 г.).

Як заканчваў я пісаць гэты адказ на артыкул сп. А. Сафу, атрымаў якраз ад сябры зь Беларусі адну старонку газэты „Свабода", у якой знайшоў цікавую заметку Андрэя Галіцкага. Ён згадвае пра польскую дабрачынную арганізацыю — Бяльска-Падляскі камітэт, які займаецца рознай дапамогай палякам, пражываючым за ўсходняй мяжой. Вось што ён піша: „Мэта (гэтай арганізацыі — Ю. В.), здаецца вельмі шляхетная, асабліва ў тым, што датычыць аднаўленьня занядбаных касьцёлаў, якія даўно патрабуюць дотыку ўмелых рук рэстаўратара. Але зьвярніце ўвагу, якімі матывамі кіруюцца арганізатары камітэту. Вось, напрыклад, што заявіў у інтэрв'ю „Тыгодніку" старшыня камітэту Томаш Кліменскі: „Мы ўсьведамляем, што адбудова касьцёла, апрача чыста рэлігійных мэтаў, стымулюе адраджэньне польскасьці на тых землях (на Беларусі — Ю. В.). Палітыка савецкіх уладаў прывя-

ла да таго, што маладое пакаленьне тамтэйшых палякаў слаба ведае або ўвогуле не карыстаецца польскай мовай. Вось касьцёл і станецца тым месцам, дзе нашы суродзічы могуць свабодна спатыкацца, узмацняць сувязі з Айчынай, удасканаляць веданьне мовы". Такім чынам, сама сабой напрашваецца выснова, што каталікам-беларусам у адбудаваных камітэтам касьцёлах рабіць няма чаго, бо гэтыя сьвятыні будуць, відаць, ператвораны дабрадзеямі з-за Буга ў асяродкі пальшчызны накшталт саўдэпаўскіх дамоў культуры. Тым большае зьдзіўленьне выклікае пазыцыя беларускіх уладаў. У тым-жа інтэрв'ю пан Кліменскі з задаваленьнем зазначае, што „дзейнасьць камітэту сутыкаецца з адабрэньнем беларускіх уладаў". Вядома, адбудова касьцёлаў — рэч выдатная. Але, мабыць, досыць нам рахмана пазіраць на тое, як чыста рэлігійныя пытаньні выкарыстоўваюцца пэўнымі коламі для парушэньня этнічнага балансу на землях Заходняй Беларусі" („Свабода" № 7, 1-15 ліпеня 1993 г., стар. 4).

Не спадзяюся, каб зразумеў слухач каталіцкага коледжа сп. А. Сафу заданьні Каталіцкага касьцёла зь ягонымі ксяндзамі на Беларусі. Каталіцкі касьцёл на Беларусі гэта ня ёсьць сапраўдная сьвятыня, гэта ня ёсьць дом малітвы — гэта была й ёсьць польская агентура, польская палітыка экспансіі на Ўсход. І такія рэчы не павінны быць талераваны ў сапраўднай незалежнай дзяржаве Беларусі.

Спадар А. Сафу, як відаць, жыхар Гарадзеншчыны. Ці можа ён падаць прыблізную колькасьць беларусаў-каталікоў у параўнаньні да палякаў-каталікоў на Гродзеншчыне? І ці ён пагаджаецца з тым, што палякаў на Беларусі „прадукуе" Каталіцкі касьцёл? У гэтым я сумняваюся, бо прачытаўшы яго артыкул у газэце „Пагоня", відаць куды ён гне.

У заканчэньні свайго артыкула А. Сафу піша: „Усяленскасьць грэка-каталіцызму можа адыграць рашаючую ролю ў аб'яднаньні дзвюх сястрынскіх канфэсіяў". На гэта я хацеў бы параіць паважанаму А. Сафу, каб грэка-каталіцкая грамада, якая хоча адыграць рашаючую ролю ў аб'яднаньні дзвюх сястрынскіх канфэсій, аб'яднала сьпярша тых беларусаў-католікаў, якія апынуліся ў паляках і вярнула іх назад да сваіх беларускіх каранёў, а тады хай зьвяртаецца да праваслаўных беларусаў.

Аднак я ня думаю, каб сёньня шчырыя праваслаўныя беларусы хацелі-б нешта мець супольнае зь людзьмі, якія здрадзілі сваю веру й нацыянальнасьць, ды пайшлі на службу польска-ватыканскай агентуры, а другія зь іх заігрываюць на нацыянальных пачуцьцях. Так, як і раней было, наступ каталіцызму на Ўсход працягваецца ўсімі магчымымі спосабамі.

Сп. А. Сафу ў сваім артыкуле „Трэці лішні, або ці можа вунія стварыць рэлігійную канфрантацыю" імкнецца да аб'яднаньня Цэркваў у імя Хрыста. Але гэтае аб'яднаньне ня ёсьць у імя Хрыста, а ў імя папы й яго Рымскай царквы. У каталікоў папа стаіць вышэй Царквы й яму ўсё духавества прысягае сваю вернасьць і тут канфрантацыя. Так, што такое аб'яднаньне зьяўляецца сьляпым падпарадкаваньнем папу рымскаму, якому ніхто ня даў на гэта права.

(„Голас Часу", №№ 10-14, 18, 23 і 26, Лёндан, студзень-люты 1991 — верасень-кастрычнік 1993 гг.)

„Беларуская крыніца" й сьвяты Фэліцыян

Сьпярша трэба прывітаць, хоць з засьцярогай, яшчэ адно беларускае друкаванае слова — „Беларускую крыніцу", якая пачала выходзіць у Менску. Газэта бярэ свой пачатак з кастрычніка 1917 году, а ў міжваенны час выдавалася ў Вільні. Гэта ёсьць газэта беларусаў-каталікоў і таму жадаю выдаўцам посьпехаў у аб'яднаньні ўсіх беларусаў каталіцкай веры ў краі й на эміграцыі, каб яны стварылі сваю сапраўдную Беларускую Каталіцкую царкву ды перасталі быць ворагамі Праваслаўнай царквы й прыяцелямі „польскай рацыі стану" на беларускай зямлі.

Рэдакцыя „Беларускай крыніцы" нічога ня кажа, што гэта была й ёсьць газэта беларусаў-каталікоў, а рэклямуе сваю газэту як палітычную, грамадзкую і літаратурную.

На жаль, у першым нумары газэты, за люты 1991 год, на 2-й старонцы зьявіўся невялікі інфармацыйны артыкул „Сьвяты Фэліцыян — апякун Менска". Артыкул ня мае подпісу аўтара, значыць, ён рэдакцыйны й пачынаецца так: „Відаць

ня ўсім вядома, што апекуном Менска зьяўляецца сьвяты Фэліцыян-пакутнік. Ён быў закатаваны за сьвятую веру, калі рымскі імпэратар Дыяклетыян зьдзекаваўся з хрысьціянаў. Ягоныя мошчы былі перададзены Апостальскай Сталіцаю роду Завішаў у Беларусі. Маршалак Вялікага Княства Літоўскага затым ахвяраваў іх айцам Ордэну езуітаў у Менску, якім належаў тады катэдральны касьцёл на Высокім Месьце. У 1713 годзе віленскі біскуп урачыста зьмясьціў сьвятую рэліквію на вечныя часы ў адной з капліцаў катэдры".

Гартаючы старонкі некаторых жыцьцяпісаў сьвятых і нават каталіцкай энцыкляпэдыі, я ніяк ня мог знайсьці пакутніка Фэліцыяна ў часе прасьледу Дыяклетыяна. Хоць у Рымскай імпэрыі Фэліцыянаў было столькі, колькі на Беларусі Іванаў, на жаль, адзін зь іх згадваецца як легенда, а другі загінуў у Рыме ў 251 годзе, яшчэ да Дыяклетыяна. Згадваецца мучанік Фэліцыян і брат яго Прымус, якія загінулі ў 297 годзе пры Дыяклетыяне, але іхняя сьмерць, як падае „Бук оф свііс" (Кніжка сьвятых) ня ёсьць верагоднай, ды ў той час не было прасьледу хрысьціян. Нават „Католік энцыклёпэдыя" нічога не гаворыць аб ніводным мучаніку Фэліцыяне. То што тады можа сказаць „Беларуская крыніца?" Калі яна мае канкрэтныя факты аб згаданым сьвятым Фэліцыяне, якога зрабіла апекуном Менска, дык хай скажа аб ім больш.

Усё майстэрства каталікоў заключаецца ў тым, каб зьвязаць беларусаў з Рымам, як вялікім дабрадзеем. Выдаўцам „Беларускай крыніцы" зусім дастаткова, што папа перадаў мошчы малавядомага, або зусім невядомага Фэліцыяна, а можа каго іншага Завішам, а яны езуітам у Менску. Гэтага ўжо каталікам хапіла, каб зрабіць нейкага рымляніна апекуном Менска.

Прасьлед хрысьціянаў быў запачаткаваны Дыяклетыянам. Але выдадзены ім эдыкт супраць хрысьціян ад 303 году не ўспамінае кары сьмерці, а толькі ліквідацыю царквы, зьнішчэньне хрысьціянскіх кніг і пазбаўленьне хрысьціян маёмасьці й пасад. Неўзабаве Дыяклетыян захварэў, і калі крыху паправіўся, то ў 305 годзе перадаў уладу свайму зяцю Галерыю й гэта ён выдаваў сьмяротныя эдыкты на хрысьціян, але не трывала гэта доўга.

Трэба памятаць, што на захадзе Рымскай імпэрыі, у юрысдыкцыі рымскага епіскапа, за выняткам Рыму й некато-

рых гарадоў Італіі, не было прасьледу хрысьціян. Тагачасны адміністратар заходніх правінцыяў імпэрыі, цэзар Хлорус, які быў бацькам Канстанціна Вялікага, не прасьледаваў хрысьціян. Хрысьціянская кроў лілася ва ўсходняй частцы імпэрыі з волі згаданага імпэратара Галерыя й ягонага памочніка цэзара Максіміяна Дая.

Неўзабаве пасьля выданьня Дыяклетыянам у 303 годзе эдыкту супраць хрысьціянаў, рымскі епіскап (папа) Марцэлін, зь некалькімі сваімі сьвятарамі, зганьбіў сябе й сваю Царкву. Ён выдаў сьвяшчэнныя кнігі й прынёс ахвяру паганскім багам. Праз некаторы час Рым ня меў епіскапа.

Сёньня-ж нам, праваслаўным беларусам, рэдакцыя „Беларускай крыніцы" хоча прадставіць Апостальскую Сталіцу, яе папаў і езуітаў як дабрадзеяў беларусаў і невядомага нікому Фэліцыяна за апекуна Менска. Трэба спадзявацца, што неўзабаве „Беларуская крыніца" пачне ўмаўляць беларусам Язафата Кунцэвіча, Андрэя Баболю і другіх насланых езуітамі агентаў на Беларусь як апекуноў ня толькі Менска, але й усяе Беларусі. Такая гэта ёсьць палітыка так званай „праўдзівай веры", якая ня так даўно абражала другія канфэсіі, называючы іх „схізматыкамі". Такой падступнаю дарогай Ватыкан шукае „царкоўнага адзінства" пад патранатам рымскага папы.

Царкоўнае адзінства, або зьліцьцё рэлігіяў пад кіраўніцтвам Рыму тое самае, што й нядаўняе камуністычнае „зьліцьцё нацыяў" пад кіраўніцтвам Масквы. Апошнім часам „непамыльная" Камуністычная партыя Савецкага Саюзу прызнала свае памылкі, але „непамыльныя" рымскія папы не прызнаюць сваіх памылак, а толькі далей праводзяць сваю экспансію. На ўсё прыходзіць свой час і канец.

(„Голас Часу" № 13 (4), Лёндан, 1991 г.)

З улікам, ці з разьлікам?

У № 6 штотыднёвіка „Літаратура і мастацтва" ад 9 лютага 1990 году зьявіўся цікавы ліст пад загалоўкам „З улікам традыцыі" інжынера-канструктара А. Капуцкага, у якім ён піша:

„Нарэшце дачакаліся мы, беларусы, закону, які паставіў нашу мову на належнае ёй месца — абвясьціўшы дзяржаў-

най на тэрыторыі Беларусі. Добры закон прынялі ці дрэнны пакажа час.

Сёньня, здаецца, ужо для ўсіх відавочна неабходнасьць перагляду існуючага правапісу й граматыкі беларускай мовы. Пытаньне гэтае ўжо ўздымалася на старонках рэспубліканскага друку, і цяпер, пасьля прыняцьця закону, яго трэба неадкладна вырашыць, пакуль яшчэ не пачалося масавае вывучэньне мовы насельніцтва рэспублікі. Але застаецца адкрытым пытаньне выбару найбольш рацыянальнага для беларускай мовы алфавіта. І тут мне прадбачваецца сапраўдная бура спрэчак. Таму я хачу падзяліцца сваімі думкамі.

Як вядома, беларуская мова мае вялікія традыцыі выкарыстаньня як кірылічнага, так і лацінскага алфавіту, і я, лічу, было-б немалой стратай для нацыянальнай культуры зьнікненьне аднаго зь іх. Каб гэтага не здарылася, я прапаную паралельнае ўжываньне абодвух алфавітаў. Так, напрыклад, лацінку можна выкарыстоўваць у справаводстве, у навукова-тэхнічнай літаратуры, пры вывучэньні негуманітарных дысцыплін, друкаваньні рэлігійнай літаратуры для беларусаў каталіцкага й вуніяцкага веравызнаньняў, як гэта, прынамсі, было раней. Кірыліцу-ж выкарыстоўваць у культурным жыцьці, мастацкай літаратуры, гуманітарных навуках, праваслаўі й г.д. Тут, вядома, могуць быць розныя варыянты, тым больш, што пэўны вопыт у нас ёсьць. І самае галоўнае, гэта адпавяда-б гістарычнай ролі Беларусі, як краіны — памежжа між Захадам і Ўсходам, між заходняй і ўсходняй культурамі.

Я разумею, што ідэя мая шмат каму здасца фантастычнай, а магчыма абсурднай. Толькі не хацелася-б, каб яе адразу адкінулі, не ўзважыўшы ўсё „за" й „супраць".

А. Капуцкі, інжынер-канструктар, г. Маладзечна".

Прачытаўшы такі ліст-прапанову, варта над ім задумацца. А „ўзважыўшы ўсе „за" й „супраць", мімаволі паўстае ў чалавека пытаньне: дзеля якой мэты ён гэта піша? Сам ліст носіць, быццам, аб'ектыўны зьмест, але ў ім, ці часам ня крыецца чужая й варожая задума. Аўтар артыкула, як бачым, паклапаціўся дарадзіць каталікам і вуніятам лацінку, а праваслаўным беларусам — кірыліцу. Толькі, чамусьці, пакінуў ён з боку бязбожнікаў і другіх сэктантаў, якіх

на Беларусі нямала. Яны-ж таксама людзі — беларусы й для іх трэба нейкае пісьмо — алфавіт.

Што праўда, сьпярша „Наша доля", а пасьля й „Наша ніва" выдаваліся лацінкай і кірыліцай, але гэта зь неабходнай прычыны. У той час на Беларусі амаль 70% насельніцтва было непісьменнымі й таму для беларусаў-каталікоў, якія ня зналі кірыліцы, а чыталі свае кантычкі на польскай мове, пісалася лацінкай. Сёньня гэтай патрэбы на Беларусі няма й няма чаго вяртацца ў старую адсталую эпоху. Лацінка ніколі не была беларускім народным алфавітам. Была яна алфавітам акаталічаньня й апалячаньня беларусаў.

У 1909 годзе, калі выходзіла „Наша ніва", Віленская Каталіцкая курыя, каб запабегчы праніканьню на вёску варожых ёй беларускіх уплываў, пачала выдаваць часопіс „Беларусь" лацінскімі літарамі з польскімі знакамі.

Прапанову, якую падсоўвае нам сёньня інжынер А. Капуцкі, афармілі ў Лёндане палякі са сваёю старою ідэалёгіяй Польшчы „од можа до можа". Адзін з гэтых ідэолягаў — Енджэй Гертых у сваёй брашуры „О пшышлосьці Зем Всходніх Жэчыпосполітэй" (Лёндан 1946), на стар. 18 падае свае прапановы адносна Заходняй Беларусі, а адна з гэтых прапаноў супадае з прапановай інжынера А. Капуцкага. Енджэй Гертых уяўляе будучыню Беларусі так:

„Лічым беларусаў і палешукоў у граніцах Рыжскага трактату — за членаў народу польскага. Шануем адасобленасьць рэгіянальную абаіх плямёнаў („шчэпув"), а таксама царкоўную й моўную. Лічым за рэч зусім натуральную, што існуе пэўны беларускі рэгіяналізм, які выяўляецца м.ін. у існаваньні літаратурнага й выдавецкага руху на беларускай мове; за рэч натуральную лічым таксама існаваньне аналягічнага літаратурнага руху на Кашубах і на Падгальлі. Дамагаемся толькі, каб рух гэты, на Беларусі, палажыў канец свайму раздваеньню ў выглядзе алфавіту, як гэта дзеялася да гэтага часу й перайшоў на адзін — алфавіт лацінскі" (падкрэсьлена мною — Ю. В.).

Зь якой мэтай Енджй Гертых хоча ўвесьці лацінскі алфавіт у беларускае пісьмо ня цяжка здагадацца. Гэта больш ясна для тых беларусаў, якія жылі пад Польшчай у 1920-1939 гадох і бачылі ўсе тыя хітрыкі, якія палякі прымалі,

каб толькі акаталічыць і апалячыць беларусаў. Ды й тут, у сваёй прапанове, аўтар ня лічыць беларусаў і палешукоў за адзін асобны беларускі народ, за нацыю, а прадстаўляе іх як асобныя плямёны — „шчэпы".

Разглядаючы коратка гісторыю Польшчы ад 1340 году, калі яна скіравала сваю палітыку на Ўсход, у Енджэя Гертыха адчуваецца боль ня толькі па страце старой Рэчы Паспалітай. Але як ён піша, „нашыя Ўсходнія Землі ад Дзьвіны да Прута зьяўляюцца сёньня краем ачышчаным з каталіцызму". Аднак аўтар ня траціць надзеі на будучыню. Калі-б зь якіх прычын наступіў расклад Расеі й пытаньне Беларусі знайшлося-б на павестцы дня, — піша ён, — то Польшча павінна атрымаць міжнародны мандат на адміністрацыю ўсёй усходняй Беларусі й усходняга Палесься.

Тлумачыць ён гэта так: „Абшары гэтыя ня маюць яснага нацыянальнага твару і самі ня могуць кіравацца; адно ёсьць толькі пэўнае, што ня ёсьць яны расейскія. Могуць узьнікнуць у даным выпадку, аб якім гаворым, тэндэнцыі да сарганізаваньня беларускай дзяржавы, намінальна незалежнай, але ў сапраўднасьці кіраванай чужымі. (...) Была-б гэта канцэпцыя ў вялікай меры штучная й неадпавядаючая вымогам жыцьця, не гаворачы ўжо аб тым, што была-б для нас небясьпечнай. Адзінай дзяржавай, здольнай да выкананьня мандату над Беларусьсю, якая мае ў гэтым напрамку адпаведнае дасьведчаньне й веду псыхалёгіі, пачуцьця, імкненьняў і традыцыі насельніцтва, а таксама маючы сярод яе ўсталеныя адносіны й уплывы, ёсьць Польшча. Толькі прышласьць можа паказаць, ці пад польскім мандатам усходняя Беларусь разьвівалася-б у новы, здольны да самастойнага жыцьця народ, палітычна запрыязьнены з Польшчай і зьвязаны цывілізацыйна й духова з захадам, ці таксама за прыкладам заходняй Беларусі зьлілася-б таксама палітычна, як і нацыянальна, аж па верхні Днепр".

Усё напісана ясна й зразумела, так што дадатковых камэнтараў непатрэбна. Адно можна сказаць, што на працягу шматвяковай гісторыі сумеснага жыцьця польскага і беларускага народаў, Беларусь зазнала нямала крыўды з боку палякаў. Нават некаторыя польскія палітыкі й гісторыкі прызнаюць сваю віну. Толькі такія людзі як Енджэй Гет-

рых не ідуць з часам наперад, а думаюць старымі катэгорыямі ягелёнскай эпохі, якая аджыла беспаваротна. Усё-ж гэта ёсьць характэрны прыклад таму як думаюць і што рыхтуюць для Беларусі польскія нацыяналісты-імпэрыялісты.

У часе апошняй вайны, дзеля замацаваньня польскіх уплываў на Беларусі, некаторыя аддзелы польскай Арміі Краёвай, якая падпарадкоўвалася польскаму эміграцыйнаму ўраду ў Лёндане, пайшлі на супрацоўніцтва зь немцамі. А вось што падае Іван Касяк:

„Пратакол № 5 з 3 траўня 1943 г. з нарады прадстаўнікоў польскай арганізацыі, шыфруючыся пад назовам партыі грэнадзёраў, гавора наступнае: 1) Усе нямецкія ўстановы ў адпаведных паветах павінны быць перапоўнены толькі нашымі людзьмі, каб уся практычная ўлада была ў нашых руках. Такім чынам усе паліцэйскія й каманданты змогуць зрабіць дапамогу зброяй ды амуніцыяй нашым узброеным легіёнам праводзіць разьведку й рабіць адпаведны ўплыў на немцаў і на ўсё акружэньне. 2) Кожны паляк павінен памятаць, што ніколі й ні за што беларус не захоча даць дапамогі, таму мы павінны імкнуцца выжыць беларусаў з усіх устаноў (...) імкнуцца вышукваць усякія матэрыялы абвінавачваючыя беларусаў за сувязь з партызанамі для таго, каб іх расстрэльвалі. Такім чынам мы зможам ня толькі выжыць беларусаў, але й супрацьставіць немцам беларускае насельніцтва. Наступна, пры дапамозе ўмелай прапаганды, мы перацягнем беларусаў на свой бок і асягнем, як мінімум, іх нейтральнасьць. (...) 3) Праз сваіх людзей прасіць паліцыю й немцаў паліць беларускія вёскі пад прэтэкстам, што яны памагаюць партызанам.

У пратаколе № 7 з дня 12 траўня 1943 г. удзельнікі польскага падпольля на Беларусі забавязаліся стасаваць тэрор супраць беларускіх дзеячоў. У дырэктыве з дня 14 траўня 1943 г., перахопленай савецкімі партызанамі на Берасьцейшчыне, кіруючы цэнтр „грэнадзёраў" устанаўляе, што мэта польскіх легіёнаў — вызваленьне Заходняй Беларусі ад бальшавізму, але кожны паляк павінен памятаць, што беларусы — гэта ворагі польскага народу (...) палякі павінны ўсякімі спосабамі кампраметаваць беларусаў з тым, каб страты ў беларусаў былі як найбольшымі" („З гісторыі Праваслаўнай царквы беларускага

народу", Нью Ёрк 1956, стар. 119). (Узята з кніжкі Л. Цанавы „Всенародная партызанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков", часть II, стар. 884-885).

Людзкія страты беларусаў у апошняй вайне былі калясальныя, загінуў кожны чацьвёрты жыхар. І да гэтых стратаў прылажылі сваю руку палякі. Аб гэтым піша польскі лібэральны пісьменьнік зь Віленшчыны Юзаф Мацкевіч. У ягонай кніжцы на польскай мове „Ня трэба гаварыць голасна" (Лёндан 1985), знаходзім такое апісаньне:

„Духоўны Канстанцін Маеўскі, сябра БНС (...) у Троках Ашмянскага павету, праваслаўны духоўны Анатоль Кірык (...) Пратаярэй Міхаіл Леўчын у Крэве (...) Дачка яго, Ларыса, настаўніца беларускай пачатковай школы ў Крэве замардаваны, замардаваны, замардаваны (...) Ераманах Лукаш з Жыровіцкага манастыра, які ў 1941 годзе вярнуў царкву забраную на каталіцкі касьцёл у 1920 г., быў нападзены польскай партызанкай і закапаны жывым у зямлю аж да галавы; вакол выстаючай з зямлі галавы Лукаша, палякі разлажылі агонь і палілі яе на вольным агні".

Пасьля закнчэньня вайны гэтыя банды АК перайшлі зь Беларусі на беларускую Беласточчыну пад Польшчай і там працягвалі мардаваць беларускую інтэлігенцыю і актыўных сялян. Вось што падае „Навуковы зборнік" (Беласток 1974, стар. 128): „За восем першых гадоў народнай улады на Беласточчыне загінула (не ўлічваючы войска) 2 782 асобы, у тым ліку 1 365 аддало жыцьцё ў барацьбе за ўмацаваньне народнай улады. Рэшта — гэта ахвяры тэрору".

Далей аўтар піша па-польску: Беластоцкі, Бельскі, Сямятыцкі й Сакольскі паветы ў значнай меры засялялі беларусы, для якіх праграма лёнданскага ўраду не была да прыняцьця, бо яны ў сваёй большасьці рашуча падтрымоўвалі народную ўладу. Рэакцыйныя банды падпольля атакавалі гэтых людзей ня толькі з нацыянальнай нянавісьці, але й таму, што былі ў той час, побач рабочага клясу, апорай улады на Беласточчыне".

18 студзеня г.г. у залі пры Беларускай бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Лёндане д-р Сямяшка прачытаў лекцыю „Адносіны Юзафа Мацкевіча да Беларусі". На жаль, такія прыкрыя рэчы, якія згадваў у сваіх публікацыях Ю. Мацкевіч,

д-р Сямашка памінуў. Рэч зразумелая, што для яго, як паляка, ня быў гонар паўтараць крымінальныя паводзіны сваіх суродзічаў на Беларусі й такім парадкам зло прамоўчвалася з пэўным разьлікам.

Калі ў Польшчы да ўлады прыйшла апошнім часам „Салідарнасьць", пачаўся новы наступ на беларускую інтэлігенцыю й яе дзейнасьць на Беласточчыне. За прыклад можа паслужыць справа беларуса, дырэктара Гайнаўскага дому культуры Мікалая Бушкі. „Салідарнасьць", якой маральнай апорай зьяўляецца каталіцкае духавенства, напамінае сабою даваенную санацыйную Польшчу, якая дыхала нянавісьцю да іншых нацыянальнасьцяў і рэлігіяў за выняткам сваёй польскай і каталіцкай.

Польскі тэрор і прасьлед не паставілі на калені беларусаў. Але на такія паводзіны палякаў, беларусы, дзе-б яны не былі, павінны рэагаваць і ісьці з дапамогай сваім братам на Беласточчыне.

Людзкая думка, трыманая даўжэйшы час у аковах дыктатуры, з часам яе вызваленьня не заўсёды знаходзіць правільную дарогу, па якой мае ісьці. Таму нічога дзіўнага, што пад узьдзеяньнем галоснасьці й перабудовы на Беларусі патварыліся розныя групоўкі, якія ў новых варунках, шукаючы праўды, падлягаюць пад чужыя ўплывы. І ў гэтых новых варунках на Беларусі хочуць праявіць свае ўплывы палякі праз свой Каталіцкі касьцёл, які, як і Вуніяцкая царква, падпарадкоўваюцца аднаму й таму-ж Ватыкану. Ватыкан ніколі не спыніў сваёй дзейнасьці, каб пакарыць Беларусь сваёй уладзе. Работа гэта вялася й вядзецца на польска-каталіцкім і вуніяцка-беларускім франтох і ўзбуджае ў неабазнаных з рэчаіснасьцю розумах шкодныя беларускай справе сымпатыі. Прапагандысты ўзьдзейнічаюць асабліва на нацыянальныя пачуцьці, падсоўваючы скажоны й нерэчаісны вобраз нашай гісторыі. Каталіцкім агентам Ватыкан не шкадуе грошай, нават таму, у каго няма сваіх вернікаў.

Ватыкан зьяўляецца буйным багачом-капіталістам, хоць у Сьвятым Пісьме сказана, што вярблюду лягчэй пралезьці праз вушка іголкі, як багатаму папасьці ў Царства Нябеснае. Ватыкан мае ўклады ў банках і замежнай індустрыі, якія лічацца не мільёнамі, а мільярдамі. Таму Ваты-

кан можа весьці сваю рэлігійную прапаганду па радыё, тэлевізіі, прэсе й праз сваіх платных работнікаў, каб заманіць лёгкаверных.

Для прыкладу прывядзём наступны факт. Як падае газэта „Індэпэндэнт Сандэй" (ад 15 красавіка г.г.), прапаганда Ватыкану па радыё й тэлевізіі каштавала ў мінулым бюджэтным 1989 годзе 22 мільёны даляраў. У гэтай рабоце прымала ўдзел 400 працаўнікоў, якія пад кіраўніцтвам 30-ці езуітаў надаюць праграму на 36 мовах, у тым ліку й на беларускай. Але, як зазначае газэта, у гэтай рабоце Ватыкан паносіць вялікія кошты, а ў яго бюджэце апошнімі гадамі наглядаецца дэфіцыт. Аднак, як бачым, работа прадаўжаецца з разьлікам...

Шаноўны прафэсар Леанід Лыч піша: „Цяжка сказаць, якая Царква прычыніла больш шкоды нацыянальнай самасьвядомасьці беларусаў, але на рубяжы XIX-XX стагодзьдзяў тут шырэйшы размах для асымілятарскай дзейнасьці быў у праваслаўя, бо да яго ў нашым краі залічалі 5 мільёнаў чалавек (да каталіцкай веры — каля 2 мільёнаў" („Літаратура і мастацтва", 13 красавіка 1990 г., стар. 5). Аднак факты паказваюць адваротнае зьявішча, што асымілятарская дзейнасьць праваслаўя на Беларусі не была такая страшная як каталіцкая. За часоў камуністычнай улады Праваслаўная царква ня мела шырокіх кантактаў зь вернікамі, а іх русыфікавалі іншыя дзейнікі. Зрусыфікаваны праваслаўны беларус хутчэй вяртаўся да свае беларускасьці як апалячаны каталік-беларус, які быў ужо ворагам беларускасьці й лічыў ужо сябе пялякам, а Беларусь — польскім краем.

Мне прыходзілася часта спатыкаць беларускія сем'і, якія ў 1940 годзе былі вывезены ў Сібір, а ў часе вайны ўдалося ім разам з палякамі выехаць з савецкага раю. Жылі яны ў Афрыцы ў польскіх лягерох. Бацькі гутарылі па-беларуску, а іхнія дзеці засвоілі польскую мову ў школах і сьпяршэ па-беларуску не размаўлялі. Але прыходзілі ў царкву, навучыліся гаварыць па-беларуску й нават чытаць і сьпяваць беларускія песьні. Але нечага падобнага я не спаткаў сярод беларусаў-каталікоў, якія прайшлі вайну разам з палякамі, каб яны захавалі беларускасьць. Знаю толькі двух людзей, якія былі старэйшага веку.

Таму беларусы, прыняўшы каталіцкую веру ці вунію, раней ці пазьней, калі ня самі, то іх дзеці, стануцца ахвярай палянізацыі. Прапагандова ўспамінаюцца беларускія ксяндзы-патрыёты. Так, яны былі беларускія патрыёты, але дзе іхнія прыхаджане беларусы-каталікі — патрыёты? Сярод іх засталіся лічаныя людзі, а рэшта — гэта рэнэгаты.

Сёньня на Беларусі ня так многа знойдзецца сьвядомых беларусаў-каталікоў, амаль усе яны палякі. А ў свой час іхнія продкі: магнаты, князі, шляхта, былі праваслаўнымі й з гонарам абаранялі інтарэсы свае дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага, пакуль не прынялі каталіцкай веры ці вуніі.

Хоць няма сёньня беларускіх князёў, магнатаў, шляхты, але ёсьць беларуская інтэлігенцыя, якая нясьведама паддаецца ўплывам каталіцкай прапаганды. Замест заняцца разбудовай і беларусізацыяй свае Праваслаўнае царквы, або напомніць каталікам на Беларусі іхняе беларускае паходжаньне, каб закладалі свае беларускія прыходы, а ня польскія, яны лезуць у вунію, у гэты чужы й варожы Беларусі твор. Пускаецца прапаганда аб былым масавым вуніяцтве й яго беларускім характары, якое сілай было навернута ў праваслаўе. Але яны не гавораць і не напішуць хто закладаў вунію, якімі спосабамі яе закладалі й дзеля якой мэты яе зноў хочуць аднавіць.

Той, хто думае сёньня, што быццам вунія ўратуе Беларусь ад Масквы й Варшавы й гэтым прынясе ёй незалежнасьць, той моцна памыляецца. Вуніі ад 1385 і 1596 гадоў зьяўляюцца польскай работай на Беларусі з падтрымкай Ватыкану й такой яна засталася сёньня.

„Дзеньнік польскі" ад 10 мая 1990 г. падае, што 18 лютага г.г. заснавана ў Менску Згуртаваньне палякаў „Полёнія". Мэтай арганізацыі зьяўляецца разьвіцьцё польскай культуры сярод грамадзян БССР польскай нацыянальнасьці й другіх нацыянальнасьцяў, жадаючых удзельнічаць у працах згуртаваньня, якія некалі належалі да Рэчы Паспалітай.

У адным зь менскіх дамоў польскай культуры, у якім паўстала арганізацыя, галоўная заля была ўпрыгожана лёзунгамі: „Паляк — брат беларусу", „Польшча — наша маці, Беларусь — айчына", а на сцэне, на белым палатне, былі намаляваны колерам крыж і арол у кароне, а з боку — надпісы:

Толькі пад гэтым крыжам,
Толькі пад гэтым знакам,
Польшча ёсьць Польшчай,
А паляк палякам.

На „крэсы" афіцыяльна едуць польскія каталіцкія ксяндзы ў выніку паразуменьня прымаса Польшчы кардынала Ю. Глемпа з савецкімі ўладамі. Яны маюць узяць пад сваю апеку ўсіх католікаў бяз розьніцы на нацыянальнасьць. І тут-жа аўтар артыкула ў „Дзёньніку польскім" ад 12 мая г.г. зазначае, што гэта будзе слушна ня толькі з рэлігійнага пункту гледжаньня. Дзякуючы гэтаму шырокія кругі насельніцтва, ня толькі польскага, запазнаюцца з польскай культурай і заходнімі ўплывамі. І далей згадвае, што магчыма ўжо выслана на „крэсы" 50 тысяч экзэмпляраў катэхізму на польскай мове.

Суродзіч з Гродзеншчыны піша нам: „Так, на сёньняшні дзень сытуацыя на Беларусі неадназначная, а на Гродзеншчыне й тым больш. Да русыфікацыі дапаўняецца яшчэ адзін спрадвечны беларускі вораг — гэта палянізацыя. Безумоўна, што ўсё гэта ідзе ад Каталіцкай царквы, якая ў большасьці сваёй настроена варожа да ўсіх праяваў беларускага руху. (...) Праўда, зараз адбываецца даволі моцны нацыянальны ўплыў сярод моладзі й што будзе далей пакажа час".

Складаць віну на Рускую Праваслаўную царкву за ўсе беларускія няшчасьці няма ніякага сэнсу. Як прыклад, на працягу камуністычнай улады ў СССР Руская Праваслаўная царква пацярпела найбольшыя страты й прасьлед. Яна была ў сапраўднасьці адзінай хрысьціянскай Царквой, якая падняла адкрытую барацьбу з камунізмам. Яна выступала ня толькі як „ахвяра прасьледу", але як адкрыты вораг. 19 студзеня 1918 году патрыярх Ціхан кінуў анатэму на бальшавікоў. На гэта бальшавікі адказалі ўзмоцненым тэрорам. Духавенства вынішчалася фізычна, цэрквы замыкаліся, рэлігійнае жыцьцё ліквідавалася. Так што тут Руская Праваслаўная царква ня мела ніякага ўплыву на русыфікацыю беларусаў.

Нечага падобнага мы не знаходзім у другіх заходніх краінах, калі яны былі захоплены камуністамі ў 1945 годзе. Хоць былі выказаны некаторыя незадаваленьні да існуюча-

га парадку, але Каталіцкая царква захавала поўную лаяльнасьць да новай камуністычнай улады.

Калі сёньня на Бацькаўшчыне беларусы маглі дабіцца права на сваю родную мову, на беларусізацыю школьніцтва й адміністрацыі, то могуць дабіцца й беларусізацыі свае Праваслаўнае царквы, замест шукаць шчасьця у каталіцкай сэкце — вуніі, бо нехта загаварыў у ёй па-беларуску. Ужо ў Духоўнай сэмінарыі ў Жыровічах гавораць па-беларуску, хоць ня ўсе, але яе вывучаюць, а ў некаторых цэрквах чытаюць Евангельле й Апостала па-беларуску. Застаецца толькі прылажыць больш стараньняў і Праваслаўная царква на Беларусі можа загаварыць па-беларуску раней за дзяржаўныя ўстановы.

Сёньня Праваслаўная царква на Беларусі, хоць павольна, але паварочваецца тварам да свайго народу, да свае культуры. Яна пачынае новую старонку свае гісторыі. Адчыняюцца цэрквы, закладаюцца новыя прыходы, епархіі, высьвячаюцца й назначаюцца новыя епіскапы на беларускія кафедры, перакладаецца на беларускую мову Біблія. Горш стаіць справа зь беларускай літургіяй і мовай у царкве, але й на гэта прыйдзе свой час.

Праваслаўная царква на Беларусі атрымала свой экзархат і найбольшы час, каб яна пачала выдаваць свой рэлігійны часопіс на беларускай мове й на яго старонках сказала пра сваю праваслаўную веру й паказала векавыя імкненьні Ватыкану, які жадаў яе зьнішчэньня. Гэта павінна быць зроблена.

Няведама па якіх прычынах Беларускі народны фронт стаўся гарачым прапагандыстам вуніцтва на Беларусі. Як усім вядома, гэтая царкоўная сэкта на Беларусі амаль не існуе, але яе хочуць зрабіць дзяржаўнай рэлігіяй. Адным з гэтых лідэраў, які стаіць за аднаўленьне на Беларусі вуніі, зьяўляецца прафэсар Юры Хадыка. Калі яму было пастаўлена пытаньне: „А Вы — веруючы чалавек?", прафэсар адказаў: „Мая бабка казала: «Вера таямніца душы». Я падзяляю хрысьціянскае веравучэньне, ягоныя догматы, ягоныя прынцыпы, аднак у звычайным разуменьні гэтага слова назваць сябе веруючым вельмі цяжка, бо веруючы чалавек абавязаны прымаць удзел у кульце, хадзіць на набажэнства, на літургію, вытрымліваць усе сьвяты, усе прадуг-

леджаныя рытуалы" („Навіны Беларускага народнага фронту за перабудову „Адраджэньне", 17 сьнежня 1989 г.).

Як бачым, прафэсар Юры Хадыка не зусім веруючы чалавек, а некаму ўмаўляе вунію, якую беларускі народ не хацеў прымаць ад часу яе ўвядзеньня. Яе накідалі праваслаўным сілай. На жаль, аб гэтым мала хто зь беларусаў ведае й мала хто хоча аб гэтым пісаць. Толькі апошнім часам, пры нагодзе, успомніў В. Каляда аб адным з гэтых „сьвятых" вуніяцкіх „мучаніках" у незалежным часопісе праваслаўнай моладзі, які выходзіць у Менску, дзе між іншым піша:

„Зьверствы Кунцэвіча зьдзіўлялі й абуралі нават высокіх каталіцкіх дзеячоў. Вось што пісаў літоўскі канцлер Леў Сапега вуніяцкаму мітрапаліту Руцкаму: «Ня толькі я, але й іншыя асуджаюць тое, што айцец уладыка Полацкі надта жорстка пачаў учыняць і вельмі абрыдзеў і зьмярзоцеў народу як у Полацку, так і ўсюды»" („Холмская Русь", стар. 81).

Заходняя Рымская Каталіцкая царква абвясьціла ката праваслаўных беларусаў сьвятым мучанікам. З малітвы: „Сьяты Іасафаце. Ты праліваў сваю кроў як пакутнік за Хрыстову Царкву".

12 лістапада 1989 году ў касьцёле ў в. Баруны Маладзечанскага раёну было зладжана набажэнства з нагоды сьвяткаваньня дня сьвятога мучаніка Іасафата. На набажэнстве былі госьці з Польшчы й некалькі аўтобусаў зь менскімі гасьцямі. Ушанаваньне беларускага ката й душахвата было зладжана зь вялікім размахам. Набажэнства справіў паводле вуніяцкага абраду каталіцкі сьвятар а. Ян Матусевіч.

А ніжэй ад рэдакцыі „Праваслаўнай думкі" ёсьць зьмешчаны такі дадатак:

„Нагадаем Вам, што акрамя Льва Сапегі, Уладзімір Караткевіч у п'есе „Званы Віцебска" даволі адназначна паказаў Кунцэвіча як ката беларускага народу. Як нам стала вядома, у касьцёле ў Барунах былі й высокія дзеячы Народнага фронту, арганізацыі, якую „Праваслаўная думка" паважае. Калі-б гэта было звычайным каталіцкім набажэнствам — іншая справа, але, калі палітычная акцыя — мы выказваем нязгоду" („Праваслаўная думка" № 3, Менск, 1989 г., стар. 5).

Гэты самы беларускі каталіцкі ксёндз-„патрыёт" Ян Матусевіч адпраўляе божыя службы й на польскай мове. Ну што-ж — „наша вяра".

Хоць царкоўныя прадстаўнікі Ўсходняй і Заходняй цэркваў спатыкаюцца й хораша між сабою гавораць, абменьваюцца падаркамі, але паміж Цэрквамі няма сапраўднае хрысціянскае любові й не відаць, каб яна была. Гэта добра паказаў кардынал Ю. Глемп у часе свайго візыту на Беларусь у 1988 годзе. Ён ня бачыў на Віленшчыне, Лідчыне й Навагрудчыне беларусаў-католікаў, а бачыў толькі палякаў- католікаў, якія арыентуюцца на польскую культуру. Падобна выказваў сваю дэмакратыю да беларускіх дэмакратаў у Менску ў 1919 годзе Ю. Пілсудскі, гаворачы толькі аб „зямлі гэтай", або „гэтая зямля", а ні разу не ўспамянуў Беларусь.

Праблема Вуніяцкай царквы мае быць неўзабаве вырашана паміж Праваслаўнай і Каталіцкай цэрквамі. З пункту гледжаньня дэмакратыі Вуніяцкая царква ў СССР ня можа быць забаронена, аднак ня ўсюды яна будзе карыстацца папулярнасьцю.

Акрамя вуніяцкай праблемы маецца многа другіх праблем з боку каталікоў у адносінах да праваслаўных. Газэта „Ортодокс Ньюс" (№ 3, 1989 г.) падае, што ў праваслаўнай царкве ў Седльцах хуліганы выбілі 100 шыб у вокнах і зламалі даволі дарагі крыж на царкве. Узламаліся ў шалаш і ўкралі будаўнічыя матэрыялы. Паліцыя не магла знайсьці вінаватых, хоць былі пакінуты сьляды.

Таксама ў газэце „Ніва" (4 лістапада 1990 г.) чытаем: „Ноччу 16-17 студзеня г.г. на праваслаўных могілках прыходу сьв. Яна ў Варшаве (квартал Воля) невядомыя злачынцы зьнішчылі 52 надмагільныя помнікі й 10 крыжоў (...), а ноччу 17-18 студзеня злачынцы вярнуліся, каб працягваць справу зьнішчэньня. Было зьнішчана яшчэ 20 помнікаў й 4 крыжы. (...) Агульная шкода ацэньваецца на 50 мільёнаў злотых". Адна асоба зь Беластоку інфармуе нас аб наступным: „Сытуацыя ў нас пагаршаецца. Польскі дзікі шавінізм дае эфэкты. На Вялікі Чацьвер нам спалілі царкву ў Нарве й парубалі ікону ў капліцы ў Крыначцы каля Гайнаўкі. Раскідалі ўлёткі, што спаляць царкву ў Трасьцянцы й Пухлах. Людзі пільнуюць іх вечарамі, але на як

доўга. Нашы людзі поўнасцю ідуць за намі, хоць некаторыя баяцца каталіцкага тэрору".

Трэба памятаць, што такія варварскія праступствы адбываюцца ня першы раз, і трэба дзівіцца, што адбываюцца яны ў вельмі-ж рэлігійнай хрысьціянскай краіне — Польшчы. І ў гэтых рэлігійных злачынствах немалую віну нясе польскае каталіцкае духавенства, якое прамоўчвае такія дзікія паступкі сваіх вернікаў.

Ангельская газэта „Індэпэндэнт" (28 сьнежня 1989 г.) пісала як вуніяты на Ўкраіне ўрываюцца ў праваслаўныя цэрквы ў часе багаслужбаў, нарушаюць сьвятую літургію й дамагаюцца аддаць ім царкву. Паводле газэты, людзі гэтыя ня хочуць чакаць легальнага вырашэньня данай справы, а рашаюць яе натоўпам. Яны акружылі дом праваслаўнага архіепіскапа й крычалі: „Даць нам Макарыя, мы яго ўкрыжуем на пляцы!"

„Дзеньнік польскі" (ад 22 сакавіка 1990 г.) падае: „Парафія ў Віньніцы атрымала шэраг пісем з Польшчы, у якіх выказваецца салідарнасьць". Як бачым, вуніятаў-украінцаў падбухторваюць палякі з Польшчы, якія трымаюць кантакт з палякамі ў Заходняй Украіне й дараджаюць ім пісаць лёзунгі тыпу: „Аддайце касьцёлы каталікам". Ды пры гэтым вучаць, каб пісаць па-расейску, але лацінскім алфавітам.

Доўга не прыйшлося чакаць, як 25 сакавіка, у часе дэманстрацыі ў Менску, на транспаранце зьявіўся надпіс лацінкай: „Беларусь Савецкая — Беларусь бяз будучыні" й нават на лацінскай мове: „Віват Альба Руссіа Лібэрта" („Жыве незалежная Беларусь"). Застаецца толькі спытаць арганізатараў: з чые ініцыятывы, для каго й дзеля чаго прымяняецца лацінка?

На Беларусі было й захавалася некалькі канфэсіяў: стараверы, юдэі, магамэтане, баптысты, пратэстанты й т.п. І ніхто супраць іх не выступаў і не выступае. Але каталіцызм зь яго прыбудоўкай — вуніяй — на Беларусі, гэта ня ёсьць вера, а чужая й варожая беларусам палітычная агентура.

„Сандэй Тэлеграф" (ад 28 студзеня 1990 г.) падае, што вядучы рыма-каталіцкі тэоляг д-р Ганс Кунк параўнаў рымскага папу да ўсходняга эўрапэйскага дыктатара. Паводле яго слоў, Ватыкан публічна дамагаецца людзкіх пра-

воў для другіх, але ў сваёй сфэры забараняе свабоду сумленьня прэсе й грамадзтву.

Яшчэ ня так даўно было прынята гаварыць, што ў Крамлі сядзяць непамыльныя лідэры камуністычнай партыі, а ў Ватыкане — папы.

Як толькі ў СССР пачала набіраць сілы галоснасьць і перабудова, то палякі ў краі адразу заварушыліся. „Дзеньнік польскі" (ад 7 сакавіка 1990 г.), які выходзіць у Лёндане, падае, што ў Варшаве газэта „Вядомосьці" ад некалькіх гадоў прысьвячае ўвагу палякам „на тэрыторыях Рэчы Паспалітай, заграбленых пасьля 1944 году. Тры гады таму „Вядомосьці" паднялі ініцыятыву збору грошай, прызначаных на падтрыманьне польскіх памкненьняў на Крэсах".

Далей „Дзеньнік польскі" падае, што 27 сьнежня 1989 году ў Радаме заснавалася Таварыства любіцеляў Вільні „Остра Брама". Мэтай гэтай арганізацыі, паводле статуту, ёсьць пазнаць духовую й матэрыяльную культуру Вільні, яе ваколіцаў, матэрыяльная дапамога ў ахове помнікаў польскай культуры на Віленшчыне, праводжаньне там лекцыяў, арганізаваньне бібліятэкаў, школаў для навучаньня польскай мовы, рэлігійныя кантакты й т.п. Такім парадкам палякі ўзяліся аднаўляць на Гарадзеншчыне замак Сапегаў і будаваць помнік сарака загінуўшым у 1863 годзе паўстанцам. Там, дзе праводзіў сваю баявую дзейнасьць Кастусь Каліноўскі, палякі заслугі прыпісваюць сабе.

Калі-б гэта мела быць чыстая культурная дапамога палякаў сваім суродзічам на Беларусі, то вельмі добра. Але, калі за гэтай „культурнай" ініцыятывай маюцца на мэце „тэрыторыі заграбленыя" й „падтрыманьне польскіх імкненьняў на Крэсах", тады іншая справа. Мы тут, на эміграцыі, ня раз чулі ад палякаў і чыталі ў іхняй прэсе, што „без Вільні й Львова не ма Польскі". Стары шавінізм жыве, палякі ня могуць забыцца, што каталіцызм і вуніі на землях Літвы, Беларусі й Украіны былі карыснымі для польскага Касьцёла, толькі забыліся, што яны аказаліся трагічнымі для дзяржавы — Рэчы Паспалітай, праз польскую заборчую палітыку й рэлігійную манію.

„Дзеньнік польскі" (ад 5 красавіка 1990 г.) наракае, што на паўночна-ўсходніх крэсах Рэчы Паспалітай у некаторых

касьцёлах гавораць па-руску, па-беларуску й па-літоўску, але не па-польску. І тут-жа аўтар артыкула ставіць пытанне: „Ці гэтыя ксяндзы-шавіністы сапраўды дзейнічаюць у імя Божае й для славы Касьцёла?" Гэта мае значыць, што Бог можа выслухаць малітву ці імшу толькі на польскай мове, што прынясе славу Касьцёлу. Далей аўтар піша, што людзі ў Данюшае моляцца й сьпяваюць па-польску, але за касьцёлам гутараць „па-просту", гэта значыць па-беларуску. У такім выпадку, калі ёсьць мова „простая", то павінна быць і мова „крывая".

Паводле перапісу насельніцтва ад 1989 года ў СССР пражывала 1 126 тысяч палякаў, з ліку якіх 418 тысяч знаходзілася на Беларусі. Робяцца захады, каб даць ім магчымасьць вярнуцца ў Польшчу. У прэсе згадвалася, што іх быццам мелі пасяляць на Беласточчыне. Большасьць гэтых палякаў ня ведае польскай мовы, таму ёсьць праект, каб пасадзіць іх на Віленшчыне, Валыні, Падольлі, на Львоўскай зямлі, дзе жылі й яшчэ жывуць іхнія продкі.

Міграцыя, або насаджэньне палякаў на Беларусі пачалося ня сёньня. Аб гэтым найбольш дбаў Каталіцкі касьцёл, які рабіў зь беларусаў католікаў-палякаў. Нават у часе апошняй вайны крэсовыя біскупы на чале з Рамуальдам Ялбжыкоўскім слалі сваіх ксяндзоў разам зь нямецкай арміяй на Ўсход, якія мелі арганізаваць польскія парафіі. Нямецкая палітыка не падзяляла польска-каталіцкай дзейнасьці ва Ўсходняй Беларусі й загадала ксяндзам спыніць сваю работу й вярнуцца туды, скуль яны прыехалі. Ксяндзы, палякі й другія, не падпарадкаваліся загаду немцаў і за гэта былі арыштаваны — адных зьнішчылі, другіх пасадзілі ў канцэнтрацыйныя лягеры.

Як у часе вайны, так і па вайне, так польская нацыянальная, як і рэлігійная дзейнасьць перахоўвалася на Беларусі нягледзячы на перашкоды. Дзейнічалі падпольныя польскія школы й падпольна рыхтаваліся маладыя ксяндзы, якія сёньня актуальна дзейнічаюць.

У такіх вось абставінах палякі арганізавалі й арганізуюць далей сваю акцыю, каб гэтым разам накіраваць з Польшчы на Беларусь больш ксяндзоў-палякаў са сваімі памагатымі, быццам дзеля рэлігійнай мэты, а ў сапраўднасьці дзеля палянізацыі гэтых абшараў. Праводзіцца пляновая работа.

Хоць права забараняе ксяндзам, грамадзянам другіх дзяржаваў выконваць душпастырскія паслугі для грамадзян СССР, аднак, як падае газэта „Голас Радзімы" (ад 22 сакавіка 1990 г.), „польскія-ж ксяндзы, якія прыязджаюць да нас па прыватных запросінах і правяць службы ў нашых касьцёлах, паводзяць сябе не як госьці: як кажуць, ідуць „у чужы манастыр са сваім уставам". Ёсьць прыкрыя сьведчаньні, калі польскія ксяндзы лічаць, што ў Беларусі сярод каталікаў павінны быць такія парадкі як у Польшчы. Быў такі выпадак у Глыбокім. Запрасіла туды суполка ксяндза з Польшчы. Прыехаў, правёў першую службу й заявіў, што яму непатрэбны ні касьцельны камітэт, як у нас прынята, ні рэвізійная камісія, ні казначэй. Буду сам вырашаць усе пытаньні, ні з кім не раячыся. Самі веруючыя яму сказалі, што такі ксёндз, які будзе тут наладжваць свае парадкі, як некалі на „крэсах", ім непатрэбны".

Такая работа праводзілася на працягу мінулых стагодзьдзяў, калі акрамя ксяндзоў-палякаў з Польшчы на Беларусь прыязджалі розныя каталіцкія ордэны, заданьнем якіх было навярнуць праваслаўных беларусаў, калі не на каталіцызм, то загнаць іх у вунію, якая таксама вяла беларусаў да апалячаньня. Пасьля гэтыя рэнэгаты гаварылі, і гавораць цяпер, што тут жывуць палякі й гэта зямля належыць да Польшчы.

Слушна гаворыць Міхаіл Біч, доктар гістарычных навук, які зьяўляецца намесьнікам дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР:

„Дзякуючы перабудове й публічнасьці, Царква ў Беларусі цяпер значна актывізавалася. Як праваслаўная, так і каталіцкая. Адкрываюцца ўсё новыя храмы. Я лічу гэта прагрэсыўнай зьявай. Але, на жаль, на Гарадзеншчыне цераз касьцёл і некаторых дзеячоў, якія кіруюць польскім культурным рухам, зноў праводзіцца фалшывая ідэя, што ўсе католікі ёсьць палякі.

Мы, вучоныя гісторыкі (дарэчы, сам я ўраджэнец Гарадзеншчыны), катэгарычна не згодны з такой, мякка кажучы, вольнай трактоўкай гісторыка-нацыянальных пытаньняў. Этнічна польскага насельніцтва ў нас у рэспубліцы практычна не засталося. Таму што ўжо ў пасьляваенны пэрыяд была дадзена магчымасьць выезду палякаў у Польш-

чу. І ўсе, хто лічыў сябе палякамі ці меў для гэтага самыя нязначныя падставы, пакінуў межы краіны. Засталіся толькі беларусы-каталікі. Навошта ім зноў марочыць галаву гэтай самай палянізацыяй, што скампраметавала сябе. (...)

Польскія клясы й школы на Гарадзеншчыне растуць як грыбы пасьля дажджу. Іх ужо дзесяткі, а беларускі кляс на ўвесь абласны цэнтр толькі адзін, хаця 75 працэнтаў жыхароў Гарадні карэнныя беларусы" („Голас Радзімы", 5 красавіка 1990 г.).

Такое прыкрае зьявішча пацьвярджае лёнданскі „Дзеньнік польскі" ад 5 красавіка 1990 г., пішучы: „У даную хвіліну вучыцца польскай мовы ў Гарадзеншчыне 2,5 тысячы дзяцей, у той час як толькі 16 дзяцей — мовы беларускай". Аб такім зацікаўленьні й стане беларускай новы на Гарадзеншчыне можа паслужыць за прыклад выступленьне Дануты Бічэль-Загнетавай, члена Сойму БНФ з Горадні на Ўстаноўчым кангрэсе Беларускага дэмакратычнага аб'яднаньня ў Беластоку ў лютым гэтага-ж году. Вось што яна сказала:

„Зараз у нас на Беларусі ідзе перадвыбарчая кампанія. БНФ у Горадні выступае выбарчым блёкам зь іншымі дэмакратычнымі арганізацыямі, у тым ліку й з польскім таварыствам. У сваёй выбарчай плятформе мы вылучаем на першым месцы пытаньні эканомікі, экалёгіі, прававой дзяржавы. Моўнае пытаньне — выратаваньне беларускай мовы — стаіць у плятформе на далейшым месцы" („Беларускія навіны", № 1, Бюлетэнь Беларускага дэмакратычнага аб'яднаньня, Беласток, май 1990 г. стар. 10).

І якое на гэта можа быць апраўданьне, што сказала Данута Бічэль-Загнетава?! Яна й яе БНФ у сваёй выбарчай кампаніі на Гарадзеншчыне вылучылі на першае месца эканоміку й здаровую атмасфэру для польскага школьніцтва, адсунуўшы сваё школьніцтва на далейшае месца.

Што да школьніцтва на Гарадзеншчыне й у другіх раёнах і вобласьцях Беларускай ССР, то тут вялікая віна ляжыць на самых беларусах, падобных да Дануты Бічэль-Загнетавай з БНФ, і мясцовых адміністрацыях, якім варта было-б узяць прыклад з палякаў і пачаць закладаць беларускія школы.

Праўда, беларускія абставіны на Гарадзеншчыне прыкрыя яшчэ й таму, што на чале яе адміністрацыі стаіць чужы для беларусаў чалавек, аб якім чытаем:

„Вядома-ж, таварышу Сямёнаву, рускаму па нацыянальнасьці, першаму сакратару абкома Гарадзеншчыны, усё роўна, якую мову разьвіваць, — польскую ці беларускую. Ён ні на той, ні на другой не размаўляе. А ў час выбарчай кампаніі нават было вельмі добра разыграць „польскую карту", каб змагацца супраць беларускіх „нацыяналістаў" з „Паходні". Як тут не ўзгадаць пастанову яшчэ ленінскага па духу 12 зьезду РКП(б), у якой у пунктах 10 д і 10 е адзначалася, што органы нацыянальных рэспублік павінны будавацца „по преимуществу из людей местных, знающих язык, быт, правы и обычаи соотвествующих народов".

Ці не закладаем мы падмурак, мякка кажучы, усялякіх нацыянальных непаразуменьняў, калі цяпер спакойна назіраем за тым, як „Чырвоны штандар" (выходзіць у Вільні), а зараз „Кур'ер віленскі" ды „Магазын віленскі", пішучы пра Баранавічы, Ліду, Нясьвіж і іншыя беларускія мясьціны й іх насельніцтва, без сумніву ўжываюць выразы „польскія тэрэны", „усходнія крэсы", „тутэйша земя", „край, дзе павінна гучэць „Рута" й г.д. і т.п. („Беларусь" № 5, май 1990 г., стар. 28-29).

Амаль кожны дзень „Дзеньнік польскі" вядзе агітацыю пра „ўсходнія польскія землі, адарваныя сілай ад Рэчы Паспалітай Ялцінскай пастановай". Але палякі нічога не гавораць аб землях Прусіі й Заходніх землях, якія ніколі не былі польскімі, а дзякуючы Ялце апынуліся ў граніцах сучаснай Польшчы.

Ужо пару дэкадаў праводзіцца ажыўленая польска-каталіцкая акцыя на „крэсах" з мэтай адрадзіць польскасьць. Натварылася там апошнім часам многа польскіх арганізацыяў, якія ёсьць занепакоены „з прабуджэньнем шавінізму ўкраінскага, літоўскага, беларускага й другіх народаў Усходу", толькі ня польскага. Такое зьявішча, пішуць палякі, б'е ў інтарэсы іхняга краю. І, як піша „Дзеньнік польскі" ад 28 траўня 1990 году, сьпяшаюць на Ўсход, між іншым, „ксенжа вэрбісьці, палётыні, езуіці, домінікане, францішкане, марыяне, хрыстусовцы, сёстры місьёнаркі й служэбнічкі", якія нясуць духовую падтрымку, узмацняюць асновы веры, вучаць польскай мовы й т.п. І ўся гэтая работа вядзецца Каталіцкім касьцёлам і праводзіцца стагодзьдзямі на Беларусі.

Мы ніколі ня знойдзем сапраўднага адказу на прэтэнзіі палякаў на яе граніцу на Ўсходзе, калі не заглянем глыбей у гісторыю Вялікага Княства Літоўскага. У 1919-1920 гадох, калі ішла дыпляматычная й збройная вайна палякаў з бальшавікамі за беларускія землі, польскі гісторык прафэсар Оскар Галецкі так абараняў на старонках прэсы юрыдычныя й гістарычныя правы Польшчы на Ўсходзе:

„Усходнюю граніцу 1772 г. мы дасягнулі ўжо 400 гадоў перад тым, у 1386 г. І тут важна перш за ўсё тое, што мы набылі яе ў XIV стагодзьдзі не шляхам бяспраўнага падбою й нават не шляхам вайсковай перамогі (...) землі літоўскабеларускія ў граніцах да падзелу дабравольна прылучыла да Польшчы правамоцная дынастыя".

І ад гэтага 1386 году, так званай Крэўскай вуніі, ідучы праз наступныя стагодзьдзі з чарговымі вуніямі, мы можам даведацца аб пысутнасьці палякаў і каталіцызму ня толькі на паганскай Літве, але й на праваслаўнай Беларусі й Украіне, калі пасьля гэтай вуніі пачалі ехаць на ўсход палякі са сваімі ксяндзамі, маючы супольнага караля Ягайлу, які прыняў каталіцкую веру й пачаў насаджваць і надзяляць зямлёю й вёскамі каталіцкія касьцёлы, а першабытную веру русінаў зьневажаць і абмяжоўваць.

Варта прыгадаць другую вунію, так званую Гарадэльскую 1413 году, якой артыкул XIV падсумоўвае ўсе прывілеі дадзеныя ў папярэдніх артыкулах, а менавіта:

„З вышэйпералічаных свабодаў, прывілеяў і ласкаў могуць карыстацца й цешыцца імі толькі паны й шляхта Літоўскія землі, якім прызнаны гербы й скарбы шляхты Польскага Каралеўства й якія зьяўляюцца вернікамі хрысьціянскай рэлігіі Рымскага касьцёла, а не схізматыкі або няверныя".

Ужо ад часу Крэўскай вуніі ўся дзейнасьць каталіцкіх біскупаў і ксяндзоў на Беларусі скіравана была супраць праваслаўных, якім забаранялася ня толькі будаваць сабе новыя цэрквы, але рамантаваць старыя. Такая забарона знайшлася ў касьцельным праве, сфармуляваным у Вялюнска-Каліскім статуце 1420 году. У 1423 годзе Ягайла забараніў бацькам католікам хрысьціць дзяцей ва ўсходнім абрадзе.

Аб Люблінскай і Берасьцейскай вуніях маем такое вось выказваньне: „Люблінская (1569 г.) і Берасьцейская

(1596 г.) вуніі адчынілі дарогу да палянізацыі беларусаў ва ўмовах дадатковай да гэтага духоўнай і матэрыяльнай эксплёатацыі нашага народу ордэнамі езуітаў" („Звязда", сувэнірны спецвыпуск, май, 1990 год, стар. II).

Люблінская вунія ня толькі адчыніла дарогу да палянізацыі беларусаў, але прылучыла да Польшчы частку зямель Вялікага Княства Літоўскага, дала палякам права асядаць і мець зямельную ўласнасьць на Беларусі, Украіне й Літве. Як прызнаюць самі палякі, эміграцыя на землі ВКЛ была „выборова", складаў яе адукаваны элемэнт, які ехаў з пэўным заданьнем і разьлікам.

Люблінская вунія была накінута ВКЛ супраць волі яе народу й яго прадстаўнікоў, ад імя якіх гаварыў, стоячы на каленях перад каралём Жыгімонтам III, жмудзкі староста Ян Хадкевіч, „што на гэтыя справы трэба глядзець замест зь міласьцю — з горыччу, бо нас абвіняць, што мы не разумелі свайго паняволеньня".

Выступленьне Яна Хадкевіча кароль не прыняў так чула, як гэта прынялі некаторыя прысутныя на сойме, а толькі сказаў беларуска-літоўскім магнатам устаць і падпісаць вунію, а як не то пазбавіць іх усіх правоў і пусьціць па сьвеце. А такі акт вуніі палякі называюць вуніяй „вольных з вольнымі, роўных з роўнымі" й што гэта рабілася ў довад „любові", што „творыць правы".

А што да Берасьцейскай вуніі, то кароль Жыгімонт III хацеў сілай і гвалтам навярнуць ня толькі праваслаўных русінаў Вялікага Княства Літоўскага, але й масквічоў, пратэстантаў-швэдаў і магамэтан-туркаў за дзесяціны, якія атрымліваў з Рыму. Жыгімонт хацеў быць унівэрсальным уладаром, але не разумеў адной важнай справы, што супраць волі народу цяжка панаваць.

Уплывы польскія ў ВКЛ абмяжоўваліся сьпярша да малой колькасьці людзей, якія былі зь імі ў кантакце, а былі гэта пераважна магнаты й шляхта, якія прынялі каталіцкую веру й празь яе апалячыліся. Толькі аснаўная маса народу, адсунутая ад палітычнага жыцьця, жыла сваім прыватным жыцьцём і засталася праваслаўнай, што ўратавала яе ад палянізацыі, якая ахапіла кіруючыя кругі Літвы й Русі. Тыя магнаты й шляхта, што прынялі каталіцкую веру,

перайшлі ў польскі лягер і сталіся ворагамі таго народу, зь якога выйшлі. Такія былі ў той час правы й парадкі, якія пакінулі па сабе прыкрыя наступствы.

Тое, што „дабравольна прылучыла да Польшчы правамоцная дынастыя" зь яе вуніямі, як гэта піша прафэсар О. Галецкі, для літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў было звычайным паняволеньнем.

Пад аслонай галоснасьці й перабудовы праводзіцца адначасна на вярхох сплянаваная й замаскіраваная работа польскай і апалячанай адміністрэцыі й Касьцёла, як гэта вялося спакон вякоў. Аб гэтым можа сьведчыць такі скромны прыклад:

„Летась 25 ліпеня папа рымскі Ян Павал II прызначыў ксяндза Тадэвуша Кандрусевіча апостальскім адміністратарам Мінскім, паднёсшы яго да годнасьці біскупа, а 20 кастрычніка ў базыліцы сьв. Пятра ў Рыме адбылася біскупская кансэкрацыя. Сьвяты Айцец зьвярнуўся да мансеньёра Тадэвуша на італьянскай і беларускай мовах. Гэта адзначылі ўсе. На якой-жа мове адказаў Яго Сьвятасьць Апостальскі Адміністратар Мінскі? Пра гэта ўсе маўчаць. Нават айцец Аляксандар Надсон, які меў гонар і абавязак прысутнічаць на ўрачыстасьці, анічога не паведаміў пра гэта ў № 3 (8) „Весьніка беларускага душпастырства" („Літаратура і мастацтва", 13 красавіка 1990 г.).

Гэты біскуп, як польскі патрыёт, не пасаромеўся ў сталіцы Беларусі Менску прамовіць у касьцёле сьпярша па-польску, пасьля па-руску, а тады па-беларуску. Назначэньне яго біскупам на Беларусі „Дзеньнік польскі" ад 14 сакавіка 1990 году называе „уколам для каталіцызму й польскасьці на доўгія гады".

Папа на Каляды й на Вялікдзень кажа прывітаньне па-беларуску, яго радыё і тэлевізія вядуць прапаганду па-беларуску, яго платныя работнікі выдаюць прапагандысцкую каталіцкую літаратуру па-беларуску, а як назначыць на Беларусь біскупа, то назначыў ярага каталіка, ворага беларускасьці. І гэтае назначэньне не было прыпадковае, а прадуманае, з разьлікам.

Вярнёмся ў XX стагодзьдзе й паслухаем што піша Анатоль Сідарэвіч пра вёску Вярэйкі Ваўкавыскага раёну, дзе мала што не дайшло да бойкі паміж праваслаўнымі й католі-

камі за праваслаўную царкву, якую хацелі забраць католікі. „У час Першай сусьветнай вайны, калі тутэйшых жыхароў вывозілі ў Расею, клір рабіў усё, каб палякі й беларусы рымска-каталіцкага веравызнаньня засталіся: гэтак рыхтаваўся грунт для калянізацыі заходніх земляў Беларусі. На сходзе ў дзень забастоўкі старэйшая жыхарка Вярэек Антаніна Данільчык успамінала, як пры адступленьні немцаў у спаленым сяле ацалелыя хаты аддавалі палякам, як каталікі на чале з ксяндзом захапілі царкву, як выкідалі й тапталі нагамі іконы й харугвы. Тыя нешматлікія праваслаўныя хрысьціяне, якія засталіся ў вёсцы, плакалі, упрошвалі не паганіць сьвятое, а каталікі, зрываючы вяроўкамі шасьціканцовы крыж, зьдзекаваліся: „Во як галава ў праваслаўнага хістаецца" („Літаратура і мастацтва, 7 верасьня 1990 г.).

Кожны беларус павінен памятаць, што Каталіцкі касьцёл на Беларусі быў і ёсьць моцна зьвязаны з польскасьцю. Гэтага не скрываюць польскія аўтары на эміграцыі. Ян Марцінкевіч у „Дзеньніку польскім" ад 7 жніўня г.г. піша, што „каталіцызм і польскасьць на крэсах паўночна-ўсходніх ішлі заўсёды ў пары з сабой". І ў гэтай рабоце Вуніяцкая царква ня можа ім супярэчыць, бо-ж і яна атрымоўвае дырэктывы ды грошы з таго-ж самага цэнтру — Ватыкану. Тут выняткаў быць ня можа. Усе ксяндзы-айцы — дзеці аднаго папы рымскага — робяць так, як ім кажа папа.

Калі вуніяцкія сьвятары выдаюць сябе за такіх вялікіх беларускіх партыётаў, то чаму яны не закладаюць сваю Царкву сярод апалячаных беларусаў-каталікоў, былых вуніятаў, якіх продкі ў свой час былі праваслаўнымі беларусамі, а лезуць да праваслаўных? Успамінаючы пару ВКЛ, палякі пішуць: „У яго лоне (ВКЛ — Ю. В.) тварыліся вялікія магнацкія фартуны. Гэты слой вырас зь літоўскага й рускага (беларускага — Ю. В.) баярства, прыняў польскую культуру й рыма-каталіцкую рэлігію й стаўся часткай польскага народу" („Дзее зем Велькего Ксенства Літэвскего", Лёндан 1953, стар. 41). Падобна згадвае Аляксей Каўка ў сваім артыкуле „Якімі скарбамі багатыя..." ў кнізе „Шляхам гадоў" (Менск 1990 г.): „Мы слушна прывыклі падкрэсьліваць пагібельныя для старабеларускай літаратуры вынікі экспансіі на Беларусь каталіцызму, апалячаньня, узмоцненых пась-

ля царкоўнай вуніі 1596 году і асабліва пасьля пастановы Варшаўскай генэральнай канфэдэрацыі 1696 года аб выцясьненьні тагачаснага „рускага языка" з адміністрацыйнага ўжытку і замены яго польскай мовай" (стар. 321).

Паралельна з акаталічваньнем (добраахвотным) разгортваецца моўная асыміляцыя нашай шляхты, якая знову-ж з уласнай волі прымае на сябе ролю валянцёра іншаземнай культуры й мовы на беларускай зямлі, занядбоўваючы духоўныя вартасьці" (там-жа, стар. 325).

Таксама пасьля скасаваньня Берасьцейскай вуніі ў 1839 годзе многа вуніятаў перайшло ў каталіцызм і, як прызнаюць некаторыя польскія гісторыкі, гэтыя людзі былі зьвязаны з полькасьцю й паступова палянізаваліся. Нешта падобнае сталася пасьля царскага ўказу аб веравызнаўчай тэлеранцыі ў 1905 годзе, калі пара дзесяткаў тысяч вуніятаў перайшла ў каталіцызм. Нават д-р Віктар Сянкевіч, каталік, у „Хрысьціянскіх навінах" (№ 7 ад 23 ліпеня 1990 году), якія выходзяць у Ватыкане, праводзячы аналіз кнігі беларускага рэлігійнага дзеяча ксяндза Адама Станкевіча „Родная мова ў сьвятынях" прызнае, што „вунія далася запрэгчыся ў сьвецкую польскую палітыку на шкоду беларускага народу".

Таму сёньня пажадана, каб вуніяты ішлі да гэтых спалянізаваных беларусаў-рэнэгатаў — католікаў на Бацькаўшчыне й на эміграцыі й усьведамілі ім іхняе паходжаньне ды вярнулі іх назад у сваю вунію й да свайго народу, замест шукаць наіўных сярод праваслаўных беларусаў.

А цяпер пацікавімся, якую хрысьціянскую работу выконвае Беларуская Праваслаўная царква й яе Экзархат у абароне свае веры перад наступам каталіцызму і вуніі. Адказ просты — ніякую. У рэдакцыю „Голасу Часу" піша беларус з Бацькаўшчыны:

„Быў дужа ўсьцешаны, што ў Лёндане выходзіць гэтакі добры часопіс. Быў усьцешаны й тым, што ён упэўнена трымае свой праваслаўны кірунак. Шкада, што ён не трапіў на Бацькаўшчыну раней. З рэлігійнай эмігранцкай літаратуры ў нас пераважна пашыраюцца вуніяцкія ды каталіцкія друкі. Мяркую, што знайшлася-б не адна тысяча на Беларусі жадаючых атрмаць „Голас Часу" (11 лютага 1990 г.).

„Выпадкова даведаўся я аб тым, што ў Лёндане пачаў выходзіць новы беларускі праваслаўны часапіс „Голас Часу". Гэта навіна вельмі ўзрадавала, бо ў нас няма рэлігійнага часопіса на беларускай нове. І таму зьяўленьне гэтага выданьня трэба толькі вітаць. У сувязі з гэтым зьвяртаюся да Вас з просьбай, калі ёсьць такая магчымасьць, можа дашляце калі ня ўсе, то хоць-бы адзін зь іх" (11 красавіка 1990 г.).

„Сапраўды, у нас няма пакуль магчымасьцяў выдаваць чыста праваслаўны часопіс на беларускай мове. На гэта ёсьць шмат прычын. Мы яшчэ не дарасьлі да таго ўзраўню, каб зразумець што такое праваслаўе для Беларусі, што прынясе штучна насаджаны каталіцызм зь яго вуніяй? Мы яшчэ сьпім, бо ўпэўнены, што гэта нас не датычыць. І здарыцца хутчэй за ўсё тое, што здарылася на Ўкраіне, хаця й не ў такіх вялікіх памерах. Наступствы каталіцызму вельмі й вельмі адчуваюцца ў рэлігійным жыцьці Беларусі. Можна прывесьці шмат прыкладаў, але вы гэта лепш за мяне ведаеце, бо чытаеце беларускую прэсу. Мяне бянтэжыць афіцыйная царкоўная абыякавасьць да гэтых фактаў, таму й наш афіцыйны часопіс ня вельмі надзейны для праваслаўных беларусаў. Нашае выданьне жыве па ўстаноўках шаноўнага ўладыкі Філарэта, які займае экумэнічную пазіцыю па гэтых пытаньнях. Вось такія справы" (3 ліпеня 1990 г.).

Што-ж на гэта можа сказаць нашае праваслаўнае духавенства са сваімі вернікамі й сам Беларускі экзархат на чале? Найбольшы час, каб нехта паважна ўзяўся за гэтую справу, а найбольш самі вернікі павінны дамагацца беларусізацыі свае Праваслаўнае царквы й выдачы свайго часопіса для ўсіх праваслаўных вернікаў. Як нас інфармуе суродзіч з Бацькаўшчыны, „у Менску пачаў выходзіць часопіс „Белорусскй Православный Экзархат", якога выйшлі 3 нумары. Патрэба ў беларускім рэлігійным часопісе даўно насьпела й бачыце яна пачала ажыццяўляцца. Часапіс выдаецца на дзьвюх мовах, пераважная большасьць матэрыялу — на расейскай, меншая — на беларускай. Але гэта ня вельмі засмучае, галоўнае — лёд праламаўся й дзякуй Богу. Гэта цешыць. Праўда, гэты часопіс не прадаецца ў розьніцу й на яго немагчыма, пакуль што, падпісвацца. Як быццам яго прадаюць у цэрквах, але асабіста я добра ня ведаю" (1 жніўня 1990 г.).

Чаму могуць мець і свабодна купляць і выпісваць свой праваслаўны часопіс на сваёй роднай мове расейцы й украінцы, а беларусы не? Ці-ж беларусы ня маюць свае мовы, што нават назоў „Белорусскнй Православный Экзархат" напісалі па-расейску? Ці Беларуская Праваслаўная царква мае быць надалей філіяй Рускай Праваслаўнай царквы? Ці беларускае духавенства мае абмежаваць сваю пастырскую работу толькі да хрысьцінаў, шлюбаў, паховінаў і славянскай літургіі ў сьценах царквы? Праз свой застой і бязьдзейнасьць Беларуская Праваслаўная царква падрывае свой аўтарытэт і гэтым дае свабодную дарогу для каталіцка-польскай дывэрсіі на Беларусі.

Хто-ж тады мае старацца, клапаціцца пра сваю Беларускую Праваслаўную царкву, калі не герархія. А мы бачым адваротнае зьявішча. Як піша нам суродзіч з Бацькаўшчыны, „мы яшчэ сьпім", а найбольшы час прачнуцца й узяцца за работу служэньня ня толькі Богу, але й свайму народу на ягонай роднай мове, што ёсьць сказана ў Сьвятым Пісьме. Гэта ёсьць магчыма зрабіць цяпершняму Беларускаму экзархату ў часе дзяржаўнай перабудовы й нацыянальнага адраджэньня. Епіскапы й духавенства павінны зразумець, што настаў час зьменаў. Адраджаецца Беларусь — народная, нацыянальная й калі Царква ня пойдзе з часам, то гэта выкарыстаюць вуніяты, якія іграюць на нацыянальным пачуцьці беларускіх патрыётаў, вера якіх ня ёсьць акрэплай. Некалі заганялі людзей у вунію, а цяпер яны пойдуць самі, калі Праваслаўная царква будзе надалей іх русыфікаваць. У пасьлядоўнасьці гэта можа вытварыць рэлігійную барацьбу прыкладам мінулых стагодзьдзяў. Беларуская Праваслаўная царква павінна цяпер пачаць бараніць нацыянальныя інтарэсы беларускага народу.

Сіла рымскага каталіцызму вымяралася й вымяраецца на Беларусі ня колькасьцю вернікаў, як гэта часта падаецца ў прэсе, а яго вядучымі палітыкамі й касьцельнымі прадстаўнікамі палянізацыі, якія часта й густа фальшуюць статыстыку ліку католікаў на Беларусі. Хоць яны залічваюць сябе да 2,5 мільёнаў, але гэты лік католікаў-палякаў не адпавядае сучаснай статыстыцы.

Апалячаньне беларусаў-католікаў і нават праваслаўных гэта старая й добра вядомая практыка палякаў, якая ня

страціла свае актуальнасьці й сёньня. Дзеля гэтае мэты палякі прымаюць розныя формы й тактыку. Зусім слушна піша Анатоль Сідарэвіч:

„Мы ведаем, што Польская Каталіцкая царква й прасякнутая духам каталіцызму „Салідарнасьць" вызначаюцца сваёй антыкамуністычнай скіраванасьцю. Чаму-ж тады ракаўскі пробашч агітаваў парафіян галасаваць за камуністаўкіраўнікоў? Чаму „Салідарнасьць" друкавала лістоўкі ў падтрымку Д. Арцімені — таксама камуніста, кіраўніка? Адказ просты: таму, што канкурэнтамі гэтых кіраўнікоў былі дзеячы беларускай культуры: В. Рагойша ў першым выпадку, А. Мальдзіс — у другім. Меркаваньні тут пэўныя, адназначныя: ня даць разьвіцца беларускаму руху, бо ён можа падтачыць польскія пазіцыі на Беларусі. „Салідарнасьць" і прапольскія ксяндзы „палюбілі" камуністаў-кіраўнікоў таму, што яны таксама супраць росту нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў. (...)

Тэорыя тут такая. Рана ці позна СССР распадзецца. Касьцёл нясьпешна (ён вечны) павінен уплываць на сьвядомасьць вернікаў, бо „пытаньне аб нацыянальнасьці — пытаньне сьвядомасьці". Вось калі паўмільёна (а Царква лічыць што два мільёны) вернікаў стануць палякамі, тады можна будзе прад'явіць Беларусі прэтэнзіі. (...)

Як беларус, як хрысьціянін, я зьвяртаюся да дэпутатаў Вярхоўнага Савета рэспублікі з просьбай, каб яны патрабавалі выдаленьня польскіх місіянераў зь Беларусі" („Літаратура і мастацтва", 29 чэрвеня 1990 г.).

У такіх вось варунках ствараецца на Беларусі й на эміграцыі не зусім здаровая атмасфэра на фоне нацыянальнага й рэлігійнага жыцьця й суадносін паміж праваслаўнымі беларусамі й каталіцкімі палякамі. У гэтай чужой, скрытай і не зусім яснай для некаторых беларусаў дзейнасьці, якая разгортваецца сёньня на Беларусі, а мае сваіх агітатараў на Захадзе, можа выканаць немалую ўслугу й лацінскі алфавіт, які прапануе нам інжынер-канструктар А. Капуцкі з Маладзечна, аб якім мы згадвалі раней і які паслужыў для напісаньня гэтага артыкула.

Сёньня важным пытаньнем для беларусаў зьяўляецца не лацінскі алфавіт, не катэхізм і малітоўнікі, якія друкуе кі-

рылічным шрыфтам ды польскімі словамі Польская Каталіцкая царква, а справа роднай школы, як гэта згадвае й А. Капуцкі. Гэтыя пытаньні павінны быць вырашаны даўно, пакуль школа мела пачаць свае заняткі.

Акрамя школьніцтва, прэсы, граматыкі, правапісу й т.п. ня менш важныя справы стаяць наперадзе, а гэта: якім спосабам правесьці пасьпяхова беларусізацыю школаў, дзяржаўных установаў і надаць Праваслаўнай царкве й Каталіцкаму касьцёлу на Беларусі беларускі характар? Што трэба зрабіць, каб беларуская мова сталася ў іх мовай штодзённага жыцьця рэспублікі, каб сталася галоўным зьвяном беларусізацыі, самасьвядомасьці й нацыянальнага гонару беларускага народу.

Гэты працэс ня будзе такі лёгкі й просты. І тут не прадбачыцца, каб А. Капуцкі пацікавіўся гэтымі справамі й да іх падышоў паважна, бо-ж Закон аб увядзеньні беларускай мовы як дзяржаўнай ён уяўляе так: „Добры закон прынялі ці дрэнны, пакажа час".

У даны час трэба быць вельмі асьцярожным на рознага роду прапановы, падшэпты й дзейнасьць рэлігійных місіянераў, бо як мы бачылі вышэй, гэтыя гандляры верай хочуць мець свой важкі голас на Беларусі. Побач сапраўдных беларускіх патрыётаў, яўна й скрыта дзейнічаюць разнародныя сілы, якія „з улікам традыцыі" стараюцца правесьці сваю работу на Беларусі. Ці мы можам дапусьціць да гэтага?

(„Голас Часу" №№ 3 (6), 4 (7), 5 (8), 6 (9), Лёндан, 1990 г.)

Ці Кірыла й Мяфодзій дапамагаюць Маскве?

Я ня меў магчымасці прачытаць артыкул спадара Анатоля Астапенкі „Беларускаму набажэнству быць!" у нумары 12 (346) „Нашага Слова" за 1 красавіка 1998 году й таму не магу над ім дыскутаваць.

Але атрымаў я частку газэты „Наша Слова" за 30 верасьня гэтага года, дзе быў зьмешчаны артыкул спадарыні Раісы Жук-Грышкевіч (Канада) пад загалоўкам „Дзеля чаго Астапенка хваліць царкоўнаславянскую мову?" У ім я чытаю:

„Царкоўнаславянская мова ёсць адной з прыладаў русіфікацыі іншых славянскіх народаў, услаўляе царкоўнаславянскую мову ды Кірылу й Мяфодзія й заклікае ставіць ім у Беларусі манументы! Чаму? А таму, што яны дапамагаюць Маскве загарнуць усіх славян пад свае маскоўскія крылы, каб, як Каліноўскі кажа, перакруціць іх на маскалёў".

Цяжка пагадзіцца з такімі цверджаннямі паважанай Раісы. Выглядае, быццам, Кірыла й Мяфодзій зьяўляюцца ворагамі шматлікіх славян і сярод іх — беларусаў, а прыяцелямі толькі Масквы. Ня трэба забываць, што Кірыла й Мяфодзій жылі ў палове IX стагодзьдзя. У час іхняй дзейнасьці аб Маскве нічога не было чуваць, яе яшчэ не было. І сёньня рабіць гэтых заслужаных салунскіх братоў прыладай маскоўскай палітыкі выглядае непаважна.

Згадаем тут коратка аб славянах. Зьявіліся яны на палітычным гарызонце неспадзявана й да таго ж як вялікі афармлены народ, які насіў у сабе больш падабенства, як розьніцы. Аб славянах пачалі пісаць грэцкія гісторыкі ў XI стагодзьдзі, калі яны ўвайшлі на тэрыторыю Візантыі, а пасля аб славянах пісалі нямецкія храністы. Супольнасць славян на Балканах прадстаўляла збройную сілу й таму візантыйская адміністрацыя змушана была дазволіць ім асесьці на сваёй тэрыторыі. Так што пачынаючы ад VI да VIII стагодзьдзяў экспансія славян расьцягвалася ад Днястра да Лабы й ад Ладагі да Пэляпанэсу.

Як ужо згадвалася, аб славянах пісалі візантыйцы й немцы, але пісалі яны таму, бо славяне, хоць былі вялікім народам, аднак ня мелі свайго пісьма. Прыйшло яно да іх разам з хрысьціянствам у палове IX стагодзьдзя. Вялікую работу ў гэтым праявіў Канстанцін (які, прымаючы духоўны сан, прыняў імя Кірылы). Ён улажыў славянскі алфавіт г.зв. глаголіцу, якую пасьля пачалі называць кірыліцай. Вялікую дапамогу ў дзейнасьці Кірылы аказваў ягоны брат Мяфодзій. Сваё жыццё прысьвяцілі яны Хрысьціянскай царкве.

На просьбу Вялікамараўскага князя Расьціслава (846-870) яны былі пасланы ў Маравію, каб там пашырыць хрысьціянскую веру на зразумелай народу мове, бо нямецкая мова была для мараўцаў незразумелай. Гэта было зроблена на пачатку 862 года. Але для нямецкіх місіянераў прысутнасць

грэкаў на Маравіі была непажаданай. Аднак салунскія браты мелі падтрымку мясцовага насельніцтва й сваю місію праводзілі пасьпяхова. Неспадзявана ў 869 годзе памёр Кірыла, але ягоны брат, Мяфодзій, працягваў далей сваю дзейнасьць на славянскай мове. За гэта быў ён увязьнены немцамі, тры гады праседзеў у турме й пасьля вызваленьня шмат меў непрыемнасьцяў, прыкрасьцяў, але стойка выконваў свае пастырскія абавязкі архіепіскапа, нягледзячы на перашкоды рымскіх папаў.

Памёр Мяфодзій у 885 годзе й быў урачыста пахаваны. Пасля смерці Мяфодзія нямецкае духавенства дабілася ад папы Сцяпана VI забароны служыць багаслужбы на славянскай мове, якую лічылі варварскай. І папа гэта зрабіў, назваўшы славянскую мову „Богу нямілай". Мала таго, што забаронена было адпраўляць набажэнствы па-славянску, дык адных святароў, вучняў Кірылы й Мяфодзія, пасадзілі ў турму, а другіх прадавалі ў рабства. Аб апошніх даведаўся візантыйскі пасол і выкупіў іх. Пасля гэтыя святары залажылі на Балканах цэнтр свае хрысьціянскай навукі. Асабліва Балгарыя сталася культурным цэнтрам царкоўнаславянскай пісьменнасці, якой кніжкі й людзі з часам былі вітаны на Беларусі.

Цяжка паверыць, каб праз пісьменнасць Кірылы й Мяфодзія Масква магла русіфікаваць падбітыя ёю народы. Чаму тады Рымская царква, якая аж да II Ватыканскага сабору карысталася латыньню ў сваёй багаслужбе, якая мае сходнасьць зь італьянскай мовай, а папы былі італьянцамі, не праявіла італізацыі ў сваім абсягу?

Факт быў той, што ў кожнай каталіцкай краіне імша адпраўлялася па-латыні, але сьвятары гаварылі пропаведзі на мове народа й апошнім часам касьцельная канцылярыя вялася на мове народа. А ў Беларусі, якая падпала пад Расею, яе мова была забаронена, назоў Беларусь замянілі на „Северо-Западный край", а ў царкве, па-за багаслужбай на славянскай мове, усё вялося на расейскай мове. Расея слала на Беларусь сваё духавенства, сваіх чыноўнікаў, закладала свае школы й так русіфікавала беларусаў.

Але ніхто так хутка не русіфікаваў беларусаў як камуністычная сістэма са сваёю дыктатураю й перасьледам незалежнай нацыянальнай думкі ўсіх народаў СССР, дзе сьмя-

ротныя пакараньні іншадумцаў былі зьявай штодзённай. Тут Расейская Праваслаўная царква, хоць і сталася прыладай палітыкі ўраду, ня мела ніякага голасу ані ў царкоўных, ані палітычных справах краіны, а нават сама пацярпела вялікія страты й існавала толькі дзеля прапаганды навонкі. Яе герархі рабілі ўсё так, як ім казаў савецкі ўрад, а мэтай ураду была русіфікацыя, таму й царква русіфікавала.

Так што русіфікацыя беларусаў і пісьменнасць Кірылы й Мяфодзія ня мелі й не маглі мець нічога супольнага. Вінаватыя тут былі беларускія святары ў краі, якія не гаварылі пропаведзяў на мове свайго народа, не вялі свае канцылярыі па-беларуску. Як раней, так і цяпер, адны святары запрадаліся Маскве, а другія — Варшаве й тут бяда.

Далей паважаная Раіса піша: „Аўтар, сябра Таварыства беларускае мовы імя Францішка Скарыны ўслаўляе мову Кірылы й Мяфодзія, услаўляе й верна ідзе ўслед за імі, а не за мовай Францішка Скарыны, а не ідзе за запаветамі Францішка Скарыны, які даў свайму беларускаму народу Біблію на ягонай роднай мове, каб ён „чытаючы (Біблію) разумеў".

І тут я нічога дрэннага не бачу ў паводзінах сябра ТБМ, як толькі ўдзячнасьць Кірылу й Мяфодзію за іхнюю дзейнасьць і ахвярнасьць, аб якой я далёка ня ўсё напісаў. Хтож як не яны, Кірыла й Мяфодзій, далі славянам пісьменнасьць пасьля габрэйскай, грэцкай і лацінскай. Яны зрабілі славян народам культуры, прывялі да хрысьціянскай веры, якая сталася сьцяной на Балканах, празь якую ня мог прабіцца іслам у Эўропу. Яны першыя пералажылі царкоўныя кніжкі на славянскую мову.

А што да Францішка Скарыны, дык гэта было ўжо XVI стагодзьдзе, але й яму таксама належыць вялікая ўдзячнасьць як прадаўжальніку ідэі Кірылы й Мяфодзія. Скарына пералажыў Біблію на беларускую мову, але не пазьбег царкоўнаславянскіх слоў Кірылы й Мяфодзія. Усё-ж дзякуючы гэтым двум апосталам славянскай пісьменнасьці, славянскія народы, а сярод іх і беларускі народ, маюць сваё пісьмо й ім даражаць, хоць ня ўсе беларусы. А калі мы маем зняважыць ахвярную дзейнасьць сьвятых апосталаў славян Кірылу й Мяфодзія, маем адмовіцца ад іх, тады трэба адмовіцца й ад іхняга алфавіту. Але што гэта дасьць?

Яшчэ да гэтага часу стаяць на Беларусі статуі злачынцаў, рукі якіх запэцканы крывёю мільёнаў нявінных ахвяр, то чаму не паставіць статуі Кірылу й Мяфодзію, якія акрамя дабра, нікому нічога дрэннага не зрабілі за сваё жыццё. Былі гэта людзі вялікай навукі, маралі й этыкі.

(„Наша Слова" № 46 (380), Менск, 25 лістапада 1998 г.)

Герархі Праваслаўнай царквы ў СССР

Жыццё й дзейнасць, ня толькі Праваслаўнай царквы, але ўсіх рэлігіяў у СССР знаходзяцца пад строгім наглядам і кантролем дзяржаўнага апарату.

Падчас рэвалюцыі 1917 году бальшавікі ў сваіх дэкларацыях абяцалі вялікія свабоды народам царскай імпэрыі, а ў тым ліку й свабоду веравызнаньня, што нават такое права знаходзім у савецкай канстытуцыі. Аднак у практычным жыцьці справа выглядае па сёньняшні дзень зусім інакш. У марксістоўскай сыстэме рэлігія ўважаецца як шкодная ідэалёгія. Свайго часу Ленін сказаў: „Рэлігія гэта опіюм народа" й з таго часу вядзецца сыстэматычны наступ на ўсе веравызнаньні ў СССР.

Ужо ў лютым 1918 году ўрад аддзяліў Царкву ад дзяржавы й асьветы, а яе маёмасьць сканфіскаваў.

Пачынаючы з 1922 году жорстка прасьледуецца духавенства й іх сем'і. Гэтыя людзі пазбаўлены былі ўсякіх правоў да нармальнага жыцьця, як харчы, адзеньне, памяшканьне, работа й асьвета. Мала гэтага, пачаўся арганізаваны атэістычны наступ на рэлігію, якім кіраваў Э. Яраслаўскі. Вынікам такой дзейнасьці маса духавенства была арыштавана, суджана, вывезена ў Сібір на пакуты, або адразу зьнішчана.

Каб увесьці большую дэзарганізацыю ўнутры Праваслаўнай царквы, урадавыя дзейнікі стаўлялі сьвецкіх людзей на пасты епіскапаў і змушалі сьвятароў падчыняцца ім.

Такія й падобныя падыходы да Праваслаўнай царквы, сьвятароў і вернікаў з часам прывялі да таго, што, як падае савецкая прэса ў 1937 годзе, з 454 сьвятыняў у Маскве за-

сталося толькі 25. У другіх большых гарадох СССР і гэтага не засталося. Сёньня ў Менску ўцалелі толькі дзьве царквы.

Як вядома са шматлікіх назіраньняў, разбурана або пераробленa на склады й т.п. тысячы сьвятыняў. Зьняважаны былі ня толькі гэтыя сьвятыя месцы, але абражаны годнасьць і значэньне самое веры.

Можна сказаць, што хрысьціянства асягнула блізка 2000-годзьдзе свайго існаваньня. За гэты пройдзены час яно шмат перанесла дзікіх прасьледаў, катаваньняў, забаронаў, насьмешак, пакутаў і т.п. Слабыя духам адзінкі ці групы хісталіся, трацілі веру й часта, так ці іначай, паддаваліся цёмным сілам спакусы, ды ішлі зь імі на супрацоўніцтва.

Падобныя зьявы мы наглядаем за свайго жыцьця ва Ўсходняй Беларусі пасьля Першай Сусьветнай вайны, а пасьля ў Заходняй Беларусі ў 1939-1941 гадох. Цяпер даведваемся з прэсы, радыё й другіх крыніцаў якімі гэта спосабамі й мэтадамі вядзецца ўсьцяж тая самая барацьба супраць рэлігіі ў СССР.

Усім вядома, што ўрад і партыя Савецкага Саюзу зьяўляюцца непрымірымымі ворагамі ўсякае рэлігіі. Але ўрад і партыя асабліва пасьля апошняй Сусьветнай вайны, каб паказаць за граніцай, што ў СССР існуе свабодная Праваслаўная царква, у сапраўднасьці выкарыстоўваюць яе дзеля сваіх палітычных махінацыяў у якасьці прапагандысцкага інструманту. Духоўныя асобы з паручэньня Крамля разьязджаюць па ўсім сьвеце й прапагандуюць за мяжой ідэі „міру", „супакою", „свабоды", „супрацоўніцтва" й таму падобнае.

Як даведваемся з прэсы, Маскоўскі патрыярхат у сваёй ляяльнасьці Крамлю зайшоў даволі далёка. У адным са сваіх пасланьняў патрыярх Пімен зьвяртаецца да праваслаўных вернікаў на эміграцыі з наказам што й як павінны яны рабіць, каб захаваць сваю веру..., але нічога не сказаў, што й як маюць рабіць праваслаўныя ў СССР, каб захаваць сваю веру... На гэтае пасланьне патрыярху быў А. Салжаніцыным дадзены адказ (1972 г.): „Всероссийскому Патриарху Пимену (Великопостное письмо)", якое на Захадзе выклікала сэнсацыю й камэнтарыі ды ня менш знайшло сваё адбіцьцё ў Маскве. У даным выпадку Салжаніцын меў поўную рацыю ў сваіх цьверджаньнях і гэта змусіла маскоўскага патрыярха запярэчыць, але яго падуладныя ўладыкі на эміграцыі, як міт-

рапаліт Антоні (Блюм) у Лёндане й архіепіскап Васіль (Крывашэйн) у Брусэлі адмовіліся гэтае зрабіць.

Таксама архіепіскап Піцірым у сваім інтэрв'ю зь некаторымі карэспадэнтамі выказаў дзіўныя погляды, якія яўна супярэчаць хрысьціянскай навуцы й маралі. Такія выказваньні архіепіскапа, як напрыклад, адказы карэспандэнту, што Праваслаўная царква ў СССР не займаецца дабрачыннай дзейнасьцю, таму што яна непатрэбная й не характэрная для Царквы ў сёньняшні час, бо гэтай работай займаецца дзяржава, якая й клапоціцца аб патрэбах жыхароў.

На пытаньне, чаму Праваслаўная царква у Расеі не займаецца навучаньнем рэлігіі, пачуўся адказ, што гэта было б духовым і маральным злоўжываньнем іхняга сумленьня й пэрсанальнасьці й т.п. Такія адказы ўладыкі яўна супярэчаць хрысьціянскай ідэі, што ёсьць сказана ў Сьвятым Пісаньні. І нічога дзіўнага, што зноў пачуліся крытычныя галасы сярод духавенства.

Праз даўжэйшы час у Маскоўскай патрыярхіі вядзецца стыхійная барацьба сярод ніжэйшага духавенства за чысьціню хрысьціянскай навукі й маралі. У імя праўды адзываюцца адважныя галасы, якія мужна выступаюць супраць фальшывых паводзін, нягледзячы скуль-бы яны не ішлі, яны стойка бароняць гонар свае праваслаўнае веры й Царквы, знаючы адначасна, што гэтым самым наражаюць сваё жыцьцё. Такіх людзей у Праваслаўнай царкве было многа. Яны найчасьцей „самі" адыходзілі на „адпачынак", ці то з поваду „хваробы", ці зь іншай прычыны, а ў сапраўднасьці за „не преклонивши колен перед Ваалам". Такімі якраз былі а. Н. Элішман, а. Якунін, арх. Ермаген, арх. Павал і многа, многа іншых...

Вяртаючыся зноў да выказваньняў архіепіскапа Піцірыма, мімаволі паўстае пытаньне: дзеля чаго й дзеля каго так гаворыць герарх Праваслаўнай царквы? Ды якое-ж тут у сапраўднасьці можа быць апраўданьне?! Ці-ж сьвет ня знае, што ў СССР дыктатура пралетарыяту адабрала ўсякую свабоду й годнасьць, ці то ў сэнсе рэлігійным, палітычным, нацыянальным, ці нават прыватным? Ці архіепіскап Піцірым да гэтага часу ня бачыць, якую татальную атэістычную прапаганду вядзе ўрад супраць Царквы? Было-б многа лепш,

каб уладыка прайшоў моўчкі каля такіх пытаньняў, калі не хацеў сказаць праўду.

Як падаюць радыё й прэса, у Арганізацыю Аб'яднаных Нацыяў надыходзяць нараканьні з камуністычных краін у сувязі з парушаньнем правоў чалавека. Дэлегацыі Галяндыі й Швэцыі злажылі Сацыяльнаму Камітэту ААН праект дакумента, на аснове якога можна было-б аформіць дэкларацыю ААН аб свабодзе чалавека й рэлігіі. У адказ на такую дэкларацыю свабоды чалавека й рэлігіі выступілі прадстаўнікі Беларусі й Балгарыі з Генэральнага Камітэту ААН па сацыяльных, гуманітарных і культурных пытаньнях з дамаганьнем адлажыць даную справу на неакрэсьлены час.

Нягледзячы нават на тое, што 2 жніўня 1975 году Леанід Брэжнеў падпісаў Акт аб пашане правоў чалавека, не прайшло два тыдні як 13 жніўня 1975 году была разбурана Богаяўленская царква ў Жытоміры. Ані шматлікія пісьмовыя просьбы, ані пратэсты, ані плач веруючых прыхаджан захаваць сваю сьвятыню не памаглі, аказаліся бясьсільнымі. Тут варта яшчэ раз прыпомніць „савецкую свабоду", гарантаваную канстытуцыяй СССР і Акт правоў чалавека, падпісаны Брэжневым.

Яшчэ адзін характэрны прыклад з дзейнасьці Праваслаўнай царквы на Беларусі мы знаходзім у газэце „Голас Радзімы":

„Наша Царква, жывучы ў згодзе з народам, заўсёды падтрымлівае ўсе мерапрыемствы ўрада, накіраваныя на ўзмацненьне міру. Ні адзін кангрэс, ні адна канфэрэнцыя не праходзяць без удзелу Рускай Праваслаўнай царквы.

Толькі за апошні час я пабываў у Швэйцарыі, ФРГ, Японіі, дзе на зьездах і канфэрэнцыях выступаў з дакладамі ў абароне міру, супраць атамнай і вадароднай зброі.

Мінск наведваюць многія зарубежныя царкоўныя дэлегацыі. Летам мы прынялі такую дэлегацыю са Злучаных Штатаў Амэрыкі. Паехалі ад нас яны з прыемнымі ўражаньнямі.

Беларуская Праваслаўная царква ўмацоўвае прэстыж Савецкай дзяржавы, усямерна падтрымлівае Савецкі фонд міру.

Яўгень Місіюк, протаіерэй Беларускай Праваслаўнай царквы".

Прачытаўшы такое асьведчаньне духоўнай асобы, без ніякага сумніву можна сказаць, што гэты чалавек у рызе зьяўляецца казённым работнікам прапагандысцкай сэкцыі. Аб царкоўных справах а. Місіюк, каб і хацеў, то нічога не на-

піша, бо работа сьвятара ў СССР сьцісла абмежавана толькі й выключна да літургіі й абрадаў у царкве й на гэтым канец. А нават, каб захацеў а. Місіюк ахрысьціць дзіця, пайсьці да хворага як сьвятар, ці на могілкі, то сьпярша трэба было-б зьвярнуцца за дазволам у гарсавет. Вось тут і „наша Царква, жывучы ў згодзе з народам..."

Ня трэба забываць і той добра вядомы факт, што ў СССР ворганы бясьпекі пільна сочаць за кожнай галінай дзейнасьці, ці то будзе спартовая, навуковая, ці культурная, літаратурная, а тым больш рэлігійная. У кожнай такой інстытуцыі на 8-12 асоб ёсьць „свой чалавек" — прадстаўнік ад КГБ, пастаўлены тайна наглядаць за дзейнасьцю й паводзінамі данай групоўкі й дакладаць свайму начальніку.

Таму зусім зразумела, што сярод духавенства таксама знаходзяцца адзінкі, даверaныя асобы КГБ, якія паступаюць згодна накінутай партыяй лініі. Усё гэта робіцца „для дабра народу", супраць ворагаў савецкай улады.

З гэтага ўсяго можна вынесьці такое заключэньне, што трагічная сытуацыя Праваслаўнай царквы ў СССР была прычынай блізкага супрацоўніцтва Маскоўскай патрыярхіі зь бязбожным камуністычным урадам. У іншых камуністычных дзяржавах царкоўныя ўлады сумелі забясьпечыць сабе правы на праводжаньне рэлігійнай дзейнасьці ў кананічным духу. Аднак Маскоўскі патрыярхат пайшоў па лініі найменшага супраціву, аддаючы духовыя, рэлігійныя й царкоўныя справы ў рукі атэістаў. Герархі Маскоўскай патрыярхіі ўважаюць зямное царства вышэй Нябеснага й нясуць большую адказнасьць перад бязбожным урадам, чым перад Богам.

(„Званіца" № 1 (4), Лёндан, 1976 г.)

„Хай будзе ўсё адно..."

Пад такім загалоўкам у часопісе „Беларуская мінуўшчына" (№ 4, 1994 г., стар. 33-36) сп. Сяргей Абламейка паказвае першынство папы рымскага, якому павінны падпарадкавацца ўсе хрысьціяне, а ў першую чаргу праваслаўныя.

Свой артыкул аўтар пачынае радкамі зь Евангельля ад Мацьвея: „І Я кажу: ты Пётр на камені гэтым Я збудую Царкву маю й брамы пякельныя не адолеюць яе, і дам клю-

чы Царства Нябеснага; і што зьвяжаш на зямлі, тое будзе развязана на нябёсах".

„Гэтыя ўрыўкі зь Евангельля, — піша С. Абламейка, — паводле якіх угрунтаваны прымат у Царкве першага епіскапа Рыма — апостала Пятра й ягоных наступнікаў. Урыўкі гэтыя не патрабуюць камэнтарыяў і гавораць самі за сябе. Аднак ужо больш за тысячу гадоў яны аспрэчваюцца ўсходняй галіной хрысьціянства, і гэта адна з прычын трагічнага падзелу Хрысьціянскай царквы".

На гэтым і асноўвае Сяргей Абламейка тэзіс прымату Рымскай царквы ў хрысьціячскім сьвеце. Хоць ён піша, што ўрыўкі гэтыя не патрабуюць камэнтарыяў, аднак я прывяду свае камэнтары. Шкада, што С. Абламейка паленаваўся гартануць пару лісткоў таго-ж Евангельля, дзе Ісус Хрыстос сказаў Пятру: „Адыдзі ад Мяне, сатана! ты спакуса, бо думаеш не пра тое, што Божае, а што чалавечае" (Мць. 16:23). А далей у Евангельлі чытаем, што Хрыстос, зьвяртаючыся не да аднаго Пятра, а да ўсіх апосталаў, кажа ім: „Праўду кажу вам, што вы зьвяжаце на зямлі, тое будзе зьвязана на небе; і што разьвяжаце на зямлі, тое будзе разьвязана на небе" (Мць. 18:18).

Як бачым, тут Хрыстос зраўняў рэшту апосталаў з Пятром, даючы ім аднолькавыя правы й аўтарытэт. Агульна прынята лічыць, што апошнія выказваньні Хрыста ёсьць важнейшыя за першыя, бо яны зьяўляюцца завяршэньнем думкі. І такой думкі быў сьвяты Аўгустын, які сказаў: „У сапраўднасьці гэта ня быў выбраны адзін чалавек, але ўся аб'яднаная царква, якая атрымала гэтыя ключы".

Калі Ісус Хрыстос назваў Пятра „каменем", на якім збудуе Царкву, то не было гэта сказана ў сэнсе асобы, бо Збавіцель меў на ўвазе веру, а не чалавека. Пасьля аб Пятру нічога не было чуваць і гэтым „каменем" аказаліся астатнія апосталы, якія зносілі прасьлед, мукі й сьмерць за будову Царквы Хрыстовай. Што праўда, апостал Пётр быў энэргічны, але не такі цьвёрды як „камень", бо калі арыштавалі Хрыста й павялі, то Пётр спалохаўся й тройчы адмовіўся ад Хрыста.

Калі ў сапраўднасьці гаварыць аб першынстве ў Хрысьціянскай царкве, то яно прыслугоўвае Ерусаліму. Там была заложана першая Царква асірацеўшымі апостамі й яе па-

трыярхі мелі больш прычын зваць сябе „намесьнікамі Хрыста", аднак гэтага не зрабілі. Таксама пакуль да Рыму, то ў Антыёхіі была заснавана Царква. І так хрысьціянства пашыралася з Усходу на Захад пакуль прыйшло ў Рым, а не з Рыму на Ўсход.

Хто залажыў Царкву ў Рыме мы ня знаем, але маглі гэта зрабіць гандляры, якія падарожнічалі, або палонныя жыды-хрысьціяне, якіх рымляне прывезлі ў Італію й было іх нямала ў Рыме. А хто быў з апосталаў у Рыме, то не для таго, каб там застацца на стала. Апосталы падарожнічалі, таму яны не маглі быць доўга на адным месцы, а Каталіцкая царква прыпісвае Пятру ажно 25 гадоў епіскапства ў Рыме.

Каб столькі гадоў жыў у Рыме Пётр, аб ім напэўна недзе нешта было-б запісана, а так нічога. Згадваецца ў Дзеяньнях Сьвятых Апосталаў прыезд у Рым апостала Паўла, яго спатканьні з жыдамі. І цяжка паверыць, каб апостал Пётр — епіскап Рымскай царквы, як гэта вучыць Каталіцкая царква, не прыйшоў прывітаць Паўла, які прыехаў у Рым і быў два гады. Адказ на гэта зусім просты й зразумелы — не прыйшоў Пётр, бо яго не было ў Рыме.

Што праўда, традыцыйна Рымская царква займала першынство, але гэта таму, што Рым зьяўляўся сталіцай імпэрыі й меў добрыя шляхі камунікацыі, ад чаго засталася пагаворка: „Усе дарогі вядуць у Рым". Але пачынаючы з канца III стагодзьдзя Рым не займаў тае пазіцыі, якую займаў папярэднія стагодзьдзі. Цэнтр сьвету Міжземнага мора перасунуўся на ўсход, калі імпэратары Рымскай імпэрыі не засядалі больш у Рыме, а сьпярша ў Нікамэдыі, а пасьля ў Канстантынопалі.

Усё-ж Рым, каб даказаць слушнасьць прысутнасьці апостала Пятра ў Рыме і быццам яго магіла знаходзіцца пад алтаром ватыканскай базылікі, то ў 1940 годзе пачаліся раскопкі й вяліся яны да 1949 году. Мала што аб іх гаварылася акрамя афіцыйных камунікатаў. Была гэта, быццам, сакрэтная й няпэўная работа. Толькі пазьней на тэму раскопак былі выдадзены кніжкі й згаданы некаторыя факты. Многа што скрывалася каталіцкай герархіяй, але вядома, што сярод касьцей, якія знайшлі пад алтаром, былі косьці двух мужчын, жанчыны, розных дамашніх жывёл і манэты з X стагодзьдзя. Ватыкан не дазваляў ніякіх публікацыяў

пра раскопкі, нават сваім духоўным. Але 13 траўня 1942 году папа Пій XII паведаміў па радыё, што косьці першага біскупа Рыму былі знойдзены. Аднак ня ўсе ў гэта паверылі, нават тыя, што стаялі блізка Ватыкану. Як прыклад, ня так даўно, у 1991 годзе, выдадзены кардыналам Пупарам даведнік па Рыме згадвае, што „навуковы досьлед знойдзеных пад фундамантам Чырвонай сьцяны людзкіх астанкаў не паказалі якіх-небудзь адносін да апостала Пятра". А ў пазьнейшым выданьні даведніка па Рыме, у тым-жа 1991 годзе, гэтая фраза зьнікла й была заменена новай: „Несумненны факт: Пётр у саборы Пятра".

Аб некаторых рэчах, як косьці мышы, косьці жанчыны й манэты X стагодзьдзя, знойдзеныя пад алтаром базылікі, то на іх знаходку быў дадзены няпоўны адказ: мыш зрабіла нару, далезла да рэліквіяў сьв. Пятра, але назад не магла выбрацца. Манэта з X стагодзьдзя дасталася да рэліквіяў свь. Пятра праз шчыліну ў падлозе базылікі. А як папалі косьці жанчыны, то тут ня так лёгка адказаць.

Зьвесткі пра раскопкі пад алтаром базылікі цікавыя, асабліва досьледы прафэсара Корэнці, але гэта другая тэма.

Гаворыць С. Абламейка й аб некаторых візантыйскіх імпэратарах як гэрэтыках, а падкрэсьлівае сьвятасьць рымскіх папаў. Не бяруся абараняць візантыйскіх імпэратараў, але раю паважанаму Сяргею Абламейку прачытаць біяграфіі рымскіх папаў, толькі не ватыканскага выданьня, але любую энцыкляпэдыю аб'ектыўных аўтараў на Захадзе. Вось колькі там будзе гэрэзіі, сімоніі, забойстваў, пракляцьцяў, калатнечы за папскі трон, распусты й другой „сьвятасьці" сярод „намесьнікаў" сьвятога Пятра.

А што да першых апосталаў славян — Канстанціна (Кірылы) і Мяфодзія, то з браку месца я ня буду тут расьпісвацца. Хто цікавіцца імі, можа прачытаць мой артыкул „Архіепіскап Мяфодзій і і ягоная дзейнасьць". Там ня ўсё сказана пра маладыя гады гэтых выдатных апосталаў Усходняй царквы, якія несьлі славянам сапраўдную навуку Хрыста, непадобна папскім езуітам, аб якіх і сёньня гаворыць увесь сьвет як аб праступніках.

Праўда, што епіскап Рыму Адрыян II пасьвяціў славянскія кніжкі й ўмясьціў іх на алтарох. Але што было да Ад-

рыяна й па Адрыяне? Адна ластаўка не сьведчыць аб вясьне. Славянская мова трактавалася рымскімі папамі як „варварская" й на ёй забаранілі служыць літургію ў юрысдыкцыі рымскага папы. І не прайшло многа часу як архіепіскапу Мяфодзію забаранілі служыць на славянскай мове, а яго вучняў, пасьля яго сьмерці, кінулі ў турму ды прадавалі ў рабства ў Вэнэцыі. І так Рымская царква душыла сваіх вернікаў незразумелай лацінай аж да нашага часу.

Згадваецца й канстантынопальскі патрыярх Ян Златавусны (397-407), які быццам стаяў па баку папы. Трэба памятаць, што ў той час аж да 1054 году не было царкоўнага разьбіцьця паміж Канстантынопалем і Рымам, былі толькі непаразуменьні як унутры Канстантынопальскай, так і Рымскай цэркваў. Але нельга залічаць Яна Златавуснага да вялікіх прыхільнікаў папаў. Калі Ян Златавусны пачуў, што готы сьпяваюць рэлігійныя песьні на сваёй роднай мове, то ад радасьці даў ім царкву на ўскраіне горада, каб маліліся на сваёй роднай мове. А ці нешта падобнае зрабілі калі рымскія папы? Колькі стагодзьдзяў прайшло пакуль яны схамянуліся?! Праўду пісаў ангельскі гісторык Г. А. Фішэр, што „раньнія папы былі ў большасьці людзі цёмныя. Не былі філёзафамі. Не далі яны ніякага ўкладу ў разьвіцьцё царкоўнай дактрыны. (...) Калі часам папа й паказаў сваю здольнасьць, то была яна ў сферы адміністрацыйнай, а не рэлігійнай" („А Гісторы оф Юрэп", Лёндан 1965, стар. 171).

І яшчэ С. Абламейка хоча прадставіць нам папу Інакента III як вялікага абаронцу хрысьціян супраць туркаў. Быў гэта папа, з блаславенства якога крыжаносцы захапілі Канстантынопаль. Аграбілі яны горад і, мала таго, зьняважылі праваслаўны храм сьв. Сафіі. Нечага падобнага не зрабіў нават варвар Алярык, які ў 410 годзе ўварваўся ў Рым і тры дні рабаваў горад, але не пераступіў парог сьвятыні. Падобна зрабіў султан Саладын, калі адабраў ад крыжаносцаў Ерусалім у 1187 годзе. Нягледзячы на злачынствы лаціньнікаў у гэтым горадзе ў 1099 годзе, якія хадзілі па калені ў людзкой крыві, ня толькі што ня зьнішчыў сьвятое месца хрыцьціян, не абразіў яго, а захаваў у пашане. Візантыйскі храніст пісаў: „Нават сарацыны ёсьць добрыя й міласьцівыя ў параўнаньні з тымі істотамі, якія носяць крыж Хрыста па плячуку".

Гэты-ж папа Інакент паклікаў тых-жа сваіх крыжаносцаў разбойнікаў-забойцаў на ўспакаеньне „катараў" (чыстых у веры) і вальдэнцаў, лідэрам якіх быў Вальдо ці Вальдэс, якія не хацелі падпарадкавацца ўладзе рымскага папы. Былі гэта прававерныя хрысьціяне паўднёвай Францыі, якія хацелі захаваць чысьціню свае веры, але рымскі папа чысьціў людзкія душы мячом. Пасьля аднаго крыжовавага паходу супраць „гэрэтыкаў" (22 ліпеня 1209 г.), яго кіраўнік, папскі прадстаўнік, даў такую справаздачу свайму гаспадару ў Рыме: „Блізка дваццаць тысяч грамадзян былі аддадзены пад меч, не зважаючы на век і пол". Калі ў некаторых гарадах крыжакі ня ведалі хто ёсьць прыхільнікам папы, а хто не, дык папа казаў: „Бі ўсіх, а Бог сам распазнае сваіх сярод забітых". Гэты-ж Інакент III прадставіў сфальшаваныя дакумэнты цэзара Генрыка IV, які меў быццам перадаць частку краіны папу. У 1215 годзе склікаў ён чацьвёрты Латэранскі сабор, на якім была ажыцьцёўлена інквізыцыя. І толькі ў XIX стагодзьдзі была яна зьнесена. Захаваньне папы Інакента III было такое, што нават некаторыя католікі гаварылі: „Каб жылі яшчэ апосталы Пётр і Павал, напэўна былі-б спалены на кастры".

Інакент III (1198-1216) Каталіцкай царквой лічыцца адным з найбольш магутных папаў, ініцыятарам увядзеньня інквізыцыі. Аб папскай уладзе Інакент пісаў, што яна ёсьць падобная на сонца, а імпэратарская — да месяца, які сьвеціць праз адбіцьцё сьвятла сонца.

Рымскія папы прэтэндавалі ня толькі на галоўную царкоўную ўладу, але й на сьвецкую. Довадам гэтага маецца „Дар Канстанціна", які зроблены быў, быццам, для папы Сыльвэстра I (памёр у 335 г.). У гэтым „дары" імпэратар, быццам, перадаў заходнюю частку імпэрыі папу. І ад папы Сыльвэстра I, да папы Рыгора II (памёр у 731 г.) папскай канцылярыяй зроблена было 35 фальсыфікатаў, якія галоўным чынам прыпісвалі раньні аўтарытэт папу, ягоную супрэмацыю як насьледніка сьвятога Пятра.

Пазьнейшыя фальсыфікаты Рымскай царквы — гэта так званыя „Дэкрэталіі", пісаныя на грэцкай і лацінскай мовах, якія паўсталі ў 847-852 гадох і ўмацоўвалі ўладу папаў. І ніхто іншы, а толькі каталіцкі ксёндзь В. Вальля раскрыў у XV стагодзьдзі падробкі папскай канцылярыі.

Сяргей Абламайка згадвае Ферара-Флярэнційскую (1439) і Берасьцейскую (1596) вуніі, толькі ня піша як дайшло да іх заключэньня. Ці былі яны сапраўды выяўленьнем добрай волі з боку праваслаўных вернікаў, ці былі накінуты палітычнымі абставінамі, дзе прымалі ўдзел імпэратар, кароль, езуіты й каталіцкія ксяндзы. Але гэта абшырныя тэмы.

Гэта яшчэ далёка ня ўсё, што я хацеў напісаць. З браку месца ў часопісе нельга даць поўны адказ на ўсе закранутыя пытаньні. Аднак гісторыя рымскіх папаў — „насьледнікаў сьв. апостала Пятра" ня ёсьць такая ружовая, як гэта хочацца прадставіць сп. Абламейку. Свой артыкул ён заканчвае так: „Гэты сьціплы пералік гістарычных фактаў прыведзеных тут адно каб паказаць, што побач зь незьяднанымі праваслаўнымі ў Беларусі маюць права існаваць і іх зьяднаныя праваслаўныя браты — вуніяты".

Калі ідзе пра вуніятаў, то гэта сэктанты й у сёньняшняй дэмакратычнай сыстэме ніхто не забараняе ніякай сэкце праводзіць сваю агітацыю. Але чаму вуніяты скіравалі свой позірк на праваслаўных, а асабліва сп. Абламейка? Чаму яны нічога не гавораць аб пратэстантах, каб вярнуць іх да Рыму, якія ў час Рэфармацыі адышлі ад Рымскай царквы, каб ня мець дачыненьня зь яе папамі.

Беларускія вуніяты выдаюць сябе за вялікіх беларускіх патрыётаў. Калі яны такія вялікія патрыёты свае краіны, то чаму яны ня хочуць вярнуць беларусаў-каталікаў, якія раней былі вуніятамі, а пасьля сталіся каталікамі-палякамі? Гэтага яны ня будуць рабіць таму, што яны зьяўляюцца платнымі агентамі Ватыкану. Вядома, што каталікі, вуніяты, праваслаўныя й члены хрысьціянскіх сэктаў вераць у аднаго Бога. То які сэнс мяняць веру? Робяць гэты гандаль рэлігіяй людзі за грошы й дзеля лепшага асабістага жыцьця, лепшых выгадаў.

Бяда, калі нехта не разьбіраецца ў рэлігійных справах, а глядзіць аднабакова. Каталіцкая царква на Беларусі, са сваёю вуніяцкай прыбудоўкай ніколі ня выказала свае сапраўднай хрысьціянскай місіі. Была яна інструмантам старой польскай палітыкі паходу на Ўсход. Хоць сёньня каталіцызм на Беларусі адраджаецца з маленькім беларускім акцэнтам, то для такой слабой беларускай дзяржавы

ён можа аказацца ў недалёкай будучыні трагедыяй. Засылка польскіх ксяндзоў на Беларусь і іхняя дзейнасьць няраз згадвалася ў беларускай прэсе. Беларусы павінны памятаць, што польскія ксяндзы зьяўляюцца на Беларусі большымі польскімі патрыётамі, чым слугамі Бога. А вуніяты сядзяць цэлы час на пайку Ватыкану й выконваюць яго загады.

„Энцыклапедыя гісторыі Беларусі" (том 2, стар. 98) піша аб вуніі такую вось навінку: „За межамі Беларусі налічваецца каля 5 тыс. вуніятаў-беларусаў (у Лёндане, Парыжы, ЗША, Бэльгіі, Германіі)". Як дзе, а ў Лёндане іх можна палічыць на пальцах аднае рукі.

(„Голас Часу" № 36 (3), Лёндан, 1995 г.)

Каляды на Беларусі

У жыцьці беларусаў Каляды належаць да ліку самых старажытных сьвятаў. Пэўныя гістарычныя крыніцы цьвердзяць, што старое й сымбалічнае сьвята Каляд у далёкай мінуўшчыне беларусы сьвяткавалі ў гонар багоў-сонца Хорса й Дажджбога. Гэта значыць у той час, калі сонца падымалася вышэй і дзень перамагаў ноч. Аднак этнолягі й гісторыкі не даюць дакладнага адказу ні аб паходжаньні гэтага сьвята, ні аб значэньні самога слова.

Старое паганскае сьвята бога-сонца якраз зьлілося з хрысьціянскім сьвятам нараджэньня Хрыста. У шырокіх народных масах паганскія элемэнты калядных традыцыяў настолькі моцныя, што розныя абраднасьці, забабоны захаваліся аж да нашага часу.

Для беларускага селяніна сьвята Каляд было быццам нейкім цэнтрам, якога ён трымаўся неадкладна. Акрамя Каляд было другое сьвята — Купала. Гэтыя два сьвяты служылі беларускаму селяніну за каляндар для вылічэньня яго важнейшых дамашне-гаспадарчых датаў у годзе. Ад Каляд да Купалы 26 нядзель і ад Купалы да Каляд таксама 26 нядзель. Напрыклад, беларускі селянін гаварыў так: „Маня радзілася якраз тыдзень да Каляд". Гэта значыць на Новы год, па новаму стылю. Такім самым спосабам ён адзначаў усе сямейныя й гаспадарчыя падзеі.

Аб важнасьці й значэньні Каляд у беларускім народзе можна назіраць з духовага й гаспадарчага прыгатаваньняў. Ужо ад Піліпаўкі людзі пачыналі пасьціць. Розныя гульні й вечарыны на гэты час перастаўлялі існаваць. Добры гаспадар загадзя пачынаў падкормліваць парсюка, каб мець на сьвяты сьвяжыну.

Таксама й гаспадарка павінна быць прыгатавана, каб у часе сьвятых вечароў (ад 25 сьнежня да 6 студзеня) не рабіць пэўных работаў, як сячы, рэзаць, вязаць, вышываць і т.п. Наогул у гэтым часе людзі асьцерагаліся нешчасьлівых выпадкаў, каб не псаваць сьвяточнага настрою.

Дзень перад Калядамі бялілі печы, мылі сталы, лавы, падлогу, завешвалі новыя фіранкі, расьсьцілалі абрусы, ручнікі. Хата прымала сьвежы сьвяточны выгляд. У гэты дзень абеду не было, усе былі заняты дамашняй работай, а пад вечар ішлі ў лазьню, або мыліся дома.

Вечарам, калі паказалася першая зорка на небе, гаспадар прыносіў пучок сена, раскладаў яго на стале й покуці. Стол засьцілаўся чыстым белым абрусом, а на покуці ставіўся гаршчок з куцьцёю. Вечарам ішлі ўсе ў царкву на вячэрню. Пасьля вячэрні прыходзілі дамоў, запальвалі сьвечкі на ялінцы й саджаліся за стол паводле сямейнай герархіі. Гаспадар браў куцьцю з покуці, даваў яе ўсім і адначасна складаў пажаданьні: „Дзякаваць Богу, што дачакаліся Каляд, дай Божа гэтыя правесьці й наступных дачакаць..."

Куцьця складалася з посных страваў: аладкі, церты мак зь мёдам, селядцы, сушаныя грыбы, аўсяны кісель і кампот. Часам была й чарка гарэлкі. Пасьля куцьці адбываліся розныя гаданьні, асабліва варажылі дзяўчаты: ці выйдуць замуж, за каго й калі?

Пасьля цяжкой цэладзённай працы, прысмакаў куцьці й столькіх забаўных прыемнасьцяў сон змрочваў вочы й уся сям'я даволі позна ішла адпачываць, каб заўтра сьвяточна спаткаць доўгачаканыя Каляды.

На першы дзень Каляд, зазвычай папаўдні пасьля абедні ў царкве, зьяўляліся калядоўшчыкі са зьвяздою, сьпевамі, скокамі, жартамі, пажаданьнямі й з прыбраным мядзьведзем, казой і т.п. Распачыналася мастацкая частка, якая мела ў сабе нешта сцэнічнае, арыгінальнае, што вабіла сва-

ім чароўным характарам і зьнешнім выглядам, якое дайшло да нас праз доўгія стагодзьдзі.

Спакон вякоў у славянаў „каза" й „зьвязда" служылі сымбалямі ўраджаю й шчасьця, аб чым нагадвае песьня:

Дзе каза рогам, там жыта стогам. Дзе каза нагой, там жыта капой. Дзе каза хвастом, там жыта кустом.

Немагчыма апісаць усе калядныя звычаі й абрады, калі гэтае сьвята сягае тысячы гадоў.

Да абраду калядных сьвят належаць яшчэ Новы год і Вадохрышчы. Гэтыя два сьвяты маюць таксама сваю багатую традыцыю, якая бытавала сярод беларускага насельніцтва й прыдавала большы зьмест і сэнс нашаму каляднаму абраду.

Галоўнай мэтай гэтых абрадавых звычаяў зьяўлялася шчырае жаданьне ў наступным новым годзе: шчасьця, добрага здароўя, посьпехаў у жыцьці гаспадара й яго сям'і, багатага ўраджаю на полі й вялікага прыплоду ў гаспадарцы.

Аднак трэба заўважыць, што набытыя правы жыцьця (традыцыі), глыбока закараніліся ў жыцьці беларускага народу, ператрывалі ўсе жыцьцёвыя завірухі, крыху зьмянілі форму, але захавалі выразны зьмест.

Шматвяковая гісторыя й досьледы паказалі, што характэрнай рысай беларускага народу была традыцыя. Царская газэта „Правительственный Вестник" канца XIX стагодзьдзя, якая выражала дзяржаўныя погляды, пісала: „У беларусаў больш, як у якога іншага славянскага племя, захавалася ўсякага роду забабонаў з паўхрысьціянскім і паўпаганскім характарам".

Падобна пісаў расейскі навуковец П. Бяссонаў: „Беларусь захавала ў абрадзе ўрачыстасьць і ў песьнях суправаджала адгалоскі сівой старыны, як нідзе ў славян".

Мінула ўжо больш за 30 гадоў, як беларуская эміграцыя праводзіць свае калядныя сьвяты ў далёкіх і чужых краінах. Шмат каму ў часе сьвятой вячэры-куцьці ажывуць думкі-вобразы мінулага, як гэта было дома, сэрца напоўніцца жалем, а сум па сваіх блізкіх і знаёмых, якія засталіся дома, або адышлі на вечны супакой, пакрые аблічча.

Але разважыўшы ўважна нашае становішча й прыгледзеўшыся бліжэй самому сьвяту Каляд, знойдзем у гэтай традыцыі невычарпальную крыніцу надзеі, падтрыманьня на духу, упэўненасьць у прышласьць і сувязь з родным краем.

Прыйшоў на зямлю Сын Божы ад Дзевы Марыі, як звычайны чалавек, каб разам зь людзьмі перажыць іх жыцьцё, перацярпець іх цярпеньні, ды паказаць зьняволенаму людзтву дарогу да збаўленьня.

Даведаўшыся аб нараджэньні Хрыста, валадар Палестыны Ірад Ідумеец мабілізуе ўсе свае сілы, каб зьнішчыць Нованароджанага. У сваім забойчым пляне ён прымае розныя подступы й хітрасьці, а калі й гэта яму не ўдаецца, адважваецца даць загад выразаць усіх дзяцей-хлапцоў у Віфляеме й ваколіцы. Аднак земскія бацькі Хрыста загадзя ўцякаюць у Егіпет і Хрыстос застаецца жыць да часу на выгнаньні.

Уцёк Ісус Хрыстос у Егіпет на тое, каб пасьля вярнуцца ў Палестыну й прапаведаваць сваю навуку Слова Божага. І мы, беларускія ўцекачы, пакінулі сваю дарагую Бацькаўшчыну на тое, каб пасьля вярнуцца да яе вольнай і ў духу хрысьціянскім свабодна вызнаваць веру й традыцыі нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў.

(„Званіца" № 1 (4), Лёндан, 1976 г.)

Якому Богу маліцца?

Калі справа аб рэлігіях, дык яны гэткія самыя старыя, як і чалавек. Археолягі знайшлі ня толькі косьці чалавека, але й нешта, што сьведчыла аб спосабе ягонага матэрыяльнага й духовага жыцьця ў той далёкі час, калі ён яшчэ ня знаў пісьма, а ў нешта верыў.

Мы згадаем тут пяць рэлігіяў, якія ў нашым стагодзьдзі выступаюць як найбольш пашыраныя. Кожная зь іх мае нешта супольнае зь іншымі рэлігіямі, але пра тое не ўспамімае. Назоў „рэлігія" паходзіць ад лацінскага слова „рэлігарэ", што значыць: быць да нечага забавязаным, у нешта верыць.

Вядома зь Бібліі, што Бог наказаў Аўрааму (Аўраму) пакінуць свой дом у горадзе Ур, над ракой Еўфратам, і разам з раднёю й маёмасьцю йсьці ў Абяцаную зямлю. Гэтай зямлёю мела быць краіна Ханаан (Палестына) у адлегласьці нейкіх 920 кілямэтраў. Аўраам ішоў па ўказаньнях Бога, як тое ёсьць запісана ў Бібліі (Быціе 12:1-3).

Бог выбраў Аўраама, які паходзіў зь мясцовасьці, што лічылася калыскай цывілізацыі, у сёньняшнім Іраку, за

патрыярха жыдоўскага народу за ягоную вернасьць Яму. Толькі мы ня знаем, якім чынам Аўраам пакінуў ідалапаклонства й пачаў верыць у сапраўднага Бога — Ягвэ (каля 1900 году да н. э.). Рэшта народаў тагачаснага сьвету верыла розным стварэньням і ім пакланялася.

Так жыдоўскае сэміцкае племя, якое мала чым розьнілася ад іншых тагачасных плямёнаў, сталася выбраным народам Бога. Але абяцаная Аўрааму й ягоным нашчадкам Ханаанская зямля лёгка ме далася. На ейнай поўначы мелі свае незалежныя дзяржавы ханааніты, адну зь іх грэкі называлі Фінікіяй (сучасны Ліван). Пакінуўшы горад Ур, жыды доўга блукалі, шукаючы месца для пастою. Іх два разы наведаў голад, і яны пайшлі ў Егіпет, аселі там на пару стагодзьдзяў і добра абжыліся. Другім разам іх вёў у Абяцаную зямлю Майсей. Але Бог не судзіў Майсею ўвайсьці ў Абяцаную зямлю: ён бачыў яе з гары Сынай, дзе памёр. Калі жыды прыйшлі ў Ханаан (каля 1100 гадоў да н.э.), ім было наказана ня мець кантактаў з рэлігіяй хананаітаў, а сьцерці яе з паверхні зямлі. Так што за гэтую зямлю трэба было ваяваць тады й цяпер. Гісторыя жыдоўскага народу запісаная сьлязьмі й крывёю.

У Торы, якую традыцыйна называюць Пяцікніжжам Майсея, запісана як маюць жыць і захоўваць сваю абраднасьць жыды. Галоўным месцам маленьня жыдоў зьяўляецца сынагога. Была яна адначасна школаю для дзяцей, шпіталем для хворых і месцам адпачынку для жыдоўскіх падарожнікаў і гандляроў.

Пасьля стагодзьдзяў перасьледу й ганеньняў хрысціянамі жыдоў, апошнія пабачылі, што адзіным збаўленьнем ад усіх гэтых зьдзекаў можа быць свая незалежная дзяржава. Такая ідэя сталася нараджэньнем у 1897 годзе сіянізму, жыдоўскага палітычнага руху, які вёў сярод жыдоў прапаганду за вяртаньне іх у Палестыну на сваю Абяцаную зямлю. А гітлераўская палітыка, якая зьнішчыла 6 мільёнаў жыдоў у часе апошняй вайны, прысьпешыла заснаваньне жыдоўскай дзяржавы пасьля вайны, якая прыняла назоў Ізраіль. Сёньня на сьвеце налічваецца 13 мільёнаў жыдоў: 6 мільёнаў у ЗША, 3 — у Ізраілі й рэшта расьцярушаная па ўсім сьвеце.

Аднак Ісус Хрыстос вучыў, што ўсе людзі перад Богам роўныя. З гэтым не хацелі пагадзіцца жыды й дабіліся ад рымскага адміністратара Палестыны, Пілата, сьмяротнага пакараньня Хрыста. Ісус Хрыстос быў укрыжаваны рымлянамі, але Яго навука не памерла зь Ім, яе пашырылі вучні Хрыста, апосталы. Аднак праз наступныя тры стагодзьдзі хрысьціянская вера была прасьледаваная рымскімі ўладамі, жыдамі й паганцамі аж да часу Канстанціна Вялікага (305-337), які зрабіў хрысьціянства дзяржаўнай рэлігіяй імпэрыі. З часам хрысьціянства пачало выступаць у шмат якіх формах на сьвеце, таму ня ёсьць так лёгка й так проста ўсё гэта паказаць. Месцам маленьня хрысьціянаў зьяўляецца царква, хоць можна ім маліцца ўсюды. У сваёй аснове царква мае некаторыя жыдоўскія традыцыі, бо-ж Ісус Хрыстос і першыя хрысьціяне былі жыдамі.

У сёмым стагодзьдзі Магамэт (570-632) залажыў у Арабіі сваю рэлігію. Ён узяў сёе-тое з жыдоўскай і хрысьціянскай рэлігіяў у сваю веру. Вера Магамэта прымітыўная, ня мае сьвятароў, ня мае вялікай абраднасьці, ня мае пасрэднікаў паміж Богам і чалавекам — і таму зразумелая кожнаму арабу. Але за тое ёсьць гэтая вера ваяўнічая й запісаная ў Каране. Арабы несьлі ў адной руцэ меч, а ў другой — Каран і казалі, што таму, хто памрэ ў баі за веру Магамэта, будзе царства нябеснае, бо Бог з ваюючымі. Рэлігія Магамэта мела посьпех дзякуючы арабскай экспансіі, якая ад 711 году расьцягвалася ад Гібральтару да Афганістану. І хоць арабы гаварылі, што Магамэт аб'яднаў іх сваёй верай, але з часам вера яго падзялілася на сэкты. Галоўныя зь іх дзьве: суніты й шыіты, лідары якіх вядуць барацьбу за ўладу. Месцам маленьня магамэтанаў зьяўляецца мячэт. Першы мячэт пабудаваны быў на тым месцы, дзе стаяў вярблюд Магамэта, калі ён у 622 годзе ўехаў у горад Мэдыну.

Акрамя юдаізму, хрысьціянства й ісламу (што значыць падпарадкавацца волі Божай) маем яшчэ індуізм і будызм. Паводле даных з 1982 году на зямлі жыве 4,8 мільярда людзей. Зь іх 1,4 мільярда хрысьціянаў, 723 мільёны мусульманаў, 583 мільёны індуістаў і 274 мільёны будыстаў. Але Энцыкляпэдыя Макмільляна за 1982 год падае індуістаў каля 400 мільёнаў, а будыстаў больш за 500 мільёнаў.

Гісторыя індуізму ёсць такая-ж старая, як і гісторыя Індыі. Ейную рэлігійную гісторыю называюць „гінду". Ёсць гэта пэрсідзка-арабскае слова, якое азначае індыйцаў. Індуізм ня мае свайго закладчыка або прарока, як хрысьціянства, будызм ці іслам. Нарадзілася гэтая вера са старажытнай абраднасьці, звычаяў, сагаў, сьвяшчэннай літаратуры індыйцаў і мае за сабою пяцітысячагадовую даўнасьць. Таму такая традыцыйная рэлігія не ўяўляе ніякае небясьпекі для іншых рэлігіяў, хоць апошмім часам паўстаюць школы для дзяцей, дзе прапагандуюцца думкі індуізму. Паводле індуісцкай традыцыі найлепшымі месцамі іхняга маленьня зьяўляюцца сьвятыя плошчы, берагі рэчак, пячоры, горы, лясы й г.д. Як бачым, улоньне натуры зьяўляецца сьвятасьцю Індыі. У натуры індыйцы знаходзяць сэнс жыцьця й аддаюць ёй сваю пашану. Маюць індыйцы й сьвятых кароў, і свае сьвятыні — але ня ўсе яны ходзяць туды, бо трымаюцца сваёй адметнай традыцыі. Згодна індыйскай канстытуцыі 1951 году ўсе сьвятыні Індыі адкрытыя для кожнага. Былы індыйскі прэзыдэнт Радгакрышнан сказаў аднойчы: „Індуізм ёсьць больш культурай, як верай". Агульна можна сказаць, што індуізм уяўляе сабою фэдэрацыю культураў, звычаяў, ідэяў і духовай асьпірацыі.

У 1947 годзе Індыя была падзелена. Большасьць ейнага насельніцтва, гінду, засталася ў Індыі, а ў Пакістане, дзе жылі пераважна мусульмане, утварылася асобная дзяржава.

За дзяржаўную незалежнасьць Індыі ад Англіі змагаўся Махандас Гандзі. Але ён змагаўся мірным спосабам, дыпляматычна й выступаў супраць гвалту й праліцьця крыві. Для Ганьдзі праўда была Богам. У студзені 1948 году яго забіў фанатычны індыец, які асудзіў Гандзі за згодніцтва з мусульманамі.

Будызм быў закладзены індыйскім прынцам Сідхартхам Гаўтама ў VI ст. н. э., якога пазьней пачалі называць Будам, што мае азначаць добрыя ўчынкі, навуку. Буда здаваў сабе справу, як гэта будзе яму цяжка здабыць давер людзей і павесьці іх за сабою. Тады адзін зь вялікіх індыйскіх багоў, Брахма, як падае гісторыя, сказаў Буду вучыць людзей Праўды. І праз такія добрыя ўчынкі прапагандавалася Праўда й Дактрыны будызму, які ёсьць аснаваны на чыста мараль-

ных ідэях. Маюцца гэткія павучэньні ў веры Буды: асьцерагайся, каб не зрабіць крыўду іншаму; асьцерагайся браць тое, што табе не дадзена; асьцерагайся алькагольных напіткаў і наркотыкаў. Калі ты п'еш алькаголь і бярэш наркотыкі, ты ня можаш думаць сьвядома. Гэта асноўныя наказы для людзей, якія хочуць насьледаваць будызм. Навука Буды заключаецца больш на практыцы, як на тэорыі. У сьвятынях будыстаў няма мэбляў — толькі плятформа для прапаведнікаў, адна або больш вялікіх статуяў Буды. Традыцыйна будысты сядзяць на падлозе або на дыванчыках ці падушках. Рэлігійную абраднасьць выконваюць манахі, а людзі глядзяць і слухаюць. Будызм пашырыўся па ўсёй Паўднёвай Азіі, але стагодзьдзі пазьней яго выціснуў іслам, які насунуўся з Усходняга Туркестану й Інданэзыйскіх астравоў.

Падобна й хрысьціянская вера вучыць маралі, пашанаваньня годнасьці чалавека, любові бліжняга й нават ворага. Але хрысьціянства найбольш разьбітае на розныя рэлігіі, сэкты й пасваранае між сабою. Ужо ў II ст. сярод хрысьціянаў наглядаецца раскол. Дзеля захаваньня рэлігійнай еднасьці й згоды першы хрысьціянскі імпэратар Канстанцін Вялікі склікаў у 325 годзе сабор епіскапаў у Нікеі. І хоць на саборы былі прынятыя важныя царкоўныя дактрыны, але згоды пасьля сабору ў хрысьціянскім сьвеце не атрымалася.

Вялікім няшчасьцем для Праваслаўнай царквы ў Канстантынопалі была варожасьць і зайздрасьць рымскіх папаў. Калі крыжаносцы ехалі на вызваленьне Сьвятой Зямлі ад туркаў-мусульманаў, яны неспадзявана зьмянілі свой плян і збройна напалі на Канстантынопаль у 204 годзе. Абрабавалі горад, зьняважылі катэдру Сьвятой Сафіі й устанавілі сваю ўладу. Як раней, так і пазьней, крыжовыя паходы, інсьпіраваныя рымскімі папамі, не асягнулі свае мэты, а прынесьлі як сабе, гэтак і іншым краінам матэрыяльныя й людзкія страты.

Маецца й Трыццацігадовая вайна (1618-1648) у Заходняй Эўропе паміж каталікамі й пратэстантамі. Увогуле, заходняя Каталіцкая царква замнога мяшалася й мяшаецца ў розныя палітычныя, рэлігійныя, дзяржаўныя справы розных краінаў і замест таго, каб аб'ектыўна глядзець на справу, падтрымоўвае той ці іншы варагуючы бок. Таму хрысь-

ціянства ня можа стрымаць варожасьці й нянавісьці сярод народаў сьвету. Гэта не сакрэт, што як і раней, так і пасьля Другой Сусьветнай вайны ва ўсіх міжнародных канфліктах былі замешаныя рэлігіі. За кулісамі в'етнамскай вайны працавалі будысты й каталікі. Канфлікт паміж Пакістанам і Індыяй — гэта варожасьць і вайна мусульманаў зь індуізмам. На Сярэднім Усходзе мусульмане, юдэі й хрысьціяне некалькі разоў пачыналі вайну й дагэтуль там няма спакою. У 1974 годзе туркі збройна напалі на востраў Кіпр, падзяліўшы яго паміж мусульманскай Турцыяй і праваслаўнай Грэцыяй.Таксама працягваецца вайна мусульманаў з хрысьціянамі паміж Эфіопіяй і Эрытрэяй у Афрыцы. Рэлігійныя ідэі й групы адыгрывалі й адыгрываюць важныя ролі ў палітыцы Ірану, Польшчы, Паўднёвай Афрыкі й шмат дзе ў іншых краінах сьвету.

Мы добра знаем, што ня так даўно дзеялася ў былой Югаславіі, а цяпер — у правінцыі Косава. Для людзей цяжка зразумець праблему Косава зь ягонай старажытнай традыцыяй, культурай і абраднасьцю. Ад часу паражэньня сэрбаў у баі з туркамі на Косавым Полі ў 1389 годзе Балканскі паўвостраў акупавалі туркі й, пачынаючы з XVI ст., некаторыя ягоныя жыхары прынялі ісламізм. Так было да 1913 году, калі Турэцкая імпэрыя пачала развальвацца. Тады на Балканах пачалі тварыцца незалежныя дзяржавы, а сярод іх — Югаслаўская дзяржава. У тым жа 1913 годзе, 29 ліпеня, канфэрэнцыя амбасадараў у Лёндане прызнала й гарантавала незалежнасьць і граніцы Альбаніі, але Косава прызнала Сэрбіі.

У часе Другой Сусьветнай вайны немцы акупавалі Балканы. Была створана Харвацкая дзяржава на чале з каталіцкім фанатыкам Павелічам, пры якім было зьнішчана сотні тысячаў праваслаўных сэрбаў і зруйнавана шмат іхніх цэркваў. Па вайне Ціта стварыў Югаслаўскую Фэдэрацыю. Аднак пасьля ягонай сьмерці пачалася грамадзянская вайна, якая прывяла да ўтварэньня незалежных дзяржаваў: Славэніі, Харватыі, Босьніі, Чарнагорыі й Сэрбіі.

Цяпер паўстала пытаньне адносна правінцыі Косава. Яго аб'ядноўвае супольная вера Магамэта з паўднёвымі альбанцамі, але ў Паўночнай Альбаніі многа каталікоў. І хоць нель-

га сказаць, каб гэтыя дзьве веры, мусульманская й каталіцкая, жылі паміж сабою любоўна, — іх яднала й яднае нянавісьць да праваслаўных сэрбаў. Маючы падтрымку сваіх адзінаверцаў у Альбаніі, косаўцы збройна пачалі ваяваць за сваю дзяржаўную незалежнасьць ад Сэрбіі. Захад жа, прызнаючы Косаву шырокую аўтаномію, ягоную дзяржаўную незалежнасьць не прызнае. Чым скончыцца гэтае процістаяньне, пакажа недалёкая будучыня, а тым часам ідзе збройная барацьба й гінуць людзі.

Такім чынам мы бачым, што сёньня праваслаўныя, каталікі й мусульмане былой СФРЮ адзін аднаго ненавідзяць. А ў VI-VII ст. ст. яны йшлі разам на Балканы супраць рымлянаў, якія дазволілі ім там асесьці. У IX ст. славяне прынялі хрысьціянства з Салёнікаў (Грэцыя), а Ілірыя, дзе знаходзілася Альбанія, належыла да Рымскай дыяцэзіі. У той час не было яшчэ царкоўнага падзелу, хоць былі непаразуменьні й разыходжаньні паміж Рымам і Канстантынопалем. Аднак ужо пад турэцкай акупацыяй каталікі й мусульмане падтрымоўвалі туркаў супраць праваслаўных сэрбаў. Як тады, так і цяпер, альбанцы глядзяць на сэрбаў, як на найбольшых сваіх ворагаў.

Нельга забываць, што пад турэцкай акупацыяй Балканаў некаторыя іхнія жыхары прынялі веру Магамэта. Сэрбы, якія былі бліжэй Грэцыі, прынялі ад яе праваслаўе, а славэнцы й часткова альбанцы, якія належылі да рымскай юрысдыкцыі, прынялі каталіцызм. І як некалі былі гэтыя славянскія плямёны адным народам, дык рэлігія іх ня толькі падзяліла, але зрабіла непрымірымымі ворагамі. Гэтая варожасьць і прывяла да падзелу й стварэньня асобных незалежных дзяржаваў: каталіцкай Славэніі й Харватыі, мусульманскай Босьніі й праваслаўнай Сэрбіі.

Падобна выглядае справа ў Паўночнай Ірляндыі, дзе каталік мардуе пратэстанта, а пратэстант — каталіка, хоць усе яны ёсьць ірляндцы. Так што рэлігію робіць чалавек, а не рэлігія чалавека.

Вядома з гісторыі, што Праваслаўная царква Расеі выконвала й выконвае палітыку свайго ўраду. Як было за князёў, цароў, так і за бальшавікоў, якія бэсьцілі й нішчылі Царкву й ейнае духавенства. Аднак расейскія герархі пай-

шлі на службу камунізму. У ліпені 1927 году мітрапаліт Сергій, выконваючы абавязкі патрыярха Рускай Праваслаўнай царквы, выдаў дэклярацыю, якая рабіла Царкву актыўным хаўрусьнікам ураду. Сваю ляяльнасьць савецкай уладзе Руская царква паказала ў часе Другой Сусьветнай вайны, калі іншыя Цэрквы заклікалі народ на барацьбу зь бязбожным камунізмам. Тады Сталін дазволіў вызваліць зь лягероў ацалелых сьвятароў, дазволіў званіць у званы й адпраўляць багаслужбы, а за гэта Царква актыўна падтрымоўвала камуністычную прапаганду й дапамагала духова й матэрыяльна ў вайне.

Таму нічога дзіўнага, што пасьля вайны высокія царкоўныя саноўнікі, разам з партыйнымі дзеячамі, адзначаліся аднолькава камуністычнымі ордэнамі й мэдалямі за свае заслугі. Быў гэта час, калі Царква ў Савецкім Саюзе зноў апынулася пад прасьледам атэістаў, але ейныя рускія герархі, крывячы душой, гаварылі, што ў іх пануе свабода рэлігіі й улады не мяшаюцца ва ўнутраныя справы Царквы. А з нагоды 50-х угодкаў Кастрычніцкай рэвалюцыі патрыярх Аляксій сказаў: „Уважаем за шчасьлівую тую акалічнасьць, што наша Царква йснуе ў варунках сацыялістычнай сыстэмы. У гэтым часе наш народ рыхтуецца да ўрачыстага ўшанаваньня 50-годзьдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Рыхтуемся да яе й мы, веруючыя грамадзяне, бо-ж высока цэнім гатае несумненнае шчасьце, якое прынесла нашай Бацькаўшчыне Кастрычніцкая рэвалюцыя!" Ангельская газэта „Дзі Майл он Сандэй" (ад 29 сакавіка1992 г.) падае імёны трох патрыярхаў РПЦ, якія былі сталымі агентамі КДБ на працягу 20-ці гадоў! А былі й іншыя падобныя да іх герархі. Выкарыстоўваючы рэлігійных агентаў, КДБ рабіў большую прапаганду на Захадзе, як савецкія амбасадары.

На працягу стагодзьдзяў Руская Праваслаўная царква адмаўляла народам свае імпэрыі права на ўжываньне роднай мовы ў царкоўным і культурным жыцьці, яна іх русыфікавала, у тым ліку й беларусаў. Такое бяспраўе з боку Каталіцкай царквы наглядалася супраць беларусаў і ўкраінцаў у міжваеннай Польшчы 1920-1930-х гадоў, дзе войт у гміне, паліцыянт на пастарунку, а ксёндз з амбоны кіравалі Заходняй Беларусьсю й Украінай.

Калі апосталы славянскай літургіі ў Маравіі (IX ст.) Канстанцін-Кірыла й ягоны брат Мяфодзій вярталіся дамоў са свае славянскай місіі, яны затрымаліся ў Вэнэцыі й патрапілі на каталіцкі сабор. Там ім пачалі закідаць, чаму яны вучаць на варварскай славянскай мове, калі ёсьць тры галоўныя мовы: лацінская, грэцкая й яўрэйская. На гэта Канстанцін адказаў: „Вы зьяўляецеся вучнямі Пілата, бо Пілат загадаў напісаць і ўмясьціць над галавой укрыжаванага Хрыста абвестку на трох гэтых мовах!"

Мы не знаходзім у гісторыі выпадку, каб РПЦ выступіла калі ў абароне вязьняў сумленьня, зьняволеных за свае палітычныя перакананьні.

Ісус Хрыстос сказаў, што ўсе людзі перад Богам роўныя й таму яны заслугоўваюць на роўныя правы.

Сёньня Праваслаўная царква ў Беларусі, як падначаленая Маскве, нічога ня хоча знаць і слухаць, што дзеецца ў краі. Яна ня хоча знаць, што сказаў апостал Павал сваім родзічам у Рыме, калі яго прывезьлі туды арыштаваным: „Мужы браты! Хаця я нічога ня ўчыніў супраць народу й звычаяў айцоў, мяне, як вязьня, аддалі зь Ерусаліму ў рукі рымлян" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 28:17). Нешта падобнае дзеялася й дзеецца сёньня ў Беларусі.

Каталіцкая царква, якая прэтэндуе на кіруючае становішча над усімі хрысьціянскімі Цэрквамі, мае за сабою вялікія грахі перад Богам і людзьмі. Таму папа Ян Павал II у 1994 годзе падаў прапанову сваім кардыналам, каб Царква пакаялася ва ўсіх сваіх грахох, зробленых на працягу гісторыі. Такое прабачэньне папа хацеў умясьціць у сваю энцыкліку, але на гэта італьянскі кардынал Джакома Біфа адказаў: „У Царквы няма грахоў". Гэта значыць, што Царква можа рабіць і падтрымоўваць усялякія злачынствы й ня будзе мець грахоў.

На сьвеце маецца многа рэлігіяў, розных сэктаў і культаў, якія актыўна праводзяць сваю дзейнасьць, але іх немагчыма ўсіх успамянуць. Можна сказаць адно, што рэлігійныя вераваньні, іхняя абраднасьць і вучэньне маюць вялікае значэньне ў разьвіцьці й аб'яднаньні, як і разьяднаньні людзей. Але, гледзячы на ўсе гэтыя рэлігіі, чалавеку часам робіцца незразумелы іхні зьмест. Нават тыя самыя рэлігіі, перанятыя іншымі народамі, прымаюць сваю адметнасьць.

Апошнім часам людзі менш пачалі хадзіць у сьвятыні. Маюцца на гэта розныя прычыны, апраўданьні, домыслы. Адны ня хочуць ісьці й даваць ёй цяжка запрацаваныя грошы. Другія бачаць царкву як багатую й пышную ўстанову, якая дбае больш пра матэрыяльны быт, чым пра духовую вартасьць. І гэта мы бачым сёньня, як пры некаторых цэрквах сьвятары й ягоныя памагатыя карыстаюцца царкоўнымі грашыма за свае паслугі. А вядома зь Еваягельля, што Ісус Хрыстос забараніў сваім вучням-апосталам браць грошы за прапаведаваньне праўды Божай. Калі Ісус зайшоў у Ерусалімскую сьвятыню й убачыў, што там ідзе гандаль, перакуліў сталы гандляроў, рассыпаў іхнія грошы й сказаў: „Ці-ж не напісана: дом Мой домам малітвы ўсімі народамі будзе названы, а вы зрабілі яго прытонам разбойнікаў!" (Мк, 11:17). Трэція бачаць царкву, як чужы палітычны інструмант, шкодны для народу. А ёсьць і такія, якія ідуць у царкву, каб крыху падзарабіць.

І калі сярод рэлігіяў не наступіць згода й зразуменьне сваіх памылак, а тым больш сваіх абавязкаў перад Богам, — датуль ня будзе спакою сярод народаў сьвету.

У сапраўднасьці ніхто яшчэ дакладна й упэўнена ня знае, якая рэлігія ёсьць лепшая, справядлівейшая й сапраўднейшая. Амаль усе яны вучаць маралі, але тыя, якія яе вучаць і прапаведуюць, часта самі зьневажаюць сваю рэлігію. Сярод рэлігіяў і яе кіраўнікоў наглядаецца беспарадак. І паўстае пытаньне: у якую сьвятыню йсьці й якому Богу маліцца?

(„Рунь" № 16-17, Вільня, 11 верасьня — 12 кастрычніка 1998 г.)

Замежны рапарт

(Апублікаваны праз „Экономіст Паблікэйшэн". Лёндан, 27.04.1989 г.)

„Ватыкан загадаў выданьне катэхізісу на беларускай мове бяз прынятага штэмпеля „Нігіл обстат" прыпушчальна таму, каб пазьбегчы клопатаў ад польскіх епіскапаў, якія ўважаюць, што Беларусь ёсьць пад іхняй уладаю й што набажэнствы павінны быць на польскай мове, а не на беларускай. Ватыканскі інфарматар заявіў: „Ватыкан ня выслаў катэхізісу ў Расею" й адмовіўся сказаць больш. Друкары кажуць, што заказ атрымалі ад Ватыканскай кангрэгацыі

для Ўсходніх цэркваў. Кангрэгацыя кажа, што катэхізіс ёсьць для беларусаў пражываючых на Захадзе й мажліва што „адна ці дзьве копіі" трафіць на Беларусь.

Папа, які выслаў 60 000 бібліяў у Савецкі Саюз і які моцна прывязаны да царквы ў Польшчы, захоўвае свайго роду сакрэтнасьць".

„З ацэнкі, якая падаецца вышэй, відаць, што Ватыкан у адбудове Беларускага Каталіцкага касьцёла апіраецца на польскіх духоўнікаў, а не на беларускіх. Невядома што ёсьць надрукавана па-беларуску й ці перададзена да ўжытку. Ёсьць вядома, што мова ў касьцёлах ужываецца польская, а беларуская толькі ў некаторых выпадках. Пад шыльдам Беларускага Каталіцкага касьцёла праводзіцца палянізацыя беларускага каталіцкага насельніцтва. Але-ж натуральным правам у французскім касьцёле ёсьць французская мова, у польскім — польская, у літоўскім — літоўская мова й г.д. Дык выглядае, што касьцёлы на Беларусі маюць да беларускай мовы алергію.

У каталіцкіх касьцёлах на Беларусі павінна ўжывацца мова беларуская, а ксяндзамі прызначацца беларусы. Урад БССР абзывае беларускія нацыянальныя групоўкі баўтунамі, але сам, для самазахаваньня беларускае народнасьці, неабходных мераў і крокаў не праяўляе.

Беларусы да гэтага пытаньня ня будуць абыякавыя, — паставяць належна супраціў".

І мала што ў вёсцы Вярэйкі Ваўкавыскага раёну не дайшло да бойкі паміж праваслаўнымі й католікамі, якія хочуць забраць ад праваслаўных царкву й зрабіць зь яе касьцёл. Старыя людзі памятаюць польскія парадкі пілсудчыкаў. Як падае Анатоль Сідарэвіч, „у час Першай Сусьветнай вайны, калі тутэйшых жыхароў вывозілі ў Расею, клір рабіў усё, каб палякі й беларусы рымска-каталіцкага веравызнаньня засталіся: гэтак рыхтаваўся грунт для каляніза-цыі заходніх земляў у Беларусі. На сходзе ў дзень забастоўкі старэйшая жыхарка Вярэек Антаніна Данільчык успамінала, як пры адступленьні немцаў у спаленым сяле ацалелыя хаты аддавалі палякам, як каталікі на чале з ксяндзом захапілі царкву, як выкідалі й тапталі нагамі іконы й харугвы. Тыя нешматлікія праваслаўныя хрысьціяне, якія заста-

ліся ў вёсцы, плакалі, упрошвалі не паганіць сьвятое, а каталікі, зрываючы вяроўкамі шасьціканцовы крыж, зьдзекаваліся: „Во як галава ў праваслаўнага хістаецца" („Літаратура і мастацтва", 7 верасьня 1990 г., стар. 16).

Такімі вось учынкамі, трактоўкай і духовай стравай кормяць і гадуюць беларускіх авечак рымскія папы, а сёньняшні папа „клапоціцца" й аб беларускай эміграцыі, хоць яго ніхто ня просіць.

Другі характэрны прыклад падае нам Кастусь Цьвірка, які двойчы наведаў так званы Віленскі край, які Сталін аддаў Літоўскай ССР. Аб ім аўтар у „Літаратуры і мастацтве" (за 14 верасьня 1990 г., стар. 5) піша так: „У гэтам краі я пабываў двойчы. Першы раз яшчэ ў пачатку 70-х гадоў, калі вывучаў творчую біяграфію Ўладзіслава Сыракомлі, другі — летась, вандруючы па Віленшчыне ў складзе экспэдыцыі Дзяржаўнага музэя гісторыі беларускай літаратуры. Першае, чым я зацікавіўся, гэта мова насельнікаў Віленшчыны, „тутэйшых", як яны сябе часам яшчэ называюць. У часе гэтых паездак я адкрыў для сябе, што ва ўсіх вёсках, у якіх давялося пабываць — а пабываў я ў шмат якіх вёсках і вёсачках Віленскага й Шальчынінскага раёнаў — людзі гавораць на вельмі калярытнай беларускай мове. (...) Прычым, людзі самі прызнаюць, што яны гавораць па-беларуску. Прызнаваць прызнаюць, але тым ня менш называюць сябе не беларусамі, а палякамі, „палякамі". (...) Адкуль-жа ўзяліся тады ў Віленскім краі палякі?

На гэта вельмі проста адказаў мне ў Сьвіранах пажылы калгасьнік мясцовага калгаса „Іскра" Людвік Марцінавіч Корвень: усіх тутэйшых сялян „папісалі на палякаў" пры Польшчы. Замацаваць беларускую сьвядомасьць дапамагла ім іхняя каталіцкасьць. (...)

І вось на згаданым Багушэвічавым сьвяце гляджу я выступленьне тутэйшай мастацкай самадзейнасьці — пераважна школьнікаў са Сьвіран, Рукойнаў, Меднік — родных мясьцін клясыка беларускай літаратуры. Але дарма чакаў я пачуць зь іх вуснаў хоць адно мясцовае, беларускае слова, пачуць тую мову, што спрадвек гучала на гэтай зямлі, мову іх бацькоў і дзядоў. Калі яны выступалі, зь летняй эстрады

гучала адна толькі польская мова. Маладзенькія мясцовыя хлопцы, на галовы якіх нехта ўзьдзеў чатырохкутныя чырвоныя канфэдэраткі й дзяўчынкі-школьніцы, апранутыя кімсьці ў яркія польскія нацыянальныя строі, фарсіста адстуквалі абцасамі толькі польскія танцы, сьпявалі толькі польскія песьні.

Слухаў я землякоў Францішка Багушэвіча, якіх, мусіць, дарма некалі заклікаў „панарскі салавей" не пакідаць „мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі" й зь якіх гэтак вытраўліваецца сёньня ўсё самабытнае, беларускае, і думаў толькі адно: каму ўсё гэта патрэбнае?"

Кожны беларус павінен памятаць, што Каталіцкі касьцёл на Беларусі быў і ёсьць моцна зьвязаны з польскасьцю. Гэтага не скрываюць польскія аўтары на эміграцыі. Ян Марцінкевіч у „Дзёньніку польскім" ад 7 жніўня г.г. піша, што „каталіцызм і польскасьць на крэсах паўночна-ўсходніх ішлі заўсёды ў пары з сабой". І ў гэтай рабоце Вуніяцкая царква ня можа ім супярэчыць, бо-ж і яна атрымлівае дырэктывы й грошы з таго-ж самага цэнтру — Ватыкану. Тут вынаткаў быць ня можа. Усе ксяндзы-айцы — дзеці аднаго папы рымскага й робяць так, як ім кажа папа.

Калі вуніяцкія сьвятары лічаць сябе такімі вялікімі беларускімі патрыётамі, то чаму яны не закладаюць сваю царкву сярод гэтых апалячаных беларусаў-каталікоў, былых вуніятаў, якіх продкі былі ў свой час праваслаўнымі беларусамі, а лезуць да праваслаўных? Успамінаючы пару Вялікага Княства Літоўскага, палякі пішуць: „У яго лоне (ВКЛ — Ю. В.) тварыліся вялікія магнацкія фартуны. Гэты слой вырас зь літоўскага й рускага (беларускага — Ю. В.) баярства, прыняў польскую культуру й рыма-каталіцкую рэлігію й стаўся часткай польскага народу" („Дзее Зем Велькего Ксенства Літэвскего", Лёндан 1953, стар. 41).

Падобна згадвае Аляксей Каўка ў сваім артыкуле „Якімі скарбамі багатыя..." ў кнізе „Шляхам гадоў" (Менск 1990): „Мы слушна прывыклі падкрэсьліваць пагібельныя для старабеларускай літаратуры вынікі экспансіі на Беларусь каталіцызму, апалячваньня, узмоцненых пасьля царкоўнай вуніі 1596 году й асабліва пасьля пастановы Варшаўскай генэральнай канфэдэрацыі 1696 года аб выцясьненьні тага-

часнага „рускага языка" з адміністрацыйнага ўжытку й замены яго польскай мовай" (стар. 321).

„Паралельна з акаталічваньнем (добраахвотным) разгортваецца поўная асыміляцыя нашай шляхты, якая, знову-ж з уласнай волі, прымае на сябе ролю валянцёра іншаземнай культуры й мовы на беларускай зямлі, занядбоўваючы нацыянальныя духоўныя вартасьці" (там-жа, стар. 325).

Таксама пасьля скасаваньня Берасьцейскай вуніі ў 1839 годзе многа вуніятаў перайшло ў каталіцызм і, як прызнаюць некаторыя польскія гісторыкі, гэтыя людзі былі зьвязаны з польскасьцю й паступова палянізаваліся. Нешта падобнае сталася пасьля царскага ўказу аб веравызнаўчай талерантцыі ў 1905 годзе. Нават д-р Віктар Сянкевіч, каталік, у „Хрысьціянскіх навінах" (№ 7 за 23 ліпеня 1990 г.), якія выходзяць у Ватыкане, праводзячы аналіз кнігі беларускага рэлігійнага дзеяча ксяндза Адама Станкевіча „Родная мова ў сьвятынях", прызнае, што „вунія далася запрэгчыся ў сьвецкую польскую палітыку на шкоду беларускага народу".

Таму сёньня пажадана, каб вуніяты ішлі да гэтых спалянізаваных беларусаў-рэнэгатаў-каталікоў на Бацькаўшчыне й на эміграцыі й усьведамілі ім іхняе паходжаньне ды вярнулі іх назад у сваю вунію й да свайго народу, замест шукаць наіўных сярод праваслаўных беларусаў.

А цяпер пацікавімся, якую работу выконвае Беларуская Праваслаўная царква й яе Экзархат у абароне свае веры перад наступам каталіцызму з вуніяй. Адказ просты — ніякую. У рэдакцыю „Голасу Часу" пішуць беларусы з Бацькаўшчы:

„Быў дужа ўсьцешаны, што ў Лёндане выходзіць гэтакі добры часапіс. Быў усьцешаны й тым, што ён упэўнена трымае свой праваслаўны кірунак. Шкада, што ён не трапіў на Бацькаўшчыну раней. З рэлігійнай эмігранцкай літаратуры ў нас пераважна пашыраюцца вуніяцкія ды каталіцкія друкі. Мяркую, знайшлася-б не адна тысяча на Беларусі жадаючых атрымаць „Голас Часу" (11 лютага 1990 г.).

„Выпадкова даведаўся я аб тым, што ў Лёндане пачаў выходзіць новы беларускі праваслаўны часапіс „Голас Часу". Гэта навіна вельмі ўзрадавала, бо ў нас няма рэлігійнага часапісу на беларускай мове. І таму зьяўленьне гэтага выданьня трэба толькі вітаць. У сувязі з гэтым зьвяртаюся да

Вас з просьбай, калі ёсьць такая магчымасьць, можа дашляце калі ня ўсе, то хоць-бы адзін зь іх" (11 красавіка 1990 г.).

„Сапраўды, у нас няма пакуль магчымасьцяў выдаваць чыста праваслаўны часапіс на беларускай мове. (...) На гэта ёсьць шмат прычын. Мы яшчэ не дарасьлі да таго ўзраўню, каб зразумець што такое праваслаўе для Беларусі, што прынясе штучна насаджаны каталіцызм зь яго вуніяй. Мы яшчэ сьпім, бо ўпэўнены, што гэта нас не датычыць. І здарыцца хутчэй за ўсё, што здарылася на Ўкраіне, хаця й не ў такіх вялікіх памерах. Наступствы каталіцызму вельмі й вельмі адчуваюцца ў рэлігійным жыцьці Беларусі. Можна прывесьці шмат прыкладаў, але Вы гэта лепш за мяне ведаеце, бо чытаеце беларускую прэсу. Мяне бянтэжыць афіцыйная царкоўная абыякавасьць да гэтых фактаў, таму й наш афіцыйны часапіс ня вельмі надзейны для праваслаўных беларусаў. Нашае выданьне жыве па ўстаноўках шаноўнага Ўладыкі Філарэта, які займае экумэнічную пазіцыю па гэтых пытаньнях" (3 ліпеня 1990 г.).

Што-ж на гэта можа сказаць нашае праваслаўнае духавенства са сваімі вернікамі й сам Беларускі Экзархат на чале? Найбольшы час, каб нехта паважна ўзяўся за гэтую справу, а найбольш самі вернікі павінны дамагацца беларусізацыі свае Праваслаўнае царквы й выдачы свайго часапісу для ўсіх праваслаўных вернікаў. А вось інфармацыя суродзіча з Бацькаўшчыны:

„У Менску пачаў выходзіць часапіс „Белорусский православный экзархат", якога выйшла тры нумары. Патрэба ў беларускім рэлігійным часапісе даўно насьпела й бачыце яна пачала ажыцьцяўляцца. Часапіс выдаецца на дзьвюх мовах, пераважная большасьць матэрыялу на расейскай, меншая на беларускай. Але гэта ня вельмі засмучае, галоўнае лёд крануўся й дзякуй Богу. Гэта цешыць. Праўда, гэты часапіс не прадаецца ў розьніцу й на яго немагчыма, пакуль што, падпісацца. Як быццам яго прадаюць у цэрквах, але асабіста я добра ня ведаю" (1 жніўня 1990 г.).

Чаму могуць мець і свабодна купляць і выпісваць свой праваслаўны часапіс на сваёй роднай мове расейцы й украінцы, а беларусы не? Ці-ж беларусы ня маюць свае мовы, што нават назоў „Белорусский православный экзархат" на-

пісаны па-расейску? Ці Беларуская Праваслаўная царква мае быць надалей філіяй Рускай Праваслаўнай царквы? Ці беларускае духавенства мае абмежаваць сваю пастырскую работу толькі да хрысьцінаў, шлюбаў, паховінаў і славянскай літургіі ў сьценах царквы? Праз свой застой і бязьдзейнасьць Беларуская Праваслаўная царква падрывае свой аўтарытэт і гэтым дае свабодную дарогу для каталіцка-польскай дывэрсіі на Беларусі. Хто-ж тады мае старацца, клапаціцца пра сваю Беларускую Праваслаўную царкву калі не яе герархія. А мы бачым адваротнае зьявішча. Як піша нам суродзіч, „мы яшчэ сьпім", а найбольшы час прачнуцца й узяцца за работу служэньня ня толькі Богу, але й народу на роднай мове. Гэта пад сілу цяперашняму Беларускаму Экзархату ў часе дзяржаўнай перастройкі й нацыянальнага адраджэньня. Епіскапы й духавенства павінны зразумець, што настаў час зьменаў. Адраджаецца Беларусь — народная, нацыянальная — і калі Царква ня пойдзе з часам, то гэта выкарыстаюць вуніяты, якія іграюць на нацыянальных пачуцьцях беларускіх патрыётаў, вера якой ня ёсьць акрэплай. Некалі заганялі людзей у вунію, а цяпер яны пойдуць самі. У пасьлядоўнасьці гэта можа давесьці да рэлігійнай барацьбы, прыкладам мінулых стагодзьдзяў. Беларуская Праваслаўная царква павінна пачаць цяпер бараніць нацыянальныя інтарэсы беларускага народу.

Сіла рымскага каталіцызму вымяралася й вымяраецца на Беларусі ня колькасьцю вернікаў, як гэта часта падаецца ў прэсе, але яго вядучымі палітыкамі й касьцельнымі прадстаўнікамі палянізацыі, якія часта й густа фальсыфікуюць статыстыку католікаў на Беларусі. Хоць яны налічваюць сябе да 2,5 мільёна, але гэты лік католікаў-палякаў не адпавядае сучаснай статыстыцы.

Апалячаньне беларусаў, католікаў і нават праваслаўных, гэта старая й добра вядомая практыка палякаў, якая ня страціла свае актуальнасьці й сёньня. Дзеля гэтае мэты палякі прымаюць розныя формы й тактыку. Зусім слушна піша Анатоль Сідарэвіч: „Мы ведаем, што Польская Каталіцкая царква й прасякнутая духам каталіцызму „Салідарнасьць" вызначаюцца сваёй антыкамуністычнай накіраванасьцю. Чаму-ж тады ракаўскі пробашч агітаваў парафіян

галасаваць за камуністаў кіраўнікоў? Чаму „Салідарнасьць" друкавала лістоўкі ў падтрымку Д. Арцімені — таксама камуніста, кіраўніка? Адказ просты: таму, што канкурэнтамі гэтых кіраўнікоў былі дзеячы беларускай культуры: В. Рагойша ў першым выпадку, А. Мальдзіс — у другім. Меркаваньні тут пэўныя, адназначныя: ня даць разьвіцца беларускаму руху, бо ён можа падтачыць польскія пазіцыі на Беларусі. Прапольскія ксяндзы й „Салідарнасьць" „палюбілі" камуністаў-кіраўнікоў таму, што яны таксама супраць росту нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў.

Тэорыя тут такая: рана ці позна СССР распадзецца. Касьцёл нясьпешна (ён вечны) павінен уплываць на сьвядомасьць вернікаў, бо „пытаньне ад нацыянальнасьці — пытаньне сьвядомасьці". Вось калі паўмільёна (а Царква лічыць, што два мільёны) вернікаў стануць палякамі, тады можна будзе прад'явіць Беларусі прэтэнзіі.

Як беларус, як хрысьціянін, я зьвяртаюся да дэпутатаў Вярхоўнага Савету рэспублікі з просьбай, каб яны патрабавалі выдаленьня польскіх місіянераў зь Беларусі" („Літаратура і мастацтва", 29 чэрвеня 1990 г., стар. 15).

У такіх вось варунках ствараецца на Беларусі й на эміграцыі не зусім здаровая атмасфэра на фоне нацыянальнага й рэлігійнага жыцьця й суадносін паміж праваслаўнымі беларусамі й каталіцкімі палякамі. У гэтай чужой, скрытай і не зусім яснай для некаторых беларусаў дзейнасьці, якая разгортваецца сёньня на Беларусі, а мае сваіх агітатараў на Захадзе, можа выканаць немалую ўслугу й лацінскі алфавіт, які прапануе нам інжынер А. Капуцкі з Маладзечна, аб якім мы згадвалі ў перадапошнім нумары „Голасу Часу" й які паслужыў для напісаньня гэтага артыкула.

Сёньня важным пытаньнем для беларусаў зьяўляецца не лацінскі алфавіт, не катэхізіс і малітаўнікі, якія друкуе кірылічным шрыфтам ды польскімі словамі Польская Каталіцкая царква, а справа роднай школы, перагляд існуючага правапісу й граматыкі беларускай мовы, як гэта згадвае й інж. А. Капуцкі. Гэтыя пытаньні павінны былі быць вырашаны даўно, пакуль школа мела пачаць свае заняткі.

Акрамя школьніцтва, прэсы, граматыкі, правапісу й т.п., ня менш важныя справы стаяць наперадзе, а гэта: якім спо-

сабам правесьці пасьпяхова беларусізацыю школаў, дзяржаўных устаноў і надаць Праваслаўнай царкве й Каталіцкаму касьцёлу беларускі характар. Што трэба зрабіць, каб беларуская мова сталася ў іх мовай рабочай штодзённага жыцьця рэспублікі, каб сталася яна галоўным зьвяном беларусізацыі, самасьвядомасьці й нацыянальнага гонару беларускага народу.

Гэты працэс ня будзе такі лёгкі й просты. І тут не прадбачыцца, каб А. Капуцкі пацікавіўся гэтымі справамі й да іх падышоў паважна, бо-ж адобраны Закон аб увядзеньні беларускай мовы як дзяржаўнай, ён уяўляе яго так: „Добры закон прынялі ці дрэнны, пакажа час".

У даную хвіліну трэба быць вельмі асьцярожным на рознага роду прапановы, падшэпты й дзейнасьць рэлігійных місіянераў, бо як мы бачылі вышэй, гэтыя гандляры верай хочуць мець свой важкі голас на Беларусі. Побач сапраўдных беларускіх патрыётаў, яўна й скрыта дзейнічаюць разнаякія сілы, якія „з улікам традыцыі" стараюцца правесьці сваю работу на Беларусі. Ці мы можам дапусьціць да гэтага?

(„Голас Часу" № 6 (9), Лёндан, лістапад-сьнежань 1990 г.)

Раньняе хрысьціянства

Хрысьціянства ад Галілеі да Беларусі (гістарычны нарыс)

Уступнае слова

У сувязі з 1000-годзьдзем Хрышчэньня Русі (988 г.), што адносіцца й да Беларусі, шмат дзе раней адбыліся ўрачыстасьці, сэмінары й выдавалася багатая літаратура на даную тэму. Важнасьць Хрышчэньня Русі прыцягвала ўвагу шырокіх кругоў міжнароднай грамадзкасьці, дзеячоў навукі й культуры. Аб гэтым найлепш сьведчыць заклік 24-й сэсіі Генэральнай Канфэрэнцыі ЮНЭСКО, каб адзначыць 1000-годзьдзе ўвядзеньня хрысьціянства на Русі як важную падзею ў эўрапэйскай і сусьветнай гісторыі й культуры.

Важнасьць гэтай падзеі была ўрачыста адзначана ня толькі на Русі, але і за яе межамі, дзе пражываюць праваслаўныя беларусы, украінцы й расейцы. Беларусы Англіі, пры сваіх цэрквах, таксама ўрачыста адсьвяткавалі 1000-годзьдзе свае праваслаўнае веры.

З гэтае нагоды многа было сказана й напісана пра Хрышчэньне Русі, пра Ўладзіміра Вялікага, пра пашырэньне хрысьціянства на Русі й Беларусі, але вельмі мала, або й зусім нічога не згадавалася пра паходжаньне й разьвіцьцё самога хрысьціянства ў першых стагодзьдзях яго арганізацыі пакуль прыйшло яно на Русь.

На тэму хрысьціянства маецца апошнім часам багатая літаратура, але досьледы над яго раньнім разьвіцьцём не былі й ня ёсьць лёгкія. Справа ў тым, што раньнія гісторыкі хрысьціянства ня дбалі, каб падаць дакладную дату, геагра-

фічны назоў й т.п., што стварае праблему дасьледчыкам. Ды нават тыя хрысьціянскія дакуманты, якія маюцца, не заўсёды пэўныя. Аднак і з гэтага матэрыялу, які захаваўся й маецца, можна сьмела прадставіць гісторыю разьвіцьця хрысьціянства ў першых стагодзьдзях нашай эры.

Першымі пісанымі дакумантамі навукі Ісуса Хрыста зьяўляюцца Евангельле і Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, якія былі напісаны ў другой палове I стагодзьдзя нашай эры. Але пасьля першага стагодзьдзя мала што згадваецца пра Хрысьціянскую царкву, аб ёй няма канкрэтных запісаў. І толькі дзякуючы Яўсевію, які ў 314 годзе быў рукапаложаны на епіскапа Кесарыі, была напісана „Гісторыя Царквы". Была гэта першая кніга, дзе Яўсевій сабраў ранейшы матэрыял і ўвёў бягучы, якога сьведкам быў сам аўтар. Безь яго інфармацыі ў гісторыі Хрысьціянскай царквы засталася-б белая пляма. Памёр Яўсевій у 339 або 340 годзе маючы нейкіх 80 гадоў.

У гэтым ужо часе, за імпэратара Канстанціна Вялікага (306-337) у 313 годзе хрысьціяне атрымалі свой праўны статут і пачалі легальную дзейнасьць, бо да гэтага часу былі яны прасьледаваны жыдамі, паганамі й рымскімі ўладамі.

Ня будзем тут заглыбляцца ў веравызнаньне, догмы й зьмест сьвяшчэнных кніг, але скажам агульна, што ня ўсе пытаньні паходжаньня й разьвіцьця хрысьціянства вырашаны навукай аднолькава. Усё-ж Ісус Хрыстос зрабіў аграмадны ўплыў на духовае, палітычнае й штодзённае жыцьцё чалавека.

Сёньня ў гісторыі цяжка знайсьці падобны факт, які быўбы так пашыраны сярод народу як разьвіцьцё хрысьціянства й яго прасьлед уладамі Рыму. Які цяжкі й складаны шлях прыйшлося прайсьці хрысьціянству ў першых стагодзьдзях яго арганізацыі й у якой форме прыйшло яно на Беларусь, аб гэтым варта пацікавіцца. А паколькі хрысьціянства бярэ свае вытокі зь юдэйста, таму свой гістарычны нарыс „Хрысьціянства ад Галалеі да Беларусі" пачнем зь юдэйства.

Дзеці Ізраіля

У першай кнізе Майсея, Быціі, сказана, што Аўрам (Аўраам) пакінуў дом ва Ўры над Еўфратам у Месапатаміі й з раднёй, сваімі людзьмі й усёй маёмасьцю накіраваўся ў Ханаанскую зямлю, пазьнейшая Палестына, сёньня Ізраіль. Ішоў Аўраам як рэнэгат, які парваў зь ідалапаклон-

ствам свайго племені, а пачаў верыць у аднаго Бога — Творца неба й зямлі.

На зямлі Ханаану Аўраам вандраваў зь месца на месца шукаючы дому, дзе мог-бы затрымацца й жыць згодна свае выбранае веры. Але голад на гэтай зямлі змусіў Аўраама са сваім родам перайсьці ў Егіпет. У Егіпце людзі Аўраама разжыліся й з багатым даробкам вярнуліся назад у Ханаан.

Аднае начы явіўся Аўрааму Бог й сказаў: „Я — Госпад, Які вывеў цябе з Ура Халдэйскага, каб даць табе зямлю гэтую ва ўладаньне" (Быціе 15:7). Калі Аўрааму было 99 гадоў, яму зноў явіўся Бог і зрабіў ягю бацькам шматлікіх народаў, ды абяцаў патомкам Аўраама зямлю Ханаан ва ўладаньне вечнае. За гэта Аўраам і яго патомкі мелі захаваць і прапагандаваць запавет Бога.

Паводле біблейнага паданьня, найбольш пераканаўчым фактам веры Аўраама ў аднаго Бога й адначасна ягонай кар'еры, стаўся той мамэнт, калі Аўраам хацеў прынесьці ў ахвяру Богу свайго адзінага сына Ісаака. Ужо Аўраам падняў меч, але ад такога паступку стрымаў яго руку голас зь неба.

І так, Біблія нам гаворыць, што першым веруючым чалавекам у аднаго Бога, які стаўся адначасна бацькам яўрэйскага народу, быў Аўраам. Жыў ён каля 1700 году да нашай эры. На жаль, Біблія не гаворыць нам, якім чынам Аўраам стаўся веруючым у аднаго Бога, нічога не гаворыць аб яго маладых гадох і нічога не гаворыць, чаму Бог выбраў яго бацькам яўрэйскага народу. Больш аб жыцьці Аўраама можна знайсьці ў Быціі (11-25).

Некаторыя дасьледчыкі ўважаюць біблейную гісторыю Аўраама за фікцыю, якая была напісана ў сэнсе духоўным, а не гістарычным. І была яна напісана стагодзьдзі пасьля сьмерці Аўраама й нават Майсея.

Некалькі дзесяткаў гадоў пасьля павароту Аўраама зь Егіпту ў Ханаан голад зноў змусіў насьледнікаў Аўраама пакінуць Палестыну й перайсьці ў Егіпет. Вёў іх унук Аўраама, Якаў, якога называлі яшчэ Ізраілем, а яго людзей — „дзецьмі Ізраіля".

Егіпцяне добра прынялі ізраэлітаў і як першы раз, так і другі, далі ім магчымасьць жыць і нават займаць у дзяржаве высокія пасады. Жывучы стагодзьдзі ў Егіпце, насель-

ніцтва жыдоў колькасна значна ўзрасло, што сталася пагрозай для егіпцянаў. Каб спыніць рост насельніцтва, фараон пастанавіў зрабіць дзяцей Ізраіля нявольнікамі. Акрамя гэтага ён загадаў забіваць нованароджаных хлапцоў і тапіць іх у рацэ Ніл. Прычынай такой дзейнасьці фараона мела паслужыць яшчэ прароцтва аб нараджэньні дзіцяці, якое пазбавіць яго трону.

Адна сям'я адмовіла замардаваць сваё дзіця й схавала яго ў кашы на вадзе ў зарасьлях. Дачка егіпецкага фараона знайшла дзіця, усынавіла малога хлапца й дала яму імя Майсей. Майсей стаў князем Егіпту, але яго родная сям'я знала гэта й была ў кантакце зь ім. Такім чынам Майсей знаў сваё паходжаньне.

Майсей узгадоўваўся ў палацовым асяродзьдзі. Аднойчы ён забіў егіпецкага начальніка, які быў ізраэлітам. Каб пазьбегчы пакараньня, Майсей уцёк у пустыню. Там спаткаў ён Сепфору, ажаніўся зь ёю й меў двух сыноў. У пустыні, паводле Бібліі, Майсей пачуў з палымнеючага куста голас Бога, Які наказваў яму вярнуцца ў Егіпет і вывесьці свой ізраільскі народ зь егіпецкай няволі назад у Ханаан і стварыць „сьвяты народ". Егіпецкая няволя ізраэлітаў мела прадаўжацца 400 гадоў.

Майсей вярнуўся да свайго народу й па ўказаньнях Бога рабіў захады па выхаду жыдоў зь Егіпту. Тады Бог паслаў няшчасьце на егіпцянаў. Аднае начы, у кожнай егіпецкай сям'і, памёр найстарэйшы сын. Гэта падзейнічала на фараона й ён дазволіў жыдам пакінуць Егіпет. Быў гэта звычайны выхад, які неўзабаве стаўся ўцёкамі. За ізраэлітамі кінуліся ў пагоню егіпцяне на чале з фараонам, але былі яны патоплены ў Чырвоным моры.

Вялікі біблейны паход, які цягнуўся сорак гадоў, меў стацца важным здарэньнем у жыцьці жыдоўскага народу. Быў гэта час, калі сярод жыдоў нарадзілася пачуцьцё салідарнасьці, калі жыды атрымалі сваю палітычную арганізацыю, калі была створана першая ізраільская армія й калі былі дадзены Богам Дзесяць Запаведзяў на Сінайскай гары.

Што праўда, у часе саракагадовага блуканьня па пустыні сярод жыдоў наглядаліся бунты й адступствы ад веры, за што Бог караў жыдоў. Нават сам Майсей губіў часам веру

й за гэта Бог не даў яму ўвайсьці ў Абяцаную Зямлю. Майсей бачыў яе здалёк, з гары Сінай, дзе ён памёр як заслужаны ізраільскі правадыр, якому было 120 гадоў. Там яго пахавалі, але дзе, у якім месцы — ніхто ня ведае. Аднак гара Сінай засталася для жыдоў сьвятым месцам. Біблія згадвае, што жыды аплаквалі сьмерць Майсея сорак дзён.

Майсея заступіў Ісус Навін і ён прывёў ізраэлітаў у Абяцаную Зямлю — Ханаан. Але на гэтай зямлі жылі сэміцкія плямёны ханаанітаў, фінікійцаў, апошнія залажылі Тыр і Сідон. Былі гэта старажылы, якіх паселішчы адносяць да 3000 гадоў да нашай эры. І таму зусім зразумела, што яны не хацелі ўпусьціць ізраэлітаў на сваю зямлю й зь імі трэба было ваяваць. Неўзабаве ізраэліты спаткаліся з новым народам філістынцаў, якія займалі ўзьбярэжжа Міжземнага мора ад Газы на поўнач за Яффу й зь імі прыходзілася ваяваць таксама доўга.

Так, што Абяцаная Зямля ня так лёгка дасталася ў рукі ізраэлітам. І на гэтым, можна сказаць, канчаецца біблейная легенда аб жыдах, якая паступова пераходзіць у гісторыю.

Першым жыдоўскім каралём у Абяцанай Зямлі быў Саўл (1030-1010 г. да н.э.), але хаця ягонае каралеўства было слабое, аднак быў гэта пачатак жыдоўскай дзяржаўнасьці. Дзяржаву Саўла тварылі дванаццаць сэміцкіх плямёнаў, аб якіх мала што вядома. Вядома толькі, што паміж гэтымі плямёнамі й каралём Саўлам былі непаразуменьні, што сталася прычынай дзяржаўнай дэзарганізацыі. Саўл ня так быў каралём дзяржавы, як галоўнакамандуючым гэтай збройнай племянной арміі. Жыцьцё яго не было спакойным. Сьпярша Саўл вёў удалыя войны з суседнімі плямёнамі, але праз сваю зайздрасьць хацеў забіць Давіда, які быў прадбачаны прарокам Самуілам на будучага жыдоўскага караля.

Гісторыя Давіда пачынаецца з пасвення ім авечак у горах вакол Віфляему. Жыў ён у небясьпечны час. Больш як 200 гадоў прайшло з таго часу, калі Майсей вывеў жыдоў зь егіпецкай няволі ў Абяцаную Зямлю. Але на гэтай зямлі не было спакою й яго ня мог навесьці кароль Саўл. Як рос Давід, расла зь ім слава, а калі ён у паядынку забіў філістынскага велікана каменем, слава яго, кар'ера й папулярнасьць яшчэ больш узрасьлі. Давід прыйшоў жыць у кара-

леўскі двор, дзе пасябраваў з сынам Саўла, Янатанам, і ажаніўся з дачкой караля Мэлхолай.

Хутка ўзрастаючая папулярнасьць Давіда занепакоіла Саўла, што ён у злосьці два разы кінуў у яго кап'ём. Давід пакінуў каралеўскі двор і пайшоў у свой дом. За ім пайшлі жаўнеры Саўла з мэтай забіць яго, але Давіду памагла ўцячы жонка.

Давід стаўся ўцекачом-выгнаньнікам і хаваўся ад людзей Саўла, але меў ён і сваіх прыяцеляў. У гэтым часе Саўл забраў сваю дачку Мэлхолу, якая была жонкай Давіда й аддаў яе другому чалавеку. На яе месца Давід знайшоў сабе дзьве жанчыны, якія сталіся яго жонкамі.

Замест забіць Давіда, забіты быў сын Саўла, Янатан, а сам Саўл ранены ў часе бою зь філістынцамі. Янатан, як ужо згадвалася, быў добрым сябрам Давіда й ягоную сьмерць Давід моцна перажываў. Ранены Саўл, апынуўшыся ў крытычнай сытуацыі, не хацеў папасьці жывым ворагу ў палон і прасіў свайго слугу, каб прабіў яго мячом, але той адмовіў забіць свайго караля. Тады Саўл узяў меч і сам прабіў сябе. Гледзячы на Саўла, гэта самае зрабіў з сабою ягоны слуга й два трупы ляжалі побач на гары Гэлвуе.

Неўзабаве прыйшлі філістынцы, адрэзалі галаву Саўла, забралі яго зброю і аднесьлі ў свой лягер як трафей. Ноччу жыды забралі цела свайго караля й аднесьлі ў свой лягер, дзе пахавалі разам з сынам. Так скончыў сваё жыцьцё першы ізраільскі кароль Саўл. Становішча ізраільскай дзяржавы аказалася ў вельмі крытычнай сытуацыі.

Як было прадказана прарокам Самуілам, месца забітага караля Саўла заступіў былы віфляемскі пастух Давід. Толькі пакуль Давід сеў на каралеўскі трон, не адна зьляцела галава, бо жыў яшчэ адзін сын Саўла, Евастэй, які быў забіты подступам.

Давід аказаўся надзвычай здольным палітыкам, стратэгам, каралём-генэралам, прарокам, музыкантам і аўтарам вялікай духовай вартасьці псальмаў. Ён перамог сваіх ворагаў філістынцаў, аб'яднаў дванаццаць жыдоўскіх плямёнаў, заняў Ерусалім у 1000 годзе да н.э. і зрабіў яго сталіцай каралеўства Ізраіля.

На працягу 33-х гадоў каралеўства Давіда першыя дзьве дэкады вяліся агрэсыўныя войны. За Давіда Ізраіль прад-

стаўляў сілу, быў вядомы паміж Нілам і Еўфратам, а ягонае каралеўства й кіраўніцтва захавалася ў памяці жыдоў як першы Залаты Век жыдоўскага народу. Постаць Давіда займае цэнтральнае месца ў яўрэйскай традыцыі.

Першай жонкай Давіда была дачка караля Саўла, што давала яму права на трон Ізраіля, але Давід меў больш жонак, як з Палестыны, так і з чужых тэрыторыяў. Хоць меў Давід права на трон, аднак каралеўства яго не тварыла суцэльнай дзяржавы. Юдэя й Ізраіль захоўвалі свае аўтаноміі, хаця мелі аднаго супольнага караля. Маладая манархія Давіда была новай формай дзяржаўнай арганізацыі й працавала яна спраўна.

Ня ўся біяграфія Давіда прыгожая й сумленная. Аднойчы яму спадабалася Вірсавія, жонка аднаго зь ягоных вайсковых камандзіраў і ён прывёў яе да сябе. Калі яна зацяжарыла, Давід шукаў розныя спосабы, каб выйсьці нявінным з прыкрай сытуацыі. Не знайшоўшы іншага спосабу, Давід адважыўся зьнішчыць мужа Вірсавіі, паслаўшы яго ў цяжкі бой, дзе быў забіты. Трук удаўся, а Вісравія сталася жонкай Давіда. Аднойчы супраць Давіда збунтаваўся сын Абсалон, былі таксама й іншя трагічныя й кампраметуючыя здарэньні ў сям'і Давіда.

Пасьля сьмерці Давіда каралеўства пераняў Саламон, сын яго й Вірсавіі, які кіраваў дзяржавай ня горш за бацьку. Галоўным заданьнем Саламона было ўтрымаць тыя дасягненьні, якія былі здабытыя ягоным бацькам. Саламон рэарганізаваў армію й узмоцніў абарону краіны, аднак стараўся ён рашаць унутраныя й зьнешнія справы дыпляматычна, каб не прымяняць збройнай сілы, што ў пэўнай меры яму ўдавалася.

Пры Саламоне жыды карысталіся дабрабытам, культурай і цывілізацыяй. Мудрасьць Саламона вядома была далёка за межамі Палестыны й да яго прыходзілі за парадай каралі з другіх дзяржаваў.

Саламон меў вялікія праекты розных пабудоваў, якія выконваліся сілай рабоў. Жыды ня мелі сваіх спэцыялістаў па будаўніцтве й таму галоўнымі архітэктарамі былі фінікійцы, вядомыя марскія падарожнікі, якія жылі ў Ліване. Фінікійцы славіліся будовай караблёў, вырабам шкла, пурпуры, тканін і былі вядомыя як будаўнічыя майстры. Гэта

яны пабудавалі прыгожыя палацы для Саламона й яго жонак. Але найбольш выдатным будынкам па сваёй архітэктуры зьяўлялася Сьвятыня Саламона ў Ерусаліме.

Хоць Саламон быў памазанікам Божым, але Стары Запавет асуджае некаторыя яго паступкі. Напрыклад, Саламон меў 700 жонак. Палітычныя жанімствы Саламона прыносілі яму мір з навакольным сьветам, але гэтыя замежныя жонкі прыносілі з сабою й паганскіх багоў. Быў гэта грэх, калі Саламон адвярнуўся ад сапраўднага Бога й на старасьць пачаў пакланяцца ідалам.

Нягледзячы, што ў сям'і Саламона й бацькі яго Давіда згадваюцца вялікія праступствы, усё-ж гісторыя ставіць іхняе каралеўства высока, не зважаючы на тагачасныя меркаваньні жыдоў. Аб гэтым сьведчыць факт, што зараз пасьля сьмерці Саламона выбухла паўстаньне. Жыдоўскія паўночныя плямёны не хацелі прызнаць сына Саламона, Раваама, каралём. Яны выступалі супраць дыскрымінацыі, прымусовай работы й вялікіх падаткаў. Малады кароль не хацеў пайсьці на кампраміс і гэтым спрычыніўся да падзелу народу.

Асновы жыдоўскай дзяржавы й магутнасьці, паложаныя Саўлам, Давідам ды ўзмоцненыя Саламонам, былі нарушаныя самымі жыдамі. Унутраныя сваркі разьбілі еднасьць жыдоўскага народу, што прывяло дзяржаву да падзелу на Ізраіль са сталіцай Самарыяй, і Юдэю са сталіцай у Ерусаліме.

Гэтым падзелам жыды аслабілі сябе яшчэ больш і сталіся ахвярай асырыйцаў, а пасьля вавілонцаў. У 721 годзе да н.э. асырыйцы занялі Ізраіль, а ў 567 годзе вавілонскі цар Навухаданосар II заняў Сырыю й Палестыну. Вавілонія й Асырыя былі першымі біблейнымі імпэрыямі, якія знаходзіліся ў даліне рэк Тыгр і Еўфрат. Упадак дзяржавы Ізраіля жыды тлумачылі непасрэдным вынікам ідалапаклонства Саламона й ягоных наступнікаў.

Жыды рабілі спробы вызваліцца з залежнасьці акупантаў і падымалі рэвольты ў 597 і 586 гадох да н.э. Каб уціхамірыць жыдоўскі нацыянальна-рэлігійны шавінізм, спалены былў да фундаманту каралеўскі палац і слаўная Ерусалімская сьвятыня Саламона, а жыды пайшлі з Абяцанай Зямлі Ханаан у асырыйскую й вавілонскую няволю.

З маральнага пункту гледжаньня й матэрыяльнага быту былі гэта цяжкія няволі для жыдоў. Праваслаўная царква так згадвае жыдоў у вавілонскай няволі: „На реках вавилонских, тамо седохом я плакахом, внегда помянути нам Сияона". Жаль па бацькаўшчыне й любоў да яе выказваецца далей у псальме: „Како воспоем песнь Господню на земле чуждей; Аще забуду тебе, Иерусалиме, забвенна буди десница моя".

Канец жыдоўскай няволі палажыў у 538 годзе да н.э. пэрсідзкі імпэратар Кір Вялікі. Ён і яго наступнікі дазволілі жыдам, пасьля нейкіх пяцідзесяці гадоў вавілонскай няволі вярнуцца ў Ерусалім. Аднак многа жыдоўскіх сем'яў засталіся жыць далей у новай краіне. Вярнулася на бацькаўшчыну 50 тысяч жыдоў, якія адбудавалі зьнішчаную сьвятыню ў Ерусаліме. Быў гэта звычайны будынак у параўнаньні да папярэдняй сьвятыні Саламона, але меў ён важнае значэньне для жыдоў.

Жыды, якія пайшлі ў асырыйскую няволю, былі абсарбаваны й па іх нічога не засталося. Затое вавілонская няволя сталася зваротным пунктам у гісторыі жыдоўскага народу. Там жыды мелі сваё сьвяшчэннае пісьмо, якое прынесьлі яны з сабою з Палестыны й яно гуртавала іх вакол права Майсея.

Калі жыды вярнуліся ў Палестыну ў 539 годзе да н.э., то ў першую чаргу аднавілі рэлігію сваіх продкаў і практыкавалі свае абрады ў межах Пэрсідзкай імпэрыі. Ад гэтага часу юдаізм пачаў прымаць акрэсьленую форму, дзе рэлігія заняла вядучае месца. А прывезеныя сьвятаром Эздрам сьвяшчэнныя кнігі жыдоўскага права з Вавілоніі, каля 400 году да н.э., сталіся нацыянальным законам жыдоўскага жыцьця.

Пэрсідзкі кароль даў Эздру аўтарытэт над усімі жыдоўскімі рэлігійнымі справамі й ён правёў многа рэформаў, якія зрабілі яго „бацькам сучаснага юдаізму". Жыды, што праўда, мелі сваё ўстаноўленае права ад часу Майсея, але пазьнейшая ўтрата свае дзяржаўнасьці, выгнаньне з дому й паняволеньне аслабілі жыдоўскую традыцыю. Гэта разглядалася Эздрам як Боская кара за грахі й таму большая ўвага была зьвернута на навучаньне жыдоў свайго права, каб зрабіць іх „народам кнігі".

Ня ўсе жыды віталі рэформы Эздры, дзе трэба было даказаць чысьціню свайго жыдоўскага паходжаньня й развясьціся з жонкамі, якія не былі жыдоўкамі. Гэтым намячалася захаваць чысьціню жыдоўскай расы, каб зрабіць яе „сьвятою". Такая жыдоўская „сьвятасьць" не дазваляла жыць паганцам у Ерусаліме.

Пасьля пэрсаў Палестынай у 332 годзе да н.э. завалодаў Аляксандар Македонскі (336-323), які стварыў найбольшую імпэрыю, якую перад гэтым ня бачыў сьвет. Аляксандар гарантаваў усім краінам і народам імпэрыі іхнюю маёмасьць і правы. Жыды прынялі спакойна зьмену ўлады. Аляксандар дазволіў ім жыць згодна сваіх старых законаў і звольніў іх ад некаторых абавязкаў.

Тады якраз адчыніліся дзьверы грэцкай культуры й цывілізацыі, якія завіталі ў Палестыну й Егіпет. Жыды прынялі ахвотна новую культуру й ёю карысталіся ў штодзённым жыцьці, што нават пачалі забываць сваю яўрэйскую мову. У той-жа час Біблія была перакладзена на грэцкую мову. Жыдоўскія ўстановы, школы, тэатры, бібліятэкі, пісьменьнікі былі наскрозь прасякнуты грэцкай філязофіяй, што не зусім падабалася прававерным юдэям і гэта завастрыла канфлікт супраць гэленскай культуры грэкаў.

Палестына пасьля Аляксандра Македонскага

Сьмерць Аляксандра Македонскага, якая спаткала яго на 33-м годзе жыцьця ў Вавілоне ў 323 годзе да н.э. спрычынілася да падзелу ягонай імпэрыі. На егіпецкі трон мясцовых фараонаў сеў генэрал Аляксандра, грэк Пталамей, які стаў закладчыкам новай дынастыі. Ягонай сталіцай была Александрыя ў Егіпце, заложаная Аляксандрам Вялікім Македонскім. У яе эміграваля многа жыдоў, якія жылі ў сваіх гетах. Мелі яны свае незалежныя арганізацыі на чале з Радай Старшых і свабодна практыкавалі сваю рэлігійную абраднасьць у сынагогах.

Пад кіраўніцтва Пталамеяў сьпярша папала й Палестына (323-200 г. да н.э.), а пасьля трапіла яна пад сырыйскую дынастыю. Былі гэта грэцкія дынастыі гэленскай культуры, мова ў якіх была грэцкая. Грэкі кіравалі Егіптам і Палестынай на працягу апошніх стагодзьдзяў старой эры.

Нацыянальна-рэлігійнае жыццё жыдоў у Палестыне выглядала зусім добра. Толькі таму, што грэкі мелі вярхоўную ўладу, свабодна прыязджалі ў Палестыну, закладалі свае калёніі, вялі адміністрацыю й пашыралі сваю культуру, стала гэта галоўнай прычынай жыдоўскага незадаваленьня. А дзейнасьць сырыйскага караля Антыёха IV (175-163), які пачаў умешвацца ў рэлігійныя й нацыянальныя справы жыдоў, выклікала бунт.

Жыдоўскі народ, памятаючы сваю гістарычную веліч і славу, ня мог пагадзіцца з чужой дамінацыяй і дамагаўся сваёй нацыянальнай свабоды. Нацыянальна-рэлігійныя пераканаьні жыдоў прывялі іх да вострага канфлікту з гэленістычным сьветам грэкаў, які рабіў уплыў на жыдоў. Культура гэтага сьвету вабіла многіх жыдоў, якія пачалі занядбоўваць сваю абраднасьць.

Супраць такой дзейнасьці выступіла многа жыдоў, якія здавалі сабе справу зь небясьпекі ад гэленскай культуры, якая можа зьмяшаць іх з другімі народамі. Таму ў 167 годзе да н.э. жыды збунтаваліся, паднялі паўстаньне супраць сырыйскай адміністрацыі ў імя свае жыдоўскай апрычонасьці.

Лідар паўстаньня, сьвятар Юда Макавей, заклікаў жыдоў вярнуцца да традыцыі бацькоў. Ён зрабіў дагавор з Рымскай рэспублікай і вёў перамовы аб помачы супраць сырыйцаў, але, не дачакаўшыся адказу, быў забіты ў баі ў 160 г. да н.э. Змаганьне прадаўжалі сыны Макавея, Янатан і Сымон, і яны дабіліся рэлігійнай і нацыянальнай свабоды для свайго народу.

Дзякуючы Макавеям, першы раз ад упадку Ерусаліма ў 597 г. да н.э., жыды ў 142 годзе да н.э. асягнулі сваю незалежнасьць. Наступныя кіраўнікі Палестыны прымалі тытулы „каралёў", утрымоўвалі прыязныя адносіны з Рымам, занялі Самарыю, Галілею, Ідумею (сёньня Нэгаў) і так кіравалі да 63 году да н.э.

У гэтым-жа 63 годзе, карыстаючы унутранай дынастычнай дыспутай жыдоў, Юдэя была занята рымскім генэралам Пампэем. Жыды адчынілі брамы Ерусаліма, але часьць іх захапіла Ерусалімскую сьвятыню й на працягу трох месяцаў баранілася. Аднак рымлянам удалося ўварвацца ў сьвятыню й зламаць супраціў. У гэтым баі мела загінуць

12 тысяч жыдоў, а тысячы іх былі высланы ў Рым як нявольнікі. Пасьля былі яны звольнены й залажылі ў Рыме вялікую калёнію.

Такім парадкам Юдэя апынулася пад рымскім пратэктаратам. Як раней у сваёй гісторыі, так пад рымскім пратэктаратам, Юдэя была сталым месцам розных непаразуменьняў. Яе жыдоўскі народ на працягу стагодзьдзяў верыў і маліўся аднаму Богу — Ягвэ й усхваляў Яго ў песьнях, псальмах, ды адмаўляў маліцца рымскаму богу — імпэратару.

Жыдоўская рэлігія зьяўляецца адным з найстарэйшых веравызнанняў. Яе паходжаньне ёсьць запісана ў Бібліі, якую хрысьціяне называюць Старым Запаветам. Першыя пяць кніг Бібліі былі напісаныя Майсеем. Гэтыя пяць кніг, або адна кніга падзеленая на пяць разьдзелаў, якую жыды называюць Тора (Права, або Закон), абымае перыяд часу ад Аўраама да сьмерці Майсея. Паколькі гэтую кнігу быццам напісаў Майсей па ўказаньні Бога, зь Якім ён меў непасрэдны кантакт, таму Тора ня можа быць заменена або дапоўнена.

З гістарычна-навуковага пункту гледжаньня маюцца паважныя засьцярогі да Бібліі. Па-першае, гістарычная крытыка заключаецца ў адсутнасьці арыгіналу, або часу зробленай копіі. Па-другое, як можна спраўдзіць пададзеную ў Бібліі інфармацыю, калі на іх няма ніякага пацьверджаньня. Таму некаторыя сучасныя дасьледчыкі ня вераць, што першыя кнігі Бібліі мог напісаць Майсей, і адносяць іх на пазьнейшы час.

Да гэтых першых жыдоўскіх кнігаў даходзіць яшчэ Талмуд — збор вусных законаў, якія складаліся на працягу стагодзьдзяў. Ёсьць два выданьні Талмуду — Вавілонскі й Палестынскі або Ерусалімскі. Першы карыстаецца большым аўтарытэтам за другі.

Уся гэтая літаратура, якая складае Біблію, зьяўляецца для жыдоў найбольшым дарам, які даў ім Бог. Праз гэтую літаратуру жыды трымаліся разам на працягу доўгіх стагодзьдзяў пасьля іхняга выгнаньня, уцёкаў і міграцыі з Палестыны ў краіны басейна Міжземнага мора.

Біблія прадстаўляе сабою ня толькі гісторыю рэлігіі народу Ізраіля, але заключае ў сабе калекцыю старажытных дакумантаў, якія кідаюць сьвятло на разьвіцьцё тагачаснай

цывілізацыі. Таксама Біблія апісвае змаганьне жыдоў з акружаючымі іх народамі.

Нейкіх 700 гадоў да н.э. прарок Ісая прадказаў, што на зямлю прыйдзе Мэсія, якога слава будзе большая за Саламона. Мэсія меў прыйсьці на зямлю, каб адкупіць людзкасьць і вярнуць славу Давіда й Саламона. Меў ён прыйсьці з роду Давіда. Усё гэта мела адбыцца, выключна, пад жыдоўскім кіраўніцтвам як выбранага Богам народу.

Акрамя рэлігійных і бытавых спраў, як ужо вядома, немалую ролю ў Палестыне адыгралі палітычныя й нацыянальныя справы. На гэтым якраз фоне паўстала найбольш непаразуменьняў, дзе тагачасная рымская адміністрацыя Юдэі мела найбольшы клопат. Гэта паслужыла прычынай таго, што ў 44 годзе да н.э. Юдэя была аддадзена пад непасрэднае кіраўніцтва рымскага пракуратара.

Пракуратар і рымская адміністрацыя апынуліся ў даволі прыкрай сытуацыі. З аднаго боку яны рэпрэзэнтавалі й трымалі ўладу — аўтарытэт Рымскай імпэрыі, але з другога боку павінны былі лічыцца з жыдоўскімі рэлігійнымі і нацыянальнымі імкненьнямі. Жыды, што праўда, не прадстаўлялі сабою рэлігійна-нацыянальнага маналіту, а былі падзеленыя на групы, аднак усе яны імкнуліся да свае рэлігійнай і нацыянальнай незалежнасьці. І з гэтым рымлянам трэба было лічыцца.

Найбольшымі сярод жыдоўскіх групаў былі садукеі й фарысеі, якія паміж сабою не заўсёды жылі згодна, але якія надавалі галоўны тон жыдоўскай рэлігіі, традыцыі й палітыцы. Садукеі былі меншай, але вядучай групай юдаізму, якая кантралявала сынагогу і яе галоўныя сьвятыні. Быў гэта заможны кляс людзей, які супрацоўнічаў з рымскімі ўладамі, прымаў грэка-рымскую культуру й прыхільна ставіўся да іншых нежыдоўскіх народаў, ад чаго меў карысьці. Садукеі строга трымаліся ўстаноўленага парадку, запісанага ў сьвяшчэннай кнізе юдэяў — Бібліі й не прызнавалі ніякіх новых дапаўненьняў.

Праціўнікамі садукеяў былі фарысеі — жыды з жыдоў. Тварылі яны асобную групу, якая мела насьледаваць жыдоўскае права штодзённага жыцьця. Хоць фарысеі не выступалі супраць існуючага права, але на першае месца ставі-

лі чысьціню свае рэлігіі, яе традыцыі, сьвяшчэннае пісьмо й выступалі супраць кантактаў з чужынцамі. Аднак і сярод фарысеяў не было еднасьці. Была гэта група розных грамадзкіх слаёў сярэдняй клясы, якая абараняла Божае Права й мела за сабою людзей.

Як прыклад непаразуменьняў паміж садукеямі й фарысеямі можа паслужыць тагачасны запіс: „Бо садукеі кажуць, што няма ўваскрэсеньня, ані ангела, ані духа; а фарысеі-ж прызнаюць і тое, і другое" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 23:8).

Былі яшчэ й другія жыдоўскія групы, сярод якіх згадаем зілотаў. Да іх належалі найбольш заўзятыя жыды, якія тварылі тайныя арганізацыі, што выступалі супраць жыдоў, якія паддаліся чужым уплывам. Яны выказвалі супраціў рымскай акупацыі й былі галоўнымі завадзіламі розных бунтаў.

Сярод гэтых рэлігійных сэктаў была яшчэ адна сэкта так званых эсэнаў. Абшчына іх тварыла групу з 4 000 жыдоў, якія жылі каля Мёртвага мора. Звалі яе яшчэ кумранскай ад назвы мясцовасьці Ваді-Кумран. Там пасьля Другой Сусьветнай вайны арабскія пастухі выпадкова знайшлі ў пячоры рукапісы гэтай абшчыны.

Эсэны верылі ў Мэсію, які прыйдзе на зямлю збавіць некаторыя душы, а ня ўсіх жыдоў як нацыю. Эсэны захоўвалі чысьціню жыдоўскага права й вялі сваё жыцьцё бязгрэшна, у адасобленасьці ад грэшнага сьвету, што напамінае пазьнейшых хрысьціянскіх манахаў. Эсэнскае вучэньне, як паказалі знойдзеныя ў пячоры каля Мёртвага мора рукапісы, зрабілі вялікі ўплыў на фарміраваньне раньняга хрысьціянства.

У большасьці выпадкаў жыдоўская абраднасьць заключалася ня толькі на маленьнях, захаваньню сьвятой суботы й іншых сьвят, але ня менш на захаваньні свае апрычонасьці. Прававерныя жыды не сядалі за стол есьці разам зь іншымі людзьмі нежыдоўскага паходжаньня. Рымляне не маглі зразумець такое дзіўнае захаваньне жыдоў, але яны былі прызвычаены да розных дзіўных звычаяў і навыкаў розных народаў свае абшырнай імпэрыі й сярод іх талеравалі жыдоў.

Большасьць жыдоў ганарылася сваімі продкамі, сваёй рэлігійнай абраднасьцю, якая мела за сабою блізка 2000 гадоў гісторыі. Ды што праўда, юдаізм зьяўляецца найбольш старажытнай монатэістычнай рэлігіяй, гэта значыць, рэлігіяй,

якая аддае пашану толькі аднаму Богу — Ягвэ. Жыды верылі ў закон, які дадзены быў Богам Майсею на гары Сінаі, калі ён вёў іх продкаў зь егіпецкай няволі ў Абяцаную Ханаанскую зямлю каля XIV ці XII стагодзьдзяў да н.э.

Рымскае права прызнавала пэўную аўтаномію мясцовым жыхарам свае імпэрыі, якія састаўлялі асобнае племя. І каб прымірыць жыдоў, у 40 годзе да н.э. рымляне прызналі Ірада І Вялікага жыдоўскім каралём і ён у 37 годзе да н.э. устанавіў сваю адміністрацыю ў Ерусаліме.

Ірад быў жыдам па рэлігіі, але ня вельмі рэлігійным. Сям'я яго паходзіла з правінцыі Ідумеі, што знаходзіцца на поўдні ад Юдэі, а маці была арабкай. Пры канцы II стагодзьдзя да н.э. Ідумея была заваявана жыдоўскімі каралямі Юдэі й сілаю змушана была прыняць юдаізм.

Так, што Ірад ня вельмі трымаўся жыдоўскай веры й традыцыі. Жыхары Юдэі павінны былі прыносіць прысягу на вернасьць ня толькі Іраду, але й рымскаму імпэратару. Ірад абкладаў жыдоўскае насельніцтва вялікімі налогамі, канфіскаваў зямлю ў сваіх праціўнікаў і раздаваў яе сваякам і фаварытам.

Усё-ж Ірад быў руплівым каралём, які, нягледзячы на сваю антыпатыю да жыдоў, адбудаваў Ерусалімскую сьвятыню. Тысяча рабінаў вучылася малярству й сталярству, каб іншыя брудныя рукі не маглі датыкацца да сьвятога месца. Быў гэта не адзін будынак, а цэлы комплекс збудаваньняў, якія будаваліся паміж 19 і 9 гадамі да н.э., ды некаторыя работы прадаўжаліся аж да 64 году н.э.

Як на злосьць, супраць жыдоўскага закону, Ірад умясьціў на браме збудаванай сьвятыні фігуру арла. Гэта абурыла жыдоў, якія збунтаваліся й зьнішчылі арла, які меў быць супраць закону Майсея. За гэта Ірад пакараў кіраўнікоў бунту карай сьмерці на кастры. Акрамя галоўнай сьвятыні Ірада ў Ерусаліме згадваецца ў той час сем сынагогаў.

Як праяву свайго незадаваленьня да мясцовых жыдоў Ірад паклікаў на высокіх сьвятароў жыдоў не зь ерусалімскай арыстакратыі, а з Александрыі. Гэта ўжо сьведчыць, што паміж Ірадам і жыдоўскімі рабінамі Ерусаліма не было згоды.

Ірад кіраваўся, як бачым, традыцыяй Давіда, Саламона й некаторых другіх жыдоўскіх каралёў, якія супрацоўні-

чалі са сваімі суседзямі, не ставячы на першае месца рэлігію. Факты сьведчаць, што Ірад быў верным саюзьнікам рымлянаў.

Час каралеўства Ірада можна падзяліць на тры перыяды, ад 37 года да 4 году да н.э. У першым перыядзе (37-27) вялася барацьба супраць сваіх ворагаў са старой дынастыі. Барацьба вялася дарогай сьмяротных пакараньняў.

У дрыгім перыядзе (27-13) вялася разбудова гарадоў з тэатрамі, палацамі, амфітэатрамі, стадыёнамі, гіпадромамі, рэзэрвуарамі на ваду, ад якіх нешта захавалася да нашага часу. Ірад умацоўваў гарады, будаваў крэпасьці (напрыклад, Масада) на заходнім беразе Мёртвага мора й т.п.

Трэці перыяд панаваньня Ірада (13-4) адзначаецца ўнутранымі канфліктамі. Яго дзесяць жонак прывялі некалькі насьледнікаў, зь ліку якіх Ірад выбраў Антыпатра й яму меў перадаць каралеўства, што было запісана ў тастаманце. Ірад быў стары, меў нейкіх 70 гадоў і быў цяжка хворы. Сын Антыпатр пачаў дзейнічаць як кароль і гэта моцна ўразіла бацьку, што ён з дазволу Аўгуста пакараў сьмерцю свайго сына.

Пяць дзён пасьля сьмерці Антыпатра, якая наступіла перад самай Пасхай у 4 годзе да н.э., памёр бацька — кароль Ірад Вялікі. Быў гэта найбольш магутны кароль пасьля Давіда, але ніколі ня быў ён папулярны сярод жыдоў. Сьмерць Ірада выклікала хваляваньні ў Галілеі й на поўдні Палестыны, якія былі скіраваны супраць сыноў Ірада, каб не дапусьціць іх да ўлады. Дзьве тысячы зілотаў было ўкрыжаваных.

У 6 годзе н.э. Юдэя й Самарыя былі ўключаны ў імпэратарскую правінцыю, якая кіравалася намесьнікамі імпэратара. Але некаторыя правы былі пакінуты кіраўнікам жыдоўскай сьвятыні й сьвецкай адміністрацыі. Сынам Ірада Вялікага: Архелаю, Філіпу й Іраду Антыпе, якія сталіся васаламі Рыму, было дазволена кіраваць акраінамі Палестыны. Галілея й Пярэя апынуліся пад уладай Ірада Антыпы аж да 39 году, пры якім Ісус Хрыстос прапаведаваў сваю навуку ў Галілеі.

(„Голас Часу" № 1, ліпень-жнівень 1989 г. і № 2, Лёндан, верасень-кастрычнік 1989 г)

Ісус Назаранін

Быў амаль пачатак нашай эры, калі ў Віфляеме нарадзіўся Ісус. Мы вельмі мала знаем пра Яго першыя 30-ць гадоў жыцьця. А ў біяграфіі вялікіх людзей і сьвятых важна знаць іхняе дзяцінства, умысловае разьвіцьцё й другія дэталі з жыцьця, якія прадстаўляюць веліч будучай асобы. На жаль, аб Ісусе гэтага мы не знаходзім.

Ці-ж апосталы ня ведалі пра маладыя гады Ісуса? Чаму яны не запыталі Яго самога або маткі Марыі? А можа яны пыталі й не атрымалі адказу?.. Што праўда, протаевангельле згадвае маладыя гады Ісуса, але яны не ўваходзяць у састаў кананічных кнігаў. Дзеля таго зьвернемся тут да Евангельля, хоць і яно не дае поўнай біяграфіі Ісуса Хрыста, аднак Яго нараджэньне апісвае так:

„Калі Ісус нарадзіўся ў Віфляеме Юдэйскім у дні цара Ірада, прыйшлі ў Ерусалім магі з Усходу й кажуць: Дзе народжаны Цар Юдэйскі? бо мы бачылі зорку Яго на ўсходзе й прыйшлі пакланіцца Яму. Пачуўшы гэта, Ірад цар занепакоіўся й увесь Ерусалім зь ім. І, сабраўшы ўсіх архірэяў і кніжнікаў народных, пытаўся ў іх: дзе павінен нарадзіцца Хрыстос? Яны-ж сказалі яму: у Віфляеме Юдэйскім, бо гэта напісана праз прарока.

Тады, Ірад тайком прыклікаў магаў, выведаў ад іх час зьяўленьня зоркі. І, паслаўшы іх у Віфляем, сказаў: пайдзеце, добра разьведайце пра Дзіцятка і, калі знойдзеце, паведаміце мяне, каб і мне пайсьці пакланіцца Яму. Яны, выслухаўшы цара, пайшлі. І вось зорка, якую бачылі яны на ўсходзе, ішла перад імі, пакуль нарэшце, прыйшоўшы, не спынілася над месцам, дзе было Дзіця. І, увайшоўшы ў дом, убачылі Дзіцятка з Марыяй, маткай Яго, і ўпаўшы пакланіліся Яму і, адчыніўшы скарбы свае, прынесьлі Яму падаркі: золата, ладан і сьмірну. І, меўшы ў сьне наказ ад Бога не варочацца да Ірада, іншым шляхам адышлі ў старану сваю.

Калі яны адышлі, вось, Ангел Гасподні зьяўляецца ў сьне Язэпу й кажа: устань, вазьмі Дзіця й матку Яго й бяжы ў Егіпет і будзь там, пакуль не скажу табе, бо Ірад хоча шукаць Дзіцятка, каб забіць Яго. Ён устаў уначы, узяў Дзіцят-

ка й матку Яго й пайшоў у Егіпет. Тады Ірад угледзеўшы, што магі зь яго насьмяяліся, вельмі разгневаўся й паслаў выбіць усіх дзяцей у Віфляеме й усіх ваколіцах яго, ад двух гадоў і малодшых, паводле часу, які выведаў ад магаў.

Па сьмерці-ж Ірада, вось Ангел Гасподні ў сьне зьяўляецца Язэпу ў Егіпце й кажа: устань, вазьмі Дзіцятка й матку Яго й ідзі ў зямлю Ізраілеву, бо памерлі шукаўшыя душу Дзіцяткі. Ён устаў, узяў Дзіцятка й матку Яго й прыйшоў у зямлю Ізраілеву. А пачуўшы, што ў Юдэі пануе Архелай замест Ірада, бацькі свайго, пабаяўся туды ісьці, але папярэджаны ад Бога ў сьне, пайшоў у межы Галілейскія. І, прыйшоўшы, асеў у месьце, званым Назарэт, каб споўнілася сказанае праз прарокаў, што Ён Назарэем назавецца" (Суд. 15,5; Мць. 2: 1-5, 7-9, 11-14, 19-23).

Калі Ісус меў 12 гадоў, бацькі ўзялі Яго ў Ерусалім на сьвяткаваньне Пасхі. Была вясна, многа сышлося людзей у Ерусалім, каб ушанаваць гэтую гістарычную падзею. Сярод шматлікага натоўпу згінуў іхні Сын. І толькі назаўтра знайшлі Яго ў сьвятыні сярод адукаваных людзей, каторым даваў Ён пытаньні й адказы, што ўсе былі зьдзіўлены.

Пасьля гэтага мы нічога ня знаем пра Ісуса аж Яму было 30 гадоў. А гэта таму, што паводле тагачаснага закону забаранялася чалавеку навучаць людзей і называць сябе настаўнікам ня маючы скончаных трыццаці гадоў. Увесь гэты час, васемнаццаць гадоў, Ісус жыў у Назарэце й займаўся сталярствам.

Назарэт знаходзіўся ў Галілеі, якая была густа заселенай і даволі заможнай правінцыяй. Галілея была незалежнай ад Юдэі й была месцам шматлікіх нацыяналістычных і рэвалюцыйных рухаў, якія паявіліся на рубяжы старой і новай эры ў часе жыцьця Ісуса. Нават адзін з блізкіх сваякоў Хрыста, Сымон, належаў да гэтых рэвалюцыянераў і таму называлі яго Зілотам. Згінуў ён сьмерцю мучаніка на крыжы ў часе прасьледу.

Хоць Юдэя на поўдні была бяднейшаю за Галілею, але глядзела на апошнюю зь недаверам і бачыла ў ёй малаадукаваных і маларэлігійных сялян. Сярод гэтага насельніцтва Галілеі жыў Ісус і працаваў мясцовым столярам.

У гэтым часе жыдоўскі прапаведнік Ян Хрысьціцель, які быў сваяком Ісуса, гаварыў аб непазьбежным прыходзе Цар-

ства Нябеснага. Ён заклікаў народ пакаяцца й ачысьціцца ад усіх грахоў. Выражэньнем такога ачышчэньня ад грахоў было хрышчэньне ў вадзе Ярдану.

Сваімі пропаведзямі Ян Хрысьціцель прыцягваў да сябе многа людзей і рабіў на іх вялікі ўплыў. Гэтага найбольш пабойваўся тэтрарх Антыпа, малодшы брат Ірада Вялікага. Прыходзіў слухаць Яна Хрысьціцеля й Ісус і ад яго прыняў хрышчэньне ў рацэ Ярдан. Аб хрышчэньні Ісуса ў Ярдане згадвае евангеліст Мацьвей:

„Тады прыходзіць Ісус з Галілеі на Ярдан да Яна хрысьціцца ў яго. Ян-жа ўстрымліваў Яго, кажучы: мне трэба хрысьціцца ў Цябе, а Ты прыходзіш да мяне. Але Ісус сказаў яму ў адказ: пакінь цяпер; бо так нам цяпер належыць выпаўняць усякую праўду. Тады Ян дапускае Яго. І, ахрысьціўшыся, Ісус зараз-жа выйшаў з вады, і вось расчыніліся Яму нябёсы, і ўгледзеў Ян Духа Божага, Каторы зыходзіў, як голуб, і спускаўся на Яго. І вось голас зь неба гаворыць: Гэта ёсьць Сын Мой улюбёны, якому спагадаю" (Мць. 3:13-17).

Прыняўшы хрышчэньне, Ісус пайшоў у пустыню, дзе пасьціў і маліўся праз сорак дзён. У гэтым часе Ісуса хацеў спакусіць Сатана, які спакусіў жыдоў у часе іхняга саракавога прабываньня ў пустыні, калі яны адвярнуліся ад сапраўднага Бога й пачалі пакланяцца ідалам. Сатана абяцаў Ісусу магічную сілу, уладарства сьветам і т.п., але Ісус не даўся спакусам, а застаўся верным наказам Бога, якія былі дадзены жыдам у часе іхняга прабываньня ў пустыні.

Пасьля посту, малітваў і спакусаў Ісус пакінуў дом бацькоў і пайшоў прапаведаваць сваю навуку. Ён быў адзін, ня меў арганізацыі, якая падтрымала-б Яго й ня меў грошай на сваё ўтрыманьне. Часта прыходзілася быць галодным, змучаным падарожжам і так аднойчы прыбыў Ісус у Капэрнаум. Быў гэта прыгожы рыбацкі гарадок над берагам Галілейскага мора й тут спаткаў Ён чатырох рыбакоў: Сымона, Андрэя, Якава й Яна. Ісус запрапанаваў ім пакінуць усё й стаць ад гэтага часу „рыбакамі людзей".

У хаце Сымона й Андрэя Ісус паказаў сваю сілу над злым духам і сваю любоў да людзей. Такім чынам Ісус знайшоў для свае дзейнасьці больш вучняў, якія мелі малую ашчаднасьць і яны жылі пераважна з гасьціннасьці людзей. Ся-

род сваіх вучняў Ісус выбраў дванаццаць апосталаў, якія былі Ягонымі памочнікамі. Слова „апостал" значыць пасланьнік — чалавек пасланы са спэцыяльнай місіяй.

Ісус прапанаваў сваю навуку ў сынагогах і адкрытых мясцох, не карыстаючыся сьвяшчэннымі кнігамі. Але быў ён узгадаваны ў жыдоўскай веры, паводле старых кнігаў і на гэтых кнігах асноўваў сваю новую навуку й веру. Часам расказваў Ісус людзям звычайныя гісторыі зь іхняга штодзённага жыцьця й параўноўваў іх да зьявішчаў у прыродзе.

Карыстаўся Ісус у кантактах зь людзьмі мясцовай арамэйскай мовай, якая была адной з сэміцкіх і якую зналі ў Палестыне й Сырыі. Але некаторыя дасьледчыкі гавораць, што Ісус прапаведаваў таксама й на грэцкай мове. Гэта магчыма, бо-ж на працягу трох стагодзьдзяў грэцкія ідэі, звычаі й адміністрацыя мелі ўплыў ня толькі на багатых жыхароў Палестыны, як арыстакратыю, але й на бедных. Гэта прызнаў нават рымскі пракуратар Понцій Пілат, калі даў пазьней свой надпіс на крыжы на габрэйскай, грэцкай і лацінскай мовах. Але ў вачох рымлян і грэкаў жыды былі паніжаным народам. Мы ня будзем тут успамінаць падрабязна навуку Ісуса й Ягоныя шматлікія цуды, бо яны ёсьць запісаны ў Евангельлі.

Было гэта за рымскага пракуратара Понція Пілата (26-36), калі Ісус з Назарэту прапаведаваў сваю веру у роднай Галілеі. Пасьлядоўнікі новай веры называлі Ісуса Мэсіяй, што ў грэцкай мове значыць Хрыстос. Спачатку жыды слухалі новую навуку свайго земляка Хрыста, але неўзабаве пачалі бунтавацца супраць яе й супраць Хрыста. Яны думалі, што на зямлю прыйдзе Мэсія, які сапраўды верне ім славу Давіда й Саламона, ды зробіць жыдам царства зямное.

Царства Ісуса Хрыста не было зямное, а Нябеснае й яно адносілася ня толькі да жыдоў, як выбранага народу, але да ўсіх людзей. Хрыстос адкінуў жыдоўскае цьверджаньне выбранага народу Богам пасьля Аўраама, Ісаака й Якава, а гаварыў, што ўсе людзі зьяўляюцца роўнымі перад Богам. Гэтым, быццам, Ісус Хрыстос панізіў жыдоўскі народ.

Эпоха, у якой жыў і прапаведаваў сваю веру Ісус Хрыстос, была вельмі неспрыяльнай для Яго навукі. На гэта складаліся палітычныя абставіны Рымскай імпэрыі, яе па-

ганска-рэлігійныя вераваньні розных народаў, расаў, сэктаў, грэцкая філязофія, а найбольш жыдоўскія летуценьні як выбранага Богам народу.

Гэтыя чатыры аснаўныя фактары склалі тагачасную эпоху, у якой прыходзілася жыць і дзейнічаць Ісусу Хрысту. Яго навука насіла ў сабе паступовы зьмест, прымала розгалас, але не была яна гвалтоўнай. Такім чынам ствараласа своеаблівая эпоха, якая сталася зваротным пунктам у гісторыі ня толькі Палестыны, але ўсяго акружаючага яе сьвету.

Пасьля трохгадовага вучэньня, у даволі прыязнай Галілеі, Хрыстос пайшоў у варожую для Яго сталіцу Ерусалім. Апошні раз быў Ён тут на Пасху, як было Яму дванаццаць гадоў. Гэтым разам ішоў Ісус Хрыстос са сваімі вучнямі й ішло многа народу зблізку й здалёку, каб ушанаваць Пасху — вялікае жыдоўскае нацыянальнае сьвята іхняга выхаду зь егіпецкай няволі, калі нарадзілася нацыя Ізраіля. І калі ўваходзілі яны ў Ерусалім, Ісус дарогаю адклікаў дванаццаць сваіх вучняў асобна й сказаў ім:

„Вось мы ўваходзім у Ерусалім, і Сын Чалавечы выдадзены будзе архірэям і кніжнікам, і асудзяць Яго на сьмерць і выдадуць Яго паганам на зьдзек і біцьцё й ўкрыжаваньне, і на трэці дзень уваскрэсьне" (Мць. 20:18-19).

Што аб гэтым маглі падумаць вучні Хрыста? Ці былі яны гатовы стаяць далей пры Яго баку, прадаўжаць Яго работу й памерці разам зь Ім? Быў гэта для апосталаў вырашальны час, альтэрнатыва.

Аднак народ спаткаў Хрыста ў Ерусаліме ўрачыста, як караля, бо-ж быў Ён з роду караля Давіда, народжанага ў Віфляеме. Але замест ехаць у пышнай карэце, як гэта робяць каралі, Хрыстос уехаў у Ерусалім на асьле. І калі зайшоў Ён там у сьвятыню й пабачыў, што ў ёй ідзе гандаль таварам, Ісус выгнаў гандляроў, перавярнуў іхнія сталы, рассыпаў грошы й выходзячы сказаў: „Ці-ж напісана: дом Мой домам малітвы ўсім народам будзе названы, а вы зрабілі яго прытонам разбойнікаў" (Мць. 11:17).

Такі паступак Ісуса Хрыста ў Ерусаліме й Ягоная новая навука не падабаліся жыдоўскім кансэрватыўным старшыням і яны ад даўжэйшага часу дзейнічалі супраць Хрыста. Цяпер, для ворагаў Хрыста, наступіў рашаючы час.

У чацьвер Хрыстос меў Апошнюю вячэру са сваімі вучнямі й сказаў, што адзін зь іх, прысутны на вячэры, прадасьць Яго, і што было-б лепш, каб гэты чалавек не радзіўся. Далей евангеліст Марк падае: „І калі яны елі, Ісус, узяўшы хлеб, блаславіў яго ды, паламаўшы, даў ім і сказаў: вазьмеце, ешце; гэта ёсьць цела Маё. І, узьняўшы чашу й аддаўшы хвалу, падаў ім: і пілі яе ўсе. І сказаў: гэта ёсьць кроў Мая новага запавету, што за многіх праліваецца" (Мк. 14:22-24).

(„Голас Часу" № 3, Лёндан, 1989 г.)

Ісус — Цар Юдэйскі

Як прадказаў Ісус Хрыстос сваім вучням, Ён быў арыштаваны ў Ерусаліме. Арышт наступіў у садзе Гефсіманскім з-за здрады Юды Іскарыёта, аднаго з вучняў Хрыста, які ў паразуменьні з Сынедрыёнам прывёў жаўнераў зь мячамі й натоўп з каламі. Ісус спытаў іх: „Каго шукаеце?" — „Ісуса Назараніна", — адказаў Малх, адзін з жаўнераў. „Я ёсьць Ісус Назаранін", — адказаў Ісус. Малх ня быў пэўны й глянуў на Юду, які, паводле дамоўленасьці, падышоў да Хрыста і, сказаўшы „Раві", пацалаваў Яго. Двух жаўнераў узялі Хрыста пад рукі весьці, тады Пётр, стаяўшы недалёка, выцягнуў меч і адным махам адсек вуха Малху. Хрыстос не любіў мяча й зьвярнуў увагу Пятру. Быў гэта адзіны фізычны ўдар зроблены ў абароне Хрыста, які ёсьць запісаны.

Зараз пасьля арышту Хрыста, вучні яго спалохаліся, рассыпаліся, пахаваліся. Толькі Пётр з адным здалёк сьлядзілі за рухам Хрыста. І калі адна жанчына пазнала Пятра й сказала, што ён адзін з тых, гэта значыць вучняў Хрыста, то Пётр ад страху тройчы адмовіўся. І сталася так, як яму нядаўна сказаў Хрыстос:

„Запраўды кажу табе, што ты сёньня, у гэтую самую ноч, перш, чым певень двойчы прапяе, тры разы адрачэшся ад Мяне" (Мк. 14:30).

Пётр быў чалавекам добрай натуры, любіў Хрыста, але быў троха парывісты й не заўсёды прынцыповы, што аказалася пераацэнкай сваіх сілаў.

Арыштаванага Хрыста завялі й паставілі перад судом знатных жыдоўскіх арыстакратычных грамадзян і сьвятароў на

чале з галоўным сьвятаром, якія былі верны старому закону. Гэтая група людзей, у якую ўваходзіла 72 чалавек, тварылі суд, так званы Сынедрыён.

Рымскія ўлады дазволілі жыдам мець свой суд і выносіць прыгаворы на злачынцаў, за выключэннем кары сьмерці. Жыдоўскае начальства абвіняла Хрыста ў Ягонай новай навуцы, якая паводле іх была зьнявагай Бога. І, як падае евангеліст Марк, „Ён (Хрыстос) маўчаў і не адказваў нічога. Ізноў архірэй спытаў Яго, кажучы Яму: Ці Ты Хрыстос, Сын Бога Бласлаўлёнага? Ісус адказаў: Гэта Я; і вы ўбачыце Сына Чалавечага на хмарах нябесных. Тады архірэй, разьдзёршы вопраткі свае, сказаў: Нашто нам яшчэ сьведкі?" (Мк. 14:63).

На шматлікія пытаньні Сынедрыёну Хрыстос не адказваў. Але, калі Яго запыталі, што ён вучыў, на гэта Хрыстос адказаў, што яны знаюць, што Ён вучыў, бо гэта ня ёсьць ніякі сакрэт. Тады Яго ўдарылі па твары й тут Хрыстос сказаў, што Яго ўдарылі за тое, што Ён сказаў праўду.

Людзі часта наракаюць, калі ім нешта прыкрае здарыцца. Але Ісус, маючы прыкрасьці й знаючы, якія прыкрасьці й мукі чакаюць Яго наперадзе, не наракаў. Ён ішоў на сьмерць, каб пасьля затрыумфавала перамога. Гэтага, аднак, не маглі зразумець людзі ў тыя дні.

Суд, як і трэба было спадзявацца, знайшоў Хрыста вінаватым у Ягоным вучэньні й за гэта вынес сьмяротны прысуд. Заставалася толькі кару сьмерці прыпячатаць афіцыйным пацьверджаньнем рымскага пракуратара Юдэі.

Хрыста прывялі да Пілата. Быў гэта час Пасхі, многа тысяч жыдоў сышлося ў Ерусалім на сьвяткаваньне. Пілат хацеў дагадзіць жыдам, бо баяўся, каб яны не бунтаваліся. Але, калі Пілат даведаўся, што Ісус — галілеянін, адаслаў Яго да Ірада Антыпы (4-39) — малодшага сына Ірада Вялікага, які адміністраваў Галілеяй. Гэты вось Антыпа сказаў адсячы голаў Яну Хрысьціцелю. А сталася гэта так: Антыпа жыў з жонкай брата Філіпа, Ірадыядай. Было гэта незаконнае сужыцьцё й Ян Хрысьціцель дакараў іх. За гэта Ірад хацеў забіць яго, але баяўся народу, які бачыў у Яне прарока. Ян хрысьціў людзей у рацэ Ярдан і заклікаў людзей пакаяцца за свае грахі. У дзень нараджэньня Ірада, дачка Ірадыяды, Саломія, так прыгожа танцавала перад Ірадам,

што ён пакляўся даць ёй усё, што яна папросіць. А Саломія, падгавораная маткай, папрасіла галаву Яна Хрысьціцеля. Гэтая просьба была задаволена.

Не відаць, каб Антыпа шкадаваў свой паступак. Ён глядзеў насьцярожана на дзейнасьць Яна Хрысьціцеля, асабліва, калі зьбіралася вакол яго многа народу, што Антыпу нагадвала небясьпеку. Паводле жыдоўскага гісторыка Язэпа Флавія, які жыў у пару апосталаў, Ян Хрысьціцель быў „добры чалавек, і добра навучаў людзей".

Ірад Антыпа быў рады спаткаць Ісуса Хрыста, бо многа чуў аб Ім і спадзяваўся ўбачыць ад Яго нейкае цуда. Ён і яго прыбочныя ставілі Хрысту пытаньні, але Хрыстос на іх нічога не адказваў. Тады яны насьмяяліся зь Яго й адаслалі назад да Пілата.

Як бачым, Ірад Антыпа не адважыўся браць на сябе адказнасьць за Хрыста, а адаслаў Яго да Пілата.

Понцій Пілат, спаткаўшыся раней зь Ірадам, разгледзеў справу Хрыста, але не знайшоў у ёй нічога шкоднага й хацеў арыштаванага выпусьціць на волю. І калі народ сышоўся, Пілат запытаў: „Каго хочаце, каб я звольніў вам, Вараву ці Ісуса?" Усе прасілі Вараву, а Хрыста абвінялі, што Ён сваёю навукай выклікае беспарадак у Юдэі, забараняе плаціць падатак цэзару, ды называе сябе Мэсіяй — Хрыстом. Інакш кажучы, яны думалі, што Хрыстос праводзіць рэвалюцыйную работу й называе сябе царом, а называць сябе царом у Рымскай імпэрыі было небясьпечна. Але дзейнасьць Ісуса Хрыста ня мела нічога супольнага з рэвалюцыяй, а толькі раскрывала фальшывасьць людзей.

Понцій Пілат бачыў у гэтых абвінавачаньнях змову й таму некалькі разоў прабаваў абараняць Хрыста, аднак за кожным разам напатыкаў востры супраціў жыдоў. Нават жонка Пілата, Пампея, рабіла захады праз слугу, каб памагчы мужу ў яго сумленьні супраць жыдоўскага фанатызму. Яна прасіла мужа, каб ня браў на сябе віны за Хрыста, бо яна сьніла аб Ім як аб сьвятой асобе. Але й яе захады аказаліся дарэмныя.

У канцы Пілат спытаў прысутных жыдоў: „Што мне зрабіць з Хрыстом?" Адказ быў адзін: „Расьпяць!" Да такой кары прыгаворваліся рабы, разбойнікі, якія знаходзіліся па-за законам. А Ісус Хрыстос ніякага злачынства не зра-

біў. Сьмяротны прысуд быў вынікам злой волі Сынедрыёну, які ў Ісусе не пазнаў Мэсію, а бачыў у Ім ворага, якога трэба зьнішчыць.

Пілат быў добрым адміністратарам Юдэі й многа чаго добрага зрабіў для мясцовага насельніцтва, але жыды яго моцна не любілі. Пілат ня аказваў павагі для жыдоўскай рэлігійнай традыцыі й часам некаторыя рэчы рабіў на злосьць жыдам. Як пракуратар меў ён вялікую ўладу, асабліва над войскам і фінансамі. Пілат назначаў галоўных сьвятароў, кантраляваў фінансы жыдоўскай сьвятыні й браў зь яе грошы на розныя будовы, за што жыды яшчэ больш не любілі Пілата й слалі на яго жалабы да цэзара. А на судзе Хрыста жыды не забыліся напомніць пракуратару: „Калі ты выпусьціш гэтага Чалавека (Хрыста) на волю, ты ня ёсьць прыяцель цэзара. Той, хто робіць сябе каралём, ёсьць ворагам імпэратара".

Пілат няраз правакаваў жыдоў, але гэтым разам, ня хочучы наражацца на большыя непрыемнасьці з боку жыдоўскай Рады — Сынедрыёну, умыў свае рукі ад данай справы й гэтым паслаў Хрыста на крыж: „І ішло за Ім вялікае мноства народу й жанчыны, якія плакалі й галасілі па Ім. Ісус-жа зьвярнуўся да іх і сказаў: дочкі ерусалімскія! не плачце па Мне, а плачце па сабе й па дзецях вашых" (Лк. 23:27-28). Гэты трагічны мамэнт згадвае яшчэ навочны сьведка евангеліст Ян:

„І нясучы крыж Свой, Ён выйшаў на ўрочышча Чарапоў, па-жыдоўску называюць Галгофа; дзе й укрыжавалі Яго й зь Ім двух паабапал Яго, а ў сярэдзіне Ісуса" (Ян 19:17-18).

Як бачым, Хрыстос быў здраджаны, пакінуты сваімі найбліжэйшымі прыяцелямі, зьняважаны, біты й няслушна ўкрыжаваны. Укрыжаваньне было рымскім звычаем запазычаным у фінікійцаў. Жыдоўская практыка пакараньня сьмерцю чалавека заключалася на кіданьні ў яго камянямі, а ўкрыжаваньне лічылася паніжаючай карай.

Евангельле ў сваім апісаньні суда над Хрыстом злагоджвае паступкі Пілата. Аднак факт застаецца бясспрэчны, што прыгавор сьмерці быў апрабаваны рымскім пракуратарам і экзэкуцыю выканалі рымскія жаўнеры.

Пілат не здаваў сабе справы, што ён, умываючы рукі, асуджаў ня толькі Хрыста, але й тых, што мелі Яго ўкрыжа-

ваць, і тых, каторых рэпрэзэнтаваў і адначасна сябе самога. Аднак рымскі цэнтурыён (прафэсійны афіцэр рымскай арміі), гледзячы на паміраючага на крыжы Хрыста, сказаў: „Гэта быў Сын Божы".

Апошняе, што мог зрабіць Пілат супраць жыдоў, гэта напісаць на крыжы кароткую абвестку: „Ісус — Цар Юдэйскі" на лацінскай, грэцкай і габрэйскай мовах, якая была прыбіта да крыжа над галавой Хрыста. Цела памерлага Хрыста прыяцелі пахавалі ў пячоры й з сумам разышліся.

Калі жыды даведаліся, што цела Хрыста пахаванае, яны пасьпяшылі да Пілата з дамаганьнем, каб паставіў варту каля гроба. Тлумачылі гэта тым, што Хрыстос перад сьмерцю сказаў, што Ён уваскрэсьне на трэці дзень, таму гроб павінен быць зачынены й пільнаваны дзень і ноч, каб Яго цела ня ўкралі вучні і пасьля не сказалі людзям, што Ён уваскрос. „Бо калі гэта здарыцца, то будзе намнога горш, калі-б мы пакінулі Яго жывым", — гаварылі .

Пілат меў многа клопату з жыдамі, меў іх досыць асаблі-ва са сьмерцю Хрыста й сказаў ім: „Маеце сваю варту, рабіце што хочаце" й сам завярнуўся й пайшоў...

Сталася гэта за ўрадаваньня рымскага імпэратара Тыбэрыя, лепш знанага ў гісторыі пад назовам Аўгуста (14-37), на 33-м годзе жыцьця Ісуса Хрыста.

Понцій Пілат, які паслухаў жыдоў і гэтым спрычыніўся да сьмерці Хрыста, не ўратаваў сябе перад жыдамі. Ён меў зь імі іншыя непаразуменьні й жыды дабіліся ад рымскіх уладаў, што Пілат быў зьняты са сваёй пасады й адкліканы ў Рым, каб там апраўдаць перад імпэратарам свае паводзіны.

Пакуль Пілат прыехаў у Рым, памёр імпэратар Тыбэрый і яго заступіў Калігуля. Мы ня знаем, які абарот у Рыме прыняла справа Пілата, але паводле хрысьціянскага гісторыка Яўсевія (IV ст.), Пілат пакончыў жыцьцё самагубствам.

Таксама Юда Іскарыёт ня мог дараваць свае здрады. Ён, трымаючы ў руках трыццаць срэбранікаў, за якія прадаў Хрыста, пайшоў у сьвятыню й з плачам кажа сьвятару: „Я зрабіў вялікае злачынства. Я здрадзіў нявіннага чалавека, які быў маім прыяцелем. Вазьмі гэтыя грошы назад. Я іх не патрабую". На гэта жыдоўскі сьвятар адказаў спакойна: „Што ты зрабіў і як ты чуешся, гэта нас нічога не

абходзіць". Юда кінуў грошы на падлогу пад ногі і, завярнуўшыся, пабег са сьвятыні. Адзін са сьвятароў зачапіў нагой манэты й сказаў: „Мы ня можам палажыць гэтыя грошы ў сваю касу, гэта цана жыцьця Чалавека".

Дзе Юда не ішоў, на яго глядзелі людзі. Яму прыпаміналіся павучэньні Хрыста й ён ня мог дараваць свае віны-здрады. Завязаўшы вяроўку на шыю, Юда павесіўся на дрэве.

Няменш перажываў сваё адрачэньне ад Хрыста й апостал Пётр. Ён моцна шкадаваў за сваю слабасьць і цяпер хацеў жыць ды працаваць толькі для Хрыста.

Бяручы агульна, справа выглядае так, што перамога засталася за жыдамі. Яны пазбавіліся свайго рэлігійнага праціўніка Ісуса Хрыста й пазбыліся непажаданага ім рымскага пракуратара Понція Пілата. Аднак, як пабачым далей, рэчаіснасьць паказала што іншае.

Дата сьмерці Ісуса Хрыста ня ёсьць дакладна вядомая. Паводле біблейскіх даных і астранамічных вылічэньняў двух оксфардзкіх навукоўцаў, сьмерць Ісуса Хрыста наступіла ў Ерусаліме ў пятніцу, 3-га красавіка 33 года.

(„Голас Часу", № 2 (5), Лёндан, 1990 г.)

Асірацеўшыя апосталы

Пасьля сьмерці Ісуса Хрыста на крыжы, здавалася, што місія Яго на гэтым скончылася. Бо-ж у такіх выпадках сьмерць прымаецца як сымбаль страты, паражэньня, а не перамогі. Але, як прадказаў сам Ісус Хрыстос, на трэці дзень Ён уваскрос і няраз паказаўся многа каму, а найбольш сваім вучням. У часе аднаго спатканьня з вучнямі Хрыстос паясьніў ім некаторыя рэчы, якія яны да гэтага часу не разумелі. Напрыклад, што для Яго было неабходным пацярпець і памерці, каб пасьля ўваскрэснуць.

Будучы на Аліўнай гары, вучні ставілі Хрысту розныя пытанньні, але Ён адказаў ім: „Ня вам знаць час і пару, што Айцец паклаў ва ўладзе Сваёй; але прыміце сілу, як сыдзе на вас Дух Сьвяты, і будзеце Мне сьведкамі й у Ерусаліме й ува ўсёй Юдэі й Самарыі, ды ажно на край зямлі. І, сказаўшы гэта, Ён узьнёсься перад вачыма іхнімі, і хмара ўзяла Яго ад вачэй іх" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 1:7-9).

Апосталы вярнуліся ў Ерусалім з Аліўнай гары, што недалёка Ерусаліма, зь вялікай радасьцю й як падаюць Дзеяньні: „І ў гэтыя дні Пётр, устаўшы сярод вучняў сказаў (а была грамада людзей разам каля ста дваццацёх): Мужы браты! Тое пісаньне, якое праз вусны Давідавыя Дух Сьвяты прадказаў пра Юду, які быў павадыром тых, каторыя ўзялі Ісуса, — мусіла збыцца; быў ён пакліканы з намі, і лёс вызначыў яму частку ў служэньні гэтым; але цаной крыўды прыдбаў ён зямлю (...) і выпала жэрабя на Мацьвея, і далучаны быў да адзінацаццьцёх Апосталаў". (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 1:15-18, 26).

Сем тыдняў пасьля ўваскрэшаньня Хрыста, у часе спатканьня апосталаў у Ерусаліме, у дзень Пяцідзесятніцы (Сёмухі), на іх сышоў Дух Сьвяты ў выглядзе агнявых языкоў. Вучні Хрыста пачалі гутарыць на розных мовах, каб такім чынам яны маглі ісьці й навучаць усе народы праўды Хрыстовай. У душы апосталаў наступіла новае адраджэньне, а ў памяці ажылі нядаўнія павучэньні Хрыста.

Сыход Сьвятога Духа на апосталаў быў папярэджаны шумам зь неба, як-бы нясушчымся ветрам. Зьявішча такое чулі й бачылі жыхары Ерусаліма. „І здумеваліся ўсе й у недаўменьні гаварылі адзін да другога: Што гэта магло быць?" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 2:12). У гэты самы дзень апостал Пётр ахрысьціў каля трох тысяч іх у новую хрысьціянскую веру, а неўзабаве прыняло хрысьціянства дзьве тысячы больш. Адгэтуль і пачыналася апостальская эра, якая рашуча паўплывала на ход гісторыі.

Аднак трэба памятаць, што хрысьціянскі рух узяў свой пачатак не зь Ерусаліма, а з Капэрнаума, з берагоў Галілейскага мора. У Ерусаліме Хрыстос быў няцэлы тыдзень часу, а дзеля таго, што Яго там укрыжавалі, таму агульна прынята лічыць гэты горад цэнтрам хрысьціянства. Другі факт важнасьці Ерусаліма заключаецца ў тым, што пасьля ўваскрэшаньня Хрыста апосталы залажылі тут свой цэнтр і нідзе няма ўспамінаў, каб яны калі наведалі Галілею.

У сувязі зь місіянерскай дзейнасьцю апосталаў паўстала неабходнасьць стварыць свой духоўны інстытут або арганізацыю, інакш кажучы, Царкву. Фактына Усяленская Царква Хрыстовая заснавана была самім Ісусам Хрыстом па сло-

вах Яго: „Я збудую Царкву Маю, і вароты пякельныя не перамогуць яе" (Мць. 16:18).

Далейшую разбудову Царквы Хрыстос даручыў сваім вучням-апосталам, сказаўшы: „Дык ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысьцячы іх у імя Айца й Сына, і Сьвятога Духа; навучаючы іх выпаўняць усё, што Я скажу вам; і вось Я з вамі ўва ўсе дні да сканчэньня веку" (Мць. 28:19-20).

І таму, неўзабаве пасьля сьмерці свайго Настаўніка, зь ініцыятывы апосталаў паўстала першая хрысьціянская абшчына ў Ерусаліме, якой кіравала Калегія Дванаццаці. І як ужо згадвалася, што на месца адпаўшага Юды Іскарыёта, які за здраду Хрыста сам павесіўся, выбрана на апостала Мацьвея.

Акрамя дванаццаці апосталаў Хрыстос меў яшчэ семдзесят вучняў, якія памагалі Яму ў місіянерскай дзейнасьці. Цяпер гэтая грамада састаўляла апостальскую абшчыну першых хрысьціян. І як напісана ў Дзеяньнях, „у грамадзе веруючых было адно сэрца й адна душа, і ніхто нічога з маёмасьці сваёй не называў сваім, але ўсё ў іх было супольнае" (4:32).

Дзейнасьць Калегіі Дванаццаці мела місіянерскі характар. Яна пачала прымаць розгалас і пашырацца за межы Палестыны, чым зьвярнула на сябе ўвагу рымскай адміністрацыі.

Матка-Царква, у той час яшчэ Ерусалімская абшчына, ад часу яе заснаваньня карысталася пашанай сваіх вернікаў. Яе першыя апосталы выступалі й гаварылі як жывыя супрацоўнікі Хрыста. Яны зналі навуку свайго настаўніка, зналі Яго думкі й у гэтым духу навучалі, бо ў той час не было яшчэ напісанага Евангельля. Сваёю прысутнасьцю апосталы сведчылі аб дзейнасьці, сьмерці й уваскрэшаньні Хрыста. Асаблівую ўвагу надавалі яны немінучаму канцу сьвету й зьвярталіся да народу, каб пакаяўся.

Аднак цяжка сказаць, каб народ прымаў хрысьціянскую веру з-за страху перад канцом сьвету. Ён больш цікавіўся не канцом сьвету, а яго пачаткам. Хрысьціяне спатыкаліся на свае малітвы, аб чым Дзеяньні Сьвятых Апосталаў згадваюць наступным чынам: „І ўсе веруючыя былі разам, і ўсё ў іх было супольнае; і прадавалі дабро сваё, і дастаткі й дзялілі між усіх, як каму трэба было. І кожны дзень, аднадушна бываючы ў храме ды ламаючы хлеб у дамох, прымалі страву ў радасьці й прастаце, слаўлючы Бога й маючы ла-

ску ўсяго народу. Госпад-жа штодня дадаваў царкве тых, хто ратаваўся (2:44-47).

Сярод апосталаў на першае месца высунуўся сьпярша Пётр. Ён выступаў ад імя ўсіх. Але гэта ня значыць, што апостал Пётр быў першым пасьля Хрыста, або быў выбраны апосталамі за свайго кіраўніка. За жыцьця Хрыста й пасьля Яго сьмерці і ўваскрэшаньня ўсе апосталы былі сабе роўныя. Ісус Хрыстос сказаў: „Хто хоча між вамі быць першым, няхай будзе вам слугою" (Мць. 20:26-27).

У Евангельлі гаворыцца, што сярод дванаццаці апосталаў Хрыстос любіў Яна і яму даручыў апеку над сваёй маткай Марыяй.

З пашырэньнем хрысьціянства агульныя абставіны патрабавалі засноўваць новыя хрысьціянскія цэнтры й абшчыны, у якіх хрысьціяне выбіралі сярод сябе сумленных мужоў, якіх апосталы назначалі на дыяканаў, што значыць — слугаў. У Дзеяньнях запісана: „Вось-жа, браты, нагледзьце спасярод вас сем дазнаных мужоў, поўных Духа Сьвятога й мудрасьці, якіх паставім на гэту патрэбу. І спадабалася слова гэтае ўсенькай грамадзе. І выбралі Сьцяпана, мужа поўнага веры й Духа Сьвятога, і Піліпа, і Прахора, і Міканора, і Тымона ды Пармена й Мікалая Антыёхійца, нованаверненага, ды паставілі іх перад апосталамі; і яны, памаліўшыся, узлажылі на іх рукі" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 6:5-6).

Галоўным заданьнем гэтых людзей быў справядлівы падзел дапамогі бедным, а таксама былі яны блізкімі памочнікамі апосталаў у іхняй дзейнасьці.

Першыя хрысьціяне, якімі былі жыды, не нарушалі Майсеевага права. Яны нічым ня розьніліся ад другіх жыдоў, толькі што ўспаміналі Хрыста. Нават апосталы хадзілі ў сынагогу, аднак жыдоўская адміністрацыя Юдэі была чулая на такія рэчы й жорстка распраўлялася з тымі, хто прапаведаваў імя Хрыста, як пастаўленага Мэсію. У Дзеяньнях згадваецца: „Калі-ж яны гаварылі да народу, падышлі да іх сьвяшчэньнікі, і начальнік варты царкоўнай, і садукеі, узлаваныя тым, што яны навучаюць народ і прапаведуюць у Ісусе ўваскрэсеньне із мёртвых; і палажылі на іх рукі, і аддалі іх пільнаваць да раніцы, бо быў ужо вечар" (4:1-3).

Апостал Пётр і Ян былі арыштаваны, але неўзабаве выпушчаны з наказам спыніць сваю місіянерскую дзейнасьць, а Якава, брата Яна, Ірад забіў мячом без ніякага поваду. Якаў быў першым апосталам, які памёр за веру. У часе жыдоўскага прасьледу першых хрысьціян, у 36 годзе забіты быў Сьцяпан. Была гэта яшчэ адна ахвяра жыдоўскага прасьледу хрысьціян. Сьцяпан па паходжаньні быў жыдам, якога апосталы назначылі дыяканам. Меў ён гэленістычныя погляды й апекаваўся грэкамоўнымі ўдовамі. У сваёй дзейнасьці Сьяпан меў посьпех, пашану й гэта выклікала зайздрасьць сярод жыдоў. Сьцяпана паклікалі на суд Сынедрыёну — старшых жыдоўскіх сьвятароў, які абвінавацію яго ў вераломстве. Сьцяпан ня толькі што не прызнаў за сабою віну, але асудзіў судзьдзяў за забойства Хрыста. За гэта й прыгаварылі яго на кару сьмерці. Аб гэтым забойстве гаворыцца:

„І білі камянямі Сьцяпана, які маліўся, мовячы: Госпадзе Ісусе, прымі дух мой! І, укленчыўшы, загаласіў моцным голасам: Госпадзе, не паліч ім грэху гэтага! І, сказаўшы гэта, памёр. Саўл-жа пахваліў забойства яго" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 7:59-60).

Сьцяпан быў адным зь сямі дыяканаў, выбраных каб памагаць апосталам у прапаведваньні навукі Хрыста. Ягоным пропаведзям не маглі запярэчыць праціўнікі-жыды. Яны аказаліся заслабыя ў дыскусіі й таму пастанавілі зьнішчыць Сьцяпана. Сьцяпан мае гонар лічыцца першым хрысьціянскім мучанікам. Жыдоўскі прасьледавацель Саўл хадзіў ад хаты да хаты й вышукваў хрысьціян. Аб гэтым чытаем:

„І сталася ў той дзень вялікае прасьледаваньне царквы ў Ерусаліме. Дык усе, апрача апосталаў, расьцярушыліся па зямлі Юдэі й Самарыі. А Сьцяпана пахавалі багабойныя людзі ды ўчынілі па ім галошаньне вялікае" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 8:1-2).

У гэтым часе ў Палестыне кіраваў Ірад Агрыпа І. Быў ён унукам Ірада Вялікага, выхоўваўся ў Рыме й зьяўляўся блізкім прыяцелнм імпэратара Калігулі, а пасьля імпэратара Кляўдыя. Калігуля даў яму ў адміністрацыю землі Філіпа, які памёр, у 37 годзе, і Галілею ў 39 годзе, калі Антыпа папаў у няласку імпэратара й быў асланы на выгнаньне.

У 41 годзе, калі імпэратар Кляўдый даў Агрыпу Юдэю й Самарыю, Ірад Агрыпа валодаў адноўленым каралеўствам свайго дзеда Ірада Вялікага. З хрысьціянскага пункту гледжаньня Ірад Агрыпа быў зяўзятым ворагам царквы, катам зь мячом у руцэ.

Неспрыяльныя й варожыя абставіны для дзейнасьці апосталаў заставілі іх пакінуць Ерусалім і Палестыну, бо акрамя прасьледу хрысьціян заносілася на паўстаньне жыдоў супраць рымлян. Яшчэ за свайго жыцьця Хрыстос прадказаў невясёлую будучыню для сваіх апосталаў, што запісана ў Евангельлі:

„Сьцеражыцеся-ж і вы самі: бо будуць вас аддаваць пад суд і біць вас у школах, і будзеце пастаўлены перад ваяводамі ды царамі за Мяне, каб сьведчылі ім. І перш усім народам мусіць быць абвешчана Евангельле" (Мк. 13:9-10).

Хрысьціянства ў Палестыне ня мела добрых шансаў для свайго разьвіцьця. Замоцныя былі там уплывы юдаізму, замнога было розных групаў і сэктаў, якія між сабою спрачаліся. А найбольш Агрыпа прасьледаваў хрысьціян.

Ужо пасьля забойства Сьцяпана пачаўся прасьлед хрысьціян у Ерусаліме. Аб гэтым пісаў Павал у сваіх пісьмах да галятаў (1:13), карынфянаў (I, 15:9) і філіпянаў (3:6), які сам прымаў удзел у прасьледаваньні Царквы. Ён быў прысутны на забойстве Сьцяпана.

Была жыдоўская Пасха як другі раз арыштавапі Пятра й зараз пасьля сьвята мелі публічна забіць, але апошняй ночы яму ўдалося цудам уцячы з-пад мяча Агрыпы. Праз элімінацыю кіраўнікоў Царквы, Агрыпа хацеў адначасна спаралізаваць дзейнасьць хрысьціян за іхнія адносіны з гэленізмам. Пётр быў выратаваны з турмы, але ня мог выступаць кіраўніком хрысьціянскай абшчыны. Ён недзе схаваўся, а ягонае месца заняў Якаў, брат Хрыста.

У выніку прасьледу Агрыпы апосталы пакінулі Ерусалім. Адны зь іх пайшлі ў Сырыю, у Дамаск, другія — у Антыёхію. Там было многа жыдоў, патомкаў дыяспары — расьсяленьня, якое пачалося яшчэ ў VI стагодзьдзі да нашай эры вавілонскім царом Навухаданосарам. Ён завалодаў Юдэяй і сілай перасяліў жыдоў у Вавілон.

Хоць пэрсідзкі цар Кір, заваяваўшы Вавілон, дазволіў жыдам вярнуцца на бацькаўшчыну, аднак многія засталіся

жыць на сваім новым месцы. Час ішоў, улады мяняліся, а жыды гуртаваліся вакол сынагогаў ды паступова прымалі грэцкую мову, яе культуру. Сярод гэтых жыдоў і прапаведавалі сваю веру апосталы пераконваючы іх, што Ісус Хрыстос ёсць Мэсіяй.

Жыды дыяспары адчувалі сваю прыналежнасць да Палестыны й зь цікавасьцю слухалі хрысьціянскіх прапаведнікаў-апосталаў, якія расказвалі ім аб падзеях, якія адбываліся на радзіме іхніх продкаў. Гэтыя людзі з прыемнасьцю слухалі цікавыя расказы й прымалі новае вучэньне, нягледзячы на супраціў фарысеяў. Акрамя жыдоў, на малітоўных зборках прысутнічалі й мясцовыя жыхары, пераважна грэкі, якія былі зацікаўленыя новай верай, бо да гэтага часу яны былі паганамі або прымалі юдаізм.

Тут варта згадаць, што фарысеі былі людзьмі, якія лічылі сябе найбольш прававерным і ў захаваньні Божых правоў. У пэўнай ступені яны былі рэлігійнымі людзьмі, але многія зь іх не былі такімі „сьвятымі" як яны думалі. Аднак на іншых людзей яны глядзелі як на гэрэтыкаў і не маглі зразумець, чаму Хрыстос любіў усіх людзей і меў зь імі дачыненьне. Яны не хацелі зразумець навуку Хрыста, якая заключалася на любові й пашане чалавека, нягледзячы на яго мову, паходжаньне й колер скуры.

У Новым Запавеце згадваецца сем грэцкіх гарадоў у Малой Азіі, зь якіх хрысьціянскія прапаведнікі вандравалі ў іншыя краіны. І ў гэтых краінах, а асабліва ў Сырыі й Малой Аэіі, фарміраваліся першыя хрысьціянскія абшчыны. Даволі рана паявілася хрысьціянства ў Егіпце, дзе жыло многа жыдоў, а найбольш жыло іх у Александрыі.

Першым вядомым александрыйскім хрысьціянінам быў Апалос, з паходжаньня жыд, які добра знаў габрэйскае вучэньне. Каля 52 году ён наведаў Эфэс і Карынтыю. Пазьней успамінаецца і другі александрыйскі хрысьціянін, які слаў пісьмы Варнаву. На жаль, маюцца рэдкія інфармацыі аб раньняй Александрыйскай царкве да 180 году. Вядома толькі, што александрыйскія жыды былі гэленскай культуры, аб чым гаворыць Біблія, перакладзеная на грэцкую мову каля 200 году да нашай эры. Але ня толькі жыды Александрыі былі гэленскай культуры, але ўсе жыды дыяспары га-

варылі па-грэцку за выняткам Палестыны, дзе пераважна гаварылі на арамэйскай мове.

Як бачым апосталы не сядзелі бязьдзейна на адным месцы, але падарожнічалі прапаведуючы новую веру й закладалі хрысьціянскія абшчыны. Утрымоўвалі яны кантакты з рознымі абшчынамі праз лісты-пасланьні. Лісты гэтыя маюць вялікае гістарычнае значэньне для хрысьціянства. Тэматыка іх розная. Таксама як Евагельле, так і дваццаць адзін апостальскіх пасланьняў, зь якіх чатырнаццаць належаць пяру апостала Паўла, былі напісаны ў першай палове першага стагодзьдзя.

Такія, вось, былі пачаткі Хрысьціянскай царквы й дзейнасьці апосталаў. Трэба сказаць, што аб дзейнасьці некаторых апосталаў мала пішацца ў Дзеяньнях Сьвятых Апосталаў, але ўсе яны, у большай ці меншай ступені займаліся місіянерскай работай.

(„Голас Часу" № 3 (6), Лёндан, 1990 г.)

Як Саўл стаўся Паўлам

Адно з найбольш выдантых месц сярод апосталаў заняў новы прышэлец — Павал. Павал быў жыдам-фарысеем, рымскім грамадзянінам і паходзіў з гораду Тарс, што ў паўднёва-ўсходняй Малой Азіі. Асьвету атрымаў ён у Ерусаліме ў школе знатнага жыдоўскага настаўніка Гамалііла. Павал, якога імя было сьпярша Саўл, знаў грэцкую мову, пісьмо, літаратуру й філязофію й займаў пасаду галоўнага жыдоўскага прасьледавацеля хрысьціян. Гэта ён прымаў удзел у прасьледаваньні першых хрысьціян у Ерусаліме, ходзячы ад хаты да хаты й быў прысутны ў часе забойства архідыякана Філіпа, сьмерць якога ўважаў за кару зусім слушную. Саўл быў чалавекам моцнай волі, энтузыязму й перакананьня.

Аднойчы Саўл пайшоў да галоўнага ерусалімскага сьвятара, каб дазволіў яму паехаць у Дамаск і прывесьці адтуль хрысьціян у Ерусалім дзеля пакараньня іх. Такі дазвол ён атрымаў на паперы й адправіўся ў дарогу.

Ідучы ў Дамаск, у сваёй антыхрысьціянскай місіі, яго на дарозе асьляпіла сьвятло. Саўл упаў і пачуў зь неба голас,

які гаварыў яму: „Саўл, Саўл, чаму ты прасьледуеш Мяне? Ён-жа сказаў: Хто Ты, Гасподзь? А Госпад адказаў: Я — Ісус, Якога ты прасьледуеш. Цяжка табе проці ражна ўпірацца" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 9:4-5).

Саўл устаў, але нічога ня бачыў і яго адвялі ў дом Юды. Па ўказаньні Хрыста ў гэты дом прыйшоў шанаваны людзьмі хрысьціянін Ананія. Ён, пачуўшы імя Саўл, спалохаўся, знаючы, што ён рабіў у Ерусаліме. Але Ананія падышоў да Саўла, палажыў на яго свае рукі й сказаў! „Брат Саўл, Гасподь Ісус, Які зьявіўся табе на дарозе, прыслаў мяне да цябе, каб вярнуць табе зрок і быў поўным Сьвятога Духа". Пасьля трох дзён Саўлу вярнуўся зрок.

Быў гэта зваротны пункт у жыцьці Саўла. Асоба яго зьмянілася неспадзявана й рашуча. Ён зьмяніў сваё габрэйскае імя Саўла на Паўла й неўзабаве стане адным з найбольш актыўных апосталаў. На працягу наступных 30 гадоў ён будзе дамінаваць у гісторыі хрысьціянства. Ды нават цяпер, замест увайсьці ў Дамаск прасьледавацелем хрысьціян, Павал увайшоў хрысьціянінам і ў жыдоўскай сынагозе пачаў гаварыць, што „Хрыстос — Сын Божы". Жыды не маглі паверыць і пагадзіцца з такой раптоўнай зьменай поглядаў галоўнага прасьледавацеля хрысьціян і ўплянавалі замах на яго жыцьцё. Як толькі Павал даведаўся аб гэтым, ён ноччу спусьціўся ў кашы з гарадзкой сьцяны й ўцёк з Дамаску ў Арабію, праўдападобна ў пустыню на пакаяньне. Каля 38 году Павал вярнуўся ў Ерусалім, каб спаткаць там апосталаў новай веры.

Ерусалімская абшчына добра знала й памятала нядаўнюю дзейнасьць Саўла ў гэтым горадзе й таму ставілася да яго зь недаверам. Але за Саўла заступіўся апостал Варнава, які адказнасьць узяў на сябе. Варнава ўспамінаецца ў Дзеяньнях Сьвятых Апосталаў як добры чалавек, поўны Сьвятога Духа. І таму, мабыць, Павал быў прыняты ў лік апосталаў і выехаў дамоў у Тарс.

Неўзабаве апосталы паслалі Варнаву да Антыёхскай царквы, дзе ён прапаведаваў год таму. Пры нагодзе Варнава завітаў у Тарс да Паўла. Каля 43 году яны вярнуліся ў Антыёхію. Тут Павал атрымаў сваю першапачатковую навуку аб Хрысьце. Быў ён маладым, энэргічным, здольным і аду-

каваным прапаведнікам, які разам з Варнавам падарожнічаў па розных краінах імпэрыі, нясучы сьвятло Праўды Хрыстовай. Зь ім на Кіпры быў Марк, але, калі яны пераязджалі ў Галятыю (Малая Азія), Марк, даведаўшыся, што Павал мае намер прапаведаваць сярод нежыдоў, дзеля таго пакінуў іх і вярнуўся дамоў у Ерусалім.

Прыйшоўшы ў любы горад Малой Азіі, Павал не памінуў жыдоўскай сынагогі, каб не зайсьці й сказаць пра Ісуса Хрыста. Мала хто з жыдоў слухаў яго. Большасьць жыдоў адкідала навуку Паўла й Варнавы. Аб гэтым гавораць Дзеяньні:

„Паўла-ж і Варнава горда сказалі: Да вас належала перш прамовіць слова Божае; але вы адкінулі Яго ды ня лічыце сябе годнымі жыцьця вечнага, дык мы зварочваемся вось да паганаў" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 13:46).

У сваіх выступленьнях Павал перавышаў Варнаву ведамі, здольнасьцямі й такім чынам стаўся лідэрам. Каля 49 году яны прысутнічалі на саборы ў Ерусаліме, на якім разглядалася справа жыдоўскага закону й асабліва абразаньня хрысьціян-нежыдоў. Сярод вучняў былі нават галасы адкінуць хрысьціян-нежыдоў, якія ня хочуць поўнасьцю прыняць жыдоўскае права.

Тэндэнцыя захаваньня старых законаў уводзіла непаразуменьні сярод вучныў, а нават і сярод апосталаў. З такой пастаноўкай справы не пагаджаўся Павал, які такую дзейнасьць лічыў парушэньнем аснаўных прынцыпаў Евангельля, любові бліжняга й роўнасьці людзей у абліку Бога. Не згаджаўся ён нават з апосталам Пятром. Павал сказаў: „Калі я ўбачыў, што яны ня проста ходзяць па праўдзе Евангельскай, дык сказаў Пятру пры ўсіх: Калі ты, будучы жыдам, жывеш па-паганску, а не па-жыдоўску, дык чаму паганаў прымушаеш жыць па-жыдоўску?" (Пасланьне да галятаў, 2:14).

Ерусалімскі сабор закончыўся поўнай перамогай Паўла й яго паплечнікаў. Было прынятае важнае рашэньне й выдадзенае пасланьне да ўсіх хрысьціян, у якім гаварылася: „Гэта ўгодна Сьвятому Духу й нам не ўскладаць на вас ніякага цяжару апрача неабходнага, ды ад блуду; высьцерагайцеся таго, чаго сабе не жадаеце. Бывайце здаровы" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 15:28-29).

Гэты Апостальскі сабор даў прыклад наступным пакаленьням хрысьціян вырашаць царкоўныя праблемы саборным парадкам. Павал пераканаў рэшту апосталаў, што Хрысьціянская царква не павінна быць жыдоўскай сэктай, а ўнівэрсальнай Царквой. У гэтай справе Павал меў даўжэйшыя перагаворы зь лідарамі Ерусалімскай царквы, асабліва зь Пятром і Варнавам, дзе хадзіла пра нежыдоўскіх хрысьціян.

У сваім пасланьні да галятаў Павал ясна гаворыць, што справу свайго жыцьця ён бачыць сярод паганаў, гэта значыць нежыдоў і таму яго лічаць, у пэўным сэнсе, за апостала нежыдоў. Маючы ўплывы на нежыдоўскія абшчыны, пісьмы Паўла рабілі большы ўплыў на людзей, як яго вуснае прапаведаваньне. Павал не баяўся ўспамянуць і сваё мінулае: „Бо вы чулі аб маім ранейшым жыцьці ў Юдэйстве, што я бяз меры прасьледаваў Божую царкву й пустошыў яе". Цяпер Павал быў рэлігійным патрыётам, адным з найбольшых у гісторыі новай веры й яму належцца найбольшая заслуга ў арганізацыі Хрысьціянскай царквы як унівэрсальнай.

Магчыма, рэшта апосталаў думала, што хрысьціяне-нежыды з часам асымілююцца й прымуць жыдоўскую абраднасьць. У сапраўднасьці так не сталася. Хрысьціян-нежыдоў аказалася больш за жыдоў-хрысьціян, а выхад жыдоў-хрысьціян зь Ерусаліму й зьнішчэньне гораду рымлянамі ў 70 годзе палажыла канец уплыву жыдоўскага закону сярод хрысьціян. Жыды-хрысьціяне зраўняліся з хрысьціянамі-нежыдамі.

Апостал Пётр, апынуўшыся, праўдападобна, пад узьдзеяньнем Паўла, сказаў: „Вы ведаеце, што нельга чалавеку жыду лучыцца ці схадзіцца з чужынцамі, але Бог наказаў мне не лічыць ніводнага чалавека паганым ці нячыстым" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 10:28).

Пасьля Ерусалімскага сабору сяброўства Паўла з Варнавам пахаладзела. Павал пайшоў з Сілам праз Малую Азію ў Македонію, а Варнава з Маркам паехалі на Кіпр і там заснавалі царкву. У часе іхняй прысутнасьці на Кіпры збунтаваўся народ і забіў Варнаву камянямі. Марк пахаваў яго скрыта, паклаўшы яму на грудзі копію Евангельля сьв. Мацьвея. Пасьля Марк апынуўся ў Егіпце й быў першым епіскапам Александрыі.

Пасьля другога візыту ў Ерусаліме Павал падарожнічаў зь Цімафеем у сваёй евангельскай місіі. Згодна традыцыі, ён навярнуў на хрысьціянства Дыянісія Арэапагіта, які стаўся першым афінскім епіскапам.

Зрабіўшы вялікае падарожжа, Павал вяртаўся ў Ерусалім і вёз з сабою сабраныя грошы для бедных хрысьціян гораду, але па дарозе яго вучні асьцераглі, каб ня ехаў у Ерусалім дзеля свае бясьпекі. Аднак апостал Павал не паслухаў парадаў і прыбыў у горад у 58 годзе. Тут ён быў арыштаваны рымскімі жаўнерамі перад збунтаванымі жыдамі. Арышт Паўла быў нічым іншым як толькі ягонай пратэкцыяй перад жыдамі й яго адаслалі пад канвоем у Кесарыю, дзе знаходзіўся рымскі адміністратар Фэлікс. Аднак жыды Паўла асудзілі, сказаўшы: „Чалавек гэты ёсьць зараза, будзіцель бунту сярод жыдоў на ўсім сьвеце ды правадыр Назарэйскай гэрэзіі" („Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 24:5).

У гэтым часе рымскага адміністратара Палестыны Антонія Фэлікса заступіў Порцый Фэст. Ён паехаў у цэнтр жыдоўскага жыцьця — Ерусалім, які адначасна быў месцам розных забурэньняў. Фэсту хадзіла пра апостала Паўла. Гэты эпізод з Паўлам ёсьць запісаны так: „Фэст-жа прыйшоўшы ў сваё гаспадарства, цераз тры дні вырушыў з Кесарыі ў Ерусалім. І архірэй, і выдатнейшыя з жыдоў зьявіліся да яго проці Паўла й малілі яго, каб зрабіў ласку ды прыслаў яго ў Ерусалім, зрабіўшы змову, каб забіць яго ў дарозе. Але Фэст адказаў, што Паўла сьцерагуць у Кесарыі, а сам ён маніцца хутка выехаць. Дык хто з вас можа, сказаў ён, няхай ідуць са мною, і калі ёсьць нешта на чалавеку гэтым, няхай яго вінавацяць. Пабыўшы ў іх больш дзесяці дзён, вярнуўся ў Кесарыю й назаўтра, сеўшы на суджаным пасадзе, загадаў прывесьці Паўла. Калі-ж той прыйшоў, абступілі яго жыды, што прыйшлі зь Ерусаліма, прыносячы на яго многа цяжкіх абвінавачаньняў, якіх ня здолелі даказаць. Ён-жа апраўдаўся, што ні ў чым не правініўся ані проці закону жыдоўскага, ані проці царквы, ані проці кесара. Але Фэст, хочучы зрабіць ласку жыдам, адказваючы Паўлу, сказаў: „Ці хочаш ісьці ў Ерусалім, ды каб там судзіў я цябе за гэта?" Павал бачыў тут змову й таму, як рымскі грамадзянін, зажадаў, каб яго справу разглядалі ў Рыме" (Дзеяньні Сьвятых Апосталаў, 25:1-9).

Павал два гады прабыў у заключэньні ў Кесарыі, праўдападобна ад 58 да 60 году й на ягонае жаданьне прывезьлі яго арыштаванага ў Рым. І тут прабыў ён два гады пад хатнім арыштам, дзе мог пісаць пісьмы да хрысьціянскіх абшчын, а пасьля пасадзілі яго ў турму. Разам Павал прасядзеў у заключэньні пяць гадоў.

Будучы бясстрашным прапаведнікам, Паўлу прыходзілася перажываць розныя небясьпекі. У сваім другім пасланьні да карынфянаў Павал пісаў: „Ад юдэяў пяць разоў дастаў сорак без аднаго (удараў); тройчы білі мяне кіямі, аднойчы камянямі; тры разы разьбіваўся карабель, ноч і дзень прабываў у глыбіні. Многа быў у падарожжах, у небясьпеках на рэках, у небясьпеках ад разбойнікаў, у небясьпеках ад землякоў, у небясьпеках ад паганаў, у небясьпеках у месьце, у небясьпеках між фалшывымі братамі" (Другое пасланьне Паўла да карынфянаў, 11:24-26).

Ня меншая заслуга належыць Паўлу й у тым сэнсе, што ён сумеў пераканаць гэленскі сьвет грэкаў да новай веры. У Палестыне былі калёніі грэкаў, якія да нараджэньня Хрыста прымалі юдаізм, але гутарылі на сваёй мове. Сярод грэкаў Павал працаваў каля 20-ці гадоў, езьдзячы па большых і меншых гарадах прапаведаваць навуку Хрыста. І трэба прызнаць, што хрысьціянскае вучэньне, якое слухалі жыды, грэкі й іншыя пагане, знайшло многа чаго супольнага з гэленскай культурай.

Ня трэба забываць, што ўсходняя візантыйская культура перавышала ўсе іншыя культуры народаў Рымскай імпэрыі, а гэта таму, што зьяўляецца яна насьледніцай антычнай Грэцыі зь яе культурным багацьцем. Гэтую культуру й багацьце хрысьціянства не адкідала, але прымала. Таму яна разам з хрысьціянствам знаходзілі послух у шмат якіх народаў тагачаснай Рымскай імпэрыі. Так, што пасьля жыдоў, грэкі былі першымі, што прынялі хрысьціянства й увялі ў яго сваю моўную рэлігійную тэрміналёгію.

Пры канцы першага стагодзьдзя нашай эры колькасьць хрысьціянскіх абшчын-цэркваў дасягнула сотні. З гэтага ліку тры чацьвёртыя знаходзіліся на Ўсходзе. І такім парадкам пашыралася хрысьціянства.

Варта ўспамянуць, што рэлігіяй народаў абшырнай Рымскай імпэрыі было паганства, якое ня мела нічога суполь-

нага з этыкай і маральлю. Традыцыяй паганскага культу было ідалапаклонства, якое заключалася на здабыцьці ласкі багоў натуры дарогай ахвярапрынашэньня. Была гэта паганская традыцыя культу, на які складаліся дзіўныя забабоны й цырымоніі, ад якіх мела залежаць дабро дзяржавы й ласка нябёс. Для прыкладу можна згадаць Месапатамію — краіну паміж рэкамі Тыгр і Еўфрат, сёньняшні Ірак. У старажытнасьці гэта краіна была калыскай рэлігіяў і цывілізацыі. Яе народы пераказалі сваю мову, ідэі й рэлігіі наступным пакаленьням. Агульна было прынята верыць, што людзі створаны верыць багам. З Месапатаміі паходзіў і Аўраам (Абрагам), які ўвёў веру ў аднаго Бога адкінуўшы ідалапаклонства.

Ідалапаклонства было вядомае спакон вякоў ня толькі ў Месапатаміі, але ў старажынтных індусаў, егіпцян і іншых народах басейна Міжземнага мора, якія будавалі сьвятыні, прыносілі ў іх свае ахвяры й пакланяліся ідалам. Аб гэтым згадвае Біблія з часоў Аўраама. Першыя ідалы прадстаўлялі фігуры жывотных, якія ня маюць нічога супольнага з рэлігіяй. Гісторыя многа згадвае пра грэцкіх і рымскіх багоў. Напрыклад, рымская рэлігія спазнала на сабе ўплыў шматлікіх рэлігіяў, а найбольш грэцкай міфалёгіі. Зь цягам часу рымскія багі былі атоесамлены з грэцкімі: Юпітар з Зэўсам, Юнона з Герай, Мінэрва з Афрадытай і г.д.

Побач тагачасных дзяржаўных паганскіх абрадаў існаваў яшчэ хатні культ, які заключаўся на шанаваньні розных духаў, зьвязаных са штодзённым жыцьцём рымлян. Была гэта рэлігія пераважна набытая ад суседзяў, якая на працягу доўгіх стагодзьдзяў глыбока ўрасла сваімі каранямі ў народную сьвядомасьць шматлікіх народаў. І трэба сказаць праўду, што паганскія масы любілі сваю веру, а найбольш абрады й моцна іх трымаліся.

Паганскіх абрадаў, багоў і духаў было многа, нават п'яніцы, зладзеі й распусьнікі мелі сваіх багоў. Што праўда, дзяржава не падзяляла такія крайнасьці, але не магла ім запабегчы. Бяручы агульна, рымляне па сваёй натуры не былі рэлігійнымі людзьмі. Іхняя ўласная міфалёгія была бедная, затое былі яны больш прывязаны да рытуальных абрадаў. У сваёй дзейнасьці рымляне кіраваліся мэтадамі

больш палітычнымі як рэлігійнымі. Абшырная імпэрыя мела многа розных рэлігіяў і багоў, так што адна рэлігія больш ці менш для дзяржавы не рабіла вялікай розьніцы.

Рымская дзяржава была аснавана на праве й яе адміністрацыя не выступала супраць ніякай рэлігіі, калі гэтая рэлігія не была агрэсыўнай, заставалася ляяльнай да дзяржавы й не нарушала спакою. Аднак годнасьць цэзара лічылася боскаю — „Понтыфікс Максімус".

Ад Юлія Цэзара, які быў забіты ў сэнаце ў 44 годзе да нашай эры, выводзіцца легенда, што род яго паходзіць ад багіні Вэнэры. Актавіян, які быў адаптаваным сынам Цэзара, прапанаваў аб'явіць пакойнага бажаством. Была ўзьнесена калона ў гонар Цэзара. А паколькі Аўгуст быў у свой час усыноўлены Цэзарам, таму й ён лічыўся сынам бога. У часе нараджэньня Ісуса, Цэзар Актавіян атрымаў званьне аўгуста, якое раўнялася паганскім багам і ён сам называў сябе „Дэі філіус" (сын бога).

Культ рымскага імпэратара насіў у сабе палітычны зьмест і паступова пашыраўся па ўсёй дзяржаве й пераходзіў на яго наступнікаў. Такая сьвятасьць накладала на грамадзян абавязак пакланяцца статуям імпэратара, а яго дзень нараджэньня адзначаўся ўсёй імпэрыяй як дзяржаўнае сьвята.

Праз такі ўведзены парадак некаторыя імпэратары пачалі дамагацца, каб народ уважаў іх за багоў і каралі тых, хто не хацеў аддаць ім боскай пашаны. Такая імпэратарская сьвятасьць супярэчыла хрысьціянскай дактрыне й тут апосталы востра адрэагавалі, ставячы пытаньне: хто ёсьць першы ў сьвятыні, імпэратар ці Хрыстос? Гэтае апостальскае пытаньне сталася пачаткам вялікага змаганьня хрысьціян зь імпэратарамі й уладамі Рымскай імпэрыі, якое цягнулася тры стагодзьдзі. І адным зь яго пачынальнікаў быў апостал Павал, які, што праўда, шукаў пагадненьня з антыхрысьціянскай дзейнасьцю рымскіх імпэратараў, але трагічна загінуў у часе прасьледу хрысьціян Нэранам.

Павал памёр, знаючы, што яго місіянерская работа скончана. Ён палажыў асновы пад Хрысьціянскую царкву, якая стала расьці на крыві хрысьціянскіх мучанікаў, пакуль ня сталася афіцыяльнай рэлігіяй Рымскай імпэрыі.

(„Голас Часу № 4 (7), Лёндан, 1990 г.)

Евангельле — Добрая Навіна

Пачатак I стагодзьдзя нашай эры — час зямнога жыцьця Ісуса Хрыста, зьяўляецца надзвычай складанай эпохай у гісторыі Палестыны. Пасьля шматлікіх канфліктаў Палестына была падзелена на пяць адміністрацыйных раёнаў, а яе насельніцтва складала некалькі народнасьцяў, сярод якіх больш колькаснымі былі юдэі, самаране, фінікійцы й арамэйцы. Гаварылі яны на розных мовах, дыялектах і вызнавалі розныя рэлігіі. Такі стан адміністрацыйна-палітычнага парадку быў характэрны ўсім правінцыям Рымскай імпэрыі.

Найбольш колькаснымі сярод народнасьцяў Палестыны былі юдэі, якіх цэнтрам быў Ерусалім. Яны былі патомкамі юдэяў, вярнуўшыхся ў VI-V стагодзьдзях да нашай эры з вавілонскай няволі. Юдэі былі кроўныя тутэйшым плямёнам, а іхняя арамэйская мова розьнілася толькі дыялектам. На гэтай мове прапаведаваў сваю навуку Ісус Хрыстос і на гэтай мове апосталы прапаведавалі й пісалі свае пісьмы-пасланьні як на больш зразумелай і даступнай мове для мясцовага народу. Таксама пашырана была й грэцкая мова. Яна лічылася мовай усяго цывілізаванага сьвету, але ёю карысталіся пераважна ў гарадох вышэйшыя слаі грамадзтва, людзі больш адукаваныя.

Хрысьціянская навука ёсьць аснавана на вучэньні Ісуса Хрыста й бярэ яна вытокі зь юдэйскіх кнігаў Старога Запавету, бо сьпярша не было сваіх хрысьціянскіх кніг. Але неўзабаве пачынаюць паяўляцца хрысьціянскія выданьні. Былі гэта апостальскія пісьмы-пасланьні, апакаліпсы й Евангельлі (што значыць: Добрая Навіна) да абшчынаў па ўсёй Рымскай імпэрыі. Апостальская пісьмовая творчасьць ёсьць пачаткам Новага Запавету ў адрозьненьні да кнігаў біблейскага Старога Запавету.

Апрача кананічных кнігаў, якія увайшлі ў Новы Запавет у канцы I стагодзьдзя й пасьля, зьявіліся фабрыкаты евангельляў, протаевангельлі й апакаліпсісы, якіх агульна называюць „апокрыфамі", або тайнымі кнігамі няведамых аўтараў і якія часта не зусім згодны з духам навукі Хрыста. Па гэтай прычыне яны не былі прызнаны Айцамі Царквы за кананічныя й да царкоўнага ўжытку не прымяняліся.

Весткі аб хрысьціянстве можна знайсьці таксама й у тагачаснай сьвецкай літаратуры, якая захавалася да нашых дзён, для прыкладу ў „Аналах" Тацыта (60-120), а таксама ў працы жыдоўскага гісторыка Язэпа Флавія, які нават прыхільна ставіўся да Хрыста. У жыдоўскім Талмудзе, зразумела, матэрыял аб хрысьціянстве ёсьць варожы.

27 кніжак Новага Запавету зьяўляюцца дакумантам, які састаўляе аснову хрысьціянскай веры. Кнігі гэтыя былі крыніцай веды жыцьця, дзейнасьці й сьмерці Ісуса Хрыста, якія аб'ядноўвалі раскіданыя хрысьціянскія абшчыны. Яны часта заступалі моўную дзейнасьць апосталаў і прапаведнікаў.

Амаль на працягу паўстагодзьдзя хрысьціянства пашыралася дзякуючы вусным пропаведзям. І нават калі паявіліся першыя запісы Евангельля, вусная пропаведзь выконвала важную, калі не галоўную ролю.

Евангельле сталася дадатнім дзейнікам у жыцьці Хрысьціянскай царквы, бо да гэтага часу хрысьціян папракалі, што іхняя вера ня ёсьць аснавана на кнізе, а на Асобе. Такія закіды рабілі жыды, бо іхняя вера зьявілася намнога стагодзьдзяў раней і была аснавана на кнізе.

Што да Евангельля, то аўтарамі яе былі чатыры евангелісты. Яны апісалі жыцьцё Ісуса Хрыста ад Яго нараджэньня да небаўзяцьця, але найбольшую ўвагу аддалі місіянерскай дзейнасьці Хрыста й асабліва апошняму тыдню Яго жыцьця.

Першае Евангельле напісаў апостал Мацьвей каля 70 году, які даўжэйшы час прапаведаваў у Юдэі, Македоніі, Пэрсыі, Сырыі й Эфіёпіі. Працаваў ён у жыдоўскім асяродзьдзі й пісаў для жыдоў, канцэнтруючыся галоўным чынам на Ісусе як доўгачаканым Мэсіі.

Згодна сьведчаньню хрысьціянскага пісьменьніка Папія, які жыў у першай палове II стагодзьдзя, Мацьвей напісаў Евангельле на жыдоўскай мове, гэта значыць на арамэйскай, на якой вучыў Хрыстос. Яго Евангельле было пасьля перакладзена на грэцкую мову праўдападобна самім апосталам, як лічаць некаторыя дасьледчыкі. У Евангельлі Мацьвея пэўны матэрыял ёсьць даслоўны, што знаходзіцца й у Евангельлі Марка й таму гісторыкі лічаць, што існаваў ранейшы пісаны матэрыял з выказваньнямі Ісуса Хрыста, але ён не захаваўся, аднак-жа паслужыў прататыпам

для абодвух евангелістаў. Евангеліст Мацьвей памёр сьмерцю мучаніка.

Другое Евангельле каля 65 году напісаў сьвяты Марк, які быў сваяком апостала Варнавы. Гэтае Евангельле было напісана на грэцкай мове. У сваім Евангельлі Марк даволі часта паясьняе жыдоўскія звычаі, мабыць, гэта сведчыць, што прысьвячае яе нежыдам. Ён урачыста прадстаўляе дзейнасьць Хрыста й паказвае месцы, па якіх Ён хадзіў. Евангеліст Марк быў заснавальнікам Александрыйскай царквы й там памёр сьмерцю мучаніка.

Варта згадаць, што сьвяты Марк падарожнічаў з Паўлам і Варнавам у Антыёхію, пасьля ў Ерусалім і на востраў Кіпр. Праз нейкі час быў ён разам зь Пятром, які ласкава называў яго „мой сын". Марк быў блізкім супрацоўнікам апостала Пятра й усе сабраныя ад яго інфармацыі зь дзейнасьці Хрыста, запісаў. Галоўная дзейнасьць Марка праходзіла ў Паўночнай Афрыцы.

У Евангельлі Марка ёсьць цікавая заметка, якая ня мае нічога супольнага з тэмай Евангельля: „Адзін хлапец апрануты па голаму целу адно пакрывалам, пайшоў за Ім і жаўнеры схапілі яго. Але ён, пакінуўшы пакрывала, голы ўцёк ад іх" (14:51-52). Дасьледчыкі Евангельля лічаць, што гэта маглі быць юнацкія ўспаміны самога евангеліста Марка, як навочнага сьведкі трагічных падзеяў у Гефсіманскім садзе.

Трэцяе Евангельле каля 80 году напісаў сьвяты Лука. Матэрыял для свае Евангельлі ён сабраў, праўдападобна, у сваёй мясцовай царкве й не выключаецца, што нешта ўзяў ад сьв. Мацьвея й сьв. Марка. Але й ён сам быў навочным сьведкам некаторых здарэньняў, якія апісаў у Дзеяньнях Сьвятых Апосталаў. Лука разам з апосталам Паўлам падарожнічаў у Грэцыю, Македонію й Ерусалім.

Евангельле Лукі адзначаецца сваім стылем, дабраным матэрыялам і дакладнасьцю. Апостал Павал называў Луку доктарам, але апошні, акрамя доктарскіх і аўтарскіх здольнасьцяў, быў яшчэ мастаком пэндзля. Мы ня ведаем пра апошнія гады жыцьця Лукі. Традыцыя гаворыць, што жыў ён больш за 80 гадоў і памёр недзе ў Грэцыі. Толькі невядома якой сьмерцю: натуральнай ці мучаніка?

Чацьвёртае й апошняе Евангельле каля 90 году напісаў сьв. Ян, калі вярнуўся да сваіх вернікаў з выгнаньня

ў Эфэс, дзе быў епіскапам Царквы. Яму паказалі тры кнігі Евангельля й прасілі напісаць успаміны з гутарак Хрыста. Апостал Ян быў вельмі стары, слабы й меў усебаковыя недамаганьні, але згадзіўся напісаць Евангельле й у дапамогу ўзяў сабе вучня.

Евангельле Яна было бадай найбольш уплывовай кніжкай Новага Запавету ў раньніх стагодзьдзях гісторыі Царквы. Яна расказвае, галоўным чынам, пра дзейнасьць Хрыста ў Юдэі, а не ў Галілеі. Таксама маюцца весткі, што сьвяты Ян напісаў на выгнаньні Апакаліпсіс. Аднак некаторыя дасьледчыкі сумняваюцца, каб гэтыя дзьве працы мог напісаць сьвяты Ян. Евангельле й Апакаліпсіс розьняцца мовай і стылем. Памёр евангеліст Ян натуральнай сьмерцю ў Эфэсе.

Можна згадаць яшчэ, што евангеліст Ян, сын Завядзееў, якога Хрыстос спаткаў як рыбака на Галілейскім моры, быў Яго любімым апосталам. Яму даручыў Хрыстос апеку над сваёй маткай Марыяй, калі яны стаялі каля крыжа. Ян заапекаваўся маткай Хрыста як сваёй роднай аж да яе сьмерці.

На жаль, ніводзін зь евангелістаў не ўспамянуў шырэй біяграфію Хрыста. Існуе кніга, так званае протаевангельле невядомага аўтара, у якой апісываюцца здарэньні з маладых гадоў Хрыста. Але гэтая кніга ня ёсьць прызнана кананічнай і таму няма падставы спасылацца на яе як на верагодную. Усе евангелісты найбольш канцэнтруюцца на апошнім тыдні жыцьця Хрыста. Ім хадзіла ў першую чаргу, каб пашырыць навуку Хрыста сярод верных і задакумантаваць асноўныя тэзісы навукі Ісуса Хрыста й тое зь Ягонага жыцьця, што было зьвязана з гэтым.

Арыгінальнай мовай Евангельля была грэцкая. Але ў яе грэцкі тэкст увайшлі словы й звароты арамэйскай мовы, на якой гутарыў Хрыстос. Увайшлі яны, праўдападобна, у нязьменным выглядзе так як іх вымаўляў Хрыстос. Але як хрысьціянства пачало пашырацца за арэал грэцкай мовы, тады Евангельле пачалі перакладаць на іншыя мовы, а ў першую чаргу на лацінскую, як дзяржаўную мову Рымскай імпэрыі.

Дзякуючы сьвятым роўнаапосталам Кірылу й Мяфодзію маем славянскі пераклад Евангельля й іншых кнігаў Сьвяшчэннага Пісаньня. І толькі з пашырэньнем рэфармацыі Біблію пачалі перакладаць на нацыянальныя мовы.

Бяручы агульна, чатыры кніжкі Евангельля па сваім зьместу супадаюць за выняткам некаторых розьніцаў. Кніжкі пісаліся некалькі дэкадаў пасьля сьмерці Хрыста ў розных мясцох і для рознага асяродзьдзя. Таму, магчыма, што ў іх спатыкаюцца некаторыя адметнасьці.

Маем яшчэ кнігу Дзеяньняў Сьвятых Апосталаў, якая абымае амаль 30-гадовы перыяд, ад сыходу Сьвятога Духа на апосталаў аж да апошніх гадоў жыцьця апостала Паўла. У ёй апісваецца пашырэньне хрысьціянства вакол берагоў Міжземнага мора, якое зь Ерусаліма праз Сырыю, Малую Азію й Грэцыю ішло да сталіцы Рымскай імпэрыі — Рыму.

Дзеяньні Сьвятых Апосталаў напісаў прыяцель Паўла, евангеліст Лука. Быў ён адзіным аўтарам Новага Запавету, які ня быў жыдам, а толькі грэкам, і паходзіў калі не з Антыёхіі, то зь Філіпіі.

На аснове Евангельля й Дзеяньняў Сьвятых Апосталаў Царква пачала прымаць сваю форму й таму былі ўведзены свае дактрыны, якія адрозьнівалі хрысьціян ад паганаў і жыдоў. Дактрыны гэтыя апрацоўваліся на царкоўных саборах. Такім парадкам Хрысьціянская царква прымала свае акрэсьленыя формы.

Агульна прынята Біблію, што значыць — кніга, называць літаратурай хрысьціян. У шырэйшым значэньні гэтага слова Біблія зьяўляецца калекцыяй 66 паасобных кніжак і пісьмаў, напісаных на працягу больш як 1 000 гадоў. Яе завяршэньне наступіла каля 100 году пасьля сьмерці й уваскрэшаньня Хрыста. Біблія падзяляецца на Стары Запавет (першыя 39 кніжак) і Новы Запавет (апошнія 27 кніжак), якія зьяўляюцца асновай хрысьціянскай веры.

Новы Запавет, у параўнаньні да Старога, абымае толькі 60-80 гадоў, пачынаючы ад нараджэньня маці Ісуса Хрыста Марыі й канчаючы апісаньнем дзейнасьці апосталаў.

Сёньня Біблія ёсьць ператлумачана на больш як 1 600 моваў і дыялектаў. І хоць была яна закончана блізка 2 000 гадоў таму, але яшчэ й цяпер карыстаюцца й цікавяцца ёю шырокія колы людзей рознай культуры й веры, а для хрысьціян зьяўляецца яна асновай веры.

(„Голас Часу" № 13 (4), Лёндан, 1991 г.)

Хрысьціянства й яго першыя рымскія цэзары

Дзяржаўную палітыку й адміністрацыйную арганізацыю Рымскай імпэрыі цэзары спалучалі з паганскай верай у адну цэласьць. Яны ўважалі, што ляяльны Рымскай імпэрыі чалавек павінен быць ляяльны й рымскім багам, якія зьяўляюцца сьвятымі апекунамі імпэрыі. Адкінуць паганскіх багоў азначала адкінуць дзяржаву, што было яўнай здрадай. З такой пастаноўкай справы не пагаджаліся хрысьціяне й жыды Юдэі.

Знаючы жыдоўскі фанатызм, рымскія ўлады далі ім канцэсіі, якіх іншыя народы імпэрыі ня мелі. Жыды маглі захоўваць сваю рэлігійную традыцыю па ўсёй імпэрыі без ніякіх перашкод. Але аб хрысьціянах мала хто знаў, нават у сталіцы — Рыме. Прыязджалі яны ў гэты горад як кожны іншы чалавек. Першыя хрысьціяне, якія былі пераважна згэленізованымі жыдамі або сапраўднымі грэкамі, мелі свае ўмоўленыя знакі, па якіх пазнаваліся й тварылі сваю хрысьціянскую „эклезію" — згуртаваньне або царкву. Зарганізаваўшыся такім парадкам у „эклезію", хрысьціяне выбіралі са свайго ліку „прэсбітэрос", „епіскопос", „дыяконос", якія абслугоўвалі хрысьціянскдя абшчыны. Асновы першай Хрысьціянскай царквы ў Рыме, а таксама яе малітвы былі пакладзены на грэцкай, а не на жыдоўскай ці лацінскай мовах. Гэта, магчыма, выклікала непаразуменьні, або зайздрасьць жыдоў, што выявілася ў яўным бунце ў 49 годзе. У выніку бунту рымскі імпэратар Кляўдый выганяў з горада жыдоў як рэлігійных агітатараў і адчыніў некаторыя сынагогі.

Маючы непаразуменьні з жыдамі, усё-ж хрысьціяне хаваліся перад рымскімі ўладамі пад жыдоўскія прывілеі, якія апошнім далі рымляне. Хрысьціяне рэпрэзэнтавалі новую веру, а зь ёю — новыя адносіны да існуючых культаў, да старажытных багоў і розных бажаствоў, што ахоўвалі старажытны парадак у межах і за межамі Рымскай імпэрыі. І ня менш важна было тое, што хрысьціянства рэпрэзэнтавала новыя адносіны да юдэйства, зь якога ўзяло пачаткі свайго жыцьця-эры. Рымляне на гэта не зьвярнулі вялікай

увагі, трактавалі хрысьціян аднолькава, так як і іншыя жыдоўскія сэкты, і гэтым самым ахоўвалі іх.

Зь цягам часу розьніцы паміж жыдамі й хрысьціянамі паглыбляліся й станавіліся больш відавочнымі. Гэта заўважылі рымскія ўлады й пачалі бліжэй прыглядацца да рэлігіі хрысьціян. І тут яны ўбачылі непажаданую для сябе арганізацыю, якая пагражае еднасьці дзяржавы. Гэта паслужыла прычынай для розных абвінавачваньняў і закідаў скіраваных пад адрасам хрысьціян.

Характэрнай рысай першых хрысьціян было тое, што зьвярталі яны вялікую ўвагу на свой маральны бок, як на што іншае й гэта магло не падабацца рымскім уладам. Досьць таго, што хрысьціяне праявілі сябе настолькі, што рымскія ўлады ўстанавілі розьніцу паміж імі й жыдамі. Гэтым хрысьціяне прыгаварылі сябе на ўтрату легальнай пратэкцыі, якой яны карысталіся да гэтага часу.

Імпэратара Аўгуста, пры якім нарадзіўся Ісус, заступіў сын Тыбэрый (14-37). Быў ён у свой час актыўным і здольным генэралам, але ў Рыме не карыстаўся папулярнасьцю. Амаль усе гістарычныя крыніцы выказваюцца аб ім адмоўна й таму, праўдападобна, ён у 26 годзе выехаў на востраў Капры й гэтым ізаляваў сябе ад асяродзьдзя.

Баючыся, аднак, за сваё жыцьцё й ўладу, Тыбэрый строга караў сваіх праціўнікаў за мінімальныя правіненьні, часам няслушныя. За гэта быў замардаваны загаворшчыкамі, сваімі блізкімі людзьмі, якія таксама баяліся за сваё жыцьцё. Фактычна Тыбэрыя задушыў падушкаю Марко, найбліжэйшы імпэратараў кампаньён, які быў камандзірам гвардыі. Памёр Тыбэрый нічога ня ведаючы пра хрысьціян.

Яшчэ за свайго жыцьця Тыбэрый у 35 годзе назначыў сваім заступнікам сына Германіка — будучага Калігулю. Калігуля (37-41), як імпэратар, быў вітаны народам, але нейкая хвароба ўпала яму на галаву й стаў ён тыранам. Калігуля пачаў выступаць у кароне на галаве як сапраўдны бог і загадаў жыдам ставіць яго статуі ў сынагогах. Пагане ўрываліся ў жыдоўскія сынагогі, ставілі там статуі імпэратара, білі жыдоўскіх кіраўнікоў рады, а жанчын змушалі есьці сала. Быў гэта адказ на жыдоўскія дамаганьні грамадзянскіх правоў замест аўтаномнай правінцыі, якою яны карысталіся.

У 40 годзе высланы былі ў Рым грэцкія й жыдоўскія дэлегацыі, каб прадставіць на разгляд імпэратара сваю справу рэлігійнага закалоту. Жыдоў рэпрэзэнтаваў філёзаф Філон, памяркоўны прадстаўнік, які насьвятліў імпэратару прынцыпы жыдоўскай рэлігіі. Нэрвовы Калігуля, які лічыў сябе богам, ня мог зразумець, каб нехта не хацеў прызнаць ягоную сьвятасьць, а мог верыць у нешта нябачанае.

Гэта паслужыла прычынай, што жыды Александрыі й Палестыны паднялі новы бунт супраць культу імпэратара. Рэакцыя наступіла хутка. Пастаноўлена было замяніць усе жыдоўскія сынагогі на культ імпэратара. Заносілася на вялікі бунт жыдоў, які невядома чым мог закончыцца, каб не свае слугі замардавалі маладога бога Калігулю ў ягоным палацы. Сьмерць Калігулі стрымала новы канфлікт і прынесла радасьць жыдам. Быў гэта імпэратар-тыран, які без суда паслаў на сьмерць многа людзей.

Калігулю заступіў дзядзька Кляўдый (41-54) у той час, калі паміж жыдамі і грэкамі Александрыі й Палестыны даходзіла да боек. Каб ахаладзіць атмасфэру, імпэратар напісаў пісьмы да жыдоў і грэкаў ня толькі Александрыі й Палестыны, але ўсяе імпэрыі. Ён у пісьмах выказаў сваю сымпатыю й адначасна напомніў, каб абодва бакі захоўваліся годна да багоў ды іншых людзей.

У той час была вялікая варожасьць жыдоў і да хрысьціян. Наколькі яна была вялікая сьведчыць той факт, што часам паганскія магістраты аказвалі прытулак хрысьціянам ад прасьледу мясцовых жыдоўскіх сынагогаў. Рабіны выганялі жыдоў-хрысьціян са сваіх сынагогаў за іхнюю новую веру й асуджалі іх за зьнявагу Бога. Такія паводзіны рабінаў паслужылі прычынай таму, што ў той час прыняты былі першыя крокі да аддзяленьня хрысьціянскай тэрміналёгіі ад жыдоўскай. Бяручы агульна, Кляўдый быў здольны й разважны адміністратар. Акрамя ўрэгуляваньня рэлігійных спраў ён пашырыў граніцы імпэрыі на захадзе, далучыўшы паўднёвую Англію.

Імпэратар Кляўдый меў сына Брытаніка, на якога сэнат ускладаў надзею як на будучага імпэратара. Але чацьвёртая жонка Кляўдыя, Агрыпіна, таксама мела сына Нэрона з папярэдняга сужэнства. Яна пераканала мужа й ён згадзіўся

адаптаваць яе сына. Пасьля, мабыць, Агрыпіна пабаялася, што Кляўдый можа зьмяніць сваю думку адносна яе сына й рашыла атруціць імпэратара, што неўзабаве зрабіла. Памёр Кляўдый 13 кастрычніка 54 году на 64 годзе жыцьця. Сьмерць яго змоўшчыкі трымалі ў сакрэце, пакуль не было афармлена насьледзтва Нэрона.

Такім злачынным парадкам на імпэратарскі трон сеў Нэрон (54-68) — 17-гадовы юнак, народжаны 15 сьнежня 37 году. Яго настаўнікам быў філёзаф Сэнэка, чалавек здольны на ўсякую пакасьць. Аднак найгоршай была Агрыпіна, па сьлядах якой пайшоў і сын Нэрон. Агрыпіна пры дапамозе Сэнэкі замаскавала забойства мужа, імпэратара Кляўдыя. Змоўшчыкі зладзілі ўрачыстыя паховіны, на якіх прамову, напісаную Сэнэкам, зрабіў Нэрон, адзначыўшы заслугі памерлага імпэратара.

Не было гэта першае й апошняе забойства ў акружэньні Агрыпіны й Нэрона. У 55 годзе атруцілі Брытаніка, у 59 годзе Нэрон атруціў матку сваю Агрыпіну, якая пасадзіла яго на імпэратарскі трон, у 62 годзе Нэрон атруціў сваю жонку Актавіяну, якая была дачкой атручанага імпэратара Кляўдыя, каб ажаніцца з Сабінай Папеяй, якую забраў ад мужа й па некаторым часе забіў яе ў злосьці. Трэцяя жанчына адмовіла быць ягонай жонкай і за гэта была замардавана. Замардаваў Нэрон мужа чацьвёртай жанчыны, спадзеючыся, што яна будзе ягонай жонкай. У 66 годзе Нэрон ажаніўся са Сталіліяй Мэсалінай, якая перажыла яго.

Тыран Нэрон меў падазрэньні на ўсё бізкае акружэньне. Па яго загаду зьнішчана было шасьнаццаць сэнатараў, а іншыя, каб уратаваць сваё жыцьцё, пачалі падлізвацца імпэратару, што не заўсёды ўдавалася. Нэрон змусіў нават свайго памагатага, былога настаўніка, філёзафа Сэнэку, пакончыць жыцьцё самагубствам. Як бачым, забойствам у асяродзьдзі Нэрона не было канца.

Усе гэтыя забойствы рабіліся, быццам, з волі багоў за немаральныя паводзіны. Ды нават сэнат вынес удзячнасьць багам за навядзеньне маральнага парадку. А злачынны Нэрон, маючы на сумленьні не адну замардаваную асобу, уважаў сябе за „сына Апалона" й выступаў у яго ролі.

Таксама Нэрон лічыў сябе вялікім артыстам, удзельнічаў у тэатральных выступленьнях, сьпяваў і чытаў свае вершы.

На гэтых выступленьнях павінен быў прысутнічаць кожны. Бяда чакала таго, хто адважыўся-б пакрытыкаваць артыстычныя здольнасьці Нэрона, якія ён сабе надаваў. Аднойчы, у часе такога тэатральнага выступленьня Нэрона ў Грэцыі ў крэсьле заснуў камандзір войска, будучы імпэратар Вэспасіян, які ледзь пазьбег бяды.

Нэрона баяліся ўсе, аб чым піша гісторык Тацыт: „І вось, у каго загінуў сын або брат, і той, у каго — сваяк або прыяцель, узносілі ўдзячнасьць багам, упрыгожвалі лаўровымі галінкамі свае дамы, падалі да кален Нэрона, цалавалі яго рукі". Уначы з 18 на 19 ліпеня 64 году загарэўся Рым і праз дзевяць дзён і начэй агонь руйнаваў горад. У час пажару Нэрон ня быў у Рыме, а ў Анзіё. Калі ён вярнуўся ў Рым, хадзілі чуткі, што Рым быў падпалены па загаду імпэратара. Спыніць такія чуткі, як піша Тацыт, было вельмі цяжка. Тады Нэрон рашыў знайсьці „казлоў адпушчэньня" й у падпале сталіцы абвінаваціў хрысьціян.

Аб хрысьціянах хадзілі рознага роду недарэчнасьці, быццам яны на сваіх сходах забіваюць дзяцей, п'юць кроў, ядуць людзкое мяса й спраўляюць оргіі, аб якіх не гавораць. Хрысьціян абвінялі ўсе й асуджалі іх як атэістаў, якія абражаюць усіх багоў.

У антыхрысьціянскай прапагандзе вінавата была й жонка Нэрона Папея. Як згадвае тагачасны жыдоўскі пісьменнік-гісторык Язэп Флавій, ён пры спатканьні з Папеяй прасіў яе вызваліць жыдоўскіх сьвятароў. Просьба яго была задаволена й у знак прыязьні Флавій атрымаў вялікія падаркі ад Папеі. Гэты факт сьведчыць, што Папея сымпатызавала жыдам і, як хадзілі чуткі, верыла ў жыдоўскага Бога й быццам была жыдоўкай. Празь яе жыды ўратавалі сябе, а хрысьціян прыгаварылі на мукі й сьмерць.

Весткі пра сьмяротныя пакараньні хрысьціян у Рыме разышліся па-за межы сталіцы й аб хрысьціянах загаварылі мацней. Гэта паслужыла прычынай, што рымская адміністрацыя ўвяла яўны падзел паміж юдаізмам і хрысьціянствам. Ды нават хрысьціяне пасьля пажару Рыму й пазьнейшых жыдоўскіх рэвольтаў-паўстаньняў супраць рымскай адміністрацыі не хацелі мець нічога супольнага з жыдамі-юдэямі. Апостал Павал пісаў у сваім пасланьні да рымлянаў: „Уся-

кая душа няхай будзе пакорна ўладам, бо няма ўлады, каб не ад Бога; існуючыя-ж улады ад Бога пастаўлена" (13:1).

Крывавы прасьлед хрысьціян Нэронам адбыўся толькі ў Рыме. Сьмяротныя экзэкуцыі, катаваньні й мучэньні тырана Нэрона ня зьнішчылі першых хрысьціянскіх абшчын. Традыцыйна прынята верыць, што апосталы Пётр і Павал загінулі ў Рыме сьмерцю мучанікаў у часе прасьледу Нэрона, але на гэта няма дакладных фактаў і месца іхняй сьмерці.

Вяртаючыся да пажару Рыму, Тацыт, які трымаўся ўрадавых кругоў і быў навочным сьведкам тагачасных падзеяў, пытаньне пажару сталіцы пакінуў адкрытым. Нейкіх 50 гадоў пазьней ён пісаў: „Хаця хрысьціяне й былі людзі вінаватыя й заслугоўвалі на суровыя пакараньні, аднак да іх адчувалася спачуваньне таму, што вынішчаліся яны не дзеля агульнай карысьці, а дзеля суровасьці аднаго чалавека".

Тацыт асуджаў хрысьціян не за іхнюю веру, як выказваюцца некаторыя дасьледчыкі й не за пажар Рыму, але за тое, што яны крытыкавалі паганскі спосаб жыцьця рымлян і тут была іхняя галоўная „віна".

Жыхары Рыму не паверылі Нэрону ў справе пажару Рыму, яны былі пэўны, што хрысьціянам прышылі справу падпалу гораду. Аднак даная справа не была высьветлена. Таксама нідзе не сказана, што Нэрон загадаў спаліць Рым. Але некаторыя факты нагадваюць, што была гэта яго ініцыятыва, каб пабудаваць новы і больш прыгожы Рым. Нэрон узяўся адбудаваць горад і ў першую чаргу пабудаваў сабе прыгожы палац — Залаты Дом. А сьмерць памардаваных напамінала, што ня можна быць хрысьціянінам.

І, нягледзячы на прасьлед Нэрона, хрысьціянскі рух разьвіваўся й меў многа пасьлядоўнікаў вакол Міжземнага мора й шматлікіх гарадоў як Антыёхія, Кесарыя, Эфэс, Філіпі, Карынтыя, Александрыя й Рым. Ва ўсіх гэтых і іншых гарадах можна было знайсьці групы хрысьціян, якія былі даволі актыўныя ў сваёй дзейнасьці. Людзі гэтыя мелі такую глыбокую веру, што за яе гатовы былі аддаць жыцьцё кожнай хвіліны. Як сказаў пазьней Яўсевій — быццам бляск сонца разьясьніў усю зямлю й хрысьціянская навука пашыралася па ўсёй імпэрыі. Таму хрысьціян, як нелегальную арганізацыю, Нэрон хацеў зьнішчыць.

Прыйшоў час, калі пасьля 14 гадоў крывавага імпэратарства Нэрона аўтарытэт яго ўпаў. Нэрона не любілі ў Рыме й цікава тое, што не любілі яго не за тое, што ён мардаваў сваіх родных, блізкіх і чужых, а галоўна за тое, што ў часе яго імпэратарства пачыналіся бунты ў імпэрыі. Супраць Нэрона, акрамя жыдоў, збунтаваліся некаторыя кіраўнікі правінцыяў, легіёны над Рэйнам і ў Гішпаніі, сэнат, урадаўцы, ды нават прыбочная ахова адступіла ад яго. Стаўшы адзінокім і разумеючы абставіны, свае памылкі й праступствы, Нэрон пакончыў сваё жыцьцё самгубствам 9 чэрвеня 68 году, маючы 31 год.

Даведаўшыся аб сьмерці Нэрона людзі ад радасьці бегалі па вуліцах, але былі й такія, што праз даўжэйшы час прыносілі кветкі на яго магілу.

Імпэратара Тыбэрыя й трох яго наступнікаў прынята называць у гісторыі дынастыяй Юліяў-Клаўдыяў. За гэтых трох імпэратараў мы не знаходзім у гісторыі нічога такога, што гаварыла-б аб іхняй варожасьці ці прыязьні да хрысьціянства. Характэрна ім тое, што ніводзін зь імпэратараў гэтай дынастыі не памёр натуральнай сьмерцю. Інтрыгі, загаворы, сьмяротныя пакараньні й самагубствы былі неразлучнымі спадарожнікамі іхняга неспакойнага кіраўніцтва. А найбольш дзіўнай і трагічнай асобай гэтай дынастыі аказаўся апошні імпэратар — Нэрон.

(„Голас Часу" № 5 (8), Лёндан, 1990 г.)

Новая эра ў гісторыі Рымскай імпэрыі

На рубяжы старой і новай эры Рымская імпэрыя абымала шырокую тэрыторыю. Усё ўзьбярэжжа Міжземнага мора — Малая Азія, Сырыя, Егіпет, Гішпашя, Францыя, Нямеччына, Англія й краіны над Дунаем належалі да Рымскай імпэрыі. Адны з гэтых краін стаялі на высокім культурным узраўні, як напрыклад Грэцыя, а другія ўваходзілі ў склад імпэрыі як народы першабытнай эпохі.

Кіраваць гэтымі народамі й краінамі не было так лёгка. Аднак народы імпэрыі жылі між сабою згодна, карысталі-

ся адной гэленска-рымскай культурай. Вынятак складалі толькі жыды, якіх найбольш дзяліла іхняя вера й баявы дух Макавеяў.

У апошніх гадах жыцьця Нэрона жыды паднялі паўстанне ў Юдэі й выразалі ў Ерусаліме рымскі гарнізон. Рымская армія, якая ішла навесьці парадак, папала ў жыдоўскую засаду й была зьнішчана. Быў гэта пачатак так званай Першай рымска-жыдоўскай вайны (66-70). На чале паўстанцаў у Галілеі стаў сын рабіна, Язэп бен Матыя, патомак герояў Макавеяў.

Больш бунтаўнічая была Юдэя, жыхарамі якой былі жыдоўскія фанатыкі, якія мала калі жылі згодна між сабою, а з грэкамі й хрысьціянамі былі ў сталым канфлікце. Яны пачалі вайну з грэкамі, якіх масакравалі ў Самарыі, Галілеі й Транс'рданіі, а ў адказ грэкі масакравалі жыдоў у Александрыі, Кесарыі й другіх гарадох імпэрыі.

Перад хрысьціянамі-жыдамі, жыхарамі Палестыны, паўстала пытаньне, дылема: ці стаць за збунтаванымі жыдоўскімі нацыналістамі, ці адысьці зусім ад гэтага неразважнага бунту-паўстаньня, якое вяло краіну да руіны. Выбраны быў апошні варыянт. Хрысьціяне пакінулі Ерусалім і пасяліліся ў Пэльля, у грэцкім горадзе за Ярданам. Хрысьціяне памяталі нядаўнюю сьмерць брата Хрыста, Якава, у 62 годзе з рук жыдоўскіх фанатыкаў у Ерусаліме. Памяталі прасьлед Хрысьціянскай царквы й таму не маглі аказаць свае сымпатыі жыдам-юдэям. І хоць была гэта гераічная вайна жыдоўскіх фанатыкаў з рымлянамі, аднак была яна прыгаворана на паражэньне. Жыдам не ўдалося пазбыцца над сабою чужой дамінацыі й уплываў, а толькі праз свае бунты сьцягнулі на сябе большы прасьлед.

Паўстаньне жыдоў у Палестыне было падтрымана паўстаньнем жыдоў у Александрыі ў 66 годзе. Як падае тагачасны жыдоўскі гісторык Язэп Флавій, у Александрыйскім паўстаньні загінула 50 тысяч жыдоў. Каб успакоіць паўстаньне, трэба было рымлянам сьцягнуць большыя сілы войска.

У лютым 67 году Нэрон назначыў Вэспасіяна галоўнакамандуючым войска ў Юдэі. Быў гэта здольны й асьцярожны генэрал, які ў тым-жа годзе забраў ад збунтаваных жыдоў Галілею, а ў чэрвені 68 году падышоў пад галоўны жы-

доўскі горад Ерусалім. Вэспасіян не хацеў праліцьця крыві й таму прадставіў жыдам варункі міру. На жаль, былі яны адкінуты абаронцамі Ерусаліма.

У гэтым часе Вэспасіян спыніў свой наступ супраць жыдоў і паслаў у Рым сына Ціта па новыя інструкцыі ад новага імпэратара Гальбы, бо Нэрон, папаўшы ў няласку, пакончыў жыцьцё самагубствам. Па ім з радні нікога не засталося й таму пачалася рывалізацыя за трон паміж прэтэндэнтамі.

Па дарозе Ціт даведаўся аб забойстве Гальбы ў студзені 69 году, якога заступіў Ота Марк Сальвій. Ціт вярнуўся да бацькі. Спадзяючыся, што грамадзянская вайна закончылася, Вэспасіян пачаў рыхтавацца да атакі на Ерусалім, але ў гэтым часе атрымаў навіну аб паражэньні Оты й паходзе Вітэлія на Рым. Зноў прыйшлося адлажыць атаку на Ерусалім.

Пабітая армія Оты скапітулявала, а расчараваны камандзір пакончыў жыцьцё самагубствам. Сьмерць Оты выратавала краіну ад грамадзянскай вайны, але на гэтым ня быў канец.

У сувязі з частымі зьменамі на імпэратарскім троне ў Рыме, 1 ліпеня 69 году легіёны ў Егіпце прагаласілі Вэспасіяна імпэратарам. 20 сьнежня гэтага-ж году Рым пацьвердзіў кандыдатуру Вэспасіяна. Вітэлій быў забіты, а летам 70 году Вэспасіян прыбыў з Александрыі ў Італію. Перад сваім ад'ездам у Італію Вэспасіян справу Ерусаліма даручыў сыну Ціту.

Вясной 70 году, у часе Пасхі, Ціт аблажыў Ерусалім. Падобна бацьку, ён ахвяроўваў жыдам варункі міру, але й гэтым разам былі яны адкінуты. Сярод жыдоў не было парадку, згоды, яны сварыліся між сабою замест арганізаваць абарону супраць легіёнаў.

Найбольшым ворагам жыдоў у абложаным Ерусаліме аказаўся голад. Яны паміралі ў хатах, на вуліцах, былі аслаблены да таго, што ня мелі сілы хаваць трупаў, але ня здаваліся. Пасьля аблогі, як жыды фізычна аслабелі, 10 жніўня 70 году пачаўся штурм гораду. Барацьба за горад ішла амаль месяц часу й толькі 8 верасьня супраціў жыдоў быў канчаткова зламаны й Ерусалімам завалодалі рымляне.

Горад Ерусалім быў зьнішчаны пажарам. Ціт, быццам, хацеў уратаваць слаўную Ерусалімскую сьвятыню, але яму параілі зьнішчыць яе, што адаб'ецца ня толькі на веры жыдоўскай, але й на хрысьціянах. У часе бою згарэла многа жыдоўскай

літаратуры, зьнішчылася слаўная сьвятыня Ірада Вялікага. Застаўся ад ёй толькі кавалак муру — „сьцяна плачу", перад якою жыды, верныя старой традыцыі, прывыклі плакаць.

Многа жыдоў загінула ў паўстаньні; толькі частка іх уцякла, а частка пайшла ў няволю. Як падае гісторык Язэп Флавій, 1 100 000 жыдоў загінула, калі не ад голаду ў часе аблогі, то ад мяча, а 97 тысяч пайшло ў няволю.

Язэп Флавій быў камандзірам аднаго жыдоўскага аддзелу ў гэтай вайне, але перайшоў на бок рымлян і быў перакладчыкам пры будучым імпэратары Вэспасіяне і ягоным сыне Ціце. Вайну 66-70 гадоў Язэп Флавій апісаў у сваёй кнізе „Юдэйскія старажытнасьці".

Пасьля паражэньня жыды расьсеяліся (дыяспара) вакол Міжземнага мора. Паводле запісаў таго-ж Язэпа Флавія, была гэта Божая кара за забойства апостала Якава — першага хрысьціянскага настаяцеля Ерусалімскай царквы. А ў Евангельлі маецца такі запіс, які адносіцца да Ерусаліма: „Прыйдуць на цябе дні, калі ворагі твае абкладуць цябе акопамі й акружаць цябе й сьціснуць цябе зусюль, і зруйнуюць цябе й пазабіваюць дзяцей тваіх у табе й не пакінуць у табе каменя на камені" (Лк., 19:43-44).

У другім месцы Евангельля запісана: „Усё-ж гэта — пачатак гора. Тады будуць выдаваць вас на мукі й забіваць вас; і зьненавідзяць вас усе народы за імя Маё" (Мць., 24:8-9).

У верасьні 70 году Ціт канчаткова здушыў паўстаньне жыдоў і завалодаў Ерусалімам, а ў кастрычніку бацька Вэспасіян урачыста ўехаў у Рым вітаны народам. Для Рымскай імпэрыі адкрылася новая старонка гісторыі.

На працягу свае доўгае гісторыі жыды многа зазналі горкага прасьледу, выгнаньня й дэпартацыі з боку мацнейшых дзяжаваў, але гэта мала іх навучыла. У 71 годзе Вэспасіян разам з Цітам, а пры іх баку Даміцыян, брат Ціта, сьвяткавалі ў Рыме сваю перамогу над жыдамі. Была гэта вялікая мілітарная перамога, але не духовая. Ерусалім надалей застаўся этнічна жыдоўскім горадам і разам з Палестынай лічыўся Рымскай правінцыяй, але горад гэты перастаў быць рэлігійным цэнтрам для жыдоў і хрысьціян.

Пры нагодзе можна ўспамянуць, што пасьля падзеньня Ерусаліма, яшчэ праз тры гады трымалася Ірадава крэпасьць

Масада, якая знаходзілася на заходнім беразе Мёртвага мора. Трымалі яе галоўныя лідэры паўстаньня — зілоты на чале з Элазарам бэн Яірам. Крэпасьць была захоплена ад рымлян на пачатку паўстаньня. І калі рымскае войска пад камандай Сільвы Флавія акружыла стромую гару й нарэшце зламала супраціў абаронцаў, узялі яны жывымі толькі дзьве кабеты й пяцёра дзяцей. Рэшта гарнізону, які налічваў 967 людзей, пакончыла самагубствам. Сёньня для жыдоў Масада зьяўляецца сьвятым месцам. Кожны прызваны ў армію ізраільцянін прысягае, што „Масада ніколі не здасца".

Пасьля трагічнага жыдоўскага паўстаньня няма ніякіх канкрэтных сьведчаньняў аб Хрысьціянскай царкве ў Ерусаліме, якая лічылася Маткай. Толькі ў наступным стагодзьдзі пачынае аднаўляцца царкоўнае жыцьцё, а гэта таму, што жыды-хрысьціяне парвалі зносіны з жыдамі-юдэямі й пакінулі Ерусалім за іхняе неразважнае паўстаньне супраць рымлянаў. Галоўным цэнтрам хрысьціян Палестыны аказалася на той час Кесарыя, дзе добра памяталі апостала Паўла.

Імпэратар Вэспасіян (69-79) паходзіў з заможнай сям'і й меў адукацыю. Ведаў ён грэцкую мову, а як жаўнер-камандзір займаў адказныя становішчы ў Тракіі, Нямеччыне, Брытаніі й Юдэі. Адміністрацыя яго працавала спраўна, дзе зьвернута была ўвага на пашырэньне асьветы. У дзяржаўных справах Вэспасіяну многа памагаў Ціт. Бяручы агульна, Вэспасіян быў добрым гаспадаром імпэрыі й палажыў канец грамадзянскай вайне, што было станоўчым дзейнікам гаспадарчага й культурнага разьвіцьця. Будучы цяжка хворы, Вэспасіян падняўся, апёрся на плячох сваіх сяброў і сказаў: „Імпэратар павінен памерці на нагах". Памёр Вэспасіян ва ўзросьце 69 гадоў.

Былі, аднак, ворагі й у Вэспасіяна ў сэнаце, якія тварылі кансьпірацыю. У 71 годзе ён высяліў некаторых змоўшчыкаў з Рыму. І калі гэтыя людзі пачалі атакаваць яго з правінцыі, то й гэтым разам імпэратар не падняў на іх свае рукі, а сказаў: „Я не забіваю сабаку за тое, што ён брэша".

Вэспасіяна заступіў сын Ціт (79-81). Мы ўжо коратка пісалі аб ім і можна яшчэ дадаць, што быў ён паважаны народам за свае заслуті. Ціт добра валодаў латыньню і грэкай і быў надзвычай працавіты. Аднойчы, калі ён заседзеўся за сталом

і нічога не зрабіў, то, зьвярнуўшыся да сваіх субяседнікаў, сказаў: „Сябры, сёньняшні дзень быў для мяне страчаны".

У часе імпэратарства Ціта адбыліся страшэнныя здарэньні. 24 жніўня 79 году ўзарваўся верх Везувія. Задрыжала зямля, узбурылася мора й паветра напоўнілася дымам, попелам і агнём. Вулканічная лава заліла Пампэю й суседнія вёскі зь людзьмі, а цёмныя хмары попелу пакрылі навакольле. У 80 годзе сталася другое няшчасьце, загарэўся Рым і праз тры дні й ночы агонь нішчыў будынкі сталіцы. Трэцім няшчасьцем для Ціта аказалася эпідэмія, якая касіла людзей.

Ціт разумеў людзкое няшчасьце й пацярпеўшым аказваў дапамогу. Ён прадаў нават частку сваёй мэблі, каб сабраць грошы для пацярпеўшых гараджан. У гэты крытычны й трагічны час Ціт сам стаўся ахвярай эпідэміі.

За свайго жыцьця Ціт меў многа непрыемнасьцяў ад брата Даміцыяна, які кансьпіраваў супраць яго. Ён учыняў замяшаньне ў арміі й часам рабіў гэта адкрыта. За такое Ціт мог сурова пакараць яго, але ён прасіў брата: „Памятай, што ты ёсьць мой супрацоўнік і выбраны заступнікам", а часам са сьлязьмі на вачох прасіў яго спыніць шкодную работу.

Перад сьмерцю Ціт сказаў, што зрабіў ён толькі адзін грэх, які спачывае на яго сумленьні. Але які гэта быў грэх не сказаў. Ціт памёр 1 верасьня 81 году, маючы 41 год.

Сьмерць яго сэнат і народ прынялі зь вялікім жалем. Толькі жыды былі задаволеныя. Яны не любілі Ціта за зьнішчэньне Ерусаліма й іхняй слаўнай сьвятыні, але ў сапраўднасьці ня Ціт, а самі жыды былі вінаватыя ў гэтым. Выбух Вэзувія й другія няшчасьці жыды тлумачылі як Божую кару.

Ціт прадаўжаў палітыку свайго бацькі, Вэспасіяна, і за іхняга панаваньня ня было прасьледу хрысьціян. Яны былі пакінуты ня толькі ў спакоі, бо можна іх было знайсьці на імпэратарскім двары. Толькі жыды Палестыны пацярпелі кару за сваю бунтаўнічую дзейнасьць, але й іх не прасьледавалі. У другіх гарадох імпэрыі, як Антыёхія ці Александрыя, некаторыя дарадчыкі Вэспасіяна прасілі яго пазбавіць жыдоў некаторых прывілеяў за той клопат, які яны зрабілі ў Палестыне. Аднак Вэспасіян не згадзіўся са сваімі дарадчыкамі.

Пад лагодным кіраўніцтвам Вэспасіяна й Ціта жыды Палестыны знайшлі сабе новага лідэра ў асобе Гамалііла й яго-нага заступніка Акібы. Пачала дзейнічаць жыдоўская акадэмія ў Ямніі з новай культурай і тэалягічным цэнтрам, што падняло жыдоў на духу.

Калі мы глянем на апошніх пару стагодзьдзяў жыдоўскай гісторыі старой эры і пачатку новай, то бачым, што быў гэта цяжкі для іх час. Прыціхлі галасы прарокаў, якія жыдам абяцалі залаты век. Замест якога наступілі паражэньні, акупацыі, перасяленьні й рэлігійны прасьлед, калі не за Вэспасіяна й Ціта, то за наступных імпэратараў. Усёж жыдам было дазволена, яшчэ да нашай эры, практыкаваць сваю веру й абраднасьць дзе толькі яны пражывалі ў Рымскай імпэрыі.

Пачынаючы ад Нэрона й жыдоўска-рымскай вайны (66-70) паміж хрысьціянамі і жыдамі наступіў яўны падзел. Іхнія рэлігійныя дарогі разышліся, хоць як адны, так і іншыя верылі ў аднаго Бога. Хрысьціян-нежыдоў з кожным годам станавілася больш як хрысьціян-жыдоў і пасьля Апостальскага сабору ў 49 годзе, які вызваліў веруючых ад жыдоўскага закону, хрысьціянства пашыралася яшчэ хутчэй па-за этнічныя межы жыдоў. Аднак і для хрысьціян шчасьце не ўсьміхалася, бо былі яны прасьледаваныя ня толькі жыдамі, але й рымскімі ўладамі.

Ціт не пакінуў насьледзтва, каб пераказаць сваю ўладу, а да свайго малодшага брата Даміцыяна ня меў даверу. Хоць Ціт казаў, што Даміцыян — „выбраны заступнік", але ніхто ня чуў, каб Ціт перадаў яму ўладу, аднак яе Даміцыян (81-96) пераняў. Паводле пагалосак, Даміцыян быццам бы спрычыніўся да сьмерці свайго брата Ціта, але больш верагодна, што яе прычынай была хвароба.

Даміцыян, народжаны 24 кастрычніка 51 году, быў першым імпэратарам, які выступіў супраць пераймальнікаў навукі Хрыста й пачаў прасьледаваць хрысьціян.

Як дэспат патрабаваў, каб людзі маліліся да яго як да „бога пана", а хрысьціянства трактаваў як вялікае злачынства. Нават сваяк імпэратара, консул Флавій Клімент, загінуў у 95 годзе, а яго жонка Дамітыльля была саслана на малы востраў Пандатэра (на захад ад Нэапалю) за тое, што

былі атэістамі (так у той час называлі тых, хто ня верыў у паганскіх багоў).

Даміцыян быў бязьдзетны й адаптаваў двух малых сыноў Клімента й Дамітыльлі, якая была ўнучкай Вэспасіяна. Хлопцы мелі быць наступнікамі трону й атрымалі адпаевдныя імёны — Вэспасіян і Даміцыян. Але ў сувязі з забойствам іхніх сапраўдных бацькоў у 95 годзе й па дзецях загінуў сьлед. Даміцыян ня меў ласкі да нікога, нават да свае радні й усіх тых, што верылі ў Хрыста. Па яго загадуасланы быў на востраў Патас апостал Ян, дзе напісаў Апакаліпсіс.

Даміцыян быў добрым адміністратарам, але быў адначасна строгім і зайздросным чалавекам. Ён многіх хрысьціян прыгаварыў на сьмерць, выгнаньне, выступаў супраць сваіх крытыкаў у сэнаце. За гэта на яго жыцьцё рабіліся змовы, але былі яны выяўленыя, а змоўшчыкі — пакараны сьмерцю.

На чорным сьпіску Даміцыяна сваё імя знайшла яго жонка Даміцыя й неадкладна зьвязалася са змоўшчыкамі. Гэтым разам Даміцыян быў забіты, можна сказаць, у апошнюю хвіліну. Дзень да гэтага, 17 верасьня 96 году, ён сказаў, што нешта нечаканае станецца наступнага дня, аб чым будзе гаварыць увесь сьвет, а месяц напоўніцца колерам крыві. Так сталася, што наступнага дня загінуў сам імпэратар, а не хто іншы.

Пасьля сьмерці імпэратара Даміцыяна сэнат вынес рэзалюцыю, у якой выказаў сваю нянавісьць да памяці памерлага, зьнёс яго надпісы, зьнішчыў статуі, выпусьціў на волю палітычных вязьняў і спыніў прасьлед хрысьціян і жыдоў. Пліній назваў Даміцыяна зьверам зь пекла, які сядзеў у сваім логаве й лізаў кроў.

Даміцыян памёр 18 верасьня 96 году й яго заступіў выбраны сэнатам дастойны й паважаны сэнатар Нэрва (96-98). Ягонае двухгадовае імпэратарства вызначалася гуманнасьцю. Нэрва паходзіў з малазнатнай сям'і, але здольнага юрыста заўважыў Нэран і ўзьняў у ранг. Будучы чалавекам старшых гадоў, Нэрва ўсынавіў і назначыў сваім наступнікам здольнага палкаводца й адміністратара Траяна.

Нэрва надзяляў зямлёю бедных грамадзян, наладзіў адміністрацыю й адмяніў няслушныя пакараньні. Ён дазволіў хрысьціянам вярнуцца з выгнаньня й вярнуў ім забраную

маёмасьць. Сярод гэтых выгнаньнікаў апынуўся й апостал Ян. Ён вярнуўся з вострава Патас (на Эгейскім моры) да сваіх вернікаў у Эфэсе, дзе быў епіскапам Царквы, якую заснаваў апостал Павал.

Апостал Ян быў вельмі стары, цяжка яму было хадзіць і нават гаварыць. Перажыў ён два прасьледы хрысьціян, за Нэрона й Даміцыяна й застаўся адзіным жывым апосталам, які асабіста памятаў Ісуса Хрыста й быў прысутны на Ягоным расьпяцьці. Таму на просьбу прадстаўнікоў Эфэскай царквы ён з дапамогай свайго вучня напісаў яшчэ адзін разьдзел Евангельля. Ян Евангеліст праўдападобна памёр у Эфэсе пры панаваньні імпэратара Траяна.

Факты гавораць, што, нягледзячы на жыдоўскую правакацыю й два прасьледы хрысьціян рымскімі ўладамі, якія адбыліся ў I стагодзьдзі нашай эры, яны не стрымалі разьвіцьця й пашырэньня Хрысьціянскай царквы, якая набірала размаху й уступала ў II стагодзьдзе дзейнасьці.

І так, на рубяжы I і II стагодзьдзяў у малаколькасных яшчэ абшчынах ідуць складаныя працэсы станаўленьня хрысьціянскага вучэньня, пачынае разьвівацца структура Царквы.

(„Голас Часу" № 6 (9), Лёндан, 1990 г.)

Ад Траяна да Марка Аўрэлія

За Траяна (98-117), які быў рымскім імпэратарам народжаным за межамі Італіі (Гішпанія), былі прыняты меры супраць хрысьціян. Траян выступаў супраць тайных згуртаваньняў, якія карысталіся сваімі законамі. Такое настаўленьне Траяна выкарыстоўвалі некаторыя адміністратары правінцыяў, каб выступіць супраць хрысьціян. Аднак на просьбу хрысьціян Траян часам выказваў справядлівасьць. Некаторыя гісторыкі застанаўляюцца над асобай Траяна й ставяць пытаньне: быў ён прыяцелем ці ворагам хрысьціян?

Пры панаваньні Траяна найбольш хрысьціянскіх абшчын знаходзілася ў Малой Азіі, якая ў той час была сейбітам хрысьціянства. Там адміністратар правінцыі, Пліній Малодшы, прыгаворваў хрысьціян на сьмерць. Да яго зьвярнулася мясцовая хрысьціянская дэлегацыя, і мабыць, пераканала яго ў няслушнасьці такіх паводзін.

У 112 годзе Пліній Малодшы, ня хочучы браць на сябе адказнасьць у справе хрысьціян, зьвярнуўся да Траяна з запытаньнем, як яму ставіцца да хрысьціянаў, якіх ёсьць, як ён пісаў, „вялікая колькасьць". Пліній адкрыта сьцьвярджаў, што ў сувязі з пашырэньнем хрысьціянства ня толькі ў горадзе, але й у вёсцы пусьцелі паганскія сьвятыні, што сярод хрысьціян Віфініі знаходзяцца нават рымскія грамадзяне. Быць рымскім грамадзянінам на правінцыі было ў той час гонарам.

У адказе Плінію Траян выказаў аб'ектыўнасьць. Ён забараніў прымаць пад увагу ананімныя абвінавачваньні хрысьціян. Інакш кажучы, Траян ня бачыў у хрысьціянах вялікай палітычнай небясьпекі, якая пагражала-б дзяржаве й гэтым абмежаваў самаволю намесьнікаў правінцыяў.

Усё-ж хрысьціянства заставалася забароненай рэлігіяй, а яе наяўнасьць каралася. За Траяна пацярпелі пакутніцкую сьмерць епіскап Антыёхіі Ігнацій і епіскап Ерусаліма Сямён. Паводле аднаго паданьня, Ігнацій меў спатканьне зь імпэратарам, які паслаў яго на сьмерць. Паводле другога паданьня, епіскап Ігнацій быў асуджаны антыёхскай адміністрацыяй, але за што — не сказана. Яго везьлі ў кайданах у Рым, дзе мелі казьніць на арэне амфітэатру. Едучы праз Малую Азію ў Рым, па дарозе прыходзілі да яго шматлікія дэлегацыі, якія яго суправаджалі. Яны запісвалі Ігнаціевы пасланьні, адрасаваныя розным хрысьціянскім абшчынам. У сваіх пасланьнях Ігнацій асабліва ўздымаў аўтарытэт епіскапаў і прасіў хрысьціян, каб яны не перашкаджалі ягонай экзэкуцыі.

Епіскап Ігнацій загінуў на арэне ў Рыме, але дакладны дзень і год невядомыя. Даты падаюцца розныя: 17 кастрычніка, 20 сьнежня й 1 лютага, а год прынята лічыць 107. Ёсьць паданьне, што астанкі епіскапа Ігнація сабралі ягоныя прыяцелі й адвезьлі ў яго родны горад, а ў V стагодзьдзі, за імпэратрыцы Аўдоціі, былі зложаны ў царкве.

Траян быў разумны імпэратар і ляяльны слуга імпэрыі, які карыстаўся пашанай у арміі. Дбаў ён пра будаўніцтва, а ў аграрным пытаньні працягваў палітыку Нэрвы.

Армія Траяна перайшла Дунай і ўвайшла у Трансыльванію, у 106 годзе заняла частку Арабіі, у 114 годзе пасуну-

лася ў верхні Еўфрат і ўвайшла на тэрыторыю Арменіі. На гэтым ваенныя посьпехі Траяна ня мелі быць закончаны, але спыніла іх неспадзяваная сьмерць імпэратара на дарозе ў Рым. За плённае супрацоўніцтва з сэнатам Траян атрымаў мянушку Найлепшы.

Паміраючы, Траян назначыў сваім наступнікам земляка Адрыяна (117-138), які быў, бадай, адным з больш прагрэсыўных імпэратараў. Маладыя гады правёў ён у Рыме, дзе вучыўся й захапляўся грэцкай навукай. Апынуўшыся ў арміі, Адрыян наведаў Панонію, Гішпанію, Нямеччыну й быў з Траянам у Дакіі. Як адукаваны чалавек займаў ён высокія й адказныя пасады ў адміністрацыі імпэрыі, ды праявіў сябе энэргічным генэралам і дыпляматам.

Будучы добра запазнаны зь дзяржаўнымі справамі, Адрыян пачаў весьці зусім другую палітыку, чым Траян. Ён спыніў агрэсыўныя войны й стаў на дарогу мірнага прагрэсу. Падшукаўшы сабе адукаваных людзей, Адрыян узяўся за правядзеньне радыкальных рэформаў у краіне. Ён адвёў больш увагі бедным, даў прывілеі рабам, забараніўшы прадаваць іх у якасьці глядыятараў і выносіць над імі кары; заняўся кадыфікацыяй Рымскага права й уводзіў другія палёгкі для народу.

За Адрыяна многа рабоў выкупіла сабе вольнасьць або атрымала яе за верную службу. У 124-125 гадох Адрыян, падобна Траяну, выдаў распараджэньне губэрнатару Малой Азіі, у якім забараніў карыстацца самаволяй натоўпу й ананімнымі даносамі на хрысьціян, дзе меліся на ўвазе судовыя справы. Забароны Адрыяна хрысьціяне прынялі з удзячнасьцю, толькі што ў легальнай працэдуры хрысціціянства разглядалася як нешта чужое, варожае.

Каб пераканацца, што яго рэформы ажыцьцяўляюцца, Адрыян зрабіў дзьве вялікія паездкі й некалькі меншых па імпэрыі. У часе свае другое паездкі, зімою 128 году ў любімы горад Афіны, мясцовы епіскап Квадрат у асысьце былога паганскага філёзафа Арыстыда, які прыняў хрысьціянства, зьвярнуліся да імпэратара й прадставілі яму напісаную хрысьціянскую апалёгію. Адрыян прыхілна аднёсься да навукі Хрыста й дазволіў будаваць сьвятыні, якія мелі адпавядаць новай хрысьціянскай веры.

Бунт жыдоў у Юдэі, які пачаўся пры канцы жыцьця Траяна, быў строга здушаны Адрыянам. І калі ў 130 годзе Адрыян наведаў Юдэю, Ерусалім ляжаў у руінах. Адрыян запрапанаваў адбудаваць горад і назваць яго Аэлія Капіталіна.

Жыды не маглі пагадзіцца з гэтым і ў 132 годзе паднялі новае паўстаньне на чале з Сымонам бэн Касібам, захапілі Ерусалім, аб'явілі сваю незалежнасьць ад Рыму й чаканілі манэту. Да паўстаньня жыдоў-юдэяў далучыліся жыды-хрысьціяне. Але, калі Сымон бэн Касіба, якога падтрымоўваў Рабі Акіба, адзін з найбольшых духоўных лідэраў юдаізму, аб'явіў сябе мэсіяй — „памазанікам божым" — і прыняў імя Бар-Кохба — Сын Зьвязды, хрысьціяне адышлі ад паўстаньня. Яны мелі свайго Мэсію — Ісуса Хрыста й не хацелі мець другога.

Таксама многа памяркоўных жыдоў не падзялялі фанатызму сваіх суайчыньнікаў, як Рабі Ёганан бэн Закі, якога прыяцелі вынесьлі зь Ерусаліма ў труне, быццам забітага. Бар-Кохбу падтрымала пераважна палестынская бедната, а многа хто называў яго Бар-Козба — Сын Хлусьні.

Узьнятае Сымонам бен Касібам паўстаньне ня мела й не магло мець шанцу. Яно было скіраванае ня толькі супраць рымлянаў, але й супраць хрысьціян, якія не хацелі адмовіцца ад Хрыста. У 135 годзе паўстаньне было задушана рымскімі легіёнамі. Бар-Кохба й Рабі Акіба былі забіты, а жыды — выгнаны зь Юдэі й Ерусаліма.

І толькі цяпер Адрыян мог ажыцьцявіць плян адбудовы свае Аэліі Капіталіны. У адбудаваным горадзе дамінавалі грэкі й паганскія сьвятыні ў гонар Афрадыты, Юпітэра й т.п. Як бачым, вынік жыдоўскага паўстаньня аказаўся катастрафічным для жыдоў. На месцы іхняй сьвятыні Ягвэ была пастаўлена сьвятыня Юпітэру Капіталінскаму й другія паганскія сьвятыні й рымскія тэатры з рознымі будоўлямі агульнага ўжытку.

У горадзе Ерусаліме рымляне дазволілі жыць хрысьціянам, але не жыдоўскага паходжаньня. Мелі яны сваю царкву й яе епіскап падпарадкоўваўся Кесарыйскаму мітрапаліту. У гэтым часе хрысьціянскія абшчыны не прытрымоўваліся жыдоўскіх традыцыяў і ў сваёй літургіі карысталіся грэцкай мовай. Жыдоў не любілі хрысьціяне і не любілі іх рым-

ляне. Жыдам забаронена было, пад карай сьмерці, прыбліжацца да Ерусаліма, мець свае школы й нават змушалі іх працаваць у суботу. І хоць наступнік Адрыяна, Антоній Пій, дазволіў жыдам выконваць свае абрады, але аб іхнім павароце на радзіму не было мовы. Толькі на пачатку IV стагодзьдзя імпэратар Канстанцін Вялікі дазволіў жыдам адзін раз у год наведаць горад, у гадавіну зьнішчэньня Ерусалімскай сьвятыні, дзе яны плакалі пад яго сьценамі. І толькі ў часе арабскай інвазіі Палестыны (VII ст.) жыды атрымалі свабоду вярнуцца ў Ерусалім.

Так, што ад 135 году ў Ерусаліме жыдоў не было, а былі ў ім грэкі-хрысьціяне, якія мелі сваю царкву. Найбольш важнымі цэнтрамі юдаізму, у той неспрыяльны час, сталіся Вавілон і Александрыя. Адгэтуль пачыналася іхняя міграцыя ў Арабію, паўдзённую Эўропу й уздоўж паўночнага берагу Афрыкі.

Жыдоўскія паўстаньні 70 і 135 гадоў адмоўна адбіліся й на хрысьціянах Ерусаліма. Аб іхняй першай абшчынецаркве, якая мела свайго епіскапа, мала было чуваць. Толькі за імпэратара Канстанціна Вялікага пачалі часьцей успамінаць Ерусалім. На Нікейскім саборы (325) прысутнічаў Ерусалімскі епіскап Макар, а на Саборы ў Эфэсе (431) Ерусалім узьняты быў да рангу патрыярхату. Бунтаўнічая дзейнасьць жыдоў супраць рымлян зрабіла адначасна рашаючы ўплыў на хрысьціян, яна прысьпяшыла канчатковы разрыў зь юдэйствам.

Хоць Адрыян выказаў ветлівасьць да хрысьціян, аднак не стрымаў іх прасьледу. За яго панаваньня пацярпеў сьмерць епіскап Рыму Тэлесфор. Як паказалі факты, рымская грамадзкасьць не дарасла да сапраўднай дэмакратыі. Клясавыя й рэлігійныя розьніцы былі вялікія й моцныя, каб можна было лёгка іх прымірыць. І, нягледзячы на памяркоўныя адносіны Адрыяна, захады яго скончыліся паражэньнем і нямала прынесьлі яму ворагаў. Ваенныя апэрацыі, якія праводзіў Адрыян асабліва ад 132 да 135 году супраць жыдоў, ня мелі на мэце пашырэньня тэрыторыі імпэрыі, а толькі прадухіленьне небясьпекі, якая магла пагражаць імпэрыі. Памёр Адрыян 10 ліпеня 138 году й яго заступіў адаптаваны сын Антоній Пій.

За Антонія Пія (138-161) Рымская імпэрыя ганарылася ўсебаковымі дасягненьнемі, а ў хрысьціянскім пытаньні наглядалася талеранцыя. Аб гэтым сьведчыць значная колькасьць хрысьціян на двары цэзара й апалёгіі, скіраваныя да яго. Аднак апалягет Юстын успамінае, што за Антонія Пія былі зьнішчаны хрысьціяне — Пталямэі, Лівіі й іншыя. Юстын напісаў дзьве апалёгіі, адну да Антонія Пія, а другую — да Марка Аўрэлія. Той, хто чытаў іх у той час, мог даведацца аб новай хрысьціянскай веры й яе навуцы.

Юстын быў адным зь вядучых апалягетаў. Паходзіў ён з багатай грэцкай сям'і, якая жыла ў Палестыне. Па яго ўласных расказах, вучыўся ён у розных філёзафаў, аднак у канцы прыняў хрысьціянства й пачаў прапаведаваць новае вучэньне, езьдзячы з гораду ў горад. Ім была заснавана хрысьціянская школа ў Рыме. Такім чынам аўтара апалёгіяў, Юстына, як і другіх апалягетаў, можна лічыць прасьветнікамі хрысьціянскай веры. Юстына можна лічыць і першым хрысьціянскім філёзафам і мучанікам, які адкрыта выступаў у абароне хрысьціянства й за гэта, разам зь пяцьцю іншымі хрысьціянамі й адной жанчынай прыняў пакутніцкую сьмерць каля 165 году.

За наступніка Антонія Пія, Марка Аўрэлія (161-180) філёзафа, пэўная колькасьць хрысьціян была замучана. Тут варта згадаць аднаго з застаўшыхся вучняў апосталаў, епіскапа Смырны Палікарпа, які быў вучнем евангеліста Яна. Ён цалаваў ланцугі епіскапа Ігнація, калі яго везьлі праз Сьмірну ў Рым, а Ігнацій у той час даручыў яму апеку над сваёю царквою ў Антыёхіі.

Будучы арыштаваным рымскімі ўладамі як хрысьціянін, Палікарп загадаў накарміць сваіх прасьледавацеляў, якія арыштавалі яго, а сам у гэты час маліўся. Пасьля прывялі яго да прадстаўнікоў улады. Прадстаўнік паліцыі хацеў уратаваць жыцьцё старому й раіў яму вусна адмовіцца ад Хрыста. „Падумай аб сваёй сівой галаве, — казаў начальнік паліцыі, — скажы: цэзар уладар". На гэта епіскап Палікарп адказаў: „Восемдзесят шэсьць гадоў я служу Яму й Ён нічога не зрабіў мне дрэннага, а цяпер я маю зьневажаць Цара, які ратаваў мяне?" Такім адказам епіскап Палікарп пацьвердзіў сваю прыналежнасьць да хрысьціянства й 23 лютага 155 або 156 году быў пасланы на касьцёр.

Палікарп быў паважаным чалавекам у горадзе. Ён меў прыяцеляў сярод гарадзкой арыстакратыі, якая старалася ўратаваць жыццё старому чалавеку, але ён лягчэй прыняў сьмерць як здраду свае веры. Марк Аўрэлій захапляўся стойкасьцю хрысьціянаў у вачох сьмерці як годную пахвалы.

Да Марка Аўрэлія пісаліся прапановы, каб устанавіць дыялог паміж дзяржавай і царквою, што будзе карысным для абедзьвюх старон. Гэтую самую думку ў свой час выказаў апостал Павал. Ён згаджаўся прызнаць рымскага цэзара як пастаўленага Богам для дабра грамадзян, а хрысьціяне мелі быць ляяльнымі да цэзара й маліцца за яго. Нават у Сьвяшчэнным Пісьме нідзе не сказана, каб выступаць супраць улады. „Аддайце кесарава кесару, а Божае Богу" (Лк., 20:25).

Марк Аўрэлій не згадзіўся зьмяніць сваіх адносінаў да хрысьціян і таму іх прыгаварылі на сьмерць. Так сталася з апалягетам Юстынам, які ў сваіх пісьмах да імпэратараў Антонія Пія й Марка Аўрэлія абараняў становішча веры хрысьціян. Пісаў ён і іншыя працы, за што загінуў сьмерцю мучаніка. Таксама ўспамінаецца ў гэты час грэцкі філёзаф Афінагор, які пісаў апалёгію да Марка Аўрэлія каля 177 году.

Больш вядомымі хрысьціянскімі апалягетамі III-IV стагодзьдзяў, акрамя Юстына й Афінагора, былі Клімент Александрыйскі, Арыген, Тэртуліян, Лактанцій.

Працэс падгатоўкі саюзу паміж хрысьціянствам і паганскай імпэрыяй быў зацяжны й крывавы. Сытуацыя хрысьціян часта была трагічнай, яны знаходзіліся па-за правам і найменшая правіна магла выклікаць абвінавачаньне, а за ім — сьмяротнае пакараньне.

Хто з хрысьціян хацеў жыць у той час спакойна, павінен быў хавацца са сваёй верай ад людзей. Але хрысьціяне не хаваліся. Сярод іх было нямала фанатыкаў, якія сьведама шукалі мучаніцкай сьмерці. Аб гэтым сьведчыць такі факт, што праконсул правінцыі Азіі, Ары Антоній, у 184-185 гадох адмовіўся караць хрысьціянскіх фанатыкаў сьмерцю. Ён заявіў: калі яны так жадаюць сьмерці, то хай самі адбяруць сабе жыцьцё.

Чаму людзі гарнуліся да хрысьціянства ў той час, калі гэта было забаронена, справа складаная. Магчыма, шукалі

яны праўды, хацелі пазьбегчы грахоў, да чаго пабуджалі іншыя матывы высокай хрысьціянскай філязофіі.

Некаторыя пісьменьнікі сьцьвярджаюць, што адной з прычын была іхняя любоў да бліжняга й за гэтую любоў яны былі гатовыя плаціць сваім жыцьцём.

(„Голас Часу" № 10 (1), Лёндан, 1991 г.)

Ад Камода да Філіпа Араба

За імпэратара Камода (180-192), сына Марка Аўрэлія філёзафа, які быў здолны на розныя нікчэмнасьці, не было прасьледу хрысьціян і ў пэўнай меры наглядалася талерацыя, якая трывала да 202 году. Згадваецца толькі спарадычны прасьлед хрысьціян як працяг палітыкі Марка Аўрэлія. Чатыры месяцы пасьля ягонай сьмерці 17 ліпеня 180 году дваццаць мужчын і адна жанчына былі асуджаны ў Карфагене на сьмерць праз усячэньне галавы. За наступныя гады імпэратарства Камода мы ня спатыкаем прасьледу хрысьціян. У гэтым была заслуга каханкі імпэратара Марціі, якая, калі не была хрысьціянкай, то была вялікай прыхільніцай хрысьціян. Яна клапацілася пра хрысьціянскія абшчыны й яе захадамі многа хрысьціян было вызваленых з капальняў Сыцыліі.

У параўнаньні да бацькі філёзафа, сын Камод не падыходзіў на імпэратарскі трон. Быў ён чалавекам слабога характару, п'яніцай, шмат да каго меў недавер, што выклікала падазрэньні й правакацыі. Хочучы ўтрымацца пры ўладзе, Камод вярнуўся да сьмяротных пакараньняў, як гэта было ў I стагодзьдзі. Ён прасьледаваў сэнат без ніякай міласьці й гэта сьцягнула на яго помсту. У апошні дзень 192 году яму падсунулі атруту й паколькі атрута дзейнічала павольна, дык яго задушылі. Такой ганебнай дарогай скончылася дынастыя Антоніяў, якая ганарылася слаўнымі імпэратарамі.

Пасьля сьмерці Камода пачынаецца грамадзянская вайна, а зь ёю беспарадкі ў імпэрыі. I хоць Рымская імпэрыя заснавана была на праве й наступнікі імпэратараў мелі займаць трон згодна праву, аднак не заўсёды так было, паколькі найчасьцей цэзарамі кіравала армія.

Наступнікам Камода быў Пэртынакс, які займаў трон нядоўга, толькі 87 дзён. Пэртынакса забілі тыя самыя людзі, якія пасадзілі яго на трон. У імпэрыі наглядаўся хаос, пачатак палітычнага й маральнага раскладу дзяржаўнай улады, а зь ёю й парадку. Пачаўся новы перыяд барацьбы за імпэратарскі трон, які вялі камандзіры арміяў на правінцыях. Кожная з гэтых арміяў старалася правесьці свайго кандыдата.

Неўзабаве на імпэратарскі трон сеў Сэптым Сэвэр (193-211), які аказаўся памяркоўным для хрысьціян. Ён бараніў іх перад натоўпам збунтаваных паганаў, даваў магчымасьці займаць высокія пасады ў сваёй адміністрацыі, акружэньні й за гэта меў прыкрасьці з боку паганаў. Нянькай яго сына Каракальлі была хрысьціянка, а доктар хрысьціянін вылечыў імпэратара ад нейкай хваробы.

У часе свайго падарожжа праз Палестыну Сэвэр бачыў узрастаючую сілу хрысьціянства, але не перашкаджаў хрысьціянам. Толькі тады, калі ў час вайны хрысьціянскія жаўнеры, згодна свае веры, адмаўлялі ваяваць, зьмяніліся адносіны імпэратара да хрысьціян. На Сэвэра пачалі рабіць націск яго супрацоўнікі пагане й гэта паслужыла прычынай таго, што ў 202 годзе Сэвэр пачаў караць некаторых хрысьціян і забараніў пераходзіць у хрысьціянства. Быў гэта першы юрыдычны акт скіраваны супраць Царквы. Тады-ж была зачынена Хрысьціянская школа ў Александрыі, але яе ўдзельнікі спатыкаліся ў другім месцы. У 211 годзе імпэратар аддаў усіх хрысьціян пад нагляд паліцыі. Бяручы агульна, гэты імпэратарскі эдыкт супраць хрысьціян не прымаўся сур'ёзна й аб ім наступныя імпэратары забыліся.

У 198 годзе Сэвэр надаў свайму старэйшаму сыну Антонію (Каракальлю) тытул Аўгуста, а малодшаму сыну Гэту — Цэзара. Сыны Сэвэра былі адметнага характару: што адзін любіў, таго другі не любіў, ды нават адзін аднаго не маглі перанесьці.

Асабліва мяняліся паводзіны Каракальлі з кепскіх на горшыя як ён рос. Ён адважыўся нават зрабіць замах на жыцьцё свайго бацькі. Замах ня ўдаўся, аднак бацька прабачыў сыну злачынства, а другога сына, Гэту, зрабіў з цэзара імпэратарам на роўні з Каракальлем. Гэта меў лагаднейшы характар і яго бацькі любілі лепш і з такім падыходам Каракальля ня мог пагадзіцца.

Неўзабаве Сэвэр цяжка захварэў і лежачы на ложы сьмерці сказаў сваім сынам, якія стаялі каля ложка: „Жывіце згодна паміж сабою. Глядзіце за войскам". Памёр імпэратар Сэптым Сэвэр 4 лютага 211 году.

Сыны памерлага імпэратара, як ужо згадвалася, не жылі паміж сабою згодна, не паслухалі просьбы бацькі, нават не спатыкаліся, ня гутарылі, а ўнікалі адзін аднаго. Каракальля насіўся з думкай зьнішчыць свайго брата Гэта й зрабіў на яго жыцьцё два няўдалыя замахі.

У такім прыкрым становішчы пастаноўлена было падзяліць імпэрыю. У Рыме меў сядзець Каракальля, а ў Александрыі ці Антыёхіі — Гэта. На такі падзел імпэрыі не згадзілася іхняя маці Юлія Домна, якая спадзявалася, што яе сыны неяк будуць кіраваць імпэрыяй безь яе падзелу.

Неспадзявана Каракальля выказаў згоду пагадзіцца з братам Гэтам. Маці была рада й у яе пакоі назначана было спатканьне, на якім мелі быць высьветлены непаразуменьні. Але як толькі Каракальля ўвайшоў у пакой, за ім увайшлі ўзброеныя забойцы. Прысутны Гэта адразу сьцяміў у чым справа й кінуўся да маткі пад апеку. Маці абняла сына, каб засланіць, але Гэту прабілі сэрца й нават ранілі матку. Было гэта вечарам 27 лютага 212 году. Повад забойства Гэты, свайго роднага брата, Каракальля тлумачыў перад гвардыяй проста як самаабарону, хоць кожны знаў добра як дайшло да забойства.

Каб унікнуць помсты за сваё праступства, Каракальля выдаў эдыкт аб амністыі для ўсіх тых, хто меў быць саслaны на выгнаньне. Усё-ж Каракаллья баяўся блізкіх супрацоўнікаў Гэты, якія маглі памсьціцца на ім і таму былі яны зьнішчаны. Загадана было змазаць імя Гэты дзе толькі яно было напісана.

Хваравіты стан здароўя Каракальлі нарушаў і яго кантролю за нэрвамі. Хварэў ён яшчэ на манію вялікасьці, асабліва ў пляне мілітарных дасягненьняў падобных Аляксандру Вялікаму Македонскаму, але не чапаў ён хрысьціян. Таксама й маці яго Юлія, якая была дачкой высокага паганскага сьвятара ў Сырыі й мела свой голас у палітыцы, не выступала супраць хрысьціян, а нават цікавілася іхняй верай.

Усё, што Каракальля зрабіў у часе свайго імпэратарства, гэта прысваеньне ў 212 годзе вольным грамадзянам імпэрыі рымскага грамадзянства.

Асоба імпэратара Каракальлі не была папулярнай у дзяржаве й ён за свае крывавыя злачынствы быў забіты на вуліцы Эдэсы 8 красавіка 217 году ў 29-гадовым узросце. Ягонымі забойцамі былі блізкія яму афіцэры, якія баяліся за сваё жыцьцё. Маці Каракальлі ў той час жыла ў Антыёхіі й яна, як і яе памерлы муж імпэратар Сэвэр, ня мелі пашаны да свайго сына Каракальлі, а лепш любілі Гэту. Для маткі была гэта сямейная трагедыя й яна, аўдавеўшая й асірацеўшая пажылая кабета, будучы перамучанай фізычна й духова, замучыла сябе голадам.

Тут можна сказаць агульна, што пасьля крывавых прасьледаў Нэрона, Даміцыяна й часткова Марка Аўрэлія, сярод хрысьціянскіх абшчын наглядаўся спакой, але хрысьціянства ўсьцяж лічылася рэлігіяй забароненай. Адкрытае й галоснае выступленьне хрысьціян навонкі каралася. Прынцып заставаўся той самы, што ня можна быць хрысьціянінам.

Чарговыя два імпэратары, Макрын і Элагабал, не былі імпэратарамі доўга й магчыма ня мелі многа часу прымаць рашэнні адносна хрысьціян і сваіх палітычных мэтаў. Таму Хрысьціянская царква, нягледзячы на частыя зьмены імпэратараў, праводзіла сваю работу без перашкод, хоць у некаторых правінцыях імпэрыі, па старой традыцыі, захоўваліся лякальныя антыхрысьціянскія настроі. Гэты мірны перыяд дазволіў хрысьціянскім абшчынам умацаваць сваё становішча.

Дарэчы згадаць наступнага імпэратара Аляксандра Сэвэра (222-235), які быў адаптаваным сынам. Паходзіў ён з Усходняй імпэрыі (Трыпалітаніі) і меў сымпатыі да грэкаў, на мове якой пашыралася хрысьціянская вера. Імпэратарскі пасад заняў ён у маладых гадох, але на свой век быў ужо даволі добра адукаваны. Маці загадзя пастаралася даць асьвету будучаму імпэратару. Але, бяручы пад увагу яго маладыя гады, маці імпэратара была галоўным адміністратарам у палацы.

Малады чалавек Аляксандар не любіў войнаў, стараўся жыць мірна й цікавіўся навукай. Будучы вельмі рэлігійным, кожны дзень маліўся ў сваёй капліцы, дзе, акрамя

паганскіх багоў, стаяла статуя Хрыста. На яго двары й двары маткі, Юліі Мамэі, было многа хрысьціян. Аляксандар меў нешта ў сабе прыхільнае да новай хрысьціянскай дактрыны й хацеў зьмяніць права, каб даць хрысьціянам свабоду й хацеў нават пабудаваць царкву ў гонар Хрыста. На жаль, да гэтага не дапусьцілі яго паганскія супрацоўнікі, якія баяліся, каб ня ўпала веліч старых паганскіх багоў.

Будучы зацікаўленым хрысьціянскай верай, Аляксандар наладзіў непасрэдныя кантакты зь вядучымі хрысьціянамі й карыстаўся некаторымі хрысьціянскімі павучэньнямі, але не занядбоўваў і дзяржаўныя справы. Таксама й ягоная маці Юлія Мамэа перапісвалася з Арыгенам, хрысьціянскім тэолягам.

Тут трэба згадаць, што захадамі маткі Юліі, Аляксандар сеў на трон і празь яе ўтраціў усё. Маці замнога мяшалася ў ягоныя дзяржаўныя справы, што не падабалася ваенным, палітыкам і заўзятым паганам. Апынуўшыся з арміяй над Рэйнам, Аляксандар не хацеў прыняць бою з алеманамі, толькі хацеў непаразуменьні вырашыць мірнай, дыпляматычнай дарогай. За гэта войска, якое хацела ваяваць, асудзіла Аляксандра як баязьліўца. Падбухтораная рэшта войска збунтавалася й 10 сакавіка 235 году замардавала Аляксандра разам з маткай. Загінуў Аляксандар маючы 26 год.

Наступнікам Аляксандра Сэвэра быў Максімін Тракіец (235-238), вайсковы тыран. Ён не пагаджаўся на тыя прывілеі, якія былі дадзены хрысьціянам у імпэратарскім двары за Аляксандра Сэвэра й таму пачаў прасьледаваць іх. Быў гэта невялікі прасьлед, скіраваны галоўным чынам супраць духавенства, якое высылаў на выгнаньне. Епіскапы Рыму Гіпаліт і Понцій, па паходжаньні грэкі, былі сасланыя на Сардынію, дзе памерлі, а ў Александрыі вядомы тэоляг Арыген, сын замучанага ў 203 годзе хрысьціяніна Леаніда, быў увязьнены са сваімі аднадумцамі, дзе памёр у 254 годзе.

Аднак і за наступнікаў Аляксандра Сэвэра й Максіміна Тракійца, якія кіравалі Рымскай імпэрыяй, хрысьціянства карысталася талеранцыяй, хоць не афіцыйнай. Нават адзін з тагачасных імпэратараў — Філіп Араб (244-249) быў шчырым прыхільнікам хрысьціян, а яго жонка й сын былі хрысьціянамі. У гісторыі ёсьць успамін, што Філіп Араб, знаходзячыся ў Антыёхіі, хацеў прысутнічаць

на Велікоднай багаслужбе. Ён атрымоўваў пісьмы ад хрысьціянскага тэоляга Арыгена.

За ўрадаваньня Філіпа Араба па большых гарадох імпэрыі будуваліся хрысьціянскія сьвятыні, зьмяшчаліся ў публічных мясцох хрысьціянскія надпісы й не прасьледаваліся хрысьціянскія абшчыны. У Александрыі дзейнічала школа хрысьціянскай філязофіі.

Быў гэта даволі доўгі перыяд спакойнага часу — паўстагодзьдзе, калі Хрысьціянская царква магла кансалідаваць свае сілы, засноўваць новыя цэрквы й пашыраць сваю дзейнасьць без вялікага шуму. За гэты час Царква набыла такую сілы, што сталася адной зь вядучых рэлігіяў Рымскай імпэрыі. Усё-ж гэтае спакойнае паўстагодзьдзе часам парушалася, калі не паганамі ці жыдамі з намовы рабінаў, або паганскіх сьвятароў, то рымскімі ўладамі, якія стараліся зрабіць шкоду хрысьціянам.

У такіх абставінах становішча Хрысьціянскай царквы ў Рымскай імпэрыі было няпэўнае й кожнае хвіліны сытуацыя магла зьмяніцца на горшае. Усё залежала ад настаўленьня імпэратара й яго памагатых.

(„Голас Часу" № 11 (2), Лёндан, 1991 г.)

Разьвіцьцё й пашырэньне хрысьціянства

Ісус Хрыстос сказаў сваім апосталам: „Ідзеце, навучайце ўсе народы, хрысьцячы іх у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, усё, што Я сказаў вам; і вось Я з вамі ўва ўсе дні да сканчэньня веку. Амін" (Мць. 28, 19-20).

Апосталы верна выконвалі наказ свайго Настаўніка. Тыя людзі, якія прымалі словы Евангельля засноўвалі абшчыны — мясцовыя цэрквы. Апосталы назначалі ў гэтых асяродках старэйшын, т.зв. прасьвіцераў і дыяканаў для апекі й выконваньня царкоўных абрадаў.

Зь ліку старэйшых назначалі больш знатнейшых на наглядчыкаў — епіскапаў, якія кіравалі большымі асяродкамі. У пасланьні апостала Паўла да Ціта гаворыцца хто можа быць епіскапам і якія павінны быць яго абавязкі.

Такім парадкам заснаваныя хрысьцінскія абшчыны аб'ядноўваліся адзінай супольнай навукай, даверам і сужыцьцём, называючы сябе братамі й сёстрамі.

Сярод веруючых хрысьціян жыло пераканаьне, што Хрыстос, які быў укрыжаваны й уваскрос, хутка прыйдзе на зямлю, каб судзіць жывых і памерлых, таму яны пільна трымаліся Ягоных павучэньняў.

З пашырэньнем хрысьціянства, спатрэбілася й пісанае слова для прапаведаваньня. Дзеля таго былі напісаны евангельлі, пасланьні й лісты, кнігі Дзеяньняў Сьвятых Апосталаў і іншыя. Апостал і евангеліст Ян напісаў Апакаліпсіс — прысьвечаны хрысьціянам сямі грэцкіх гарадоў Малой Азіі. Быў ён адзіным апосталам, які памёр натуральнай сьмерцю, усе іншыя сталіся мучанікамі.

Вядома, што найбольш з гораду ў горад хадзіў апостал Павал і закладаў хрысьціянскія абшчыны як стратэгічныя пункты для далейшага пашырэння хрысьціянства. Гісторыя падае, што хрысьціянства ўзяло сваю сілу з усходніх гарадоў імпэрыі, або так званай Візантыі.

Часьць вучняў Ісуса Хрыста й вучняў Яго вучняў, пасьля ўтраты свайго Настаўніка й у выніку жыдоўскага прасьледу ў Ерусаліме, перайшлі ў Сырыю. Там яны пачалі прапаведаваць новую веру ў Дамаску й Антыёхіі, а ў гэтым апошнім горадзе далі ім назоў „хрысьціян".

Сярод скромных абшчын, закладчыкамі якіх былі сьпярша самі апосталы, або іхнія блізкья супрацоўнікі, захоўвалася сталая еднасьць. Кантакты ўтрымоўваліся праз пісьмы, а таксама праз асабістыя кантакты. Пісьмы апосталаў, а неўзабаве выдадзенае Евангельле, што ў грэцкай мове значыць Добрая Навіна, ды з часам разьвіцьцё сьвятой літургіі, маюць вялікае значэньне ў жыцьці хрысьціян. Усё тое, што несьлі й прапаведавалі апосталы й настаўнікі, лягло ў аснову першых хрысьціянскіх абшчын. Гэта спрыяла далейшаму пашырэньню й умацаваньню хрысьціянскай веры й царкоўнай арганізацыі.

У большых гарадох Грэка-Рымскай імпэрыі існавалі сьпярша невялікія групы хрысьціян, асабліва бяднейшага клясу, якія спатыкаліся ў прыватных дамох для малітваў, навукі й дыскусіяў. Спатыкаліся яны часам тайна, каб не

наражацца на жыдоўскія правакацыі й прасьлед рымскіх уладаў. Таксама й іхнія малітоўныя дамы ня розьніліся нічым асаблівым, каб не зьвяртаць на сябе ўвагу. Таму некаторыя пагане называлі хрысьціян сэктай, якая „хаваецца па завулках, баючыся сьвятла". Ня так хрысьціяне баяліся й хаваліся ад сваіх ворагаў, аб чым мы ўжо чулі раней і пачуем яшчэ больш.

Першыя хрысьціянскія абшчыны ўспамінаюцца на паўднёвым беразе Міжземнага мора. Некаторыя крыніцы падаюць, што акрамя Ерусаліма царква ў Александрыі была заложана сьвятым Маркам Евангелістам, які быў яе першым епіскапам і там памёр сьмерцю мучаніка.

У гандлёвым цэнтры Карфагена таксама існавала царква. Сярод вядомых хрысьціян I стагодзьдзя, што жылі ў Лібіі, успамінаецца Сымон Кірэнейчык, які змушаны быў несьці крыж Хрыста.

У Малой Азіі й Сырыі, напрыканцы I стагодзьдзя не было большага гораду, каб не было ў ім хрысьціянскай абшчыны. У Грэцыі першым прасьвіцерам Афінаў быў Дыянісій Арэапагіт, якога хрысьціў сьвяты апостал Павал.

У Італіі, аднак, абшчыны былі вядомыя толькі ў Рыме й Путэолі каля Нэапалю. Яны існавалі скрыта, бо паганскія традыцыі ў цэнтры імпэрыі й на яе захадзе трымаліся мацней і даўжэй як на ўсходзе. А гэта таму, што паганства найдаўжэй трымалася на вёсцы сярод сялян, якіх па-лаціне называлі „пагані", таму гэты сынонім захаваўся да нашага часу.

Важную ролю ў пашырэньні хрысьціянства ў II і III стагодзьдзях праявілі такія высокаадукаваныя хрысьціяне, як Ігнацій — епіскап антыёхійскі; Палікарп — епіскап Смырны, вучань апостала Яна; Клімент — епіскап рымскі; Мінуцій Фэлікс — слаўны адвакат; Клімент Александрыйскі — філёзаф; Кіпрыян — епіскап Карфагену, здольны моўца і інш.

У другой палове II стагодзьдзя ў Александрыі была школа хрысьціянскага багаслоўя, на чале якой стаялі ў свой час Клімент і Арыген. Людзі гэтыя прымалі ўдзел у афармленьні хрысьціянскай дактрыны. Іх дзейнасьць прыцягвала да хрысьціянства больш адукаваных людзей. Гэтая адукаваная эліта стварыла хрысьціянскую філязофію, тэалёгію й літаратуру.

На асаблівую ўвагу ў II стагодзьдзі заслугоўваюць апалёгіі й апалягеты. Першым апалягетам быў Квадрат, які напісаў і прадставіў першую хрысьціянскую апалёгію імпэратару Адрыяну. У ёй быў выказаны пратэст супраць несправядлівасьці Рымскай дзяржавы ў адносінах да хрысьціянскай веры. Таксама згадваецца й другі афінскі апалягет „філёзаф" Арыстыд, які падобна Квадрату прадставіў апалёгію Адрыяну. У сваёй апалёгіі Арыстыд прысьвячае многа месца фальшывым паганскім культам, а ўзносіць новую хрысьціянскую веру.

Адукаваным апалягетам быў Юстын, бацькі якога былі паганамі. Ён быў зьвязаны са шматлікімі філязафічнымі школамі, але не знайшоў у іх задавальненьня і прыняў хрысьціянства. У сваіх апалёгіях ён зьвярнуў вялікую ўвагу на маральны бок хрысьціянства ў адпаведнасці з навукай Хрыста.

Спатыкаецца таксама апалягет Афінагор з Афін. Ён апісаў жыцьцё й характар першых хрысьціянскіх абшчын, іхнюю веру. І апошнім апалягетам другога стагодзьдзя зьяўляецца Тэафіль, які быў у Антыёхіі за панаваньня Марка Аўрэлія й Камода. Ён напісаў многа апалёгіяў, але захавалася толькі адна. Ёсьць гэта вялікая апалёгія напісана лёгкай грэцкай мовай.

Нельга памінуць Тэртуліяна, які быў адвакатам, а пасьля актыўным хрысьціянскім прапаведнікам. Ён — аўтар шматлікіх твораў, але найбольш папулярным зьяўляецца „Апалягетык" напісаны ў абароннай форме. У ім Тэртуліян стараецца расправіцца з усімі закідамі, якія ставяцца хрысьціянам. Ад абароны ён пераходзіць у атаку, асуджае паганскіх багоў, іхнюю немаральнасьць у параўнаньні з культам хрысьціян і абараняе хрысьціян перад няслушнымі нападкамі.

Трэба памятаць, што хрысьціянскія апалягеты былі людзьмі адукаванымі, здольнымі й іхнія апалёгіі й дзейнасьць, як сярод народу, так і ва ўрадавых кругах, уплывалі на пашырэньне хрысьціянства й місіянерскай актыўнасьці.

Як бачым, галоўную ролю ў пашырэньні хрысьціянства ў гэтым часе выконвалі хрысьціянскія абшычыны ў Малой Азіі. Адгэтуль — з Фрыгіі, Віфініі, Галякіі, Лікаоніі — расходзіліся місіянеры па ўсім рымскім сьвеце.

Сярод сапраўднай веры пашыралася й гэрэзія. Прыкладам можа паслужыць гэрэзія Мантана з Фрыгіі, які каля 170 году аб'явіў сябе „Новым Прарокам". Да яго далучыліся дзьве жанчыны — Прысцыльля й Максімільля. Яны гаварылі аб непазьбежным другім прыходзе Хрыста й нават падавалі час і месца Яго прыходу на зямлю. Мантаністы заклікалі народ на мукі, цярпеньні, што імпэратару Марку Аўрэлію паслужыла прычынай выдаць у 177 годзе эдыкт, які забараняў фанатычныя сэкты. У тым часе выходзіла й іншая гэрэтычная літаратура, якую пісалі адукаваныя пагане.

Не зважаючы на варожыя адносіны рымскіх паганскіх уладаў і прасьлед жыдоўскіх сынагогаў, хрысьціянства не стаяла на адным месцы. Вера пашыралася дарогай прапаведаваньня й у палове III стагодзьдзя царква была сарганізавана на чале зь епіскапамі.

Назоў епіскап паходзіць з грэцкай мовы „епіскопос", што значыць — назіральнік. У пасьляапостальскіх часох епіскапа выбіралі сьвятары й веруючыя, а рукапалагалі яго ў гэты сан другія епіскапы. Епіскап загадваў царквой, яе маёмасьцю, падрыхтоўваў новых кандыдатаў у духоўны сан, высьвячаў іх, і рэпрэзэнтаваў свой прыход перад цывільнымі ўладамі. Трымаў ён вялікую ўладу ў сваіх руках і быў адзіным кіраўніком на вызначанай тэрыторыі. Усе епіскапы лічыліся наступнікамі апосталаў, былі сабе роўнымі й за сваю дзейнасьць адказвалі перад Богам. Але епіскап мог быць пазбаўлены свайго сану, калі ў нечым правініўся.

З разьвіцьцём хрысьціянства ўзрастала колькасьць епіскапаў, якія падчыняліся мітрапаліту. Мітрапаліт знаходзіўся ў сталіцы правінцыі, якую называлі мітраполіяй. З часам мітрапаліт уваходзіў у склад яшчэ большай царкоўнай арганізацыі, якую называлі патрыярхіяй. Патрыярхія, на чале з патрыярхам, знаходзілася ў галоўным горадзе дзяржавы, яе сталіцы. Такім парадкам, пачынаючы ад скромных абшчын і канчаючы на патрыярхіі, замацоўвалася арганізацыйная структура Хрысьціянскай царквы.

Разьвіцьцё царкоўнай адміністрацыі праходзіла ў розных мясцох імпэрыі па-рознаму, не заўсёды гарманійна. Такім парадкам на працягу стагодзьдзяў, хрысьціяне стварылі свае

аўтарытэтныя ўстановы: епіскопіі, патрыярхіі й папскі аўтарытэт, які ўстанаўляўся вельмі павольна й з перабоямі.

Арганізацыя раньняй Хрысьціянскай царквы вялася на ўзор жыдоўскай сынагогі, якая пачала сваю дзейнасьць недзе ў VI стагодзьдзі да нашай эры, калі была зьнішчана першая жыдоўская сьвятыня ў Ерусаліме, а жыды пайшлі ў вавілонскую няволю. Тады ролю вялікай сьвятыні заступілі малыя хаты-сынагогі, у якіх гуртаваліся жыды на працягу наступных стагодзьдзяў. У сынагогу хадзілі ўсе жыды й некаторыя зь іх сталіся хрысьціянамі. У сынагогу хадзіў таксама Ісус Хрыстос аж да канца свайго жыцьця. Евангеліст Лука падае: „І пайшоў у Назарэт, дзе быў выхаваны, і ўвайшоў па сваім звычаю, у дзень суботні ў сынагогу, і ўстаў чытаць. І далі яму кнігу прарока Ісаі; і Ён, разгарнуўшы кнігу, знайшоў месца, дзе было напісана: Дух Гасподні на Мне: бо ён памазаў Мяне дабравесьціць убогім і паслаў Мяне аздараўляць разьбітых сэрцам, гаварыць вязьням аб вызваленьні й сьляпым аб павароце зроку, пусьціць змучаных на волю й абвяшчаць год Гасподні прыемны" (Лк., 4:16-19).

Падобна Хрысту наведвалі сынагогу ўсе апосталы й такім парадкам з жыдоўскіх сынагогаў былі арганізаваны, у большасьці выпадкаў, першыя хрысьціянскія абшчыны. Для першых жыдоў-хрысьціян сынагога была асяродкам пашырэньня навукі Хрыста, за што рабіны гналі іх.

Зь цягам часу хрысьціянства парывала зь юдэйствам і тварыла сваю царкву згодна сваіх вымогаў і паступовага разьвіцьця. Пачынаючы ад апостала Паўла хрысьціяне спатыкаліся на малітвы не ў суботу, як жыды, а ў нядзелю, у дзень уваскрэсеньня Хрыста, а таксама заменены былі дні посту. З прыняцьцём хрысьціянства паганамі, іхнія сьвятыні станавіліся хрысьціянскімі й часта паганскія звычаі мяшаліся ў паняцьці людзей з хрысьціянскімі, што цяжка было Царкве пазбыцца іх з народнай традыцыі.

Працэс разьвіцьця хрысьціянскай літургіі можна ахарактарызаваць так: хрысьціянская літургія брала свой пачатак галоўным чынам зь юдэйскіх формаў дапоўненых неабходнымі хрысьціянскімі элемэнтамі й гэта трывала, больш-менш, да канца II стагодзьдзя. III стагодзьдзе лічыцца пераходным перыядам, калі хрысьціянская герархія імкнулася ўстабіліза-

ваць літургію й уводзіла свае першыя каноны. А ў палове IV стагодзьдзя наглядаецца багатае разьвіцьцё літургіі. Быў гэта час, калі хрысьціянства карысталася поўнай свабодай.

З арганізацыяй царкоўнага жыцьця літургічны культ ніколі ня быў аднолькавы й прымаў розныя формы. Ва Ўсходняй царкве літургія фарміравалася ў буйных асяродках, патрыярхія, як Александрыйская, Антыёхская й Ерусалімская, а ад імпэратара Канстанціна Вялікага галоўным цэнтрам літургічнага жыцьця стаўся Канстантынопаль. У Праваслаўнай царкве ўспамінаюцца літургіі епіскапа Кесарыйскага Васілія Вялікага (370-379), патрыярха Канстантынопальскага Яна Хрызастома (Златавуснага — 398-404), антыёхская, ерусалімская, над якою працаваў сьв. Кірыла (315-386) і інш. З часам візантыйская літургія сталася асновай пазьнейшых формаў літургіі Праваслаўнай царквы.

Найбольш раньні ўспамін аб хрысьціянскай літургіі спатыкаем у рымскага адміністратара Віфініі, Плінія, пад 112 годам. Ён піша, што хрысьціяне спатыкаюцца ў вызначаныя дні, сьпяваюць антыфоны да Хрыста як да Бога. А многа раней успамінаў аб царкоўным сьпеве апостал Павал у пасланьні да каласянаў: „Слова Хрыстовае няхай асядае ў вас багата, ва ўсякай мудрасьці: навучайце й настаўляйце адзін аднаго псальмамі й гімнамі й духоўнымі сьпевамі, у ласцы сьпяваючы ў сэрцах вашых Госпаду".

Філон Александрыйскі апісвае разьвіцьцё царкоўнай музыкі, якая заключалася ва ўрачыстых гімнах. Былі мужчынскія й жаночыя хоры.

У раньняй царкве сьвятую літургію адпраўляў пераважна епіскап. Ён ня меў на сабе спэцыяльнага літургічнага аблачэньня, і выконваў свой абрад у звычайным адзеньні. Багаслужба пачыналася малітвай удзячнасьці. Вернікі выказвалі свае грахі, прычачшчаліся, слухалі малітвы. Усе гэтыя цырымоніі адбываліся на грэцкай мове. Латынь паявілася ў літургіі 250 гадоў пазьней.

Старымі й пабожнымі рэлігійнымі практыкамі былі пасты. Хрысьціяне пасьцілі ў сераду й пятніцу, часам у суботу. Суровы пост адбываўся перад Вялікаднем, калі трываў два дні. У Александрыі пасьцілі цэлы тыдзень (у Вялікую Пятніцу й у Вялікую Суботу нічога ня можна было есьці).

Аб заходняй рымскай літургіі маюцца не зусім ясныя даныя. Вядома, што апостал Павал пісаў да рымлян пісьмы на грэцкай мове й яшчэ ў III стагодзьдзі грэцкая мова ўжывалася ў літургіі Рымскай царквы, аб чым съведчаць грэцкія надпісы ў катакомбах. У IV стагодзьдзі на Захадзе ўспамінаецца „галійская" літургія, якая паўстала ў Галіі. У Галію хрысьціянства завітала з Малой Азіі. Епіскап Ліёну, Ірыней, прыехаў у Галію каля 180 году са Смырны, сваю працу „Супраць ерасей" пісаў на грэцкай мове й на гэтай мове прапанавалася хрысьціянства. І таму зразумела, што заходняя літургія мае ў сабе грэцкія элемэнты.

Магчыма, што былі й іншыя літургіі. За прыклад можа паслужыць факт, што калі аднойчы маці епіскапа Амбражэя (374-397) выказала сваё незадавальненьне літургічнымі розьніцамі паміж сьвятынямі, на гэта сын яе, епіскап Мілану, параіў матцы трымацца лякальных традыцыяў так, як яны ёсьць. Гэта значыць, у Мілане трэба насьледаваць звычай міланскі, у Рыме — рымскі, у Галіі — галійскі й т.д.

Пры нагодзе можна згадаць, што адным з найстарэйшых царкоўных будынкаў тае пары агульна прынята лічыць будынак у Дура-Эўропас, над ракой Еўфрат, пабудаваны ў 232-233 гадох, які мог памясьціць сотню людзей. Сьцены сьвятыні мелі малюнкі са Старога й Новага Запаветаў. Археалягічныя раскопкі паказалі, што была гэта жыдоўская сынагога, якая сталася хрысьціянскай царквой.

Першыя хрысьціянскія сьвятыні былі звычайнымі дамамі, без насьценных роспісаў і такімі яны засталіся да часу Канстанціна Вялікага. Першыя хрысьціянскія малюнкі паявіліся ў пахавальных катакомбах. Таксама да найстарэйшых сьвятыняў адносіцца царква ў Віфляеме, дзе нарадзіўся Ісус. Царкву гэту пабудавала ў 326 годзе Галена, маці Канстанціна Вялікага. У VI стагодзьдзі яе аднавіў і пабольшыў імпэратар Юстыніян.

Дазволім сабе яшчэ раз згадаць рэлігію жыдоў. Заключалася яна на веры ў аднаго Бога. Зьмест гэтай веры ўтрымліваецца ў старых кнігах, якія сёньня называем Старым Запаветам. Сьвятым законам жыдоў зьяўляецца Тора — пяць кніг Майсея, якія займаюць галоўнае месца ў сынагозе.

Была гэта нацыянальная рэлігія, да якой належалі пераважна жыды. Яны выконвалі свае правы й абрады строга, згодна ўстаноўленаму праву. Пачынаючы ад Майсея, невялікае сэміцкае племя мела сваю натхнёную літаратуру й сваю палітычную арганізацыю. Важную ролю адыгрывала тут сынагога, якая аказалася найбольш арыгінальным інстытутам у станаўленьні жыдоўскага народу. Яна была ня толькі месцам маленьня, але таксама культурным і адміністрацыйным цэнтрам. Часта сынагога заступала шпіталь для хворых і была домам прытулку для жыдоўскіх гандляроў. Расьсеяныя жыды мелі свае багатыя абшчыны й традыцыю салідарнасьці. Калі прыехаў куды жыд, яго заўсёды свае прымалі, давалі яму гасьціну й дапамогу. Таму юдаізм застаўся сэпаратыстычнай, нацыянальнай і нейкім чынам непрыязнай да хрысьціянства рэлігіяй.

Жыдоўскую рэлігію рымскія ўлады не прасьледавалі. Жыды атрымалі гарантыю на захоўваньне свае рэлігійнай традыцыі за Юлія Цэзара. І нягледзячы, што паднялі яны тры вялікія паўстаньні за Нэрона (66-70), Траяна (115-116) і Адрыяна (133-135), за што былі моцна пакараны, аднак урад надалей талераваў юдаізм. Як ішлі гады й міналі стагодзьдзі, жыдоўскі нацыянальна-рэлігійны сэпаратызм выклікаў у шмат якіх народаў варожасьць да жыдоў і яна перахоўваецца да гэтага часу.

(„Голас Часу" № 12 (3), Лёндан, 1991 г.)

Ад Дэцыя да Дыяклетыяна

У 248 годзе Рым адзначаў сваё тысячагодзьдзе існаваньня. Праз тры дні й тры ночы гулялі рымляне сьвяткуючы міленіюм свае славы. Гэтага самага году генэрал наддунайскай правінцы Панноніі Дэцый прагалошаны быў сваімі легіёнамі імпэратарам. Быў гэта бунт супраць імпэратара Філіпа Араба, прыхільніка хрысьціян. Забіўшы яго, жонку, сына й другіх канкурэнтаў да ўлады, Дэцый пераможна ўехаў у Рым.

Адным зь першых і важных сваіх заданьняў новы імпэратар Дэцый (249-251) палічыў спыненьне дзейнасьці хрысьціян. Да гэтага часу ўлада Рымскай імпэрыі ставілася да хрысьціян па-рознаму. Часам адміністрацыя не зьвяртала

на іх увагу, а часам выступала варожа. Дэцый быў першым імпэратарам, які забавязваў адміністрацыю, каб трымала нагляд за хрысьціянамі й каб у вызначаныя дні аддавалі яны пашану паганскім багам і імпэратару. Такога роду эдыкт меў сачыць за вернасьцю грамадзян імпэрыі, аднак ён нарушаў прынцыпы хрысьціянскай веры й выдадзены быў выключна супраць хрысьціян.

Дэцыый не плянаваў масавай экзэкуцыі хрысьціян, як гэта зрабіў Нэрон у Рыме, але выступаў ён пераважна супраць хрысьціянскіх кіраўнікоў, каб празь іх прывесьці Царкву да ўпадку. Эдыкт Дэцыя загадваў усім грамадзянам імпэрыі прынесьці ахвяры паганскім багам і за гэта кожны атрымаў пасьведку.

Сваім загадам Дэцый хацеў узмоцніць дзяржаўную рэлігію паган, каб празь яе вярнуць славу Рымскай імпэрыі. Той, хто гэтага не зрабіў, лічыўся ворагам дзяржавы, а таго чакала кара сьмерці. Такім парадкам пачалося сыстэматычнае прасьледаваньне нявінных хрысьціян у рымскай дзяржаве, якога да гэтага часу не было.

Аднак, хто меў знаёмых у адміністрацыі, або грошы, мог адкупіцца ад прынашэньня ахвяр багам і атрымаць нелегальна пасьведку. Нямала было хрысьціян і нават епіскапаў, якія за грошы й знаёмства адкупіліся ад ахвярапрынашэньня паганскім багам. Аднак артадаксальная хрысьціянская думка лічыла такіх людзей здраднікамі.

Таксама загадана было здаць сьвяшчэнныя кнігі. Аднак царкоўнікі адмовілі гэта зрабіць, а другія гэта зрабілі, здаючы кнігі, але не сьвяшчэнныя. Аднак былі й такія, што ад страху перад рэпрэсіямі аддалі ўсё. Епіскап Карфагену Кіпрыян і епіскап Александрыйскі Дыянісій схаваліся й лістоўна трымалі кантакты са сваімі вернікамі.

Больш стойкія хрысьціяне ішлі ў вязьніцы, або прымалі гераічную сьмерць. Архіепіскапы Ерусаліма, Антыёхіі, Рыму й некаторыя іншыя хрысьціяне загінулі сьмерцю мучанікаў за сваю веру, таксама многа хрысьціян адступіла ад свае веры пад націскам прасьледу. У гэты трагічны час у студзені 250 году памёр рымскі епіскап Фабіян. Больш году часу Рым ня меў епіскапа. Новым епіскапам у 251 годзе быў абраны Карнэлій.

Пасьля сьмерці Дэцыя, які забіты быў у баі з гатамі праз здраду сваіх афіцэраў, на працягу двух гадоў ішло змаганьне за імпэратарскі трон паміж Трэбаніянам Гальлем і Эміліянам. Гэтыя два гады анархіі ў краі былі перадышкай для хрысьціян пасьля іхняга прасьледу Дэцыем, а адначасна глыбокім прыгнечаньнем і сорамам для тых хрысьціян, што адступілі ад свае веры.

Многія хрысьціяне-адступнікі хацелі вярнуцца назад у Царкву, але ня ўсюды іх прымалі. Людзі гэтыя каяліся ў сваіх паступках, аднак ня так лёгка й проста ім даравалася. Ім дазволена было маліцца за сьценамі царквы й пасьля цяжкіх перажываньняў некаторыя зь іх атрымалі прычасьце толькі на ложы свае сьмерці.

Рымскі епіскап Карнэлій (251-253), які сам захістаўся ў часе прасьледу Дэцыя, выказаў спачуваньне хрысьціянам слабой волі. Таксама ў часе гэтага прасьледу пагане падняліі свой голас у Карфагене й пачалі дамагацца аддаць епіскапа Кіпрыяна львам. Каб пазьбегчы кары сьмерці, епіскап, як ужо згадвалася, схаваўся, аднак гэтым сьцягнуў на сябе вялікую крытыку. Пасьля ён апраўдваўся й лістоўна даваў повады ў сваіх паступках перад духавенствам, але гэтага не хацелі забыцца яго заўзятыя праціўнікі на чале з Навацыянам.

У 252-253 гадох Карфаген наведала эпідэмія. Тут епіскап Кіпрыян арганізаваў хрысьціян гораду, прамаўляў да іх у духу хрысьціянскай любові, каб памагалі ня толькі хрысьціянам, але й сваім ворагам, прасьледавацелям.

У 257 годзе пачаўся новы прасьлед хрысьціян у адпаведнасьці з эдыктам Валерыяна, які забараняў зьбірацца хрысьціянам і загадваў прыносіць ахвяры паганскім багам. Кіпрыян гэтым разам не хаваўся й адмовіў складаць ахвяры паганскім багам і за гэта быў сасланы на выгнаньне. Неўзабаве яго адклікалі з выгнаньня й аддалі на суд. Епіскапа Кіпрыяна судзілі за „бязбожнае жыцьцё" ў паганскім разуменьні й гэтым разам хацелі яго прымусіць злажыць ахвяру паганскім багам, але й тут епіскап адмовіў. І калі яму адчыталі сьмяротны прыгавор праз усячэньне мячом, Кіпрыян сказаў: „Дзякуй Богу". Сталася гэта 14 кастрычніка 258 году.

Рымскі прасьвіцер Навацыян пагражаў адшчапенцам пракляцьцем. Пачалася вострая дыспута сярод рымскай царкоўнай герархіі, якая ўвяла схізму. Навацыян, пры ўдзеле трох епіскапаў, высьвяціўся на епіскапа, залажыў сваю абшчыну й пачаў дзейнічаць незалежна ад епіскапа Карнэлія.

Навацыян быў здольным тэолягам, адным з раньніх лацінскіх аўтараў. Памёр ён, праўдападобна, сьмерцю мучаніка ў часе прасьледу імпэратарам Валерыянам, каля 256 году, але ягоная абшчына прадаўжала існаваць і пасьля ягонай сьмерці. Яна знайшла сабе прыхільнікаў ня толькі у Рыме, але ў паўднёвай Францыі, Афрыцы й на ўсходзе імпэрыі. Навацыяне лічылі сябе людзьмі чыстага сумленьня, якія ня мелі за сабою грахоў, а сваю абшчыну называлі „чыстай".

Да Канстанціна Вялікага навацыянаў трактавалі як гэрэтыкаў, але на Нікейскім саборы (315) прысутнічаў іхні епіскап Ацэцій, а ў 326 годзе дазволена было будаваць ім свае цэрквы. Навацыяне пашыралі сваю дзейнасьць у Егіпце й Гішпаніі, але Канстантынопаль і Рым асудзілі іх у гэрэзіі. Навацыянскаму духавенству абяцалася пакінуць іх духоўны сан, калі яны вернуцца да Ўсяленскай царквы. Толькі з часам былі яны абсарбаваны галоўнымі Цэрквамі, але яшчэ на рубяжы VI-VII стагодзьдзяў аб навацыянах пісаў александрыйскі патрыярх.

Вяртаючыся да рымскіх цэзараў варта згадаць, што пасьля сьмерці Дэцыя двухгадовая барацьба за імпэратарскі трон закончылася перамогай Гальля Трэбаніяна. Новы імпэратар, быццам, прасьледаваў хрысьціян, але гісторыя многа не запісала пра яго прасьлед. Вядома адно, што ў гэтым часе эпідэмія ў імпэрыі й за яе межамі касіла людзей. І ў гэтым агульналюдзкім няшчасьці хрысьціяне праявілі сваю гуманітарнасьць і любоў да бліжняга згодна павучэньняў Хрыста. Ня робячы ніякай розьніцы, яны апекаваліся хворымі, хавалі памерлых і аказвалі ўсебаковую дапамогу хворым і пацярпеўшым грамадзянам, хоць і сярод іх былі ахвяры.

У 253 годзе свае жаўнеры забілі імпэратара Гальля й уладу пераняў пажылы сэнатар Валерыян (253-260), які свайго сына Гальліена (253-268) зрабіў супрацоўнікам імпэратара. Бацька й сын мелі многа работы. Франкі націскалі ў Гішпаніі, готы — у Грэцыі, алеманы ішлі на Мілан, пэрсідзкі

кароль заняў Антыёхію й рабіў беспарадак у Малой Азіі. Але двух імпэратараў абаранілі сябе. Бацька перамог пэрсаў, а сын — алеманаў. Радасьць была, але нядоўгая.

Сьпярша Валерыян выказаў прыхільнасьць да хрысьціян, якіх было на яго двары так многа, што імпэратарскі палац называлі „Божым домам". У гэтым часе дзяржава перажывала ўнутраны крызіс. Шматгадовая эпідэмія, якая ў некаторых правінцыях зьнішчыла больш за палову насельніцтва, ды войны — усё гэта адмоўна адбілася на гаспадарчай сытуацыі дзяржавы.

Каб пакрыць неабходныя недахопы, загадчык фінансаў, Марцін, дарадзіў імпэратару, што грошы можна атрымаць ад хрысьціян. А каб іх атрымаць, на гэта знойдзена прычыну, што хрысьціяне абыякава ставяцца да абароны дзяржавы.

Імпэратар паслухаў свайго міністра й у 257 годзе выдаў эдыкт, які забараняў пад карай сьмерці адпраўляць хрысьціянскія багаслужбы й рабіць сходкі на могілках. Як пакараньне канфіскавалася хрысьціянская маёмасьць і забаранялася адпраўляць багаслужбы ў прыватных дамах, а епіскапа Сыкста II (257-258) і дыякана Лаўрэнція прыгаварылі на сьмерць. Акрамя таго хрысьціяне пазбаўляліся цывільных і вайсковых пасад, а іх лідары строга караліся за невыкананьне дзяржаўных пастаноў.

Сярод прасьледаваных асуджаных хрысьціян у рэскрыпце Валерыяна згадваюцца сэнатары, высокія ўрадаўцы й рыцары. Сваім законам Валерыян уводзіў дыскрымінацыю й канфіскацыю хрысьціянскай маёмасьці, якая мела папоўніць дзяржаўную касу коштам нявінных хрысьціян.

У 260 годзе Валерыян папаў у палон да пэрсідзкага караля Сапора й там памёр пасьля дзесяці гадоў зьняволеньня. У дзяржаве ўладу пераняў ягоны сын Гальліен, які спыніў прасьлед хрысьціян. Ён на просьбу епіскапаў вярнуў хрысьціянам іхнюю забраную маёмасьць, дазволіў адчыніць малітоўныя дамы й праводзіць у іх рэлігійныя абрады. Нават дазволена было хрысьціянам займаць дзяржаўныя пасады. Такім парадкам многа хрысьціян зноў апынулася на двары цэзара, асабліва жаўнераў. Гэта падняло іх на духу й на руінах зьнішчаных сьвятыняў уздымаліся новыя й больш прыгожыя будынкі, у якіх канцэтравалася рэлі-

гійнае й адміністрацыйнае жыццё хрысціян. У такіх абставінах, на працягу сарака гадоў, хрысціянства разьвівалася й пашырала сваю дзейнасьць, ахопліваючы вышэйшыя клясы грамадзтва.

Год 260 і наступныя былі перыядам вялікай трагэдыі Гальліена. Шмат у якіх мясцох імпэрыі пачаліся бунты й зьявіліся кандыдаты на імпэратарскі трон. Пачынаючы ад імпэратара Аляксандра Сэвэра, які загінуў у 235 годзе ад рук сваіх жаўнераў, наступныя імпэратары доўга не сядзелі на сваім троне. Амаль усе яны былі пакліканы войскам і за выняткам некаторых, усе яны загінулі трагічна. Забойцамі іх былі ўласныя жаўнеры, або людзі хцівыя да ўлады.

Праводзячы адміністрацыйную рэарганізацыю, Гальліен адсунуў сэнатараў ад вайсковых пастоў і даручыў ім адміністрацыю. Гэта, магчыма, паслужыла прычынай, што 4 сакавіка 268 году свае генэралы замардавалі імпэратара Гальліена. Яго заступіў Кляўдый II (268-270). Быў ён дзейны імпэратар, але памёр у 270 годзе.

Новы цэзар Аўрэліян (270-275) меў 57 гадоў як легіёны зрабілі яго імпэратарм. За свайго жыцьця бачыў ён каля трыццаці імпэратараў на троне, так што мог прадбачваць і сваю невясёлую будучыню. На той час Аўрэліян быў добрым імпэратарам, перамог гатаў, алеманаў, узмоцніў граніцу імпэрыі на Дунаі і Рэйне, акружыў Рым абаронным мурам і дарогай рэформаў хацеў узмоцніць дзяржаву.

Адносіны яго да Хрысьціянскай царквы засталіся невядомымі. Сам ён быў паклоньнікам бога сонца Апалона й быццам хацеў прасьледаваць хрысьціян, але пры ім не запісана прасьледаў. У 275 годзе ён сьвяткаваў сваю годнасьць „бога й уладара ад нараджэньня" й у гэтым самым годзе „нябеснага ўладара" замардавалі свае збунтаваныя афіцэры.

Аўрэліяна заступіў генэрал Проб (276-282), які шукаў міру, але й ён быў замардаваны ў 282 годзе. Пасьля яго імпэратарамі былі Кар (282-283) і Нумэрыян (283-284), якія былі заангажаваны ў кансцірацыйнай барацьбе пакуль да ўлады прыйшоў Дыяклетыян.

Пры такой частай зьмене імпэратараў улада ў дзяржаве не магла быць устабілізавана й гэтым пакарысталіся хрысьціяне, каб узмоцніць і пашырыць уплывы свае Царквы.

Нягледзячы на частую барацьбу, хрысьціянства ня мела пашаны ў вачох урадавых кругоў. Прычыны былі старыя, а менавіта такія, што хрысьціяне не хацелі прызнаць культ імпэратара й гэтым аўтарытэт дзяржавы ды ўнікалі ваеннай службы.

Вядома, што рымскія імпэратары талеравалі ўсякія рэлігіі, калі яны не супярэчылі законам і традыцыі Рымскай імпэрыі й асобе імпэратара. Разважныя рымскія імпэратары не ўважалі сябе за багоў за выняткам Каліґулі, Нэрона й Даміцыяна, якіх пасьля іхняй трагічнай сьмерці прызналі за вар'ятаў. Яны хацелі на сваёй боскасьці будаваць еднасьць імпэрыі.

Усё-ж імпэратары трымаліся сваіх паганскіх традыцыяў і мала гаварылі простым людзям аб сваёй веры. Слушна, ці няслушна, сказаў у свой час Цыцэрон, што багі клапоцяцца аб справах вялікіх і занядбоўваюць малыя справы. Гэта значыць, што адзінка людзкая зь яе штодзённымі клопатамі й бедамі ня можа спадзявацца на помач багоў, бо яны клапоцяцца толькі справамі дзяржаўнага значэньня.

Калі, аднак, рэлігія хрысьціян пачала ахопліваць шырэйшыя кругі грамадзтва, калі ў яе радох апынуліся адукаваныя людзі, вайсковыя камандзіры й высокія чыноўнікі на двары цэзара, тады небясьпека для ўраду станавілася больш відавочнай. Рымскія ўлады мелі сумніў да хрысьціян, яны зналі, што хрысьціяне маюць непаразуменьні з жыдамі, ня ёсьць папулярнымі сярод паганаў і сваёю дзейнасьцю выклікаюць беспарадак у імпэрыі.

Таксама паміж рымскімі ўладамі й хрысьціянамі трывала непаразуменьне праз даўжэйшы час, амаль ад самага пачатку яго заснаваньня. І тут няма нічога дзіўнага, што рымскія ўлады прымалі часта строгія меры супраць хрысьціян і трымалі над імі нагляд. Усё-ж, якія былі ў той час хрысьціяне, але супраць іх не было агульнага дзяржаўнага закону, за выняткам часовых распараджэньняў, якія мелі пераважна лякальны характар.

Былі й другія перыяды талеранцыі, калі рымскія ўлады не перашкаджалі хрысьціянам маліцца й глядзелі на іх праз пальцы. Паміж урадам і хрысьціянамі не было дыялёгу й яго мала хто шукаў. Урад стаяў на сваіх пазіцыях, а хрысьція-

не на сваіх, так што пагроза над хрысьціянамі вісела далей. Хрысьціяне былі зь ёю запазнаныя й стаялі на сваім пункце гледжаньня, што Царква ня можа існаваць толькі як культавая абшчына, але павінна праводзіць місію пашырэньня навукі Хрыста, не зважаючы на перашкоды.

(„Голас Часу" № 16 (1), Лёндан, 1992 г.)

Прасьлед хрысьціян за Дыяклетыяна й Галерыя

Ад часу імпэратара Гальліена да Дыяклетыяна прайшло каля сарака гадоў духовай перадьшкі, калі Хрысьціянская царква была пакінута ў спакоі. Але, як падаюць некаторыя гісторыкі, Дыяклетыян (284-305), прыйшоўшы да ўлады, пабачыў узрастаючую сілу Хрысьціянскай царквы й гэтым небясьпеку для свайго імпэратарскага аўтарытэту. Каб запабегчы гэтаму, Дыяклетыян распачаў прасьлед Царквы з мэтай зьнішчыць яе раз і назаўсёды.

Ня ўсе, аднак, гісторыкі пагаджаюцца з такой пастаноўкай справы. Ведама, што праз дзевятнаццаць гадоў свайго імпэратарства Дыяклетыян не чапаў хрысьціян. Прычынай прасьледу мела быць эканамічная палітыка Дыяклетыяна, якая яму не ўдалася й трэба было знайсьці казла адпушчэньня, на якога можна было-б зваліць віну. Гэтым казлом аказаліся хрысьціяне, якія быццам выклікалі гнеў рымскіх багоў.

У 298 годзе Галерый атрымаў вялікую перамогу над пэрсамі й гэта ўзьняло яго аўтарытэт і ўзмоцніла пазіцыю. Зімой 302/303 году ён меў спатканьне з Дыяклетыянам у Нікамэдыі й тут Галерый, маці якога была заўзятай паганкай, дамагаўся ад Дыяклетыяна прыняць рашучыя меры супраць хрысьціян. Галерый быў зяцем Дыяклетыяна. Таксама вялікі ўплыў на Галерыя рабіў адміністратар Віфініі Геракл, які быў ворагам хрысьціянства.

На працягу свайго доўгага панаваньня Дыяклетыян ставіўся да хрысьціян зь ветлівай нейтральнасьцю. На яго двары ў Нікамэдыі аж кіпела ад хрысьціянскіх чыноўнікаў, а найбольш было моладзі. Хрысьціяне былі нават намесьнікамі правінцыяў і займалі іншыя адказныя пасады ў дзяржаве

не гаворачы аб навуковых, як прафэсары, дактары, інжынеры й т.п. Нават Прыска, жонка імпэратара й дачка Валерыя спрыялі хрысьціянам і прысутнічалі на хрысьціянскіх багаслужбах. Хадзілі чуткі, што недалёкі той час, калі й сам Дыяклетыян навернецца на хрысьціянства.

Ніхто ня мог лепш разумець за Дыяклетыяна, што значыць жыцьцё чалавека, пазбаўленае права індывідуальнай свабоды. Дыяклетыян нарадзіўся каля 240 году ў незаможнай сям'і. Адны аўтары падаюць, што быў ён сынам сьціплага ўрадніка; другія падаюць, бацька Дыяклетыяна быў нявольнікам у рымскага сэнатара. Пасьля, нейкім спосабам бацьку ўдалося атрымаць свабоду, а сын, як здольны аратар і афіцэр, які адзначыўся ў вайне з ворагамі, уступіў на імпэратарскі трон.

Заняўшы гэты пасад, Дыяклетыян правёў вялікія рэформы. Ён фактычна падзяліў дзяржаву на Ўсходнюю й Заходнюю імпэрыю. Быў гэта не палітычны, а адміністрацыйны падзел дзеля спраўнейшага кіраваньня імпэрыяй. У 286 годзе Дыяклетыян паклікаў сабе да помачы, як роўнага, Максіміяна. Абодва мужы прыдбалі сабе тытулы аўгустаў, або боскіх, і ў 293 годзе паклікалі да помачы цэзараў. Усходняй часткай Рымскай імпэрыі кіраваў Дыяклетыян з цэзарам Галерыем, а Заходняй — Максіміян са сваім цэзарам Канстанцыем Хлорам. Дыяклетыян асеў у Нікамэдыі (Малая Азія), а Максіміян — у Міляне, пазьней у Равэне. Як бачым, старажытная сталіца імпэрыі Рым не ўспамінаецца, яна страціла сваё папярэдняе цэнтральнае значэньне.

У адміністрацыйнай герархіі ў Рымскай імпэрыі Дыяклетыян лічыўся галоўным, ён выступаў як „домінус" і пастаўлены быў да найвышэйшага боства Юпітэра.

Уступіўшы на імпэратарскі трон, Дыяклетыян папаў пад моцны націск сваіх супрацоўнікаў-сяброў, якія змусілі яго прыняць меры супраць хрысьціян. Дыяклетыян, паводле Лякантыя, паддаўся бальшыні, але пад варункам, што ў змаганьні з хрысьціянствам ня будзе праліцьця крыві.

У дзяржаўных актах справа рэлігіі фармулявалася так, што ўсё грамадзтва аддавалася пад спэцыяльную пратэкцыю двух найстарэйпых рымскіх багоў — Юпітэра й Гэркулеса, а народ павінен быў верыць і аддаваць ім пашану; іншыя рэлігіі лічыліся сэктамі. Гэтым Дыяклетыян уводзіў традыцыю

цыю рымскай рэлігіі як дзяржаўнай, дзе асоба імпэратара лічылася боскай. Абавязкам кожнага грамадзяніна было прыносіць багам ахвяры, а хто ня ўчыніць гэтага будзе лічыцца ворагам дзяржавы, якога чакае кара сьмерці. Такім парадкам пачаўся першы сыстэматычны прасьлед хрысьціян у Рымскай дзяржаве, якога не было да гэтага часу.

Прычыны, якія змушалі раньніх імпэратараў, а таксама й Дяклетыяна прыняць суровыя меры супраць хрысьціян, мы ўжо згадвалі некалькі разоў. І яшчэ паўторым, што хрысьціяне ад пачатку свае царкоўнай арганізацыі няраз выказвалі абыякавасьць да дзяржаўных законаў, што ў многіх выпадках урад талераваў. Напрыклад, у часе ваенных дзеяньняў 295-297 гадоў, гэта ўжо за імпэратара Дыяклетыяна, здараліся такія выпадкі ў рымскай арміі, калі хрысьціяне адмаўляліся насіць дзяржаўныя эмблемы, якія прадстаўлялі цэзараў на роўні з багамі, або зусім адмаўляліся служыць у войску, спасылаючыся на свае хрысьціянска-рэлігійныя перакананьні. Такія паступкі хрысьціян, ды яшчэ ў часе вайны, не маглі быць талераваны, калі дзяржава знаходзілася ў небясьпецы. І тут трэба прызнаць аб'ектыўна, што хрысьціяне былі галоўным дзейнікам раскладу Рымскай імпэрыі знутры, як антычнай паганскай дзяржавы. Былі гэта пераважна людзі бедныя, ня мелі пашаны да ўлады й за гэта можна іх па-рознаму ацэньваць.

Паганскія дзеячы выступалі голасна супраць хрысьціян і абвінавачвалі іх у тым, што яны нікому не прыносяць карысьці, не бяруць удзелу ў агульных сьвяткаваньнях, у грамадзкім жыцьці, у абароне краіны й т.п. Адчувалася насьцярожанасьць паганаў, якія баяліся, каб іхняя дзяржава не пераўтварылася ў хрысьціянскую.

На працягу аднаго году (ад лютага 303 да красавіка 304 году) выдадзена было чатыры эдыкты супраць хрысьціян. Першы эдыкт забараняў культ, загадваў канфіскацыю сьвяшчэнных кніг і нішчэньне сьвятыняў. Другі — наказваў арыштоўваць герархаў царквы. Трэці — дазваляў звальняць арыштаваных хрысьціян пад варункам, што яны прынясуць ахвяру багам. Чацьвёрты эдыкт забавязваў усіх грамадзян імпэрыі публічна прынасіць ахвяры багам пад пагрозай катаваньняў, сьмерці, або роўнай сьмерці дэпартацыі ў капальні.

Напярэдадні апублікаваньня першага эдыкту 23 лютага 303 году зьнішчана найбольшую царкву ў рэзыдэнцыі Дыяклетыяна ў Нікамэдыі. Рэч зразумелая, што хрысьціяне былі моцна абураныя такім актам імпэратара.

Строгія пастановы-эдыкты ўмяшчаліся на вуліцах Нікамэдыі. Адзін праходзячы хрысьціянін сарваў прыказ, за што быў арыштаваны й зьняволены. Яго намаўлялі адрачыся ад Хрыста, але ён не згадзіўся й як стойкі хрысьціянін прыняў сьмерць мучаніка на кастры.

Неўзабаве ўспыхнуў пажар у імпэратарскім палацы ў Нікамэдыі. Віна пала на хрысьціян. Пачаліся допыты й тэрор службы. Нават сам Дыяклетыян, які за пару гадоў зрабіў Нікамэдыю прыгожым горадам, браў удзел у допытах, але ніхто нічога не дазнаўся. Толькі службу Галерыя ніхто не дапытваў і не прыпякаў агнём, каб дазнацца праўды. З гэтага відаць, што палац быў падпалены з ведама цэзара Галерыя, каб сьцягнуць віну на хрысьціян і распачаць супраць іх суровыя пакараньні. І так яно сталася, што дыяканы й сьвятары імпэратарскай рэзыдэнцыі ў Нікамэдыі разам са сваім епіскапам Антымам пацярпелі нявінную сьмерць.

Праз пятнаццаць дзён успыхнуў другі пажар у палацы й гэтым разам падпальшчыка не знайшлі. Гэтага самага дня Галерый пакінуў Нікамэдыю й перад ад'ездам сказаў, што ўцякае, каб не згарэць жывым. І так справа пажару ў імпэратарскім палацы ніколі не была выкрыта. Але імпэратарская служба заплаціла сваім жыцьцём за пажар і нават жонка й дачка Дыяклетыяна мелі прыкрасьці з гэтай прычыны, бо прыхільна адносіліся да хрысьціян. Жонка Дыяклетыяна, як казалі, мела прынесьці ахвяру паганскім багам, каб ня быць падазронай у хрысьціянстве. Тэрор і прасьлед хрысьціян узмоцніліся, а іхнія лідары — епіскапы й духавенства запаўнялі турмы.

Апошні чацьвёрты прыказ супраць хрысьціян выдадзены быў у красавіку 304 году й у ім гаварылася ўжо аб кары сьмерці. У гэтым часе Дыяклетыян цяжка хварэў і такі прыказ выдадзены быў безь яго ведама. Пасьля чацьвёртага эдыкту абяцалася ўзнагарода тым хрысьціянам, якія адмовяцца ад свае веры й аддадуць пашану паганскім бажаствам, а неслухі будуць перададзены суду, які прыгаворыць іх на сьмерць, або цяжкія работы ў капальнях.

Тым часам здароўе Дыяклетыяна аказалася безнадзейным, што яго палічылі памерлым. Аднак, калі ён акрыяў пасьля цяжкой хваробы й паказаўся народу, то нават тыя, што зналі яго добра, не маглі пазнаць. Быў гэта зламаны фізычна й духова чалавек.

Цяжкая хвароба адбілася на здароўі Дыяклетыяна й змусіла яго зрачыся імпэратарскага трону. Сваю пасаду Дыяклетыян здаў 1 траўня 305 году перад статуяй Юпітэру за Нікамэдыяй і выехаў у сваю родную Дальмацыю. Гэта самае зрабіў й імпэратар Максіміян на Захадзе. На іх месца былі вызначаны два новыя імпэратары: на Усходзе — Галерый, а на Захадзе — Канстанцый Хлор. Яны ўзялі сабе ў памочнікі цэзараў: Максіміяна Дая на Ўсходзе, а Сэвэра на Захадзе.

Непадобна сваім папярэднікам, Дыяклетыян прасядзеў на імпэратарскім троне больш за дваццаць гадоў і здаў яго толькі з прычыны хваробы. За яго ўрадаваньня праведзены былі вялікія рэформы адміністрацыйнага й вайсковага характару. Дзеля большай спраўнасьці адміністрацыі абшырнай імпэрыі Дыяклетыян, як ужо згадвалася, падзяліў яе на Ўсходнюю й Заходнюю, што дало пачатак царкоўнаму падзелу.

Дыяклетыян праявіў ініцыятыву ў пабудове вялікіх будынкаў, увёў цырыманіял ва ўрадзе й рабіў усё магчымае, каб утрымаць веліч Рымскай імпэрыі. Увайшоў ён у гісторыю як адзін з выдатных імпэратараў, перад якім людзі падалі на калені й цалавалі берагі ягоных шатаў як нейкае сапраўднае боства.

Толькі з прычыны хваробы Дыяклетыяна, Галерый (305-311) пераняў пасаду імпэратара й выдаў не адзін строгі эдыкт супраць хрысьціян. Хваля масакраў і прасьледу хрысьціян пракацілася па ўсёй усходняй імпэрыі. Прыказы прасьледаў выконваліся ўрадавымі агентамі, але ня ўсюды было аднолькавае антыхрысьціянскае насільле. Амаль у кожнай правінцыі справа хрысьціян прадстаўлялася па-рознаму. Многа залежала ад кіраўнікоў правінцыяў і таму па-рознаму тлумачаць некаторыя аўтары гэты перыяд прасьледу. Напрыклад, цэзар Заходняй Эўропы Канстанцый Хлор, не зважаючы на эдыкт Дыяклетыяна й Галерыя, не зачапіў веры сваіх падданых хрысьціян. Што праўда, былі толькі закрыты сьвятыні пасьля першага эдыкту. Але пасьля абдыкацыі

Максіміяна, 1 траўня 305 году, прасьлед хрысьціянаў на Захадзе Эўропы спыніўся. Нават сьвятыні былі вернуты хрысьціянам. А некаторыя дочкі Хлора былі хрысьціянкамі, або прыхільныя да хрысьціянства.

Найбольш хрысьціяне прасьледаваліся ў Афрыцы й Малой Азіі, а гэта таму, што там кіраваў Галерый і там найбольш было хрысьціян. На Захадзе Рымскай імпэрыі хрысьціяне састаўлялі малаколькасныя групы. Напрыклад, 12 лютага 304 году было арыштавана 49 жанчын, мужчын і дзяцей, калі яны маліліся ў хаце Актавіяна Фэлікса ў Паўночнай Афрыцы. Іх прывялі да праконсула Анулінуса за тое, што яны, як хрысьціяне, супраць загаду імпэратара й цэзара прысутнічалі на забароненай багаслужбе. Арыштаваныя да віны не прызналіся, не пакаяліся, ад хрысьціянскай веры не адмовіліся й за гэта былі прыгавораны да кары сьмерці.

Часта хрысьціян мучылі, калечылі, зьдзекаваліся, палілі жывымі, а часамі прапушчалі справы без пакараньня. Многа залежала ад кіраўнікоў улады. Як піша айцец царквы Яўсевій, які жыў у часе прасьледу, па дзесяць, па дваццаць, па трыццаць, па шэсьцьдзесят, або й сто мужчын, жанчын і дзяцей аддаваліся на сьмерць, а іншых кідалі зьвярам у амфітэатры. І ён сам быў зьняволены за веру. Антыхрысьціянскай акцыяй кіраваў там той самы Галерый, а апошнім часам заўзяты вораг хрысьціян цэзар Максіміян Дая.

Прасьлед хрысьціян запачаткаваны Дыяклетыянам меў адну характэрную рысу. Ён паказаў, што хрысьціяне больш знатнага паходжаньня лягчэй адмаўляліся ад свае веры чым бедныя. Аб гэтым гаворыць александрыйскі епіскап Дзяніс у сваім пісьме да антыёхскага епіскапа Фабіяна. Ён піша, што многа людзей „знамянітых" зараз падпарадкаваліся эдыкту, не сумелі захаваць уласнай годнасьці. Калі яны ішлі прынесці ахвяры багам, то народ сьмяяўся зь іх, што так лёгка выракаюцца свае веры. Людзі гэтыя, як піша далей епіскап Дыяніс, аднолькава баяліся як сьмерці, так і ахвярапрынашэньня.

Зьняволеных хрысьціян Егіпту наведаў з пустыні пустэльнік Антон, каб падтрымаць іх на духу. Ён два разы прыходзіў у Александрыю, каб узяць удзел у справах усяго хрысьціянства.

Праз увесь час жорсткага прасьледу Царквы Галерыем і ягонымі памагатымі, хрысьціяне не заўсёды хаваліся ад вока ўладаў, а часам адкрыта й голасна заяўлялі сваю веру. Гэтым яны сьцягвалі на сябе большы прасьлед, але з другога боку, сваёю стойкасьцю прыцягвалі да сябе новых вернікаў. Як заўважыў хрысьціянскі пісьменьнік Тэртуліян, „кроў мучанікаў ёсьць насеньне".

Ужо ў той час было прынята верыць, што дарога да збаўленьня вядзе праз мукі й цярпеньні. Таму некаторыя хрысьціяне сьвядома падвяргаліся пакутніцкай сьмерці за сваю веру й трэба было іх стрымоўваць ад гэтага.

Рымскі лёгіён у Галіі, які складаўся з хрысьціян Егіпту, атрымаў загад ад цэзара Максіміяна Дая ісьці лавіць і вешаць хрысьціян. Легіён, які налічваў нейкіх шэсьць тысяч чалавек, адмовіўся выканаць загад цэзара й за гэта яго зьдзесяткавалі. Максіміян думаў, што гэтым запалохае рэшту жаўнераў і яны пойдуць мардаваць сваіх братоў па веры, але яны й гэтым разам адмовіліся. Тады прамовіў да іх камандзір Маўрыкій, зазначыўшы, што калі яны адмовяць яшчэ раз імпэратару, то ўсе загінуць. Адказ жаўнераў быў такі: „Мы былі жаўнерамі Хрыста пакуль сталіся яго, мы злажылі прысягу Богу намнога раней як імпэратару". І, злажыўшы свае шчыты й зброю, былі пакараны сьмерцю. За час прасьледу Галерыя хрысьціяне ўсходніх правінцыяў Рымскай імпэрыі моцна пацярпелі фізычна, але духова не заламаліся.

Цяжка сказаць колькі было страчана хрысьціян у той час прасьледу. Адны навуковыя досьледы налічваюць сотні, другія дзесяткі тысяч хрысьціян, якія загінулі сьмерцю мучанікаў за сваю веру. Але больш умераныя дасьледчыкі прымаюць лік 2500-3000 ахвяр тэрору. Невядома таксама колькі было разбурана цэркваў, зьнішчана яе маёмасьці й літургічных кнігаў, якіх палілі дэманстрацыйна.

Год 308 быў годам тэрору, а судовыя працэсы цягнуліся праз наступныя гады. Турмы, у якіх хрысьціяне так доўга сядзелі, былі запханыя епіскапамі, прасьвітарамі, дыяканамі й усімі тымі, што мелі нешта супольнае з царквой. Турмы былі набіты так шчыльна, што не было месца дзе сесьці. Зьявішча вельмі непрыемнае, прыкрае. Тут хадзіла ўжо ня так пра самую веру, як аб маральны бок, што на апубліка-

ваную атаку на хрысьціян паганскага апалягета Гераклія пагане выказалі сваё незадавальненьне. Яны пачалі ратаваць прасьледаваных хрысьціян і хаваць іх у сябе, за што пагражала ім кара ўтраты маёмасьці або турма.

Прасьлед хрысьціян пацягнуў за сабою многа ахвяр. Акрамя сьмяротных пакараньняў многа іх памерла ў турмах або на выгнаньні й у капальнях. Выгнаньне ў той час было суровай карай, бо такі чалавек, апынуўшыся ў новым асяродзьдзі, ня быў там ветліва спатыканы. І трэба памятаць, што паводле эдыкту канфіскавалася маёмасьць хрысьціян.

Усё-ж глыбокія перакананьні хрысьціян у слушнасьці свае веры загартавалі іх маральна й стварылі зь іх своеасаблівую сілу, якой ніхто не валодаў у тагачасным сьвеце. Людзкія ахвяры не стрымалі разьвіцьця Цэрквы, а ўвялі ў яе новы элемэнт. Быў гэта культ сьвятых, або мучанікаў за хрысьціянскую веру.

Аднак пад націскам прасьледу многа хрысьціян адступіла ад свае веры. Успамінаюцца нават епіскап Рыму Марцэлін (296-303) зь некалькімі сьвятарамі, Пётр, епіскап александрыйскі й быццам епіскап Карфагену Мэнсурый. Епіскап Марцэлін ня толькі сябе сплямiў адступствам, але выдаў сьвяшчэнныя кнігі й прынёс ахвяру багіні Вэнэры, г.зн. стаўся ідалапаклоньнікам, каб захаваць сваё жыцьцё. Неўзабаве пасьля гэтага ён памёр, а Рымская царква некалькі гадоў ня мела епіскапа.

У IV стагодзьдзі хрысьціянская вера была настолькі распаўлюджана й прынята народам, што ня так лёгка можна было яе зьнішчыць. Хрысьціянства дамінавала ў цывілізаваным сьвеце, мела сваё добра сарганізаванае сьвятарства, аформленую Царкву, тэалягічную структуру й таму карысталася ў народзе аўтарытэтам. Прасьлед хрысьціян за Нэрона, Дэцыя й апошні за Дыяклетыяна й Галерыя паказаў, што ў Рымскай імпэрыі нечага не хапае й гэта мае запоўніць Хрысьціянская царква.

Варта таксама ведаць, што ў той час былі й іншыя „таямнічыя культы" ў Рымскай імпэрыі, аб якіх зналі ўлады, але іх не прасьледавалі.

Справу рэлігіі Дыяклетыян разумеў добра й таму праз даўжэйшы час свайго панаваньня не хацеў чапаць хрысьці-

ян. Ён, мабыць, прадчуваў, што кампанія прасьледаў ня будзе мець задавальняючага рэзультату. Вядома было ўсім, што нават жонка й дачка Дыяклетыяна верылі ў Хрыста, трымалі блізкія кантакты зь веруючымі хрысьціянамі й як падаюць некаторыя аўтары, самі яны прынялі хрысьціянскую веру й сталіся яўнымі вернікамі. Аднак ня ёсьць пэўным, ці жонка Прыска й дачка Валерыя былі хрышчаны.

З часам, калі Дыяклетыян выздаравеў, выказаў сваё спачуваньне хрысьціянам. Ня маючы іншага выхаду, гэта самае зрабіў пасьля й Галерый.

(„Голас Часу" № 17 (2), Лёндан, 1992 г.)

Сьмерць Галерыя й Максіміяна Дая

Імпэратар Галерый, выконваючы ўладу супольна з Максіміянам Даям ва Ўсходняй Рымскай імпэрыі, хацелі сарганізаваць паганскую рэлігію на хрысьціянскі спосаб з герархіяй і рытуаламі. Такія задума не дасягнула свае мэты, толькі нарабіла многа крыўды, горкіх сьлёз і пакінула па сабе крывавы сьлед. Прасьлед, запачаткаваны Дыяклетыянам і прадоўжаны Галерыем і Максіміянам Даям паказаў, што дзяржаўная алігархія Рымскай імпэрыі кіруецца тыраніяй. Гэта сьведчыць аб бездухоўнасьці жыцьця Рымскай дзяржавы.

Галерый прызнаў сваё палітычнае паражэньне ў барацьбе з хрысьціянствам, а цяжкую хваробу — як помсту хрысьціянскага Бога. Некалі здаровае цела адважнага жаўнера-камандзіра неспадзявана пачало гнісьці да такой ступені, што па ім поўзалі чэрві, якія раз'ядалі яго ніжнюю палавіну цела.

У апошніх днях свайго жыцьця, 30 красавіка 311 году, Галерый падпісаў эдыкт, у якім гаварылася аб агульным дабры дзяржавы, каб улажыць усе справы рымлян згодна старых правоў і грамадзкіх звычаяў. І тут-жа дазвалялася хрысьціянам адбудоўваць свае малітоўныя дамы, праводзіць у іх свае зборкі, каб толькі ня быў нарушаны грамадзкі парадак. У выніку аказанай ласкі хрысьціяне маглі маліць свайго Бога за бясьпеку дзяржавы, каб у ёй можна было спакойна жыць. У такім, вось, пакорным духу, у формне амністыі, быў падпісаны эдыкт заўзятага ворага хрысьціян.

Галерый цяжка мучыўся й памёр у Сірміум (цяпер Срэмска Мітровіца). Яго пахавалі не ў маўзалеі, які ён пабудаваў у Салёніках, але завезьлі цела ў Дакію і пахавалі ў вёсцы ягонага нараджэньня, якую Галерый разбудаваў, упрыгожыў і назваў Ромунаянум у гонар свае маткі Ромулі, якая была заўзятай паганкай.

Наконт эдыкту Галерыя ёсьць другая вэрсія, што ён, будучы сьмяротна хворы, ня мог добра знаць, што робіцца вакол, а за яго плячыма ўсім кіраваў Ліцыній, які сам ніколі ня меў намеру стацца хрысьціянінам. Але маючы палітычную мэту, ён падыктаваў гэты эдыкт, каб мець сабе саюзьніка Канстанцыя, які знаходзіўся на Захадзе імпэрыі й адначасна супраць свайго праціўніка на Ўсходзе Максіміяна Дая, які быў заўзятым ворагам хрысьціян, як і Галерыя.

Варта згадаць, што дзьве вялікія імпэрыі — Рымская й Пэрсідзкая пакланяліся богу-сонцу Мітру. Ён быў богам і індзейцаў. Мітру сьвяткавалі зімой, 25 сьнежня, калі дзень быў найкарацейшы. Паклоньнікам Мітры быў Дыяклетыян, які, адышоўшы ад палітычнага жыцьця ў 305 годзе, у 307 годзе быў у кантакце з Галерыем і Ліцыніем з мэтай захаваць Мітру як „пратэктара іхняй імпэрыі".

Супрацоўшк Галерыя, вораг хрысьціян — цэзар Максіміян Дая, не апублікаваў эдыкту імпэратара Галерыя аб рэлігійнай свабодзе для хрысьціян, толькі абмежаваўся да вуснага наказу стрымаць прасьлед хрысьціян. Аднак і праз вусны наказ хрысьціян выпушчалі на волю. Яны адкрывалі свае цэрквы, свабодна служылі ў іх багаслужбы, а епіскапы разглядалі справы хрысьціян, якія ў часе прасьледу адступілі ад свае веры.

Пасьля сьмерці Галерыя ўладу першага імпэратара пераняў Ліцыній, што бяз мала не прывяло да вайны з Максіміянам Даям. Дая, як першы па старшынству, меў быць пакліканы на трон. Свае палітычныя амбіцыі яны ўзгоднілі, прыехаўшы караблямі на сярэдзіну праліва Босфара. Кожны зь іх захаваў сваю ўладу й тэрыторыю, якімі валодалі да гэтага часу.

Як толькі Максіміян Дая стаў незалежным гаспадаром Усходу, ён адразу вярнуўся да прасьледу хрысьціян. Паганскія жрацы вялі галоўную прапаганду супраць хрысьціян. Ім ха-

дзіла, каб скампраметаваць хрысьціян у вачох паганаў, якіх было яшчэ многа й якія карысталіся падтрымкай цэзара. У сваёй дзейнасьці яны прымянялі фізычныя мэтады пакараньня хрысьціян. Іх калечылі й асьляплялі на адно вока.

Максіміян планаваў арганізацыю паганскага культу з галоўнымі жрацамі ў кожнай правінцыі, якія мелі насіць белую вопратку. Ён абяцаў звольніць ад падаткаў тыя гарады, якія выкажуць згоду прасьледаваць хрысьціянскія асяродкі.

Заключаны мір паміж Ліцыніем і Максіміянам Даям трываў толькі да 313 году. Ліцыній, каб перамагчы свайго праціўніка, выказаў прыхільнасьць да хрысьціянскай веры. У той час кожны ведаў, што Максіміян Дая — сьмяротны вораг хрысьціянства, але ў ягонай Усходняй імпэрыі й ягоным войску было найбольш хрысьціян. Паміж Ліцыніем і Максіміянам заносілася на непазьбежную вайну, якая неўзабаве пачалася.

Калі варожыя войскі 1 траўня 313 году спаткаліся на полі бою, то жаўнеры й афіцэры Ліцынія зрабілі на вачох жаўнераў Максіміяна рэлігійную маніфэстацыю. Яны голасна гаварылі малітвы й узносілі ўгору рукі, а на іх глядзелі жаўнеры-хрысьціяне бязбожнага Максіміяна Дая, якіх баявы дух упаў. І калі неўзабаве прыйшло да бою, армія Максіміяна Дая была разьбіта, часьць яе паддалася Ліцынію, а сам Максіміян Дая, скінуўшы зь сябе імпэратарскія шаты, уцёк.

Пасьля паражэньня заўзяты вораг хрысьціян Максіміян Дая, які быў адначасова цэзарам Сырыі й Егіпту, нарэшце здаўся й у чэрвені ці ліпені 313 году выдаў прыказ рэлігійнай свабоды. Ён дазволіў хрысьціянам будаваць малітоўныя дамы й загадаў вярнуць ім забраную маёмасьць. У сваёй антыхрысьціянскай дзейнасьці Дая мала каго паслаў на сьмерць, больш высылаў хрысьціян на катаржныя работы ў капальні, каменяломні, а апорных калечыў.

Страціўшы надзею ў сваю антыхрысьціянскую справу, Максіміян Дая ня мог гэтага лёгка перанесьці й у жніўні 313 году памёр. Адны гісторыкі падаюць, што Дая пакончыў самагубствам, а другія — што быццам загінуў у грамадзянскай вайне супраць Ліцынія. А Ліцыній падае, што Дая праглынуў атруту, якая мучыла яго чатыры дні так, што ён біў галавою аб сьцяну. У канцы прызнаў сваю віну

й прасіў Хрыста мець ласку над ім. Загінуў Дая ў даволі маладым веку, маючы нейкіх трыццаць гадоў. А даўно хворы Дыяклетыян, маючы на сумленьні пралітую кроў хрысьціян, замучыў сябе голадам. Гады яго імпэратарства, з рэлігійнага пункту гледжаньня, увайшлі ў гісторыю царквы як „Эра Мучанікаў".

Суровы лёс спаткаў і імпэратарскую сям'ю Максіміяна Дая, нягледзячы на яе век і пол. Забілі васьмігадовага сына й семнаццацігадовую дачку, а жонку Дая ўтапілі ў рацэ Аронт.

Таксама жонку Дыяклетыяна Прыску й дачку Валерыю, якая была жонкай Галерыя, напаткаў трагічны лёс. Пасьля сьмерці мужа апеку над Валерыяй меў абняць Ліцыній. Але, як відаць, яна, матка й сын Галерыя, Кандыдый, былі нечым незадаволеныя зь Ліцынія й прыбылі на двор Максіміяна Дая. Прысутнасьць іхнюю на двары сваім Дая стараўся выкарыстаць дзеля сваіх палітычных мэтаў. Ён хацеў разьвесьціся са сваёй жонкай і ажаніцца з Валерыяй, дачкой Дыяклетыяна, аднавіцеля імпэрыі. Валерыя адмовіла прапанову сужэнства пад прэтэкстам жалобы па мужу Галерыю. За гэта Дая памсьціўся, выгнаў яе з маткай у пустыню Сырыі. Аб гэтым даведаўся жывы яшчэ ў той час стары Дыяклетыян і прасіў адаслаць яму жонку й дачку, але дарэмна. У гэты пераходны час узаемнага змаганьня яны былі забітыя, а целы іх укінуты ў мора. А некалі абедзьве яны сымпатызавалі хрысьціянам і, як падаюць некаторыя аўтары, быццам былі хрысьціянкамі. Будучы ў страху за сваіх мужоў, Прыска й Валерыя хаваліся пераадзетыя за простых жанчын, але й гэта іх не ўратавала.

Такія забойствы не былі звычайнай помстай за рэлігійныя ці якія іншыя пераканаьні, але былі яны зазвычай вынікам палітыкі, каб пазьбегчы прэтэндэнтаў на трон для пануючай сям'і-дынастыі.

Гісторыкі розна глядзяць на рэпрэсіі хрысьціян з боку рымскіх імпэратараў: Нэрона, Траяна, Марка Аўрэлія, Дэцыя, Дыяклетыяна й бачаць у іх палітычна-дзяржаўную прычыну. Гэтыя імпэратары клапаціліся больш пра будучыню імпэрыі, яе сілу й стараліся вярнуць яе старую славу. А таму, што хрысьціяне абыякава адносіліся да дзяр-

жаўных спраў і не падпарадкоўваліся наказам імпэратараў, таму іх прасьледавалі не агульнымі правамі, але па спэцыяльных распараджэньнях у залежнасьці ад абставін часу.

Бяручы агульна, выпадкі прасьледаў хрысьціян былі больш частымі на правінцыі, чым у сталіцы й другіх большых гарадох імпэрыі. У гарадох хрысьціяне былі пад большай кантроляй урадаў і вялі сябе стрымана, чаго не было на правінцыі.

Прасьлед за Дыяклетыяна й Галерыя працягваўся восем гадоў. Быў гэта апошні і бадай найбольш суровы прасьлед, ад якога пацярпелі хрысьціяне з рук рымскіх імпэратараў і цэзараў. Аднак не змаглі яны зьнішчыць Хрысьціянскай царквы. Гэта сьведчыць аб тым, што хрысьціянская вера насіла ў сабе неперамożную сілу, большую за рымскіх імпэратараў. Многа зьнішчылі хрысьціян, многа разбурылі іхняй маёмасьці, сьвятыняў, абшчынаў, аднак не змаглі зьнішчыць самое веры. Яна засталася жыць і жыве на нашага часу. Факт, што многа хрысьціян пакланілася паганскім багам са страху й паддаліся волі цэзара ня значыць, што яны страцілі веру ў свайго Бога. Многа іх вярнулася назад да царквы.

Падобна сьвятару Навацыяну, пасьля прасьледу хрысьціян Дэцыем (249-251), прасьлед Дыяклетыяна й Галерыя ўвёў немалую варожасьць і сярод хрысьціян. Некаторыя з тых хрысьціян, якія стойка стаялі пры сваёй веры й зносілі пакуты, выступалі супраць тых хрысьціян, што пад страхам рэпрэсіяў адступілі ад свае веры, а пасьля прасьледу пачалі вяртацца назад у царкву. Супраць іх выступіў асабліва епіскап Данат з Карфагену.

Данат утварыў сваю так званую „праўдзівую царкву", меў сваіх вернікаў і вёў вострае змаганьне супраць „здраднікаў" хрысьціянскай веры. Царква данатыстаў розьнілася ад іншых хрысьціянскіх цэркваў тым, што была звонку белая, чыстая, але змаганьне яе вернікаў са сваімі праціўнікамі было бруднае, чорнае, нязгоднае з навукай Хрыста й таму кампраметавала ягоную сэкту.

Каб прывесьці данатыстаў да сапраўднай Царквы, многа духоўных працавала над гэтым з падтрымкай дзяржавы, але вынікі былі марныя. Тады тэоляг Заходняй царквы сьв. Аў-

густын прыйшоў да перакананьня, што данатыстаў ня дасца навярнуць інакш як толькі фізычнымі мерамі. Быў ён першым з Айцоў Царквы, які апрабаваў фізычныя сродкі й пасьля быў абраны патронам інквізыцыі.

У 412 годзе імпэратарскі эдыкт загадаў разьвязаць сэкту данатыстаў у Афрыцы. Канец ім палажыла арабская інвазія ў 637 годзе.

Варта яшчэ прыпомніць, што першымі ворагамі хрысьціянскай веры былі жыды. Іхняя вера талеравалася рымскімі ўладамі ў той час, калі вера хрысьціян прасьледавалася. Яшчэ да новай эры жыды атрымалі прывілеі, якія баранілі іх ад прасьледу й не змушалі іх прыносіць ахвяры цэзару, а мелі складаць „ахвяру Богу за цэзара", але гэта іх не задавальняла.

Укрыжаваўшы Хрыста, жыды прадаўжалі сваю вайну супраць хрысьціян. Іхні наступ на хрысьціян быў-бы яшчэ мацнейшы, каб Ціт не разрушыў жыдоўскае сьвятыні ў Ерусаліме ў 70 годзе й не разагнаў жыдоў па ўсёй імпэрыі, што пасьля паўтарыў у 135 годзе Адрыян. У гэтых жыдоўскіх рэвольтах хрысьціяне ўдзелу не прымалі й за гэта жыды называлі іх здраднікамі.

Аднак і пасьля зьнішчэньня Ерусаліма, дзе-б жыды не апынуліся, яны ў сваіх сынагогах уводзілі ў малітвы антыхрысьціянскія дадаткі, якія пацьвярджалі іхнюю нянавісьць да хрысьціян.

Зь цягам часу хрысьціянства разыходзілася з юдэйствам, але варожасьць не слабела, часта ўзмацнялася. У казаньнях Яна Златавуснага, сказаных у Антыёхіі ў 387 годзе, прабіваюцца абвінавачаньні хрысьціян скіраваныя супраць жыдоў. Ды нават дзяржаўная адміністрацыя не заўсёды ветліва глядзела на іх. У 413 годзе збунтаваны народ Александрыі выгнаў жыдоў з гораду. Як бачым, карта гісторыі павярнулася так, што хрысьціяне пачалі прасьледаваць жыдоў за грахі іхніх продкаў, а галоўна за ўкрыжаваньне Хрыста. Жыды няраз цярпелі за свае грахі й церпяць далей, як сказана ў Евангельлі: „Кроў Яго на нас і на дзецях нашых" (Мць. 27:25).

(„Голас Часу" № 19 (4), Лёндан, 1992 г.)

Канстанцін Вялікі — першы хрысьціянскі імпэратар

Канстанцін нарадзіўся 27 лютага ў Нішы (Югаславія), але год ягонага нараджэньня ня ёсьць пэўны. Традыцыйна прынята лічыць 274 год. Бацька Канстанціна, Канстанцый, празваны Хлорам, быў адным з больш здольных генэралаў, а маці Галена была звычайнай жанчынай.

Свае юнацкія гады Канстанцін правёў на двары імпэратара Дыяклетыяна як заложнік і разам зь імпэратарам аб'язджаў усходнія правінцыі імпэрыі. У паваротнай дарозе зь Егіпту, у кампаніі 295-296 гадоў, Канстанцін, праязджаючы праз Кесарыю, запазнаўся зь дзейнасьцю маладога хрысьціяніна Яўсевія. Пазьней гэты Яўсевій будзе епіскапам Кесарыі й першы напіша біяграфію Канстанціна. Два гады пазьней мы знаходзім Канстанціна пры баку Дыяклетыяна ў паходзе на пэрсаў.

Падарожжа Канстанціна па Сярэднім Усходзе дало яму магчымасьць запазнацца з рознымі народамі, спосабам іхняга жыцьця й прыгледзецца бліжэй да хрысьціянскай справы. Як навочны сьведка, Канстанцін добра запазнаўся з абставінамі ня толькі ў імпэрыі, але й у імпэрскім палацы, зь якога ішла антыхрысьціянская прапаганда. Маючы пятнаццаць гадоў, Канстанцін уступіў у армію й за два гады быў ужо „трыбунам першага рангу", што раўняецца большменш генералу брыгады.

У часе падзелу імпэрыі Дыяклетыянам, Канстанцыя Хлора, бацьку Канстанціна, у 293 годзе назначылі цэзарам на Захадзе Эўропы. У той час ня быў гонар для цэзара мець жонку зь нізоў і таму Канстанцый разьвёўся са сваёй жонкай Галенай, якая паходзіла зь Віфініі. Сын Канстанцін падзяляў прыкрае становішча маткі, што мела свой уплыў і на яго вайсковую кар'еру ў арміі Галерыя на Ўсходзе. Канстанцін быў высокі, прыстойны, ветлівы й карыстаўся аўтарытэтам у радох арміі, што не зусім падабалася Галерыю, які пасылаў яго на небясьпечныя выправы.

1 траўня 305 году Дыяклетыян здаваў абавязкі імпэратара з прычыны хваробы. У часе гэтае цырымоніі Канстанцін стаяў на плятформе каля Дыяклетыяна. Усе спадзява-

ліся, што імпэратар вызначыць яго цэзарам, а бацьку яго зробіць першым аўгустам. Нават у Александрыі выбіта была манэта з надпісам „Канстанцін цэзар", але ў апошнюю хвіліну Дыяклетыян памінуў Канстанціна й яго бацьку, а на першага аўгуста вызначыў Галерыя (305-311) і на дапамогу яму вызначыў двух цэзараў — Максіміяна Дая й Сэвэра, якія былі сваякамі Галерыя.

Калі аўгустам стаў Галерый, Канстанцін знаў, што яго чакае вялікая непрыемнасьць, а нават небясьпека. Аб гэтым знаў добра таксама бацька Канстанціна й таму слаў пісьмы ў Нікамэдыю, каб як найхутчэй выпусьцілі сына Канстанціна, бо ён ёсьць цяжка хворы.

Галерый не хацеў выпушчаць з рук заложніка й чакаў сьмерці Канстанцыя, каб паставіць на яго месца свайго чалавека, а Канстанціна зьнішчыць. Галерый пабойваўся й даў Канстанціну пісьмовы дазвол пакінуць Нікамэдыю. Больш дакладныя інфармацыі аб падарожжы Галерый меў даць Канстанціну на другі дзень рана. Гэтыя інфармацыі маглі быць пасткай для Канстанціна. Таму, не чакаючы раніцы, Канстанцін вечарам ціха ўцёк зь Нікамэдыі да бацькі й на кожнай паштовай станцыі браў сьвежыя коні. Такім спосабам Канстанцін уцёк на Захад да свайго бацькі.

Разам з бацькам і ягоным войскам Канстанцін прыбыў у Брытанію. Неўзабаве, 25 ліпеня 306 году, памёр бацька Хлор і ягонае войска ў Англіі прагаласіла Канстанціна цэзарам, а ў 308 годзе — аўгустам.

Згодна праву, першым аўгустам у імпэрыі быў Галерый і ён меў назначаць цэзара на Захадзе. А тым часам войска прагаласіла Канстанціна ня толькі цэзарам, алі й аўгустам, што азначала вайну з Галерыем. Але дарадчыкі Галерыя параілі яму прызнаць Канстанціна цэзарам, а не аўгустам, што ён зрабіў дзеля захаваньня міру.

Але ў тым часе зьявілася двух новых кандыдатаў на трон цэзара: стары Максіміян, які зноў захацеў улады й ягоны сын, Максенцій. Такім чынам было ўжо не чатыры, але шэсьць цэзараў. Галерый не прызнаў Максіміяна й дабраў сабе на Ўсходзе яшчэ аднаго цэзара — Ліцынія.

Канстанцін прыбыў у Францыю, дзе падтрымаў яго былы імпэратар Максіміян. Неўзабаве Канстанцін ажаніўся

зь яго дачкой Фаўстай, якая была сястрой Максенція, які валодаў Рымам. Па сьмерці бацькі Максіміяна, сын Максенцій парваў саюз з Канстанцінам і заключыў новы з усходнім цэзарам Максіміянам Даям.

Для Канстанціна быў гэта крытычны момант. Максенцій знаходзіўся ў намнога лепшай гаспадарчай і мілітарнай сытуацыі. Ён меў запасы зерня, новыя абаронныя сьцены ахоўвалі Рым, ды меў большую армію, чым Канстанцін.

Баявы шлях Канстанціна з Англіі ў Рым быў для яго добрай школай. Розныя хваробы, перажываньні й іншыя цяжкасьці, зьвязаныя з барацьбой германскіх плямёнаў, схілілі Канстанціна на бок хрысьціянства. Да гэтага часу быў ён паклоньнікам бога сонца — Апалона.

Перад вялікім боем з пераважаючымі сіламі Максенція пры Мальвійскім мосьце, недплёка Рыму, Канстанцін бачыў на небе здань. Аб гэтым ён так расказваў: „Было папаўдні, сонца садзілася, азначала надыход вечара. Я глянуў у бок сонечных праменьняў і на дзіва ўбачыў ясны крыж над сонцам з надпісам: „Гэтым знакам пераможаш". Я ня знаў што гэта значыць".

Гэтае ночы яму прысьніўся той самы крыж і тады ён зразумеў значэньне крыжа й прыняў яго без ніякіх тлумачэньняў і загадаў сваім жаўнерам зьмясьціць на шчытох знак крыжа. У вялікім баі, які адбыўся 28 кастрычніка 312 году, Канстанцін атрымаў вялікую перамогу над многа большай арміяй Максенція, якая дала яму веру ў хрысьціянскага Бога.

Ад гэтага часу крыж стаўся вялікім сымбалем хрысьціянскай веры — ня так у сэнсе паніжэньня Хрыста, як і Ягонай перамогі. Аднак Канстанцін увайшоў у Рым не хрысьціянінам, а яшчэ паганінам і паклоньнікам бога Апалона.

Тут многа гісторыкаў застанаўляецца над асобай Канстанціна й ня вельмі вераць у здань крыжа, які яму паказаўся ўдзень і ўначы. Нават тагачасны айцец царквы Яўсевій Кесарыйскі, апісаючы жыцьцё Канстанціна й яго барацьбу з Максенціем, нічога аб гэтым не ўспамінае.

Мы мала знаем пра арганізацыйныя здольнасьці Канстанціна ў яго першых гадах адміністрацыі (306-312), але можна вынесьці ўражаньне, што быў ён добрым кіраўніком, які памятаў аб людзях і ўмеў падысьці да іх.

Народ Рыму вітаў Канстанціна энтузыястычна й вітаў яго сэнат, хоць ня знаў яго сапраўдных замераў і быў гэтым насьцярожаны. Насьцярожанасьць гэта хутка разьвеялася, калі Канстанцін аднёсься да сэнату з павагай і захаваў старадаўнюю традыцыю. За гэта сэнат прысвоіў яму званьне „Максімус Аўгустус", што значыць найбольшы, або першы аўгуст. Такі тытул рабіў Канстанціна фармальна галавой імпэрыі й выказьнікам сымвалічнай еднасьці імпэрыі. Аднак, не зважаючы на гэта ўсё, Канстанцін разумеў, што без саюзу з Хрысьціянскай царквой яму будзе цяжка стацца ўлараром імпэрыі.

Як падаюць некаторыя гісторыкі, Канстанцін, пакуль прыняць рашэньне адносна хрысьціянскай веры, паведаміў матку Галену. Такую навіну маці прыняла холадна, бо была паганкай, але мела сымпатыю да веры жыдоў. Сын знаў аб гэтым і запрасіў матку з рабінамі да сябе. Неўзабаве ў Рыме, у прысутнасьці Галены, Канстанціна й запрошанага жыдоўскага й хрысьціянскага духавенства, засеў і паганскі філёзаф. Вялікія тэалягічныя спрэчкі закончыліся тым, што Галена й яе жыдоўскія дарадчыкі прынялі хрысьціянства. Але іншыя гістарычныя крыніцы падаюць, што 63-гадовая маці Канстанціна раней была хрысьціянкай.

Пазьней, у 326-327 гадох, Галена, будучы 72-гадовай жанчынай, наведала Сьвятую Зямлю, дзе епіскап Ерусаліма, Макарый, пазнаёміў яе зь мясьцінамі, па якіх хадзілі Хрыстос і апосталы. Паводле традыцыі, Галена знайшла крыж, на якім расьпяты быў Хрыстос. Як знайсьці гэты крыж ёй было сказана ў сьне. А каб адрозьніць яго ад двух іншых крыжоў, на якіх былі расьпяты разбойнікі, на крыж палажылі паміраючыую жанчыну, якая цудам вярнулася да здароўя. Галена сказала падзяліць дрэва крыжа на тры часьці: адну меў атрымаць Рым, другую — Канстантынопаль, а трэцяя частка мела застацца ў Ерусаліме. Пасьля пачалося далейшае дзяленьне дрэва крыжа.

На радзіме Хрыста Галена пабудавала цэрквы на Галгофе, на Елеонскай гары, у Віфляеме й другіх мясцовасьцях. Дзе Галена не завітала, памагала бедным і аказвала ласку пацярпеўшым у бядзе.

Вярнуўшыся зь вялікага падарожжа да сына ў Канстантынопаль, Галена неўзабаве памерла маючы 80 гадоў. Па-

хавалі яе ў Рыме, дзе жыла даўжэйшы час. Канстанцін ушанаваў памяць маткі. Казаў паставіць яе статую, назваць яе родны горад Дрэпанэ яе імем і нават правінцыю назваў Галенапонтам. За сваю дзейнасьць у карысьць хрысьціянскай справы Галена Ўсходняй і Заходняй цэрквамі была прызнана сьвятой. А Яўсевій у сваёй „Гісторыі Царквы" ўспамінае, што Галена малілася ў царкве ў прысутнасьці ўсіх, хадзіла скромна апранута, упрыгожвала цэрквы й капліцы ў гарадох і вёсках.

Канстанцін і яго сям'я ніколі не маглі забыцца хрысьціянскага Бога, Мульвійскага мосту й тых дасягненьняў, якія яны атрымалі дзякуючы хрысьціянству. За гэта ў першую чаргу Канстанцін пабудаваў у Рыме Лятэранскі палац для мясцовага духавенства й катэдру — Базыліку Канстанціна. Была гэта вялікая катэдра (75 х 55 мэтраў), багата ўпрыгожаная ўнутры срэбрам і золатам.

Аднак хрысьціянская справа для Канстанціна была рызыкоўным крокам. Яму, як рымскаму імпэратару, трэба было зрачыся старой шматвяковай рымскай паганскай традыцыі, каб прыняць хрысьціянскую веру, якую вызнаваў толькі кожны дзесяты грамадзянін ды й той быў нізкага клясу. Большасьць насельніцтва імпэрыі састаўлялі пагане, якіх рэпрэзэнтавалі таксама пагане сэнатары, — найбольш адукаваныя клясы народу. Так, што быў гэта сапраўды рызыкоўны для Канстанціна крок, аднак ён на яго адважыўся. Быў гэта зваротны пункт у гісторыі ня толькі Рымскай імпэрыі, але ўсяе Эўропы.

Канстанцін бачыў прасьлед хрысьціян за Дыяклетыяна й Галерыя й знаў, што гэтае веры не ўдасца выкараніць. Таму ён пастанавіў мець добра сарганізаваную й стойкую меншасьць, як бяздушную большасьць. Канстанціну патрэбны быў духовы саюзьнік у арганізацыі новай імпэрыі, якую ён падымаў з руінаў. Ня можна сказаць, каб Канстанцін быў вельмі рэлігійны, але быў ён чулы на рэлігійныя пераканаьні хрысьціян і таму пайшоў ім на кампраміс і разам з цэзарам Ліцыніем 13 чэрвеня 313 году выдаў прыказ, так званы „Мілянскі эдыкт" аб рэлігійнай талеранцыі, у якім гаварылася: „Нікому, хто ён ня быў-бы не павінна забараняцца свабодна вызнаваць, ці гэта будзе рэлігія хрысь-

ціян, ці якога іншага культу, калі хто з уласнай волі ўзнаў яе за адпаведную сабе".

Адначасна хрысьціянам зьвярталася іхняя сканфіскаваная маёмасьць. Некаторыя гісторыкі падаюць, што рэскрыпт „Мілянскі эдыкт" быў сфармуляваны не ў Міляне, а ў Нікамэдыі.

У наступным 314 годзе Канстанцінам выдадзены былі два рэскрыпты для намесьнікаў у Афрыцы, каб падтрымоўвалі хрысьціянства. Быў гэта добры пачатак, які варажыў прышласьць хрысьціянству.

Крыху раней сын Максіміяна, Максенцій, які ў 307 годзе стаў цэзарам у Рыме, таксама выдаў эдыкт аб рэлігійнай талеранцыі й сказаў вярнуць хрысьціянам іхняе царкоўнае дабро й умясьціць знак крыжа на манэтах. Так, што ад Канстанціна Хрысьціянская царква атрымала сьпярша афіцыйны статут талеранцыі й больш нічога. Але гэтым ужо актам Канстанцін даў знаць, што нягледзячы на большасьць сваіх грамадзянаў, якія былі паганамі, яго сымпатыі знаходзіліся па баку хрысьціян. Хто хацеў мог адкрыта вызнаваць хрысьціянскую веру й карыстацца тымі самымі правамі, што й вернікі іншых рэлігіяў. Справа станавілася пэўнай, што хрысьціянства будзе абвешчана дзяржаўнай рэлігіяй імпэрыі. Канстанцін меў на ўвазе выкарыстаць хрысьціянства як галоўную спружыну свае палітыкі.

У гэтым часе Канстанцін паводзіў сябе асьцярожна як у сваіх адносінах да хрысьціян, так і да паганаў. Ён ня быў яшчэ поўным гаспадаром імпэрыі й яму патрэбна была падтрымка як адных, так і другіх. Па сьмерці Галерыя (311) засталося чатырох імпэратараў. Канстанцін валодаў Галіяй і Брытаніяй, Максенцій — Італіяй, Гішпаніяй і Афрыкай; Ліцыній — Ілірыяй, Грэцыяй і Тракіяй, а да Максіміяна Даі належала ўсё за Босфарам. Паміж гэтымі часткамі імпэрыі ня мог завязацца сапраўдны саюз, паколькі кіравалі імі людзі адменнага характару й намераў. Таму Канстанцін, хоць надаў хрысьціянству юрыдычны статус, у сваіх паводзінах быў асьцярожны. Толькі ад 318 году можна заўважыць зварот Канстанціна ў бок хрысьціян, калі пачалося абмежаваньне паганскіх практык.

У 321 годзе Канстанцін загадаў сьвяткаваць нядзелю, якую хрысьціяне ўшаноўвалі як дзень уваскрэшаньня Хры-

ста. У 322 годзе Канстанцін назначыў двух хрысьціянскіх прадстаўнікоў консуламі ў сэнаце й зьнёс з манэтаў адбітак „непераможнага сонца". У 323 годзе пасады консула атрымалі людзі з хрысьціянскімі дактрынамі. І так, паступова, хрысьціяне ўваходзілі й пераймалі ў свае рукі адміністрацыйныя ўстановы.

У той час, калі Канстанцін на Захадзе імпэрыі надаваў хрысьціянам прывілеі і рабіў іх раўнапраўнымі грамадзянамі дзяржавы, яго праціўнік на Ўсходзе, Ліцыній, пачаў прасьледаваць хрысьціян і нават караць сьмерцю. Нягледзячы на сваяцтва (Ліцыній быў жанаты зь сястрой Канстанціна) і на выдадзены разам „Мілянскі эдыкт" (313), усё-такі паміж імі дайшло да вайны. Канстанцін умясьціў на сваіх сьцягох манаграму Хрыста, а Ліцыній выступіў як абаронца старой паганскай веры.

У 324 годзе Канстанцін канчаткова перамог свайго палітычнага й рэлігійнага праціўніка Ліцынія й стаў поўным гаспадаром Рымскай імпэрыі ды заснавальнікам новай эры. Цяпер ён мог выдаць пісьмо да ўсіх сваіх жыхароў усходняй правінцыі, у якім заявіў, што яго перамога зьяўляецца Божым судом над паганамі. Адначасна ўсе хрысьціяне, якія былі прасьледаваныя за Ліцынія, атрымалі свабоду, маёмасьць і пасады, якія ад іх адабралі за рэлігійныя перакананьні.

У гэтым-жа 324 годзе Канстанцін прызнаў хрысьціянства дзяржаўнай рэлігіяй і між іншым напісаў: „Хай тыя, каторыя ўсьцяж трымаюцца ў блудзе паганства, будуць абнятыя мірам і апекай як і тыя, каторыя вераць".

З гэтай заявы відаць, што Канстанцін, хоць прызнаў хрысьціянства дзяржаўнай верай, памінуў спосаб прымусовага наварачваньня пагнаў на хрысьціянства, а толькі пакінуў іх у „міры й апецы, як і тых, каторыя вераць". Гэта ясна сьведчыць, што Канстанцін быў чалавекам памяркоўным, не шукаў канфрантацыі й прымусу, толькі лічыўся зь людзьмі й іхнімі рэлігійнымі перакананьнямі.

У IV стагодзьдзі афармялецца арганізацыйная структура Царквы. Паўстаюць вялікія арганізацыйныя цэнтры: Александрыя — для Егіпту; Карфаген — для Афрыкі; Антыёхія — для Сыріі; Ерусалім — для Палестыны; Рым — для Італіі. А малады яшчэ, але дзейны хрысьціянскі цэнтр у ста-

ліцы імпэрыі Канстантынопалі, узяў на сябе вядучую ролю ў жыцьці Ўсходняй царквы. Сталася гэта ў сувязі зь перанясеньнем сталіцы Рымскай імпэрыі з Рыму ў Канстантынопаль. Мяняліся палітычныя абставіны й зь імі мянялася становішча Хрысьціянскай царквы.

Складаліся спрыяльныя абставіны для будучай Царквы. Калі на пачатку IV стагодзьдзя хрысьціяне прадстаўлялі сабою пераважна беднату, Царква ня мела зь іх матэрыяльнай карысьці. Але цяпер было інакш. Прызнаньне юрыдычнага статусу Царкве давала бедным хрысьціянам магчымасьць займаць дзяржаўныя пасады, а багатым — прымаць хрысьціянства. Колькасьць хрысьціян узрастала аўтаматычна. Але сярод самых хрысьціян пачалася неталеранцыя й разьбіцьцё на розныя сэкты, якіх у IV стагодзьдзі налічвалася каля двух соцень. І тут хрысьціяне няраз разьміналіся са сваёю хрысьціянскаю любоўю, калі вялі між сабою вострую палеміку, якая даводзіла да боек.

Немагчыма было прывесьці іх кіраўнікоў да еднасьці імпэратарскім загадам, бо-ж раней імпэратарскія загады (эдыкты) аб рэпрэсіях не маглі стрымаць разьвіцьцё хрысьціянства. Трэба было шукаць нейкай дарогі разьвязкі ў гэтым пытаньні. Разьбіцьцё хрысьціянства на сэкты магло лёгка выклікаць унутраныя беспарадкі й прывесьці да бунту, бо ўжо наглядаліся рэлігійныя хваляваньні сярод хрысьціян.

Галоўнай прычынай гэтых беспарадкаў была навука сьвятара Арыя, які паходзіў зь Лібіі, а вучыўся ў Антыёхіі. Быў гэта здольны й уроджаны кіраўнік сэкты, які рашуча даказваў розьніцу паміж Богам Айцом і Богам Сынам. Гэрэзія Арыя пагражала небясьпекай для маладой Царквы, якая ня мела яшчэ свае адпаведна афармленай тэалёгіі.

Супраць гэрэзіі Арыя востра выступаў епіскап Аляксандар з Александрыі. Зробленыя мясцовыя захады па прымірэньні царкоўных непаразуменьняў ня мелі посьпеху. Нават да імпэратара Канстанціна ішлі скаргі з двух старон, просячы ў яго дапамогі. Канстанцін не разумеў дагматычных розьніцаў, але каб захаваць рэлігійны спакой у імпэрыі, выслаў пісьмо да епіскапа Аляксандра й Арыя, у якім прасіў, каб яны дайшлі да паразуменьня, але паразуменьня не было відаць.

Крыху пазьней імпэратар разабраўся ў царкоўнай гэрэзіі, зразумеў яе праблемы й пастанавіў склікаць агульны сабор зь як найбольшым удзелам хрысьціянскіх прадстаўнікоў, каб на ім прывесьці Хрысьціянскую царкву да еднасьці.

(„Голас Часу" № 20 (5), Лёндан, 1992 г.)

Першы экумэнічны сабор

Наданьне імпэратарам Канстанцінам Хрысьціянскай царкве юрыдычнага стутусу, пасьля яе жорсткага прасьледу Галерыем, сталася зваротным пунктам у гісторыі Царквы й Эўропы. Але хрысьціянства ўжо раней уступіла ў працэс падзелу на варожыя сабе сэкты, якія пачалі між сабою сваркі. Таму Канстанцін пастанавіў склікаць сабор епіскапаў, каб на ім устанавіць парадак герархаў і надаць Хрысьціянскай царкве праўныя формы.

Імпэратар меў свае пляны адносна Хрысьціянскай царквы. Ён не задавальняўся толькі ахоўваньнем хрысьціянства, аказваньня яму ласкі й прывілеяў, але хацеў зрабіць яго дзяржаўнай рэлігіяй імпэрыі. Паколькі, аднак, хрысьціяне былі пасвараны між сабою, таму Канстанціну трэба было сьпярша навесьці парадак сярод епіскапаў. Цікава, што Канстанцін, будучы раней у Рыме й ведаючы рымскага папу, не даручыў яму гэтай справы, а сам узяўся за навядзеньне парадку. Інакш кажучы, імпэратар памінуў папу, бо-ж папа ў той час меў такі самы голас у царкоўных справах як і кожны іншы епіскап. Аўтарытэт імпэратара стаяў вышэй за папу й іншых епіскапаў і ў даным выпадку аўтарытэт імпэратара сярод пасвараных епіскапаў меў свой важкі голас. Таму Канстанцін сам заняўся скліканьнем сабору епіскапаў, каб асьцерагчы маладую Хрысьціянскую царкву перад варожым падзелам на сэкты, якія ўжо вялі між сабою барацьбу.

Канстанцін асабіста запрашаў кожнага епіскапа прыбыць на сабор. У сваім лісьце ён пісаў: „Мае дарагія браты, — для ўсіх людзей павінна быць ясна, што для мяне нішто ня ёсьць больш важным як Божы страх. Вы ўжо плянуеце мець сынод у Галятыі. Зьмяніце свой плян. Прыедзьце ў Нікею, у горад Віфініі. Італьянскія й эўрапэйскія епіскапы ўжо

едуць. Едзьце ў Нікею, якая мае прыгожую пагоду й я асабіста змагу прыняць удзел у вашых дыскусіях".

Дзяржава пакрывала ўсе кошты падарожжа й утрыманьня ўдзельнікаў сабору. Епіскап Рыму Сыльвэстар па сваёй старасьці ня мог прыбыць на сабор, але прыслаў двух дэлегатаў — Віта й Вінцэнта. З Заходняй Эўропы было мала епіскапаў, быццам яны не надавалі вялікага значэньня сабору. Але на гэта ёсьць другія прычыны. Некаторыя епіскапы былі старыя й баяліся ехаць у далёкую дарогу, і таму не прыбылі на сабор. Усё-ж на сабор у Нікею зьявілася 318 епіскапаў, большасьць іх (270) была з усходніх правінцыяў, якім было бліжэй прыехаць. Прыехала нават пяць епіскапаў з-па-за імпэрыі — з Крыму, Арменіі й Пэрсыі.

Спатканьне ўдзельнікаў сабору было радаснае. Яны ніколі раней не спатыкаліся такой грамадой, а яшчэ ня так даўно іх каралі як злачынцаў. Цяпер яны спаткаліся як пераможцы свае хрысьціянскай веры й мелі магчымасьць пабачыць нават самога імпэратара й зь ім пагутарыць.

Першая сэсія сабору адбылася 20 траўня 325 году ў вялікай залі імпэратарскага палацу. На яе зьявіўся сам імпэратар Канстанцін у акружэньні сям'і й некаторых хрысьціянскіх прыяцеляў, без прыбочнай аховы. Прысутныя прывіталі яго ўстаўшы й селі на дадзены знак. З прывітальнай прамовай выступіў епіскап Кесарыі Яусевій. Пасьля яго прамовіў імпэратар на дзяржаўнай лацінскай мове, замест на царкоўнай — грэцкай. А гэта таму, што ён ня ведаў добра гэтай мовы, але сакратар перакладаў на грэцкую.

Прамова імпэратара зводзілася да неабходнасьці еднасьці й славы Хрысьціянскай царквы. Між іншым Канстанцін сказаў: „Гэта будзе прыкра, сапраўды вельмі прыкра, калі скончылася вайна й ніхто цяпер не аказвае супраціву, мы пачынаем атакаваць адзін другога, каб гэтым зрабіць прыемнасьць і сьмех для паганскага сьвету".

Але ўжо ў першым дню сабору, у часе перапынку, пачалі надыходзіць на рукі імпэратара пісьмы поўныя нараканьняў і ўзаемных абвінавачваньняў. Канстанцін абяцаў разгледзець гэтыя нараканьні, але неўзабаве сказаў: „Бог узяў вас да сьвятарства й даў вам аўтарытэт судзіць нават па-над намі. Таму вы ня можаце быць суджаны людзьмі". І тут-

жа загадаў спаліць усе пісьмы, так што ніхто ня знаў непаразуменьняў паміж айцамі сабору.

Саборам пераважна кіраваў сам Канстанцін. Хоць ня быў ён яшчэ поўным хрысьціянінам, але рабіў значны ўплыў на рашэньні й дзейнічаў як кіраўнік Царквы. У часе перапынкаў хадзіў ён сярод епіскапаў, гутарыў зь імі на сваёй слабой грэцкай мове й жартаваў. Калі Канстанцін быў заняты, функцыю старшыні выконваў епіскап Осія з Кардовы (Гішпанія). Яму й Александрыйскаму архіепіскапу Аляксандру, які прыбаў на сабор са сваім маладым сакратаром, архідыяканам Афанасіем, прыпісваецца вялікая роля ў працах сабору. Гэтаму маладому й здольнаму архідыякану належыць удзячнасьць за напісаныя ім дзьве працы аб Нікейскім саборы.

Дзейнасьць сабору праходзіла ажыўлена й часам некаторыя яго айцы траціліе над сабою кантроль. Былі на ім людзі розных тэалягічных і дагматычных поглядаў, перакананьняў і асабістых перажываньняў за веру яшчэ ня так даўно прасьледаваныя Дыяклетыянам, Галерыем і Даям. На ім можна было спаткаць інвалідаў без нагі, без рукі, асьлепленых на адно вока. Былі гэта ахвяры апошняга прасьледу за веру. Цяпер яны былі героямі, пераможцамі хрысьціянскай справы. Але сабор быў скліканы з прычыны ілжэвучэньня Арыя. Арый быў добрым прамоўцам, прасьвітарам у Александрыі, умеў добра гаварыць. Ён знайшоў сабе многа аднадумцаў. Але, калі Арый выступаў на саборы, адзін з прысутных ударыў яго па твары, другія затыкалі вушы і выходзілі з залы, каб ня чуць гэрэзіі старога чалавека. У ходзе дыскусіі гэрэзія Арыя, якая адмаўляла Боскую натуру Хрыста, была саборам асуджана, хаця фактычна яна толькі што пачыналася. І нягледзячы на тое, што навуку Арыя адкінулі раней епіскапы Лібіі й Ерусаліма, а цяпер у Нікеі, усёж яго падтрымоўвала нейкіх дваццаць айцоў сабору.

На саборы ўзгоднены былі формы для ўнівэрсальнай (каталіцкай) хрысьціянскай веры, каб празь яе забясьпечыць мір і супрацоўніцтва сярод народаў абшырнай імпэрыі. Яго ўдзельнікі ў сваіх працах карысталіся павучэньнямі сьвятых апосталаў. Гэтыя апостальскія павучэньні перадаваліся вусна Айцамі Цакрвы да IV стагодзьдзя. Пасьля яны былі сабраны ў адну кнігу пад назовам „Правілы Сьвятых Апосталаў",

якія ляглі ў аснову царкоўнага жыцьця. Нікейскі сабор палажыў здаровыя дагматычныя й кананічныя падваліны пад Хрысьціянскую царкву, якая заняла цэнтральнае становішча ў гісторыі артадоксіі й была прынята як права імпэрыі.

На Нікейскім саборы было яшчэ пастаноўлена сьвяткаваньне Вялікадня; дазвалялася сьвятарам, якія былі жанатыя, мець пры сабе жонак; і ўведзены былі іншыя правы зьвязаныя з жыцьцём Царквы. Нікейскі сабор таксама прызнаў гонар, а не ўладу, тром епіскапам: Антыёхскаму, Александрыйскаму й Рымскаму ды раўняў іх зь епіскапамі Ерусалімскай царквы.

25 ліпеня імпэратар Канстанцін абыходзіў дваццатую гадавіну свайго панаваньня й з гэтае нагоды зладзіў у сваім палацы прыём для ўдзельнікаў сабору. Урачыстасьць была адначасна закрыцьцём Першага Экумэнічнага сабору ў жыцьці Хрысьціянскай царквы. У часе прыёму Канстанцін зрабіў доўгую прамову, у якой высока ацаніў вынікі Нікейскага сабору й прасіў усіх прысутных захаваць вакол сябе спакой і не быць зайздроснымі.

Першы Экуменічны сабор закончыўся перамогай Канстанціна. Усе важнейшыя пытаньні былі разьвязаны згодна яго волі амаль аднагалосна. Устанавіў ён канфэдэрацыю паміж Усходняй і Заходняй цэрквамі й зьвязаў іх з дзяржавай на доўгія стагодзьдзі. У яго інтарэсе было прывесьці Царкву да еднасьці, нягледзячы на чыім баку была дагматычная праўда. Царкоўнай еднасьці хацеў ня толькі Канстанцін, але патрабавалі гэтага інтарэсы самой Царквы й імпэрыі, каб разам супрацоўнічаць.

На разьвітаньне Канстанцін асабіста ўручыў кожнаму епіскапу прэзэнт і імпэратарскі ліст да вернікаў. Удзельнікі сабору былі моцна ўзрушаны ветлівасьцю й гасьціннасьцю імпэратара й разьехаліся дамоў задаволеныя.

Тэкст сымбаляў нікейскай дактрыны падпісалі ўсе епіскапы за выняткам Феоны Мармарыцкага й Сэкунда Пталемаідзкага, якія разам з Арыем пайшлі на выгнаньне, а на касьцёр пайшла Арыева пісаніна. Зь Нікейскага сабору зьбераглісь толькі тры фрагмэнты: сымбаль веры, якога зьмест да сёньняшняга дня паўтараецца на хрысьціянскіх багаслужбах, тэкст 20 канонаў і саборны дэкрэт. Акты Нікей-

скага сабору склалі больш за 40 тамоў й былі разасланыя па розных цэрквах.

Канстанцін адсьвяткаваў сваё дваццацігодзьдзе панаваньня 25 ліпеня 325 году ў Нікамэдыі ў часе закрыцьця абрадаў сабору. А паколькі такія ўрачыстасьці адбываліся зазвычай у старажытнай сталіцы імпэрыі, таму Канстанцін хацеў паўтарыць яе ў Рыме, куды прыехаў 18 красавіка 326 году. Быў гэта яго апошні візыт у Рым. Многа ня ведаем аб яго ходзе, аднак згадваюцца некаторыя непаразуменьні паміж імпэратарам, сэнатам і насельніцтвам. Гэты элемэнт гораду Рыму захоўваў паганскія традыцыі й хацеў схіліць да іх Канстанціна. І, магчыма, што гэтае непаразуменьне выклікала ў Канстанціна гнеў да гораду, у выніку чаго ён наважыўся пабудоваць новую сталіцу над Босфарам.

Да прынятых у Нікеі пастаноў Канстанцін застаўся верным да сьмерці. Пасьля сьмерці яго палітыка мела посьпех. Як шчыры прыяцель хрысьціянства, Канстанцін пашыраў яго па ўсёй імпэрыі, будуючы храмы ў Эўропе, Азіі й Афрыцы. Пры ім пачаўся новы этап у гісторыі Ерусаліма й ягонай Царквы, якім Канстанцін вярнуў папярэднюю годнасьць. Да гэтага часу Ерусалім і Сьвятая Зямля сталіся месцам паломніцтваў хрысьціян з усіх канцоў сьвету. Некаторыя з гэтых паломнікаў, хочучы пасьвяціць сваё жыцьцё царкоўнай справе, засталіся жыць у Палестыне. Да іх можна залічыць Ерамію, які жыў у пячоры недалёка Віфляема й займаўся перакладам Бібліі на лацінскую мову, ведамую пад назовам Вульгаты.

Канстанцін успамагаў Царкву фінансава, даў сьвятарам прывілеі й звольніў іх ад падаткаў. Яго прыклад насьледавалі іншыя імпэратары й багатыя гараджане, якія неўзабаве зрабілі Канстантынопаль сапраўднай метраполіяй хрысьціянства, толькі не сумелі яго аб'яднаць і абараніць.

Аднак некаторыя гісторыкі выказваюць сумніў наконт рэлігійнасьці Канстанціна. Адны бачаць у ім апартуніста, другія здагадваюцца, што здань крыжа перад Мульвійскім мостам у Рыме пераканала яго ў хрысьціянскай веры. Больш верагодна, што Канстанцін, бачучы стойкасьць хрысьціян, абапёрся на іх дзеля еднасьці імпэрыі. І не выключаецца той факт, што Канстанцін быў стойкім хрысьціянінам, бо

калі даведаўся аб прасьледзе хрысьціян у Пэрсіі, то напісаў доўгае пісьмо пэрсідзкаму манарху Сапору, у якім паказаў ролю хрысьціянства, яго вядучых людзей і тыя няшчасьці, якія напаткалі прасьледавацеляў хрысьціян.

Пісьмо Канстанціна падзейнічала на Сапора й ён спыніў прасьлед, але пасьля яго сьмерці новы манарх аднавіў прасьледаваньні хрысьціян.

Прыклады паказваюць, што Канстанцін паступаў згодна навукі Хрыста аж да свае сьмерці, але кіруючы такой абшырнай імпэрыяй цяжка было быць добрым імпэратарам і хрысьціянінам.

(„Голас Часу" № 22 (1), Лёндан, 1993 г.)

Сьмерць Канстанціна Вялікага

Нягледзячы на тое, што Канстанцін быў пашыральнікам хрысьціянства, усё-ж ён сам прыняў яго позна, на ложы свае сьмерці й прыняў яго ад арыянскага епіскапа, хоць сам не падтрымоўваў гэтай навукі. На такі паступак мы не знаходзім адказу. А па-другое, не прымаў хрысьціянства раней таму, каб не рабіць прыкрасьці паганам, якіх было больш у імпэрыі чым хрысьціян, а таксама, запазнаўшыся з хрысьціянскай навукай, Канстанцін ня мог выканаць яе годна, займаючы пасаду імпэратара. У даным выпадку Канстанцін добра зрабіў, што рана не прымаў хрысьціянства, бо некаторыя яго паступкі не адпавядалі хрысьціянскай навуцы й маглі-б выклікаць незадаваленьні сярод паганаў. Немагчыма было імпэратару ў такой вялікай дзяржаве не прымаць часам строгіх мер і таму, замест грашыць, Канстанцін адкладаў сваё хрышчэньне на старасьць, але сваіх дзяцей выхоўваў у хрысьціянскай веры. У той час быў звычай, што людзі не прымалі хрысьціянства адразу. Трэба было прайсьці пэўную падрыхтоўку, запазнацца з катэхізмам і часам гэта цягнулася да двух гадоў. Вынятак рабілі для цяжка хворых, якіх адразу прымалі ў хрысьціянства.

Пасьля свайго хрышчэньня на Вялікдзень 337 году Канстанцін адмовіўся надзець імпэратарскія фіялетавыя шаты й застаўся ў белых, у якіх яго хрысьцілі.

Паводзіны Канстанціна як імпэратара, падобна кожнаму чалавеку, не заўсёды былі ідэальныя. Але пры Канстанціне больш не расьпіналі нявольнікаў на крыжы, не ламалі ім ног за кару, не закоўвалі ў цесныя кайданы й не разьбівалі сем'яў пры зьмене гаспадара або пры падзеле гаспадаркі.

Праўда, пры Канстанціне згадваецца дыскрымінацыя жыдоў, нішчэньне хрысьціянамі сынагогаў і т.п. Тлумачыцца гэта помстай за ўкрыжаваньне Хрыста і іншыя крыўды, зробленыя жыдамі на працягу стагодзьдзяў дамінацыі над хрысьціянамі. Таксама трэба згадаць, што ў сям'і Канстанціна былі трагедыі ў 326 годзе.

Сам Канстанцін не лічыў сябе сьвятым, як гэта рабілі некаторыя рымскія паганскія імпэратары, а ўважаў сябе за чалавека зь місіяй. Усё, што ён хацеў, гэта ўтрымаць Рымскую імпэрыю й Хрысьціянскую царкву ў цэласьці, якія мелі тварыць дзяржаўны арганізм.

У сваёй хрысьціянскай дзейнасьці Канстанцін быў увесь час асьцярожны, стараўся захоўваць тактыку. Хоць ён рашуча стаяў па баку хрысьціян, але не прасьледаваў паганаў за выняткам тых, якія востра выступалі супраць хрысьціянства. Стараўся ён схіліць паганаў да новай веры лагоднымі спосабамі. Канстанцін не падзяляў строгіх мер, гвалтаў і забойстваў, якімі карысталіся ягоныя папярэднікі супраць хрысьціян і гэтым унікаў праліцьця крыві сваіх грамадзян. Ён упэўнена верыў, што паганская вера з часам замрэ сама па сабе й уся імпэрыя будзе хрысьціянскай. Дзякуючы палітыцы Канстанціна, Рыма-Візантыйская імпэрыя знайшла ў хрысьціянскай веры надзейнага правадніка, а імпэратарскі абсалютызм — паважную маральную апору. І з часам сталася так, што ў шматлікіх паганскіх сьвятынях, дзе раней ушаноўвалі статуі цэзараў і іншых багоў, ад часу Канстанціна месца іх пачалі займаць абразы Хрыста й яго апосталаў.

Прадчуваючы сваю сьмерць, Канстанцін прыняў прычасьце й ціха сказаў: „У такім дню я чуюся сапраўды шчасьлівым. Бачу Божае сьвятло". Памёр Канстанцін на Сёмуху, у нядзелю 22 траўня 337 году ў Галенаполіс (Віфінія), пражыўшы амаль 64 гады. Забальзамаванае цела Канстанціна перавезьлі ў Канстантынопаль, каб зладзіць тут урачыстыя пахавіны. Цела першага хрысьціянскага імпэратара палажылі

ў залатую труну й прывезьлі ў цэнтральную залю палацу, дзе памерлы меў апошнюю сустрэчу. Вакол цела гарэлі тысячы сьвечак, а яго прыбочная варта стаяла са зброяй у залатых шлемах. Палацавая абслуга, афіцэры, генэралы, сэнатары й другія адміністратары імпэрыі прыйшлі сюды, каб аддаць апошнюю паслугу свайму імпэратару. Таксама доўгая чарга грамадзян, жанчын і дзяцей праходзіла каля цела нябожчыка, аддаючы яму пашану.

Пахавальную працэсію ўплянаваў сын Канстанціна, Канстанцый, які любіў цырымоніі. Ён вёў з палацу аддзел войска ў поўным баявым парадзе. Наступна несьлі залатую труну, якую акружалі аддзелы лучнікаў і цяжка ўзброенай пяхоты, а на канцы ішла маса народу. І так прынесьлі цела Канстанціна ў новапабудаваную царкву Сьвятых Апосталаў. Тут ганаровая варта й войска адступілі, а іх месца занялі сьвятары. Цела памерлага злажылі ў саркафагу. Так пахавалі імпэратара Канстанціна ў ягоным горадзе — сталіцы імпэрыі — Канстантынопалі.

Царкву Сьвятых Апосталаў збудаваў Канстанцін і ў ёй, сярод дванаццаці сымбалічных гробаў апосталаў, збудаваў сабе гроб як трынаццатаму апосталу. І ад гэтага трынаццатага гробу прынята Канстанціна называць „трынаццатым апосталам", або „роўнаапостальным".

Можна сказаць, што на працягу трыста гадоў вялася барацьба не паміж Рымскай дзяржавай і Хрысьціянскай царквой, але паміж боскасьцю імпэратара й боскасцю Хрыста. У канцы боскасьць Хрыста перамагла. Канстанцін зрабіў мір паміж хрысьціянамі й устанавіў новую Рымскую імпэрыю пад знакам крыжа ў Канстантынопалі. Аб гэтым сьведчаць шматлікія цэрквы пабудаваныя па ініцыятыве Канстанціна, які даў Царкве ўсё, чаго яна ня мела да яго — зямлю, багацьце, выдатныя будынкі, прывілеі й усебаковую падтрымку.

За заслугі для хрысьціянства Ўсходняя царква кананізавала Канстанціна і назвала яго Вялікім. Ворагі й пагане абвінялі яго ў зьнішчэньні старога парадку, а Заходняя царква прызнала Канстанціну толькі гонар закладчыка часовай улады папства, адмовіўшы яму ў званьні сьвятога, ды часам асуджала яго за паняволеньне Царквы дзяржавай.

У свой час Канстанцін пабудаваў у Рыме царкву побач Лятэранскага палацу — рэзыдэнцыі папаў і гэтую царкву назвалі яго імем — Базылікай Канстанціна, але пазьней папы перайменавалі яе на Базыліку сьвятога Яна й зрабілі катэдрай гораду. Заціраньне імя й годнасьці Канстанціна на Захадзе рабілася сьведама таму, што ён разбудаваў невялікую мясцовасьць, вёску Візантыён у вялікі горад, які ў яго гонар назвалі Канстантынопалем. Як казаў пасьля Канстанцін, Бог зьявіўся яму ў сьне й загадаў заснаваць новую рэзыдэнцыю. Гэтую рэзыдэнцыю — Канстантынопаль — Канстанцін зрабіў сталіцай сваёй імпэрыі й цэнтрам хрысьціянства, за што не маглі дараваць яму рымскія папы. Гэта пацьвярджае факт, што калі ў ліпені 326 году Канстанцін прыбыў у Рым, яму гараджане закідалі, чаму будуе канкурэнтны Рыму горад.

Як не стараліся праціўнікі панізіць асобу Канстанціна Вялікага й дрэннае аб ім пісаць, аднак гэтае яму не пашкодзіла. Канстанцін зьмяніў ход гісторыі й стаў першым хрысьціянскім імпэратарам на троне й за гэта належыць яму ўдзячнасьць. І слушна хрысьціяне ўважаюць яго за „трынаццатага апстала" або „роўнага апосталам".

У асобе Канстанціна Вялікага бачым чалавека вялікага палітычнага розуму, які добра знаў і разумеў праблемы народаў свае імпэрыі, ішоў ім насустрач і сумеў аб'яднаць іх у адну хрысьцінскую дзяржаву-імпэрыю без праліцьця крыві. Варта зьвярнуць увагу на яго тры рашэньні: 1) выданьне Мілянскага эдыкту; 2) заснаваньне Канстантынопаля й 3) скліканьне Нікейскага сабору. Мілянскі эдыкт аб рэлігійнай свабодзе, які быў выдадзены ў 313 годзе, рашыкальна зьмяніў становішча Хрысьціянскай царквы. Калі раней выступала яна супраць ураду зь яго паганскімі імпэратарамі, то цяпер стала на службу Рымскай імпэрыі зь яе хрысьціянскімі імпэратарамі.

Пачынаючы ад Канстанціна Вялікага хрысьціяне пачалі сьвяткаваць нядзелю замест суботы. Дату 25 сьнежня прынялі за дзень нараджэньня Ісуса Хрыста, а Ерусалім, які пры адбудове Адрыян назваў Аэліяй Капіталінай, зноў пачаў называцца Ерусалімам. Канстанцін зрабіў вялікі ўклад у справу ажыцьцяўленьня й пашырэньня хрысьціянства й яго ідэалаў.

Калі ходзіць аб Ерусалім, то будуць ці ня будуць хрысьціяне, ці ён будзе стаяць, ці як некалі быў разбураны рымлянамі, ён, а не Рым, як быў сьпярша, так і застанецца далей Маткай Хрысьціянскай царквы.

Аднак за Канстанціна Вялікага хрысьціянства ня сталася ўнівэрсальнай рэлігіяй. Вынятак рабіла Сырыя, Малая Азія й Александрыя, дзе хрысьціяне састаўлялі лічэбную колькасьць і былі больш вядомыя й актыўныя. Але на Захадзе імпэрыі хрысьціяне прадстаўлялі зьнікомую меншасьць. Дзейнічала яшчэ моцная сэкта Арыя й ня менш актыўнай была сэкта данатыстаў, якая мела сваіх мучанікаў за веру. Арыяне мелі падтрымку з боку імпэратарскага двара ў асобе сястры імпэратара Канстанцыі. Гэта яна пераканала брата вярнуць Арыя й некаторых яго памагатых з выгнаньня. Імпэратар хацеў далучыць яго да царквы ў Александрыі, але александрыйскі епіскап адмовіў прыняць гэрэтыка, які быў асуджаны ўсім саборам. Тады намячалася ўвесьці яго ў Канстантынопальскую царкву. Аднак і гэта не ўдалося. Як некаторыя кажуць, Божая кара — сьмерць спаткала Арыя ў дарозе ў царкву ў 336 годзе.

Дзейнасьць Канстанціна палажыла здаровыя асновы пад Хрысьціянскую царкву і дала ёй праўны ход. Гэтыя важныя фактары сталіся дадатнім дзейнікам для будучыні Царквы, імпэрыі й эўрапэйскай цывілізацыі. І таму ня будзе памылкай сказаць, што Канстанцін адкрыў новую эпоху, якую можна назваць Канстанцінскай. Была гэта эпоха, у якой барацьба паміж хрысьціянствам і паганствам была канчаткова разьвязана на карысьць Хрысьціянскай царквы, а асоба Канстанціна Вялікага сталася несьмяротнай.

(„Голас Часу" № 23 (2), Лёндан, 1993 г.)

Сыны Канстанціна й Юліян Апастат

Канстанцін Вялікі быў першым хрысьціянскім імпэратарам, які паставіў Хрысьціянскую царкву на моцны грунт, даў ёй магчымасьць свабоднага разьвіцьця й сам прымаў удзел у яе разьвіцьці. У апошніх гадох жыцьця Канстанціна й пасьля яго сьмерці хрысьціянскую дзейнасьць разгарнулі тры цэнтры: Канстантынопаль — цэнтр імпэрыі, які

стаўся другім Рымам; Ерусалім — першы апостальскі цэнтр хрысьціян і раньняя Царква ў Рыме. Ня менш важную ролю ў жыцьці хрысьціянскай веры адыгралі Александрыя й Антыёхія. Тут варта згадаць, што пасьля зьнішчэньня Цітам Ерусаліма ў 70 годзе, а пасьля Адрыянам у 135 годзе горад гэты страціў сваё рэлігійнае значэньне й толькі за Канстанціна Вялікага абудзіўся да жыцьця.

Пасьля паховін імпэратара Канстанціна Вялікага пару тыдняў захоўваўся спакой. Але неўзабаве пачалі хадзіць чуткі, што ў сьціснутым кулаку пакойнага Канстанціна знайшлі кавалак пэргаміну, на якім імпэратар абвіняў некаторых сваякоў у яго атручаньні й прасіў сваіх сыноў адпомсьціць. Была гэта сплянаваная правакацыя, каб пачаць ліквідацыю ня так ворагаў Канстанціна й ягоных сыноў, як будучых канкурэнтаў на імпэратарскі трон.

Два гады да сваёй сьмерці, у 335 годзе, Канстанцін падзяліў імпэрыю паміж трох сыноў. Былі яны ўзгадаваны ў духу хрысьціяскай веры, але празьмерная любоў да ўлады прывяла іх да заўчаснай сьмерці. Магчыма, што падзел імпэрыі паміж трох сыноў ня быў прапарцыянальна разьмеркаваны з эканамічнага й стратэгічнага пункту гледжаньня. Наймалодшы сын Констанс атрымаў Італію, Афрыку й большую частку Балканаў, сярэдні сын Канстанцый атрымаў Канстантынопаль і ўсе ўсходнія правінцыі; а самы старэйшы сын Канстанцін II атрымаў найменш: Брытанію, Галію і Гішпанію. Гэтыя правінцыі не адпавядалі гаспадарчаму і мілітарнаму статусу Канстанціна й ён пачаў дамагацца ў брата Констанса атрымаць частку сумежнай зямлі. На гэта паступіў адмоўны адказ. У 340 годзе паміж братамі пачалася вайна. Канстанцін II быў забіты ў неспадзяваным нападзе. Констанс стаў уладаром усяе Заходняй імпэрыі.

У наступным годзе Констас выдаў указ, у якім застрашваў карамі паганаў за прынашэньне ахвяр сваім багам. Але яго брат Канстанцый паступаў больш асьцярожна. Ён узяў пад абарону паган і пагражаў хрысьціянам карамі за іхнія самавольныя паступкі ў адносінах да інаверцаў.

Абодва браты былі хрысьціянамі, але розьніліся між сабою дактрынамі. Канстанцій быў арыянінам й у ягонай Усходняй імпэрыі было многа арыян. Констанс кантратраля-

ваў Заходнюю імпэрыю, якая трымалася нікейскай дактрыны. Каб пагадзіць рэлігійныя розьніцы, восеньню 343 году скліканы быў сабор у Сардыцы, але ён не прывёў да царкоўнай еднасьці. Толькі што малодшы брат Констанс змусіў старэйшага брата Канстанцыя, каб ён вярнуў з выгнаньня епіскапаў нікейскай дактрыны, што было зроблена. Тады якраз вернуты быў на сваю катэдру папулярны Александрыйскі епіскап Афанасій.

Такая дзейнасьць выклікала незадавальненьне сярод арыян. Аднак у 346 годзе абодва браты выдалі супольны эдыкт, які быў паўтарэньнем антыпаганскага ўказу ад 341 году й адносіўся ён да ўсяе імпэрыі.

У 350 годзе адзін з высокіх афіцэраў Констанса, нейкі ўзурпатар, які быў паганінам, прыняў рымскае імя Магнецій. Ён меў скрыты намер захапіць пост імпэратара. Аднойчы, калі Констанс паехаў на паляваньне, Магнецій запрасіў да сябе на прыём з нагоды народзінаў свайго сына высокіх афіцэраў. Як усе добра падпілі, Магнецій апрануўся ў імпэратарскія шаты й быў п'янымі афіцэрамі прагалошаны імпэратарам. Констансу прыйшлося ўцякаць, але быў ён злоўлены недалёка Пірэнэяў і забіты.

Магнецій, як імпэратар Заходняй імпэрыі, загадаў зьмясьціць на сваіх манэтах сымбаль Хрыста. Гэтым хацеў ён знайсьці падтрымку сярод хрысьціянскіх епіскапаў. Завязалася трохгадовая грамадзянская вайна паміж Магнеціем і Канстанцыем. Было гэта крывавае змаганьне, у якім Магнецій быў пабіты й у жніўні 353 году пакончыў жыцьцё самагубствам.

Такім чынам Канстанцый стаўся поўным гаспадаром усяе імпэрыі й у 396 годзе загадаў закрыць усе паганскія сьвятыні, спыніць прынашэньне ахвяраў і шанаваньне паганскіх бостваў. За нарушэньне такіх пастаноў пагражала кара сьмерці, ды нават намесьнікі правінцыяў мелі быць пакараны штрафам за талеранцыю паганскіх абрадаў.

Непадобна свайму бацьку Канстанціну Вялікаму, Канстанцый спрыяў арыянскай дактрыне, якая была асуджана на Нікейскім саборы ў 325 годзе. Такая зьмена імпэратара Канстанцыя, рэч зразумелая, не магла зрабіць дадатняга ўплыву на еднасьць Хрысьціянскай царквы. Ён прасьледаваў хрысьціян нікейскай дактрыны, пераважна епіскапаў, якіх

высылаў на выгнаньне, а на іх месца саджаў арыянаў. У гэтай рабоце асабліва адзначыўся арыянскі епіскап Александрыі Юрый. Пры ім многія сьвятары нікейскай дактрыны вымушаны былі пакінуць Александрыю, а іхнія цэрквы былі зачынены.

Усё-ж, бяручы агульна, за Канстанцыя хрысьціянства не пацярпела, а нават коштам паганаў пашырыла свае ўплывы сэкта арыянаў. Канстанцыю хадзіла, каб хрысьціянства было дзяржаўнай рэлігіяй, а ён быў яго лідарам. Таму ён вёў упартую барацьбу з паганамі.

Аснаўныя масы хрысьціян — прыхільнікі нікейскай дактрыны — асудзілі паводзіны Канстанцыя як арыяніна й калі ён памёр не аддалі яму належнай пашаны. Супраць арыянскай дзейнасьці Канстанцыя актыўна выступаў царкоўны дзеяч з Александрыі Афанасій, а сьвяты Ерамія сказаў: „Памёр зьвер і наступіў спакой". Канстанцый быў хрысьціянскім імпэратарам і меў за сабою арыянаў. Пахавалі яго ўрачыста ў царкве Сьв. Апосталаў.

Са сьмерцю імпэратара Канстанцыя ў 361 годзе прыціх другі этап арыянскай барацьбы. Гэта прыхільнікам нікейскай дактрыны дало магчымасьць склікаць свой сабор у Александрыі (362), які прывёў да агульнага сабору ў Канстантынопалі ў 381 годзе.

Новы імпэратар Юліян Апастат (361-363), або Адступнік, быў плямяньнікам Канстанціна Вялікага. Імпэратарскі пасад назначаны быў яму раней, згодна дынастычнаму праву. Але ў Парыжы войска збунтавалася супраць загаду імпэратара Канстанцыя, які хацеў лепшае войска Юліяна перакінуць супраць пэрсаў і таму прагаласіла Юліяна імпэратарам. Гэта азначала новую грамадзянскую вайну. Для Юліяна нічога не заставалася як выступіць супраць Канстанцыя, які ня быў прыязны да Юліяна.

Канстанцый ў сьпешцы заключыў мір з пэрсамі й пайшоў у Канстантынопаль, каб пасьля спаткаць свайго ворага Юліяна. Але далёка яшчэ да спатканьня Канстанцый меў сардэчны ўдар і памёр 5 кастрычніка 361 году каля Тарсу ў Малой Азіі. На ложы сьмерці ён назначыў, аднак, сваім наступнікам Юліяна. Такім парадкам грамадзянская вайна была закончана пакуль пачалася.

Трэба прызнаць што Канстанцый быў добрым імпэратарам і ў некаторых сваіх дзеяньнях нагадваў бацьку, Канстанціна Вялікага. Ён быў больш здольны за сваіх братоў, аб чым сьведчыць той факт, што яму было даручана кіраўніцтва Ўсходняй імпэрыяй.

Юліян бяз бою ўвайшоў у Канстантынопаль 11 сьнежня 361 году й паказаў сябе зусім іншым імпэратарам. У гэты самы дзень ён дазволіў адкрываць паганскія сьвятыні, вярнуць ім зямлю й маёмасьць, якія Канстанцыем былі сканфіскаваны й прыносіць ахвяры на алтарох. Неадкладна ачысьціў імпэратарскі двор ад прыхільнікаў памерлага Канстанція, а некаторых аддаў пад суд.

Тут трэба згадаць, што адносіны паміж Канстанцыем і Юліянам не былі прыязныя. Пасьля сьмерці Канстанціна Вялікага радня Юліяна была зьнішчана, каб не засталося канкурэнта на імпэратарскі трон. У 354 годзе Канстанцый пакараў сьмерцю дваюраднага брата Юліяна, цэзара Канстанцыя Галя, які быццам належаў да нейкай здрадніцкай кансьпірацыі, аб чым мела сьведчыць знойдзенае ў яго пісьмо. Магчыма што была кансьпірацыя, паколькі Канстанцый, нягледзячы на тое, што яго сястра Канстанцыя была замужам за Галем, зьнішчыў яго. Аднак калі памёр Канстанцый, Юліян аддаў пашану памерламу імпэратару сваёю прысутнасьцю на паховінах. І ў гэтым часе пачалі кружыць весткі, што Канстанцый паміраючы, нягледзячы на папярэднія непаразуменьні, прызнаў сваім праўным наступнікам Юліяна.

Флявій Кляўдый Юліян нарадзіўся у Канстантынопалі ў 331 або 332 годзе й быў ахрышчаны. Маці яго Васіліна памерла пару месяцаў пасьля яго нараджэньня, а бацька быў па палітычных матывах замардаваны калі Юліяну было пяць гадоў. Сам Юліян уцалеў толькі таму, што быў яшчэ дзецюком, а старэйшы яго брат Канстанцый Галь быў у той час хворы.

У маладосьці Юліян вучыўся ў Афінах, добра знаў старажытную літаратуру, філязофію й Біблію. Яго любоў да навукі была такая вялікая, што, калі яго паклікалі ў палац і прыйшлося пакідаць Афіны, ён плакаў. Вярнуўшыся дамоў, Юліян ажаніўся з Галенай, сястрой Канстанцыя й у лістападзе 355 году быў назначаны цэзарам у Галію.

Жанімства Юліяна з сястрой Канстанцыя нагадвала палітычную вунію. У той час Юліяну было 24 гады. Быў ён добра адукаваным адміністратарам і здольным генэралам. Ён супакоіў германскія плямёны, пабіўшы іх у баі пад Страсбургам у 357 годзе.

Не выключаецца магчымасьць, што Канстанцый быў зайздросны посьпехамі Юліяна й яго аўтарытэтам сярод легіёнаў. У гэтым часе (359) Канстанцый атрымаў пісьмо ад пэрсідзкага караля Сапора, які дамагаўся ад Візантыі Месапатаміі й Арменіі, якія належалі ягонаму дзеду. І ў канцы свайго пісьма кароль напомніў, што, калі яго амбасадар вернецца з пустымі рукамі, то ён выступіь з усёй сваёй арміяй як толькі міне зіма. Таму Канстанцыю трэба было забраць частку найлепшага войска Юліяна пад сваю каманду. Жаўнеры Юліяна былі кельтамі і ваявалі ў абароне сваіх дамоў супраць захопнікаў. Цяпер нехта загадаў ім маршыраваць 1 500 міль на ўсход у чужую незнаёмую краіну з адменным кліматам. Жаўнеры сьпярша пратэставалі, а ў лютым 360 году збунтаваліся і, як згадвалася вышэй, прагаласілі Юліяна імпэратарам. Такім парадкам Юліян стаў імпэратарам яшчэ да сьмерці Канстанцыя.

Да дваццатага году жыцьця Юліян выдаваў сябе за хрысьціяніна дзеля вока, а духова трымаўся паганства. Ён прысутнічаў на царкоўных багаслужбах у Галіі, каб мець за сабою падтрымку войска супраць Канстанцыя. Як будучы кандыдат на імпэратарскі трон, Юліян балюча перажываў дыскрымінацыю рэлігіі продкаў. Ён у страху перад Канстанцыем патаемна прыносіў ахвяры на апусьцелых паганскіх алтарох. Да хрысьціян адчуваў апатыю, а нават нянавісьць. Але жонка Юліяна, Галена, была хрысьціянкай. Памерла яна бяздзетнай у 360 годзе.

Уступіўшы на імпэратарскі трон, Юліян прыняў тытул „понтыфікс максімус", але абяцаў не прасьледаваць хрысьціян. Пачуўшы сябе сьмела, Юліян, як заўзяты вернік паганскага культу, пачаў дзейнічаць энэргічна. Згодна сваіх перакананьняў пастанавіў вярнуць паганства й зрабіць яго асновай рэлігійнага жыцьця імпэрыі ў той час, калі не было ніводнай паганскай сьвятыні ў Канстантынопалі.

Тут варта згадаць, што паганскі сьвет, як асяродзьдзе, у якім разьвівалася хрысьціянства, ня меў свае рэлігіі як гэта мелі

жыды й хрысьціяне. Паганства пачало прымаць рэлігійную форму пад канец III стагодзьдзя пад узьдзеяньнем хрысьціянства, як яго супрацьдзейнік. Да гэтага часу паганства было культам, які нічога не гаварыў як знайсьці сэнс жыцьця.

Таму першым чынам свае паганскай дзейнасьці Юліян паставіў у сэнаце статую багіні Вікторыі, арганізаваў паганскую сьвятыню на хрысьціянскі спосаб, упрыгожыў яе абразамі, увёў абрад, сьпеў, катэхізіс паганскай догмы, назначыў галоўных сьвятароў, ад якіх патрабаваў беззаганнага вядзеньня жыцьця й сам прымаў удзел у прынашэньні багатых ахвяр.

Сьвятары паганскай сьвятыні павінны былі захоўвацца годна, а па-за сьвятыняй — паважна. Яны не павінны былі хадзіць у тэатры й іншыя месцы, якія былі немаральнымі, ды нават не павінны былі хадзіць туды й іхнія дзеці.

У сваёй натуры Юліян захоўваў хрысьціянскія прынцыпы гуманізму, пашаны да чалавека, асабліва да хворых, убогіх і вязьняў, але не любіў ён хрысьціянства. Яго сябра Сальлюстый улажыў кароткі катэхізіс паганскай догмы, а назначаныя Юліянам высокія сьвятары выконвалі ролі хрысьціянскіх мітрапалітаў. Сваю царкву Юліян назваў „гэленістычнай".

Юліян намаўляў паганаў закладаць шпіталі, прытулкі для бяздомных і нават манастыры, як гэта робяць хрысьціяне. Выдаў эдыкт рэлігійнай талеранцыі, дазволіў вярнуцца хрысьціянскім епіскапам і ўзнагароджваў тых, што вярталіся да старой паганскай веры. Юліян Адступнік меў у сваёй паганскай дзейнасьці часовы посьпех. Пагане былі яшчэ шматколькасныя на Захадзе імпэрыі, а асабліва ў Рыме, дзе частка арміі была яшчэ паганскай.

Юліян быў занепакоены хуткім пашырэньнем хрысьціянства сярод ніжэйшага клясу, але сапраўдны гнеў у яго выклікаў вышэйшы кляс, які пайшоў на кампраміс з хрысьціянствам і яго прыняў. Таму ён абмяжоўваў і пазбаўляў вышэйшых пасад хрысьціян. Яны былі адсунуты з акружэньня імпэратара, урадаў, адміністрацыі, судаводзтва, а школьніцтва перадавалася паганскім кандыдатам. Хрысьціянам забаранялася вучыць граматыку, рыторыку й філязофію. Паганская рэакцыя Юліяна яшчэ раз прадэманстравала сваю апазыцыю да хрысьціянства.

Юліян быў перакананы, што адабраньне прывілеяў Хрысціянскай царкве, зьнясеньне хрысьціянскіх сымбаляў з манэт і сьцягоў ды адкрыцьцё паганскіх сьвятыняў давядзе да таго, што пагарджанае хрысьціянства пойдзе ў забыцьцё. Дзеля таго Юліян не пачынаў крывавага прасьледу хрысьціян, толькі абмяжоўваўся да шыканаў у адміністрацыі й вёў шырокую антыхрысьціянскую прапаганду. Ён забараніў веруючым хрысьціянам называць сябе хрысьціянамі, даў і імя „галілеяне". Такую палітыку Юліяна сьв. Ерамія назваў „далікатным прасьледам, які больш заахвочваў як змушаў людзей да паганскага прынашэньня ахвяраў".

Рэлігійная дзейнасьць імпэратара Юліяна аказалася не на часе. Яна выклікала бунт, а зь ім праліцьцё крыві як з аднаго, так і з другога боку. Хрысьціянскія ўплывы аказаліся завялікія й замоцныя. Хрысьціян у войску й у шмат якіх урадах было замнога, каб іх можна было так лёгка пазбыцца ці забыцца, як гэта думаў імпэратар Юліян Апастат. Хрысьціянства мела сярод сваіх вернікаў адукаваных людзей, а яго епіскапы пашыралі ня толькі веру, але й клясычную культуру.

На злосьць хрысьціянам, каб падбухторыць супраць іх жыдоў, Юліян задумаў адбудаваць іхнюю сьвятыню ў Ерусаліме. Горад гэты, пасьля Ціта, канчаткова зьнішчыў Адрыян у часе другога жыдоўскага паўстаньня на чале з Бар-Кохбай. На развалінах Ерусаліма пабудавана была рымская калёнія Аэлія Капіталіна, а жыдам пад карай сьмерці забаранялася прыбліжацца да яе. Цяпер Юліян меў пабудаваць тут жыдоўскую сынагогу, каб гэтым здабыць сабе саюзьніка супраць хрысьціян.

Жыды мелі повад памсьціцца на хрысьціянах, якія нарушалі іх старую дактрыну. Цяпер яны ахвотна прынялі прапанову Юліяна па адбудове Ерусалімскай сьвятыні. Гэтым Юліян хацеў паказаць неправавернасьць сказаным словам Хрыста, што Ерусалімская сьвятыня будзе разрушана й такой застанецца. І хоць будова яе пачалася, але не была закончана. Ад землятрусу завалілася на людзей частка будоўлі. Паўстала паніка й праект быў занядбаны.

Чым далей тым больш стараўся Юліян зьняважыць хрысьціян псіхічна й асабліва матэрыяльна. Ён забіраў ад іх гро-

шы, зямлю й тлумачыў гэта паводле хрысьціянскай навукі, што беднаму лягчэй будзе папасьці ў Царства Нябеснае. Рабіў Юліян нямала шыканаў для хрысьціян, уводзячы свае распараджэньні. Ён у лютым 362 году загадаў выпусьціць на волю ўсіх сасланых Канстанцыем на выгнаньне хрысьціянскіх духоўных, каб яны маглі свабодна прапаведаваць сваю веру. У сапраўднасьці Юліяну хадзіла, каб паміж сьвятарамі нікейскай дактрыны й арыянамі разгарэўся канфлікт.

Апошнім часам Юліян планаваў вялікую ваенную выправу супраць пэрсаў, нешта падобнае да паходу Аляксандра Македонскага, якога душа перайшла, быццам, у яго. Пэрсідзкі цар Сапор гэтым разам не хацеў вайны, жадаў заключыць зь Юліянам мір, але апошні адкінуў яго.

Па дарозе ў Месапатамію Юліян у жніўні 362 году прыбыў у Антыёхію й зрабіў тут сваю галоўную кватэру пэрсідзкай экспэдыцыі. Горад гэты быў вялікі, гістарычна зьвязаны з раньнім хрысьціянствам, многа жыло ў ім хрысьціян і яны мелі зь імпэратарам Юліянам непаразуменьні. Пакідаючы горад у сакавіку 363 году, Юліян сказаў у злосьці, што ён больш сюды не завітае, а вернецца ў Тарс і там зробіць сваю сядзібу, замест Антыёхіі.

Ідучы вайной на пэрсаў і памятаючы непрыхільныя да яго адносіны хрысьціян, Юліян сказаў, што калі ўдасца яму падпарадкаваць сваіх ворагаў, то ў імпэрыі не застанецца ніводная хрысьціянская сьвятыня.

Мог гэта казаць і рабіць Юліян у Галіі, дзе яго войска й насельніцтва былі амаль усе паганамі, але на ўсходзе імпэрыі хрысьціянская справа выглядала інакш. Тут пераважала хрысьціянства й намеры імпэратара Юліяна Апастата аказаліся памылковымі.

Пэрсідзкая кампанія Юліяна, у якой удзел прымала 65 тысяч жаўнераў, аказалася прайгранай. Юліяна сьмяротна ранілі кавалерыйскай пікай у бок каля ракі Тыгр. Паміраючага імпэратара перанесьлі ў палатку, дзе ён сказаў апошнюю прамову да сваіх генэралаў. Ён іх пацяшаў і плакаў па загінуўшых сваіх найлепшых сяброх. Генэралы прасілі Юліяна, каб назначыў свайго наступніка, але ён не назначыў. Відаць, не было сярод іх адпаведнага кандыдата на гэтую пасаду.

Памёр Юліян апоўначы 26 чэрвеня 363 году й перад сьмерцю меў сказаць: „Ты паканаў мяне, галілеянін!" Цела яго вязьлі пахаваць у Тарс, дзе ён меў затрымацца ў паваротнай дарозе ў Канстантынопаль. У гэтым горадзе нарадзіўся вялікі апостал хрысьціянства Саўл (Павал). Пахавалі Юліяна на прадмесьці Тарсу, недалёка магілы Максіміяна Дая, вялікага ворага хрысьціян. На гэтым скончылася апошняя спроба ворагаў хрысьціянства вярнуцца да традыцыі старажытнай паганскай рэлігіі.

Жыцьцё й імпэратарства Юліяна Адступніка было кароткае. Памёр ён ва ўзросце 31 года. Каля пяці з паловай гадоў быў галоўнакамандуючым у Галіі, дзе легіёны прагаласілі яго імпэратарм; шэсьць месяцаў правёў у Канстантынопалі, дзевяць неспакойных месяцаў правёў у Антыёхіі, а жыцьцё сваё закончыў трагічным паходам супраць пэрсаў.

Як хто, а хрысьціяне былі задаволены сьмерцю Юліяна Адступніка й некаторыя іхнія пісьменьнікі называлі імпэратара „зьмяёй", „Ірадам" і т.п. Усё-ж трэба прызнаць, што Юліян быў працавітым, здольным адміністратарам, адважным палкаводцам. І каб не яго варожасьць да хрысьціян, ён мог-бы зрабіць многа чаго добрага для дзяржавы. Аднак так ня сталася. Яго вера ў дух Аляксандра Македонскага, які быццам перайшоў у яго, слаўная перамога над алеманамі ў Галіі й паварот паганскай веры як вядучай аказаліся на другім канцы імпэрыі ня толькі памылковымі, але трагічнымі. Юліян быў адзіным паганскім імпэратарам пасьля прызнаньня хрысьціянства Канстанцінам Вялікім. І яшчэ можна сказаць, як гэта пішуць некаторыя гісторыкі, што было-б намнога лепш для Рымскай імпэрыі, калі-б Юліян застаўся цэзарам у Галіі супраць алеманаў і франкаў, як меў быць імпэратарам на Ўсходзе.

Пагане абвінялі хрысьціян у забойстве імпэратара, на што хрысьціяне бараніліся. Але была й такая версія, што Юліян, пабачыўшы сваю ваенную місію бязвыхаднай, сказаў кінуць кап'ё ў яго. Пяць гадоў пасьля сьмерці Юліяна сябра Ліваній выказаў думку, што хрысьціяне забілі імпэратара. А паганскі гісторык Аміян Марцэлін падае, што гэта быў трагічны выпадак зроблены праз неасьцярожнасьць.

На працягу 21 месяца свайго ўрадаваньня Юліян многа чаго зрабіў у пашырэньні паганскай царквы. Яго работа жыла й пасьля яго сьмерці. Хрысьціянству спатрэбілася многа часу, каб вярнуць сваіх былых вернікаў, якія перайшлі да Юліяна. Сваёю дзейнасьцю Юліян абудзіў хрысьціян, на іх арэну выступілі новыя адукаваныя людзі, якія далі новы імпульс Хрысьціянскай царкве.

(„Голас Часу" № 31 (4), № 32 (5), Лёндан, 1994 г.)

Архіепіскап Мяфодзій і ягоная дзейнасьць

(На 1110-я ўгодкі сьмерці архіепіскапа Мяфодзія)

З прычыны нястачы месца ў часопісе, мы памінём маладыя гады жыцьця будучага архіепіскапа Мяфодзія, а затрымаемся на яго прыезьдзе з братам Канстанцінам у Маравію. Прыехалі яны не адны, а з групай людзей на запросіны тагачаснага князя Расьціслава дзеля пашырэньня хрысьціянскай веры на славянскай мове ў ягонай дзяржаве. Выканаўшы першую частку свае місіі, яны вярталіся ў Канстантынопаль, каб высьвяціць епіскапа для Маравіі. Апынуўшыся ў Вэнэцыі, славянскія місіянеры былі запрошаны папам Мікалаем I прыбыць у Рым, каб асабіста абараніць арганізацыю свае славянскае Царквы, бо папа быў супраць такіх замераў. Пакуль яны прыбылі ў Рым, папа Мікалай памёр і яго заступіў папа Адрыян II. Славянскія місіянеры абаранілі слушнасьць свае Царквы і тут неспадзявана, 14 лютага 869 году памёр брат Мяфодзія, Канстанцін-Кірыла, які быў галоўным місіянерам, філёзафам. Тут трэба памятаць, што двух салунскіх братоў, Канстанцін і Мяфодзій, праводзілі сваю славянскую дзейнасьць у юрысдыкцыі рымскага папы, а былі місіянерамі Канстантынопальскай царквы.

Сьмерць Канстанціна-Кірылы ў Рыме стварыла новыя складанасьці Мяфодзію й нядаўна высьвячаным сьвятарам. Ніхто ня знаў, якое становішча зойме цяпер новы папа й як глядзіць на гэтую справу новае кіраўніцтва ў Канстантынопалі. Славянскія місіянеры сядзелі ў Рыме й чакалі. Але стварыўшуюся сытуацыю разьвязаў князь Коцаль. Ён, праўдападобна, да-

ведаўся праз сваіх людзей што сталася ў Рыме з кіраўніком славянскай місіі й выслаў сваё пасольства да папы з просьбай, каб прыслаў да іх Мяфодзія — „нашага настаўніка".

Мяфодзій вярнуўся з Рыму ў Панонію да Коцаля, каб там працягваць сваю місіянерскую работу на славянскай мове, як гэта было запачаткавана з братам Канстанцінам, памерлым епіскапам, які перад сьмерцю прыняў імя Кірылы. Але Панонія належала да юрысдыкцыі Зальцбургскага арцыбіскупа й Мяфодзій, ня хочучы падпардкавацца нямецкаму арцыбіскупу, вярнуўся у Рым. Прасіў ён папу, каб надаў Панноніі незалежную юрысдыкцыю з уласнай герархіяй. Просьба Мяфодзія была задаволена й ён вярнуўся ў Панонію ў сане архіепіскапа на ўсю Маравію (870) і ў Сірміум (Срэмска Мітровіца) заснаваў сваё архіепіскапства. Адгэтуль праз наступныя 15 гадоў будзе Мяфодзій весьці змаганьне зь нямецкімі інтрыгамі.

Дзейнасьць Мяфодзія й падтрымка яго папам рымскім Адрыянам II былі не да спадобы немцам і яны шукалі спосабу, каб зьмяніць такі ход справы. Сьвятаполк адміністраваў па князю Прыбіне ў Нітры й, маючы вялікія амбіцыі да ўлады, даўся намовіць Карламану, сыну Людовіка Немца. Яны заатакавалі Вялікамараўскую дзяржаву й Сьвятаполк подступам узяў у палон свайго дзядзьку Расьціслава. У траўні 870 году Сьвятаполк аддаў Расьціслава Карламану ў Баварыю, дзе Людовік Немец абвінаваціў яго ў здрадзе й прыгаварыў на кару сьмерці, але прыгавор ня выканаў, а толькі асьляпіў Расьціслава й трымаў яго закутым у нейкім манастыры, дзе па ім загінуў сьлед.

З упадкам Расьціслава на Маравіі наступіла дэзарганізацыя. Гэта выкарыстаў Карламан і без ніякага супраціву пачаў апаноўваць краіну славян і насаджваць сваіх стаўленікаў. Мала таго, што Сьвятаполк аказаўся ашуканы немцамі, але стаўся нават іх вязьнем. Маравіяй пачалі кіраваць нямецкія намесьнікі са сваімі лацінскімі місіянерамі. Прысутнасьць немцаў на Маравіі аказалася няшчасьцем для місіі архіепіскапа Мяфодзія. Ягоная місія й так была ўскладнена, а без падтрымкі дзяржавы аказалася амаль немагчымай. У такіх абставінах архіепіскап Мяфодзій працягваў сваю пастырскую дзейнасьць.

Зальцбургскі арцыбіскуп Адалвін, маючы ў сваіх руках князя Сьвятаполка і палітычны нагляд над Маравіяй, выступіў з афіцыйным пратэстам, што „нейкі грэк, Мяфодзій, пашырае пагарду да імшы лацінскай". Баварскія біскупы, паразумеўшыся з Людовікам Немцам, склікалі сынод у Ратызбоне (Рэгенсбург), на які запрасілі архіепіскапа Мяфодзія. На саборы закідалі Мяфодзію ўсякую ўсячыну, як гэрэзію, нарушэньне правоў баварскіх біскупаў на іхняй тэрыторыі й т. п.

На закіды немцаў архіепіскап Мяфодзій бараніўся стойка й адказваў аргумэнтамі, зазначыўшы, што ў сапраўднасьці гэта яны, немцы, праз сваю пыху й хцівасьць пайшлі па-за граніцы царкоўнага права. Праціўнікаў сваіх Мяфодзій не пераканаў агрумэнтамі, а толькі абурыў іх.

У сапраўднасьці Ратызбонскі сынод ня меў права судзіць архіепіскапа Мяфодзія. Суд над архіепіскапам у юрысдыкцыі папы належаў папу. Але тут нямецкаму духавенству не хадзіла аб рэлігійныя каноны й рэлігійную мараль. Яны бачылі ў асобе архіепіскапа Мяфодзія свайго ворага й рабілі ўсё, каб яго пазбыцца. Не абышлося й без насьмешак і зьнявагаў, як біцьцё па твары й замахваньне бізуном. Пасьля розных зьдзекаў Мяфодзія паставілі на сьнезе й марозе чакаць пакуль сынод вынясе свой прысуд. А прысуд быў такі, што сынод пазбавіў архіепіскапа Мяфодзія царкоўных функцыяў і пасадзіў яго ў манастырскую турму ў Швабіі (871), дзе праседзеў ён каля трох гадоў.

Здавалася, што паложаны быў канец славянскай місіі, славянскай літургіі і самому архіепіскапу Мяфодзію, бо ніхто ня мог заступіцца за яго. Ягоны пратэктар папа Адрыян II памёр у 872 годзе й кіраўніцтва ў Рыме абняў папа Ян VIII, які ня меў таго зразуменьня да славянскай літургіі, што папа Адрыян II. Асьлеплены князь Расьціслаў дагараў недзе ў швабскай турме без ніякай весьці, Канстантынопаль быў далёка й меў свае старыя непаразуменьні з Рымам. І так адзінокі архіепіскап Мяфодзій церпяліва зносіў пакуты ў нямецкай турме, а баварцы падсылалі сваіх місіянераў у Маравію.

Сьвятаполк таксама цярпеў кару за сваю здраду. Яго арыштавалі немцы й абвінавацілі ў вераломстве. Мараўскі народ бачыў, што ў іхняй дзяржаве дзеецца непарадак і падняў паўстаньне. Нават славянкі сьцягвалі баварцаў з коней і білі

іх палкамі. У такім рэвалюцыйным настроі народ змусіў сьвятара Славаміра абняць кіраўніцтва ў краі (871), каб уратаваць парадак. Славамір карыстаўся даверам народу й яго дзейнасьць насьцярожыла немцаў.

Каб уціхамірыць народ Маравіі, непазьбежна было арганізаваць другую экспэдыцыю. На гэты час удалося Сьвятаполку апраўдацца з пастаўленых яму закідаў і ён згадзіўся добраахвотна весьці франконскае войска супраць збунтаваных мараўцаў. Калі баварцы падышлі пад галоўную мараўскую крэпасьць, Сьвятаполк пад прэтэкстам схіліць паўстанцаў да капітуляцыі ўвайшоў у горад, заключыў з паўстанцамі саюз і разам разьбілі баварцаў. Падбадзёраныя сваёй перамогай, славяне выгналі нямецкіх ксяндзоў і зьвярнуліся да папы, каб вярнуў ім Мяфодзія — архіепіскапа й настаўніка.

Наступныя дзьве экспэдыцыі немцаў на Маравію ў 872 і 873 гадох былі пасьпяхова адбітыя. У выніку ваенных дзеяньняў быў заключаны трактат у Форхейме (874), які Вялікамараўскай дзяржаве прынёс фармальную незалежнасьць, а зь ёю ўнутраную стабілізацыю.

Паступак нямецкіх біскупаў у Ратызбоне над архіепіскапам Мяфодзіем быў ня толькі што незаконным, але адначасна праступным і вялікай зьнявагай для аўтарытэту папы й яго Царквы ў Рыме. Прамаўчаць гэта было немагчыма, паколькі, яшчэ ня так даўно славянская літургія адабралася Рымам. Былі слухі, быццам Канстантынопаль выслаў сваю дэлегацыю ў Ратызбону на чале з архіепіскапам Агатонам, каб завязаць зь Людовікам Немцам прыязныя адносіны. І тут папа Ян VIII заварушыўся ды пачаў рабіць энэргічныя захады, каб выпусьціць на свабоду архіепіскапа Мяфодзія. Папскі легат, Павал з Анконы, паехаў у Баварыю да самога Людовіка Немца й там праўдападобна дасягнуты быў кампраміс. Мяфодзія выпусьцілі з турмы й ён мог вярнуцца да свае пастырскай працы на Маравіі, аднак яму было забаронена адпраўляць багаслужбы на славянскай мове. Дазволена было толькі навучаць па-славянску.

Цяжка сказаць, каб папа Ян VIII (872-882) быў вялікім прыхільнікам немцаў. Ён, як бачым, абараняючы свой аўтарытэт, зрабіў захады, каб выпусьціць на волю архіепіскапа Мяфодзія. З другога боку прымірыў дыспуту наконт „філіоквэ" з Усход-

няй царквой і не накінуў ён свае ўлады, як гэта стараліся рабіць некаторыя папы. Відаць, што папа Ян VIII разумеў неразважныя паступкі папы Мікалая I, якія ўводзілі непатрэбны закалот у справе хрысьціянскай еднасьці. І тут трэба прызнаць аб'ектыўна, што за папы Яна VIII на рэлігійным фронце паміж Усходняй і Заходняй цэрквамі наступіў спакой. Але ў сваёй юрысдыкцыі папа Ян VIII не хацеў прымірыцца са славянскай літургіяй, аказаўшыся яе праціўнікам.

Зь нямецкай турмы архіепіскап Мяфодзій прыехаў у Маравію да Сьвятаполка й быў радасна вітаны народам. Памінуў ён Панонію, свайго добрага прыяцеля князя Коцаля, а гэта таму, што баварскія біскупы загадзя пастараліся прыгразіць Коцалю, калі ў яго затрымаецца Мяфодзій.

Ня трацячы часу архіепіскап Мяфодзій узяўся за свае пастырскія абавязкі. Зь яго рук у 874 годзе хрысьціянства прынялі чэшскі князь Барывой з жонкай Людмілай і чэшскія рыцары, якія наведалі двор Сьвятаполка. Жонка Барывоя была вялікай прыхільніцай славянскага абраду. Яе сьвятаром быў Павал, вучань Мяфодзія, які хрысьціў Вацлава, што сёньня зьяўляецца сьвятым у чэхаў. Мяфодзій навучаў чэхаў хрысьціянскай веры, высьвячаў новых сьвятароў і аб'язджаў зь імі вялікую дзяржаву Сьвятаполка.

Каб спыніць місіянерскую дзейнасьць Мяфодзія, нямецкае духавенства пусьціла ў ход фалшывыя лісты, быццам, Мяфодзій пазбаўлены папам сану архіепіскапа. Пайшлі ў ход даносы, абвінавачаньні й нават рабіліся спробы нападаў на падарожнічаючага Мяфодзія. Усёй гэтай нікчэмнай работай кіраваў нямецкі біскуп Віхінг зь нейкім Янам з Вэнэцыі.

Праз сваю настойлівасьць немцы дабіліся, што папа Ян VIII у сваім пісьме ад 14 чэрвеня 879 году забараніў архіепіскапу Мяфодзію адпраўляць літургію на славянскай мове. Ён пісаў: „Табе асабіста забаранілі адпраўляць урачыстую імшу на славянскай мове, а толькі па-лаціне або па-грэцку". Папа рабіў закіды архіепіскапу Мяфодзію, што ён уводзіць народ у блуд, навучаючы іначай, як гэта робіць Рымская царква.

Архіепіскап Мяфодзій не паслухаў папы, а надалей карыстаўся славянскай мовай у літургіі. Папа паклікаў архіепіскапа ў Рым, каб ён растлумачыў, чаму навучае нязгодна наказаў Апостальскай Сталіцы й чаму адпраўляе літур-

гію на „варварскай", гэта значыць славянскай, мове. Зь ім у Рым прыехаў і Віхінг, лідэр франконскага сьвятарства, як галоўны абвінаваўца. На царкоўным судзе стойкі місіянер з Гары Алімп ня толькі што ачысьціўся ад усялякіх зробленых на яго закідаў, але сумеў пераканаць папу ў слушнасьці сваёй пазіцыі наконт славянскай літургіі.

Вярнуўся архіепіскап Мяфодзій у Маравію з булай папы Яна VIII адрасаванай Сьвятаполку і датаванай чэрвенем 880 году. У гэтай буле папа пацьвярджаў усе правы й прывілеі архіепіскапу Мяфодзію й дазваляў поўнасьцю карыстацца славянскай мовай у літургіі з той засьцярогай, каб сьпярша Евангельле чыталася па-латыні, а пасьля ў славянскім перакладзе. Была гэта вялікая й неспадзяваная перамога аднаго чалавека — Мяфодзія й яго славянскай справы насуперак наступу лацінскага Захаду.

І гэтым разам здавалася, што архіепіскап Мяфодзій выйграў справу. Аднак папа падзяліў яго мітраполію й часьць зь Нітрай аддаў біскупу Віхінгу, найбольшаму ворагу Мяфодзія. Гэта сьведчыла аб тым, што папа не давяраў архіепіскапу Мяфодзію й праз немца Віхінга паклаў бар'ер для дзейнасьці Славянскай царквы, якая аказалася нявыгаднай Рыму. Усё рабілася так, каб Славянская царква памерла натуральнай сьмерцю. Віхінг падбухторваў Сьвятаполка супраць Мяфодзію, пераймаў яго пісьмы, падстаўляў фальсыфікаты й вёў правакацыйную прапаганду. На варожыя дзеяньні Віхінга Мяфодзій паскардзіўся папу. Калі пісьмовыя жалабы не далі рэзультату, Мяфодзій праклаў Віхінга й выгнаў яго з краю. Выгнанец знайшоў прыпынішча ў Рыме й там седзячы клеваў на славянскую мову й яе літургію, якую адпраўляў Мяфодзій памінаючы „філіоквэ".

Становішча архіепіскапа Мяфодзія на Маравіі з кожным годам пагаршалася. Справа Славянскай царквы станавілася няпэўнай і Мяфодзій пачаў шукаць кантактаў з Канстантынопалем. На гэта ворагі Славянскай царквы пачалі распускаць чуткі, што Мяфодзій ня мае пашаны ў Канстантынопалі, імпэратар ёсьць злосны й калі ён пападзецца ў яго-ныя рукі, то жывым ня выйдзе. У сапраўднасьці так не было, а імпэратар Васіль I (867-886) нават прыслаў запросіны архіепіскапу Мяфодзію наступнага зьместу: „Дарагі Ойча,

я вельмі жадаю пабачыць Цябе. Будзь настолькі добры й зрабі да нас падарожжа, каб мы маглі спаткаць Цябе й атрымаць Тваё бласлаўенства".

Хоць на старасьць, маючы нейкіх 70 год, аднак архіепіскап Мяфодзій зрабіў падарожжа ў Канстантынопаль. У 881 або 882 годзе яго гасьцінна спаткаў у Канстантынопалі Васіль I і патрыярх Фоцій, які пасьля сьмерці Ігнація зноў уступіў на патрыяршы трон. Імпэратар выказаў вялікі гонар і сваё задавальненьне Мараўскаму архіепіскапу за яго місійную славянскую дзейнасьць у Маравіі, паколькі сам быў славянскага паходжаньня. Імпэратар Васіль нічога не адмовіў Мяфодзію ў ягоных патрэбах, а толькі абняў госьця, абдарыў яго падаркамі й разам з патрыярхам адвялі яго дамоў. Ды нават жыхары Канстантынопаля выказалі сымпатыю апосталу славян на Маравіі за яго вялікую работу й тыя цярпеньні й перажываньні, якія прыходзілася пераносіць у імя праўды.

На жаль, мала ведаем аб гутарках, якія вяліся паміж імпэратарам, патрыярхам і Мяфодзіем, за выняткам таго, што сьвятар і дыякан Мяфодзія ды некалькі славянскіх літургічных кніжак засталіся ў Канстантынопалі. Гэта нагадвае, што архіепіскап Мяфодзій, партыярх Фоцій і імпэратар Васіль здавалі сабе поўнасьцю справу, што Рым ня ёсьць шчыра зацікаўлены ў славянскай літургіі. Папы баяліся канфлікту з франконскай дзяржавай і для славянскай літургіі Кірылы-Мяфодзія на Маравіі і Балканах неабходна была падтрымка Канстантынопаля.

Другой справай рэлігійнага значэньня быў, праўдападобна, намер Канстантынопаля ахрысьціць суседніх славянаў імпэрыі й тут візантыйскаму ўраду спатрэбіліся дасьведчаньні й здольнасьці архіепіскапа Мяфодзія, калі яго імпэратар запрасіў прыехаць у Канстантынопаль. Пакінутыя ў Канстантынопалі славянскія кнігі й двух ягоных сьвятароў за пару гадоў былі папоўнены групай вучняў Мяфодзія з Маравіі. З гэтага ясна відаць, што Канстантынопаль рыхтаваўся да місійнай работы ў Балгарыі, Сэрбіі й на Русі.

У паваротнай дарозе ў Маравію Мяфодзій затрымаўся ў Панноніі й тут заняўся перакладам на славянскую мову Евангельля, Псалтыра, Дзеяньняў Апосталаў, тэкстаў літургічных малітваў, царкоўных канонаў, што заняло яму час ад 26 сакавіка

да 26 кастрычніка 884 году. Да помачы меў ён двух хутка пішучых духоўных. Кніжным царкоўным фондам Мяфодзій падрыхтоўваў грунт для будучай дзейнасьцў сваіх вучняў. Меў ён у той час каля 200 духоўных у межах свае юрысдыкцыі.

Адчуваючы ўпадак сваіх сіл, Мяфодзій адслужыў урачыстую славянскую літургію, блаславіў прысутных вернікаў і прадказаў сваю сьмерць, якая наступіла на трэці дзень. Памёр архіепіскап Мяфодзій 6 красавіка 885 году. Перад сьмерцю, на просьбу сваіх вучняў, назначыў сваім наступнікам аднаго з мараўскўх сьвятароў — Горазда й пры гэтым сказаў: „Вось ваш зямляк, муж свабодны, прававерны, хай будзе зь ім воля Божая й любоў нашая, так як ёсьць мая".

Выбар Горазда быў талковы. Паходзіў ён з арыстакратыі й добра знаў латынь. Гэтым мог ён здабыць падтрымку сярод кіруючых кругоў Рымскай царквы й князя Сьвятаполка, які быў прыхільнікам лацінскага абраду й культуры.

Паховіны архіепіскапа Мяфодзія адбыліся вельмі ўрачыста й над целам яго адпарўлялі малітвы на трох мовах: славянскай, грэцкай і лацінскай. Быў гэта апошні мамэнт, калі ў мараўскай сьвятыні тры мовы гучалі раўнапраўна. Незьлічоная колькасьць народу адпраўляла дастойнага ўладыку на вечны супакой са сьвечкамі ў руках і аплаквала свайго добрага пастыра-настаўніка.

Пахавалі архіепіскапа Мяфодзія ў саборнай царкве ў сьцяне за алтаром Багародзіцы і праўдападобна ў горадзе Старэ Место (Велеград). На жаль, хроніка не падала назову гораду пахаваньня архіепіскапа Мяфодзія, а дасюлешнія пошукі не далі задавальняючага рэзультату. Больш верагодна, што царква, у якой быў пахаваны архіепіскап Мяфодзій зьнішчана, рэліквія прапала й нават месца паховін ня ёсьць знанае.

Ня быў Мяфодзій філёзафам, падобна свайму брату Канстанціну-Кірылу, але затое быў ён чалавекам чыну й цьвёрдай няўступчывай волі. І ў канцы аказаўся годным настаўнікам свайго вялікага й слаўнага брата.

Аб дзейнасьці братоў Канстанціна-Кірылы й Мяфодзія на Маравіі ёсьць зацемка ў „Сказаньні", выдадзеным на Русі пад 898 годам, дзе выказваецца сымпатыя да рымскага папы з поваду законнасьці багаслужбаў на славянскай мове, а менавіта: „Папеж Рымский похулил тех, иже рощают на

книги Словенскыя. (...) Да аще кто хулит Словенскую грамоту, да будет атльучен от церкве, донце ся исправить".

Хоць было гэта напісана пасьля сьмерці Кірылы й Мяфодзія, калі Славянская царква апынулася зноў пад прасьледам Рыму, аднак аўтар палічыў патрэбным гэта зафіксаваць.

Агульна прынята ўважаць, і то без засьцярог, што місія салунскіх братоў служыла асьветным мэтам для шырокіх масаў насельніцтва ўсходняй славянскай Эўропы. Іхняя дзейнасьць навязала моцныя духовыя й культурныя сувязі сярод братніх славянскіх плямёнаў праз царкоўныя тэксты й уложанае славянскае пісьмо. І як галоўны прынцып, Кірылаўская дзейнасьць апіралася на ідэйна-маральных асновах і на іх праводзілася выяўленьне нацыянальных асаблівасьцяў і разьвіцьця агульнаславянскай сьвядомасьці. Гэтыя факты садзейнічалі далейшаму разьвіцьцю духоўных, маральных і культурных вартасьцяў славян.

Хоць многа славян ведае, што былі такія людзі — Кірыла й Мяфодзій, але мала ведае, што без гэтых людзей, мы — славяне — былі-б сёньня зусім іншым народам. Таму дзейнасьць Кірылы й Мяфодзія, стваральнікаў славянскай азбукі, зьяўлялася й зьяўляецца аб'ектам дасьледваньняў шматлікіх вучоных розных галін навукі.

Памяць засталася жыць, што дзе-б яны не былі гэтыя салунскія браты, яны ніколі не насілі пры сабе ружжа й не было чутно, каб хто зь іх павысіў свой голас супраць каго. Засталіся яны легендарнымі постацямі й пакінулі па сабе й сваёй хрысьціянскай місіі несьмяротную славу, якую прынесьлі з Усходу й якая засталася жывой і актуальнай да нашага часу. Так склалася, што гісторыя ўпамінае іх разам, называючы іх салунскімі братамі і першымі апосталамі славян.

Праваслаўныя цэрквы, якія карыстаюцца ў сваёй літургіі славянскай мовай Кірылы й Мяфодзія, з асаблівым пачуцьцём удзячнасьці адносяцца да сваіх сьвятых прасьветнікаў з Салуні. Бо-ж яны сваёю рэлігійнай дзейнасьцю палажылі трывалыя асновы й для культурнага зьбліжэньня й супрацоўніцтва ўсіх братніх славянскіх народаў. Ужо доўгае тысячагодзьдзе ўвесь славянскі сьвет карыстаецца здабыткамі салунскіх братоў.

(„Голас Часу № 35 (2), № 36 (3), Лёндан, 1995 г.)

Грамадзка-арганізацыйнае жыццё

Крытыка й правакацыя

Два зусім розныя паняцьці — крытыка й правакацыя часта выступаюць у арганізацыйна-грамадзкім жыцьці побач і таму ёсьць вельмі важным умела адрозьніць галасы сапраўднай крытыкі ад варожай правакацыі.

Калі ходзіць аб самую крытыку, дык яна патрэбная ў кожным арганізацыйна-грамадзкім жыцьці як дапаможны дзейнік. Правакацыя, у сваю чаргу, ёсьць шкодная й небясьпечная.

Права на крытыку павінна існаваць і прымацца ў кожным грамадзкім жыцьці, бо брак крытыкі з боку грамадзтва вычэрпвае кіруючы актыў гэтага грамадзтва й вядзе яго да бязьдзейнасьці, а часам нават да горшага.

Галасы агульнай крытыкі, якая выказвае патрэбу агулу, змушаюць кіруючы актыў рэгуляваць сваю дзейнасьць для агульнага дабра й заспакаеньня ягоных патрэбаў. Кіруючы актыў павінен стаць на такім узроўні, каб магчы рэальна адрозьніць галасы крытыкі ад розных выбрыкаў нездаровых адзінак.

У кожным грамадзкім, а таксама й палітычным жыцьці кожнага народу памылкі былі, ёсьць і будуць, а талковая крытыка ёсьць на тое, каб пазбыцца гэтых памылак. Але ў той час, калі крытыка апіраецца на спраўджаных фактах і б'е справядліва, хоць часам і востра, то правакацыя сее несправядлівыя, няспраўджаныя й часта злосныя пагалоскі. Калі правакацыя паходзіць зь неабдуманага цкаваньня й пустой балбатні, дык гэта яшчэ ня так шкодна. Але калі правакацыя робіцца мэтазгодна й паўтараецца сыстэматычна, то ў такім выпадку трэба асьцерагацца, а правакатара прыцягнуць да адказнасьці за свае паклёпы.

Шмат ёсьць цяжкасьцяў і заблытанасьці ў арганізацыйна-грамадзкім жыцьці й таму не заўсёды ўдаецца іх лёгка вырашыць. Розныя людзі, розныя думкі й мэты ствараюць розныя праблемы, часам здаецца не да пакананьня. Аднак пры добрай волі, узаемным зразуменьні й пашане ўдаецца гэтыя цяжкасьці супольнымі сіламі перамагчы.

Горш тады, калі неўпаўнаважаная група людзей бярэцца сама рашаць агульныя справы бяз веды грамадзтва: склікаючы тайныя сходкі, выносячы пастановы, пішучы пасквілі, шэпчучы за вугламі й т.п.

Такі спосаб дзеяньня прыносіць агульнай справе толькі ўнутранае разьбіцьцё й варожасьць. Часта трэба адмовіцца ад свае ўпартасьці, самаволі й задумацца над голасам свайго працаўніка, а ім можа быць і прыяцель. Трэба сьвядома й развазжна ўяўляць свае мэты, быць асьцярожным на розныя спакусы, шанаваць думку другога, вырабляць у сабе церпялівасьць і талеранцыю да іншых. Так павінны рабіць усе грамадзкія дзеячы, калі яны імі ёсьць, або прэтэндуюць імі быць.

Вялікім майстэрствам і заслугай ёсьць умелае кіраваньне грамадзкай справай, бо інакш усё будзе выглядаць як „мокрае гарыць".

У нашых эміграцыйных варунках ёсьць пажадана павесьці справу так, каб расла яна зьнізу, гэта значыць, унікаць накіданьня загадаў згары. Гэты першы спосаб ёсьць больш складаны, але на далейшую мэту лепшы, бо вырабляе ў людзей самадзейнасьць, пачуцьцё абавязку й грамадзкай адказнасьці.

І ў даным выпадку бяз крытыкі не абыдзецца. Але талковая й дасьпелая крытыка выйдзе нам усім на добра. Аднак перад правакацыяй, за якою крыецца прадуманы плян дзеяньня ворага, — СЬЦЕРАЖЫСЯ!

(„Аб'еднаньне" № 4 (76), Лёндан, 1958 г.)

Войска й палітыка

У Сыракузах (Сыцылія), дзе ўлада спачывала ў руках вайсковых кругоў і цывільных урадаўцаў, Плятон (428-348 гады да нашай эры), як „поттыкос" (дзяржаўны муж), правёў востры падзел функцыяў у дзяржаве, фармулуючы іх залежнасьць між сабою, акрэсьліваючы іх заданьні й прэрагатывы.

Гэты падзел функцыяў Плятонам стаўся асноўным прыкладам для некаторых дзяржаваў на працягу стагодзьдзяў. На ім апіраліся й апіраюцца ўсе сапраўдныя дэмакратычныя дзяржавы сьвету. Погляд Плятона на войска, як мілітарную сілу, быў і ёсьць лягічны й абгрунтаваны. Войска — штаб, паводле Плятона, мае за заданьне адпаведна прыгатаваць жаўнера да баявой гатоўнасьці, акрэсьлівае яго спосаб і тэхніку вядзеньня вайны й т.п., а аб тым, ці вайну весьці ці не, рашаюць цывільныя дзейнікі, як заканадаўчыя й выканаўчыя ворганы, якіх паклікаў народ і даручыў ім кіраўніцтва дзяржавай.

Аднак, на вялікі жаль, прынцыпы Плятона вайсковыя дзейнікі часта парушаюць і таму там няма спакою, дзе войска мяшаецца ў палітыку. На гэта гісторыя дае нам шэраг фактаў, а прыкладам могуць паслужыць рэспублікі Сярэдняй і Паўднёвай Амэрыкі. Сьвежым і яскравым прыкладам зьяўляецца Сярэдні Ўсход, дзе толькі ў адной Сырыі, пачынаючы з 1948 году, захапіў уладу палкоўнік Гусьнэ Займ, які быў страчаны ў 1949 годзе праз другога палкоўніка Гэронаона. Гэты, у сваю чаргу, быў арыштаваны праз палкоўніка Ціца-Клі, якога ўплывы скончыліся ў 1951 годзе, калі скінуў яго палкоўнік Шышэкелі. Апошняму-ж прыйшлося ў 1954 годзе ўцякаць за мяжу свае бацькаўшчыны, а на яго месца, пасьля палітычных розыгрышаў, прыйшоў да ўлады Гашам Эль Атасы. Цяпер Сырыя ўвайшла ў саюз зь Егіптам пад прэзыдэнцтвам палкоўніка Насэра, творачы такім чынам вунію. Як доўга будзе існаваць гэтая вунія — цяжка сказаць.

Падобныя зьявішчы захопу ўлады спатыкаліся ў Егіпце, Лібане, Пэрсыі, Іраку, а апошнім часам у Турцыі й у другіх дзяржавах. Там на чале стаяць вайсковыя клікі, якія збройнаю сілаю ўводзяць вайсковыя дыктатуры. У некаторых выпадках пры захопе ўлады даходзіць да забойстваў.

З другога боку, у ЗША найбольшыя таталітарныя праявы выклікаюць раптоўную рэакцыю. У якасьці прыкладу пакарыстаемся вядомай свайго часу справай генэрала Дугласа Макартура з часу Карэйскай вайны, калі ён рашуча дамагаўся правесьці ў жыцьцё свой плян адносна Кітаю. Справа дайшла ў канцы да таго, што тагачасны прэзыдэнт

ЗША Гары Трумэн, нягледзячы на аграмадныя заслугі генэрала ў часе Другой Сусьветнай вайны на Далёкім Усходзе ў барацьбе зь Японіяй, змушаны быў адхіліць Макартура ад пасады галоўнакамандуючага за ягоную распалітыкаванасьць і паставіць галоўнакамандуючым войскамі Аб'яднаных Нацыяў у Паўднёвай Карэі генэрала Мэцью Рыджвэя.

Калі да генэрала Эйзэнгаўэра, рэктара ўнівэрсытэту, вучонага й галоўнакамандуючага аліянцкімі збройнымі сіламі ў часе Другой Сусьветнай вайны, а пасьля вайны займаючага пост галоўнакамандуючага НАТО, зьвярнуліся яго прыхільнікі, каб кандыдаваў на прэзыдэнта ЗША, тады Эйзэнгаўэр дабравольна зрокся вайсковай функцыі й сам дабравольна зьняў зь сябе генэральскі мундзір і тады толькі даў сваю згоду.

Пераглядаючы старонкі гісторыі мы бачым, што дэмакратыі трацілі сваю вольнасьць таму, што цывільную ўладу пераймала вайсковая кліка, якая ўводзіла вайсковую дыктатуру, дысцыпліну, пры якой народ ня мог праяўляць свабоднай дзейнасьці. У такіх варунках народ церпіць таталітарны прасьлед, паносіць людзкія ахвяры, ды раней ці пазьней прыходзіць да гвалтоўных ідэалягічных і сацыяльных хваляваньняў супраць пануючага дыктатарскага рэжыму.

У старажытнасьці адзін грэцкі філёзаф сказаў, што „тайніцай шчасьця ёсьць свабода, тайніцай свабоды ёсьць адвага". Таму няма нічога дзіўнага, што ў таталітарных дзяржавах не было й няма спакою й яго ня будзе. Прыродныя элемэнты свабоды зьнішчыць цяжка й таму людзі адважна выступаюць у абароне свае свабоды.

Незалежнасьць кожнае дэмакратычнае дзяржавы апіраецца на волі народу, які стаіць на варце сваіх грамадзкіх абавязкаў, вызначаных у канстытуцыі. Абаронай канстытуцыі перад варожымі сіламі зьяўляецца яе мілітарная сіла.

Функцыя арміі ў дэмакратычнай дзяржаве ёсьць дакладна акрэсьлена. Яна зьяўляецца вартаўніком парадку й знаходзіцца ў дыспазыцыі заканадаўчай улады.

З гэтых некалькіх вышэйзгаданых прыкладаў вынікае, што мілітарная сіла павінна стаяць выключна ў абароне народу як цэласьці, а не на баку якой-небудзь распалітыкаванай партыі. Тая армія ёсьць годная высокага званьня, якая

сваю дзейнасьць абмяжоўвае да заданьняў ёй даручаных, выконваючы іх у духу ляяльнасьці да свайго ўраду й дэмакратычнай канстытуцыі.

(„Аб'еднаньне" № 3 (83), Лёндан, 1960 г.)

Халодная вайна

У дадатку „Калчэр" да ангельскай газэты „Дзі Таймс" ад 12 траўня 2002 г. паведамляецца пра выхад кнігі Дэвіда Стафарда „Спайс бэніц Бэрлін" („Шпіёны пад Бэрлінам"). Была гэта цікавая гісторыя. Як вядома, Другая Сусьветная вайна закончылася перамогай саюзьнікаў над Нямеччынай. Вораг быў пабіты, пакараны, а ягоныя саўдзельнікі таксама атрымалі пакараньне. Здавалася, ворагаў ужо няма й застаецца жыць спакойна ды цешыцца дасягнутай перамогаю. Аднак неўзабаве праявілася непрымірымая варожасьць паміж саюзьнікамі. 24 чэрвеня 1948 г. пачалася блякада Бэрліну саветамі з мэтаю выгнаць саюзьнікаў зь іхных сэктараў гораду. Тады павісла г.зв. „жалезная заслона", якая аддзяліла камуністычны сьвет ад рэшты сьвету. На савецкую блякаду амэрыканцы й брытанцы адказалі масыўнай паветранай дастаўкаю ежы, паліва й іншых неабходных рэчаў для 2,4 мільёна немцаў у сваіх акупацыйных сэктарах. Зроблена было 153 530 паветраных палётаў у Бэрлін. Сталін прызнаў паразу блякады й зьняў яе ў траўні 1949 г. У тым самым 1949 годзе быў створаны блёк НАТО, але ён не ўяўляў рэальнай сілы. Паабапал „жалезнай заслоны" суадносіны сілаў выглядалі як 125 на 14 дывізіяў — на карысьць СССР. Была гэта праблема для заходніх эўрапэйскіх краінаў. Надзея ўскладалася на ЗША й іхную атамную бомбу, як на галоўнага саюзьніка, калі раптам дойдзе да вайны з Савецкім Саюзам.

„Халодная вайна" пачалася. Савецкі Саюз ад даўжэйшага часу верыў, што камунізм можа запанаваць толькі ў выніку вайны й зьнішчэньня капіталізму. А ў Злучаных Штатах спадзяваліся, што камунізм і Савецкі Саюз заваляцца яшчэ да таго, як распачнецца новая сусьветная вайна. Аднак і Савецкі Саюз, і ЗША распачынаць вялікую вайну баяліся, бо баяліся той новай зброі, якой быў атам. Напрыклад, адна пад-

водная лодка несла ў сабе большую зьнішчальную сілу, чым усе бомбы, скінутыя ў часе Другой Сусьветнай вайны. Таму Савецкі Саюз правакаваў да распачынаньня войнаў меншыя камуністычныя краіны супраць капіталістычных дзяржаў ды аказваў ім сваю дапамогу. Гэтак у 1950 г. пачалася Карэйская вайна дый шмат дзе на азіяцкім і афрыканскім кантынентах успыхнулі збройныя канфлікты.

Склаліся такія абставіны, што заходнім саюзьнікам трэба было зьмяніць свае адносіны да немцаў, нядаўніх сваіх ворагаў, і іхных „калябарантаў" з Усходу, бо „халодная вайна" пагражала вайной гарачай. Як камуністычная Масква, так і антыкамуністычныя Вашынгтон і Лёндан зьвярнулі ўвагу на нямецкіх палітыкаў, навукоўцаў і інжынераў, шукалі іх, каб выкарыстаць іхныя веды дзеля сваіх навуковых досьледаў і тэхналёгіі. А Сталіну карцела яшчэ ў вайну, каб як найбольшую колькасьць сваіх грамадзянаў, што былі варожыя да камуністычнай сыстэмы, вярнуць з Захаду. Напачатку заходнім аліянтам гэтае было на руку, каб ня мець клопату й кошту ўтрыманьня гэтых людзей — і так Вялікай Тройкай было пастаноўлена ў Ялце.

Заходнім саюзьнікам пашанцавала, калі да іх патрапіў нямецкі ген. Рэйнхард Гелен, які загадваў нямецкай разьведкай за лініяй усходняга фронту. Па вайне ягоныя людзі засталіся на Ўсходзе й слалі свайму босу інфармацыю, якою Гелен дзяліўся з заходнімі саюзьнікамі. Па вайне савецкія рэпатрыяцыйныя місіі свабодна разьяжджалі па лягерох уцекачоў у Заходняй Нямеччыне, што паходзілі з Савецкага Саюзу, і намаўлялі іх вярнуцца на радзіму, а некаторых дык і выкрадалі. Камуністы мелі сваіх шпікоў у гэтых лягерох. Генэрал Гелен, каторы добра ведаў настроі савецкіх уцекачоў, дарадзіў заходнім палітыкам выкарыстаць іх, а сярод іх і беларусаў, дзеля выкрыцьця савецкіх шпіёнаў у лягерох. У такой сытуацыі, якая нагадвала вайну, заварушыліся заходнія аліянты, якія яшчэ нядаўна аддалі Сталіну мільёны савецкіх грамадзянаў, шукаючых прытулку на Захадзе, на яўную сьмерць і пакуты. Цяпер гэтыя людзі, праціўнікі камуністычнай сыстэмы, былі патрэбныя Захаду, але іх ужо было ня так многа. Неўзабаве пачаліся пошукі ахвотнікаў-дывэрсантаў сярод іх.

Быў пачатак 1950 г., калі й я атрымаў ліст ад ачольніка Беларускага Вызвольнага Фронту, сп. Зарэчнага, у якім ён прасіў мяне спаткаць яго аднаго вечара на станцыі Вікторыя ў Лёндане. Спатканьне адбылося. Па дарозе да ягонай кватэры, што была недалёка ад станцыі, Зарэчны зайшоў у краму, купіў трунак, закуску, і, калі мы падыходзілі да ягонага жытла, сказаў мне крыху застацца адзаду й, як ён расчыніць дзьверы хаты й пераступіць парог, скочыць усьлед за ім. Як ён сказаў, так я й зрабіў.

Зарэчны займаў адзін вялікі пакой. Мне ў вочы трапіла новенькая пішучая машынка на стале зь беларускім кірылічным шрыфтам. Варта сказаць, што сапраўднае прозьвішча Зарэчнага было Людовік Галубовіч, які быў менскім энкавэдыстам. У вайну быў паранены ў нагу, патрапіў ў палон, і немец хацеў яго, як энкавэдэшніка, застрэліць, але Галубовіч адпрасіўся ад сьмерці. Так мне, прынамсі, расказваў сам Галубовіч-Зарэчны. Паказаў мне свой дыплём маёра Беларускай Краёвай Абароны (БКА) й некаторыя здымкі беларускіх афіцэраў у іншых арміях. Калі мы выпілі па кілішку, Зарэчны прыступіў да справы. Ён ведаў, што я зьяўляюся сакратаром арганізацыі Хрысьціянскага Аб'яднаньня Беларускіх Работнікаў Вялікабрытані (ХАБР), ведаю людзей з нашае арганізацыі й буду яму дапамогаю. Зарэчны папрасіў мяне даць адпаведных кандыдатаў на дывэрсантаў. На гэтае я яму адказаў проста, маўляў, калі-б гэта была вайна Захаду з Савецкім Саюзам, дык я дапамог-бы яму, а закідаць людзей у мірны час, як дывэрсантаў, гэта паслаць іх на яўную сьмерць. Тут Зарэчны ня вытрымаў і мацюгнуўся на мяне, але зараз-жа перапрасіў і сказаў, што ён хацеў пабачыць, як я зарэагую на яго. Я зарэагаваў спакойна, быццам нічога не здарылася. Увесь вечар і ўсю ноч мы правялі пры стале, гаворачы пра нашыя беларускія справы, і толькі раніцою, калі пачала хадзіць падземная чыгунка, я паехаў дамоў. Зарэчны доўга ня быў у Англіі, паехаў у Нямеччыну, скуль прыехаў. Вёў са мною перапіску й, як я ажаніўся, прыслаў у сакавіку 1953 г. тэлеграму з пажаданьнямі. Па некаторым часе я даведаўся, што Зарэчны памёр.

Як беларусаў, так і другіх ахвотнікаў з Савецкага Саюзу, амэрыканцы школілі на дывэрсантаў у Нямеччыне й за-

сылалі іх на радзіму. Але ніхто зь іх не вярнуўся назад. Ангельскія разьведчыкі Джордж Блэйк і Гарольд Фільбі працавалі на карысьць савецкага боку й давалі знаць, калі й дзе будуць скідаць на парашутах дывэрсантаў, і на іх ужо чакалі. Пра беларускіх дывэрсантаў, якіх злавілі, пэўны час пісала газэта „Голас Радзімы".

Калі ў 1956 г. у Лёндан мелі прыехаць Хрушчоў з Булганіным, да мяне, як да сакратара ХАБР, прыйшлі двух англічанаў са свае разьведкі й пыталіся, ці плянуе нашая арганізацыя нейкую злачынную дзейнасьць супраць „гасьцей" з Масквы? Я сказаў, што ХАБР не займаецца злачынствамі, толькі матэрыяльнай дапамогай сваім суродзічам ды праводзіць беларускую нацыянальную работу. Тады адзін з гэтых англічанаў папрасіў даць яму часопіс „Аб'яднаньне", які выдавала наша арганізацыя.

У часе „халоднай вайны" амэрыканскія інжынеры пракапалі пад Бэрлінам тунэль, да тэлефанічнай лініі, і ўсе загады, якія йшлі з Масквы ў Галоўную кватэру Чырвонай Арміі ў Нямеччыне браліся на плёнку. Джон Лофтус у сваёй кніжцы „Дзі Беларус Сікрэт" („Беларускі сакрэт") крытыкуе беларускіх дзеячоў на эміграцыі за супрацоўніцтва з фашыстамі, але піша, што калі ў 1953 г. быў пракапаны гэты тунэль, дык беларусы пераглумачвалі шматтомную савецкую размову на ангельскую мову. Іншыя займаліся досьледамі й перакладамі для Дзяржадэпартаманту і ўрадавых агенцыяў. 22 красавіка 1956 г. рускія даведаліся пра тунэль й выкарыстоўвалі яго для дэзінфармацыі. Захад-жа трактаваў тунэль як сваё дасягненьне, перакананы, што мае аб'ектыўную інфармацыю адносна савецкай палітыкі ў дачыненьні да Бэрліна ды пра іншае.

Палітыка „халоднай вайны" доўжылася ад 1948 па 1991 г. У пару Гарбачова ў Савецкім Саюзе пачалі адбывацца зьмены. Хаця Савецкі Саюз уяўляў зь сябе ў тым часе магутную мілітарную сілу, але эканамічна ён адставаў ад ЗША й іншых эўрапэйскіх краінаў. Мясцовая прадукцыя не магла задаволіць патрэбы насельніцтва, дый была нізкай якасьці. Ва ўсходнеэўрапэйскіх краінах, дзе камунізм быў гвалтоўна накінуты Масквой, стаялі часткі Чырвонай Арміі, а дзесяцігадовая вайна ў Афганістане сталася трагедыяй для савецкага

народу й аслабляла й без таго слабую эканоміку краіны. І калі Гарбачоў даў знаць сваім сатэлітам, што СССР ня можа далей аказваць ім дапамогі, дык іхная камуністычная сыстэма зламалася. Народы замянілі рабства на свабоду, што сталася і ў самай Маскве ў жніўні 1991 г., дзякуючы таму, што армія ня стала на бок старога камуністычнага рэжыму.

(„Рунь" № 48, Вільня, 19 ліпеня 2002 г.)

Прычыны грамадзянскіх і міжнародных войнаў (для прыкладу — Югаславія)

Адносіны чалавека да чалавека, народу да народу, не заўсёды былі прыязныя. Прычыны былі розныя, пераважна прыватныя, палітычныя, нацыянальныя непаразуменьні й пасяганьні на чужую тэрыторыю. Такія зьявы выклікалі й выклікаюць сярод людзей войны, а зь імі цярпеньні й перажываньні не аднае сям'і.

Не апошнюю ролю ў адносінах між людзьмі адыгрывае рэлігія. Не было на сьвеце людзей, пачынаючы ад біблейнага Аўраама, каб не належалі яны да тае ці іншае веры. І часта, праз гэтыя веры, пачыналіся войны. Як раней, так і цяпер гісторыя паказала, што многа людзкой крыві пралілося й праліваецца цяпер з прычыны рэлігійнага фанатызму. Мы ведаем зь Бібліі як ваявалі жыды ў старажытнасьці за захаваньне чысьціні свае веры й дзяржаўнай незалежнасьці супраць вялікіх і магутных імпэрыяў. Ведаем мы й пра войны Рымскай імпэрыі, якая сілай пашырала свае межы.

З прыходам на зямлю Ісуса Хрыста, зь Ягоным вучэньнем свет уваходзіць у новую эру — хрысьціянскую. Ісус Хрыстос востра выступаў супраць усякіх войнаў, асуджаў прасьлед і зьнявагу чалавека чалавекам, і прапаведаваў любоў сярод людзей, тлумачыў, што ўсе яны роўныя перад Богам. У Евангельлі чытаем: „Палюбі бліжняга свайго, як самога сябе" (Мць. 22:39).

Навука Хрыста знаходзіла зацікаўленьне сярод людзей і цэлых народаў і з часам вялікая частка тагачаснага сьвету прыняла вучэньне Хрыста й людзі сталіся хрысьціянамі. Па назову былі яны хрысьціянамі, але ў сваіх дзеяньнях як былі, так і засталіся паганамі. Хрысьціянства не

зьмяніла многіх навыкаў і натуры чалавека. Войны як ішлі, так і працягваліся, толькі гэтым разам нават пад сьцягам хрысьціянскай веры. А „сьвятыя войны" часам былі больш страшныя за паганскія.

Для прыкладу прывядзем паходы крыжаносцаў у Сьвятую Зямлю. Іхнімі арганізатарамі й інсьпіратарамі былі рымскія папы, якія падбухторвалі народы Заходняй Эўропы на паходы, а ўзброеныя каталіцкія біскупы й ксяндзы вялі гэтую цёмную масу народу ня так вызваліць Гроб Хрыста з рук няверных у Палестыне, як пашырыць свае зямельныя ўладаньні й папскую ўладу. Тады-ж замест ехаць у Палестыну, вызваліць Гроб Хрыста, крыжаносцы завярнулі на Канстантынопаль і ў 1204 годзе боем захапілі горад. Аграбілі яго й зьняважылі катэдру сьв. Сафіі. Такая гэта была маральная вартасьць і сьвятасьць Рымскай царквы й яе рыцараў з нашытымі крыжамі на плячуку вопраткі.

Маецца многа прыкладаў брутальнай дзейнасьці Рымскай царквы да хрысьціян, якія не жадалі падпарадкавацца рымскаму папу й за гэта наражалі сябе на пакуты й сьмерць. Прывядзем прыклады з так званымі „катарамі" (чыстымі ў веры), якія жылі ў паўднёвай Францыі й не хацелі падпарадкавацца волі папы. Тады III Лятэранскі сабор у 1179 годзе аб'явіў крыжовы паход супраць апорных. Гэта самае было з альбігойцамі (ад гораду Альбі, што ў паўднёвай Францыі). Тады папа Інакент III паклікаў супраць „гэрэтыкаў" рыцараў, абяцаючы ім тыя самыя правы, якімі карысталіся крыжаносцы ў паходах у Сьвятую Зямлю.

Альбігойскія войны працягваліся доўга (1209-1229) і нанеслі цывілізаванай краіне спусташэньне. Пасьля аднае выправы (22 ліпеня 1209) яе кіраўнік, папскі прадстаўнік, так рапартаваў свайму гаспадару ў Рыме: „Блізка дваццаць тысяч грамадзянаў былі аддадзены пад меч, не зважаючы на век і пол".

Як дапаможны дзейнік экспансіі Рымскай царквы й адначасна абароны яе ад „сатаны" й рознай „гэрэзіі" й „схізмы" ў 1231 годзе папам Рыгорам IX была створана Сьвятая інквізыцыя. Інквізытары адзначаліся лютасьцю, да сваіх ахвяр прымянялі катаваньні, праводзілі суды пры закрытых дзьвярах і выносілі судовыя кары. Хто прызнаўся да віны, цярпеў пакуты, а хто не — ішоў у турму або на кась-

цёр. Дзейнасьць Сьвятой інквізыцыі гэта доўгая гісторыя, каб яе апісаць, але дастаткова сказаць, што быў гэта не хрысьціянскі, а чартоўскі інстытут, якім карысталася Каталіцкая царква на працягу стагодзьдзяў пад старшынством непамыльных папаў.

У часе культурнага прагрэсу, ведамага у Эўропе як Рэнэсанас, забойствы палітычных, рэлігійных дзеячоў і прадстаўнікоў навукі Каталіцкай царквой ня толькі апраўдваліся, але інсьпіраваліся. Для прыкладу прывядзем масакру гугенотаў (галоўным чынам пасьлядоўнікаў Яна Кальвіна) у Варфаламееўскую ноч з 23 на 24 жніўня 1572 году й наступныя два дні ў Парыжы. Тады папа Рыгор XIII сказаў: „Тыя, якія служаць іншаму богу як наш і вызнаюць іншую рэлігію, павінны быць зьнішчаны агнём і мячом, а іх гарады разубураны й спалены". Так гэта вучыў рымскі папа, якога Каталіцкая царква лічыць наступнікам апостала Пятра. А ці-ж так вучыў паводзіць сябе апостал Пётр і рэшта вучняў Хрыста? Напэўна не.

Была яшчэ Трыццацігадовая вайна (1618-1648) у Сьвяшчэннай Рымскай імпэрыі, якая насіла рэлігійны характар. У час вайны за дзяржаўную незалежнасьць у Паўночнай Амэрыцы яе лідэры ў Дэклярацыі незалежнасьці Амэрыкі (1776) напісалі: „Усе людзі створаны роўнымі, сярод якіх ёсьць права на жыцьцё, права на свабоду й права імкненьня да шчасьця". Супраць такіх ідэалаў Французскай і Амэрыканскай рэвалюцыяў выступала Каталіцкая царква, якая хацела далей трымаць народы ў прыгнёце.

У сярэдневякой Эўропе рэдка якая вайна не была рэлігійнай, нягледзчы што яе людзі былі адной хрысьціянскай веры, толькі розных адгалінаваньняў і гэта не падабалася рымскім папам.

Шмат дзе ўспыхвалі лякальныя войны, як на Балканах пад турэцкай дамінацыяй, пакуль не прыйшло да Першай Сусьветнай вайны, дзе хрысьціяне ваявалі супраць хрысьціян. Тады-ж кожная дзяржава спасылалася на свае правы й ня менш на Божую дапамогу, а сьвятары бласлявілі войска й зброю на перамогу над ворагамі-хрысьціянамі.

Першая Сусьветная вайна, якая пачалася 1 жніўня 1914 г., а закончылася 11 лістапада 1918 г., мела даць па-

чатак вечнаму міру на зямлі, як гэта стараўся зрабіць прэзыдэнт ЗША В. Вільсан у Парыжы, але ён моцна памыліўся. Нават Мірная канферэнцыя была настолькі расчараваная рознымі канфліктамі, што яе ўдзельнікі стараліся, каб як найхутчэй закончыць гэты разнабой і вярнуцца дамоў. Што праўда, стварылі яны Лігу Нацыяў дзеля міжнароднага парадку. Але тыя, што стварылі Лігу, ня ўсе ўвайшлі ў яе, а іншыя неўзабаве выступілі зь яе. І пасьля падпісаньня Вэрсальскага мірнага дагавору французскі маршал Фош сказаў: „Гэта ня ёсьць мір, гэта ёсьць перамір'е на дваццаць гадоў". І так яно сталася.

Якраз дваццаць гадоў пазьней пачалася Другая Сусьветная вайна. Аб ёй ня будзем гаварыць многа, бо жывуць яшчэ яе ўдзельнікі й яны яе добра знаюць. Але пасьля заканчэньня гэтай страшнай вайны яе пераможцы заснавалі Арганізацыю Аб'яднаных Нацыяў, якая мела палажыць канец усім канфліктам і войнам. І яна нічога не зрабіла, бо-ж толькі пару гадоў пасьля заканчэньня Другой Сусьветнай вайны пачалася „халодная вайна" паміж былымі саюзьнікамі — Савецкім Саюзам і заходнімі дзяржавамі. Утварылася так званая „жалезная заслона". Такія адносіны Ўсходу да Захаду прывялі да гарачай вайны ў Карэі й В'етнаме, вайны жыдоў з арабамі. У Самаліі 300 тысяч памерла, а мільёны засталіся бяздомнымі, калі пачалася вайна. У Паўднёвай Афрыцы белыя й чорныя змагаюцца за палітычны кантроль, ды нават чорныя б'юцца між сабою. Маецца ўжо больш за 10 тысяч забітых у Афрыцы, Азіі й Паўночнай Амэрыцы.

Больш за дваццаць гадоў ідзе змаганьне ў Паўночнай Ірляндыі. Тут моцны і варожы рэлігійны падзел паміж пратэстантамі й католікамі, дзе адзін аднаго забівае ў белы дзень і цёмную ноч. Нешта падобнае наглядаецца ў Індыі паміж гінду й мусульманамі, і ў Ліване паміж мусульманамі й хрысьціянамі.

Калі разваліўся Савецкі Саюз, тады й сярод яго народаў пачаліся канфлікты. Маецца больш за тысячу забітых у Грузіі, сотні загінула ў Малдове. А колькі памерла ў вайне Армэніі з Азэрбайджанам?! Ды нават у Расейскай Фэдэрацыі некаторыя народнасьці дамагаюцца сваіх незалежных рэспублік.

З развалам Савецкага Саюзу, калі яго народы адчулі вясну дзяржаўнай незалежнасьці, тады й у Югаславіі да ўлады пачалі даходзіць партыі, якія прадстаўлялі аснаўныя нацыянальна-рэлігійныя групы насельніцтва. Ужо на пачатку сямідзесятых гадоў рабіліся спробы падзелу Югаславіі. Пушчалася ў ход няясная палітычная й эканамічная інфармацыя, што сэрбы дамінуюць, а адны рэспублікі выкарыстоўваюць іншыя рэспублікі. Зрабіць баланс даходаў і страт кожнай рэспублікі справа ня так простая. І ў гэтай сфэры найбольш дзейнічаў харвацкі нацыяналізм.

25 чэрвеня 1991 году Харватыя й Славэнія дэкляравалі сваю незалежнасьць і пачалі аддзяляцца ад Югаслаўскай Фэдэрацыі. За іх прыкладам пайшлі Македонія й Босьнія. Засталіся толькі Сэрбія й малая Чарнагорыя. Харваты пачалі вяртаць свае фашыстоўскія сымбалі, салютаваньні, песьні з часу вайны, якія наводзілі страх на сэрбаў. І зусім зразумела, што сэрбы з гэтым не хацелі пагадзіцца, памятаючы што зь імі рабілі харваты ў сваёй незалежнай фашыстоўскай дзяржаве. У Харватыі й Славэніі жыла значная колькасьць сэрбаў. Замест таго, каб знайсьці талковае паразуменьне з сэрбамі, харваты пачалі іх прасьледаваць, што прывяло да закалоту.

Скуль узяліся гэтыя сэрбы, харваты, славэнцы, басьнякі й іншыя народнасьці на Балканах? Гісторыя мала іх знае. Вядома, што ў VI стагодзьдзі нашай эры з поўначы перайшлі Дунай славяне й аселі на Балканах (чытай на стар. 733 „Нашыя пабрацімы на Балканах"). Тады быў адзін славянскі народ, які гутарыў на адной славянскай мове й меў свае племянныя традыцыі й праз сотні гадоў называлі іх толькі па геаграфічнай прыналежнасьці. У той час, у VI-VII стагодзьдзі, славяне ня мелі свайго пісьма, каб маглі нешта зафіксаваць аб сабе. Аб іх пісалі візантыйскія аўтары й часта прадстаўлялі славян як варвараў.

Раней сярод „варвараў" не было канфліктаў, з часам сэрбы й харваты карысталіся пісьмом сьвятых Кірылы й Мяфодзія — глаголіцай і гаварылі на адной мове. Назовы іх паходзяць ад вядучых плямёнаў, або тэрыторыі, якую засялялі. Сэрбы жылі на тэрыторыі харватаў ад IX стагодзьдзя й садзейнічалі ў стварэньні харвацкай дзяржаўнасьці. Але

таму, што па тэрытарыяльнай і рэлігійнай розьніцы жыхары гэтых правінцыяў Балканаў былі памешаны між сабою, жылі пераважна групамі на вёсках, а ў горадзе дзялілі іх вуліцы, таму й пачалася між імі тэрытарыяльная барацьба за аўтаномію. Адна толькі Славэнія, якая налічвала 90% славэнцаў-католікаў, пазьбегла гэтай вайны. Ёсьць гэта вайна ня так этнічная, як рэлігійная.

Пасьля ўзаемнай ненавісьці й бойкі зроблены былі захады й падпісана згода паміж католікамі й мусульманамі Босьніі на новую канфэдэрацыю й у яе хочуць уцягнуць праваслаўных. Ініцыятарам такой канфэдэрацыі зьяўляюцца ЗША. Цяжка паверыць, каб гэта было практычнае аб'яднаньне славян-братоў. Ёсьць гэта палітычнае аб'яднаньне, скіраванае супраць праваслаўных сэрбаў, якія кантралююць 70% тэрыторыі Босьніі й Герцагавіны. Хоць заціхла сярод гэтых трох канфэсіяў страляніна, але хвалюе пытаньне: на як доўга? Згоды паміж гэтымі народамі няма даўно, а апошнія ўзаемныя злачынствы ня могуць быць забытымі так лёгка й проста. Адзін каталіцкі ксёндз, харват, сказаў: „Якое можа быць сужэнства, калі няма любові". Замест любові хаваецца закансьпіраваная варожасьць, ненавісьць, помста.

Аб фэдэрацыі трэба было гаварыць пару гадоў таму, калі пачынаўся канфлікт і развал фэдэрацыі, а не яго падтрымоўваць і прызнаваць незалежныя дзяржавы, як Славэнію, Харватыю й г.д. Здаецца, што найлепшай разьвязкай для гэтых трох канфэсіяў на будучыню, каб пазьбегчы далейшага праліцьця крыві, можа быць толькі развод, а не сужэнства. Югаславія — гэта краіна, у якой усё можа здарыцца. Былі там два алфавіты, тры рэлігіі, чатыры мовы, пяць нацыянальнасьцяў і шэсьць рэспублік.

Адыход Славэніі й Харватыі зь Югаслаўскай Фэдэрацыі выклікаў разыходжаньні сярод заходніх дзяржаваў у пошуках разьвязкі югаслаўскага крызісу. Былыя саюзьнікі Харватыі з апошняй вайны сталі за падзел паўднёвых славян. Але Англія, ЗША, Францыя й у той час СССР рабілі захады каб захаваць фэдэрацыю й вярнуць ёй стабільнасьць. Прэзыдэнт Буш прапанаваў заходнеэўрапэйскім саюзьнікам стрымацца ад дыпляматычнага прызнаньня Харватыі й Славэніі. Прапанова ЗША была спозьнена, развал паўднёваславянскай

фэдэрацыі пачаўся, а пад націскам Нямеччыны большасць эўрапэйскіх краін пастанавілі прызнаць незалежнасьць Харватыі й Славэніі не пазьней як 15 студзеня 1992 году.

Ужо пасьля Другой Сусьветнай вайны Захад быў зьвязаны з тэрарыстычнай дзейнасьцю ўсташаўцаў, былых саюзьнікаў немцаў у часе вайны. З розных краін ехалі харваты ў Нямеччыну, дзе іх школілі й адсюль засылалі ў Югаславію. У 1962 годзе група харвацкіх эмігрантаў падлажыла бомбу пад югаслаўскае пасольства ў Боне, у выніку чаго забіты быў урадавец. Кансьпіратарамі віннымі забойства аказаліся Пэрціч, каталіцкі ксёндз Садыч Скока (сталі яны перад судом і апошні артымаў чатыры гады зьняволеньня). Былі тэрарыстычныя дзеяньні ўсташаўцаў у Аўстраліі ў 1965 годзе й у ЗША у 1967 годзе. Аднак суды не стрымалі дзейнасьці тэрарыстаў-усташаўцаў.

Дакладныя межы народаў былой Югаславіі, за якія ідзе барацьба, ніколі не былі вызначаны й іх цяжка вызначыць. Як за фашыста Антэ Павэліча, лідэра харватаў у часе апошняй вайны, так і ў Цітавай фэдэрацыі, граніцы на тэрыторыі сэрбаў і іншых народаў фэдэрацыі вызначаліся на карысьць харватаў, бо-ж Ціта быў харвацка-славэнскага паходжаньня. Цітаўская фэдэрацыя ня мела свабоднага разьвіцьця, што ў канцы прывяло да падзелу, ненавісьці й барацьбы братніх народаў, якія выраслі з аднаго кораня. Тут спатрэбілася дапамога міжнароднай арганізацыі, каб спыніць далейшую грамадзянскую вайну.

Амаль увесь сьвет бачыць „віну" сэрбаў, быццам, бяз дай прычыны нарушылі спакой у Югаславіі. Факт аднак той, што ня сэрбы нарушылі спакой, ня сэрбы пачалі канфлікт. Мала хто разумее, што на тэрыторыі былой Югаслаўскай Фэдэрацыі жыве многа сэрбаў і што ў грамадзянскай вайне гінулі ня толькі харваты й мусульмане, але й сэрбскія сем'і, гарэлі сэрбскія дамы й вёскі. Мусульмане й каталікі атакавалі й мардавалі сэрбаў. Найбольш уцекачоў з Харватыі прыпадае на сэрбаў. Таму варта заглянуць у гісторыю й пацікавіцца мінулым народаў Югаславіі й іхнімі праблемамі, якія прывялі да канфлікту й узаемнай ненавісьці. Канфлікты ёсьць і вельмі старыя, і ня так даўнія. Старыя крыўды не забытыя, а новыя, з апошняй Сусьветнай вайны, паўстаюць жывымі.

Адной з прычын канфлікту зьяўляецца вера Магамэта (VI ст.), якая аб'яднала арабаў і пачала наступ на хрысьціян. Магамэтанская вера аснаваная на жыдоўскім і хрысьціянскім вучэньнях, але ў яе ўведзены некаторыя навінкі, напрыклад, адабрэньне экспансіі. Арабы пашыралі сваю веру й уладаньні, нясучы ў адной руцэ Каран, а ў другой — меч. Каран вучыў, што Бог на баку ваюючых, і таму, хто загіне на вайне ў імя Алаха, будзе забясьпечана царства нябеснае. Галоўнай мэтай арабаў было падпарадкаваньне сьвету ісламу. І гэтая справа пашыралася хутка. На працягу VIII стагодзьдзя ўся Паўночная Афрыка ад Пірынэяў да Цэнтральнай Індыі, знаходзілася пад уплывам магамэтан.

У 1000 годзе туркі прынялі веру Магамэта й пачалі свой наступ на Балканы. На занятай тэрыторыі атаманскія кіраўнікі ўважалі сябе ня так за нацыянальных прадстаўнікоў, як за рэлігійных. І той, хто прымаў ісламу, станавіўся сябрам прывілеяванага таварыства. Таму многа арыстакратаў, каб захаваць свае прывілеі, прыняло ісламу.

У канцы VIII і на пачатку IX стагодзьдзяў славэнцы папалі пад залежнасьць ад немцаў, а харваты — ад франкаў. Нямецкія й франконскія місіянеры навярнулі іх на заходнюю каталіцкую веру. Сэрбы, якія знаходзіліся пад Візантыйскай імпэрыяй, прынялі ўсходнюю веру — праваслаўную. Для большасьці жыхароў Балканаў прыняцьцё хрысьціянства, а пасьля падзел Царквы ў 1054 годзе выклікалі недавер і гнеў. У гэтым ужо часе добра быў вядомы розгалас непаразуменьняў паміж двума царкоўнымі цэнтрамі — Канстантынопалем і Рымам.

Напрыклад, папа Луцый III (1181-1185) пачаў нагонку на праваслаўных сэрбаў, якіх назваў „паклёпнікамі Сьвятой царквы", „няшчасьцем Царквы, „захопнікамі" й т.п. Такія рэлігійныя эпітэты, як тады, так і пазьней, дзеляць сэрбаў ад харватаў і славэнцаў ды выклікаюць паміж імі варожасьць.

Ня трэба забываць, што тысячагадовая візантыйская цывілізацыя пакінула глыбокі сьлед сярод шмат якіх прымітыўных народаў. Таксама й на Балканах паўсталі незалежныя або аўтаномныя палітычныя цэнтры на чале з каралямі, князямі й іншымі лідэрамі.

Адным з больш дзейных славянскіх народаў Балканаў былі сэрбы. Тварцом іхняй дзяржаўнай незалежнасьці быў Сьцяпан Неманія, які пайшоў у манастыр Студзеніца ў 1196 годзе. Яго два сыны, Сьцяпан і Сава, занялі ганаровыя месцы ў гісторыі Сэрбіі. Сьцяпан здабыў для Сэрбіі юрыдычную незалежнасьць ад Канстантынопаля ў 1200 годзе й стаў каралём. Каранаваў яго папскі легат у 1217 годзе, але кароль Сьцяпан поўнасьцю застаўся верным праваслаўнай веры й саюзу з Канстантынопалем. Яго другі раз каранаваў, паводле праваслаўнага абраду, ягоны брат Сава, які стаў першым незалежным архіепіскапам Сэрбіі й адным з папулярных сьвятых Сэрбскай царквы.

На асаблівую ўвагу заслугоўвае князь Сьцяпан Душан (1333-1355). Прыняў ён тытул цара, а час ягонага царствованьня адзначаецца найбольшай магутнасьцю Сэрбіі. Але пасьля сьмерці Душана ягоная імпэрыя распалася на некалькі дробных княстваў. А пасьля прайгранага бою на Косавым Полі 28 чэрвеня 1389 году сэрбы апынуліся пад турэцкай кантроляй аж да 1804 году.

У 1439 годзе была заключана, так званая, Фэрара-Флярэнційская вунія паміж Праваслаўнай і Каталіцкай цэрквамі, за якую папа Яўген IV абяцаў грэкам крыжовы паход супраць туркаў, але гэтай дамоўленасьці ня стрымаў. Пад націскам ваяўнічай Асманскай імпэрыі ў 1453 годзе туркі боем захапілі Канстантынопаль. Была гэта сапраўдная трагедыя для Праваслаўнай царквы й яна адчуваецца нават сёньня. У 1463 годзе туркі авалодалі Босьніяй, у 1467 годзе — Альбаніяй і ў 1482 годзе — Герцагавінай. Туркі налажылі на хрысьціян вялікія падаткі й такім чынам змушалі людзей прымаць веру Магамэта. Прынялі яе пераважна феадалы й былыя продкі гэрэтыкаў-багамілаў, якіх жорстка прасьледавалі каталікі-мадзьяры ў час свае акупацыі й таму яны ахвотна прынялі іслам у 1463 годзе. За гэта туркі далі ім важныя адміністрацыйныя пасады ў кіраваньні над сваімі хрысьціянскімі пабрацімамі.

Новыя магамэтане захавалі сваю мову, але прынялі вонкавы выгляд туркаў і таму славяне называлі іх „туркамі". Належалі яны да сэкты сунітаў. Але сёньняшнія мусульмане Босьніі й Герцагавіны гэта, як бачым, не арабы й ня туркі,

а славяне, якія прынялі іслам. Аднак іхняя традыцыя абраднасьці й самое веры ня ёсьць такія строгія як у арабаў.

Праваслаўная царква пад туркамі мела пэўную аўтаномію дзеля рэгуляваньня бягучых спраў. Гэтым яна, хоць часткова, перахоўвала нацыянальныя пачуцьці сэрбаў, але вялікай уладай не карысталася. І калі аўстрыйскія войскі ўвайшлі на Балканы, мясцовае насельніцтва супрацоўнічала з новым акупантам. А калі ў 1698 годзе аўстрыйцы адступілі з Македоніі, разам зь імі пакінула краіну 40 тысяч сем'яў на чале з праваслаўным патрыярхам, каб пазьбегчы турэцкага прасьледу.

Паўднёвыя славяне-хрысьціяне Балканаў зазналі многа крыўды ад туркаў-магамэтан на працягу стагодзьдзяў, але яны аказаліся той сьцяной, праз якую ня мог прабіцца іслам у Эўропу. І толькі на пачатку XIX стагодзьдзя народы Балканаў пачалі бунтавацца й вызваляцца з-пад турэцкай дамінацыі.

У 1804 годзе супраць туркаў выбухла першае паўстаньне сэрбаў пад кіраўніцтвам Карагеоргія. У другім паўстаньні 1815 году Сэрбія дабілася аўтаноміі, а ў 1833 годзе паўстала Сэрбскае Княства. У далейшай барацьбе сэрбы дабіліся ад туркаў у 1878 годзе поўнай незалежнасьці.

Харваты мелі сваё каралеўства ў 924 годзе, але ніколі ня мелі сілы абараніцца ад інтэрвэнтаў. Яны найбольш зьвязаныя былі з мадзьярамі, а ў 1527 годзе запрыязьніліся з Аўстрыяй. Пасьля Мадзьярскай рэвалюцыі 1848-1849 гадоў Харватыя й Славэнія ўвайшлі ў Аўстра-Мадзьярскую імпэрыю й былі там да канца Першай Сусьветнай вайны. У 1878 годзе Аўстрыя акупавала Босьнію.

Пасьля стагодзьдзяў турэцкай і аўстрыйска-мадзьярскай і вэнэцыянскай акупацыяў, на пачатку XX стагодзьдзя „адкрываецца" новая й больш сьветлая будучыня для славянаў на Балканах. Нацыянальныя амбіцыі гэтых народаў насьпелі да таго, што ў 1912 годзе Грэцыя выступіла вайной супраць Турцыі й выйграла вайну. Але тут-жа пачалася вайна паміж сэрбамі й балгарамі за Македонію. Сэрбія выйграла канфлікт і атрымала амаль усю паўночную Македонію. Паўднёвая Македонія з Салёнікамі ўвайшла ў склад Грэцыі. Таму сёньня, калі на павестцы дня стала пытаньне незалежнай Македоніі, Грэцыя дамагаецца замяніць яе назоў

і дзяржаўны сьцяг, баючыся, каб не дайшло да аб'яднаньня гэтай краіны, што мела-б прынесьці ўтрату часткі тэрыторыі сучаснай Грэцыі.

Славэнія, Харватыя, як і Босьнія з Герцагавінай засталіся пад Аўстра-Мадзьяршчынай. Апошнія гады перад Першай Сусьветнай вайной мадзьяры дамагаліся ад Аўстрыі незалежнага кіраўніцтва над паловай манархіі. Гэта быў час, калі сэрбы праявілі энтузыязм у барацьбе за аб'яднаньне й незалежнасьць паўднёвых славянаў. Такі энтузыязм прывёў да непрадбачанай сусьветнай катастрофы. Якраз на 525 угодкі паражэньня сэрбскай арміі ў бітве з туркамі на Косавым Полі, 28 чэрвеня 1914 году аўстрыйскі наступнік трону Франц Фэрдынанд, праязджаючы праз горад Сараева, быў забіты. Замардавалі яго сэрбскія кансьпіратары з арганізацыі „Чорная рука". Была гэта помста за далучэньне славянскіх краінаў да Аўстра-Мадзьярскай імпэрыі.

Сэрбскі ўрад ня быў замешаны ў забойства Фэрдынанда й гэта прызнала міжнародная камісія, ды нават нямецкі кайзар, саюзьнік Аўстрыі, спадзяючыся, што апошняя згодзіцца на мір. Але тут не абышлося без парады Ватыкану. Аб гэтым сьведчыць тэлеграма Рытэра, баварскага амбасадара, да свайго ўраду высланая 21 ліпеня 1914 году пасьля гутаркі яго з папам Піем X:

„Папа пахваляе энэргічную акцыю Аўстрыі супраць Сэрбіі й на выпадак вайны ня мае ніякай веры ў расейскую й французскую арміі. Кардынал — сакратар стану мае надзею, што гэтым разам Аўстрыя ня ўступіць; яна рашыцца адбіць з ружжом у руках варожую агітацыю, якая прывяла да забойства наступніка трону й загражае самому існаваньню Аўстрыі. Зь яго выказваньняў адчуваецца страх Курыі Рымскай перад панславізмам".

Так гэта папа Пій X, замест стрымаць Аўстрыю ад праліцьця хрысьціянскай крыві, падбадзёрваў яе на вайну з Сэрбіяй. Так пачалася Першая Сусьветная вайна.

На трэці дзень вайны арцыбіскуп Заграбу, Антэ Баўэр, арганізаваў вялікую працэсію й у казаньні заклікаў харватаў на зьнішчэньне ворага — праваслаўных сэрбаў.

Не чакаючы вынікаў вайны, у ліпені 1917 году на востраве Корфу была падпісана дамоўленасьць паміж Сэрбіяй

і паўднёвымі славянамі аб аб'яднаньні іх пад сэрбскай манархіяй. У дэклярацыі гаварылася, што ў будучай палітычнай арганізацыі паўднёвых славянаў мае быць захаваная палітычная, рэлігійная й культурная роўнасьць у канстытуцыйнай манархіі.

Гэта аднак не адпавядала палітыцы Ватыкану й таму летам 1917 году папскі нунцый Э. Пацэльлі вёў перагаворы з цэнтральнымі дэяржавамі наконт „міру без перамогі", каб уратаваць Нямеччыну й Аўстра-Мадзьяршчыну ад паражэньня ў вайне й гэтым ня даць магчымасьці паўднёвым славянам стварыць сваю незалежную дзяржаву, дзе будзе кіраваць праваслаўны кароль. Паводле папскай прапановы немцы мелі пакінуць Францыю й Бэльгію, але застацца на занятых землях на ўсходзе.

У Першай Сусьветнай вайне Сэрбія ваявала гераічна й пацярпела вялікія людзкія страты. У яе арміі служыла 800 тысяч жаўнераў, зь якіх 356 815 было забітых. Больш за 600 тысяч жыхароў Сэрбіі памерла ў выніку вайны. Але пры канцы вайны, у 1918 годзе, калі Аўстра-Мадзьярская імпэрыя распалася, Сэрбія аказалася сярод пераможных дзяржаваў. У гэты час яна была важным дзейнікам у тварэньні незалежнай дзяржавы паўднёвых славян, маючы ваенную й палітычную важнасьць.

На руінах старой Аўстра-Мадзьярскай імпэрыі паўднёвыя славяне, сэрбы, харваты й славэнцы, 4 сьнежня 1918 году аб'явілі сваё незалежнае фэдэратыўнае каралеўства. Да фэдэрацыі далучыліся Чарнагорыя ды Босьнія й Герцагавіна. Ідэю новай фэдэрацыі падтрымалі заходнія дзяржавы. Для гэтых розных правінцыяў і народаў каралеўства ў 1927 годзе прыняты быў адзін назоў дзяржавы — Югаславія са сталіцай у Бялградзе. Насельніцтва гэтай дзяржавы складалі сэрбы, македонцы, чарнагорцы (праваслаўныя), харваты і славэнцы (каталікі). Былі яшчэ ў югаслаўскай дзяржаве нацыянальныя меншасьці альбанцаў, мадзьяраў, жыдоў, цыганоў, немцаў і іншых. Дзяліліся яны па рэлігійным прынцыпе, у асноўным на праваслаўных, католікаў і мусульманаў. Такім чынам рух за аб'яднаньне паўднёвых славянаў, які пачаўся на пачатку XIX стагодзьдзя, закончыўся толькі пасьля Першай Сусьветнай вайны.

У новай югаслаўскай дзяржаве толькі адна траціна насельніцтва была каталікамі й гэта не падабалася Ватыкану, што імі кіруе нехта другі, а не каталік. І тут Ватыкан праз каталіцкае духавенства Харватыі пачаў дзейнічаць, каб паралізаваць Праваслаўную царкву Югаславіі, зрабіць замяшаньне й пераняць кіраўніцтва ў дзяржаве. Такая дзейнасьць Ватыкану занепакоіла нават некаторых разважных харвацкіх католікаў. Аднак харвацкі нацыяналізм імкнуўся да разьбіцьця югаслаўскай фэдэрацыі на незалежныя дзяржаўкі. Палітыка харвацкага сэпаратызму была вельмі карыснай для Ватыкану й ён яе падтрымоўваў.

Найбольшай этнічнай групай сярод народаў былой Югаславіі былі й засталіся сэрбы, пасьля іх — харваты. І хоць карысталіся яны адной мовай, аднак харваты пішуць лацінкай, а сэрбы — кірыліцай. На жаль, паміж гэтымі двума народамі даўно няма згоды й таму Югаслаўская Фэдэрацыя ня мела моцнага фундаманту, каб утрымацца. Аднак славянскія народы Балканаў не вялі войнаў між сабою, увяла іх Каталіцкая царква праз сваю экспансыўную палітыку й харвацкі нацыяналізм. Як пісаў аднойчы адзін басьнійскі пісьменьнік, „нашыя бацькі, нашыя тыраны, устанавілі сьвет гэты на свой спосаб і змушаюць нас жыць у ім".

Югаславія — калярытная краіна. Яе паўночныя гарады напамінаюць Габсбургскую манархію; Босьнія дыхала турэцкім мусульманствам; Сэрбія перахоўвала глыбокі патрыятызм, сваё слаўнае гістарычнае мінулае й глыбокую сямейную традыцыю, што перахоўвалася ў народных песьнях, а на берагох Дальмацыі, былой Вэнэцыянскай рэспублікі, можна было пачуць італьянскую песьню. Такой багатай была мазаіка насельніцтва Югаславіі.

Бяручы агульна, Югаславія — маладая краіна, але гісторыя яе народаў даволі старая й запоўненая войнамі, інтрыгамі й забойствамі. Гэтыя славянскія народы хацелі завяваць, хоць часткова, балгары, туркі, грэкі, немцы, італьянцы й рускія. І так гэта вялося ад VII стагодзьдзя.

У параўнаньні да іншых эўрапэйскіх дзяржаваў, Югаславія ў міжваенны час была адсталай краінай, дзе акрамя нацыянальных праблемаў, ня менш важнай праблемай быў нізкі ўзровень жыцьця насельніцтва. Восемдзесят працэн-

таў людзей жыло ў вёсках і агульны настрой у іх быў незадавальняючы. Вялася палітычная барацьба паміж сябрамі камуністычнай партыі й правымі ды сэпарастычнымі групамі, якія ў асноўным былі агентамі ў руках нацысцкай Нямеччыны й фашыстоўскай Італіі.

Шмат людзей чулі пра апошняе стагодзьдзе зь яго дыктатурамі й дыктатарамі. Чулі пра канцэнтрацыйныя лягеры й тую мудрую палітыку й палітыкаў, што прывялі сьвет да Другой Сусьветнай вайны. Не апошнюю ролю ў сусьветнай катастрофе адыграла тут і дыпляматыя Ватыкану. Як у Сталіна быў НКУС, а ў Гітлера СД, дык у папы рымскага Пія XII былі ксяндзы й манахі, якія былі гатовы выканаць работу ня горш за НКУС ці СД.

Вялікім няшчасьцем для народаў Югаславіі, а асабліва для сэрбаў, аказалася Другая Сусьветная вайна. Краіна з трох старон была акружана саюзьнікамі Гітлера. Першых восем месяцаў вайны Югаславія захоўвала нэйтральнасьць, але будучы пад націскам Італіі й Нямеччыны, урад Югаславіі паддаўся й 25 сакавіка 1941 году ў Вене падпісаў дакуманты аб далучэньні да Бэрлінскага пакту. Гэтым урад хацеў уратаваць Югаславію ад варожай акупацыі, ведаючы, што сярод славэнцаў і харватаў пануюць прафашыстоўскія й пранацыскія сымпатыі.

Наступнага дня дэпутат ангельскага парляманту Л. С. Амэры, які меў кантакт у Бялградзе, зьвярнуўся праз БіБіСі да югаславянаў, асабліва да сэрбаў, каб яны захавалі свой гонар і адкінулі рашэньне ўраду. Наступнага дня група афіцэраў на чале з генэралам Душанам Сімавічам зрабіла пераварот, захапіла ўладу. Пакт быў адхілены й Югаславія аб'явіла ранейшую нэйтральнасьць. Народы Югаславіі былі задаволеныя пераваротам і людзі гаварылі: „Лепш вайна як пакт" і „Лепш магіла як няволя".

Путч у Югаславіі энтузыястычна быў прыняты ў Лёндане, Вашынгтоне й таксама ў Маскве, якая пачала разумець пляны свайго саюзьніка Гітлера. У позьніх гадзінах 5 красавіка 1941 году Савецкі Саюз падпісаў мірны дагавор аб неагрэсіі зь Югаславіяй. Быў гэта толькі вонкавы пратэст супраць нацысцкай агрэсіі на Балканах. Але ніводная з гэтых дзяржаваў не аказала дапамогі югаслаўскаму народу.

Югаславія аказалася ізаляванай, незабясьпечанай перад нацысцка-фашыстоўскай агрэсіяй краінай. І тут Гітлер не прызнаў справу Югаславіі за прайграную і 6 красавіка 1941 году пачаў супраць яе вайну моцнай бамбёжкай Бялграду, у выніку якой загінула 10 тысяч жыхароў сталіцы. Супраць Югаславіі ішлі 24 нямецкія дывізіі, 23 — італьянскія, 6 мадзьярскіх брыгадаў, якіх успамагалі каля 2 200 баявых самалётаў. Югаслаўская армія была слаба ўзброеная й непрыгатаваная да сучаснай вайны, да таго ўнутры краіны дзейнічалі варожыя сілы. Адзіным фактычным абаронцам незалежнасьці Югаславіі аказаліся сэрбы.

Цяпер настаў час дзеяньня для харвацкага фашыста й каталіцкага фанатыка Антэ Павэліча, які знаходзіўся за мяжой. Выдадзеныя былі загады ўсім усташам быць гатовымі да дзеяньня. Зь Нямеччыны, Аўстрыі й Італіі, разам з акупацыйным войскам, яны сьпяшаліся на граніцу Югаславіі. Не абышлося й без здраднікаў, як палкоўніка Крэна — усташаўца, які самалётам прыляцеў зь Бялграду й прывёз немцам пляны разьмяшчэньня югаслаўскіх самалётаў. Адным махам былі яны зьнішчаны нямецкай авіяцыяй. І ў той час, калі ішлі яшчэ баі сэрбаў зь немцамі ў горах Босьніі, арцыбіскуп Заграбу Алёйзіе Стэпінац заклікаў усташаўскіх лідараў падтрымаць Новую Каталіцкую Дзяржаву Харватыю. Гэтага-ж дня заграбская газэта паведаміла, каб усе праваслаўныя сэрбы, жыхары новай каталіцкай сталіцы, пакінулі горад на працягу 12 гадзін. А хто будзе хаваць праваслаўных, неадкладна будзе пакараны сьмерцю.

Югаслаўска-нямецкая вайна не трывала доўга. На працягу дзесяці дзён Югаславія была акупавана немцамі, італьянцамі, мадзьярамі, балгарамі й альбанцамі. Пад нямецкай і італьянскай апекай утворана была каталіцкая фашыстоўская дзяржава — Харватыя. Яе 10 красавіка 1941 году ў Заграбе, ад імя Антэ Павэліча, прагаласіў палкоўнік Слаўко Кватэрнік, былы аўстрыйскі афіцэр. 12 красавіка арцыбіскуп Стэпінац заклікаў усташаўскіх лідараў і іншых харватаў падтрымаць новую каталіцкую дзяржаву.

13 красавіка ў Заграб прыехаў Антэ Павэліч. Наступнага дня яго асабіста спаткаў арцыбіскуп Стэпінац і павіншаваў з дасягнутым посьпехам. Неўзабаве Павэліч прамовіў

па харвацкім радыё, праз якое заклікаў: „Харваты-жаўнеры, прымяняйце сваё ружжо супраць усіх сэрбскіх жаўнераў. Мы ваюем плячо ў плячо з нашымі новымі саюзнікамі — немцамі й італьянцамі". Харваты адмовілі ваяваць супраць немцаў і італьянцаў. Шмат харвацкіх афіцэраў югаслаўскай арміі дэзэрціравалі, напрыклад, Франё Ніколіч, шэф Штабу Першай Групы Арміяў. Ён прыбыў у Загараб і зьвязаўся з Кватэрнікам ды стаў працаваць у Харвацкім Генэральным Штабе.

У першы дзень вайны славэнскія палітычныя партыі (за выняткам камуністаў) утварылі Славэнскую Нацыянальную Раду й 11 красавіка Рада па радыё Любляны паведаміла, што яна зьяўляецца адзінай сувэрэннай рэпрэзэнтацыяй славэнскага народу. Але наступнага дня ў Любляну ўвайшлі італьянскія войскі й Рада здала свае паўнамоцтвы.

На Вялікдзень 1941 году арцыбіскуп Стэпінац з катэдральнай амбоны Загребу абвясьціў людзям аб утварэньні Незалежнай Дзяржавы Харватыі, у чым як мясцовы Касьцёл, так і Ватыкан адзначыў вялікую заслугу А. Павэліча. 28 чэрвеня Стэпінац зь некаторымі біскупамі наведалі Павэліча ды ўзгоднілі сваё супрацоўніцтва. Адначасна арцыбіскуп урачыста блаславіў тырана Павэліча як лідара харвацкага народу.

Ня трэба забываць, што лідар харвацкага народу быў два разы прыгавораны да кары сьмерці. Сьпярша югаслаўскі суд прыгаварыў Павэліча да вышэйшай меры пакараньня за тэрарыстычную дзейнасьць, якую ён вёў з Аўстрыі, Італіі й Мадзьяршчыны. Другую кару сьмерці вынес яму французскі суд за забойства ў Марселе югаслаўскага караля Аляксандра й міністра замежных спраў Францыі Барту.

Гітлер ня быў супраць незалежнай Харватыі тэрарыста Павэліча й арцыбіскупа Стэпінаца, а Мусаліні ад некатораго часу разьлічваў на экспансію ў Дальмацыю, быўшую частку рэспублікі Вэнэцыі. Было гэта нішто іншае як прапагандысцкі жэст навонкі, быццам фашысты-нацысты вызваляюць прыгнечаныя народы й даюць ім дзяржаўную незалежнасьць, а ў сапраўднасьці ўся Югаславія была падзелена на акупацыйныя зоны паміж немцамі, італьянцамі, балгарамі й альбанцамі. Босьнія й Герцагавіна ўвайшлі ў склад харвацкай дзяржавы Антэ Павэліча.

Антэ Павэліч (1889-1959) пакінуў Харватыю ў 1929 годзе й у гэтым-жа годзе ажывіла сваю дзейнасьць тэрарыстычная група „Усташа" — удзельнікаў барацьбы за незалежнасьць Харватыі. Гэтая арганізацыя была заснавана ў 1919 годзе Кватэрнікам і Павэлічам, але ня мела шансаў весьці дывэрсыйную дзейнасьць на тэрыторыі Югаславіі. Павэлічу памог Мусаліні, які адпусьціў Алеонскія астравы для падрыхтоўкі харвацкіх дывэрсантаў, аб чым югаслаўскі ўрад ня ведаў. Харвацкія дывэрсанты школіліся таксама ў Мадзьяршчыне.

У верасьні 1932 году банда ўсташаў зь Італіі зьявілася ў паўночнай Дальмацыі й падбухторыла сялян да паўстаньня. Паліцыя строга ўзялася за бунтаўшчыкоў, аднак іх дзейнасьць працягвалася. Усташы дамагаліся незалежнай Харватыі й як галоўны метад свае барацьбы прынялі тэрор. Усташам памагалі югаслаўскія камуністы, мэтай якіх была барацьба з манархіяй. У 1922 годзе камуністы забілі міністра ўнутраных справаў і за гэта была забаронена Камуністычная партыя Югаславіі. Дзейнічала яна падпольна.

Наняты тэрарыстам Павэлічам балгар 9 кастрычніка 1934 году ў Марселе забіў югаслаўскага караля й французскага міністра замежных спраў. Прычынай забойства было, паводле тэрарыстаў, „прасьледаваньне Каталіцкага касьцёла".

У забойствах прымаў удзел і Павэліч, якому ўдалося ўцячы ў Італію. Увесь плян забойства караля быў апрацаваны ў Рыме зь ведама Ватыкану й пры дапамозе Мусаліні й немцаў. А мэтай папы Пія X было пакараць „бязбожных праваслаўных гэрэтыкаў сэрбаў" і прыняць строгія меры супраць праваслаўнай Сэрбіі. Забойства караля й асьведчаньні папы рымскага ўстрывожылі сэрбаў. На дамаганьні Францыі перадаць ёй Павэліча, удзельніка забойства міністра Барту, Мусаліні адмовіў, а зварот Югаславіі ў Лігу Нацыяў за дапамогай у справе забойства караля застаўся без рэзультату.

Харвацкая дзяржава Антэ Павэліча абымала частку Босьніі, Герцагавіны й Сэрбіі. Мела гэта быць, быццам, каралеўства на чале зь італьянскім князем, як тытулярным каралём Таміславам II. (Таміслаў I атрымаў каралеўскае званьне з Рыму ў 925 годзе). Харвацкае каралеўства было пад патранатам папы рымскага й пратэкцыяй Гітлера, але каралеўствам кіравалі тэрарысты Павэліча. Аднак кароль Та-

міслаў II ніколі не парупіўся наведаць сваё каралеўства. Была гэта дзяржава, якой кіравалі звар'яцелыя ўсташы.

У незалежнай каталіцкай Харватыі, або „каралеўстве", толькі палову насельніцтва складалі католікі-харваты, рэшту — 2,2 мільёна складалі праваслаўныя сэрбы, 700 тысяч — мусульмане, 45 тысяч — жыды, цыганы, немцы й інш.

Ужо ў першы дзень харвацкай дзяржаўнай незалежнасьці ў адной магамэтанскай вёсцы харватамі спалена была мячэць; гэтая-ж банда ўзарвала таксама праваслаўную царкву ў Бегай і нарабіла шкоды на праваслаўных могілках.

Наступнага дня, г.зн. 11 красавіка 1941 г., радыё Заграб падало ўрадавы камунікат да насельніцтва Харватыі, што са зьменай палітычнай сытуацыі людзі павінны зьвяртацца да сьвятароў, якія скажуць ім, што рабіць і як захоўвацца перад акупацыйнымі войскамі.

Гэта ўжо сьведчыць якую ўладу ў незалежнай харвацкай дзяржаве выконвала Каталіцкая царква, яе духавенства. А што тычыцца праваслаўных, то 3 траўня пачалі зачыняць пачатковыя школы для сэрбскіх дзяцей. 25 чэрвеня зносілася дзяржаўная дадатковая ільгота для Праваслаўнай царквы. 19 ліпеня назоў „сэрба-праваслаўная рэлігія" быў заменены на „грэка-ўсходняя рэлігія". Праваслаўным вернікам рэкамэндавалася пераходзіць у каталіцызм, або грэка-каталіцкую царкву (вунію). Міністар харвацкай адукацыі 8 чэрвеня сказаў: „Што да сэрбаў пражываючых тут, дык яны ня ёсьць сэрбы, але народ прысланы сюды з Усходу туркамі, якія карысталіся імі як васаламі й слугамі. Яны ёсьць аб'яднаныя таму, што належаць да Праваслаўнай царквы й мы не імкнёмся іх асыміляваць. Але ў між часе добра будзе для іх знаць наш лёзунг: „Лепш паддайцеся, або выматвайцеся" („Ді сайленс оф Піус XII" („Маўчаньне Пія XII"), стар. 227).

Гэта былі толькі пачаткі, перасьцярогі, дзейнасьці каталіцкай дзяржавы Антэ Павэліча. Усташаўская Харватыя была тыпова фашыстоўскай дзяржавай, вяла вайну супраць нацыянальных меншасьцяў і партызанаў. Але харватам памагалі мусульмане, хоць яны не былі ў пашане ў харватаў. Супраць партызан утворана была дывізія СС з мусульманаў Босьніі, якія насілі шапкі з эмблемай нацысцкага арла. Атрымоўвалі яны таксама спэцыяльны правіянт. Немцы былі задаволены

жаўнерамі-мусульманамі, бо-ж, паводле іхняй веры, забіты ў баі жаўнер ідзе проста ў рай. Такім чынам сьмерць для мусульманаў не была страшная. Дзейнічала таксама мусульманская брыгада партызанаў, якая ваявала на баку Ціта. Але лідар мусульманаў Куленовіч перайшоў на бок Павэліча й мусульмане супрацоўнічалі з харватамі. Былі таксама мусульмане, якія хацелі мець сваю аўтаномную правінцыю.

Неўзабаве пасьля капітуляцыі югаслаўскай арміі ў красавіку 1941 году ня ўсе жаўнеры злажылі ружжо й вярнуліся дамоў. Сярод іх быў палкоўнік Дража Міхайлавіч. Ён наладзіў кантакт з афіцэрамі, якія хаваліся, або мелі свае аддзелы. Знаючы здраду славэнцаў і харватаў у вайне з Гітлерам, у партызанах (чэтніках) Міхайлавіча не было афіцэраў славэнцаў і харватаў. Міхайлавіч прадбачваў, што вайна зь немцамі будзе доўгая й таму хацеў сьпярша сарганізаваць падпольную арганізацыю, разьведку й падрыхтавацца да партызанскай вайны супраць акупантаў. Быў гэта нацыянальны герой і разумны партызанскі лідар, які першы ўзьняў сьцяг барацьбы. У верасьні 1941 г. яго слабыя радыёвыя сыгналы былі атрыманы на Мальце. У іх гаварылася аб антынацысцкім супраціўленьні. Была гэта добрая навіна для аліянтаў, а асабліва для югаслаўскага ўраду на эміграцыі. І хоць па вайне Ціта зьнішчыў Дражу Міхайлавіча, але ягонае імя фігуруе сёньня сярод сэрбскіх герояў — ахвяр камунізму.

Партызаны Ціта паўсталі пазьней. Калі Гітлер, як саюзьнік Сталіна, займаў эўрапэйскія дзяржавы, Масква маўчала, а нават дазволіла камуністам на Захадзе супрацоўнічаць з гітлераўцамі. Але, калі Гітлер напаў на Савецкі Саюз, тады ўсе камуністычныя партыі на Захадзе атрымалі загад заняцца дывэрсіяй супраць немцаў. Аўтаматычна „імпэрыялістычная вайна" замянілася ў „айчынную вайну" й так яно было ў Югаславіі, дзе арганізацыяй камуністычных партызанаў заняўся даваенны сакратар партыі Ціта.

Варта заўважыць, што Ціта, харвацка-славэнскага паходжаньня, арганізацыю партызанкі пачаў не сярод суродзічаў, а ў Заходняй Сэрбіі, сярод сэрбаў, якія былі настаўленыя супраць акупантаў. Ня так, як гэта зрабілі харвацкія кіраўнікі й Каталіцкая царква, якія выказалі ляяльнасьць акупантам.

Новую ўладу й новы парадак у Харватыі прывітаў арцыбіскуп Алёйзіе Стэпінац у фашыстоўскім каталіцкім выданьні „Нядзеля" (27 красавіка 1941 г.) такімі словамі: „Слава Богу, наша ўдзячнасьць Адольфу Гітлеру й бязьмежная адданасьць для нашага лідара Антэ Павэліча". А арцыбіскуп Сараева, Шарыч, быў сябрам усташы ад 1934 году й у сваіх пісьмах, одах, параўноўваў Антэ Павэліча да Хрыста.

Дзяржаўны, фашыстоўска-каталіцкі парадак у Харватыі ўстанавілі Павэліч і Стэпінац. Усё, што магло супярэчыць гэтым двум уладарам зямлі й неба, забаранялася. Рабіліся захады ўцягнуць моладзь у вайсковыя фармацыі, дзе апеку над імі мелі ксяндзы, якія вучылі не хрысьціянскай маралі, а толькі брутальнай сілы, катаваньняў, забойстваў. Каталіцызм быў аб'яўлены адзінай галоўнай верай, а іншыя рэлігіі — забароненыя. Жыды насілі нашытую на вопратцы зьвязду Давіда. Нічога лепшага не чакала й праваслаўных. Неўзабаве ў публічных мясцох і транспарце паявіліся надпісы: „Уступ сэрбам, жыдам і цыганам забараняецца". У залажэньні лідараў харвацкай дзяржавы Сэрбская Праваслаўная царква не прызнавалася. Для яе заставалася адно з двух: прыняць каталіцызм, або сьмерць.

Многія сэрбы пакідалі дамы, гаспадаркі й уцякалі з Харватыі, часта ў Дальмацыю пад апеку італьянцаў. А хто застаўся на месцы, заплаціў дорага. Харваты доўга не чакалі й адразу пачалі прасьледаваць праваслаўных сэрбаў. 350 тысяч праваслаўных у Харватыі сілай навярнулі на каталікаў. Наварачвалі пераважна менш адукаваных, а больш адукаваных — расстрэльвалі. Больш за 400 праваслаўных цэркваў спалілі, некаторыя замянілі на касьцёлы, разграбілі царкоўную маёмасьць, зьнішчылі рукапісы й культурныя помнікі праваслаўя. Згадваецца й такі факт, калі цягнік з праваслаўнымі маткамі, дзяўчатамі й малымі дзецьмі ад'ехаў з Мостару й Чапліна ў горы, там усіх іх высадзілі й кінулі са скалы ў прорву. Аб гэтым біскуп пісаў арцыбіскупу Стэпінацу, а ён — Павэлічу. Але ўсе яны былі прыгатаваны зьнішчыць праваслаўных і нікога не знайшлося, каб абараніць гэтых нявінных людзей і спыніць такое дзікае злачынства. Маецца характэрнае асьведчаньне каталіцкага сьвятара, усташа, палкоўніка Ёзэфа Вукеліча, якое ён зрабіў пе-

рад судовай камісіяй: „Я знаю, што ўсташы зрабілі многа злачынстваў і спалілі некалькі вёсак. Я знаю, што яны рабілі мардэрствы. (...) Я не пратэставаў супраць масакры й пажараў таму, што іншыя, уключна са Стэпінацам, не пратэставалі" („Ді кэйс оф кардынал Алёйзіус Стэпінац" („Справа кардынала Алёйзіе Стэпінаца") стар. 186).

Аднойчы адзін арыштаваны, якога пільнаваў рэлігійны каталік, запытаў яго, ці ён не баіцца Божай кары за ўчыненыя злачынствы. На гэта атрымаў такі адказ: „Не пытай мяне пра гэта, я добра знаю, што мяне чакае. За маё мінулае, сучаснае й будучае я згару ў пекле, але згару за Харватыю".

На артыкул аб падзеях у былой Югаславіі пачалі адзывацца некаторыя чытачы „Голасу Часу". Яны, чытаючы заходнюю прэсу, бачаць віну сэрбаў як сапраўдных злачынцаў, забойцаў, якія ня хочуць жыць мірна. Факт, аднак, застаецца той, што Захад, а асабліва Нямеччына, якой Харватыя была саюзьніцай у апошняй вайне, робяць харватаў ахвярай гэтай грамадзянскай вайны, падобна як і Другой Сусьветнай вайны. Каб лепш зразумець сутнасьць басьнійскай трагедыі, паслухаем што піша А. Дамашэвіч: „Амаль 60% Босьніі гэта хрысьціяне. Былы генэрал арміі Ціта, а цяпер прэзыдэнт Харватыі Ф. Туджман ужо ў 1990 г. абмежаваў правы сэрбаў у канстытуцыі ад 22 сьнежня 1990 г. Пачалі тады праводзіць этнічную чыстку сэрбаў, нішчылі праваслаўныя цэрквы". Лёрд Карынгтан напісаў: „Калі ўдумацца ў прычыны вайны, можна пацьвердзіць, што гэта харваты падпалілі кнот, абвяшчаючы канстытуцыю, якая не бярэ пад увагу асаблівай пазіцыі сэрбаў у гэтай рэспубліцы". Памылкай заходняй Эўропы, а тым больш Германіі, было ўвядзеньне эмбарга на інфармацыі ад сэрбаў. Аўтары рапарту Сусьветнай Рады Цэркваў „Ді траджэты оф Босьнія" пішуць: „З праўдзівым сорамам мусім пацьвердзіць, што на працягу двух тыдняў пасьля адкрыцьця масавых магіл забітых сэрбаў у Басанскім Бродзе не зьявілася туды аніводная тэлевізійная брыгада, аніводзін заходні журналіст". А інфармацыі мусульман і харватаў ідуць у эфір бесперапынна й зьмяшчаюцца ў міжнароднай прэсе на першых старонках. Многія з гэтых інфармацый зьяўляюцца непраўдзівымі. Далей у „Ді траджэты оф Босьнія" пішацца: „Мно-

гія выяўленыя сакрэты з тайных рапартаў паказваюць, што многа лютасьцей, прыпісаных сэрбам, зрабілі ў Сараеве мусульмане, каб выказаць сімпатыю грамадзкай думкі й паскорыць узброеную інгэрвэнцыю НАТО" („Ніва" № 19, Беласток, 8 мая 1994 г.).

8 верасьня г.г. папа Ян Павал II меў наведаць Бялград, Сараева й Загараб, але ніхто ня мог гарантаваць яму бясьпеку. А небясьпека магла быць рэальная як з боку мусульманаў, так і сэрбаў. Аднак 10 верасьня папа прыляцеў на лётнішча сталіцы каталіцкай Харватыі — Загараб. Ягоныя словы прывітаньня зьмяшчалі ў сабе словы мір, згода, узаемнае прабачэньне, прыпаміналі, што многа нявіннай крыві было праліта. Сказаў папа, што быццам рэлігія да гэтай вайны дачыненьня ня мае. З такім асьведчаньнем папы цяжка пагадзіцца.

Як хто, але харваты-каталікі віталі папу, бо-ж Ватыкан першы прызнаў незалежнасьць Харватыі ў 1991 годзе й першы прызнаў яе фашыстоўскую незалежнасьць пры Антэ Павэлічу ў 1941 годзе. Адначасна папа выказаў свой смутак з прычыны адмовы наведаць Сараева й Бялград.

Заклік галавы Ватыкана Яна Паўла II да міру, згоды, узаемнага прабачэньня й т.п. ня могуць задаволіць праваслаўных сэрбаў, бо Ватыкан яшчэ да гэтага часу не прызнаў сваю праступную дзейнасьць у былой Югаславіі.

Шкада, што людзі не цікавяцца прычынай вайны ў Югаславіі. А трэба ведаць хто першы яе пачаў, хто яе інсьпіраваў і якую ролю адыграла тут Каталіцкая царква на чале з папам? Я паўтару яшчэ раз тое, што ўжо раней пісаў: „Старыя крыўды не забытыя, а новыя, з апошняй Сусьветнай вайны, паўстаюць жывымі". Аб мінулым Югаславіі заходняя прэса амаль нічога ня піша, маўчыць, а ёсьць аб чым пісаць, каб паказаць корань зла. Ішла й ідзе тут ня толькі нацыянальная вайна за тэрыторыю, але ня менш і рэлігійная, са сваімі чысткамі. І хто яе запачаткаваў і як яе вёў, мы даведаемся ніжэй.

У сваёй злачыннай дзейнасьці супраць праваслаўных сэрбаў харваты мелі свой лёзунг: „Вярні трэцяга, забі трэцяга й выгані трэцяга", ды казалі: „Наша дзейнасьць ёсьць аснавана на рэлігіі. Для меншасьці — як сэрбы, жыды й цыганы — мы маем тры мільёны куляў".

Але не заўсёды ўсташы карысталіся кулямі, яны мелі свой прымітыўны, але дзікі спосаб нішчэньня схізматыкаў. Як падае Карло Франконі, „28 красавіка (1941 г.), як прыклад, некалькі соцень усташаў акружылі сярод ночы сэрбскія вёскі Гудовец, Туке, Брэзовец, Клокачэвец і Больч (у раёне Белавару). Узялі 250 мужчын, пераважна сялян, а таксама сьвятара Бозіна й кіраўніка школы Стэфана Іванковіча. Павялі іх у поле й загадалі капаць ямы. Пасьля павязалі іх дротам і закапалі жывымі.

Гэтай самай ночы, недалёка ад Вукавару, на беразе Дунаю, іншым 180 сэрбам падрэзалі горла й кінулі ў раку. Пару дзён пазьней у мясцовасьці Сточац меў месца масавы арышт 331 сэрба, а таксама сьвятара, ягонага сына й былога дэпутата Бранко Добрасалевіча. Пасьля звычайнага капаньня ямаў і вязаньня ахвяр, выканана экзэкуцыю сякерамі. Але сьвятар і ягоны сын былі трыманы да канца. Сын быў пасечаны на кавалкі на вачох бацькі, якога змусілі сказаць малітву па загінуўшых. Калі сьвятар выканаў сваё заданьне, паддадзены ён быў павольным катаваньням, сьпяршa рвалі на яго галаве валасы, пасьля бараду, а потым скуру; калі вынялі вочы, шоу ня было яшчэ канца.

Але найбольш сьвятатацкім эпізодам і нават страшнай разьнёй праведзенай харватамі Павэліча былі падзеі ў Гліне. 14 траўня 1941 г. некалькі соцень сэрбаў былі сабраны з суседніх вёсак, каб наведаць рэлігійную цырымонію „Тэ Дэум", якая мела быць адсьвяткавана з нагоды канстытуцыі Незалежнай Дзяржавы Харватыі. Прыйшоўшыя ў сьвятыню людзі не спадзяваліся нічога дрэннага, пакуль не пачулі, што за сьцяной затрымаліся вайсковыя самаходы. Увесь сумніў разьвеяўся, калі сэрбы ўбачылі страшную банду паліцыі, патрасаючую нажамі й сякерамі. Усташаўскі афіцэр запытаў, хто з прысутных мае пасьведку пераходу ў каталіцызм. Мелі толькі двух і яны былі адпушчаны. За зачыненымі дзьвярамі пачалася масакра. Сьвятыня замянілася ў людзкую бойню, зь якой гадзінамі разносіліся плач, лямант і енк" („Ді сайленс оф Піус XII" („Маўчаньне Пія XII"), стар. 277-278).

З масакры ў Гліне са 160 сэрбаў уцалеў толькі адзін чалавек, якога харваты палічылі забітым. Тады-ж зьнішчылі яны алтар, іконы й другія царкоўныя рэчы.

2 чэрвеня 1941 году д-р Мілован Заніч, міністар справядлівасьці ўсташаўскай дзяржавы пісаў у „Нова Градыска": „Гэта дзяржава, наша краіна, ёсьць толькі для харватаў і нікога больш. Няма іншых дарог і спосабаў, каб мы, харваты, не зрабілі сваю дзяржаву сапраўды сваёй і не ачысьцілі яе ад усіх праваслаўных сэрбаў. Усе яны, што прыйшлі ў нашу краіну 300 гадоў таму, павінны зьнікнуць. Мы не хаваем сваіх намераў. Гэта ёсьць палітыка нашага ўраду й мы будзем рабіць ня што іншае як ажыцьцяўляць прынцыпы ўсташа" („Католік тэрор тудэй" („Каталіцкі тэрор сёньня") , стар. 29).

Аўро Мангатан піша: „Першым усташаўскім камандантам у раёне Ўдбіна быў францішканскі сьвятар, Матэ Могус, які сарганізаваў усташаўскую міліцыю й раззбройваў югаслаўскіх жаўнераў. На мітынгу ва Ўдбіна 13 чэрвеня 1941 году ён даў такую казань: „Глядзі, народ, на гэтых 16 адважных усташаўцаў, якія маюць 16 000 куляў і могуць забіць 16 000 сэрбаў, пасьля чаго мы можам падзяліць паміж нас, па-брацку, іхняе поле Мутыліц і Карбавы". Гэтая мова была сыгналам пачаць разьню сэрбаў у раёне Ўдбіна" („Тэррор овэр Югославія", Лёндан 1953, стар. 79).

Усташаўскія праступнікі параўноўвалі сябе да Хрыста. У выданьні „Нядзеля" (ад 6 чэрвеня 1941 г.) у артыкуле „Хрыстос і харваты" чытаем: „Хрыстос і ўсташы крочаць разам праз гісторыю. Зь першага дня свайго існаваньня ўсташаўскі рух ваяваў за перамогу прынцыпаў Хрыста, за перамогу справядлівасьці, свабоду й праўду. Наш Сьвяты Збавіцель паможа нам у будучыні, як і памагае цяпер і таму новая ўсташаўская Харватыя будзе Хрыстова, нашая й нікога больш". Аднак гэтая дзяржава не была Хрыстовай, хаця завадатарамі былі ўсташы з дапамогай Каталіцкай царквы й з блаславенства рымскага папы.

Ад красавіка да чэрвеня 1941 г. у Харватыі зьнішчана было 120 тысяч людзей. Улічваючы малую тэрыторыю праступства й кароткі час, была гэта найбольшая масакра, якая ня мела сабе роўнай у час Другой Сусьветнай вайны.

Аб злачынствах католікаў Харватыі над жыдамі, цыганамі й праваслаўнымі сэрбамі згадвае Ніно Бэло: „Забойства мела падтрымку ня толькі рыма-каталіцкіх сьвятароў, але праводзілася пры ўдзеле вялікай колькасьці сьвятароў і ма-

нахаў, якія кіравалі бандамі. Больш страшнымі былі каталіцкія сьвятары, якія загадвалі канцэнтрацыйнымі лягерамі, прымянялі катаваньні й мардавалі тысячы людзей. Успамянём некаторыя іхнія прозьвішчы: сьвятар езуіт Драгуцін Комбер, айцец Бранімір Зупаніц, айцец Срэцко Перыц і манах Міраслаў Філіповіч, францішканін, якога зрабілі камандантам канцэнтрацыйнага лягеру ў Ясеновац. Па зьдзеках гэты апошні раўняўся лягеру ў Дахаў, а Філіповіч быў адказны за сьмерць 40 000 людзей" („Ді Ватыкан пэйпэрс" („Ватыкану паперы"), Вялікабрытанія, Сэвэнокс 1982, стар. 26). Далей аўтар піша, што Каталіцкая царква ёсьць адказная за праступствы ўчыненыя ў Харватыі й што Міжнародны Чырвоны Крыж паслаў свайго прадстаўніка, Бранко Бакуна, у Рым, каб зрабіць захады перад Ватыканам дзеля спыненьня праступстваў у Харватыі. Бакун быў блізка чатыры гады ў Ватыкане, бачыў некалькі разоў яго ксяндзоў-ураднікаў, але ня быў імі ветліва спатыканы. Неяк прадставіў ён свае дакумэнты аб Харватыі ксяндзу, які меў перадаць іх вышэйшай інстанцыі, бо Бакуна не дапусьцілі вышэй, толькі сказалі прыйсьці за тыдзень часу. Калі ён прыйшоў, яму сказалі, што злачынствы ў Харватыі былі ўчынены камуністамі. Такі адказ не задаволіў Бакуна. Яму ўдалося папасьці на аўдыенцыю да папы Пія XII, дзе прысутнічала каля 30 асоб. Калі прысутныя праходзілі каля папы, ён іх блаславіў. Калі падышоў Бакун, папа блаславіў і яго. Бакун загаварыў да папы па-італьянску й падаў яму паперы, але папа не зьвярнуў на іх увагі й блаславіў наступную асобу, якая ішла за Бранко Бакуном.

Чытаючы пра страшныя рэчы, якія адбываліся ў Харватыі, у дзяржаве Павэліча і Стэпінаца, міжволі паўстае пытаньне: зь якой прычыны ці ненавісьці харваты мардавалі сэрбаў? З гісторыі знаем, што раней нечага падобнага паміж гэтымі народамі не было, хоць быў паміж імі недавер. Скуль тады ўзялася такая дзікая ненавісьць? Можа хто й не паверыць, але як піша Аўро Мангатан, „сапраўдным інсьпіратарам і экзэкутарам рэлігійных масакраў быў Ватыкан". Як прыклад маецца такая афіцыйная дырэктыва № 2 Біскупства Крызевіцы ад 1942 г., якая паказвае сапраўдную мэту Ватыкану й зь ёю варта запазнацца:

„Дырэктыва адносна наварачваньня прыхаджан Усходняй Праваслаўнай царквы ў Славэніі, Срыем і Босьніі. Спэцыяльная ўстанова й касьцельныя камітэты павінны быць утвораны неадкладна для тых, хто будзе навернуты. (...) Хай кожны ксёндз памятае, што гэта гістарычныя дні для нашай місіі й мы не павінны ў ніякім выпадку прапусьціць. (...) Да гэтага часу мы зрабілі вельмі мала (...) мы баімся людзкіх нараканьняў. Кожнай вялікай рабоце нехта супраціўляецца. Нашая ўнівэрсальная місія заключаецца ў збаўленьні душаў і прыдбаньні найбольшай славы для Ўладара Ісуса Хрыста. Наша работа ёсьць легальная бо яна — згодная з афіцыйнай палітыкай Ватыкану" (падкрэсьлена мною — Ю. В.).

Камэнтараў непатрэбна, усё ясна й зразумела. Але, дзеля прапаганды, маюцца крытычныя выказваньні арцыбіскупа Стэпінаца адносна паступкаў усташаўцаў да праваслаўных сэрбаў. Аднак яны гучаць не па-хрысьціянку. Ягонай канцылярыяй быў выдадзены цыркуляр № 4104/41 за датай 3 траўня 1941 году, які пачынаецца так: „У даны час многа людзей прыходзіць у нашыя ўстановы й выказваюць жаданьне ўступіць у Каталіцкую царкву". А заканчваецца цыркуляр такімі вось словамі: „Розныя схізматыкі й іх нешчасьлівыя сем'і налічваюцца тысячамі й для іх трэба аказаць любоў і ўсё магчымае, каб вярнуць у Каталіцкую царкву дзеля ўратаваньня сябе й сваіх дзяцей".

Так гэта нікчэмна, пад пагрозай кары сьмерці, забойцы з Каталіцкай царквы заганялі праваслаўных сэрбаў у свой касьцёл, а пасьля гэты самы праступны касьцёл аказвае сваю „любоў", прымаючы ратуючыхся ад непазьбежнай сьмерці з рук харвацкіх катаў нявінных ахвяр дзікага генацыду.

І яшчэ адзін прыклад. „Каталіцкі ліст", орган біскупства Заграбу, кантраляваны арцыбіскупам Стэпінацам, у сваім выданьні (№ 31, 1941 г.) паведамляе: „Новы прыход, больш за 2 300 душаў, быў створаны ў вёсцы Будынці як вынік перахрышчваньня праваслаўных у каталіцкую веру. І ў часе аднаго такога перахрышчваньня ксёндз Могус сказаў: „Мы, каталікі, да гэтага часу працавалі для каталіцызму пры дапамозе крыжа й кніжкі для набажэнства. Прыйшоў час, калі працуем з рэвальвэрам".

Акрамя рэвальвэра харваты добра валодалі нажамі й сякерамі. Аб гэтым піша Аўро Мангатан: „Ноччу 29 жніўня 1942 году ў канцэнтрацыйным лягеры Ясеновац быў дадзены загад экзэкуцыі вязьняў. Тыя, што кіравалі гэтай акцыяй, зрабілі заклад хто найбольш заб'е вязьняў. Пётр Брэзіц падрэзаў горла 1 300 вязьням спэцыяльным нажом разьніка й выйграў спаборніцтва на званьне караля падразаньня горлаў. За гэта атрымаў залаты гадзіньнік, сярэбраныя рэчы, смажанае парася й віно. Аб такім маральным праступстве расказваў навочны сьведка д-р Ніколя Кіколіч, харват" („Католік імпэрыялізм энд ворльд фрыдом", Лёндан 1952 , стар. 453). Прыгадайма, што камандантам лягеру Ясеновац быў каталіцкі манах Філіповіч.

Верным сынам Каталіцкай царквы быў ксёндз Боза Сімлес з вёскі Лістані, актыўны ўсташавец, які займаў пасаду начальніка ў раёне Лівно. Ён асабіста сарганізаваў усташаўскую міліцыю й атрымаў для яе зброю. У час забойства сэрбаў у раёне Лістані ён з касьцельнай амбоны гаварыў, што прыйшоў час на экстэрмінацыю сэрбаў у Харватыі. 27 ліпеня 1941 г. Боза Сімлес меў мітынг у вёсцы й калі даведаўся, што ўсіх сэрбскіх мужчын замардавалі, а жанчын і дзяцей замардуюць гэтае ночы, сказаў не чакаць ночы й пажадаў, каб ніводнага сэрба ў Харватыі не засталося жывым (узята з кніжкі А. Мангатана „Тэррор овэр Югославія", стар. 80).

Антэ Павэліч — лідар фашыстоўскай Харватыі не любіў сэрбаў так, як Гітлер жыдоў. Але, калі ён так моцна не любіў сэрбаў, то чаму не мардаваў іх тады, калі яны прынялі каталіцкую веру? Тут была ненавісьць ня так да сэрбаў, як да праваслаўнай веры. Гэтую ненавісьць выклікаў Ватыкан і напушчаў сваё духавенства на праваслаўных і ўсім сваім праступнікам дараваў грахі.

Акрамя масакры праваслаўных сэрбаў дзейнічаў яшчэ садызм. Як падае Нора Белоф у кніжцы „Тіто's флоўэн легасы" (стар. 94), Крузіо Малянартэ казаў, што Павэліч паказваў яму поўны кош людзкіх вачэй, вырваных у сэрбаў усташаўцамі. Аб гэтым успамінаў таксама ангельскі доктар, які ў вайну быў у Югаславіі й бачыў на стале мяшок з людзкімі вачыма. Нават немцы выказвалі сваё зьдзіўленьне ўсташаўскімі масакрамі праваслаўных сэрбаў й сказалі спыніць прасьлед.

Пяцьсот ці семсот тысяч сэрбаў зьнішчылі фашысты Павэліча, а сярод іх загінула чатыры епіскапы, 187 праваслаўных сьвятароў і 30 манахаў. У некаторых раёнах харвацкай дамінацыі 90% праваслаўных было забітых і 75% цэркваў зачыненых. Усташаўскія банды хадзілі ад вёскі да вёскі, прымушалі праваслаўных сэрбаў ісьці ў царкву й там іх мардавалі, а пасьля падпальвалі храм. У Любіне за адзін дзень зьніштожана 70 схізматыкаў.

На пачатку 1942 году партызаны Ціта прыйшлі з Чарнагорыі ў Босьнію й Харватыю. Яны бачылі спаленыя ўсташаўцамі вёскі й перапалоханых людзей. Былі гэта сэрбы й яны ўступалі ў партызанку Ціты, дзе ваявалі ў абароне свайго жыцьця. Партызаны лавілі ўсташаўцаў і ліквідавалі йх. Фільліс Аўты падае, што „калі ўсташаўцаў вялі на расстрэл, (...) то сялянка падбегла й пачала біць іх і крычала цэлы час. Цяжка было партызанам адарваць гэтую жанчыну. (...) Калі палі ружэйныя стрэлы, яна зноў падбегла да забітых і пачала танцаваць у крыві. Нам сказалі, што ўсташаўцы замардавалі ўсіх яе сыноў" („Тіто", Сафольк 1970, стар. 198). На аснове ўласных досьледаў харвацкі гісторык Любо Бобан сьцьвярджае, што „да масавай заглады сэрбаў і жыдоў у Харватыі выкарыстоўваліся ўсташаўскія канцэнтрацыйныя лягеры: Ясеноваць (600 тысяч забітых), Ядоўна (72 тысячы), Стара Градыска (75 тысяч), Срэмска Мітровіца (10 тысяч) Слано, Дзякова, Сісак, Ястрабарска й т. д.

Запазнаўшыся са злачынствамі каталікоў-харватаў у адносінах да праваслаўных сэрбаў, нічога дзіўнага што апошнія ня хочуць адступіць тыя землі, на якіх яны жывуць, каб зноў не паўтарылася крывавая гісторыя. Аб гэтым, як бачым, Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў нічога ня хоча знаць, а за плячыма трох рывалізуючых групаў правяла свае граніцы й дарогай санкцый і мілітарнай сілы хоча прымусіць басьнійскіх сэрбаў прыняць падыктаваны мір.

Наконт таго, як гэта Каталіцкі касьцёл са сваімі ксяндзамі памагаў Павэлічу „ратаваць душы" сэрбаў і нават немаўлят, маюцца чарговыя даныя. Толькі ад чэрвеня да кастрычніка 1942 году, калі абавязкі каманданта выконваў былы каталіцкі манах Міраслаў Філіповіч, у зьверскі спосаб былі зьнішчаны 20-30 тысяч вязьняў. У ходзе сьледзтва

былы францішканін прызнаўся, што асабіста забіў сотню людзей у лягерох Ясеновац і Стара Градыска. У гэтых канцэнтрацыйных лягерох вязьняў прабівалі штыхамі, мучылі, закопвалі жывымі або палілі. З паленьнем жывых сэрбаў было горш, бо яны крычалі й бараніліся, калі іх кідалі ў агонь і таму, каб пазьбегчы такой вазьні, сьпярша іх забівалі, а пасьля палілі. А сьвятар Божыдар Брало, які прымаў удзел у масакры 180 сэрбаў у мясцовасьці Аліпашын Мост, разам з усташаўскай міліцыяй танцаваў у сутане вакол трупаў.

Быў канцэнтрацыйны лагер і для малых дзяцей. Аб ім чытаем наступнае: „Кожны дзень прыязджалі новыя жанчыны ў лягер Стара Градыска. Каля чатырнаццаці дзён пазьней Врбан (камандант лягеру) загадаў забраць усіх дзяцей ад матак і занесьці ў адзін пакой. Дзесяцьцю з нас было сказана занесьці іх у пледзе ў гэты асобны пакой. Дзеці поўзалі па пакоі й адно дзіця ўсадзіла руку й нагу праз дзьверы, што было немагчыма іх зачыніць. Врбан крычаў: „Зачыняй!" Калі я гэтага не зрабіла, ён ляснуў дзьвярыма й зламаў дзіцяці нагу. Пасьля ўзяў дзіця за нагу й стукнуў галавой аб сьцяну й забіў дзіця. Пасьля мы далей прыносілі дзяцей. І калі пакой быў поўны дзяцей, Врбан прынес газ і атруціў усіх дзяцей" („Католік тэррор тудэй", стар. 32).

Згадваецца яшчэ, што дзяцей труцілі каўстычнай содай, якую прымешвалі ў харчы. Магчыма, што такія паводзіны ўсташаўцаў абурылі немцаў і італьянцы паслалі сваё войска, каб спыніць масакру ў лягерох. Відаць, што й войску было цяжка стрымаць каталіцкіх фанатыкаў, калі прыйшлося павесіць некалькіх праступнікаў, а сярод іх двух францішканскіх манахаў. Так гэта падае газэта „Дэйлі Тэлеграф" (ад 9 жніўня 1992 г.).

З касьцельнай амбоны, — як піша Ільля Марынковіч, — у мясцовасьці Ліўно ксёндз Срэчко Перыч заклікаў вернікаў на „Сьвятую вайну", прапануючы, „каб пачаць разьню зь ягонай сястры, бо выбрала сабе за мужа сэрба, а скончыць на дзецях". І напомніў харватам, „як скончыце работу, прыходзьдзе сюды, у касьцёл, я вас паспавядаю й дарую грахі". Тады-ж, 10 жніўня 1941 году, больш за 5 600 праваслаўных сэрбаў з раёну Ліўно страціла жыцьцё.

Такіх і падобных праступнікаў, заслужаных людзей для фашыстоўскай дзяржавы й „адзінай праўдзівай царквы", узнагароджваў сам Антэ Павэліч. Усташаўскія лідэры адкрыта гаварылі, што на працягу 10 гадоў Харватыя будзе стопрацэнтна каталіцкай, бо-ж была гэта палітыка ўраду й Каталіцкай царквы. І так яно было-б, бо Антэ Павэліч са сваімі ўсташаўцамі й бласлявенствам каталіцкіх герархаў мардаваў усіх, за выняткам харватаў і каталікоў.

Цяжка паверыць у праступствы харватаў, але такія былі факты, аб чым пісала прэса й у большасьці аб'ектыўныя ангельскія газэты й кніжкі. Усе гэтыя злачынствы немагчыма зьмясьціць у гэтым часопісе, але на гэту тэму, як ужо згадвалася, напісаны кніжкі, апублікаваны здымкі, прозьвішчы ахвяр і праступнікаў. Усё гэта перахоўваецца ў некаторых установах і бібліятэках. За паваенныя гады на Захадзе зьявілася даволі многа кніжак аб Югаславіі, больш як за папярэднія стагодзьдзі, але зьмест іх крытычны.

Усташаўцы Павэліча й каталіцкі клір Стэпінаца ў Харватыі пакінулі за сабою крывавы сьлед. Іхняя дзейнасьць насьцярожыла нават немцаў, якія стварылі спэцыяльную камісію для правядзеньня сьледзтва. Таксама Праваслаўная царква Сэрбіі зьвярнулася да нямецкага генэрала Дулькемана, каб ён спыніў страшныя мардэрствы сэрбаў усташаўцамі. Немцы гэта зрабілі, у некаторых выпадках паслалі свае танкі, каб засланіць сэрбаў. Нямецкім акупацыйным войскам хадзіла, каб захаваць спакой у Харватыі й наогул на акупаванай імі тэрыторыі. Пад нямецкай пратэкцыяй у студзені 1942 году створана была Харвацкая Праваслаўная царква. Але, як толькі немцы пакінулі Харватыю, усташаўцы яшчэ больш пачалі вынішчаць сэрбаў. Эсэсаўцы ў сваім рапарце ў лютым 1942 году пісалі: „Злачынствы робленыя аддзеламі ўсташаўцаў супраць праваслаўных на харвацкай тэрыторыі трэба прызнаць як повад актыўнай дзейнасьці партызанаў. Усташаўскія аддзелы прасьледуюць ня толькі праваслаўных мужчын здольных да ваеннай службы, але ў найбольш зьверскі спосаб адносяцца да старых няўзброеных мужчын, жанчын і дзяцей".

Таксама ў тайным рапарце № 153 ад 15 верасьня 1942 г., прадстаўленым харвацкім уладам у Заграб, хар-

вацкі афіцэр Андрыч пісаў: „Найвышэйшы камандзір, барон Мэсэнбах скрытыкаваў праступствы ўсташаўцаў супраць праваслаўных, сьцьвярджаючы, што да гэтага часу ў Харватыі замардавана было 700 тысяч людзей і што немцы мусяць гінуць з прычыны дрэнна ведзенай харвацкай палітыкі. (...) Нарэшце скончыў з нараканьнямі сьцьвярджаючы, што адзіны выхад з такой сытуацыі такі, каб нямецкае войска акупавала Незалежную Харвацкую Дзяржаву. Усімі магчымымі спосабамі я даказваў яму, што ня мае рацыі. На гэта мне адказаў: „Пакіньма гэта ў спакоі, маем дакладныя даныя!" Праз цэлы дзень і ноч я не пачуў ад немцаў ніводнага добрага слова аб Харватыі" („Война в Югославіі. Длячэго?", стар. 137-138).

Наконт сытуацыі ў Харватыі меркаваньні немцаў былі падзелены. Камандуючы акупацыйнымі войскамі ген. Эдмунд фон Гляйсе-Горстэнаў хацеў спыніць тэрор усташаўскага рэжыму, які ўважаў шкодным для нямецкай ваеннай справы. Але яму супрацівіўся палітычны афіцэр Зыгфрыд Кашэ, які меў блізкія зносіны з Рыбэнтропам і быў перакананы, што ўсташаўцы зьяўляюцца адзінай групай харватаў, на якую можна спадзявацца. Антэ Павэліч 7 чэрвеня 1941 году сказаў Гітлеру, што па паходжаньні харваты не ёсьць славяне, а толькі готы.

Пяцьдзесят гадоў пазьней, 11 жніўня 1991 году, з глыбокіх ямаў у ваколіцы Ліўна, у якія ўсташаўцы кідалі жывых сэрбаў, выцягнулі й па-хрысьціянску пахавалі косьці 1 200 ахвяр гэтай „сьвятой вайны".

У той час, аднае нядзелі, сэрбскі патрыярх адправіў паніхіду па 3 000 сэрбаў замардаваных францішканамі. Адзін з пару ўцалеўшых у той час сэрбаў асудзіў праступствы зробленыя 50 гадоў таму. А другі, старэйшы гадамі, мусульманін успамінаў, як гэта ўсташаўцы-францішкане кідалі плачучых дзяцей у глыбокія прорвы, і зазначыў, што яшчэ й да гэтага часу Каталіцкая царква не прызнала свае віны й не прынесла перапросін.

Захад добра ня ведаў, што ў той час дзеялася ў Незалежнай Дзяржаве Харватыі. А калі й даходзілі некаторыя страшныя весткі, то людзі не хацелі паверыць. Аднойчы італьянская газэта Балёніі „Іль Рэсто дэль Карпіно" за 18

верасьня 1941 году паведаміла як мардуюць людзей у Харватыі, кідаюць жывымі ў прорвы, у рэкі, у мора й т.п.

Італьянскі гісторык Карла Франконі ў кніжцы „Маўчаньне Пія XII" кажа, што толькі ў Харватыі было зьнішчана паўмільёна людзей, праўдападобна з прычыны ненавісьці да праваслаўнай веры й іх паходжаньня. А была й блюзьнерчая кампанія перахрышчваньня праваслаўных на каталікаў. Фізычныя пакуты й псыхічныя перажываньні сэрбаў у час апошняй вайны пакінулі глыбокія духовыя раны, бо-ж тут была вайна ня супраць акупанта, але супраць канфэсіі, супраць народу, які жыў там спакон вякоў. І ўсё гэта рабілася з блаславенства Ватыкану.

За час вайны 1941-1945 гадоў у Югаславіі больш людзей было забітых сваімі суродзічамі як акупантамі — немцамі, італьянцамі, мадзьярамі ці балгарамі. Часта ад прасьледу сваіх людзей сэрбы ўцякалі пад апеку акупантаў. Каталіцкая тыднёвая газэта „Неделя" за 10 жніўня 1941 году пісала: „Так, мы моцна верым у Бога, так мы верым і ў нашага паглаўніка (лідара) Павэліча. (...) Справядлівасьць будзе зроблена й нашы ворагі будуць зьнішчаны".

Такія рэчы рабіліся зь ведама й апрабаты Каталіцкай царквы ў Харватыі, на чале якой стаяў арцыбіскуп Стэпінац. Ён быў ня толькі галавой харвацкіх епіскапаў і камітэту па прымусовым наварачваньні праваслаўных, але быў адначасна галоўным ваенным сьвятаром усташаўскай арміі. Калі ў 1945 годзе прыйшоў канец усташаўскай Харватыі, а Павэліч уцёк і схаваўся, то арцыбіскуп Стэпінац ратаваў усташаўскі рэжым. Быў ён зьвязным усташаўцаў і сваім ксяндзам загадваў наладжваць спэцыяльныя цырымоніі ва ўсіх каталіцкіх касьцёлах з нагоды дня нараджэньня Павэліча й блаславіў усташаўцаў.

Арцыбіскуп Алёйзіе Стэпінац, як галава харвацкага епіскапату, па вайне быў занесены на сьпісак ваенных злачынцаў, а папа рымскі, быццам, нічога ня ведаў, што дзеялася ў Харватыі. А вядома, што Ватыкан быў добра інфармаваны аб сітуацыі ва ўсташаўскай Харватыі. Мала таго, каталіцкая герархія рэгулярна слала рапарты папу, а да таго ў Харватыі быў яшчэ папскі рэпрэзэнтант магістар Марконэ. Супраць гэнацыду, арганізаванага Каталіцкай царквой

у Харватыі, сэрбскі епіскап у ЗША й Канадзе выслаў у сьнежні 1942 году мэмарандум да ўраду ЗША.

Таксама былым міністрам Югаславіі напісаны быў ліст да папы Пія XII наступнага зьместу:

„Ваша Міласьць: я пішу да Вас як чалавек да чалавека, як хрысьціянін да хрысьціяніна. Зь першага дня Незалежнай Харвацкай Дзяржавы пачалася масакра сэрбаў і гэтая масакра працягваецца да сёньня. (...) Чаму я пішу Вам? А таму, што ўва ўсіх гэтых беспрыкладных праступствах, горш за паганаў выкарыстоўваецца наша Каталіцкая царква двума спосабамі. Па-першае, вялікая колькасьць сьвятароў, клірыкаў, манахаў і сарганізаваных маладых католікаў прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх гэтых злачынствах, а што больш страшна, што каталіцкія сьвятары сталіся лягернымі й груповымі камандзірамі й як такія загадваюць і талеруюць страшныя катаваньні, забойствы, масакры хрышчаных людзей. Ніхто гэтага не зрабіў-бы без дазволу сваіх епіскапаў, а калі гэта было зроблена, яны былі-б прызваны на Царкоўны суд і пазбаўлены свае годнасьці. Калі гэта ня сталася, значыць, біскупы далі сваю згоду. (...) Абавязкам Царквы ёсьць узяць свой голас: па-першае, што Царква Хрыстова; па-другое, што яна ёсьць магутная. Пішу я гэта Вам аб такіх страшных злачынствах, каб ратаваць сваю душу й пакідаю гэта Вам знайсьці дарогу збавіць Вашу душу". Падпісана: Првіслаў Грызагона, былы міністар Югаслаўскага Каралеўства. Зэмум, 8 лютага 1942 г.

На жаль, гэты ліст не ўдалося даручыць папу Пію XII з прычыны добра абстаўленых дарог ягонымі інфарматарамі. Бранко Бакун, будучы ў Рыме ў час вайны, вёў дзёньнік і калі хацеў яго апублікаваць, ніхто ім не зацікавіўся. Чакаў ён аж да 1973 году, калі адна нью-ёркская друкарня яго выдала.

Варта памятаць, што папа Пій XII на працягу ўсяе Другое Сусьветнае вайны кіраваў Каталіцкай царквой як прафашыстоўскі сымпатык. Ён добра знаў дзе што дзеецца, а тым больш што адбываецца ў Харватыі. Папа прымаў у сябе ня толькі Павэліча й ягоных міністраў, але 14 ліпеня 1941 году прыняў сотню ўсташаўскіх галаварэзаў і блаславіў іх, а газэта „Оссэрваторэ Рамана" пісала, што гэта было прыватнае спатканьне папы. На адным з такіх прыватных спат-

каньняў папы з Антэ Павэлічам, удзельнікам забойстваў югаслаўскага караля, французскага міністра й сотні тысяч сэрбаў, жыдоў і цыганоў, прысутнічаў толькі адзін стэнограф, які злажыў прысягу, што ніколі не выявіць таго, што ён чуў у сваёй прысутнасьці. Дык аб чым яны маглі гутарыць на такім сакрэтным спатканьні? А гутарылі напэўна аб тым, што дзеецца ў Харватыі.

Як некалі ў Сярэднявеччы, так і ў сучаснай Харватыі, Каталіцкая царква верыць, што строгі каталіцкі меч — найлепшы спосаб уратаваць людзкія душы. І ратаваў іх папа Пій XII з арцыбіскупам Стэпінацам і з дапамогай фашыста Антэ Павэліча, што вызвалялі ад цела душы нявінных людзей. Такой дарогай Рымская царква пашырала сваю веру, зямныя ўладаньні й багацьці на працягу стагодзьдзяў.

Маецца інфармацыя, што толькі адзін з лідараў Курыі, кардынал Тэсэранд, асуджаў усташаўцаў і казаў, што гэтую ганебную пляму католікаў-харватаў ніколі не ўдасца змыць. Але што ён мог зрабіць супраць волі сьвятога папы рымскага?

Вясной 1945 году, калі набліжалася небясьпека, Павэліч зь ведама Стэпінаца закапаў у францішканскім манастыры Загараба скрыні з золатам і серабром, забраным у забітых схізматыкаў. Многа нарабаванага ўсташы падзялілі між сабою й касьцёламі й гэтага багацьця немагчыма палічыць.

Бачучы паразу свае палітыкі, Стэпінац зьвярнуўся да папы Пія XII з просьбай зрабіць усё магчымае для захаваньня Незалежнай Дзяржавы Харватыі, адзначыўшы „масу навернутых праваслаўных, якія з утратай харвацкай незалежнасьці могуць быць страчаны для Каталіцкай царквы".

Таксама А. Павэліч выслаў двух сваіх паслоў і групу ангельскіх палоненых лётчыкаў да аліянцкага камандаваньня з просьбай высадзіць англа-амэрыканскія войскі на тэрыторыі Незалежнай Дзяржавы Харватыі. Відаць, што ён ня ведаў аб вызначаных аліянтамі граніцах, куды маюць ісьці іхнія войскі й дзе маюць затрымацца.

Схаваўшы нарабаванае людзкое дабро на сьвятым манастырскім месцы, ратуючы сваё жыцьцё й душы, Павэліч уцёк у Аўстрыю й там трапіў у палон да амэрыканцаў. Калі ішла падрыхтоўка ягонага працэсу, па невядомых прычынах Павэліч быў звольнены з палону. І тут задзейнічала

магутная рука Ватыкану й уратавала злачынца. Павэліч праз Гішпанію прыбыў у Ватыкан, сядзеў там некаторы час, але для Ватыкану ня быў гонар трымаць такую пэрсону, таму Павэліча, пераадзетага за айца Бенарса й айца Гомэза, паслалі па розных манастырох. Пры дапамозе таго-ж Ватыкану, у 1948 годзе Павэліч пакінуў Эўропу пад прыбраным прозьвішчам. Паперы былі прыгатаваны ў Рыме й 6 лістапада 1948 году Павэліч як Дал Араньёс прыбыў у Аргэнтыну на караблі „Сэстрырэ". І тут не пакінуў ён фашыстоўскай дзейнасьці. Стварыў свой урад і праводзіў тую самую фашыстоўскую палітыку, што й у Харватыі, спадзяючыся на Трэцюю Сусьветную вайну, якая дазволіла-б яму вярнуцца ў Харватыю, каб зноў праліваць людзкую кроў. Аднак мары яго не збыліся. Вальтэр Лакуэр у сваёй кніжцы „Юрэп ін аўр тайм 1945-1992" („Эўропа ў наш час 1945-1992") падае, што Антэ Павэлич памёр у Мадрыдзе ў 1959 годзе.

У Першую Сусьветную вайну Аўстра-Мадзьярская імпэрыя мабілізавала харватаў у сваю армію супраць сэрбаў. Сярод навабранцаў 25 пяхотнага палка створанага ў Заграбе быў малады 21-гадовы Ёсіп Броз, які пазьней прыняў прозвішча Ціта. Пазьней Ціта хаваў свой удзел у гэтай ваеннай кампаніі, якая забіла 132 тысячы сэрбаў, з ліку 250 тысяч ваяваўшых супраць наступу аўстрыйскай арміі на Сэрбію.

Пасьля заканчэньня Другой Сусьветнай вайны Югаславію ўзначаліў Ціта. Кіраваў ён жалезнай рукой і строга распраўляўся са сваімі праціўнікамі. Ціта не талераваў этнічных і рэлігійных розьніц. Каб замацаваць сваю ўладу, паставіў перад судом некаторых усташы зь „незалежнай харвацкай дзяржавы". Аднак камуністычны ўрад Югаславіі не хацеў уздымаць рэлігійную справу, а злачынствы харватаў-католікаў у адносінах да праваслаўных сэрбаў патлумачылі фашызмам. Сэрбская Праваслаўная царква ня мела шансу прадставіць сваю справу ваеннаму трыбуналу Аб'яднаных Нацыяў, аднак дзейнасьць усташаўскай Харватыі была асуджана.

Вясной 1945 году Ціта меў спатканьне са Стэпінацам і дараджаў яму супрацоўніцтва з новым урадам у кіраваньні царквой у Югаславіі й быць больш незалежным ад Рыму, бо ў авдваротным выпадку стане перад судом як ваенны злачынца і супрацоўнік калябарантаў-усташаўцаў. Стэпінац ад-

мовіўся ад супрацоўніцтва з камуністамі й быў суджаны. Суд над арцыбіскупам Стэпінацам праходзіў адкрыта. Запрошана была заходняя прэса, каб пасьля не было абвінаваўчых камэнтараў. Працэс працягваўся дзесяць дзён. Разам са Стэпінацам судзілі ягоных падуладных за калябарацыю з ворагам, з усташаўскімі праступнікамі-забойцамі, за перахрышчваньне праваслаўных, за кансьпірацыю з замежнымі дзяржавамі з мэтай забясьпечыць іхнюю інтэрвэнцыю ў Югаславію. Агульная віна арцыбіскупа заключалася ў невыкананьні сваіх духоўных абавязкаў. 11 кастрычніка 1946 году арцыбіскупу Алёйзіе Стэпінацу, за ягоную „пастырскую дзейнасьць", суд адчытаў 16 гадоў цяжкіх работ. Але арцыбіскуп цяжка не працаваў і па двух гадох адпушчаны быў на волю.

За „зьнявагу" арцыбіскупа папа экскамунікаваў усіх тых, хто прымаў удзел у працэсе „нявінна арыштаванага й суджанага арцыбіскупа Стэпінаца". Бо-ж папа Пій X 9 кастрычніка 1911 году пастанавіў, што ксёндз не павінен быць пакліканы на суд нават тады, калі зрабіў найбольшае злачынства.

Аднак арцыбіскуп Стэпінац акампраметаваў сваю Царкву, адмовіўшыся асудзіць злачынствы свайго духавенства, якое нават само прызналася да мардэрстваў, а іншыя, як біскуп Сараева Марыч і біскуп Любляны Рожман, ды шмат другіх духоўных і сьвецкіх, баючыся народнага гневу й пакараньня, пакінулі Югаславію.

Акрамя арцыбіскупа Стэпінаца судзілі яшчэ дзевяцёх францішканаў, зь якіх трох апраўдалі. Прысуд быў адчытаны 11 кастрычніка 1946 году.

Аднак Ватыкан не прызнаў віны за сваім духавенствам і 29 лістапада 1952 году надаў Стэпінацу сан кардынала. Памёр Стэпінац 10 лютага 1960 году й пахаваны быў у катэдры Заграбу за алтаром.

Душы сэрбаў, жыдоў і цыганоў, памардаваных каталікамі Харватыі, патрабуюць ад папы рымскага прызнаць віну герархіі й вернікаў, і, як гэта зрабіў Вільлі Брандт у Аўшвіц, на каленях пакаяцца.

Па сваёй натуры Ватыкан любіць гуляць у палітыку. Агульна вядома, што папа Пій XII быў вялікім прыяцелем немцаў і пазьбягаў адкрыта ці скрыта асуджаць іхнія паводзіны ў час вайны. Аднак, дзеля людзкога вока, папа выказаў спачуваньні

Бэльгіі, Галяндыі й Люксэмбургу, калі гэтыя краіны былі акупаваныя немцамі бяз дай прычыны. Але, калі немцы акупавалі Данію, Нарвэгію, Югаславію, або была акупавана Грэцыя, папа не адазваўся, а гэта таму, што жылі там пратэстанты й праваслаўныя. Хоць былі яны хрысьціянамі, але не таго Бога й ня той канцылярыі, якой загадваў папа Пій XII. Калі-ж немцы наехалі Савецкі Саюз, дык зараз за імі пацягнуліся выхаванцы „Русьсікум", групы нямецкіх і польскіх езуітаў з мэтай устанавіць там каталіцкі лад, але гэта ім не ўдалося. Гітлер не хацеў уводзіць у гэтых краінах рэлігійнай вайны, для яго лепш было гаварыць аб вызваленьні Праваслаўнай царквы ад камуністычнага прыгнёту, чым уводзіць каталіцкую веру, якая нямала прынесла бяды й няшчасьця, асабліва на Беларусі ў часе польскага панаваньня.

Калі зараз пасьля вайны пачалася гонка атамных збраеньняў, у 1949 годзе папа Пій XII, каб узмацніць антыбальшавіцкую ідэалёгію, экскамунікаваў каталікоў, якія былі камуністамі, або падтрымоўвалі камуністаў. А яго каталіцкія тэолягі ў Амэрыцы пачалі гаварыць, што абавязкам Амэрыкі ёсьць прымяніць атамную бомбу, каб уратаваць Захад ад камунізму. Але якія насьледзтвы выкліча атамная бомба для мірнага насельніцтва, аб гэтым каталіцкія тэолягі не клапаціліся.

Палітыка Ватыкану — гэта палітыка міжнароднага замяшаньня, або прыпадабаньня. Асабліва імя папы Пія XII было вядомае як чалавека двудушнага. Ягоныя прафашыстоўскія й пранямецкія сымпатыі былі вядомыя даўно. Быў ён ад 1917 да 1929 году рэпрэзэнтантам Ватыкану (нунцыем) у Нямеччыне. А калі яго, кардынала Яўгена Пацэльлі, 2 сакавіка 1939 году выбралі папам, дык ён як першаму аддаў пашану Гітлеру. Аб гэтым сьведчыць дэпэша амбасадара Трэцяга Рэйху пры Ватыкане Д'ега Бэргэна да міністра замежных спраў Рыбэнтропа неадкладна пасьля выбару папы й ягоным візыце ў яго: „Папа, каторому заступнік сакратара стану пераказаў на маю просьбу віншаваньні ад фюрэра й канцлера, а таксама ад ураду Рэйху, прыслаў апошняй ночы навіну, што хоча прыняць мяне сёньня рана. На аўдыенцыі, у час якой паўтарыў віншаваньні, папа падкрэсьліў, што я быў першым амбасадарам, якога ён прыняў і жадаў пера-

казаць праз мяне асабістае сардэчнае дзякуй фюрэру й канцлеру. Да гэтага дадаў найбольш шчырыя пажаданьні для нямецкага народу".

На прыёме нямецкіх лётчыкаў у Ватыкане 4 лютага 1941 году папа сказаў, што ён „шчасьлівы прыняць іх" і блаславіў. Ці былі гэта сапраўдныя сымпатыі папы Пія XII да немцаў, ці былі яны выкліканыя небясьпекай для ягонай Царквы праз немаральныя паводзіны ягоных ксяндзоў у Нямеччыне, цяжка сказаць. Але каталіцкія ксяндзы сталі перад нямецкім судом. На гэту тэму так піша Станіслаў Янкоўскі:

„Каб не дапусьціць да больш складаных праблем ватыканскага кліру й каб стрымаць судовыя ўлады ўзбуджваць далейшыя судовыя працэсы, Ватыканскі касьцёл заключыў з Гітлерам цікавую дамову, на аснове якой Гітлер адклікаў усе абвінавачваючыя акты супраць немаральных ксяндзоў і францішканаў, а нямецкія біскупы выдалі пастырскі ліст, які заклікаў каталікаў падтрымаць палітыку Гітлера. Лісты гэтыя былі зачытаны ва ўсіх каталіцкэх касьцёлах 30 жніўня 1936 г." („Гжэхы жымскіх папежы", Толедо, ЗША).

Усё-ж папа Пій XII быў прафашыстоўскім датуль, пакуль фашызм кіраваў Заходняй Эўропай. Калі-ж стала вядома, што Гітлер вайну прайграе, тады й папа далучыўся да змоўшчыкаў забойства Гітлера. Гэта забойства мела, быццам, уратаваць Нямеччыну ад краху. Але ня так лёгка было згладзіць Гітлера, хоць ахвотнікаў хапала, толькі не знаходзілася рашучага чалавека. Ватыкан інфармаваў змоўшчыкаў, каб дзейнічалі хутчэй, калі хочуць заключыць асобны мір з аліянтамі. Нарэшце знайшоўся каталік, граф фон Штаўфэнбэрг, які 20 ліпеня 1944 году падлажыў бомбу ў бункеры Гітлера. Бомба ўзарвалася, забіла й раніла некалькі генэралаў, а Гітлер застаўся жывы. І тады пачалася масакра апазыцыі. Некаторыя маршалы, генэралы, пакончылі жыцьцё самагубствам. Агулам было зьнішчана 4 980 жанчын і мужчын.

Бачучы трагэдыю, Ватыкан хутка загадаў сваёй нямецкай герархіі выказаць спачуваньні Гітлеру. Пачаліся падзячныя малебны ў каталіцкіх касьцёлах са сьпевам „Тэ Дэум". Кардынал Фаўльгабэр выслаў ад сябе й сваіх біскупаў віншаваньні Гітлеру. Але ўсё гэта аказалася дарэмна. Ватыкану прыйшлося наладзіць супрацоўніцтва з аліянтамі.

Апошнім часам Ватыкан мала гаварыў аб падзеях у Югаславіі, бо чуе за сабою віну ў гэтай краіне. А была гэта не адна віна, не адна злачынная дзейнасьць рымскіх папаў, якія няраз пралівалі нявінную хрысьціянскую кроў дзеля пашырэньня свае каталіцкай экспансіі. Але, калі ў гэтай грамадзянскай югаслаўскай вайне пачалі гінуць і католікі, то папа Ян Павал II 11 ліпеня 1993 году зьвярнуўся з заклікам спыніць этнічную барацьбу ў Босьніі. Гэта самае ён паўтарыў і на Каляды 1993 году. А 10 верасьня мінулага году папа прыбыў у Заграб, дзе гаварыў аб міры, згодзе, узаемным прабачэньні, аб пралітай нявіннай крыві, быццам у гэтай хатняй вайне рэлігія нічога ня мела супольнага. Але зварот-заклік папы ня можна разглядаць як шчырыя, аб'ектыўныя захады арбітра, бо-ж праступная дзейнасьць католікаў, ня толькі ў Харваты й Босьніі, накіраваная супраць праваслаўных і вядзецца з бласлаўенства рымскіх папаў.

Немцы ўжо даўно прызналі свае злачынствы ў час апошняй вайны. Але Каталіцкая царква яшчэ да гэтага часу не прызнала віны ксяндзоў у адносінах да праваслаўных, цыганоў і жыдоў у былой фашыстоўскай Харваты. Дык як ён можа прызнаць сваю віну, калі рымскі папа — „насьледнік сьв. апостала Пятра", „сьвяты айцец" і да таго „непамыльны". Ён бачыць віну ўсіх, толькі не сваю. Фрэд Сінглетон піша: „Праваслаўная царква захавалася лепш за Рымскую Каталіцкую царкву. Яна была ачолена патрыярхам, якога антыфашысцкае стаўленьне было бязгрэшным, і Царква, непадобна Рымскай Каталіцкай царкве, не была ў ніякіх варожых зносінах за мяжой і таму была прызнана нацыянальнай Царквой. Яна не вяла рэлігійнай вайны супраць католікаў нават у раёнах з перавагай праваслаўных" („Твэнтыдэ Сэнчэры Югославія", стар. 201).

Патрыярх Сэрбскай Праваслаўнай царквы Гаўрыла падтрымаў сакавіцкі пераварот у 1941 годзе супраць саюзу з гітлераўскай Нямеччынай. І калі немцы акупавалі Бялград, патрыярх ня ўцёк, як гэта зрабілі кароль і міністры, або папскія біскупы з ксяндзамі ў Харваты ў 1945 годзе. Пазіцыя праваслаўнага першагерарха да акупантаў засталася нязьменнай і за гэта немцы арыштавалі патрыярха й саслалі ў канцэнтрацыйны лягер Маўтгаўзэн і Дахаў. Ляге-

ры яго не зламалі. Патрыярх вярнуўся дамоў і ў 1946 годзе ачоліў Праваслаўную царкву ў Югаславіі.

Фактычна Каталіцкай царквы няма, а ёсьць толькі „Ватыканская царква", а Ватыкан — гэта гняздо палітыкі, дыпляматыі й інтрыгаў. І гэтым інтрыгам і правакацыям з боку каталіцкіх герархаў няма канца. Для прыкладу прывядзем вынятак з газэты „Ніва":

„Інтэрв'ю зь беластоцкім каталіцкім арцыбіскупам Станіславам Шымэцкім і яго супрацоўнікамі, якога аргумэнты мы прадставілі чытачам „Нівы", было нядаўна надрукаванае ў каталіцкім часопісе „Госьць нядзельны". Выказваньні каталіцкіх герархаў — гэта ўжо ня толькі фальшаваньне гісторыі, але таксама паклёпы й абвінавачваньне праваслаўных і беларусаў у здрадзе дзяржавы („оні сон на услугах Москвы") (...) імкненьне да выкліканьня нацыянальных і рэлігійных канфліктаў.

Паводле меркаваньняў беластоцкіх герархаў, усе мы тут — праваслаўныя і беларусы — нашчадкі расейцаў, прывезеных сюды царскімі ўладамі на месца вывезеных у Сібір палякаў. І толькі ў 1989 г. — вядома, у выніку вонкавых інтрыгаў — некаторыя пачалі называць сябе беларусамі. Нягледзячы на тое, ці была тут царская ці камуністычная польская адміністрацыя, праваслаўнае насельніцтва заставалася маскоўскай агентурай. Польскае грамадзтва аказалася пад пагрозай (якой, невядома). Урад да справы ставіўся абыякава, мясцовая й цэнтральная прэса нават спрыяла здраднікам і чужой агентуры. Бараніць польскасьць і хрысьціянства прыйшлося толькі Каталіцкаму касьцёлу. (...)

Арцыбіскуп Шэмэцкі будзе вучыць сваіх вернікаў „што гэта абазначае быць сёньня хрысьціянінам" („Ніва" № 43, Беласток 24 кастрычніка 1993 г., стар. 3).

Вось гэта ёсьць навука „праўдзівай веры", якая ўнушае свайму верніку ў Польшчы нелюбоў бліжняга й ненавісьць да кожнага, хто не паляк і не каталік. У гэтым месцы можна прывесьці словы Ларысы Геніюш: „О, Рым, якога ксяндзы ня йдуць да нас з салодкім і вечна мудрым словам Божым і любоўю, а з палітыкай, з дэнацыяналізацыяй тых, якія так намагаюцца, так хочуць выжыць як народ, як лепшыя людзі" („Споведзь", Мінск 1993, стар. 220).

Аднойчы лёнданская тыднёвая газэта „Гардыян Уіклі" пісала аб каталіцкім духавенстве ў Польшчы, якое пасьля ўпадку камунізму апынулася ў сур'ёзных цяжкасьцях. Сьвятары згубілі прэстыж, зьменшыўся наплыў студэнтаў у сэмінарыі, ды ўпала вера ў народзе. Людзі не зьвяртаюць увагі на касьцельную забарону разводаў і абортаў, калі гэта не забараняецца законамі дзяржавы. І таму, магчыма, каб дзейнасьць каталіцкіх ксяндзоў не абмежавалася да чатырох сьцен касьцёла, яны пачынаюць займацца палітыкай і то фальшывай.

Падобна піша ў рэдакцыю „Голасу Часу" наш супрацоўнік зь Нямеччыны: „У канцы кастрычніка (1993 г.) канстантынопальскі патрыярх, Яго Сьвятасьць Варфаламей I, наведаў Нямеччыну. Што цікава, яшчэ на пачатку кастрычніка, калі ў Мюнхене аднавілі сабор (катэдру) прасьв. Дзевы Марыі, то мюнхенскі кардынал Фрыдрых Вэтэр заявіў, што ён — з нагоды так вялікага госьця — „пазычыць" усяленскаму патрыярху сабор на набажэнства — як „экумэнічны жэст" у адносінах да праваслаўя. Трырскі прагрэсіўны каталіцкі тыднёвік (за 31 кастрычніка 1993 г.) зьмясьціў даволі абшырную зацемку (з фатаграфіямі) аб Варфаламею I.

Калі частка нямецкіх кардыналаў уважае Праваслаўную царкву „сястрыцкай" і раўнапраўнай, то польскі клір у Рыме (з інтэлектам з-пад Радама ці Кельцаў) лічыць, што „экумэнічнае аб'яднаньне" Рыму з Канстантынопалем будзе тады „сапраўдным", калі праваслаўе падпарадкуецца „рымскаму архіепіскапу — насьледніку апостала Пятра". Адна група кардыналаў і епіскапаў, на чале з кардыналам Рацынгерам, коратка й ясна заяўляе, што ня можа быць ніякага „сястрыцтва", а толькі поўнае падпарадкаваньне. Такіх тупагаловых епіскапаў насаджвае Вайтыла ў Нямеччыне. Таму тут вялікае абурэньне з боку вернікаў. А трырскі і баварскія епіскапы выказваюцца супраць такой палітыкі Ватыкану. Зразумела, што пры такім прымітыўным „намесьніку Хрыста на зямлі" цяжка дагаварыцца. Дадам, што евангеліцкія касьцельныя арганізацыі проста зь вялікім уздымам віталі патрыярха (таксама прэзыдэнт Нямеччыны фон Вайцзэкэр — былы старшыня Рады Евангелікаў). Папа мае шчасьце, што ў радох каталіцкага кліру яшчэ не паявіўся сьвятар тыпу Марціна Лютэра". (Дадам толькі, што пасьля сьмерці

папы Яна Паўла II канклаў кардыналаў у красавіку 2005 году выбраў папам нямецкага кардынала Рацынгера, які прыняў імя Бэнэдыкта XVI. Чаго тады можа спадзявацца Праваслаўная царква, калі дванаццаць гадоў таму, будучы папа заявіў, што ня можа быць ніякага „сястрыцтва" з Праваслаўнай царквой, а толькі поўнае падпарадкаваньне).

Ня так яшчэ даўно, у 1960-х гадох здавалася, што Каталіцкая царква ўзыходзіць на шлях саборнага яднаньня, што можна было бачыць па ходзе II Ватыканскага сабору. Але гэты працэс стрымаў сучасны папа Ян Павал II. Прычынай гэтаму паслужыў крызіс, у якім апынулася Каталіцкая царква й каб гэты крызіс не паглыбіўся, папа памінуў саборнасьць і вярнуўся да старой дактрыны.

Вяртаючыся да Югаславіі, прадстаўнік камісіі ААН па дасьледаваньні злачынстваў у былой Югаславіі сказаў, што пачынаючы ад 1991 году, ва ўзьніклай барацьбе жыцьцё страціла больш за 140 тысяч людзей (мусульманаў, каталікоў і праваслаўных). У параўнаньні да самых праваслаўных сэрбаў, якіх каталікі зьнішчылі ў часе апошняй вайны ў адной толькі Харватыі, то гэта лічба не такая вялікая.

Аб дзейнасьці харватаў змясьціла зацемку „Народная газета" (№ 235 за 2 сьнежня 1993 г.) пад назовам „Змрочныя вынікі этнічнай чысткі ў Харватыі", дзе чытаем:

„Этнічная чыстка ў Харватыі прывяла да выгнаньня 300 тысяч сэрбаў. Аб гэтым гаворыцца ў паведамленьні міністэрства па справах правоў чалавека й нацыянальных меншасьцяў Саюзнай Рэспублікі Югаславіі, распаўсюджаным у штаб-кватэры ААН у якасьці дакумента Генэральнай Асамблеі.

Прыняцьце Канстытуцыі Рэспублікі Харватыі ў 1990 годзе, адзначаецца ў дакуманце, суправаджалася актыўнай кампаніяй па памяншэньні нацыянальнай ролі сэрбаў і ўяўляе сабою акт дыскрымінацыі".

У такой перамешанай рознымі народамі краіне як Югаславія сэрбы, каб захаваць мір, былі зацікаўлены ў захаваньні фэдэрацыі. Каля 15% сужэнстваў у Югаславіі былі этнічна зьмешанымі. Босьнія й Герцагавіна так перамяшаліся, што цяжка сярод іх насельніцтва вылучыць этнічныя адзінкі, ад якіх захаваўся толькі гістарычна-геаграфічны назоў.

Многа сэрбаў жыло ў розных рэспубліках Югаславіі. Напрыклад, у Босьніі й Герцагавіне жыло 32% сэрбаў, у Харватыі — 15%. Таксама розныя народы югаслаўскай фэдэрацыі жылі й у Сэрбіі. Так, як абавязкам кожнай дзяржавы ёсьць апекавацца сваімі грамадзянамі, таксама й Сэрбская Рэспубліка ў сваёй новай канстытуцыі ад 28 верасьня 1990 году адзначыла, што ўрад Сэрбіі ёсьць адказны за сваіх людзей на ўсёй тэрыторыі Югаславіі, паколькі канстытуцыя Рэспублікі Харватыі абмежавала правы сэрбаў. Але харваты з гэтым не пагадзіліся, яны хацелі, як і раней, у час вайны, падпарадкаваць сабе сэрбаў і зрабіць іх грамадзянамі другой катэгорыі.

У выніку палітыкі харватаў у Бялградзе й іншых гарадох Сэрбіі пачалі ўзрывацца бомбы й праводзіцца тэрарыстычныя акты. У такой рабоце харваты не былі адзінокімі, яны мелі падтрымку на Захадзе. Для сэрбаў нічога не заставалася як толькі ўзяць зброю ў рукі, каб пазьбегчы тае масакры, якую ўчынілі над імі харваты ў часе Другой Сусьветнай вайны ў сваёй незалежнай дзяржаве.

Як бачым, этнічная й рэлігійная ненавісьць паміж народамі Югаславіі нарастала на працягу гадоў і летам 1991 году выбухла грамадзянская вайна. Гэта акружаючаму сьвету нагадвала небясьпечны канфлікт, які можа прыняць шырэйшы маштаб. Акрамя Харватыі, Босьніі й Сэрбіі збройная барацьба можа ахапіць і іншыя дзяржавы на Балканах, напрыклад, Альбанію, Грэцыю й Балгарыю, якія даўно зацікаўлены ў сэрбскай правінцыі Косава.

Тое, што ўчынялі харваты над сэрбамі, жыдамі й цыганамі ў сваёй Незалежнай Дзяржаве Харватыі ў час апошняй вайны, ніколі ня будзе забыта. За зроблены генацыд ня толькі праваслаўныя сэрбы, але й жыды дамагаюцца справядлівасьці. Як падае газэта „Гардыян" за 18 лістапада 1993 г., жыдоўскія лідары ў Заграбе зьвярнуліся да харвацкага ўраду спыніць рэабілітацыю фашыстоўскага рэжыму з Другой Сусьветнай вайны. Жыдоўскія лідары занепакоеныя ўзвышаньнем квісьлінгаўскай усташаўскай дзяржавы, якая мардавала сотні тысяч сэрбаў, жыдоў і цыганоў. Вуліцы, плошчы й школы, якія насілі імёны антыфашысцкіх змагароў перайменавалі, а помнік у гонар замардаваных 1 500 жыдоў

у канцэнтрацыйным лягеры Ядоўна быў разбураны. Прэзыдэнт Туджман прапануе, каб астанкі памардаваных партызанамі харватаў перанесьці й пахаваць у Ясенавац. Гэта абражае жыдоў, бо гэтыя харваты былі ўсташаўцамі й у час вайны мардавалі жыдоў, цыганоў і сэрбаў. Прадстаўнікі жыдоўскай абшчыны ў Заграбе зьвярталіся да харвацкай адміністрацыі ў справе злачынстваў Іва Ройніца, старшага ўсташаўскага ўрадаўца, які пасьля вайны ўцёк у Аргэнтыну й быў назначаны амбасадарам. Як бачым, дарога да сапраўднага міру ў Харватыі выглядае вузкай і далёкай.

Лідэры трох ваюючых групаў: Мілошавіч, Туджман і Ізятбегавіч — гэта былыя камуністы, супрацоўнікі Ціта, якія ня так даўно жылі мірна. Але мір гэты нарушылі свае й чужыя людзі. Пры канцы лістапада 1991 году Бон прызнаў афіцыйна, што ў Харватыі дзейнічаюць нямецкія „вайсковыя інструктары". Так, старое сяброўства захоўваецца, а старыя й новыя крыўды памятаюцца. На жаль, аб іх мала хто гаворыць і мала хто хоча знаць.

Усё-ж замежная інтэрвэнцыя спрычынілася да таго, што 25 чэрвеня 1991 году Славэнія й Харватыя абвясьцілі незалежнасьць. Іх насьледавалі Македонія й Босьнія. Разам з абвяшчэннем незалежнасьцяў пачалося праліцьцё крыві ў былой Югаслаўскай Фэдэрацыі, бо не было тут узаемнага паразуменьня як правесьці падзел тэрытарыяльных інтарэсаў. Справай занялася ААН, але й ёй ня так лёгка ўдаецца залагодзіць югаслаўскі канфлікт.

Апошнім часам у югаслаўскі канфлікт хацелі ўцягнуць і Беларусь. Як падае газэта „Звязда" (№ 92 за 21 траўня 1993 г.), у Менску „20 мая сьпікер беларускага парлямэнту Станіслаў Шушкевіч сустрэўся з сустаршынёй Канфэрэнцыі па мірнаму ўрэгуляваньню югаслаўскага крызісу лордам Оўэнам і міністрам замежных спраў РБ П. Краўчанкам". Дакладнай справаздачы з гутарак газэта не падае. Але 25 траўня „Звязда" (№ 95) падала, што „была сустрэча супрацоўніка міністэрства замежных спраў Швэцыі — пасрэдніка плянў Вэнса-Оўэна са сьпікерам парляманту Станіславам Шушкевічам і размова датычыла менавіта ўдзелу Ўзброеных Сіл Беларусі ва ўрэгуляваньні югаслаўскага канфлікту, але станоўчага адказу швэд не атрымаў. Справа ня толькі ў стату-

се нэйтральнай дзяржавы, якой Беларусь сябе абвясьціла. Адпраўляць падразьдзяленьні трэба на свой кошт, а ўтрыманьне аднаго жаўнера ў Югаславіі каштуе прыблізна 100 даляраў у суткі.

Няма сумніву, што ў югаслаўскай грамадзянскай вайне ганебную ролю выконваюць некаторыя людзі з заходніх дзяржаваў. Так аб гэтым піша І. Марынковіч:

„Чаго шукаюць на харвацкім фронце наёмнікі („сабакі вайны") з краін так разьвітых эканамічна й культурна як Данія, Галяндыя, Нямеччына, Аўстрыя? Выступаючы перад камерамі ТБ тлумачацца, што зьявіліся на „ахвотнікаў", каб бараніць цывілізацыю перад дзікімі балканскімі плямёнамі. Нямецкая прэса параўноўвае сэрбскі народ да зьвяроў, зноў прымяняе пагардлівыя акрэсьленьні („ніжэйшая раса") са слоўніка гебэльсоўскай прапаганды".

Нельга сказаць, каб і беларусы абыякава глядзелі на падзеі ў Югаславіі. Як падае газэта „Мы и время" (№ 66, май 1993 г., стар. 2), знатныя прадстаўнікі беларускай навукі й культуры 25 траўня 1993 году прынялі рашэньце аб утварэньні Беларускага камітэту салідарнасьці з сэрбамі. Аб гэтым так піша Валеры Казлоўскі: „Створаны ў канцы траўня Беларускі камітэт салідарнасьці з сэрбамі й чарнагорцамі, у які ўвайшлі вядомыя навукоўцы А. Махнач, М. Барысевіч, І. Ліштван, І. Кучараў, пісьменьнік І. Шамякін, мастак М. Гасцюхін, кінарэжысёр В. Тураў і іншыя, пасьпеў ужо атрымаць розныя ацэнкі". Старшынёй новай арганізацыі выбраны пісьменьнік Іван Чыгрынаў. Якую дзейнасьць будзе праводзіць гэты Беларускі камітэт салідарнасьці з сэрбамі й чарнагорцамі, гаворыць сам яго назоў. Доўга не прыйшлося чакаць кантактаў беларусаў з сэрбамі. Як падае газэта, камітэт, куды ўваходзіць шэраг вядомых дзеячаў навукі й культуры Беларусі, прыняў гасьцей з Сэрбіі — вядомага гісторыка, аўтара кнігі „Генацыд пад блаславенствам Ватыкана", акадэміка славянскіх культур прафэсара Расьціслава Петравіча, ваеннага фотарэпарцёра інфармацыйнай службы пры галоўным штабе сэрбскай арміі Міленка Шукалы, а таксама Савета Міжнароднага фонду славянскага пісьменства й культуры, выдаўца Ю. Мядзьведзева. Госьці з Сэрбіі адказалі на пытаньні журналістаў. У фае Прэзыдыюма

Акадэміі навук, дзе праходзіла сустрэча, прысутныя азнаёміліся з фотавыстаўкай „Сэрбія просіць аб дапамозе", — пісала „Мінская праўда" (№ 77, 1993 г.).

Што робіцца ў балканскім катле — справа складаная, бо тут, так ці інакш, але скрыта й адкрыта дзейнічаюць замежныя дзяржавы. Усе тры ваюючыя між сабою бакі маюць спонсараў. Плян Вэнса-Оўэна, прадбачваючы стварэньне дзесяці кантонаў, не знайшоў падтрымкі й яго адхілілі. Вядуцца перагаворы сярод ваюючых груп наконт заключэньня міру, але яго ніхто не захоўвае й таму барацьба працягваецца.

Неяк ЗША ўдалося прывесьці харватаў і мусульманаў Босьніі да падпісаньня мірнага саюзу. Згадзіліся яны таму, бо ня мелі сілы ўстаяць супраць сэрбаў. Але пакладаць надзеі на гэты мір цяжка. Завялікая варожасьць праявілася апошнімі гадамі сярод гэтых этнічных групаў, каб яны маглі весьці мірнае жыцьцё. Найлепшы спосаб захаваньні між імі міру — сэпарацыя.

Як ужо згадвалася раней, галоўным вінаўнікам канфлікту на Балканах робяць сэрбаў і супраць іх прымянілі санкцыі ды бамбілі з самалётаў. А ці-ж толькі адны праваслаўныя сэрбы ваююць з католікамі й мусульманамі? Нямала паміж сабою ваююць і каталікі з мусульманамі ды мусульмане з мусульманамі. Так, што калі бамбіць, то ўсіх — мусульманаў, католікаў і праваслаўных, але гэта не разьвяжа канфлікту.

Гісторыя Сэрбіі гэта безупыннае змаганьне яе народу з далёкімі й блізкімі захопнікамі дзеля захаваньня свае нацыянальнай тоеснасьці. Прынятыя Захадам санкцыі супраць сэрбаў не зламалі іхняга духа супраціву. Таму Захад павінен больш сур'ёзна падысьці да пытаньняў так званай „этнічнай чысткі". Для прыкладу Срэбраніца, аб якой так многа гаварылася й пісалася на Захадзе, але прамоўчваліся тысячы сэрбаў, што былі забітыя або змушаны пакінуць гэты раён ад 1991 году, які захапілі мусульмане.

„Дзеньнік польскі" ў Лёндане, які зазвычай выказваў спачуваньні харватам, 11 лютага 1994 г. зьмясьціў камэнтар Кшамінскага, перадрукаваны з прэсы ў краі, дзе ён піша:

„Увесь сьвет абурыўся на масавыя гвалты на мусульманах у Босьніі, а Джон Бэрнс з „Нью Ёрк Таймс" атрымаў узнагароду Пуліцэра за справаздачу з 6-гадзінных допытаў

сэрбскага забойцы й гвалтаўніка. Сёньня аказалася, што гэтая й іншыя справаздачы з Босьніі, Харваты й Сэрбіі ёсьць неверагодныя, што бачым на нашых экранах сапраўдныя здымкі, што гэтыя людзі сапраўды гінуць, але ня ёсьць яны тымі, аб якіх гавораць нам дыктары тэлевізійных навінаў.

Згаладалы чалавек за дратамі — здымак гэты абег сьвет — ня быў мусульманінам, але сэрбам і быў арыштаваны за разбой ды ад некалькіх гадоў хварэў на сухоты. Масакру мусульманаў, каля пякарні ў Сараеве, спрычыніла бомба, падложаная мусульманамі, якія хацелі вымусіць інтэрвэнцыю ААН супраць сэрбаў".

„Найгоршае аднак, — піша Пітэр Брок, — што міжнародная зграя ў Югаславіі з выгады й нядбальства, зь няведаньня мовы, але ўдзячнасьці для сваіх харвацкіх або басьнійскіх апекуноў даецца злавіць на клясычныя трукі ПР, паўтараць, што бачаць. Напрыклад, расказваюць усяму сьвету аб абстрэле шпіталя ў Сараеве, але маўчаць аб тым, што выходзячы з гэтага шпіталя напатыкаюцца на ўстаноўленыя пад ім басьнійскія гарматы". Кшамінскі піша далей так: „Ня ходзіць, каб бяліць па часе сэрбаў, зьмяшчаць трагедыю ўсіх забойстваў і паніжэньняў у Югаславіі, але ходзіць аб тое, каб не ўпадаць у аднабаковую прапаганду й тварыць сабе ідэальнага ворага, прадбачанага для „абстрэлу", згодна простага правіла выключнай віны". Таксама газэта „Ніва" (№ 9 за 27 лютага 1994 г.) піша, што паводле польскай газэты „Палітыка" (№ 6), „амэрыканская тэлевізія й прэса груба фальшуюць справаздачы зь Югаславіі паводле простай схемы: сэрбы ёсьць „усходнія" й „візантыйцы", армія югаслаўская ёсьць кіраваная „цьвёрдагаловымі камуністычнымі генэраламі", а аб харватах гаворыць, што яны — „заходнія", „заможныя", „будуючыя заходнюю дэмакратыю". Паказалі зьнішчэньні на баку мусульманаў або харватаў, а аб мардэрствах і гвалтах на сэрбах нічога не сказалі. Хоць „пазычылі" сабе сэрбскія трупы, гавораць і пішуць, што гэта харваты й мусульмане".

Прывядзем яшчэ адзін прыклад, які падае Дзмітры Шатыловіч: „Былы генэрал арміі Ціта, а цяпер прэзыдэнт Харватыі Ф. Туджман, ужо як гісторык, апраўдваў усташаўскія забойствы сэрбаў. Ужо ў 1990 г. абмежаваў правы сэрбаў

у канстытуцыі ад 22 сьнежня 1990 году. Пачалі тады праводзіць этнічную чыстку сэрбаў, нішчылі праваслаўныя цэрквы. Лёрд Карынгтан напісаў: „Калі ўдумацца ў прычыны вайны, можна пацьвердзіць, што гэта харваты падпалілі кнот, абвяшчаючы канстытуцыю, якая не бярэ пад увагу асаблівай пазіцыі сэрбаў у гэтай рэспубліцы". Памылкай заходняй Эўропы, а тым больш Германіі, было ўвядзеньне эмбарга на інфармацыю ад сэрбаў. Аўтары рапарту Сусьветнай Рады Цэркваў „Ді траджэды оф Босьнія" пішуць: „З праўдзівым сорамам мусім пасьведчыць, што на працягу двух тыдняў пасьля адкрыцьця масавых магіл забітых сэрбаў у Басанскім Бродзе не зьявілася туды аніводная заходняя тэлевізійная брыгада, аніводзін заходні журналіст". А інфармацыі мусульман і харватаў ідуць у эфір бесперашкодна й зьмяшчаюцца ў міжнароднай прэсе на першых старонках. Многія з гэтых інфармацыяў зьяўляюцца непраўдзівымі. Далей у „Ді траджэды оф Босьнія" пішацца: „Многія выяўленыя сакрэты з тайных рапартаў паказваюць, што многа лютасьцей прыпісаных сэрбам зрабілі ў Сараеве мусульмане, каб вызваць сімпатыю грамадзкай думкі й паскорыць узброеную інтэрвэнцыю НАТО". („Ніва" № 19, Беласток 8 мая 1994 г.).

19 верасьня 1994 г. агенцтва Сіфакс падало, што мусульмане каля Сараева адкрылі страляніну па пазіцыях сэрбаў з мэтай справакаваць іх, каб пасьля сьцягнуць на іх бамбёжку саюзных самалётаў. Але галоўнакамандуючы войскамі ААН ген. Рос сказаў мусульманам спыніць неадкладна страляніну, бо інакш скіруе свае самалёты на мусульманскія пазіцыі.

Свае камэнтары аб падзеях у былой Югаславіі пачала падаваць і беларуская газэта ў Вільні „Наша ніва". Ці часам яна не падшукала сабе размоўцы па-душы, каб ачарніць сэрбаў? Аказаўся ім украінскі прафэсар, грамадзянін Харваты, Васіль Страхалюк. На пытаньне рэдакцыі „Нашай нівы": „Якая тут роля лёзунгу братэрства праваслаўных славянаў?" адказ прафэсара быў неспадзяваны: „Адна з вызначаных. Сэрбы перакананыя, што яны народ, які найбольш пакутаваў ад іншых, у іх ёсьць нават тэрмін — сэрбажэрства. У іх адзначаная этнічная арыентацыя, яны кажуць — мы й расейцы! Апрача гэтага — вось уплыў арыенту — падступнасьць, сэрбы заражаныя чыста турэцкім фанатызмам.

Праваслаўныя сьвятары ў Сэрбіі адыгралі ў гэтай вайне благую ролю — бласлаўлялі на забойства. Чаго не скажу пра мусульманаў і католікаў" („Наша ніва" № 3,1994 г.).

Зь якіх гэта гістарычных крыніцаў падае такія інфармацыі прафэсар В. Страхалюк? Ці-ж яму ня ведама, што сэрбы адпакутавалі намнога больш за харватаў і мусульманаў, а найбольш ад каталікоў-харватаў у час апошняй вайны. Тады ня толькі з блаславенства харвацкіх біскупаў, але й самога рымскага папы, сэрбы страцілі 1,5 мільёна людзей. І калі фальшыва будзе абвіняцца праваслаўнае духавенства ў забойствах, а прамоўчвацца сапраўдны злачынца, які па вушы вымазаны ў крыві праваслаўных сэрбаў, то ў югаслаўскім канфлікце ніколі ня будзе спакою.

Апошнім часам Ватыкан мала гаворыць аб падзеях у Босьніі, Герцагавіне й Харватыі, бо чуе за сабою віну ў гэтых краінах. А была гэта не адна віна, не адна праступная справа рымскіх папаў, якія няраз пралівалі нявінную хрысьціянскую кроў дзеля пашырэньня свае каталіцкай экспансіі.

Як гаворыцца ў дакладзе спэцыяльнага дакладчыка камісіі па справах чалавека Тадэвуша Мазавецкага, апублікаваным у штаб-кватэры ААН, харваты праводзяць у Босьніі й Герцагавіне сыстэматычную палітыку „этнічных чыстак". Ратуючыся ад беспадстаўнай сьмерці, людзі сотнямі й тысячамі пакідаюць родныя мясьціны й уцякаюць. Ёсьць гэта вельмі небясьпечны час. Чытаючы зацемку ў газэце „Ніва" (№ 45, 7 лістапада 1993 г.), аб чым згадвала й ангельская тэлевізія, даведаемся, што „харвацкія жаўнеры прымацоўвалі да сэрба-басьнійскіх палонных выбуховыя зарады й высылалі іх у напрамку праціўніка, а наступна, пры пэўнай адлегласьці, дэтанавалі пры дапамозе электроннай прылады. Заметка аб харвацкіх „жывых тарпэдах" пацьвярджае нашая пранікальнасьць да загранічнай палітыкі, якая, як памятаем, была ў югаслаўскай праблеме ад пачатку рашуча антысэрбская й прахарвацкая. Сэрбы былі заўсёды вандаламі ў той час, калі харваты рэпрэзэнтавалі справядлівыя незалежніцкія імкненьні й былі падтрымоўваны Апастольскай Сталіцай" (пераклад з польскай мовы).

Рэлігійныя войны ніколі й нідзе не былі справядлівымі. Яны правакавалі, правакуюць й прапагандуюць ілжывую,

ненавісную ідэю з боку тых „сьвятых" айцоў, якія любяць глядзець на людзкую бяду, кроў, дзеля свае нажывы й выгады. Усе гэтыя тры рэлігійныя групы не жадаюць сапраўднага міру, а думаюць, што толькі дарогай зьнішчэньня працiўніка змогуць асягнуць сваю мэту й спакой.

Аб аднабаковым станаўленьні польскай прэсы да падзей у Югаславіі пісаў журналіст Ілья Марынковіч — сэрба-харват, які пражывае ў Варшаве. Марынковіч крытыкуе польскую прэсу за недахоп аб'ектыўнасьці ў югаслаўскім канфлікце. Шматразова зьвяртаў ён увагу на патрэбу пазнаньня гістарычнай праўды аб Югаславіі, прычын і вынікаў бязьлітаснай разьні. І, як відаць, аўтар не дачакаўся сумленнай ацэнкі польскай прэсы ў краі й напісаў кніжку на польскай мовае па загалоўкам „Война в Югославіі — Длячэго?", у якой прадставіў гістарычныя факты.

Таксама й мусульмане маюць рукі ў крыві нявінных харватаў і сэрбаў. Сярод гэтых трох этнічных гупаў паўстала такая ўзаемная варожасьць, што адзін аднаго мардуе й усе яны, у большай ці меншай меры, нясуць віну й кару. Ды нават сярод сэрбаў, харватаў і мусульманаў вядзецца часам унутраная барацьба. Але трэба памятаць, хто першы пачаў разьню, калі, і хто быў яе ініцыятарам, хто да гэтага часу не прызнаецца да віны й ня хоча пакаяцца за свае страшныя грахі?

У грамадзянскай вайне няма невінаватых, а ўсе больш ці менш вінаватыя й пацярпеўшыя. Тут трэба шукаць мірнай разьвязкі сярод людзей гэтых канфэсіяў, узяць пад увагу іхняе гістарычнае супольнае мінулае, а не вырашаць справу дарогай бамбёжкі. Усякі мір, які творыцца на сіле, прымусе, пад дыктатам, ніколі ня будзе трывалы.

У гэтай далікатнай справе сваю аблудную палітыку праяўляе Каталіцкі касьцёл, які абапёрся на свой шавінізм і застрашвае харватаў сэрбскім нацыяналізмам і вялікай Сэрбіяй. Каталіцкі часопіс „Глас Конціла" (26 жніўня 1990 г.) так тлумачыць разьбіцьцё Югаславіі: „Сёньня ёсьць зусім ясна, што Бог мог дапусьціць да існаваньня Югаславіі, каб мы зразумелі балючыя дасьледаваньні, што экумэнізму ня можа быць. (...) Няма экумэнізму й раўнапраўя народаў, калі мацнейшы хапае ў абняцьці слабейшага й у гэтых абняцьцях душыць яго так, што слабейшы

Жыве Беларусь!

БЕЛАРУС

РУНЬ

ГАЗЭТА БЕЛАРУСАЎ ЛІТВЫ

ISNN 1392-7671 WWW.RUNBEL.LT

Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, кай не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

наша СЛОВА

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

ў штучнай дзяржаўнасьці здаецца на ласку й няласку мацнейшага, больш бязьлітаснага" („Война в Югославіі — Длячэго?", стар. 16). Ці-ж гэтыя словы каталіцкага аўтара з „Глас Конціла" не адносяцца да каталікоў Харватыі, якія ў сваёй Незалежнай Дзяржаве Харватыі замардавалі больш за 600 тысяч праваслаўных сэрбаў, ня лічачы жыдоў і цыганоў.

Далей аўтар гэтай кніжкі падае, што „Глас Конціла" піша аб былых камуністах злосныя фармулёўкі, што „быў гэта яшчэ адзін знак, што камунізм і атэізм ніколі не вынікалі зь ідэйных перакананьняў, толькі былі выгаднай маскай дзеля ўвядзеньня ў жыцьцё гэтай самай вялікасэрбскай праграмы сьвятога Савы". Ці сапраўды мелі такія амбіцыі — пытае І. Марынковіч — будаўнікі югаслаўскага сацыялізму, харваты Ціта й Бакерыч, а так-жа славенец Кардэлій?!"

Хто, як не харваты Павэліча й Ціта рабілі вялікую Харватыю коштам зямель сваіх суседзяў. Мы ўжо гаварылі, што сэрбы, харваты й другія народы Балканаў маюць у сваіх жылах славянскую кроў, паходзяць з аднаго кораня. Таксама ў праваслаўнай і каталіцкай Цэрквах, як чытаем у „Глас Конціла", „экумэнізму ня можа быць". Значыць, вайна будзе далей, да пераможнага канца, бо так хочацца Ватыкану. „Бі, а Бог душы выбярэ", — так казаў аднойчы рымскі папа, калі каталікі атакавалі непаслушных ім хрысьціян. Такая гэта была й ёсьць навука „праўдзівай веры", каб пасеяць толькі нязгоду між народамі, замест знайсьці дарогу пагадненьня, зразуменьня й хрысьціянскай міласэрнасьці.

Ці дачакаецца калі сьвет таго дня, калі ня будзе ніякіх войнаў? Гэта пытаньне. Больш за 2 000 гадоў таму Плятон сказаў, што „небясьпечна даць у рукі меч звар'яцеламу, а ўладу несумленнаму".

Варта напомніць, што камуністычная фэдэрацыя Ціта складалася з шасьці рэспублік: Сэрбіі, Чарнагорыі, Славэніі, Босьніі-Герцагавіны й Македоніі. Кожная зь іх мела свой уласны ўрад, які прымаў удзел у фэдэральным уладзе. І хоць людзі гэтых этнічных групаў жылі разам, аднак гэта не наблізіла іх, адчувалася паміж імі адрозьненасьць і старая варожасьць. Але таму, што Ціта трымаў дысцыпліну, яны жылі ціха і мірна. Аднак пасьля ягонай сьмерці ў 1980 годзе ка-

муністычная ўлада ў Югаславіі амаль зусім растварылася, што не магло адбіцца на еднасьці югаслаўскай фэдэрацыі.

Калі прыціх харвацка-сэрбскі канфлікт, паўстала пытаньне незалежнай Босьніі й Герцагавіны. Ёсьць гэта нешта штучнае, дзе дзяржава творыцца не па нацыянальнай прыналежнасьці, а па рэлігійнай. Ды тыя этнаканфэсійныя абшчыны ня маюць кампактнага разьмяшчэньня й гэта будзе адчувацца адмоўна сярод насельнікаў такой дзяржавы, якой прыкладам зьяўляецца Босьнія й Герцагавіна. І калі паўстане гэтая дзяржава, то яна будзе мусульманскай па рэлігіі. Але тут можа паўстаць пытаньне: хто гэтыя мусульмане — сэрбы ці харваты? І калі пачаць тут разьбірацца, то не абысьціся без канфліктаў. Аднак усім канфліктам і бойкам ня быць вечна. З часам людзі апамятаюцца й прыйдуць да паразуменьня, бо-ж гэта такая вайна, у якой усе вінаватыя.

Вайна працягваецца, балканскі кацёл, або вулкан, як некаторыя гісторыкі называлі гэты паўвостраў, усьцяж бурліць. І ці патухне ён сам па сабе, ці выбухне новай і большай лавай вайны, пакажа недалёкая будучыня. Тут ня толькі непаразуменьні між сэрбамі, харватамі й мусульманамі, але паўстала пытаньне Македоніі, якое можа выклікаць канфлікт паміж Грэцыяй і іншымі былымі акупантамі.

Будзем, аднак, верыць і спадзявацца, што збройны канфлікт паміж братнімі народамі былой Югаславіі будзе залагоджаны палюбоўна пры ўдзеле Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў, гэта-ж яе заданьне.

Падобная зьява як сярод народаў Югаславіі наглядаецца сёньня ў некаторых рэспубліках былога СССР. Гэта сьведчыць аб тым, што нацыяналізм зьяўляецца моцнай зброяй і каб захаваць мір у дзяржавах, якія атрымалі сваю дзяржаўную незалежнасьць, былы начальнік не павінен накідаць свае гегемоніі. Ён павінен шанаваць і паважаць звычаі аўтахтонаў, гаспадароў гэтай зямлі, а сваіх людзей у гэтых краінах лічыць гасьцямі, а не гаспадарамі. Вельмі дрэнна паступіў прэзыдэнт Б. Ельцын, калі пачаў дамагацца для рускіх і іхняй культуры ўпрывілеяваных правоў, лепшай пашаны, а ў Чачні пачаў праліцьцё крыві. Якой-жа гэта пашанай карысталіся розныя народы пад уладай рускіх цароў і камуністаў? Які ня быў-бы ў Расеі кіраўнік, ён павi-

нен забыцца, што рускі, гэта „старэйшы брат" і яго трэба слухаць. Яшчэ ня так даўно Ельцын паказаў сябе вялікім дэмакратам, а ў сапраўднасьці аказаўся расейскім шавіністам мала лепшым ад Жырыноўскага.

(„Голас Часу" № 30 (3), 31 (4), 32 (5), 33 (6), 1994 г. і № 34 (1), 35 (2) і 36 (3), Лёндан, 1995 г.)

Правы чалавека

Наш чытач, сп. Валеры Ядранцаў з Чэрыкава, папрасіў нас у лісьце расказаць, што такое правы чалавека, пра якія гэтак шмат пішацца сёньня ў апазыцыйнай беларускай прэсе. Што-ж, сапраўды, гэтая тэма для Беларусі цяпер надзвычай актуальная. На запытаньне сп. В. Ядранцава адказвае вядомы беларускі публіцыст з Англіі Юры Весялкоўскі:

Чалавек змагаецца за свае правы, свабоду так доўга, як гэта памятала й запісала гісторыя. Свабода для людзей заўсёды была й застаецца найбольшым іхным шчасьцем. Таму кіраўнікі некаторых дзяржаваў стараліся ўлажыць правы для сваіх грамадзянаў, каб захаваць стабільнасьць. Адзін з такіх раньніх зборaў правоў — збор вавілонскага караля Гамурабі (1750 г. да н.э.) — захаваўся да нашага часу.

Даволі вядомае й папулярнае зьяўляецца рымскае права, якое паслужыла за аснову для ўкладаньня пісаных правоў шмат якім краінам Заходняй Эўропы. Рымскае права бярэ свой пачатак з паловы V ст. да н.э., але яго ўпарадкаваў і пашырыў імпэратар Юстыніян I у 528-533 гг. Рымскае права прыняло назоў „Корпус Юрыс Цывіліс" і яно заслугоўвае на сваю асаблівую ўвагу тым, што ў ім перш за ўсё націск клаўся на прынцып справядлівасьці й талеранцыі.

Чулі мы й пра гэтак званую „Магна Карта", у якой ангельскія духаўнікі й мяшчане дамагаліся ад караля Яна ў 1215 г. свабоды для царквы й справядлівасьці суда. З часам „Магна Карта" дапаўнялася кляўзулямі й сталася Вялікай Хартыяй Свабодаў —яна пераўтварылася ў канстытуцыю, якая абмяжоўвала ўладу манарха.

У пару Вялікага Княства Літоўскага на ўвагу заслугоўвае „Судзебнік" вялікага князя Казімера 1468 г. Гэта быў першы крымінальны кодэкс напісаны на беларускай мове.

Працягам ягоным сталіся тры „Статуты Вялікага Княства Літоўскага", выдадзеныя ў 1529, 1566 і 1588 гг. Гэта быў збор законаў, якога ня мелі нашы суседзі, палякі й расейцы, і праз даўжэйшы час ім карысталіся літоўцы, украінцы й расейцы. З нагоды выданьня Статуту 1588 г. ягоны аўтар, канцлер Леў Сапега, пісаў: „Прашу зрабіць ласку ўдзячна прыняць ад мяне гэтую працу, а, маючы свае вольнасьці добра захаванымі, сачыць, каб у суды й трыбуналы выбіраліся людзі ня толькі дасьведчаныя й добрыя, але набожныя й дабрадзейныя, якія-б не для ўласнай выгады й на шкоду чалавеку праз сваю хцівасьць і за хабар законы парушалі, — а выключна прадугледжаным парадкам дзейнічалі, зьберагаючы сьвятую праўду й справядлівасьць, а свабоду, якой карыстаемся, у непарушнасьці захавалі".

Прайшлі гады й стагодзьдзі, але, на вялікі жаль, усімі гэтымі правамі на свабоду, на чалавечую годнасьць мала калі хто карыстаўся й да іх прыслухоўваўся. Быў час, калі людзьмі гандлявалі, як быдлам, і трымалі нявольнікамі-рабамі. У Дэклярацыі Незалежнасьці Амэрыкі, выдадзенай 4 ліпеня 1776 г., чытаем: „Усе людзі створаныя роўнымі; (...) надзеленыя Тварцом натуральнымі непазьбежнымі правамі, сярод каторых ёсьць права на жыцьцё, права на свабоду й права на імкненьне да шчасьця". Але гэтае „права на свабоду й шчасьце" з утварэньнем ЗША ня зьдзейсьнілася для нэграў. Свабоду яны атрымалі значна пазьней.

Як даўно існуе сьвет, так даўно назіраецца прыгнёт слабейшага мацнейшым у нацыянальным, рэлігійным, эканамічным пляне. Каб пазьбегчы такой несправядлівасьці на сьвеце, у часе апошняй вайны прэзыдэнт ЗША Рузвэльт і прэм'ер Вялікабрытаніі Чэрчыль 12 жніўня 1941 г. падпісалі гэтак званую Атлянтычную Карту Будучай Палітыкі. Яе падпісаў і савецкі амбасадар у Лёндане Іван Майскі, каторы ў сваёй прамове ад 27 верасьня 1941 г. зазначыў, што „Савецкі Саюз абараняе права ўсталяваць такі агульны лад і выбраць такую форму ўраду, якая спрыяла-б разьвіцьцю і ўзбагачэньню эканомікі й культуры". Якія былі „лад", „форма ўраду" й „культура" ў СССР мы добра знаем і бачылі ўсё гэта перад вайной, падчас вайны й пасьля яе. Савецкі Саюз быў у ладзе-згодзе з аліянтамі датуль, пакуль

ішла вайна й аліянты дапамагалі яму мілітарна й гаспадарча. А як скончылася вайна, дык скончылася й сяброўства, распачалася „халодная вайна".

Усё-ж, дзеля каардынацыі міжнародных дачыненьняў па вайне ўдалося стварыць важны міжнародны інстытут — Арганізацыю Аб'яднаных Нацыяў. Адной з заснавальніц ААН была й Беларусь. Калі раней у міжнародных дачыненьнях закраналіся выключна справы, што тычыліся палітыкі, дзяржаўных межаў, войнаў і падобнае, дык захадамі ААН было ўзьнятае пытаньне правоў чалавека, якія ў шматлікіх краінах сьвету, а асабліва ў камуністычных, былі моцна абмежаваныя й адкрыта парушаліся. 10 сьнежня1948 г. на Генэральнай Асамблеі ААН у Парыжы спадарыня Элеанора Рузвэльт, што была тады старшынёй камісіі ААН па правох чалавека, сказала: „Сёньня мы стаім на парозе вялікіх падзеяў як у жыцьці ААН, гэтак і ў жыцьці чалавека, на парозе ўстанаўленьня Генэральнай Асамблеяй «Унівэрсальнай Дэкларацыі Правоў Чалавека»". Тады-ж Дэкларацыя была прынятая і ААН зьвярнулася да ўрадаў усіх краінаў, каб яны апублікавалі ейны тэкст і як мага шырэй распаўсюдзілі сярод сваіх грамадзянаў.

Аднак было зразумела, што пытаньне правоў чалавека ня пойдзе так лёгка ў камуністычных краінах. Камуністы прапаноўвалі ўвесьці ў Дэкларацыю марксісцкія ідэі, заходнія дэмакраты — хрысьціянскія. На працягу двух гадоў работы камісіі было ўнесена сотні й тысячы розных папраўвак, фармулёвак, над якімі было больш за тысячу галасаваньняў. Пасьля гэтай карпатлівай працы быў прыняты першы артыкул Дэкларацыі, у якім гаворыцца: „Усе людзі родзяцца свабоднымі й роўнымі ў сваёй годнасьці й сваіх правох. Яны надзелены розумам і сумленьнем і павінны ў адносінах адно да аднога паводзіць сябе дружалюбна і ў духу братэрства". На падставе першага артыкулу былі ўкладзеныя й наступныя трыццаць. У 19-м артыкуле сказана; „Кожны чалавек мае права на свабоду меркаваньня й яго выказваньня; права гэтае заключаецца на свабодзе мець незалежную думку, пошук, на свабодзе атрыманьня й распаўсюджаньня інфармацыі й поглядаў шляхам кожных СМІ без увагі на дзяржаўныя межы".

„Універсальная Дэкларацыя Правоў Чалавека" павінна была-б захоўвацца й выконвацца ўсімі краінамі, якія яе падпісвалі. Аднак ейныя артыкулы й дагэтуль парушаюцца ў некаторых, асабліва посткамуністычных краінах. Яшчэ й цяпер чуюцца патрабаваньні перагледзецьДэкларацыю, унесьці ў яе папраўкі, на што генэральны сакратар ААН Кофі Анан сказаў: „Як ня трэба перапісваць Біблію ці Каран, так ня трэба выпраўляць і Дэкларацыю". ААН абвесьціла 1995-2005 гг. „Дзесяцігодзьдзем асьветы ў галіне правоў чалавека". Ды ўсё адно ў шмат якіх краінах пастановы Дэкларацыі не выконваюцца і ў ейныя міжнародныя прадстаўніцтвы сьцякаюцца нараканьні з усяго сьвету з просьбай аказаць дапамогу ў абароне правоў чалавека й вязьняў сумленьня.

Сёньня на сьвеце налічваецца 13 краінаў, дзе перасьледуюцца правы чалавека, і да іх прымаюцца адпаведныя санкцыі. З сумам хачу адзначыць, што сярод гэтых дыктатарскіх краінаў фігуруе й Беларусь, дзе грамадзяне пазбаўленыя элемэнтарных свабодаў. У Беларусі прасьледуецца незалежная прэса, лідары апазыцыйных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў, ачольнікі свабодных прафсаюзаў. Робяцца ператрусы ў офісах праваабарончых арганізацыяў. Апазыцыю не дапушчаюць да электронных СМІ. Ідзе наступ на беларускую культуру, якую мае заступіць расейская, а Беларусь мае стацца расейскай правінцыяй. І што жахліва, у Беларусі зьнікаюць бязь весьці або гінуць пры загадкавых абставінах здольныя й актыўныя апазыцыянэры, якія адкрыта выступаюць супраць дыктатуры. У такім сёньня становішчы знаходзіцца Беларусь, дзе нялюдзкая ўлада робіць чалавека нявольнікам.

Дзьве тысячы гадоў таму вядомы рымскі заканадаўца й аратар Цыцэрон сказаў: „Мір прыгожы ў кожнай форме, але паміж мірам і нявольніцтвам вялікая розьніца. Мір — гэта свабода, нічым неабмежаваная, а нявольніцтва — гэта найвялікшая згуба, супраць якой трэба змагацца ўсімі сіламі й да самай сьмерці".

(„Рунь" № 33, Вільня, 2000 г.)

Прысвоілі патэнт на сьвяткаваньне

Штогод 3 ліпеня адзначаюцца ўгодкі вызваленьня Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў. А ў гэтым, 1994 годзе, супалі 50-я ўгодкі. Знакамітая дата й яе, зразумела, трэба было ўшанаваць урачыста. Але, як і мінулыя гады, так і ў гэтым годзе, камуністы вялі рэй. Амаль уся беларуская прэса трымалася старой бальшавіцкай традыцыі й у гэтым духу пісала. Напраклад, часопіс „Беларусь" (№ 6, 1994 г.) так адзначыў гадавіну:

„Трэцяга ліпеня 1944 года зямля Беларусі, беларускі народ са сьлязьмі на вачох віталі сваіх вызваліцеляў — вядомых і невядомых салдат Савецкай Арміі й народных мсьціўцаў — партызан".

Асабліва вэтэраны вайны выступаюць героямі й прыпісваюць сабе заслугі ў вызваленьні Беларусі. Гэтага ім ніхто не адмаўляе, але не адны яны спрычыніліся да перамогі. Тут варта прывесьці пару радкоў з газэты, у якой піша Мікалай Крукоўскі, доктар філязафічных навук, прафэсар, былы начальнік штаба 2-ой Заслонаўскай брыгады:

„Але да радасьці перамогі й чыстага, сьветлага смутку па загінуўшых пачынае прымешвацца прыкрае адчуваньне таго, што на гэтай вялікай даце нехта спрабуе зьдзейсьніць нячыстыя, цёмныя палітычныя сьпекуляцыі. Можна было тое выразна бачыць ужо на нядаўнім сьвяткаваньні Дня Перамогі ў нас, у Мінску, калі на плошчы ля Вечнага агню не відно было амаль што аніводнага беларускага сьцяга за мноствам зялёна-чырвоных сьцягоў камуністычнай БССР, і калі перад калёнай Беларускага народнага фронту, упрыгожанай менавіта нашымі бел-чырвона-белымі штандарамі, быццам з-пад зямлі, зусім як у мінулыя часы, вырас ланцуг амонаўцаў з гумовымі палкамі па-за сьпіной" („Літаратура і мастацтва" № 25, 24 чэрвеня 1994 г.).

Таксама ў рэдакцыю „Голасу Часу" піша наш супрацоўнік з Беларусі:

„Сёння па радыё (Радыёфакт) пачуў, што калёну БНФ не пусьцілі на плошчу Перамогі, нягледзячы на тое, што Менскі Гарвыканкам дазволіў БНФ правесьці ў гэты дзень, 3 лі-

пеня 1994 г., сваю дэманстрацыю. У калёне БНФ былі ня толькі маладыя, але й вэтэраны вайны, у тым ліку й Васіль Быкаў, які прайшоў вайну ад першага да апошняга дня; архітэктар, аўтар абэліска перамогі на плошчы Перамогі, ды іншыя вэтэраны. Таксама не прапусьцілі да манумэнта Перамогі яго аўтара, Юрыя Заборскага, які ішоў у першым шэрагу з В. Быкавым. Камуністы вырашылі прысвоіць гэтае сьвята толькі сабе. Нездарма Вячаслаў Кебіч у сваёй прамове падкрэсьліў вялікую арганізуючую ролю камуністаў у арганізацыі партызанскага руху й дасягненьні перамогі".

Быў і такі выпадак, калі пад бел-чырвона-белым сьцягам ішлі вэтэраны вайны, дык іх сьцяг сарвалі й патапталі, а гэта-ж ёсьць дзяржаўны сьцяг. Ці былі гэтыя змагары „адзінай і недзялімай" прыцягнены да адказнасьці за зьнявагу дзяржаўнага сьцягу?

Тут варта прыгадаць, што сказаў яшчэ прафэсар Мікалай Крукоўскі аб вайне на Беларусі: „Прыходзілася й нам, на жаль, удзельнічаць у баях са „сваімі", г.зн. паліцаямі, уласаўцамі й інш. Успрымалі мы іх тады, аднак, толькі як здраднікаў у чыста ваенным сэнсе слова, хоць і ўзьнікала часам недаўменнае пытаньне: чаму ж іх так многа, гэтых „здраднікаў". Не ўсьведамлялася яшчэ цалкам уся трагічнасьць такога ненармальнага стану рэчаў. Толькі намнога пазьней, пасьля публікацыі твораў Алеся Адамовіча і асабліва Васіля Быкава, стала ясна, што гэта сапраўды была й грамадзянская вайна, дзе адзін бок сьвядома нацкоўваўся на другі. Разыгрывалася выпрабаваная ленінска-сталінская карта клясавай барацьбы, абы толькі ня ўзьнікла ідэя нацыянальна-вызваленчай барацьбы, не выкрашталізавалася беларуская ідэя як асноўны прынцып гэтай вайны, хоць у Расіі напоўніцу ўжо выкарыстоўвалася ідэя, няхай яна так тады яшчэ й не называлася. Баяліся, каб не паўтарылася тое, што разгортвалася на Украіне й у прыбалтыйскіх рэспубліках" („Літаратура і мастацтва" № 25, 24 чэрвеня 1994 г., стар. 5).

На тэму апошняй вайны многа было сказана, і ёй прысьвечана розная літаратура. Многа згадваецца пра ахвяры прычыненыя фашыстамі, якія далёка адстаюць за тыя, што былі зроблены камуністамі перад вайной, у вайну й пасьля вайны. А камуністычная прапаганда трубіла аб вернасьці

грамадзян СССР роднай партыі й яе лідарам. Але апошнім часам некаторыя з гэтых аўтараў пачалі сумнявацца ў сваіх камуністычных лідарах, а сваю барацьбу прыпісваюць радзіме. Аднак, яшчэ ня так даўно, можна было бачыць маніфэстантаў з партрэтамі Леніна й Сталіна.

Я добра памятаю пачатак вайны. Захаваўся ў маёй памяці такі выпадак. Быў гэта аўторак, першы тыдзень вайны, я ляжаў у ложку, калі пачуў трэск кулямёта, а была тады 11-я гадзіна вечара. Я выйшаў на вуліцу, на якой былі ўжо людзі, а сярод іх зьняволеныя з клункамі й куфэрчыкамі, якія вярталіся дамоў. Нехта пусьціў пагалоску, што нямецкі бранявік падышоў й застрачыў з кулямёта. Людзі паверылі, што ўжо недалёка немцы й у іх разьвязаўся язык. Усе яны разам зь вязьнямі кляймілі савецкія парадкі.

Назаўтра рана, як я ўстаў, немцаў не было відаць, толькі час ад часу адступалі невялікія калёны чырвонаармейцаў. А тыя, што так бойка асуджалі савецкія парадкі апошняй ночы, недзе схаваліся. Нямецкія танкі паказаліся ў нас у пятніцу раніцай, а пасьля поўдня прыйшоў невялікі аддзел немцаў. Адзін селянін прынёс ім дзялянку сала. Яны ўзялі з удзячнасьцю.

Нават замежныя аўтары пішуць, што сьпярша беларусы віталі немцаў, але неўзабаве расчараваліся. Немцы зрабілі вялікую памылку ў ходзе вайны з камунізмам. Яны адразу не дазволілі народам акупаванае імі краіны на самакіраваньне ў дзяржаўным сэнсе. Па-другое, ня трэба было сьведама нішчыць палонных, а даць ім нармальныя харчы й замест зоркі зь сярпом і молатам начапіць на пілотку нацыянальны значок і яны пайшлі-б ваяваць за дэмакратыю й свабоду, супраць дыктатуры Сталіна й ягоных апрычнікаў. Вядома, што здаваліся ў палон да немцаў не паасобныя байцы, але групы, роты, батальёны й нават дывізіі. Да канца 1941 году ўзята было ў палон больш за тры мільёны байцоў і афіцэраў Чырвонай Арміі. Баявы дух арміі ўпаў і каб немцы павялі больш гуманную палітыку над захопленымі імі народамі, ход вайны прыняў-бы зусім другі абарот.

Вялікай дапамогай для Сталіна аказалася падтрымка Амэрыкі, Вялікабрытаніі й Канады. Гэта падняло дух Чырвонай Арміі, даказала, што яна мае надзейных саюзьнікаў.

Дзякуючы іхняй дапамозе немец быў адкінуты ад Масквы зімой 1941 году. Аб гэтым павароце Чырвонай Арміі, або вызваленьні, згадвае яе ўдзельнік Віктар Карамазаў:

„Как русские люди, крестьяне, своих же сынков-освободителей проклинали, что к ним явились, в лес лошадей угоняли, воды не давали. А всё потому, что немец недолго у них побывал, дал землю и машины, по дворам не грабили, лодырей да пьяниц работать заставили...

Или еще рассказал старик, как освобождали Калугу, а русские бабы немцев по избам да городским квартирам прятали. На штыки бросались, защищая чужих от своих, будто своих — от чужих...

Проехать Польщу оказалось нелегко. Огнем встречала и проводила Армия Краёва" („Неман" № 7, 1993 г.).

Вось як „приветствовали" паварот савецкай арміі свае й чужыя.

На працягу ўсяе вайны была аказана вялікая дапамога Савецкаму Саюзу з боку заходніх дзяржаў. Пачынаючы ад 1 кастрычніка 1941 году ЗША заслалі ў Савецкі Саюз масу рознага ваеннага ўзбраеньня, сыравіны, прадуктаў харчаваньня й т.п. Былі тут самалёты, танкі, рознага тыпу ваенныя караблі, самаходы, матацыклі, артылерыя, тэлефоны, радыёпрыёмнікі, адзеньне ды іншыя неабходныя рэчы. Падобныя рэчы слала ў Савецкі Саюз і Вялікабрытанія, а Канада засылала пераважна прадукты харчаваньня, самаходы, снарады, выбуховыя матэрыялы, цынк, нікель, тоны мукі й пшаніцы. Усё гэта ёсьць запісана й падаецца мільёнамі тонаў і мільярдамі даляраў. Больш дакладныя даныя наконт замежнай дапамогі Савецкаму Саюзу ў час вайны можна знайсьці ў матэрыялах Народнага камісарыяту замежнага гандлю ў Маскве ад 11 чэрвеня 1944 году. Але аб гэтым сёньня ніхто ня піша, не ўспамінае, быццам нічога падобнага не было, а ўся перамога была дасягнута выключна собскімі сіламі й рэзэрвамі ды дзякуючы мудрай палітыцы таварыша Сталіна й ягонай партыі.

Шмат захавалася бальшавіцкай прапаганды аб гэтай „Вялікай Айчыннай вайне", аднак адзываюцца здаровыя галасы людзей навукі, якія бачаць шмат фальшу, шкоднага ў разьвіцьці незалежнай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь.

Таму на заканчэньне гэтай кароткай зацемкі аб вызваленьні Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў, паслухаем, што піша Леанід Трацэўскі ў сваім невялікім артыкуле „Абавязак вучоных — расказаць праўду аб вайне":

„У вялікай канфэрэнц-зале Прэзыдыюма Акадэміі Навук Беларусі 21 чэрвеня адбылася навуковая сесія, прысьвечаная 50-годзьдзю вызваленьня Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

— Падзеі Вялікай Айчыннай вайны, — сказаў, адкрываючы сесію, прэзыдэнт АН акадэмік Леанід Сушчэня, — не могуць трактавацца адназначна, таму што наша рэспубліка аказалася ў ліку самых пацярпеўшых ад варожага нашэсьця. Абавязак вучоных — усебакова й аб'ектыўна разабрацца ў асьпэктах трагічнага часу. Многае імі зроблена, але, на жаль, у гісторыі беларускага народу той пары застаюцца яшчэ белыя плямы невядомасьці. Гісторыя — гэта палітыка, зьвернутая ў мінулае, і яна здольная рабіць істотны ўплыў на сьвядомасьць людзей і сёньня, — падкрэсьліў акадэмік Леанід Сушчэня. Ён заклікаў вучоных аб'ектыўна разабрацца ў праўдзе вайны, данесьці яе да сьвядомасьці цяперашняга й будучага пакаленьняў, каб пазьбегнуць фальсіфікацыі гісторыі на шкоду разьвіцьцю сувэрэннай, незалежнай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь" („Звязда" № 128-129, 22 чэрвеня 1994 г.).

На працягу папярэдніх дзесяцігодзьдзяў старонкі савецкай гісторыі апошняй вайны замалёўваліся ідэалягічнай афарбоўкай. Цяпер прыйшоў час, калі ёсьць магчымасьць глянуць шчыра ў твар гісторыі й змыць тую фарбу, якой партыя замалёўвала сапраўднае аблічча вайны на Беларусі.

(„Голас Часу" № 32 (5), Лёндан, 1994 г.)

Годалічэньні й розьніца паміж новым і старым стылямі

Які год адзначаюць людзі на нашай плянэце Зямлі залежыць ад сыстэмы, якой яны карыстаюцца, або ў якую рэлігію вераць.

Аднак прынята лічыць за аснаўную адзінку год. Год — гэта час, на працягу якога Зямля выконвае свой поўны абарот ва-

кол Сонца. Час гэты раўняецца 365 суткам, 5 гадзінам, 48 мінутам і 46 сэкундам. Гэта ёсьць поўны сонечны год. Але каляндарны год налічвае толькі суткі й таму ён недакладны.

Каляндарную сыстэму, паводле якой большасьць краін карыстаецца сёньня, увялі рымляне. Яны ўзялі за пачатак 753 год да нашай эры (да нараджэньня Хрыста), які лічыўся пачаткам заснаваньня Рыму. Але тагачасная сыстэма месяцаў, высакосных гадоў была недакладная й выклікала засьцярогі.

За часоў рымскага імпэратара Юлія Цэзара ў 46 годзе да н.э., г.зн. да нараджэньня Хрыста, праведзена паправу календара. Для зручнасьці было прынята, што кожны год будзе мець 365 дзён і 6 гадзін і што тры гады будуць налічваць па 365 дзён, а кожны чацьвёрты год — 366 дзён. Адзін дадатковы дзень устанавілі ў канцы месяца лютага, а менавіта 29 лютага, і гэты год назвалі высакосным. Каб быць пэўным, які год ёсьць высакосны, павінен ён дзяліцца бяз рэшты на 4. Напрыклад 1968, 1972, 1976 і г.д. Паправу календара рымляне правялі паводле прынцыпаў старажытных егіпцянаў.

З часам аказалася, што каляндарны час адстае ад сапраўднага й розьніца ў год складае 11 мінут і 14 сэкундаў. За 128 гадоў гэтая розьніца састаўляе адзін дзень, а ў XVI стагодзьдзі сабралася ўжо 10 дзён.

У 1582 годзе за часоў папы Грыгорыя XIII вырашана было скасаваць гэтае адступленьне, ліквідаваць адсталасьць. Такім чынам дзень 5 кастрычніка 1582 году быў прыняты за 15 кастрычніка. Новы каляндар назвалі новым стылем, або грыгарыянскім у адрозьненьні ад юліянскага.

Каб пазбегчы памылкі ў будучыні, улічвалі дзень, які накапляўся за 128 гадоў у старым календары; таму прынята было тры высакосныя гады — 1700, 1800 і 1900 не лічыць высакоснымі. Але ў старым стылі яны засталіся высакоснымі й на сёньня розьніца паміж абодвума стылямі складае 14 дзён. У 2100 годзе гэтая розьніца павялічыцца на адзін дзень.

Новы стыль таксама не зусім дакладны, але такая памылка практычнага значэньня ня мае й гэтым няма чаго пераймацца, тым больш што пры нашым жыцьці яе ня будзе.

Розныя народы й рэлігіі маюць свае годалічэньні. І так хрысьціяне лічаць свае гады ад нараджэньня Хрыста. Аднак у годалічэньнях паслугоўваюцца рознымі календарамі: праваслаўныя (у царкоўным жыцьці) — юліянскім, а каталікі й пратэстанты — грыгарыянскім.

Жыды лічаць гады паводле жыдоўскай эры — ад стварэньня сьвету, якое па вылічэньні рабіна Гільлера было ў 3761 годзе да нашай эры ў панядзелак 7 кастрычніка. У гэтым 1975 годзе пачынаецца 5735-5736 жыдоўскі год.

Магамэтане лічаць гады паводле магамэтанскай эры, гэта значыць ад часу падарожжа Магамэта з Мэккі ў Мэдыну ў 622 годзе нашай эры. Наш 1975 год будзе ў іх 1394 годам. Магамэтанскі год ёсьць карацейшы за наш на 11 дзён.

У некаторых азіяцкіх краінах ужываецца старажытная сыстэма календара, якая называе кожны год іменем нейкага зьвяра, на прыклад — год тыгра.

Была яшчэ адна спроба замены календара падчас Французскай рэвалюцыі. Рэвалюцыйны ўрад у 1793 годзе ўвёў такую змену, што кожны месяц будзе мець 30 дзён за выняткам верасьня, які налічваў 35 дзён і 36 на высакосны год. Але гэтая сыстэма календара не ўвайшла ў жыцьцё.

У Польшчы новы стыль уведзены быў у 1586 годзе, у Вялікабрытаніі — у 1752 годзе, а ў Расеі — пасьля рэвалюцыі, 14 лютага 1918 году.

Праваслаўная царква ў сваёй бальшыні не прыняла новага грыгарыянскага календара, аснаванага на навуковых вылічэньнях і захавала стары — юліянскі.

Пасьля Першай Сусьветнай вайны праваслаўныя мітраполіі ў паразуменьні з Усяленскім Канстантынопальскім патрыярхам рабілі захады перайсьці на новы стыль. У 1924 годзе Канстантынопальскі патрыярх разаслаў усім праваслаўным Цэрквам пасланьні, у якіх пастаноўлена было перайсьці на новы стыль, прапануючы месяц сакавік 1924 году.

Праваслаўныя ў Польшчы, а пераважна беларусы, востра адрэагавалі на зьмену календара, не пайшлі ў царкву на сьвяты паводле новага стылю й змушалі сьвятароў служыць паводле старога стылю. У выніку народ перамог і стары стыль захаваўся да сёньняшняга дня.

Цяпер паўстае пытаньне: чаму праваслаўныя вернікі Польшчы адкінулі новы стыль? Адказ выглядае даволі проста. Па-першае, ён быў накінуты згары, пад націскам польскай адміністрацыі й паліцыі. Па-другое, праваслаўныя вернікі не былі своечасова й належна запазнаныя з новым стылем. Яны думалі й баяліся, што новы стыль як-бы падважыць ці зьняважыць значэньне праваслаўя, або наблізіць яго да каталіцызму. Гэты яскравы факт красамоўна сьведчыць аб глыбокай рэлігійнасьці праваслаўных, аб прывязанасьці да свайго веравызнаньня. Аднак праваслаўныя ў той час не разумелі дастаткова, што зьмена календара ня мае дачыненьня да дагматычнай праблемы і ў ніякім выпадку не мяняе характару праваслаўя ў адносінах да каталіцызму.

Але, як бачым, праваслаўная сялянская маса не хацела ні ў якім выпадку збліжацца з польскім каталіцызмам, і старалася захаваць сваю адасобленасьць і абрадавую самабытнасьць, якія для яе былі значна важнейшымі й даражэйшымі чымсьці навуковыя вылічэньні новага грыгарыянскага календара.

(„Званіца" № 1 (2), Лёндан, 1975 г.)

Праблемы Чарнобыля

Ангельская нядзельная газэта „Ды Сандэй Таймс" ад 11 жніўня г.г. як перадавіцу змясьціла артыкул маскоўскага карэспадэнта гэтай газэты Джэймса Блітза пад загалоўкам „Грошы для дзяцей Чарнобыля згінулі".

Гэтае выявіў адзін з членаў палітбюро (прозьвішча не падаецца) „Независимой газете". Ён на 28-ым зьездзе КПСС сказаў, што 500 мільёнаў рублёў (па афіцыйным курсе абмену вартыя 160 тысяч фунтаў стэрлінгаў) былі перададзены на мэты „палепшаньня здароўя дзяцей, якія жывуць у забруджаных раёнах Беларусі й Украіны.

Камуністычная партыя хацела зрабіць сабе рэкляму й прапаганду добрага пачыну, але выявілася, што ані капейкі з гэтых грошай не выдадзена на ахову здароўя дзяцей, а грошы згінулі ў рахунках 12 раённых партыйных камітэтаў і іх сёньня немажліва адшукаць. У артыкуле мяркуецца, што невядома ці грошы пайшлі на прыватную

нажыву партыйных камітэтчыкаў, ці былі злоўжытыя гэтымі-ж апаратчыкамі.

Паводле аднаго паведамленьня, у Гомелі 200 000 рублёў з Чарнобыльскага фонду былі выдадзены на аўтаматычную сыстэму продажы білетаў на чыгуначнай станцыі, а паводле другога — 600 000 рублёў выдалі на пабудову 15 памешканьняў, зь якіх 13 былі выдадзены мясцовым партапаратчыкам.

Апрача таго каля аднаго більёна рублёў штодня траіцца на ценявыя расходы й фінансы адно папаўняюцца выручанымі грашыма ад міністэрстваў абароны й замежных спраў.

Усе гэтыя выяўленьні непакояць мільёны людзей, якія, праз нядбаласьць камуністычнай партыі, у руках якой трымаецца ўлада, змушаны жыць у забруджаных раёнах.

Беларускае міністэрства аховы здароўя заявіла, што колькасьць уродаў (дзяцей з ненармальнай будовай цела) ад 1986 г. павялічылася на 18%. На Ўкраіне захворваньні даходзяць да 45%, а сьмяротнасьць у апошніх двух гадах павялічылася на 25%.

Палова дзяцей і падросткаў у забруджаных раёнах мае захворваньні шчытавідных залозаў, паніжаную імунітэтную сыстэму й іншыя радыяцыйныя пашкоджаньні.

Вялікую пагрозу прадстаўляе й сам пашкоджаны рэактар Чарнобыльскай АЭС, саркафаг якога пачынае развальвацца, радыяцыя вылучаецца й 180 тонаў нуклеарнага стрыжня можа растапіцца й выцячы.

Трэба паставіць пытаньне: хто вінаваты ў такім становішчы? Адказ будзе ясны, — гэта ўлада, а ўлада была ў руках тагачаснае камуністычнае партыі й таму гэтая партыя нясе ўсю адказнасьць.

Яна ня толькі што мала рабіла, каб ратаваць усіх пацярпеўшых ад нуклернай катастрофы, а намаўляла іх на небясьпеку, быццам нічога страшнага не сталася, ды грошы, якія ішлі на дапамогу хворым, злоўжывала на свае партыйныя й прыватныя мэты.

Газэта „Ды Сандэй Таймс" адзначае, што камуністычная партыя Беларусі зьяўляецца найбольш кансэрватыўнай у Савецкім Саюзе й найбольш перашкаджае рэфарматарскім плянам перабудовы Гарбачова.

Цяпер зьмяніліся палітычныя абставіны на Беларусі й будзем спадзявацца, што адміністрацыя прыме новыя меры, каб аказаць належную дапамогу ахвярам чарнобыльскай трагедыі.

Як сказаў міністар замежных спраў Беларусі Пятро Краўчанка, „у апошні час стала відавочным, што краіна — СССР — пакінула нас сам-насам зь бядой. За пяць гадоў Беларусь атрымала з саюзнага бюджэту па лініі Міністэрства аховы здароўя прыкладна 2,6 мільёна інвалютных рублёў. Гэта менш, чым кропля ў моры: штогод для ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай трагедыі рэспублікі патрабуецца 75 мільёнаў даляраў. Штогод!...

Візыт прэзыдэнта СССР М. Гарбачова сёлета ў сакавіку на Беларусь нічога рэспублікі ня даў. Як ня меў ніякага выніку й зварот прэм'ер-міністра В. Кебіча: на яго ліст канцылярыя прэзыдэнта нават не адказала хаця-б дзеля прыстойнасьці. Наогул, стаўленьне Цэнтра да Беларусі ўсё-ж дзіўнае, калі не сказаць — брыдкае. Пры разьмеркаваньні імпартных лекаў у першым паўгодзьдзі гэтага году Расея атрымала 56 працэнтаў, Украіна — 25, Літва - 6,9, а Беларусь — толькі 5,8 працэнта лекаў.

— Ёсьць яшчэ многа дзіўных і зьдзеклівых для Беларусі момантаў, — сказаў П. Краўчанка, — якія вымушаюць нас дзейнічаць больш актыўна" („Голас Радзімы" № 37, 12 верасьня 1991 г.).

(„Голас Часу" № 15 (6), Лёндан, 1991 г.)

Зналі ці ня зналі?

У „Звароце" да суайчыньнікаў за мяжой, які быў зьмешчаны ў газэце „Голас Радзімы" (ад 3 жніўня 1989 г.) у сувязі з чарнобыльскай аварыяй, ёсьць між іншым сказана:

„Нас могуць спытаць: чаму-ж вы да гэтага часу маўчалі? Чаму не прасілі дапамогі? Адказваем: галоўным чынам таму, што ніхто, нават буйныя спэцыялісты, не змаглі адразу вызначыць ні маштабаў, ні вынікаў трагедыі. Яна аказалася намнога сур'ёзьней, чым можна было меркаваць".

Аднак дзяржаўныя органы зналі, якія рэзультаты прыносіць радыяцыя. Пасьля атамнай бомбы над Хірасімай і Нагасакі ў жніўні 1945 году, акрамя забітых былі дзесяткі

тысяч выкліканых радыяцыяй цяжкіх захворванняў, якія найчасьцей канчаліся сьмерцю. Аб іх багата пісала прэса, гаварыла й паказвала тэлевізія.

Цяпер, як падае газэта „Індэпэндэнт" (ад 16 кастрычніка 1989 г.) у Савецкім Саюзе праводзіўся досьлед радыяцыі на людзкі арганізм. Маладым, прызваным у армію жаўнерам, далі падпісаць паперку, што яны на працягу 25 гадоў ня выдадуць тайны. Гэтай тайнай было наражэньне свайго здароўя-жыцьця на радыеактыўны экспэрымэнт.

Такі экспэрымэнт адбыўся 14 кастрычніка 1954 году на паўднёвым Урале. 40 мінут пасьля таго, як эксплядавала атамная бомба, дазволена было жаўнерам пакінуць сховішчы й ісьці, а фактычна бегчы па зямлі „на якой гарэла трава й ішоў дым".

За год часу пасьля такога экспэрымэнту пачаліся паважныя захворваньні сярод жаўнераў. Былі гэта праявы моцнага болю галавы, рэўматызм сьпіны, боль касьцей, суставаў і праблема з вачыма. Такі хворы ня мог сказаць доктару прычыну, ад якой ён захварэў, бо падпісаў паперку. Колькі маладых людзей памерла ад гэтага экспэрымэнту, ніхто ня ведае, а некаторыя мучацца да гэтага часу.

Так, што ворганы ўлады зналі, што такое радыяцыя, але сьведама памінулі яе й за гэта павінны панесьці адказнасьць. Зусім слушна, што беларускія маніфэстанты ў Менску 1 кастрычніка г.г. дамагаліся прыцягнуць да судовай адказнасьці тых людзей, якія ў часе чарнобыльскай аварыі стаялі на чале беларускага ўраду й нічога не зрабілі, каб забясьпечыць здароўе насельніцтву, якое апынулася ў межах радыяцыі.

Як бачым, нуклеарная радыяцыя не была нечым зусім новым, неспадзяваным для савецкага ўраду й навукі, як гэта падаецца ў „Звароце" да суайчыньнікаў за рубяжом. А была тут бязьдзейнасьць дзяржаўных ворганаў і адміністрацыі. Некаторыя газэты пісалі, што нуклеарную хмару, якая ішла з Чарнобыля на Маскву, збамбардавалі. Гэта значыць, выклікалі штучны дождж, каб асадзіць радыектыўны попел, які знаходзіўся ў паветры. І яго асадзілі на Беларусі, якая аказалася найбольш забруджанай.

(„Голас Часу" № 3, Лёндан, лістапад — сьнежань 1989 г.)

Чалавек сам сабе шкодзіць

Ад пачатку індустрыяльнай рэвалюцыі (XVIII стагодзьдзе) дымныя коміны шматлікіх заводаў і фабрык атручвалі і атручваюць дымам ня толькі арганізм чалавека, але і ўсё навакольле. Няшчасцем для людзей зьяўляюцца вулканы, якія выкідваюць ляву, шмат газаў, дыму, таксама паліва самалётаў, ракет і самаходаў. Адна частка гэтых выкідаў з дажджом ападае як атрута й нішчыць флёру. Другая частка газаў падымаецца ўгару й нішчыць азонавы слой, які знаходзіцца на вышыні 15-50 кіляметраў над нашай галавой.

Гэтая азонавая пялёнка абсарбіруе шкодныя для жывога арганізму на нашай зямлі праменьні сонца. У 1980 годзе дасьледчыкі заўважылі, што над Антарктыдай зьнікла 40 працэнтаў азону, патанчэў яго слой, а месцамі зрабіліся дзіркі. Адна такая дзірка ў два разы большая за абшар Эўропы. І каб такую дзірку залатаць, трэба найменш 60 гадоў часу пры ачыстцы атмасфэры. Гэта вынік скапленьня вышэйзгаданых газаў, дыму...

Такія зьявішчы ў прыродзе — галоўная прычына раку скуры й хваробы вачэй. Таксама шкодныя праменьні сонца, якія праходзяць праз гэтыя азонавыя дзіркі, наносяць урон пасевам, дрэвам, жывёле на сушы й у вадзе. Так што азонавая пялёнка зьяўляецца вельмі важнай для захаваньня здароўя чалавека й прыроды на нашай плянэце, і таму яе трэба ашчаджаць.

Дваццатае стагодзьдзе можна назваць стагодзьдзем хіміі. Амаль кожная хата мае сёння ў сабе нешта, што выдзяляе шкодныя рэчывы. Гэта розныя аэразолі для асабістага хатняга ўжытку. Прадукцыя хімічных заводаў стала настолькі пашыранай, што на рынку можна знайсьці каля тысячы розных хімікатаў, і колькасьць іх узрастае. Але людзі ня ведаюць, як гэтая хімія ўздзейнічае на наша здароўе. Яны думаюць, што няма ніякай пагрозы для іхняга здароўя, акружэньня.

Трэба прызнаць, што хімічная тэхналёгія зрабіла многа чаго карыснага для чалавека, але нямала й шкоднага. Хімічная рэакцыя адбываецца вакол нас і ўнутры нас, яна ня мае сваіх граніц. Напрыклад, штучнае ўгнаеньне палёў і ніш-

чэньне насякомых распыляльнікам з самалётаў не праходзіць незаўважана. Дождж змывае гэту хімікалію й нясе яе ў рэкі, азёры й іншыя вадаёмы, забруджвае іх і выклікае гібель рыбы й іншых вадзяных стварэньняў. І гэта даволі часта здараецца ў шматлікіх краінах сьвету, калі некаторыя фабрыкі сьвядома спускаюць у рэкі й нават у акіяны свае хімічныя адходы й гэтым забруджваюць ваду.

Ня будзем гаварыць тут пра добра вядомую трагедыю з Чарнобылем, якую шкоду прынёс ён для здароўя чалавека й экалёгіі. А радыеактыўныя рэчывы з атамных электрастанцый ня могуць быць зьнішчаны. І хоць іх запакоўваюць у шчыльныя кантэйнэры й топяць у акіянах, але ў гэтым няма ніякай гарантыі бяспекі. З часам яны знойдуць магчымасць вызваліцца з кантэйнэра й дойдуць да жывога аргамізму. А робяцца яшчэ тайныя біялягічныя досьледы для сьвядомага забіцьця чалавека.

І тут у многім вінаваты сам чалавек. Таму ў верасьні 1987 году 165 краін сьвету падпісалі ў Канадзе так званы Манрэальскі пратакол, паводле якога абавязаліся скараціць выпуск непажаданых для экалёгіі рэчываў.

Нешта падобнае адбылося ў сьнежні 1997 году ў японскім горадзе Кіота. Спаткалася там 2 200 дэлегатаў са 161 краіны сьвету, каб неяк змагацца з глябальным пацяпленьнем, якое нясе людзям пагрозу. Пацяпленьне клімату пагражае ня толькі полюсам, але й горным хрыбтам Гімаляяў. Вучоны Саід Хаснэйн, які наглядае за ледавікамі, асцерагае, што калі хуткасьць іх раставаньня ня зьменшыцца, то такія рэкі, як Ганг, Інд і Брахмапутра, з часам высахнуць.

У выніку такога пацяпленьня ўзровень вады ў акіянах павялічыцца, што пагражае шматлікім малым астравам зьнікненьнем пад вадой. З павышэньнем тэмпературы пачашчаюцца паводкі, буры, а таксама хваробы, якія перадаюцца празь ежу й ваду й выклікаюць эпідэміі й сьмерць. Таму ў Кіота было прапанавана, каб да 2012 году развітыя краіны скарацілі выдзяленьне парніковых газаў ніжэй узроўню 1990 года на 5,2 працэнта. Але ня ўсе краіны на гэта пагаджаюцца, бо трэба скараціць работу прадпрыемстваў, што пагражае беспрацоўем.

У красавіку 2000 года спаткаліся ў Японіі міністры па справах экалёгіі „вялікай васьмёркі": Вялікабрытаніі, Францыі, Канады, Нямеччыны, Італіі, Японіі, Расеі й ЗША. Але й гэтым разам нічога не было зроблена. Адмоўна выказаліся ЗША й Канада. Яны сказалі, што пратакол з Кіота ад 1997 года будзе ратыфікаваны большасьцю дзяржаў у 2002 годзе.

Як падае газета „Дзі Таймс" (16 траўня 2000 года), міністар экалёгіі Вялікабрытаніі Майкл Мічэр заўважае, што краіна не ўратуе сябе ад узрастаючай тэмпературы. Спатрэбіцца найменш 1,2 більёна фунтаў на працягу наступных 50 гадоў, каб умацаваць марскія й рачныя берагі Англіі й Валіі. А некаторыя ўсходнія раёны Англіі трэба будзе пакінуць як неэканамічныя.

У сувязі са зменай клімату прадбачацца дажджы, буры, а зь імі шкодная для будынкаў вільгаць. І каб гэта ўсё давесьці да парадку, спатрэбіцца 15,5 мільёна фунтаў да 2050 году. Таксама прадбачваецца нястача пітной вады й вады для паліву агародаў, асабліва ў паўднёва-ўсходняй Англіі. Таму на пабудову новых рэзэрвуараў спатрэбіцца 900 мільёнаў фунтаў.

Многія з названых праблем не зьяўляюцца нечым новым, але апошнія паказчыкі й доследы патрабуюць станоўчых мер дзеля забесьпячэньня жыцьця будучым пакаленьням на нашай плянэце. І ў гэтай рабоце бяруць удзел навукоўцы, прамыслоўцы, урады й звычайныя грамадзяне. Ці будзе што зроблена ў гэтым напрамку, пакажа час.

(„Голас Радзімы" № 41 (2703), Менск, 11 кастрычніка 2000 г.)

Пра Алімпійскія гульні

Ніякія іншыя спартовыя гульні не выклікаюць такога зацікаўленьня ў народзе як алімпійскія. Сотні тысяч людзей едуць на Алімпіяды, каб палюбавацца спаборніцтвамі, а іншыя мільёны сядзяць за прэсаю й перад тэлевізарам.

Алімпійскія гульні зьявіліся тысячы гадоў таму ў Грэцыі. Старажытныя грэкі дапаўнялі свае рэлігійныя абрады спартыўнымі выступленьнямі — гульнямі, якія былі папулярнымі ў народзе. Былі гэта Істмінскія, Неменскія, Алімпійскія й Піфійскія. Але найбольш папулярнымі лічыліся Алімпійскія гульні. Усе яны адбываліся ў гонар бога Зеўса,

якога грэкі ўважалі за бацьку ўсіх багоў. Сьвятасьць да гэтых гульняў і пашана да іх былі такімі, што ў гэты час спыняліся войны.

Першая Алімпійская гульня запісаная пад 776 годам да нашай эры, але яны бяруць свой пачатак з XIV стагодзьдзя да н.э.

У вайне грэкаў з пэрсамі ў 490 г. да н.э. афінскі камандзір Мільтыяд паслаў ганца Філіпіда з Марафону ў Афіны па дапамогу. Адлегласьць была 42 195 мэтраў, і жаўнер Філіпід прабег гэтую дыстанцыю. У тым часе грэкі пабілі пэрсаў без дапамогі з Афінаў. Арганізатары Алімпійскіх гульняў выбралі гэты гістарычны Марафонскі шлях, каб ушанаваць подзьвіг жаўнера Філіпіда.

Калі Грэцыя апынулася пад уладаю рымлянаў, Алімпійскія гульні пачалі адыходзіць у забыцьцё. Рымляне не надавалі вялікага значэньня спроту, і Феадосій Вялікі забараніў Алімпіяду ў 393 г. н.э.

Аднак зацікаўленьне да старажытных грэцкіх Алімпійскіх гульняў жыло й французскі барон П'ер дэ Кубэртэн (1863-1937) падаў прапанову адрадзіць Алімпійскія гульні, якія праходзілі кожныя чатыры гады за рэдкімі выключэньнямі.

Барон Кубэртэн хацеў і верыў, што праз Алімпійскія гульні можна навучыць людзей розных нацыянальнасьцяў жыць у згодзе й братэрстве. Ён казаў: „Важнейшае ў Алімпійскіх гульнях — гэта ўдзел, а не перамога". Але гісторыя паказала, што алімпійскія ідэалы не спраўдзіліся. Яны засталіся сымбалічнымі, а гульні сталі арэнаю для палітыкі, нацыянальных перамогаў, што выяўляецца ў падняцьці нацыянальных сьцягоў і ігранъні дзяржаўных гімнаў.

Нельга забыцца й на той сумны факт, што ў часе Алімпіяды ў Мюнхене (Нямеччына) у 1974 годзе тэрарысты забілі жыдоўскіх спартоўцаў.

Таксама спартоўцы, каб дасягнуць добрых вынікаў, прымаюць забароненыя стэроіды, допінгі, стымулятары. Доктар Робэрт Вой, былы дырэктар допінг-кантролю Алімпійскага камітэту ЗША, спартоўцаў называе „хадзячай лябараторыяй". Робяць гэта спартоўцы, каб задаволіць алімпійскі лёзунг „Хутчэй, вышэй, мацней".

Алімпійскія гульні прыносяць радасьць пераможцам, але й ня менш засмучэньня спартоўцам з тых краінаў, якія на

Алімпіядзе пакажуць сябе бедна. Беларускія спартоўцы, у параўнаньні зь іншымі з большых і багацейшых краінаў, на папярэдніх Алімпіядах паказвалі сябе добра.

Сёньняшні беларускі кіраўнік сказаў, што беларускія спартоўцы прывязуць з Алімпіяды 25 мэдалёў. Спадзявацца на гэта можна. Усе спартоўцы, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтвах маюць надзею заваяваць мэдаль, але ня ўсім суджана. Аднак дзіўна, што ад беларускіх спартоўцаў улады дамагаюцца падпісаньня забавязаньня прывезьці мэдалі. Нічога падобнага нідзе не было, але ў сёньняшняй Беларусі ўсяго можна спадзявацца.

XXVIII Алімпіяда 2004 году праходзіць у Афінах ад 13 да 29 жніўня. У ёй бяруць удзел каля 10 000 спартоўцаў з 201 краіны. Гэта найбольшая колькасьць краінаў-удзельніцаў Алімпіяды. Маюць адбыцца спаборніцтвы па 28 відах спорту.

(„Беларус" № 500, ЗША, верасень 2004 г.)

У краінах сьвету

Атам — новая крыніца энэргіі й змаганьня

Атамістычная тэорыя вядомая была старажытным грэкам 500 гадоў да нараджэньня Хрыста. Знаўцамі яе былі два філёзафы — Леўкіп і Дэмакрыт. Да навук фізікі й хіміі ўведзена яна была толькі ў 1804 годзе Джонам Дальтанам пад назовам атамістычнай гіпатэзы.

Да мінулага стагодзьдзя ў навуцы было прынята, што атам прадстаўляе сабою найменшую колькасьць, найменшую частку дадзенага цела, якое мае ўсе яго фізічныя й хімічныя ўласьцівасьці. Сёньня гэтая тэорыя ня ёсьць актуальная, яе падважыў Антуан Ларан Лавуазье ў 1774 годзе.

Французскі вучоны Антуан Анры Бэкерэль у 1896 годзе адкрыў радыеактыўнасьць, гэта значыць — самавольнае вызваленьне атамнай энэргіі некаторых цяжкіх мэталаў. З гэтага часу пачаліся ўсе магчымыя досьледы, якія паказалі, што атам ня ёсьць непадзельнай часткай матэрыі й што будова яго ёсьць не канчатковая, а складаная.

У сваёй будове атам напамінае плянэтарную сыстэму, а менавіта Сонца й ходзячыя вакол яго плянэты. Атам складаецца зь ядра (сонца). Каб прадставіць сабе велічыню атаму, можна дарогай параўнаньня даць наступны прыклад: велічыня атаму так маецца ў адносінах да кроплі вады, як велічыня яблыка да зямнога шару. Што праўда, гэта ня ёсьць дакладнае, але прыблізнае параўнаньне.

Над заданьнем атамнай энэргіі й магчымасьці яе прымяненьня ў практычным жыцьці працавалі вучоныя амаль усіх

большых краінаў сьвету. Таму вынаходзтва атамнай бомбы ня ёсьць заслугай аднаго ці двух вучоных, але ўсіх тых, што працавалі гадамі ў гэтай галіне. Можна ўспамянуць тых вучоных, якія далі найбольшы ўклад у гэтую справу, як: Антуан Анры Бэкерэль, Эрнэст Рэзэрфард, Нільс Бор, Робэрт Опэнгеймэр, П'ер Кюры, Ота Ган, Энрыка Фэрмі й інш.

У канцы 1939 году амэрыканскі прэзыдэнт Тэадор Рузвэльт вызначыў неафіцыйны „Адвісоры Коммітты он Ураніюм" (Дарадчы камітэт над уранам). Быў гэта толькі пачатак, інакш кажучы — праект. Але капітуляцыя Францыі ў вайне зь Нямеччынай паскорыла рэалізацыю намечанага пляну. Дня 11 кастрычніка 1941 году прэзыдэнт Рузвэльт зьвярнуўся да Ўінстана Чэрчыля з прапановай супрацоўніцтва ў атамнай галіне. Неўзабаве брытанскія навукоўцы-дасьледчыкі выехалі ў ЗША, дзе ў лябараторыях, пад пільнай аховай, супольна з амэрыканцамі вялі сваю работу. Апеку над цэлым мерапрыемствам пераняло Міністэрства вайны.

Кожная большая дзяржава сьвету здавала сабе добра справу з важнасьці й значэньня атамнай энэргіі. Распачалася даследчыцкая работа ў лябараторыях. Варожыя дзяржавы як Нямеччына, Італія й Японія, а таксама Францыя й Данія перад 1940 годам, не гаворачы ўжо аб Савецкім Саюзе, настойліва стараліся пазнаць тайну атаму, разьбіць яго.

Паважным канкурэнтам па распрацоўцы атамнай бомбы былі немцы, якія апярэджвалі саюзьнікаў. Каб не інвазія аліянтаў у чэрвені 1944 году, то немцы былі б здольныя першыя прымяніць атамную бомбу ў студзені 1945 году.

Летам 1942 году 8 нямецкіх дывэрсантаў пакінулі падводную лодку пры беразе Амэрыкі й накіраваліся да атамных лябараторыяў у Тэнэсі з мэтай зьнішчэньня іх, але ўсе яны былі злоўлены амэрыканскай контрразьведкай.

У лютым 1943 году 6 нарвэжскіх парашутыстаў, школеных у Англіі дзеля сабатажу, высадзіліся ў Нарвэгіі каля Р'юкан і ўзарвалі на заводзе надта складаную машыну, якая прадукавала „цяжкую ваду". Па некаторым часе самалёты саюзьнікаў зьнішчылі рэшту такіх заводаў у Нарвэгіі.

У сакавіку 1945 году аліянты плянавалі скінуць парашутыстаў на Кіль, дзе праўдападобна, як і ў Нарвэгіі, была

прадукавана „цяжкая вада", але неўзабаве заводы папалі ў рукі аліянтаў у непашкоджаным стане.

Шмат чаго плянавалі абодва бакі ў гэтай справе, аб чым нам дакладна не вядома, як невядомыя нам аснаўныя элемэнты атамнай зброі. Знаем толькі адно, што два японскія гарады Нагасакі й Хірасіма былі зьнішчаны гэтай атамнай бомбай. Якое яна прынесла зьнішчэньне гаворыць той факт, што з 300-тысячнай Хірасімы засталося ў жывых 6 000 людзей, у той час як кінутая бомба вызваліла толькі 0,1% сваёй энэргіі.

Барацьба лябараторыяў ня скончылася на капітуляцыі Нямеччыны й Японіі, яна яшчэ ў большых тэмпах праводзіцца цяпер у час „халоднай вайны".

Лёс будучага сьвету залежыць ад таго, ці гэтая зброя будзе служыць як магутная сіла для мірных мэтаў чалавецтва, ці як страшнае ружжо зьнішчэньня на выпадак „гарачай вайны".

(„Аб'еднаньне" № 8, Лёндан, 1948 г.)

Кітай змагаецца

Кожны народ мае сваю гісторыю й культуру — багатую ці бедную, вялікую ці малую. Глянуўшы на гісторыю чалавецтва бачым, што кітайская культура належыць да найстарэйшых культураў сьвету, якая паўстала 2 000 гадоў да нашай эры й адкуль пачалі запазычаць яе й другія народы.

Ужо ў III стагодзьдзі да нашай эры Кітай прадстаўляў сабою моцную, аб'яднаную дзяржаву, якая дзеля аховы сваіх ураджайных зямель пабудавала гістарычны мур — сьцяну даўжынёю ў 4 000 кілямэтраў.

У XIII стагодзьдзі н.э. наступае ўпадак, манголы заваёўваюць Кітай, але неўзабаве, бо ў 1368 годзе кітайцы вызваляюцца з-пад улады манголаў і твораць даволі моцную дзяржаву, якой кіруюць насьледнікі з дынастыі Мін. У 1644 годзе дынастыя Мін адсоўваецца праз маньчжурскую дынастыю Цын, якая кіруе дзяржавай аж да 1912 году, да часу выбуху рэвалюцыі, калі Кітай аб'яўляе сябе рэспублікай.

Мінае 21 год як не сьціхаюць стрэлы на кітайскай зямлі. Два варожыя сабе ўрады — Гаміньдан з Чан Кайшы й камуністы з Мао Цзэдунам — вядуць упартае змаганьне за ўладу. Гэтыя два лідары да 1927 году былі сябрамі, абодва

паходзяць зь сялянскіх сем'яў. Калі Чан Кайшы меў 9 гадоў, памёр яму бацька. У маладога Чан Кайшы паўстала думка стаць жаўнерам; у Мао Цзэдуна — здабыць асьвету. Чан Кайшы, як кадэт, разам зь іншымі кітайцамі паехаў у Токіо (Японія) на ваенную акадэмію, дзе спаткаў Сунь Ятсена, які ў 1911 годзе спрычыніўся да рэвалюцыі й скінуў маньчжурскую дынастыю Цын. Неўзабаве Чан Кайшы далучаецца да Сунь Ятсена.

Грамадзянская вайны ішла ў поўным разгары. Усюды наглядаліся разлад і спрэчкі. Сунь Ятсен памёр. Неспадзявана й на дзіва ўсяму сьвету ў 1927 годзе паўстала Народная Армія, якая хутка дайшла да перамогі, а яе галоўнакамундуючы, мала каму вядомы 39-гадовы Чан Кайшы займае дзяржаўную пасаду прэзыдэнта.

Здавалася, грамадзянская вайна мінула ўжо й у пасвараным Кітаі запануе спакой. Аднак неўзабаве ў Гаміньдане наступілі разьбежнасьці ў сувязі з уплывам расейскіх дарадчыкаў і камуністаў, на што Чан Кайшы рашуча супрацьставіўся. Пасьля некаторых рэвольтаў наступіла новая грамадзянская вайна. Чан Кайшы быў поўнасьцю пры ўладзе, але дэмакратычныя прынцыпы ў той час былі слабыя, а грамадзтва — падзеленае.

Рэжым Чан Кайшы ня споўніў спадзяванняў перад сваім народам, аказаўся прадажным для нажывы й праўдападобна ўпаў бы, каб не інвазія Японіі. Гэта аднак уратавала Чан Кайшы й дала яму пэўную надзею на прышласьць.

У часе вайны зь Японіяй паміж нацыяналістамі й камуністамі Кітаю наступіла замірэньне. Калі вайна зь Японіяй скончылася, Кітай патрабаваў адпачынку, спакою, патрабаваў правядзення зьмен у дзяржаўным апараце на дэмакратычных прынцыпах, а галоўнае — трэба было правесьці зямельную рэформу.

Чан Кайшы занядбаў гэтыя рэформы, а ягонай амбіцыяй стала толькі захаваць уладу. Аднак рэжым з кожным годам пачаў падаць. Чан Кайшы не зрабіў таго, чаго хацеў працавіты кітайскі народ і гэтым самым падвёў як дзяржаўны муж.

Аднак нельга сказаць, што галоўную віну ў катастрофе нясе выключна Чан Кайшы. Яго ўпадак два гады таму амэрыканцы прадбачвалі з поўнай дакладнасьцю. Своечасова

прэзыдэнтам ЗША Гары Трумэнам у Кітай быў высланы генэрал Джордж Маршал са спэцыяльнай місіяй. Пасьля некалькіх месяцаў свайго побыту ў Кітаі генэрал Маршал зарыентаваўся ў сытуацыі й знайшоў толькі адзін выхад з крытычнага становішча: запрапанаваў Чан Кайшы стварыць кааліцыйны ўрад з удзелам камуністаў. Такую прапанову Чан Кайшы адкінуў. Пасьля гэтага была спынена ўсякая дапамога Кітаю. А камуністы Мао Цзэдуна вялі сваю дзейнасьць у Маньчжурыі з мэтай захопу Кітая й ўсяе Азіі.

Амэрыканскія ваенныя дзеячы бачылі небясьпеку, якая паўстае для ЗША й па іх ініцыятыве зь місіяй у Кітай у 1947 годзе быў высланы генэрал Альбэрт С. Бэгмэер, які па сваім павароце ў Вашынгтон, з аграмадным рапартам, неадкладна зажадаў помачы для Кітаю. Генэрал Маршал прыняў гэты рапарт за сьцісла тайны й не ўзяў яго пад крытыку.

Трэба поўнасьцю прызнаць, што такая сытуацыя ў Кітаі паўстала „дзякуючы" непрадбачанай палітыцы Амэрыкі. Выдача ў Ялце Саветам — за іх васьмідзённую вайну зь Японіяй — Маньчжурыі, Паўночнай Карэі, Курыльскіх астравоў і часткі Сахаліна было няўвагай тых, якія не сумелі дагледзець небясьпекі, якая неўзабаве пачала пагражаць ім самім.

Апошнім часам увес сьвет зьвярнуў увагу на Кітай і ставіць сабе пытаньне: што будзе далей? З усяго відаць, што Кітай станецца часткай камуністычнага сьвету, куды працягне сваю брацкую руку Чырвоны Крэмль, каб захапіць 450-мільённы народ, які ў будучыні напэўна прыдасца. „А пойдзе Кітай, заяваць кідай", — кажа старадаўняя беларуская прымаўка.

(„Аб'еднаньне" № 10, Лёндан, 1949 г.)

Рост насельніцтва Вялікабрытаніі

Разглядаючы рост насельніцтва Вялікабрытаніі варта згадаць і аб самым востраве, які па сваёй сьціплай плошчы, мала прыдатнай глебе, порамі году й тыпова марскім клімаце ўтрымоўвае й забясьпечае жыцьцё больш за 50 мільёнаў людзей.

Брытанскія астравы адкрыты былі ўпершыню фінікійцамі ў 320 годзе да нашай эры. Астравы гэтыя ў старажытнай гісторыі зямлі былі спалучаны ў адну цэласьць з эўра-

пэйскім кантынэнтам. Але ў выніку шматлікіх рухаў зямлі й ледавікоў паўсталі астравы, інакш кажучы, аддзяліліся часткі кантынэнту.

Паверхня галоўнага востраваВялікабрытаніі з прыбярэжнымі малымі астравамі складае 329 523 квадратных кіламэтраў. Паверхня цэлага архіпэлягу зь Ірляндыяй, Гэбрыдамі, Аркадамі й Шатляндыяй складае 325 000 кв. км.

Пачынаючы з X стагодзьдзя й пазьней, калі нармандзкія пераможцы занялі Англію, колькасьць насельніцтва, праўдападобна, не перавышала 400 тысяч. Ад гэтага часу аж да 1700 году насельніцтва ўзрасло да 5,5 мільёна. Што праўда, гэтыя лікі ня ёсьць дакладныя, бо ў тым часе не было праведзенага перапісу насельніцтва. Упершыню ў 1735 годзе было пастаўлена пытаньне ўвесьці закон аб перапісе насельніцтва, што выклікала раптоўную апазыцыю. Знайшліся людзі, якія пачалі сеяць пагалоскі, што перапіс насельніцтва ёсьць „замахам на грамадзянскія свабоды, а нават можа выклікаць эпідэмію й другія няшчасьці". І толькі ў 1800 годзе ўдалося прыняць адпаведны закон, а год пазьней (1801) адбыўся першы падлік насельніцтва Брытанскіх астравоў.

Як аказалася, Англія й Валія налічвалі няцэлыя 9 мільёнаў людзей. Шатляндыя мела каля 1,3 мільёна, а Ірляндыя — 6 мільёнаў. Гэтыя лічбы сьведчаць нам, што рост насельніцтва на Брытанскіх астравох да XIX стагодзьдзя быў вельмі павольны.

У стагодзьдзі пары й вугалю (XIX ст.), калі прамысловая рэвалюцыя спрычынілася да паўстаньня новых гарадоў і небывалага іх росту, а насельніцтва так хутка пачало павялічвацца, што ў парляманце пачалі баяцца ці край зможа ўсіх пракарміць і забясьпечыць працай. Калі ў 1801 годзе Англія й Валія налічвалі разам няцэлыя 9 мільёнаў людзей, то за 100 год (1901) колькасьць насельніцтва ўзрасла амаль у чатыры разы — да 32,5 мільёна людзей.

Як падае апошні перапіс насельніцтва Вялікабрытаніі, які адбыўся 8 красавіка 1951 году, Англія, Валія, Шатляндыя, Паўночная Ірляндыя й малыя прыбярэжныя астравы ў гэты дзень налічвалі 50 176 716 жыхароў. На 1 000 мужчын прыпадала 1 081 жанчына. Бяручы агульна, жанчын ёсьць больш за мужчын амаль на 1 700 000. Тлумачыцца гэта тым, што сярэдняя працягласьць жыцця кабеты ў гэтым

краі ёсьць даўжэйшая чым мужчыны, не зважаючы на тое, што хлапцоў родзіцца больш чым дзяўчат.

Першы раз у гісторыі Вялікабрытаніі ў апошніх дзесятках гадоў насельніцтва гарадоў і мястэчак упала на карысьць вёсак. Вялікі Лёндан і яго метраполія налічвае 8 346 137 жыхароў. Другім вялікім горадам, які за 20 гадоў перагнаў Глязгаў, ёсьць Бірмінгам — 1 112 340.

Дасьледчыкі ў гэтай справе прадбачваюць, што Вялікабрытанія па колькасьці насельніцтва дайшла ад свайго найвышэйшага ўзроўню й ад гэтуль мае пачацца спад, які ў бягучым стагодзьдзі праўдападобна дасягне 15-20 мільёнаў.

Апошнім часам урад стварыў спэцняльную Каралеўскую камісію па справах насельніцтва (Роял Комішын он Популейшэн), заданьнем якой ёсьць весьці сталую статыстыку насельніцтва Вялікабрытаніі.

Як даведваемся з гэтай статыстыкі, перад паўвекам сярэдняя сям'я ў Вялікабрытаніі налічвала пяцёра дзяцей, сёньня мае яна двое дзяцей. Толькі сем'і рабочых маюць пераважна 3-4 дзяцей. На вышэйшыя клясы грамадзтва прыпадае 1,5 дзіцяці. З гэтага бачым, што вышэйшыя клясы вымірaюць, а ўзрастае толькі лік работнікаў.

На 10 асобаў 9 уступае ў сужэнства, але 12 працэнтаў жанчын ня мае дзяцей, што ёсьць вельмі вялікім працэнтам. Сто гадоў таму працягласьць жыцьця мужчыны складала 40 гадоў, жанчыны — 42 гады. Сёньня мужчына жыве ў сярэднім 59 гадоў, а жанчына — 63 гады.

Бяручы пад увагу ваенныя страты Вялікабрытаніі ў апошняй вайне, якія складаюць каля 240 000 жаўнераў і цывільнага насельніцтва загінуўшага ў часе налётаў нямецкіх бамбавікоў, ды паваенную эміграцыю зь Вялікабрытаніі, не зрабілі яны вялікага спадку насельніцтва.

Зараз пасьля вайны й амаль па сёньняшні дзень рээміграцыя ў Вялікабрытанію дасягнула паўмільённай лічбы.

Перапіс насельніцтва Вялікабрытаніі адбываецца кожныя 10 гадоў. У 1941 годзе перапіс не адбыўся з прычыны ваенных дзеяньняў.

Гэта былі-б кароткія інфармацыі, што да росту насельніцтва Вялікабрытаніі.

(„Аб'еднаньне" № 1 (59), Лёндан, 1955 г.)

Суэцкі канал

Трохсотгадовае панаваньне брытанскага флёту на акіянах дало яму магчымасьць пабудаваць магутную Брытанскую імпэрыю. Уплывы Англіі праз гэты час сягалі ў Афрыку, Азію, Амэрыку й Аўстралію. Адзіная марская дарога, якая вяла брытанскі флёт у Індыю, пралягала праз праліў Добрай Надзеі ў Паўднёвай Афрыцы, якую ў 1487 годзе адкрыў партугальскі навігатар Барталамеу Дыяш.

Што тычыцца Азіяцкага кантынэнту, то ён быў вядомы яшчэ ў старажытнасьці егіпцянам, а фактычна фінікійцам, якія ў той час былі вядомыя з марскіх падарожжаў. Фінікійцы пачалі дашуквацца карацейшых шляхоў на Ўсход і ўжо каля 1090 году да нашай эры фінікійскі князь Гірам намаўляў егіпецкага фараона Рамзэса XIII, каб пракапаць канал, які-б лучыў Афрыку з Азіяй.

Таксама спатыкаюцца гістарычныя даныя, што яшчэ фараон Сеці I у 1340 годзе да нашай эры меў такую ж думку пракапаць канал. Аднак у той час адважыцца на пабудову каналу такой даўжыні было нялёгкай справай.

На пачатку XIX стагодзьдзя нашай эры Францыя пачала праяўляць свае ўплывы на Ўсходзе, пераважна ў пошуках калёніяў. Вядомы французскі інжынер Фэрдынанд дэ Лесэпс у 1854 годзе прадставіў плян пабудовы каналу ў найвузейшым месцы, які будзе лучнікам паміж Афрыкай і Азіяй. Гэты канал, паводле Лесэпса, скароціць дарогу з Эўропы на далёкі Ўсход напалову. Але на пабудову такога каналу патрэбны былі грошы. Англія на прапанову Лесэпса паціснула плячыма й не прыдала ёй асаблівага значэньня. Англічане ў той час не ўяўлялі сабе, што празь егіпецкія пяскі можна пракапаць канал такой даўжыні.

Аднак энэргічны французскі інжынер не пакінуў свайго намеру. Для фінансаваньня будовы каналу стварыў акцыянернае таварыства, якое англічане не падтрымалі. Але падтрымалі яго разважны егіпецкі хедыў Магамэд Сайд і французы.

25 сакавіка 1859 году першыя лапаты пачалі рэалізаваць мроі егіпецкіх фараонаў. Будова каналу працягвалася 10 гадоў і ў лістападзе 1869 году канал быў гатовы.

Суэцкі канал стаўся брамай, вядучай ва ўсходнюю імпэрыю й адначасна галоўнай камунікацыйнай артэрыяй, якая скарочвала дарогу, час і кошты падарожжа. Тады толькі Англія пабачыла, якое важнае для яе значэньне мае Суэцкі канал, які яна праігнаравала й апынулася на ласцы Егіпту пад французкай кантроляй у той час, калі 4/5 усіх параплаваў, якія праходзілі праз Суэцкі канал, былі пад брытанскімі сьцягамі.

Аднак у лістападзе 1875 году здарылася неспадзяваная нагода, якая англічанам дала нагоду ўвайсьці ў кіраўніцтва Суэцкага каналу. Сталася гэта таму, што насьледнікам хедыва Магамэда Сайда аказаўся нядбалы хедыў Ісмаіл, які апынуўся на парозе банкруцтва і, каб заплаціць належнасьці, змушаны быў прадаць свой удзел у адміністрацыі каналу.

Гэтая вестка хутка й тайна дайшла да прэм'ера брытанскага ўраду Дызраэлі, які адразу паведаміў каралеву Вікторыю. Апошняя дала сваю згоду на выкуп егіпецкіх акцыяў, зазначыўшы, што справа будзе цяжкая да зрэалізаваньня.

У гэтым часе хедыў Ісмаіл, як супольнік французаў, даў ім прапанову выкупіць ягоны ўдзел у адміністрацыі каналу. Але парыжскія фінансісты не маглі дастаць 85 мільёнаў франкаў і зьвярнуліся разам зь інжынерам Лесэпсам да французскага ўраду. Але ўрад баяўся, каб Англія сваёй палітыкай не напусьціла супраць Францыі Бісмарка й адмовіла гарантаваць дапамогу.

Час ішоў, а хедыў Ісмаіл сьпешна патрабаваў грошай. І тут англічане пачалі дзейнічаць. 22 лютага 1875 году прэм'ер Дызраэлі паведаміў каралеву Вікторыю, што справа Суэцкага каналу ёсьць на заканчэньні зь вельмі задавальняючым вынікам. У гэтай куплі Англія дала хедыву Ісмаілу 4 мільёны фунтаў адступнога й пераняла пад сваё кіраўніцтва Суэцкі канал, які мае 161 кілямэтар даўжыні, 11 мэтраў глыбіні й 65 мэтраў шырыні.

Пасьля Другой Сусьветнай вайны, сілаю палітычных абставін, Вялікабрытанія пачала здаваць свае калёніі й ключавыя пазіцыі, якімі валодала сотні гадоў. Прыйшла чарга й на Суэцкі канал, дзе працавала 4 000 брытанскіх тэхнікаў.

Сёньня Суэцкі канал не сыходзіць з арэны міжнародных канфліктаў. Вялікія дзяржавы добра разумеюць важнасьць гэтага стратэгічнага адрэзку.

Апошнім часам на старонках прэсы парушаюцца пытаньні пабудовы другога каналу даўжынёю 75 кілямэтраў, які ішоў бы празь ізраільскі Нэгаб, лучачы Міжземнае мора з Чырвонам морам. Але гэты плян ёсьць вельмі цяжкі для выкананьня, паколькі ў адным месцы паверхня тэрыторыі ляжыць некалькі дзесяткаў мэтраў ніжэй узроўню мора.

Але калі Суэцкі канал быў выкапаны пры помачы лапатаў і мулаў, то ў выніку прымяненьня адпаведных магутных тэхнічных дасягненьняў такі праект можа быць зрэалізаваны.

(„Аб'еднаньне" № 6 (64), Лёндан, 1956 г.)

Партыя працы на сваім шляху да ўлады

27 лютага 1900 году (у малой памятнай залі „Мэморыял Гол" на Фарынтан у Лёндане) сабралася 129 дэлегатаў, якія пастанавілі стварыць рэпрэзэнтацыю рабочага клясу ў Брытанскім парляманце.

Тагачасная лёнданская прэса нават словам не ўспамянула аб гэтым здарэньні. Дзьве вялікія партыі: Кансэрватыўная й Лібэральная, якія ад двух стагодзьдзяў вядуць паміж сабою змаганьне за ўладу, не надалі ніякага значэньня гэтаму новаму твору.

На асаблівую ўвагу заслугоўвае тут той факт, што ў канцы XIX стагодзьдзя ў Вялікабрытаніі разьвіўся паважны рух сярод рабочых масаў, які актывізаваўся пад знакам барацьбы за паправу матэрыяльных варункаў. У тым часе дзейнічала ўжо Незалежная партыя працы (Індэпэндэнт Лейбэр Парты), амбітная й адважная, але пазбаўленая падтрымкі масаў. Побач яе праводзіла сваю дзейнасьць група маладых інтэлектуалаў — Фабіян Сосайты, якая разумнымі аргумэнтамі старалася пераканаць грамадзтва Вялікабрытаніі аб патрэбе паступовых рэформаў.

Незалежная партыя працы — дынамічная, але слабая колькасна — мела праграму, якой рэвалюцыйная сьмеласьць застрашвала разважных і асьцярожных дзеячоў. Фабіяны, у сваю чаргу, мелі сілу інтэлекту й вялікую веду ў гаспадарчых справах краіны, не хапала ім толькі энэргіі й майстэрства ўздзеяньня на масы.

Пры спалучэньні рэвалюцыйнай Незалежнай партыі працы зь ведамі фабіянаў, паўстаў сплаў вялікай ідэовай сілы. Заслуга такога спалучэньня належыць прыпісаць лідэру Кэру Гарды, які поўнасьцю адпавядаў годнасьці рэфарматара й місіянера з дасьведчаньнем спрактыкаванага дзеяча. Яго глыбокая вера ў даную справу й энтузыязм паканалі першыя перашкоды й адчынілі дарогу перадавым аддзелам.

У часе свайго нараджэньня Партыя працы прадказала зьмены цэлага аблічча Вялікабрытаніі. У залажэньні яе тварцоў, Партыя працы ня мела быць новай палітычнай партыяй, але новым гатункам палітычнай партыі — партыяй шэрага чалавека. Ня мела яна быць, таксама, ані партыяй сацыялістычнай, ані клясавай партыяй і ня мела нават сьцісла акрэсьленай праграмы.

У першую выбарчую баталію Партыя працы, як такая, уступіла адразу пасьля свайго заснаваньня ў 1900 годзе, выступаючы пад назовам Лейбэр Рэпрэзэнтэйшэн Коммітты. Сабрала яна ў той час у краіне 62 698 галасоў, а ў 1906 годзе мела ўжо 29 сваіх дэпутатаў, а ў 1910 годзе — 42 дэпутаты ў парляманце й стала на трэцім месцы.

У канцовай фазе вайны 1918 году была апрацавана абшырная праграма пад назовам „Лейбэр энд дзі Нью Коммон Ордэр", акрэсьліваючы прынцыпы й мэты брытанскага працоўнага руху. У гэтай праграме ўпершыню былі высунуты аснаўныя палітычныя й сацыяльныя пастуляты, палітыка поўнага працаўладкаваньня й агульнага забясьпечаньня „Сошал Сэкюрыты".

Прыняцьцё такой праграмы надало Партыі працы сацыялістычны характар. У тым жа годзе Партыя працы ўстанавіла лякальныя прадстаўніцтвы для здабыцьця сяброў у рады партыі. Адгэтуль, бадай, і пачынаецца хуткі рост партыі, якая на выбарах 1918 году здабыла 57 мандатаў, а ў 1922 годзе — 142 мандаты й такім чынам стала афіцыйнай апазыцыяй у парляманце. Маючы такія посьпехі, усім стала вядома, што адна зь вялікіх партыяў мусіць уступіць. Лёс гэты прыпаў Лібэральнай партыі, якая паступова пачала сыходзіць з палітычнай арэны, а аснаўная барацьба за ўладу, у апошнія гады, праводзіцца паміж лейбарыстамі й кансэрватарамі.

Будучы найбольшай партыяй у парляманце, але ня маючы абсалютнай бальшыні ў 1924 і 1929 гадох, Партыя працы ўтварыла кааліцыю зь лібэраламі пад кіраўніцтвам Макдоналда. Аднак, як першы, так і другі кааліцыйны ўрад доўга не сужыліся паміж сабою й на выбарах 1931 году лейбарысты пацярпелі вялікае паражэньне й улада перайшла да Кансэрватыўнай партыі.

Апошнія гады перад Другой Сусьветнай вайной Партыя працы праходзіла вострае ўнутранае змаганьне на фоне замежнай палітыкі. Асабліва яе левае крыло востра й актыўна выступала супраць ураду кансэратараў Чэмбэрлена.

Калі ў часе вайны 1940 году Чэмбэрлена заступіў Уінстан Чэрчыль, Партыя працы падтрымала яго й увайшла ў кааліцыю. Шмат хто зь лейбарыстаў займаў адказныя пасты ва ўрадзе прэм'ера Чэрчыля.

Пасьля заканчэньня вайны ў 1945 годзе Партыя працы выступіла з кааліцыі й у агульных выбарах таго-ж году рашуча высунулася наперад, здабываючы 11 992 292 галасы й гэтым самым 393 дэпутатаў у парляманце.

Першы раз у гісторыі Вялікабрытаніі Партыя працы дасягнула абсалютную бальшыню ў парляманце, пераняла ўладу ў свае рукі й пад кіраўніцтвам прэм'ера Этлі ажыцьцяўляла свае пляны.

З часам унутраныя разьбежнасьці ў партыі, а асабліва яе левае крыло групы А. Бэвіна, паступова падважвалі аснаўную лінію палітыкі Партыі працы, у выніку чаго на выбарах 1951 году ўлада перайшла да кансэратараў.

І толькі пасьля 13 гадоў, у 1964 годзе, лейбарысты праціснуліся да ўлады, маючы толькі 5 галасоў агульнай большасьці ў парляманце, а неўзабаве — 3 галасы. Такія нявыгадныя абставіны змусілі прэм'ера Г. Вільсана распусьціць парлямант і вызначыць новыя выбары, якія адбыліся 31 сакавіка 1966 году. Гэтыя выбары прынесьлі жаданую палёгку Партыі працы, якая здабыла 13 057 941 голас і правяла 363 сваіх дэпутатаў, маючы такім чынам агульную большасьць у парляманце — 97 дэпутатаў.

На выбарах 1970 году лейбарысты прайгралі, што было неспадзеўкай для грамадскай думкі.

На пачатку 1970 году кансэрватыўны ўрад, не дацягнуўшы свае кадэнцыі, змушаны быў расьпісаць новыя выбары, асабліва з прычыны страйку вуглякопаў і трохднёвага тыдня працы. Меркаваньні кансэрватараў не ўдаліся. Выбары выйгралі лейбарысты трыма мандатамі й ня мелі агульнай бальшыні ў парляманце. Кансэрватары не дамовіліся зь лібэраламі ўтварыць кааліцыю й уладу перанялі лейбарысты. Але лейбарысты, ня маючы агульнай бальшыні ў парляманце, не маглі праводзіць свае праграмы ў жыцьцё й змушаны былі вызначыць новыя выбары на 10 кастрычніка гэтага-ж году.

Выбары 10 кастрычніка не разьвязалі поўнасьцю стварыўшайся праблемы. Што праўда, лейбарысты выйгралі выбары, але толькі трыма дэпутатамі агульнай бальшыні ў парляманце й пры такой мінімальнай бальшыні немагчыма было спадзявацца, каб урад Партыі працы мог поўнасьцю рэалізаваць свае пляны на працягу пяцігадовае кадэнцыі.

Што праўда, грамадзтва на апошніх выбарах ня выказала энтузыязму сваім масавым галасаваньнем. З гэтага відаць, што народ Вялікабрытаніі быў у пэўнай ступені стомлены частымі выбарамі й перавыбарамі, а асабліва перадвыбарчай кампаніяй.

Усё ж Партыя працы правяла найбольшую колькасьць сваіх дэпутатаў — 319 з агульнага ліку 635 дэпутатаў, на якіх галасавала 11 468 646 (39%) выбаршчыкаў. На другім месцы апынулася Кансэрватыўная партыя — 276 дэпутатаў — галасавала 10 429 020 (35,7%). Лібэральная партыя правяла 13 дэпутатаў — галасавала 5 345 271 (18%). Рэшту галасоў атрымалі кандыдаты Шатляндзкай, Паўночнаірляндзкай (Альстэр) і Валійскай нацыянальных партыяў, якія разам правялі 26 сваіх дэпутатаў, на якіх галасавала 1 891 414 выбаршчыкаў.

Яшчэ на выбарах кандыдавалі крайнія правыя — Нацыянальны фронт і крайнія левыя — камуністы. Як адны, так і другія праваліліся, што нават прэса прайшла ціха каля гэтага факту. На Нацыянальны фронт аддадзена было каля 120 000 галасоў, а на камуністаў — 20 000.

Пішучы аб брытанскай Партыі працы, ня можна прамінуць яе адносінаў да марксізму. Ідэалёгія клясавай барацьбы, прызнаваная за догму сацыялістычнымі партыямі кан-

тынэнту, ніколі не змагла выклікаць жару фанатызму ў брытанскіх рабочых асяродках.

На працягу свае шматгадовай дзейнасьці Партыя працы разраслася ў вялікую партыю, пацягнула за сабою мільёны людзей, здабыла ўладу воляй народу й легальнай дарогай правяла ў жыцьцё рэвалюцыйныя зьмены ў цэлым сацыяльным, палітычным і гаспадарчым укладзе Вялікабрытаніі.

Веруючы ў свой народ, шэрага чалавека Партыя працы ажыцьцяўляе свае пляны дарогай бескрывавай рэвалюцыі й уводзіць іх у жыцьцё дарогай паступовай эвалюцыі.

(„Званіца" № 1, Лёндан, 1974 г.)

Нашыя пабрацімы на Балканах

У штомесячніку „Часопіс" № 12/91 — 1/92 (сьнежань 1991 — студзень 1992), што выходзіць на Беласточчыне на польскай і беларускай мовах, быў зьмешчаны артыкул Андрэя Матэнькі на польскай мове „Чы Бялорусіні гінон в Югославіі?"

З артыкула выглядае, што ў Югаславіі знаходзіцца паважная колькасьць беларусаў. Аднак так ня ёсьць. Ды нават сам аўтар, як відаць, ня быў пэўны таго матэрыялу, якім карыстаўся, калі ў канцы свайго артыкулу пісаў: „Што аднак да нашых суродзічаў у Югаславіі, то насоўваецца больш пытаньняў як маецца адказаў... Можа хто з Чытачоў патрафіць даць адказ на гэтыя пытаньні?"

Аб беларусах у Югаславіі я нічога ня знаю, але магу сказаць, што ў жылах югаславаў і народаў Балканаў плыве многа крыві продкаў беларусаў і аб гэтым ніжэй раскажу.

У старажытнасьці Балканы занялі грэкі, македонцы, тракі, ілірыйцы і часткова скіфы й сарматы. Народы гэтыя паддаліся моцным уплывам грэцкай культуры. Пад канец старажытнасьці Балканы апынуліся пад уладай Рымскай імпэрыі. На пачатку хрысьціянскай эры, як піша Самуіл Гозард Крос у падручнай кніжцы аб славянах, яны, мабыць, пачалі пранікаць у басейн Дуная й Савы. Расейскі навуковец Дрынаў, на аснове тапонімаў, адносіць праніканьне славян на Балканы на канец другога стагодзьдзя. Але больш яўная інвазія на Балканы пачалася ў палове V стагодзьдзя,

пасьля ўпадку мангольскай імпэрыі Атылы. Ягоная сьмерць у 453 годзе адкрыла славянам дарогу на поўдзень і яны пачалі свой паход на ніжні й сярэдні Дунай.

Перправіўшыся праз Дунай, славяне апынуліся на тэрыторыі Візантыйскай, або Рымскай, імпэрыі як новы ваенны, палітычны й эканамічны дзейнік. Грэк Пракопій пісаў, што славяне, перайшоўшы Дунай, змусілі рымскае войска ганебна ўцякаць і пакідаць вайсковыя цытадэлі ў прыдунайскіх землях. Другі храніст — Ізыдор Севільскі ў 615 годзе пісаў: „Славяне адабралі ад рымлян Грэцыю".

Міграцыю славян на Балканы можна падзяліць на два галоўныя этапы. Першы — пачаўся ў V стагодзьдзі, — гэта пераважна рабунковы этап, часта ў саюзе з аварамі. Другі этап, які прыпадае на 577 і 581 гады, зьяўляецца славянскай калянізацыяй Балканаў. Па даных Менандра, у 577 годзе 100 тысяч славян пераправіліся праз Дунай. Гэтая маса народу ня мела ніякай палітычнай мэты, яе ўдзельнікі ішлі шукаць лепшых матэрыяльных варункаў для жыцьця. Візантыя, будучы зьвязанай вайной з пэрсамі, а пасьля з арабамі, аказалася бясьсільнай на славянскую інвазію.

Візантыйскі імпэратар Маўрыкій (582-602) цікавіўся славянамі, іхняй ваеннай сілай ды стараўся зрабіць некаторыя практычныя высновы дзеля абароны свае імпэрыі. Ён дараджаў свайму ўраду, каб пры помачы падаркаў і абяцанак перацягнуць частку славян на свой бок і скіраваць іх супраць другіх славян. Гэтым намячалася не дапусьціць славян да аб'яднаньня, каб яны не сталіся пагрозай для Візантыі. Дараджалася свайму войску рабіць выправы супраць славян зімою, калі дрэвы голыя й не даюць заслоны, а сьнег здраджвае сьляды ўцякаючых. А што найгорш, у такіх выправах рэкамэндавалася ня браць у палон славян здольных да ваеннай барацьбы, толькі забіваць іх.

Не знайшоўшы саюзьнікаў сярод славян, канстантынопальская дыпляматыя за дапамогай зьвярнулася да авараў. Авары, якія былі таксама ўдзельнікамі балканскай інвазіі, адазваліся на просьбу Канстантынопаля і ўсёй сваёй сілай наехалі на паселішчы славян паміж Арсовай на Дунаі і ракой Ольтай у Румыніі. Авары зьнішчылі паселішчы славян і руйнавалі ўсё на сваім шляху.

Аварскі хан Баян (Байкан) меў повад выступіць супраць сваіх саюзнікаў, а фактычна памсьціцца на славянах. Адноўчы выслаў ён паслоў да славянскага князя Лаўрыстана (па другіх запісах — Даўрыстана), каб сказалі славянам падпарадкавацца яму й плаціць даніну. На гэта славяне, якія над ніжнім Дунаем жылі незалежна, адказалі, што няма на сьвеце чалавека, які падпарадкаваў-бы такіх людзей як яны, і што славяне ёсьць прызначаны заваёўваць народы, а ня быць самым заваяванымі. Ды пры гэтым заявілі, што пакуль на сьвеце ёсьць меч, яны не дазволяць, каб нехта да іх датыкаўся. Сваю адмову прадэманстравалі тым, што ў востpай дыспуце забілі паслоў Баяна.

Аб гэтым выпадку даведаўся Баян ад чужых і таму, на просьбу візантыйцаў, зрабіў неспадзяваны руйнуючы паход на славян, як помсту за забойства сваіх паслоў. Не прайшло многа часу як авары зноў запрыязьніліся са славянамі і разам працягвалі свае паходы супраць Візантыі.

У 581 і 584 гадох славяне з аварамі трымалі аблогу Салёнікаў і ў 588 годзе ўвайшлі на Пэляпанэс. У 597 годзе славяне зноў аблажылі Салёнікі, якія былі другім пасьля Канстантынопаля найбольшым горадам Візантыі.

Славянская інвазія і каляніізацыя Балканаў прынесла страх і клопат візантыйскім рамэям. Мясцовае насельніцтва ўцякала перад славянамі ў горы, або эвакуавалася на астравы. У 611 годзе славяне разьбілі рымскае войска ў Істрыі й падышлі пад вялікі адміністрацыйны горад Салёну (сучасны Спліт у Дальмацыі), які зьнішчылі ў 614 годзе. Гэта азначала пагрозу для візантыйска-рымскай цывілізацыі на ўсходнім узьбярэжжы Балканаў. У 623 годзе славяне на сваіх лодках прыплылі на Крыт і другія астравы архіпэлягу, а ў 624 годзе высадзіліся ў Апуліі (паўднёвая Італія).

У 626 годзе славяне пралілі многа крыві пад сьценамі Царграда (Канстантынопаля), але здабыць яго не маглі ані славяне, ані авары. Здабылі славяне толькі сьцяг аднаго візантыйскага аддзелу. Так гэта славяне ступілі моцнай нагой на Балканскі паўвостраў і вырашылі застацца там „так доўга, як ім дазволіць Бог".

Гэта сьведчыць аб тым, што ў VI-VII стагодзьдзях усходнія славяне добра валодалі геаграфічнымі ведамі й тэхніч-

нымі прыладамі, што маглі самастойна падарожнічаць па Балканах і Міжземным моры.

Паход славянаў на Балканы прадстаўляў сабою збройную сілу, якая была здольнай апанаваць добра ўмацаваныя візантыйскія крэпасьці. У сярэдзіне VI стагодзьдзя славяне й авары асвоілі візантыйскае ружжо й навучыліся весьці баі з рэгулярным войскам рымлянаў.

Славянскія жаўнеры былі лёгка ўзброеныя, ня мелі на сабе панцыраў, толькі несьлі цяжкія шчыты, пікі й лукі з заражанымі стрэламі. Некаторыя зь іх ня мелі на сабе нават кашулі, толькі насілі доўгія нагавіцы, якія падкасвалі вышэй кален і так станавіліся да бою з ворагам. Хронікі ўспамінаюць, што славяне не любілі ваяваць у адкрытым полі, а выбіралі праходы, скалы і дрэвы. Былі яны спрытныя ў неспадзяваных атаках, а асабліва ў начных. Узгадаваныя над рэкамі і вазёрамі, славяне былі вопытныя ў плаваньні й умелі хавацца пад вадою, аддыхаючы праз доўгую трысьнягу. Прынесьлі яны на Балканы і сваю рачную навігацыю.

Славяне ішлі на ваенныя выправы разам з сем'ямі й дзяцьмі. Таксама аўтары падкрэсьліваюць, што прысутнасьць жанчын блізка бою дадатна дзейнічала на мужнасьць жаўнераў. Прычым раненыя мелі запэўненую апеку, а ў часе перамогі здабывалі славу на вачох радні.

Візантыйскі ўрад, акрамя славян, меў многа клопату на другіх франтох свае імпэрыі й таму пайшоў на кампраміс. Ён дазволіў славянам асесьці на Балканах, паколькі былі яны добрымі земляробамі, але пры кожнай нагодзе выганялі авараў.

На жаль, мы мала ведаем аб тагачаснай арганізацыі, культуры і дзейнасьці славян. Але тыя інфармацыі, якія ёсьць, сьведчаць, што славяне над Дунаем дзейнічалі пад аварскай інсьпірацыяй. Часта авары выкарыстоўвалі славян у сваіх мэтах. Памагалі славяне лангабардам у Італіі пры аблозе й здабыцьці Крэмоны й Мантуі ў ліпені й жніўні 603 году. Многа славянскай крыві праліта над Дунаем, на Балканах, у Італіі й нават у Афрыцы.

Папа Рыгор I (590-604) наглядаў за рухам славянаў і ў пісьме да экзарха Равэнны, Кальлініка, пісаў аб сваёй радасьці з прычыны яго перамогі над славянамі ў 999 годзе. Але год

пазьней славяне наехалі Істру й папа выказаў сваю трывогу, што славяне могуць увайсьці ў паўночную Італію.

Заходняя Царква ў той час ня мела моцнай арганізацыі, каб паўплываць на славян. Яе духавенства ў VI-VII стагодзьдзях падчынялася сьвецкаму манарху й безь яго дазволу епіскап ня мог выехаць нават на сабор. Толькі за папы Рыгора I заходняе хрысьціянства пачало аб'ядноўвацца пад аўтарытэтам папы рымскага, што не ішло так лёгка. Напрыклад, папа Ян IV (640-642) не рабіў ніякіх захадаў у адносінах да славян, каб прывесьці іх да хрысьціянскай веры. Ён толькі зьбіраў грошы і пасылаў сваіх паслоў у Істру і Дальмацыю, каб выкупіць хрысьціян са славянскай няволі. А папа Захарый (741-752) у адным са сваіх пісьмаў назваў славян найбольш агідным і найгоршым народам.

Каб падпарадкаваць славян сваёй традыцыі і парадкам, імпэратар Гэраклій (610-641) пастанавіў навярнуць іх на хрысьціянскую веру. Паколькі некаторыя славяне знаходзіліся пад юрысдыкцыяй рымскага папы, таму імпэратар зьвярнуўся да яго, каб прыслаў місіянераў. Мы ўжо знаем настаўленьні рымскіх папаў да славян, а па-другое, славяне-пагане мелі час разгледзецца вакол сябе й аддавалі перавагу Канспантынопалю, а не Рыму. Рымскія сьвятары ня мелі для іх таго аўтарытэту як канстантынопальскія і таму місіі іх ня мелі посьпеху. Прынялі лацінскую веру толькі тыя славяне, якія жылі пераважна ў гарадох, або недалёка гарадоў і мелі кантакты зь мясцовым хрысьціянскім насельніцтвам.

За імпэратара Юстыніяна II (685-711) больш за 200 тысяч славян было пераселеных з ваколіц Салёнікаў у Малую Азію. Усім ім былі прыдзелены зямельныя ўчасткі, якія паставілі славян матэрыяльна ў добрыя варункі. Але за гэта трэба было выканаць ваенную службу.

Імпэратар Юстыніян II у 690 годзе стварыў армію з асеўшых славян у сіле 30 тысяч жаўнераў, якія разам зь візантыйскай арміяй пайшлі супраць арабаў. Славянскім войскам камандаваў славянін, Нябуляс, які быў князем аднаго з пераселеных плямёнаў. У часе акцыі арабы перакупілі князя Нябуляса й ён з 20 тысячамі жаўнераў перайшоў на бок арабаў. За кару многія застаўшыеся славяне былі асьлеплены. А Нябуляс са сваімі перабежчыкамі атрымаў

ад халіфа раён каля Антыёхіі й Кыркоса ў паўночнай Сырыі, дзе яны пасяліліся.

Яшчэ ў 663 годэе, у часе ваеннай выправы арабаў на паселішчы ў Малой Азіі, група асеўшых там славянаў, у ліку 5 000, перайшла на бок арабаў і разам зь імі адступіла ў Сырыю. Гэтыя людзі былі паселены ў раёне Апамэі, у вёсцы, якую назвалі „Саабія", што па-арабску значыць — славянская.

Пераход славян на бок арабаў тлумачыцца тым, што ў часе ваенных дзеяньняў Візантыі на славян-земляробаў накладаліся вялікія падаткі. Другім повадам, як падаюць некаторыя гісторыкі, было незадавальненьне з прычыны перасяленьня. Гэта сярод славян выклікала хваляваньні, якія пацягнулі за сабою й зьмену арыентацыі.

Астаўшыеся на Балканах славяне прынялі хрысьціянства з Канстантынопаля, але, ня маючы свайго пісьма, не маглі мець сваіх літургічных кнігаў і таму карысталіся грэцкімі. А пакуль навучыліся чытаць па-грэцку, таму сьвятарамі сярод іх былі грэкі. Такім чынам Царква сталася магутным дзейнікам абсарбіраваньня славян. Былі і другія дзейнікі. Славяне аселі ў раёнах з моцнымі ўплывамі гэленскай культуры, дзе ўся адміністрацыя вялася на грэцкай мове. Да таго славяне былі ізаляваны ад сваіх галоўных масаў і таму лёгка растваралiся сярод грэкаў. Толькі там, дзе яны тварылі сваю згуртаваную масу і былі далей ад грэкаў і іхніх уплываў, там яны захаваліся.

Ад часу зьяўленьня на Балканах славян, у наступных стагодзьдзях склалі яны большасьць насельніцтва й чуліся там гаспадарамі. Яшчэ імпэратар Маўрыкій пісаў: „Славяне не падпарадкоўваюцца, іх цяжка зьняволіць, апанаваць, асыміляваць". Ён прызнаў, што нават палонным славяне даюць па пэўным часе выбар вярнуцца дамоў за выкуп, або застацца на месцы як вольныя й прыяцелі. Гэта ясна сьведчыць, што славяне былі народам свабодалюбным, не рабілі людзей нявольнікамі, захоўвалі свае дэмакратычныя прынцыпы.

На аснове візантыйскіх хронік можна сказаць, што дзе-б славяне не апынуліся, іхняя матэрыяльная культура, мова, арганізаванасьць, гаспадарлівасьць, былі амаль аднолькавыя. На працягу стагодзьдзяў славяне зьбераглі свае народныя традыцыі і звычаі. Гісторыкі і хронікі падаюць, што

славяне былі рослыя, добра збудаваныя фізічна, працавітыя, гасьцінныя, шчырыя да чужынцаў, паслушныя сваім начальнікам, рэлігійныя ў сваіх абрадах, міралюбныя, а калі вялі войны, то пераважна абаронныя. Пачуцьцё сваёй нацыянальнай прыналежнасьці й любоў да свае роднае мовы характэрны тым, што славяне масава прынялі хрысьціянства тады, калі Сьвяшчэннае Пісьмо было перакладзенае на іхнюю мову. А калі ў X стагодзьдзі хацелі накінуць ім лаціну, то пачалося змаганьне.

Аднак трэба сказаць праўду, што славяне, як і другія народы, не былі заўсёды міралюбныя. Яны часта бунтаваліся, рабілі злачынствы й мелі свае вялікія заганы. Апынуўшыся ў новай краіне, сярод славян пачалі нараджацца новыя палітычныя канцэпцыі і ствараццa моўныя дыялекты ды розныя спэцыфічныя сытуацыі, якія адасобілі іх ад рэшты славян, а перад усім ад сваіх кроўных усходніх суродзічаў.

Прывесьці іх назад, спалучыць у адну групу, не было магчыма. Той-жа Маўрыкій пісаў: „Славяне былі здолнымі злучыць свае сілы для барацьбы з ворагам, але сярод іх разлад, бо згода адных была прэцэдэнтам для другіх не пагадзіцца".

Падобную думку аб славянах выказаў у X стагодзьдзі Ібрагім ібн Якуб: „Агульна славяне сьмелы і агрэсыўны народ, каб толькі ня іхні разлад (...) разгаліненьне іхніх плямёнаў, ніякі народ у сьвеце ня мог-бы раўняцца зь імі ў сіле". Пры гэтым Ібрагім успомніў, што славяне вядуць войны з рымлянамі, франкамі, лангабардамі й другімі народамі, аднак такая барацьба праходзіць са зьменным шчасьцем. Нягледзячы аднак на свой разлад, славяне праявілі палітычныя амбіцыі і свае арганізацыйныя здольнасьці на палітычнай арэне Балканаў.

З другога боку славяне спаткаліся ў новай краіне зь невядомай для іх дзяржаўнай структурай, культурай, цывілізацыяй, правам і хрысьціянскай верай. Яны ўважна прыслухоўваліся і вывучалі тамтэйшыя дасягненьні, але адначасна моцна трымаліся племянных традыцыяў і прынцыпаў. Іхняя славянская прысутнасьць на Балканах сталася тым фактарам, які садзейнічаў у зьменах дзяржаўнага ладу Візантыйскай імпэрыі. Што праўда, славяне не маглі даць многа культурным грэкам, але згодна візантыйскім крыні-

цам, славяне ператварылі рабскую Рымскую імпэрыю ў феадальную дзяржаву. Мову сваю славяне перахоўвалі ў Грэцыі да XV стагодзьдзя. Паводле філёлага Міклосіча, славяне перадалі ў грэцкую мову 129 сваіх слоў.

Цяпер мы заглянем у розьніцу ці падабенства паміж славянамі на Балканах і на Ўсходзе. Навуковыя досьледы выявілі падабенства племянных імёнаў балканскіх славян з усходнімі. Прыкладам маюцца дрыгавічы, севяране, крывічы й драўляне. Як падае Гэнрык Лаўмяньскі, пад назовам дрыгавічоў выступаюць на Балканах дзьве групы. Адна група пад Салёнікамі, а другая — у паўночна-заходняй Тракіі, паміж Радопскімі горамі й Балканамі, над рэчкай Драговіцай, якая ўліваецца ў Марыцу. У гэтай самай мясцовасьці другая рэчка, прыток верхняй Струны, носіць назоў Драговістыцы. Назвы гэтых рэк прыняты напэўна ад назову жыхароў, якія там аселі, а не адваротна.

Часта дрыгавічы на Балканах успамінаюцца ў прэсе як „држгавіты" й „дрогувіты". На гэта можа паслужыць заўвага таго-ж гісторыка Гэнрыка Лаўмяньскага, што другавіцкія групы, зь якіх адна асела ў раёне Марыцы й Струны, а другая — у раёне Салёнік, адзначаюць шлях інвазіі рускіх дрыгавічоў, або беларускага племя. Гэта самае пісаў гісторык Мітрафан Доўнар-Запольскі, што ў часе вялікага перасяленьня народаў частка племені дрыгавічоў зайшла на Балканы і пасялілася ў раёне Салёнік. На рубяжы Тракіі й Македоніі знаходзіцца вёска Драговіца й ад яе носіць назоў царква.

Другавіцкі Пятро, як епіскап Тракіі, быў прысутны на Канстантынопальскім саборы ў 879 годзе. Другавіцкая епіскопія існавала да XII стагодзьдзя й падпарадкоўвалася мітраполіі ў Салёніках. У VII-X стагодзьдзях другавіты займалі абшырную тэрыторыю й мелі сваіх князёў. На пачатку IX стагодзьдзя яны былі падпарадкаваны Візантыі й плацілі ёй даніну. Яшчэ ў X стагодзьдзі мелі другавіты сваю аўтаномію, а ў XI стагодзьдзі землі іх былі яшчэ асобнаю адміністрацыйнаю адзінкай.

Археалягічныя знаходкі на Балканах пацьвярджаюць факт, што дрыгавічы паходзяць з басейна Прыпяці. Да свае міграцыі яны маглі таксама называцца другавітамі на сваёй радзіме і маглі пакінуць па сабе назоў гораду Друцк і ракі Друць.

На Пэляпанэсе (Грэцыя) жылі крывічы й драўляне. Іхні сьлед застаўся ў тапанімічных назвах, як памятка асобнага этнічнага існаваньня. Монэмвасійская хроніка, напісаная на Пэляпанэсе каля X стагодзьдзя, зьмяшчае шэраг даных аб славянскай калянізацыі на гэтым паўвостраве. Згодна гэтай хронікі славяне кіравалі Пэляпанэсам 218 гадоў (588-805) і на пачатку VIII стагодзьдзя Пэляпанэс называлі „Склявонія тэрра" — Славянская зямля.

Адносна прысутнасьці крывічоў на Балканах маецца яшчэ заўвага дасьледчыка, што ў паходзе славян на Канстантынопаль у 626 годзе славяне палілі сваіх памерлых і забітых. У той час паўднёвыя плямёны славян не палілі сваіх памерлых, толькі хавалі. Гэтая заўвага пацьвярджае прысутнасьць крывічоў на Балканах.

Хоць нідзе ў запісах не ўспамінаюцца радзімічы й вяцічы, але археалягічныя знаходкі сьведчаць аб іхняй прысутнасьці на Балканах. Таксама ў X-XI стагодзьдзях былі ўспаміны аб славянскім племені смаленцаў у візантыйскай хроніцы. Мелі яны сваю тэму й епіскопію, якая належала да мітраполіі ў Філіпіі.

Бяручы агульна, славяне не былі задаволены мясцовай грэцкай адміністрацыяй, якая абмяжоўвала іхнія правы, што выклікала збройны канфлікт. Пры канцы VIII стагодзьдзя імпэратрыца Ірэна паслала спэцыяльную экспэдыцыю супраць славянскіх плямёнаў у раён Тэсаліі й на Пэляпанэс. Гэта сьведчыць, што славяне моцна ўсадавіліся ў Грэцыі, мелі ўплыў на палітычнае жыцьцё імпэрыі, нават пагражалі ёй.

Варожасьць славян да існуючага парадку выявілася неўзабаве, калі адзін з найбольш здольных у візантыйскай арміі генэрал Тамаш вёў рэвалюцыю супраць імпэратара Міхаіла II (820-829). Тамаш аб'яднаў пад сваім сьцягам славян, армян, пэрсаў і пры помачы халіфа ал-Мумуна хацеў захапіць уладу імпэратара. Ён каранаваўся на грэцкага басілеуса ў Антыёхіі. Праз год часу Тамаш трымаў аблогу Канстантынопаля і імпэратар Міхаіл ня меў дастаткова сілы, каб разьбіць войска Тамаша. Тады Міхаіл пачаў весьці перагаворы з балгарамі. Аб чым яны гутарылі — афіцыйна невядома, але ў 823 годзе балгарская армія неспадзявана напала на

армію Тамаша ззаду й разагнала яе. Сам Тамаш папаў у палон і быў страчаны разам са сваімі супрацоўнікамі.

Таксама славяне Пэляпанэсу былі незадаволены дзейнасцю візантыйскай адміністрацыі. Яны каля 807 году збунтаваліся й аблажылі горад Патрас. Славяне Пэляпанэсу былі даволі колькасныя, мелі свае незалежныя правінцыі. У 842 годзе яны зноў збунтаваліся, але бунт быў збройна задушаны міністрам Феакцістам і ў гэтым-жа 842 годзе былі ліквідаваны славянскія незалежныя правінцыі. На іх месца візантыйская адміністрацыя ўвяла так званыя тэмы, якія былі падпарадкаваны цэнтральнай вайсковай уладзе.

Нягледзячы на бунты і збройныя паўстаньні, славяне Грэцыі былі пераможаны збройнай сілай ураду і, апынуўшыся пад моцнымі ўплывамі гэленскай культуры, паступова абсарбаваліся. У XII стагодзьдзі можна было знайсьці толькі групкі славян на поўдні Эпіру й Тэсалёніі. Няма сумніву, што ў жылах грэкаў цячэ славянская й беларуская кроў.

Візантыйскі гісторык Феафан успамінае севяран як жыхароў Мізіі. Маюцца тапанімы, якія сьведчаць, што частка севяран жыла ў Румыніі й Балгарыі. Яшчэ да гэтага часу генэза румынаў ня ёсьць поўнасьцю ўзгоднена, але адно ёсьць пэўнае, што вялікі ўдзел маюць тут славяне. Аб гэтым напамінаюць славянскія словы ў румынскай мове і славянскія геаграфічныя назовы раскіданыя па ўсёй Румыніі.

У Балгарыі за Аспаруха сем славянскіх плямёнаў прымала ўдзел у абароне сваіх граніцаў, а племя севяран абараняла ўсходні балканскі праход — Вэргаву (праўдападобна ці ня сёньняшнія Вярбішкі). За часоў балгарскага хана Прэсьяна (836-852) успамінаецца славянскае племя смаленцаў. Займалі яны тэрыторыю над рэчкай Мстой у паўднёва-ўсходніх Радопах.

Балгары навучылі славян ваяваць у адкрытым полі, бо славянская тэхніка барацьбы заключалася пераважна на нападах з-за заслоны, якую тварылі лясы, кусты, скалы. Хоць балгары далі культурнейшым славянам сваё імя й палітычную арганізацыю, аднак прынялі ад іх мову, звычаі, лякальную арганізацыю й з часам сталіся славянамі.

Аб сходнасьці вышэйзгаданых славянскіх плямёнаў на Балканах з плямёнамі, пражываючымі ў той час і пазьней на тэрыторыі, якую мы сёньня называем Беларусьсю, могуць

паслужыць некаторыя назіраньні дасьледчыкаў славяншчыны. Напрыклад, акадэмік Яўхім Карскі падае: „Валачобныя песні (дахрасціянскі абычай) належыць выключна беларусам, іх няма нават сярод украінцаў, але ёсьць нешта падобнае ў сэрбаў". Таксама Т. Пэскэр у „Кэмбрыдж Мэдывал Гісторы" знаходзіць падабенства паміж дрыгавічамі Палесься й сэрба-харватамі ў іхнім дамашнім звычаі. А Адам Кіркор згадвае, што Сэрбія й Балгарыя, як і Беларусь, багацейшыя за ўсе іншыя славянскія землі сваімі міталягічнымі пераканаьнямі й песьнямі, якія сьпяваюць тысячы гадоў.

Калі зьвярнуць увагу на адзеньне й жылішчы, то відаць, што наддунайскія жыхары Балгарыі маюць многа супольнага з усходнімі славянамі. У памятках старабалгарскай мовы IX-XI стагодзьдзяў можна знайсьці беларускія рысы, таксама як і ў сучасных дыялектах балгарскай мовы.

Візантыйскія аўтары называлі нашых суродзічаў барбарамі, або варварамі, але гэтыя варвары ў апісаньні Пракопа Кесарыйскага мелі свае вечавыя сходы, на якіх вырашалі важныя справы. Вечавы парадак сярод славян Балканаў перахоўваўся амаль да XI стагодзьдзя й на ім выбіралі сваіх князёў і каралёў. Славяне даволі хутка пачалі займаць кіруючыя палітычныя, вайсковыя й царкоўныя пасады ў візантыйскай дзяржаве, даходзячы да імпэратараў. Слаўная македонская дынастыя візантыйскіх імпэратараў (867-1056) увайшла ў перыяд кансалідацыі й экспансіі.

Славяне сваёй экспансіяй VI-VIII стагодзьдзяў зьмянілі этнічны выгляд Эўропы ад Днестру да Лабы й ад Ладагі да Пэляпанэсу. Няраз стаялі славяне пад сьценамі Канстантынопаля й зь імі лічылася візантыйская адміністрацыя. Дзейнасьць славян на Балканах не магла прайсьці незаўважанай, яна дала свае станоўчыя рэзультаты.

Ужо ў VII стагодзьдзі славяне мелі сваю незалежную дзяржаву, т.зв. Самона на тэрыторыі сёньняшняй Чэхаславаччыны. Дзяржава гэтая ў IX стагодзьдзі пераўтварылася ў Вялікамараўскую імпэрыю й дала пачатак славянскай культуры. Славяне сумелі апанаваць балгараў, прывіць ім сваю мову й замяніць іхніх каганаў на славянскіх князёў і цароў. У VIII-X стагодзьдзях славянская Балгарыя тэрытарыяльна разраслася й пачала пагражаць Візантыі.

Таксама ў VIII стагодзьдзі паўстала дзяржава харватаў, якая ў канцы IX стагодзьдзя ўнезалежнілася ад франкаў. У XII стагодзьдзі паўстала сэрбская імпэрыя на чале са Сьцянанам Неманіяй.

Славянскія дзяржавы на Балканах трацілі з часам сваю незалежнасьць пад напорам туркаў, але ў канцы яны адрадзіліся й існуюць па сёньняшні дзень. Славяне Балканаў, як і іншыя народы Эўропы, прайшлі свой гістарычны шлях, выказалі сваю жывучасьць і не даліся, каб іх сьцерці з паверхні зямлі.

Вышэйпрыведзеныя факты сьведчаць, што сёньняшнія жыжары Грэцыі, Югаславіі, Балгарыі й Румыніі, не гаворачы аб усіх, гэта-ж нашы пабрацімы на Балканах.

(„Голас Часу" № 19 (4), Лёндан, 1992 г.)

Крытычныя галасы немцаў

Палітыка Гітлера, калі ён ішоў вайной на Савецкі Саюз, мела на мэце паняволеньне славянскіх народаў, якіх фюрэр уважаў за „унтэрмэншаў" і якія павінны былі служыць парабкамі ў нямецкім „лебэнсраўм" („жыцьцёвай прасторы"). Аднак у першым часе вайны народы Савецкага Саюзу ня ведалі злачыннай палітыкі Гітлера, які нядаўна быў хаўрусьнікам Сталіна. І, пачынаючы ад Балтыйскага й аж да Чорнага мораў, простыя людзі ў бальшыні сваёй віталі немцаў як вызвольнікаў з крывавых сталінскіх кіпцюроў. Як піша Мартын Валькэр, „у 1941 г., калі нацыстыя наехалі ў Савецкі Саюз, некаторыя беларусы супрацоўнічалі зь немцамі з надзеяй, што будзе ўстаноўленая незалежная дзяржава. Яны хацелі стварыць сваю паліцыю й некаторыя вайсковыя часткі з добраахвотнікаў (...). Беларусь была найбольшай ахвярай вайны, ейныя гарады, вёскі й насельніцтва былі спустошаны арміямі, якія каціліся па ейнай тэрыторыі ўпярод і назад" („Совет Уніон", 1989, стар. 240). А. М. Купэр у сваёй кніжцы „Дзі Рашын Вор" („Руская вайна") піша, што ў беларусаў праяўлялася звычайная нянавісьць да камунізму й савецкага рэжыму.

Экспансыўную палітыку Гітлера на Ўсходзе падтрымоўвала многа ягоных саўдзельнікаў з нацысцкай партыі. Аднак,

ня ўсе немцы пагаджаліся з палітыкай свайго фюрэра. Ужо пасьля акупацыі заходняй Польшчы ў 1939 г. (усходнюю акупавалі савецкія войскі) нямецкі генэрал Ёганес Бласковіц, ваенны камандзір у Польшчы, пабачыўшы арышты, забойствы й дэпартацыю палякаў, 6 лютага 1940 г. напісаў мэмарандум галоўнаму каманьдзіру арміі. У ім гаварылася, што вялікай шкодай для нямецкага народу ў тадышняй сытуацыі былі ягоныя (галоўнага камандзіра) брутальныя й антыманальныя паводзіны, якія неўзабаве, як зараза, могуць пашырыцца сярод іншых вайскоўцаў. Бласковіц разумеў, што злачынная дзейнасьць немцаў на акупаванай тэрыторыі нічога добрага нямецкаму народу й урадоўцам СС не прынясе, і паслужыць толькі добрай прапагандай для ворага. Час паказаў, што крытыка Бласковіца была слушнай.

Памінаючы палякаў, нацысты не хацелі прыняць і славянскую гасьціннасьць народаў Савецкага Саюзу, і тую надзею, якую яны ўскладалі на немцаў. З часам народ аказаўся расчараваны. Вось яскравы прыклад як нацысты паступова прайгравалі прапагандысцкую кампанію на Ўсходзе.

Перад нападам на СССР нацысты склалі лістоўку на нямецкай мове, дзе гаварылася, каб насельніцтва й Чырвоная Армія не аказвалі супраціву й віталі немцаў як вызвольнікаў. Аднак было сказана, каб савецкія жаўнеры й цывільнае насельніцтва мардавалі „камісараў, камуністаў і камсамольцаў". Лістоўка была аддадзена на пераклад двум немцам-балтыйцам, былым афіцэрам царскай арміі, якія ў Першую Сусьветную вайну самі ваявалі супраць кайзэра. Перакладчыкі, добра ведаючы рэаліі жыцьця ў Савецкім Саюзе, ведаючы, як на такую злачынную справу прарэагуе тамтэйшае насельніцтва, — сказ пра забойства „камісараў, камуністаў і камсамольцаў" у лістоўцы прамінулі. Нацысты партыйцаў і камсамольцаў таксама згадзіліся прамінуць, але „камісараў" пакінулі.

У верасьні 1941 г. Гебэльсу было павядомлена, што захоплены ў палон рускі палкоўнік сказаў, што многія жаўнеры Чырвонай Арміі здэзэрціруюць, калі немцы паабяцаюць стварыць свабодную рускую дзяржаву на месцы бальшавіцкай сыстэмы. Пра сымпатыі мясцовага насельніцтва да немцаў згадвае й генэрал Гудэрыян. У часе бою пад Ярас-

лаўлем мясцовыя жанчыны зь вёсак прыносілі яму хлеб, малако, яйкі й не дазвалялі адысьці, пакуль ён чаго-небудзь не скаштуе з прынесенага. На жаль, успамінае Гудэрыян, прыязныя адносіны мясцовага насельніцтва да немцаў трывалі нядоўга. Гэтак званыя „рэйхкамісары" адвярнулі сымпатыі народу да немцаў і такім парадкам падрыхтавалі глебу для партызанскай вайны. (Мне памятаецца, як першымі месяцамі вайны старэйшыя векам людзі, убачыўшы як паводзяць сябе нямецкія салдаты, асабліва ў дачыненьні ад ваеннапалонных, гаварылі, што гэта „ня тыя немцы, якія былі ў 1918 г." — Ю. В.).

Гітлер і ягоны Галоўны штаб, укладаючы „плян Барбароса", не ўлічылі магчымай партызанскай дзейнасьці. У „пляне Барбаросы" сказана проста: „Партызаны бязьлітасна будуць зьнішчаныя войскам у барацьбе або падчас уцёкаў". Такім простым дыктатам мела быць разьвязанае партызанскае пытаньне. А вось што 16 сакавіка 1942 г. пісаў у сваім дзёньніку Гебэльс: „Актыўнасьць партызанаў значна ўзмоцнілася апошнімі тыднямі. Яны вядуць добра арганізаваную вайну. Дабрацца да іх вельмі цяжка, бо яны скарыстоўваюць такія тэрарыстычныя мэтады ў сваіх акругах, што мясцовае насельніцтва баіцца супрацоўнічаць з намі ляяльна".

Увосень 1942 г. большасьць старшых нямецкіх армейскіх афіцэраў не пагаджалася з жорсткай каляніяльнай палітыкай нацыстаў. Паміж імі й эсэсаўцамі не было прыязьні на працягу ўсяго часу як толькі Гітлер стаў фюрэрам. (Дарэчы, на Нюрнбэргскім працэсе фэльдмаршал Манштэйн прывёў гэткую статыстыку. З 17 фэльдмаршалаў нямецкай арміі толькі адзін утрымаўся на сваёй пасадзе , 10 было зусім звольнена. З 36 генэрал-палкоўнікаў таксама 18 (палавіна!) была звольнена зусім і толькі 3 захавалі свае пасады). Палкоўнік Геньніг фон Трэскоў, малады й здольны афіцэр апэрацыі Арміі Цэнтар, падсумаваўшы свае назіраньні й дасьведчаньні з паводзінаў немцаў на акупаванай тэрыторыі на Ўсходзе, 25 сьнежня 1942 г. напісаў, што немцы страцілі прыгожую нагоду выйграць супрацоўніцтва славянскіх народаў у вайне з саветамі, а сталася гэта ў выніку неразумнага трактаваньня названых народаў войскам — тэрор, рэквізіцыі, паленьне вёсак, прымусовы вываз людзей на працу

ў Нямеччыну — заганялі людзей у партызаны. Фон Трэскоў, як і іншыя больш разважныя вайскоўцы, прычыну пашырэньня партызанскай дзейнасьці бачылі ў адмове немцаў супрацоўнічаць з народам. Фэльдмаршал фон Клейст, камандзір групы армій „А" на поўдні, абяцаў, што пад ягоным кантролем насельніцтва атрымае большыя свабоды, што трэба выдаць адмысловую дэрэктыву ў справе трактаваньня цывільнага насельніцтва. А фэльдмаршал Манштэйн, камандзір групы армій „Поўдзень", гаварыў, што народы Ўсходу трэба трактаваць не як ворагаў, а як саюзьнікаў, даць ім магчымасьць працаваць у сваёй адміністрацыі, культуры, школьніцтве, рэлігіі. Стрык-Стрыкфэльд, перакладчык і афіцэр разьведкі, напісаў фэльдмаршалу фон Боку мэмарандум, у якім прапанаваў стварыць Русскую освободительную армию, рускі ўрад на эміграцыі, палепшыць умовы жыцьця палонных, якія пажадаюць уступіць у гэтую армію. У духу вышэйпададзеных выказваньняў была аформленая г.зв. „Смаленская праклямацыя", якая дамагалася зьмены ў лепшы бок тагачаснай палітыкі немцаў да мясцовага насельніцтва й савецкіх палонных. Склалі яе генэралы й штабовыя афіцэры фронту й тылавых частак.

Ведама, аднак, што Гітлер востра адрэагаваў на праклямацыю, а фэльдмаршал Кейтэль выдаў строгую дырэктыву, у якой наказваў, каб армія трымалася далей ад палітыкі. Але дырэктыва Кейтэля не зьмяніла настрояў лібэральна настаўленых штабовых афіцэраў. Так міністар Міністэрства ўсходу (акупаванай савецкай тэрыторыі) Розэнбэрг, які быў балтыйскім немцам, ведаў рускую мову й гісторыю й які прадстаўляў „Смаленскую дэклярацыю" Гітлеру, быў зацікаўлены ў зьмене нямецкай палітыкі на Ўсходзе. Ён разумеў праблемы паняволеных Масквой народаў і прапаноўваў гітлераўцам (каб ня мець у будучыні пагрозы з Усходу) стварыць пад пратэктаратам Нямеччыны „санітарны калідор" зь незалежных дзяржаваў ад Балтыйскага даЧорнага мораў. Ён слушна сцьвярджаў, што „Расея ніколі не была нацыянальнай дзяржавай, а была дзяржавай розных нацыянальнасьцяў". (Палітыка Розэнбэрга была небясьпечнай для Сталіна, бо дала-б пэўную самастойнасьць народам Усходняе Эўропы, чаго не давала палітыка Сталіна). Калі-ж эсэ-

саўцы зажадалі большых правоў для свае дзейнасьці на Ўсходзе, дык міністар Розэнбэрг запратэставаў.

Нават памянёны ўжо намі нядобрай памяці Гебэльс і той прапаноўваў увесьці больш мяккую палітыку на Ўсходзе. У сваім дзёньніку ён пісаў: „Я перакананы, што мы мусім зьмяніць нашы адносіны да людзей на Ўсходзе. Мы значна аслабім небясьпеку партызанаў, калі ў пэўнай ступені зможам выйграць давер у народа". І адданы нацыст фэльдмаршал фон Рэйхен прапанаваў у студзені 1942 г. стварыць украінскую й беларускую дывізіі, але прапанова гэтая была Гітлерам адкінутая. Фюрэр трымаўся прынцыпаў, выкладзеных ім у „Майн Кампф", ніяк не хацеў даваць зброі ў рукі славянам і з-за сваёй сьляпой упартасьці не прыслухоўваўся да парадаў армейскіх афіцэраў, ведучы краіну да немінучай катастрофы. Славяне былі для Гітлера на другім пасьля жыдоў месцы, другараднымі людзьмі. Савецкіх палонных немцы ў сваіх газэтах паказвалі ў скажоным выглядзе, называючы іх „унтэрмэншамі", якім нібыта не было месца на зямлі.

Тым часам справы на ўсходнім фронце непакоілі ня толькі маршалаў, але й радавых жаўнераў. Непакоіла іх дзейнасьць партызанаў. Не ставала свайго войска, якое таяла ў ходзе вайны. Адзінай дапамогай магла быць падтрымка мясцовага насельніцтва. Фюрэр, аднак, гэтага разумець не хацеў. Слушныя перасьцярогі генэрала фон Бласковіца, палкоўніка (пасьля генэрала) Трэскова ды шмат іншых разважных маршалаў і генэралаў не пераканалі Гітлера. Многа немцаў было засьлепленых лёгкімі перамогамі палітыкі Гітлера ў Заходняй Эўропе, і яны думалі, што й на Ўсходзе ўсё закончыцца іхнай перамогай.

Ідучы вайной на Савецкі Саюз, старшыя камандзіры нямецкай арміі атрымалі г.зв. „Камісараў загад", падпісаны Гітлерам, у якім гаварылася: „Вайна супраць Расеі ня можа весьціся рыцарскім звычаем. Ідзе змаганьне бальшавіцкай ідэалёгіі зь ідэалёгіяй аб расавай розьніцы, і змаганьне павінна весьціся безь ніякае літасьці й зь неўступчывай жорсткасьцю". Гэтым загадам Гітлер хацеў увесьці на Ўсходзе такі тэрор, які павінен быў запалохаць людзей да такой ступені, каб яны не былі здольныя да ніякага супраціву, на што фон Трэскоў заўважыў аднаму свайму афіцэру: „Калі

мы не пашлем да Гітлера неадкладна (фэльдмаршала Бока) з дамаганьнем адклікаць ягоны загад, вайна будзе прайграная, а нямецкая армія страціць свой гонар". Многія маршалы й генэралы, прачытаўшы загад свайго фюрэра, не паказвалі яго сваім падначаленым. А фэльдмаршал фон Бок у сваім дзёньніку 4 чэрвеня адзначыў наступнае: „Даць права жаўнеру страляць абы-каго толькі на падставе адно падозраньня ў прыналежнасьці да партызанаў (...) ёсьць ненармальна й супярэчыць вайсковай дысцыпліне". (Крыху пазьней, напрыканцы верасьня 1945 г., Гітлер выдаў свой новы загад „Нахт унд Нэбэл" („Ноч і імгла"), у якім, каб схаваць злачынствы эсэсаўцаў, загадваў не расстрэльваць заложнікаў і партызанаў на вачох у народа, які глядзеў на іх як на пакутнікаў, а дастаўляць „ноччу і ў імгле" ў Нямеччыну, каб ніхто ня бачыў, ды трымаць іх там у канцлягерах).

Замены нялюдзкага трактаваньня савецкіх палонных на больш гуманнае дамагаўся Абвэр і Розэнбэргава Міністэрства ўсходу. Канарыс, кіраўнік нямецкай разьведкі, выслаў свайго падначаленага на канфэрэнцыю, каб той згадаў пра міжнароднае права адносна палонных, бо разумеў, што нялюдзкая дзейнасьць немцаў супраць палонных выклікае ўсё большы супраціў і ў тылу, і на фроньце. Такой самай думкі падтрымліваўся й генэрал фон Шэнкенбэрг, камандзір групы армій „Цэнтр". Ён пісаў у рапарце, што дзеля вядзеньня пасьпяховай барацьбы супраць партызанаў неабходна здабыць прыхільнасьць рускага насельніцтва, і што калі гэтага ня будзе зроблена, партызаны атрымаюць з боку насельніцтва падтрымку ў людзях і рэчах. (Дарэчы, і памагаты Сталіна — Панамарэнка, таксама добра ведаў, што посьпех у дзейнасьці й тактыцы партызанаў шмат у чым залежыць ад супрацоўніцтва зь мясцовымі жыхарамі, якія добра зналі сваю мясцовасьць, людзей, сытуацыю й лякалізацыю ворага. Таму згодна ягоных указаньняў, дзе ласкай, дзе пагрозамі, партызаны змушалі сялянаў да супрацоўніцтва зь імі). На пачатку 1943 г. Розэнбэрг пратэставаў Гімлеру за дыскрымінацыйнае паленьне беларускіх і ўкраінскіх вёсак у часе антыпартызанскіх акцыяў. Аднак Гітлер упарта трымаўся думкі, што партызанскае пытаньне можа быць разьвязанае толькі сілай.

Толькі пасьля таго, як вайна на Ўсходзе зрабілася зацяжной, і нямецкія арміі атрымалі паразу ў шмат якіх бітвах, калі непамерна ўзрасьлі небясьпека й правакацыі з боку партызанаў, Вэрмахт пачаў заахвочваць людзей тварыць сваю паліцыю супраць партызанаў, дазволіў на стварэньне славянскіх вайсковых адзінак. І гэта мела некаторы плён. Так, у зьвязку з апэрацыяй генэрала Ўласава (чэрвень 1944 г.) і г.зв. „Пражскім маніхвэстам", дзе гаварылася аб ганаровым заключэньні міру зь Нямеччынай, аб будучай дэмакратычнай Расеі, аб закрыцьці лягероў прымусовай працы, дэпартацыі, свабодзе рэлігіі, слова, прэсы й г. д., ад савецкіх палонных і „остарбайтэраў" прыходзіла штодня па 2,5-3 тысяч просьбаў прыняць іх у РОА (Русская освободительная армия).

Але час ужо быў не на баку гітлераўцаў. Да таго-ж людзі на акупаваных тэрыторыях даведаліся, што такія моцныя дзяржавы, як Вялікабрытанія й ЗША, зьяўляюцца хаўрусьнікамі СССР і аказваюць яму ўсебаковую дапамогу ў барацьбе супраць Гітлера, што таксама значна паменшыла веру ў перамогу немцаў на Ўсходзе.

Гітлер, як і ягоны нядаўні сябра Сталін, людзьмі не даражылі. Яны іх адно толькі і выкарыстоўвалі ў сваёй экспансыўнай палітыцы, не прамінулі таксама й беларусаў. Так нацысты неаднойчы зьвярталіся да беларускіх дзеячоў у Парыжы й Празе за дапамогай. Як добры жэст, каля 30 тыс. палонных беларусаў з разгромленай у 1939 г. польскай арміі было вызвалена зь лягероў і атрымала лепшыя ўмовы працы й жыцьця. Для іх выдаваліся беларускія газэты „Работнік" і „Раніца". Сярод палонных беларусаў вербаваліся дэвэрсанты, каторых цераз пару дзён пасьля нападу на Савецкі Саюз засылалі ў Беларусь з заданьнем.

(„Рунь" № 38, Вільня, 12 сакавіка 2001 г.)

Дыктатары XX стагодзьдзя

XX стагодзьдзе пакінула па сабе сьлед вялікіх перамен у жыцьці людзей. Ніводнае стагодзьдзе ня можа раўняцца з XX па значнасьці й колькасьці карысных навуковых адкрыцьцяў, вынаходзтваў, якімі людзі карыстаюцца сёньня. Але XX стагодзьдзе пакінула нам сумныя ўспаміны пра

дзве сусьветныя войны. Асабліва прыкрай была Другая Сусьветная вайна, якая запатрабавала ня менш 50 мільёнаў людзкіх ахвяр і пакінула незагойныя цялесныя й духоўныя раны.

Час прамімуў, але цяжка забыць і нялёгка прабачыць тым, хто спрычыніўся да гэтай вайны.

XX стагоддзе „падарыла" Эўропе двух вялікіх дыктатараў — Сталіна й Гітлера, і пра іх мы ўспомнім. Першы дайшоў да ўлады пасля сьмерці Леніна ў 1924 годзе дарогай злачынстваў. Гітлер атрымаў уладу праз прапаганду й агітацыю. Ён дасягнуў сваю большасьць у парляманце й дэмакратычна быў у 1933 годзе назначаны канцлерам Нямеччыны. Маючы большасьць у парляманце й моцны ўрад, Гітлер пачаў дыктаваць свае пастуляты й ліквідаваць усе дэмакратычныя ўстановы, якія выступалі супраць яго ўлады. Дзейнічаў Гітлер адкрыта, свае пляны ён раскрываў перад народам і даводзіў да вышэйшага накалу эмоцый.

Гітлер і яго сябрукі многа гаварылі пра арыйскую расу, да якой сябе залічвалі. Арыйская раса сталася рэлігіяй, ідэалёгіяй, інсьпірацыяй нямецкага народу. А ўсе іншыя „неарыйцы", або „нетэўтонцы", аказаліся ворагамі немцаў, і супраць іх мела пачацца змаганьне.

Наконт арыйскай расы памагаты Гітлера Альфрэд Розэнбэрг сказаў: „Калі нават будзе даказана, што арыйскай расы няма, дык мы хочам, каб яна была ў будучыні".

Сталін, у параўнанні з Гітлерам, не паказваў свайго энтузыязму, а дзейнічаў больш скрытна. Сваю тэорыю марксізму-ленінізму Сталін разьвіваў пры дапамозе камумістычнай партыі, якая служыла прыкладам у дасягненьні сусьветнага камунізму. Гэтая мэта дасягалася суровай дыктатурай пралетарыяту, „ваенным камунізмам". Сталін ведаў, што рускім народам можна кіраваць толькі праз страх і цярпеньне. Так паступалі Іван III Строгі, Іван IV Жахлівы, Пётр I і іншыя князі, цары й імпэратары, якія на людзкіх касьцях будавалі магутнасьць Расейскай імпэрыі.

Усіх папярэднікаў Сталін перасягнуў у жорсткасьці і, каб дасягнуць сваёй мэты, за найменшае непаслушэнства ягонай волі бязьлітасна караў турмамі, выгнаньнем у лягеры Сібіры й расстрэламі.

У гэты самы час Гітлер стараўся, каб жыццёвы ўзровень нямецкага народу быў задавальняючы, каб людзі не наракалі на недахопы. Ён праводзіў прапагандысцкія парады са сьцягамі, гукамі маршаў, палітычнымі выступленьнямі, што ўздымала прэстыж нацысцкай партыі.

Сталін нічога падобнага не рабіў. Усе дзяржаўныя справы рашаліся Палітбюро, пад яго дыктоўку за закрытымі дзвярыма. А прынятыя пастановы ішлі ў народ праз пасрэдніцтва прэсы, радыё, кіно, апошнім часам тэлебачаньня, а таксама праз абавязковыя палітінфармацыі. Вулічных шэсьцяў у СССР не было. Толькі з нагоды Кастрычніцкай рэвалюцыі й 1 Мая праходзілі вялікія парады ў Маскве й сталіцах рэспублік.

Сваю ўладу Сталін замацоўваў, мардуючы не толькі апанентаў, але й сваіх саратнікаў, калі нехта зь іх меў папулярнасьць у народзе. Такі чалавек быў прыгавораны на сьмерць. Пра гэта сьведчаць прапагандысцкія працэсы 1930-х гадоў над камуністамі, якія змагаліся за камуністычны лад, а сталіся яго „ворагамі" па сфабрыкаваных абвінавачаньнях.

Пры пэўнай розьніцы шляхоў заваяваньня й утрыманьня ўлады ў некаторых дзеяньнях і поглядах дыктатары былі падобныя. Гітлер казаў, што чалавек, які ня ведае гісторыі, ня мае вушэй і вачэй. Ён прыводзіў прыклады, што Рымская імпэрыя, якая сама па сабе распадалася, упала пад напорам германскіх варварскіх плямёнаў, якія палажылі падмурак пад новую цывілізацыю.

Сталін, хоць сам быў грузінам, меў вялікія спадзяванні на рускі народ. У час прыёму на Крамлі 24 траўня 1945 году Сталін сказаў: „Я падымаю тост за здароўе рускага народа не толькі таму, што ён кіруючы народ, але й таму, што ў яго светлы розум, стойкі характар і цярплівасць".

Хоць нацысцкая партыя мела сацыялістычную афарбоўку, аднак Гітлер не прыняў навукі Карла Маркса, таму што быў непрымірымым ворагам яўрэяў. Таксама й хрысціянства не адпавядала ягонай палітыцы. Гітлер казаў, што ў хрысціянстве ён бачыць яўрэйскае ашуканства й зь ім ніколі не пагодзіцца. А каб ня мець у краіне канфліктаў з Царквой, Гітлер нічога не рабіў, не праследаваў яе, але казаў, што пасля вайны справа Царквы будзе вырашана. А тэарэтык арый-

скага міту Альфрэд Розэнбэрг прапанаваў замяніць хрысціянства новай нямецкай „рэлігіяй па крыві". Паводле Розэнбэрга, „раса зьяўляецца вонкавай формай душы".

Заступнік Гітлера М. Борман пісаў у 1941 годзе: „Ніколі нельга даваць Царкве ўплываць на народ і ягонае кіраўніцтва. Гэты ўплыў мусіць быць зьнішчаны цалкам і назаўсёды". Так што Гітлер, як і Сталін, ня верыў у хрысціянства, у яго мараль, толькі выкарыстоўваў Царкву ў сваёй палітыцы. Міжнародны капіталізм таксама не адпавядаў гэтым двум дыктатарам.

Варта згадаць, што, нягледзячы на Берасьцейскі дагавор 1918 году, які стаў ганьбай для бальшавікоў, у 1922 годзе ў Рапала падпісаны быў новы дагавор аб супрацоўніцтве Савецкага Саюзу зь Нямеччынай. Аб ім у заключэньні сваёй кніжкі так піша І. Каблякоў („От Бреста до Рапалло", Москва 1954): „Рапала азначала пералом да лепшага ў савецка-нямецкіх адносінах, абумоўлены пераходам Нямеччыны да палітыкі супрацоўніцтва з Савецкай краінай, да палітыкі падтрымання й развіцця мірных адносін і гандлёва-эканамічмых сувязей".

Цікава, што пасля Рапала два дыктатары, будучы ідэалягічна непрымірымымі й адзін да аднаго насьцярожанымі, супрацоўнічалі паміж сабою. Найперш Сталін шукаў кантактаў зь Нямеччынай, нягледзячы на Берасьцейскі дагавор. Нават прасьледаваньне й ізаляцыя камуністаў у дзяржаўным жыцьці гітлераўскай Нямеччыны не перашкаджалі Сталіну шукаць саюзу з Гітлерам. Савецкія інжынеры павышалі сваю кваліфікацыю на нямецкіх прадпрыемствах, а нямецкія афіцэры вучылі чырвонаармейцаў ваеннаму майстэрству. На савецкай тэрыторыі немцы выпрабоўвалі ваенную тэхніку, ствараючы аснову „маланкавай вайны". Усё гэта бачылі камандзіры Чырвонай Арміі й маглі многаму навучыцца на выпадак вайны.

Нацысцкая дыпляматыя не заўсёды была антысавецкай. 24 лютага 1941 году Гітлер прызнаў у сваёй прамове, што нацыянальны сацыялізм і марксізм ёсць аднолькавыя. І, што праўда, Гітлер пераняў многа чаго з навукі Карла Маркса ў сваёй дактрыне, толькі не прыняў самога Маркса, які быў яўрэем. Расейскі камунізм для Гітлера быў яўрэйскім тварэньнем.

Мусаліні таксама надаваў вялікае значэньне італьянскай нацыі, ваеннай сіле, і выступаў супраць старога парадку й марксізму. Так што нацызм Гітлера, камунізм Сталіна й фашызм Мусаліні маюць у сабе больш падабенства, чым адрозьненняў. Усе яны выступалі супраць лібэралізму. Толькі фашызм Мусаліні ня быў такім суровым, як камунізм Леніна й Сталіна ды нацызм Гітлера, якія неміласэрна нішчылі сваіх праціўнікаў. У Італіі не было тэрору, паміж 1926 і 1943 гадамі забітых было толькі 26 асоб. Па словах Уінстана Чэрчыля, „фашызм быў ценем ці, хутчэй, пачварным дзіцём камунізму". Усе гэтыя дыктатарскія краіны аддавалі многа энэргіі прапагандзе, якая ўсхваляла жыццё свайго народа, сваіх лідараў і абяцала шчаслівую будучыню.

Справы, якія былі ўзгоднены на Вэрсальскай канфэрэнцыі без удзелу Нямеччыны й Савецкай Расеі ў 1919 годзе, не пасавалі Гітлеру й Сталіну, і таму яны іх збліжалі й вялі да новай вайны. Асабліва Гітлер ніяк ня мог пагадзіцца з прайгранай немцамі вайной і варункамі міру, якія немцам дыктавала Антанта ў лістападзе 1918 году.

Гітлер хацеў дайсці да ўлады, каб усё гэта ліквідаваць. У лістападзе 1923 году ён падняў няўдалае паўстанне супраць Веймарскай рэспублікі й за гэта трапіў у Нюрнбергскую турму разам са сваімі паплечнікамі. Там ён пачаў пісаць „Майн Кампф" і праводзіў сэмінары па сваёй палітыцы сярод вязьняў.

Нельга сказаць, каб нямецкі народ прагнуў вайны, ён перажываў цяжкі час дэпрэсіі й хацеў мець такі ўрад, які вярнуў-бы яму нацыянальную годнасць і стабільнасць. Таму народ паверыў Гітлеру й пайшоў за ім.

Сталін чытаў „Майн Кампф" у перакладзе на рускую мову і, напэўна, разумеў намеры Гітлера на ўсходзе Эўропы, аднак шукаў зь ім паразуменьня.

Англія й Францыя бачылі, як Гітлер узбройваецца, але гэтаму не заміналі. Спыніць яго можна было толькі мілітарнай інтэрвэнцыяй, але вынік яе быў няясны. Таму нічога не было зроблена, і Гітлер спакойна працягваў сваё ўзбраеньне.

Ліга Нацыяў аказалася мала аўтарытэтнай, досыць бязьдзейснай установай, у якой не было еднасьці. У такім бяз-

ладзьдзі Гітлер у 1936 годзе заняў дэмілітарызаваную Рэйнскую правінцыю, у 1938 годзе заняў Аўстрыю, забраў ад чэхаў Судэты, ад Літвы — Клайпэду з правінцыяй.

Потым настала чарга Польшчы з вольным горадам Гданьскам (Данцыгам) і „польскім калідорам", што вёў да Балтыйскага мора.

Жадаючы пазьбегнуць далейшай экспансіі немцаў, брытанскі ўрад прапанаваў, каб Вялікабрытанія, Францыя, Польшча й СССР выдалі супольную дэклярацыю абароны на выпадак пагрозы вайны для адной зь іх.

Савецкі ўрад падтрымаў такую прапанову, але не хацеў паказаць сябе яўным праціўнікам Гітлера. Польшча таксама не згадзілася на такі саюз, які дазваляў Чырвонай Арміі маршыраваць па яе тэрыторыі, бо ўсё яшчэ лічыла сябе вялікай дзяржавай.

Перагаворы ваенных місій Англіі й Францыі ў Маскве 14 жніўня 1939 году ў справе супольнай абароны не далі задавальняючага выніку. Вядома было, што 10 сакавіка Сталін сказаў у сваёй прамове, што заходнім дзяржавам ня ўдасца ўцягнуць СССР у вайну зь Нямеччынай. Такое сцвярджэньне Сталіна прыйшлося даспадобы Гітлеру, і пяць дзён пазьней немцы акупіравалі Чэхаславакію й устанавілі на яе тэрыторыі свой пратэктарат.

Якраз год раней, 26 сакавіка 1938 году, слушна пісаў у сваім лісьце прэм'ер-міністар Вялікабрытаніі Н. Чэмбэрлен: „Я павінен прызнацца ў сваім глыбокім недаверы да Расеі. Я ня веру, што яна здольная да эфектыўнага выступленьня, нават калі-б гэтага хацела. Я ня веру й яе матывам".

Падобнае пісаў амэрыканскі амбасадар у Маскве Чыльстан 19 красавіка 1939 году: „Чырвоная Армія здольная да абароны граніц Савецкага Саюзу, але няздольная весці вайну на варожай тэрыторыі. (...) На Савецкі Саюз у эўрапейскай палітыцы нельга разлічваць".

19 жніўня 1939 году на тайным пасяджэнні Палітбюро было прынята рашэнне ажыцьцявіць раней выказаны плян Сталіна „вызваліць" Эўропу. Гэта быў плян, які меў уцягнуць Эўропу ў вайну й чакаць, пакуль праціўнікі зморацца ў вайне. Тады Чырвоная Армія пачне сваё „вызваленьне" народаў Заходняй Эўропы.

У паняцьці бальшавікоў, вайна можа быць справядлівая і несправядлівая. Першая — гэта „вызваленне народаў ад рабства капіталізму", а другая — гэта „зняволенне народаў капіталізмам".

Аднак міністар замежных спраў СССР М. Літвінаў стаяў за „калектыўную бясьпеку" супраць агрэсіі, што азначала саюз з дэмакратычнымі дзяржавамі — Англіяй і Францыяй. Але Сталіну, як дыктатару, дэмакратычныя прынцыпы не пасавалі. Ён палічыў больш карысным звязацца з дужай і дыктатарскай Нямеччынай. І, каб не злаваць немцаў, ня мець перашкодаў у перагаворах з Гітлерам, 3 траўня 1939 году М. Літвінава, які быў яўрэем, замяніў В. Молатаў. Такая зьмена абазначала намер супрацоўніцтва двух дыктатараў.

22 чэрвеня 1939 году Молатаў зьвярнуўся да нямецкага амбасадара ў Маскве Шуленбурга, каб нармалізаваць палітычныя адносіны. Прапанова была прынята ахвотна. Перагаворы пачаліся неадкдадна, адбыўся абмен лістамі паміж Гітлерам і Сталіным, што прывяло да падпісання 23 жніўня 1939 году так званага пакту Рыбэнтропа-Молатава, дзе гаварылася аб узаемнай дапамозе й ненападзенні „друг на друга" й падзеле „сфер уплываў". Калі немцы пакідалі залю, Сталін сказаў Рыбэнтропу, што савецкі ўрад прымае пакт вельмі сур'ёзна й ён (Сталін) дае слова гонару: „Савецкі Саюз ня здрадзіць партнёру". Такім чынам было замацавана сяброўства Сталіна з Гітлерам, а не з заходнімі дэмакратычнымі дзяржавамі, якія стаялі за захаваньне міру ў Эўропе, што нічога не давала Маскве. Цяпер Сталін меў нагоду вярнуць Расею ў межы 1914 году.

Падпісваючы гэты пакт, Гітлер і Сталін ашукаліся. Яны думалі, што пазьбеглі вайны. Гітлер спадзяваўся, што справа з Польшчай за Данцыг яму ўдасца так, як з Чэхаславакіяй за Судэты й іншыя правінцыі, дзе пражывалі немцы. А Сталін быў задаволены, што пазьбег вайны зь Нямеччынай.

У жніўні 1939 году Сталін меў тры магчымасьці (у эўрапэйскім канфлікце): дамовіцца з Англіяй і Францыяй, дамовіцца зь Нямеччынай або не дамаўляцца зь нікім, чакаць, адкладваць і застацца нэйтральным у канфлікце. Аднак, як бачым, Сталін рашыў зьвязацца з Гітлерам, што азначала вайну.

Пакт Рыбэнтропа-Молатава меў для Гітлера часовае значэньне. Яму ўдалося ізаляваць СССР ад саюзу з Англіяй, Францыяй і Польшчай на выпадак вайны з апошняй. Гітлер меў на мэце ня толькі Данцыг і „калідор", а значна большае — славянскую прастору на ўсходзе аж да Урала.

Усё-ж можна сказаць смела: каб не было гэтага пакту, не было-б і сусьветнай вайны, яе можна было-б пазьбегнуць мірнымі перагаворамі. Не што іншае, а пакт Рыбэнтропа-Молатава даў пачатак Другой Сусьветнай вайне.

Нельга сказаць, каб дзень 1 верасьня 1939 году прынёс радасць нямецкаму народу, які пачуў вестку пра вайну. Гэтай раніцай, калі Гітлер ехаў у Рэйхстаг, не відаць было на вуліцах людзей, якія-б яго віталі, не было ранейшага энтузыязму. Яшчэ больш змрочнай стала вестка, што 3 верасьня Англія й Францыя аб'явілі вайну Нямеччыне.

Польшча капітулявала за месяц, але, не чакаючы капітуляцыі Варшавы, 25 верасня ў Берасьці адбыўся парад нямецкага й савецкага войскаў у гонар супольнай перамогі над ворагам. Між тым аб парадзе нічога не было сказана ў савецкай прэсе, быццам яго не было.

Па жаданню Сталіна Рыбэнтроп зноў прыехаў у Маскву, дзе 28 верасня быў заключаны тайны дагавор, які дазваляў Савецкаму Саюзу акупіраваць Балтыйскія дзяржавы ўключна зь Фінляндыяй, якая мела ўвайсці ў зону савецкіх уплываў. Савецкі Саюз запатрабаваў ад фінаў перанесьці граніцу далей ад Ленінграда, за што абяцаў узамен тэрыторыю ў іншым месцы. На гэта фіны згадзіліся, аднак адмовіліся ад прысутнасці савецкай марской базы на сваёй тэрыторыі. У адказ савецкі ўрад скасаваў свой ранейшы дагавор зь Фінляндыяй аб ненападзеньні й 30 лістапада 1939 году распачаў зь ёю вайну. 26 савецкіх дывізіяў, 465 000 байцоў рушылі супраць 9 фінскіх дывізіяў — 130 000 жаўнераў, тысяча савецкіх самалётаў супраць 150 фінскіх старых самалётаў. Аднак фіны біліся мужна, што выклікала сімпатыю й спачуваньне ў шмат якіх краінах сьвету. Ім аказвалася дапамога зброяй і добраахвотнікамі. Сапраўднай мэтай Крамля зьяўлялася ўсталяваньне ў Фінляндыі камуністычнага ўраду, які быў ужо падрыхтаваны. Але супраціўленьне фінаў на фронце аказалася такім стойкім, што савецкі ўрад пачаў у Швэ-

цыі сакрэтныя перагаворы з урадам Фінляндыі, дзе ішла размова толькі пра граніцу паміж дзвюма дзяржавамі.

Зімняя вайна каштавала Чырвонай Арміі 200 000 забітых, у той час як фіны страцілі 23 000. Мір быў заключаны 12 сакавіка 1940 году. І хоць частка Карэліі адышла да СССР, вайна Савецкага Саюзу зь Фінляндыяй паказала слабасьць Чырвонай Арміі. Камісарам абароны замест Варашылава быў пастаўлены Цімашэнка. Не абышлося й без новай чысткі ў армейскіх радах.

Цікава, што ніхто ў Лізе Нацыяў не падняў пытання аб пачатку польска-нямецкай вайны ў верасні 1939 году. Але ў снежні таго ж году Ліга Нацыяў пазбавіла Савецкі Саюз членства за напад на Фінляндыю. А прэзыдэнт ЗША Ф. Рузвэльт пра вайну Савецкага Саюзу зь Фінляндыяй сказаў перад кангрэсам амэрыканскай моладзі ў лютым 1940 году наступнае: „Савецкі Саюз, як усведамляе ўсякі, у каго хапае мужнасці паглядзець у твар фактам, кіруецца дактрынай настолькі абсалютнай, што падобную цяжка знайсці ў свеце. Ён уступіў у саюз з другой дыктатурай і ўварваўся на тэрыторыю суседа, настолькі малога, што той ня мог уяўляць ніякай пагрозы, не мог нанесьці ніякай шкоды Савецкаму Саюзу й жадаў аднаго — жыць у міры як дэмакратычная краіна".

Летам 1940 году Літва, Латвія й Эстонія пад націскам заключылі пакт з СССР, які пазбаўляў іх суверэнных правоў. Вось што сказаў тады літоўскі міністар Крэве-Міцкявічус Молатаву: „Хацеў-бы толькі папярэдзіць вас, што, калі аб вашых мэтах стане вядома нашаму народу, ён будзе глядзець на немцаў як на магчымых саюзьнікаў, якія дапамогуць яму вызваліцца ад вашай тыраніі. Няма ніякага сумненьня, насельніцтва будзе разглядаць вашы гарнізоны як акупацыйную армію й будзе змагацца зь імі ўсімі магчымымі шляхамі. Ці выгадна гэта Савецкаму Саюзу ў такі нестабільны час? Каб пазьбегнуць усяго гэтага, мы прапануем заключыць новы дагавор аб дружбе. Гэта палепшыць наша становішча й умацуе аўтарытэт Савецкага Саюзу ў вачах літоўскага народу. У адпаведнасці з гэтым пактам мы згодны нават на абмежаваньне волі нашых дзеяньняў у галіне зьнешняй палітыкі дзеля таго, каб улічыць інтарэсы й парады Савецкага Саюзу".

На гэта Молатаў, спасылаючыся на Леніна, адказаў міністру Літвы, што Другая Сусьветная вайна дазволіць СССР заваяваць уладу ва ўсёй Эўропе. „Я думаю, — казаў Молатаў, — дзесьці каля Рэйна адбудзецца рашаючая бітва паміж пралетарыятам і загніваючай буржуазіяй. (...) Мы ня можам дазволіць застацца ў нас у тыле маленькаму астраўку той сацыяльнай сістэмы, якая павінна будзе зьнікнуць па ўсёй Эўропе".

Так ігнараваліся законныя правы людзей і ўсіх народаў дыктатарскімі рэжымамі Сталіна й Гітлера. Пасля такіх экспансій двух дыктатараў граніца СССР зь Нямеччынай расцягнулася на 3 000 кілямэтраў і не была фартыфікавана.

Дружалюбныя адносіны паміж двума дыктатарамі засталіся. Былі падпісаны дзве гандлёвыя дамовы. Савецкі Саюз дастаўляў у Нямеччыну неабходную сыравіну для яе ваеннай прамысловасці, якая вылічвалася тысячамі тон розных мэталяў, нават каляровых, паліва й зерня. Так што Гітлер не баяўся марской блякады Англіі й Францыі. Сталін аказаўся такім шчодрым для Гітлера, што слаў у Нямеччыну больш, чым гэта было ўзгоднена дагаворам. Нават за некалькі гадзін да атакі на СССР прыйшоў цягнік з таварам.

Як верныя саюзьнікі Гітлера, Сталін і Молатаў гаварылі, што Брытанія й Францыя — агрэсары, а Нямеччына толькі бароніцца. Савецкая прапаганда трубіла, каб ЗША не ўмешваліся ў эўрапэйскія справы й не падтрымлівалі Брытанію й Францыю.

Адказваючы Рыбэнтропу на прывітанні з нагоды свайго 60-годзьдзя, Сталін дзякаваў міністру й сказаў: „Сяброўскія сувязі народаў Нямеччыны й Савецкага Саюзу, замацаваныя крывёю, маюць усе падставы быць працяглымі й моцнымі".

Нягледзячы ма антызаходнія выступленьні Крамля супраць Вялікабрытаніі й Францыі, брытанскі амбасадар у Маскве Стафард Крыпс 1 ліпеня 1940 году перадаў Сталіну пісьмо ад Чэрчыля, які прапанаваў саюз на выпадак нямецкага нападу на СССР. Але такую прапанову Сталін не прыняў. Падобная прапанова брытанска-савецкага саюзу была 15 красавіка 1941 году прадстаўлена савецкаму амбасадару ў Лёндане Івану Майскаму, але й гэтым разам яна не мела падтрымкі. І толькі

калі Гітлер напаў на СССР, Сталін зразумеў свае памылкі й уступіў у саюз зь Вялікабрытаніяй і ЗША.

Дзякуючы матэрыяльнай дапамозе Сталіна, Гітлер узброіў сваю армію й у 1940 годзе заняў Бэльгію, Данію, Галяндыю, Францыю й Нарвэгію. Восеньню таго-ж году саюзьнік Гітлера, Мусаліні, напаў на Грэцыю. І хоць яго напад грэкі адбілі, было зразумела, што немцы дапамогуць італьянцам.

Раней, 24 чэрвеня 1940 году, Югаславія падпісала на пяць гадоў дагавор з СССР аб сяброўстве, спадзеючыся на дапамогу Савецкага Саюзу на выпадак нямецкай агрэсіі. Разумеючы небясьпеку, якая пагражала СССР з боку Нямеччыны й Японіі, Сталін на канфэрэнцыі камандзіраў арміі 13 студзеня 1941 году сказаў, што Расея павінна падрыхтавацца да вайны, бо ёй пагражае небясьпека з захаду й усходу.

Але калі немцы дапамаглі італьянцам заняць Грэцыю ў сакавіку 1941 году, а Югаславію ў красавіку, Савецкі Саюз не аказаў ім ніякай дапамогі, а 9 траўня 1941 году нават адмовіў прызнаць югаслаўскае пасольства ў Маскве з прычыны страты дзяржаўнай незалежнасьці.

У ходзе агрэсіўнай вайны Мадзьяршчына, Румынія й Балгарыя сталіся сатэлітамі Гітлера. Такая экспансія на Балканах занепакоіла крамлёўскіх лідараў, але яны не аказалі дапамогі сваім старым саюзьнікам. Чырвоная Армія ме магла аказаць мілітарнай дапамогі, бо ў часе сталінскай чысткі не стала:

— 3 з 5 маршалаў,
— 13 з 15 камандзіраў армій,
— 8 з 9 адміралаў,
— 50 з 57 камандзіраў карпусоў,
— 108 са 154 членаў Вярхоўнага Ваеннага Савету.

Ад 1937 да 1941 году 43 000 камандзіраў батальёнаў і ніжэйшых афіцэраў былі арыштаваны. Адных расстралялі, іншых адаслалі ў лягеры. Як падае Рой Мядзьведзеў, „ніколі афіцэры ніякай арміі не пацярпелі такіх вялікіх страт ні ў якой вайне, як Савецкая Армія ў гэты час".

12 лістапада 1940 году Молатаў паехаў у Бэрлін. Гітлер прапанаваў яму, каб Савецкі Саюз далучыўся да саюзу Нямеччыны, Італіі й Японіі. За гэта абяцаліся Расеі ўплывы на Чорным моры й прастора ў Азіі. Гітлер гаварыў аб па-

дзеле сьвету на чатыры сфэры ўплываў. Наступнага дня Молатаў гутарыў з Рыбэнтропам, а англічане пачалі бамбіць Бэрлін. Прыйшпося перайсьці ў бункер Рыбэнтропа, дзе ў далейшай дыскусіі Рыбэнтроп запэўніваў Молатава, што Брытанія пабіта й яе імпэрыю чакае падзел між дзяржавамі „восі". Тады Молатаў іранічна запытаў Рыбэнтропа: „Калі так, то чые гэта бомбы падаюць так блізка?"

Наслухаўшыся прапаноў Гітлера й Рыбэнтропа, Молатаў прывёз іх у Маскву 14 лістапада. Дванаццаць дзён пазьней Гітлер атрымаў з Масквы згоду ма падзел сьвету на чатыры сфэры ўплываў з канкрэтнымі савецкімі прапановамі. Але яны Гітлеру не спадабаліся, і ён ужо не так патрабаваў матэрыяльную дапамогу ад Савецкага Саюзу, бо меў пад сваім кантролем некалькі дзяржаў і больш за 330 мільёнаў насельніцтва. Гітлер загадаў генэралу Гадлеру распрацаваць дакладны плян нападу на Савецкі Саюз. „Плян Барбароса" быў прыняты 18 сьнежня 1940 году. Калі Гітпер паведаміў сваім генэралам пра „Плян Барбароса", то некаторыя зь іх былі здзіўлены й не падзялілі такі рызыкоўны крок. Але Гітлер запэўніў: усё, што патрэбна ў вайне, будзе ўзята на Ўсходзе.

КДБ меў добрых разьведчыкаў ва ўсіх краінах сьвету, яны інфармавалі свой цэнтр аб найважнейшых падзеях. Першая вестка аб тым, што мае адбыцца атака немцаў на Савецкі Саюз, прыйшла са Швайцарыі. Такая інфармацыя паступала з Бэрліна, Парыжа, Токіо. Чэрчыль некалькі разоў папярэджваў Маскву пра плянаваны напад Гітлера на СССР, але такую інфармацыю Сталін прымаў за правакацыю. Масква хацела паказаць свету, што быццам паміж Савецкім Саюзам і Нямеччынай пакт Рыбэнтропа-Молатава актуальны.

Найбольш дакладную інфармацыю пра напад Гітлера на СССР перадаваў Рыхард Зоргэ. Ён працаваў карэспандэнтам адной нямецкай газэты ў Токіо, быў сябрам нямецкага амбасадара й японскага прэм'ера, таму меў доступ да інфармацыі. Зоргэ паведаміў, што японскі ўрад не мае намеру напасьці на СССР.

18 чэрвеня нямецкі сяржант перайшоў на савецкі бок і сказаў, што 22 чэрвеня ф гадзіне 4^{15} раніцы немцы пойдуць у наступ па ўсёй савецка-нямецкай граніцы. Але ўся гэтая інфар-

мацыя пра напад Гітлера на Савецкі Саюз не пераканала Сталіна, які ніяк не мог паверыць у здраду Гітлера.

22 чэрвеня 1941 году на пасяджэньні Цэнтральнага Камітэта партыі Сталін сядзеў белы. Пра напад Гітлера на Савецкі Саюз паведаміў па радыё В. Молатаў. Ён сказаў, што гітлераўская Нямеччына напала вераломна й неспадзявана.

Сталін, які быў галоўным ідэолягам саюзу з Гітлерам, так ніколі й не прызнаў сваёй віны. Віну ўсклалі на невінаватых генэралаў Заходняга фронту на чале з Паўлавым за іх „некампэтэнтнасць". На допытах іх білі й дамагаліся прызнаньня ў змове супраць Сталіна й за гэта 30 чэрвеня 1941 году расстралялі.

Чырвоная Армія была дэмаралізаваная. Справы на Заходнім фронце пачалі мяняцца да лепшага зімою 1941 году, калі быў адбіты наступ немцаў на Маскву.

Дзякуючы інфармацыі Зоргэ, што японцы не нападуць на СССР, каля дзесяці дывізіяў з поўным узбраеньнем былі пераведзены на Заходні фронт. Яны прымалі ўдзел у баях пад Масквой.

У кастрычніку 1941 году Зоргэ быў арыштаваны японскай паліцыяй і тры гады пазней, 7 лістапада 1944 году, павешаны. Савецкі ўрад нічога не зрабіў, каб уратаваць жыцьцё свайму чалавеку, які так многа яму заслужыўся. Сталін ня меў намеру ратаваць жыцьцё тым, хто папярэджваў яго й мог быць сьведкам ягоных пралікаў на парозе вайны. Падобны лёс напаткаў і іншых савецкіх разьведчыкаў, якія інфармавалі свой цэнтр аб непазьбежным нападзе немцаў на СССР. Нават жонку Зоргэ арыштавалі й вывезьлі ў лягер.

Варта згадаць, што перад нападам на Савецкі Саюз старшыя камандзіры нямецкай арміі атрымалі так званы „Камісараў загад", падпісаны Гітлерам, у якім гаварылася: „Вайна супраць Расеі ня можа весьціся рыцарскім звычаем. Ідзе змаганьне адной зь ідэалёгій расавай розьніцы, і змаганьне павінна весьціся без ніякай міласьці й зь няўступнай жорсткасцю". І той жаўнер, які паступіць супраць міжнароднага права, будзе прабачаны, бо Расея не прымае ўдзелу ў Гаагскай канвэнцыі й таму не падлягае яе праву. Так тлумачыў Гітлер.

Хоць Сталін ніколі не прызнаў свае памылкі, аднак на прыёме на Крамлі 24 траўня 1945 году сказаў: „У нашага

ўрада было нямала памылак, былі ў нас моманты адчайнага становішча ў 1941-1942 гадох, калі наша армія адступала (...) таму што не было іншага выйсьця. Іншы народ могбы сказаць ураду: вы не апраўдалі нашых спадзяваньняў, ідзіце прэч, мы паставім іншы ўрад, які заключыць мір зь Нямеччынай і забясьпечыць нам спакой. Але рускі народ не пайшоў на гэта, бо ён верыў у правільнасць палітыкі свайго ўраду".

„Правільная палітыка свайго ўраду" каштавала СССР дзесяткі мільёнаў жыцьцяў.

Нягледзячы на ўсе страты й пралікі, Сталін стаўся ў час вайны мацнейшым, чым быў перад вайной. Заходнія саюзнікі шчодра дапамагалі яму ў вайне. Толькі ўсё гэта пайшло ў забыцьцё, бо хутка пасьля гарачай вайны пачалася „халодная вайна" й апусцілася „жалезная заслона".

Варта яшчэ згадаць, што сьмерць Гітлера й Сталіна пакінула па сабе чорны след. Гітлер, каб не адказваць перад судом за свае злачынствы, 30 красавіка 1945 году скончыў самагубствам і быў спалены. Яго верны слуга й прапагандыст арыйскай расы Гебэльс 1 траўня 1945 году атруціў шасцёра сваіх дзяцей, застрэліў жонку й сябе. Герман Герынг, які быў асуджаны Нюрнбергскім трыбуналам, за некалькі гадзін да шыбеніцы прыняў атруту. Дзесяць нацыстаў, блізкіх супрацоўнікаў Гітлера, апынуліся на шыбеніцы 16 кастрычніка 1946 году.

Сталін, як вядома, перад паралічам меў гутарку са сваімі сябрамі даволі позна ўначы. Калі раніцай ён не паказаўся, абслуга была занепакоеная, але баялася яго трывожыць. І толькі а другой гадзіне ночы зайшлі ў яго спальню й убачылі, што Сталін ляжыць ма падлозе й не можа гаварыць. Тады паклікалі Малянкова й Бэрыю. Бэрыя прыехаў а трэцяй гадзіне раніцы й сказаў, што Сталін сьпіць і ня трэба клікаць доктара. Ён і іншыя лідары прыйшлі зноў а дзевятай гадзіне вечара з доктарам. Бэрыя хадзіў па пакоі, пляваўся й выказваў свой гнеў, што збоку выглядала непрыстойна. А калі Сталін адкрыў вочы, ягоная дачка Сьвятлана ўбачыла, як хутка зьмяніўся Бэрыя. Ён ужо хацеў паказаць, які ён „адданы майму бацьку. Позірк майго бацькі быў страшны, яго не магу забыць па сёння", — запісала Святлана. Хрушчоў адзначаў: „Калі

Сталін адкрыў вочы, Бэрыя ўпаў на калені, узяў руку Сталіна й пачаў яе цалаваць. А калі Сталін страціў прытомнасць і закрыў вочы, Бэрыя ўстаў і плюнуў.

Такой была сьмерць двух былых саюзнікаў-дыктатараў, на сумленні якіх засталіся мільёны ахвяр як у мірны час, так і ў вайну. Таму, каб чалавек мог спакойна жыць і свабодна сябе адчуваць, трэба змагацца з усімі праявамі дыктатуры.

(„Голас Радзімы" № 18-20, Менск, 3-17 мая 2000 г.)

Юры Весялкоўскі — эміграцыйны беларускі гісторык і публіцыст. Нарадзіўся 2 студзеня 1924 г. у Новым Сьвержані. У 1942 г. пачаў навуку ў Беларускай Настаўніцкай Сэмінарыі ў Нясьвіжы. Вясною 1944 г. у групе шасьцідзесяці сэмінарыстаў накіраваны ў афіцэрскую школу Беларускай Краёвай Абароны. У канцы чэрвеня школу эвакуіравалі ў Прусію, а яе вучняў накіравалі на французскі фронт. У канцы жніўня 1944 г. уцёк да французскай партызанкі і быў інтэрнаваны амэрыканцамі. Як грамадзянін II Рэчы Паспалітай быў пераведзены ў польскі ваенны лягер у Марсыліі. Пасьля абучэньня 27 сьнежня 1944 г. накіраваны ў польскія падразьдзяленьні, якія змагаліся ў Італіі.

Пасьля вайны пераехаў у Вялікабрытанію. Жыве ў Лёндане. У 1947 г. быў адным з закладчыкаў Згуртаваньня Беларусаў Вялікабрытаніі. Дзеяч Хрысьціяньскага Аб'яднаньня Беларускіх Работнікаў — да 1962 г. яго сакратар. Рэдактар часопісаў „Аб'яднаньне" (1948-1962), „Званіца" (1974-1976) і двухмесячніка „Голас Часу" (1989-1996).

Аўтар кніг прысьвечаных гісторыі Беларусі:

- Дарогі рымскіх папаў на Усход (1992);
- Што прывяло Армію Краёву на Беларусь? (1995);
- Беларусь у Першай Сусьветнай вайне (1996);
- Няясна мроіліся новыя дарогі (1997);
- Нарысы па гісторыі Беларусі. Частка I — да 1384 г. (1998);
- Па сьлядах Другой сусьветнай вайны (2002);
- Нарысы па гісторыі Беларусі (2002);
- Рабы ў старажытным і сучасным сьвеце (2003);
- Ад Гарбачова да Белавежы (2004).

ЮРЫ ВЕСЯЛКОЎСКІ

ДУХ ЧАСУ